РАІСА ЖУК-ГРЫШКЕВІЧ

ЖЫЦЬЦЁ ВІНЦЭНТА ЖУК-ГРЫШКЕВІЧА

Раіса Жук-Грышкевіч

ЖЫЦЬЦЁ ВІНЦЭНТА ЖУК-ГРЫШКЕВІЧА

RAISA ŽUK-HRYŠKIEVIČ

The Life of
VINCENT ŽUK-HRYŠKIEVIČ

Belarusan Memoirs Publishing Fund
Toronto – Canada
1993

РАІСА ЖУК-ГРЫШКЕВІЧ

ЖЫЦЬЦЁ ВІНЦЭНТА ЖУК-ГРЫШКЕВІЧА

Выдавецкі Фонд Успамінаў зь Беларускага Жыцьця
Торонто – Канада
1993

Printed by:
GORDEN & GORDON ASSOCIATES INC.
1295 Eglinton Ave. E., Unit 28
Mississauga, Ontario Canada L4W 3E6



Вінцэнт Жук-Грышкевіч (1903-1989)

У адзначэньне
75-х Угодкаў
Беларускай Народнай Рэспублікі



In observance of the
75th anniversary of the
Belarusan Democratic Republic

УВОДЗІНЫ

Мэта гэтае працы – аддаць пашану памяці Вінцэнта Жук-Грышкевіча; прадставіць ягонае жыццё так, каб факты гаварылі самі за сябе. І тут ён – Вінцэнт Жук-Грышкевіч – сам выказваецца болей, як укладальнік гэтай кнігі гаворыць аб ім. Гэта больш за ўсё ўложаны амаль ў храналягічным парадку няпоўны збор дакумэнтаў з жыцця й дзейнасьці Вінцэнта Жук-Грышкевіча, ягоная спадчына.

Інтэгральнай часткай зьместу багатай душы В. Жук-Грышкевіча, сына паняволенага народу, была любоў да Бацькаўшчыны-Беларусі, любоў, што дыктавала яму абавязак служэньня беларускай справе. Ён верыў, што Бог даў яму жыццё, здароўе, здольнасьці й сілы ператрываць, перажыць савецкія лягеры сьмерці патое, каб аддаць сябе на службу Бацькаўшчыне, на змаганьне за вызваленьне Беларусі. Незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі, абвешчаная Актам 25 Сакавіка 1918 году, была, як ён казаў, «пуцяводнай зоркай» ягонага жыцця, і павінна ёю быць для ўсяе беларускае эміграцыі, для ўсяго беларускага народу.

Каб магчы пасьпяхова праводзіць нялёгкае й складанае змаганьне за незалежнасьць Беларусі, ён верыў, беларуская эміграцыя – свабодная частка беларускага народу – павінна быць так сарганізаванай, каб ейныя высілкі, ейная энэргія была скаардынаванай. Скаардынаваная энэргія – гэта апошняе слова палітыкі. Каб гэта асягнуць, трэба грамадзтва ўсьведаміць, узгадаваць, навучыць. І Вінцэнт Жук-Грышкевіч быў настаўнікам, арганізатарам і палітыкам. Ягонае жыццё цесна зьвязана зь беларускім адраджэнскім рухам.

Праца гэтая кідае сьвятло на эпоху – амаль не на цэлае дваццатае стагодзьдзе, на жыццё й дзейнасьць беларускае эміграцыі, яе суадносіны зь беларускім народам на Бацькаўшчыне, на беларускі вызвольны рух.

Укладальнік гэтае кнігі з прыемнасьцю выказвае шчырую падзяку др. Вітаўту Кіпелю, старшыні Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ў ЗША, др. Вітаўту Тумашу, быўшаму старшыні БІНіМ у ЗША, сп-ні Зоры Кіпель, паэткам Натальлі Арсеньневай, Дануце Бічэль-Заг-

нетавай, а. Аляксандру Надсону, сп. Гай дэ Пікарду, др-у Яну Запрудніку, сп-ні Валі Пашкевіч, праф. Томас Е. Бэрду, сп-ні Людовіцы Будзька-Бяленіс, сп.сп.: Міхасю Яськевічу, Яну Міхалюку, Міхасю Тулейку, Васілю Стому, Паўлюку Пашкевічу, сп-ні Рагнедзе Грышкевіч-Аляхновіч і шматлікім суродзічам, якія радай, матар'ялам ды маральнай падтрымкай спрычыніліся да зрэалізаваньня гэтага выданьня. Укладальнік спадзяецца, што яна выканала запавет др. Вінцэнта Жук-Грышкевіча, які заклікаў нас пісаць «пра прошласьць – дзеля будучыні».

Раіса Жук-Грышкевіч

БІЯГРАФІЯ ВІНЦЭНТА ЖУК-ГРЫШКЕВІЧА

Вінцэнт Жук-Грышкевіч быў выдатным беларускім дзеячом і адыграў вялікую ролю ў беларускім вызвольным руху свайго часу. Дзейнасьць яго абыймала розныя галіны – пэдагагічную, навуковую, арганізацыйна-грамадзкую, палітычна-дзяржаўную – і вялася, не зважаючы на перасьледы, арышты, вязьніцы, ссылкі, канцэнтрацыйныя лягеры.

Нарадзіўся Вінцэнт Жук-Грышкевіч 10 лютага 1903 году ў рыма-каталіцкай сям'і ў мястэчку Будслаў Вялейскага павету ў заходняй Беларусі. Бацькі ягоныя – Марыя, з дому Ханяўка, і Антон – былі абое беларусы, займаліся земляробствам. Мелі яны шасьцёра дзяцей, пяцёра зь іх дажыло да дарослага веку: Ядвіня, Яська, Міхась, Браніслаў і наймалодшы Вінцэнт.

Пачаткавую асьвету Вінцук здабыў у Будславе, сярэднюю – у беларускіх гімназіях: у Будславе і Вільні. У 1922 годзе ён закончыў Віленскую Беларускую Гімназію.

Восеньню 1922 году Вінцэнт паступіў на факультэт славянскай філялёгіі й гісторыі ўнівэрсытэту Карла IV ў Празе Чэскай і ў 1926 годзе закончыў студыі як вучыцель сярэдняй школы.

У сьнежні 1932 году В. Жук-Грышкевіч нострыфікаваў свой чэскі дыплём на ўнівэрсытэце Сьцяпана Батуры ў Вільні, здаўшы дзяржаўныя экзамены, якія кваліфікавалі яго выкладаць у сярэдніх школах гісторыю й славянскую філялёгію.

26 ліпеня 1952 году праф. В. Жук-Грышкевіч абараніў на Атаўскім унівэрсытэце ў Канадзе дакторскую дысэртацыю з галіны беларускай літаратуры на тэму: «Лірыка Янкі Купалы», і 11 кастрычніка 1952 году атрымаў навуковую ступень доктара філязофіі з галіны літаратуры.

Пэдагагічную дзейнасьць пачаў В. Жук-Грышкевіч, вярнуўшыся з Прагі Чэскай (а фактычна ў 1915 годзе пасьля заканчэньня двухкляснага прыхадзкога вычылішча, калі ён быў хатнім настаўнікам у вёсцы Васілеўшчыне; там ён зарганізаваў і школку, якую палякі зачынілі ў 1919 годзе). У гадох 1927-1939 ён быў вучыцелем у Віленскай Беларускай Гімназіі, дзе выкладаў гісторыю, беларускую мову й літаратуру. Гэтаксама быў выкладчыкам беларускае мовы ў Праваслаўнай Духоўнай Сэмінарыі і ў Вышэйшай Школе Палітычных Навукаў у Вільні.

Будучы ў войску ад 1945 да 1949 году, праф. В. Жук-Грышкевіч быў выкладчыкам гісторыі й псыхалёгіі ў вайсковых польскіх сярэдніх школах: у Порто Сан Джорджыё й Модэна – у Італіі ды ў Англіі.

У Канадзе ад 1951 да 1954 году пры ўнівэрсытэце Таронта (University Extension) ён вёў, зарганізаваны ягоным стараньнем, лектарат беларусаведы.

Апрача пэдагагічнай працы, Вінцэнт Жук-Грышкевіч з 19-ці годоў праз усё сваё даўгое жыцьцё займаўся навуковай, нацыянальна-грамадзкай і палітычнай дзейнасьцьцю. Ужо ў 1922 годзе, у часе першых выбараў у польскі сойм, ён, выпускнік Віленскай Беларускай Гімназіі, быў выбарчым інструктарам на Браслаўскі й Дзісьненьскі паветы ад Беларускага Выбарчага Камітэту ў Вільні; агітаваў па сёлах і мястэчках за беларускіх кандыдатаў у польскі сойм і сэнат. Беларусы йшлі на выбары ў блёку г. зв. меншасьцяў Польшчы.

У Празе Чэскай В. Жук-Грышкевіч належаў да беларускіх студэнцкіх арганізацыяў; у Вільні браў актыўны ўдзел у беларускім «Навуковым Таварыстве», «Беларускім Вучыцельскім Саюзе» й у «Таварыстве Беларускай Школы – ТБШ»; супрацоўнічаў у часопісах і газэтах: «Беларуская Справа», «Наша Справа», «Народны Звон», «Сям'я й Школа», «Беларускі Звон» і «Маладая Беларусь».

30 верасьня 1939 году, пасьля акупацыі Чырвонаю Арміяй Вільні, НКВД арыштавала В. Жук-Грышкевіча. Ён быў зьняволены ў турмах: Лукіскай, Беластоцкай, Вялейскай, Менскай, Полацкай і ў Воршы. У 1940 годзе прачы-

талі яму прыгавор, у якім было сказана, што ён «социально опасный элемент» ды вораг народу й савецкай улады і дзеля гэтага прысуджаны на 8 гадоў «исправительных трудовых лагерей».

У гэтых «трудовых» лягерах ён разам з сотнямі іншых вязьняў будаваў найболей паўночную – ад Белага мора да паўночнага Уралу – чыгуначную лінію.

У выніку дагавору генэрала Сікорскага з Молатавым пра звальненьне зь лягероў польскіх грамадзян у 1942 годзе В. Жук-Грышкевіч быў звольнены, і каб урэшце вырвацца з Савецкага Саюзу, увосені 1942 году накіраваўся ў польскае войска, якое тады фармавалася з польскіх грамадзян.

З войскам гэтым, што было ў складзе восьмай Брытыйскай Арміі, ён быў у Іраку, Палестыне, Эгіпце, а пасьля ў Італіі. Браў удзел у бітве пад Монтэ Касына. Пасьля спыненьня ў 1945 годзе ваенных дзеяньняў у Італіі ён выкладаў у вайсковай польскай сярэдняй школе гісторыю й псыхалёгію. З вучнямі-беларусамі падрыхтоўваў грунт для заснаваньня беларускай арганізацыі ў Англіі, куды ведама было, што яны з войскам пераедуць.

У 1946 годзе В. Жук-Грышкевіч з жаўнерамі-беларусамі арганізаваў у Лёндане, Англіі, першую пасьля вайны на эміграцыі беларускую арганізацыю – Згуртаваньне Беларусаў у Вялікай Брытаніі, быў ягоным першым старшынём. У гэтых гадох быў рэдактарам часопісаў: «На Шляху» і «Беларус на Чужыне».

У студзені 1950 году В. Жук-Грышкевіч пераяжджае ў Таронта і стаецца “spiritus movens” беларускага нацыянальна-грамадзкага й навуковага жыцьця ў Канадзе. Арганізаваў групоўку «Авангард», быў ініцыятарам і галоўным арганізатарам у Канадзе Першае Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі, арганізаваў Беларускую Крэдытовую Супалку – “Byelorussian (Toronto) Credit Union Ltd.”, пры ўнівэрсытэце Таронта – Лектарат Беларусаведы, на якім ён быў выкладчыкам. Рэпрэзэнтаваў беларусаў на кангрэсе “Pax Romana” ў Таронта, Монтрэалі й Квэбэк Сіты. Супрацоўнічаў у газэтах: «Беларускі Эмігрант» і «Бацькаўшчына». Увосені 1952 году здабыў на Атаўскім унівэрсытэце навуковую ступень доктара філязофіі. 4-га верасьня 1953 году ажаніўся зь беларускай студэнткай факультэту дэнтыстыкі Тарантонскага ўнівэрсытэту Раісай Жукоўскай.

У лютым 1954 году старшыня Рады БНР інж. М. Абрамчык накіроўвае яго ў Нямеччыну арганізаваць і весьці беларускую сэкцыю радыё «Вызваленьне» ў Мюнхэне. 20 траўня 1954 году беларускія радыёперадачы пайшлі ў Беларусь. На становішчы кіраўніка беларускай сэкцыі радыё «Вызваленьне» В. Жук-Грышкевіч быў да красавіка 1956 году, калі вярнуўся назад у Таронта ў Канаду.

У Канадзе йзноў поўнасьцю ўключаецца ў беларускае грамадзкае жыцьцё. Супрацоўнічае з др. В. Дж. Кэйэ ў апрацаваньні магаграфіі пра беларусаў у Канадзе – Canadians of Byelorussian Origin. У 1966 годзе арганізуе Каардынацыйны Камітэт Беларусаў Канады, у 1967 – Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва ў Канадзе й зьяўляецца першым старшынём абедзьвюх арганізацыяў.

Вінцэнт Жук-Грышкевіч рэпрэзэнтуе беларусаў на агульнаканадыйскіх кангрэсах і канфэрэнцыях, як: у верасьні 1965 году бярэ ўдзел у зьезьдзе Рады Стагодзьдзя Канады ў Таронта як прадстаўнік ад Згуртаваньня Беларусаў Канады (сябры Рады Стагодзьдзя Канады ад 1961 году), у 1966 годзе – на канфэрэнцыі "Rights and Responsibilities" у Порт Элджын, на "Thinkers' Conference" ў 1968 годзе ў Таронта. На Другім Кангрэсе Канадыйскіх Славян у 1967 годзе ў Атаве чытае даклад на тэму: "Belorussians and Canadian Statistics" – «Беларусы й канадзкая статыстыка» і даказвае, што беларусаў у Канадзе ёсьць што найменш 50 тысяч і яны павінны мець лепшы, як дагэтуль, статус у канадзкай статыстыцы. Ён супрацоўнічае ў газэтах: «Бацькаўшчына», «Беларус» і рэдагуе «Весткі з Канады».

Як сябра Рады БНР і старшыня Сэктару Рады БНР на Канаду В. Жук-Грышкевіч апрацоўвае праект рэарганізацыі Рады БНР, зьмены яе Статуту і стварэньня нацыянальна-палітычнай бээнэраўскай арганізацыі Лігі БНР. Праект гэты, як дыскусійны матарыял, ён прадстаўляе на 10-ай Сэсіі Рады БНР, што адбылася 13 красавіка 1968 году ў Нью Ёрку. На гэтай Сэсіі др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч быў выбраны першым заступнікам Старшыні Рады БНР.

Пасьля сьмерці 29 траўня 1970 году Старшыні Рады БНР інж. Міколы Абрамчыка Старшынём Рады БНР стаўся першы заступнік старшыні др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч, а 11-я Сэсія Рады БНР 29 травеня 1971 году ў Нью Ёрку абрала яго за Старшыню Рады БНР на на-

ступны шасьцігадовы тэрмін. На становішчы Старшыні Рады БНР ён быў да лістапада 1982 году – амаль да 80-годзьдзя свайго жыцьця.

Апошнім асягненьнем др. В. Жук-Грышкевіча трэба ўважаць ягоны вядучы ўдзел у пабудове ў 1988 годзе, на 1000-я ўгодкі хрысьціянства ў Беларусі, Беларускага Памятнага Крыжа ў Сьвятыні Пакутнікаў у Мідлянд у Канадзе.

Аддаў сваё працавітае й творчае, ахвярнае й пакутнае жыцьцё Вінцэнт Жук-Грышкевіч на службу Бацькаўшчыне-Беларусі, закончыў яго 14 лютага 1989 году ў Бэры ў Канадзе і заслужыў на вечную памяць. Цела яго спачывае на беларускім могільніку Жыровіцкае Божае Маці ў Іст Брансвіку ў ЗША.

Раіса Жук-Грышкевіч

INTRODUCTION

The purpose of this volume is to record the events of Vincent Žuk-Hryškievič's life.

An integral part of his biography was the love he had for his homeland, Belarus. He believed that he had been allowed to survive the Soviet death camps in order to serve the Belarusan cause. He regarded the declaration of Belarusan independence on March 25, 1918, as a landmark in his own life and wished it to have the same unique significance for all Belarusans.

Through this work an attempt has been made to survey the life and work of the Belarusan immigrant community and the network of relationships which it has developed with the Belarusan homeland through the greater part of the twentieth century. It was his wish that the Belarusan nation's shared past could be thus recorded and preserved for the sake of the future.

The author wishes to express her gratitude to Dr. Vitaut Kipel, President of the Belarusan Institute of Arts and Sciences in the United States, Dr. Vitaut Tumash, former President of that Institute, Mrs. Zora Kipel, poet Natalla Arsieńnieva, Father Alexander Nadson, Mr. Guy de Picarda, Dr. Jan Zaprudnik, Mrs. Valentina Pashkievich, Prof. Thomas E. Bird, Queens College, N.Y.C., Mrs. Rahnieda Hryškievič-Alachnovič, Messrs. Michael Jaskievich, Jan Michaluk, Michael Tulejka, Vasil Stoma, and all those who assisted in realizing this project through their advice, and material or moral support.

BIOGRAPHY

Vincent Žuk-Hryškievič played a significant role in the Belarusan independence movement of his time. His involvement included activities in pedagogy, research, social and political organizing for which he was persecuted, arrested, deported, and exiled from his homeland.

He was born on February 10, 1903, into a Catholic family in the township of Budsłaŭ, Vialejka district, the son of Anton and Mary (née Chaniaŭka). He was the youngest of six chil-

dren, five of whom survived, Jadvinia, Jan, Michael, Branislaŭ, and Vincent.

Vincent attended elementary school in Budsłaŭ. His secondary school years were divided between Budsłaŭ and Vilna, where he graduated in 1922. That autumn he enrolled in the Charles University in Prague, where he was a student of Slavic philology and history. He received his degree in 1926, qualifying him to be a secondary school teacher. From 1927 until 1939 he taught history and literature at the Belarusan lycée in Vilna. Simultaneously he held the rank of lecturer in the Belarusan language at the Belarusan Orthodox Seminary and at the School of Higher Political Studies, both in the city of Vilna. In December 1932, he passed a national examination at Stephen Batory University in Vilna, qualifying him to teach history and Slavic philology. In both Prague and Vilna he was actively involved in community organizations and teachers' societies and participated in the publication of several Belarusan-language newspapers and periodicals. Having come to Canada in 1950, he matriculated at the University of Ottawa which awarded him a doctorate in July 1952 after his successful defense of a dissertation on the lyricism of Janka Kupala.

As a member of the Polish Army from 1945 to 1949, he lectured in history and psychology in Polish military schools in England and in Italy. He emigrated to Canada in 1950 and from 1951 to 1954 coordinated and conducted a series of lectures in Belarusan Studies through the University of Toronto's extension programme.

In addition to his life-long career as a teacher and lecturer, Žuk-Hryškievič was involved in the social, educational, and political life of the Belarusan diasporan community.

When the first elections to the Polish *Sejm* were held in 1922, he served as the campaign director for the Brasłaŭ and Dzisniensk regions for the Belarusan campaign committee of Vilna, promoting the minority-bloc Belarusan candidates in the *Sejm* and the Senate.

With the occupation of Vilna by the Soviet Army on September 30, 1939, Žuk-Hryškievič was arrested and, over a period of many months, was imprisoned in Lukiski, Bialystok, Vialejka, Miensk, Polack, and Vorsha. In 1940 he was charged with being an "anti-social element" and an "enemy of the [Soviet] people" and was sentenced to eight years at hard labour. Together with thousands of other prisoners, he was sent to the north, where he worked on the northern railroad from Kotlas

to Vorkuta. In 1942 an agreement was signed between Soviet Foreign Minister Molotov and Polish General Sikorski to free Polish citizens being held in Soviet prison camps. He was released and joined the newly-formed Division of the Eighth British Army, made up of citizens of Poland. He served with this Division in Iraq, Palestine, Egypt, and later, in Italy, where he took part in the Battle of Monte Cassino.

With the cessation of hostilities in Italy, he taught history and psychology in the Polish military secondary school. It was already known that the final destination of a number of the Belarusan soldiers would be Great Britain. As he worked with these young soldiers, Žuk-Hryškievič laid the groundwork for the creation of what would become the Association of Byelorussians in Great Britain, the first organization formed in any Western country in the post-war period. Elected its first president, he directed the work of the Association into several fields and began the publication of two periodicals aimed at the Belarusan immigrant community.

Having moved to Toronto, Ontario, Canada, in January 1950, Žuk-Hryškievič became a leading figure in Belarusan-Canadian community life. He took an important role in a number of initiatives, for example, in the organization of the First Convention of Belarusans in North America, which took place at Niagara Falls, Ontario, in 1952; in the formation of the Byelorussian (Toronto) Credit Union, Limited; and in development of a lecture series on Belarusan themes at the University of Toronto.

In September 1953 Vincent Žuk-Hryškievič married Raisa Žukoŭskaja, a student in the Faculty of Dentistry at the University of Toronto.

In addition to his extensive activity with the community, he often represented Belarusan-Canadians at conferences and conventions such as the Centennial Planning Committee (Toronto, 1965), the Conference on Rights and Responsibilities (Port Elgin, 1966), and the Second National Conference on Canadian Slavs (Ottawa, 1967).

At this 1967 conference, Žuk-Hryškievič presented a paper on: "Belorussians and Canadian Statistics," demonstrating that official statistics had drastically under-represented that group. According to data which he marshalled, he proposed a conservative estimated that over 50,000 Canadians were of Belarusan origin.

For a period of two years, Žuk-Hryškievič moved to Munich, Germany, at the invitation of Mikola Abramčyk. Here

Vincent established and managed the Belarusan section of Radio Liberty. He made the first broadcast to his homeland on May 20, 1954, and remained with the programme until April 1956 when he returned to Toronto.

In Canada he resumed his involvement in community affairs. Among the first projects which he undertook was assisting Dr. V. J. Kaye in preparing his essay, "Canadians of Byelorussian Origin." In response to the felt need for an umbrella organization to help coordinate Belarusan activities throughout Canada, he spearheaded the formation of what became the Belarusan Canadian Coordinating Committee and became its first president. In 1967, he established the Belarusan Institute of Arts and Sciences in Canada and was elected its first president.

As a member of the Council *(Rada)* of the Belarusan Democratic Republic, he undertook the restructuring and reorganization of that body, by means of amendments proposed for the Statute (Constitution) of the BDR. These ideas were presented in a discussion paper at the Tenth Session of the *Rada,* held in New York in April 1968. Vincent Žuk-Hryškievič was elected Vice-President at this Tenth Session and, upon the death of Mikola Abramčyk in May 1970, assumed the presidency. At the Eleventh Session of the *Rada* which took place in New York in May 1971, he was elected to full six-year term of office. In fact he held the post of president into the 80th year of his life, until November 1982.

The thousandth-year anniversary of Christianity in Belarus was celebrated throughout the world in 1988, and Žuk-Hryškievič took an active part that year in the erection of a Belarusan memorial cross at the Martyrs' Shrine in Midland, Ontario.

Vincent Žuk-Hryškievič passed away on February 14, 1989, in Barrie, Ontario. He was interred in the Belarusan Cemetery in East Brunswick, New Jersey, U.S.A.

Раіса Жук-Грышкевіч
Бэры, Канада,
21 лістапада, 1989 году.

ЖЫЦЬЁ ВІНЦЭНТА ЖУК-ГРЫШКЕВІЧА

«Блаславёны Бог наш спрадвеку,
цяпер, заўсёды, і на векі вякоў.»

I. АПОШНІ Й ПЕРШЫЯ ДНІ

Сяньня споўнілася сорак тыдняў, як перад поўначчу 14-га лютага 1989 году, у гошпіталі ў Бэры ў прысутнасьці лекара, мэдычнае сястры й мяне памёр мой муж сьв. пам. др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч. Перад сьмерцьцю трызьніў. Гаварыў пра беларускі сход, на якім мы зь ім, цьвердзіў, абавязкава павінны быць. «Які вялізарны бел-чырвона-белы сьцяг!» – казаў. Стаў моцна задыхацца, не хапала паветра. Адкідаў маску з тлёнам, якая, здавалася яму, перашкаджала дыхаць... Калі зьняможанаму лекар зачыніў вочы, я адчула палёгку, што Вінцук больш ня церпіць. Розум ведаў, што вочы Ягоныя зачыненыя навекі... Але мне ўсё здавалася, доўга здавалася, што гэта толькі тымчасова, што ўсё вернецца да нармальнага. Усё будзе добра, Вінцук вернецца... Усё нейкая была надзея, сяньня яе ўжо няма. Ня будзе «добра», Вінцук ня вернецца...

Пражыў Вінцэнт Жук-Грышкевіч 86 гадоў і чатыры дні. Як айцец Аляксандар Надсон сказаў, «Пражыў даўгое й карыснае жыцьцё.»



Ядвіня, сястра Вінцэнта Жук-Грышкевіча, Рыга, 1915.

Вінцэнт Жук-Грышкевіч нарадзіўся 10 лютага 1903 году ў рыма-каталіцкай сям'і ў мястэчку Будслаў Вялейскага павету ў заходняй Беларусі. Бацькі ягоныя – Марыя, з дому Ханяўка, і Антон – былі абое беларусы, займаліся земляробствам. Мелі яны шасьцёра дзяцей, пяцёра зь іх дажыло да дарослага веку: Ядвіня, Яська, Міхась, Браніслаў і наймалодшы Вінцэнт.

Будслаў, асабліва было мястэчка. Ня было ў ім ніводнага праваслаўнага. Таму ня было й царквы. Затое быў і ёсьць агромністы барокавага стылю цудоўны Бэрнардынскі касьцёл Узьнясеньня Божай Маці. Пабудаваны ў 1783 годзе будслаўскі касьцёл – гэта помнік архітэктуры позьняга бароку. Першы касьцёл у Будславе быў пабудаваны ў 1504 годзе – за часоў Франьцішка Скарыны. («Жывапіс Беларусі XII-XVIII ст.ст.» б.13)

Пасярэдзіне мястэчка, прымыкаючы да касьцёлу, была вялікая плошча рынку, ад якога разыходзіліся вуліцы. Рынак, як то звычайна ў нас бывала, быў цэнтрам гандлёвага, грамадзкага, а часткова рэлігійнага й культурнага жуцьця Будславу й ваколіц. Тут адбываліся кірмашы, фэсты, мітынгі й што толькі. Спрадвеку кажнага 2-га ліпеня адбываўся тут кірмаш і фэст Сьвятое Марыі. На фэст



Стагодні кірмаш і фэст імя Сьв. Марыі 2-га ліпеня ў Будславе да 1939 году ўключна. Бэрнардынскі касьцёл і рынак застаўлены вазамі й коньмі, на якіх прыехала некалькі тысяч сялян з Будслаўскай і суседніх парафій.

зьяжджалася тысячы сялян з будслаўскай і суседніх парафій.

Касьцёл сваёй веліччу, хараством й надзвычайнай таямнічасьцьцю вабіў дапытлівых падлеткаў. Вінцук з сваімі сябрукамі рабілі, на колькі ім гэта было магчыма, «дасьледаваньні» такіх частак касьцёлу, як званіца з магутнымі званамі, як пад'зямельле з грабніцамі пахаваных там айцоў Бэрнардынаў. У касьцёле гэтым Вінцук падслужваў да імшы, выняткі якой палаціне навучыўся напамяць. Тут ён прыслухоўваўся й захапляўся музыкай арганаў. Зацікаўленьне музыкай малога Вінцука заўважыў сусед Грышкевічаў і дараваў хлапцу, няпрыгодную зрэштай сабе, іскрыпку. Пасьля, падросшы, займеў Вінцук і гармонік.

Ля Будслава былі лясы й рака Сэрвач. Гэта давала малазямельным Будслаўцам немалую падтрымку. Лес апрача заробкаў і дроваў даваў грыбы й ягады, Сэрвач – рыбу. Зь дзеда й прадзеда Грышкевічы былі рыбакамі. З маленства палюбіў Вінцук лес, рэчку й вудзеньне рыбы. У лесе ведаў ён кожную хвойку, сьцяжынку й палянку. Ведаў, дзе хаваюцца баравікі, рыжыкі й іншыя грыбы. Прыносіў іх кошыкамі маме, якая ўмела, як ніхто, прыпраўляць ды перахаваць іх на зіму. Сушоны баравік быў добрай акрасай поснай стравы ўзімку, а вянок сушоных баравікоў можна было прадаць на рынку й зарабіць капейку на соль і газу. Зімовымі вечарамі тата Антон зарабляў шчапаючы драніцы, якімі людзі крылі стрэхі будынкаў. Тата быў майстра! За што-б ня ўзяўся, што-б не зрабіў, было выканана дасканала, прыгожа. Мама вечарамі прала й пяяла. Мела добры слух і цудоўны голас, умела шмат народных песень. З асаблівай любасьцьцю Вінцэнт успамінаў сваю маму, ейнае пяяньне й турботы за ўсіх. Добрай мама была гаспадыняй, умела смачна зварыць і ўсё ў яе было як сьлед дагледжана.

Вінцук вучыўся й у 1915 годзе закончыў Будслаўскае двукляснае прыхадзкое вучылішча, іграў на йскрыпцы й гармоніку. Іграў добра. Клікалі яго йграць на вечарынках і вясельлях. За гэта дарылі яго грашмі, каўбасамі, ці чым іншым. Усё прыдавалася дома. Рос Вінцук як музыкант і як настаўнік. Узімку багацейшыя сяляне суседняй вёскі Васілеўшчыны бралі яго, як хатняга настаўніка, для сваіх дзяцей. (Там ён пасьля зарганізаваў і школку, якую палякі зачынілі ў 1919 годзе.) Калі падвесну вучням пара бы-

ло выганяць на луг статак, «дырэктар», як тады звалі такіх настаўнікаў, ехаў дамоў, прывозіў з сабой жыта на хлеб, бульбу, ці якія іншыя прадукты.

Быў пасьля Вінцэнт і пісарчуком «Усерасейскага Земскага Саюзу», напаўвайсковай арганізацыі дапамогі жаўнерам на фронце. У 1917 годзе апынуўся ў Менску й быў сьведкам збройнага разгону Усебеларускага Кангрэсу. Аб гэтым ён сам успамінае.

II. У МЕНСКУ

«Сьнежань 1917 году ў Менску. Я, як пісарчук «Усерасейскага Земскага Саюзу» (напоўвайсковай арганізацыі дапамогі жаўнерам на фронце), прыкамандыраваны быў да «Камітэту Северназападняга Фронту», што стаяў тады ў Менску. Горад гэты, перапоўнены войскам, быў надзвычай рухлівы. Але ў паветры чулася яшчэ нешта асаблівае, нейкае надзвычайнае ажыўленьне: усюды гучэлі словы: «Беларускі Нацыянальны Зьезд», «Усебеларускі Кангрэс». Паўтарала гэтыя словы й расейская й беларуская прэса й расейская цывільная ды вайсковая публіка. Слухаў я гутаркі й дыскусіі аб «Беларускім Кангрэсе» і сярод маіх супрацоўнікаў «Земсаюзу». Спрачаліся расейцы й мясцовыя менчукі аб «Учредительном Собрании», сэпаратызьме, фэдэралізьме й непадзельнай Расеі. Мне – вучню, гэтыя словы тады мала што гаварылі, але я адчуваў, што ў Менску адбываецца нешта вельмі важнае й беларускае, бо Беларусь была на вуснах ува ўсіх. Сэрца маё пачынала ёкаць, пры кажнай важнай спрэчцы я мімавольна, хоць ціха, трымаў бок тых, што баранілі Беларусь, і мне страшэнна хацелася ведаць, што такое гэты «Беларускі Кангрэс» і дзе ён адбываецца. Асьцярожненька я дапытаўся ўсё-ж: «Беларускі Кангрэс» адбываецца ў будынку тэатру, недалёка ад Пётрапаўлаўскай вуліцы, дзе я жыў. Туды я й шмыгануў пасьля працы.

На вуліцы й на сквэрыку каля тэатру было большае ажыўленьне, а газэтчык – хлапец больш менш у маім веку – прадаваў тэлеграмкі – надзвычайны дадатак, з крыкам «Беларусь аддзяляецца ад Расеі!» Я цешыўся, што змагу ў яго спытацца, як папасьці на Кангрэс, бо старэйшых і важных мне не хацелася чапаць, і я адразу да яго зьвярнуўся. На маё пытаньне хлапец адказаў: «Пачакай, я зараз скончу прадаваць тэлеграмкі, тады разам пойдзем». Мяне падбадзёрыла, што ён гаварыў такой самай гаворкай, як і я, а не «пагарадзкому», і я стаў побач яго. – «На, чытай, калі ўмееш», – сунуў ён мне ў руку тэлеграмку. Я ўмеў чытаць пабеларуску, бо яшчэ перад вайной чытаў беларускія календары з Пецярбургу й «Нашу Ніву» зь Вільні. У тэлеграмцы было напісана, што «Усебеларускі Зьезд» вынес пастанову аб тым, што Беларусь мае аддзя-

ліцца ад Расеі. Гэта быў надзвычайны дадатак – ня помню цяпер добра – ці «Вольнай Беларусі» ці «Звону».

Тымчасам на сквэрыку зьявілася шмат войска. Жаўнеры ў баявым страі, са стрэльбамі хлынулі ў тэатр. Адразу выбухла нейкая нэрвовая атмасфэра. Праходзячыя затрымваліся каля войска, што затыкала ўсе дзьверы тэатру, і адразу пачаў стварацца натаўп. Пры самым уваходзе ў тэатр стаяла некалькі кулямётаў. Жаўнеры сталі адціскаць натаўп і загадвалі разыходзіцца. З тэатру пачуўся гоман і вострыя крыкі. Гуло там, як у вульлі. Час ад часу чутны былі стрэлы. Людзі пачалі панічна разьбягацца й з нэрвовым зацікаўленым позіркам затрымліваліся воддаль. Мой новы знаёмы даўно ўжо перастаў выкрыківаць сваё «Беларусь аддзяляецца ад Расеі» й з трывогай паглядаў на тое, што дзеялася навокал. – «Хадзем!» – урэшце сказаў ён і, схапіўшы мяне за руку, пацягнуў да тэатральных дзьвярэй. – «Куда вы, мышенята, вход в театр запрещен!» – крыкнулі на нас жаўнеры й адапхнулі ўбок. – «Бачыш? Разганяюць Кангрэс! Хадзем на другі бок вуліцы, паглядзім, што далей будзе», – прамовіў нэрвова мой новы сябра, і мы адыйшліся.

А ў тэатры варылася, як у катле. Гоман і крыкі чутны былі аж на другім баку вуліцы. Стрэлы часьцелі. Жаўнераў прыбывала ўсё больш і больш. Яны прыходзілі цэлымі ротамі. Будынак тэатру быў ахоплены вайсковым кругам. Над'ехалі й бранявыя самаходы. Жаўнеры кінуліся разганяць і тых людзей, што групаваліся воддаль. Нам, хлапцом, патапталі ногі й укінулі ў нейкі бакавы завулак. Зьсінелыя ад сьцюжы, мы стараліся йзноў прашмыгнуць да тэатральнага будынку, але нічога з гэтага ў нас ня выйшла. Вуліца й сквэрык былі запруджаны войскам, цывільных зусім не было відаць, усякі вулічны рух быў спынены. – «хадзем да мяне ў «общежытие», – запрапанаваў я. – «Добра, пакажы мне, дзе ты жывеш, дык я да цябе прыйду пазьней, бо цяпер мушу бегчы ў рэдакцыю й паглядзець, што там дзеецца». – І так мы рассталіся зь Лёнькам, бо так называўся гэты рухавы хлапец.

Лёнька прыйшоў да мяне позна, бо аж па адзінаццатай. Ён не званіў, а пастукаў у вакно, як мы ўмовіліся. Я выйшаў на вуліцу. Ён расказаў мне, што Беларускі Кангрэс разагналі бальшавікі за тое, што ён пастанавіў, каб Беларусь аддзялілася ад Расеі, што акцыяй разгону кіраваў камісар Крывашэін, што ў тэатры была вялікая бойка

й што некаторых беларусаў паарыштоўвалі. Назваў прозвішчы, але я іх цяпер ня помню. Сказаў мне пад сакрэтам, што ён падслухаў у рэдакцыі, што Кангрэс мае йзноў сабрацца, толькі ён ня ведае дзе. Мы зь ім пасябравалі й пасьля шмат разоў спатыкаліся, пакуль я быў у Менску. Гэта быў заядлы беларус. Я яго знайшоў і ў 1919 годзе, калі другі раз быў у Менску – пры паляках. Мы разам хадзілі ў «Беларускую Хатку» на прадстаўленьні.

На другі дзень увесь Менск гаварыў аб разгоне Усебеларускага Кангрэсу. Пісала аб гэтым і расейская прэса. На кожным кроку чуліся дыскусіі. Тады яшчэ бальшавікі толькі прыходзілі да ўлады і ніхто іх надта не баяўся, гаварылі сьмела. У абсалютнай бальшыні дыскутуючых чулася абурэньне супраць бальшавікоў за разгон Кангрэсу. Абураліся ня толькі беларусы, але й расейцы. Мае супрацоўнікі ў «Земсаюзе» толькі аб гэтым і гаварылі. Нават урадаўцы высокай рангі, як упаўнамочаны Уладзіміраў – эсэр па перакананьнях – быў старшэнна абураны. – «Як яны сьмелі разагнаць Беларускі Кангрэс, Кангрэс народу, які найбольш прыгнятаны быў царскай уладай і першы раз сабраўся, каб сказаць сваё слова!» – казаў ён. Падобных галасоў было многа. А калі пазьней зьявілася вестка, што Кангрэс ўсё-ж сабраўся зноў у чыгуначным дэпо пад аховай чыгуначнікаў, якіх бальшавікі ня сьмелі крануць, што закончыў сваю працу й перадаў усе свае паўнамоцтвы аб лёсе Беларусі Радзе Кангрэсу – чуліся словы пахвалы й задаваленьня: «Ай да белоруссы, вот так молодцы, не побоялись красных штыков Крывошеина! Не так, как наша эсэрыя, что сидит, как мышь под метлой!»

* * *

Будучы ў Менску, ці гэтым разам, ці іншым, давялося Вінцуку адведаць і Янку Купалу. Завёў яго да Паэты Мікола Шыла, дарэчы, удзельнік Усебеларускага Кангрэсу, якога Вінцук ведаў з Будслава. – «Холадна было ў кватэры, – успамінаў Вінцук – Янка Купала быў у кажусе, сядзеў за сталом і ножыкам крышыў тытунь.» Адлажыўшы свой занятак набок, гаспадар заняўся гасьцьмі. Запытаўся ў Вінцука, ці ён чытаў ягоныя вершы. Вінцук сказаў, што так, і ў доказ сказаў адзін Купалаў верш напамяць. Дзядзька Купала пахваліў хлапца й заахвочваў яго вучыцца й чытаць.

Даведаўшыся, што ў родным Будславе заснавана беларуская гімназія, Вінцэнт звальняецца з працы, паясьняючы, што мае нагоду далей вучыцца. Працаўнікі й начальства Усерасейскага Земскага Саюзу паставіліся да яго прыхільна. Заплацілі яму належнасьць і далі яшчэ адступнога. А цётка Раіса, як матка, ім заапекавалася. – «Зьнімай кашулю», – кажа. Вінцук зьбянтэжыўся... «Зьнімай, зьнімай, зашыю грошы, каб цябе па дарозе дамоў не абакралі!»

Будслаўская Беларуская Гімназія – першая беларуская гімназія – паўстала стараньнем будслаўскай інтэлігэнцыі й сялянства. Першым яе дырэктарам і адным із заснавальнікаў яе быў архэалёг – скончыў архэалёгію ў Маскве – Васілевіч зь вёскі Пузыры, што каля Будслава. Панковіч з Крывіч кіраваў вучнёўскім хорам, вычыў пяць беларускія песьні, прыкладам «Чаму-ж мне ня пець...». Інжынер Дубейкаўскі – архітэкт – пазьнейшы муж панічкі Юльяны Мэнкэ, некалі нарэчанай Івана Луцкевіча, будаваў Будслаўскую Беларускую Гімназію. Аб гэтым Вінцэнт Жук-Грышкевіч сам успамінае.

III. 25-ГА САКАВІКА Ў БУДСЛАВЕ

«Гэта было ў Будславе Вялейскага павету, у Беларускай Гімназіі, якую заснавала беларуская мясцовая інтэлігэнцыя й сялянства ўласнымі высілкамі пасьля выбуху расейскай рэвалюцыі. Цяга да навукі ў людзей была так вялікая, што існуючыя там толькі чатыры клясы зьмясьцілі больш за 300 дзяцей. Гімназія працавала нармальна й пад нямецкай акупацыяй у 1918 годзе. Немцы цікавіліся толькі, каб была добра пастаўлена нямецкая мова, і каб сярод вучыцялей ня было бальшавікоў. Я быў прыняты ў 4-ю клясу, але пакуль набраўся кантынгэнт, сядзеў у трэцяй.

Дзесь у канцы сакавіка дайшла вестка зь Менску аб абвешчаньні незалежнасьці Беларусі й да Будслава. Аднаго дня, памятаю, наш дырэктар Васілевіч узварушаны й вясёлы хадзіў па ўсіх клясах і дзяліўся з вучнямі гэтай радаснай навінай. – «Рада Беларускай Народнай Рэспублікі абвесьціла незалежнасьць Беларусі, наш край будзе вольным і незалежным, як калісь даўней. Будзе мець свой урад, сваё войска, сваіх ураднікаў, свой скарб і свае школы. Цяпер беларусы будуць самі гаспадарамі на сваёй зямлі, і ня будзе ўжо нас трывожыць і страшыць чужое войска й паліцыя,» – тлумачыў ён. Вучні слухалі гэтыя словы зь вялікім зацікаўленьнем і ўвагай, хоць многія яшчэ й не разумелі ўсёй важнасьці гэтай гістарычнай падзеі ў жыцьці Беларусі. – «Абвешчаньне незалежнасьці Беларусі ёсьць вялікім нацыянальным сьвятам для ўсяго беларускага народу, – казаў ён далей, – і наша гімназія мусіць адсьвяткаваць гэта сьвята дастойна й урачыста. Сьвяткаваньне адбудзецца ў наступную нядзелю а шостай гадзіне вечара. Хорам і дэклямацыямі займуцца настаўнікі: Панковіч і Ігнатава, яны-ж прыгатуюць усю праграму. А вы, дзеткі, скажыце сваім бацьком аб радаснай навіне й запрасіце іх на сьвяткаваньне разам з іхнімі сябрамі й знаёмымі».

Праз цэлы тыдзень гімназія была ўва ўзбуджаным сьвяточным настроі. Пасьля лекцыяў адбываліся сьпеўкі й рэпэтыцыі дэклямацыяў. Хадзілі ў лес па ялінкі й дзеразу, каб прыбраць зеленьню залю. На лекцыях рысункаў рысавалі Пагоню й бел-чырвона-белы сьцяг. Настаўнік

рысаваньня сьв. пам. Мікола Шыла сказаў, што найлепшыя рысункі быдуць павешаны ў залі ў дзень сьвяткаваньня. Гэта дадавала імпэту й стараньня ў працы. Сьцяжкі выходзілі ня блага, але з Пагоняй было горш. Мой сусед Кіслы так праняўся нацыянальнымі колерамі, што ягоны конь у Пагоні вышаў бел-чырвона-белым. Пры конкурсе настаўнік амаль усе сьцяжкі прыняў годнымі й пазьней упрыгожыў імі залю. Пагоні-ж былі збракаваны ўсе. Настаўнік сказаў, каб кожны ўзяў сваю сабе на памятку, а для залі намаляваў сам вялікю прыгожую Пагоню.

Нарэшце прыйшоў доўгачаканы дзень сьвяткаваньня. Людзей сабралося столькі многа, што яны запоўнілі залю, сумежныя клясы й нават сенцы. Прыйшлі яны зь мястэчка і з суседніх і далейшых вёсак. Урачыстасьць адчыніў дырэктар палкай, хоць і даўгой прамовай. Ён прывітаў усіх зь вялікай навінай абвешчаньня незалежнасьці Беларусі й вытлумачыў, якое значэньне мае гэты векапомны акт. Пазьней ён прачытаў цэлую лекцыю зь гісторыі Беларусі, насьвятляючы найважнейшыя мамэнты: Полацкі пэрыяд і Вялікае Княства Літоўскае, зьвяртаючы асаблівую ўвагу на ролю беларускае мовы й культуры ў апошнім.

Вялікі натаўп людзей у цішыні ўспрымаў як нешта сьвятое першы раз пачутыя словы са сваёй гісторыі. Патрыятычны настрой узрастаў. Прамова дырэктара закончылася магутным клічам народу: «Хай жыве Незалежная Беларусь!»

Далей прамаўлялі прадстаўнікі ад Гімназіяльнага Камітэту бацькоў і ад воласьці, а таксама сьв. пам. інжынер архітэкт Дубейкаўскі зь Вільні, які кіраваў будаваньнем дому для гімназіі. Якісь дзядзька з Камарова ці Алешак пачаў прамаўляць, але ня мог скончыць, узварушаньне душыла яму словы ў горле. Ён патрапіў толькі сказаць: «Хай жыве Незалежная Беларусь!». Словы гэтыя, падхоплены народам, зноў паліліся магутнай хваляй па гімназіяльным будынку й пляцы.

Пасьля кароткага перапынку пачалася канцэртная частка. Паліліся стройныя харавыя мэлёдыі беларускай песьні, што дагэтуль, бязь ніякага дырыжорства, бытавала ў народзе. І песьня, нібы атрымаўшы адукацыю, гучэла прыгажэй, як у звычайных жаночых сьпевах. – «Бач, як стройна пяюць! – падміргівалі адна другой жанчыны, – а здаецца тыя самыя песьні, што й мы сьпяваем; відзіш,

што значыць навука!» Песьні чаргаваліся з дэклямацыямі. Найбольш спадабаліся дэклямацыі Зімношышкі «Бор» – Купалы, і «За свабоду сваю» – Купалы, прадэклямаваны найменшым з прысутных – вучнем В. Са сцэны яго зьнясьлі на руках. Нельга было зразумець, ці ён плакаў, ці сьмяяўся. Супакоіўся тады толькі, як уткнуўся ў падол роднай маткі.

Урачысты, паважны настрой сьвяткаваньня перайшоў у весялосьць, калі вучні на сцэне заскакалі Лявоніху. У танцы прымала ўдзел уся сялянская грамада, бо, па будслаўскаму звычаю, жанчыны й мужчыны ў такт музыкі прыплёсквалі рукамі, а некаторыя й прытуптывалі нагамі.

Так весялілася ўся грамада, народ спраўляў сваё нацыянальнае сьвята. Ён здаваў сабе справу з важнасьці падзеі ў сваёй гісторыі. Тут ня было нічога штучнага. Атмасфэра была шчырай, натуральнай радасьці й задаваленьня.

А як пачалі разыходзіцца, тольлі й гутарка была аб тым, як пачнецца разбудоўвацца жыцьцё ў новай, вольнай Беларусі, у якой зямлёй будзе карыстацца той, хто сам на ёй працуе. Моладзь парушала вайсковыя тэмы, выказвала гатовасьць пайсьці пад родныя сьцягі, як толькі паклічуць. Ведала добра, што першай і неабходнай справай было замацаваньне незалежнасьці маладой Беларускай Народнай Рэспублікі.

А было іх – стройных, як дубы – толькі ў самым мястэчку некалькі дзясяткаў, моцных духам, сьведамых нацыянальна маладых людзей. Не адзін добры горад мог пазайздросьціць у гэтым малому Будславу. Адны зь іх паварочаліся з войска, пабыўшы ў беларускіх гурткох, другія павырасталі за час вайны. Дзякуючы ім, мястэчка, апрача гімназіі, мела клюб і бібліятэку, тэатр зь вялікай заляй, што пакінуў штаб расейскай арміі, хор і струнную аркестру. Ня было нядзелі, каб не адбылося якое прадстаўленьне ці канцэрт. Руньню зелянела беларуская культура, пашыраючыся на суседнія вёскі. І ня было ані сварак, ані непаразумленьняў. Работа йшла ў атмасфэры задаваленьня й згоды пад уплывам цягі да веды й мастацтва. Маладое й здаровае беларускае жыцьцё станавілася на ўласныя ногі, абяцаючы ўзрасьці да сілы волата.

Бязьлітасны лёс, аднак, зноў пачаў баразьніць узыходзячую беларускую рунь. Ворагі з Усходу й Захаду шчапі-

ліся клешчамі ў барацьбе за беларускую спадчыну нашых дзядоў, топчучы маладыя ўсходы, руйнуючы й пераворваючы стальлю той грунт, зь якога гэтыя ўсходы ўзрасталі.»

(«25 Сакавіка», Успаміны зь Менску, Будслава, Вільні, Прагі, Савецкай турмы. В. Жук-Грышкевіч. Выдавецкі Фонд Успамінаў з Беларускага Жыцьця. Торонто – Канада, 1978)

IV. У ВІЛЬНІ Ў 1-АЙ ВІЛЕНСКАЙ БЕЛАРУСКАЙ ГІМНАЗІІ

Да 45-х угодкаў адкрыцьця гэтай школы
З успамінаў д-ра В. Жук-Грышкевіча

«Неяк перад вялікаднем у 1920 годзе трапіла мне ў рукі абвестка аб тым, што ў Вільні ўжо ад лютага месяца 1919 году працуе 1-я Віленская Беларуская Гімназія. Гэты зялёны лісток паперы са звычайнай абвесткай зрабіў цэлы пераварот у маёй душы, бо ўваскрасіў страчаную надзею на ўзнаўленьне навукі ды яшчэ ў сваёй беларускай гімназіі.

Справа ў тым, што ад восені 1919 году быў у нас новы акупант – палякі, якія аказаліся ня лепшымі, як папярэднія акупанты – немцы й першыя – бальшавікі. Яны, што праўда, ня грабілі маёнткаў, касьцёлаў, цэркваў, як бальшавікі, але пазачынялі беларускія школы, у тым ліку й Беларускую Гімназію ў Будславе, ды зацісьнулі ўсякія праявы беларускага жыцьця пад пратэкстам змаганьня з бальшавізмам. Пад тым жа пратэкстам яны ўзялі ў моцныя абцугі насельніцтва. Рабілі частыя вобыскі ў сялян – асабліва актыўных беларусаў, арыштоўвалі абы за што, забіралі ў іх авёс і сена, сьвіней і курэй. Найбольш даўся ў знакі 13-ты полк уланаў. Уланы былі пострахам вясковага жыхарства. Дайшло да таго, што вёскі выстаўлялі сталыя варты, якія давалі знаць, калі на небасхіле паказаўся ўлан. Усе тады ўцякалі ў найбліжэйшы лес, як калісь перад татарамі, гонячы перад сабой праз гароды хатнюю жывёлу. У першую чаргу ўцякалі дзяўчаты й маладзіцы, за імі мужчыны. У хатах заставаліся старыя й малыя. У нашым мястэчку, дзе быў сталы пастой уланаў, як сьцямнелася, ніхто ня сьмеў выйсьці на вуліцу.

Польска-бальшавіцкі фронт быў, што праўда, ужо далёка, недзе каля мястэчка Бярэзіна, але паветы Вялейскі й Дзісьненьскі былі яшчэ ў руках вайсковых уладаў. З цывільных арганізацыяў толькі г. зв. «Страж Крэсова» была дзейнай. Ейныя інструктары зьбіралі сходы сялян і расхвальвалі культуру й багацьце Польшчы ды нагаварвалі моладзь, каб уступала ў «Страж Крэсову». Мэтай гэтай арганізацыі было палянізаваньне беларускіх земляў, яна была ў цесным супрацоўніцтве з польскім войскам.

Пры такой цяжкой, задушлівай атмасфэры – абвестка Віленскай Беларускай Гімназіі сталася для мяне пуцяводнай зоркай. Мне за ўсякую цану трэба было дабрацца да Вільні, каб паступіць у Віленскую Гімназію. Але як?

Чыгуначнае палучэньне зь Вільняй было наладжана, але цягнікі хадзілі рэдка й то толькі ваенныя. Цывільнага руху яшчэ ня было. Толькі із спэцыяльным дазволам вайсковых уладаў некаторым абшарнікам ды розным панюсям удавалася езьдзіць цягніком. А на што-ж спадзявацца мог я, 17-ці гадовы вясковы хлапец – усім ведамы як сьведамы беларус, што палякамі трактаваўся раўназначна з бальшавіком? Ткнуўся я ў жандармэрыю, каб дастаць пропуск і білет у Вільню – дык чуць цэлы выйшаў. Пачалі выпытваць: чаму, да каго, пашто? Ды чуць не пасадзілі. Вось тут то ўсе мае мары аб Вільні й Беларускай Гімназіі сталіся безнадзейнымі. Пехатой ня пойдзеш, далёка – 180 кілямэтраў з гакам, ды затрымаюць дзесь па дарозе, назавуць бальшавіцкім агітатарам, пасадзяць. Былі ўжо такія выпадкі. А тут і канец школьнага году не за гарамі, і год прападзе. Я й так быў запозьнены з навукай, меў толькі чатыры клясы. На ўсякі выпадак не пакідаў навукі, саматугам і з большага прайшоў матар'ял за 5-ю клясу. Нейкая нутраная сіла ціснула мяне да навукі, гнала наперад. (Падручнікі я меў, што не хапала, дастаў. З матэматыкай і зь іншымі прадметамі я даваў сабе рады. Нямэўны быў з французскай і нямецкай мовамі, бо ня было каму паправіць вымову і пісаньне, але граматыку ведаў.) Але як вырвацца?! Што рабіць?

Разьвязка прыйшла раптоўна й зь нечаканага боку. Якраз на вялікдзень спаткаў я суседку, прыгажуню Мальвіну, зь якой падфліртоўваў інструктар із «Стражы Крэсовай» – «Я еду ў Вільню», – з шчасьлівай усьмешкай абвесьціла дзяўчына. – «Калі, якім чынам?! – спытаў я. – Цывільных жа ня пускаюць!?» – «‹Страж Крэсова› арганізуе экскурсію ў Вільню на ўрачыстае адзначэньне ўгодкаў вызваленьня Вільні ад бальшавікоў. Праезд дармовы, толькі ежу трэба мець з сабой,» – адказала мне пасьпешна дзяўчына й пабегла далей хваліцца сваім шчасьцем. Мне аж горача зрабілася ад Мальвінінай весткі. Гэткім усюды даступна, а мне, каб вучыцца, дык усе дарогі зачынены, падумаў я з горыччу. Але пазьней раздумаў, што й я мог бы неяк уключыцца ў гэтую экскурсію, няхай сабе й «Стражы Крэсовай». Мне абы ў Вільню дастацца, а там я сабе дам

рады. На гэтым і стала. Мальвіна мне памагла. Праз тры дні мы ехалі ў Вільню.

* * *

Прыехалі каля паўдня.

У Вільні я ніколі ня быў. Горад вялікі й прыгожы. На вуліцах было поўна людзей і вельмі шмат польскіх жаўнераў. Са станцыі йшлі мы групай каля дваццаці чалавек хлапцоў і дзяўчат. Трымаліся разам, каб не разгубіцца. Прайшлі праз Вострую Браму і, як усе праходзячыя, зьнялі шапкі, затрымаліся й пераждагналіся. Я дагадаўся, што гэта й ёсьць Вострабрамская вуліца, і шукаў вачыма нумару 9. Прайшоўшы Вострую Браму й яшчэ кусок я заўважыў зь левага боку перш вялікую табліцу з напісам «1-я Віленская Беларуская Гімназія», а пасьля нумар 9. Сэрца маё закалаціласа ад радасьці: вось маё прызначэньне, вось мая мэта! Але ня мог адбіцца ад групы.

Трымаўся яе праз суботу й нядзелю. Толькі ў нядзелю вечарам заявіў кіраўніку экскурсіі, што йду да знаёмых, у якіх затрымаюся магчыма тыдзень, а то й на стала, бо наклёўваецца работа. Сказаў, каб на мяне не чакалі. Так адкараскаўся я ад экскурсіі «Стражы Крэсовай».

Ад гэтага часу я ўзыйшоў на самастойны жыцьцёвы шлях. Пачуўся надзіва лёгка й самаўпэўнена. Чужы для мяне тады й незнаёмы горад, як і ўся няпэўная будучыня, нічым мяне не адстрашалі. Можа таму, што я ведаў, чаго хачу й да чаго ймкнуся. Вехі былі вызначаны, заставалася толькі прайсьці іх. Я быў пераконаны, што траплю ў беларускае асяродзьдзе й там знайду сваё мейсца і здабуду асьвету. Меў адрасы некулькіх суседзяў з Будслава, а перадусім адрас Эдварда Будзькі, які падтрымаў не аднаго беларуса, што хацеў вучыцца. Да яго я й ськіраваўся. Прыняты быў, як свой, як родны. Тымчасова затрымаўся ў сям'і Будзькаў, а пазьней, пакуль уладзіўся на працу, спаў у канцылярыі Віленскага Саюзу Каапэратываў, да ўправы якога належаў і мой слаўны Эдвард Будзька.

У Гімназіі

У панядзелак я першы раз перайшоў праз браму Базыльянскіх муроў і перастуліў парог 1-ай Віленскай Беларускай Гімназіі. Гэта адзін з важнейшых дзён у маім

жыцьці, і таму гэты дзень я так добра памятаю й да гэтага часу. Сэрца маё трапяталася ад радасьці й вялікіх надзеяў. Я быў прагны зьліцца зь беларускім жыцьцём, што адраджалася й расло ў гэтай слаўнай нашай сталіцы. Мне хацелася як найхутчэй апынуцца ў сваёй клясе сярод новых сяброў і сябровак. Мне хацелася паглынаць бесьперапынна навуку, веду аб Беларусі, аб яе мінулым і сучасным. Мне нават у галаву ня прыйшло, што мяне могуць адкінуць, ня прыняць, гэта-ж наша беларуская гімназія, яна-ж створана для такіх, як я.

Аднак, калі я пастукаў у канцылярыю гімназіі – мае рукі трасьліся, мабыць ад хваляваньня, і мой голас дрыжэў, калі я гаварыў з сакратаром. Ён мяне паінфармаваў, што экзамен за 5-ю клясу я буду магчы здаваць толькі з дазволу дырэктара, да якога я магу пайсьці зараз жа.

Дырэктар – Міхась Кахановіч спаткаў мяне вельмі прыхільна, сказаў сесьці й распытваў пра ўсе мае справы, як родны бацька. Зарыентаваўся ў маёй падрыхтоўцы ды сказаў, што дазволіць здаваць экзамен за 5-ю клясу, і запрапанаваў скласьці заяву. Параіў мне таксама пагутарыць з вучнямі 5-ае клясы, каб даведацца пра падручнікі, а то й пажычыць некаторыя.

Гэта быў высокі стройны мужчына крыху суровы на выгляд, сінія вочы якога сьвяціліся бязьмернай дабрынёй.

Аж расьпірала мяне ад радасьці й задаваленьня, калі я выйшаў з габінэту дырэктара. На калідоры было душна й гамонна. Быў перапынак. Хлапцы й дзяўчаты, большыя й меншыя, высыпалі з клясаў. Яны тварылі рухомы натаўп, які адразу стаўся для мяне блізкім і родным. У агульным гомане цяжка было пачуць паасобныя гутаркі, словы. Я адшукаў 5-ю клясу. Каля яе стаялі хлапцы й дзяўчаты ў маім веку й малодшыя. Я зьвярнуўся да аднаго з групы – хлапца рослага й добра апранутага, з чорнай чупрынай. Я спытаў яго, якія падручнікі яны ўжываюць у 5-ай клясе. Выясьніў, што маю здаваць экзамен за 5-ю клясу. – «Дык вы будзеце ў нашай клясе ў будучым годзе» – весела прамовіў мой будучы сябра – «прыемна пазнаёміцца. Я Мікола Ільяшэвіч, а вы?» – Я сказаў сваё прозьвішча. Мігам мяне абступілі пяціклясьнікі. Пачаліся ўзаемныя роспыты, знаёмствы. Раптам званок перарваў нашу жывую гутарку. Мой новы знаёмы Мікола Ільяшэвіч пасьпеў усё-ж даць мне свой адрас і запрасіць да сябе на 4-ю гадзіну. У яго мы мелі абгаварыць справу падручні-

каў. Ён абяцаў дастаць мне іх і дапамагчы ўва ўсім. Я застаўся адзін на калідоры. Толькі цяпер я мог сабрацца з думкамі. Паміма агульнага задаваленьня я адчуваў нейкую трывогу й цень расчараваньня. У чым справа? Усё пайшло так гладка!? Тады толькі я здаў сабе справу, што мае новыя сябры – гарадзкія былі, нейкія іншыя, як я. Яны-ж нават ня ўсе гаварылі са мной пабеларуску. Ці ня ўмелі, ці не хацелі. Нават беларуская гутарка Міколы Ільяшэвіча была нейкая асаблівая. Пры гэтым ва ўсёй групе маіх субяседнікаў я не пабачыў ніводнага хлапца, які-б быў такім самым вясковым беларусам, як я. Цяпер мне прыпомнілася, што ў цэлым гомане вучнёўскага натаўпу часта чулася расейшчына, да таго-ж у гэтым натаўпе я заўважыў шмат жыдоўскіх твараў. Нават ад некаторых вучыцялёў я чуў расейскую гутарку. Што-ж гэта такое? Зноў я пачуўся нясвойска й няпэўна.

З гэтай задуменнасьці абудзіў мяне голас гімназіяльнага сакратара. Ён спытаў мяне пра вынікі гутаркі з дырэктарам. Я расказаў яму ўсё і выказаў сваё расчараваньне, што ў беларускай гімназіі чуецца шмат расейшчыны.

«Гэта толькі ў старэйшых клясах – паясьніў сакратар – у малодшых клясах вы рэдка пачуеце расейскую мову. Толькі цяпер пачынаюць прыбываць вучні зь вёскі, і зь вялікімі цяжкасьцямі. Няма нармальнай камунікацыі. Усюды няпэўнасьць. Вайна ня скончылася, – гаварыў мой субяседнік. – Вучні-ж старэйшых клясаў, – працягваў ён – вучыліся дагэтуль у расейскіх школах. Сярэдніх беларускіх школ у Вільні дагэтуль ня было. Адкуль жа яны могуць ведаць беларускую мову? Хіба тыя толькі, што дома гаварылі пабеларуску. Але ў Вільні ня шмат такіх. Беларускі адраджэнскі рух ня мог так хутка зьнішчыць русыфікатарскіх сьлядоў па гарадох. Жыдоў у нашай гімназіі – гаварыў далей сакратар – высокі працэнт. Гэта мясцовыя віленскія жыды, дык ад іх цяжка вымагаць веданьня беларускай мовы. Але мы іх ахвотна прымаем. Яны старанна вучацца беларускай мовы і аплачваюць поўнасьцьцяй плату за навуку. Дзякуючы гэтаму гімназія мае больш матар'яльных магчымасьцяў і можа звальняць ад платы бяднейшых беларускіх вучняў. Некаторыя вучыцялі таксама ня ўмеюць добра гаварыць пабеларуску, бо да гэтага часу яны выкладалі ў расейскіх школах. Наша гімназія існуе толькі адзін год.» – Так закончыў свае інфармацыі сакратар. Быў ім Аляксандар Сасноўскі. Вайна пе-

раўвала ягоную навуку ў сярэдняй школе, а цяпер ён быў ужо пераросшы, каб сесьці ў клясу. Ён думаў здаваць атэстат сьпеласьці экстэрнам, што яму й удалося зрабіць праз год. Праз тры гады пазьней мы спаткаліся зь ім у Празе ў Чэхаславаччыне, дзе апынуліся на студыях у чэскіх вышэйшых школах.

Выясьненьні сакратара пераканалі мяне шмат у чым, хоць і ня зьнішчылі канчальна майго расчараваньня й трывогі. Пачуцьці гэтыя зьніклі толькі пасьля таго, як я зьліўся з вучнёўскай моладзьдзю Віленскай Беларускай Гімназіі.

У Ільяшэвічаў

Ільяшэвічы жылі на Паплаўскай вуліцы. Сям'я іх складалася з бацькі, маці, двох сыноў і аднэй дачкі. Найстарэйшага – Міколу – мы ўжо пазналі. Малодшая за яго Ніна таксама вучылася ў Беларускай Гімназіі ў трэцяй клясе. Наймалодшы – Хведар – хадзіў у найбліжэйшую польскую пачаткавую школу. Бацька Ільяшэвічаў быў паштальёнам і як беларус ды праваслаўны непакоіўся, што палякі могуць звольніць яго з працы. Аднак ён ня цураўся беларускасьці ні дома, ні паза домам. Маці таксама была беларускай, і дома ў іх гаварылі толькі пабеларуску. Ільяшэвічы паходзілі з Пружаны. У часе вайны эвакуаваліся ў глыбіню Расеі, але ўжо пасьпелі вярнуцца й аселі ў Вільні. Мова іх была характэрная палеская (пружанская, сказала-б, – Р. Ж.-Г.), дыялектычна розная ад мовы Віленшчыны. Жылі яны сьціпла, але ў параўнаньні зь вясковым стандартам нават няблага. У сям'і іх я пачуўся свойска й свабодна. Асабліва маці адзначалася сардэчнасьцьцю ў адносінах да мяне, як да падростка, што апынуўся ў вялікім горадзе без бацькоў, бязь ніякай апекі. Яна была душой сям'і й дому. Яна тварыла аснову здаровай, спакойнай, шчырай сямейнай атмасфэры. Чуласьць ейнай матчынай ласкі вычувалася ўва ўсім яе абыходзе й ахоплівала нават мяне, зусім чужога. Я вычуваў, што прысутнасьць мая тут пажадана й таму ў далейшым бываў частым гасьцём у Ільяшэвічаў. У іх я аддыхаў душою ад розных жыцьцёвых нягод.

Пажычыў я ў Міколы Ільяшэвіча падручнікі, якіх мне не хапала й узяўся моцна за навуку. Да экзаменаў заставалася толькі два тыдні, дык ня было жартаў. Асабліва

мусіў я рабіць націск на хімію, якую тады чамусьці праходзілі ў 5-ай клясе. Гэтая навука аказалася для мяне цяжкой, сухой і мала зразумелай. Аб якіхсьці практыкаваньнях у лябараторыі, ці наагул помачы збоку не магло быць і мовы, ня было на гэта ані грошы, ані часу. Я проста завучаў напамяць хімічныя формулы й дэфініцыі. Вучыўся я звычайна ад 4-ай гадзіны папаўдні й да позьняй ночы – гэта знача тады, калі ў канцылярыі Саюзу Каапэратываў ня было ўрадаваньня – ня было нікога. Раньнія гадзіны я прабываў на вуліцах або ў добрае надвор'е праседжваў з кніжкай у Цялятніку ці Бэрнардынцы. Ад Вялікай вуліцы нумар 60, дзе мясьціўся тады Саюз Каапэратываў, было зручна даходзіць да тых паркаў.

Страваваўся дзе папала й як папала. Мусіў аблічаць свае мізэрныя рэсурсы так, каб хапіла да экзаменаў. Ды і з прадуктамі тады ня было так лёгка ў Вільні. Цукру, сала й мяса дастаць было цяжка. Адно добра, што было досыць хлеба, хоць і падобнага на гліну, малака, якое прывозілі прыгародныя сяляне, ды селядцоў. Гэта й была мая аснаўная ежа.

У канторы была газавая плітка, на якой рабілі гарбату для працаўнікоў у часе ўрадаваньня. Вось жа я меў магчымасьць гатаваць варатак, якім запіваў хлеб з селядцом. Спаў на канапцы, накрываўся сваёй ватоўкай, пасьцелі ня меў.

У пазьнейшых гадзінах мне хацелася спаць. А калі вызначаная дзённая норма навукі ня была зроблена, я мусіў пераадольваць сон. Прамываў вочы сьцюдзённай вадой. А калі гэта не памагала, закурваў папяроску й пускаў дым так, каб ён трапляў у вочы. Тады я й уцягнуўся паважна ў курэньне, якога ўжо ніколі ня мог пазбыцца. (У сярэдзіне сямідзесятых гадоў пазбыўся, калі пасьля двох сарцовых атакаў лекар яму сказаў: – Вінцук, кідай курыць, або... – ён кінуў і ніколі больш да курэньня не вярнуўся. – Р. Ж.-Г.). Мая настойлівасьць і працавітасьць дала свае вынікі. Праз два тыдні я быў гатовы да экзаменаў.

Экзамены

Экзаменаў чакаў я, як сьвята. Па першае, дзеля таго, што яны мелі быць выпрабаваньнем маіх сілаў і вырашыць мой далейшы лёс, па другое – тут я меў спаткацца

й пазнаёміцца з вучыцелямі Віленскай Беларускай Гімназіі, якія ў маім уяўленьні ўваасаблялі ўсю веду, усю сутнасьць беларускасьці й таму прадстаўляліся нейкімі надзвычайнымі істотамі. Некаторыя зь іх сапраўды былі надзвычайнымі. Першы зь іх быў вучыцель беларускай мовы Максім Гарэцкі. Я чуў пра Максіма Гарэцкага яшчэ ў Будславе, прачытаў ягоны зборнік апавяданьняў «Рунь». І цяпер, калі ён пачаў экзаменаваць мяне, я ўяўляў сабе, што маю дачыненьне зь вялікім чалавекам, і вельмі хваляваўся. Тымчасам гэты вялікі чалавек вышэй сярэдняга росту й худога складу глядзеў на мяне сваімі сурогімі чорнымі вачыма й пачаў пытаць мяне пра маю папярэднюю навуку. Голас у яго быў прыемны й спакойны, а твар ня быў ужо такі сурогі, як мне здавалася спачатку. Калі даведаўся, што я вучыўся ў Будслаўскай Гімназіі, пачаў распытваць пра акалічнасьці яе закрыцьця. Такім чынам экзамен пачаў ён з пабочнай гутаркі. Мне здавалася, што мой экзаменатар больш цікавіцца маёй асобай, як маёй ведай. Я быў зьдзіўлены, што не адчуваю больш ніякага хваляваньня, што гавару з Максімам Гарэцкім, як з добрым знаёмым. Але гутарка гутаркай, а экзамен усё-ж такі пачаўся й неспадзявана ператварыўся ў вельмі прыкры выпадак з «іканьнем». Я не магу ручацца за дакладнасьць апісанай тут сцэны, бо адбылася яна 44 гады таму назад, аднак ў аснаўным я яе помню добра, ясна з дапаўненьнем дэталяў, якія забыліся.

Максім Гарэцкі даў мне прачытаць адрывак апавяданьня (здаецца з «Родных Зьяў» Тараса Гушчы) і сказаў пераказаць прачытанае. Калі я пераказваў – ён час ад часу ўсьміхаўся, што мяне пачало непакоіць, тым больш, што й іншыя экзаменатары пасьміхаліся. Пазьней сказаў, каб я напісў свой пераказ, што я й зрабіў без ніякіх цяжкасьцяў. Аднак, як ён пачаў чытаць мой пераказ – я пажалеў, што так хутка аддаў сваю працу – не прачытаўшы нават. Ён пачаў крэсьліць і перакрэсьліваць маю пісаніну – у чым справа? Так я й экзамену магу ня здаць – падумаў я.

«Я так і знаў, што вы так напішаце, як і гаворыце – сказаў Гарэцкі – хоць гэта згодна з духам беларускай граматыкі пісаць так, як чуецца, аднак часта мясцовая вымова адыходзіць ад аснаўной граматычнай беларускай вымовы. Вы напісалі так, як гавораць у вас у Будславе. Ці вы мелі падручнік беларускай граматыкі ў Будславе?»

– Не, ня мелі – адказаў я, – нам толькі вучыцель тлумачыў у клясе пра аканьне, дзеканьне й цеканьне.

«Зусім зразумела тады, што вы ікаеце» – сказаў Гарэцкі. Я не зразумеў аб што ходзіць. Я-ж здаецца чыста гавару, не заікаюся, дык якое-ж іканьне? – падумаў я й глядзеў на яго зьбянтэжана, ня ведаючы што й казаць.

«Вы гаворыце й пішаце: дурэіць, іграіць, наракаіць, а правільна пабеларуску мусіла-б быць: дурэе, іграе, наракае – гаварыў далей мой экзаменатар. – Вы пішаце: нівялікі, ні хадзіў, ні такі, а мусіла-б быць: невялікі, не хадзіў, не такі – (Усе гэтыя прыклады я прыдумаў цяпер; тады былі напісаны мною хіба што іншыя словы, але напэўна з такім, як і тут іканьнем).

«Вы пішаце *і* замест *е*. Таму я сказаў, што вы ікаеце. Вы прадстаўнік аднэй зь вельмі цікавых беларускіх гаворак, у якой часта ненаціскное *е* вымаўляецца, як *і*. Калі не лічыць памылак з правапісу, ваш вусны й пісьмовы пераказ зроблены ня блага» – сказаў Гарэцкі. Ён даў мне яшчэ некалькі пытаньняў пра будову сказу й запытаўся нешта са стылістыкі. Адказы мае былі здавальняючыя. Экзаменатар мой тут жа сказаў, што экзамен я здаў. Ён устаў і хутка пайшоў з сваім вялікім партфэлям да дзьвярэй, дзе чакала на яго высокая ростам жанчына. Пазьней я даведаўся, што гэта была ягоная жонка, якую вучні звалі пані Чарняўская. Яна вучыла ў пачаткавых клясах, якія тады існавалі пры гімназіі. Паходзіла яна недзе з пад Полацка.

Ня гледзячы на прыкрасьці з іканьнем, ад экзамену ў Максіма Гарэцкага ў мяне застаўся якісь радасны настрой. Я быў задаволен, што здаў экзамен у беларускага пісьменьніка. Пачуў да яго апрача пашаны, і вялікую сымпатыю.

Аднак ня прышлося мне быць вучнем Максіма Гарэцкага. У шостай клясе й далей беларускую мову выкладаў Антон Луцкевіч. Гарэцкі ня доўга пабыў у Віленскай Беларускай Гімназіі, мусіць яшчэ каля году. У 1921-м годзе польскія ўлады выкінулі яго зь межаў Польшчы разам зь іншымі беларускімі культурнымі й палітычнымі дзеячамі ў так званым тады ліку «33-х». Ён трапіў у Латвію, а ад туль паехаў у Савецкую Беларусь. З гэтага часу й пачалася кальварыя – галгота гэтага выдатнага беларускага пісьменьніка й гісторыка беларускай літаратуры.

Шчасьліва склалася, што ягоны падручнік «Гісторыя Беларускай Літаратуры» ўжо быў надрукаваны (Вільня,

1920). Гэтая сьціплая кніжка зрабіла вялізарную работу, можна сказаць стварыла новую эпоху ў беларускім руху. Гэта быў першы падручнік гісторыі беларускай літаратуры. Да гэтага часу ўсе нашы ворагі цьвердзілі, што мы ня маем ніякае гісторыі, ніякай культуры, ніякай літаратуры, і ня было пад рукой ніякіх доказаў, каб зьбіць гэтае хвальшывае цьверджаньне. Цяпер жа «Гісторыя Беларускай Літаратуры» Максіма Гарэцкага давала доказы чорным на белым супраць гэтых зласьлівых нападаў. На гэтай кніжцы ўсьведамлялася нацыянальна ня толькі вучнёўская моладзь, але й тысячы беларусаў, што ў беларускіх школах ня былі. Гэта кніжка была аснаўным падручнікам беларусаведы ў Заходняй Беларусі праз увесь час польскай акупацыі. Дапоўніла яе выданая крыху пазьней, у Вільні ў 1922 годзе, «Хрыстаматыя Беларускай Літаратуры» гэтаксама Максіма Гарэцкага.

Далейшых дэталяў экзаменаў ужо ня помню. Помню толькі вучыцялей, якія мяне экзаменавалі. З матэматыкі экзаменаваў Ласковіч. Гэта быў тыповы настаўнік калішняй царскай расейскай сярэдняй школы, высокі, з барадой, з пэнс-нэ на носе, у даўгім чорным сурдуце й чорных запрасаваных портках. Быў ён беларусам зь Віцебшчыны й стараўся гаварыць пабеларуску, але выходзіла ў яго слаба: фактычна гаварыў ён парасейску, ужываючы толькі некалькі беларускіх слоў, як: – добра, вельмі добра, сядайце й інш. Экзамен праходзіў суха, бязь ніякага ўражаньня. Падобны характар меў і экзамен з прыроды ў Івана Якаўлевіча (так яго ўсе называлі) Катовіча – зрусыфікаванага беларуса – сына праваслаўнага сьвятара.

Зь гісторыі экзаменавала сярэдняга веку жанчына Мікуліна. Экзамен адбываўся ў 5-ай клясе для новаўступаючых вучняў у веснавым тэрміне. Кандыдатаў было каля 15 чалавек на гэты дзень. Былі гэта пераважна гарадзкія дзеці, хоць было некалькі шарачкоўцаў зь вёскі. Дырэктар хадзіў па клясе й прыслухоўваўся да экзамену, даючы часамі пытаньні таму ці іншаму кандыдату. Мяне ён запытаўся пра Люблінскую вунію. На гэта пытаньне я мог яму адказаць, бо яшчэ ў Будславе наш дырэктар Васілевіч гаварыў ня раз і ня мала пра Люблінскую вунію.

З лацінскай мовы экзаменаваў настаўнік жыд (прозьвішча ня памятаю). З французскай мовы экзаменатарам, на маё шчасьце, была мая настаўніца з Будслава – Ігнатава (масквічка). У Будславе мы яе вельмі любілі й шана-

валі за яе шчырыя й спагадлівыя адносіны да беларускай справы, а таксама за зацікаўленасьць, якую яна выяўляла ў справе навукі кожнага свайго вучня.

Помню яшчэ добра экзамен з рэлігіі, магчыма таму, што ён зьвязваўся зь імём будслаўскага ксяндза. Тут я першы раз пабачыў ксяндза Адама Станкевіча. Ён сам падыйшоў да мяне й прывітаўся славамі: «Як маешся, будслаўскі беларус». Я быў зьдзіўлены, што ён ведае адкуль я, ды тым, што ён загаварыў да мяне чысьцюсенькай беларускай мовай. Да гэтага часу я ніколі ня чуў, каб ксёндз гаварыў пабеларуску, усе ксяндзы, зь якімі я меў дачыненьне, гаварылі папольску. На пытаньне, ці я вучыўся рэлігіі – я адказаў, што ў Будслаўскай Гімназіі пры бальшавікох рэлігія была забаронена, а пры немцах рэлігію вучыў нас мясцовы ксёндз Мішкінец і гаварыў з намі папольску. Кс. Станкевіч сказаў, што такога ксяндза ня знае. Я прыпомніў, што надовечы спаткаў кс. Мішкінеца на Вялікай вуліцы, ды расказаў пра гэта спатканьне. Кс. Мішкінец, пабачыўшы мяне на вуліцы ў Вільні, затрымаўся й прывітаўся, ды спытаў, што я раблю ў Вільні. Я адказаў, што прыехаў вучыцца ў беларускай гімназіі. – «Ого, дык ты ня йначай як міністрам беларускім хочаш быць!?» – сказаў ён з іранічнай усьмешкай. Я адразу зразумеў, куды ён кідае свой камень. Справа ў тым, што тымі днямі польская эндэцкая газэта «Дзеннік Віленьскі», якая заўсёды атакавала беларускі рух, напісала, што «жменька беларускай інтэлігэнцыі» праводзіць прапаганду незалежнасьці Беларусі, бо ўсе гэтыя інтэлігэнты хочуць мець для сябе цёплыя пасады міністраў. Абураны іранічнай заўвагай кс. Мішкінеца я адказаў яму даволі востра: – «Можа буду беларускім міністрам, а мо й беларускім ксяндзом, ці-ж толькі палякі могуць быць ксяндзамі ў беларусаў?» – Ён не чакаў ад мяне такога адказу, бо знаў мяне як спакойнага й ветлівага хлапца. Таму ён аж зьбянтэжыўся і адразу перавёў гутарку на іншую тэму. Сказаў мне між іншага, што ў Будслаў больш ня вернецца (відаць баяўся бальшавікоў).

Ксёндз Станкевіч выслухаў маё апавяданьне і сказаў мне, што цяпер ужо ёсьць шмат ксяндзоў беларусаў, якія нясуць Хрыстовую навуку ў народ у сваёй роднай мове. Што ён пытаў мяне з рэлігіі, я ўжо ня помню, помню толькі, што пасьля экзамену распытваўся шмат пра Будслаўскыю Гімназію, пра яе вучыцялёў і страшэнна цераймаўся, што такая маса вясковых беларускіх вучняў гэтай гім-

назіі (325!) – ня лічачы адзіночных выпадкаў – ня трапіць ужо ў беларускую сярэднюю школу. Ён выпытваў мяне, ці ёсьць якіясь магчымасьці, каб больш гэтых вучняў прыехала ў Віленскую Беларускую Гімназію. Тут я нічым пацешыць яго ня змог, бо жыцьцё ў краі й камунікацыя былі ненармальнымі, і высылаць дзяцей у далёкі горад нават пры найвялікшай ахвярнасьці бацькоў-сялян было амаль немагчымым.

Ксёндз Адам Станкевіч зрабіў на мяне ўражаньне сапраўднага, добрага пастыра, які цікавіцца лёсам ня толькі тых, што былі пад ягонаю духоваю апекай, але й лёсам тых, што знаходзяцца пад чыёйсь апекай. Ён клапоціцца лёсам усяго беларускага народу. Я вычуваў, што маю перад сабою ня толькі ксяндза беларуса, але й вялікага беларускага дзеяча, змагара за беларускую справу.

Новыя знаёмыя. Базыльянскія Муры

Экзамены я здаў і быў прыняты ў 6-ю клясу Віленскай Беларускай Гімназіі. Цяпер трэба было падумаць, як жыць, каб утрымацца ў Вільні й вучыцца. З гэтымі справамі зьвярнуўся я да Эдварда Будзькі й другога свайго суседа з Будслава Язэпа Гапановіча, які таксама працаваў у Віленскім Саюзе Каапэратываў як бугальтар. Аказалася, што мае землякі ўжо пастараліся аб маё забясьпечаньне. Яны ўладзілі мяне на працу ў беларускім спажывецкім каапэратыве «Райніца» на Вялікай Пагулянцы. Апрача «Райніцы» ў Вільні існавалі тады яшчэ два спажывецкія каапэратывы на Сьпінішках і на Новым Сьвеце. Я меў працаваць у «Райніцы» як скарбнік у краме. Кватэру-ж я ўжо раней быў сабе знайшоўшы ў свайго земляка на Белым Завулку на Зарэччы. Адно было нявыгадна, што з Зарэчча на Вялікую Пагулянку было далёка хадзіць, але я да гэтага хутка прывык. Тут я спаткаўся з новымі людзьмі і з новымі справамі.

Загадчык «Райніцы» быў віленскі беларус пан Валейша. Кожны дзень перад закрыцьцём крамы я здаваў яму грошы ўтаргаваны за дзень. Прадаўцом у «Райніцы» быў ня то беларус, ня то паляк, які гаварыў таксама добра папольску, як і пабеларуску. Чалавек ён быў добры й працаваць зь ім было лёгка. Прозьвішча ня помню.

Валейша ўважаў сябе за беларускага дзеяча, каля 45 год, кульгаў на адну нагу. З сям'ёй сваёй ён аднак гава-

рыў толькі папольску. Цікавіўся больш гандлёвымі справамі чымся нацыянальна-культурнымі. Ён быў замешаны ў якуюсь грашовую афэру й быў суджаны. Пазьней пайшоў на палянафільскую акцыю сярод беларусаў і быў адкінуты віленскім беларускім грамадзтвам. У «Райніцы» я пазнаёміўся яшчэ з адным віленсклім беларусам – Знамяроўскім, які таксама ўважаў сябе за беларускага дзеяча. Ён быў загадчыкам беларускай друкарні «Друк». Знаёмства з Знамяроўскім мне з часам прыдалося, бо ў ягонай друкарні я падвучыўся наборшчыцкай спэцыяльнасьці, ды падзарабляў сабе ў вольных хвілінах.

Пасьля экзаменаў я меў больш вольнага часу, вечарамі й у нядзелі, дык лепш мог пазнаёміцца зь Вільняй, а перадусім зь беларускім асяродкам. Звычайна я ськівоўваўся ў Базыльянскія муры, дзе спатыкаўся са сваімі новымі сябрамі шасьціклясьнікамі. Апрача Міколы Ільяшэвіча я пасябраваў з братамі Дылісамі, Арнольдам і Аўгенам, ды Уладзімірам Каржом. Дылісы паходзілі фактычна з латышскай сям'і й былі лютэранамі. Бацька іх быў бугальтарам у фабрыцы Мозэра ў Новай Вялейцы. Дылісы жылі ў асабніку на Паплавах. Дома гаварылі панямецку ці палатышску, а як быў нехта з беларусаў – парасейску. Хлапцы вучыліся ў Беларускай Гімназіі хіба таму, што латышскай, ці нямецкай сярэдняй школы ня было. Абодва рослыя й здольныя хлапцы далучыліся да беларускага асяродзьдзя шчыра й былі актыўнымі ў беларускім вучнёўскім жыцьці. На вялікі жаль, старэйшы брат Арнольд загінуў трагічнай сьмерцяй неяк вясною 1921 году. Раз вечарам ён вяртаўся дамоў позна й дзеля таго, што вароты былі ўжо замкнёны, пералазіў праз агароджу ад вуліцы. Польскі патруль, што пільнаваў вайсковы склад пасуседзтве, палічыў, відаць, яго за злодзея й стрэліў. Адным стрэлам палажыў Арнольда на мейсцы. Гэту трагічную сьмерць маладога 18-ці гадовага хлапца глыбока перажыла ня толькі сям'я Дылісаў, але й уся наша 6-я кляса. У паховінах узяла ўдзел уся гімназія. Аўген Дыліс, застаўшыся адзін, тым больш здружыўся з сваімі беларускімі сябрамі й поўнасьцьцю ўвайшоў у беларускае асяродзьдзе. Ён вельмі хутка апанаваў беларускую мову, і не адна беларуская імпрэза, вучнёўская, ці агульная, безь яго не абыйшлася. Пасьля заканчэньня гімназіі ён вучыўся ў Празе, дзе быў актыўным сябрам беларускай студэнцкай групы, ды не пераставаў быць актыўным у беларускім жыцьці пасьля павароту ў Вільню.

Уладзімір Корж быў сынам стрэлачніка. Сям'я яго складалася з бацькі, маці, якая была каталічкай і гаварыла да ўсіх востарабрамскай польшчынай, ды малодшага брата. Усе, апрача маткі, добра гаварылі пабеларуску. Мелі яны невялікі домік недзе каля Таварнай стацыі й жылі даволі бедна. Валодзька, як усе звалі Уладзіміра, чуўся сьведамым беларусам. Зь ім лёс злучыў мяне аж да Прагі, пасьля якой дарогі нашы разыйшліся. Вось жа Мікола Ільяшэвіч, Дылісы й Корж сталіся маімі найбліжэйшымі сябрамі ўжо летам 1920 году. Да нашай групы далучаліся часта шасьціклясьнік Журэпнаў Іван ды Калаўр Уладзімір. Спатылкаліся мы звычайна вечарамі ў Базыльянскіх мурох, дзе гутарылі пра беларускія справы на тэму дня, ды ўмаўляліся, як правесьці нядзельку над ракой ці на экскурсіі ў ваколіцах Вільні.

Ня гледзячы на тое, што лета было ў разгары й заняткаў у гімназіі ўжо ня было – у Базыльянскіх мурох было заўсёды жыва, быў заўсёды рух. Усе, хто больш ці менш быў зьвязаны зь беларускім жыцьцём, быў зьвязаны й з Базыльянскімі мурамі, бо тут быў цэнтр беларускага жыцьця.

Што-ж такое Базыльянскія Муры?

Гэта камплекс будынкаў калішняйшага вуніяцкага кляштору айцоў Базыльянаў. З вуліцы ўвайходзілася ў Базыльянскія муры праз старую мураваную браму як бы ў калідор, абапал яго стаялі двыхпавярховыя будынкі, а ў канцы калідора другая брама ў папярочным двухпавярховым будынку. З гэтай брамы ўвайходзілася ў прасторны панадворак, у якім зараз жа справа стаяла вежа-званіца, а крыху далей было правае крыло вялікага трохпавярховага будынку, што далей у глыбіні панадворку заламваўся пад простым кутом у левы бок і цягнуўся аж да суседняга панадворку. Гэта й быў галоўны корпус Базыльянскіх муроў, у якім месьцілася Віленская Беларуская Гімназія з 8-мі гімназіяльнымі клясамі й 2-ма пачаткавымі, Духоўная Сэмінарыя, Інтэрнат абедзьвюх школ і Беларускі Музей імя Івана Луцкевіча з Беларускім Навуковым Таварыствам. Былі тут яшчэ й прыватныя кватэры. Такім чынам панадворак быў ахоплены будынкамі з трох бакоў. Толькі з усходняга боку Базыльянскія муры перарываліся, але затое на сярэдзіне панадворку аж пад усходнюю мяжу стаяла прыгожая царква Сьвятой Тройцы, калішняя вуніяц-

кая царква айцоў Базыльянаў. За паўдзённым крылом галоўнага корпусу быў даволі прасторны сад з кіпарысамі й фруктовымі дрэвамі, а ў садзе знаходзіўся аднапавярховы будынак праваслаўных Манашак. За заходнім крылом корпусу быў другі вялікі панадворак (на ім звычайна адбываліся лекцыі гімнастыкі), які даходзіў да Конскага пляцу. Што й казаць, месца ў Базыльянскіх мурох было досыць, і таму тут месьцілася столькі розных устаноў. Апрача вышэй успомненых, тут месьціўся яшчэ Беларускі Нацыянальны Камітэт, рэдакцыя беларускай газэты й Беларускія Вучыцельскія Курсы, якія падрыхтоўвалі вучыцялёў у існуючыя школы, аб адкрыцьці якіх старалася Беларуская Школьная Рада Віленшчыны. У самой Вільні было тады сем беларускіх пачаткавых школ.

Паза Базыльянскімі мурамі знаходзіліся: Беларуская Кнігарня й Беларускае Выдавецкае Таварыства на Завальнай вуліцы нр. 7, беларускія пачаткавыя школы, каапэратывы, беларуская друкарня й Беларускі Клюб. З газэт выходзілі: «Беларуская Думка», «Беларускія Ведамасьці», а крыху пазьней пачала выходзіць «Крыніца» – лацінкай.

Шмат было беларускіх устаноў у Вільні тады, дык мне было што пазнаваць. І людзей было нямала – і палітычных ды культурных дзеячоў і звычайных мясцовых грамадзян беларусаў. Пераканаўся я аб гэтым, пабываўшы на беларускіх спэктаклях і вечарынах, якія найчасьцей адбываліся ў залі Віленскага Беларускага Таварыства, а пазьней і ў Беларускім Клюбе. Ня раз мне прышлося сутыкнуцца з беларускім насельніцтвам Вільні – пераважна на ўскраінах. Некаторыя нават гаварылі чыста пабеларуску, а іншыя, што гаварылі спольшчанай беларускай мовай (даючы польскія канчаткі, ці расейскай мовай зь беларускім акцэнтам), як крануць глыбей – аказваліся беларусамі. Спольшчану беларускую мову мы называлі вострабрамскай, бо яе найчасьцей можна было пачуць ад баб, што зьбіраліся каля Вострай Брамы. Вільня перастала быць для мяне чужой і незнаёмай, асабліва калі я пачаў пазнаваць гісторыю яе зь гісторыі Беларусі. Я прыйшоў да выснаву, што польскасьць Вільні – наносная. Яна трымалася на спалянізаваным, каталіцкім касьцёле й польскай уладзе. Калі-б Вільня трапіла ў незалежную Беларусь – яна напэўна сталася-б беларускім местам. Польскасьць тут была пераважна штучная, наносная. Кругом жа Вільні было мора беларускага насельніцтва. Беларускі

рух меў атракцыйную сілу ня толькі для беларусаў, але й іншага насельніцтва Вільні.

Найбольш кідаліся ў вочы жыды, якіх было тады ў Вільні каля 40%. Далей ішлі расейцы – каля 25%, зь якіх толькі частка была сапраўдных расейцаў, што засталася з царскіх часоў, рэшта-ж іх – гэта зрусыфікаваныя праваслаўныя беларусы.

Заставаліся яшчь летувісы – каля 2-х тысяч, якія трымаліся вельмі-ж агрэсыўна, маючы сталую дапамогу з Коўна. Яны мелі сваю гімназію і адзін касьцёл. Беларусаў афіцыяльна лічылі дзьве з паловаю тысячы, але фактычна іх было шмат больш. Беларусы з сваім натуральным заплеччам і гістарычным мінулым мусілі-б быць гаспадарамі Вільні. Да такіх выснаваў прыходзіла наша вучнёўская група ў сваіх гутарках у Базыльянскіх мурох.

Віленскі Саюз Каапэратываў

У каапэратыве «Райніца» я працаваў мусіць з паўтара месяца. Як пачаў набліжацца фронт, пачалася гаворка пра забясьпечаньне насельніцтва прадуктамі на выпадак прыходу бальшавікоў. Моцна адчувалася гэта гаворка ў Віленскім Саюзе Каапэратываў. Ён звозіў прадукты з розных складаў на станцыі, што пачалі эвакуавацца, ды расьпіхаў па сваіх каапэратывах. Было шмат працы й трэба было больш людзей. Дзеля гэтага й мяне ўзялі на працу ў Саюз Каапэратываў. Працаваў я на складзе, дзе памагаў пакаваць тавары, або езьдзіў на станцыю, каб наглядаць за нагрузкай, прывозам і разгрузкай тавараў. Відаць палякі ня мелі надзеі на ўтрыманьне Вільні, калі распачалі эвакуацыю. Ужо зьяўляліся першыя ластаўкі ўцекачоў зь Меншчыны й усходняе Віленшчыны. У аднэй з такіх групаў быў Аляксюк. Ён хіба што ня быў уцекачом, хіба толькі прышоў з групай уцекачоў. Я да яго прыглядаўся, бо наслухаўся шмат лаянак на яго сярод беларусаў за супрацоўніцтва з польскім урадам. Быў ён сярэднягя веку й сярэдняга росту, вельмі добра апрануты й прыгожа гаварыў па-беларуску. Я быў зьдзіўлены, што нашы беларусы з Саюзу Каапэратываў вітаюцца й ветліва гавораць з чалавекам, якога так часта лаялі. Мусіць тут была якаясь афіцыйная справа, гаварыць аб якой было неабходна.

Я шмат выйграў, пераходзячы на працу ў Саюз Каапэратываў. Мне лепш плаціл, а найважнейшае, працаўнікі

Саюзу атрымоўвалі прадукты, як цукар, мука й тоўшчы, якіх у Вільні нельга было тады дастаць.

Віленскі Саюз Каапэратываў – гэта была вялікая эканамічна-гандлёвая арганізацыя на ўсю Віленшчыну. Яна аб'ядноўвала каля 350 вясковых і гарадзкіх спажывецкіх каапэратываў. Бальшыня зь іх былі беларускія каапэратывы. Але былі й іншыя, як польскія, жыдоўскія й летувіскія. Таму й у Радзе Саюзу ды сярод працаўнікоў былі людзі розных нацыянальнасьцяў, якія згодна з духам каапэрацыі супрацоўнічалі дружна, не падкрэсьліваючы сваёй нацыянальнасьці. Блянкі Віленскага Саюзу Каапэратываў – як цяпер іх бачу перад сабой – былі надрукаваны на чатырох мовах: польскай, беларускай, летувіскай і жыдоўскай. Кнігаводзтва аднак вялося на польскай мове.

Сябрамі Віленскага Саюзу Каапэратываў былі паасобныя каапэратывы, якія бралі тавар для сваіх каапэратываў у гэтым Саюзе, на пэўных ільготах, ды карысталі з крэдыту, але за тое ўносілі азначаную сяброўскую складку ў Саюз ды працавалі пад наглядам і радай інструктараў Саюзу. Раз на год адбываўся Зьезд сяброў Саюзу – прадстаўнікоў каапэратываў, што да яго належалі. Зьезд выбіраў Урад Саюзу й вырашаў розныя бягучыя справы. На Зьезьдзе, на якім зьбіралася да 500 чалавек, відаць было, што беларусы былі ў абсалютнай бальшыні. Прамаўлялі там на ўсіх чатырох мовах, асабліва, калі гэта былі афіцыйныя выступленьні, як прывітаньні. Прывітаньні былі й ад некаапэратыўных арганізацыяў, прыкладам ад Беларускага Нацыянальнага Камітэту. У выступленьнях у часе працы Зьезду, ды ў прыватных гутарках, найбольш чулася беларуская мова. Шматлікія дэлегаты й не называлі інакш, як Беларускі Саюз Каапэратываў.

У часе Зьезду Саюзу Каапэратываў было шмат працы й сьведамым нацыянальна старэйшым вучням Беларускай Гімназіі. Па сваёй ініцыятыве яны пашыралі беларускія газэты й часопісы сярод дэлегатаў ды стараліся запрасіць іх на беларускую пастаноўку й вечарыну, якую звычайна падрыхтоўвалі на гэты дзень. Зьезд Саюзу Каапэратываў моцна адчуваўся ўва ўсім беларускім асяродзьдзі: і ў беларускай кнігарні, дзе дэлегаты куплялі беларускія кніжкі, у беларускіх рэдакцыях, дзе яны выпісвалі газэты для сябе ці сваіх вяскоўцаў, і ў прыватных памешканьнях, дзе затрымоўваліся дэлегаты – у радні, ці знаёмых, бо ведама, нашы вяскоўцы гатэляў ня любяць.

Дык Віленскі Саюз Каапэратываў быў найлепшай часткай беларускага жыцьця. Ня дзіва, што й у Ўправе Саюзу ды сярод працаўнікоў было шмат беларусаў – пэўне бальшыня. Досіць вылічыць такіх выдатных беларускіх каапэратараў, як Эдвард Будзька, інж. Антон Нэканда-Трэпка, інж. К. Душэўскі, Сталыгава, Аркадзь Смоліч, Чыжэўскі, Язэп Гапановіч, праф. Краскоўскі, як інструктар – Арэхва, Гэрмановіч, Ганчарук, браты Канчэўскія, Ян Малька, загадчык складу Маркевіч, ды іншыя, прозьвішчы якіх ужо ня помню.

Віленскі Саюз Каапэратываў гуляў на пачатку 20-х гадоў вялізарную ролю ня толькі ў Віленшчыне, але й на ўсёй беларускай тэрыторыі не занятай бальшавікамі, бо праз яго рукі праходзіла бальшыня таваравымены па ўсім краі. Ён забясьпечваў насельніцтва сольлю й іншымі неабходнымі прадуктамі перад прыходам бальшавікоў ды пасьля іх адступленьня. Ён арганізаваў збыт жыта, малочных прадуктаў, мяса з нашай вёскі. У далейшым разьвіцьці ён мог бы стварыць моцную эканамічную базу для ўсяе Заходняе Беларусі, згуляць ня меншую ролю, як масласаюз у Галіччыне. І ў беларускім нацыянальным усьведамленьні Саюз Каапэратываў гуляў паважную ролю, як праз зьезды й беларускіх інструктараў, так і праз каапэратыўную літаратуру, якая ў значным ліку была на беларускай мове.

Для палякаў, якія хацелі перабраць у свае рукі ўсё жыцьцё краю й спалянізаваць яго, Віленскі Саюз Каапэратываў быў сольлю ў воку. Таму яны, як толькі замацаваліся ў Заходняй Беларусі, пастанавілі прысабечыць Віленскі Саюз Каапэратываў. Яны змусілі гэтую незалежную, талерантную краёвую арганізацыю злучыць з агульнапольскім Саюзам «Сполэм» і такім чынам ператварылі яе ў польскую нацыяналістычную пляцоўку.

Зусім здушыць беларускасьці ў каапэрацыі ў Заходняй Беларусі ім ніколі не ўдалося, але яны сапхнулі яе з афіцыйнага зроўню ў прыватны. Пазьней польскія ўлады не дазвалялі арганізаваць беларускія каапэратывы, асабліваж калі яны арганізоўваліся незалежна ад польскіх каапэратыўных саюзаў. Пераканаліся аб гэтым найлепш у канцы 20-х гадоў інжынеры аграноміі Гусоўскі й Орса, якія распачалі тады арганізацыю беларускай малачарскай каапэрацыі ў Баранавічах. Вельмі-ж хутка іх змусілі перайсьці да польскага малачарскага саюзу.

Мая праца ў Саюзе Каапэратываў пачалася нешчасьліва. Ад нерэгулярнасьці ў ежы пераважна ў сухамятку я захварэў на востры катар кішак. Зьлёг у ложак і нічога ня мог есьці апрача шчолаку з адвараных і перацэджаных круп. Нават мае гаспадары, зь якімі я быў у пэрмамэнтнай спрэчцы за беларускасьць Віленшчыны, занепакоіліся й пачалі даглядаць мяне. Добры дагляд і дыета, а перадусім малады арганізм перабароў хваробу, і я праз пару тыдняў стаў на ногі.

Дарэчы варта сказаць пару слоў пра маіх гаспадароў зь Белага Завулку. Абое – муж і жонка – былі беларускага паходжаньня, і толькі пад уплывам польскіх касьцёлаў і польскага купецкага асяродзьдзя, у якое трапілі, сталі падцягвацца да яго й польшчыцца. Мой гаспадар Фэлікс Грузд паходзіў зь вёскі Палесьсе пад Будславам і быў братам мужа маёй стрыечнай сястры. Грузды ў Палесьсі прабіваліся на паўчвёртцы зямлі й дараблялі цясьлярствам. У цэлай іх сям'і ніхто ня ўмеў нават двух слоў зьвязаць папольску. Старэйшы іх сын яшчэ падросткам паехаў у Вільню, уладзіўся на працу прадаўца ў ведамым магазыне судзьдзя Одынца. Праз доўгія гады працы й зьмены ў часе першай Сусьветнай вайны ён стаўся супольнікам Одынца і, відаць ня хочучы быць у канфлікце са сфэрай, у якую папаў, пачаў польшчыцца. Жонка яго паходзіла зь Лідчыны і пачала польшчыцца, пабыўшы некалькі год у сваёй радні ў Вільні. Гэтае польшчаньне працягвалася пасьля выхаду замуж за Грузда – ужо супольным высілкам. Аднак, як яна не старалася, яе польская мова была пераплецена беларушчынай. Затое брат яе, якога яна сьцягнула ў Вільню, быў заядлым беларусам і грамадаўцам у часе Грамады й сварыўся з Груздамі за беларускасьць. Такім чынам спрэчка за беларускасьць у Груздаў на Белым Завулку ня скончылася й пасьля майго выхаду ад іх. Яна мусіць ніколі ня скончылася.

Прыклад Груздаў вельмі характэрны для гэтак званай польскасьці Вільні. Такіх Груздаў былі там тысячы.

Бальшавікі ў Вільні

Лета й восень 1920 году ў Вільні было багатае на палітычныя падзеі. Мне прышлося быць сьведкам аж трох зьменаў улады трох дзяржаваў.

Наступ Пілсудзкага на Кіеў заламаўся. Гэта адбілася й на беларускім фронце. Бальшавікі перабралі ініцыятыву, і іх горды рынуліся на Заходнюю Беларусь. Кавалерыя Будзённага хутка пасоўвалася на Захад з клічам «Даёш Варшаву!»

Ужо ў чэрвені ў Вільні ўзьняўся перапалох ды хаос эвакуацыі. Наплывала вялікая колькасьць раненых жаўнераў, усе гошпіталі былі перапоўнены й некуды было іх дзяваць.Неўзабаўе раненых трэба было эвакуаваць, што яшчэ больш павялічыла хаос эвакуацыі войска, цывільных уладаў ды цывільнага насельніцтва. Па месьце хадзілі групы жаўнераў з разьбітых пазнанскіх аддзелаў – гэтак званых галершчыкаў. Яны зьдзекаваліся над жыдамі. Цярпелі найбольш старэйшыя й барадатыя. Спатыканых на вуліцы барадатых жыдоў пазнанчыкі лавілі, абразалі ім пэйсы або пускалі ў бароды г. зв. ваўчкоў (ваўчок – гэта кароткі сагнюны пруточак як лук, канцы якога злучаў шнурок, як цяціва ў луку. На сярэдзіне шнурка была ўткнута ў яго кароценькая палачка, або цьвек, пры помачы якога шнурок моцна накручваўся. У такім стане ваўчка шнурком датыкалі да барады й выпускалі яго з рук. Ён пачынаў вельмі хутка адкручвацца разам з цьвяком ды ўкручваў валасы барады так моцна, што яго цяжка было выняць. Лучок жа падымаўся ўверх і або падаў у рот, або біў па носе. Бедны чалавек крычаў са страху, зьдзеку й болю, а галерчыкі рагаталі).

Здарылася й у мяне бяда. Неяк вечарам а гадзіне 10-ай выйшаў я купіць папярос. Адкульсьці зьявіліся два жаўнеры бяз зброі, затрымалі мяне й забралі мой гадзіньнік.

Плякаты, што заклікалі да абароны Вільні й адозвы розных польскіх камітэтаў і арганізацыяў, аблеплены па кіёсках і сьценах дамоў, аказаліся пустымі словамі. Віленскія палякі цэлымі натаўпамі ўцякалі на захад. Таму ў такой атмасфэры сьмешна выглядалі групкі, апранутых у вайсковае, ахвотнікаў патрыётаў, што крычэлі «Не дамо Вільні», а тым больш пацешнымі былі жаночыя дружыны абаронцаў Вільні ў сваіх шырокіх спадніцах і сініх бэрэтах. Першыя паходзілі пераважна з сем'яў віленскіх краўцоў і шаўцоў, якія ня мелі сродкаў на выязд зь Вільні, а другія – пераважна кухаркі й служанкі, якія ня мелі чаго рабіць, бо працадаўцы іх даўно ўжо трымалі кірунак на Варшаву. Зьявіліся й бандыты, перапранутыя ў вайскоўцаў. Яны ўрываліся ў прыватныя памешканьні й рабавалі. Я бачыў праз вакно рабаўніка ў панадворку на Вялі-

кай вуліцы нр. 60 за пару гадзін да прыходу бальшавікоў. Ён сілай зрываў пярсьцёнкі з пальцаў жанчыны, якая нямым голасам крычэла ад болю, а супольніца бандыта ў касьцюме шпітальнай сястры зь пісталетам у руках пільнавала ў дзьвярох, каб не набег хто на помач.

Тымчасам пачалася хаатычная страляніна ўва ўсіх напрамках, а праз поў гадзіны на Вялікай вуліцы праімчаўся вялікі бальшавіцкі аддзел коньніцы. Бандыты й абаронцы Вільні зьніклі як камфора. У горадзе чутна была яшчэ якісь час бязладная страляніна, а пазьней запанавала магільная жудасная цішыня. Усе рэстараны й памешканьні, усе брамы й парадныя ўваходы былі наглуха зачынены. На вуліцах ані жывой душы. А гэта-ж была другая гадзіна папаўдні. Таму й цішыня была такой жудаснай. Толькі праз якія дзьве гадзіны пачалі валіць калёны бальшавіцкай коньніцы – гэтым разам ужо без ніякага сьпеху. Вільня была занята корпусам Гая. Паступова пачалі адчыняцца брамы, людзі з трывогай пачалі выходзіць на вуліцу ды прыглядацца да новага акупанта.

Цэлы дзень гэты я прабыў на Вялікай 60 у Саюзе Каапэратываў. У гэты трывожны дзень мне было загадана быць у канцылярыі Саюзу на ўсякі выпадак. Я наглядаў праз вакно за ўсім, што дзеецца, або зыходзіў да брамы й глядзеў на вуліцу. Здавалася, што нічога Саюзу Каапэратываў не пагражае, ніхто ім не цікавіцца.

Але вось да брамы падыйшоў малады жыдок, а за ім некалькі бальшавіцкіх коньнікаў. Жыдок паказаў на панадворак Вялікай 60 і штось тлумачыў коньнікам. Яны загадалі дворніку адчыніць браму, уехалі ў панадворак, зьлезьлі з каней і пачалі ламаць дзьверы складу Саюзу Каапэратываў. Я падыйшоў да іх і паінфармаваў, што гэта склад Саюзу Каапэратываў, што гэта ня прыватнае, а каапэратыўнае – а значыць народнае дабро. Яны не зьвярталі на мяне ўвагі й далей ламалі дзьверы. Тады я хуценька пабег праз Ігнатаўскі завулак да Віленскае 12, дзе быў заездны дом Саюзу Каапэратываў і дзе жылі некаторыя сябры Ўправы. Я знайшоў там Загадчыка складу й паінфармаваў яго аб тым, што робіцца на Вялікай 60. Ён пагаварыў з двома сябрамі Ўправы й мы разам у чатырох пайшлі ў Саюз Каапэратываў. Толькі цяпер я заўважыў на Ігнатаўскім завулку двуколку, на якой ляжаў сколаты штыхамі польскі легіянер. Наагул жа забітых і раненых у горадзе было мала, бо польскае войска Вільню

не бараніла. Адстрэльваліся толькі нялічныя аддзелы, што прыкрывалі зад польскага адступаючага войска.

На другі дзень з Полацкага тракту йшла бесперапынна бальшавіцкая пяхота. Складалася яна пераважна з моладзі й падросткаў – нэндзных, абарваных, галодных. Іх гналі камісары, як скаціну на ўбой. Пры кожнай сутычнасьці зь віленскім насельніцтвам яны пыталі, ці далёка да Варшавы. Відаць агітатары моцна ўбілі ў галовы найбліжэйшую мэту паходу. А за кожным аддзелам даўгім шнурам цягнуўся, здавалася без канца, абоз. Але які абоз?! Не такі вайсковы зь вялікімі вайсковымі фурамі й добрымі вялікімі коньмі, які мела ў тыя часы кожнае войска, а абоз з звычайных драўляных беларускіх сялянскіх калёсаў з малымі выхуджанымі сялянскімі конікамі. На кожных калёсах сядзеў за фурмана беларускі дзядзька, або шкандыбаў побач з калёсамі, каб крыху аблегчыць лёс беднай жывёлы, што столькі дзён ужо цягнула непамерны для яе цяжар вайсковага дабра. У гутарках з гэтымі дзядзькамі выяўлялася, што сагнаны яны ў бальшавіцкі абоз чуць не з усяе беларускае зямлі: і з пад Полацку, і з пад Віцебску, з Магілёўшчыны і нават са Смаленшчыны! – не гаворачы ўжо пра шматлікія фурманкі зь Меншчыны й Віленшчыны. Гэтых фурманак сотні тысяч! Яны тыднямі, а некаторыя й месяцамі церпяць у гэтым абозным ярме пакуль іх конь ня зваліцца ў аглоблях, і хто ведае колькі яшчэ будуць цягнуць, пакуль дабяруцца, ці не дабяруцца, да Варшавы. Хто ведае, які іх будзе лёс. Яны-ж вязуць і ежу й усе ваенныя прыпасы, і аружжа, і амуніцыю. Не з аднаго воза будуць страляць з кулямётаў у часе бою (было гэтак з маім бацькам мінулай восеньню пад Варонежам), не адзін зь іх разьвітаецца з жыцьцём ні за што, ні пра што. І ніхто не клапоціцца пра іхні лёс, пра іхнія сем'і й гаспадаркі без гаспадара й каня ў гарачую летнюю пару, нікому галава не баліць пра гэта. Кліч «Даёш Варшаву» закрываў усё. Дзеля гэтага клічу ўся Беларусь руйнуецца ў полымі вайны, на карках сыноў яе бальшавікі хочуць здабыць Варшаву.»

* * *

Пасьля Рыжскага дагавору, які быў падпісаны 18 сакавіка 1921 году, Вільня й уся Заходняя Беларусь ізноў апынулася пад польскай акупацыяй.

Вясной 1920 году Вінцэнт Жук-Грышкевіч здаў уступны экзамен і быў птыняты ў шостую клясу Віленскай Беларускай Гімназіі.

«Якраз тады, – гаворыць ён у сваім дакладзе на 50-я ўгодкі сьмерці Івана й 10-я – Антона Луцкевічаў, – у красавіку 1920 году выйшла кніжка «Іван Луцкевіч». Гэту кніжку я прачытаў тады, яна моцна ўзьдзейнічала на мяне і пашырыла маю веду пра беларускі рух.» – І ў іншым мейсцы гэтага дакладу кажа: «Івана Луцкевіча я знаў толькі па расказах і па тых настроях, якія застаў пасьля ягонай сьмерці, па прыезьдзе ў Вільню. Яны зрабілі на маёй сьведамсьці вялікі й незабыўны сьлед. Але Антона Луцкевіча я знаў вельмі доўга й сустракаўся зь ім гадамі. Ён быў маім настаўнікам у Віленскай Беларускай Гімназіі, дзе выкладаў беларускую мову й літаратуру. Ён прышчапіў мне любоў да беларушчыны, да беларускае мовы, літаратуры, гісторыі.»

Вінцэнт вучыцца ў Віленскай Беларускай Гімназіі й адначасна працуе начным сторажам у Віленскім Саюзе Каапэратываў. Натальля Арсеньнева ў адным сваім вершы – «Сябру юнацтва» гаворыць пра яго: «У шэрым фрэнчыку Вінцук...сябрук ціхі й працавіты». Натальля Арсеньнева, гэтаксама вучаніца Віленскай Беларускай Гімназіі, і Вінцэнт складаюць разам вучнёўскі часапіс, што паводле Вінцэнта называўся «Маладое жыцьцё». У вышэй успомненым вершы Натальля Арсеньнева кажа:

Вось –
Базыльянскія муры.
Сутоньне... недзе ў лістападзе...
А мы да позьняе пары
з Табою часапіс наш ладзім...

«Сябрук ціхі й працавіты» вучыцца інтэнсыўна, каб за год зрабіць дзьве клясы, бо ўтрымацца ў Вільні матарыяльна вельмі цяжка. Недаядае... А тут тата піша яму з хаты: – «Сынок, прыяжджай, некаму малаціць...» Старэйшых братоў вайна раскінула па сьвеце. У 1922 годзе Вінцэнт канчае гімназію.

Пра тыя часы вось як ён сам пасьля піша:

25-га Сакавіка ў Вільні

«У 1919 г. палякі акупуюць Заходнюю Беларусь. Ня гледзячы на шматабяцаную адозву Пілсудзкага да жыхароў быўшага Вялікага Княства Літоўскага, у якой белару-

сам запэўніваліся ўсе нацыянальныя свабоды й вольнасьці, палякі паступова прыступаюць да ліквідацыі беларускіх школ, як пачаткавых, так і сярэдніх. Першай ахвярай пала Беларуская Гімназія ў Будславе, а затым – Беларуская Гімназія ў Горадні й беларускія вучыцельскія сэмінарыі ў Барунах і Сьвіслачы. Даўжэйшы час толькі ўтрымоўваюцца беларускія гімназіі ў Вільні, Клецку, Радашкавічах і Наваградку.

Ня ўсе вучні з масы моладзі з зачыненай беларускай гімназіі ў Будславе пагаджаюцца з прымусовым перарваньнем навукі. Многія зь іх шукаюць прадаўжэньня навукі ў іншых сярэдніх школах. Некаторыя трапляюць у Віленскую Беларускую Гімназію ў 1920 г., а сярод іх і аўтар гэтых радкоў. Гімназія гэта тады была аднэй зь вялікшых школаў у Вільні. Пад кіраўніцтвам дырэктара М. Какановіча і такіх слаўных беларускіх людзей, як А. Луцкевіч і М. Гарэцкі, ксёндз Адам Станкевіч, І. Краскоўскі й іншых, вучыцца ня толькі беларуская моладзь, але й вялікі працэнт жыдоўскай, якая глядзела на польскую акупацыю, як на нешта часовае, пераходнае. Беларусы-ж былі пэўныя, што польская акупацыя будзе зьнесена ўжо хутка й што Вільня станецца другой сталіцай Беларусі. Пад кіраўніцтвам Ураду БНР, які быў тады ў саюзе з Летувай і знаходзіўся ў Коўне, беларусы рыхтаваліся да паўстаньня супраць палякаў, праводзячы па ўсім краі падпольную арганізацыю «Саюзу Вызваленьня Беларусі».

Уся акупаваная тэрыторыя была падзелена на раёны, на чале якіх стаялі камісары БНР, і на мясцох арганізавалі сетку сяброў успомненага саюзу. У Вільні ў гэту работу былі ўцягнуты й старэйшыя грамадзяне, і вучні старэйшых клясаў з Беларускай Гімназіі, і слухачы беларускіх вучыцельскіх курсаў. Вялікую дапамогу ў працы несьлі ўдзельнікі Слуцкага Паўстаньня, якія, пасьля ўпадку яго ў канцы 1920 году, невялікімі групкамі трапілі ў Вільню й знаходзілі прыпынак і беларускую работу ў Базыльянскіх мурох.

У скляпох Базыльянскіх муроў знаходзілася тайная друкарня, якая выдавала нелегальныя адозвы й брашуры, а спрытная моладзь пашырала іх па ўсёй Заходняй Беларусі й у Вільні, асабліва-ж сярод беларусаў, што трапілі ў польскае войска.

Кальпартаж сярод жаўнераў асабліва быў дагодны, калі яны цэлымі аддзеламі прыходзілі ў Сьвятадухаўскую

царкву на багаслужбы. Тады вучнёўская моладзь увівалася паміж імі, а нехта з вышыні званіцы ветрам рассыпаў афішы на галовы жаўнерскай масы, лучаючы на момант, калі яна выходзіла з царквы. Роля гэтая найчасьцей прыпадала маладому Случчаку Д-не.

Быў тады ў Вільні й асобны беларускі батальён, створаны на падставе паразумленьня беларускіх вайсковых кругоў з Пілсудзкім аб утварэньні асобнага беларускага войска, да арганізацыі якога прыступіла адумысловая Беларуская Вайсковая Камісія. Палякі вельмі хутка прыпынілі рост беларускіх аддзелаў, аднак ня сьмелі яшчэ расфармоўваць тых, што існавалі. Беларускі батальён браў удзел ува ўсіх беларускіх імпрэзах і жыў тымі-ж настроямі зьнясеньня польскай акупацыі. Пры такіх абставінах прышлося мне ў 1921 годзе прыняць удзел у святкаваньні 25-га Сакавіка ў Вільні.

Дзень 25-га Сакавіка быў вольным ад заняткаў як у гімназіі, так і ў існуючых тады ў Вільні сямёх беларускіх пачаткавых школах, ды ўва ўсіх беларускіх установах. Уся гімназія й школы, а таксама грамадзтва й беларускі батальён – праваслаўныя й каталікі, бяз розьніцы – каля дзесятай гадзіны раніцы накіроўваліся на ўрачыстую багаслужбу ў Сьвятадухаўскую праваслаўную царкву, якая была тады катэдральнай. Ужо сама гэта царква гаварыла аб славе Беларусі, бо пабудавана была ў чэсьць пераможнай бітвы з маскалямі пад Воршай у 1514 годзе. Урачыстую багаслужбу за Беларусь адпраўляў сам япіскап у асысьце сьвятароў, зь якіх адзін сказаў патрыятычнае казаньне. На заканчэньне архірэйскі хор сьпяваў «Многая лета».

Пасьля багаслужбы ўсе ўдзельнікі – школьнікі, грамадзтва, ды батальён – уфармаваліся на царкоўным пляцы і доўгай калёнай пайшлі вуліцамі Вільні да касьцёлу сьв. Мікалая на беларускую каталіцкую багаслужбу. Абавязковы ўдзел у гэтай багаслужбе быў толькі для каталікоў, але нікому з праваслаўных ня прыходзіла ў галаву застацца ззаду ўфармаванага маршу. Такім чынам на вуліцах Вільні адбывалася беларуская нацыянальная дэманстрацыя.

У касьцёле сьв. Мікалая служыў ксёндз Адам Станкевіч з удзелам беларускага касьцельнага хору, які цудоўным гімнам «Божа, што калісь народы пассобку падзяліў і казаў, каб народ кожны сваёй мовай гаварыў» узварушаў да глыбіні душы кожнага беларуса. Казаньне ксяндза Станкевіча, ведамага са свайго красамоўства, пакідала не-

забыўнае ўражаньне аб вялікім дні абвешчаньня незалежнасьці Беларусі.

Па каталіцкай багаслужбе ўсе ў прыкладным парадку вярталіся ў Базыльянскія муры, дзе знаходзілася Беларуская Гімназія, у залі якой адбывалася ўрачыстая акадэмія. Галоўную ролю гуляла тут вучнёўская моладзь. Акадэмію адчыніў дырэктар гімназіі. Віталі вучнёўскую моладзь з днём абвешчаньня незалежнасьці Беларусі розныя беларускія арганізацыі й інстытуцыі, а вучні ім адказвалі. Гімназіяльны хор сьпяваў беларускія песьні, пераплятаныя дэклямацыямі. Быў урачысты й патрыятычны настрой. Акадэмія закончылася беларускім нацыянальным гімнам «Не пагаснуць зоркі ў небе». Вучнёўскай моладзі абвешчана было аб вечарыне на вечар і аб тым, што старэйшыя клясы могуць выслаць свае дэлегацыі на вялікі канцэрт у Беларускім Клюбе.

Беларускі Клюб месьціўся на Біскупскай вуліцы каля Катэдральнай плошчы. Займаў ён цэлы паверх вялікага дому. Апрача некалькіх пакояў, меў вялікю канцэртную залю. Ужо тады ў Вільні назоў «Беларуская Хатка» выйшаў з моды. Беларускі Клюб у Вільні быў рэпрэзэнтацыйнай арганізацыяй і для сваіх і для чужых. Там можна было спаткацца ў вольны вячэрні час з паважнымі прадстаўнікамі беларускага грамадзтва, прагледзець рознамоўныя часапісы, знайсьці добрую кніжку, пачуць розныя навіны, паслухаць добры канцэрт ці пабачыць беларускую п'есу, пагуляць у більярд ці шахматы, і ўрэшце выпіць і смачна зьесьці. Клюб гэты лічыўся добрым месцам ня толькі ў беларусаў, але й у рознанацыянальнай віленскай інтэлігэнцыі – польскай, летувіскай, расейскай, жыдоўскай ці іншай.

Зразумелая рэч, што ў дзень беларускага нацыянальнага сьвята ў Беларускім Клюбе адбывалася вялікая урачыстасьць з удзелам вышэйшых кругоў віленскага грамадзтва.

Акадэмію адчыніў старшыня клюбу, прамаўлялі выдатныя беларускія дзеячы, далей ішлі прывітаньні прадстаўнікоў іншых нацыянальнасьцяў: летувісаў, жыдоў, украінцаў і нават палякаў – звычайна прадстаўнікоў паступовых палітычных польскіх груп. Канцэртны аддзел быў багаты і на высокім мастацкім узраўні. Галоўную ролю гулялі ў ім мастакі – драматург Франьцішак Аляхновіч, Пракулевічыха, сьпявачка Ганна Д. У. і хор Грыневіча.

Вечар канчаўся банкетам, на якім беларускае грамадзтва прымала сваіх прыяцеляў – прадстаўнікоў іншых народаў. Лік удзельнікаў банкету, хоць абмежаны спэцыяльнымі запросінамі, далёка перавышаў сотню. Вучням на банкет уступ быў забаронены.

Пасьля канцэрту ў Беларускім Клюбе мы, школьнікі, трапілі яшчэ на заканчэньне вучнёўскай вечарыны, дзе аж да поўначы моладзь выбівала свае такты, памятаючы, што да наступнага сьвята трэба будзе чакаць цэлы год.

Сьвяткаваньне 25-га Сакавіка ў Вільні пад польскай акупацыяй што год адбывалася зь нязьменным уздымам, ня гледзячы на стала ўзрастаючы ўціск з боку польскай улады. Мяняліся арганізацыйныя формы й людзі ў сувязі з прымусовай ліквідацыяй устаноўаў, аднак лік удзельнікаў сьвяткаваньняў ня толькі не памяншаўся, але нават стала ўзрастаў. На месца зьняволеных у вастрогах, ці выгнаных з краю, прыходзіла новая хваля людзей з палетак, займала месца выбыўшых і працягвала далей даўно распачатую справу, вялікую справу 25-га Сакавіка.»

Выбарчым інструктарам ў 1922 годзе

У сваіх успамінах пра ксяндза Віктара Шутовіча Вінцэнт Жук-Грышкевіч гаворыць пра свой удзел у выбарчай кампаніі ў польскі сойм у 1922 годзе. У 1964 годзе ён піша:

«....Лічу за вялікі гонар, што меў шчасьце спаткацца з гэтым вялікім сьвятаром, хоць два разы толькі. Было гэта ў 1922 годзе восеньню. Тады адбываліся першыя выбары ў польскі сойм. Тады была яшчэ такая-сякая свабода. Беларусы йшлі на выбары ў гэтак званым блёку нацыянальных меншасьцяў Польшчы пад нумарам 16. На маю долю выпала быць выбарчым інструктарам на Браслаўскі й Дзісьненьскі паветы ад Беларускага Выбарчага Камітэту ў Вільні. Я езьдзіў па мястэчках і вёсках Браслаўскага павету, зьбіраў сходы сялян і арганізаваў мясцовыя выбарчыя камітэты. Трапіў і ў Барадзенічы. Даведаўся,што тут быў ксёндз-беларус, зайшоў да яго. Ксяндза Віктара Шутовіча ня было дома. Я пагаварыў толькі зь ягонай сястрой, ад якой даведаўся, што ў нядзелю будзе фэст у адной з капліцаў Барадзеніцкай парафіі, на які зьбярэцца шмат народу. Я пастанавіў скарыстаць з гэтай нагоды. Тады ў памешканьні ксяндза Шутовіча мне кінулася ў вочы вельмі-ж скромная абстаноўка.

У нядзелю я прыехаў у капліцу й пасьля багаслужбы зрабіў мітынг. Было шмат сялян і яны слухалі мяне ўважна. Сярод сялянскай масы я заўважыў і ксяндза Шутовіча. Ён быў да канца сходу, і пры абмене думак і ў часе выбараў мясцовага выбарчага камітэту. Голасу ён не забіраў. Сход прайшоў гладка. Ніякай апазыцыі ня было. Пасьля сходу я падыйшоў да ксяндза Шутовіча й пазнаёміўся зь ім. Ён запрасіў мяне на гарбату. Вельмі цешыўся з беларускага выбарчага руху й запэўніваў мяне, што ў Браслаўскім павеце ліста нумар 16 атрымае шмат галасоў, бо тут многа сьвядомых беларусаў. Распытваўся пра мяне і Віленскую Беларускую Гімназію, якую я нядаўна скончыў. Радзіў мне дабівацца на ўнівэрсытэт, бо ў нас мала інтэлігэнцыі, казаў ён.

Ксёндз Шутовіч быў вельмі простым і непасрэдным у дачыненьнях з людзьмі. Ён дбаў пра сваіх вернікаў, і тыя любілі яго. З усімі справамі яны зьвярталіся да яго, і ён ім дапамагаў, як родны бацька. Таму шнур людзей у ягоным памешканьні,здавалася, ніколі не перарываўся. І тады ў часе нашай гутаркі чакала некалькі наведвальнікаў.

Другі раз я спаткаўся з ксяндзом Шутовічам на фэсьце ў Новым Пагосьце пасьля мітынгу. Там я меў даволі моцную перапалку з «вызваленцамі». Польская радыкальная партыя «Вызваленьне» падшывалася пад патрэбы беларусаў, нават іх агітатары прамаўлялі пабеларуску ды пашыралі сваю літаратуру ў беларускай мове. Мне было цяжка змагацца зь імі, але дапамаглі мясцовыя сьведамыя беларусы (асабліва адзін студэнт-мэдык, прозьвішча яго не магу прыпомніць) і я перамог. Мы выбралі мясцовы выбарчы камітэт, а «вызваленцы» паехалі зь нічым. Пасьля мітынгу я пайшоў да тутэйшага ксяндза. Пробашчам у Новым Пагосьце быў беларус (прозьвішча ня памятаю), ён прыняў мяне прыхільна. Неспадзявана я натрапіў на вялікую групу ксяндзоў-беларусаў, якія прыехалі на фэст. У сталовай, дзе яны сядзелі, я ня чуў іншай гутаркі, як толькі беларускую. Яны ведалі ўжо пра вынікі мітынгу й зацікавіліся мной. Абступілі мяне й распытваліся пра падрабязнасьці мітынгу. Быў тут і ксёндз Шутовіч. Мы сустрэліся зь ім як знаёмыя й ён мне даў якіясь даручэньні для сваёй сястры ці пляменьніцы ў Вільні,што была загадчыцай беларускага прытулку для дзяцей пры Беларускай Гімназіі. У гутарцы са мной ён наракаў на польскіх асаднікаў, якія былі вельмі агрэсыўныя да ўсяго белару-

скага й шмат прыкрасьцяў рабілі нашым сялянам, а нават ксяндзом-беларусам. Ён раіў мне высьцярагацца іх, бо могуць пабіць, пакалечыць і расправы на іх ня знойдзеш, казаў ён. На разьвітаньне раіў мне, каб я – малады й без дасьведчаньня – пры ўсёй маёй дзейнасьці, асабліва-ж палітычнай, не пераставаў быць хрысьціянінам.

У далейшым жыцьці мне не давялося спаткацца з ксяндзом Шутовічам. Мае жыцьцёвыя дарогі не скрыжаваліся больш з ягонымі. Але ягоная асоба запраўднага сьвятара, ягоныя словы да мяне моцна заселі ў маёй памяці. **В. Жук**»

(З артыкулу «Рэфлексыі на сьмерць ксяндза Віктара Шутовіча», «Бацькаўшчына», нр. 9-10 [623-624], 1964)

V. У ПРАЗЕ ЧЭСКАЙ

У гэтым самым 1922 годзе восеньню Вінцэнт Жук-Грышкевіч пасьля заканчэньня Віленскай Беларускай Гімназіі, ды пасьля працы ў перадвыбарчай кампаніі, разам зь іншымі сябрамі праз Летуву, дзе тады быў Урад БНР, з БНР-аўскім пашпартам едзе ў Прагу Чэскую вучыцца. Чаму аж у Прагу?! Таму, што на польскія ўнівэрсытэты абсальвэнтаў зь Віленскай Беларускай Гімназіі, ды наагул зь беларускіх гімназіяў ня прымалі, а ў Празе Чэскай, дзякуючы стараньням Ураду БНР, беларускім студэнтам можна было дастаць і стыпэндыі на студыі.

Граніцу пераходзілі хлапцы нелягальна. Ад польскае пагранічнае стражы яны ўсьцерагліся, а летувіская іх затрымала й арыштавала. Зрэштай яны ад яе не надта й хаваліся. Ім трэба было прадставіцца перад летувіскай уладай, дастацца да Ураду БНР, атрымаць пашпарты й лягальна ўжо ехаць у Чэхаславаччыну.

У Празе ў Чэхаславаччыне Вінцэнт Жук-Грышкевіч паступае на факультэт славянскай філялёгіі й гісторыі Праскага Унівэрсытэту Карла IV.

У сваіх успамінах пра Міколу Гарошку ён піша:

«...На пачатку 20-х гадоў у Прагу ехалі беларускія матурысты й студэнты пераважна з Заходняй Беларусі, у меншым ліку з Латвіі й з іншых краінаў, у якіх яны (пераважна старэйшыя студэнты) апынуліся ў сувязі з вайной і расейскай рэвалюцыяй. Справа ў тым, што Урад Беларускай Народнай Рэспублікі, які, згодна з умовай з Летувіскім Урадам, знаходзіўся тады ў Коўне, выстараўся ў Чэхаславацкага ўраду – які прызнаваў Беларускую Народную Рэспубліку – значную колькасьць стыпэндыяў для беларускіх студэнтаў, каб яны маглі атрымаць вышэйшую асьвету ў чэскіх вышэйшых школах. Для беларускай справы гэта мела вялікае значэньне, бо палякі ў Заходняй Беларусі былі супраць павялічаньня ліку беларускай інтэлігэнцыі й не прымалі матурыстаў зь беларускіх гімназіяў у польскія ўнівэрсытэты. Справа адукацыі беларускай моладзі ў Заходняй Беларусі камплікавалася тым больш, што польскія ўлады не давалі пашпартоў тым беларусам, што хацелі выехаць на навуку заграніцу. Але гэта ня стрымлівала нашых студэнтаў ад выезду ў Прагу. Яны ехалі не-



Вінцэнт Жук-Грышкевіч, Прага Чэская, 1925.

лягальна – «празь зялёную граніцу», хоць і ведалі, што за гэта іх пазбавяць польскага грамадзянства.

Справа ўладжаньня беларускіх студэнтаў у чэскіх вышэйшых школах была праведзена Урадам БНР ужо ў 1921 годзе. У Празе, дзе было шмат эмігранцкіх студэнтаў – расейскіх, украінскіх, беларускіх і іншых – быў створаны Чэска-Украінскі Камітэт для дапамогі ўкраінскім і беларускім студэнтам. Уладжаньнем беларускіх студэнтаў у чэскіх вышэйшых школах у Празе займаўся прадстаўнік Рады БНР на Чэхаславаччыну праф. Мікола Вяршынін.

Ужо ў 1921 годзе была там значная група беларускіх студэнтаў, якая складалася з тых, што ўжо былі на эміграа-

цыі як супрацоўнікі Ураду БНР, ды тыя, што восеньню 1921 году прыехалі зь Вільні, як Янка Станкевіч, Ігнат Дварчанін, Клімовіч, Сасноўскі, Бабровіч, Шах і іншыя. Да іх далучылася каля 20 асоб, што прыехалі ў Прагу восеньню 1922 г., сярод іх былі: Ул. Корж, Янка Геніюш, Макоўскі, Дзехцяроў, Ігнатовіч, Малевіч, аўтар гэтых радкоў (Вінцэнт Жук-Грышкевіч, – Р. Ж.-Г.) і іншыя.

У 1923 годзе прыехала яшчэ большая група, што складалася зь віленчукоў, наваградчан і дзьвіншчукоў. У гэтай групе былі: Мікола Гарошка, Аляксандар (бацька Алы Орса-Романо) і Пётра Орсы, тры браты Сакі, пяць студэнтак – Сазановіч, Краскоўская, Садоўская, Мілоўская, Вярнікоўская (зь Дзьвінску) – Сланеўская,Гузоўскі, Чарнэцкі, Мікола Ільяшэвіч, Аўген Дыліс, Лявон Рыдлеўскі, Мікола Абрамчык, Уладзімір Жылка, Лаўскі й іншыя. Сабралася ўжо паважная група беларускіх студэнтаў. Віленскія беларускія дзеячы, што выпраўлялі беларускіх студэнтаў на навуку ў Прагу,прасілі, каб яны памяталі, што ў першую чаргу ў Заходняй Беларусі патрэбны вучыцялі беларускіх гімназіяў, а наступна спэцыялісты сельскай і лясной гаспадаркі. І усё-ж бальшыня нашых студэнтаў у Празе пашла на тэхнічныя аддзелы й мэдыцыну.

Апрача Прагі, частка беларускіх студэнтаў вучылася ў Брне, Братыславе, Падэбрадах (Мікола Абрамчык) і Пшыбраме. Нават тым, што ня мелі матуры, знойдзены былі магчымасьці закончыць сярэднюю асьвету й сьціраваць іх у вышэйшыя школы.

Беларуская студэнцкая арганізацыя ў Празе мела ўжо каля сотні сяброў і з кожным годам узрастала. Гуло ў ёй, як у вульлі. На сходах разглядаліся ня толькі стыдэнцкія справы, але й палітычныя. Як толькі зьявіліся беларускія студэнты ў Празе, дык зараз жа знайшоўся сярод іх – быццам беларус з Эстоніі – савецкі палітрук Пётр Цьвяткоў, які адразу распачаў камуністычную работу. Штогод наведвала яго «сястра» з Эстоніі з новымі інструкцыямі. У першых гадох камуністычная прапаганда мела сярод нас слабы посьпех. Занадта сільная была нацыянальная сьведамасьць у бальшыні студэнтаў, што гуртаваліся у групах: з правейшым ухілам зь Янкам Станкевічам начале, і ў сялянскай групе з эсэраўскімі лідарамі – Грыбам і Мамонькам начале. Першая выдавала часопіс «Беларускі студэнт», другая «Перавясла». Хто скуль паходзіў, ня мела значэньня. Нацыянальна – апрача некулькіх камунізую-

чых і русафілаў – мы ўсе былі за БНР і сябравалі між сабою. Маімі блізкімі сябрамі былі віленчукі: Корж, Дыліс, Дварчанін, Геніюш і наваградчане: Мікола Гарошка, Лаўскі й браты Орсы. Спатыкаліся мы ў Студэнцкім Доме й у піўной, дзе зьбіраўся наш студэнцкі гурт на розныя сходы.

Мікола Гарошка быў добрым сябрам для ўсяе нацыянальна настроенай грамады: быў стойкім нацыянальна, вытрывалым, працавітым, паважным. Ня помню выпадку, каб Гарошка зь кім сварыўся, апрача з камуністамі, якім умеў добра адказаць на іхнюю прапаганду. У сяброўскай падтрымцы можна было на яго лічыць заўсёды. Ня курыў і рэдка калі выпіваў піва, таму й грошы ў яго мацней трымаліся, і ён ахвотна пазычаў іх сябром у патрэбе. Падтрымліваў таксама добрыя нацыянальныя пачыны.

У 1924 г. нашыя нацыянальныя актывісты навязалі лучнасьць зь беларускімі студэнцкімі арганізацыямі ў Вільні, Бэрліне, Парыжы й Рыме ды заснавалі Аб'яднаньне Беларускіх Студэнцкіх Арганізацыяў на Эўропу – АБСА. Тады-ж скантактаваліся з міжнароднай студэнцкай арганізацыяй CIE ды пачалі выдаваць свой бюлетэнь на французскай мове, у якім пісалі пра свае арганізацыі, працу ды ўціск беларусаў, асабліва моладзі й студэнтаў, польскімі ўладамі. Выслалі таксама дэлегата АБСА, Уладзімера Жылку, на міжнародны кангрэс CIE. (што адбываўся кожныя тры гады ў розных эўрапэйскіх сталіцах) у Варшаву. Гэтым дабіліся таго, што знайшлі сымпатыкаў сярод міжнароднага студэнцтва, а палякі пабачылі, што лепш мець беларускіх студэнтаў у Польшчы пад кантролем, чымся за граніцай і даваць ім магчымасьць рабіць прапаганду супраць Польшчы. Наша арганізацыйная дзейнасьць і прапаганда вымагалі шмат працы, высілкаў, зразуменьня яе патрэбы й грашовае падтрымкі.

З Коўна ў Прагу пераехаў Урад БНР разам з сваімі сем'ямі. Цяпер было ўжо больш старэйшага грамадзтва, якое вельмі цікавілася беларускім студэнцтвам. Частыя гутаркі мелі з намі Прэзыдэнт Крэчэўскі й сябры Ураду БНР уключна з др. Цьвікевічам, які прыяжджаў да нас са сваімі дакладамі з Бэрліна. Была створана тады супольная для студэнтаў і старэйшых грамадзян беларуская грамадзкая арганізацыя «Беларуская Грамада ў ЧСР». Агульныя сходы Грамады былі многалюдныя й ня раз вельмі шум-

ныя. Дзейнасьць палітрука Цьвяткова на працягу трох год спрычынілася да стварэньня групкі камунізуючых студэнтаў, якія сваімі правакацыйнымі выступленьнямі стараліся шкодзіць у працы Грамады. Ня раз трэба было іх абсаджваць. У гэткіх выпадках сябры з нацыянальных групаў хапалі іх за жэбры й садзілі на мейсца або больш упорыстых выкідалі на вуліцу. Цікава, што такі, здавалася-б, ціхмар Мікола Гарошка быў адным з першых, што рабіў парадак з камунізуючымі крыкунамі.

Чэхаславаччына давала беларускім студэнтам ня толькі фаховую вышэйшую асьвету, але, як адна з найбольш дэмакратычных краінаў Эўропы, дала нам добрую практычную грамадзкую й палітычную школу.» (З успамінаў В. Жук-Грышкевіча, прыватны архіў)

* * *

Чэхаславаччына з сваім кліматам і прамысловасьцьцю – фабрычным дымам – давала беларускім студэнтам й хваробу лёгкіх. Ведаю,што Вінцэнт, Мікола Абрамчык, Мікола Ільяшэвіч, Уладзімер Жылка між іншымі, былі ў Чэхаславаччыне ў санаторыі для тубэркулёзна хворых. Вінцэнту Жук-Грышкевічу й Міколу Абрамчыку эпізод у санаторыі скончыўся добра, а Мікола Ільяшэвіч, хоць тады падлячыўся, закончыў унівэрсытэт, вярнуўся у Вільню, дзе выкладаў у Віленскай Беларускай Гімназіі, перадчасна памёр у Вільні на тубэркулёз лёгкіх. Уладзімер Жылка памёр у 1933 годзе ў савецкай ссылцы.

Ды Залатая Прага, унівэрсытэт, студэнцкія арганізацыі ўзгадоўвалі грамадзкіх і палітычных дзеячоў, працаўнікоў беларускае культуры, лідараў беларускага руху. З гэтага дасканала здавалі сабе справу савецкія агенты, якія інфільтравалі беларускае студэнцкае асяродзьдзе й праводзілі ў ім сваю дэструктыўную работу. Нагаварвалі студэнтаў кідаць навуку й ехаць у Савецкі Саюз. Некаторыя паддаваліся гэтай агітацыі, тым больш, што гэта-ж былі 20-я гады, калі, як казалі, у Беларусі будаваўся «Беларускі Дом» – праводзілася беларусізацыя. І так нямала здольных, ідэйных, маладых беларускіх студэнтаў паехала з Прагі ў Савецкую Беларусь.

Вінцэнт Жук-Грышкевіч прадаўжаў студыі, і ў 1926 годзе закончыў Праскі Унівэрсытэт – курс гісторыі й славянскай філялёгіі, як вучыцель сярэдняй школы.

Пытаньне лёсу тых студэнтаў і абсальвэнтаў з Прагі, што паехалі ў Савецкую Беларусь,парушае Вінцэнт Жук-Грышкевіч у артыкуле «Толькі адзін аказаўся», надрукаваным у «Вестках з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 120, 1967. Тут падаю яго цэласьцьцю:

«Толькі адзін аказаўся

У 20-х гадох у Чэхаславаччыне, а перадусім у Празе, студыявала ў вышэйшых школах каля сотні беларускіх студэнтаў. Бальшыня зь іх прыехала сюды з Заходняй Беларусі, бо ў польскія ўнівэрсытэты іх ня прыймалі. Але былі там студэнты й з Латвіі, і з Савецкай Беларусі.

Яны мелі сваю нацыянальную арганізацыю, у якой вялася нацыянальна-грамадзкая праца, і выдавалі свае часопісы «Беларускі Студэнт» і «Перавясла».

Беларускім студэнтам у Чэхаславаччыне належацца шырэйшыя ўспаміны, якімі, спадзяёмся, займуцца тыя нялічныя калішнія студэнты ў Празе, што захаваліся пры жыцьці й знаходзяцца ў вольным сьвеце. У гэтай-жа кароткай зацемцы я хачу зьвярнуць увагу толькі на адно пытаньне: Што сталася з нашымі суродзічамі, якія ў 20-х гадох студыявалі ў вышэйшых школах у Чэхаславаччыне, а пазьней апынуліся ў Савецкім Саюзе. Іх мусіла-б быць некалькі дзесяткаў – добрых спэцыялістых розных прафэсіяў, як лекары, інжынеры, аграномы, лясьнікі й іншыя.

Справа ў тым, што сярод іх быў вялікі працэнт марксістых-леніністых па перакананьню. Беларускія студэнты студыявалі ў Чэхаславаччыне якраз тады, калі, як казалі, у Савецкай Беларусі будаваўся «Беларускі Дом» – нацыянальная дзяржаўнасьць, калі там праводзілася беларусізацыя дзяржаўнага апарату, калі ў Менск запрашалася беларуская інтэлігэнцыя з эміграцыі й Заходняй Беларусі. Нічога дзіўнага таму, што ў параўнаньні з нацыянальным прыгнётам беларусаў пад польскай акупацыяй Савецкая Беларусь выглядала тады вальнейшай і выклікала сымпатыю й прыхільнасьць усіх беларусаў, у тым ліку й беларускіх студэнтаў у Чэхаславаччыне.

Скарысталі з гэтага бальшавікі й пастараліся ўзяць пад свае ўплывы беларускіх студэнтаў у Празе. Ад самага пачатку існаваньня гэтай студэнцкай групы вялася сярод яе бальшавіцкая прапаганда й марксістоўскае ўзгадаваньне. Распачаў яго студэнт Пётра Цьвяткоў, які хоць пабела-

руску гаварыць ня ўмеў і гаварыў пераважна парасейску, называў сябе беларусам і прыехаў у Прагу адным зь першых, як казаў ён, з Эстоніі. Час ад часу адведвала яго «Сястра», якая зьяўлялася й так-жа нечакана зьнікала. З усяго відаць, што гэты Цьвяткоў быў адумыслова прысланым палітруком з заданьнем наварачваньня на камунізм беларускіх студэнтаў у Празе.

Трэба прызнаць, што работу сваю ён вёў спрытна й умела. Праз пару гадоў яму ўдалося звэрбаваць у свой Марксістоўскі Гурток амаль палавіну беларускай студэнцкай групы ў Празе. Пры канцы сваіх студыяў сябры гэтага Гуртка былі ўжо пераканаными марксістамі, або й камуністамі. Бальшыня зь іх пазьней апынулася ў Заходняй Беларусі ў КПЗБ, а некаторыя паехалі ў БССР беспасярэдня. Некаторыя ў часе працы ў КПЗБ былі выкрыты польскай паліцыяй, атрымалі судовыя прысуды й былі выменены бальшавікамі на польскіх вязьняў. Іншыя ўцякалі ў БССР ад пагражаючых рэпрэсыяў. І цікава, што па ўсіх тых, што трапілі ў БССР, і сьлед прастыў. Нічога не ўспамінала пра іх савецкая прэса, ня было пра іх нават ніякіх чутак. Як у ваду канулі.

Пасьля апошняй вайны ўсе калішнія беларускія студэнты з Прагі, што засталіся на Беларусі, апынуліся пад Саветамі. І вось прайшло ўжо 22 гады пасьля вайны, а дагэтуль праз усе гэтыя гады ня было пра іх ніякіх вестак, нават аб такіх актыўных, дзейных людзях, перакананых марксістых-леніністых, як Бабровіч, Верамей. Каўцэвіч, Муха, Шавейка й шмат іншых. З усіх іх аказаўся толькі адзін – М. Шыманка, які ў «Літаратуры й Мастацтве» нр. 13 (1272) з 14-га лютага 1967 году зьмясьціў зацемку «Вывучаюць Чэхі», у якой мова пра чэскае выданьне савецкай літаратуры й, між іншага, пра д-ра Міколу Ільяшэвіча й яго кніжку на чэскай мове «Беларусь і Беларусы». Гэта адзін выпадак, што ў Савецкай Беларусі адазваўся хтось з калішняй групы беларускіх студэнтаў у Чэхаславаччыне.

Што-ж сталася з рэштай? Чаму празь якіх больш як 30 год ня было пра нікога зь іх ніякіх вестак, апрача аднаго?

Праўдападобна й яны сталіся ахвярай бальшавіцкага тэрору й пагінулі. Відаць сыстэматычнае й плянавае вынішчэньне бальшавіцкай Масквой беларускае інтэлігэнцыі было праведзена й у вадносінах да калішніх беларускіх студэнтаў, што студыявалі ў Чэхаславаччыне. **Ж.**»

Пытаньне, што сталася з сям'ёй Жылкі, таго самага Уладзімера Жылкі, якога Аб'яднаньне Беларускіх Студэнцкіх Арганізацыяў на Эўропу (АБЦА) выслала з Прагі, як свайго дэлегата на Міжнародны Кангрэс Студэнтаў у Варшаву, В. Жук-Грышкевіч парушае ў артыкуле «Жылкава жонка 35 гадоў ня бачыла сваёй дачкі» («Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 107, 1966). Артыкул падаем у цэласьці:

«Жылкава жонка 35 гадоў ня бачыла сваёй дачкі

І ня ведала, што дачка яе жыве. Нешта падобнае можа быць толькі пад савецкім рэжымам. Сэнсацыю гэту падае «Літаратура й Мастацтва» ў нр. 89, з 5-га лістапада 1965 году. Праўду кажучы – на савецкія ўмовы гэта ніякая сэнсацыя, а вельмі частая зьява.

Як жа гэта сталася?

Ведамы беларускі паэта Уладзімер Жылка ў 20-х гадох вучыўся ў унівэрсытэце ў Празе, у Чэхаславаччыне і ў 1926 годзе вярнуўся ў сваю родную Случчыну. Гэта былі гады, калі, як казалі тады, у БССР будаваўся «Беларускі Дом» і праводзілася беларусізацыя. Кажная беларуская культурныя адзінка была там пажаданая, і Уладзімер Жылка хутка ўключыўся ў беларускае літаратурнае жыцьцё ў Менску. Там ён пазнаёміўся з маладой дзяўчынай, музыкай Рымай Маневіч. Ён ажаніўся зь ёй, а па якімсь часе нарадзілася ў іх дачушка Бэатрычэ, якую яны назвалі Бэатай, ці Атай. Аднак сямейнае шчасьце Жылкаў трывала нядоўга. Як нам ведама, хутка прышла навальніца калектывізацыі й змаганьня з нацдэмаўшчынай. Навальніца гэта зьнішчыла ўсё беларускае жывое й творчае. Не абмінула й Жылкаў. Яна ня толькі зруйнавала іх сямейнае шчасьце, але й самога паэта зьнішчыла.

Аўтар зацемкі ў «Літаратуры й Мастацтва» Уладзімер Мехаў замоўчвае калектывізацыю й змаганьне з нацдэмаўшчынай. Ён кажа толькі, што... «Лёс паэта, як многіх іншых яго равесьнікаў у літаратуры, склаўся трагічна. У 1930 годзе ён быў безпадстаўна арыштаваны й неўзабаве асланы. Даўняя хвароба ў выніку перажытага абвастрылася, і ў 1933 годзе паэт памёр».

З далейшага зьместу зацемкі Мехава даведваемся, што жонка Уладзімера Жылкі пастанавіла падзяліцца лёсам свайго мужа й паехала зь ім на высылку. Маленькую-ж дачушку завезла на Случчыну й прыпаручыла яе мужавай радні. З высылкі яна пасылала пасылкі для дзіцяці. Але праз якісь час усякая сувязь зь дзіцём перарвалася, а пазьней прышла вестка, што дзяўчынка загінула. Можна ўявіць сабе, колькі перажыла бедная жанчына, страціўшы мужа й адзінае дзіцё. Але была йшчэ маладая й мусіла думаць пра сваю будучыню.

Празь некалькі год яна другі раз выйшла замуж і пераехала ў Маскву. Ёй і ў галаву ня прыходзіла, што дачка яе можа жыць. А яна жыла й сталася настаўніцай у Полацку. Называлася толькі ня Бэатай Жылка, а Наталь-ляй Уладзіміраўнай Жылка-Лазаравай. Як адбылася гэта мэтамарфоза – аўтар зацемкі Мехаў нічога ня кажа. Праўдападобна радню Жылкі раскулачылі й зьнішчылі, а дачушку ягоную забралі ў дзетдом, ды зьмянілі яе вельміж несавецкае імя Бэатрычэ на больш панараўнае Наталь-ля. Зь бегам часу дзяўчынка прайшла савецкую школу, выросла й сталася настаўніцай.

Даведаўшыся, хто былі яе бацькі, Натальля Жылка пачала цікавіцца лёсам бацькавых твораў, а калі ўжо ў апошніх гадох можна было пра яго гаварыць і пісаць, пачала дасылаць у рэдакцыю «Літаратуры й мастацтва» ягоныя неапублікаваныя рукапісы. Адначасна ўсімі магчымымі шляхамі шукала сваю маці. Але ў савецкіх умовінах гэта справа была нялёгкая, тым больш, што й прозьвішча маці цяпер было іншае, ёй няведамае. Так магло-б стацца, што ніколі-б не адшукаліся маці з дачкой, каб не надарыўся шчасьлівы зьбег акалічнасьцяў.

Аўтар зацемкі Ўладзімер Мехаў і ягоны сябра паэта Хаім Мальцінскі, які, да рэчы, быў калісь знаёмы з Жылкам, прабывалі два гады таму на адпачынку ў вадным паўднёвым савецкім курортным горадзе. Там яны прыпадкова пазнаёміліся з «масквічкай» Рымай Маркаўнай, з гутаркі зь якой выявілася, што яна была жонкай паэты Ўладзімера Жылкі. Рыма Маркаўна дала ім цікавыя інфармацыі пра жыцьцё Ўладзімера Жылкі на высылцы й толькі мімалётна ўспомніла, што ў іх было дзіцё, але загінула. Гэтай мімалётнай заўвазе субяседнікі ня прыдалі ніякага значэньня. Пасьля адпачынку знаёмыя разьехаліся й знаёмства іх пачало выгасаць з памяці.

І трэба было другой шчасьлівай нагоды, каб маці з дачкой адшукаліся й спаткаліся. Адзін з полацкіх настаўнікаў быў на сэмінары ў Менску й пазнаёміўся з Хаімам Мальцінскім. У гутарцы зь ім сказаў між іншага, што сябруе з дачкой паэты Жылкі Натальляй. – «А я два гады таму сустракаўся зь ягонай жонкай на курорце,» – адказаў Хаім Мальцінскі, зусім ня думаючы, якое вялікае значэньне маюць ягоныя словы для полацкага настаўніка, а тым больш для ягонай сяброўкі Натальлі Жылкі. Ад гэтай гутаркі лёгка дайшлося да спатканьня маці з дачкой. Пры помачы сваіх знаёмых яны сьпісаліся з сабой, а пазьней Рыма Маркаўна прыехала ў Плацак, дзе й адбылося шчасьлівае спатканьне.

«Літаратура й мастацтва» падае з зацемкай здымку дзьвюх шчасьлівых жанчын, а таксама здымку маленькай Бэаты й здымку маладых яшчэ бацькоў яе. Здымкі гэтыя, як і сама зацемка ў «Літаратуры й мастацтве», вельмі вартасныя для літаратурных дасьледнікаў і для сяброў паэты, якія яшчэ засталіся пры жыцьці на бацькаўшчыне й у вольным сьвеце. **Ж.**»

VI. У ВІЛЬНІ ПАСЬЛЯ ПРАГІ

Ізноў Вільня, «Вільня родная, каханая, цябе залье крывіцкі рух!» Ізноў славутыя Базыльянскія муры. Але гэтым разам Вінцэнт Жук-Грышкевіч у Базыльянскіх мурах – у Віленскай Беларускай Гімназіі – ня вучань, а вучыцель – ад 1927 году выкладае гісторыю, беларускую мову й літаратуру. Апрача таго й студыюе, каб нострыфікаваць свой чэскі дыплём. І ў гадох 1931 – 1932 на Універсытэце Сьцяпана Батуры ў Вільні здаў экзамены за курс гісторыі й беларускай мовы і здабыў польскі дыплём прафэсара сярэдняй школы.

У гэтых гадох, недзе ў 1930-ым, Вінцэнт Жук-Грышкевіч ажаніўся з Ксеняй Лапіцкай. 9-га жнівеня 1931 году нарадзілася ў іх дачка. Ксеня, сястра пазьнейшага сьвятара Міколы Лапіцкага, была праваслаўная, Вінцэнт – ры-



Вучні 1-ай клясы Віленскай Беларускай Гімназіі (ня ўся кляса) – 1927/1928 школьны год з клясавым выхаваўцам – Вінцэнтам Жук-Грышкевічам у ягоным першым годзе працы ў гімназіі.

Зь лева на права: 1. Багдановіч (сын былога сэнатара), 2. Сіняўская, 3. Найдзюк Часлаў, 4. Рыбак, 5. Юсьціцкая (пляменьніца Арсеня Канчэўскага), 6. (?), 7. Астапчык (дачка грамадаўскага дзеяча зь Дзісьненшчыны).



Вінцэнт Жук-Грышкевіч, Вільня, 1930.

макаталік. Дачушку вырашылі ахрысьціць уніяткай. Хрышчонымі бацькамі былі: Валерыя й Эдвард Будзькі, Радаслаў ды Антаніна Астроўскія і Надзея ды Язэп Шнаркевічы. Хрысьціны адбыліся ўва ўніяцкай царкве ў Вільні. Дзяўчынцы далі імя Рагнеда, Ірэна. (Паводле расказу Людовікі Будзька-Бяленіс).

Апрача ў Віленскай Беларускай Гімназіі, Вінцэнт Жук-Грышкевіч выкладае беларускую мову ў праваслаўнай Духоўнай Сэмінарыі і вядзе лектарат беларускай мовы ў Школе Палітычных Навукаў у Вільні.

Побач працы ў школах ён увесь час дзейны ў беларускім грамадзкім і культурным жыцьці. Як сам успамінае:

«Калі я вярнуўся з Прагі ў 1927 годзе, сам стаўся настаўнікам у гімназіі ды браў чынны ўдзел у беларускім грамадзкім жыцьці, Антон Луцкевіч быў маім вучыцелем



З Будслаўскаю моладзьдзю – Каляднiца, 1935. В. Жук-Грышкевiч сядзiць на крэсьле зь левага боку між дзяўчатамі.


у грамадзкай працы. Ён быў фактычным кіраўніком беларускага руху ў Заходняй Беларусі пад Польшчай. Ня было ніводнай важнейшай справы ў беларускім жыцьці, у якой бы ён ня браў удзелу.» Далей ён гаворыць пра стварэньне братамі Луцкевічамі «сталага палітычнага цэнтру» – «стрыжня вызвольнага беларускага руху». «Гэты стрыжань існаваў ад 1903 да 1939 году. Дзякуючы яму – гэтаму палітычнаму асяродку – беларускі рух мог разьвівацца й сканцэнтравацца ідэйна ў Акце 25-га Сакавіка.

За польскіх часоў у гэты ‹стрыжань› – палітычны цэнтр – апрача Антона Луцкевіча ўвайходзілі: інж. Трэпка, сэнатар Уласаў, пасьля Тарашкевіч і Рак-Міхайлоўскі... ды іншыя людзі зь Вільні й правінцыі. Дзякуючы гэтаму арганізацыйнаму стрыжню ніводная дзялянка жыцьця, ніводная галіна дзейнасьці ў нашым змаганьні нацыянальным, палітычным і культурным ня была занядбаная, ён дбаў пра ўвесь беларускі рух, пра ўсе яго патрэбы... Калі па павароце з Прагі я пачаў браць удзел у беларускім грамадзкім і палітычным жыцьці ў Вільні, я таксама ўвайшоў у гэты стрыжань.»


Быў Вінцэнт Жук-Грышкевіч сябрам «Беларускага Навуковага Таварыства» ў Вільні, «Беларускага Вучыцель-

скага Саюзу» й «Таварыства Беларускай Школы – ТБШ», супрацоўнічаў у часопісах й газэтах у Вільні: «Беларуская Справа», «Наша Справа», «Народны Звон», «Сям'я й Школа», «Беларускі Звон» і «Маладая Беларусь».

У 1967 г. у часе Беларускага Тыдня на ЭКСПО ў Мантрэалі Вінцэнт Жук-Грышкевіч пры нагодзе запытаўся ў Максіма Танка: «Як Вы маглі пісаць, што «Маладая Беларусь» выдавалася за польскія грошы? Вы-ж ведаеце, як гэта было...» – «А хто Вам казаў, – гаворыць Танк, – што гэта я пісаў?» Максіма Танка хуценька ад нас забралі. Станіслаў Станкевіч пасьпеў толькі сказаць, пасьміхаючыся, да Танка – «Ну, браток...» Яны-ж былі сябрамі ў Вільні....



Рагнеда, дачка Вінцэнта Жук-Грышкевіча, 1936.



Вінцэнт Жук-Грышкевіч з дачкой Рагнедай у Рабцы, 1936.

VII. У САВЕЦКІХ ТУРМАХ І ЛЯГЕРОХ

УСПАМІНЫ
Др. В. Жук-Грышкевіч. 27.04.1976

У верасьні 1939 году, колькі дзён пасьля акупацыі чырвонаю арміяй Вільні, на паседжаньні пэдагагічнае рады Віленскае Беларускае Гімназіі, у якой я быў тады настаўнікам, пасулілі мне ўзяцца за працу рэдактара-стылісты ў газэце «Віленская праўда». Газэта пачынала выходзіць, але не ставала ў рэдакцыі працаўнікоў зь ведаю беларускае мовы. Рэдакцыя газэты мясьцілася там, дзе пры паляках была рэдакцыя газэты «Кур'ер віленьскі». Із знаёмых працаваў у рэдакцыі й Макар Краўцоў-Косьцевіч.

Ды папрацаваць у газэце доўга не давялося. 30 верасьня, між гадзінамі 11-12 начы, у маёй кватэры на вуліцы Тызэнгаўза зьявіліся агенты НКВД і я быў арыштаваны. Трасьлі кватэру гадзіны тры. Забралі ўсю карэспандэнцыю, фатаграфіі, некаторыя кніжкі мае бібліятэкі. Калі вобыск скончыўся, пасадзілі мяне ў «чорны воран», дзе ўжо сядзеў рэдактар жыдоўскае віленскае газэты «Вільнэр Ток» – Рэйзін.

Завязьлі нас у Лукіскую турму, дзе я праседзіў тры тыдні без ніякіх допытаў. Камэры былі бітком набітыя арыштаванымі. Уначы за сьценамі чуваць былі стогны, крыкі, енкі зьбіваных вязьняў. На панадворку турмы блізу ня сьціхаў лязгат танку, які пускалі, каб стрэлы расстрэльваных ды крыкі й енкі катаваных не пачулі за сьценамі турмы людзі ў месьце. Усю ноч у камэры гарэла лямпачка, цяжка было заснуць; днём-жа прылегчы было забаронена. На праходку выводзілі рэдка, кармілі вельмі блага, пераважна «баландой», але усё-ж лусту хлеба давалі што дзень. На вокнах камэры былі паўстаўляныя засланкі.

Калі Вільню балышавікі перадавалі Летуве, вязьняў з турмы НКВД забрала ды павязла цягнікамі ў беластоцкую турму. З Лукіскае турмы на станцыю везьлі вязьняў праз места грузавікамі. На вуліцы бачыў праф. Эрэнкройца й ксяндзоў. На станцыі ўсіх вязьняў сабралі разам. Можна было спаткаць знаёмых і гаварыць зь імі. Тут я спаткаў інж. Антона Нэканду-Трэпку, знаёмых палякаў і жыдоў

(Завадзкія браты мелі магазын вопраткі на Вялікай вуліцы). У беластоцкай турме ў камэрах была яшчэ большая цесната. Класьціся спаць можна было толькі на зьмену – на падлозе не хапала месца. Марылі нас тут голадам, хлеба давалі вельмі мала, кармілі з колькіх крупінак баландой. Вязьні пачалі хутка пухнуць з голаду.

Зь віленскіх беларусаў у турме ў Беластоку давялося мне бачыць інж. Антона Нэканду-Трэпку, а Віктар Астроўскі, сын Астроўскага Радаслава, сядзеў у адной камэры са мной, гэтаксама й расеец Уладзіміраў. Ніякіх кантактаў з вонкавым сьветам тут ня было. І тут ніякіх допытаў не праводзілі.

Пасьля трох тыдняў перавязьлі нас таварнымі цягнікамі ў турму ў Вялейцы. І тут была яшчэ горшая цесната, голад з той самай баландой, ніякае сувязі з роднымі, ніякіх перадачаў. На праходку выводзілі толькі рэдчас. З знаёмых тут сядзелі тыя-ж Нэканда-Трэпка ды Віктар Астроўскі, Лекант, Антон Луцкевіч.

У Вялейцы па нейкім часе пачалі ўжо выклікаць на допыты, заўсёды ўначы. Допыты праводзілі розныя сьледчыя. Допыты ў маім выпадку былі накіраваныя на тое, каб «прызнаўся» ды падпісаў тое, што я «шпіён», вёў шпіянаж супраць СССР.

У 1926 годзе Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада выдавала ў Вільні побач іншых газэтаў і газэту лацінь-ніцай «Беларускі Звон». У рэдакцыі гэтае газэты працаваў і я. Падпісваў газэту як «зыцрэдактар» мой будслаўскі аднаместачковец Казюк Ханяўка. Калі пасьля трох канфіскатаў газэты «зыцрэдактару» пагражаў арышт, суд і турма, кіраўнікі Грамады перакінулі Казюка Ханяўку спосабам нелягальным праз мяжу ў БССР.

З маіх допытаў я зар'ентаваўся, што ў часе партыйнага тэрору Сталінскае пары К. Ханяўку ў БССР арыштавалі, зьвінавацілі ў шпіянажы ды відавочна й зьнішчылі, бо ўсякі сьлед па ім загінуў. Мае допыты вяліся ў тым кірунку, каб я прызнаўся, што гэта я паслаў яго, як сваяго блізкага знаёмага, у БССР для шпіянажу ў Савецкім Саюзе.

Выклікалі мяне на допыты шмат разоў. Вяліся допыты вельмі брутальна, білі па твары, па галаве, прыстаўлялі да галавы рэвольвэр. У часе аднаго з гэткіх допытаў мяне зьбілі так, што я самлеў, няпрытомнага мяне занесьлі ў карцэр, дзе трымалі тры дні. Гэта была вельмі цяжкая зіма 1939-40 году, а карцэр не аграваліі.

Паколькі я ў часе ўсіх допытаў на адрэз адмаўляўся падпісваць пратакол сьледзтва, у якім было ўпісана маё быццам прызнаньне ў шпіянажы, нейкі час пакінулі мяне ў супакоі. Пасьля-ж мяне йзноў выклікалі, але гэтым разам быў іншы сьледчы, як папярэднія, ён вёў гутарку зусім іншым тонам, навет ветліва, а пра закіды мне ў шпіянажы й зусім не згадваў.

Цяпер сьледчы вінаваціў мяне толькі ў тым, што я працаваў у беларускіх «буржуазных» установах і арганізацыях, у гэтым ліку настаўнікам у Віленскай Беларускай Гімназіі, у Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамадзе, у беларускіх газэтах і г. п. Калі я зьвярнуў сьледчаму ўвагу, што Грамада знаходзілася пад кіраўніцтвам Камуністычнай Партыі, на гэта ён адказаў, што Грамаду апанавалі варожыя Савецкаму Саюзу беларускія нацыяналісты й яна была антысавецкаю.

Паколькі я ня мог адмовіць факту, што працаваў і быў актыўным у беларускіх арганізацыях і быў беларускім настаўнікам, пратакол допытаў гэтым разам я падпісаў.

27.XII.1939 г. мяне, А. Нэканду-Трэпку, др. Малафеева ды чалавек 20 іншых вязьняў павязьлі зь Вялейкі цягніком да Менску ды пасадзілі ў старую турму. Там было ня гэтак цесна, як у Вялейцы, кармілі крыху лепш. Выясьнілася, што ў Менск нас прывязьлі для правядзеньня дакумэнтацыі: фатаграфавалі, рабілі водціскі пальцаў, афармлялі нейкія дакумэнты. Калі пасьля трох дзён вязьлі нас назад у Вялейку й мы затрымаліся на Вялейскай станцыі, у пачакальні станцыі здалёку давялося мне бачыць маю жонку. Яна мяне не заўважыла.

25-га Сакавіка ў савецкай турме

Дзьверы камэры раптам адчыніліся, вартаўнікі ўкінулі, як калоду, чалавечае цела й зьніклі за зьвяканьнем замка й ключоў. Напалоханая цішыня зноў разьляглася на воддых, хоць праз прамугі закратаваных і заслоненых вакон пачала ўжо прыскаць сакавіковая раніца, кідаючы шэры водблеск на затхлую ад людзкога згушчэньня камэру і вырысоўваючы па куткох панурыя кантуры вязьняў, што тырчэлі з покату целаў. І яны былі спавітыя начной цішынёй і змогай лёсу, хоць фактычна й ня спалі, бо чакалі, калі прыдзе іх чарга на роскаш ляжаньня на тым

малым лапіку турэмнай падлогі, які на дзьве гадзіны займалі іх сябры.

Кінутае цела глуха шлёпнула па сьпячых на падлозе і лягло на іх нярухома, як-бы прыклеілася. Здавалася, што ўсе яны ўжо трупы: і тыя, што моцна спалі, трымаючы на сабе няпрошанае цела, і нават тыя, што стоячы ці седзячы чакалі на сваю чаргу палажыцца. Так было ўсё зможанае, застылае, нярухомае ў гэтай несамавітай цішыні зьбітай людзкой масы.

Але вось, як глухі водгалас, як гукавы цень пачуўся стогн – «вады»... Хоць ён быў такі ціхі, так мала чутны й прыкметны – заварушыў кантурамі стоячых і ляжачых, яны пачалі прыбліжацца да ўкінутага цела, абступілі яго, знайшлі для яго месца, палажылі на звольненым куску падлогі і нават пад галаву палажыць нешта знайшлі.

«Пііць...» – праскрыпелі зноў сасмагшыя й выкрыўленыя ад болю вусны. Гэты стогн-скрып падзеіў мацней ад усякага загаду. Адразу знайшлася конаўка, прайшла праз ланцуг рук і ўвачавідкі апынулася пры вуснах таго, што стагнаў. Ён пацягнуў некалькі глыткоў і пачаў ачуньваць. Яго падбітыя вочы абвілі поглядам стоячых кругом сяброў, як-бы шукаючы на кім спыніцца, а твар, хоць зьбіты й акрываўлены, пачаў набіраць азнак жыцьця. Гэта быў беларускі вучыцель Кастусь В. Палякі выкінулі яго ў сваім часе са школы і ён праз доўгія гады нідзе ня мог знайсьці сабе месца. А як прыйшлі бальшавікі, дык арыштавалі яго аднаго зь першых і вось цяпер мучылі на допытах.

Што ён быў зьбіты да паўсьмерці – нікога ня дзівіла. Прайшло ўжо трое сутак, як яго былі забраўшы з камэры. Яго катавалі і ў карцэры, і ў час допытаў. Так паступалі «сьледавацелі» з кожным вязьнем, якога бралі на допыт. Такія ўжо парадкі былі ў Вялейскай турме, якая тады месьціла ў сваіх мурох больш 1000 людзей.

Там, дзе за польскіх часоў саджалі 20 вязьняў, цяпер іх было 60, або й 80. Гэта быў сакавік 1940 году, калі НКВД у «асвабожджанай» Заходняй Беларусі распасьцірала сваё панаваньне над усімі людзьмі і стрыгла іх безапэляцыйна пад сваю машынку, падцягваючы розныя катэгорыі пад адпаведны нумар. Адных забралі адразу пасьля прыходу й даўно згладзілі са сьвету, як найбольш небясьпечных. Другіх з гэтай катэгорыі трымалі жывымі ў сваіх мучэльнях толькі дзеля таго, што спадзяваліся павялічыць далей-

шы лік ахвяр. Трэціх, хоць нічым не вінаватых, трэба было ізаляваць, бо гэта былі людзі думаючыя – інтэлігэнцыя з асьветай, або мясцовы вясковы ці гарадзкі актыў.

Яны сваім здаровым розумам і разважаньнямі маглі ўплынуць на акружэньне й ужо дзеля гэтага іх трэба было ізаляваць. Яны звычайна мусілі з год пасядзець у турме, прайсьці сэрыю допытаў, а пазьней «тройка НКВД» засуджвала іх на павольнае кананьне пры цяжкіх работах у савецкіх лягерох. Да гэтай катэгорыі далучалі таксама ўсіх тых, хто быў на службе цывільнай ці вайсковай пры паляках. Апрача таго трэба было-ж набраць на розныя лягерныя прадпрыемствы і «спецперасяленцаў». Усю тут пералічаную масу людзей мусіла перапусьціць машына савецкай чысткі, гэта была першая перадумова прылучэньня новай краіны да савецкага «раю». Дык нічога дзіўнага, што ўсе турмы былі перапоўнены да адказу. У камэрах ня толькі ня было месца ўсім дзе легчы, але й сесьці на падлозе ня было дзе, а спаць прыходзілася па чарзе.

Прабываньне ў камэры ў такіх варунках, плюс вельмі благое аджыўляньне, страшэнна падрывалі сілы вязьняў, і яны хадзілі як цені. Найгоршым няшчасьцем, аднак, былі допыты, бо яны адбываліся пераважна начамі на працягу цэлых тыдняў з перадышкай ці безь яе і то з усімі атрыбутамі савецкіх паліцыйных маральных і фізычных мукаў. Ахвяра, забраная на ноч на допыт, укідвалася ў камэру чуць жывая над раньнем, як гэта было і з нашым Кастусём.

Ён небарака вадзіў вачамі па ўсіх нас – беларусах, што абкладалі яго мокрымі ручнікамі, каб супакоіць ці палегчыць болі; здавалася, што ён хоча выбраць кагось і сказаць яму нешта вельмі важнае. Грамадка наша складалася зь некалькіх чалавек: апрача мяне быў тут старшыня Гуртка Беларускага Інстытуту Гаспадаркі й Культуры з К. Цімафей, два грамадаўцы зь мясцовай акругі – Ш. і З., вучань Віленскай тэхнічнай школы С. і малады асьвечаны земляроб А. У нашай камэры было шмат беларусаў, асабліва сялян, але пералічаная тут група месьцілася разам і была найболш зжытая. Мы чакалі ў напружаньні, да каго Кастусь зьвернецца й што скажа. Ужо згаварыліся, каб адыйсьціся на хвіліну, пакінуўшы пры хворым таго, да каго ён мае давер. Але згаворы аказаліся лішнімі. Кастусь яшчэ раз правёў па ўсіх нас вачыма й тады вымавіў ціха, але выразна: «дваццаць пяць...» Мы задумаліся, бо ня ведалі як гэта зразумець, што знача гэтых «двац-

цаць пяць»? Урэшце пачалі пытаць, што ён праз гэта хоча сказаць. Кастусь ляжаў нерухома з заплюснутымі вачыма, як самлелы, а мы стаялі, са зьдзіўленьнем уляпіўшыся ў яго вачыма. Урэшце, не адчыняючы вочы, ён прамовіў зноў: – Я не дзіўлюся, што вы ня ведаеце, аб што ходзіць, бо ў гэтым пекле можна забыцца аб усім, асабліва-ж калі ніхто ня сочыць за календаром. Як мяне цягнулі з допытаў, на нас наткнуўся зьнянацку з-за вугла калідору студэнт Б. зь Вільні з канвоем. Яго зараз-жа адвярнулі да сьцяны тварам, але ён усё-ж пасьпеў сказаць «дваццаць пяць» і я гэта выразна пачуў, я дагадаўся, што хацеў сказаць студэнт Б. Я пэўны, што й вы дагадаецеся, як падумаеце.

Фактычна ня трэба было й думаць. Некаторыя з нас і так добра ведалі, што на наступны дзень прыпадае 25 Сакавіка, а тыя, што забыліся, адразу прыпомнілі пры ўспамінах аб календары. Непаразуменьне-ж адразу вынікла з тэй прычыны, што нікому й у галаву ня прышло, што гэты да непрытомнасьці скатаваны беларус здольны думаць у такім стане аб 25-м Сакавіку. Таму цяпер, калі ўсім стала ясна, аб што ходзіць, на гэтага маладога чалавека пачалі мы глядзець, як на сьвятога, як на нейкі сымбаль. Ён быў амаль паміраючы, але ў ім жыў дух волата! Яго нацыянальнага ідэалу ня выбілі з галавы й сэрца ні турма, ні голад, ні катаваньне сталінскіх апрычнікаў. Трэба было дзівіцца, як мог вытрымаць гэты малы й хударлявы хлапец столькі часу галадаморства й катаваньня. Хіба таму толькі, што ў гэтым вымучаным целеце жыў вешчы дух Вялікага Усяслава Чарадзея, Скарыны й Кастуся Каліноўскага, ягонага цёскі... І таму ў нашых вачох тады ён вырас да велічы героя, мучаніка за Бацькаўшчыну. І нам стала й балюча, і сумна, і радасна адначасна, бо здалі сабе справу з таго, што такіх Кастусёў цяпер памірае шмат – сотні, тысячы... Паміраюць у мурох, замест таго, каб жыць і працаваць для Бацькаўшчыны...

* * *

На другі дзень наша група сядзела амаль цэлы дзень каля Кастуся. Ён чуўся значна лепш, усьміхаўся й браў удзел у гутарках. Гутарылі мы паўголасам, дзелячыся ўражаньнямі й успамінамі, як праводзілася сьвяткаваньне 25-га Сакавіка ў розных мясцовасьцях і асяродках. Разважалі

над тым, чаму Акту 25-га Сакавіка не ўдалося правесьці ў жыцьцё. Ня гледзячы на панурыя абставіны, на душы неяк было весялей, бо ўрачысты дзень прыпамінаў нам, што мы не адны, што мы частка вялікага Беларускага Народу.

Наш пагодны настрой дзеіў нейкім флюідам і на цэлую камэру. Усе нашы сяляне-вязьні даведаліся аб беларускім нацыянальным сьвяце, хоць падыходзілі да нас толькі некаторыя зь іх. Відаць ведалі аб гэтым і іншанацыянальныя групы. Неяк нечакана падыйшоў да нас былы рэдактар жыдоўскай газэты Р. і, не называючы ўсё іменьнямі, улучыў сказаць асьцярожненька, што ён ведае, што мы сягоньня перажываем, глыбока нам спачувае й ад душы жадае, каб жаданьні нашы зьдзейсьніліся. Пазьней падышоў да нас і паляк – б. віленскі судзьдзя Н., які ў гутарцы вельмі недвузначна таксама сказаў нам свае пажаданьні. Нават не абмінуў нас і заўсёды сымпатычны паручнік рэзэрвіста З. – садавод па фаху, які марыў увесь час аб тым, каб папасьці ў Канаду й спакойна гадаваць добрыя яблыкі. Ён заўсёды гаварыў з намі пабеларуску і, здаецца, больш чуўся беларусам чым палякам.

Не абыйшлося без надзвычайных праяў і вонках нашай камэры. Ужо ў часе ранішняй прагулкі мы заўважылі на сьценах у розных мясцох напісы алоўкам лічбу «25» і літару «С». Пры набліжэньні груп з розных камэраў чуліся словы «дваццаць пяць» зьнячэўку, хоць гэтыя групы адна другую й ня бачылі. І нічога дзіўнага. Хіба ня было тады такой камэры ў вялікай турме, у якой-бы не сядзелі беларусы. Супраць нашай камэры сядзеў інжынер Б. зь некалькімі людзьмі, побач зь ім наш стары й заслужаны дзеяч А. Нэканда-Трэпка (ён ужо напэўна ня жыве), праз камэру за імі сядзелі К., У. – і так па ўсёй турме. Былі нават і такія, што хацелі праз вакно вывесіць напісаную на паперы вялікую лічбу 25, аднак ім адрадзілі гэта, баючыся якойсь правакацыі й непатрэбных ахвяр. Затое паўтараньне нявінных слоў «25» нікога ня разіла і ня ўзбуджала ніякага падазрэньня й кожны беларус чуў яго ў гэты дзень ня раз.

«25» была для нас доўга магічнай лічбай. Яна нас падтрымоўвала на духу, лучыла ўсіх беларусаў у адну сям'ю, прыпамінала аб тым, што сядзім мы не прыпадкова.

* * *

Вясной 1940 году мяне зь іншымі вязьнямі пасадзілі ў цягнік і павязьлі ў кірунку Полацка. Калі цягнік затрымаўся на станцыі майго роднага Будслава, я бачыў здалёк, як праходзілі знаёмыя мне будслаўскія жанчыны й дзяўчаты.

Я напісаў картачку,і калі цягнік крануўся, выкінуў яе з вагону пры праезьдзе чыгункі праз дарогу, што ідзе да Мядзела (каля Лабуця). На картцы напісаў: «Арыштаваны, сядзеў у Вялейцы, чуюся добра, не вінаваты, спадзяюся, што мяне звольняць, вязуць ня ведаю куды.». Як пазьней даведаўся, картку гэту знайшлі ды перадалі майму брату.

У Полацку нас выгрузілі з вагонаў ды ізноў загналі ў турму, у якой пратрымалі зь месяц. Тут я сустрэўся зь Пётрам Сычом і былым вучнем Радашковіцкае Беларускае Гімназіі Паўлам Асіповічам. Пасьля трох тыдняў выклікалі нас усіх разам ды прачыталі нашыя «прыгаворы». У маім «прыгаворы» было сказана, што НКВД разгледзіла справу й праведзенае сьледзтва выявіла, што я «социяльно опасный элемент» ды вораг народу й савецкае ўлады, і дзеля гэтага прысуджаны на 8 гадоў «исправительных трудовых лагерей». Пасьля гэтага загадалі падпісацца аб тым, што прыгавор быў адчытаны, ды павялі ўжо ў іншую камэру.

Напрамак – Варкута

Пры канцы жнівеня 1940 году нас, ужо «засуджаных», павязьлі з Полацку цягніком да Воршы. У Воршу мы прыехалі ў той дзень, калі савецкія газэты паведамлялі пра забойства Троцкага. Аб гэтым крычалі прадаўцы газэтаў. У Воршы за колькі дзён быў сфармаваны вялізны транспарт вязьняў, моцна абстаўлены аховаю НКВД, на вагонах былі пастаўленыя кулямёты. Вязьлі нас праз Віцебск, Вялікія Лукі, Валагду, Яраслаўль, Кіраў да Котласа, што на Паўночнай Дзьвіне.

У Котлас мы прыехалі напачатку верасьня 1940 г., пасадзілі нас у перахадны лягер. Тут былі блатныя, яны пробвалі нас абрабаваць, але мы абараніліся доскамі. У лягеры давалі баланду, але шмат у каго ня было ні лыжак, ні місак, ні кубкаў, ні нейкіх бляшанак. Некаторыя чэрпалі баланду казыркамі шапак.

Хутка павязьлі цягніком далей, кармілі ў дарозе маленькай салонай рыбкай камсой, давалі бахонак хлеба на

ўвесь вагон, у якім было набіта больш паўсотні вязьняў. Ніякай гарачай стравы.

Па нейкім часе перасадзілі нас зь цягніка ў вялікую баржу. Было на баржы каля 1500 вязьняў, «зэка». Баржу цягнуў невялікі параходзік. Вязьлі баржаю з тыдзень па рацэ Вычагдзе пры ейным утоку ў Паўночную Дзьвіну. Жывуць там людзі фінскага племя Комі. Маюць вялікія чыстыя хаты. Будавалася тады з Котласа да Варкуты чыгунка, бо ў Варкуце дабываўся вугаль ды розныя мінэралы.

Калі высадзілі з баржы, дзень-два гналі нас пешкі. Пасьля дзьве-тры станцыі правезьлі чыгункай, і дзе чыгунка канчалася, там высадзілі. Там мы чакалі, пакуль нас забяруць на «ляжнёўку». Гэта высланая расьпілаванымі бярвеньнямі маставая. Па «ляжнёўцы» на грузавіках адбываўся падвоз людзей, прадуктаў, снасьці, матар'ялаў. Вязьлі нас у сьнег, вецяр, холад. Меў я тады яшчэ хутраную куртку, а на галаве капялюш, зь якім мяне забралі пры арышце з дому.

З грузавікоў нас ськінулі ў тайзе на сьнег, пад сасну. Ніякіх баракаў ці іншага прыстанішча. «Вохра» – наша «ахрана», – засталася на грузавіку. На грузавіку была й печка, на якой варылі нам баланду. Каб яе есьці, вязьні парабілі сабе з кары дрэва конаўкі, міскі. Нанач мы ськінулі сабе з лапак шалаш.

Усе вязьні мае брыгады былі з «вызваленых» ад Польшчы земляў – беларусы, украінцы, палякі. Рэдка здараліся жыды. Толькі ў часе работы давалі нам пілы, сякеры. Мы сьсякалі дрэвы, церабілі іх, бярвеньні знасілі на плячох ды пачалі будаваць сабе баракі. Дзеля благое ежы й недаяданьня вязьні хутка пачалі хварэць і слабець. Дзеля авітамінозы блізу ўсіх мучыла ганячка, шмат каго гнала крывёю. Ня было ніякіх дактароў, ніякае лекарскае помачы. Быў санітар «медпош» у будцы, але ніякіх лекаў ён не даваў, бо ня меў.

Калі на другім месяцы працы пачало гнаць крывёю й мяне, нясучы бервяно я самлеў, ляжаў бяз памяці. Занясьлі мяне на санітарны пункт, на якім прабыў каля тыдня. Час-ад-часу пры санітарным аглядзе слабеўшых адбіралі й перавозілі ў шпіталь. У шпіталь павязьлі й мяне. Пётру Сыча забралі ў шпіталь раней, яшчэ з дарогі.

«Шпіталь» – гэта раскіданыя ў лесе тайгі зямлянкі. У іх стаялі зялезныя ложкі, былі сянікі, коўдры, посьцілкі.

Зь віленскіх беларусаў у шпіталі сустрэў К. Міцкевіча зь Віленскай Тэхнічнай Школы, паходзіў ён з Пастаўшчыны. Быў там таксама даволі зрадлівага характару француз. Пасьля вайны сустрэўся зь ім у Парыжы Чэслаў Мілош, аб чым ён пісаў.

Прабыў я ў шпіталі ўсю зіму. Там пазнаёміўся зь інжынерам Кэнігам з Ковеншчыны. Ён прабыў у лягерох ужо шмат гадоў. Загадчыкам шпіталю быў доктар Шэрман, жыд, які прыехаў у СССР з Амэрыкі й дастаў 20 гадоў за «шпіянаж». Добрым лекарам і добрым чалавекам быў у шпіталі доктар Загуменны з Саратава, сам таксама вязень.

Калі я паправіўся, доктар Загуменны затрымаў мяне ў шпіталі, бо я знаў лацінскую мову, мог пісаць дыягнозы ды рыхтаваць штодзённыя шпітальныя рапарты: колькі хворых, на якую хваробу, на колькі дзён. Я дастаў штатнае месца «статысты».

Асабліва шмат у шпіталі было хворых на цынгу, пэлягру ды іншыя авітамінозы. Для іх лячэньня доктар Загуменны дамогся молатага сырога мяса, порцыю якога даваў кожны дзень хворым. Гэта памагала шмат каму, хоць і мерлі хворыя масава. Было ў шпіталі каля 500 хворых. Мне кажны дзень даводзілася пісаць па 15-20 актаў сьмерці. Акты пісаліся паводля адмысловае формы. Трэба было падаць у акце век, нацыянальнасьць хворага, хваробу, дзень сьмерці, каго з радні трэба паведаміць аб сьмерці, хоць, здаецца, ніхто нікога з радні аб гэтым у запраўднасьці не паведамляў. Калі закапвалі памерлых, клалі нябошчыкаў заўсёды галавой на ўсход.

У шпіталі зьмяніў я й сваю вопратку. Сваю абгарэлую ўжо куртку памяняў на звычайны кажух і рукавіцы, з прыдаткам двух баханкаў хлеба. Таму, што я насіў капялюш, мяне клікалі «Шляпай». Сваю «шляпу» пры нагодзе прамяняў аднаму лягернаму франту, расканваіраванаму шофэру, на шапку-ушанку з прыдаткам баханка хлеба з цукрам.

Пад вясну 1941 году кіраўніцтва канцэнтрацыйных лягероў пачало дамагацца ад адміністрацыі шпіталя, каб падлечаных выслаць на работу. Камендант тады паклікаў нас ды абвесьціў, што мы пераводзімся ў лясную часьць лягероў. Далі нам прадукты ды завязьлі ў «Отделение лесных лагерей». Інжынер Кэніг, зь якім я пазнаёміўся ў шпіталі, абяцаў, што як выздаравею, мяне забярэ ў сваю

лясную брыгаду. Я думаў, што ён пра мяне ўжо забыўся. Аднак па нейкім часе я дастаў выклік у брыгаду інжынера Кэніга, якая праводзіла памер лесу, таксацыю ды ўлік дрэваў, годных для высеку. Выбіраліся тады для высечкі бярозы. Яны ішлі на выраб прыкладаў для стрэльбаў.

У лясной часьці быў свой лягер. Было там шмат рознае прафэсіі інтэлігенцыі, у гэтым ліку інжынеры.Тут можна было слухаць радыя, быў «ларёк» – лягерная крамка – і ежа была лепшая. Калі пацяплела ды сагнала сьнег, інжынер Кэніг перадаў мяне пад каманду інжынера з Казані, татарына-нацыяналісты. Пад ягонай камандай мы, тры «лесатэхнікі» – я, Мацкевіч, і яшчэ адзін – праводзілі памеры й таксоўку лесу.

Мелі з сабой 5 чалавек работнікаў. Два ішлі зь лентамі, адмяралі, запісвалі, як далёка ад ляжнёўкі. Мы разьмервалі лес на дзялянкі па чатыры квадратныя кілямэтры. Ішлі проста ад ляжнёўкі 2 км., заварачвалі пад простым кутом, ішлі зноў 2 км. паралельна да ляжнёўкі, ізноў заварачвалі пад простым кутом і проста кіраваліся да ляжнёўкі. Гэтак атрымліваліся квадраты вялічыні 4-х квадратных кілямэтраў. Дрэвы гэткіх дзялянак мы аглядалі, апісвалі, дадзеныя запісвалі ў кнігу, наносілі на карту.

У часе лясное работы мы былі расканваіраваныя, пры нас ня было ніякае варты. Даставалі павышаны паёк – алей, рыбу, «збой» – сэрца, ныркі, вантробу – і цыбулю. Як пацяплела, у лесе зьявілася зайчая капуста, а хутка пачалі дасьпяваць і вялікія, падобныя на суніцаў, ягады. Мы тады аджылі, акрыялі – вітамінаў мелі дастаткова.

Калі пачалася вайна зь Нямеччынай, нас адразу ізноў загналі ў лягер, у «зону». Цяпер мы рабілі падсумаваньні з сабраных у часе таксацыі матар'ялаў.

Па нейкім часе прыйшла вестка аб дамове між генэралам Сікорскім і Молатавым пра звальненьне зь лягероў польскіх грамадзян. У нашай лясной часьці былі тады ўжо й грамадзяне савецкія. Хутка нас, польскіх грамадзянаў, павязьлі ў ПЕЧЛАГ – Пячорскі лягер – дзе знайходзілася «Управление лагерей». Пасьля трох дзён там мяне вызвалі ды сказалі, што маіх дакумэнтаў няма й таму мяне пашлюць ізноў у лягер на працу. Назад у лягеры адаслалі тады чалавек 60.

Гэтым разам трапіў я ў вельмі цяжкі лягер. Трэба было насыпаць насып пад чыгунку, дзённая норма была накідаць на плятформу вагону 9 кубамэтраў зямлі. Нормы

былі не да выкананьня, а за невыкананьне накладаліся кары й дадатковымі кубамэтрамі й пагоршаным пайком. Вязьні вельмі хутка марнелі, слаблі, гінулі. Лягер да гэтага быў вельмі брудны, кармілі пагана. Ужо пры канцы жнівеня выпаў сьнег, стала да ўсяго іншага й холадна.

Чыгункай тымчасам ад'яжджалі звольненыя польскія грамадзяне. Мы-ж, мокрыя ад дажджу і сьнегу, вымучаныя працаю, перамерзлыя, пазіралі ўсьлед шчасьліўцам ды цэлы дзень капалі, насыпалі на плятформу зямлю. Вярнуўшыся позна вечарам ад работы ў лягер, ня мелі дзе памыцца, высушыцца, ляжалі мокрыя, гнілі. Раніцай, у мокрай яшчэ вопратцы, змарнелыя, зьзелянелыя, ізноў выходзілі капаць, кідаць зямлю. Ціраз прыходзіла тады думка: «Нашто далей цярпець, мучыцца, пераносіць холад і голад?» Але другая думка наперакор першай казала: «Трывай!»

Звальненьне

Пасьля паўтара месяца гэткае цяжкое працы аднае раніцы прыходзе ад лягернае каманды пасланец ды загадвае некаторым, у тым ліку й мне, ня выходзіць на працу. Праз паўтары гадзіны мяне выклікалі ў лягерную канцылярыю, дзе сказалі, што я еду на «освобождение». Праверылі мае дакумэнты, якія ляжалі на стале ў зялёнай папцы з пастаўленым на ёй вялікім знакам запытаньня, ды выпісалі пасьведчаньне аб звальненьні. За два гады лягернае працы я дастаў за ўсе мае рабскія «працадні» як «зарплату» каля 300 рублёў. Пыталіся, куды хачу ехаць, далі час падумаць.

Звольнілі мяне месяцы тры пасьля пачатку вайны зь Нямеччынай. Я задумаў кіравацца туды, дзе цяплей, дзе заўсёды нешта расьце, дзе лягчэй знайсьці яду. Параіўся з адным жыдком, і мы папрасілі, каб далі нам пропускі ў горад Дэрбэнд на ўсходнім беразе Касьпійскага мора.

Да Котласа павязьлі нас грузавікамі. Там мы затрымаліся, аддыхнулі. Ішоў якраз транспарт, які вёз на поўдзень «палякаў» да арганізаванага там польскага войска. Ехалі яны ўжо як вольныя. Селі й мы разам зь імі. Польскае войска арганізавалася ў Бузулуку, але места там ужо ня было й таму ўсіх польскіх грамадзян кіравалі ў Узбэкістан або ў Туркменію.

З Котласа мы ехалі на Кіраў, Вятку, тады на Сьвярдлоўск, Чалябінск. Там, калі я хацеў зайсьці ў рэстаран

пад'есьці, мяне ня пусьцілі, бо адзеты быў палягернаму. З Чалябінску ехалі на Орск, праз Турксіб, Артыск, Ташкент, Самарканд, Бухару, на Чарджаў у Туркменіі.

Там мы даведаліся, што ўсіх, якіх разгружаюць зь цягніка, кіруюць на працу ў калгасы. Уначы мы выйшлі тады з вагону ды селі на цягнік, каб ехаць да Краснаводзку над Касьпійскім морам. У Байрам-Алі мы заўважылі, што па цягніку ходзіць НКВД, правярае дакумэнты, і мы ўцяклі ў кусты.

Ішлі далей пешкі і дайшлі да Мары. Там напаткалі другога знаёмага зь лягеру жыдка, які параіў нам заставацца. Хутка мой сябра дастаў працу ў пякарні, я-ж у малочна-брынзавым трэсьце.

Кіраўніком у трэсьце быў украінец, былы зьняволены. Пасьля двух тыдняў мяне накіравалі ў малочна-брынзавы пункт трэсту 20 км. ад Мары. Трэст зьбіраў на пункце малако кароваў, авечак, козаў, вырабляў масла, тварог, авечы сыр – брынзу. На гэтым пункце я праседзеў усю зіму, паправіўся, прыбыў на вазе, «па блату» прыадзеўся.

На брынзавым пункце я прабыў да часу, як з польскіх грамадзян пачала фармавацца для выезду ў Іран 3-я Дывізія Карпацкіх Стралкоў. Каб вырвацца ўрэшце з СССР, увосені 1942 году ў польскае войска накіраваўся й я. (Прыватны архіў)



Вінцэнт Жук-Грышкевіч пасьля павароту з савецкіх лягероў. Мары, Туркменія, кастрычнік, 1941.

VIII. У ПОЛЬСКІМ ВОЙСКУ Ў ІТАЛІІ

«Маё падарожжа ў II-гі корпус: Па звальненьні вязьняў з савецкіх лягероў – пераважна беларусаў, палякаў, украінцаў, якія збудавалі чыгуначную лінію ад Белага мора да паўночнага Уралу – нас павязьлі цягніком уздоўж Уральскіх гор у Туркменскую й Узбекскую ССР...» – піша Вінцэнт Жук-Грышкевіч у нататцы, зьмест якое далей абарваны.

«Звольнілі мяне (з савецкіх лягероў, Р. Ж.-Г.) месяцы тры пасьля пачатку вайны зь Нямеччынай...» – піша ён у другім мейсцы. (Разьдзел VII. «У савецкіх турмах і лягерох»)

* * *

Ад восені 1942 да 1949 году Вінцэнт Жук-Грышкевіч быў у другім польскім корпусе ў складзе VIII-ай Брытыйскай Арміі, сьпярша на Сярэднім Усходзе ў Іраку, Эгіпце, Палестыне, з 1944 г. у Італіі, ды наканец з канца 1945 г. (ці з 1946?, Р. Ж.-Г.) у Англіі. Давялося Вінцэнту Жук-Грышкевічу, як і шматлікім беларусам, сярод якіх быў і Пётра Сыч, браць удзел у бітве пад Монтэ Касыно. З удзелу ў вайне супраць Гітлера Вінцэнт Жук-Грышкевіч атрымаў чатыры адзнакі – мэдалі:

1. "The Defense Medal" 1939-1945. На адвароце мэдалю – выява караля Англіі – George VI.
2. "The Star" 1939-1945.
3. "The Italy Star"
4. Monte Casino, May 1944. На адвароце цыфры: 45 і 334.
5. На зялёным сукне мэталёвы бронзавы напіс: P. R. Officer.

Настаўнікам у вайсковай сярэдняй школе

У войску Вінцэнт Жук-Грышкевіч быў радавым, і «баяўся», як казаў, каб хоць не далі яму якога падвышэньня – у сяржанты прыкладам... Гэтага ён усьцярогся, але надалі яму рангу "Public Relations Officer" з правамі афіцэра, бо ад вясны 1945 да 1949 году ён быў настаўнікам, прафэсарам гісторыі й псыхалёгіі, у вайсковай (польскай) сярэд-




Вінцэнт Жук-Грышкевіч у Эгіпце, 1942.


няй школе для хлапцоў у Модэна, для дзяўчат («пэстак») у Порто Сан Джорджыё, у Італіі, а пасьля ў Англіі.

Адзін зь ягоных вучняў Міхась Яськевіч, цяпер сакратар Аддзелу Згуртаваньня Беларусаў у Вялікай Брытаніі ў Манчэстары, у лісьце да аўтара гэтых радкоў успамінае:

«Пасьля вайны (вясной 1945-га году, Р. Ж.-Г.) ў Італіі пры 5-ай Крэсовай Дывізіі сарганізавана польскую гімназію ў горадзе Модэна. У гэтай гімназіі апынулася, здаецца, 12-15 беларусаў-жаўнераў, якія былі сьведамыя нацыянальна, пераважна былыя жаўнеры беларускай арміі. Прыпамінаецца такі эпізод: прыходзіць у клясу настаўнік гісторыі – сп. В. Грышкевіч. Устаем. – "Dzień dobry, proszę siadać" – кажа настаўнік. Пераглядае дзёньнік. У дзёньні-



У Эгіпце, 1943.




Пры руінах Бабілёну, 1943.

ку была старонка эвідэнцыі вучняў-жаўнераў. Пад маім прозьвішчам падана: “Narodowość – białoruska, język ojczysty – białoruski” і гэтак далей. – “Jaskiewicz Michał” – кажа настаўнік – устаю. – “Skad pan pochodzi?” – кажу, з Наваградчыны, зь вёскі. – “Proszę siadać.” – Думаю сабе, няўжо палячына прычэпліваецца. Аказалася, наадварот, сп. Грышкевіч шукаў сваіх суродзічаў. Ён і мы, беларусы-жаўнеры, былі той самай думкі. І так паволі мы пазнаёміліся. Сабралася група, паўстала моцнае супрацоўніцтва і то тайнае, бо пагражала нам небясьпека. Калі-б вайсковыя дзейнікі гэта выкрылі, нас, вучняў, выкінулі-б са школы, а прафэсара Грышкевіча звольнілі-б і паслалі-б у аддзел, а можа навет маглі-б даць пад вайсковы суд.

Тады мы, вучні, былі маладыя, пераважна 18-20 гадоў. Нам патрэбна была «апора», і мы ў сп. Грышкевічу мелі «магутную сілу». Сп. Грышкевіч меў прыватную кватэру, жыў у італьянца, карыстаўся цывільнай поштай. Хутка зьвязаўся з М. Абрамчыкам, які жыў у Парыжы. Там быў «Хаўрус», якім кіраваў М. Абрамчык.

Першае наша спатканьне з сп. Грышкевічам адбылося ў піўной. Пасьля мы сталі спатыкацца зь ім у ягонай ква-



В. Жук-Грышкевіч са знаёмымі ў Галіопалі, 24 сьнежня, 1943.



Выкладчыкі з вучаніцамі жаночай гімназіі ў Порто Сан Джорджо ў Італіі ў 1945 г. В. Жук-Грышкевіч пяты зьлева.

тэры (у вільлі над Адрыятыкай, Р. Ж.-Г.) вечарамі, каб ня выклікаць падазрэньня ў уладаў. На такіх паседжаньнях сп. Грышкевіч дзяліўся з намі ўспамінамі зь беларускага жыцьця й лістамі ад М. Абрамчыка, які пісаў аб арганізацыйным жыцьці беларусаў у Францыі, аб тым, як уладжваюцца бежанцы. Помню, у адным лісьце ён пісаў: «Вінцук, адведай мяне, я не багаты, але хлеба кусок знойдзецца, падзелімся...»

Памятаю, у школе адзначалі ўгодкі «Стычнёвага паўстаньня». Рэфэрат чытаў гісторык праф. Грышкевіч. Даклад быў добра апрацаваны. Большая частка яго была прысьвечана падзеям у Літве й Беларусі. Помню: – "Powstanie na Litwie i Białorusi było pod przewodnictwem Konstantego Kalinowskiego, który wydał odezwę w białoruskiej gazecie 'Mużyckaja praŭda,' którą on sam redagował i wydawał." – гаварыў дакладчык.

Дзесьці летам у 1945 г. палякі ў Модэна арганізавалі сьвята Казюка. Збудавалі Вострую Браму й горку з трома крыжамі. У тым часе сп. Грышкевіч атрымаў з Парыжа беларускую газэту «Беларускія Навіны», выдаваныя Міколам Абрамчыкам. Мы, хлапцы, згаладнелыя беларускага друкаванага слова, чыталі яе і як-жа цешыліся! На сьвята



Вінцэнт Жук-Грышкевіч, Рым, 1945.

Казюка прыехалі жаўнеры-беларусы зь іншых аддзелаў, мы патаемна давалі ім чытаць гэтую газэту.

На адным з нашых паседжаньняў сп. Грышкевіч сказаў нам, што «як прыедзем у Англію, – а ўжо было ведама, што будзем пераяджаць, – там заложым сваю арганізацыю. У Англіі будзе свабода, і палякі нічога ня будуць мець да гаварэньня». – І так яно й сталася. Па прыезьдзе ў Англію паўстала беларуская арганізацыя, і то заўдзячаючы настаўніку Вінцэнту Грышкевічу. Дай Божа, каб наша зямелька больш радзіла такіх Беларусаў-Патрыётаў!»

Так закончыў свой ліст сп. Міхась Яськевіч, былы вучань Вінцэнта Жук-Грышкевіча ў Модэна.

Другі вучань В. Жук-Грышкевіча з гэнай жа польскай вайсковай гімназіі ў Модэна сьв. пам. Павал Навара, успамінаючы тыя часы, гаварыў: «Прафэсар расказвае, як палякі ўкралі карону Вялікага Князя Вітаўта... мы, хлапцы-беларусы, бачым, што Прафэсар не паляк....»

(Пра падзеі ў Італіі глядзі гэтаксама разьдзел XIV «Успаміны аб Пётру Сычу»)



Вінцэнт Жук-Грышкевіч, Рым, 27. 3. 1945.

IX. У АНГЛІІ

Згуртаваньне Беларусаў ў Вялікай Брытаніі

З гэтымі хлапцамі-беларусамі й пачаў праф. В. Жук-Грышкевіч у 1946 годзе арганізаваць Згуртаваньне Беларусаў у Вялікай Брытаніі. У артыкуле «Дзесяцігодзьдзе Згуртаваньня Беларусаў Вялікабрытаніі» («Бацькаўшчына» нр. 11-12 [345-346], 1957), гаворыцца:

«ЗБВБ як арганізацыя паўстала ў Вялікабрытаніі, аднак грунт для ягонага паўстаньня быў падрыхтаваны яшчэ ў Італіі ў 1945-46 гадох, куды трапіла рознымі шляхамі некалькі тысяч беларускіх хлапцоў, што разам з палякамі пабывалі на розных франтох... Паводле слоў польскага міністра Тарноўскага, у 2-ім польскім корпусе налічвалася 12,000 беларусаў. Усе яны пасьля пераехалі ў Ангельшчыну.»

Стварыць у Ангельшчыне беларускую арганізацыю адразу ня было так проста. Польскія вайсковыя ўлады й тут перашкаджалі. Сьпярша паўстала пад кіраўніцтвам В. Жук-Грышкевіча ініцыятыўная група вайскоўцаў-беларусаў. Раз пасьля зборкі гэтай групы польскія вайсковыя ўлады арыштавалі В. Жук-Грышкевіча. Ён паразумеўся з сваімі вучнямі – бо выкладаў яшчэ ў польскай гімназіі – каб двох ці трох зь іх паехалі да генэрала Копаньскага, які болей прыхільна ставіўся да беларусаў, расказалі яму, што здарылася, і шукалі інтэрвэнцыі. Прычым, хлапцы мусілі ў той-жа дзень вярнуцца, каб назаўтра зраніцы быць у школе на лекцыях. Дэлегацыя паехала, выканала заданьне і пакуль яна вярнулася, начальства корпусу атрымала тэлефанічны загад: звольніць прафэсара Грышкевіча з арышту.

«Пад націскам беларускіх вайскоўцаў на чале з праф. Жук-Грышкевічам, – кажацца далей у вышэй успомненым артыкуле, – 16 лістапада 1946 году Польскімі Збройнымі Сіламі ў Вялікабрытаніі быў выдадзены фармальны дазвол беларускім жаўнерам належаць да беларускае арганізацыі самапомачы. Загад быў наступнага зьместу: ‹Дазваляю жаўнерам Польскіх Збройных Сілаў беларускае нацыянальнасьці належаць да Згуртаваньня Самапомачы Беларусаў у Вялікабрытаніі›. Падпісаўся пад загадам ген. Копаньскі, шэф Галоўнага Штабу...

Хутка пасьля апублікаваных загадаў паўстае Тымчасовая Управа Згуртаваньня Беларусаў у Вялікабрытаніі ў складзе праф. В. Жук-Грышкевіча, Віктара Сенькевіча і Ч. Кукеля...

Недахоп матарыяльных сяродкаў, расцярушанасьць людзей, частыя зьмены адрасоў, нястача свайго прыпынку ў Лёндане – усё гэта ляжала на перашкодзе ў тварэньні арганізацыі. Апрача гэтых цяжкасьцяў былі яшчэ іншыя, асабліва з боку шавіністаў-палякаў, якія, ня гледзячы на поўны свой крах, там дзе маглі, шкодзілі беларусам... У вадным зь першых камунікатаў Тымчасовае Управы ЗБВБ чытаем наступнае: ‹Зьвяртаемся з заклікам да ўсіх жаўнераў-беларусаў Польскіх Збройных Сілаў ці П. К. П. Р. даваць нам знаць аб усіх перасьледаваньнях, перашкодах ці т. зв. ‘шыканах’ вайсковых зьверхнікаў у вадносінах да іх, калі-б такія здарыліся...› Нам вельмі добра ведама, што ‹шыканы› рознага роду – высьмейваньне беларускае мовы ў гутарцы й падобнае – здараліся. ЗБВБ ад самага пачатку стала ў вабарону жаўнера-беларуса, ня гледзячы на шынэль, які ён насіў – польскі ці ангельскі.» – гаворыцца далей у артыкуле «Дзесяцігодзьдзе Згуртаваньня Беларусаў у Вялікабрытаніі.»

Тымчасовая Ўправа выдае бюлетэнь ЗБВБ «На Шляху». І ў параўнальна кароткім часе правяла вялікую падрыхтавальную працу да 1-га Агульнага Зьезду сяброў ЗБВБ, які адбыўся 18 і 19 студзеня 1947 году. Ніжэй падаем яго цэласьцьцю:

Пратакол нр. 1.

Пратакол Першага Агульнага Зьезду Сяброў ЗБВБ.

Дня 18. 01. 1947 г. а гадз. 14:30 распачаўся ў Лёндане, 218 Сассэкс Гардэнс, В2, у памешканьні ЗБВБ Першы Агульны Зьезд Сяброў Згуртаваньня Беларусаў у Вялікай Брытаніі. На Зьезьдзе было прысутных 150 сяброў.

Адкрыцьцё Зьезду.

Зьезд адчыніў старшыня Тымчасовай Управы ЗБВБ сп. Вінцэнт Жук-Грышкевіч, які ад імені Управы прывітаў прысутных.

Выбары Прэзыдыюму Зьезду і прыняцьце павесткі дня.

На прапанову сп. В. Жук-Грышкевіча старшынёю Прэзыдыюму быў выбраны сп. Нор. Іншыя сябры Прэзыдыю-

му былі выбраны цераз галасаваньне ў наступным складзе: заступнік старшыні сп. Ч. Кукель і сакратар сп.А. Надсон. Пасьля старшыня Прэзыдыюму сп. Нор прачытаў наступны праект павесткі дня:

1. Прывітаньні.
2. Справаздачы Тымчасовай Управы:
   а) Агульная
   б) Справаздачы паасобных рэфэратаў
   в) Грашовая
3. Дыскусія над справаздачамі і справа ўдзяленьня абсалюторыюм Тымчасовай Управе.
4. Даклады зь месцаў.
5. Справа касы ўзаемнай помачы.
6. Выбары камісіяў для апрацоўкі:
   а) Статуту ЗБВБ
   б) Пляну працы
   в) Статуту касы ўзаемнай помачы.
7. Дыскусія і прыняцьце Статуту ЗБВБ, пляну працы і статуту касы ўзаемнай помачы.
8. Выбары Галоўнай Управы і Наглядная Рады.
9. Бягучыя справы.

Праект гэты быў прыняты сябрамі Зьезду аднагалосна.

Прывітаньні.

Сп. В. Жук-Грышкевіч перадаў прывітаньні для Зьезду ад старшыні Саюзу Украінцаў у Вялікай Брытаніі сп. Буры і прачытаў наступныя прывітальныя тэлеграмы і лісты: ад Віцээгзарха Беларускай Каталіцкай Царквы а. Гарошкі з Парыжа, ад беларускага згуртаваньня ў Францыі «Хаўрус», ад Згуртаваньня Беларускіх Работнікаў у Францыі, ад сп. М. Абрамчыка з Парыжа, ад а.Ч. Сіповіча з Рыму.

Справаздачы Тымчасовай Управы.

а) Агульная справаздача.

Агульную справаздачу з працы Тымчасовай Управы ЗБВБ здаў сакратар Тымчасовай Управы сп. Віктар Сенькевіч. Насамперш ён накрэсьліў гісторыю паўстаньня ЗБВБ. Патрэба стварэньня беларускай арганізацыі адчувалася яшчэ ў Італіі, калі ў радох прабываючай там польскай арміі апынулася шмат беларусаў. На перашкодзе гэтаму стаялі аднак ваенныя абставіны, а пасьля непрыхільныя адносіны вайсковых уладаў. Пасьля пераезду Польскіх Аружных Сілаў у Вялікую Брытанію абставіны

зьмяніліся і паўстала магчымасьць стварэньня беларускай арганізацыі. Ініцыятыўнай групе беларусаў удалося атрымаць ад галоўнага польскага вайсковага камандаваньня дазвол на належаньне да беларускіх арганізацый жаўнерам Польскіх Аружных Сілаў беларускай нацыянальнасьці. Дазвол быў выданы 16.11.46., і гэтую дату мы павінны лічыць за пачатак нашай арганізацыі.

Ініцыятыўная група беларусаў пастанавіла назваць новапаўсталую арганізацыю Згуртаваньнем Беларусаў у Вялікай Брытаніі (ЗБВБ). Створаная Тымчасовая Управа апрацавала праект статуту ЗБВБ і пачала выдаваць інфармацыйныя камунікаты, а таксама часапіс ЗБВБ «На шляху». Да гэтага часу выдана тры камунікаты і два нумары часапісу. Каб разгарнуць шырэйшую працу, Тымчасовая Ўправа стварыла наступныя рэфэраты: пасрэдніцтва працы, эміграцыйны і культурна-асьветны.

У сучасны мамэнт ЗБВБ мае ўжо сваё памешканьне, хаця вельмі скромнае, уласны цыклястыль і невялікую беларускую бібліятэчку, у якую ўвайшлі пераважна кніжкі і часапісы, прысланыя нам беларусамі з Францыі. Арганізацыя налічвае больш дзьвюх соцень сяброў, а зацікаўленьне ёю ўзрастае так сярод беларусаў у В. Брытаніі, як і ў іншых краёх.

б) Справаздачы з працы паасобных рэфэратаў.

Справаздачу з працы рэфэрату пасьрэдніцтва працы здаў сп. Ч. Кукель. Рэфэрат пасьрэдніцтва працы паўстаў у сьнежні 1946 г. і мае за заданьне дапамагчы сябром ЗБВБ у час пераходу з вайсковага да цывільнага жыцьця. Гэты рэфэрат нядаўна заіснаваў і мае шмат труднасьцяў у выпаўненьні свайго заданьня. – У далейшым сп. В. Сенькевіч здаў справаздачу з працы эміграцыйнага рэфэрату. Гэты рэфэрат агранічыўся да зьбіраньня розных інфармацыяў адносна магчымасьцяў выезду й асяленьня ў заморскіх краінах. Інфармацыйны матар'ял быў паданы да публічнага ведама ў першым нумары часапісу «На Шляху». Сп. В. Жук-Грышкевіч здаў справазадчу з працы культурна-асьветнай, якая разьвіваецца ў двох напрамках: а) дапамагаючы беларускай моладзі ў здабыцьці асьветы, б) пашыраючы культурна-асьветную працу сярод беларускага грамадзтва ў В. Брытаніі. Ужо ў сучасны мамэнт мы можам бачыць некаторыя вынікі гэтай працы: шматлікія зь беларускай моладзі вучацца ў розных прафэсыянальных сярэдніх і вышэйшых навуковых установах, а часапіс «На

шляху» пашырае беларускую культуру сярод нашага грамадзянства ў В. Брытаніі.

в) Грашовая справаздача.

Справаздачу з грашовай гаспадаркі Тымчасовай Управы ЗБВБ здаў сп. В. Сенькевіч. Адзінымі крыніцамі даходаў былі ўступныя й сяброўскія складкі. Агульная сума даходу ад часу існаваньня Згуртаваньня ёсьць трыццаць два фунты і адзін шылінг. Расходы на закуп канцылярскіх прыладаў, на карэспандэнцыю, выдавецтва часопісу і камунікатаў раўняюцца дваццаць адзін фунт і восем шылінгаў. Апрача гэтага Тымчасовая Управа пажычыла ў украінцаў на куплю цыклёстылю трыццаць фунтаў ангельскіх.

Справаздачу зь дзейнасьці Тымчасовай Управы закончыў сп. В. Жук-Грышкевіч агульнай падсумоўкай. Арганізацыя ЗБВБ й яго разьвіцьцё зьвязана з усялякага роду труднасьцямі – у першую чаргу – гэта расцярушанасьць беларусаў па розных аддзелах Польскіх Аружных Сілаў і падпарадкаваньне іх вайсковай дысцыпліне. Пры адсутнасьці эвідэнцыі беларусаў трудна было даведацца, дзе хто зь іх знаходзіцца. Дзеля таго пачыналася Згуртаваньне ад асабістых знаёмстваў. Кожны сябра, які ведаў ужо аб паўстаньні ЗБВБ, паведамляў аб гэтым іншых сяброў і знаёмых, забавязваючы іх пашыраць весткі далей. Іншыя труднасьці былі злучаныя з адсутнасьцьцю беларусаў у Лёндане. Ня было ня толькі свайго памешканьня, але нават адрасу, на які было-б магчымым кіраваць усю карэспандэнцыю. Беспасрэдныя кантакты былі вельмі рэдкія між сябрамі і амаль усе справы заладжваліся цераз перапіску. Паступова перамагаліся ўсе гэтыя труднасьці і сяньня маем ужо некалькі людзей, стала пражываючых у Лёндане, маемо памешканьне, хаця й невялікае, грашовыя сродкі, хаця абмежаваныя; маемо свой часопіс, уласны цыклёстыль і невялічкую бібліятэчку. Найважнейшае аднак – гэта дынаміка й разгон нашай арганізацыі. Яна разрастаецца хутка й абыймае ўсьцяж шырэйшыя кругі беларускага грамадзянства на чужыне.

3. Дыскусія над справаздачамі і абсалюторыюм Тымчасовай Управе.

Зьезд, ацэньваючы веліч высілку, які ўлажыла Тымчасовая Управа пры паўстаньні ЗБВБ, аднагалосна ўдзяліў ёй абсалюторыюм, а старшыня прэзыдыюму сп. К. Нор падзякаваў ад імені Зьезду Тымчасовай Управе за праведзеную працу.

4. Даклады з месцаў.

Згодна з прынятай павесткай дня паасобныя ўдзельнікі Зьезду пазнаёмілі прысутных зь ведзенай працай у іх асяродках. – Сп. В. Сенькевіч паінфармаваў аб працы беларускага асяродка ў гімназіі й ліцэі 3 ДСК. Гэты асяродак зьяўляецца адным з найбольшых і найлепш зарганізаваных беларускіх цэнтраў у Польскіх Аружных Сілах. – Далей сп. Асіповіч здаў справаздачу з працы беларускага асяродка ў гімназіі й ліцэі 5 КДП. Сябры гэтага асяродка вядуць усьведамляючую й культурна-асьветную працу сярод аддзелаў там, дзе знаходзяцца беларусы. Сп. Т. Цімафейчук паінфармаваў аб працы беларускага асяродка ў гімназіях і ліцэях нр. 1, нр.2 (база 2-га Корпусу). Асяродак гэты разгарнуў вельмі шырака працу як унутраную (ладзячы сходкі, рэфэраты і г. д.), так і на вонкі, пашыраючы беларусаведу ў іншых аддзелах базы 2-га Корпусу.

5. Каса Узаемнай Помачы.

У справе Касы Узаемнай Помачы забраў голас сп. В. Жук-Грышкевіч, які выказаў патрэбу зарганізаваньня сярод беларусаў такой касы. Каса Узаемнай Помачы павінна быць сарганізавана на каапэратыўных прынцыпах: кожны сябра ўносіць свой пай у азначанай вышыні, прычым гэты пай будзе зваротны на кожнае жаданьне ўкладчыка. Капітал, атрыманы з паёў сяброў, павінен быць уложаны ў нейкае даходнае прадпрыемства. Даход з уложаных у прадпрыемства грошаў будзе ўласнасьцьцю пайшчыкаў, і толькі нейкі працэнт пойдзе на ЗБВБ. Гэтак зарганізаваная Каса Узаемнай Помачы мела-б вялікае значэньне як для паасобных сяброў, так і для цэлай арганізацыі. Перадусім уласнае прадпрыемства дазволіла-б затрудніць пэўную колькасьць нашых сяброў, што (у пратаколе нельга прачытаць, Р. Ж.-Г.) ЗБВБ мела-б таксама сільную матар'яльную апору да далейшага разьвіцьця і хутчэй магло-б прыйсьці з помаччу сваім сябром, даючы ім, напрыклад, зваротную пазыку пры закладаньні ўласных варштатаў працы або пры выезьдзе ў заморскія краіны ці даючы магчымасьць некаторым вучыцца. Зьезд большасьцьцю галасоў прыняў прапанову спадара Жук-Грышкевіча адносна арганізацыі Касы Узаемнай Помачы і пастанавіў даручыць спэцыяльнай камісіі апрацоўку яе статуту.

6. Выбары камісіяў дзеля апрацоўкі статуту ЗБВБ, пляну працы і статуту Касы Узаемнай Помачы.

На прапанову Старшыні Зьезду сп. Нора К. у камісіі для апрацоўкі статуту ЗБВБ, пляну працы й статуту Касы Узаемнай Помачы былі выбраныя спадары: Курыла, Надсон, Кляймоў, Юзэфовіч, Арцюх, Кукель, Навара, Асіповіч і Каленік.

На гэтым Зьезд закончыў працу 18 студзеня, пакідаючы паасобным камісіям апрацоўку статуту ЗБВБ, пляну працы і статуту Касы Узаемнай Помачы.

19 студзеня а гадз. 9 Зьезд распачаў далей сваю працу.

7. Дыскусіі й прыняцьце статуту ЗБВБ, пляну працы й статуту Касы Узаемнай Дапамогі.

Сябра камісіі для апрацоўкі Статуту ЗБВБ сп. А. Надсон прачытаў праект Статуту, апрацаваны камісіяй. Падчас дыскусіі была ўнесена папраўка да пункту VII б. Зьезд прыняў папраўку й зацьвердзіў апрацаваны камісіяй статут як Статут Згуртаваньня Беларусаў у Вялікай Брытаніі. Пасьля зацьверджаньня Зьездам Статуту ЗБВБ адступаецца ад павесткі дня, бо прыбыў прадстаўнік Фэдэральнага Клюбу Народаў Сярэдня-Усходняе Эўропы сп. А. Загурскі, які ад імені Клюбу прывітаў наш Зьезд. У далейшым прачытаў праект пляну працы сп. А. Надсон. Праект гэты, апрацаваны адумысловай камісіяй, прыймаюць удзельнікі Зьезду аднагалосна.

8. Выбары Галоўнай Управы і Нагляднай Рады.

Галоўная Управа выбіраецца Зьездам тайным галасаваньнем у наступным складзе 1. Сп. Вінцэнт Жук-Грышкевіч; 2. Сп. Віктар Сенькевіч; 3. сп К. Нор; 4. сп. М. Буяк; 5. сп. Арцюх; 6. сп. С. Серафімовіч; 7. сп. Ч. Кукель; 8. сп. А. Надсон; 9. сп. Ф. Бартуль; 10. сп. К. Акула; Выбраным сябрам Галоўнай Управы даручыў Зьезд разьдзяліць між сабой функцыі.

У склад Нагляднай Рады выбраны: 1. сп. Рудзь; 2. сп. Юзэфовіч; 3. сп. Кляйноў; 4. сп. Гэнрык Сенькевіч; і 5. сп Цімафейчык.

9. Бягучыя справы.

Спадар Жук-Грышкевіч парушыў справу дапамогі беларускаму цэнтру ў Францыі, які сёньня зьяўляецца адзіным лучнікам паміж усімі беларусамі на эміграцыі.

У далейшым парушаецца справа дапамогі беларускім уцекачом. Даручаецца Галоўнай Управе дэтальнае яе апрацаваньне й выкананьне.

На гэтым Зьезд спыніў сваю працу. Старшыня прэзыдыюму сп. К. Нор падзякаваў усім удзельнікам і выказаў зна-


чэньне Першага Агульнага Зьезду АБВБ у жыцьці беларускага грамадзянства ў Вялікай Брытаніі. На заканчэньне сьпяваецца беларускі гімн «Мы выйдзем шчыльнымі радамі».

Старшыня Прэзыдыюму Зьезду
Ч. Кукель, Заступнік Старшыні Прэзыдыюму Зьезду.
А. Надсон, Сакратар

На 2-м Агульным Зьездзе ЗБВБ была выбрана Камісія для куплі Беларускага Дому ў Лёндане і было даверана Галоўнай Управе залегалізаваць Згуртаваньне. Усё было зьдзейсьнена паміж 2-ім і 3-ім зьездамі ЗБВБ.



Другі Зьезд ЗБВБ, Лёндан, Англія, сакавік, 1949. Вінцэнт Жук-Грышкевіч сядзіць трэці справа.



Агульны Сход Акадэмічнага Аб'еднаньня «Жыцьцё», Дом Мар'янаў, Лёндан, жнівень, 1948.



Трэці Зьезд ЗБВБ. Лёндан, 20. 3. 1949.

ЗБВБ – гэта першая беларуская арганізацыя, заснаваная пасьля Другое Сусьветнае Вайны на эміграцыі. Вінцэнт Жук-Грышкевіч быў, як ён кажа, адным із закладчыкаў і першым яго старшынём.

Думкі і спасьцярогі
Вінцэнта Жук-Грышкевіча, Англія, чэрвень, 1947.

«1. Незалежнасьць Беларусі і Фэдэрацыя народаў Цэнтральна-Усходняй Эўропы.

Незалежнасьць Беларусі – Conditio sine qua non.

Фэдэрацыя – гэта паразуменьне зь іншымі народамі-суседзямі, што знаходзяцца ў такой-жа палітычнай сытуацыі як і беларусы, каб супольна зь імі супольным высілкам аблегчыць асягненьне незалежнасьці нашай і іхняй і запэўніць магчымасьць утрыманьня яе.

Зь кім сфэдэравацца, як і на якіх варунках – гэта пакажа само жыцьцё і міжнародная палітычная сытуацыя, з варункам, што рацыя стану Беларусі мае быць на першым мейсцы.

2. Кансалідацыя сіл. Арганізацыю беларусаў на эміграцыі трэба правесьці так, каб ня толькі згуртаваць іх у па-

асобныя асяродкі, **але каб усе гэтыя асяродкі падлягалі аднаму кіраўнічаму цэнтру, які-б быў найвышэйшым аўтарытэтам для ўсіх.** (Падкрэсьлена мною. – Р. Ж.-Г.)

Выясьніць,на колькі аўтарытэтным для ўсіх зьяўляецца Урад БНР. Старацца зрабіць яго такім аўтарытэтам. Калі-б якія групы ці партыі былі супраць Ураду БНР – старацца дайсьці да паразуменьня зь імі, узяць іх прадстаўніка ў Урад, каб усе як адзін былі за адно.

Фэдэрацыя й прапагаваньне яе можа даць нам і такую карысьць, што шмат работы патрэбнай для нас будуць рабіць апрача нас і іншыя народы (напрыклад прапаганда, здабыцьцё прызнаньня нас у заходніх дзяржаў), што лепш за нас сарганізаваны й знаныя цэламу сьвету, бо мелі ўжо перад вайной сваю незалежнасьць і маюць сваіх дыпляматычных прадстаўнікоў.

Фэдэрацыйныя крокі найлепш было-б пачаць ад балтаў, яны ўжо згаварыліся й усюды: эстонцы, летувісы і латышы выступаюць заадно, як балты.

Яны моцныя эканамічна й культурна, маюць моцнае прадстаўніцтва ўва ўсім заходнім сьвеце і цешацца вялікай сымпатыяй цэлага сьвету: уважаныя за дэмакратычныя народы, пакрыўджаныя Саветамі. Ніхто ім не закіне імпэрыялізму. Але яны здаюць сабе справу, што яны малыя: усе тры разам лічаць каля пяці мільёнаў. Шукаюць апоры ў лічнейшых суседзяў, зь якіх – немцы й расейцы выключаны, як найстрашнейшыя імпэрыялісты, Польшча сваім прошлым і сучасным зьяўляецца (нечытэльна, Р. Ж.-Г.) і несымпатычнай для іх, Украіна ня мае зь імі супольнай мяжы.

Да беларусаў яны не павінны былі-б мець засьцярог. Беларусы найбліжэйшыя для іх у сэнсе геапалітычным, культурным і гаспадарчым. Наша сужыцьцё зь летувісамі і латышамі датуецца ад найдаўнейшых часоў. Ад зараньня гісторыі нашы інтарэсы вязаліся з балтамі ў натуральны спосаб.

Беларусы прынясуць балтам патрэбную ім сілу, творачы супольна зь імі арганізм, які дараўняе па велічыні й насельніцтву Польшчы й зьбліжыцца да Ўкраіны.

Беларусы, сфэдэраваныя з балтамі, мелі-б вялікія карысьці.

1. Такая фэдэрацыя зьяўляецца пацьверджаньнем натуральнага бегу гістарычнага разьвіцьця. Ужо Полацкая дзяржава, а нават Смаленск, былі зьвязаны гаспадарча й

культурна з Рыгай, а пазьней уся Беларусь зьвязана была палітычна з Летуваю ў Вялікім Княстве Літоўскім.

2. Геапалітычная сытуацыя: імкненьне да Балтыцкага мора; Дзьвіна й Нёман былі й ёсьць натуральнымі шляхамі лучнасьці з Балтыкам і Захадам. Калі беларусы не прэтэндуюць на заваяваньне балтыцкага ўзьбярэжжа, то мусяць дагаварыцца з народамі яго засяляючымі, каб карыстаць зь яго.

3. Культурна беларусы блізкія летувісам і недалёкія ад латышоў. Маюць за сабой стагодзьдзі супольнага культурнага разьвіцьця. Супольна стварылі права, традыцыі, звычаі.

4. Балты не пагражаюць нам імпэрыялізмам і асыміляцыяй.

5. Да гэтага часу мала было ў нас спрэчных пунктаў. Спор аб Вільню зь летувісамі мог бы быць вырашаны так, што Вільня магла-б быць сталіцай Фэдэрацыі (панад сталіцамі паасобных краін, як Менск, Коўна, Рыга, Талін) з прызнаньнем роўных правоў для летувіскай і беларускай (нацыі? – нячытэльна, Р.Ж.-Г.).

6. Пагроза Польшчы й асыміляцыйнага дзейніка польскага насельніцтва віленшчыны адпала-б сама сабой па паразуменьні беларусаў з летувісамі.

Мусіць быць выразна апрацавана праграма: Чаго хочуць і да чаго імкнуцца беларусы.

1. Назоў: Зьмена назову Беларусі на Крывію ці іншы – пазьней пажаданы, але не ў сучасных абставінах. Увядзеньне якогась іншага назову цяпер-бы ўнесла яшчэ большую путаніну і было-б шкодным. Устанавіць трэба толькі французскую транскрыпцыю: Ruthenia Blanche ці Bielorussia, ангельскую: Whiteruthenia, Belorussia, ці White Russia. Нямецкая ўжо ўстаноўлена: White Ruthenia.

2. Гісторыя: Ці слушна ўважаць пэрыяд Вялікага Княства Літоўскага як выключна беларускі? Адкінуць розныя рамантычныя тэорыі аб Рурыках (? – нячытэльна, – Р. Ж.-Г.) ці тым падобныя. Непаважнымі ёсьць розныя гістарычныя нацяжкі, як падкрэсьліваньне на кожным кроку, што назоў Русь для ўсходніх славян быў толькі прыпадковым і ня меў істотнага ўплыву на выдзяленьне нацыянальных груп.

3. Абэцэда. Кірыліца ці лаціньніца: Пераходзіць на лаціньніцу, кірыліцу падаваць побач, каб ня выйшла з ужытку і не забылася, з агляду на лучнасьць з Беларусяй.

4. Усталеньне аднолькавага ўсіх абавязваючага правапісу.»

(З нататак В. Жук-Грышкевіча, прыватны архіў)

Экспэдыцыя па «Залатое Руна». 10.7.47.
(З нататак В. Жук-Грышкевіча)

«Езьдзіў па пішучую машынку, якая сапраўды для ЗБВБ зьяўляецца «залатрым рунам», бо да гэтага часу трэба было пісаць на пажычаных машынках.

У сваім часе дастаў я ад генэрала Вісьнеўскага запіску да палкоўніка Твожыдло, кіраўніка «Сэкцыі Выхованьў» 2-га Корпусу, каб выдаў для ЗБВБ машынку, 10,000 аркушаў паперы, адпаведную колькасьць капіркі. Трэба было паехаць у Ф. Кэмп па гэтыя рэчы.

Палкоўнік Твожыдло аднёсься да мяне надспадзявана добра: ня толькі выдаў усё, што было ў запісцы, але стараўся надарыць нас, чым толькі мог. Паперы замест 10,000 аркушаў даў 26,000, машынку даў найпрактычнейшую – Underwood – хоць ня новую. Замест капіркі (яна нам ня надта патрэбная), якой ня меў, даў 1000 штук васкоўкі. Апрача таго даў 10 тыб фарбы да Гэстэтнэра, некалькі істужак да машынкі, 2 шчоткі, скрэпкі, 2 канцылярскія кніжкі, ды іншыя рэчы, ужо ня помню ўсяго. Усё гэта разам з жаўнерамі памог упакаваць і нагрузіць на таксі. Параіў папрасіць у ген. Вісьнеўскага яшчэ 100,000 аркушаў паперы і эвэнтуальна Гэстэтнэр, бо паперы ёсьць колькі хочаш.

Да ўсяго гэтага выявіў надспадзяваную прыхільнасьць і сардэчнасьць. Цікавіўся нашай арганізацыяй і лёсам беларусаў на эміграцыі.

Дарога й туды аплаціласа надзвычай багата. Еду ў Лёндан з сьведамым задаваленьнем, што асягнуў ‹залатое руна›.»

(Прыватны архіў)

Беларусы ў Мальвэрн Вэйлз лягеры
(З нататак В. Жук-Грышкевіча)

«Выехаў з разьлікам адведаць беларусаў, што прыехалі зь Нямеччыны й часова знаходзяцца ў Мальвэрн Вэйлз лягеры, што ляжыць па дарозе ў Гэрэфорд. Аказалася –

больш трудоў й высілкаў, чым вынікаў. Хадзіў гадзіны чатыры, зрабіў больш за 10 міль, пакуль знайшоў лягер. Зь няменшым трудом адшукаў беларусаў сярод масы балтаў і ўкраінцаў. Дабравольскага, якога шукаў, там не аказалася, выехаў на работу. Украінцы й іншыя пра беларусаў зусім мала, або й нічога ня ведалі. Асобы, да якіх я зьвяртаўся, былі як-бы зьдзіўлены, што нейкі «пан зь Лёндану» – беларус шукае беларусаў у лягеры, калі іх тут ніхто ня знае. Сытуацыя даходзіла да распачлівай. Урэшце якісь украінец завёў мяне ў жаночы барак да пажылой жанчыны, якая заявілася беларускай: паходзіла з пад Бабруйска, гаварыла пабеларуску добра. Запрапанаваў ёй беларускую газэту, сказала, што ня ўмее чытаць. Сытуацыю выручыў муж яе эстонец, што ўмее парасейску й разумее добра беларускую мову. Прасіў нават прыслаць газэту. Праявілася беларуская гасьціннасьць, пачалі частаваць мяне ўсім чым мелі й расказваць свае беды. Сп-ня Бунд (з Тышкевічаў) знайшла яшчэ адну беларуску – маладую дзяўчыну. І тая аказалася беларускай з Ватэнштэту. Ад яе я больш чаго даведаўся. Прыехала разам з Дабравольскім. Ён ужо выехаў на работу зь яе бацькам і братам. Яна засталася, бо ёй там работы ня было. Мае надзею далучыцца да іх. Аказалася моцнай беларускай зь Беласточчыны – Марцінская. Чыста, хоць сьціпла апранута, рабіла мілае ўражаньне. Знаёмыя падкрэсьлівалі ейныя прыкладныя паводзіны. Больш беларусаў, як цьвердзіла Марцінская, там ня было.

У той жа вечар хацеў выехаць, але, як прыйшоў на станцыю, даведаўся, што вечарам цягнікі тут не затрымоўваюцца. Прышлося плясьціся назад у лягер, там начаваць і раніцай паехаць. Няўдача.» (Прыватны архіў)

Разважаньні

(З нататак В. Жук-Грышкевіча)

«Трэба ўстанавіць адносіны да палякаў, украінцаў і балтаў. Як дабрацца да ангельцаў?

Моцны «касьцяк».

Адначасна з гуртаваньнем і арганізаваньнем беларусаў трэба тварыць моцны «касьцяк» з найбольш моцных і сьведамых элемэнтаў. Ён мусіць быць здысцыплінаваны, як войска, сьведамы нашых мэтаў і заданьняў, ідэйны на

100% і адначасна безапэляцыйны выканаўца ўсіх загадаў кіраўнічых беларускіх чыньнікаў, якім павінен падлягаць. Здаецца, нешта падобнае прадстаўляе сабой Рада БНР. Трэба да яе прыгледзіцца, і калі будзе адпавядаць, зрабіць яе «касьцяком», калі-ж не – то стварыць нешта адпаведнае. Без «касьцяка» эміграцыя будзе нечым хаатычным, а арганізацыя распадзецца.

Цяпер патрэбны быў-бы кангрэс беларусаў на эміграцыі, які ўсталіў-бы мэты й заданьні яе і стварыў-бы адзіны кіруючы аўтарытэтны для ўсіх ворган. Кангрэс зрабіць або ў Парыжы, або ў Нямеччыне.

Гаспадарчыя справы нельга занядбоўваць.

Усюды, дзе знаходзяцца беларусы, яны павінны ствараць матар'яльную базу, найлепш на каапэратыўных прынцыпах. Такая матар'яльная база была-б падставай беларускага жыцьця. За бедныя мы, каб аб гэтым ня думаць».

(Прыватны архіў)

Condicio sine qua non

Вінцэнт Жук-Грышкевіч меў візію, выразную мэту жыцьця, ня толькі яго самога, як адзінкі, але й усяе беларускае эміграцыі, усяго народу: – асягненьне дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі. Гэта, як ён казаў – Condicio sine qua non – неабходны варунак, прадумова быцьця. Разважаў ён не з пункту гледжаньня свае арганізацыі, «сваяго панадворку», а з пункту гледжаньня ўсяе беларускае эміграцыі, якая ў той час зьявілася ў большым ліку, разважаў, як яе сарганізаваць, каб яна магла выконваць сваю місію – змаганьне за незалежнасьць Беларусі. Свае задумы сыстэматычна праводзіць ён у жыцьцё.

Першы Сусьветны Зьезд Беларускай Эміграцыі

На 28 лістапада 1948 году быў скліканы ў Парыжы Першы Сусьветны Зьезд Беларускай Эміграцыі.Зьезд, які трываў пяць дзён, адбываўся ў залі Сындыкату Беларускіх Работнікаў у Францыі. На Зьезьдзе былі дэлегаты з правам пастанаўляючага голасу з наступных краінаў: з Францыі – 9 дэлегатаў, з Англіі – 4, зь Нямеччыны – 2, з Бэльгіі – 1, Даніі – 1, Швэцыі – 1, Італіі – 1, Канады – 1, Аргэнтыны – 1 і Аўстраліі – 1. У склад Прэзыдыюму Зьезду былі выбраны: старшыня – інж. Уладзімер Тамашчык, за-

ступнік старшыні – праф. Вінцэнт Жук-Грышкевіч, сакратары – інж. Уладзімер Шыманец, Янка Сурвіла і Сьпічонак. Паводле прынятага Статуту, над прапановай якога дыскутавалася паўтары дні, новастворaная беларуская арганізацыя называлася «Сусьветнае Аб'яднаньне Беларускае Эміграцыі» зь мейсцам свайго знаходжаньня ў Парыжы.

У склад Ураду Аб'яднаньня ўвайшлі: старшыня – інж. Лявон Рыдлеўскі (Францыя), заступнікі старшыні – праф. Вінцэнт Жук-Грышкевіч (Англія), інж. Уладзімер Тамашчык (Нямеччына), інж. Уладзімер Шыманец (Францыя). Сакратар – Янка Сурвіла (Францыя), рэфэрэнты духовае апекі – Яго Блажэнства Япіскап Сяргей (Нямеччына) і а. Франьціш Чарняўскі (Францыя), рэфэрэнт архіву й дакумэнтацыі – праф. Мікола Нікан (Англія), рэфэрэнт прэсы й інфармацыі – Пётра Манькоўскі (Нямеччына), фінансавы рэфэрэнт – Ул. Шыманец (Францыя). Была таксама выбрана Наглядная Рада й Грамадзкі Суд. («1-шы Сусьв. Зьезд Бел. Эмігр.», «Бацькаўшчына», Мюнхэн, 12.12.48.)

Матар'яльная база ЗБВБ

Задуму стварэньня матар'яльнай базы для ЗБВБ таксама праводзіць Вінцэнт Жук-Грышкевіч у жыцьцё. Пад ягоным старшынствам ужо ў 1948 годзе быў куплены беларускі дом у Лёндане, Англіі.

«Яшчэ аб беларускім доме ў Лёндане»

Як паведамляе Камунікат ЗБВБ у «Бацькаўшчыне», Мюнхэн, 28.11.48.:

«29 кастрычніка (1948) былі закончаныя ўсе фармальнасьці з даўно запраектаванай купляй беларускага дому ў Лёндане, а 11 лістапада беларускія арганізацыі й установы ў Вялікабрытаніі перанесьліся ўжо ў свой собскі дом.

Дата гэта зьяўляецца да некаторай меры гістарычнай у жыцьці нашае эміграцыі, бо спасярод яе беларусы ў Вялікабрытаніі першыя купілі собскі дом як грамадзкую маемасьць. Гэты дзень стаўся важнай падзеяй у Лёндане: ужо ня трэба будзе карыстацца з чужых адрасоў для карэспандэнцыі, скончыліся цяжкасьці з шуканьнем памешканьняў для беларускіх арганізацыяў. Цяпер яны маюць сталае памешканьне ў беларусклім доме. Тут-жа будзе месца й для сходаў і лекцыяў, для беларускай біблія-

тэкі й архіву. Тут памесьцяцца рэдакцыі беларускіх часапісаў.

У беларускім доме знойдзе месца кожны беларус, каб пачытаць часапісы й кніжкі, спаткацца із знаёмымі, адпачыць. А прыехаўшым у Лёндан тут можна будзе знайсьці начлег, а як зарганізуецца кухня, дык і цёплую страву. Адным словам беларускі дом у Лёндане станецца цэнтрам усей беларускай працы, усяго беларускага жыцьця ў Вялікабрытаніі.

Мэта куплі собскага дому, пастаўленая ў травені 1947 г., напасьледак дасягнутая. Зь якім высілкам, зь якой натугай, – кожнаму, хто гэтай справай цікавіўся – ведама. Дасягнутая яна дзякуючы ахвярнасьці, вытрываласьці нашага грамадзтва. Адныя не пажалелі грашовых ахвяраў, другія пазыкаў, трэція – часу й працы, або навет аднаго, другога й трэцяга разам. Таму вартасьць купленага дому ацэньваецца ня толькі грашыма, а перадусім грамадзкім капіталам, які мае большае значэньне, чымсьці грошы.



Беларускі Дом у Лёндане, Англія, куплены 28. X. 1948.



Вінцэнт Жук-Грышкевіч (пасярэдзіне) з сябрамі ЗБВБ у сьвятліцы Беларускага Дому ў Лёндане. 1949.

Дом складаецца з 10 пакояў і кухні, з умывальняй, ваннай і ўсімі выгадамі. Да яго належыць гародчык ад вуліцы, кветнік за домам і досыць вялікі кусок агароду за ім, які даходзіць да другой вуліцы. Дом знаходзіцца ў добрым стане й адразу зьяўляецца прыгодным для жыцьця. Знаходзіцца ён у цэнтральнай і вельмі прыемнай частцы гораду: пры зацішнай вуліцы, абсаджанай дрэвамі й насупраць сквэру.»

(З Камунікату ЗБВБ)

А гэтак, як ЗБВБ займела маемасьць, дзеля праўнага забясьпечаньня як яе сяброў, гэтак і яго самога, Згуртаваньне Беларусаў у Вялікай Брытаніі было інкарпаравана 24 сьнежня 1948 году. Дакумэнт пад нумарам 462750 аб'ёмам 16-ці даўгіх ангельскіх бачын называецца: "Memorandum and Articles of Association of Bylorussians in Great Britain, Limited." У дакумэнце гэтым ёсьць і Статут ЗБВБ. Маемасьць ЗБВБ – ягоныя дамы – праспэруюць і сяньня. Цяпер ЗБВБ мае ўжо тры дамы: у Лёндане, Брадфардзе й Манчэстары.

Кантакты зь іншымі нацыянальнасьцямі

"Kwestia Białoruska"

13 траўня 1949 году Вінцэнт Жук-Грышкевіч чытаў даклад у «Рэдуце» – Інстытуце Блізкага й Сярэдняга Усходу – на тэму "Kwestia Białoruska." Даклад у польскай мове абымае 23 даўгія ангельскія бачыны машынапісу. У сшытку не хапае мусіць адной апошняй карткі, на якой, як зазначана, пададзены працяг бібліяграфіі. Даклад надрукаваы ў польскім часопісе "Kurs Spraw Wschodnich," Serja III, Zeszyt 6, Instytut Blizkiego i Środkowego Wschodu, "Reduta," London, 1949.

У сьнежні 1949 году беларуская дэлегацыя брала ўдзел ў **2-ім Кангрэсе Журналістаў Цэнтральнае й Усходняе Эўропы.** Кангрэс адбыўся ў Лёндане. Старшыня беларускай дэлегацыі праф. Вінцэнт Жук-Грышкевіч выступаў на ім з дакладам.




Другі Кангрэс журналістаў Цэнтральнае й Усходняе Эўропы. Даклад старшыні беларускай дэлегацыі Вінцэнта Жук-Грышкевіча. Лёндан, Англія, 1949.

Беларуска-украінскае зьбліжэньне
Рэфэрат для украінцаў

«У нядзелю 8-га траўня (1949) ў вялікай залі Саюзу Украінцаў Вялікабрытаніі ў Лёндане праф. В. Жук-Грышкевіч прачытаў для украінцаў рэфэрат аб белару-



Другі Кангрэс журналістаў Цэнтральнае й Усходняе Эўропы. Беларуская дэлегацыя. Лёндан, сьнежань, 1949.



Другі Кангрэс журналістаў Цэнтральнае й Усходняе Эўропы. Вінцэнт Жук-Грышкевіч сядзіць у першым радзе першы справа. Лёндан, 1949.

скім нацыянальна-вызвольным руху. Рэфэрат, які выклікаў вялікае зацікаўленьне сярод слухачоў, спрычыніўся да яшчэ большага замацаваньня прыязных беларуска-украінскіх дачыненьняў Вялікабрытаніі.»

«Беларус на Чужыне»
(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, нр. 13 [57], 30 чырвеня, 1949.)

3-га ліпеня 1949 году ў садзе Беларускага Дому ў Лёндане адбыўся ўкраінскі даклад для беларусаў.



Украінскі даклад у садзе Беларускага Дому ў Лёндане, 3-га ліпеня, 1949.

22 верасьня 1949 г.у Беларускім Доме ў Лёндане адбылося паседжаньне сяброў Рады БНР і сяброў УНРады.

"Byelorussia (White Ruthenia) under Russian occupation"

Каб інфармаваць іншыя народы пра Беларусь, Вінцэнт Жук-Грышкевіч у гэтым-жа 1949 годзе выдае ад імя ЗБВБ памфлет у ангельскай мове на шэсьць бачын з картай Беларусі й суседніх краін: "Byelorussia (Whiteruthenia) under Russian Occupation" Published by: "Association of Byelorussians in Gt. Britain Ltd." Інфармацыя падпісана літарай: **Z** і ніжэй: Association of Byelorussians in Great Britain Ltd. 52, Penn Road, LONDON, N. 7. Tel. NORth 1455.

В. Жук-Грышкевіч – рэдактар часапісаў ЗБВБ «**На шляху**» й «**Беларус на чужыне**». У Лёндане ён утрымоўваў кантакт й супрацоўнічаў з Старшынём Рады БНР інж. М. Абрамчыкам, які наведваў Лёндан; супрацоўнічаў цесна з айцом Чаславам Сіповічам. Падзяляў ягоныя турботы аб рэлігійным жыцьці беларусаў у Англіі, аб царкве Пятра й Паўла ў Marian House ды мары й імкненьні аб заснаваньні беларускай бібліятэкі. У жніўні 1948 году адбыўся ў Marian House – Доме Мар'янаў – у Лёндане Агульны Сход Акадэмічнага Аб'яднаньня «Жыцьцё», у якім В. Жук-Грышкевіч зь беларускай дэлегацыяй бралі ўдзел.

4-га студзеня 1950 году на Густаў станцыі ў Лёндане сябры, між імі Пётра Сыч й Алесь Надсон, разьвіталіся зь Вінцэнтам Жук-Грышкевічам, які выяжджаў у Канаду. З вакна вагону цягніка, што рухаўся ўжо зь мейсца, Вінцэнт крыкнуў яшчэ ім на разьвітаньне: «Трымайцеся!»

У сярэдзіне студзеня 1950 году В. Жук-Грышкевіч ужо ў Канадзе, але ягоная духовая сувязь з ЗБВБ трывае праз усё ягонае жыцьцё. Да самога канца ён быў ганаровым сябрам ЗБВБ. У 1957 годзе, на 10-я ўгодкі арганізацыі, ён піша:

«Згуртаваньню Беларусаў у Вялікай Брытаніі

Паважаная Галоўная Ўправа, Дарагія сябры арганізацыі, Вітаю Вас зь дзесятымі ўгодкамі ЗБВБ!

Прайшло дзесяць год ад таго часу, калі мы закладалі першую беларускую арганізацыю ў Вялікай Брытаніі. Перамаглі шмат цажкасьцяў, палажылі шмат працы й высілкаў, але дапялі свайго. Арганізацыя наша сталася моцнай і трывалай, а не якойсь прыпадковай, сэзоннай – ці капрысам чыіхсь амбіцыяў.

Мы хацелі, каб ЗБВБ сталася цьвярдыняй беларускасьці на чужыне – на вачох цэлага сьвету, як доказ таго, што хоць Беларусь паняволена расейскім бальшавізмам – Яна жыве й дзеіць у вольным сьвеце, усюды, дзе толькі знойдуцца выгнаныя з Дому й распарушаныя сыны Яе.

Мы хацелі, каб ЗБВБ было стрыжнём беларускага жыцьця ў Вялікай Брытаніі, моцным апорышчам і прамянюючым цэнтрам для тых, у каго б'ецца беларускае

сэрца, для тых, што згубілі беларускі шлях і ня могуць знайсьці сьцежак да яго, для тых, што маюць сілы, здольнасьці й ахвоту да беларускай працы, але ня ведаюць куды накіраваць, або як праявіць іх; для тых чужынцаў, што ня знаюць праўды аб Беларусі і ня ведаюць, дзе й як знайсьці яе.

Жаданьні нашыя сталіся рэчаіснасьцяй. ЗБВБ паказала сябе такой цьвярдыняй беларушчыны ў канкрэтнай штодзённай працы на працягу 10 год. Навет выезд сяброў яго ў іншыя краіны ня спыняў нармальнага бегу жыцьця й працы арганізацыі. Месцы выехаўшых займалі іншыя сябры. Тыя-ж, што выехалі, спрычыніліся да паўстаньня беларускіх арганізацыяў на новых мясцох, як прыкладам, Згуртаваньне Беларусаў у Аргэнтыне й Згуртаваньне Беларусаў у Канадзе. Такім чынам ЗБВБ жыве й разьвіваецца ня толькі на сваім пні, але й пускае атожальле, парасткі.

ЗБВБ сталася такім моцным і жывучым арганізмам дзякуючы таму, што заснавалася на здаровым грунце, на шчырым, праўдзівым патрыятызьме сваіх сяброў, на іх ахвярнасьці ды адданасьці беларускай справе.

Дзесяць год існаваньня й дзейнасьці ЗБВБ ёсьць доказам, што беларусы здольны да самастойнага арганізацыйнага жыцьця навет на выгнаньні, а раз так – дык тым больш здольны да самастоймага арганізаванага жыцьця ў сваёй собскай незалежнай дзяржаве на бацькаўшчыне. Такія арганізацыі, як ЗБВБ – ужо цяпер будуюць **Незалежнасьць Беларусі.**

Дык хай жыве, расьце й красуе ЗБВБ на славу Беларусі! Пашана й гонар для сяброў яго!

Злучаны душой і сэрцам з Вамі, Дарагія Сябры ЗБВБ,

Ваш В. Жук.

20. 03. 1957.»

(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 13 [347], 1957)

«На дваццатыя ўгодкі ЗБВБ

21-шаму Зьезду Сяброў і Дэлегатаў ЗБВБ

Вітаю 21-шы Зьезд ЗБВБ й усіх удзельнікаў яго. Вітаю ЗБВБ з 20-мі ўгодкамі яго існаваньня й усіх Вас, Дарагія Сябры, што на працягу 20-ці год несьлі на сваіх плячох цяжар беларускага арганізацыйнага жыцьця ў Вялікай Брытаніі й трымалі высока й годна бел-чырвона-белы сьцяг.

Прайшло 20 год ад таго памятнага Вадохрышча, калі наша вайсковая йшчэ грамада сабралася з усіх канцоў вольнай Брытанскай зямлі ў яе слаўнай сталіцы Лёндане, каб залажыць першую ў яе гісторыі беларускую арганізацыю – Згуртаваньне Беларусаў у Вялікай Брытаніі.

Мы былі поўныя сілы й запалу, нам прысьвячала ідэя вызваленьня нашай паняволенай Бацькаўшчыны. Мы былі пэўныя, што вольны заходні сьвет рашуча прыйдзе на дапамогу нашаму народу, што ён не дапусьціць, каб Беларусь стала ахвярай маскоўскага імпэрыялізму, стане ў вабароне паняволеных народаў, у выніку чаго й Беларусь будзе вызвалена. Мы былі гатовы ўключыцца ў гэту вызвольную барацьбу. Аднак міжнародныя падзеі пайшлі іншымі шляхамі, давялі да гэтак званае каагзыстэнцыі, і нашы надзеі павісьлі ў паветры. Гэта ўсё-ж не зламала нас на духу й ня зьбіла з тропу. Мы зразумелі, што наша вызвольная барацьба зацяжная й даўгая. Яна вымагае ад нас цярплівасьці. Таму мы пераключыліся на жмудную арганізацыйную працу ў галіне нацыянальна-грамадзкай і культурнай, у чым ЗБВБ можа пахваліцца сваімі вялікімі дасягненьнямі. Але я перакананы, што ЗБВБ ня спыніцца на гэтых дасягненьнях, а пойдзе далей на выкананьне новых заданьняў.

У цяперашні час, калі нашаму народу на Бацькаўшчыне пагражае русыфікацыя й зьнішчэньне ягонай роднай мовы, нацыянальнай культуры й самабытнасьці, калі браты нашы змагаюцца дома за гэтыя нацыянальныя скарбы, наша роля – роля беларускай эміграцыі – тым больш важная й адказная. Мы мусім захаваць нацыянальны твар нашай эміграцыі, захаваць нашу мову, культуру й самабытнасьць і, што найважнейшае, раскрываць бальшавіцкую хлусьню й ашуканства й інфармаваць вольны сьвет аб нялюдзкім наступе маскоўскага камунізму на беларускую культуру й самабытнасьць.

Мы мусім памятаваць, што кажнае наша выступленьне, кажны наш пратэст супраць русыфікацыі нясе палёгку, нясе падтрымку нашым братом на Бацькаўшчыне ў іх няроўным змаганьні за беларушчыну. Наша існаваньне, наш голас, наша актыўнасьць ім патрэбны цяпер, як ніколі раней. Таму злучайма цясьней нашы шэрагі, нашы высілкі ў арганізацыйным жыцьці, каб дружна й старанна выканаць нашы вялікія й адказныя заданьні.

Жадаю 21-му Зьезду ЗБВБ плённай працы, самому ЗБВБ доўгага існаваньня на карысьць нашай Бацькаў-

шчыны, а ўсім сябром ЗБВБ здароўя, шмат сілаў і вытрываласьці. Лучуся душою й сэрцам з Вамі ўсімі ў гэты сьвяточны дзень 20-ых угодкаў ЗБВБ. ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!

В. Жук-Грышкевіч, адзін із заснавальнікаў ЗБВБ.»

(«Весткі з Канады»-«Беларус», Нью Ёрк, нр. 123-124, 1967)



Першы Сусьветны Зьезд Беларускай Эміграцыі. Зьлева на права: Ул. Шыманец, В. Жук-Грышкевіч, Ул. Тамашчык, Я. Сурвіла. Парыж, лістапад, 1948.

X. У КАНАДЗЕ

Недзе ў сярэдзіне студзеня 1950 году ў Таронта ў Канаду прыехаў зь Лёндану з Англіі Вінцэнт Жук-Грышкевіч. Пазнаёмілася я зь ім 22 студзеня ў кватэры мае сястры Валі Жукоўскае, якую ён ведаў яшчэ зь Вільні, і якая была адзінай яму ляпей знаёмай асобай у Таронта. Мы з сястрой прыехалі ў Канаду зь Нямеччыны 12 ліпеня мінулага 1949 году, і для мяне ў той час беларусы Таронта былі мала знаёмымі. Прафэсар Грышкевіч выдаўся мне асаблівым, зусім іншым ад тых беларусаў, якіх я ў Таронта нядаўна пазнала. Гледзячы на іншых можна было сказаць – бляндын або брунэт, больш або менш прыстойны й усё. У прафэсара Грышкевіча, чалавека сярэдняга веку й сярэдняга росту, худога складу, чупрыну якога «спавіваў ужо срыбрны дым», перш за ўсё кідалася ў вочы сумнае, задуменнае выражэньне твару, адбітак цяжкіх перажываньняў і яшчэ нешта, што прымушала перад гэтым Незнаёмым духова «ў пашане прыгнуць калені». Гаварыў ён плаўна, не сьпяшаючыся, кожны сказ старанна выказаны, хацелася слухаць ня толькі пра што гаворыць, але й як гаворыць. Уся ягоная пастава, трыманьне сябе, было зраўнаважанае, паважнае, хіба гэта ўсё й прымушала яго паважаць. Такое было маё першае ўражаньне, такім яно засталося й назаўсёды.

Новы 1950 год сустракалі мы, беларусы, з прафэсарам Грышкевічам, пазьней навет, як паводле старога стылю, у раскошнай кватэры Масэяў. Тых Масэяў, бацька якіх Вінцэнт Масэй быў – Governor General – прадстаўнік Каралевы на Канаду, ды ў свой час рэктар Тарантонскага ўніверсытэту.

У Канадзе – у Таронта – існавала ўжо Згуртаваньне Беларусаў у Канадзе, заснаванае ў лістападзе 1948 году.

На другім зьезьдзе Згуртаваньня Беларусаў у Канадзе

2-гі Зьезд Згуртаваньня Беларусаў у Канадзе (ЗБК) адбыўся 27-28 травеня 1950 году ў украінскай залі на 191 Ліпінкот, Таронта. З пратаколу, які запісала сп-чня Валя Жукоўская, відаць, што Зьезд пачаўся малебнам, адпраў-

леным беларускім сьвятаром айцом Міхалам Мігаём. Пасьля прывітаньняў прадстаўнікоў украінскіх арганізацыяў і прэсы «Зьезд праслухаў два рэфэраты: 1. «Сытуацыя беларускай эміграцыі ў Канадзе й нашыя заданьні» сказаў сп. А. Грыцук, і 2. «Беларускі вызвольны рух» сказаў праф. В. Жук-Грышкевіч,» – гаворыцца ў пратаколе.

Мандатная камісія ў складзе: сп. М. Ганька, праф. В. Жук-Грышкевіча й сп. В. Навіцкага прызнала Зьезд паўнамоцным. З агульнага ліку дзейных сяброў ЗБК 38, 34 прынялі ўдзел у Зьезьдзе, з чаго 23 – асабіста, і 11 прыслалі ўпаўнаважаньні. Далей у пратаколе кажацца: «Сп. праф. Жук-Грышкевіч прапануе ў першую чаргу прыняць парадак нарадаў, адразу ўносячы канкрэтную прапанову: замест 5-га пункту парадку дня, прапанаванага Галоўнай Управай (глядзі залучнік Но. 3), што гучыць «Уношаньне паправак у Статут ЗБК і выбары камісіі для апрацаваньня Статуту», паставіць: «Выбары плянавай, статутовай і рэзалюцыйнай камісіяў» і як наступны пасьля 5-га пункт: «Уношаньне паправак у праекты: статуту, пляну працы й бюджэту ЗБК на будучы год». Даючы ў гэткі спосаб матар'ял для працы ўсіх камісіяў, сп. Жук-Грышкевіч лічыць мэтазгодным перапынак у нарадах да наступнага дня.»

У даўгіх нарадах дыскутавалася пытаньне, якім мае быць ЗБК – палітычнай ці апалітычнай арганізацыяй. Чуліся галасы, што арганізацыя павінна быць апалітычнай. Сп. Хмара ўважаў: «...На старшыню трэба выбраць чалавека больш прыемлівага для ўсіх. Дагэтуль быў сябра Рады БНР і гэта адпіхала ўсходнікаў. Другая важная справа – аддзяленьня газэты ад ЗБК, бо газэта мае палітычную лінію, а арганізацыя мусіць быць апалітычнай, мусіць стаяць ано на грунце 25 Сакавіка.»

«Сп. Жук-Грышкевіч зьвяртае ўвагу на неабходнасьць сыстэматычнае й плянавае працы. Што-ж да ідэялягічнага кірунку арганізацыі, быў дагэтыуль ён правільным. Уступкі магчыма дапусьціць у тактыцы, але ніколі ў аснаўных ідэялягічных пазыцыях, як ідэал 25 Сакавіка і БНР. У адказ на кінутыя прадмоўцам сугэстыі, што да ўсходнікаў і заходнікаў, сп. Грышкевіч адказвае, што такога падзелу няма ў саміх беларусаў і гутаркі аб ім найчасьцей сугэруюцца чужымі агентамі збоку. Далей выказвае ён свае асабістыя ўражаньні, якія зрабіла на ім арганізацыйнае беларускае жыцьцё ў Таронта за ягоны адносна

кароткі побыт у Канадзе: «Бяручы пад увагу ўмовы й невялікую колькасьць людзей, уражаньне гэтае зусім добрае. Маё поўнае прызнаньне ўступаючай Галоўнай Управе».

«...Зьезд большасьцьцю галасоў пастанавіў, што ЗБК павінна быць арганізацыяй грамадзка-нацыянальнай, апалітычнай і стаяць на грунце 25 Сакавіка». Але да пытаньня, палітычнай ці апалітычнай мае быць арганізацыя, сябры ЗБК вернуцца йзноў на 4-ым Агульным Зьезьдзе ЗБК 17-18 травеня 1952 году ў сьвятліцы ЗБК на 140 Батэрст Стрыт у Таронта. На гэтым Зьезьдзе дайшло да расколу. Прычынай было ўстанаўленьне ідэялягічнага напрамку ЗБК.Некаторыя сябры не хацелі пагадзіцца з тым, што ЗБК мае стаяць на БНР-аўскім грунце. Апынуўшыся пры галасаваньні ў меншыні, яны пакінулі Зьезд.

«Авангард Беларусі»

Раскол бязумоўна быў вялікім маральным ударам для, і так невялікага лікам, ЗБК. Адчуваўся пасьля Зьезду ціхі сум, прыгнечаньне. Гэта лёгка магло перайсьці ў зьняверaньне.

Вінцэнт Жук-Грышкевіч, не старшыня ЗБК, гуртуе вакол сябе зь дзесятак найбольш нацыянальна сьведамых і дзейных маладых людзей і кажа ім, што трэба ратаваць ЗБК. Каб гэта асягнуць, трэба стварыць моцны, здысцыплінаваны «касьцяк» – групоўку, якая павядзе інтэнсыўную працу і ня толькі сама будзе трымацца, але й іншых будзе трымаць на духу, глядзець, каб ЗБК не развалілася.

Групоўку, у якую ўвайшлі: Алесь Грыцук, Кастусь Акула, Мікола Ганько, Язэп Чорны, Янка Баран, Мечыслаў Рачыцкі і яшчэ некалькі асобаў, маладыя энтузіястыя назвалі «Авангард Беларусі». І «Авангард» зь відавочным гонарам сваё заданьне выконваў і мэту асягнуў. ЗБК ажыло. Дзейнасьць Групоўкі трывала аж да выезду яе заснавальніка й кіраўніка ў лютым 1954 году ў Мюнхэн, дзе др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч арганізаваў і быў першым кіраўніком Беларускае Сэкцыі Радыя «Вызваленьне».

Перад выездам у Мюнхэн «Авангард» зрабіў свайму «духоваму правадніку», як выразіўся Мечыслаў Рачыцкі, разьвітальны вечар. Мы толькі каля паўгоду таму назад, 4-га верасьня 1953 году, пажаніліся. Я з мужам ехаць тады ў Мюнхэн не магла, бо канчала пры Тарантонскім універсытэце дэнтыстыку і ня мела яшчэ канадыйскага гра-

мадзянства. Пэрспэктыва растаньня з мужам была для мяне болей як няпрыемнай, ды на тым разьвітальным вечары я яму задэклямавала верш Ларысы Геніюш: «Беларуска»:

Калі цябе, мілы, Краіна пакліча,
за родны змагацца загон,
то суму ня будзе ў мяне на абліччы,
ні страху ня будзе ў грудзёх...

(«Беларуска» у зборніку «Ад родных ніў», Прага, 1942, б. 141)

Вінцук быў узрушаны й вельмі мне дзякаваў.

Літаратурныя ўгодкі

Ды перш чым выехаць у Нямеччыну, Вінцэнт Жук-Грышкевіч дзейнічае шматбакова ў Канадзе. Супрацоўнічае ў «Беларускім Эміграпце». Дакладамі й артыкуламі ў газэце адзначае літаратурныя ўгодкі:

Ядвігіна Ш, М. Багдановіча, Янкі Купалы, Ул. Жылкі.

Некаторыя з гэтых артыкулаў тут цытуем:

«Антон Лявіцкі – Ядвігін Ш.
(Да 30-х угодкаў сьмерці пісьменьніка)

На 22-га лютага г.г. (1952) прыпадаюць 30-я ўгодкі сьмерці беларускага пісьменьніка Антона Лявіцкага, які пісаў пад псэўдонімам Ядвігіна Ш. Радзіўся ён у 1870 г. у фальварку Карпілаўка, каля Радашкавіч – Вялейскага павету. Паходзіў з шляхоцкай каталіцкай сям'і.Сярэднюю школу скончыў у Вільні, пасьля чаго выехаў на ўнівэрсытэцкія студыі ў Маскву. Тут ён сяброе з рознанацыянальнай студэнцкай грамадой, што захапілася радыкальным народніцкім палітычным напрамкам, і сам стаецца народнікам.

Разам з сваімі сябрамі ён прыймае ўдзел у ўнівэрсытэцкіх забурэньнях, за што трапляе ў Бутырскую турму. У супольнай вязьніцы ён бачыць паасобныя групы студэнтаў розных нацыянальнасьцяў – як украінцаў, палякаў, каўказцаў, якія чуюцца зьвязаныя сваім нацыянальным пачуцьцём, гуртуюцца й пяюць свае нацыянальныя песьні. Толькі ён адзінокі, ня можа прыстаць да ніводнай з гэ-

тых груп, бо ўсе яны яму чужыя. Калі-ж разгледзіўся добра – дык пабачыў яшчэ некалькі такіх адасобненых студэнтаў, як і ён. Пачаў зь імі гутарыць. Аказалася, што й яны зь Беларусі, і яны чуюцца адзінокімі. Сабраўшыся разам, і яны ажывіліся. Пачалі прыпамінаць пра сваё жыцьцё на Беларусі, пра ўсе злыбяды. Зацягнулі сваю родную песьню. Спачатку ціханька, нясьмела, пазьней што раз сьмялей, што раз мацней і ўрэшце засьпявалі поўным голасам. Тады яны пачуліся бадзёрымі й моцнымі й зусім ня горшымі за іншых. Тут Антон Лявіцкі канчальна ўсьведамляецца нацыянальна. Аб гэтым ён піша ў сваім творы «Успаміны».

Па выхадзе з турмы Лявіцкі робіцца актыўным у беларускім руху. Ужо ў 1891 г. ён перакладае на беларускую мову «Сыгнал» Гаршына. Жыве пераменна то ў Менску, то ў Вільні. У Менску выдае сельска-гаспадарчы месячнік «Саха». Ад 1909 г. зьяўляецца сталым супрацоўнікам «Нашай Нівы», а пазьней і рэдактарам літаратурнага аддзелу гэтае газэты. Ён падцягвае «ў людзі» нашых волатаў слова Купалу й Коласа, а разам з тым няпрыхільна ставіцца да твораў пачынаючага тады пісаць М. Багдановіча. Відаць ня змог зглыбіць яшчэ паэзыі нашага слаўнага песьняра красы. У «Нашай Ніве» Лявіцкі друкуе свае навэлькі й апрача таго выдае іх асобнымі зборнікамі. У 1910 годзе выходзіць ягонае вершаванае апавяданьне «Дзед Завала», у 1912 г. зборнік дробных апавяданьняў «Бярозка», у 1914 г. «Васількі», і ўрэшце ў 1921 г. – «Успаміны». Памёр Лявіцкі ў 1922 г., пахаваны на віленскіх могілках «Росса». Хаўтуры яго былі вялікай беларускай нацыянальнай маніфэстацыяй у запханай палякамі Вільні, з удзелам Віленскай Беларускай Гімназіі, існуючых яшчэ тады беларускіх пачатковых школаў і беларускага грамадзтва.

Магілка Ядвігіна Ш. не зарастала дзікім зельлем і пазьней. Апекавалася ёю беларуская моладзь, упрыгожваючы ўсьцяж сьвежымі кветкамі. А ў дзень задушак беларускае студэнцтва й вучні сярэдніх школаў што-год ушаноўвалі памяць аб пісьменьніку вялікім зборышчам; запальвалі на яго магілцы сьвечкі й лямпіёны, сьпявалі беларускія гімны. Прыпамінала ўсё гэта беларускі народны абрад дзядоў. Зборышчы беларускае моладзі на магіле Ядвігіна Ш. у дзень задушак увайшлі ў традыцыю.»

* * *

Тут хачу зрабіць сваю зацемку. У такім паломніцтве да магілы Ядвігіна Ш. на дзень задушак у 1938 годзе была й я, тады студэнтка першага году факультэту Права пры Універсытэце Сьцяпана Батуры ў Вільні, сяброўка Беларускага Студэнцкага Саюзу ў Вільні. У маім уяўленьні тады магіла Ядвігіна Ш. на могільніку «Росса» была беларускім нацыянальным «шрайнам» – сьвятым месцам, да якога абавязкава што-год на дзень задушны беларускае грамадзтва Вільні рабіла паломніцтва. Помню зольны лістападаўскі вечар на могілках «Росса» над магілай Ядвігіна Ш. Вялікая грамада людзей з запаленымі сьвечкамі ў руках пяяла беларускія рэлігійныя й патрыятычныя песьні. Быў гэта ня інакш рэлігійна-нацыянальны беларускі мітынг. Ці захавалася яшчэ цяпер, у 1991 годзе, магіла Ядвігіна Ш. – беларускі «шрайн»?...

* * *

«Ядвігін Ш. быў тыповым прадстаўніком пераходнага часу між народніцтвам і нашаніўскай парой у беларускай літаратуры – піша далей В. Жук-Грышкевіч – Ён бадай што равесьнік Багушэвіча й Няслухоўскага, жыве тымі самымі ідэямі народніцтва, што й яны, але дажывае да нашаніўскае пары й супрацоўнічае з новай плядай паэтаў і пісьменьнікаў, выйшаўшых з народнае гушчы, хаця й вельмі розьніцца ад іх сваёй ідэялёгіяй. Больш таго, Ядвігін Ш. мае ў сабе яшчэ й карэньні беларускіх шляхоцкіх рамантыкаў. Фальварак Карпілаўка, у якім узрастаў наш пісьменьнік, знаходзіцца ў суседзтве з фальваркам Дуніна-Марцінкевіча. У Марцінкевічаў малы Лявіцкі бываў вельмі часта. Гутарыў зь беларускім Дударом, слухаў чытаньне «Гапона» і «Вечарніц», дачка Марцінкевіча вучыла яго чытаць. Тут ён пасьпеў яшчэ надыхацца атмасфэрай аджываючых шляхоцкіх рамантыкаў, тут яму моцна зайшла ў душу беларушчына, якая сталася асновай яго канчатковага нацыянальнага афармленьня ў Бутырскай турме. І тойжа самы Антон Лявіцкі, як беларускі пісьменьнік і грамадзкі дзеяч ужо, дае пабачыць першы раз беларускае друкаванае слова ў сваёй Карпілаўцы вясковаму дзяцюку Івану Луцэвічу – пазьнейшаму пророку беларускага адраджэньня – Янку Купалу. Ён знаёміць будучага волата слова з творамі Марцінкевіча й Багушэвіча так, як быццам перадае яму спадчыну аж двух пакаленьняў, двух пэрыя-

даў у беларускай літаратуры – рамантызму й народніцтва. Зьявішча вельмі цікавае й адзінае ў сваім родзе.

* * *

Пісьменьнік акумулюе ў сябе асяродзьдзе, у якім ён жыве й узрастае, атмасфэру, якой ён дыхае, дух часу, у якім ён жыве. Ён зьяўляецца вытворам свайго асяродзьдзя й свайго часу. І калі пачне пісаць, ён мімавольна адбівае ў сваіх творах усё тое, што ўвабрала ў сябе ягоная душа. Так было й зь Ядвігінам Ш. Мы не зразумеем яго твораў, іх сутнасьці, іх ідэялягічнае падкладкі, калі не пазнаёмімся з жыцьцём, асяродзьдзем і духам часу яго.

У творах Ядвігіна Ш. мы знойдзем ідэялёгію шляхоцкіх рамантыкаў, і народніцтва, і рэалізму. Ён шляхціц, узгадаваны пад уплывам польскай культуры рамантызму, адначасна ён моцны беларус і патрыёт. Ён усёй душой любіць свой край, свой народ з яго беларушчынай. Ён апісвае цяжкое становішча беларуса й спачувае яму. Відаць гэта з апавяданьняў яго, як «Зарабляюць», «З бальнічнага жыцьця», «Гаротная». Выстаўляе на паказ людзкое зло, благія інстынкты й дурноту ў алегарычных творах, як «Падласінькі», «Рабы», «Дачэсная». У пералічаных тут творах ён выяўляе народніцкую ідэялёгію, амаль такую, як у Багушэвіча. Але прадстаўленае мужыцкае гора апісана ім, як добрым, спачуваючым гледачом, абсэрватарам, а не як самым удзельнікам яго. І нічога дзіўнага, так яно й было. Антон Лявіцкі глядзеў з боку на бяду беларускага селяніна, ён ніколі ня быў у яго скуры. І таму яму не хапае тэй інтуіцыі, тэй беларускасьці выяўленьня, якую мы бачым у Купалы й Коласа – гэтых беспасярэдніх гэніяў беларускай народнай стыхіі. Ядвігін Ш. часамі падыходзіць да сацыяльнага зла ў адносінах да беларускага селяніна толькі са спачуваньнем, зусім не закранаючы каранёў, прычыны гэтага зла, як-бы абыходзячы гэтую прычыну сьведама – якраз тое самае, што рабіў і шляхоцкі рамантык Марцінкевіч. Тут вось і выходзіць наверх тая рамантычна-шляхоцкая атмасфэра, якой наглытаўся яшчэ Лявіцкі ў дзіцячых гадох. Час ад часу наш пісьменьнік любіць і пасьмяяцца зь беларускага селяніна, зь яго цемнаты й прымітывізму. Возьмем, напрыклад, апавяданьне «З маленькім білецікам». Тут няма ніякай ідэйнай закрасы, а выступае толькі жаданьне пасьмяшыць чытача.

Поруч з усім вышэй сказаным у Ядвігіна Ш. ёсьць і рэалізм нашаніўцаў. Вобразы з жыцьця беларусаў ён умее прадставіць у поўнай нагаце – бяз ніякіх злагоджваючых заслон. Бачым мы гэта ў цытаваных творах, як «Гаротная», «Зарабляюць», «Зарабіў» і іншыя.

Такім чынам у творчасьці Ядвігіна Ш. мы бачым выразнае напластаваньне трох пэрыядаў беларускай культуры: шляхоцкага рамантызму, народніцтва й рэалізму.

Як пісьменьнік, Ядвігін Ш. прадстаўляе вельмі важныя вартасьці. Ён уносіць у беларускую літаратуру новы від творчасьці – навэлю – маленькае апавяданьне зь беларускага народнага жыцьця. Апавяданьні яго напісаны жывой гібкай мовай, вельмі рэльефна адбіваюць сапраўднасьць апісанага. Па сваёй натуры яны блізкія беларускай стыхіі, бо беларускія па духу й таму даступныя й зразумелыя для народу. Мова Ядвігіна Ш. лёгкая, выяўляецца натуральна, беспасрэдна. Ён мастак дыялёгу. Гутарачыя між сабою асобы выступаюць, як жывыя. Чытаючы іх гутарку, мімавольна чуешся ўдзельнікам яе.

Ён мастак, бяз сумліву, але хутчэй у этнаграфічным разуменьні, чымся ў літаратурным. Яму далёка да Тараса Гушчы – Коласа. Мастацтва творыцца хутчэй інтуіцыяй, як розумам, а ў бытавых апавяданьнях з сялянскага жыцьця Ядвігіну Ш. якраз і не хапае творчай мастацкай інтуіцыі. І зусім зразумела чаму. Інтуіцыі не набудзеш адкульсьці. Яна мусіць быць уроджанай, заложанай у самой натуры мастака. Тады яна й праявіцца ў адтварэньні свайго асяродзьдзя. У народна-бытавых творах Ядвігіна Ш. не магла праявіцца інтуіцыя, бо ён па свайму духоваму складу да народна-сялянскай гушчы не належаў. Яго інтуіцыя магла-б знайсьціся ў іншага роду творах, але ніколі ў сялянскіх бытавых, бо ён паходзіў з асяродзьдзя шляхоцкай інтэлігэнцыі й ня быў уросшы ў сялянскі быт. **Жук.**»

(«Беларускі Эмігрант», Таронта, Год V, нр. 2 (40), 28 лютага, 1952 г.)

«Уладзімер Жылка

Ужо дваццаць год прайшло ад сьмерці ведамага беларускага паэты Уладзімера Жылкі. Гожа й нам дакінуць некалькі фактаў з жыцьця песьняра ў сувязі з гэтымі сумнымі ўгодкамі.

Уладзімер Жылка радзіўся ў 1900 г. у вёсцы Макашы на Меншчыне. Вучыўся ў Менску. У часе расейскай рэвалюцыі 1917 г. належаў да партыі беларускіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў) і браў удзел у будове Беларускае Народнае Рэспублікі й Слуцкім Паўстаньні. На эміграцыі апынуўся разам з урадам БНР. Быў у Коўне, Рызе й Дзьвінску. У 1921 г., як адзін з камісараў ураду БНР, Жылка прыяжджае ў Вільню й працуе ў віленскім паўстанчым асяродку, які падгатоўваў паўстаньне супраць палякаў. Арганізаваны польскімі ўладамі працэс 45 беларусаў у Беластоку ў 1922 г. загарнуў шматлікіх заканспіраваных камісараў БНР. Шырокая хваля арыштаў пракацілася тады па ўсёй Заходняй Беларусі. Жылка мусіў хавацца. Урэшце ён нелегальна прыяжджае ў Прагу Чэскую, дзе паступае на філялягічны факультэт унівэрсытэту Карла і студыюе славянскую літаратуру й гісторыю.

Жылка ведамы ня толькі як паэта, але і як грамадзкі дзеяч. Ён уважаў, што грамадзкая праца ёсьць першым і галоўным абавязкам кажнага беларуса, незалежна ад яго індывідуальных замілаваньняў і прафэсыі. «Беларусь трэба падымаць!» – казаў ён, паўтараючы словы Каруся Каганца. Таму, паводле яго, сваім улюбленым напрамкам дзеяньня можна займацца толькі ў вольным часе ад грамадзкай працы. Так ён і рабіў. Пісаў свае вершы пераважна начамі. Ніколі не адмаўляўся ад грамадзкай працы. Ніколі не прыкрываўся тым, што ён беларускі паэт і гэтага зь яго хопіць. Ува ўсякай грамадзкай справе ён быў адным зь першых. Ен браў беларускае жыцьцё ўва ўсім разрэзе і ў кожнай галіне, дзе трэба было падтрыманьне, быў чынным. Такая надмерная актыўнасьць, відаць, і падкасіла яго маладыя сілы.

Аднак душу Жылкі выпаўняе зацікаўленьне літаратурай і ўласная паэтыцкая творчасьць. У 1923 годзе ў Вільні выходзіць яго першы зборнік вершаў «Уяўленьне», а праз год – другі зборнік вершаў «На ростані». Жылка – эстэт-імажыніст. Ён смакуе паэзію Багдановіча, Дубоўкі й Пушчы. Вельмі паважна студыюе Вэрлена й Бодлера. Ён шукае новых формаў сваёй паэзіі, што адбівае самабытнае беларускае жыцьцё. Ягоная творчасьць здраджае ўплывы выдатных мастакоў слова, а перадусім вышэй пералічаных. Яго паэзія з аднаго боку рэвалюцыйна-змагарная, глыбока-патрыятычная, а з другога – квола-мэлянхалійная, адбіваючая хвараблівасьць душы. І нічога дзіўнага,

чаму. Жылка быў хварэючым паэтам, які страшэнна баяўся памерці на чужыне, далёка ад бацькаўшчыны. Ён быў хворы на сухоты. Некалькі разоў лячыўся ў санаторыі на Маравах і ў Закарпацкай Русі на Квасах.

Ня гледзячы на гэта, хвароба шпарка падразала яго кволыя сілы, бо клімат Чэхаславаччыны яму ня спрыяў. Таму ён сьпяшаўся напісаць як найбольш і хацеў дастацца на бацькаўшчыну, каб там спакойна памерці ў сваіх Макошах, хоць там і панавалі бальшавікі, якіх ён так ненавідзіў і зь якімі змагаўся праз усё сваё жыцьцё. На гэтым усім і палягала трагэдыя жыцьця й сьмерці паэты.

У тыя часы, у 1924-26 г.г. сярод рознанацыянальнай эміграцыі быўшай расейскай імпэрыі шырылася хваля «зьменавехаўства» – г. зн. жаданьня вярнуцца на бацькаўшчыну і дастасавацца да новых бальшавіцкіх умоваў. Аднак Жылка быў далёкі ад «зьменавехаўства». Ён вельмі добра знаў пэрфіднасьць і жорсткасьць бальшавікоў і ненавідзіў іх усёй душой. Толькі страх перад тым, што прыдзецца паміраць на чужыне, далёка ад сваіх, ад улюбёнай Беларусі – змусіў яго да павароту на бацькаўшчыну. Бліжэйшыя сябры Жылкі – з аўтарам гэтых радкоў уключна, стараліся дапамагчы яму ў ягонай трагічнай сытуацыі, пераконвалі застацца на эміграцыі і выбраць якуюсь іншую вольную краіну замест павароту пад савецкае ярмо. З гэтай мэтай рабілі спэцыяльныя сяброўскія сходкі ў чэскай вёсцы Ліпаны – 25 кілёмэтраў ад Прагі, дзе разам з Жылкам пражывала значная частка беларускіх студэнтаў. Але ўсе аргумэнты губілі сваю сутнасьць, калі ўлюбёны ўсімі паэта й сябра заяўляў са сьлязьмі ў вачох: «Я еду на бацькаўшчыну не па тое, каб пакланіцца катам, дастасавацца да іх варункаў, а толькі па тое, каб яшчэ раз пабачыць Беларусь, надыхацца яе паветрам і спакойна памерці, злажыць свае косьці ў роднай зямельцы – побач з касьцьмі сваіх продкаў.» Па такіх словах усе моўклі, наступала доўгая й нязносная цішыня. Нікому ў галаву тады ня прыходзіла, што каты могуць пазбавіць чалавека нават яго натуральнага жаданьня спакойна памерці на роднай зямлі...

Жорсткая бальшавіцкая сапраўднасьць топча ўсе сьвятыя правы – Боскія й людзкія. Жылка паехаў на бацькаўшчыну ў 1926 г. Толькі кароткі час удалося яму пабыць на Беларусі. Ня ведама нават, ці ён пабываў у сваіх Макашох, ці пабачыў сваіх старых бацькоў, але ведама доб-

ра, што ён быў загнаны на ссылку ў Уржуму, дзе й памёр у 1933 г. Такім чынам не ўдалося яму злажыць сваіх касьцей на роднай зямлі – трагічнае маладое жыцьцё кончылася трагічнай сьмерцяй. **Ж.**»

(«Беларускі Эмігрант», Таронта, Год VI, нр. 7 (55), жнівень, 1953 г.)

Дактарат


Пасьля арышту й савецкіх лягероў у Вінцэнта Жук-Грышкевіча ня стала ніякіх дакумэнтаў адносна ягонай асьветы, а трэба-ж думаць пра жыцьцё, уладжвацца на працу. На эміграцыі – у Лёндане ў Англіі – былі тады яшчэ прафэсары зь Віленскага Унівэрсытэту, у якіх ён здаваў экзамены, калі нострыфікаваў свой чэскі дыплём. Адным зь іх быў др. С. Косьцялковскі, прафэсар Унівэрсытэту Сьцяпана Батуры ў Вільні. На падставе іхняга пад прысягай асьведчаньня Вінцэнт Жук-Грышкевіч атрымаў пасьведчаньне, датаванае: Лёндан, 13 кастрычніка, 1950 г., аб тым, што ў сьнежні 1932 году ў Вільні ён здаў дзяржаўныя экзамены, якія кваліфікавалі яго выкладаць у сярэдніх школах гісторыю й славянскую філялёгію, ды што ён быў настаўнікам сярэдніх школ у Вільні аж да 1939 году, і адначасна ад 1930 да 1937 гадоў выкладаў беларускую мову ў Вышэйшай Школе Палітычных Навукаў у Вільні.

З гэтым пасьведчаньнем Вінцэнт Жук-Грышкевіч быў прыняты на факультэт славянскае філялёгіі Facultate Artium Атаўскага Унівэрсытэту, і 11-га кастрычніка 1952 году атрымаў дыплём з навуковай ступеньню Доктара Філязофіі – "Ad gradam Doctoratus in Philosophia promoveatur" – кажацца ў дыплёме. І пасьля, у 1975 годзе ў часе сымпозіюм Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ў Канадзе, у Атаве, прафэсар др. В. Дж. Кэйэ сказаў: «Др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч быў першым беларусам, што здабыў дактарат на Атаўскім Унівэрсытэце».

«ЗАПІСЫ» нр. 2, за 1952 год падаюць наступнае паведамленьне:

«Новая дакторская праца зь беларускай літаратуры

Праф. В. Жук-Грышкевіч, які яшчэ перад апошняю вайною кончыў факультэт гісторыі праскага ўнівэрсытэту ў Чэхаславаччыне, 26 ліпеня сялетняга (1952) году на ўні-



Universitatis Ottaviensis
DIPLOMA

Omnibus has Litteras Inspecturis
SALUTEM:

Nos Cancellarius Apostolicus Rector et Doctores Universitatis Ottaviensis testamur:


Vincent Zuk-Hryszkiewicz

post absolutum in Facultate Artium cursum, atque tum scripto tum orali periculo rite facto, suae doctrinae specimen praebuisse et legitimis examinatorum suffragiis dignum fuisse declaratum, qui ad gradum Doctoratus in Philosophia promoveatur.

In cujus rei fidem sigillum apud nos in hiis usitatum apposuimus Die 11a Mensis Octobris Anno Domini MCMLII

+ Alexander Vachon Cancellarius Apostolicus
R. Normandin, O.M.I. Ph.D. S.T.L. Rector
W. Bourbonnais O.M.I. Ph.D. S.Th. Secretarius
[illegible] Decanus

Дыплём Вінцэнта Жук-Грышкевіча, Атаўскі Універсытэт, 11 кастрычніка, 1952.



Др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч. Атава, 1952.



Др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч сядзіць першы зьлева, каля яго экзаменатары: др. Кэйэ, др. Дамарадзкі і др. Літвіновіч. Стаяць – сябры студэнты пасьля атрыманьня навуковае ступені Доктара Філязофіі. Атава, 1952.

вэрсытэце ў Оттаве, Канада, абараніў сваю дакторскую дысэртацыю з галіны беларускай літаратуры на тэму: Лірыка Янкі Купалы. Абарона адбылася перад камісіяй слявістаў універсытэту ў Оттаве, у склад якой уваходзілі прафэсары: др. Дамарадзкі, старшыня, др. Кэйэ і др. Літвіновіч – сябры.

Рэфэраваў дактарант сваю тэму пабеларуску, а трыгадзінная дыскусія пасьля гэтага вялася ў розных мовах, якімі гаварылі прысутныя на паседжаньні. У выніку абароненай дысэртацыі праф. В. Жук-Грышкевіч атрымаў ад Універсытэту ў Оттаве навуковую ступень доктара філязофіі з галіны літаратуры.»

(«ЗАПІСЫ» Vol. 1, No. 2. New York 1952. б. 123.)

А «Беларускі Эмігрант» паведамляе:

«Дактарат з беларускай літаратуры на Універсытэце ў Атаве

26-га ліпеня г.г. (1952) на ўніверсытэце ў Атаве ў часе летняй сэсіі адбылася абарона дакторскай дысэртацыі на тэму: Лірыка Янкі Купалы. Аўтарам і абаронцам яе быў праф. В. Жук-Грышкевіч, які здаў ужо ўсе экзамены, вымаганыя ўніверсытэтам, і дзякуючы прыняцьцю й абароне дысэртацыі атрымоўвае навуковы тытул доктара філязофіі ад універсытэту ў Атаве.

Абарона адбылася перад журы слявістаў, прафэсароў Аттаўскага Універсытэту, у складзе: праф.д-р Дамарадзкі, як старшыня,праф. д-р Кэйэ і праф. д-р Літвіновіч, як сябры камісіі. Яна выклікала зацікаўленьне сярод рознанацыянальнай групы студэнтаў і дактароў, якія прыйшлі на абарону й таксама задавалі пытаньні кандыдату. Апошні прадставіў справаздачу з дысэртацыі пабеларуску, а апанэнтам з камісіі й на запытаньні публікі даваў адказы на тых мовах, на якіх былі даваныя пытаньні.

Прабег паседжаньня й дыскусыі былі вельмі цікавыя й занялі тры гадзіны часу. Шмат хто ўпяршыню пачуў беларускую мову й даведаўся многа цікавага аб беларускай літаратуры. Камісія прызнала дысэртацыю й абарону яе за належныя да навуковага зроўню, адзначаючы іх высокай нотай і прызнала кандыдата за годнага навуковай ступені доктара філязофіі.

Такім чынам на ўніверсытэце ў Атаве была годна адзначана 10-я гадавіна сьмерці найвялікшага паэта Бела-

русі, а беларуская навука ўзбагацілася новай працай і яшчэ адным доктарам.»

(«Беларускі Эмігрант», Таронта, Год V, нр. 7 (45), ліпень, 1952.)

Першая Сустрэча Беларусаў Паўночнае Амэрыкі

Вінцэнт Жук-Грышкевіч ведаў, што ў ЗША жыве шмат ягоных сяброў зь Вільні і з Прагі, ды ягоны дваюродны брат інж. Часлаў Ханяўка. Нікога зь іх ён ня бачыў ад 1939 году. Меў вялікую прагу зь імі сустрэцца. Стаў зь імі камунікавацца й сугэраваў наладзіць спатканьне. З гэтай мэтай ён зьвязаўся й з Арганізацыяй Беларускае Моладзі (АБМ) у ЗША, старшынём якое быў сп. Міхась Тулейка. Дагаварыліся, што ЗБК і АБМ зарганізуюць Сустрэчу Беларусаў у Канадзе.

Наступным заданьнем было знайсьці адпаведнае мейсца на Сустрэчу. Найляпей адпавядаў бы, меркаваў Вінцук, на гэта нейкі летні рэсорт у прыгожай і цікавай мясцовасьці й недалёка граніцы ЗША. У рэсорце была-б магчымасьць затрымацца ўдзельнікам Сустрэчы, ды было-б мейсца – заля ці пляц – на сход, імпрэзы. Запасіўшыся картамі, якія надта любіў студыяваць, каб пазнаваць і арыентавацца ў ваколіцы, – любіў ён наагул геаграфію й прыроду, – ды запасіўшыся аўтобуснымі раскладамі, выбраўся Вінцэнт Жук-Грышкевіч са мною ў падарожжа. Аўтобусам пад'ехалі мы да пэўнага мейсца, а далей – пехатой да заплянаванага загадзя аб'екту. Нахадзіўшыся да мленьня ног, мы знайшлі рэсорт з чыстымі котыджамі, вялікай плошчай пляцу для сходу, маляўніча паложаным над Вэлянд каналам, недалёка вадаспаду Ніягара, і недалёка граніцы ЗША. У такім падарожжы аўтобусам і пехатой шуканьня мейсца на Сустрэчу, была я толькі адзін раз, а Вінцуку прышлося адбыць іх некалькі, каб дасьледаваць не адзін аб'ект і выбраць найбольш адпаведны.

Сустрэча Беларусаў з Канады й ЗША адбылася 5-6 ліпеня 1952 году на канадыйскім баку вадаспаду Ніягара над Вэлянд каналам. І гэтак запачаткавала яна традыцыйныя **Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі,** а было іх ужо дваццаць (20-я ў 1992 г.) – 18-я ў 1988 годзе была ў Таронта ў Канадзе.

Першая Сустрэча прысьвечана была Янку Купалу – 70-тым угодкам ад ягонага нараджэньня і 10-тым – ад трагічнае яго сьмерці. Ключавы даклад на тэму «Янка Купала як чалавек і грамадзкі дзеяч» меў Вінцэнт Жук-Грышкевіч, які быў ініцыятарам ды адным з галоўных арганізатараў Сустрэчы ў Канадзе. На гэтай першай Сустрэчы прысутнічалі: прадстаўнік Ураду БНР у ЗША сп. Ян Чарапук-Змагар, што жыў тады ў Чыкага, а дакладней у Дэльтон Ільліной, які пасьля Сустрэчы ліставаўся з Вінцэнтам Жук-Грышкевічам (ліст з 20. 3. 1953); паэтка Натальля Арсеньнева й яе муж генэрал Франьціш Кушаль; сьпявачка зь Менску, што так хораша выконвала беларускія народныя песьні, прозьвішча ня памятаю; др. Балеслаў Грабінскі, Вінцэнтаў сябра зь Вільні; інж. Мікола Гарошка, сябра яшчэ з Прагі Чэскай; старшыня АБМ сп. Міхась Тулейка; сп. Васіль Русак, сяброк зь беларускай студэнцкай групы ў Мюнхэне, які часта адведваў Марбурскую беларускую студэнцкую групу, а дакладней кажучы, наймаладзейшую яе сяброўку Галіну Родзьку; праўнік Леанід Галяк, што хацеў сустрэцца з сёстрамі Жукоўскімі, якія з сям'ёй Галякоў дзялілі гора ў беларускіх ДП лягерох – у Ватэнштэце й у Фленсбургу Ангельскай зоны Нямеччыны; уся сам'я Ханяўкаў – інж. Часлаў, Марыя й малая іх дачка Рагнеда. Паводле Камунікату Галоўнай Управы ЗБК з 24. 1. 1953 году «У Сустрэчы прыняло ўдзел панад 120 беларусаў з абедзьвюх краін.»



Першая Сустрэча Беларусаў Паўночнае Амэрыкі ў Канадзе над вадаспадам Ніягара. 1-3 ліпеня, 1952.



Прадстаўнік Ураду БНР у ЗША сп. Ян Чарапук-Змагар прамаўляе да ўдзельнікаў 1-ае Сустрэчы БПА. Першы зьлева стаіць генэрал Франьціш Кушаль. 1952.

Уся багатая праграма Сустрэчы – даклады, мастацкая частка, адведваньне вадаспаду Ніягара, увечары купальскае (хоць і ў ліпені) вогнішча над рэчкай, фактычна над Вэлянд каналам, зь песьнямі й вянкамі на вадзе – усё адбывалася пад адкрытым небам. А ліпнёвае канадыйскае неба было яснае, – сонечнае або зорнае, – прыветлівае да беларускіх выгнанцаў зь іхняе «сінявокае Беларусі».

А чым-жа мы яшчэ жывіліся? Што й дзе мы елі? Банкетаў-жа ня было. Помню толькі, як рабілі канапкі – бутэрброды, і нам, канадыйскім беларускам, спрытна памагала Марыся Ханяўка, а каля яе ног тапталася маленькая Рагнеда.

«Не адным толькі хлебам жыве чалавек.»

Кангрэс "Pax Romana"

У тым-жа 1952 годзе Вінцэнт Жук-Грышкевіч, як прадстаўнік ад Беларускага Акадэміцкага Каталіцкага Аб'яднаньня «Рунь», браў удзел у Кангрэсе "PAX ROMA-

NA," што адбываўся ў Канадзе – у Таронта, Мантрэалі й Квэбэк Сіты – правінцыі Квэбэку.

«"Pax Romana" – гэта міжнародная арганізацыя, сябрамі якой зьяўляюцца каталіцкія арганізацыі інтэлектуалістаў і студэнтаў амаль усіх краінаў сьвету. Краіны з-за зялезнае заслоны рэпрэзэнтуюць эміграцыйныя арганізацыі.

Аб'яднаньне Беларускіх Абсальвэнтаў Вышэйшых Школаў і Студэнтаў Каталікоў – «Рунь» зьяўляецца поўнапраўным сябрам "Pax Romana" ад двух гадоў. На бягучым Кангрэсе рэпрэзэнтуе яго праф. В. Жук-Грышкевіч. Заданьнем "Pax Romana" ёсьць: утрымоўваньне хрысьціянскага духу ў інтэлектуальным і прафэсыйным жыцьці, ды маральная й матарыяльная дапамога студэнтам і навукоўцам. Сёлетні Кангрэс, галоўным пунктам праграмы якога ёсьць тэма: Значэньне ўнівэрсытэту ў мінулым і сучасным жыцьці, зьвярнуў асаблівую ўвагу на барацьбу з камуністычнай ідэялёгіяй, якая пранікае ў унівэрсытэты й асяродзьдзі студэнтаў і інтэлектуалістаў. Дзеля гэтае барацьбы створана спэцыяльная сталая камісія. Апрача таго перад кангрэсам адбылася ў Таронта асамблея "Pax Romana," што занялася арганізацыйнымі справамі.

Кангрэс распачаў сваю працу ў Таронта 22-га жніўня, 25-га пераехаў у Мантрэаль, а закончыў працу ў м. Квэбэку 1-га верасьня. Канадыйцы хочуць паказаць інтэлектуалістам цэлага сьвету свае найпрыгажэйшыя й найважнейшыя мясцовасьці, дзеля таго возяць Кангрэс па ўсім Антарыё й Квэбэку. Слушна сялетні Кангрэс "Pax Romana" называецца кангрэсам на калёсах.

Кангрэс мае вялікае значэньне й для нас, беларусаў, хоць-бы ўжо дзеля таго, што паміж 40 краінаў сьвету красуецца імя «Беларусі», сярод 800 удзельнікаў – пераважна прафэсароў унівэрсытэтаў і студэнтаў – эліты ўсяго сьвету, знаходзіцца й беларускі дэлегат.»

(«Беларускі Эмігрант», Таронта, Год V, нр. 8 (46), верасень, 1952.)

У наступным 1953 годзе кангрэс «Пакс Романа» адбыўся ў Бонн (Нямеччына), на ім дэлегацыя ад Беларускага Акадэміцкага Каталіцкага Аб'яднаньня «Рунь» складалася з шасьці чалавек. Ачольваў яе а. др. Часлаў Сіповіч.

* * *

Беларуская (Торонто) Крэдытовая Супалка
Byelorussian (Toronto) Credit Union, Limited

Вінцэнт Жук-Грышкевіч цьвердзіў, што для нармальнага разьвіцьця беларускай арганізацыйнай дзейнасьці апрача ідэялягічнага напрамку патрэбная матар'яльная й рэлігійная база. Патрэбны свой беларускі дом, на які ўжо зьбіраліся грошы, патрэбная свая беларуская пажычковая каса, патрэбная свая царква.

Шукайма эканамічных падстаў для нашых арганізацыяў

У артыкуле «**Шукайма эканамічных падстаў для нашых арганізацыяў**» у «Беларускім Эміграпце» Заляшчанін – псэўдонім В. Жук-Грышкевіча – гаворыць:

«Эканамічнае жыцьцё ёсьць матар'яльнай базай для ўсяго арганізацыйнага жыцьця; бяз гэтае базы кожная арганізацыя вісіць у паветры, яе разьвіцьцё й будучыня стаіць пад знакам запытаньня. Ідэйны зрыў і ахвярнасьць вельмі добрыя на пачатак, але на даўжэйшую мэту яны найчасьцей заводзяць». І далей: «...салідная й сыстэматычная праца ня можа апірацца на прыпадковай ахвярнасьці, ці нават складках сяброў... Таму згары трэба вышуківаць і плянаваць сабе нейкія крыніцы сталага даходу для арганізацыі... А варта было-б падумаць, каб сябры нашай арганізацыі ня толькі мелі абавязак плаціць складкі, але й мелі ад сваёй арганізацыі й маральную, ды матар'яльную падтрымку. Тады яны высока будуць цаніць сваю арганізацыю, самі будуць яе трымацца й іншых будуць уцягваць. Дзе-ж знайсьці гэтыя матар'яльныя крыніцы?

На нашу думку, гэтыя матар'яльныя крыніцы знаходзяцца ў нас саміх, толькі мы мусім знайсьці іх і ўмела іх выкарыстаць. Пакуль адказаць на пытаньне, як знайсьці гэтыя крыніцы й выкарыстаць іх, зьвернем увагу на тое, што патрэбна кожнай арганізацыі для яе матар'яльнага дабрабыту. Перш за ўсё гэта патрэбнае собскае памешканьне ці дом, як аснаўная база дзеяньня. Адразу магу спаткацца тут са шматлікімі закідамі, што стаўлю за вялікія вымогі й што ня кожная арганізацыя зможа здабыцца на собскі дом нават на працягу дзесяці гадоў. Бязумоўна гэта залежыць і ад ліку сяброў у дадзеным мамэнце й ад пэрспэктываў павялічэньня гэтага ліку. Арганізацыя, якая мае 50 сяброў, можа мець сабе за амбіцыю набыцьцё ўласнага дому, аса-

бліва-ж калі ёсьць пэрспэктыва на павялічаньне ліку сяброў. Уласны дом беларускай арганізацыі ў тэй ці іншай краіне – гэта беларускі нацыянальны штандар, які будзе заўсёды прыцягваць да сябе прыбываючых суродзічаў, а разам з тым будзе сьветчыць аб наяўнасьці беларусаў і іх праблемах. Аб практычнай важнасьці дому для арганізацыі гаварыць хіба ня прыходзіцца...

Другім фактарам дабрабыту арганізацыі й матарыяльнай дапамогі сябрам трэба ўважаць касу ўзаемнай помачы, якая магла-б даць падтрымку ў крытычным для іх часе, а таксама абаротны капітал для арганізацыі. На гэту справу дагэтуль не зьвярнула ўвагі ніводная беларуская арганізацыя за выняткам ЗБК у Таронта, якое распачало першыя арганізацыйныя крокі...

Цяпер пастараемся адказаць на пытаньне, як стварыць найважнейшыя крыніцы дабрабыту арганізацыяў: собскі дом і касу ўзаемнай помачы... Касу ўзаемнай помачы можна стварыць, апіраючыся выключна на сродкі сяброў арганізацыі. Трэба іх толькі ўсьведаміць, што іх ашчаднасьці, а нават згарушчаныя паадзіночныя паі па 5 даляраў, разам узятыя, дадуць так паважную суму, што апошняя зможа заспакоіць крэдытовыя патрэбы сяброў і, дзякуючы сталаму абароту, прынясе працэнт на ашчаднасьці – большы за той, які яны атрымоўваюць звычайна, кладучы грошы ў банк. Пры гэтым той заработак ад капіталу, які звычайна застаецца ў банку – у прыватнай кішэні – у касе ўзаемнай помачы будзе тварыць грамадзкі капітал, спрычыняючыся да грамадзкага дабрабыту. Ёсьць гатовая форма касы ўзаемнай помачы, прынятая ўрадамі ЗША й Канады. Гэта форма зусім надаецца для ўтварэньня беларускіх кас узаемнай помачы й называецца «Крэдыт Юньён». У наступным нумары «Б.Э.» мы разгледзім яе бліжэй.

У іншых краінах разсяленьня нашых суродзічаў напэўна знойдзецца якаясь мясцовая форма, прыдатная для ўтварэньня касы ўзаемнай помачы.»

Заляшчанін» (В. Жук-Грышкевіч)

(«Беларускі Эмігрант», Таронта, Год VI, нр. 5 (53), чэрвень, 1953.)

У наступных нумарох «Б.Э.» В. Жук-Грышкевіч знаёміць шырэйшае беларускае грамадзтва з тым, што такое ёсьць Каса ўзаемапомачы, падаючы самыя важныя пы-

таньні й адказы паводле лістоўкі, выдадзенай Асацыяцыяй Крэдыт Юньён.

Арганізацыйны Сход Касы Узаемнай Помачы пры ЗБК адбыўся 3-га травеня 1953 году ў сьвятліцы ЗБК на 140 Батэрст вуліцы. В. Жук-Грышкевіч зрабіў даклад «аб арганізацыйных падставах касы, яе карысьці для сяброў і прачытаў урадава прызнаны рамовы статут у перакладзе з ангельскай на беларускую мову. Прысутныя сябры пастанавілі залажыць касу, падпісалі заяву аб зацьверджаньні яе ўрадам, аплацілі па 25 цэнтаў уступных і ўнясьлі першыя сяброўскія паі. Фармальна каса будзе называцца Belorussian Credit Union пры ЗБК. Вышыня паю – пяць даляраў, лік паёў неабмежаваны.

Статут Касы ўжо паданы на зацьверджаньне канадыйскім уладам. Незалежна ад гэтага запіс сяброў Касы прадаўжаецца. Уступіць у сябры можа кажная беларуска ці беларус, якія захочуць складаць ашчаднасьці й рэфлектуюць на эвэнтуальныя пазычкі, хаця фармальнае ўрадаваньне пачнецца пасьля зацьверджаньня статуту й атрыманьня «Чартэр». Па бліжэйшыя інфармацыі адносна Касы просім зьвяртацца ў сакратарыят ЗБК да сп. М. Рачыцкага, або сп. Н. Сільвановіча.»

(«Арганізацыйны Сход Касы Узаемнай Помачы пры ЗБК». «Беларускі Эмігрант», Таронта, Год VI, нр. 5 (53), 1953.)

Наступы нумар «Беларускага Эмігранта» за ліпень 1953 году падае наступнае:

«Зацьверджана Каса Узаемапомачы пры ЗБК

Як мы інфармавалі нашых чытачоў раней, пры Згуртаваньні Беларусаў у Канадзе, аддзел Таронта, паўстала Беларуская Каса Узаемапомачы. Каса мае на мэце ашчаджаньне грошы сяброў, а таксама выдаваньне пазычак. Зарганізавана яна на каапэратыўных асновах. У палове ліпеня сёлета (1953) Беларуская Каса Узаемапомачы пры ЗБК зацьверджана ўрадам правінцыі Антарыё, атрымала чартар і цяпер можа прыступіць да ўрадаваньня. Цяперашні афіцыйны яе назоў настыпны: **Byelorussian (Toronto) Credit Union Ltd.**

У нядзелю 26 ліпеня адбыўся Агульны Сход сяброў Касы, на якім былі выбраны кіраўнікі й кантрольныя воргаы. У дырэкцыю Касы ўвайшлі сп. сп. др. В. Жук-Грыш-

кевіч, В. Касьцюкевіч, сп-ня Н. Слаўко, Я. Чорны й Чыркун.

У Пазычкавы Камітэт выбраны сп. сп. Ананіч, Г. Барановіч і А. Грыцук, а ў Наглядную Раду – сп-ня Р. Жукоўская, Крыванос і Ю. Слаўко.

Пасьля правядзеньня апэрацыйных дзеяньняў, г. зн. наладжаньня канцылярыі, картатэкаў, уступленьня ў Лігу Крэдыт Юньён, Каса зачне прымаць грошы на ашчаднасьці і рэгулярна весьці сваю працу. Скарбнік сп. Я. Чорны будзе раз на трыдзень у сьвятліцы ЗБК на 140 Батурст стр., да якога трэба будзе зьвяртацца ўва усіх грашовых справах. Гадзіны працы Касы, а таксама дадатковыя выясьненьні падамо ў наступным нумары нашае газэты. Да Касы могуць належаць сябры ЗБК толькі з Таронта. Хто жадаў-бы зараз уступіць у сябры, або атрымаць падрабязныя інфармацыі адносна Касы Узаемапомачы, павінен зьвярнуцца да страшыні др. В. Жук-Грышкевіча, або сакратара сп. В. Касьцюкевіча.»

(«Зацьверджана Каса Узаемапомачы пры ЗБК». «Беларускі Эмігрант», Год V, 6 (54), ліпень 1953. Артыкул не падпісаны, але пісаў яго старшыня Касы др. В. Жук-Грышкевіч)

І гэтак 3-га траўня 1953 году была заснавана **"Byelorussian (Toronto) Credit Union Ltd."** – «Беларуская (Таронта) Крэдытовая Супалка», а называлі яе Касай. Першым яе кіраўніком, аж да выезду ў Мюнхэн, быў ейны закладчык др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч.

Другі Агульны Сход Беларускай (Таронта) Крэдытовай Супалкі, ці Касы даручыў сакратару Сходу сп. Язэпу Чорнаму выслаць Закладчыку Супалкі ў Мюнхэн, у Нямеччыну, ліст наступнага зьместу:

"Byelorussian (Toronto) Credit Union Ltd.
1000 Dundas Street, Toronto, Ontario

17 студзеня, 1955.

Вельмі Паважаны сп. Др. В. Жук-Грышкевіч,

Другі Агульны Сход "Byelorussian (Toronto) Credit Union Ltd.," які адбыўся 15 студзеня 1955 г. у Таронта ў Канадзе, пастанавіў вынесьці Вам прызнаньне вялікай заслугі й падзяку, як закладчыку вышэй успомненай беларускай фінансавай арганізацыі. Пастанавіў пераслаць

Вам прывітаньні ад Сходу і пажадаць, каб Ваша карысная праца, якая Вамі цяпер праводзіцца ў Нямеччыне, у будучыні дала вялікія вынікі й спрычынілася да хуткага вызваленьня нашае Бацькаўшчыны Беларусі.

Жыве Беларусь!

(подпіс) Я. Чорны
Сакратар Сходу.»

(Прыватны архіў)

Сход Беларускай Касы ў Таронта

26 студзеня 1969 году адбыўся адзін з чарговых сходаў Касы:

«Беларуская Каса, Крэдыт Юньён, у Таронта – адзіная беларуская фінансавая арганізацыя ў Канадзе. Яна праіснавала ўжо шмат год і дапамагла не аднаму з нашых суродзічаў уладзіць сваё жыцьцё. Калі каму зь беларусаў бывае няхватка й патрэбная пазыка, ён ня шукае яе ў мала зразумелых яму сваімі камбінацыямі канадыйскіх банках, а проста зьвяртаецца да сваёй касы, бо ведае, што тут ён дастане пазыку бяз ніякіх цяжкасьцяў, на добрых умовах і ніхто яго тут не абдурыць. Апрача гэтага, кажны сябра Беларускай Касы мае аўтаматычнае грашовае забясьпечаньне на выпадак сьмерці. Усе даходы, што Беларуская Каса мае із сваіх апэрацыяў, застаюцца ў сваім жа асяродзьдзі. Частка гэтых даходаў ідзе на карысьць сяброў Касы – як дывідэнды на іх паі й уклады, а рэшта йдзе на гаранцыйны фонд, культурна-асьветны фонд і на забясьпечаньні. Чым больш сяброў у Касе, тым большыя яе грашовыя звароты, а зь імі й большыя выгады й даходы як для Касы, так і для сяброў яе. Таму належыць да Беларускае Касы ляжыць у інтарэсе кожнага беларуса, а з другога боку ў павялічэньні ліку сяброў зацікаўленая й сама Каса. Калі-б усе беларусы зразумелі гэта і ўсе сталіся сябрамі Касы, дык сяньня Беларуская Каса варочала-б мільёнамі, і кажны меў-бы большыя даходы із сваіх ашчаднасьцяў, ды хапіла-б грошай на нашыя грамадзкія справы, школы й прэсу.

Такія выснавы сталіся відавочнымі на агульным сходзе Беларускай Касы, што адбыўся ў нядзелю 26 студзеня 1969 году ў Таронта.

Із справаздачы скарбніка Касы сп. Я. Чорнага выявілася, што за мінулы год грашовы абарот Касы выносіў 27,387.98 даляраў. Лік пазыкаў у Касе зьменшыўся (нашыя людзі абжыліся ўжо), але вольны капітал Касы не ляжаў бескарысна, а быў пушчаны ў зварот у цэнтралі крэдытовых касаў і прынёс значны даход нашай Касе. Пасьля пакрыцьця ўсіх расходаў і адлічэньняў на гарантыйны фонд і забясьпечаньні, на дывідэнды – чысты прыбытак пайшчыкаў – выпала па 4% на іхныя паі.

Лік сяброў зьменшыўся на 1 (4 выбылі й 3 прыбылі). За апошнія гады 4 сябры Касы памерлі. Сход ушанаваў іх памяць хвілінай маўчаньня. Мейсца памёршага ў мінулым годзе вельмі паважанага й любленага сакратара Касы сьв. пам. Кірылы Брокінга заняла маладая сяброўка сп-ня Рыта Целеш. Гэтую новую сяброўку й сакратарку сход прыняў з задаваленьнем воплескамі й выбраў яе ў Дырэкцыю Касы. Трэба было давыбраць аднаго сябру ў Наглядную Раду Касы. Давыбраны быў др. В. Жук. (др. В. Жук-Грышкевіч)

Сход вёў старшыня Касы сп. М. Ганько. Справаздачу з пазычковай камісіі зрабіў сп. Ул. Целеш, які заклікаў, каб сябры прыцягвалі больш людзей у Касу ды дбалі пра большае карыстаньне з пазыкаў. Старшыня Нагляднае Рады сп. А. Маркевіч зрабіў справаздачу з Нагляднай Рады і запрапанаваў апрабаваць дзейнасьць і грашовыя апэрацыі Касы за мінулы год, на што сход пагадзіўся без засьцярогаў.

Сход разгледзіў старанна ўсе пункты парадку дня, правёў некалькі пастановаў і зрабіў давыбары ў органы Касы, чым забясьпечыў Дырэкцыю Касы на цэлы год далейшай працы.»

Артыкул падпісаны: **Ж** – адзін з псэўданімаў В. Жук-Грышкевіча. («Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, люты, 1969.)

Каса праіснавала болей дваццаці гадоў. Пасьля людзі ўладзіліся, пакуплялі дамы, аўты, попытаў на пазыкі амаль ня было, працэнты на ашчаднасьці ў канадыйскім банку былі вышэйшыя, як тыя, на якія магла пазволіць Беларуская Крэдытовая Каса, бо лік сяброў яе ня быў, ня мог быць, масавым. Каса перастала быць рэнтабельнай – аджыла сваю мэтазгоднасьць. Пры чым вядзеньне яе вымагала шмат працы й энэргіі, адказнасьці і людзей. Вырашылі яе зачыніць.

Царква

Паралельна з арганізацыяй Беларускай Касы праводзіліся стараньні знайсьці сьвятара, які належаў-бы да Беларускай Аўтакэфальнай Праваслаўнай Царквы. Знайшоўся кандыдат – сп. Міхась Мацукевіч. Яму трэба было закончыць украінскую Духоўную Сэмінарыю ў Вініпэгу. Настаўнік – Вінцэнт Жук-Грышкевіч – дае кандыдату ў сьвятары лекцыі – патрэбную падрыхтоўку, каб паступіць у духоўную школу.

Апрача сьвятара трэба знайсьці й кваліфікаванага псаломшчыка, калі магчыма, беларуса. Вінцэнт Жук-Грышкевіч едзе, да рэчы са мной, да спадарства Слаўкоў – сям'і зь Менску. Бацька яе, сп. Пётра Слаўко, быў на Бацькаўшчыне псаломшчыкам. Мэтай візыты было папрасіць сп. П. Слаўка, ці ён не згадзіўся-бы прыняць функцыі псаломшчыка ў будучай БАПЦ у Таронта. Справа была далікатнай, бо ведама было, што беларускі сьвятар а. М. Мігай, што жыў у Таронта і пры розных нагодах абслугоўваў беларусаў, не згадзіўся далучыцца да БАПЦ, і сп. П. Слаўко, ды ягоная жонка сп-ня Марта, былая харыстка царкоўнага хору, маглі таксама з рэзэрвай аднесьціся да БАПЦ. Першыя крокі здабыць сваю царкву былі ані простыя, ані лёгкія, але яны праклалі сьцежку да мэты, якая была асягнута.

Першая божая служба ў БАПЦ Сьв. Кірылы Тураўскага ў Таронта адбылася 2-га кастрычніка 1954 г. у нованабытым беларускім доме на Дандас 1000. Адпраўляў яе айцец Міхась Мацукевіч, Апостала чытаў псаломшчык сп. Пётра Слаўко, у хоры між іншымі пяяла спрактыкаваная ў царкоўных напевах сп-ня Марта Слаўко.

Мастацка аформлены Іканастас зрабіў Мечыслаў Рачыцкі – рымакаталік. Аблачэньне на прыстол і аналой пашыла сп-ня Надзя Барановіч. Агульным афармленьнем царквы-капліцы займалася аўтарка гэтых радкоў з каляжанкай Валяй Штэкэліс – латышкай, пратэстанткай, якую для спакою ейнага сумленьня трэба было пераканаць, што яна служыць Богу, хоць і праваслаўнаму. Бог не дзяліў нас на праваслаўных і пратэстантаў, людзі самыя падзяліліся.

1-га кастрычніка ўвечары царква была гатовая да прыношаньня ў ёй Святых Дароў. Прыйшлі «пабачыць» з другое царквы беларускае але не Аўтакэфальнае, Сьв. Еў-

фрасіньні Полацкай, сп-ня Мігай і яшчэ нехта, і яна сказала: «Што праўда, то праўда, царква вельмі прыгожая», і я дзякавала Богу.



Рагнеда Аляхновіч, дачка Вінцэнта Жук-Грышкевіча, з дачушкай Арыяднай. 18 лістапада, 1953.

Арганізацыйная, культурна-асьветная і ўзгадаваўча-палітычная праца

Апрача за гаспадарчымі й рэлігійнымі справамі, Вінцэнт Жук-Грышкевіч сочыць за ўсім чыста беларускім жыцьцём, арганізацыйным станам ЗБК, кладзе націск на культурна-асьветную й узгадаваўча-палітычную працу.

Напісаны ім, як старшынём Нагляднай Рады, аб'ёмам болей чатырох бачын машынапісу, «Пратакол рэвізіі касы, як і ўсёй дзейнасьці Згуртаваньня Беларусаў у Канадзе, праведзенай Нагляднай Радай ЗБК 14 сьнежня 1952 г.» – гэта ўзор – лекцыя, як правільна павінна выконваць свае абавязкі Наглядная Рада, як яна павінна праводзіць рэві-

зіі дзейнасьці арганізацыі, як пісаць пратаколы. Гэта ня толькі сыстэматычны агляд і аналіз ўсяе дзейнасьці (ці бязьдзейнасьці) арганізацыі, Галоўнай Управы й кожнага рэфэрату паасобку, а й сяброўскае добразычлівае паказаньне на недахопы (бо працаўнікі відавочна яшчэ зусім арганізацыйна ня выраблены) – і даклад, што й як трэба рабіць, каб паправіць сытуацыю. Прыкладам: «Дзеля ўпарадкаваньня касы, Наглядная Рада знаходзіць неабходным правесьці наступныя мерапрыемствы», якіх у пратаколе падана аж дзевяць пунктаў.

У «Агульных спасьцярогах» В. Жук-Грышкевіч кажа: «Агульнае палажэньне ЗБК вельмі цяжкое...»

Толькі-ж паўгоду таму назад адбыўся раскол ЗБК.

У наступным жа абзацы пратаколу кажацца: «Ня гледзячы на ўсё, ЗБК мае ўсе дадзеныя на памыснае разьвіцьцё: мае пэўную частку стойкіх і адданых сяброў і забясьпечанае памешканьне.» Гэтыя «стойкія й адданыя сябры» й былі сябрамі групоўкі «Авангард Беларусі». У іх Вінцэнт Жук-Грышкевіч бачыў заруку будучыні ЗБК, на іх пакладаў надзею й яны яе апраўдалі. Летась, у 1988 годзе, ЗБК сьвяткавала свае 40-я ўгодкі. Сёлета на памінкавым абедзе сп. Кастусь Акула, галоўны закладчык ЗБК, сказаў: «Ён – Вінцэнт Жук-Грышкевіч – быў чалавекам патрэбным якраз у тым часе й у тым мейсцы. Што я – мы ўсе, тады маладыя – ведалі й маглі...?!»

У тым часе й тым мейсцы пры розных нагодах Вінцэнт Жук-Грышкевіч дае даклады ня толькі на гістарычныя й літаратурныя, але й на такія тэмы, як: «Місія беларускай эміграцыі», «Роля актыву ў жыцьці народу», у «Беларускім Эміграцне» парушае такія пытаньні, як: «Дыскусія ці лаянка?», «За, ці супраць палітыкі», «Байкот Амэрыканскага Камітэту Вызваленьня народаў Расеі, ці ўдзел у ім?» і іншыя.

Асабліва на пачатку 50-тых гадоў беларускае грамадзтва баялася слова «палітыка», баялася ёю займацца. Другі агульны сход ЗБК вырашыў, што ЗБК мае быць арганізацыяй апалітычнай. Сябры Згуртаваньня Беларусаў у Мантрэалі заяўлялі: «Мы (беларусы ў Мантрэалі) пастанавілі не займацца палітыкай, бо за нізкі наш зровень умысловага разьвіцьця... Мы зьвярнулі ўвагу выключна на культурна-асьветную працу...». Вінцэнт Жук-Грышкевіч разглядае пытаньне: займацца ці не займацца палітыкай, у «Беларускім Эміграцне» ў абшырным артыкуле:

«За, ці супраць палітыкі?»

Падаем тут найважнейшыя вытрымкі зь яго:

«....У сувязі з гэтымі думкамі насоўваюцца два аснаўныя пытаньні: 1) Ці беларуская эміграцыя мусіць займацца культурна-асьветнай працай і, барані Божа, не займацца палітыкай? 2) Ці могуць займацца палітыкай людзі, якія маюць нізкі зровень умысловага разьвіцьця?

Што такое палітыка?

Перад тым, як адказаць на гэтае пытаньне, разгледзім, хоць павярхоўна, што такое палітыка. Палітыка – гэта грэцкае слова. У старадаўнай Грэцыі горад называўся «поліс», і кожны жыхар, які займаўся справамі «полісу» – гораду й яго насельніцтва, называўся палітыкам. Такім чынам усе справы, зьвязаныя з арганізацыяй і ўладжаньнем гораду й яго жыхарствам, інакш кажучы, грамадзкія справы, называліся палітыкай. Але кожны амаль горад у старой Грэцыі быў адначасна й самастойным гаспадарствам. Таму ўжо тады палітыка абыймала ня толькі справы гораду як населенага пункту й яго жыхарства, але й дзяржаўныя справы. З такім абсягам слова «палітыка» перайшло ў сярэднявечча і ў новую гісторыю. Пазьней толькі з палітыкі, якая займалася дзяржаўнымі справамі вонкавымі й нутранымі, пачалі выдзяляць справы датычныя беспасрэдна грамадзтва, называючы іх грамадзкімі справамі. Аднак і сягоньня яшчэ цяжка ўстанавіць мяжу між палітычнымі й грамадзкімі справамі, бо апошнія так, ці інакш вяжуцца з беспасрэднымі палітычнымі справамі.

У нашы часы да палітыкі залічаюць: 1. форму й самую арганізацыю дзяржавы, 2. унутраны лад яе, 3. адносіны зь іншымі народамі й дзяржавамі, 4. дачыненьні між дзяржаўнымі ўладамі й грамадзтвам, 5. дачыненьні між паасобнымі грамадзкімі клясамі ці партыямі. Да гэтых аснаўных пяцёх пунктаў можна было-б дадаць цэлы сьцаг іншых, зьвязаных з жыцьцём дзяржавы й яе грамадзтва, а ўсе ўзятыя разам трэба аднесьці й да нацыі, калі яна ня мае сваей дзяржавы. У такой сытуацыі знаходзімся якраз і мы – беларусы.

Ці можам не займацца палітыкай?

Мы ня маем сваёй дзяржавы (хіба-ж БССР нельга назваць беларускай незалежнай дзяржавай), наш край захапіў наш векапомны вораг і дзеля гэтага мы апынуліся на

эміграцыі. Ужо сам факт, што мы не паддаліся волі акупанта, зьяўляецца нашым палітычным актам. Але, апынуўшыся на эміграцыі, мы ня выракліся свайго краю, наадварот, мы паўтараем на кажным кроку, што мы не перастаём весьці барацьбу з акупантам, выжанем яго з краю і створым сваю незалежную дзяржаву. Гэтыя намеры нашы – палітычныя ў 100%. Далей, каб асягнуць нашыя намеры, мы гуртуемся, арганізуемся на эміграцыі, хочам сабраць і зарганізаваць усіх нашых суродзічаў, каб мець большую сілу. А каб яны не асыміляваліся, не растапляліся ў чужым моры – мы падтрымоўваем і пашыраем сярод іх нацыянальную сьведамасьць, знаёмім з нашай гісторыяй, літаратурай, культурай – інакш кажучы праводзім сярод іх беларускую культурна-асьветную працу. І гэту ўсю нашу дзейнасьць нельга назваць інакш, як палітычнай дзейнасьцьцю, або зьвязанай з палітыкай. Апрача таго мы праводзім прапаганду нашай справы сярод чужынцаў і змагаемся з шкоднай нам прапагандай; мы высоўваем нашу справу, як слушную, на міжнародны палітычны форум, у міжнародныя палітычныя дзейнікі; дзеля гэтага мы дэлегуем сваіх палітычных прадстаўнікоў і падтрымоўваем іх гурмам, бо яны прамаўляюць ад нашага імя. Усё гэта ёсьць таксама палітыкай у 100%. І ўрэшце, калі мы кажам, што хочам незалежнай Беларусі, мусім ведаць якой, якую форму, які лад гэта Беларусь мае мець; якія ў ёй будуць адносіны паміж паасобнымі клясамі, як мае быць разьвязана зямельнае пытаньне і наагул эканамічнае і г. д. і г. д. І ўсе гэтыя пытаньні мы павінны апрацаваць, прадыскутаваць і ўсталіць для сваей патрэбы й для чужых дзейнікаў, якіх прызнаньня й падтрымкі мы будзем шукаць, бо бяз гэтага яны з намі нават гаварыць не захочуць. І тут, як бачым, палітыка ў 100%.

Цяпер патрабуем адказаць на першае пытаньне: ці мы маем займацца палітыкай, ці адкінем яе? З усяго вышэй сказанага выплывае ўжо адказ. Калі-б мы хацелі ўхіліцца ад палітыкі – дык мусілі-б астацца дома, падпарадкавацца акупанту, а не выяжджаць на эміграцыю. Або, калі мы ўжо апынуліся на эміграцыі дзякуючы палітычным падзеям, але хочам унікаць палітыкі – дык нічога нам не застаецца, як вырачыся свайго краю, сваіх найбліжэйшых і нават самога сябе, а стацца канадыйцамі ці іншымі амэрыканцамі й замест волі Беларусі здабываць «гаўза», «кару», «штора» і г. д. Усе тыя, што не пайшлі вы-

ключна па шляху здабываньня апошніх, а лучацца да беларускага арганізацыйнага жыцьця, ніяк ня могуць адкінуць палітыкі. Яны займаюцца ёй мімавольна, хоць мо й не здаюць сабе з гэтага справы.

Хто мае займацца палітыкай?

Каб адказаць на пытаньне, ці могуць займацца палітыкай людзі з ніжэйшым зроўнем умысловага разьвіцьця, г. зн. менш асьвечаныя – разгледзім абсяг палітычнай дзейнасьці. Вось-жа дзейнасьць гэта абыймае некалькі ступеняў, як і ўсе іншыя галіны людзкой дзейнасьці. Найвышэйшую ступень, як прэзыдэнты ці міністры ў дзяржавах, або нацыянальныя рэпрэзэнтанты ў народаў недзяржаўных, могуць займаць выключна людзі кампэтэнтныя ў палітыцы, г. зн. маючыя адпаведную да гэтага асьвету й здольнасьці. Такімі-ж кампэтэнтнымі ў палітыцы мусяць быць павадыры палітычных груп ці партыяў, як і рэдактары палітычных газэт, ці наагул людзі, прэтэндуючыя на вядучую ролю ў палітычным жыцьці. Усе яны ёсьць, або могуць стацца чаловымі павадырамі народу й калі ня маюць адпаведнага прыгатаваньня й здольнасьцяў, могуць у сваёй павадырскай ролі давясьці да неаблічальных шкод, нават паміма сваей волі. Так, як вучыцель пачатковай школы ня можа стацца рэктарам унівэрсытэту, як звычайны сьлёсар ня можа стацца дырэктарам фабрыкі, як санітар ня можа стацца загадчыкам клінікі, аматар ня можа быць дырэктарам опэры, так і звычайны грамадзянін без адпаведнай асьветы, практыкі й здольнасьцяў ня можа займаць вядучага становішча ў палітычным жыцьці народу. Сёньняшняя навука называе палітыку практычнай філязофіяй, ці, інакш кажучы, правядзеньнем у жыцьцё выніку стагодзьдзяў людзкога думаньня. З гэтага пункту гледжаньня нашы мантрэальцы можа й маюць рацыю, калі кажуць, што дзеля нізкага зроўню ўмысловага разьвіцьця, не ўважаюць за адпаведнае займацца палітыкай. У такім сэнсе гэту скромнасьць трэба толькі прывітаць у процівагу да некаторых, якія ўважаюць сябе майстрамі на ўсе рукі бязь ніякай навукі й падрыхтоўкі.

Але ў палітыцы, як і ўва ўсім, ёсьць і ніжэйшыя ступені. Урадаўцам у палітычных інстытуцыях ці арганізацыях, як дзяржаўных, так і нацыянальных, трэба быць кампэтэнтнымі ў палітыцы дзеля іх работы, хоць і не вымагаецца ад іх укладаньня самастойных палітычных кан-

цэпцыяў ці плянаў. Патрэбны таксама кампэтэнтныя ў палітыцы людзі ў аддзелах нацыянальных і палітычных арганізацыяў на мясцох, якія праводзяць у жыццё палітычныя канцэпцыі нашых вядучых палітычных дзеячоў і асьведамляюць палітычна сяброў арганізацыяў пры помачы дакладаў і дыскусіяў. Яны могуць гуляць вельмі паважную ролю, бо на іх кладзецца цяжар палітычнага выраблення нашага грамадзтва.

Урэшце падыходзім да найважнейшага дзейніка – масы нашага грамадзтва. Сярод апошняй могуць буць людзі зусім мала граматныя, або й бязграматныя. Аднак з гэтага не вынікае, што яны не павінны браць удзелу ў нашым палітычным жыцьці, што яны могуць быць палітычна нявыраблены мі. Наадварот, яны павінны арыентавацца ўва ўсіх нашых палітычных справах, бо ад іх залежыць наша палітычнае змаганьне, ад таго, ці яны падтрымаюць яго, ці не. Яны зьяўляюцца дэцыдуючым дзейнікам у высоўваньні нашай палітычнай рэпрэзэнтацыі, а апошняя ня зможа зрабіць нічога бязь іх падтрыманьня.

Усе тры (а можа быць і больш) разгледжаныя тут ступені палітычнай дзейнасьці маюць велізарнае значэньне кожная паасобку і ўсе разам. Памысны вынік палітычнай працы залежыць ад гарманійнай дзейнасьці ўсіх трох. Адсутнасьць кожнага зь іх паасобку спрычыніцца да заламаньня ўсяе дзейнасьці, так як фабрыка ня можа ісьці бяз кіраўніцтва, тэхнікаў, ці работнікаў, так і палітычная праца ня можа быць памыснай без адпаведнага кіраўніцтва, папулярызатараў-актывістаў і цэлага грамадзтва. У гэтым цьверджаньні знаходзіцца адказ на пытаньні ці людзі зь нізкім умысловым зроўнем могуць браць удзел у палітычным жыцьці.

Як бачым, палітыка ахоплівае ўсе аспэкты нашага жыцьця, калі мы прызнаёмся да саміх сябе й лучымся ў арганізацыі. Нашым нацыянальным абавязкам ёсьць прыняць чынны ўдзел у ёй, кожны на сваім месцы, паводле сваіх сіл і здольнасьцяў, а не адкідаць яе ад сябе, як нешта злое. Мусім рабіць так, як робяць усе культурныя народы. Мусім займацца палітыкай усе, але кожны на сваім ступені, паводле сваёй кампэтэнцыі, здаючы сабе справу з таго, што кожная ступень аднолькава важная й карысная. Шкода будзе толькі тады, калі хто бярэцца за не сваё, хапаецца за вышэйшую ступень, ня маючы да гэ-

тага ні адпаведнай падгатоўкі, ні практыкі, ні здольнасьцяў.

Памылковы погляд

Нашы сябры з Мантрэалю мыляюцца, калі кажуць, што яны могуць не займацца палітыкай. Папершае яны самі сабе пярэчаць. Паколькі яны сьвяткуюць Слуцкае Паўстаньне й Дзень Незалажнасьці Беларусі – яны займаюцца палітыкай. Паколькі яны вядуць культурна-асьветную працу дзеля нацыянальнага ўсьведамленьня беларусаў і хочуць спрычыніцца да памысных вынікаў нацыянальна-вызвольнага руху – гэтым самым яны таксама займаюцца палітыкай. Адно, чаго яны, відаць, хочуць унікнуць – гэта працы над палітычным выраблень-нем сваіх сяброў шляхам палітычных дакладаў, рэфэратаў і дыскусіяў. Хочуць унікнуць аднэй з найважнейшай дзейнасьці ў нашым вызвольным руху. Відаць, не здаюць сабе справы з памылковасьці сваіх поглядаў, як і з таго, што народ, які ня выраблены палітычна, і ня мае сваіх палітычных асьпірацыяў, ніколі ня можа вызваліцца зь няволі, яго ніхто не захоча прызнаць за народ, уважаючы за нейкую этнаграфічную масу, якая можа быць толькі гноівам для разьвіцьця іншага народу, зьняволіўшага яго.

Весьці культурна-асьветную працу – гэта добрая й карысная справа. Але гэта толькі адзін бок нашай дзейнасьці. А хто-ж займецца палітычным выраблень-нем нашага грамадзтва? Папросім мо бальшавікоў, ці палякаў? Ніхто, толькі мы самі. А калі мы самі гэтым не займемся, дык і вынікі відаць адразу – палітычная нясьведамасьць. Вось вам прыклад. Нашы мантрэальскія сябры закідаюць нам, што мы ў Таронта гразьнем у палітычных спрэчках. Якраз у нас няма ніякіх палітычных спрэчак, якія-б апіраліся на розьніцы палітычных паглядаў ці партыйных праграм. Ды й партыяў у нас няма, калі ня лічыць аднаасобнай народнай партыі сп-ра Хмары. Такія спрэчкі, як мы маем, могуць кожную хвіліну ўзьнікнуць і ў Монтрэалі, які адхрышчваецца ад усякай палітыкі, калі там зноўйдзецца амбітная асоба, якая за ўсякую цану захоча рапцам быць рэдактарам, хоць ня мае на гэта ніякіх кваліфікацыяў, або акажацца такі суб'ект, для якога ня існуюць ніякія статуты ні рэгуляміны, а ўсё мае быць так, як ён хоча. Калі-ж такім асобам ня ўступіць, дык і пачнуцца

спрэчкі, могуць нават паўстаць новыя арганізацыі. Але-ж гэтага ні ў якім выпадку нельга назваць палітыкай.

Трэба-ж навучыцца ўрэшце адрозьніваць палітыку – работу для агульнага грамадзкага дабра – ад палітыканства – работы дзеля асабістых капрысаў і амбіцыяў. Але навука прыдзе толькі тады, калі мы вырабімся палітычна. Дзеля гэтага мы павінны працаваць над палітычным усьведамленьнем сваім асабістым і агульнаграмадзкім, а не адхрышчывацца ад палітыкі.

Магутнасьць народу залежыць ня столькі ад яго ліку й багацьця, колькі ад палітычнай сьведамасьці, палітычнай дасьпеласьці яго.

Заляшчанін» (В. Жук-Грышкевіч)

(«Беларускі Эмігрант», Таронта, Год V, 9 (47), кастрычнік, 1952.)

Лекцыі зь беларускай літаратуры на ўнівэрсытэце ў Атаве

«У часе летняй сэсіі 1952 году Усходня – й Паўднёва – Эўрапэйскага Інстытуту Унівэрсытэту ў Атаве праф. В. Жук-Грышкевіч прачытаў дзьве лекцыі з новай беларускай літаратуры: 1. Беларуская літаратура ў 19-ым веку; і 2. Нашаніўская пара.»

(«Беларускі Эмігрант», Таронта, Год V, нр. 7 (45), ліпень, 1952.)

У Украінскім Літаратурна-Мастацкім Клюбе

Украінскі Літаратурна-Мастацкі Клюб запрашае др. Вінцэнта Жук-Грышкевіча й сп. Алеся Грыцука рабіць у іх даклады зь беларускай літаратуры. Два такія даклады Вінцэнта памятаю, бо ён мяне прасіў дзеля ілюстрацыі тэмы дакладу рэцытаваць адпаведныя вершы. Тэмы першага дакладу ня памятаю, ведаю толькі, што дэклямавала верш Максіма Танка. Другі даклад Вінцэнта быў пра жыцьцё й творчасьць Янкі Купалы. Памятаю, вясной 1953 году, увечары пасьля заняткаў – студыявала тады пры Тарантонскім унівэрсытэце дэнтыстыку – сьпяшалася дамоў прыстроіцца й троху дэнэрвавалася, каб хоць дзе не забыць даўгое й мае любімае паэмы Янкі Купалы «На Куцьцю». Пасьля рэцытацыі яе казалі мне, што выглядала

я, як сьвятая. Не я, а Богам натхнёная Купалава паэзія – сьвятая!

...Ня ўмруць, ня ўмруць ужо яны,
Раз хочуць сонца, славы, песьні;
Заб'юць ім зычныя званы
Прабудным звонам на прадвесьні,
Сваёй забранай старане,
Скаванай мучаніцы княжне
Узьнясуць пасад на кургане
На панаваньне недасяжне...

У 4-тым нумары, «Беларускага Эмігранта» за красавік 1953 году зьмешчана такая зацемка:

«Лекцыя аб Купале для украінцаў

17-га красавіка г.г. (1953) у Украінскім Літаратурна-Мастацкім Клюбе ў Таронта д-р В. Жук-Грышкевіч прачытаў лекцыю «Жыцьцё й творчасьць Янкі Купалы». На заканчэньне выступіла з мастацкай дэклямацыяй паэмы Купалы «На Куцьцю» сп-ня Р. Жукоўская. Як лекцыя, так і дэклямацыя выклікала вялікае зацікаўленьне сярод украінскага грамадзтва.»

Лектарат беларусаведы

Пры ўнівэрсытэце ў Таронта існаваў аддзел сьлявістыкі, дырэктарам якога ў 50-тых гадох быў праф. Шор (Shore). Аддзел гэты, апрача нармальных лекцыяў для студэнтаў, арганізаваў пры – University Extension – для шырэйшых грамадзкіх кругоў лектараты славянскіх моваў і культуры. Ад даўжэйшага часу існавалі ўжо лектараты: украінскі, польскі, чэскі, славацкі й іншыя.

У сакавіку 1951 году праф. В. Жук-Грышкевіч дамовіўся з праф. Шорам, што з пачаткам 1951/52 акадэмічнага году будзе адчынены беларускі лектарат, аб чым і было пададзена да ведама зацікаўленых у ўнівэрсытэцкім сьпісе лекцыяў і лектаратаў, так і асобнымі ўнівэрсытэцкімі абвесткамі.

15 кастрычніка 1951 г. беларускі лектарат урачыста быў адчынены праф. Шорам. Із згодаю праф. Шора лектарат быў ператвораны з лектарату беларускае мовы ў лектарат беларусаведы, і ён трываў да 30 сакавіка 1952 году. Увесь курс лектарату даў слухачом 20 лекцыяў зь гісторыі Беларусі, па 2 гадзіны кожная. Курс быў закончаны экзаменам.

На наступную зіму праектуецца курс у дзьвёх групах: беларуская мова й беларуская культура. Курс пачнецца ў кастрычніку, запісы прыймаюцца ад месяца верасьня.

(Паводле: «ЗАПІСЫ» No. 1, Vol. 1, New York 1952.)

У «Беларускім Эміграпце», Таронта, нр. 4 (42), з 20 красавіка, 1952 году М. Р. падае наступную зацемку:

«Заканчэньне Лектарату Беларусаведы ў Таронта

Дня 30 сакавіка г.г. (1952, Р. Ж.-Г.) удзельнікі Лектарату Беларусаведы пры Ўнівэрсытэце ў Торонто ўрачыста закончылі свой курс, запрашаючы сваіх сяброў і знаёмых на супольную гарбатку ў памешканьні сьвятліцы ЗБК.

У мілай і паважнай атмасфэры слухачы й лектары курсу падзяліліся сваімі асягненьнямі, ведамі. Зьмястоўную справаздачу з прабегу працы й яе вынікі падаў арганізатар лектарату й выкладчык сп. праф. Жук (В. Жук-Грышкевіч – Р.Ж.-Г.). Ён зазначыў, што курс абняў 20 лекцыяў, па дзьве гадзіны кожная. Кожная лекцыя прадстаўляла сабой разгляд важнейшай праблемы зь гісторыі Беларусі ў храналягічным парадку, а мяноўна:

1. Беларусы й іх мова сярод іншых народаў.
2. Пачатак гісторыі Беларусі; княжы пэрыяд, хрысьціянства.
3. Барацьба Полаччыны з Кіевам (рэфэрат сп. мгр. А. Грыцука).
4. Беларусь пад назовам Вялікага Княства Літоўскага.
5. Вітаўт Вялікі; Ворскла, Грунвальд.
6. Сьвідрыгайла; зраўнаньне ў правох праваслаўнага баярства.
7. Часы Казіміра Ягайлавіча, яго палітыка, яго судзебнік.
8. Жыгімонт II-гі й III-ці Аўгуст; адносіны з Масквой.
9. Літоўскі Статут, Літоўская Мэтрыка.
10. Вуніі з Польшчай, сутнасьць і прабег іх.
11. Гуманізм і рэфармацыя на Беларусі; культура, асьвета, друкарства.
12. Дзяржаўна-адміністрацыйны лад Вялікага Княства Літоўскага. Суды.
13. Парлямэнтарызм у Вялікім Княстве Літоўскім. Сойм, соймікі.

14. Эканамічныя й сацыяльныя адносіны ў Вялікім Княстве Літоўскім. Гарады й вёскі.
15. Беларускасьць культуры ў Вялікім Княстве Літоўскім.
16. Вялікае Княства Літоўскае пасьля Люблінскай вуніі.
17. Рэчыпаспалітая двух народаў, а ня Польшча.
18. Беларусь пад Расеяй.
19. Адраджэньне Беларусі.
20. Пісьменны экзамен.

Ад імя ўдзельнікаў курсу й гасьцей сп-ня Н. Навіцкая падзякавала сп. праф. Жуку (Жук-Грышкевічу – Р. Ж.-Г.) за ягоную ахвярнасьць і працу для дабра беларускае справы на эміграцыі, перадала маленькі падарунак выкладчыку й пажадала, каб наступны курс наведвалі ўсе беларусы Таронта.

Вечар прайшоў міла ў сяброўска-беларускай сямейцы. Кожны даў штось з сябе – песьню, расказ, дэклямацыю, а беларуская песьня гучэла няўпынна з маладых грудзей. Кожны з нас выняс незабыўнае ўражаньне й думку, што беларус ня толькі жыве, змагаецца, але й вучыцца.

У верасьні г.г. (1952, Р. Ж.-Г.) будуць прыймацца запісы на наступны курс. Праектуецца дзьве групы: 1) Беларуская мова; 2) Беларуская літаратура й культура. Далейшыя інфармацыі будзе падаваць «Беларускі Эмігрант».

М. Р. (праўдападобна М. Рачыцкі, Р. Ж.-Г.)

(«Беларускі Эмігрант», Таронта, 4 (42), 20 красавіка 1952.)

Другі год Лектарату Беларусаведы

«Лектарат Беларусаведы пры Унівэрсытэце Таронта распачаў у пятніцу 24 кастрычніка (1952 г.) другі год навучаньня. Жадаем плённай працы выкладчыку сп-ру праф. Жук-Грышкевічу й слухачом, а тым, што жадалі-б яшчэ ўступіць на курс, паведамляем, што могуць гэта зрабіць, злажыўшы заяву да сп-ра Грышкевіча. Аплата за курс выносіць у гэтым годзе 12 даляраў.»

(«Распачаў працу Лектарат Беларусаведы.» «Беларускі Эмігрант», Таронта, Год V, 9 [47], 1952.)

А «ў нядзелю, 26-га кастрычніка, 1952 г., у сьвятліцы ЗБК слухачы лектарату й запрошаныя госьці міла правялі вечар, прысьвечаны адкрыцьцю навучальнага году на лектараце беларусаведы пры ўнівэрсытэце ў Таронта.

Пры гульнях, сьпевах і танцах вечар прайшоў вельмі прыемна. Вялікая падзяка належыцца сп-ні Р. Жукоўскай і сп-ні Н. Барановіч за падрыхтоўку пачастунку.» – чытаем у зацемцы «Вечар Лектарату Беларусаведы» ў «Беларускім Эмігранце», Таронта, 9 (47), 1952.

Паводле артыкулу: «**Заканчэньне Лектарату Беларусаведы пры Унівэрсытэце ў Таронта на 1952/53 г.**» у «Беларускім Эмігранце», Таронта, за красавік 1953 г., у гэтым акадэмічным годзе адбыўся «другі курс» лектарату, які складаўся з «20-ці двугадзінных лекцыяў» і «абняў беларускую літаратуру й аснаўныя асаблівасьці беларускае мовы – з фанэтыкі, марфалёгіі й сынтаксу. Кожная лекцыя складалася з дзвюх частак: зь літаратурнай і мовазнаўчай. Літаратура была падзелена на 20 лекцыяў такім чынам:

1. Паняцьце літаратуры. Падзел беларускай літаратуры. Царкоўнаславяншчына (11, 12 век). Падгатаваўчая пара (14, 15 век).
2. Залатая пара (16 век). Гуманізм і рэфармацыя. Друкарства. Духоўная літаратура: Франьцішак Скарына, Васіль Цяпінскі, Сымон Будны.
3. Сьвецкая літаратура: Хронікі, Буркалабаўская хроніка; Одпісы Філона Кміты, Т. Еўлашэўскі,Прамова Мялешкі, А. Рымша.
4. Юрыдычная літаратура: Леў Сапега, Літоўскі Статут, Літоўская Мэтрыка, Перакладныя повесьці.
5. Заняпад беларускага пісьменства (17, 18 век). Палемічная літаратура. Інтэрмэдыі. Школьная драма. Марашэўскі.
6. Беларускае народнае творства: песьні, казкі, лягэнды, прыказкі.
7. Адраджэньне новай беларускай літаратуры (19 век) Беларуская «Энэіда,» «Тарас на Парнасе.» Пачатак этнаграфіі.
8. Рамантызм. Старашляхоцкія рамантыкі: Баршчэўскі, Рыпінскі, Чачот.
9. Марцінкевіч: «Сялянка», «Гапон», «Вечарніцы», «Шчароўскія дажынкі», «Купальле», «Залёты», «Пінская шляхта», пераклад «Пана Тадэуша». Пасьлядоўнікі Марцінкевіча: Дарэўскі-Вярыга, Каратынскі, Сыракомля.
10. Беларускае народніцтва: Багушэвіч, Няслухоўскі.
11. Навейшая беларуская літаратура: Каганец, Цётка, Ядвігін Ш., Нашаніўская пара.

12. Янка Купала.
13. Якуб Колас.
14. Максім Багдановіч, Зьмітрок Бядуля.
15. Алесь Гарун, Максім Гарэцкі, Гурло, Галубок.
16. Драматургі: Аляхновіч, Галубок.
17. Цішка Гартны. Паэты сьвятары: Казімір Сваяк, Вінцук Адважны.
18. Савецкая беларуская літаратура. Літаратурныя згуртаваньні: «Полымя», «Маладняк», «Узвышша».
19. Маладнякоўцы: М. Чарот, Александровіч, Дудар, А. Вольны.
20. Узвышэнцы: Язэп Пушча, Уладзімер Дубоўка, К. Чорны, Крапіва.»

Курс закончыўся ў палове красавіка 1953 г. «Як у мінулым годзе, так і ў гэтым, – гаворыцца далей у артыкуле, – у сьвятліцы ЗБК адбылося ўрачыстае заканчэньне Курсу Лектарату Беларусаведы 19 красавіка... Прадстаўнік ад студэнтаў курсу ў сваім уступным слове, адкрываючы вечар, злажыў шчырую падзяку выкладчыку лектарату сп. д-ру В. Жук-Грышкевічу і ўручыў яму ад вучняў падарак». Апрача студэнтаў курсу, былі прысутныя шматлікія госьці. Сп. др. Жук-Грышкевіч пазнаёміў прысутных з праробленай на курсе праграмай, коратка аналізуючы кожную лекцыю, наканец, зьвярнуўся з заклікам да мясцовых беларусаў, каб прылажылі стараньняў, каб гэты курс ня быў апошнім... Вечар прайшоў надзвычай міла й адзначыў закрыцьцё яшчэ адной балонкі вялікіх асягненьняў у ўсьведамленьні й адукацыі беларускага грамадзтва на чужыне. Спадару д-ру В. Жук-Грышкевічу, дзякуючы няўтомнай працы й стараньням якога Лектарат паўстаў і праіснаваў два сэзоны навучаньня, ад беларускага грамадзтва ў Таронта належыцца самая сардэчная падзяка. К.»

(«Беларускі Эмігрант», Таронта, Год VI, нр.4 [52], красавік, 1953.)

Аб другім курсе Лектарату Беларусаведы ў Таронта паведамляюць і «Запісы» 2, Нью Ёрк, 1953.

Я наведвала лектарат беларусаведы ад першае яго лекцыі да апошняе. Выклады адбываліся заўсёды ўвечары. Пасьля заняткаў з сваім Прафэсарам заходзілі мы ў студэнцкую кафейку, што знаходзілася недалёка ўнівэрсытэту. У гутарках пры кубку кавы праводзілі мы прыемныя часіны адпачынку й адпружаньня. Вінцук заказваў

каву, а я малако, бо калі ўжо выдаваць дзесяць цэнтаў, дык прынамсі на нешта пажыўнае... думала сабе. Была я тады студэнткай дэнтыстыкі, і матар'яльна прыходзілася мне даволі тугавата, бо навет у багатай Канадзе некаторым студэнтам заўсёды не ставала «пажыўнага»...

Затое мне, выпусьніку з польскіх школ, з польскай гімназіі, курс гісторыі Беларусі й курс гісторыі беларускай літаратуры, якія я праслухала ў часе двох сэзонаў лектарату беларусаведы, былі здабычай, якраз той бясцэннай інтэлектуальнай пажывай, якая памагала мне выпаўняць, і пасьля, прабелы ведаў аб сваім родным краі – Беларусі.

Лектарат Беларусаведы прадаўжаўся, на колькі памятаю, і ў 1953/54 навучальным годзе. Былі гутаркі, каб мгр. Алесь Грыцук пераняў яго, бо др. В. Жук-Грышкевіч у лютым 1954 году мусіў выехаць у Мюнхэн у Нямеччыну, дзе яго чакала наступнае заданьне – арганізаваць і весьці беларускую сэкцыю радыя «Вызваленьне».

Трагічная сьмерць паслоў Работніцка-Сялянскай Грамады

Перад выездам у Нямеччыну Вінцэнт Жук-Грышкевіч падае ў 3-ім нумары «Беларускага Эмігранта» за 25 сакавіка 1952 году артыкул: «Трагічная сьмерць паслоў Работніцка-Сялянскай Грамады», які тут цытуем у цэласьці:

«Прыпадкова трапіла мне ў рукі ўкраінская кніжка Підгайнага ‹Нідостріляні›, выданая ў 1949 г. Аўтар апісвае свой мучаніцкі шлях, які правёў ён у савецкіх лягерох. Адзін разьдзел сваёй кніжкі ён прысьвячае спэцыяльна беларусам, якіх спаткаў на сваім шляху. Там мы, між іншым, і знаходзім заканчэньне трагэдыі беларускіх грамадаўскіх паслоў на Салаўках. Вось што кажа спадар Підгайный:

«Зімой 1933 г. я быў недалёка ад станцыі Кем на гэтак званым ‹Морсплаве› – перасыльным пункце, праз які йшлі этапы на Салаўкі. Тут я сустрэў толькі-што прыбыўшую групу беларусаў зь Менску.

Перадусім прыпомню тут групу гэтак званага «Беларускага Нацыянальнага Цэнтру», што складалася зь беларусаў, якія вярнуліся ў Савецкую Беларусь. Гэта былі калішнія сябры беларускай «Грамады» – арганізацыі з тэры-

торыі Заходняе Беларусі, што была пад Польшчай. Група гэта апынулася ў польскай турме ды пазьней была выменена на беларускіх і польскіх вязьняў, якія сядзелі ў савецкіх турмах.

Зь вялікім трыумфам і помпай ехалі гэтыя ахвяры польскай сваволі ў Савецкую Беларусь – «шчасьлівую, незалежную й самастойную сацыялістычную беларускую дзяржаву». Курорты, санаторыі, банкеты, найлепшыя пасады – усё было да дыспазыцыі гэтых мучанікаў-рэвалюцыянераў, над якімі так зьдзекаваліся фашысты-палякі. Сапраўды пачалося жыцьцё не звычайнае, а поўнае сьвята. Рак-Міхайлоўскі, Дварчанін (прозьвішча памылкова падана Дварчанінаў, правільна будзе Дварчанін – без канчатку «аў». заўвага мая, Ж.), Мятла, Гаўрылік – былі шчасьлівы надмеру.

Ды сьвяточны пэрыяд неяк незаўважна кончыўся й настала звычайная савецкая будзёншчына. Сябры «Грамады», калішнія паслы польскага сойму, найменш спадзяваліся гэтае будзёншчыны ды зьдзіўлена пачалі азірацца навокал. А кругом іх быў жах, а навакол быў пагром за пагромам, і «грамадаўцы» задумаліся. Ды думаць доўга не давялося, бо незабавам тыя звычайныя беларускія (савецкія, прып. наш, – Ж.) буднія дні зачапілі іх саміх, пэўных, што савецкія ўлады – гэта шчасьце для беларускага народу.

Савецкая сапраўднасьць прыйшла неспадзявана, і нашыя лятуценьнікі апынуліся ў найбольшай менскай турме, на беларускай, але, нажаль, не сваёй зямлі.

* * *

Рак-Міхайлоўскі, Мятла, Дварчанін ды іншыя былі засуджаныя **ЗА ШПІЯНАЖ НА КАРЫСЬЦЬ ПОЛЬШЧЫ** (падкрэсьленьне нашае, Ж.), удзел у падпольнай нацыяналістычнай арганізацыі, у збройным паўстаньні, у выкарыстаньні дзяржаўнай трыбуны дзеля контррэвалюцыйных мэтаў, у тэроры супраць прадстаўнікоў савецкае ўлады. А ўсе гэтыя страшныя правіны яны зрабілі ў падпольнай арганізацыі, што называлася «Беларускі Нацыянальны Цэнтр».

Якраз у менскім ГПУ гэтыя «возвращенцы» зразумелі, што прадстаўляе сабою савецкая ўлада й што такое «савецкая сацыялістычная Беларусь».

У турму іх, гадаў, на Салаўкі, – крычэлі тыя, што так нядаўна іх віталі, і праслаўленыя героі апынуліся ў глыбокіх лёхах менскага ГПУ.

Але мала было кінуць іх у турму. Трэба было прымусіць абчарніць сябе, напісаць пра сябе, што яны сапраўды зацятыя ворагі бальшавікоў, што яны даканалі страшных злачынстваў і што яны са сьлязьмі просяць аб памілаваньне. Амаль год сядзелі калішнія грамадаўцы, і энкавэдыстаўскія галаварэзы з ГПУ ня толькі павыцягвалі ім жылы, але некаторым і душы павыварачвалі ды затапталі ў балота.

Няшчаснымі й жалюгоднымі прыбылі на Салаўкі гэтыя «ўладары», што сталіся наймізарнейшымі нявольнікамі.

* * *

З усіх іх найвыдатнейшым і найбардзейшым быў Рак-Міхайлоўскі. Ня ведаю пра яго мінулае, ня ведаю й пра ягоную дзейнасьць у Савецкай Беларусі. Магу сьцьвердзіць толькі адно, што гэты чалавек сапраўды адкрыта й без найменшага жалю казаў: «Так нам і трэба». Мне давялося некалькі разоў гутарыць з Рак-Міхайлоўскім, і ён на мяне зрабіў добрае ўражаньне. Здавалася, што чалавек, галава якога была шчыльна набіта ўсякай саветафільскай начынкай, ня можа так хутка прыйсьці да сьведамасьці, але ў Рак-Міхайлоўскага гэты чад борзда разьвеяўся. Ён рашуча й катэгарычна асуджаў усё, у што так сьлепа паверыў, і грыз сябе за мінулае. На Салаўках трымаўся незалежна, працаваў на цяжкіх фізычных работах, скрозь і заўсёды падкрэсьліваючы сваю нянавісьць да бальшавікоў, да Масквы, і ўрэшце дзесь у 1936 годзе папаўся ў адзін з салавецкіх ізалятараў. З гэтага часу я ня меў пра яго ніякіх вестак.

Высокі, гонкі, з сінява-шэрымі вачыма, Мятла быў лірычна-кволаю, ціхай адзінкай, і ніколі не выконваў нормы.

На Салаўках давялося капаць канавы на мэльёрацыйных работах, а ў выніку гэтага ён трапіў у салавецкі гошпіталь, адкуль патаемна вынясьлі толькі труп Мятлы, а дзе пахавалі – ніхто ня ведае. Гэта сумная падзея адбылася восеньню 1936 году.

Я любіў слухаць, як ён апавядаў пра Польшчу, пра тое, што яго змусіла стацца беларускім камуністам, што

прывяло яго да гэтых страшных, усёўпасьледжываючых салавецкіх тартураў. Ён быў хворы на сухоты, кашляў, а працаваў на цяжкой непасільнай для яго рабоце. Яшчэ на «Морсплаве», габлюючы брускі ў дрэваапрацоўчай майстэрні, кідаючы гэбаль, казаў:

– Не, ня вытрымаю! Каб хаця нормы былі меншыя!

* * *

Бледны, з чорнай барадою, крыху прыгорблены Дварчанін сваёй манерай у гутарцы прыпамінаў прафэсара. Ён ніколі не казаў прамоваў, як гэта рабіў Рак-Міхайлоўскі, і ня ставіў кропкі над і. Не, ён спакойна стараўся ўсё зважыць, пераацаніць і знайсьці забыты ўжо шлях да ўласнай нацыі. На Салаўках трымаўся вельмі прызваіта й дзяржаўся добрага таварыства. Працаваў спачатку на гэтак званых агульных работах, і адносна яго ня было ніякіх выбрыкаў з боку ГПУ. Але ён таксама ў 1936 годзе трапіў у ізалятар і ўжо пасьля нічога больш пра яго ня было чуваць.

Гаўрылік быў тыповым народным настаўнікам.Высокі, русавы, з рыжанькай бародкай на круглым адкрытым твары, з крыху кірпатым носам. Ад яго аж грэла моцным беларускім дзядзькам. Ён быў мілым чалавекам, чэсным, працавітым і спакойным. Ён неахвотна ўступаў у гутарку, але калі ўжо пачаў гаварыць, то гаварыуў доўга й з запалам, быццам баючыся, што слухачы яго не зразумеюць. Але найчасьцей ён быў адзінокім і толькі ягоныя задумлівыя вочы ўглядаліся кудысь у далечу. На ніводным з гэтай групы беларусаў менская трагэдыя не адбілася так цяжка, як на гэтым настаўніку. Ён ня мог нават слухаць гутаркі пра Менск, пра савецкую Беларусь, пра савецкі сацыялізм. Так ён яго зьненавідзіў і так ён яго праклінаў. Ён прыпамінаў таго шэкспіраўскага героя, які казаў: «Так, вы навучылі мяне гаварыць і я магу вас цяпер праклінаць.» Гэта страшная траўма, гэты ўсёўпасьледжваючы жах прывёў Гаўрыліка да запярэчаньня самой магчымасьці каяцца. Ён казаў: «Я – найнешчасьлівейшы чалавек, бо не магу, ня маю нават права падняць сваю галаву да неба й паглядзець на зоры зь іх вечнаю й непарушнаю справядлівасьцяй». І вось ён, калішні камуніст, станавіўся на калені шчыра й аддана маліцца Богу ды прасіў памілаваньня й прабачэньня для яго акаяннага.

Дзесь у канцы 1936 году я апошні раз сустрэў Гаўрыліка на маленькай абтоцы «Малыя зайчыкі», дзе ён знаходзіўся зь некалькімі «штрафнымі». Хтось з тамтэйшых бывальцаў назваў яго «камуністычным манахам». Ён быў страшэнна змучаным, ні з кім ня гутарыў, вечарамі выходзіў з бараку й за дзікаю сівою заімшалаю скалою станавіўся на калені ды доўга маліўся. Ужо паўзвар'яваным забралі яго з тых «Малых зайчыкаў» і пасадзілі ў ізалятар, адкуль ён так і ня выйшаў.»

* * *

«Столькі кажа спадар Підгайный аб лёсе беларускіх грамадаўскіх паслоў. Іншыя беларускія постаці, прадстаўленыя ў ягонай кніжцы, мала знаныя й менш цікавыя. Гэтыя чатыры – Рак-Міхайлоўскі, др. Дварчанін. Гаўрылік і Мятла былі моцнымі беларусамі й гулялі паважную ролю ў беларускім вызвольным руху, асабліва першыя два. Ніяк нельга паверыць, што яны сталіся камуністамі. Іх апісаньне й характэрыстыкі правільныя, сьцьвердзіць гэта кожны, хто знаў іх асабіста. Факт гэты служыць довадам праўдзівасьці й апісаньня макабрычнай гісторыі заканчэньня іх жыцьця. Няма чаго дадаваць, усё ясна, ня трэба ніякіх камэнтараў.

Трэба падаць, аднак, крыху фактычных паясьненьняў, якія шаноўнаму аўтару маглі быць няведамымі. Грамадаўскія паслы прайшлі ў польскі сойм, пры выбарах у 1922 годзе. Тварылі яны асобны грамадаўскі клюб, адыйшоўшы ад агульнага Беларускага Пасольскага Клюбу ў 1925 г. Было іх чатырох: Тарашкевіч (старшыня), Рак-Міхайлоўскі, Мятла й Валошын – так, як яны прадстаўлены тут на здымку, на якім знаходзім і пасла Галавача – таксама беларуса, які прыйшоў з Незалежнай Сялянскай Партыі й супрацоўнічаў з грамадаўцамі. Усе чатыры былі арыштаваныя польскай паліцыяй у студзені 1927 г. пры разгроме Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады й польскі суд засудзіў іх на доўгія тэрміны – па восем гадоў кожнаму. Тры зь іх, апрача Тарашкевіча, пападаюць у Саветы раней, а Тарашкевіч значна пазьней, будучы вымяняным на ведамага беларускага драматурга Ф. Аляхновіча. Спадар Підгайный апісаў нам трагічны канец Рак-Міхайлоўскага й Мятлы. Аб лёсе Тарашкевіча й Валошына ён ня ўспамінае.

Др. Дварчанін і Гаўрылік разам з Валынцом, Гарэцкім і Стагановічам былі выбраны ў польскі сойм на другую кадэнцыю – ў 1928 г. Належылі яны да клюбу «Змаганьне», што рэпрэзэнтаваў левы кірунак Грамады, якая пасьля разгрому была ў падпольлі. У польскую турму яны папалі нешта па годзе пасьля выбараў, але толькі Дварчанін, Гаўрылік і Валынец згадзіліся на высылку іх у Саветы пры помачы вымены, больш-менш у тым самым часе, як і першыя грамадаўцы. Мы даведаліся тут аб лёсе Дварчаніна, а што сталася з Валынцом – ня ведаем.

Трагэдыя паслоў Рак-Міхайлоўскага, Мятлы, д-ра Дварчаніна й Гаўрыліка ёсьць толькі малым фрагмэнтам тэй вялікай трагэдыі, якую перажывае ўвесь беларускі народ пад акупацыяй маскоўскіх бальшавікоў. Так, як мучыліся й паміралі грамадаўскія паслы – мучацца й паміраюць сотні тысячаў лепшых сыноў Беларусі. Але ня гледзячы на гэта – Дабравешчаньне 25 Сакавіка перамагае тэрор, цемру й варожыя злачынствы. У муках паміраюць тысячы, каб паўсталі мільёны на барацьбу за сваю праўду.

Жук.»

(«Беларускі Эмігрант», Таронта, нр. III (41), 25 сакавіка, 1952 г.)

«Байкот Амэрыканскага Камітэту Вызваленьня Народаў Расеі, ці ўдзел у ім?»

Артыкул Заляшчаніна (псэўдонім В. Жук-Грышкевіча, – Р. Ж.-Г.) зьмешчаны ў «Беларускім Эмігранце» як дыскусыйны:

«Апошнімі часамі сярод эміграцыі падняўся шум у сувязі з узнаўленьнем дзейнасьці Амэрыканскага Камітэту Вызваленьня Народаў Расеі. Беларускія зарубежнікі схапіліся за прапагацыйныя артыкулы ў расейскай прэсе і, нават не дачакаўшыся камунікату Штарнбэрскай канфэрэнцыі, зь пенай на вуснах кінуліся на Раду Беларускае Народнае Рэспублікі і Старшыню яе інж. Абрамчыка з абвінавачваньнямі ў здрадзе, у прадажы Беларусі (Sic!) і таму падобнымі выкрыкамі, не задаючы сабе труду нават даведацца, ці абвінавачаныя бяруць удзел у канфэрэнцыі Амэрыканскага Камітэту. Выкрыкі гэтыя нікога ня зьдзівяць. Ужо даўно гэтыя «патрыёты» намагаюцца цягнуць у расейскае зарубежжа беларускую эміграцыю і нічога іншa-

га ня робяць, як лаяцца, крычаць і падбураюць. Калі мы зноў гаворым аб актуальным імкненьні Амэрыканскага Камітэту да стварэньня супольнага супрацьбальшавіцкага фронту, дык не з увагі на крыкуноў, а дзеля таго, што справа гэта вельмі важная, істотная для нас беларусоў, яна вымагае паважнага й саліднага разгляду, а таксама аб'ектыўнага інфармаваньня грамадзтва.

Як ведама, спробы стварэньня антыбальшавіцкага фронту на канфэрэнцыі ў Вісбадэне леташняй восеньню, як і пазьнейшыя намаганьні, кончыліся поўным фіяскам. СОНР тады распаўся. Прычынай гэтага распаду было імпэрыялістычнае настаўленьне расейцаў да паняволеных народаў, непрызнаваньне ім поўных правоў на самавызначэньне й сувэрэннасьць з аднаго боку, а з другога – станоўкасьць і непарушнасьць сваіх нацыянальных прынцыпаў прыймаючых удзел у канфэрэнцыі дэлегатаў гэтых народаў. Барацьба на канфэрэнцыі была зацятая, але расейцам проста немагчыма было зьбіць слушныя наступы дэлегатаў паняволеных народаў. Ім мусілі прызнаць рацыю й амэрыканцы й дэмакратычная прэса цэлага сьвету. Расейцы былі выведзеныя на чыстую ваду як імпэрыялісты, а іхныя захопніцкія пляны на той час пашлі пад сукно. Заслуга ў гэтым дэлегатаў паняволеных народаў і ў першую чаргу беларускага, які, як сьцьвердзіла рэпрэзэнтаваная на канфэрэнцыі эўрапэйская прэса, быў тараном супраць расейскіх намаганьняў. Цьверджаньне розных арганізацыяў паняволеных народаў, байкатаваўшых канфэрэнцыю, што быццам іх байкот спрычыніўся да развалу СОНР'у, ёсьць беспадстаўным, бо згары было ведама, што яны ня прымуць удзелу ў Вісбадэнскай канфэрэцыі, а канфэрэнцыя паміма гэтага адбылася, і калі-б дэлегаты паняволеных народаў пайшлі на ўгоду з расейцамі, то СОНР ня толькі не распаўся-б, але прыступіў-бы да выкананьня сваіх заданьняў, ня гледзячы на чыйсь байкот ці не байкот.

Такім чынам СОНР распаўся дзякуючы ўдарам знутра, што былі нанесены яму дэлегатамі паняволеных народаў. У гэтым якраз і выявіўся пазытыўны бок браньня ўдзелу ў канфэрэнцыі, а не байкатаваньне яе, чым давалася-б толькі вольную руку расейцам у правядзеньні іх плянаў. З гэтага можна выцягнуць і навуку на будучыню.

Падыходзячы да разгляду другой фазы працы Амэрыканскага Камітэту ўжо пад кіраўніцтвам Кэрка, трэба

ўзяць пад увагу, што апрача агульных плянаў Камітэту – **на парадку дня стаіць справа радыёперадачаў для народаў СССР на іх мовах** (падкрэсьляна мною, – Р. Ж.-Г.) з гатовай да дыспазыцыі магутнай радыёстанцыяй ў Мюнхэне. Было-б вялікае няшчасьце, калі-б ад імя беларусаў праз гэта радыё прамаўляў хтось іншы. Каб зразумець, што такая эвэнтуальнасьць магчымая, мусім узяць пад увагу наступныя факты.

Расейцы ёсьць найвялікшым народам з усяго СССР, і амэрыканцы ня могуць ігнараваць іх пры тварэньні антыбальшавіцкага фронту. У Амэрыканскім Камітэце Вызваленьня Народаў Расеі і ў кіраўніка яго адмірала Кэрка пануюць русафільскія тэндэнцыі. І гэта не выпадкова, а таму, што й у амэрыканскім урадзе і ў балышыні палітыкаў і грамадзтва пануюць гэтыя тэндэнцыі. Спрычынілася да гэтага расейская прапаганда, якая на працягу больш за сто год праз сваю навуку, дыплямацыю і шмат іншых дзейнікаў прадстаўляла расейскую імпэрыю, як і СССР цяпер, за суцэльны адзіны народ, старанна не дапускаючы вестак пра існаваньне іншых народаў і іх сэпаратыстычныя імкненьні.

Прабываючая ў Злучаных Штатах расейская эміграцыя сочыць старанна за тым, каб такі сфальшаваны погляд на Расею ў амэрыканцаў існаваў непарушна далей. Гэта заданьне аблягчае ім тая акалічнасьць, што расейскай інтэлігэнцыі ўдалося ўладзіцца ў розныя важнейшыя амэрыканскія дзяржаўныя ўстановы як дараднікам у справах СССР. Яны ня толькі пільнуюць непарушнасьці погляду аб непадзельнасьці Расеі, але ўсімі спосабамі стараюцца не дапусьціць да гэтых установаў прадстаўнікоў нерасейскіх нацыянальнасьцяў. Пераканаўся аб гэтым ня раз той, хто стараўся дабіцца да амэрыканскіх дэцыдуючых дзейнікаў. З гэтага фальшывага прадстаўленьня адзінства Расеі й вынікае русафільская амэрыканская палітыка, няспрыяльная для паняволеных Расеяй народаў. Яе ня зьменіш адным махам; каб гэтага дабіцца, трэба зьмяніць погляд на Расею 150 мільёнаў амэрыканцаў, трэба зьмяніць іх настаўленьне, падыход, псыхіку. На гэта трэба час і ўсільныя стараньні эмігрыцыяў паняволеных народаў, праніканьне ўва ўсе закуткі амэрыканскага жыцьця й пераконваньне амэрыканцаў. Толькі такім шляхам, а не шляхам байкоту, можна чагось дабіцца.

Расейская эміграцыя ня толькі пільнуе непарушнасьці погляду аб адзінстве Расеі. Яна выконвае ня менш шкоднае для нас і другое заданьне. Яна прэпаруе й накідае амэрыканцам апінію аб эміграцыях паняволеных народаў, прадстаўляючы іх у найцямнейшых хварбах залежна ад патрэбаў і акалічнасьцяў. То называе іх нацыстамі, то падкупленымі бальшавікамі здраднікамі Расеі, то кучкамі «асьцервянелых» нацыяналістаў і шавіністаў, варожых Расеі, супакою й міру. Ад гэтых прыметнікаў роіцца ўся расейская прэса. Таму ня трэба дзівіцца, што пры існуючых поглядах на Расею амэрыканцы вераць цьверджаньням расейцаў, што калі яны згодзяцца на аддзяленьне ад Расеі паняволеных народаў – дык увесь расейскі народ пойдзе за Сталінам. Праўда, сягоньня ўжо можна сьцьвердзіць нязначную зьмену на нашу карысьць, то той то іншы амэрыканскі палітык пераконваецца ў слушнасьці нашай справы, але шмат яшчэ трэба намаганьняў, каб зьмяніць амэрыканскі погляд на Расею, а разам з тым і іх палітыку.

Апрача таго ня трэба забывацца, што расейцы маюць у сваіх шэрагах сотні тысяч зрусыфікаваных беларусаў, украінцаў і іншых, якія выэміграваліі нясьведамыя нацыянальна й стаяць за «единую неделимую» Расею – сталінскую, царскую ці Керанскага. На іх расейскія эміграцыйныя палітыкі й апіраюцца, калі цьвердзяць, што беларусы, украінцы ці іншыя стаяць за адзіную Расею, што толькі групкі «падкупленых шавіністаў» хочуць аддзяляцца ад Расеі. Бяручы гэта пад увагу, трэба прызнаць аб'ектыўна, што пагроза расейцаў аб стварэньні антыбальшавіцкага камітэту з усіх нацыянальнасьцяў бяз удзелу сэпаратыстаў-незалежнікаў мае зусім рэальныя падставы. Больш таго, з расейскай прэсы відаць, што расейцы хацелі-б, каб ненавісныя ім сэпаратысты-незалежнікі збайкатавалі Амэрыканскі Камітэт, тады-б яны прынамсі мелі вольныя рукі. А што амэрыканцы падтрымлівалі-б і такі камітэт, дзе мелі-б прымат расейцы без сэпаратыстаў, яны ў гэтым пэўныя. Яны-б тады мелі яшчэ адзін довад на сваё цьверджаньне, што сэпаратысты супраць усялякага проціўбальшавіцкага фронту, што яны толькі крычаць аб сваёй нянавісьці да камунізму, а на самай справе трымаюцца сталінскай лініі. Таму нас ня дзівіць, што нашы зарубежнікі стаяць за байкот перамоваў з расейцамі, інспіраваных Амэрыканскім Камітэтам, з мэтай стварэньня су-

польнага антыбальшавіцкага фронту, бо наш удзел ня йдзе на карысьць расейскай палітыцы.

Ня трэба таксама забывацца, што ініцыятарам і дэцыдуючым дзейнікам у справе ўтварэньня супольнага з расейцамі антыбальшавіцкага фронту зьяўляюцца амэрыканцы ў асобе спэцыяльна створанага імі камітэту. Расейцы тут выступаюць як адзін з удзельнікаў, а не ініцыятар і гаспадар, як гэта сіліцца прадставіць варожая нам прапаганда. Факт гэты вельмі важны. Ёсьць сэнс і мэтазгоднасьць пераконваць аб слушнасьці нашай справы амэрыканцаў нават пры найвастрэйшай апазыцыі расейцаў.

Бяручы пад увагу ўсё вышэй сказанае, мусім сьцьвердзіць, што справа ўдзелу ці байкоту Амэрыканскага камітэту ня ёсьць такой простай. Мы ня можам зачыняць вачэй на тое, што ў самым Амэрыканскім камітэце далёка ня ўсё ў парадку – пачынаючы ад самога назову з азначэньнем «народы Расеі», русафільствам кіраўнікоў і канчаючы на ўпрывілеяваным становішчы расейскага партнэра. Сьцьвярджае гэта прэсавы камунікат канфэрэнцыі Камітэту ў Штарнбэргу. Аднак зьмена ўсяго гэтага на правільнае й слушнае сама сабой ня прыйдзе. За гэта трэба змагацца і то не шляхам байкоту, які мог бы быць толькі карысным для расейцаў, а шляхам актыўных выступленьняў у самым Камітэце, шляхам пераконваньня амэрыканцаў і ўсяго дэмакратычнага сьвету. Трэба выкарыстаць камітэт і эвэнтуальныя радыёперадачы, як трыбуну для прапаганды слушнасьці нашай справы. Трэба падкрэсьліваць усюды й заўсёды наша сапраўднае становішча адносна СОНР'у, зьмешчанае ў пастановах апошняй Сэсыі Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, а адначасна гаварыць аб той крыўдзе ня толькі для нашай справы, але й адносна элемэнтарных прынцыпаў вольнасьці народаў і дэмакрацыі, якую робіць нам Амэрыканскі Камітэт тым, што ігнаруе гэтыя слушныя пастуляты. Няхай вольны сьвет даведаецца аб праўдзе, няхай скажа сваё слова.

Толькі такі актыўны ўдзел беларускіх прадстаўнікоў у Камітэце мае рацыю быту. Нельга ім забывацца аб пастановах Рады Беларускае Народнае Рэспублікі. Абавязкам іх ёсьць прапагаваць гэтыя пастановы з трыбуны створанага антыбальшавіцкага камітэту і змагацца за правядзеньне іх у жыцьцё. Як кажны народ, мы маем права вольнага голасу на міжнароднай трыбуне. Калі-ж сільныя гэтага сьвету абмяжоўваюць наш голас, мы выкарыстоўва-

ем яго ў гэтай абмежаванай форме дзеля змаганьня за нашы поўныя правы.

Тых, што стаяць за байкот Амэрыканскага Камітэту Вызваленьня Народаў Расеі дзеля яго русафільскага настаўленьня, варта было-б спытаць: чаму яны не байкатуюць амэрыканскага ўраду, як і ўсіх ЗША, што таксама русафільскія? Дык не, гэтыя прыхільнікі байкоту камітэту стараюцца пераконваць і амэрыканскі ўрад і грамадзтва аб слушнасьці сваёй справы. Чаму-ж тады яны супраць такой самай лініі паступаньня ў антыбальшавіцкім камітэце, які зьяўляецца пляцоўкай таго-ж амэрыканскага ўраду? Можна з пэўнасьцяй сказаць, што салідарнае выступленьне ўсіх паняволеных народаў у антыбальшавіцкім камітэце дало-б куды большыя вынікі чымся байкот яго.

Заляшчанін.» (В. Жук-Грышкевіч)

(«Беларускі Эмігрант», Таронта, Год V, нр. 7 [45], ліпень, 1952.)

XI. У НЯМЕЧЧЫНЕ

Беларуская сэкцыя радыя «Вызваленьне»

Асабліва на часы трэцяга курсу лектарату беларусаведы ў Таронта прыпадаюць канчальныя стараньні й дагаворы Старшыні Рады БНР інж. М. Абрамчыка з Амэрыканскім Камітэтам Вызваленьня, каб атрымаць у радыё «Вызваленьне» беларускую сэкцыю. Калі дазвол быў атрыманы, Старшыня Рады БНР інж. М. Абрамчык запрасіў др. Вінцэнта Жук-Грышкевіча арганізаваць беларускую сэкцыю радыя «Вызваленьне». 30 сьнежня 1953 году Вінцэнт Жук-Грышкевіч атрымаў ад Амэрыканскага Камітэту тэлеграму наступнага зьместу:

1953 Dec 30 PM 1 10
TNO52 16/13–OJ NEW YORK NY 30 1125A –
PROF VINCENT ZUK-HRYSZKIEWICZ –
133 BRUNSWICK AVE –

NEW YEAR'S GREETINGS. WE OFFER YOU POST CHIF BELORUSSIAN DESK RADLIB. AIRMAILING DETAILS –ROBERT DREHER–

У сярэдзіне лютага 1954 году Вінцэнт паехаў у Мюнхэн у Нямеччыну. У лісьце з падарожжа караблём United States Lines ён піша:

«United States Lines

21.02.1954.

Даражэнькая Раіска,

Сяньня нядзеля, а ў аўторак (23.02.) а г. 8.00 раніцы я высяду ў Ле Гавр. Таму хачу мець гатовы ліст, каб выслаць. Буду мець зараз-жа цягнік у Парыж, дзе маю спаткацца з а. Гарошкам і адведаць Нінку (Абрамчык, Р. Ж.-Г.). Дзень і ноч пабуду там напэўна, а мо й яшчэ адзін дзень, а тады вырушу ў Мюнхэн. Такі мой расклад на найбліжэйшыя дні. А цяпер пару слоў аб тым, што было пасьля нашай апошняй тэлефанічнай гутаркі ў сераду раніцай (18.02.).

У Камітэце (Амэрыканскім)... містэр Дрэгэр сказаў, што хоча прадставіць мяне адміралу Стывэнсу (прэзыдэнт Камітэту), які хацеў пазнаць мяне перад выездам. Аказаўся ён вельмі сімпатычным і дабрадушным чалавекам. Нагаварыў мне камплімэнтаў, чаго я зусім не спадзяваўся. Казаў, што калі-б я хоць на палавіну выявіўся ў працы такім, якую ён мае аба мне апінію, дык ён быў бы вельмі задаволены. Гэта мяне паставіла ў цяжэйшую сытуацыю, бо будзе спадзявацца па мне больш чымся я думаў.

* * *

На карабель праводзіў мяне Мікола (Абрамчык, Р. Ж.-Г.). Рэчы ўсе ўнясьлі ў маю кабіну, што на Deck "A," вельмі выгодная, прасторная, чыстая ідэальна, з убікацыяй і прышніцам, дрэсэрам зь вялізарным люстрам і выгадным ложкам – air conditioned. Карабель гэты – сучасны цуд тэхнікі: кіно, swimming pool, балявая заля, сталовая заля з аркестрай, плошча для тэнісу й іншых гульняў. Кожны дзень два сэансы кіна, пры абедзе грае аркестра, а ў 9:00 гадзін танцы. Кухня – нешта з байкі. Багаты выбар ежы, усё смачнае, сьвежае. Навет жытні хлеб ёсьць, усе напіткі з «водкай уключна». Абслуга старанная. Адным словам роскаш і кветкі...

...Маю добрае таварыства... людзі цікавыя й культурныя... Маю нагоду ангельскай канвэрсацыі.

Чуюся вельмі добра. Не адчуваю марской хваробы. Праўда, неяк прыглушаны крыху. Мора хоць і не бурлівае, але неспакойнае. Калыша часам і моцна. Выабражаю, што было-б, калі-б ехаў меншым караблём, а ня гэтым гігантам, якога Ты хіба ўжо пабачыла з паштоўкі... Сяньня францу ў беленькай кашульцы, якая, як і шмат што іншае, прыпамінае аб чулым сэрцы маей жонкі. Думкамі я ўвесь час з Табою, мая мілая...

...Напішу Табе з Парыжа. А Ты, калі захочаш напісаць – пішы на Сычоў адрас:

Mr. P. Syč (dla V. Žuk-Hryškieviča), Petenkofer Strasse 23. Munchen, Germany.

Тулюся, цалую моцна. Твой Вінцук.»

25 лютага атрымала я ад Вінцука наступнага зьместу тэлеграму:

«Здароў, прыехаў шчасьліва, Мюнік, цалую, Вінцук.»

У лісьце з 27-га лютага, зь Мюнхэну, Regina Hotel, Вінцук піша:

«...Ужо трэці дзень, як я ў Мюнхэне, а здаецца, што два тыдні. Столькі рознага ўсяго перавалілася. Таму не дзівіся, што толькі сяньня ўрэшце магу з Табой пагаварыць на адзіноце. Зараз па прыезьдзе выслаў Табе тэлеграму, якую, спадзяюся, Ты атрымала.

Спаткалі мяне 25.02. на станцыі ў 11:40 дня надспадзявана шумна: сп. Сыч, др. Ст. Станкевіч, праф. Кабыш, др. Рагуля, сп. Карась і Мр. Дэсэ ад радыя «Вызваленьне». Гэта група навалілася на мяне, як я выйшаў на пэрон, і проста ашаламіла мяне. Пасьля прывітаньня паехалі самаходамі ў гатэль Рэгіна – адзін з найлепшых гатэляў у Мюнхэне. Мр. Дэсэ ўлякаваў мяне ў прыгожым пакоі, адбыў са мной кароткую канфэрэнцыю й паехаў, умовіўшыся, што на другі дзень зраніцы забярэ мяне сваім самаходам у бюро. Наша-ж грамада забрала мяне ўніз у рэстаран на абед. Абмяняліся думкамі аб сытуацыі з арганізацыяй нашай радыёвай сэкцыі і аб нашым жыцьці тут і за акіянам. Пасьля абеду я вярнуўся ў гатэль, выкупаўся (мой пакой з прасторнай лазенкай) і лёг на пару гадзін аддыхнуць, а вечарам пайшоў на канфэрэнцыю да Сыча з вышэй успомненымі асобамі. Рагуля выехаў у Бэльгію каля гадзіны 10-ай вечара. Мы правялі яго на стнцыю. На другі дзень залагоджваў розныя фармальнасьці з Дэсэям у будынку радыёстанцыі. Сягоньня зраніцы, хоць мог бы быць вольным, паехаў у бюро, каб прадставіцца Мр. Вільямсу – дырэктару радыёстанцыі. Канфэраваў зь ім больш 2-х гадзін. Папаўдні паехаў у Розэнгаім да Станкевічаў на раней умоўленыя запросіны. Вярнуўся вечарам і цяпер пішу гэты ліст. У міжчасе пазнаў шмат людзей, зь якімі трэба будзе спатыкацца ў працы. Вось Табе, Даражэнькая, кароткая справаздача за гэтыя няпоўныя тры дні. Аб падарожжы ня пішу, бо думаю, што ты атрымала мае два лісты: з параплаву (з фатаграфіямі) і з Парыжа. Чуюся наагул добра, хоць яшчэ ня прышоў да сябе з ашаламленьня.

З арганізацыяй нашай сэкцыі справа ідзе тугавата. Паўстала камплікацыя ў сувязі з тым, што Цьвірка й Марговіч да ліпеня ня прыедуць, бо хочуць канчаць студыі. Трэба знайсьці на іх мейсца іншых людзей, а гэта ня лёгкая справа можа зацягнуцца. Горш тое, што амэрыканцы ня хочуць браць людзей з за акіяну. Але нічога, будзем кратацца. Адносіны амэрыканцаў да мяне вельмі добрыя. Гэта дадае мне адвагі ў перамаганьні цяжкасьцяў.

У гатэлі я не хачу быць доўга, бо вельмі дарагая ежа ў рэстаране. Буду дамагацца кватэры. А пакуль што на абеды буду хадзіць да Сыча, які носіцца са мной, як з родным дзядзькам... Жыцьцё ў Мюнхэне мне падабаецца: культурнае й дастатняе. Немцы сталі на ногі. Аб іншых уражаньнях напішу пазьней. Дабранач, мая Ты кветачка! Цалую, Твой Вінцук.»

7.3.54.

«Раіска, Жоначка мая Дарагая,

Ужо другі Твой ліст атрымоўваю неспадзявана. Дзякую, мая Даражэнькая...

...Хоць з пэрсаналам нашай сэкцыі справа зацягваецца..., я запушчаю карэньні. Атрымаў залю для нашай сэкцыі, сталы, машынкі і ўсе прылады ўключна з тэлефонамі і ў пятніцу пачаў урадаваць у сваім бюры. Беларуская сэкцыя пачала існаваць, пастаўлена цьвёрдая нага. Цяпер трэба абсадзіць месцы за 5-ма сталамі і машыністаў за машынкамі. Трэба сабраць і падрыхтаваць матар'ял для нашых аўдыцыяў і апрацаваць яго на найбліжэйшы час. Вось першыя пункты маей праграмы дзеяньня. Сягоньня была «парты» для ўсіх супрацоўнікаў радыя «Вызваленьне», прысьвечана ўгодкам яго існаваньня. У прамовах амэрыканцы падкрэсьлівалі значэньне дзейнасьці радыя «Вызваленьне» і цешыліся з таго, што хутка загавораць беларусы й украінцы. Так, відаць, што ім вельмі залежыць на гэтым. У чацьвер запрасіў мяне заступнік Прэзыдэнта Амэрыканскага Камітэту на Эўропу Мр. Кэлі і разам з трыма яго шэфамі аддзелаў паехалі на лянч у гатэль "Excelsior." Былі цікавыя й прыемныя гутаркі. Амэрыканцы да мяне добра адносяцца. Таму спадзяюся, што праца наша пойдзе бяз вялікіх труднасьцяў...»

«Regina Palast Hotel
Maximilian Platz 5
Munchen 2, Germany.

18. 03. 1954

О, Раіска, Раіска мая.

Дзе Ты ёсьць і што Ты робіш?... Прышоў да «хаты» – і так удырыла мяне бяздушная пустка пакою. У Таронта

Ты была душой майго дому, а тут Цябе няма, дык і дому няма.

Ты цяпер хіба чахнеш над кнігамі і ня відзіш нават якое надвор'е. А ў нас такія прыгожыя сонечныя дні! Цёпла, вясна ў поўнай сіле, што хоць ты ў поле йдзі...

Магу пахваліцца аднэй перамогай: усё-ж такі Ліманоўскага я адваяваў, у канцы сакавіка ён ужо будзе тут. Тады разам зь ім і з Сычом можна пачаць прыгатаваўчыя аўдыцыі, бо і Сыч, спадзяюся, у будучым тыдні будзе аформлены...

...Дык трымайся, мая любая, вучыся й адвальвай экзамены. Хай Усемагутны Табе дапаможа! Я малю Яго аб гэта кожны вечар. А пакуль што абыймаю Цябе моцненька й цалую.

Твой Вінцук.»

22.03.1954.

«Раіска, Жоначка мая Дарагая!

Еду праз краіну Нібэлюнгаў: Візбадэн і ўзьбярэжжа Рэйну з гарадамі й замкамі. А сонейка сьвеціць і залаціць усё. Цяплыня – проста горача. Станцыя Рудэзгайм. Па Рэйне плывуць шматлікія баржы й параходы. Хвалі разьліваюцца серабром. Цягнік рушыў ізноў і йдзе над самай ракой. Так хораша й цудоўна і было-б шчасьліва, калі-б Ты была пры мне. Але няма Цябе.Таксама цяжка мне было без Цябе й учора, калі з высокай гары аглядаў цудоўны Гайдэльбэрг. Начаваў у Франкфурце. Раніцай быў у брытыйскага консула, каб дастаць візу ў Лёндан. Ужо даваў візу, але агледзіўся, што на маім дакумэнце сярод краін, куды я магу ехаць, няма Вялікай Брытаніі. Таму адмовіў. А канадыйскага консула там ня было. Ён у Боне. Але няма ў мяне часу ехаць у Бон, ды варочацца ў Франкфурт. Таму еду ў Лювэн. Можа заўтра ў Бруксэлі дастану візу, там хіба ёсьць і канадыйскі консул. У Лёндане хачу быць 26 і 27.03. Там вялікія ўрачыстасьці. Інаўгурацыя Англа-Беларускага Таварыства й сьвяткаваньне 25-га Сакавіка. Выступае хор з Лювэну і барытон Конюха з Рыму. Хачу выкарыстаць гэтую аказію, каб найграць беларускія песьні для нашага радыя й знайсьці іншыя матар'ялы. У кожным выпадку сяньня ў 10:30 буду ў Лювэне. Бэльгійскую візу дастаў яшчэ ў Мюнхэне.

Чуюся вельмі добра. Цяпер, едучы цягніком, сяджу ў рэстаране, цягну піва пішучы гэты ліст і ўрыўкамі кідаю вокам на цудоўную даліну Рэйну, аблітага сонцам.

Будзь пры мне, Раіска, хоць думкамі. Абыймаю Цябе й цалую моцна. Твой Вінцук.

P. S. Буду пісаць і з далейшай дарогі. Гэты ліст хіба ў Кэльне ўкіну, бо там цягнік стане на даўжэй. 28.03. буду ўжо ў Мюнхэне.»

27.03.1954.

«У імя Айца і Сына і Духа Сьвятога, Амін.

Даражэнькая Раіска,

Перасылаю Табе пастырскае блаславенства ад духоўнага Пастыра і апякуна нашага **біскупа Слосканса,** якога я адведаў. Ён блаславіў мяне ў маёй адказнай рабоце і Цябе (хоць завочна) праз мяне ў Тваёй ня менш цяжкой навуцы, а таксама блаславіў наша сужэнства. Памаліўся, каб Усемагутны даў шчасьце ў нашым сямейным жыцьці і шчасьлівую будучыню. Было гэта ў Лювэне 24. 03. г.г. (1954). Маім абавязкам ёсьць перадаць Табе гэта блаславенства. Мая надзея, што яно дадасьць Табе духовай сілы й вытрываласьці ў навуцы і дапаможа здаць шчасьліва ўсе экзамены, а таксама зноў злучыць нас у шчасьці пад адной страхой. Дай жа нам зьдзейсьніць гэта, Божа!

Ведаю, што наша разлука цяжыць нам моцна, але, дзетачка мая, Ты-ж ведаеш, што калі-б мы не дапусьцілі да маяго выязду – былі-б неўпарадку перад людзьмі і нашай Бацькаўшчынай – ды нават перад Богам, бо калі Бог выпусьціў мяне з савецкага пекла і захаваў мае сілы і здольнасьці праз усе нягоды апошняй вайны – дык грэшна было-б гэтыя сілы і здольнасьці марнаваць, замест таго, каб ськіраваць іх на добрую справу.

Таксама і з Табой, мая Ты кветачка. І Ты-ж дзякаваць Богу вышла з усёй ваеннай пажогі цэлай і непашкоджанай духова й фізычна. Дык ці-ж за ўсё гэта мы ня можам панесьці ахвяру ў відзе нашай кароткай разлукі? Ці-ж мы ўжо зьняверыліся ў сябе й у сілу нашага каханьня?...

...Ведаю, што прыдзецца куды цяжэй працаваць як цяпер, бо ад 1. 4-га пачынаем пробныя аўдыцыі ўдваіх з Сычом, але не баюся гэтага, хоць і матар'ялаў няма, бо пэўны сіл сваіх. Як дагэтуль, усё йшло гладка. Мусіць Бог мне памагае. Удалося выгаварыць падарожжа, каб найграць новыя беларускія песьні хору ў Лювэне і барытона Конюха...

...На 25 Сакавіка мы нічога не маглі сказаць праз наша радыё, бо наша сэкцыя яшчэ ня чынна. Таму я стараўся, каб усе іншыя сэкцыі ўдзялілі месца на 25 Сакавіка. Напаткаў аднак на страшную апазыцыю расейцаў. Ня гледзячы на гэта, усё-ж пры помачы амэрыканцаў удалося нам прапхнуць пяць скрыптаў аб 25 Сакавіку праз 5 сэкцыяў: Азэрбайджанскую, Грузінскую, Татарскую, Туркестанскую й Паўночна-Каўкаскую. Гэтых 5 сэкцыяў пусьцілі наш скрыпт у сваіх аўдыцыях па некулькі разоў – 25 і 26 сакавіка. Расейцы паднялі авантуру, а армяне (у іх склад пэрсаналу хутка зьменіцца) ўстрымаліся. Аднак авантура расейцаў ня мела ніякага значэньня. Затое яшчэ адзін клін убіты між расейцаў і нацыяналаў. Такім чынам шмат чаго ўдаецца зрабіць, і трэба з гэтага карыстаць, як і зь іншых магчымасьцяў працы. Скажы Грыцуку, каб ён скамунікаваўся з Ст. Станкевічам (Бацькаўшчына) і запрапанаваў якуюсь тэму з гісторыі ці беларускай літаратуры. Ён (Грыцук) зможа дастаць стыпэндыю ад Навуковага Інстытуту ў Мюнхэне, калі захоча.

З Лювэнскім хорам я быў у Антвэрпе. Гэта быў іхні другі канцэрт у Бэльгіі, прысьвечаны 25 Сакавіку. Сьпяваюць надзвычай добра. Дырыгэнт Кіслы... Ён між іншага хоча выехаць у Канаду. Добра было-б, каб Грыцук да яго напісаў...»

Газэта «Бацькаўшчына» ў нр. 14 (196), 1954, паведамляе:

«Радыё ‹Вызваленьне› аб 25 Сакавіку

Беларуская сэкцыя Радыя «Вызваленьне» не магла яшчэ прамовіць 25 сакавіка 1954 г. – у дзень 36-ай гадавіны абвешчаньня незалежнасьці Беларусі, – бо знаходзілася ў стадыі арганізацыі. Затое яна спрычынілася да таго, што іншыя нацыянальныя сэкцыі адзначылі беларускае нацыянальнае сьвята ў сваіх аўдыцыях. Як і трэба

было спадзявацца, расейцы адмовіліся ад гэтага на адрэз. Мала таго, яны, як мага, націскалі, каб і іншыя сэкцыі зрабілі тое самае. Аднак астатнія сэкцыі прысьвяцілі нам шмат мейсца ў сваіх аўдыцыях. Грузіны й азэрбайджанцы перадалі даўжэйшыя рэфэраты аб абвешчаньні незалежнасьці Беларусі, а татары, туркестанцы, паўночныя каўкасцы падалі аб гэтай падзеі ў сваіх навінах.

Варта вярнуцца яшчэ да паступку расейцаў. Яны гэтым паказалі, як ня трэба лепей, сваё «непрадрашэнства» ўжо не ў дачыненьні да будучыні, як гэта яны звычайна фармулююць, але да мінуўшчыны. Аб тым, што Беларусь 36 год таму назад праклямавала сваю незалежнасьць, успамінаць сяньня нельга, бо гэта-ж быў «сэпаратыстычны» акт, ськіраваны супраць «адзінай і недзялімай». Значыцца, «не было, нет и быть не может»!»

Беларускія перадачы ў Радыё «Вызваленьне»

Пад такім загалоўкам газэта «Бацькаўшчына» ў нумары 12-13 (196-197), за 27-га сакавіка 1954 году падае:

«Неўзабаве, за які месяц з амэрыканскае радыястанцыі «Вызваленьне» (Liberation) пачнуцца беларускія перадачы. Бязспрэчна, вестка гэта будзе ўспрынятая беларускай эміграцыяй зь вялікай радасьцяй. А зь яшчэ большаю хіба радасьцяй прывітаюць яе беларусы на Бацькаўшчыне, якім якраз згаданыя радыяперадачы й прысьвечаныя.

Вольнага голасу з вольнага сьвету, праўдзівай інфармацыі аб падзеях у сьвеце з асьвятленьнем нашага беларускага жыцьця, нашых праблемаў у роднай беларускай мове – беларускае грамадзтва як на чужыне, гэтак і на Бацькаўшчыне чакала даўно. Часіна гэтая нарэшце надыйшла. Доўгагадовыя жаданьні й змаганьне палітычных беларускіх дзейнікаў на эміграцыі – мець свае беларускія радыяперадачы – нарэшце зьдзейсьніваюцца.

Нарэшце й беларусы атрымоўваюць магчымасьць мець свае штодзённыя аўдыцыі – а беларуская палітычная эміграцыя – нагоду падаць свой голас разлучаным з намі зялезнай заслонай нашым братом на Бацькаўшчыне. Няма сумлеву, што ў дзень адкрыцьця беларускіх перадачаў – у часіну, калі нашыя паняволеныя браты ў далёкім родным Краю, таптаныя бальшавіцкім захопнікам і атуманьваныя нахабнай бальшавіцкай маной, пачуюць наш голас, – сэр-

цы іхнія трапянуцца не абы-якой радасьцяй. Яны даведаюцца, яны пераканаюцца, што тут, за межамі нашага забранага краю, нехта жыве, нехта турбуецца за іхны лёс, выступае ў іхняй абароне. Яны даведаюцца, што жывуць тутка іхнія, столькі мо ўжо раз аплаканыя сыны, браты ці бацькі, а галоўнае, што ўсе мы тут ня толькі на іх не забыліся, што мы працягваем змаганьне з бальшавіцкай тыраніяй за вызваленьне нашай любай незапомнай Бацькаўшчыны-Беларусі, але й тое, што мы не адны, што мы маем пашану й спачуцьці вольнага дэмакратычнага сьвету, а ў тым ліку зразуменьне найвялікшай ды найстрашнейшай нашым ворагам, нашым панявольнікам – дэмакратыі амэрыканскай.

Няма таксама сумлеву, што ў маскоўскіх тыранаў, калі яны пачуюць наш голас адгэтуль, прабягуць па скуры дрыжыкі й яны будуць намагацца, каб гэты наш голас не дайшоў да вушэй беларускага народу. Але гэта ім не ўдасца. Мы ў гэтым сяньня **цалкам пэўныя**.

Амэрыканская інфармацыйная служба дакладна пераканалася, што голас радыястанцыі «Вызваленьне», надаваны ўжо на працягу нейкага часу іншым народам СССР, **да іх даходзіць**. Тымбалей ёсьць пэўнасьць, што голас гэты трапіць на Беларусь, дзякуючы шэрагу адмыслова спрыяльных для нас абставінаў.

Таму няма дзіву, што бальшавіцкія агенты й іхныя спадарожнікі ды розныя іншыя ворагі беларускага вызвольнага руху, намагаліся ўсякімі спосабамі не дапусьціць беларусаў да голасу ў амэрыканскіх радыёстанцыях, а калі гэта ім усё-такі не ўдалося, яны прабавалі прынамся захапіць кіраўніцтва беларускімі перадачамі ў свае рукі. Аднак, амэрыканскія дзейнікі, якія кіруюць радыёстанцыяй «Вызваленьне», на пару пазналіся на гэтай акцыі нашых ворагаў і беларуская сэкцыя радыёстанцыі «Вызваленьне» абсаджаная цяпер нашымі пэўнымі людзьмі. Дырэктарам беларускіх перадачаў прызначаны вядомы, адзін з старэйшых нашых грамадзкіх і культурных дзеячоў праф. др. Жук (др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч, Р. Ж.-Г.), ведамы нашаму грамадзтву ня толькі ў эміграцыі, але й на Бацькаўшчыне, як непахісны дэмакрат і нястомны змагар за волю беларускага народу.

Беларуская эміграцыя, успрыймаючы гэтую радасную вестку, павінна памацніць свае намаганьні, каб дапамагчы ў працы дырэкцыі беларускіх перадачаў. Беларуская

інтэлігэнцыя, палітыкі, навукоўцы, актыў беларускіх грамадзкіх арганізацыяў – павінны ўзяць чынны ўдзел у засыланьні дырэкцыі перадачаў артыкулаў, матар'ялаў.

Радыястанцыя «Вызваленьне» адчыняе шырокія магчымасьці і дзеля ўсебаковае інфармацыі. Беларускае сьвятарства мае нагоду забраць голас у вабароне перасьледаванай бальшавікамі царквы, выступіць із сваім моцным словам супраць зьдзеку бязбожнікаў над веруючым беларускім народам. Эканамістыя павінны дэмаскаваць барбарскую бальшавіцкую экспляатацыю беларускіх працоўных масаў і паказаць ім праўдзівы шлях нармальнага людзкога гаспадарчага й сацыяльнага разьвіцьця, заместа цынічных насьміханьняў над працоўным народам ды ўгаварваньня яму байкаў аб «шчасьлівым і радасным жыцьці» ды ўдачах і перамогах бальшавіцкага сацыялізму.

Гісторыкі, пісьменьнікі, паэты, музыкі – кажны ў сваёй галіне – патрапяць таксама займець у нашых радыяперадачах свой голас, слова, накіраванае да сваіх нявольнікаў-сяброў.

Актыў беларускіх грамадзкіх арганізацыяў, раскіданых па ўсім сьвеце, павінен штодзённа, пільна зьбіраць і перасылаць дырэкцыі беларускіх перадачаў весткі-хроніку аб жыцьці й працы сваіх арганізацыяў.

Беларускія перадачы ў Радыё «Вызваленьне» – гэта наша **першая штодзённая «газэта»**, газэта вольнага слова, «чытаць» якую не перашкодзяць беларускаму народу нат бальшавіцкія тыраны. Разам ізь ім, перадачаў гэтых будуць слухаць і тысячы чужынцаў на ўсім сьвеце, якія сочаць за намі й цікавяцца нашым вызвольным рухам.

Дзеля ўсяго прыгаданага, нашыя радыёперадачы павінны быць пастаўленыя на належнай вышыні. Яны павінны поўнасьцяй адлюстроўваць нашае як грамадзка-палітычнае, гэтак і культурнае жыцьцё на чужыне ды выяўляць усюману бальшавіцкае прапаганды і ўвесь зьдзек чырвонага панявольніка над беларускім народам.

Паставіць-жа на належнай вышыні нашыя перадачы, а гэтым самым і накіраваць лязо нашае зброі супраць нашых прыгнятальнікаў, мы патрапім без асаблівых цяжкасьцяў, калі ўсе станем да працы і актыўнага супрацоўніцтва з дырэкцыяй нашых радыёперадачаў.

Мы перакананы, што беларускае грамадзтва на эміграцыі належна ацэніць здабытыя намі цаною даўгога змаганьня магчымасьці й на гэтых новых, запраўды важ-

ных выходных пазыцыях, заданьні свае перад беларускім народам годна выканае. **М. Відук.**»

(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 12-13, [196-197] 1954)

* * *



Раіса Жукоўская (пазьнейшая жонка Вінцэнта Жук-Грышкевіча). Марбург, 1947.



Вінцэнт Жук-Грышкевіч. Мюнхэн, 1955.

03.04.1954.

«Раіска, Жоначка мая Дарагая,

Сяньня ідучы на сьнеданьне дастаў Твой ліст з 28.03... Па абедзе, вяртаючыся ў гатэль, дастаў другі Твой ліст з 27.03. Дзіўная гэтая пошта. Ранейшыя лісты дастаю пазьней, чым пазьнейшыя. Але горш за ўсё, што лісты ходзяць так доўга – аж 6 дзён! У той час, як зь Нью Ёрку дастаю за тры дні...

Апошні тыдзень быў для мяне страшэнна цяжкі. 01.04. мы пачалі ўжо гаварыць – хоць і ўпустую, як практыка, якая патрывае месяц, бо толькі 01.05. выйдзем на этэр. Але ўсяроўна праграму маем прыгатаўляць нармальна. А

мы-ж толькі яшчэ ўдваіх – я і Сыч. Мусім самі знайсьці матар'ял, апрацаваць яго, перапісаць на матрыцы. Тады яго ўжо бяз нас адбіваюць на рататары Dital, уласныя матарыялы трэба нам перакласьці на ангельскую мову і пазьней выгаласіць усю праграму праз мікрафон. Усё сказанае наігрываецца на істужцы, і пазьней мы слухаем самі сябе і крытыкуем – разам з рэжысёрам. Мой голас аказаўся добры для мікрафону. Слухаючы яго, я сам яго не пазнаю. Чуецца глыбокі, моцны барытон. Але адчуваецца шмат недахопаў, некаторыя словы я вымаўляю нявыразна, глытаючы цэлыя склады. У Сыча яшчэ горш. У яго й дыкцыя горшая. Рэжысёр кажа, што трэба больш распрацоўваць мускулы роту, якія бяруць удзел пры гутарцы, тады словы будуць вымаўляцца без ніякіх цяжкасьцяў і выразна. Сродак на гэта: мусім кожны дзень хоць 5 мінут гаварыць, уставіўшы корак у зубы. Уяві сабе абраз: кожны дзень пасьля вячэры гутарым з коркамі ў зубах, аж пакуль мускулы не забаляць. Гэты тыдзень адбывалі сваіх 8 гадзін у нашым бюры, і яшчэ да гадзіны 11.00 працавалі дома. Найгорш, што ня маем тэхнічных работнікаў, машыністак і перакладчыкаў. Маю надзею, аднак, што ў будучым тыдні пад'едзець магчыма Ліманоўскі зь Нью Ёрку і Карась з Бэльгіі, тады будзе лягчэй...

...А найважнейшае – не пераймайся нічым і не забівай цяпер галавы справамі ня зьвязанымі з навукай. Усё, дзякаваць Богу, ідзе добра. Я здароў і ўмацоўваюся. Ведаю, што раблю важнае заданьне, і ганаруся тым, што й Раіска мая робіць важнае заданьне...

...Пішу гэты ліст, а за вакном дождж цубарыць, як зь вядра. Ужо 12-я даходзіць, але я ўсё-ж укіну гэты ліст яшчэ сяньня. Бывай, мая Даражэнькая! Цалую Цябе моцна, моцна – Твой Вінцук.»

07.04.1954.

«Раіска, Жоначка мая Даражэнькая,

Чуюся змучаным, але хочацца хоць пару слоў замяніць з Табою.Страшна многа працы маю цярер, бо ўжо амаль тыдзень як з Сычом надаём штодзённыя праграмы. Праўда не ў этэр, а ў пустую, але ўсяроўна мусім апрацаваць нармальную праграму, перапісаць і хоць свае камэнтары пералажыць на ангельскую мову, а пазьней выгаласіць

перад мікрафонам. Заўтра даходзіць да нас праф. Кабыш, а ў наступным тыдні спадзяёмся прыезду Ліманоўскага. Тады будзе лягчэй...

...Толькі што вярнуўся з візыты ад **праф. Сукенніцкага** (ён быў прафэсарам юрыдычнага факультэту на Віленскім універсытэце. Выкладаў тэорыю права, быў маім прафэсарам у 1938-39 годзе. Р. Ж.-Г.). Ён працуе тут у Radio Free Europe у польскім аддзеле. Мы ня бачыліся ад 1948 г. ў Лёндане. Спатканьне таму было вельмі мілым і пажаданым. Ён многа пастарэў і фізычна й духова. Гаварылі на розныя тэмы – да філязофіі ўключна. У яго апатычныя адносіны да жыцьця. Найважнейшае аднак, што ён абяцаў мне памагчы з матар'ялямі з тэорыі савецкага жыцьця. Агулам жа ён пакінуў на мяне прыгнобленае ўражаньне і сваім выглядам і псыхічным станам.

Надыходзіць Вялікдзень. Ня ведаю, колькі буду мець вольнага часу. Калі 2-3 дні – паеду ў горы крыху аддыхнуць, бо ўжо крыху зматаўся.

А Ты, дзетка, куеш цяпер... Як я Табе спачуваю, а з другога боку і ганаруся Тваёй вытрываласьцяй і станоўкасьцяй. Маю не абы якую жонку!... Памятай, што я думкамі заўсёды з Табою, памятай, што Ты ў мяне адна. А цяпер дабранач, Раіска!...

Цалую моцна. Твой Вінцук.»

30.4.54.

«Раіска, Жоначка мая Дарагая,

Адлягло нам крыху сяньня, бо заўтра (1. 5) яшчэ ў паветра ня пойдзем. У панядзелак і ў аўторак будзем дыскутаваць 18 праробленых праграмаў, а наш выхад у паветра прызначаны на 10. 5. Украінцы-ж пойдуць у паветра 24.5., у іх яшчэ большыя прабелы, чымся ў нас. Дырэктар радыя прызнаў, што нашы праграмы на добрым узроўні і нас можна пусьціць у паветра, але адсунулі яшчэ на тыдзень з тэхнічных прычынаў.

Мікола (Абрамчык, Р. Ж.-Г.) прыедзе ў наступны аўторак, чакаю я яго з нецярплівасьцяй, бо сабралося шмат розных спраў.

Гэты ліст атрымаеш хіба што ўжо пасьля заканчэньня экзаменаў. Раіска, як я цешуся, што Ты ўрэшце дабіла да

канца. Ведаю, што Ты яшчэ ня пэўна, ці здала, але я ў гэтым пэўны. Ад шчырага сэрца складаю табе павіншаваньне з заканчэньнем такой агромністай працы й сьхіляю галаву перад тваёй вытрываласьцяй, здольнасьцямі й сілай характару.

Учора я выслаў табе 12 ружаў, спадзяюся, што ты іх атрымала...

А цяпер з Богам. Цалую.

Твой Вінцук.»

02. 05. 1954.

«Раіска, Жоначка мая Дарагая,

Прышоў ад Сыча і знашоў Твой лісьцік. Як добра, што яго атрымаў, бо змучаны й працай і дыскусіямі і ня было чым душу адвесьці. І вось Твой лісток мяне пацешыў. На дзіва хутка ён прышоў – праз 3 дні...

...Сяньня й заўтра не надаём праграмаў, але затое рыхтуемся да 10/5, калі з першай аўдыцыяй выступім на этэр. Таксама і экзамен і ўрачыстая хвіліна. Цяпер-жа ходзіць аб падрыхтаваньне тэхнічнае і матар'ялаў. Скрыпты ўжо сягоньня здалі ў ангельскім перакладзе – мой і Сычоў – да акцэпцыі. Але трэба падумаць, каб былі крыніцы матар'ялаў на далей, бо як выйдзем на паветра, ужо нельга будзе перарываць. З гэтым якраз найбольшы trouble (клопат), бо матар'ял зьбіраць і выбіраць могуць толькі беларусы, а іх якраз у такіх мясцох, як подслух савецкіх перадачаў – ці бібліятэцы – няма. Трэба ўпіхаць сваіх людзей, а за гэта неабходна змагацца. Заўтра прыяжджае Мікола (Абрамчык), спадзяюся таму, што прыдзе мне з дапамогай.

Фізычна чуюся вельмі добра...

...Яшчэ ня выяжджаў з Мюнхэну на прыроду. Учора й у суботу была добрая пагода, але ня было часу. А сягоньня цэлы дзень лье дождж. Пакуль праца ня ўвойдзе ў каляіну – цяжка будзе адхіліцца. За тое, як Ты да мяне прыедзеш, вазьму на тры тыдні водпуск і будзем мы тады з Табой гайсаць.

А цяпер трымаймася!

Цалую Цябе моцна, Даражэнькая, – Твой Вінцук.»

07.05.1954.

«Раіска, Жоначка мая Дарагая,

Учора ў Цябе былі апошнія экзамены. Праз цэлы дзень помніў, што ў Цябе рашаючы дзень. Наш Дырэктар перад выездам у водпуск на 6 тыдняў паклікаў усіх шэфаў рэдакцыяў і вышэйшы пэрсанал на лянч у амэрыканскі рэстаран. Было нас чалавек 25. Каля гадзіны 3-ай па паўдні мы селі за стол. Пачалі з кактэйлю. Я помніў, што ў Таронта тады было каля гадзіны 9-ай раніцы й падумаў, што мая Раіска йдзе цяпер на страшны суд. Маю задуму заўважыла суседка мая Міс Гантэр (амэрыканка родам з Данцыгу) і спытала, у чым справа. Я сказаў ёй, што цяпер недзе мая жонка прыступае да апошняга экзамену. Яна злажыла руку ў кулак – у відзе фігі, я зрабіў тое самае. Мы віпілі за Твой пасьпех. А 10-ай вечара быў у мяне Мікола (Абрамчык). Гаварылі, частаваў яго каньяком. Тады ў Таронта была 4-я папаўдні. Цікава, ці мая Раіска кончыла ўжо свае экзамены? – Спытаў я мімавольна. Мікола сьціснуў кулак, я таксама. І тут выпілі за Твой посьпех. Ці-ж гэта не памагло Табе пры экзаменах?

Але цяпер Ты ўжо зусім вольная, і спадзяюся, адпачываеш. Гара камянёў звалілася з Тваіх плеч. Дай Божа, каб усё было добра.

У панядзелак мы яшчэ ня йдзем у паветра, бо няма яшчэ дэцызіі зь Нью Ёрку. Тымчасам буду рабіць высілкі, каб сьцягнуць зь Нью Ёрку Ганчарэнка Галіну і ўгрунтоўваць наш пэрсанал.

Мікола пабудзе тут яшчэ некалькі дзён. Бачымся што дня й гутарым аб бягучых справах...»

11.05.1954.

«Раіска, Жоначка Мая Дарагая,

Нарэшце атрымаў ліст, у якім паведамляеш, што апошні экзамен здала. Значыць вытрымала да канца, не захварэла й не заламалася. Дзякуючы гэтаму асягнула сваю мэту. Выказала адвагу, станоўчасьць, здольнасьці і вытрываласьць – розум і характар – чалавек. З гэтым я Цябе й віншую, мая даражэнькая. Большых супэрлятываў хіба ня трэба. Цешуся, што маю такую жонку...»

У лісьце з 17 травеня, 1954 г. Вінцэнт Жук-Грышкевіч піша да мяне:

«...Заўтра й у сераду ня робім праграмаў, затое ў чацьвер (20.05.54) – першая сапраўдная праграма пойдзе на этэр. Гэтым разам хіба ўжо не адложаць, бо вызначаны ўжо час і мейсца ў агульнай праграме й разасланыя паведамленьні. Той раз (10-га, 5-га) адлажылі, бо ня было яшчэ дэцызіі зь Нью Ёрку. Цяпер-жа дэцызія прыйшла яшчэ ў мінулым тыдні з «ОК». Запрапанавалі нам выбраць дату першага выступу і мы самі выбралі 20-га травеня. Надавацца будзе наша праграма ў 9:30 – 10:00 вечарам і пачынаючы ад 0:30 – 1:00 у начы (ноч патрэбна для тых, якія захочуць слухаць тайком на Бацькаўшчыне). Сем разоў будзе паўтарацца да 7:30 папаўдні наступнага дня, а тады зноў новая праграма ў 9:30 вечара. У Амэрыцы нашы перадачы ня будуць чутны. Слаба будуць яны чутны й у Заходняй Эўропе, бо хваля будзе ськівана пад спэцыяльным кутом на Беларусь.

У сувязі з нашым выступам на паветра паўстала шмат розных спраў тэхнічнага характару, зь якімі нам прыдзецца змагацца яшчэ доўга... Мо' й добра, што няма добрай пагоды, бо й так нельга зь яе карыстаць. Праўда, учора й у суботу было цёпла. Сады цьвітуць у цэлай поўні, але не магло быць мовы аб тым, каб куды выехаць.

Дзякую Табе за весткі з грамадзкага жыцьця ў Таронта. Як Мацукевіч прыехаў, дык можа што й выйдзе з царквой. Але з домам – дык сапраўды ня ведаю, як яны выйдуць. Хацелася-б ім памагчы, але няма як і няма чым. Нават няма часу напісаць ліст камусь з Авангарду. Скажы ім, няхай ня крыўдзяцца. Я і Прэзыдэнт вельмі цешымся, што наша Тарантонская грамадка стойка й вытрывала ідзець па раз абраным правільным шляху. Гэта якраз тое, што нам цяпер так патрэбна...»

* * *

Інаўгурацыйная беларуская перадача цераз радыястанцыю «Вызваленьне»

Пад такім загалоўкам у «Бацькаўшчыне», нумары 20-21 (202-203) за нядзелю, 30 травеня 1954 году чытаем:

«У чацьвер 20 травеня сёлета а 11-ай гадзіне дня адбылося ўрачыстае адкрыцьцё беларускага аддзелу радыястанцыі «Вызваленьне» ў Мюнхэне ў прысутнасьці амэрыканскага шэфа гэтага аддзелу сп. Тэрпака, Прэзыдэнта Рады БНР інж. М. Абрамчыка, прадстаўніка рэдакцыі «Бацькаўшчына» др Ст. Станкевіча, усіх сяброў беларускай рэдакцыі радыястанцыі, др. Вінцука Жука (др. В. Жук-Грышкевіча, Р. Ж.-Г.), праф. Ліманоўскага, Сымона Кабыша і Пётры Сыча ды іншых працаўнікоў беларускага аддзелу, як і іншых аддзелаў і працаўнікоў радыястанцыі. Вечарам гэтага дня адбылася супольная вячэра, ладжаная Амэрыканскім Камітэтам для працаўнікоў беларускага аддзелу радыястанцыі й гасьцей,што былі прысутныя на адкрыцьці, дзе ў прыемнай таварыскай атмасфэры адбылася вымена думак у справе першай і наступных беларускіх радыяперадачаў. Амэрыканскі шэф беларускага аддзелу радыя сп. Тэрпак, як і іншанацыянальныя прадстаўнікі радыя, адназгодна падчыркнулі бліскучыя вынікі працы сяброў беларускага аддзелу, асабліва ягонага дырэктара й галоўнага рэдактара др. В. Жука (др. В. Жук-Грышкевіча, Р. Ж.-Г.), і выказалі ім поўнае прызнаньне.

Падчас урачыстага адкрыцьця беларускага аддзелу радыястанцыі адбылася першая інаўгурацыйная беларуская радыяперадача, якая сваім глыбокім патрыятычным зьместам і пачуцьцёвым настроем пакінула глыбокае ўражаньне на прысутных. Пачынаючы з гэтага дня, беларускія перадачы адбываюцца штодзень па восем разоў па паўгадзіны часу, выпаўняючы гэтым роўна чатыры гадзіны ў суткі. Апошняя вячэрняя аўдыцыя а гадзіне 20,30 да 22 зьмяшчае новую праграму, а сем наступных аўдыцыяў, што адбываюцца наступнага дня, зьяўляюцца яе паўтарэньнем. Беларускіх радыёперадачаў зь Мюнхэну ў Заходняй Эўропе амаль што нельга пачуць дзеля таго, што хвалі голасу зьяўляюцца спэцыяльна накіраваныя толькі на тэрыторю Беларусі, Прыбалтыкі, Польшчы й большае часткі Украіны ды далей на ўсход. У заакіянскіх краінах іх нельга пачуць і пагатове. Дык каб даць магчымасьць нашым суродзічам на эміграцыі хоць агульна зарыентавацца ў характэры й зьмесьце беларускіх радыяперадачаў, мы ніжэй падаём дакладны зьмест і тэксты ўспомненай інаўгурацыйнай аўдыцыі.

Аўдыцыя распачалася музычным сыгналам – двукратным паўтарэннем мэлёдыі першага радка песьні «Мы выйдзем шчыльнымі радамі». Пасьля гэтага быў пададзены анонс наступнага зьместу: «Тут радыё «Вызваленьне». Вы слухаеце голас сваіх суродзічаў-беларусаў з вольнага сьвету». Пасьля анонсу наступае галоснае харавое адсьпяваньне дзьвюх першых строфак зь песьні «Пагоня» ў выкананьні Лювэнскага Студэнцкага Ансамблю. Тады, спачатку на фоне прыцішанай мэлёдыі далейшых строфак гэтае песьні, а потым безь яе, быў перададзены зварот беларускага аддзелу радыястанцыі, напісаны й сказаны ейным дырэктарам др. В. Жукам (др. В. Жук-Грышкевічам, Р. Ж.-Г.), да суродзічаў на Бацькаўшчыне наступнага зьместу:

«Дарагія Суродзічы! Браты-Беларусы! – дзе-б Вы толькі не знаходзіліся.

З глыбокім узрушаньнем зьвяртаемся да Вас з вольнага сьвету праз Радыё «Вызваленьне».

Сярод нас ёсьць тыя, што пакаштавалі «справядлівасьці» тройкі НКВД у часох Яжова й Цанавы, бо за адданасьць свайму краю і за любоў да свайго народу былі прызнаныя «нацдэмамі, ворагамі народу»; тыя, што ўцяклі з жудасных савецкіх турмаў, канцлягероў і масавых расстрэлаў; тыя, што ў часе апошняй вайны зь лясоў Беларусі грудзьмі станавіліся супраць бальшавіцкай навалы, заліваючай наш край, але змушаныя былі ўступіць пад націскам брутальнай сілы; тыя, якім удалося прарвацца з сотняў тысяч беларусаў, захопленых савецкім войскам у Ўсходняй Прусіі ў 1945 годзе і пагнаных на Ўсход, як скаціну; тыя, што пакінулі шэрагі чырвонай арміі ў часе й пасьля апошняй вайны і пайшлі на Захад, каб знайсьці там свабоду; усе тыя, якіх бацькі, браты й сёстры або загінулі з рукі савецкага ката, або церпяць яшчэ зьдзек і катаваньне ў савецкіх турмах, сьмягнуць з голаду, холаду й непасільнай працы ў нязьлічоных савецкіх лягерах; усе тыя, што дагэтуль абціраюць сьлёзы па сваіх найбліжэйшых – бацькох, братох і сёстрах, жонках і дзяцёх.

Усе мы – дзе-б мы толькі ня былі: ці ў вольных краінах Эўропы, ці ў свабодалюбнай Амэрыцы, ці ў далёкай аўстралійскай дэмакратыі, ці ў гарачай Аргэнтыне й Бразыліі – усе мы злучаны гарачай любоўю да сваіх найбліжэйшых, да свайго краю й народу, творым адну беларускую сям'ю ў вольным дэмакратычным сьвеце. Усе мы церпім душой і сэрцам за зьдзек бальшавікоў над Вамі,

Дарагія Суродзічы, і ўсім нашым краем, бо ўсе мы добра знаем, што значыць бальшавіцкае панаваньне.

Словы, якія Вы пачуеце ў нашых перадачах, будуць словамі ад нас усіх і будуць ськіваваны да Вас усіх: і да сялян, якія адбываюць галодную савецкую паншчыну, і да работнікаў, імём якіх гандлююць крамлёўскія дыктатары, а фактычна экспляатацыяй высмоктваюць зь іх апошнія сілы, і да інтэлігенцыі савецкага апарату, якой веда і здольнасьці выкарыстоўваюцца прымусова на разбудову тыраніі над народам, і да жаўнераў чырвонай арміі, якіх зьненавіджаны Крэмль штыхамі змусіў абараняць тыранію перад хвалямі свабоды і імкнецца пры дапамозе тых-жа штыхоў накінуць бальшавіцкую дыктатуру на рэшту вольнага сьвету. Мы будзем прамаўляць таксама і да тых камуністых, камсамольцаў і працаўнікоў МВД, якія ў запраўднасьці стаяць з народам і вядуць скрытае змаганьне з бальшавізмам, а толькі з мусу выконваюць загады Крамля і належаць да ўпрывілеяваных.

Мы пэўныя ў тым, што нашы перадачы знойдуць глыбокі водгук і зразуменьне сярод усіх пералічаных тут групаў. Бо занадта добра мы знаем іхняе жыцьцё й цярпеньні, бо моцна лучыць нас зь імі ў вадно любоў да свайго краю й народу ды нянавісьць да бальшавіцкай дыктатуры, бо роўна мы хварэем душой за нашых найбліжэйшых, якія сталіся ахвярамі савецкіх катаў, бо перад намі роўнае стаіць змаганьне за свабоду Беларусі, за вызваленьне паняволеных Крамлём народаў.

Праз усе гады, ад часу, калі змушаны былі пакінуць сваю бацькаўшчыну, мы вядзем бязупыннную барацьбу з бальшавізмам, і стараемся прыцягнуць увагу ўсяго вольнага сьвету да таго жудаснага палажэньня, у якім апынуўся наш край і Вы, Дарагія Суродзічы. Нашае змаганьне расьце, павялічаецца, набірае большага размаху, з кожным месяцам мы робімся лічнейшымі й мацнейшымі.

Радыёстанцыя «Вызваленьне» ёсьць голасам стойкіх і адважных, Яна зьяўляецца тэй прыладай, пры помачы якой мы будзем інфармаваць Вас аб запраўдным, свабодным жыцьці ў вольным сьвеце, аб тэй бязьмежнай сымпатыі, якую выказвае гэты вольны сьвет да Вас, прыгнечаных, але захаваўшых поўнасьцьцю сваё людзкое «Я».

«Вызваленьне»! – гэта наш кліч і мэта, гэта назоў, пад якім мы прамаўляем да Вас сяньня і прамаўляць будзем кажны дзень. Мы ўважаем за свой грамадзкі й людзкі аба-

вязак інфармаваць Вас таксама аб'ектыўна й праўдзіва аб тым, што адбываецца вакол Вас, у Савецкім Саюзе, аб чым Вы навет ня маеце магчымасьці даведацца з хвальшывых інфармацыяў савецкага радыя й прэсы.

Слухайце нашага голасу, лавеце кажную магчымасьць, каб пачуць яго. Інфармуйце пра нашыя радыёперадачы ўсіх, да каго маеце давер, пры кожнай нагодзе. Не забывайцеся аб тым, што да Вас прамаўляюць Вашыя сыны й дочкі, Вашыя браты й сёстры, якія зьяўляюцца неадрыўнай часткай Вас саміх.

Памятайце, што мы ў вольным сьвеце робім усё магчымае для вызваленьня нашай бацькаўшчыны, і што пры супольным высілку з Вамі, з Божай помаччу мы пабачым яшчэ шчасьлівы дзень вольнасьці нашае любай Беларусі.»

Пасьля сканчэньня звароту былі пададзеныя голасна дзьве першыя строфкі песьні «Мы выйдзем шчыльнымі радамі» ў харавым выкананьні таго-ж Лювэнскага Ансамблю.

Наступнай часткай праграмы быў прыгожы, узварушаючы глыбокай і шчырай пачуцьцёвасьцьцю, нарыс сябры беларускай рэдакцыі радыястанцыі Пётры Сыча п. н. «Напрамак сэрца», пачатак якога быў адчытаны пад акампаньямант прыцішанай мэлёдыі і словаў далейшых строфак песьні «Мы выйдзем шчыльнымі радамі». Поўны тэкст гэтага нарысу падаём ніжэй:

«У тапаграфіі кут, мераны ўправа ад магнэтычнай поўначы, завецца азымутам. Азымут паказвае нам напрамак простага маршу да мэты. Зьмераны на карце кут досыць добра запамятаваць, пасьля, гледзячы на стрэлку компасу, можна ў дзень і ў ночы ісьці проста да мэты.

Мы, беларускія эмігранты, маем свой зьмераны і добра запамятаваны азымут ад месца нашага прабываньня да нашае мэты – Беларусі. І гэты азымут мы завём азымутам сэрца. Залежна ад нашага месца, цыфры азымуту зьмяняюцца, так азымут з Аўстраліі іншы, чым з Англіі, а яшчэ іншы з Канады, але мэта застаецца адна і тая самая – дарагі, родны,паняволены наш край.

Ня лёгкі хлеб эмігранта і не зайздросная доля на чужыне. Хаця матарыяльна маемся пераважна ня блага. Вольны, дэмакратычны сьвет прыняў нас наагул добра і даў усе правы вольных і поўнавартасных людзей. Але не асабістага дабрабыту мы тут шукаем, набіваючы ногі па ўсіх дарогах і бездарожжах чужога сьвету. Мы, як нашыя

птушкі ў выраі: гнёздаў ня ўём – павароту чакаем. Ярдань ці Ніль, Тыбар ці Няміза, Амазонка ці Гадсон шумяць нам разьліўным Нёманам, сьветлай Дзьвіной. Пад ружовым урукам, шэрай аліўкай ці стромкім кіпарысам нам сьняцца нашы родныя, вечна-зялёныя хвоі, белыя плакучыя бярозы.

Аднак мы ўпэўнены, што Вы там, на паняволенай бацькаўшчыне ня скажаце нам з дакорам: «Дык калі так сумуеце, дык чаму не вяртаецеся?», бо Вы ведаеце, што мы тут маем выконваць адказную місію: супольна з вольным і дэмакратычным сьветам змагацца за зьнішчэньне найгоршага зла й няшчасьця, якога людзтва ня знала ніколі ад свайго пачатку – дзікай жудаснай камуністычнай тыраніі і вызваленьня нашага і іншых народаў спад гэтай злыбяды. Мы маем выканаць тое, чаго ня можаце выканаць Вы там, дзе ня толькі дзейнасьць і слова, але нават думка задушана ў абцугох страху.

Мы гэта заданьне выконваем і маем дасягненьні. Адным зь іх ёсьць наш голас у Радыё «Вызваленьне», зь якога мы сяньня прамаўляем да Вас першы раз.

Дарагія Суродзічы! Ад вякоў і праз шэрагі стагодзьдзяў наш народ усё пачынаў ад Бога. Калі вясной наш араты, ці сявец выходзіў на сваё поле, першае, што ён рабіў – хрысьціўся і казаў: «Памажы-ж, Божа!» а пасьля кідаў першую жменю зярнят у ральлю. Дык і мы сяньня, кідаючы першае зерне вольнага слова з вольнага сьвету да Вас, Дарагія Суродзічы, таксама зачнем ад таго, што нас творыць і жывіць, з чаго наш пачатак і наш канец:

Дык дай нам, Божа! Памажы нам, Божа!

Дык дай нам, Божа, каб наша слова дайшло да Вас цераз усе запоры і барыкады, каб яно, дайшоўшы, знайшло ў Вашых сэрцах пажаданы водгук!

І мы верым, што так станецца.

Хоць ноч і зіма лютуе над нашым краем, мы верым у вясну й сьветлы дзень.

Дык накіроўваем хвалі **Вызваленьня** на азымут сэрца...»

Калі спікэр дайшоў да словаў: «Ад вякоў і шэрагаў стагодзьдзяў наш народ усё пачынаў ад Бога», пачалося прыцішанае харавое выкананьне беларускага рэлігійнага гімну «Магутны Божа» (словы Натальлі Арсеньневай, музыка кам. М. Равенскага). Калі-ж нарыс быў скончаны, далейшыя строфкі гімну былі пададзеныя на ўвесь голас, што дало глыбока настраёвы музычны фінал цэлай аўдыцыі.

У канцы, як звычайна, было пададзенае заканчэньне: «Слухайце нас рэгулярна на кароткіх хвалях у наступных гадзінах маскоўскага часу» (пералік гадзінаў), і аўдыцыя была закончаная словамі: «А цяпер з Богам! Бывайце здаровы!»

Гэтак была пабудована інаўгурацыйная аўдыцыя радыястанцыі «Вызваленьне». Прыблізна гэткімі, з тымі ці іншымі варыянтамі, будуць і наступныя аўдыцыі.»

(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 20-21 [202-203], 1954.)

* * *

У лісьце з 21-га траўня 1954 Вінцук піша да мяне:

«...Так, Раіска! Ты дапяла сваёй мэты. Ты цяпер доктар Раіса Жук-Грышкевіч. Як жа я цешуся! Віншую з цэлага сэрца!...

Я-ж Табе пахвалюся, Раіска. І я здаў экзамен – праўдзівей наша сэкцыя. Ужо два дні нашы словы вітаюць у этэры і хіба што нехта пачуў іх на Беларусі. Першая перадача адбылася ў чацьвер, 20-га. Быў запрошаны Прэзыдэнт наш (М. Абрамчык) і прадстаўнік прэсы др. Ст. Станкевіч. Было прысутна наша начальства з радыё і наша сэкцыя. Праслухалі праграму – наіграную намі раней. Кажуць, што добрая. Віншавалі нас і дзякавалі. Атрымалі павіншавальную тэлеграму з Амэрыканскага Камітэту з Нью Ёрку. Ужо два дні перад гэтым усе сем сэкцыяў – ня вылучаючы расейцаў, паведамлялі ў сваіх аўдыцыях аб тым, што беларусы пачнуць гаварыць 20-га.

Вечарам зрабілі нам урачыстасьць. У найлепшым гатэлі ў Мюнхэне – Hotel Vierjahrenzeiten – замовілі ўрачыстую вячэру на 12 асоб. 5 – нашая сэкцыя, Мікола (Абрамчык), Ст. Станкевіч, і 5 – амэрыканцаў – начальства. Асобная заля. Аграмадны ўрачысты стол – з кветкамі, серабром і крышталам. Каньяк – віны – смакалыкаўная вячэра – прамовы, тосты. А сяньня мы закасаўшы рукавы закончылі й надалі праграму на сёньня, на суботу й нядзелю, бо субота й нядзеля мусяць быць вольнымі ад працы, але праграмы таксама мусяць ісьці. Таму так змучыліся й зьбіліся з ног. Будзем адпачываць два дні. Наагул справы нашы стаяць добра. Нас расцэньваюць высока і паважна з намі лічацца. Гратулявалі нас нават расейцы. Украінцы засталіся за намі далёка з заду. Хоць украінская сэкцыя мае таксама 5 чалавек – ня ведама калі іх пусьцяць на

паветра. Можа праз месяц, можа пазьней... Але яшчэ шмат цяжкога наперадзе, прыдзецца многа працаваць!...»

* * *

Толькі пазьней у 1991 годзе, калі з Бацькаўшчыны сталі прыяжджаць мае родныя, даведалася, што мой тата Мікола, які даўно ўжо памёр, слухаў і падслухоўваў перадачы радыя «Вызваленьне», ды наагул усякія перадачы з вольнага сьвету. Цяпер няма ані Вінцука, што арганізаваў і перадаваў радыёперадачы, ані Таты, які іх слухаў. Сяньня, магчыма, на тым сьвеце яны ўжо з сабой пазнаёміліся, дзеляцца ўспамінамі, дыскутуюць – яны абое любілі дыскутаваць! Памятаю, калі зь Вільні прыяжджалі на летнія канікулы браты Мікола й Хведар Іьяшэвічы, Тата вёў зь імі доўгія гутаркі, распытваўся, як стаяць беларускія справы. Ён наведваў у Пружане цётку Кацярыну Стаўбунік, беларускую дзеячку, якая была рассаднікам беларускай сьведамасьці ў Пружаншчыне, у якой можна было атрымаць усю важнейшую беларускую папулярную літаратуру, што выдавалася ў 20-х і 30-х гадох у Вільні: беларускія календары, розныя часапісы й газэты. Кацярына Стаўбунік памерла, калі не мыляюся, у 1957 годзе. Магчыма й яна, калі ёй здароўе й абставіны дазвалялі, слухала й цешылася беларускімі перадачамі радыя «Вызваленьне».

Кацярыне Стаўбунік і майму Тату належацца шырэйшыя ўспаміны. Дзякуючы ім з малых гадоў і я сьведамая беларуска.

* * *

Першыя 15-ці хвілінныя штодзённыя праграмы перасылаліся на Беларусь 24 разы на суткі. Кажная беларуская радыёвая перадача пачыналася гэтак: «Тут Радыё Вызваленьне. Вы слухаеце голас сваіх суродзічаў-беларусаў з вольнага сьвету... Наш голас ёсьць вашым голасам, бо мы зьяўляемся часткай вас, часткай усіх беларусаў.»

Першую перадачу «Да Суродзічаў на Бацькаўшчыне» пісаў і асабіста перадаў па радыё дырэктар Беларускае Сэкцыі Радыя «Вызваленьне» др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч. Перадача гэта запісана на кружэлцы – собскасьць аўтаркі гэтых радкоў (Тэкст яе паданы вышэй у інаўгурацыйнай аўдыцыі).

Беларуская рэдакцыя радыя «Вызваленьне» гаворыць да свайго народу аб усім, што яго цікавіць і хвалюе: аб

ягонай слаўнай мінуўшчыне, аб ягоным бяспраўным палітычным, сацыяльным і нацыянальным жыцьці ў межах СССР. Кожны дзень падаюцца «Навіны дня», у кожную нядзельную праграму ўваходзіць гутарка на рэлігійныя тэмы; перадаюцца інфармацыі з цыклю «Беларусы ў вольным сьвеце», перадаюцца літаратурна-музычныя праграмы на матар'ялах беларускай музыкі й літаратуры ў вольным сьвеце.

А наагул працу беларускай сэкцыі радыя «Вызваленьне» кіраўнік яе др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч схарактэрызаваў ва «Успамінах аб Пётру Сычу» надрукаваных у «Бацькаўшчыне» нр. 9-10 (623-624), 1964, дзе ён пісаў:

«...Спаткаліся мы з Пятрусём (Сычом, Р. Ж.-Г.) ізноў праз тры гады, калі зьявілася магчымасьць прамаўляньня да беларускага народу праз радыё. Тут адкрылася новая баёвая лінія – лінія псыхалягічнай вайны. Трэба было выяўляць маскоўскі імпэр'ялізм ды разьбіваць ману й ашуканства пэрфіднай бальшавіцкай прапаганды, а адначасна змагацца з амэрыканцамі й расейскімі шавіністамі на месцы за беларускі й незалежніцкі зьмест нашых праграмаў. Трэба было зносіць інтрыгі й паклёпы ды быць гатовым на спатканьне савецкіх агентаў, што сачылі з-за вугла. Не адзін працаўнік радыя быў замардаваны іхняй бандыцкай рукой – у тым ліку й наш сябра Лявон Карась.»



У часе працы ў беларускай сэкцыі радыя «Вызваленьне». Мюнхен, 28 ліпеня, 1954.

Вытрымкі зь лістоў Вінцэнта Жук-Грышкевіча да жонкі Раісы

06.06.1954

«Раіска...

Пішу Табе з цудоўнага мейсца ў Альпах. Возера ў горах. Харaство чаруючае. Я так змахаўся апошні тыдзень, што за ўсякую цану пастанавіў выехаць на сёмуху, карыстаючы з трох дзён вольных. Выбраўся на рыбу. Сам самусенькі. Зраніцы было цёпла й прыгожа. Едучы любаваўся прыродай: харaство гор, лясоў і возера. Прыехаў у Вальхэнзээ – у прыгожую мясьціну. Затрымаўся ў гатэлі і зрабіў усе фармальнасьці, каб выехаць на возера лавіць рыбу. Тымчасам пашоў дождж. Я паабедаў, сядзеў пасьля гадзіны тры, а дождж не перастае. Зазлаваўся й пашоў брадзіць, узяўшы дажджавік з сабой. Дождж зьменшыўся, але марасіў увесь час. Я прайшоў якіх 5 кілямэтраў. Змахаўся й захацеў есьці. Вярнуўся ў гатэль. Зьеў вячэру, а цяпер Табе пішу. Калі заўтра будзе дождж зраньня – адразу варочаюся ў Мюнхэн...»

10.06.54.

«...Сяньня выслаў Табе кружэлку нашай першай перадачы. Думаю, што пазнаеш мой голас, хоць ён і адменны ад натуральнага. Як праслухаеш сама – дай магчымасьць паслухаць Авангарду й іншым, хто зацікавіцца. Лепш было-б, каб яны зрабілі публічнае слуханьне ў сьвятліцы ЗБК, калі такая яшчэ існуе...»

12.06.54.

«URFELD am Walchensee. Hotel Post u. Jager.

Раіска, Жоначка мая Дарагая,

Гэтым разам мне ўдалося лепш. Прыехаў на тое самае возера, але з другога канца. Пагода сяньня цудоўная. Уяві сабе аграмаднае возера сярод гор, парослых лесам, і ўсё гэта абліта сонцам. Зелень лясоў б'ець сваёй сьвежасьцю, паветра, як званок. А ў воддалі за горамі, пакрытымі

лесам, высоўваюцца беласьнежныя вяршыні вышэйшых гор. Крыху прабаваў лавіць рыбу, але хутчэй любаваўся красой прыроды. Празрыстая саледыновая вада пераходзіць у цемень на глыбіні. Гэта найглыбейшае возера ў Нямеччыне, 198 мэтраў! Крутыя абрывы скал цягнуцца ад вяршынь і з такой жа крутасьцяй прадаўжаюцца, адбіваючыся ў вадзяной адхлані. А захад сонца! Вібруе тысячамі ценяў і калёраў. Вось сонца ўжо схавалася, кругом пачало сутунець – а далёкія сьняговыя вершаліны і цяпер яшчэ зьбіраюць сонечныя праменьні... такое харастваю...»

17.06.54.

«...Учора прыехаў **Мікола (Абрамчык).** Я яго выклікаў, бо сюды зьехала Кангрэсовая Камісія, што займаецца бальшавіцкай агрэсіяй, ды зьбірае матар'ялы аб тым, як бальшавікі падбівалі паасобныя краіны. Мусім скарыстаць з гэтай аказіі і прадставіць усё што ёсьць, каб асьветліць сапраўдны лёс Беларусі...

...Паінфармуй мяне, Раіска, што чуваць на грамадзкім грунце ў Канадзе. Ці сапраўды дом купілі? Ці а. Мацукевіч прыехаў? Што з царквой? З ЗБК? З газэтай?...»

26.06.54.

«... Учора наіграліпраграму на ўгодкі сьмерці Купалы. Выйшла моцная й прыгожая. На шчасьце на пярэдадні прыехалі Галіна Ганчарэнка з сп-няй Барбарай Вержбаловіч з ЗША, Галіна дэклямавала «На сход», а я «Паўстань з народу нашага, прарок!» На заканчэньне яны ўдваіх прасьпявалі «Я ад вас далёка». Выйшла цудоўна. Казалі, што ў Нью Ёрку на слуханьне нашай кружэлкі сабралося 60 асоб. Людзі цешыліся й плакалі... Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва прыслаў нам павіншаваньне й падзяку...»

01.07.1954.

«...Галіна (Ганчарэнка) дае нам калясальную помач. Гэта сапраўды здольная, спрытная й разумная дзяўчына. Лепшай тэхнічнай сілы ня мае хіба ўсё наша Радыё. Незалежна ад гэтага вяду вайну за сьцягненьне й уладжаньне іншых нашых вартасных людзей, як Карповіч, Цьвір-

ка, Запруднік і інш. Робіцца ўсё па пляну, але йдзе вельмі цяжка...»

08.07.1954.

«...Учора прыехаў позна дамоў з канфэрэнцыі Інстытуту па вывучэньні СССР... Сяньня быў вечар беларускай песьні й музыкі, зладжаны экспромтам нашай сэкцыяй і гасьцямі, якія бралі ўдзел у канфэрэнцыі: **а. Сіповіч, а. Татарыновіч, праф. Карповіч** і беларус – зь мюнхэнаўскай кансэрваторыі сп. **Семянкевіч.** Яны былі нашымі гасьцямі, да якіх, апрача 6-ці асоб з нашай сэкцыі, дайшлі іншыя мясцовыя беларусы і **Абрамчык.** У пакоі ў адным рэстаране правялі вечар: зьелі вячэру, выпілі й рэшту часу прысьвяцілі музыцы й песьням. Гэта была прэзэнтацыя нашых музычных і вокальных сіл. Сьпявалі: Ганчарэнка і Вержбаловіч беларускія песьні з акардыёнам, сп. Семянкевіч – нязнаны дагэтуль беларускі тэнар – прасьпяваў песьні, якія калісь сьпяваў Забэйда-Суміцкі. Яму, ясна, не дараўняў, але тэнар прыгожы, сьвежы й малады. Ёсьць і культура голасу. Вялікая находка і вялікая надзея. Стараемся ўладзіць яго на працу ў радыё. Душу маю, адчыненую Тваім лістом – развярнуў на ўсю шырыню праф. Карповіч выкананьнем на фартап'яно сваіх твораў: «Бальляда», «Мяжою» і "Stoccato." Што за магутнасьць, што за сіла, што за краса! Сваёй музыкай Карповіч вываручвае душу кожнага, хто слухае й разумее. Гэта вялікі талент, кампазытар і выканаўца. Раблю ўсе высілкі, каб выцягнуць яго з лягернай нэндзы і даць магчымасьць матарыяльнага забясьпечаньня й творчасьці. Маю надзею, што нешта ўдасца, хоць вялікія цяжкасьці, бо гэты вялікі артыст, і як звычайна бывае, у прыватным жыцьці вельмі незарадны.

Сяньня папаўдні нашы госьці з Міколам (Абрамчыкам) адведалі нашу рэдакцыю і праслухалі аўдыцыі: 1-ю, Багдановіча, Купалаўскую і апошні скэч Сыча «Мясакамбінат». Над трымя першымі праранілі сьлязу ад уражаньня, над скэчам – ад сьмеху...»

20.07.1954.

«...Я ўжо на сваёй кватэры... у раёне Bogenhausen... Пераходжу на сваю гаспадарку... Учора адсьвяткавалі разам навасельле й мае імяніны. Галіна з Цёткай прынесьлі ва-

зонік кветак, а Сыч з Карасём віно. Быў яшчэ й госьць з Бэльгіі – сп, Арэшка. Галіна прынесла акардыён. Пілі і за здароўе няпрысутнай гаспадыні, прамаўляючы да твaёй фатагртафіі. Пяялі, гралі, гаварылі. Вельмі добра правялі вечар да позна. Закуску прыгатавалі сп-ні Вержбаловіч і Галіна. На канец вымылі мне ўсю пасуду й прыбралі.

У нядзелю быў Барыс Рагуля. Зьбіраецца выехаць у Канаду. Разам зь ім у нядзелю ад'ехаў і Абрамчык. Цяпер мне паспакайнела, бо было шмат спраў, у якіх, паза заняткамі ў радыё, і я варыўся...»

28.07.1954.

«...Быў у Ст. Станкевіча ў Розенгайме, там і прырода не благая і рыбу ёсьць дзе палавіць. Адпачыў духова, хоць змучыўся фізычна. Затое маю лепшы апэтыт, і сьплю, як сусел...

Прывёз кілі са два рыбкі. Сяньня сп-ня Вержбаловіч і Галіна сьпяклі яе, а адну вялікую зварылі на халоднае – заліўную. Пячоную зьелі на вячэру, а халодную пакінулі мне на заўтра. Праз месяц яны займуць кватэру праз сьцяну з маёй, дык тады жыцьцё ўладзіцца інакш: буду ў іх сталавацца і абяцаюць мне дагляд за маёй кватэрай і мной...»

30.07.1954.

«...Заўтра ў маёй кватэры будзе «парты». Наша рэдакцыя разьвітваецца з амэрыканскім адвайзэрам, які варочаецца ў Нью Ёрк. (Ён **сп. Тэрпак** – прыехаў пасьля Дэсэя толькі на 2 месяцы). Са сп. Тэрпакам мы добра зжыліся й спрацаваліся. Ён разумее пабеларуску так, як парасейску. Яго месца заняў новы амэрыканец, зь якім, думаю, таксама спрацуемся...»

03.08.1954.

«...Падзялюся з Табой добрай навінай. Мая праца лічылася пробнай на 6 месацаў. 9.8. мае кончыцца 6 месяцаў. Але сяньня прыйшоў да мяне дырэктар пэрсанальнага аддзелу і заявіў на чатыры вочы: "We are satisfied with your work, you did a good job. From July 1st you will get a raise to

$5,300.00." Гэта значa падвыжка 800 даляраў на год, 66 на месяц. Не вялікае што, але ўсё-ж буду даставаць 441.60 дал. плюс кватэра. Нам выйдзе цяпер па 220.80. Больш за ўсё гэта сатысфакцыя маральная...

Са здароўем – ня думаю, каб было нешта асаблівае. Баюся, што зноў нічога ня знойдуць і я ня буду ведаць, як змагацца з маімі нястраўнасьцямі...»

12.08.1954.

«Даражэнькая Раіска,

Карыстаючы з нагоды пасылаю Табе ўпамінак з Эўропы: адну вазу і судзіну на фрукты з арыгінальнага чэскага крышталу. Хай гэты упамінак адзначыць 6 месяцаў нашага расстаньня, але разам з тым і ўзмоцненага каханьня.

Я чуюся добра й усё ў мяне ў парадку. Атрымаў Твой мілы лісьцік з 6-8, на які адкажу пазьней. Твае кветкі й цяпер яшчэ як жывыя і ўпрыгожваюць мой пакой.

Цалую моцна. Твой Вінцук.»

14.08.1954.

«... Дзякю Табе за справаздачу з куплі дому і з Касы. Я здаю сабе справу з тае вялікаге работы, якую прарабілі групоўка (Авангард, Р. Ж.-Г.) і ЗБК...

Пішу Табе кораценька, бо зьбіраюся выехаць у Розенгайм на сяньня й заўтра. У мяне госьціць др. Станкевіч з сям'ёй, зь імі я й выеду разам. Вярнуся заўтра. Тулюся й цалую моцна.

Твой Вінцук.»

17.08.1954.

«... У суботу паехаў із Стасем (Станкевічам) да яго ў Розенгайм. Шукаў грыбоў, якіх няма, а ў нядзелю лавіў рыбу. Надвор'е было благое, дождж ды сьцюжа. Злавіў 5 рыбак, зь якіх дзьве парадачныя... Вярнуўся ў нядзелю...

Вечарам быў на «парты» шэфаў і дырэктароў аддзелаў Радыя ды шэфаў нацыянальных сэкцыяў. Прычына: Украінцы ўрэшце пайшлі ў паветра (тры месяцы пазьней

за нас). Аказія не абы якая, бо ўрэшце апошняя сэкцыя (украінская) пайшла ў паветра, і такім чынам сям'я падсавецкіх народаў у радыё «Вызваленьне» прадстаўлена поўнасьцьцю...»

21.08.1954.

«...Я Табе пісаў ужо, што замест падаркаў на ўгодкі нашага шлюбу – лепш ахвяраваць штось у нашу царкву і абяцаў Табе ікону. Сяньня я знайшоў адпаведную і купіў. У панядзелак яна будзе выслана табе лятунскай поштай, а кіёт да яе і два падсьвечнікі – звычайнай. Такім чынам ты атрымаеш ікону перад 4.9., і зможаш ахвяраваць яе нашай царкве... На адвароце можаш прыклеіць картку з напісам: «**Дар ад Раісы і Вінцэнта Жук-Грышкевічаў для Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы ў Таронта ў дзень першых угодкаў іх шлюбу, 04.09.1954.**». Або зрабі, як захочаш. Мне здаецца, што ікона гэта адпаведная. Яна са Смаленска (магчыма Смаленскай Божай Маці). Выраз твару Маці Божай – такі наш, спакойны, добры... Гэта самае лепшае, што я мог знайсьці. Такім чынам больш Табе нічога на гадавіну ня прышлю. Гэтым разам прымі гэты падарак і ахвяруй у царкву ў адзнаку тэй Божай апекі й помачы, якой мы былі абдораны праз год нашага жанімства...»

25.08.1954.

«... Быў тут **Мр. Дрэгэр** (той, што наймаў мяне на работу ў Нью Ёрку) праз два тыдні. Нагаварыў мне й нашай сэкцыі камплемэнтаў... Але я ня быў зь яго задаволены, зь яго нявыразнага адношаньня да нацыянальных праблем. Я зь ім ня цацкаюся, кажу, што думаю, і па меры магчымасьці стараюся праводзіць сваё ў жыцьцё. І ня гледзячы на гэта яны мяне шануюць, цэняць і лічацца са мной...»

28.08.1954.

«...Пакуль «Беларускі Эмігрант» ня выходзіць, «Бацькаўшчына» можа быць выкарыстана для ўсіх вашых абвестак і справаздачаў. Стась (др. Станкевіч, Р. Ж.-Г.) і ўсе тут, гэта-ж вашы сапраўдныя аднадумцы. Гэта абсурд лічыць нас усіх чужымі. Пагавары аб гэтым з групоўкай (Авангардам, Р. Ж.-Г.): з Ганьком, Акулам, Грыцуком...»

07.09.1954.

«...Суботу й нядзелю правёў у Розенгайме. Лавіў рыбу й загараў. Учора й сяньня мелі рыбны абед. Прызнаўся Стасю аб сваіх угодках (шлюбу, 04.09. – Р. Ж.-Г.). Быў там Кабычкін (стары беларус з Аўстрыі) і сусед Стася, зь якім я лавіў рыбу. На нашу інтэнцыю выпілі па чарцы й закусілі сьвежай рыбай... У нядзелю паехалі на іншае мейсца за 10 км. Там быў добры ўлоў. Не магу дараваць толькі, што ў мяне ўзяўся вялікі карп, калі я яго цягнуў – ён бэстыя загнуў кручок і сарваўся. А карпы тут смачнейшыя, як у Канадзе...»

16.09.1954.

«...Я ўжо пісаў Табе, што Чайкоўскі за два абразы (іконы) хоча 300 нямецкіх марак. Мы маем толькі 80. Без прысылкі з Таронта грошы – нельга ў яго нічога заказваць. Тут у Аўсбургу беларусы будуюць царкву. Ім таксама трэба было ападаткавацца. Абразы – гэта справа з а. Міхалам і Грыцуком. Можа вы іншы спосаб знойдзеце. А пакульшто бывай здарова.

Тулюся й цалую моцна. Твой Вінцук.»

21.09.1954.

«...Нічога ня пішаш, скуль у Цябе пэўнасьць, што 12.10. пазавуць Цябе ў суд. Даў бы Бог, каб так было. Можа тады ў канцы кастрычніка мы злучыліся-б, і адышлі-б на бок і адзінота й Тваё неспакойства за мяне. Ня маеш паняцьця, як я чакаю Твайго прыезду.

Сяньня прыехаў на працу ў радыё Запруднік. У канцы месяца прыедзе Цьвірка, а ў канцы гэтага тыдня мае прыехаць Мікола на якісь час.

Выбач, што перарываю, вочы клеяцца. Тулюся да Цябе й цалую моцна. Твой Вінцук.»

24.09.1954.

«...Мінулы тыдзень быў вельмі цяжкі. Здарылася нящчасьце, – хавалі мы свайго супрацоўніка сьв. пам. Лявона Карася. Ён у нас быў перакладчыкам. Што зь ім зда-

рылася – цяжка сказаць... Досьць таго, што знайшлі яго затопленага ў рэчцы. Сьледзтва й мэдыцынская аўтопсія не знайшлі ніякіх сьлядоў насільства ці параненьняў, таму прыпушчаюць, што сьмерць наступіла ў выніку самагубства. Што-б там ня было, але справа вельмі няпрыемная й цяжкая. Каштавала нам шмат нэрваў, неспакою ды часу. У гэтым тыдні ўжо зноў усё пайшло нармальнай дарогай. Прыехаў Запруднік, і праца йдзе без асаблівых высілкаў...»

Пра сьмерць Лявона Карася Вінцук піша да мяне вельмі асьцярожна, каб мяне ня страшыць, бо я й так за яго пераймалася. У сапраўднасьці ў прычыне сьмерці Карася ўсе бачылі не самагубства, а бальшавіцкую руку, бо на гэта былі падставы...

А 18 сьнежня 1954 году Мюнхэнаўская газэта "Suddeutsche Zeitung" пісала наступнае:

«14 верасьня, недалёка ад Віттэльсбахскага мосту зь Ізару выцягнулі цела. Гэта быў 31-гадовы перакладчык Леанід Карась, які працаваў на радыястанцыі «Вызваленьне». Тады ўважалася, што Карась стаўся ахвярай нейкага выпадку. Новыя дадзеныя Камісіі Забойстваў дазваляюць меркаваць, што над Карасём зроблена праступства...»

(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 39 [269], 25 верасьня, 1955)

02.10.1954.

«Раіска мая Даражэнькая,

Ужо ня меў надзеі атрымаць сёньня Твой ліст. Чакаў і зраніцы і па паўдні, а ліста, як няма, так няма. Ад Твайго апошняга ліста прайшло 5 дзён. Непакоіўся, што Ты мо' нездарова. Аж па гадз. 3-яй па паўдні прыйшоў твой ліст з 25 і 27. Ну, дзякаваць Богу, адлягло мне на душы.

Цешуся, што ўсе вы там у Таронта заняты домам і царквой, і ў Цябе няма духовай пусткі. Ты,відаць, так занята, што нават сп. Равенскага ўваскрасіла, кажучы, што ён прыедзе з хорам і Уладыкам на высьвячэньне (дому, Р. Ж.-Г.). Відаць, думала, Куліковіч, а напісала Равенскі.

Затое прыкрае для мяне сьцьверджаньне факту, што няма ніякай пэўнасьці, што 12.10. Цябе паклічуць у суд (атрымаць канадыйскае грамадзянства, Р. Ж.-Г.). Цяпер я

ўжо зусім ня ведаю, за што ўчапіцца, і на калі чакаць Твайго прыезду. Відаць, на калі прыдзецца, а мо й ня прыдзецца?

З Твайго настрою відаць, што ніякая «гэй фівэр» Табе не дакучае, што Ты зусім здарова. Гэта мяне супакойвае.

У мяне ідзе ўсё пастараму. Калясо радыёвае круціцца бесперапынна, і тыдні зь іх праграмамі бягуць адзін за другім. Пачалася восень, раптоўная сьцюдзённая восень, якой я так ня люблю. Лета фактычна сёлета ня было ў большасьці Эўропы. Французы падтруньваюць, што сёлета летам была зусім добрая зіма і лаюць амэрыканцаў пры гэтай аказіі, кажучы, што яны атамнымі выбухамі перавярнулі лета на зіму. Камуністы-ж падліваюць больш масла да гэтага анекдоту і выходзіць, што ўва ўсім амэрыканцы вінаваты...

...Сяньня хачу яшчэ спаткацца з Міколам (Абрамчыкам), які заўтра выяжджае дамоў. Гэтым разам абыйшлося толькі 2-ма паседжаньнямі, у якіх я браў удзел...

...Так, Раіска, як бы там ня было, а мне без Цябе вельмі цяжка. Сяджу дома ў прыгожай прасторнай кватэры і адчуваю пустку, бо няма душы дома. Наша разлука робіцца чым далей, тым больш нязноснай... на сэрцы жаласьць, дасада...

Цалую моцна. – Твой Вінцук.»

* * *

Але Ты, Вінцук, чакаў мяне, ведаў, што прыеду, ведаў, што я жывая... А вось цяпер мне, якая пустка, якая безнадзейнасьць, бо Ты ніколі ня прыйдзеш, ня можаш прыйсьці... толькі я да Цябе прыйду на магілку, прынясу кветак, якія Ты так любіў, згавару малітву... а калісь і лягу побач... Гэта ўсё такое сумнае, але-ж такое правіла жыцьця, якога зьмяніць ніхто ня можа, дык трэба толькі зь ім мірыцца...

* * *

05.10.1954.

«...**Аб сьв. пам Леаніду Карасю**... Так шкада гэтага маладога чалавека, бо ён быў і добрым чалавекам і патрыётам беларускім і добрым працаўніком. Дзеля гэтага ўсе

яго любілі й шанавалі – нават чужынцы. 100 чалавек супрацоўнікаў радыя па сваёй ініцыятыве сабралі 205 марак на вянок і помнік, дэлегацыя ад усіх нацыянальнасьцяў складала нам свае кандаленцыі і многія ўключна з амэрыканскім начальствам прынялі ўдзел у паховінах. Было аж 16 вялікіх прыгожых вянкоў. Яму-ж было толькі 30 год...

Зьбліжаецца 12.10. Чакаю на Твой ліст, у якім мне паведаміш, што ўжо пазвалі цябе ў суд, дзе ўсе фармальнасьці праведзены. Засталося-б тады чакаць на Твой прыезд. Ой, каб хутчэй!...

Твой Вінцук.»

Аб царкве й Тарантонскіх справах

09.10.1954.

«Раіска мая Даражэнькая,

Учора атрымаў Твой пабожны ліст. Думаў, што будзе нешта новае ў справе Твайго выезду да мяне, бо-ж выглядаў ён надзвычайным, паколькі быў ужо аж 3-ім лістом у гэтым тыдні. Аказалася, нічога новага ў справе выезду... Ну што-ж, трэба мець цярплівасьць...

...Гэта добра, што Ты мне так падробна апісала царкоўныя справы. Вельмі цешуся, што ўсё так добра й прыгожа пачалося. Дзякую Табе за старанную справаздачу. Аднак я толькі баюся, каб гэты запал не астыў зь бегам часу. Тое, што вы ўпарта пачалі – мусіце ўпарта цягнуць і на далей... Найважнейшае тут: вытрымка, адданасьць справе, пашана да царквы і сьвятара і такт – як у ўзаемаадносінах між сваімі, так і да нашых праціўнікаў...

...Трэба зьвярнуць увагу таксама на тое, каб на царкоўным грунце не закранаць ніякіх палітычных праблем, ніякіх дражлівых пытаньняў. Аб ворагах і праціўніках нашых і шкоднікаў нашых можна, а нават трэба ўспамінаць пры кожным выпадку, але не палемізаваць зь імі, а паступаць па Хрыстоваму, памаліцца за іх, асьлепленых злосьцяй ці нянавісьцяй, каб Усемагутны адчыніў ім вочы і зьмякчыў іхнія сэрцы. Такой лініі трымаўся наш Уладыка, чым здабыў сабе вялікую прыхільнасьць.

Урачыстасьць высьвячэньня дому трэба выкарыстаць дзеля найшырэйшага розгаласу, каб як мага больш бела-

русаў прыняло ў ёй удзел. Наш Уладыка (Уладыка Васіль) напэўна зробіць на людзей добрае ўражаньне, каб толькі яны былі прысутныя. Варта запрасіць беларусаў з правінцыі, з Мантрэалю, Гамільтону і адкуль толькі можна. Пастарайся сугэраваць гэтыя думкі, ясна, не ўспамінаючы майго імя.

Як дагэтуль, дык Ты стараешся добра – і за сябе і за мяне, каб запоўніць тое пустое месца, якое я пакінуў. Аб адно толькі Цябе прашу, мая Даражэнькая: старайся быць у адносінах з людзьмі разважнай і тактоўнай, ня выбухай гневам, ці абурэньнем, замест гэтага лепш ужыць цярплівасьці й выразумеласьці. Выбач, што я так аб гэтым гавару, гэтыя прыкметы кожнаму патрэбны, а іх вельмі цяжка культываваць. Яны выступаюць лягчэй, калі маецца "self-control." Унікай здэнэрваваньня. Лепш зусім не рэагаваць, калі здэнэрвавана, а перачакаць, супакоіцца і тады зарэагаваць разважна. Унікай крыку й падвышэньня голасу на каго-б то ня было, гэтым самым даецца повад да павышэньня голасу таму, з кім маеш дачыненьне. Я таксама змагаюся з гэтымі людзкімі недахопамі ўвесь час у маёй працы і, на вялікі жаль, не заўсёды мне ўдаецца быць такім, якім бы я хацеў быць. Усё-ж у выніку выходзіць лепш, чымся, калі-б пусьціць сябе так «бяз руля і бяз ветразі»...

...Патрэбны мне будуць: лісты Рагнеды (яны ўсе ў адным канвэрце з напісам, зьверху), мікрафільм кніжкі: Клейнбарт «Молодая Белоруссия» (мікрафільмы ў асобных папяровых пушках) і адзін каляндарык – Notes z 1945 году з Італіі. Там ёсьць адрасы й тэлефоны, мне патрэбныя. Калі гэта ня цяжка, папрабуй знайсьці ўсё гэта і прывязі, калі-б прыяжджала хутка.

А цяпер з Богам, заставайся здаровая й вясёлая!

Абыймаю й цалую моцна – Твой Вінцук.»

16.10.1954.

«...Атрымаў сёньня Твой ліст, у якім ты апісваеш благую сытуацыю каля царквы. Для мяне гэта ўсё зразумела. У вас жа ня масавая работа, а работа невялікай групы адзінак. Са стараны... праціўнікаў трэба спадзявацца ўсякіх напасьцяў... Царква ўтрымаецца, калі ўтрымаецца

група, што яе стварыла, і будзе паважна адносіцца да сваіх абавязкаў адносна царквы. Самае важнае, каб групоўка (Авангард, Р. Ж.-Г.) трымалася моцна гэтай пазыцыі, а апрача таго старалася пашыраць свой круг, здабываючы для падтрыманьня царквы іншых, на якіх можна ўплываць і прыцягнуць. Дзеля гэтай справы варта склікаць групоўку, на якой пытаньне гэта трэба паставіць рабром. Пасьля сходу групоўкі варта зрабіць шырэйшы сход – сход вернікаў, падгатаваўшы да ўдзелу ў ім іншых, якіх удасца прыцягнуць. Я разумею пад гэтым: сем'і з групоўкі, сям'ю Слаўкоў (вельмі важна, каб яе замацаваць пры царкве, выбраўшы мо' старога Слаўка на старшыню ці сакратара царкоўнага камітэту, а мо' й чымсь іншым прымацаваць), ды і іншых,каго можна. Трэба старацца стварыць групу вернікаў хоць мо' невялікую, але пэўную й моцную. У якую форму ўняць – ці царкоўны камітэт, ці брацтва – даўшы яму выразны праваслаўны назоў – вам на месцы відаць лепш. Трэба, каб гэтыя людзі былі ў курсе ўсіх царкоўных спраў, нават грашовых. Трэба разьбіць у іх усякія сумлівы, у тым ліку й адносна грошы, за якія куплены дом. Трэба, каб яны відзелі кожную капейку, прыходзячую і выходзячую, тады яны ня толькі ня будуць мець сумліву самі, але іх будзе абураць усякі паклёп. Гэта была памылка, што затойвалася, нібы дзеля тактоўных прычын, як згарусьцілася сума на куплю дому. Гэту памылку трэба паправіць на адным са сходаў, даючы падрабязную справаздачу з удакумэнтаваньнем. Тых, якія маюць сумлівы – найлепш было-б выбраць у царкоўны камітэт, калі яны аўтакэфалісты, ды ўзваліць на іх хоць частку грашовых апэрацыяў. Гэта справа цяжкая, скамплікаваная, аднак якісь выхад зь яе трэба знайсьці. Скалаціўшы хоць невялікую, але сталую групу вернікаў, паказаць, што вам не залежыць на іншых людзях, не ганяцца за імі і не прасіць. Адно рабіць сваё стала й упарта. Пагоня за людзьмі прыносіць адваротны вынік. Выкарыстайце ўрачыстасьць адкрыцьця дому, каб парушыць паклёпы, але не палемізаваць, а па прыкладу Уладыкі памаліцца за тых, што зло чыняць. Гэтыя думкі можаш выказваць ад сваяго імя, не ўспамінаючы мяне.

У мяне нічога новага, чуюся добра. Жадаю ўсяго найлепшага.

Абнімаю й цалую – Твой Вінцук.»

08.11.1954.

«...Сёньня працавалі ў траіх толькі. Запруднік паехаў у Лювэн жаніцца, а Галіна зь ім да кампаніі. Заўтра вернуцца.

...Скарэй ужо прыяжджай, бо мне надаела адзінота. Але самалётам не ляці...»

«Пайшлі паміраць, каб жыла Бацькаўшчына»

Пад такім загалоўкам газэта «Бацькаўшчына» падае 5 сьнежня перададзеную 27 і 28 лістапада 1954 году радыястанцыяй «Вызваленьне», а прысьвечаную 34-м угодкам Слуцкага паўстаньня, аўдыцыю наступнага зьместу:

«У кажным годзе дзень 27-га лістапада беларусы ў вольным сьвеце прысьвячаюць памяці герояў Беларусі – усім тым, што пайшлі паміраць і церпяць і паміраюць цяпер, каб жыла Бацькаўшчына. І мы ім прысьвячаем нашу сяньняшнюю праграму.»

Далей ішлі: жалобны марш «Сьпі пад кургаман герояў», дэклямацыя верша А. Будзіча «Над магілай герояў» і пасьля яе зьмест дакладу:

«Чалавечая вольнасьць, свабода слова й дзеяньня, права быць гаспадаром у сваёй хаце й на сваёй зямлі – даражэйшыя за ўсё, навет за жыцьцё. Нашы продкі змагаліся за гэту вольнасьць і права цэлымі стагодзьдзямі. І калі выбухла рэвалюцыя 1917-га году, а расейская імпэрыя распалася – беларусы, як і іншыя народы гэтай імпэрыі, прыступілі да вырашэньня свайго лёсу.

У сьнежні 1917 году быў скліканы ў Менску Першы Усебеларускі Кангрэс, на якім 1800 дэлегатаў выявілі волю беларускага народу, што іх выбраў, будаваць вольную й незалежную беларускую дзяржаву. Аднак яны не змаглі правясьці сваёй работы да канца, бо бальшавікі, якія стараліся захапіць уладу на Беларусі, кінулі на Кангрэс свае ўзброеныя палкі, каб здушыць волю народу, разагнаць народных выбранцаў. Усё-ж Усебеларускі Кангрэс пасьпеў выбраць сваю Раду ў ліку 71 асобы, якой і перадаў усе свае паўнамоцтвы давесьці да канца будаваньне беларускай дзяржавы. На падставе гэтага Рада Кангрэсу 25 сакавіка 1918 году абвесьціла на ўвесь сьвет незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі – БНР, і пачала арганізаваць уладу на мясцох.

Але на Беларусі тады змагаліся чужыя сілы: немцы і бальшавікі пустошылі край. Пазней-жа бальшавікі з палякамі вялі вайну на беларускай зямлі за ўладу над ёй і ўрэшце пачалі дагаварвацца, каб падзяліць Беларусь між сабой. Як адны, так і другія арыштоўвалі сяброў Рады БНР, ліквідавалі яе органы на мясцох. Урад БНР мусіў выехаць за граніцу, адкуль кіраваў змаганьнем з напасьнікамі. А змаганьне гэтае крывавіла ранамі па ўсёй Беларусі. Выбухалі паўстаньні, якія хоць былі жорстка здушаны ў вадным месцы – паўставалі ў другім. Крывавілі ў паўстаньнях Віцебшчына, Магілёўшчына, Гомельшчына ды Меншчына. Але найлепш зарганізаваным і найтрывалейшым было паўстаньне Слуцкае, таму мы яму і ўдзяляем найбольш увагі.

Случчына выявіла найвялікшую нацыянальную сьведамасьць і найбольшую актыўнасьць у будаваньні БНР. Пасьля абвешчаньня незалежнасьці БНР 25-га сакавіка 1918 году ў Слуцку паўстае Беларускі Нацыянальны Камітэт на чале з Жаўрыдам, як мясцовы ворган ураду БНР. Бальшавікі, якія пачалі змагацца з БНР ад пачатку яе паўстаньня, зьліквідавалі гэты Камітэт і арыштавалі Жаўрыда. Калі-ж бальшавікі пад націскам польскіх войск адыйшлі із Слуцку – Жаўрыду ўдалося ўцячы з бальшавіцкага вастрогу і Беларускі Нацыянальны Камітэт у Слуцку ўзнавіў сваю дзейнасьць.

Але вось у лістападзе 1920-га году палякі з бальшавікамі пачалі дагаворвацца аб міры і падзеле Беларусі. Беларускі Нацыянальны Камітэт у Слуцку зарэагаваў на гэта зваротам да народу і скліканьнем, народнага зьезду Случчыны. 14-га лістапада сабралася 107 прадстаўнікоў Случчыны разам з камісарам ураду БНР Жаўрыдам. Зьезд вынес такую рэзалюцыю:

«Першы Зьезд Случчыны, скліканы ў ліку 107 асобаў, вітае Найвышэйшую Раду Беларускае Народнае Рэспублікі й заяўляе, што ўсе свае сілы аддасьць на адбудову Бацькаўшчыны; катэгарычна пратэстуе супраць заняцьця нашае Бацькаўшчыны чужацкімі й самазванымі савецкімі ўладамі. Хай Жыве вольная, незалежная Беларуская Народная Рэспубліка ў яе этнаграфічных межах!».

У дэкляцыі-ж з 21-га лістапада зьезд выявіў сваю станоўкую волю бараніць незалежнасьць БНР і інтарэсы сялянства «... ад гвалту з боку чужаземных захопнікаў і ў выпадку патрэбы навет сілаю аружжа, ня гледзячы на лічбовую перавагу ворага...»

Калі-ж бальшавікі пачалі пасоўвацца на захад, займаючы новыя тэрыторыі Беларусі, Рада Случчыны кінула заклік да народу, каб узброжваўся, і прыступіла да арганізацыі І-ай Слуцкай дывізіі. Пад сьцягамі БНР сабралося каля 10 тысяч жаўнераў. Аб запале Случчакоў сьведчыць факт жывога ўдзелу жанчын у гэтым збройным руху. Маткі й сёстры жаўнераў дарылі слуцкім аддзелам вышытыя іх рукамі сьцягі з напісам: «Тым, што першыя паўсталі й пайшлі памірaць, каб жыла Бацькаўшчына».

27 лістапада Слуцкая дывізія ўступіла ў бой з бальшавікамі. Было адабрана ад ворага мястэчка Цімкавічы й іншыя пункты. Фронт расцягнуўся на 100 кілямэтраў. Чырвонаармейцы пераходзілі на бок случчакоў. Тады бальшавікі кінулі ў бой свае найбольш адданыя камуністычныя палкі й аддзелы з перавагай кітайцаў. Пад націскам лічбовай перавагі ворага случчакі адступілі да ракі Лань. Аднак зацятыя баі трывалі да 28 сьнежня. Былі кінуты новыя бальшавіцкія дывізіі, а случчакі ня мелі падмогі ніскуль. Іх заклікі аб помачы да заходніх дзяржаваў былі збытыя маўчаньнем. Нічога не заставалася ім, як перайсьці польскую лінію. Там слуцкая дывізія была разброена й інтэрнавана. Аднак ня ўсе паўстанцы пайшлі на разаружаньне. Некалькі тысяч іх разыйшлося па лясох Случчыны й іншых паветах. На падставе савецкай прэсы можна сьцьвердзіць, што вогнішчы беларускіх паўстанцаў былі дзейныя доўгія гады, а некаторыя аж да 1926 году. Змаганьне йшло поруч з другім магутным беларускім нацыянальным рухам, гэтак званай «нацдэмаўшчынай».

Змаганьне беларускага народу за сваю незалежную БНР не давяло да гэтай вялікай мэты. Яно не магло перамагчы націску палякаў з захаду і бальшавікоў з усходу. Аднак тыя, што памерлі, каб жыла Бацькаўшчына, выявілі ў змаганьні за сьвятую ідэю вольнасьці веліч духа й нязломную волю. Злажылі-ж на аўтар вольнасьці найдаражэйшае, што мелі – сваё жыцьцё. Таму яны сталіся прыкладам для ўсіх патомных. Таму мы сяньня аддаём ім чэсьць і ўшаноўваем памяць гэтых герояў. Таму мы ім сьпяваем наш нацыянальны гімн, зложаны Слуцкім паўстанцам – ведамым пісьменьнікам Макарам КАРАЎЦОВЫМ, замучаным у засьценках НКВД. **В. Жук.**

(Аўдыцыя закончылася адсьпяваньнем беларускага нацыянальнага гімну ‹Мы выйдзем шчыльнымі радамі›).»

(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 45 [227], 5 сьнежня 1954)

Раіса ў Мюнхэне

Працаваць кіраўніком беларускае сэкцыі радыя «Вызваленьне» Вінцэнт Жук-Грышкевіч падпісаў з Амэрыканскім Камітэтам кантракт на адзін год. У травені 1954 году я закончыла ўнівэрсытэт – факультэт дэнтыстыкі – увосені атрымала канадзкае грамадзянства й перад Калядамі далучылася да мужа. Мюнхэн, хоць мясцамі былі яшчэ быльлём заросшыя паваенныя руіны, быў багатым, жывым, перадсьвяточна радасным і прыгожым горадам. Мы мелі кватэру ў калісьнейшым замку на Siebert Strasse 7, у дзяльніцы Bogenhausen, насупраць была турэцкая амбасада, якую часамі турбавалі армяне... Блізка быў парк, куды мы зь Вінцуком хадзілі на спацыр. Заўважыла, што Вінцук пачаў падупадаць на здароўі – галаўныя болі, нястраўнасьці. Нэрвовае напружаньне – казалі. З працы прыходзіў змучаны й заўсёды перад вячэрай мусіў паляжаць.

Адносіны між працаўнікамі радыя, а асабліва між працаўнікамі беларускай рэдакцыі былі сяброўскія. Хутка пасьля майго прыезду ў Мюнхэн новы 1955 год сустракала супольна ўсё радыё «Вызваленьне», у вялікім гатэлі на вялікую скалю з мастацкай шматнацыянальнай праграмай. Калісь опэрная Менская сьпявачка, **Барбара Вержбаловіч** узначальвала беларускую праграму. Як каралева, выплывала яна ў шыкоўным беларускім народным строі на сцэну. Гледзячы на яе, слухаючы яе сьпеву, заўсёды я думала: як мастацтва робіць чалавека прыгожым, чароўным! Цётка Барбара, чалавек ужо старэйшы, ня была, можна сказаць, прыгожай, а на сцэне, калі яна пяяла, у захапленьні вачэй ад яе нельга было адарваць! Ды захапляла ня толькі мастацкая праграма, а й уся віруючая заля, асьвятленьне, музыка, танцы, і ў душы такая радасьць – шчасьце, якога ўжо ніколі ня будзе... Каляды, Вялікдзень, сямейныя сьвяты – заўсёды разам у нашай грамадзе. І так шмат каго з тае грамады ўжо няма...

Летнімі месяцамі кожную няделю прыходзіў да нас сьв. пам. **Уладзімер Бортнік,** і мы трамваямі й чыгункамі выяжджалі за горад на прыроду, у лес, або з вудамі на рэчку. Цікавае бывала рыбалоўства ў Нямеччыне. Купіўшы два дазволы, адзін ад гораду, другі ад собсніка рэчкі й рэстарану, рыбакі павінны былі злоўленую яшчэ жывую рыбу насіць у бочцы са сьсюдзённай вадой, і ўвечары ўвесь жывы ўлоў аддаць рэстарану. Тады, мы ўжо й зму-

чаныя й галодныя заказвалі ў рэстаране сьвежазлоўленую намі фарэльку й за вячэру плацілі нармальную цану. Была гэта фарэльная рэчка, і шмат было ў ёй рыбы, рыбалоўства было цікавае, бо фарэлька бралася, толькі дамоў ехалі з пустымі рукамі. Праўда, гэткае рыбалоўства здарылася нам толькі раз, болей у тое мейсца мы ўжо не паехалі. У іншых мясцох варункі рыбалоўства былі нармальныя, рыба магла блага брацца, але, што злавіў, тое тваё.

Працаўнікі Радыя – рухавы быў народ. Усьцяж рабілі розныя экскурсіі, то зьведвалі старое замчышча, то езьдзілі грамадой на Каляды на пастэрку ў нейкі слаўны на высокай гары касьцёл, то ў Гарміш Патрэн Кірхэ на лыжы.



Старшыня Рады БНР інж. Мікола Абрамчык і старшыня беларускай сэкцыі радыя «Вызваленьне» др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч. Мюнхэн, 1955.



Вінцэнт Жук-Грышкевіч з жонкай Раісай і Уладзімерам Бортнікам (зьлева). Мюнхэн, 1955.



Вінцэнт Жук-Грышкевіч (стаіць з паднятай рукой), побач жонка Раіса й супрацоўнікі радыя «Вызваленьне» на сьвяткаваньні 52-х угодкаў ягонаго жыцьця. Мюнхэн, люты, 1955.

У Італіі

Будучы ў Нямеччыне, мы зь Вінцуком адведалі й Італію. У Рыме бачыліся з айцом Татарыновічам, беларускім сьпеваком Пётрам Конюхам. Зьведвалі Рым: Рафаэляўскія станцы ў Ватыкане, базыліку Сьв. Пятра з Pieta, Сыкстынскую капліцу з фрэскамі Міхала Анжэля й ягоным «Апошнім судом», у месячным асьвятленьні Colloseum, руіны старога Рыму, палац Дучэ... І адведалі з Пётрам Конюхам Вінцуковую знаёмую з часоў вайны італьянскую піяністку, імя якой ніяк не магу прыпомніць.

Ды адной з галоўных мэтаў адведаньня Італіі была парада мюнхэнаўскага лекара паехаць на вульканічны востраў Іскію, каб лячыць Вінцуковую праблему, якую ён меў са сьпіной і зьвязаным зь ёй іш'ясам.

На Іскіі

У той час, напачатку кастрычніка 1955 году, Іскія ня была камэрцыйным турыстычным мейсцам, якім яна сталася цяпер. Усё там мела вясковы прымітыўны характар. Цяжка было знайсці мейсца на закватэраваньне. Нарэш-

це знайшлі. Аказалася, у нашым пакоі, за занавескай з радна, месьціліся дзьве іншыя турысткі. На другі дзень Вінцук ізноў стаў шукаць такога месца, каб у нашым пакоі за радном не кватэравалі іншыя турысты. Знайшлі, і італьянец запэўніваў нас, што будзе «тутто сэпарато».

На чым-жа палягала славутае лячэньне на Іскіі? На пляжы пясок быў гарачы й не ад сонца, а гарачыня йшла з глыбіні зямлі, чым глыбей, тым гарачэй. «Пацыентаў», а такіх там было процьма, «інструктар» заграбаў у добра цёплы пясок і казаў, колькі часу ім трэба так грэцца. Было там весела, шмат жартаў і сьмеху, бо «інструктара» (гэта я яго так назвала) называлі «Казанова». Мясцамі на пляжы было балотца, якое варылася й булькатала. У ім можна было варыць яйкі. Мясцовасьць была скалістая. Тут пяшчаная раўніна, а тут падымаецца ўвысь скала. У ёй пячэры, поўныя сярчанай пары, або са скалы выплывае гарачая вада. Яе выкарыстоўваюць на даволі прымітыўна ўладжаныя ванны. За вельмі малую цану можна карыстаць з такой ванны. Вада ў ёй прыемна цёплая й увесь час зьмяняецца, значыць чыстая. Вада так насычана рознымі мінэраламі, што ў ёй ня тонеш, а фактычна трымаешся на паверхні. Ня ведаю, на колькі гэтыя ванны былі карысныя для здароў'я, але давалі прыемнасьць і задаваленьне.

І людзі як хацелі, і дзе хацелі, так і «лячыліся». З большым даглядам й пад назорам было лячэньне вульканічным балотам. Абмазвалі чалавека зь пятак па шыю чорным балотам і па колькіхсь там мінутах абмывалі яго гэтаксама мінэральнай вадой.

Пасьля такое тэрапіі пераехалі мы ў малое мястэчка, а фактычна вёску, да лекара. Вінцук-пацыент і лекар разгаварыліся. Вінцук расказваў пра ягоны побыт у Італіі ў часе вайны. Я не магла браць удзелу ў гутарцы, бо ня ведала італьянскай мовы. Пасьля лекарскага дасьледаваньня Вінцук пытае, колькі ён вінен, бо там ня было неяк ані сакратара, ані сястры, а лекар за нішто ня хоча браць за візыту заплаты, і ня ўзяў. Ідзем з рацэптам у аптэку, ізноў тая самая гісторыя: лякарстава далі, а грошаў за яго браць ня хочуць. Ну што-ж, натрапілі на двох надзвычайных людзей. Мне было цяжка зразумець і паверыць, а Вінцук кажа: «Італьянцы вось такія, як яны да каго прыхільна паставяцца, дык выказваюць надзвычайную сардэчнасьць».

У гэтай вёсцы быў касьцёл, невялічкі, але як цацка ўва ўсіх дэталях, такі прыгожы.

Пасяліліся мы ў прыватным доме, у выгадным пакоі з кухняй і памятаю, як гаспадыня вучыла мяне, як прыгатаўляць-варыць шматногую рыбу-ня-рыбу, але вельмі смачную зь яе страву. У гэтай вёсцы, падобна, як у нас у Беларусі, людзі між сабою жылі, як суседзі, а не як чужыя. І ў гэтае суседзкае жыцьцё хутка й нас улучылі. І мы ўсіх зналі, і нас усе зналі й чым толькі маглі нам памагалі й нас бавілі. Прыдзе вечар – «ночка цёмна» на вуліцы, як некалі ў Пружане на Горцы (так называлася наша вуліца), музыка, сьпевы, рамантыка. Толькі тая музыка й сьпевы на Іскіі то ўжо зусім іншыя ад нашых пружанскіх – «О, солё мія...!». Аглядалі мы прысадзістыя аліўкавыя дрэвы, а на іх, як сьліўкі, чорныя аліўкі. Праз колькі дзён нам трэба было ад'яжджаць, дык да параплаву праводзіла нас уся вёска – усе нашыя «суседзі». Неверагодна, але праўдзіва!

Вернемся з сонечнай Іскіі ў Мюнхэн

Было сьвяткаваньне 25-га Сакавіка, даклад меў сьв. пам. др. Станіслаў Станкевіч. У прыгожай вялікай залі было шмат людзей, між імі й старэнькі ўжо зь Віленскага Унівэрсытэту **прафэсар Кошмідэр,** некалі апякун Беларускага Студэнцкага Саюзу ў Вільні. Пасьля акадэміі мы зь ім гаварылі. Каго ня ўспомніш, дык усё няма й няма...

Перад заканчэньнем кантракту Амэрыканскі Камітэт прасіў Вінцэнта прадоўжыць кантракт на другі год, ён згадзіўся, але пазьнейшую прапанову застацца на становішчы кіраўніка Беларускай Сэкцыі Радыя «Вызваленьне» і на трэці год, дзеля мяне, ён ужо прыняць ня змог. Закончыўшы студыі ў 1954 годзе, я не магла заставацца без дэнтыстычнай практыкі так доўга. Трывожылася, што ўсё забуду... Хадзіла-ж ня толькі пра тэорыю, але перадусім пра практыку...

Разьвітаньне з супрацоўнікамі радыя «Вызваленьне»

Перад нашым выездам у Канаду супрацоўнікі Беларускай Сэкцыі Радыя «Вызваленьне» зрабілі свайму адыходзячаму кіраўніку разьвітальную бяседу. Было гэта ў аўто-

рак, 3-га красавіка 1956 году ў Cafe Luitpold – Kaffee-Restaurant, Brienner Str. 8. Вінцэнт атрымаў ад супрацоўнікаў вялікі на 30 цэнтымэтраў вышыні баварскі куфаль-пугар да піва, прыкрыты зьверху срэбраным векам. Мюнхэн слынуў з добрага піва й прыгожых куфляў. На куфлі сем малюнкаў-пласкаразьбы характэрных аб'ектаў Мюнхэну: Altes Rathaus, Alte Frauen Kirche, Hofbräuhaus, Neues Rathaus, Bavaria, Hopfen u. Malz. На срэбраным веку глінянага куфля напіс: «На добры ўспамін ад супрацоўнікаў Радыя «Вызваленьне», Мюнхэн, красавік 1956». Калі падымеш куфаль са стала, ён іграе Мюнхэнаўскую песьню, што зь любоў'ю ўсхваляе чар і прыветлівасьць Мюнхэну:

So lang der alte Peter
der Peterstrum noch steht,
So lang die grüne Isar
durchs Münch'ner Stadt'l gebt
So lang da drmut am Platze
noch stehts, das Hofbräuhaus –
So lang stirbt die gemütlichkeit
in München niemals aus.

З пугара гэтага ўсе мы кругом стала папарадку па глыткоў некулькіх пілі баварскае піва, і ў гэткі спосаб падкрэсьлівалі нашу сяброўскую супольнасьць.

Паварот у Канаду

У касавіку 1956 году цягніком праз Францыю, затрымаўшыся ў спадарства Абрамчыкаў, Англію – Лёндан, адведаўшы Беларускі Дом на 52 Penn Road ды Marian House u Finchlej параплавам United States Lines вярнуліся мы ў Канаду – Таронта. На чыгуначнай станцыі сустрэлі нас: Алесь Грыцук і Мечыслаў Рачыцкі (абое даўно нябожчыкі) і ўручылі нам прывітальныя значкі з напісам: "Mr. and Mrs. Zuk, welcome home!"

У Канадзе перад намі стаяла заданьне знайсьці сталае мейсца жыхарства й працы – адкрыцьця для мяне дэнтыстычнае практыкі. Знайшлі мы гэтае мейсца недалёка, 100 кілямэтраў напоўнач ад Таронта, у маляўнічым залаціста-чырвоным ад кляновых лістоў Бэры. Але гэта было ўжо позьняй восеньню.

XII. У КАНАДЗЕ – НА «ПАРУ АКРАЎ СЬНЕГУ», ЯК КАЗАЎ ВАЛЬТЭР

Неяк нялёгка было, прыехаўшы ў Канаду. Пасяліліся мы ў малой кватэры на 18 Мэйджар вуліцы ў Таронта. Пачала я працаваць, зарэнтаваўшы ў др. Гэлен Манчэстэр адзін "operatory." А думка ўсё пра сталае прыстанішча, бо жывем, як «на вакзале». Гэтае сталае пыстанішча ўяўляем сабе не ў Таронта, а недзе блізка яго. Ды цяпер не да гэтага было. Набліжалася 2-я Сустрэча (тады Сустрэчы яшчэ не называліся Сустрэчамі Беларусаў Паўночнае Амэрыкі), якую ладзіла ЗБК й БАЗА ў Таронта. Вінцук заняты, заангажаваны ў падрыхтоўцы да яе.

2-я Сустрэча Беларусаў адбылася 1-2 верасьня 1956 году ў Таронта, ды й на Centre Island – Цэнтральным Востраве, што блізка яго. У той час Саветы праводзілі інтэнсыўную агітацыю «За вяртаньне на Радзіму». У сваім дакладзе «Мы ня вернемся пад савецкую акупацыю», прачытаным на ўрачыстым Сходзе Сустрэчы, др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч аналізуе тактыку й прычыны настойлівых дамаганьняў да павароту эмігрантаў у Савецкі Саюз і адносіны эмігрантаў да гэтае акцыі. На тым Сходзе, памятаю, меў даклад і др. Янка Станкевіч, гэтаксама, як і Вінцэнт, калішнейшы Пражак.

Апрача ўрачыстага Сходу Сустрэчы, цікавай была паездка параплавам усіх удзельнікаў Сустрэчы на Centre Island – на прыроду. Пад адкрытым небам адпраўлялася Багаслужба. Слухала яе шмат вернікаў, бо Сустрэча была вельмі людная. Багаслужба асабліва памятная й важная тым, што першы раз чула я, як з сотні грудзей узьнімалася ў неба малітва «Магутны Божа!». Чула гэта першы раз і канадыйская зямля.

Наша прыстанішча – Бэры

Пасьля Сустрэчы пачынаецца нашае «хадзеньне па муках». Кожную нядзелю едзем зь Вінцуком аўтобусам у адно зь мястэчак, што блізка Таронта. Гутарым зь людзьмі, аглядаем эвэнтуальныя аб'екты, на закладзіны дэнтыстычнай практыкі. Кожны раз не ляжыць мне на сэрцы

ўсё тое, што бачым, і кожны раз мне ўсё робіцца болей сумна й безнадзейна.

Быў канадыйскі дзень падзякі – Thanksgiving Day, што прыпадае кожны год на другі панядзелак кастрычніка. Зранічкі Вінцук будзіць мяне: «Раіска, уставай, паедзем,...». Не хачу ўставаць, кажу: «Хоць адзін вольны дзень адпачынем. Надаела гэта езьдзеньне без рэзультату.» Вінцук налягае: «Сёньня паедзем у Орылью й Бэры, уставай, паедзем.» У яго заўсёды ўсё расплянована, куды паедзем, што будзем рабіць. І як у ЗБК, хоць не старшыня, але неўзаметку ўсім кіруе, гэтак і са мною.

Паехалі аўтобусам сьпярша ў далейшую Орылью, і, вяртаючыся назад, заехалі па дарозе ў Бэры. А Бэры, як кветка, цьвіце ў сонцы чырвона-залацістым цьветам кляновых лістоў! – «Тут хачу быць!» – кажу. І Вінцуку тут падабаецца, але паводле яго трэба сьпярша даведацца, колькі тут дэнтыстаў, а ці яны хочуць, каб яшчэ хто сюды прыехаў...? Для мяне гэтыя пытаньні – засьцярогі былі, і зусім слушна, неістотнымі. У кітайскім рэстаране зьелі мы "Thanksgiving dinner" – сьвяточны абед, пахадзілі па горадзе, аглядалі дамы, што на продаж. Калі-б што адпаведнае натрапілася, можа й купілі-б. А грошаў, як на задатак, на дом і на апаратуру ў дэнтыстычны габінэт, ня хопіць, пажычым у Беларускай Касе. Пляны растуць.


У тым жа тыдні Вінцук скамунікаваўся з дэнтыстычнай кампаніяй, і з прадстаўніком яе Містэрам Рэй Мэк Тэвішам, паехалі ў Бэры шукаць адпаведнага мейсца на «офіс». Знайшлі яго на другім паверсе, над крамай на цэнтральнай вуліцы Данлёп. Хоць у добрым мейсцы, але выдалося яно мне малым і няпрыветлівым. На большае мейсца трэба больш грошаў, вырашылі на ім затрымацца. У пошуках кватэры прыехаў раз Вінцук з Бэры й ўсхвалявана кажа: «Знайшлі прыгожы дом у добрым мейсцы. Паедзем, паглядзіш!» Як толькі ўвайшлі мы ў дом, і я пабачыла элегантна закругленыя на другі паверх сходы, ды ўсю калішнейшага Віктарыянскага ангельскага стылю архітэктуру, адразу здэцыдавалася, што хачу якраз гэты дом.

І не дарма я адразу спадабала й Бэры, і наш дом. Тут мы пражылі шчасьліва 32 гады, аж пакуль Бог не сказаў: «Досыць, твая, Вінцук, пілігрымка скончана...»

3-га сьнежня 1956 году купілі мы гэты дом на 54 Mary Street, Barrie, Ontario. Вінцук рабіў у доме рамонты, а я працавала ў Таронта й на канецтыдні прыяжджала дамоў



Рэзыдэнцыя Жук-Грышкевічаў у Бэры, Канада.



Дом у віктарыянскім стылі Жук-Грышкевічаў у Бэры, Канада.



З часоў каралевы Вікторыі стаіць перад домам Жук-Грышкевічаў чыгунны стоўп для прывязваньня коней.

у Бэры. Зайшла ў дом і расплакалася, бо ў ім было так шмат пылу, што й бачыць нічога нельга было. Вінцук зьдзіраў старую тынкоўку...

Каляды 1956 году сустракалі мы першы раз у сваім собскім доме. Тады было радасна на душы, а цяпер, як гэта ўспамінаю – вельмі сумна. І цяпер набліжаюцца Каляды й першы раз сустракаць іх буду бяз Вінцука... У траўні 1957 году пачала я дэнтыстычную практыку ў Бэры. Мой дэнтыстычны габінэт, з лябараторыяй і пачакальняй, уладзілі мы ў сваім прасторным і прыгожым доме. У Бэры – у гэтым англасаскім гарадку знайшлі мы й духовае прыстанішча – рыма-каталіцкі касьцёл Сьвятое Марыі.



Дзень Герояў Беларусі.
Вінцэнт Жук-Грышкевіч у першым радзе трэці зьлева. Садбуры, 1956.

І жыцьцё ў ЗБК не стаяла на мейсцы. У 1958 годзе ўрачыста адзначалі мы 40-я ўгодкі абвешчаньня дзяржаўнай незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі. У Канаду прыехаў Старшыня Рады БНР інж. Мікола Абрамчык. Затрымаўся ў нас у Бэры. Старыя, яшчэ з Прагі, сябры шмат з сабой гаварылі й дыскутавалі. У часе святкаваньня 25-га Сакавіка даклад меў др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч, а пасьля яго прамаўляў Старшыня Рады БНР інж. Мікола Абрамчык. У гэтым годзе ЗБК адзначала 10-я

ўгодкі свайго існаваньня. У гэтым годзе ЗБК й БНА дагаварыліся супольна адзначыць угодкі Слуцкага Збройнага Чыну. У жніўні 1959 году быў куплены другі, куды большы, як папярэдні на 1000 Дандас вуліцы, беларускі дом на 524 St. Clarens Avenue, Toronto. Дом гэты, названы Беларускім Рэлігійна-Грамадзкім Цэнтрам, быў высьвечаны 22-га лістапада пры ўдзеле Архіяпіскапа БАПЦ Уладыкі Васіля. (Першы беларускі дом на 1000 Дандас, быў прададзены.)

Сьмерць Эдварда Будзькі

«У нядзелю 19 кастрычніка» – як паведамляе газэта «Бацькаўшчына», Мюнхэн, 44 (430), 1958 г. – «у сьвятліцы Беларускага Дому беларусы Таронта выслухалі цікавы даклад аб жыцьці й дзейнасьці сьв. пам. Эдварда Будзькі.

Дакладчык др. Жук (Вінцэнт Жук-Грышкевіч, Р.Ж.-Г.) не пашкадаваў часу й дарогі, каб пазнаёміць прысутных аб слаўнай працы нябожчыка на карысьць беларускага народу.»

«Сьв. пам. Эдвард Будзька (з дакладу др-а Жука, 19.10. у З.Б.К. у Таронце)

14 жнівеня г.г. (1958) у Чыкага памёр ведамы беларускі дзеяч Эдвард Будзька. Гэтая сьмерць прынесла беларускай справе вялікую страту ў агульна-нацыянальным засягу, бо шматгадовая дзейнасьць нябожчыка была зьвязана з нашым нацыянальным і вызвольным рухам.

Эдвард належаў да піянераў беларускага руху. Радзіўся ў 1882 годзе ў мястэчку Будславе Вялейскага павету. Быў равесьнікам Янкі Купалы й Якуба Коласа, зь якімі супрацоўнічаў у «Нашай Ніве», але быў старэйшым нашаніўцам і належаў да старэйшых беларускіх дзеячоў. Ён быў актыўным беларусам перад 1905 годам, ужо ў 1901 годзе зарганізаваў беларускую калёнію ў Рызе.

Жыцьцёвы шлях нябожчыка быў нялёгкі, хоць гэтага па ім і ня было відаць: заўсёды жывы й рухлівы, энэргічны, з новымі ідэямі й сьмелымі праектамі й плянамі – ён ніколі ня скардзіўся на свой лёс, а заўсёды шукаў чагось новага, заўсёды ішоў наперад. З пачатковай асьветай пакінуў родны Будслаў, пайшоў у шырокі сьвет у раньняй

маладосьці. І ня згубіўся. Ня толькі здабыў асьвету самаадукацыяй і знайшоў сабе мейсца ў жыцьці, але й выцягваў у людзі й спрычыніўся да адукацыі шматлікіх беларусаў, каб працавалі, як ён сам, для свайго народу. Ягоная ж дзейнасьць у беларускім жыцьці была такая разнастайная, што, здаецца, няма дзялянкі, да якой ён не прыкладаў свае рукі. Ён – грамадзкі дзеяч і арганізатар, пашыральнік беларускай сьведамасьці, кніжкі й газэт, публіцыст, рэдактар-выдавец беларускай газэты «Дзяньніца» ў Петраградзе ў 1916 годзе, а ў 1920 – «Беларускай Думкі» ў Вільні. Ён займаўся рознымі сялянскімі справамі й гаспадарчымі, арганізаваў каапэратывы й выбіўся на аднаго з найлепшых каапэратараў на Беларусі. Пазьней каапэрацыі ўдзяляўся найбольш, працаваў у гэтай дзялянцы да вайны 1939 году. У каапэратывы ён нёс ня толькі фаховую параду, але й беларускую кніжку й газэту – нацыянальную сьведамасьць. Сам аўтар гэтага дакладу ўжо ў 1912 годзе навучыўся чытаць пабеларуску на «Беларускім календары» і нумарах «Нашай Нівы», якія трапілі ў ягоныя рукі дзякуючы Эдварду Будзьку.

Калі ў часе першай сьветавой вайны масы беларусаў эвакуюцца ў Расею й рассыпаюцца па яе абшары, Эдвард Будзька адным зь першых ідзе ім на спатканьне з маральнай і матар'яльнай дапамогай, закладаючы «Беларускі Камітэт Пацярпеўшых ад Вайны». Дзякуючы гэтаму Камітэту беларусы ў Расеі трымаюць сувязь із сваім нацыянальным рухам і бяруць удзел у важных падзеях у часе Расейскай рэвалюцыі й пазьней.

Дзейнасьць Эдварда Будзькі не абмяжоўваецца да якойсь аднэй мясцовасьці, што праўда, найбольш праяўляецца ў Вільні, Рызе, Петраградзе й Будславе, дзе ён найбольш прабываў, але прамянюе й у іншых пунктах на Беларусі й за ейнымі межамі – ці то ў Менску й меншых беларускіх асяродзьдзях, ці то ў Бэрліне, Коўне, Дзьвінску й на эміграцыі. Таму імя Эдварда Будзькі было ўсюды ведамым і папулярным.

Ён адчуваў сваёй душою ўсе патрэбы беларускага руху. Зьяўляўся там, дзе гэтыя патрэбы выступалі найвастрэй. Браўся за тое, што ў даную хвіліну, у даных абставінах было найбольш неабходным, найбольш пякучым. Вычуваў ён гэта з надзвычайным зразуменьнем і сьмела й рашуча прыступаў да дзеяньня. І нішто, здавалася, не магло стрымаць ягонай дзейнасьці. Калі ў 1921 годзе палякі выкіну-

лі яго ў ліку 33 беларусаў і летувісаў зь Вільні ў Летуву, ён праяўляе сваю беларускую дзейнасьць спачатку ў Коўне, а пазьней Дзьвінску.

* * *

Нябожчык пакінуў таксама вялікі сьлед у змаганьні за беларускую школу. Браў удзел у арганізацыі беларускіх пачаткавых школ, быў кіраўніком беларускіх настаўніцкіх курсаў у Дзьвінску, але найбольш праявіў сябе ў гэтай дзялянцы пры арганізацыі Беларускай Гімназіі ў Будславе. Было гэта ў 1917-1919 гадох.

Беларуская нацыянальная сьведамасьць у Будславе й ваколіцах, дзякуючы Эдварду Будзьку, даўно ўжо запусьціла глыбокія карэньні. Нядаўная рэвалюцыя стварыла спрыяльныя абставіны да гэтага, аднак патрэбна была ініцыятыва, актыўнасьць і ахвярнасьць, каб арганізаваць беларускае школьніцтва. Але Эдвард Будзька не задавальняецца пачаткавай школай. Ён адразу сягае па сярэднюю. Калі ўзяць пад увагу, што Будслаў – гэта невялікае мястэчка (каля 1000 жыхароў), паложанае далёка ад большых местаў і што не магло марыць дагэтуль аб чатырохклясовай школе гарадзкога тыпу – дык плян заснаваньня тут беларускай гімназіі выглядаў занадта сьмелым. У Будславе ня было ані адпаведнага будынку для гімназіі, ані вучыцялёў, ані сродкаў на абсталяваньне, на кнігі ды школьныя прылады. Праўда, Будслаў з ваколіцамі меў каталіцкае насельніцтва, якое не зачапіла русыфікацыя, а палянізацыя праз касьцёл і двор кранула павярхоўна некалькі трацьціярак ды нялічных панскіх служак. Нацыянальная сьведамасьць і цяга да навукі, як было ўжо сказана, была значная, аднак нікому ў галаву ня прышло, што трэба пачынаць адразу зь гімназіі; людзі не разумелі патрэбы й значаньня такой школы – ды некаторыя навет слова «гімназія» блыталі з словам «гімнастыка». Таму шмат якія будслаўцы гаварылі, што няма тут падрыхтаванага грунту пад гімназію. Гэта была восень 1917 году, ад лютаўскай рэвалюцыі прайшло толькі некалькі месяцаў, якія не маглі згладзіць цемнату й безпрасьвецьце створанае расейскай рэакцыйнай палітыкай за амаль паўтара стагодзьдзя. Аднак Эдвард Будзька не пабаяўся ўсіх гэтых цяжкасьцяў, бо ён ведаў, чаго хацеў, ведаў чаму ў Будславе трэба адкрыць беларускую гімназію. Ён знаў, што бела-

русам патрэбна перадусім інтэлігэнцыя, якой тады было так мала, – пры тым інтэлігэнцыя сялянская, зь нетраў народу. Аб сярэдніх школах у большых мястэчках было каму паклапаціцца, але гэтыя школы для сялянства былі мала даступныя. Таму зусім слушна ён уважаў, што трэба тварыць беларускія сярэднія школы для сялянства ў самай гушчы вясковых асяродкаў. Будслаў-жа быў ідэальным мейсцам для гэтай мэты.

Наш слаўны дзеяч умеў выбіраць адпаведныя мамэнты дзеля правядзеньня сваіх сьмелых плянаў, – а восень 1917 году была вельмі адпаведным часам дзеля арганізацыі беларускіх школ. Рэвалюцыя была яшчэ ў руху, Керанскі тросься, адбываўся бальшавіцкі пераварот ды й немцы былі недалёка. У сталіцы Беларусі йшла гарачая арганізацыйная работа, крышталізавалася ідэя незалежнасьці, але ня было яшчэ рашучасьці замацаваньня сваёй беларускай улады. Намінальна прызнавалася па інэрцыі расейская ўлада, якая была тады ў зьменнай стадыі й асаблівай эфэктыўнасьці на Беларусі не праяўляла. Аднак сытуацыя магла зьмяніцца ці то з узмацненьнем тэй ці іншай расейскай улады, ці то з прыходам немцаў. Таму трэба было лавіць мамэнт, каб стварыць дакананы факт, ня просячы нічыей ласкі, ці канцэсіі. І вучыцялёў цяпер было знайсьці лягчэй, бо з галодных гарадоў уся інтэлігэнцыя ехала на заможную хлебам вёску. Цяжка было праціставіцца гэтым аргумэнтам, яны пераканалі й тых, што ня верылі ў магчымасьць заснаваньня гімназіі, і тых, што не разумелі патрэбы яе. Выявілася гэта на агульным сходзе бацькоў у Будславе, якіх Эдвард Будзька пераканаў у патрэбе арганізацыі беларускай гімназіі ды збудзіў іх энтузіязм да дзеяньня. Ён умеў гаварыць з сялянамі, умеў пераконваць іх, а найважнейшае – меў іх давер, быў сваім чалавекам і не аднаму памог у нягодзе ды быў добрай радай, не аднаму памог вызваліцца з акупанцкіх арыштаў.

Пасьля сходу работа загула. Быў створаны адмысловы камітэт, які пачаў зьбіраць грошы на гімназію, рыхтаваць клясы ў быўшай прыхадзкой школе й будынку воласьці ды упарадкоўваць абсталяваньне. Эдвард Будзька заняўся шуканьнем вучыцялёў. На дырэктара быў запрошаны ведамы архэалёг Васілевіч, які скончыў два факультэты ў Маскве й паходзіў зь вёскі Пузыры 7 км. ад Будслава. Была запрошана група вучыцялёў, у якой была родная сястра Э. Будзькі й шмат каму ведамы на эміграцыі Мі-

кола Шыла. Падручнікі й школьныя прылады былі прывезены зь Менску. Эдвард Будзька бываў тады часта ў беларускай сталіцы. І хоць аддаваў свае сілы на арганізацыю Беларускай Гімназіі ў Будславе – не занядбоўваў і буйнага тады арганізацыйнага жыцьця ў Менску. Браў удзел ува ўсіх важнейшых беларускіх канфэрэнцыях і зьездах, уключна зь Першым Усебеларускім Кангрэсам.

Камітэт вырашыў на пачатак адчыніць тры гімназіяльныя клясы й дзьве пачатковыя. Заняткі мелі распачацца па новым 1918 годзе. Распачаліся яны дзесь у сярэдзіне студзеня таго-ж году.

У сакавіку 1918 году прыйшлі немцы. Гімназія з азначанымі вышэй клясамі працавала ўжо поўнай парай. Дакананы факт застаўся фактам. Немцы не рабілі ніякіх перашкодаў у працы гімназіі. Ім было прыемнма, што ў гімназіі выкладаецца нямецкая мова. Пацьвердзілі гэта нямецкія афіцэры, што час-ад-часу наведвалі лекцыі нямецкай мовы. Ад нямецкіх уладаў удалося навет здабыць грашовую дапамогу на гімназію.

Нямецкая акупацыя прынясла магчымасьць навязаньня сувязі зь Вільняй, якая была перарвана фронтам ад 1916 году. Віленскае беларускае асяродзьдзе дало Будслаўскай Гімназіі маральнае падтрыманьне й свае ўплывы. Наагул пэрспэктывы для гімназіі былі вельмі добрыя. Трэба было думаць аб далейшым этапе, а перадусім аб адпаведным будынку для гімназіі. Як фаховая сіла дзеля гэтага быў запрошаны ведамы беларускі архітэкт, сп. інж. Дубейкаўскі. Ён прыехаў у Будслаў і апрацаваў плян двухпавярховага драўлянага будынку для гімназіі. Будслаўскія сяляне аддалі пад пляц для гімназіі адрэзкі шнуроў, што даходзілі да вуліцы, на якой мела знаходзіцца гімназія. Агульны сход бацькоў пастанавіў, каб бацькі, апрача аплаты за навуку, адпрацавалі па два дні ад кажнага вучня пры будоўлі гімназіі, ці то пры вывазцы дрэва й каменьня – для тых, што мелі коней, ці то ручной працай – для мяшчан, што ня мелі коней. І тут работа загула. Яна стрымана была часова толькі выступам мясцовага абшарніка перад нямецкай уладай, якой ён злажыў скаргу на будслаўцаў, што самавольна высяклі бярвеньне на гімназію ў ягоным лесе. Але праз пару месяцаў немцы адыйшлі на Захад, а за імі выехаў і пан Оськерка.

Новы 1918/19 школьны год распачаўся нармальна ў верасьні, ужо з чатырмя гімназіяльнымі клясамі й дзьвю-

ма пачаткавымі. Навука трывала дзевяць з палавінай месяцаў. Наплыў вучняў быў такі вялікі, што ня было дзе іх зьмясьціць. Ува ўсіх чынных клясах налічвалася панад 350 вучняў. Засяг абшару, зь якога яны паходзілі, даходзіў да 30 км. радыюсам вакол Будслава. А што-ж было-б, калі-б гімназія дайшла да поўнага складу 8 кляс. Запраўды тут створана была кузьня беларускай сялянскай інтэлігэнцыі.

Восеньню паказаліся бальшавікі. Яны тады былі яшчэ ў стадыі арганізацыі й не зрабілі вялікіх зьменаў у жыцьці Будслава. Загадалі толькі, каб гімназія фармальна называлася трудавой школай. Тым часам будынак гімназіі хутка вырастаў. Былі ўжо выведзены сьцены першага паверху. Тут праявіўся надзвычайны высілак будслаўскага сялянства ды арганізацыйныя здольнасьці Гімназіяльнага камітэту. Зразумела, што за ўсім гэтым як кіраўнік і інспіратар стаяў Э. Будзька.

Лета 1919 году прынясло благія навіны. Урад БНР і ягоны апарат акупанты-бальшавікі й палякі змусілі эміграваць, ды пачалі вайну між сабой за жывое цела Беларусі. Будслаў апынуўся ў засягу ваенных апэрацыяў і трывожна глядзеў на будучыню. З усяго відаць было, што прыдзецца паспытаць новай акупацыі – польскай, ад якой беларусы нічога добрага не спадзяваліся. Ведамым было, што з палякамі вернуцца ўсе мясцовыя паны й паўпанкі, што так моцна даліся сялянству ў знакі ў часе нямецкай акупацыі.

Палякі прыйшлі пад восень. Адчуў іх найбалючай Будслаў. Будслаўская Беларуская Гімназія была зачыненая. Дошка з гэтым напісам была зьнятая з школьнага будынку за пару тыдняў перад пачаткам школьнага году.

Будслаўская Беларусклая Гімназія праіснавала паўтара года, але за гэты час у існуючых клясах была праробленая праграма двох гадоў. Ускалыхнула цэлым паветам. Пасьля закрыцьця Гімназіі вучні разыйшліся па сваіх хатах з жалем на чужую ўладу, што зачыніла ім дарогу да асьветы. Але панесьлі з сабой беларускую кніжку, беларускую песьню, беларускую нацыянальную ідэю. Шмат якія зь іх, засмакаваўшы духовай стравы ў Гімназіі – не маглі ўжо безь яе абыходзіцца, яны пайшлі ў шырокі сьвет, у пагоні за асьветай і здабылі яе. І тут не аднаму дапамог Эдвард Будзька. Да вынікаў уплыву коратка існаваўшай Будслаўскай Беларускай Гімназіі трэба залічыць і той

факт, што пазьней пад Польшчай – аж да 1939 году Будслаў меў вялікую колькасьць моладзі, што вучылася ў розных школах – сярэдніх і вышэйшых.

* * *

Дзеля паўнаты вобразу варта кінуць вокам і на пазашкольнае жыцьцё ў Будславе ў часе існаваньня гімназіі. Як і трэба было спадзявацца, гімназія зрабіла ўплыў на ўсё насельніцтва, а перадусім на моладзь у пазашкольным веку. Шматлікія дзяцюкі й дзяўчаты вучыліся на агульнаасьветных курсах пры гімназіі. Гімназія ладзіла беларускія пастаноўкі, канцэрты й вечарынкі. Вучні выдавалі на шапіраграфе свой часопіс «Сьветач». Дырэктар і вучыцялі чыталі публічныя лекцыі для ўсяго насельніцтва. Моладзь пазашкольнага веку арганізавала свой клюб «Вяночак», бібліятэку, хор, струнны аркестр і драматычны гурток. Культурнае жыцьцё ў Будславе біла поўнай крыніцай. Кажную нядзелю ладзіўся беларускі спэктакль ці канцэрт. У часе-ж прынагодных зборышчаў сялянства, як кірмашы й фэсты, лучыліся сілы Гімназіі й пазашкольныя. Так было, напрыклад, на далёка-ведамым будслаўскім фэсьце 2 ліпеня ў 1918 годзе, калі зьехалася да 10,000 людзей. Вучні прадавалі на рынку беларускія кніжкі. Пасьля імшы дырэктар Гімназіі прачытаў для народу публічную лекцыю з археалёгіі. Надвечар драматычны гурток даў беларускую пастаноўку, а вечарам адбыўся канцэрт з удзелам струннага аркестру й хору, які закончыўся танцамі. Уражаньні з усяго бачанага й чутага на тадышнім будслаўскім фэсьце доўга камэнтаваліся па ўсім павеце й навет у такіх глухіх вёсках, дзе раней нічога ня было ведама пра беларускі рух.

Так будавалася й расла беларуская справа ў Будславе й ваколіцах. На працягу двох гадоў тут адбывалася цэлая рэвалюцыя, пачынальнікам і кіраўніком якой быў Эдвард Будзька. Цешыліся будслаўцы з сваей працы, а разам зь імі цешыўся іх духовы правадыр, бачучы ўраджай з таго, што сеяў на працягу 20 год. Успамінаючы, што рабілася тады ў Будславе – мімавольна паўстае пытаньне: што сталася-б зь Беларусяй, калі-б гэтую рэвалюцыю ня здушылі акупанты з усходу й захаду, калі-б такія людзі, як Эдвард Будзька маглі праводзіць свае сьмелыя пляны бязь ніякіх перашкодаў па ўсім беларускім абшары? Напэўна белару-

сам ня трэба было-б тады вандраваць па нявольных і вольных краінах сьвету.

Дакладчык наўмысьля спыніўся над Будславам, каб шырэй прадставіць адзін з адрэзкаў дзейнасьці Эдварда Будзькі – найбольш яму ведамы. Розных адрэзкаў дзейнасьці нашага вялікага дзеяча было нямала. І напэўна на эміграцыі ёсьць людзі, што былі ўдзельнікамі, або сьведкамі іх. Таму было-б вельмі пажадана, каб яны падзяліліся зь беларускім грамадзтвам тым, што ведаюць пра ягонае жыцьцё й дзейнасьць. Гэта ня толькі папоўніла-б вобраз гэтай дзейнасьці, але й было-б значным укладам у гісторыю беларускага руху. Маючы гэта на ўвеце, дакладчык толькі агульна гаварыў пра дзейнасьць Эдварда Будзькі ў часе апошняў нямецкай акупацыі й у часе прабываньня яго на эміграцыі, пакідаючы шырэйшае слова для тых, што былі сьведкамі гэтай апошняй дзейнасьці.

* * *

Эдвард Будзька вызначаўся надзвычайнымі рысамі характару. Фізычна ён быў малога росту, сьціплым і надзвычай мала вымагаючым для сябе: ня гнаўся за раскошным жыцьцём. Еў скромна – быў вэгэтарыянцам і абстынэнтам, ня курыў – ды нават унікаў гарбаты, піў ваду або малако. Апранаўся чысьценька й акуратна, але ня любіў франтарства. Унікаў усяго, што было шкодным фізычна й духова ці то дзеля яго самога, ці для іншых. Але якая веліч духа й сэрца была ў гэтага чалавека! Якая адзыўчывасьць на чужую бяду, на крыўду людзкую! Чужое няшчасьце ён перажываў, як сваё. Яго жаданьнем было, каб кажны быў шчасьлівы. Ён цешыўся чужым шчасьцем, як сваім і ніхто хіба ў яго не заўважыў навет найменшай ноткі зайздрасьці, або помсты. Колькі людзей прыпомняць ягоную помач, ахвярнасьць, добрадзейнасьць ды адзыўчывасьць на чужую бяду! І тыя, якіх ён, наражаючы сябе на небясьпеку, вызваліў з арыштаў у часе розных палітычных зьменаў, і тыя, што былі ў бядзе й дзякуючы яму атрымалі працу, і тыя, што дзякуючы яму дабіліся асьветы, і тыя, што зь яго парадай знайшлі жыцьцёвы шлях, і яшчэ шмат якія, што бачылі ў яго асобе прыяцеля, павадыра, дарадніка й лекара на розныя беды. Зь ягонага жыцьця й дзейнасьці плыла глыбокая гуманнасьць, яна адбівалася ў яго шляхотных рысах твару. Ягоны патрыя-

тызм, адданасьць беларускай справе базаваліся на гэтай глыбокай гуманнасьці, на адчуваньні тых бедаў і няшчасьцяў, якія абступілі беларускі народ, на адчуваньні крыўдаў і зьдзекаў, якімі кармілі беларусаў чужыя ўлады. Згодна з сваёй добрай гуманнай натурай ён хацеў, каб беларусам было добра, каб яны былі шчасьлівымі. Дзеля гэтага трэба было беларускаму народу адраджацца ды здабываць сваю культуру й палітычную незалежнасьць.

У пары зь яго гуманнасьцяй ішла крыштальная чэснасьць, праўдамоўнасьць, справядлівасьць і дабрата – найвялікшай чалавечай цноты. Нікому, хто знаў Эдварда Будзьку, навет у галаву ня прыйшло, што ён мог схлусіць ці ашукаць каго. У вадносінах да людзей ён быў заўсёды ветлівым, вытрыманым, ляяльным і выразумелым, а ў вадносінах да справы – абавязкавым, актыўным, адказным, працавітым і безінтэрасоўным. Беларуская грамадзкая справа была ў яго на першым мейсцы. І ніхто хіба ня ўмеў так пагадзіць асабістае жыцьцё з грамадзкай дзейнасьцьцю.

Гэта быў рэдкі чалавек. Цяжка знайсьці такога другога ня толькі сярод беларусаў, але й сярод іншых. Якое-ж няшчасьце, што яго нястала сярод нас! Ды яшчэ большае няшчасьце таму, што нястала яго ў гэтым часе маны, ашуканства ў цэлым сьвеце й цяжкога становішча беларускай справы.

Хай-жа будзе яму лёгкай амэрыканская зямля, а нам і нашым патомным хай прысьвячае сьветлая памяць аб ім у жыцьці й грамадзкай працы.

* * *

Даклад быў заснаваны выключна на асабістых успамінах дакладчыка.

Пасьля дакладу й вымены думак – на прапанову а. Мацукевіча прысутныя выказалі пажаданьне, каб былі выданы ўспаміны Эдварда Будзькі, калі ён іх пакінуў, а калі не – каб радня яго й бліжэйшыя сябры й знаёмыя пастараліся апублікаваць матар'ялы аб ягоным жыцьці й грамадзкай дзейнасьці. **Прысутны**» (В. Жук-Грышкевіч).

(«Бацькаўшчына, Мюнхэн, 44 [430], 1958)

XIII. ПЕРАПІСКА З ДР. В. ДЖ. КЭЙЭ Ў СПРАВЕ МАНАГРАФІІ «КАНАДЫЙЦЫ БЕЛАРУСКАГА ПАХОДЖАНЬНЯ»

CANADA
DEPARTMENT of CITIZENSHIP and IMMIGRATION
MINISTERE de la CITOYENNETE et de L'IMMIGRATION

Canadian Citizenship Branch

Ottawa, December 16, 1958

Dr. V. Žuk
54 Mary Street
Barrie, Ontario

My dear Doctors, both of you,

Instead of writing the conventional Christmas Card, I thought a letter would convey much better the festive sentiments and thus I wish you a Merry Christmas and a Happy and Prosperous New Year.

Remembering our pleasant but short hour spent together at your place in Munich, I always hoped to be able to come to Barrie and rob you of an evening of your busy time. I have so many things to ask you. You were connected for many years with the Byelorussian movement and now, as a detached observer, you are above group and party politics. I do not know any other person who would be able to give a better and more unbiased picture of the Byelorussian setup in Europe and in Canada than yourself. I intend to write a monograph on the Byelorussian group in Canada. The Byelorussian group, until about ten years ago was practically unknown and it was identified either with the Russian or Polish group in Canada. Only with the arrival of the postwar immigration it emerged from obscurity, although still not listed separately by the census. The Byelorussians certainly deserve a place among other ethnic groups who form our Canadian nation and participate actively in our economic, social and political life. Do you have some material on hand which I could use or could you suggest where I

could get such material? I intend to divide the monograph into the following chapters: (1) Canadians of Byelorussian origin – general information, statistics; (2) Byelorussia and Byelorussians – a brief historical sketch of the country of origin and of its people; (3) The beginnings of Byelorussian immigration to North America; (4) Byelorussian immigration to Canada; (5) Byelorussian organizations in Canada and their divisions; (6) Byelorussian press in Canada; (7) Summary and observations.

There is very little material available as you know. On Soviet Byelorussia I collected all the publications which you kindly arranged for me to receive. This material, although interesting and valuable, is not suitable for the monograph. There is a very good "Special Report No. 9" presented to the House of Representatives by Congressman Charles J. Kerston which gives in its twenty-nine pages a good summary of the Byelorussian problem. This could be utilized as a background material. But I am looking for material on the history of the settlement of Byelorussians in Canada and particularly for material on the present setup of the Byelorussian community in Canada. I am regularly reading the Byelorussian Voice but as you yourself know, it gives only one side of the picture and I would like to have the whole picture. Where could I get the information? The situation is a litle confusing and the reason I intend to write the monograph is to give a more clear, unbiased interpretation of who the Byelorussians are, what part they play in the Canadian general life, what the Byelorussian National Association represents and in what does it differ from the Byelorussian Alliance in Canada. I have some material on it but it is not enough and I would like to have the advice of an expert (like yourself) to clarify it.

I wrote a long letter although I intended only to send you Christmas greetings but it just so happened that I was tempted to discuss also other things.

Yours very sincerely,

(Dr.) V. J. Kaye,
National Liaison Officer.

* * *

Як з вышэй зацытаванага ліста відаць, др В. Дж. Кэйэ, высокі ўраднік Міністэрства Грамадзянства й Імі-

грацыі Канады, а гэтаксама прафэсар Атаўскага Універсытэту ў сваім, вышэй пададзеным, лісьце з 16 сьнежня 1958 году да др. Вінцэнта Жук-Грышкевіча паведамляе аб сваім намеры напісаць манаграфію (для патрэбаў Міністэрства) аб беларусах у Канадзе й дзеля гэтага просіць аб дапамогу збору матарыялаў для свае працы. Такім чынам у сьнежні 1958 году пачалася ў др. В. Жук-Грышкевіча з др. В. Дж. Кэйэ жывая й даўгая перапіска.

Некаторыя лісты др. В. Кэйэ й др. В. Жук-Грышкевіча падаю тут поўнасьцьцю, некаторыя не захаваліся. У сваім лісьце да др. Кэйэ з 16-га лютага 1959 году др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч піша:

«Вельмі Паважаны й Дарагі Доктар:

Атрымаўшы Ваш апошні ліст, я зараз жа заняўся пастаўленымі Вамі пытаньнямі. А каб адказ на іх быў ясны й правільны, я пастанавіў зьвярнуцца беспасрэдна да кампэтэнтных асоб, дзеля чаго ўчора зьезьдзіў у Таронта.

На першае пытаньне адказваю вуснамі а. Міхаіла Мацукевіча, зь якім я ўчора меў інтэрв'ю: Парафія й Царква Сьв. Кірылы Тураўскага паўстала ў Таронта (1000 Dundas West) у 1954 годзе дзякуючы стараньням беларусаў, што згуртаваны ў ЗБК (Згуртаваньне Беларусаў у Канадзе) і каля яго пры поўнай падтрымцы ЗБК, як арганізацыі. Група гэтых людзей ўжо у 1950 годзе хацела арганізаваць беларускую праваслаўную парафію, падпарадкаваную юрысдыкцыі Беларускай Аўтакэфальнай Праваслаўнай Царквы. На перашкодзе стаяў брак сьвятара. Тады ўсе ў Таронта стаялі на грунце аўтакэфаліі, нават і Сяргей Хмара. Быў сьвятар беларус а. Міхаіл Мігай, але ён неахвотны быў да юрысдыкцыі Беларускай Аўтакэфальнай Праваслаўнай Царквы. Згаджаўся ўрэшце стаць на грунт аўтакэфаліі, калі-б яму беларусы маглі забясьпечыць добра матарыяльны быт. На гэта яны тады яшчэ не маглі сабе пазволіць, бо грашовыя выдаткі былі-б за вялікія. Таму трэба было абмежавацца нясталымі багаслужбамі, прынагодна запрашанымі сьвятарамі – а. Мігая, або іншых (найчасьцей украінцаў). Тымчасам жа адзін ідэйны аўтакэфаліст – цяперашні а. М. Мацукевіч выехаў на студыі ў Украінскую Духоўную Акадэмію ў Вінніпэг. З арганізацыяй сталай парафіі трэба было ўстрымацца да часу яго высьвячэньня. Пасьля яго павароту ў Таронта ў 1954 годзе

й была заснаваная сталая парафія сьв. Кірылы Тураўскага.

Гэта парафія падлягае юрысдыкцыі Сыноду Беларускай Аўтакэфальнай Праваслаўнай Царквы, галавой якое ёсьць архіяпіскап Сяргей (украінец, што ахвяраваўся дапамагчы беларусам у разбудове сваёй аўтакэфальнай царквы), а сакратаром – архіяпіскап Васіль (беларус). Сам факт аўтакэфаліі запэўнівае незалежнасьць юрысдыкцыі й толькі ў дагматычных справах царква падпарадкоўваецца пастановам Усяленскіх Сабораў.

Парафія сьв. Кірылы Тураўскага належыць да дыяцэзіі архіяпіскапа Васіля зь Нью Ёрку. Усе вернікі беларусы і настаяцель – а. Міхаіл Мацукевіч – беларус. Парафія гэта разьвіваецца добра, яна абслугоўвае беларусаў ня толькі ў Таронта, але й у Ашаве, Лёндане, Садбуры, дзе знаходзяцца аддзелы ЗБК. Цяжкасьці – цесната памешканьня для царквы ў Таронта, таму парафія гэта робіць пошукі большага будынку пад царкву.

Адносіны Беларускай Аўтакэфальнай Царквы, а гэтым самым і парафіі сьв. Кірылы Тураўскага, з Канстантынопальскім Патрыярхам базуюцца толькі на малітоўным яднаньні. Доказам гэтага была нядаўна візыта ў Таронта архіяпіскапа Богдана (украінца), які наведаў парафію сьв. Кірылы Тураўскага і адслужыў у царкве гэтай урачыстую багаслужбу ў саслужэньні з а. Міхаілам Мацукевічам. (Характэрна, што архіяпіскап Богдан не адведаў царквы сьв. Еўфрасіньні Полацкай, В. Ж.-Г.)

Выясьненьні на другое пытаньне дала мне спадарыня Валентына Пашкевіч, адна з удзельніц парафіі сьв. Еўфрасіньні Полацкай. Царква гэтай парафіі знаходзіцца ў Таронта на 1008 Довэркорт Роўд. Яна ніколі не належала да тэй ці іншай украінскай кангрэгацыі. Вернікамі гэтай парафіі зьяўляюцца беларусы й казакі, румыны-ж толькі карыстаюцца памешканьнем царквы для сваіх багаслужбаў. Гэта праўда, як Вы сказалі ў сваім лісьце, што гэта царква знаходзіцца пад юрысдыкцыяй эгзарха Канстантынопальскага Патрыярха на Паўночную й Паўдзённую Амэрыку. Гэта царква ня мае нічога супольнага з беларускай Аўтакэфальнай Праваслаўнай Царквой, а тым больш з архіяпіскапам Сяргеям. Настаяцелям гэтай царквы якісь час быў а. Міхаіл Мігай, беларус, але пасьля выезду яго ў ЗША настаяцелям стаўся ўкраінец – а. Сагайдакіўскі, які не прызнае Украінскай Аўтакэфальнай

Царквы. Царква гэта была арганізавана сябрамі Беларускага Нацыянальнага Аб'яднаньня ў Таронта (Byelorussian National **Association,** a nie Byelorussian National **Alliance,** як Вы кажаце ў сваім лісьце).

Ад сябе дадам, што, як я ўжо пісаў раней, царква гэта пачала тварыцца ў 1952 годзе ў выніку сэцэсіі групы Хмары з ЗБК (Belorussian Alliance in Canada). Тады ён пачаў змагацца з усімі беларускімі арганізацыямі, што стаяць на грунце БНР (Беларускай Народнай Рэспублікі) і БАПЦ (Беларускай Аўтакэфальнай Праваслаўнай Царквы). Тады ён заснаваў асобную арганізацыю Беларускае Нацыянальнае Аб'яднаньне й у паразуменьні з а. Мігаём распачаў арганізацыю асобнай парафіі й царквы сьв. Еўфрасіньні Полацкай, пачынаючы гэтым самым барацьбу з БАПЦ. Цяпер, як я ўжо пісаў, настроі й у Беларускім Нацыянальным Аб'яднаньні й у парафіі сьв. Еўфрасіньні Полацкай зьмяніліся, пашлі супраць Хмары. За лаянку й хлусьню ў «Беларускім Голасе» управа Бел. Нац. Аб'яднаньня два тыдні таму назад завесіла яго ў сяброўстве гэтай арганізацыі й пагразіла поўным выдаленьнем. Наагул жа паправіліся адносіны між абедзьвюма арганізацыямі – ворагамі да нядаўнага, а таксама паправіліся адносіны й між абедзьвюма парафіямі. Цяпер ЗБК і БНА абгаварваюць справу супольнага сьвяткаваньня 25 Сакавіка – ўгодкаў абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі.

Пашкодзіў крыху артыкул Акулы ў «Бацькаўшчыне», у якім ён, адзначаючы дзесяцігодзьдзе ЗБК, завостра праехаўся па БНА, аб чым я, здаецца, таксама ўжо Вам пісаў. Маю ўражаньне аднак, што й гэта прыкрая адрыжка ня будзе перашкодай да супольнага сьвяткаваньня.

Цяпер хачу вярнуцца да Вашага папярэдняга ліста й Вашай манаграфіі наагул. Я ня меў магчымасьці дастаць "Belorussia – The Making of a Nation" Вакара, але ўсе нашы гісторыкі й публіцысты ўважаюць гэту кніжку за слабы твор з пэўнай тэндэнцыйнасьцяй. Магчыма, што фактычны матар'ял і можна выкарыстаць зь яе. Іншыя ўспомненыя Вамі працы ўважаю за добрыя. – Ёсьць надзея, што «Беларускі Эмігрант» у недалёкай будучыні пачне выходзіць ізноў. – Ваш вучань маг. А. Грыцук заняты павушы грамадзкай працай у ЗБК, у царкоўных справах і "Belorussian (Toronto) Credit Union" пры ЗБК. Nota bene – трэба будзе апрацаваць для Вашай манаграфіі бачыну аб гісторыі гэтай фінансавай арганізацыі. – Я гаварыў з Грыцу-

ком адносна Вашай працы. Шмат ён ня зможа памагчы, але згадзіўся зрабіць інтэрв'ю з некаторымі сваімі знаёмымі, старымі беларускімі эмігрантамі. Аносна "Who is who" мусім нешта прыдумаць. – Акулевіч іміграваў у Канаду з Заходняй Беларусі як грамадавец і дзейны беларус. Ён быў у кантакце з нашымі старымі эміграцыйнымі цэнтрамі ў Эўропе, пакуль не пачаў камуністычнай работы. Яшчэ ў газэце расейскай «Гудок» ён зьмяшчаў куток на беларускай мове, хочучы звабіць да сябе беларусаў. Ясна, што сьведамыя беларусы зігнаравалі гэту расейска-камуністычную пастку й беларускі куток хутка быў спынены. Усё-ж бальшыню сваей расейска-камуністычнай работы абапёр на сваіх землякох Гродзенскай губерні. Мне хацелася-б зарганізаваць інтэрв'ю са спадаром Акулевічам. Бяда толькі, што ніхто да яго не адважыцца йсьці. Ведама, што ён ёсьць маскоўскім агентам, а бальшыня нашых актыўных людзей, у тым ліку й я, маюць сваіх блізкіх у Савецкім Саюзе й баяцца камплікацыяў. Цікава, што Акулевіч расказаў бы пра беларускую эміграцыю ў Канаду? Можа я яшчэ й знайду каго, хто згодзіцца пайсьці да яго. Як Вы на гэта глядзіце? – Я сам цікавіўся лёсам беларусаў, якія ў 1956 годзе выступілі з Расейскай Фэдэрацыі, але дагэтуль ня мог гэтым заняцца. Вельмі хачу, аднак, раскапаць гэту справу.

Зь вялікай прыемнасьцьцю прагледжу й зраблю свае заўвагі да паасобных частак Вашай манаграфіі аб беларускай эміграцыі ў Канаду. Дзякую за ўвагу й давер.

Цяпер пару слоў пра цэласьць Вашай працы: Як я ўжо Вам пісаў, уважаю за свой абавязак дапамагчы Вам у чым толькі магу і заангажаваць да гэтай помачы іншых беларусаў. У сувязі з гэтым я разгарнуў шырэйшую дзейнасьць, дагаварыўшыся з нашымі людзьмі ў Таронта й напісаў лісты ў іншыя нашыя асяродкі. Ходзіць перадусім аб сабраньне матарыялу пра старую эміграцыю. Гэта мая дзейнасьць вымагала крыху часу, што й тлумачыць маё зацягваньне з адказам на Ваш апошні ліст. Наагул зьбіраньне матарыялу аб старой эміграцыі займае больш часу і можа стрымаць тэмпа Вашай працы. Можа Вы з гэтым ня згодны?

На маю думку, апрача агульнага нарысу пра старую эміграцыю, трэба было-б зрабіць паасобныя разьдзелы аб беларускай эміграцыі ў паасобных асяродках, як Таронта, Монтрэаль, Вінніпэг, Лёндан, Судбуры й іншыя, дзе асядалі й разьвіваліся групы беларускіх эмігрантаў. У гэтым

кірунку я й разгарнуў сваю дзейнасьць. Я дагаварыўся з сваімі сябрамі ў Таронта, якія зробяць інтэрв'ю з сваімі знаёмымі – старымі эмігрантамі, а зь некаторымі я ўжо сам рабіў. У Мантрэалі мог бы гэтым заняцца інж. Ян Жытко. Там была беларуская арганізацыя й значная дзейнасьць. Можа й Вы да яго захацелі-б напісаць, апіраючыся на маю рэкамэндацыю? Гэта дзейны малады навуковец, унівэрсытэт закончыў у Лювэне ў Бэльгіі.

Але пакуль што на гэтым спынюся, бо напісанае хачу выслаць сяньня. Прадаўжэньне наступіць заўтра.

Дык пакуль што жадаю Вам пасьпеху.

Ваш В. Жук-Грышкевіч.»

* * *

Дадатак да ліста, высланага В. Жук-Грышкевічам 18-га лютага 1958 г., быў напісаны ім пабеларуску. Тут ён падаецца ў перакладзе на ангельскую мову, зробленым др-ам Кэйэ. Беларускі тэкст не захаваўся:

"Montreal was the most important centre of Byelorussian immigration, both for the old and the new. As many of them have recounted, most of the immigrants stopped in Montreal, even those who later found themselves a place farther west. Some of them stayed in Montreal permanently. The new immigrants made contact with them. The new immigrants started a branch of ZBK in Montreal, they began organizing a parish of BAPC, bought a lot to build a church, but they were unable to find a priest and I believe this plan has faded. They organized their own choir and travelled to Toronto and New York. The director of the choir was a singer called Čopčyc. They made a number of records of Byelorussian songs, of which some have been sold just lately. They also published an issue of a journal called "Palessie."

In London there is a branch of ZBK. The secretary is Viktar Ivanoŭski and he will probably help you. You must just explain what items you need. His address is: Viktar Ivanoŭski, 777 Little Gray St., London, Ont.

There is also a branch of ZBK in Sudbury, where you could gather information of Byelorussian immigration in this area. For this it would be best to communicate with Mr. M. Bućko. His address: 435 Brock St., Sudbury, Ont.

Oshawa, there is a branch of ZBK.

In Winnipeg there is a large group of Byelorussians, both from the old as well as the new immigration. I am not sure if there are any Byelorussian organizations there. I do know though, that there were Byelorussian concerts and national celebrations organized there. With his performances at these concerts a young Byelorussian singer, Radčanka, became popular, and not only did the Winnipeg press write about him but also the Toronto papers mentioned him. There are two men there that do a great deal of work in Byelorussian affairs but they do not get along with each other: Mikoła Silvanovič, 128 Walnut St., Winnipeg, and V. Hucko, 147 McFarlane St., Winnipeg. You can turn to both these people. I will write to the above-named people myself but it would not hurt if you wrote to them also, if you can. Your letters would give them enthusiasm and respect. I can give you another person's name who lives close to you in Ottawa: This is a young man called Ivan Brucky. Address: 221 Fourth Ave., Ottawa. Phone CE 4-7319. He is a friend of Engineer Žytko and goes to Montreal often. Besides this he knows a little of Winnipeg where his father lives.

Now I come to Toronto. I want to give you my own interviews about old immigrants.

Jury (George) Zajko, 65 years old, employed by CNR, he became a pensioner this year. He lives at 322 Kingwood Rd. He came to Toronto in 1913 from the county of Kosaŭ, village of Zapolle, province of Horadnia. He stopped at Montreal. In Czarist Russia he had a difficult life as a farmer where he had little land and almost no income. The governmment did not care about the people. This is why he came to Canada, to make money, and to return home to buy land. In Montreal he did all kinds of work, whatever was available. There was difficulty with work. When work was available the resident French were very jealous and took the best jobs for themselves. An immigrant was looked at as a second-class person and everyone tried to take advantage of him. It was a little easier for a Catholic but the Orthodox found it much worse, as the residents looked on them as heretics and hated them. Most of our immigrants were Orthodox. It is interesting that at this time all the Byelorussian immigrants were called Polish by the Montrealers even though Poland at that time was not an independent country. From my country many people emigrated in 1909 and later. Some went to the U.S.A. and others travelled to Canada. Three others and I from the village of Zapolle emigrated to Canada after correspondence with our neighbour

Daniła Trynda who emigrated with others in 1912. He wrote that it was not bad in Canada and you could make money. Later Daniła Trynda went to Toronto and started a family. He died in 1954. I visit his family sometimes. When we came to Montreal we were able to start work in a paper mill. After 6 months we were laid off. Then I started work at the Primas Hotel and my three friends Maksim Maskaluk, Baroŭka and Andrej Zajko went to Port Arthur where they worked as unloaders of coal for the CPR. Where they are now, I do not know. It was a difficult situation with work in 1914 and many times I was without work. I wanted to return home, but the War interfered. In 1916 I joined the Canadian army and was at the front in France in the Battle of Ypram where I was wounded by shrapnel. My wounds healed in hospital but two pieces of shrapnel remained in my back and they bother me now when the weather changes. In 1919 I was demobilized and found a job in a Hotel. In 1926 I started work at the CNR as a sorter af steel. In 1955 I moved to London to the same kind of work, where I worked until 1958 wehen I became 65 and was pensioned. Then I moved to Toronto. I married a Ukrainian girl from Halicyi in 1927. My wife died in 1955. I have one married daughter whose husband is Ukrainian. I was interested in national groups but did not belong to any particular group for any length of time, because they were all strange to me. After the Bolshevik revolution in 1918 a worker's movement started amongst people who had lived in Czarist Russia. In 1919 they started to talk people into returning to Soviet Russia and started to organize technical courses. I did not join any organization because there were terrible arguments between different factions but I did take a technical course. I did not stay in the course long because instead of teaching they gave Bolshevik propaganda and argued with those people who did not agree with the propaganda. I spit at these people and did not go to any other courses. After 30 years I read the Russian newspaper "Vestnik" sometimes although this paper did not appeal to me because there was much Soviet propaganda in it. There was litle truth in it and they tried to have us join their Party. In London at work I became acquainted with boys from the new immigration from Byelorussia, Shustam and Ivanoŭskim. I became friends with them and started to go to the London Branch of ZBK where I learned of the Byelorussian newspaper and Byelorussian life. This appealed to me and after some time I joined ZBK and am still a member in

Toronto. In London there are many old Byelorussian immigrants. Not all of them know very much about Byelorussia but they are interested.

Michaś Kulesh told about many of the old immigrants from Byelorussia in Toronto. He is a member of ZBK. He came to Canada in 1947 from Germany and lives in Toronto. He married the daughter of an old immigrant from Byelorussia. His father-in-law is Jarmalej Baješko who came to Canada in 1911 from the township of Puchaviskaj, county of Słucak and Minsk province. There are many Byelorussians in Canada from this area. He settled in Toronto. He worked as a pressman for 35 years and then was a cleaner. He had a store and his own home, and was comfortably off. In 1924 he brought his wife from home to Canada. He praised his life in Canada and the Canadians. He did not belong to any organizations except the Russian Church on Glenmorris. He felt he was a Byelorussian and although he did not join any Byelorussian organization, he felt sympathy to ZBK.

Budźka, Ihnat from the township of Puchavickaj, county of Słucak emigrated in 1908 to the U.S.A. In 1909 he came to Canada and settled in Toronto. He is now 80 years old. He at one time felt sympathetic to the Soviets but later was interested only in religious life. He knows he is a Byelorussian and speaks Byelorussian at home. His daughter is a ballerina and danced at BNA.

Alaksej Budźka came to Canada from the Puchavickaj region in 1914. His uncle mentioned above sponsored him. He came to Canada when he was 15 years old. He learned to manufacture toys and started a business in Toronto. He later sold his business and worked in the same field. He is a wealthy man. He has a son Łuka who graduated as an engineer. They speak Byelorussian at home and read Byelorussian newspapers, but he was not active in organized clubs. At one time when it was suggested to Łuka that he anglo-saxonize his name, he became highly indignant and refused, even though a very good job was offered if he would. Alaksej Budźka felt sympathetic to the Communists but his wife and sons were against them. They feel more sympathetic to Byelorussias and their organizations.

Nikanor and Symon Pranoviči came to Canada in 1910 also from the township of Puchavickaj, county of Słuck. They settled in Toronto. Both are now pensioners and married. Nikanor worked as a presser. Symon worked in a paper mill and besides this he bought and sold homes. He bacame a wealthy man. At home they all spoke Byelorussian. Nikanor

has a son who is the owner of a sewing machine store. The Communists have tried to influence them but they do not belong to the organization on Denison St. The Communists failed to have any influence on them because they found from letters which they received from the homeland that the facts that were presented to them by the Communists were untrue and things were not as good as they said.

Michael Koron came to Canada in 1911. He was also from the province of Puchavickaj settled in Toronto, and has a family. His wife is from the region of Pinsk. At home they speak Byelorussian. They cared about the education of their children and one son is an engineer. Michael Koron worked as a coater feeder in a metal plant. He was influenced by the Communists but his son was very much against them.

Peter Špakowsky came from West Byelorussia in 1911 to Toronto. He worked as a presser in a clothing factory. He married a girl from Byelorussia and they had one son. They spoke Byelorussian in the home. They were mainly interested in the religious life. He was a Catholic while she was Orthodox, but they both attended the Russian Orthodox Church.

Alaksandar Sinica came from the district of Pastavy, province of Vilna. He came to Canada in 1930 and settled in Toronto. He works in a steel foundry. His wife is the daughter of the above-mentioned Ihnat Budźka. They have one daughter who graduated from the Faculty of Law and is a lawer in a government office. They are conscious of being Byelorussians, but are not active.

In conclusion, Mr. Kulesh thinks that the above-mentioned people and many others could contribute more to Canada and our ethnic group if they were not influenced by Denison Ave. However, this influence is diminishing."

* * *

"Ottawa, February 25, 1959

Dr. V. Žuk
54 Mary Street
Barrie, Ontario

Dear Dr. Žuk:

Part II of your letter dated February 18 contained very useful material on Byelorussians in Canada. I shall make a trans-

lation of the memoirs from Toronto and add them to the monograph as an appendix.

I shall write as you suggest to the various persons whose addresses you have given me in your letter. I enclose a copy of one of those letters for your information. I am also enclosing draft of three chapters of the proposed monograph with a request to make such observations, additions or corrections as you may deem proper and to return them to me. The monograph is intended to give a clear picture of the historical facts of the present situation of the Byelorussian group regardless of group interests or personal differences among the various leaders. We would like to present an unbiased picture of the process of settlement of the Byelorussian group in Canada and its integration into Canadian life.

Once more, many thanks for your valuable assistance.

Yours sincerely,

(Dr.) V. J. Kaye,
National Liaison Officer."

* * *

«Бэры, 10 сакавіка, 1959.

Вельмі Паважаны й Дарагі др. Кэйэ,

... Цяпер пераходжу да Вашых тэкстаў. Перадусім прашу Вас узяць пад увагу наступныя факты:

1. У Канадзе звычайна акрэсьліваюць нацыянальнасьць (ці этнічную прыналежнасьць) паводле дзяржавы, у якой жыў імігрант перад прыездам у Канаду.

2. Пры перапісях насельніцтва для нацыянальнай, ці этнічнай прыналежнасьці бралася пад увагу дзяржаўная прыналежнасьць. За малымі выняткамі – на гэтай жа аснове была ўложана ліста нацыянальных рубрык. Можна было падаваць пры перапісі нацыянальнасьць іншую, чымся дзяржаўная прыналежнасьць па дакумэнтах, але толькі ў тым выпадку, калі гэта нацыянальнасьць была ў лісьце нацыянальных рубрык. Калі-ж такой нацыянальнасьці ў пералічаных у лісьце нацыянальных рубрык ня было – дык урадавец запісваў нацыянальнасьць паводле дзяржаўнай прыналежнасьці. Як ведама, беларусы ня ме-

лі сваёй дзяржавы (калі ня лічыць існуючай некалькі месяцоў БНР ці Беларускай ССР) і ў сьпісе рубрык нацыянальнасьцяў беларускай рубрыкі ня было. Таму пры перапісях беларусы, як правіла, траплялі ў чужую рубрыку нацыянальнасьці – пераважна расейскую ці польскую. Туды трапілі нават сьведамыя нацыянальна беларусы – як з старой так і з новай эміграцыі. **Дзеля таго можа было-б няслушным цьвердзіць, што беларусы трапілі ў чужыя рубрыкі толькі з тэй прычыны, што ня ведалі, што яны беларусы.**

3. У Нямеччыне ў 1945-46 годзе альянцкія вайсковыя ўлады сілай выдавалі бальшавіком беларускіх і не беларускіх уцекачоў, тых, што паходзілі з тэрыторыі Савецкага Саюзу. Каб ратавацца ад гэтага,беларусы ня мелі іншага выбару, як ісьці ў польскія лягеры й падавацца за палякаў, або літоўскія, ці латышскія. Там пры скрынінгах яны падавалі за сваю нацыянальнасьць лягеру, у якім яны былі. З гэтымі дакумэнтамі пад чужой нацыянальнасьцяй беларусы маглі ўтрымацца ад выдачы бальшавіцкім рэпатрыяцыйным місіям, бо палякаў, літоўцаў ці латышоў насільна не рэпатрыявалі. З такімі дакумэнтамі пад чужой нацыянальнасьцяй беларусы эміграваліў розныя краіны, у тым ліку й Канаду. Настрашаныя рэпатрыяцыйнымі камісіямі, яны доўга сядзелі ціха, баючыся выявіць сваю сапраўдную нацыянальнасьць. Пазьней, калі небясьпека выдачы бальшавіком мінула, зьявіліся іншыя перашкоды пры перапісі падаць сваю сапраўдную нацыянальнасьць. Калі беларусы цьвердзілі, што яны беларусы, і дамагаліся, каб іх запісвалі такімі – урадаўцы адказвалі, што яны такой нацыянальнасьці ня знаюць, яе няма ў лісьце нацыянальнасьцяў і запісвалі пад рубрыкай расейскай ці польскай – у залежнасьці ад таго, зь якой часткі Беларусі гэтыя людзі паходзілі, або якая нацыянальнасьць запісана ў іх у дакумэнтах. Такім чынам, беларусы запісаны ня толькі пад рубрыкай расейскай ці польскай, але нават пад літоўскай і латышскай. Тыя-ж настойлівыя, што ні за што не згаджаліся быць запісаны пад чужой нацыянальнасьцяй – дабіваліся ўрэшце толькі таго, што іх запісвалі на асобным лістку. Такая гісторыя была са мной і шмат якімі іншымі беларусамі. Але што яны рабілі з гэтымі асобнымі лісткамі, ці анатацыямі – цяжка сказаць.

Я памятаю, што ў часе перапісу было страшэннае абурэньне ў беларускіх асяродзьдзях на тое, што ў лісьце на-

цыянальнасьцяў ня было беларускай рубрыкі. І сапраўды, падумайце толькі, як гэтыя людзі маглі чуцца: на бацькаўшчыне адбіралі ім іхнюю нацыянальнасьць акупанты – расейцы й палякі; у Нямеччыне іх як беларусаў аліянцкія ўлады выдавалі насільна бальшавіком; а як прыехалі ў вольную краіну ў Канаду, дзе ўрэшце думалі быць самімі сабой – дык і тут сілай фактаў змушалі іх запісвацца пад чужой нацыянальнасьцяй, найчасьцей іхніх ворагаў – расейцаў ці палякаў. Гэта-ж страшэнная людзкая крыўда! Гэта-ж проста дыскрымінацыя!

Таму нашы арганізацыі зрабілі пэўныя крокі перад канадыйскімі ўладамі, каб гэту крыўду направіць, каб беларусаў запісвалі беларусамі. І таму гэтыя ўлады далі запэўненьне, што беларуская нацыянальнасьць прызнаецца, і беларусы будуць запісаны пад сваёй рубрыкай нацыянальнасьці. Але, як я бачу з Вашых лістоў, беларусы ў Канадзе ня прызнаны дагэтуль за асобную нацыянальнасьць і ня маюць сваёй нацыянальнай рубрыкі пры перапісах насельніцтва. А калі так, дык будзьце ласкавы, парадзьце, што рабіць, да каго зьвяртацца, каб паправіць гэту крыўду?

Паданыя тут факты варта было-б насьветліць і зрабіць зь іх выснавы.

Да разьдзелу "Beginning of Byelorussian immigration to Canada"

Тут якраз, па мойму, можна было-б сказаць, чаму беларусы былі ўцягнуты ў рубрыкі нацыянальнасьцяў расейскай і польскай, бяручы пад увагу вышэй паданыя факты, а ня толькі дзеля таго, што па сваей нацыянальнай нясьведамасьці ўважалі сябе за расейцаў ці палякаў. Згаджаюся, што пэўная частка была такіх, але-ж былі й нацыянальна сьведамыя, і яны ўсяроўна былі запісаны пад чужымі рубрыкамі. Гэта адносіцца ня толькі да новай эміграцыі, але й да старой, бо й сярод старой эміграцыі былі й ёсьць сьведамыя беларусы, хоць пэўне-ж у меншым ліку, як сярод новай. І напэўна, калі-б пры перапісах існавала рубрыка беларускай нацыянальнасьці, дык напэўна шмат якія й старыя эмігранты запісаліся-б пад сваёй рубрыкай.

Да разьдзелу «Статыстыка». Колькі беларусаў у Канадзе

Перадусім мушу паправіць кардынальную памылку. Звычайна ўважаецца, што беларусаў-каталікоў ёсьць каля 25%. Вы падаецё – 20%. Гэта яшчэ з паўбяды. Можна было-б зазначыць паміж 20%-25%. Затое няпраўда, што толькі цэнтральная й Усходняя Беларусь "predominantly Orthodox," а Заходняя "became Catholic." У сапраўднасьці ўся Беларусь "predominantly Orthodox" з тэй толькі розьніцай, што чым далей на ўсход, дык працэнт каталікоў меншы, а чым далей на захад, працэнт каталікоў большы, аднак не перавышае 33%. Толькі ў некаторых паветах Віленшчыны, як Віленска-Троцкі, Сьвяньцянскі, Ашмянскі й Браслаўскі маюць каталікоў бальшыню. Затое-ж нават шмат далей на захад – у Горадзеншчыне, Беласточчыне й асабліва Палесьсі праваслаўныя пераважаюць. Пад польскай акупацыяй былі чатыры беларускія ваяводзтвы (нешта падобнае да расейскіх губэрняў): Віленскае, Навагрудзкае, Беластоцкае й Палескае з насельніцтавм каля 5,000,000, з чаго каля 3,500,000 беларусаў, а рэшта палякі, жыды й іншыя меншыя групы. Беларусаў-каталікоў было тут крыху больш, як 1,000,000, гэта значa каля траціны, ці 30%-33%.

За 20 год польскае акупацыі палянізацыя зрабіла вельмі значны поступ, а павялічэньне ліку каталікоў мінімальнае. Як апалячваньне, гэтак і акаталічваньне зрабіла значны поступ раней, часткова ў часох Рэчыпаспалітай – і часткова пазьней – пасьля падзелу Рэчыпаспалітай – пад расейскай уладай. Расейская палітыка прызнавала толькі праваслаўных, як расейцаў, і каталікоў, як палякаў. Сярэдзіны – вуніятаў і беларусаў не прызнавалі. Палякам (каталіком) асабліва за часоў Аляксандра І, даваліся вялікія канцэсіі, як гаспадарчыя (Тызэнгаўз), так і культурныя й школьныя (кн. Чартарыскі) ды рэлігійныя. У гэтых часох акаталічваньне й палянізацыя зрабілі на Беларусі найвялікшы поступ. Тое, што вы гаворыце пра ліквідацыю вуніятаў на Беларусі й пераход беларусаў з вуніі на каталіцтва – зусім згодна з праўдай, аднак Вы занадта павялічылі разьмер акаталічваньня й палянізацыі, таксама як і за часоў польскай акупацыі перад апошняй вайной. Таму Ваша цьверджаньне, што ў Заходняй Беларусі пад польскай акупацыяй перавышалі ката-

лікі над праваслаўнымі й дзеля таго беларускія імігранты ў Канаду з Заходняй Беларусі былі "Predominantly Roman Catholic" – ня згодна з праўдай. І ў гэтай групе беларускіх імігрантаў абсалютную бальшыню тварылі праваслаўныя. Гэта можна сьцьвердзіць, разглядаючы групу – «грамадаўцаў», што прыехалі разам з Акулевічам і іншых імігрантаў з гэтага часу.

Колькі беларусаў пад расейскай рубрыкай

Пераходзім да разгляду колькасьці беларусаў у Канадзе. На маю думку, што найменш палавіна 91,279 запісаных расейцамі – гэта беларусы. Як ведама, самі расейцы эміграваліў чужыя краіны з эканамічных прычын – вельмі рэдка. Эміграцыя з Расейскай імпэрыі перад рэвалюцыяй у ЗША й Канаду складалася з «інародцаў» з заходніх акраінаў, г. зн. украінцаў, беларусаў, балтыцкіх народаў, жыдоў і палякаў. Калі пападаліся расейцы, дык гэта былі нялічныя палітычныя эмігранты, рэлігійныя сэкты (напрыклад Духаборы) часамі лічнейшыя, ды магчыма дэзэртыры з расейскай арміі й флёты. Да такіх выснаваў можна прыйсьці нават чытаючыу кнігу Акулевіча. Усе пералічаныя вышэй нацыянальнаьці запісаны пад сваімі нацыянальнымі рубрыкамі, толькі беларусы засталіся пад расейскай рубрыкай, запаўняючы бальшыню яе, бо-ж рубрыкі беларускай нацыянальнасьці ня было. Пазьней, пасьля рэвалюцыі лік сапраўдных расейцаў крыху павялічыўся з прыплывам белых расейскіх эмігрантаў. Але й надалей пад расейцамі фігуруюць пераважна беларусы. Новая эміграцыя таксама дала пэўны лік расейцаў падсавецкіх, але-ж таксама й беларусаў, якія мусілі апынуцца ў расейскай рубрыцы дзеля адсутнасьці беларускай рубрыкі нацыянальнасьці. У рэзультаце нават прыплыў белых расейскіх эмігрантаў і новых мала зьмяніў працэнт беларусаў пад расейскай рубрыкай, яны й надалей там у бальшыні. Гэта цьверджаньне падмацоўваюць лічбы з Вашай статыстыкі, калі да іх падыйсьці кансэквэнтна. Вы сьцьвярджаеце, што ў ліку 91,323 расейцаў знаходзіцца 13,323 каталікі. І зусім слушна ўважаеце іх за беларусаў. Бо хто-ж іншы тут мог бы быць? Палякі й літоўцы маглі прыяжджаць з расейскімі пашпартамі перад першай сусьветнай вайной, але-ж напэўна яны далучыліся да сваіх парафіяў і запісаны пад сваімі нацыянальнымі рубрыка-

мі. А ў часе між войнамі й пасьля другой сусьветнай вайны яны прыяжджалі з паперамі сваіх дзяржаваў, дык ніяк ужо не маглі папасьці пад расейскую рубрыку. Такім чынам, толькі беларусы маглі там застацца дзеля вышэй разгледжаных прычын. Цяпер, калі пад расейскую рубрыку трапіла 13,323 беларусы каталікі, дык тым больш у гэту рубрыку трапілі ўсе праваслаўныя беларусы, бо куды-ж яны маглі трапіць інакш? Я маю тут на думцы старую эміграцыю, бо з новай частка беларусаў трапіла пад польскую рубрыку. Колькі-ж праваслаўных беларусаў трапіла ў расейскую рубрыку? Тут трэба ўзяць працэнтныя адносіны паміж беларусамі каталікамі й праваслаўнымі. Калі нават лічыць, што беларусы каталікі ў адносінах да беларусаў праваслаўных складаюць 25%, дык беларусаў праваслаўных магло трапіць у расейскую рубрыку 13,323 х 3, што дае 39,969 плюс 13,323 каталікоў – разам 53,292. Гэта й ёсьць блізкая да праўды лічба беларусаў пад расейскай рубрыкай.

Далей, блізкую да гэтай лічбы дае й аналіз дадзеных аб роднай мове. 29% расейцаў падалі за родную мову іншую, як расейскую, ангельскую ці французскую. Гэта бязумоўна былі беларусы, а не хто іншы. 28% з 91,279 дае 26,470. Родную мову як ангельскую падало 33.7%, г. зн. 30,761. Але, калі лічыць, што прынамся палавіна расейцаў – гэта беларусы, дык і ў лічбе тых, што падалі за родную мову ангельскую, палавіна прынамсі будуць беларусы, што выносіць 15,380. Апрача таго, напэўна значная колькасьць беларусаў – старых эмігрантаў асабліва – па сваёй нацыянальнай нясьведамасьці ня ведала, што мова, якой яны гавораць, называлася беларускай мовай і што яе можна ўважаць за нейкую асобную мову. Ім жа за царскіх часоў цьвердзілі, што іх мова – гэта «наречие русского языка», ці інакш кажучы, іх мова ёсьць руская і яны самі рускія. Вось жа й тут у Канадзе, як і калісь на бацькаўшчыне, яны падалі за сваю родную мову рускую мову. Дапусьцім, што колькасьць такіх беларусаў магла дайсьці да 10,000 на цэлую лічбу 34,412, што падалі за родную мову расейскую. Тады ўсе тры лічбы – 26,470 плюс 15,380 плюс 10,000 дадуць разам 51,850. Гэта лічба вельмі блізкая да вышэй паданай лічбы беларусаў 53,292. Гэта лічба ня ёсьць дакладнай, аднак вельмі праўдападобная. Няма ніякіх спосабаў, каб устанавіць дакладную лічбу. Звычайна чуеш сярод беларусаў – новых эмігрантаў і старых,

што пад расейскай рубрыкай крыецца добрая палавіна беларусаў. Здаралася чуць і ад саміх расейцаў нешта падобнае: яны казалі нашым «самастыйнікам»: «Што вы значыце з вашымі арганізацыямі, колькі-ж вас ёсьць? Невялічкая групка. Усе беларусы ў нас, яны складаюць палавіну рускіх.» Да падобных жа выснаваў можна дайсьці, чытаючы кніжку Акулевіча «Русские в Канаде». Таму я думаю, што мы не памылімся шмат, калі скажам, што з 91,279 расейцаў прыпадае 45,000 беларусаў. За гэтым прамаўляюць паважныя аргумэнты. Ніяк нельга запярэчыць, што 13,323 каталікі гэта беларусы, што тады праваслаўных беларусаў пад расейскай рубрыкай мусіць быць што найменш у тры разы больш, калі ўзяць пад увагу працэнтныя адносіны паміж беларусамі каталікамі й праваслаўнымі на бацькаўшчыне; што 26,470 расейцаў, якія падалі за родную мову іншую, як расейскую, ангельскую, ці французскую, ёсьць ні хто іншы, як беларусы; што 30,380 расейцаў, якія падалі за родную мову ангельскую, што найменш палавіна – 15,380 ёсьць беларусы, паколькі беларусы складаюць палавіну ўсёй колькасьці расейцаў; і ўрэшце, што значная колькасьць беларусаў – нясведамых нацыянальна – падала за родную мову расейскую мову.

Развагі аб паляках

Сярод 219,845 палякаў ёсьць 7,741 праваслаўных. Бязумоўна гэта ня хто іншы, як беларусы. Гэта тыя праваслаўныя беларусы з новай эміграцыі, якія паходзяць з Заходняй Беларусі пад польскай акупацыяй, мелі польскія дакумэнты. Пры перапісі яны мусілі падаць Польшчу, як дзяржаву, у якой жылі перад 1939 годам, і былі ўпісаны ў польскую рубрыку нацыянальнасьці нават паміма свае волі й пратэстаў, як я расказваў аб гэтым вышэй, бо-ж асобнай рубрыкі беларускай нацыянальнасьці пры перапісі ня было. Зразумелая рэч, што значная колькасьць праваслаўных беларусаў з пад польскай акупацыі, якія былі больш адпорныя на ўсё польскае й каталіцкае – ня маючы беларускай рубрыкі й ні зашто ня хочучы трапіць у польскую рубрыку, выбралі сабе расейскую рубрыку, што была для іх больш адпаведнай, чымся польская, з прычын рэлігійных.

Затое беларусы каталікі з пад польскай акупацыі трапілі ў польскую рубрыку амаль усе пагалоўна. Апрача таго ў польскую рубрыку трапіла шмат беларусаў каталікоў з старой эміграцыі, якім расейская рубрыка з прычын рэлігійных зусім не адпавядала.

У польскім войску і ў розных польскіх лягерох ДП беларусаў каталікоў было ня менш, а можа й больш, як праваслаўных, ня гледзчы на тое, што ў Заходняй Беларусі яны складалі 30% у адносінах да праваслаўных беларусаў. Справа ў тым, што, з прычын рэлігійных, яны ахватней гарнуліся да польскіх лягероў, як праваслаўныя, якія хутчэй ішлі ў лягеры іншых нацыянальнасьцяў. Усе беларусы каталікі з польскага войска й польскіх лягероў ДП прыехалі ў Канаду з польскімі дакумэнтамі й польскай нацыянальнай рубрыкай і пад такой рубрыкай былі запісаны пры перапісях. Дык, бяручы скромна, лік беларусаў каталікоў з новай эміграцыі ў польскай рубрыцы быў напэўна ня меншы, як праваслаўных.

Лік беларусаў каталікоў у польскай рубрыцы з старой эміграцыі быў напэўна большы, як з новай эміграцыі, бяручы пад увагу тэрыторыю ўсёй Беларусі ды даўжэйшы адрэзак часу эміграцыі. Падсумоўваючы ўсе разам тры катэгорыі, можам лічыць сьмела, што 25,000 беларусаў пад польскай рубрыкай ня будзе за вялікай лічбай. Гэту лічбу, а можа й вышэйшую пацьвярджаюць 17.8% палякаў, што падалі за родную мову іншую, як польскую, ангельскую, ці французскую. 17.8% з 219,845 (бяру прасьцей 220,000) дае 39,160. То ў гэтых 39,000 напэўна месьціцца больш, як 25,000 беларусаў, бо калі аднесьці рэшту 14,000 на прыпадковых іншых (украінцаў?, жыдоў?, расейцаў?), то гэта лічба нават за высокая для ўсіх іх, бо пры перапісах яны мелі свае нацыянальныя рубрыкі.

Я ўжо не бяру пад увагу 33.7% палякаў, што за родную мову падалі ангельскую, хоць і тут ёсьць людзі беларускага паходжаньня.

З усяго вышэй сказанага вынікае, што прыблізная лічба беларусаў у Канадзе выносіць 45,000 пад расейскай рубрыкай і каля 25,000 пад польскай рубрыкай – разам каля 70,000. Як яны разьмешчаны па ўсіх правінцыях Канады – не бяруся разглядаць, бо да такой справы ня маю пад рукой ніякіх матарыялаў. Вам гэта лягчэй будзе зрабіць, паколькі Вы маеце статыстычныя дадзеныя. Думаю аднак, што найбольш беларусаў ёсьць у Антарыё, Квібэку й Манітобе.

Мне здаецца, што Ваша лічба 30,000 беларусаў за надта зьменшаная й некансэквэнтна абаснаваная. Фактычна Вы ўзялі за аснову толькі 13,323 каталікоў з расейскае рубрыкі (памінаючы напэўна ў тры разы большую лічбу праваслаўных беларусаў у гэтай рубрыцы) ды 7,741 праваслаўных з польскай рубрыкі (памінаючы шмат вышэйшую лічбу беларусаў каталікоў з гэтай рубрыкі) і на ўсякі выпадак крыху павысілі суму гэтых дзьвюх лічбаў, закругляючы яе да 30,000. Калі-б Вы нават да лічбы каталікоў у расейскай рубрыцы прызначылі толькі такой жа вышыні лічбу праваслаўных беларусаў у расейскай рубрыцы (што было-б таксама зьменшаньнем, бо ведамым фактам ёсьць, што праваслаўных беларусаў куды больш, як каталікоў), ды лічбу праваслаўных у польскай рубрыцы павялічылі на такую-ж лічбу беларусаў каталікоў у гэтай рубрыцы – ці інакш кажучы падвоілі гэтыя дзьве лічбы, то й то атрымалі-б 42,128 (13,323 плюс 7,741 памножаны на 2 дае 42,128). Хоць лічба вельмі абмежаная, усё-ж зь яе вынікала-б, што да лічбы беларусаў каталікоў у расейскай рубрыцы дайшла нязначная лічба беларусаў праваслаўных, а да лічбы беларусаў праваслаўных у польскай рубрыцы дайшла пэўная лічба беларусаў каталікоў. Зразумелая рэч, што й гэтая лічба была-б нелягічнай, калі ўзяць пад увагу працэнтныя суадносіны паміж беларусамі праваслаўнымі й каталікамі. Але Ваша лічба 30,000 зусім аднабаковая, паколькі яна адкідае праваслаўных беларусаў у расейскай рубрыцы й беларусаў каталікоў у польскай рубрыцы. Выбачце мне за крытыку, яна выплывае з таго прынцыпу, што з дыскусіі й крытыкі лягчэй выявіць праўду.

Мне здаецца, што больш чымся адна шостая частка ўсяе лічбы беларусаў у Канадзе ўважае сябе за беларусаў. Нават тыя, што належаць да Расейскай Фэдэрацыі й чытаюць «Весьнік» і савецкую прэсу, ведаюць, што яны беларусы, хоць можа й не «самастыйнікі». Нават гэта прэса піша шмат аб беларусах, як асобнай нацыі й Савецкай Беларусі, як асобнай дзяржаве. Варта было-б пазнаёміцца з нумарам «Весьніка» з першай паловы студзеня гэтага году, дзе прысьвячаецца шмат месца 40-вой гадавіне БССР. Я думаю, што каля палавіны беларусаў ведаюць, што яны беларусы. Іншая рэч, што лік беларусаў, якія бяруць актыўны ўдзел у беларускім жыцьці ў Канадзе, значна меншы, магчыма адна шостая цэлага ліку.

Да разьдзелу "Religious Divisions..."

Перш за ўсё трэба выправіць памылку адносна працэнтных суадносін паміж беларусамі праваслаўнымі й каталікамі, згодна з маімі папраўкамі ў разьдзеле «Статыстыка» на бачыне 4-ай.

Далей я дазволіў сабе зрабіць рэчовыя папраўкі ў Вашым тэксьце (выбачце мне), якія аб'ектыўныя й згодныя з праўдай. Іншых заўвагаў ня маю.

Вось і ўсё, што да Вашых тэкстаў.

Цяпер хачу спытаць, ці Вы думаеце апрацаваць, як асобны разьдзел, агульныя інфармацыйныя дадзеныя аб Беларусі, яе сучасным і мінулым, аб чым Вы мне пісалі раней. Мне здаецца, што такі інфармацыйны ўступ ёсьць неабходным. Ці Ваша манаграфія будзе выдана друкам для публічнага ўжытку?

Выбачце, што мой адказ заняў столькі часу. Я быў крыху заняты іншымі справамі, ды прастудыяваньне Вашага тэксту й заўвагі да яго таксама вымагалі пэўнага часу. Аднак і надалей буду вельмі рады дапамагчы Вам, калі Вы знойдзеце маю дапамогу карыснай.

З глыбокай пашанай,
Ваш В. Жук-Грышкевіч»

* * *

"Ottawa, April 1, 1959

Dr. V. Žuk
54 Mary Street
Barrie, Ontario

Dear Dr. Žuk:

I read with great interest your kind letter and I appreciate very much your observations, they helped to round up the picture of the Byelorussian ethnic group in Canada.

You will permit me, I am sure, to make a few remarks to your observations.

Ad (1) You state that in Canada the ethnic origin of a person is identified with STATE ALLEGIANCE and that in census returns "origin" was equivalent to state Allegiance. This is not the case. If you consult the Enumeration Manual for the

1951 Census, you will find the following instruction given to enumerators:

"You will attempt to establish a person's origin by asking the language spoken by the person (if he is an immigrant), or by his parental ancestor when he first came to this continent" ("1951 Census, Enumeration Manual" page 44).

Ad (2) Therefore, you are mistaken when you say that the "origin" of a person was fixed according to his or her state allegiance. The criterion for the establishment of origin was the language considered as the mother tongue spoken by the person enumerated if he was an immigrant, or the language of his parental ancestor when he came to Canada. In many cases state alligiance coincided with origin and mother tongue, for instance: a person coming from Italy was in most cases of Italian origin and Italian was his mother tongue. The same applied to immigrants from Denmark, Norway, Sweden, Germany, Netherlands, etc.

If a person has given **Byelorussian** as his mother tongue, it has to be duly registered on the card of the enumerator. It was not shown in Census publications because there is no room for the inclusion in the Census publications of all lesser language groups and Byelorussian as mother tongue was given only be a small fraction of Byelorussians in Canada.

On the top of it there did exist also a certain confusion in enumerating Byelorussians, and if the enumerators put "Russian" instead of "Byelorussian" origin, it was mainly because: (a) there did not exist a generally accepted and uniform designation for this group. Even now Byelorussians themselves use FOUR different designations, viz. **Bye**lorussian, **Be**lorussian, White Russian, and White Ruthenian. I do not mention those who call themselves Krivitchi. (b) The number of persons who actually gave Byelorussian as their mother tongue and origin, was as cards indicate, extremely small. (c) The enumerators often were not aware of the existance of Byelorussians as a separate group, to them White Russians were Russian refugees from Czarist Russia. (d) And finally – because the (old) Byelorussian immigrants themselves put "Russian" or "Polish" as their mother tongue and their origin. When I visited the Russian Greek Orthodox parish in Winnipeg, in 1925, I could not find a single Byelorussian, although some of the names of parishioners did not sound Russian to me. I took them for Ukrainians from Bukovina and Volhynia, who came to Canada before the first world war and considered

themselves "Russians." The case was not better in 1949. Writes Mikola Silvanovich: "Ja prybu u Vinnipeh u 1949 hodze, heta josc dziesiac hadou tamu, to nichto i nidzie pra Bielarusau nicoha nia viedau."

Ad (3) Deliberately misstated ethnic origin, changes of names of "nationality" on the part of former Soviet citizens in order to escape forcible repatriation to the Soviet Union have been legally rectified without punishment for making false statements to immigration authorities as early as 1952. Immigrants from Byelorussia applying for Canadian citizenship are free to put in their application forms their Byelorussian origin. They are not obliged to put Russian or Polish origin.

Your observations on the number of Byelorussians in Canada need some rectification. We did not use all figures available to us and we did not explain the studies we made in that field. I shall try to give you only some observations in reply to your queries.

The Russian and Polish origin groups were our main field of study. For that purpose we used first of all census statistics: (a) denominational, (b) language, (c) origin. In addition we made "Stichproben" comparing lists of names of parishioners of Russian Orthodox parishes, lists of members of societies, biographical sketches in the press, etc. On these observations we based our statements in the monograph. You say: "in my opinion not less than half of the 91,279 persons listed as Russians, are in fact Byelorussians." I am afraid you are mistaken. The denominational statistics revealed the following facts: The 91,279 persons of Russian origin consisted of:

12,219 Greek Orthodox – (Russian, Ukrainian and Byelorussian)
7,5616 Mennonite – (practically all of German origin)
9,118 Jewish – (who did not consider themselves Byelorussian ethnically)
8,259 Lutheran – (mostly Balts)
19,597 Doukhobors – (almost without exception all of Russian racial origin)
13,323 Roman Catholics – (not all of them Byelorussians, as immigration records show)

Apart from those enumerated above there were also others who belonged to various protestant denominations, such as:

10,395 United Church of Canada
3,419 Anglican Church
3,500 Baptists
1,387 Presbyterian

It was impossible to trace the ancestry of this group, apart from the fact that most of them (with the exception of Baptists) gave English as their mother tongue and stated that their fathers and grandfathers came from Russia. Baptist congregations hold their services in Ukrainian and Russian languages and according to clergymen whom we consulted, the majority of their faithful are immigrants from Volhynia, some of whom considered themselves Ukrainians and some Russians.

It is very likely that a fair number of the second and third generation followers of the United Church of Canada, Church of England, and the Presbyterian church, are actually of Byelorussian ethnic origin but they did not state it and we are unable to determine the ratio.

Russian parishes which I visited in Western Canada consisted not of Russian or Byelorussian parishioners but mostly of old immigrants from the Austrian province Bukovina and from Volhynia. The names of the clergy also indicate that they were not of Russian stock, for instance: Rev. V. Bezkorovayny, Maple Creek, Sask; (and so on.... R. Ž.-H.)

The Russian Greek Orthodox church in St. Walburg, Sask., for instance was founded "in 1929 by a group of 18 immigrants from Volhynia, who acquired a piece of land, seven and half acres, and erected the church." (Kanadzki Pravoslavnyi Kalendar na 1952 hod). They, and their English speaking children and grandchildren probably are included in the 12,219 persons who gave Russian as their origin and Greek Orthodox as their religion.

Eastern parishes on the other hand had pure Russian parishioners and Russian priests, including a certain number of parishioners who were Byelorussian origin, judging from the spelling of their names.

This indicates that only approximately (in conservative estimation) 50 per cent of the Greek Orthodox group could have been of Byelorussian ethnic origin. As the whole group is 12,219 persons strong – the number of Byelorussians would be – 6,110. The 19,597 Doukhobors did not have any Byelorussian admixture.

The great puzzle is the large group of 13,323 Roman Catholics who did not fit into the Russian picture. We tried to penetrate the curtain, by looking up applications for citizenship, making enquiries, etc. and came to the conclusion that some of them were Latvian Catholics, some Lithuanian Catholics, and a goodly number, we concluded, must be the tribe of the Krivichi.

You state that "only some countries of Vilna Viovodship,... had Catholics majority, etc.," and you conclude that in Poland the majority of Byelorussians belonged to the Orthodox faith and only 30 to 33 per cent were Roman Catholics. If you consult the BYELORUSSIAN REVIEW, Vol.3, 1956, "The population of Western Belorussia and Its Resettlement in Poland and the USSDR" by Mikoła Vałocič, you will find on p. 19-20 statistics of the Bielosdtok region which you consider to be 30-33 per cent Roman Catholic. The author says: "The Bolsheviks willingly gave this territory to Poland in spite of its size because its population was mainly Byelorussian of Roman Catholic denomination, towards which Moscow was hostile."

Belaya Padlaska	– 66.0%	Roman Catholics		13.4%	Orthodox
Belastok	– 60.6%	"	"	9.7%	"
Augusto	– 90.9%	"	"	1.1%	"
Bielsk	– 43.3%	"	"	10.3%	"
Grodno	– 42.0%	"	"	36.6%	"
Volkovysk	– 46.2%	"	"	41.6%	"
Average	– 61.5%	Roman Catholic		22.9%	Orthodox

As many Byelorussian immigrants who came to Canada between the Wars came from these districts, we assume that about 60 per cent of them will be Roman Catholic. That would explain why the number of Roman Catholics in the Russian origin group was actually larger than the Orthodox group.

The Polish origin group contained 7,744 persons of Greek Orthodox faith, but you are mistaken when you say that "undoubtedly they are nobody else but Byelorussians." Not all of them were Byelorussians. Applications for citizenship have revealed that a considerable number of Greek Orthodox persons who were included in the Polish origin group came from Volhynia, Polessie and – Poland proper, apart from Byelorussian districts. On the other hand, many Poles, Roman Catholics, gave Byelorussian districts as their place of birth which would indicate that they might have been Byelorussians by origin.

You may have noted that Mikoła Silvanovič stated in the "Encyclopedia Canadiana" (Vol. 2) the number of persons of Byelorussian origin at between 10,000 an 15,000. We considered this figure too low and using comparative statistics and probability calculations, supported by "Stichproben" from immigration lists and citizenship applications, enquiries in parishes, press notices (obituary notices with biografical sketches) came to the conclusion that approximately 30,000 was nearer

the truth. But only about one-sixth of this group cosidered themselves Byelorussians, participated actively or passively in the Byelorussian organized life. Our calculation was based on (a) membership in ethnic societies, (b) the number of subscribers of Byelorussian papers, (c) on membership of parishes. We multiplied the figure by four (the assumed number of members in one family, – although, official statistics show that the number of single persons in the Byelorussian group (as it is in every other immigrant group) was higher than the average and that many families had only one or two children (or none). To this number we added the "safety quotient" and arrived at the figure – 5,000. These are the people who probably belong to the Belorussian Alliance in Canada, to the Byelorussian Association in Canada (should be: Byelorussian National Association, R. Z.-H.), to the parish of St. Cyril Turovski (should be: St. Kiryla of Turau, R. Z.-H.), St. Eufrasinia of Polotsk, participate in the Byelorussian Amateurs' Art Society of Winnipeg, etc. The remaining thousands are either members of the Federation of Russian Canadians, of the Polish Alliance, Polish National Union, or do not belong to any ethnic organization at all.

In Canada there is no compulsion to belong to this or that organization or ethnic group. Every person is free to choose where he wishes to belong and what he wishes to be called. There are well over one hundred various religious churches and sects in Canada, and nobody dictates to which one you should belong...

My letter is long, but I thought I had to answer your questions. Our Monograph will be for the use of the departments, but if published, it will be also available to other persons on requst.

Yours sincerely,

(Dr.) V. J. Kaye,
National Liaison Officer."

* * *

«Бэры, 12 красавіка, 1959 г.

Вельмі Паважаны Спадар Доктар:

Я вельмі ўдзячны Вам за інфармацыі, зь якіх відаць выразна, што канадыйскія ўлады робяць усё магчымае,

каб запэўніць кожнай адзінцы свабоднае выяўленьне нацыянальнага паходжаньня й даць магчымасьці ў арганізацыі асабістага й грамадзкага жыцьця. Гэтыя інфармацыі дапамогуць мне ў пераконваньні сваіх суродзічаў аб найлепшых інтэнцыях канадыйскіх уладаў у адносінах да новых імігрантаў.

Я асабіста ведаў аб тым, што канадыйскія ўлады кіруюцца прынцыпамі гуманітарнасьці, дэмакрацыі й свабоды, але некаторыя справы былі для мяне незразумелымі, нарыклад, чаму адны нацыянальнасьці маюць свае рубрукі пры перапісі насельніцтва, а другія ня маюць; чаму ўрадаўцы, што праводзяць перапісь, ня хочуць запісваць беларусаў пад іх нацыянальнасьцяй. Цяпер я разумею, што тэорыя – у гэтым выпадку інструкцыя канадыйскіх уладаў – гэта адна рэч, а практыка – другая рэч. Я далёкі ад таго, каб бачыць у ўрадаўцаў злую волю. Яны проста не запісваюць беларусаў пад іх нацыянальнасьцяй дзеля таго хіба, што для іх такая нацыянальнасьць нязнаная, тым больш, што ў рубрыках нацыянальнасьцяў яе няма. Ня ведаючы-ж што запісаць, як паступіць, яны й зьвяртаюцца да агульнапрынятага ў канадыйскім грамадзтве й прэсе паняцьця нацыянальнасьці – раўназначнага з дзяржаўнай прыналежнасьцяй. Калі-ж і ў гэтым паўстае непаразуменьне, тады яны зьвяртаюцца да акрэсьленьня ў дакумэнтах. І тут то якраз і выходзіць наверх тая нацыянальнасьць, якая была запісана ў дакумэнтах беларуса, калі ён зь ведамых прычынаў прабываў у чужым нацыянальна лягеры ў Нямеччыне. Тая самая гісторыя выходзіць з акрэсьленьнем роднай мовы, якая асоцыюецца з краінай паходжаньня.

Я не дзіўлюся, што энумэрацыйных лістоў зь беларускай нацыянальнасьцяй так мала, бо **кажная запісь беларуса здабыта штурмам** (падкрэсьлена мною, Р. Ж.-Г.). Гэта сказана на аснове практыкі ня толькі маёй, але й усіх беларусаў, якія дамагаліся, каб іх запісалі беларусамі. Я й мая жонка маем шмат прыкладаў з штодзённага жыцьця, спатыкаючыся нават з канадыйскай інтэлігэнцыяй. Пытаюцца аб нацыянальнасьці, краіне паходжаньня. Назоў "Belorussia," "Belorussian," – нічога ім не гаворыць, зараз жа падхопліваюць "Russia," "Russian." А калі ўспомніш, што паходзіш зь Беларусі, што была пад Польшчай, тады падхопліваюць "Poland," "Polish." І трэба добрага тлумачэньня, каб адказаць на пытаньне, хто мы. Ды ўсё-ж калі

зноў спаткаешся з тэй-жа асобай – яна ўсяроўна назаве цябе "Russian" ці "Polish."

Таксама выглядае справа з урадаўцам, які праводзіць перапіс. Так ці іначай вытлумачыць, пераканаць можа інтэлігэнт, які валодае ангельскай мовай. А што зробіць просты чалавек, якому нават пасвойму цяжка вытлумачыць сваю нацыянальнасьць, ці паходжаньне, а тым больш паангельску? Вось тады й выплываюць іншыя назовы, як "White Russia," "Whiteruthenia."

Для акрасьленьня сваёй нацыянальнасьці мы маем толькі адзін назоў – **беларусы.** Справа-ж увядзеньня назову «Крывічы» мае акадэмічны характар і праводзіцца др. Я. Станкевічам з некалькімі асобамі каля яго. Назовы-ж "White Russia," "Whiteruthenia" выступаюць пераважна тады, калі назоў «Беларусь» трэба вытлумачыць паангельску. Звычайна назовы народаў не тлумачацца на чужую мову. Таму ўжываньне паангельску "Belorussia," або "Byelorussia" – каб лягчэй вымаўляць, зусім на мейсцы. Бяда аднак у тым, што самі канадыйцы перакладаюць гэта слова на "White Russia" і надаюць яму зьмест, што й "Russia."

Вы кажаце, Спадар Доктар, што ад 1952 г. ёсьць магчымасьць паправіць запісаную нацыянальнасьць пры атрыманьні канадыйскага грамадзянства. You are perfectly right. Але йзноў паглядзім, як гэта выглядае на практыцы. Кандыдат на атрыманьне канадыйскага грамадзянства спатыкаецца з тэй самай гісторыяй, як і пры перапісу. Судзьдзя, ці ўрадавец звычайна ня ведае, што такое "Belorussia" й зажадае тлумачэньня. Паўторыцца тая самая дыскусія з тэй толькі розьніцай, што тут кандыдат мае вялікую аўдыторыю (звычайна экзамены й працэдура атрыманьня грамадзянства адбываецца групова), ён будзе старацца гаварыць паангельску як найлепш, бо калі сьцьвердзіцца слабое веданьне ангельскай мовы, яму могуць ня даць грамадзянства. З гэтай жа прычыны ён наагул пабаіцца наражацца судзьдзі ці ўрадаўцу, ня вытлумачыць належна, што ён хоча, і такім чынам, тут яго запішуць як папала. Ён нават і праймацца гэтым ня будзе, бо найважнейшае для яго ёсьць атрыманьне грамадзянства, а як ён запісаны, гэта менш важна. Дык і тут добра абаснаванае канадыйскімі ўладамі свабоднае й праўдзівае выяўленьне нацыянальнасьці найчасьцей не асягае мэты.

Так выглядае ў практыцы акрэсьленьне беларускай нацыянальнасьці для тых, якія пры іншых абставінах бы-

лі-б запісаны беларусамі. Я ні ў чым і нікога не хачу тут вінаваціць, я сьцьвярджаю толькі факты з жыцьця. Але беларусаў таксама трудна вінаваціць у гэтым выпадку. А з другога боку крыўдна, што беларусамі папаўняюцца расейская й польская групы і паўстае такая недарэчнасьць, як фігураваньне розных нацыянальнасьцяў пад расейскай рубрыкай. Я разумею, што справа гэта вельмі скамплікаваная. Думаю аднак, што калі-б у рэнумэрацыйных лістох "Belorussian" фігуравала поруч з назвамі іншых нацыянальнасьцяў, то гэта шмат памагло-б як энумэратарам, так і асобам, што падлягаюць перапісу.

Я аж надта дацэньваю той цяжар, тыя труднасьці, якія Вы ўзялі на сябе, Спадар Доктар, калі распачалі апрацоўку манаграфіі аб беларускай іміграцыі ў Канадзе. Я захоплены тымі стараннымі мэтадамі пры правядзеньні Вашай працы, якія Вы апісалі ў сваім апошнім лісьце. Я бачу, што Вы, пры ўсёй скамплікаванасьці справы, хочаце выявіць праўду аб беларусах у Канадзе. Таму тым ахватней я гатоў Вам дапамагчы чым толькі магу. Не разумейце блага маёй крытыкі ў папярэднім лісьце. І мне ходзіць толькі аб выяўленьне праўды.

Мае заўвагі ў выпадку аналізы расейскай групы аказаліся за надта разьбежнымі з Вашымі лічбамі часткова дзеля таго, што я ня меў тых матарыялаў, дадзеных, якія Вы маеце. Бяручы пад увагу Вашы дадзеныя, прыходзіцца зрэдукаваць прыпушчаную мною лічбу 45,000 беларусаў пад расейскай рубрыкай. На колькі? Сапраўды цяжка сказаць. Напэўна сярод пратэстантаў, што акрэсьлілі сябе расейскага паходжаньня, ёсьць якісь працэнт беларускага паходжаньня. Што да беларусаў сярод баптыстаў – дык у гэтай справе, маю надзею, дасьць Вам пэўныя дадзеныя сьвятар а. Я. Гук (ён называе сябе эвангелістам). Ён лічыць сябе беларусам, прыехаў у Канаду дзесь у 20-х гадох і мае зносіны з беларусамі баптыстамі па ўсёй Канадзе.

Вельмі магчыма, што ў ліку 13,323 каталікоў, запісаных расейцамі, ёсьць літоўцы й латышы. Дзіўна аднак, што яны засталіся ў гэтай групе пасьля 20-ці гадовага йснаваньня іх нацыянальных дзяржаваў і паўстаньня іхніх моцных і актыўных арганізацыяў у Канадзе.

Што да працэнтных адносінаў каталікоў і праваслаўных, дык мне ходзіць аб аб'ектыўную ацэну й Заходняй Беларусі. Магчыма, што ў Канаду прыехала адтуль больш каталікоў, як праваслаўных, хоць я ня віджу прычыны,

чаму. Мне хацелася перасьцерагчы ў няслушнасьці Вашага цьверджаньня, што ў Заходняй Беларусі (пад Польшчай) было больш беларусаў каталікоў, як праваслаўных. Я сам каталік, але ў імя аб'ектыўнасьці яшчэ раз мушу сказаць, што такое цьверджаньне далёка ад праўды. Свае цьверджаньні, што беларусы каталікі складаюць 30%-33% у адносінах да праваслаўных беларусаў у Заходняй Беларусі, я апіраю на студыях статыстычных дадзеных польскіх, расейскіх і нямецкіх у Лёндане ў Англіі, дзе я меў пад рукой досыць матарыялаў. Я маю выпіскі з тых часоў, нажаль толькі агульныя, а не па паветах. Аднак я ведаў, што ў Беластоцкім, Бела Падляскім, Сакольскім і Аўгустоўскім паветах пераважаюць каталікі, і гэта бязумоўна мой прамах, што я Вам іх не пералічыў. Гаворачы аб лічбовай перавазе праваслаўных беларусаў над каталікамі нават у Беласточчыне – я меў на ўвеце Гродзенскі, Бельскі й Ваўкавыскі павет. Калі-ж ходзіць аб сьцісьлейшае ўстанаўленьне працэнтных адносінаў паміж беларусамі каталікамі і праваслаўнымі ў гэтых паветах, дык яно залежыць ад інтэрпрэтацыі лічбаў статыстыкі. Калі з агульнай лічбы адкінуць адпаведную частку на палякаў, якіх розныя дасьледчыкі (не палякі) лічаць больш за палавіну, то тады й атрымаем адну трэцюю беларусаў каталікоў і дзьве трэція праваслаўных у адносінах да ўсяе лічбы беларусаў. Інакш кажучы, тады нават у Гродзеншчыне і іншых двух паветах Беласточчыны беларусы каталікі не перавысяць 30%-33% агульнай лічбы беларусаў. Калі-ж зусім выключыць палякаў, як неіснуючых у агульнай лічбе каталікоў, і ўсіх каталікоў уважаць за беларусаў, як гэта робіць Валоціч, то тады Вы будзеце мець рацыю. Але й тады для гэтых трох паветаў працэнтныя адносіны будуць іншыя, як для цэлай Беласточчыны: каталікоў будзе 43.8%. Я не выпадкова аддзяліў гэтыя тры паветы ад тых іншых чатырох, якія маюць значную перавагу каталікоў і якія Сталін, адымаючы некаторыя воласьці з праваслаўнымі, аддаў Польшчы. Я выдзеліў іх пры сваіх разважаньнях і ў папярэднім лісьце да Вас.

Іншыя дасьледчыкі на падставе тэй жа польскай статыстыкі даюць іншы абраз, як Волоціч пры разглядзе нацыянальных і рэлігійных адосін Беласточчыны. Напрыклад немец Энгэльгардт (якога нельга пасудзіць у тэндэнцыйнасьці ў польскі бок), мадыфікуючы да 1939 г. статыстыку польскага перапісу з 1931 году, падае, што ў Беластоцкім

ваяводзтве было: каталікоў 910,000, зь якіх 610,000 палякаў і 300,000 беларусаў; праваслаўных жа 400,000. Ува ўсёй жа Заходняй Беларусі (пад Польшчай) бязь Вільні й тэрыторыі адданай Літве Энгэльгардт падае: усяго насельніцтва ў 1939 годзе 4,600,000; Беларусаў 3,080,000, а палякаў 805,000; каталікоў 2,025,000, а праваслаўных 2,100,000. Далей ён кажа даслоўна: "von rund 3,100,000 Weisruthenen der westhalfe sind rund ein Drittel romisch-katolisch, zwei Drittel orthodox..." (З каля 3,100,000 беларусаў з заходняй палавіны ёсьць каля адной траціны каталікоў і дзьве траціны праваслаўных). (E F. von Engelhardt, Weissruthenien, Berlin, 1943, бачыны 237, 238). Можна не пагадзіцца з Энгэльгардтам у некаторых адносінах, але трэба прызнаць, што яго выснавы вельмі блізкія да праўды.

На маю думку было-б усё-ж рызыкоўным браць некалькі паветаў Беласточчыны (ды яшчэ з інтэрпрэтацыяй Валоціча) для разгляду беларускай іміграцыі ў Канадзе. Гэтыя паветы прадстаўляюць толькі каля аднае пятае тэрыторыі й насельніцтва Заходняй Беларусі. Ці-ж толькі з тых паветаў беларусы эмігравалі ў Канаду – нават у часе між войнамі? Па мояму, з Беласточчыны магло менш эміграваць, бо там было лягчэй знайсьці работу, па колькі там, асабліва ў Беластоцкім павеце, была разьвінутая тэкстыльная й іншая прамысловасьць. Я сам наткнуўся ў Канадзе на людзей зь іншых паветаў Заходняй Беларусі, як Косаўскі павет (шмат), Слонімскі (Аклулевіч, Зіняк), Пружанскі, Пінскі, Лунінецкі, Столінскі, Вялейскі, Маладэчанскі, Дзісьненскі, Нясьвізкі, Баранавіцкі, і інш.

На заканчэньне я Вам шчыра дзякую за Вашы вельмі карысныя сугэстыі. Мушу сьцьвердзіць пры гэтым, што яшчэ тады, калі «Беларускі Эмігрант» выходзіў, адзываліся галасы крытыкі адносна назову. Калі-ж бы Згуртаваньне Беларусаў зноў штось пачало выдаваць, дык сумлеваюся ў тым, што гэта быў бы ізноў «Беларускі Эмігрант». Людзі абжыліся, палюбілі краіну, сталі канадыйцамі, улiваюцца ў канадыйскае жыцьцё. Старыя сваркі й супярэчнасьці трацяць сэнс. Абедзьве арганізацыі, зь якімі я маю сьціслы кантакт, сталі на ногі й маюць добрыя пэрспэктывы. Пра беларускую справу не забываюцца, але на маю думку ў гэтым няма ніякае бяды. Калі вольны сьвет нічога ня робіць для вызваленьня нашых народаў, дык хоць мы мусім нешта рабіць. Іншая рэч, што й мы за мала робім.

Выбачайце за даўгі ліст. Было-б куды прыямней пагутарыць асабіста. Мы з жонкай былі-б вельмі рады, калі-б Вы адведалі нас у Бэры. Будзьце пэўны, што мы гатовы былі-б пасьвяціць не адзін вечар на ваша мілае таварыства.

З глыбокай пашанай

В. Жук-Грышкевіч

П. С. Быў бы Вам вельмі ўдзячны, калі-б можна было атрымаць хоць адзін экзэмпляр Вашай манаграфіі.»

* * *

У лісьце з 9-га красавіка 1959 году Др. Кэйэ піша, зьвяртаючыся як заўсёды: др. Жук., а не Жук-Грышкевіч:

"Dear Dr. Žuk:

I presume you are still studying my long letter in reply to your kind observations on the monograph. I included most of those observations in the corrected draft with the exception of your statements on the numbers which was a controversial subject.

'General Information' on Byelorussia and Byelorussians had to be shortened to conform to other chapters. I am enclosing for your information my own draft of the chapter hoping that you will be able to read it in spite of additions and corrections that I made.

Yours sincerely,

(Dr.) V. J. Kaye,
National Liaison Officer."

* * *

«Бэры, 22 красавіка, 1959.

Вельмі Паважаны й Дарагі Доктар Кэйэ:

Я быў заняты крыху іншымі справамі, таму заўвагі да "Belorussia and Belorussians" высылаю з апазьненьнем, за што прашу выбачыць.

Заўвагі падаю тут у парадку пастаўленых мной лічбаў на Вашым рукапісе.

1. Лічба 1,057.000 падана памылкова, яна ня ёсьць лічбай беларусаў паводле перапісу з 1931 г. Лічбу гэту падае Морнік, як лічбу беларусаў паводле перапісу 1921 г. і кажа, што яна малая на гэты час (1921) ("B.R." No. 3, бачына 9). Лічба-ж беларусаў паводле польскага перапісу 1931 г. выносіць 984,200 (Ibd. бач. 7). Гэта лічба на столькі тэндэнцыйна зьменшаная, што, мне здаецца, яе можна падаць у Вашай манаграфіі толькі з засьцярогай, што гэтай лічбы нельга браць паважна, бо нават польскія дасьледчыкі не бяруць яе паважна, не згаджаюцца зь ёй. Як прыклад можна прывесьці М. Я. Папроцкага, дырэктара «Дэпартамэнту Спраў Народовосьцёвых» у Польшчы перад 1939 г. (Ibd. бач. 8.)

2. "various principalities..." – гэтыя словы нічога не гавораць, не прадстаўляюць фактычнага стану. Ведама, што беларускія плямёны вытварылі тры княствы: Полацкае, Смаленскае і Турава-Пінскае, зь якіх Полацкае было наймагутнейшым, абыймала большыню тэрыторыі Беларусі. Замест "various principalities" я назваў бы гэтыя тры княствы.

3. Пасьля адпору татараў Смаленскам у 1339 г. ім не ўдалося апанаваць тэрыторыі Беларусі. Такім чынам Беларусь не зазнала татарскага ярма, як гэта было з Маскоўшчынай і часткова з Украінай. Гэты факт варта было-б адзначыць, бо зь яго выплываюць надзвычайныя кансэквэнцыі для далейшай гісторыі Беларусі і, між іншага, для большага разьвіцьця й усамастойненьня беларускай культуры. Татары рабілі рабунковыя загоны на беларускія землі, але ніколі ня ўсталілі сваёй тут улады.

4. Беларусь, якая тады называлася Літвой, не магла быць у леннай залежнасьці ад Вялікага Княства Літоўскага, будучы фактычна цэнтрам Вялікага Княства Літоўскага. У леннай залежнасьці ад гэтага цэнтру (калі так можна сказаць) была этнаграфічна літоўская Жмудзь (Самогітія) і ўскараінныя княствы, як Твер і іншыя. Ня можна блытаць сяняшняга назову Літва як этнаграфічнага назову народу літоўцаў з старым назовам Літва, які адносіцца да В.К.Л. Справа ў тым, што сяньняшнія літоўцы ў 13 веку і раней называлі сябе Жмудзьдзю й Аўкштотай (толькі адна воласьць Аўкштоты называлася Літвой), а назоў Літва адносіўся тады да новапаўсталай дзяржавы Вялікага Княства Літоўскага.

В.К.Л. паўстала на этнаграфічнай тэрыторыі Беларусі, з сталіцай у Наваградку. Першыя ведамыя весткі аб ім паходзяць з 1235-38 году. Першы вялікі князь Міндоўг быў тады ўжо даволі моцны. Да ягонага княства належалі паўднёва-заходнія ўдзелы Полацкага княства – Наваградак, Слонім, Зьдзіслаў, Ваўкавыск, Гродна. Гэта было аснаўное ядро, якое пачало пашырацца на рэшту тэрыторыі Беларусі. Дынастыя Полацкіх Усяславічаў была ўжо тады вымершы, таму Міндоўгу лёгка было абсадзіць паасобныя ўдзелы падлеглымі яму князямі. Хутка Полацак, Віцебск, Друцк, Ворша, Рагачоў падлягаюць Міндоўгу. Выглядае так, што Полацкае княства ператварылася ў В.К.Л.. У 1246 г. ужо й Турава-Пінскае княства прызнае зьверхнасьць Міндоўга, рэшта беларускіх земляў увайходзіць у склад В.К.Л.

У 1253 г. Міндоўг, абапіраючыся на беларускія землі, пачынае заваёўваць этнічна літоўскія землі – спачатку Аўкштоту, а пазьней і Жмудзь. Заваяваньне іх трывае доўга, бо гэтыя землі рабілі найвялікшы адпор Вялікаму Княству Літоўскаму. Раз заваяваныя, яны зноў паўстаюць супраць В.К.Л. У вайне са Жмудзьдзю, у 1263 г. Міндоўг быў забіты. Канчальна Жмудзь была далучана да В.К.Л. толькі ў 1411 г. і то з захаваньнем яе аўтаноміі.

Міндоўг быў праўдападобна жмудзкага балцкага паходжаньня, але ён узрос у беларускім асяродзьдзі Наваградка, быў жанаты зь беларускай князёўнай і праўдападобна быў праваслаўным. Яго бацька Рынгольд быў Наваградзкім князем, так што Міндоўг хіба быў зусім асымільваны. У яго дружыне маглі быць і літоўцы, але мясцовы элемэнт напэўна ў ёй пераважаў. Міндоўгу, як і беларускаму асяродзьдзю, хадзіла аб тое, каб замест сварлівых раздробленых удзельных княстваў стварыць моцную дзяржаву, якая-б забясьпечыла лад і парадак ды бараніла ад вонкавых ворагаў, крыжакоў і татараў. Гэтым і тлумачыцца той факт, што беларускія княствы ахвотна, або бяз вялікага супраціву паддаваліся ўладзе Міндоўга.

Як бачна з усяго вышэй сказанага, не літоўскія этнаграфічна землі, а беларускія стварылі В.К.Л., ня літоўцы заваёўвалі беларусаў, а беларусы пасоўваліся на літоўскія землі. Жмудзь жыла яшчэ прымітыўным жыцьцём, былі паганамі, ня мелі арганізаванага дзяржаўнага жыцьця, а беларусы мелі за сабой тры вякі дзяржаўнага жыцьця й хрысьціянскай культуры. Полацкае княства мела ўжо да-

чыненьне з літоўцамі й латышамі, ня раз літоўцы плацілі Полацку дань. Беларусы й літоўцы пранікаліся ўзаемна здаўна, у часе міжсобных удзельных войнаў літоўцы служылі ў дружынах беларускіх князёў, літоўскія князі з дружынамі ня раз былі запрошаны беларускімі ўдзельнымі князямі на дапамогу ў часе ўдзельных войнаў, шматлікія зь іх заставаліся на беларускіх землях. Літоўскія князі й баяры жаніліся з беларускімі князёўнамі й баяркамі й наадварот. Яны прыймалі хрысьціянства й асыміляваліся. У 13 веку мы часта спатыкаем літоўскія імёны на пасадах беларускіх князёў. Калі-ж паўстала В.К.Л., вышэйшыя станы літоўскія й беларускія гаварылі тэй жа беларускай мовай, належалі да тэй жа культуры, да тэй жа дзяржавы й баранілі яе, як найлепшыя патрыёты. Беларускія землі сталі называцца Літвой, беларусы самі сталі зваць сябе паводле дзяржавы літвінамі, і суседзі іх так называлі аж да нядаўных часоў. Тады й мову беларускую называлі літоўскай. З усяго гэтага зразумела, чаму беларуская мова сталася дзяржаўнай мовай В.К.Л. і мовай вышэйшых станаў, чаму беларускае права было скадыфікавана ў Літоўскім Статуце. Такім чынам В.К.Л. было дзяржавай беларускай бальшыні й этнічна літоўскай меншыні.

5. Бяручы пад увагу вышэй паданыя выясьненьні, тут я сказаў бы, што В.К.Л. было дзяржавай беларусаў і жмудзінаў і што тады беларусы называліся літоўцамі. Сказ: "In Lithuania the Byelorussians enjoyed a considerable degree of cultural freedom," я зусім выкінуў-бы.

6. Тут я сказаў-бы: (нечытэльна, Р. Ж.-Г.)

7. Я бы выкінуў "not too numerous," бо ўсё-ж такіх гарадоў было ня мала.

8. Я-б сказаў: "in the end of the sixteenth century..." або 1561.

9. Я-б сказаў: "in Polish-Lithuanian Federal-state."

Вось і ўсе мае заўвагі да Вашага тэксту. Мне здаецца, што ў разглядзе В.К.Л. абмінуты вельмі важныя факты: 1. В.К.Л. было парлямэнтарнай дзяржавай, гарантаваўшай правы й вольнасьці грамадзян у працілежнасьць да абсалютызму Масквы; 2. В.К.Л. шматлікімі ніцямі было зьвязана з Заходняй Эўропай: высылала студэнтаў на ўнівэрсытэты Эўропы, было зьвязана з Рымам, умысловыя плыні Захаду пашыраліся ў В.К.Л. Так у 16-м веку тут разьліўся шырокай хваляй гуманізм і рэнэсанс, а таксама рэфармацыйны рух. Адзін зь беларускіх гуманістаў Франьцішак

Скарына з Полацка пасьля студыяў у Кракаве й Падуі (Італія) пералажыў біблію на беларускую мову й надрукаваў яе ў 1517 годзе ў Празе, у 1525 г. (у 1959 годзе яшчэ ня ведама было, што ў 1522 г., Р. Ж.-Г.) ён залажыў друкарню ў Вільні, у якой надрукаваў пабеларуску лічныя кнігі. Па яго прыкладу паўсталі друкарні ў шматлікіх гарадох Беларусі. Гэтых культурных плыняў ня знала тады Масква, яна адмяжоўвалася ад іх, як ад найгоршага зла.»

(Заканчэньня ліста не захавалася. Р. Ж.-Г.)

* * *

У лісьце з 30-га красавіка 1959 году др. В. Кэйэ піша:

"Dear Dr. Žuk:

Your very kind letter and observations on the Historical Chapter of the draft of the monograph on Byelorussians is before me. I wish to thank you very much for taking so much trouble to assist us in editing the material. I am also indebted to Mr. Victor Ivanoŭski of London, Ontario, for very interesting and valuable material based on interviews with old immigrants.

I already made most of the changes you suggested in your observations and added explanatory notes where it was advisable. The final edition of the monograph will probably shorten some of the chapters in order to conform with monographs on other groups as they should not differ in size from each other.

In discussing Byelorussian problems with various people, I was confronted with such questions as: "Who are those people called 'White Russians'?" or "If they are Russians, why do you trouble to prepare a special monograph on them? How did it originate? Are there also Black Russians?" The monograph should answer these and similar questions. Byelorussians are indeed still an "unknown factor."

I am enclosing the draft of two more chapters for your perusal. If you have some suggestions concerning their contents, please let me know. In the meantime, I am proceeding with the assembly of the monograph because time is pressing.

Sincerely yours,

(Dr.) V. J. Kaye,
National Liaison Officer."

* * *

Таго-ж 30-га красавіка др. В. Кэйэ – В. Кысілевскы – піша да Вінцэнта Жук-Грышкевіча, як зазначае, прыватны ліст паўкраінску:

«Дорогий Пане Докторе!

Десять років ждав я, щоби появилася якась праця на англійській мові про білорусинів – і не діждавшися, взявся сам до складення хоч короткої монографії для вжитку державних чинників. Забрало мені більше як рік збирання скупих матеріялів, роблення дослідів, провірювання статистик і пр. Але – може врешті щось з того вийде.

Рівночасно, як мій час позволить, хочу зладити також розвідку про білорусинів в Канаді для університетського квартальника і попрошу, щоби мені зладили кількандцять відбиток, за які сам заплачу. Також – як час позволить, – хочу зладити для сесії Наукового Товариства Шевченка (на вересень) доповідь про білорусинів, базуючи її на матеріялах, які я зібрав. Чи зможу те все зробити, не знаю, бо в мене мало часу і... коли пишу, то про речі, які англійська преса містить без принуки.

До видання розвідки про білорусинів давно повинна була взятися котрась із білоруських організацій, про білорусинів до нині мало хто знає.

Ваша поміч в виготовлюванню монографії – дуже велика і я радий, що хоч Ви тим зацікавилися. Як буде видана, перешлю Вам копію. Як знаєте, праця є для вжитку уряду і не буде до продажі, вона не буде друком, але мімографом писана.

Щиро Вас вітаю,
Ваш (підпис – Кисілевський)

Шановній Пані Дружині – мій привіт!»

* * *

«Бэры, 13 травеня, 1959.

Вельмі Паважаны й Дарагі Доктар Кэйэ:

З прыемнасьцьцю раблю заўвагі да далейшых 2-х разьдзелаў Вашай манаграфіі. Прыкра мне толькі, што не адказаў на Ваш ліст адразу, а адклаў на некалькі дзён, чым

затрымаў, магчыма, заканчэньне вашай працы. Але я яшчэ раз хацеў упэўніцца што да палітычнага напрамку й дзейнасьці БНА, а таксама сп. Хмары, каб не падаць Вам чагось памылкова. З гэтай мэтай зьезьдзіў у Таронта, скантактаваўся з больш дзейнымі сябрамі БНА і на аснове гутаркі зь імі абапёр паданыя ніжэй заўвагі.

На пытаньне хто такія беларусы? – спадзяюся, Ваша брашура дасьць вычарпальны адказ, і тады асобы, што пазнаёмяцца зь ёй, зразумеюць, што беларусаў, якія маюць сваю асобную мову, гісторыю, культуру ды супярэчныя з расейцамі палітычныя й эканамічныя інтарэсы – ніяк нельга лучыць у адно з апошнімі. Зразумела, што назоў White Russia – падобны да Russia – зьбівае многіх з панталыку. Але назоў гэты, як, да рэчы, і назоў Чорная Русь, што адносіўся да Наваградчыны й Горадзеншчыны, меў калісь толькі геаграфічнае значэньне й ня так даўна прывіўся як палітычны назоў народу, які калісь называўся Крывічы, а пазьней Літва. Гісторыя знае шмат выпадкаў, калі народ мяняў свой назоў, напрыклад французы, фіны, нават расейцы й шмат іншых.

Істотнымі ёсьць тыя факты, што беларусы ад зараньня гісторыі сядзяць кампактнай масай на сваёй тэрыторыі, на працягу вякоў будавалі сваё палітычнае й культурнае жыцьцё, вытварылі свае звычкі й традыцыі ды выдатныя самабытныя культурныя й цывілізацыйныя вартасьці, баранілі ад дзікуноў з усходу ня толькі сябе, але й увесь заходні сьвет і толькі ў канцы 18 стагодзьдзя былі пераможаны сілай маскоўскай навалы.

Назоў народу ёсьць толькі вонкавай праявай, і зьмена яго не мяняе ані характару, ані душы, ані наогул самабытнасьці народу. Расейскія бальшавікі страшэннай ломкай намагаюцца стварыць новую, штучную «савецкую» нацыю, аднак ніяк ня могуць перамагчы самабытнасьці ўсіх нацыянальнасьцяў, што апынуліся ў Савецкай імпэрыі.

Цешуся, што сп. Іваноўскі даслаў Вам вартасны матарыял. Лічу на тое, што дашлюць Вам таксама свой матарыял інж. Жытко з Мантрэалю й эвангеліцкі сьвятар а. Гук з Таронта аб беларускіх бабтыстых. Вельмі баюся, аднак, каб гэтыя матарыялы ня прыйшлі за позна.

Шкада, што Вам трэба будзе скарачаць сваю працу, каб не зрабіць яе большай за стандартовы разьмер для

ўсіх этнічных групаў. Але мне здаецца, што беларусы, на няшчасьце, гэта асаблівы выпадак, аб іх мала хто ведае, або памылкова прадстаўляе з прычыны скамплікаванасьці іх сытуацыі. Таму, каб выясьніць належна гэту сытуацыю, трэба крыху больш напісаць. Калі-ж паскупіцца месцам – на гэтым можа пацярпець эфэктыўнасьць і мэтазгоднасьць самой працы. На маю думку апошняе ёсьць шмат важнейшым, чымся некалькі дадатковых бачын, перавышаючых стандартны разьмер.

Пераходжу да заўвагаў згодна з парадкам лічбаў на Вашым тэксьце.

1) Гэта праўда, што некалькі сяброў ЗБК не прызналі ўраду БНР з інж. Абрамчыкам на чале, а можа пара зь іх прызнавалі БЦР на чале з праф. Астроўскім. Аднак ніхто з ЗБК ня меў нічога супраць іх палітычных перакананьняў і ня гэта было прычынай расколу ў ЗБК у 1952 г. Астроўскі меў мінімальны ўплыў сярод беларусаў у Канадзе і нават перад паўстаньнем ЗБК яшчэ рататарны «Беларускі Эмігрант» стаў на плошчу БНР. БНР-аўскія настроі дамінавалі й ад самога паўстаньня ЗБК. Калі даходзілі новыя сябры, яны ведалі аб гэтым і ўсё-ж ахвотна ўступалі ў сябры гэтай арганізацыі.

Сяргей Хмара ніколі ня быў прыхільнікам Астроўскага й БЦР, ён яшчэ ў Нямеччыне быў БНР-аўцам і да 1952 г. быў сябрам Рады БНР, нават старшынём Сэктару Рады БНР на Канаду, быў у добрых адносінах з Абрамчыкам. Ён увесь час выступаў супраць БЦР і Астроўскага да цяперашняга часу ўключна. Гэта можна сьцьвердзіць неаднаразова на бачынах ягонай газэты «Беларускі Голас». Але ў 1952 годзе Хмара быў выключаны з Рады БНР за дэструкцыйную дзейнасьць. Ад гэтага часу ён праціўнік і БЦР і БНР, тактычна толькі супрацоўнічае з некаторымі прыхільнікамі БЦР у выступленьнях супраць БНР. На гэта ёсьць шмат доказаў і на бачынах «Беларускага Эмігранта», і «Беларускага Голасу», і ў архівах ЗБК й БНА.

Дэструкцыйная работа Хмары палягала на тым, што ён, будучы ўплывовым сябрам ЗБК і старшынём Сэктару Рады БНР на Канаду, выкарыстаў гэта становішча дзеля тварэньня свайго ўласнага напрамку – г. зв. «трэцяй сілы», які-б быў супраць БНР і БЦР і ў кароткім часе згуртаваў каля сябе значную лічбу сяброў ЗБК. Супраць Галоўнай Управы ЗБК і «Беларускага Эмігранта» ён выдаў

свой пашквіль «Пуга» (Біч), у якім абкідаў балотам усіх, хто зь ім не згаджаўся. Рэдактар «Беларускага Эміграната» сп. К. Акула адказаў яму падобным жа пашквілем. З гэтага й пачалася перапалка. У ЗБК узьнік страшэнны разлад. Прэзыдыюм Рады БНР прызваў Хмару да парадку. Калі-ж ён не падпарадкаваўся – яго выключылі з Рады БНР. Тады Хмара, апіраючыся на сваю групу, стараўся захапіць ЗБК і «Беларускага Эміграната». Аднак на агульным сходзе ЗБК ў 1952 г. ён з сваёй групай аказаўся ў мяншыні. Такім чынам захапіць ЗБК не ўдалося й з апанаваньнем «Беларускага Эміграната» таксама нічога ня вышла. Тады ён са сваёй групай выступіў з ЗБК. Залажыў асобную арганізацыю БНА, заснаваў асобную парафію й пачаў выдаваць «Беларускі Голас».

Але зь бегам часу фальш і лаянка надаелі ўсім, нават ягоным прыхільнікам. І сапраўды, у сваім «Беларускім Голасе» Хмара чэрніць усе беларускія арганізацыі за выняткам тых адпаўшых ад розных арганізацыяў адзінак і групак, якія зь ім супрацоўнічаюць. Людзі, нават калішнія найбліжэйшыя яго супрацоўнікі, зразумелі, што сваёй дзейнасьцяй і пісанінай Хмара шкодзіць усяму беларускаму руху, кампрамітуе імя беларуса.

Другая прычына ўтраты ўплываў сярод сваей групы: Калі ЗБК і Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне пачалі ладзіць што два гады зьезды Беларусаў Паўночнае Амэрыкі – Хмара падшываўся пад вызначаныя імі мейсцы й час і рабіў псэўда-зьезды, заяўляючы, што толькі яго зьезды праўдзівыя, а што тыя іншыя падшываюцца пад яго ініцыятыву. Гэта ўнясло замяшаньне й абурэньне сярод нашых людзей. Раз такое ашуканства прайшло яму. Але пасьля другога такога псэўда-зьезду у 1958 г. людзі ягонай групы страшэнна абурыліся, у іх загаварыла сумленьне. «Досыць маны й ашуканства!» – закрычалі яны й сталі адмяжоўвацца ад Хмары й ягонага «Беларускага Голасу». Калі-ж Хмара ня спыніў сваей дэструктыўнай дзейнасьці й зласьлівай пісаніны ў «Бел. Голасе» – Управа БНА на сваім паседжаньні 27. І. 1959 г. завесіла яго ў сяброўстве БНА і выпусьціла спэцыяльнае асьведчаньне, у якім выявіла адмежаваньне БНА ад Хмары й «Беларускага Голасу» ды нэгатыўнае адношаньне да яго.

Вось прабег некалькігадовай калатні сярод беларусаў у Канадзе, якія многія называюць хмараўшчынай. Калі-б ня было Хмары, калі-б ён не распачаў фармаваньня сваёй

групоўкі зь нейкай туманнай ідэялёгіяй і выразнай лаянкай – сярод беларусаў у Канадзе ня было-б такой калатні, праўдападобна ў ЗБК не дайшло-б да расколу і да ўтварэньня дзьвюх парафіяў.

Розьніца палітычных паглядаў магла-б спрычыніцца да спрэчак і дыскусіяў, але не давяла-б да такой вострай грызьні й расколу.

Цяпер, калі Хмара апынуўся збоку, зьнікае нянавісьць і заўзятасьць паміж ЗБК і БНА. Людзі спатыкаюцца між сабой, дыскутуюць. Часамі могуць дагаварыцца да супольных імпрэзаў, а часам ім гэта не ўдаецца, але дзеля гэтага адносіны ня горшаюць, наадварот, абедзьве стараны канстатуюць пазьней, што супольная імпрэза была-б лепшай і карысьнейшай. Такія настроі ёсьць зарукай, што пакрысе дойдзе да разумнага й сталага супрацоўніцтва паміж абедзьвюма арганізацыямі – ЗБК і БНА.

Як бачыце, не падтрымоўваньне ЗБК беларускага эгзыльнага ўраду БНР было прычынай расколу ў ЗБК у 1952 г., а прычынай гэтага была дзейнасьць Хмары, які намагаўся арганізаваць свой палітычны напрамак, гэтак званую «трэцюю сілу», стварыў сваю групу ў ЗБК і хацеў захапіць гэту арганізацыю й газэту «Беларускі Эмігрант».

Цікава, чаму Хмара згуляў такую няўдзячную ролю сярод беларусаў у Канадзе? Адны кажуць, што кіравала ім хворая амбіцыя стацца важным палітычным лідэрам, другія – што ён сьведама праводзіць дэструкцыйную работу сярод беларусаў у Канадзе па загаду камуністаў. Я-ж думаю – ні адно, ні другое, на маю думку, Хмара – гэта чалавек нясталага, крыху авантурнічага характару, прыпсутага камуністычным узгадаваньнем ды без сыстэматычнае адукацыі. Адсюль і вынікае яго нарваная, авантурная дзейнасьць.

2) Ані Хмара, ані яго група ці БНА ніколі не задэкляравалі сябе прыхільнікамі БЦР і Астроўскага (у БНА быў адзін прыхільнік і прадстаўнік БЦР, але апошнімі часамі ён расчараваўся ў БЦР і адыйшоў ад яго). Наадварот, як сказана вышэй, яны стараліся стварыць свой напрамак «трэцюю сілу» з усіх тых, што былі ў апазыцыі да ўраду БНР на чале з Абрамчыкам. Іншая рэч, што яны вастрэй выступалі супраць ураду БНР, як найважнейшага й сільнейшага палітычнага напрамку і можа слабей супраць БЦР Астроўскага, як слабейшага напрамку.

3) На маю думку, гэта ўнутраная барацьба сярод беларусаў у Канадзе ня была безсэнсоўнай, бо гэта была барацьба арганізацыйнай інтэгральнасьці супраць дэзінтэгруючай раскладовай дзейнасьці сп. Хмары. Падобныя крызысы можна спасьцерагчы ў кожным арганізацыйным грамадзтве. Мэтады гэтай барацьбы былі часта няпрыгожымі й завострымі, але ў цэлым гэта хвараблівае зьявішча мела й дадатнія вынікі: людзі шмат перажылі, перадумалі, але затое шмат чаго навучыліся, сталіся больш выраблёнымі, сталейшымі. Маю надзею, што гэта пойдзе на карысьць. Пры гэтым трэба сьцьвердзіць, што, незалежна ад гэтай барацьбы, справы ўладжаньня ў Канадзе як індывідуальна, так і арганізацыйна зусім не занядбоўваліся. Амаль усе сталіся канадыйскімі грамадзянамі, сталі на ногі матарыяльна й паставілі на ногі свае арганізацыі царкоўныя й сьвецкія. Уключыліся ў канадыйскае жыцьцё й працу. А што гэтыя людзі дбаюць аб сваю бацькаўшчыну пад бальшавіцкім ярмом – дык з пункту гледжаньня людзкога гэта зьявішча трэба трактаваць толькі пазытыўна. Гэта значa, што гэтыя людзі захавалі людзкія пачуцьці й сумленьне; нават у свабодзе й дабрабыце Канады не забыліся аб зьдзеку над чалавекам, аб цярпеньнях іх братоў і сёстраў у бальшавіцкай няволі. Калі гэтых людзей праф. Вэрнант называе гарэзьліва “militant refugee type” дык вельмі сумна. Я думаю, што праф. Вэрнант загаварыў бы іншай мовай, калі-б яго бацькаўшчына апынулася пад бальшавіцкім ярмом. На вялікі жаль, эгаізм, матэр’ялізм, ды індэфэрантызм Захаду да цярпеньняў мільёнаў людзей, да барацьбы паняволеных народаў за свае правы якраз і спрычыніліся да калясальнага ўзросту магутнасьці бальшавікоў, да таго, што сягоньня цэлы сьвет дрыжыць ад страху перад іх сілай. Калі справа пойдзе так далей, бальшавікі апануюць і рэшту сьвету. Цікава, што тады скажа праф. Вэрнант? На маю думку ня варта было-б зьмяшчаць цытаты праф. Вэрнанта.

4) У імя праўды трэба было-б сказаць: The dissidents were opposed to Abramchyk and decided to organize their own political movement so called “The Third Force.”

5) У імя праўды трэба было-б сказаць: Газэта гэта была на ўслугах імкненьняў сп. Хмары стварыць новы палітычны напрамак, гэтак званую «трэцюю сілу», незалежную ад эміграцыйнага ўраду БНР з Абрамчыкам на чале і БЦР Астроўскага.

6) Сказанае тут ня згодна з фактычным станам. Незалежны Беларускі Выдавецкі Фонд быў прыбудоўкай БНА. У 1958 г. БНА канчальна сарвала ўсякую сувязь з газэтай «Беларускі Голас», якую фактычна выдаваў і рэдагаваў сп. Хмара і ня склікаў рэдкалегіі. Апошняя была толькі шыльдай. Пазбаўлены гэтай шыльды, Хмара выдумаў новую шыльду, фікцыйную – г. зв. Фэдэрацыю Вольных Беларускіх Журналістаў. (Доказы: глядзі «Бюлетэнь БНА Нр. 1, азнакі 7 і 7, на бач. 2 і 4). Пад гэтай шыльдай ён і надалей выдае «Беларускі Голас» на сваю руку. Ніякай зьмены ў «рэдкалегіі» не адбылося. Гэта «рэдкалегія» была фікцыяй а рэдагаваў і выдаваў гэту газэту ўвесь час Хмара. Так яно йдзе і далей. Зьмена адбылася толькі ў тым, што БНА парвала фармальную сувязь з гэтай газэтай і заняла нэгатыўнае адношаньне да яе. Іншая рэч – скуль Хмара бярэ сродкі на выдаваньне сваёй газэты? Гэта ўжо сакрэт самога рэдактара.

7) Зьмешчаная тут цытата адносіцца да агульнага сходу БНА 5 кастрычніка 1958 г. Тады Хмара ня быў яшчэ выключаны з БНА, а толькі адсунуты ад кіруючых органаў БНА і пазбаўлены ўплываў. Але адзін з праціўнікаў Хмары, сябра управы БНА, такі самы ветрагон, як і Хмара, выкарыстаў проціхмараўскія настроі ў БНА і выпусьціў у сьвет абежнік, у якім паведамляў аб выключэньні Хмары з БНА. Тады Хмара напісаў самавольна зацытаванае асьведчаньне, подступам здабыў подпісы трох сяброў Наглядной Рады БНА і апублікаваў гэтае асьведчаньне ў сваім «Беларускім Голасе». Асьведчаньне гэтае, як і іншыя фальшыўкі ў «Бел. Голасе», выклікалі абурэньне ў БНА і спрычыніліся да таго, што ўправа БНА на сваім паседжаньні 27. I. 1959 г. завесіла Хмару ў сяброўстве БНА і выдала спэцыяльнае асьведчаньне, у якім выявіла нэгатыўнае адношаньне БНА да Хмары, яго дзейнасьці і яго газэты «Беларускі Голас» (Глядзі Ibidem, азнака 7 на 1 стр. і 7 на 4 стр.). Дзеля ўсяго тут сказанага радзіў бы Вам выкінуць гэту цытату, тым больш, што зьмест яе ўжо не актуальны. Актуальным і аўтэнтычным зьяўляецца пастанова ўравы БНА аб завешаньні Хмары ў сяброўстве з дня 27. I. 1959 г., і асьведчаньне ўправы БНА (Глядзі Ibidem).

Вось і ўсе мае заўвагі й паясьненьні. Выбачайце за даўгую пісаніну, але ўсе гэтыя справы трэба было выясьніць. Калі яшчэ штось Вам будзе патрэбна, зь вялікай

прыемнасьцьцяй буду служыць. А пакуль што жадаю Вам усяго найлепшага.

З глыбокай пашанай.

В. Жук-Грышкевіч

Залучнік: Бюлетэнь БНА нр. 1.»

* * *

«(Прыватна)
Бэры, 14 траўня, 1959.

Вельмі Паважаны й Дарагі Спадар Доктар:

Я зусім з Вамі згодзен, што кніжка аб беларусах на ангельскай мове ёсьць проста крытычнай патрэбай. Таму цешуся з таго, што Вы ўзяліся за апрацаваньне манаграфіі аб беларусах у Канадзе хоць бы толькі для ўжытку ўрадавых дзейнікаў. Праца Ваша яшчэ пабольшыць сваё значэньне, калі Вы выканаеце свае пляны ў лекцыях на ўнівэрсытэце і ў навуковым таварыстве ім. Шаўчэнкі.

Прызнаюся Вам шчыра, што я распачаў апрацоўваць кніжку аб беларусах яшчэ перад выяздам у Нямеччыну. Я хацеў яе выдаць пабеларуску й паангельску. Выезд у Нямеччыну перарваў гэту работу. Пасьля павароту ў Канаду я быў занадта заняты іншымі справамі. Да таго кніжку гэту я заплянаваў крыху шырэй. Цяпер напатыкаю перашкоды з патрэбнымі мне матар'ямі, якіх у Канадзе зусім няма. Ходзіць мне перадусім пра гістарычную частку. Некаторыя дадзеныя сабраныя мной раней аказаліся застарэлымі і вымагаюць паправак, аднаўленьня. Трэба было-б зьезьдзіць у ЗША, а мо' і ў Эўропу. Справа зацягнулася. Аднак, калі Бог дасьць здароў'е й сілы, маю надзею плян свой зрэалізаваць. Калі? Цяжка адказаць на гэта пытаньне.

Буду Вам удзячны за абяцаную копію Вашай манаграфіі.

Прывітаньні ад мяне й маёй жонкі Вам і Вашай Спадарыні.

З глыбокай пашанай,

В. Жук-Грышкевіч»

28 траўня 1959 году др. Кэйэ піша да В. Жук-Грышкевіча:

"Dear Dr. Žuk:

I studied most attentively your last letter and found the bulletin of "B.N.A." most interesting. I shall make corrections in the manuscript where necessary.

Your letter does not answer the question – why did a number of members of the Byelorussian Alliance leave the organization in 1952 and form the Association? What was the real issue? I understand that the issue was the difference of opinion on the recognition of the Government-in-Exile or the Counsil as legal representatives of Byelorussians abroad. You say that it was a personal difference between Chmara and other members of the Alliance. The newspaper "The Fatherland" of December 14, 1959, writes "Anti-democratic elements headed by Serhey Chmara using bolshevik methods, etc.etc. tried to dominate B.A.C.... the totalitarian anti-national and anti-democratic group having been unable to win the leadership of B.A.C. left the convention and formed its own organization, the so-called Byelorussian National Association."

This would indicate that the Association was formed by Chmara and his followers and that later he was dropped from leadership and membership because of his dictatorial ambitions. Am I right?

Yours sincerely,

(Dr.) V. J. Kaye
National Liaison Officer."

* * *

«Бэры, 4 чэрвеня, 1959.

Вельмі Паважаны й Дарагі Доктар Кэйэ:

У сваім апошнім лісьце Вы маеце поўную рацыю, калі кажаце, што БНА было заснавана Хмарам, але пазьней ён быў адкінуты сваімі прыхільнікамі й завешаны ў сяброўстве БНА за дыктатарскія амбіцыі. Да гэтага трэба было-б дадаць: за лаянку й ачэрніваньне ў сваім «Беларускім Голасе» ўсіх беларускіх арганізацыяў і людзей, якія нязгод-

ны былі з ім і яго г. зв. «трэцяй сілай»; за ашуканства і наагул неперабіраньне ў сродках пры змаганьні са сваімі палітычнымі працiўнікамі.

Да расколу ў ЗБК у 1952 годзе і паўстаньня БНА й другой праваслаўнай парафіі спрычыніўся Хмара, які хацеў стварыць новую палітычную групу г. зв. «трэцюю сілу» і падпарадкаваць сабе беларускае жыцьцё ў Канадзе. Нагаворамі, дэмагогіяй і інтрыгамі ён пасеяў разлад сярод сяброў ЗБК і згуртаваў каля сябе групу нявырабленых палітычна людзей. Апіраючыся на гэту групу, ён хацеў захапіць ЗБК і газэту. У 1952 годзе яго група аказалася ў меншыні й ёй нічога не аставалася, як выступіць з ЗБК. Тады Хмара залажыў БНА, новую праваслаўную парафію й газэту «Беларускі Голас».

Сваю работу Хмара пачаў праводзіць і ў ЗША, стараючыся абяднаць каля сваёй «трэцай сілы» тых беларусаў, што былі ў апазыцыі да БНР і БЦР. Аднак вынікі гэтай работы кончыліся такім самым фіяскам, як і ў Канадзе. І ў ЗША людзі пераканаліся, што работа Хмары ёсьць дэструкцыйнай і шкоднай і адвярнуліся ад яго, як і ў Канадзе.

Ствараючы новы напрамак «трэцюю сілу» – Хмара не патрапіў акрэсьліць выразнай мэты й ідэялягічнага напрамку. Ён кідаў дэмагагічныя клічы, сеяў нянавісьць да ўсіх беларускіх арганізацыяў і людзей за тое, што яны зь ім не згаджаліся, але ня здолеў даць нічога пазытыўнага. Таму яго дзейнасьць пасьля кароткага эфэкту кончылася фіяскам.

Зацытаваную Вамі зацемку з «Бацькаўшчыны» з 14 сьнежня 1959 г. можна прызнаць у аснаўным за слушную, але ўсе эпітэты ў ёй трэба аднесьці толькі да Хмары, які ведаў чаго хацеў і быў аўтарам цэлай дывэрсыі. Гэтых эпітэтаў ніяк нельга аднесьці да цэлай групы людзей, аб якой гаворыць зацемка, бо гэтыя людзі былі палітычна нявырабленымі й сталіся ахвярай дэмагагічнай дзейнасьці гэтага авантурніка.

Спадзяюся, што вышэй сказанае дастаткова выясьніць пытаньні, закранутыя ў Вашым лісьце.

З глыбокай пашанай,

В. Жук-Грышкевіч»

* * *

CANADA
DEPARTMENT of CITIZENSHIP and IMMIGRATION

Ottawa, June 15, 1959

Dr. V. Žuk
54 Mary Street
Barrie, Ont.

Dear Dr. Žuk:

The abbreviated and several times revised and corrected draft on the study on Byelorussians in Canada for the Ottawa University review is almost ready and when it appears in print, probably in October, I shall send you a copy.

The monograph for departmental use is being studied now and when approved it will be mimeographed for departmental use.

To round out the material on the Byelorussians I am adding also a brief history of the Byelorussian governments-in-exile. I found material on Rada (the Council) in the Byelorussian Review Vol. I, but there is only scant mention about the government-in-exile headed by M. Abramchyk. Could you supplement the information which is lacking? When in December 1918 Soviet forces entered the capital the government escaped first to Lithuania and then moved to Czechoslovakia, what happened afterwards? Where did they reside during the war and who was heading the government? Who are the members of the cabinet now? If you could give me some more information, I would be very grateful indeed.

Yours sincerely,

(Dr.) V. J. Kaye,
National Liaison Officer.

* * *

«Бэры, 4 ліпеня, 1959 г.

Вельмі Паважаны й Дарагі Доктар,

Даруйце за такі спозьнены адказ на Ваш ліст. Я хацеў даць вычарпальны адказ на Вашы пытаньні, але ня быў пэўны ў некаторых справах і зьвярнуўся па рэфэрэнцыі

да сваіх сяброў у Эўропе й ЗША. Нажаль адказы на мае лісты зацягнуліся. Але сёньня атрымаў усё, што мне было патрэбна, закочыў сваю для Вас інфармацыю аб Радзе й урадзе БНР і зараз жа высылаю.

Буду Вам вельмі ўдзячны за абяцаныя копіі Вашых працаў. Здымка запраўды вельмі важная й цікавая. Каліб можна было зрабіць копію, я хацеў бы мець яе. Здымку далучаю да гэтага ліста.

18-га гэтага месяца мы выяжджаем з жонкай на два тыдні на адпачынак у ваколіцы Нордз Бэй. Думаю, што й Вы выедзеце дзесь на адпачынак на самы гарачы час. Жадаю Вам усяго найлепшага.

З глыбокай пашанай

В. Жук-Грышкевіч»

* * *

Да свайго ліста з 4-га ліпеня В. Жук-Грышкевіч далучае наступнага зьместу матар'ял:

«Да гісторыі Рады й Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР)

Першы Ўсебеларускі Кангрэс, які быў скліканы ў канцы сьнежня 1917 году, быў разагнаны бальшавіцкай мілітарнай сілай і дзеля гэтага ня мог закончыць сваёй працы. Затое Кангрэс выбраў з сваёй агульнай масы каля двох тысяч дэлегатаў (2,000) Раду ў ліку 71 радных, якой пераказаў усе свае паўнамоцтвы ў тым ліку зрэалізаваньне незалежнасьці Беларусі й скліканьне Устаноўчага сойму. Рада гэта сталася Радай Беларускай Народнай Рэспублікі, а яе выканаўчы орган Урадам БНР.

І на эміграцыі Рада БНР – гэта зьменшаны часовы парлямэнт – адыгрывае галоўную ролю. Рада мае паўнамоцтвы 1-га Усебеларускага Кангрэсу, яна вызначае з свайго складу выканаўчы орган – Урад БНР. У першых гадох эміграцыі Рада складаецца часткова з радных выбраных на Усебеларускім Кангрэсе, часткова папаўняецца прадстаўнікамі эміграцыйных беларускіх арганізацыяў. Зразумелая рэч, што зь бегам часу лік эміграцыйных прадстаўнікоў усё больш і больш пераважае.

Пасьля абвешчаньня незалежнасьці Беларусі 25 сакавіка 1918 году – наступныя краіны прызналі Ўрад БНР de jure ci de facto і акрэдытавалі беларускія дыпляматычныя місіі й кансуляты:

Літва – de jure, дыпляматычная місія й кансулят у Каўнас;

Латвія – de jure, дыпляматычная й вайсковая місія, і кансулят у Рызе;

Естонія – de jure, дыпляматычная місія з Рыгі, пашпартны аддзел у Рэвелі;

Фінляндыя – de jure, дыпляматычная місія;

Украіна – de jure, дыпляматычная місія, кансулят і тарговая палата ў Кіеве;

Чэхаславаччына – de jure, дыпляматычная місія й кансулят у Празе;

Грузія – de jure, дыпляматычная місія;

Нямеччына – de jure, дыпляматычная місія й кансуляты ў Бэрліне й Данцыгу;

Данія – de facto, кансулят у Капэнгазе;

Турэччына – de facto, кансулят у Істамбуле;

Баўгарыя – консульская агенцыя;

Югаславія – консульская агенцыя;

Францыя – прызнаньня ня было яшчэ, але быў заключаны дагавор на эксплюатацыю беларускіх лясоў;

Швайцарыя – прызнаньня яшчэ ня было, але быў заключаны агульны гандлёвы дагавор.

У 1922 годзе Прэзыдыюм Рады й Урад БНР пераехалі з Каўнас у Прагу. Чэхаславацкі Урад прызнаваў Урад БНР de jure аж да часу прызнаньня чэхаславацкім урадам Савецкага Саюзу ў 1928 годзе. Пад націскам Масквы Чэхаславацкі ўрад спыніў дзеяньне Беларускай Дыпляматычнай Місіі ды Кансуляту. Урад БНР застаўся ў Празе ў аналягічным палажэньні, як польскі эгзыльны ўрад Залескага ў Лёндане пасьля прызнаньня Англіяй польскага варшаўскага (народнага) ураду ў 1945 г. Аднак прэзыдэнт Масарык аказаў неафіцыйна ўсю магчымую маральную й матар'яльную помач Прэзыдэнту Рады БНР Пётру Крэчэўскаму й ураду Васіля Захаркі, які ачольваў урад БНР ад 1925 году. Пасьля дэмісыі Масарыка і заняцьця пасаду прэзыдэнта Бэнэшам – палажэньне ураду БНР значна пагоршылася (усякая матар'яльная помач была спынена), аднак урад БНР прадаўжаў сваю дзейнасьць.

У сакавіку 1928 г. памёр Прэзыдэнт Рады БНР Пётра Крэчэўскі (пахаваны ў Празе) і яго мейсца заняў Васіль Захарка – як выбраны яшчэ ў Беларусі віцэ-Прэзыдэнт.

Другая Сусьветная Вайна. Пасьля заняцьця Гітлерам Прагі – немцы не чапалі ўраду БНР Захаркі.

На пярэдадні Нямецка-Савецкай вайны (за 2 тыдні перад атакай Саветаў) да Прэзыдэнта Захаркі зьявіўся прадстаўнік Гітлера фон Гэнкэ – былы міністар нямецкага пасольства ў Празе – з наступнай прапановай: на выпадак вайны між Нямеччынай і Савецкім Саюзам Урад БНР уступае ў саюз зь Нямеччынай. Прэзыдэнт Захарка згаджаўся на гэту прапанову, але пад такой умовай: 1. На тэрыторыі Беларусі – пасьля заняцьця яе немцамі – будзе рэстаўравана Беларуская Народная Рэспубліка, як незалежная й сувэрэнная дзяржава; 2. у часе ваеннага пэрыяду нямецкая армія будзе шанаваць гэту незалежнасьць і сувэрэннасьць і ня будзе ўмешвацца ў ніякім выпадку ва ўнутраныя справы БНР; 3. пасьля заканчэньня вайны нямецкая армія зараз-жа выйдзе з тэрыторыі Беларусі. Спадар фон Гэнкэ абяцаў хутка даць адказ прэзыдэнту Захарку, але хутка вайна выбухла й ніякага адказу не наступіла.

Пасьля акупацыі Беларусі немцы ніколі да ўраду Захаркі не зьвярталіся, а пачалі шукаць і вэрбаваць сабе супрацоўнікаў на Беларусі ў індывідуальным парадку. Самому Захарку быў выезд з Прагі забаронены.

Калі частка Беларусі – Беласточчына – была далучана беспасрэдна да Райху, Захарка выслаў Гітлеру рашучы пратэст супраць гэтага. Адначасна ён пачаў арганізаваць супрацыў немцам сярод беларускае калёніі ў Нямеччыне, якая лічыла да 100,000 асобаў і складалася галоўным чынам з былых палонных з польскае арміі, а часткова з дэпартаваных зь Беларусі работнікаў. Супрацыў немцам пачаў пашырацца й на Беларусі.

У 1942 г. Захарка захварэў на тубэркулёз лёгкіх. Распачатую арганізацыю супрацівы немцам пераняў тады інж. Мікола Абрамчык (Абрамчык ад 1923 году быў у сталай сутычнасьці й супрацоўніцтве з урадам БНР у Празе – спачатку будучы студэнтам у Чэхаславаччыне, а пазьней як эмігрант пражываючы ў Францыі, бо польскія ўлады забаранілі яму паварот у Заходнюю Беларусь, скуль ён паходзіў). У 1942 г. Абрамчык пераяжджае з Парыжа ў Прагу.

6 сакавіка 1943 г. Захарка перадае паўнамоцтвы прэзыдэнта Рады БНР інж. Абрамчыку, не задоўга пасьля чаго й памірае.

У кастрычніку 1943 г. прэз. Абрамчык прабіраецца на Беларусь і навязвае кантакты з мясцовымі беларускімі дзеячамі й павадырамі беларускага супраціву немцам. Ён прадстаўляе ім паўнамоцтвы – тэстамэнт Захаркі. Але 10 лістапада 1943 г. Гэстапо арыштоўвае Абрамчыка й вывозіць яго ў Парыж.

Пасьля капітуляцыі Нямеччыны ў 1945 г. Абрамчык зьяўляецца ў гушчы беларускай масавай эміграцыі, што пакінула бацькаўшчыну пад націскам бальшавікоў. Ён склікае сход беларускіх грамадзкіх і палітычных дзеячоў ды беларускага актыву наагул. Сход гэты прыймае да ведама паўнамоцтвы – тэстамэнт Захаркі, зь якога вынікае прэзыдэнцтва Абрамчыка ў Радзе БНР. На гэтым жа сходзе папаўняецца Рада БНР ды выбіраецца выканаўчы орган яе – Урад БНР.

Ад гэтага часу Рада БНР што году праводзіла свае сэсіі.

Амаль да канца 1949 году цэнтральныя органы ўраду БНР і ўрад знаходзіліся ў Мюнхэне – у Нямеччыне. Пазьней, у сувязі з перасяленьнем беларускай эміграцыі ў іншыя краіны, рассыпаліся й сябры Рады БНР. Дзеля таго аднак, што абсалютная бальшыня іх апынулася ў ЗША – за сталую сядзібу прэзыдыюму Рады БНР і ўраду быў выбраны Нью Ёрк. Там жа адбываюцца й сэсіі Рады БНР. Цяпер рассяленьне сяброў Рады БНР прадстаўляецца наступна:

1. ЗША –	знаходзіцца	сябраоў	Рады	БНР	90
2. Англія	“	“	“	“	7
3. Аўстралія	“	“	“	“	8
4. Нямеччына	“	“	“	“	7
5. Канада	“	“	“	“	7
6. Францыя	“	“	“	“	3
7. Аргэнтына	“	“	“	“	2
8. Бельгія	“	“	“	“	2
9. Швэцыя	“	“	“	“	1
Разам					127 сяброў

Да 1957 г. Сэсіі Рады БНР склікаліся што год і трывалі яны 1-2 месяцы. Ад 1957 г. сэсіі склікаліся што два гады.

Органамі Рады БНР зьяўляюцца: Прэзыдыюм Рады БНР, на чале якога стаіць прэзыдэнт Рады, які адначасна зьяўляецца й старшынём ураду БНР, ці прэм'ерам; выканаўчым органам Рады БНР – ці ўрадам ёсьць сакратарыят Рады. Сакратарыят Рады (Урад БНР) на сяньня прадстаўляецца наступна:

1. Старшыня, як прэзыдэнт Рады – інж. Мікола Абрамчык. Пражывае часова ў Францыі (154 Rue des Hortensias, Villepinte [Seine et Oise] France, але што год прыяжджае на некалькі месяцаў у Нью Ёрк);

2. першы заступнік старшыні сп. Аляксандар Стагановіч, былы пасол беларускі ў польскі сойм (Нью Ёрк);

3. праф. Антон Адамовіч – другі заступнік старшыні (Нью Ёрк);

4. Сакратар Рады БНР – Натальля Арсеньнева-Кушаль (385 Alabama Ave., Brooklyn, N.Y. Гэта адрас Сакратарыяту);

5. Сакратар вонкавых спраў – прэз. Абрамчык;

6. Сакратар нутраных спраў – К. Мерляк;

7. Сакратар Фінансаў – Віталі Кажан;

8. Сакратар Інфармацыі – А. Шукелойць;

9. Рэфэрэнт вайсковых спраў – генэрал Франьціш Кушаль;

10. Рэфэрэнт вайсковых спраў – Б. Данілюк.

Апрача таго маецца 8 паасобных рэсортаў, як асьветны, эканомікі, сельскай гаспадаркі, прамысловасьці, прэсы, школьніцтва й эміграцыі, польска-беларускіх дачыненьняў і інш.

Каля 80 беларускіх грамадзкіх эмігранцкіх арганізацыяў у розных краінах падтрымоўваюць Раду й Урад БНР. Рада БНР дыспануе каля 10 пэрыядычнымі выданьнямі й супрацоўнічае з 3-мя радыёстанцыямі: Радыё «Вызваленьне», Гішпанскае нацыянальнае Радыё і Радыё Ватыкану.

Радныя БНР у паасобных краінах твораць мясцовыя сэктары Рады БНР, падпарадкаваныя Прэзыдыюму Рады.»

* * *

У сваім лісьце з 19-га жніўня 1959 году др. В. Кэйэ дзякуе д-ру В. Жук-Грышкевічу за "additional valuable information material on the Belorussian Government-in-exile," а ў прыватным лісьце з таго-ж дня паведамляе: "The UNI-

VERSITY informed me that my paper on CANADIANS OF BYELORUSSIAN ORIGIN will be printed probably in the January number of the REVUE DE L'UNIVERSITE D'OTTAWA. The paper had to be reduced to 14 pages type in order to conform to other articles of the Review."

* * *

«Бэры, 16 верасьня, 1959.

Вельмі Паважаны й Дарагі Спадар Доктар!

Вашы лісты з 19-га жніўня й 10-га верасьня атрымаў, дзякую. Выбачце, што так доўга не адказваў на Ваш ліст з 19-га жніўня. Часткова мая віна, я зразумеў, што ў лісьце нічога пільнага няма. Тым часам мы з жонкай выехалі зноў на поўнач (ёй страшэнна дакучала гэй фівэр) і вярнуліся 11-га верасьня. Цяпер усё пайшло нармальным бегам і я ўзяўся за заладжваньне залеглых спраў.

Вельмі ўдзячны Вам за копію артыкулу. Я яго прачытаў з прыемнасьцьцю. Хоць я не ўва ўсім зь ім згодны – уважаю аднак, што артыкул вельмі вартасны й карысны. Таму адбітку трэба зрабіць абавязкава, прынамся 100 экзэмпляраў. Я пэўны, што шмат хто зь беларусаў захоча мець гэту адбітку. Шкада, што гэта скарочаны тэкст вашай працы. Ці няма якогась спосабу, каб пусьціць у сьвет поўны, хоць можа й змодыфікаваны тэкст вашай манаграфіі? Поўны тэкст меў бы куды большы эфэкт, а з другога боку шкада, каб ужыткоўнасьць яго абмежавалася толькі сьценамі Дэпартамэнту оф Сітызэншып.

Выбачайце маю наважанасьць, але я чуюся змушаным і да Вашага скарочанага артыкулу зрабіць наступныя рэчовыя заўвагі:

1. Бачына 2 – Вы кажаце, што тэрыторыю Беларусі засялялі пяць славянскіх плямён, а называеце толькі чатыры: Крывічы, Дрэговічы, Вяцічы й Северане. Пятае племя Радзімічы – якімсь чынам выпала. Варта гэту памылку паправіць у друку.

2. Бачына 3 – у тэксьце Sigismunt II – варта было-б падаць поўнае імя: Sigismunt II Auhust, так як падаюць усе гісторыкі.

3. Бачына 11 – з тэксту вынікае, што «Беларускі Голас» надалей зьяўляецца ворганам Б.Н.А. Тымчасам у сва-

іх камунікатах Б.Н.А. неаднаразова заявіла, што ня мае нічога супольнага з «Беларускім Голасам», што газэта гэта выдаецца й запаўняецца выключна сп. Хмарам і зьяўляецца толькі яго прыватнай газэтай, за якую толькі ён паносіць усю адказнасьць.

4. Бачына 12 – адрас 1000 Dundas St. W. – ужо не актуальны. Згуртаваньне Беларусаў Канады й парафія сьв. Кірылы Тураўскага набылі большы будынак на 524 St. Clarens Ave., куды й перанясьліся на пачатку гэтага месяца.

Варочаючыся да адбіткі Вашага артыкулу. Калі трэба пакрыць кошты друку, пасьля распродажы, ці перад? Хто будзе дыспанаваць адбіткамі?

Я быў бы вельмі рад пабачыцца з Вамі, Доктар, а яшчэ больш мы з жонкай хацелі-б Вас бачыць у сябе ў Бэры. Будзьце ласкавы паведаміце калі Вы будзеце ў Таронта, ды дзе й калі Вас можна будзе спаткаць. Калі Вы ня будзеце мець самаходу – я магу прыехаць па Вас сваім.

Вельмі Вам дзякую за дэдыкацыю брашуры. Мы прачыталі яе зь вялікім зацікаўленьнем.

А цяпер да пабачаньня. Прывітаньні ад нас абоіх Вам і Вашай Спадарыні.

Вашы

Жук-Грышкевічы

Залучнікі: Зьвяртаю тэкст Вашага артыкулу.»

* * *

CANADA
DEPARTMENT of CITIZENSHIP and IMMIGRATION

Ottawa, September 18, 1959

Dr. V. Žuk
54 Mary St.
Barrie, Ontario

Dear Dr. Žuk:

Your kind letter was just received and I made the pointed out corrections in the manuscript. Your kind assistance in the assembling of material on the history of settlement of Byelo-

russians in Canada was most appreciated and I wish to thank you very much for your cooperation. I am only sorry that it was impossible to utilize all the material in the preparation of the monograph.

Please covey my best regards to Mrs. Žuk.

Yours sincerely,

V. J. Kaye
National Liaison Officer

* * *

(Приватний)
Оттава, 18 вересня 1959

Др. Вінцент Жук-Гришкевіч
54 Мері Стріт
Баррі, Онтаріо.

Дорогий Пане Докторе!

Лист Ваш прийшов саме в час, щоби повідомити університет про те, щоби замовили в друкарні відбитки статті про білорусинів. Я це вже зробив і підписав декларацію на 25 дол. Скільки це буде примірників ще не знати в січневому числі.

Я вже зладив монографію про білорусинів по-українськи для Наукового Товариства ім. Шевченка і буду читати її на науковому з'їзді, що відбудеться в Торонто, дня 10 і 11 слідуючого місяця. Коли товариство буде мало фонди, то монографія вийде друком. Вона довша як ця, що її буде публікувати Університет, бо обнімає 20 сторінок.

Хоч монографія для департаменту не вийшла ще поза рамки міністерства, вона має своє значіння, бо подає інформації для урядових чинників, які досі про білорусинів нічого не знали.

Як приїду до Торонто і буду мав трохи часу, напишу Вам і постараюся на день скочити до Баррі. Авта до Торонта не буду брати, бо його дружина вживає в місті.

Щиро вітаю Вас і шановну Дружину,

Ваш В. Кисілевський

"Ottawa, October 26, 1959

Dear Doctor Žuk:

My brief visit to Barrie on Thanksgiving Day left lasting pleasant impressions, and added to the already considerable store of information on Byelorussians. I was particularly interested in the publications and the historical background material you showed me. I made a few notes, as you know.

Please accept my sincere thanks for your kind hospitality and very pleasant company.

I gave the address and the name of the pastor of the St. Cyril Church to our Regional Officer in Toronto with the suggestion to call on Rev. M. Macukievich and to see the new premises with the pleasant chapel of which Rev. Macukievich is so proud.

I arranged as reqested, for an additional 100 copies of the reprint of the Study on Byelorussians and was informed that it was due to appear in the December-January number of the Revue.

Sincerely yours,

(Dr.) V. J. Kaye,
National Liaison Officer"

* * *

«Бэры, 18 лістапада 1959

Вельмі Паважаны й Драгі Спадар Доктар,

Дзякую за Ваш мілы ліст з 26. 10. 1959. Адначасна хачу паведаміць аб нашых бягучых імпрэзах у Таронта.

У суботу 21 лістапада а гадз. 7-ай вечара адбудзецца беларускі канцэрт хору Кіслага з Клевэлянду ў залі, якую Вы бачылі на Ст. Клярэнс Аве. На другі дзень – у нядзелю 22 лістапада а 10-ай гадзіне раніцы адбудзецца ўрачыстае высьвячэньне капліцы, якую Вы таксама бачылі, з удзелам Яго Праасьвяшчэнства Архіяпіскапа Васіля, які дзеля гэтай мэты прыедзе зь Нью Ёрку.

У наступную нядзелю – 29-га лістапада, як кожны год у гэту пару, адбудзецца сьвяткаваньне «Дня Герояў Беларусі». Сьвяткаваньне гэта ладзяць супольна абедзьве арга-

нізацыі ЗБК і БНА. Той факт, што яны дагаварыліся сьвяткаваць разам гэта агульна-беларускае сьвята, гаворыць пра палепшаньне адносін паміж імі. Факт гэты мае тым большае значэньне, што ўжо некалькі месяцаў камуністычная прапаганда з Усходняга Бэрліну ў сваёй газэтцы й спэцыяльнай брашуры пераконвае беларускую эміграцыю аб безсэнсоўнасьці й непатрэбнасьці гэтага сьвята.

Маю надзею, што Вы ўжо атрымалі запросіны на канцэрт і царкоўную ўрачыстасьць, аб якой мова вышэй. Сапраўды было-б нам вельмі прыемна бачыць Вас, а таксама Спадарыню В. Дж. Кайэ сярод нас у часе гэтых урачыстасьцяў.

З глыбокай пашанай

В. Жук-Грышкевіч»

* * *

Перапіска Вінцэнта Жук-Грышкевіча з д-рам В. Дж. Кэйэ працягваецца што найменш да 1964 году. У сваім лісьце з 24 лютага, 1960 году др. Кэйэ піша:

"Many thanks for your note of February 21st just received. At the same time there arrived also an official invitation from the Byelorussian Co-ordinating Committee. It was a pleasant surprise to see that the Byelorussian National Association and the Byelorussian Alliance in Canada joined forces in the celebration. I am not certain whether I shall be free to go to Toronto on the 27th of March, but I shall do my best."

* * *

Пасьля зьяўленьня манаграфіі ў друку др. В. Жук-Грышкевіч піша рэцэнзію на яе:

"V. J. Kaye, Professor at the Faculty of Arts, University of Ottawa,
CANADIANS OF BYELORUSSIAN ORIGIN.
Adbitka z Revue de l'Université d'Ottawa, July-September, 1960.

Брашура гэта ёсьць скарачэньнем большай працы з такім самым назовам, якую др. Кэйэ апрацаваў для канадзкага Дэпартамэнту Іміграцыі й Грамадзянства, ды якая мае служыць для нутранога карыстаньня канадзкай

дзяржаўнай адміністрацыі. На вялікі жаль гэта большая праца ня была выдана друкам і таму не даступна для шырэйшых грамадзкіх колаў.

Аднак і гэта скарочаная праца ў выглядзе брашуры на 15 бачын ёсьць вельмі важнай крыніцай інфармацыяў аб беларусах на ангельскай мове, бо падае дадзеныя ня толькі пра беларускую эміграцыю ў Канадзе, але й пра беларусаў наагул. Інфармацыі гэтыя тым больш важныя, што апрацаваны не беларусам, а канадыйцам – у дадатку паважным навукоўцам і высокім канадзкім урадаўцам. Факт гэты сам сабою настаўляе чытача на веру ў аб'ектыўнасьць пададзеных інфармацыяў.

Брашура мае чатыры разьдзелы: 1. Гістарычнае мінулае; 2. Пачаткі беларускай іміграцыі ў Канаду; 3. Беларускія арганізацыі ў Канадзе; і 4. Беларуская прэса й парафіі. Праца абапіраецца на статыстычных дадзеных Канадзкага Дэпартамэнту Іміграцыі й Грамадзянства ды на розных, між іншым і беларускіх, выданьнях.

У ўводзінах аўтар гаворыць, што беларуская этнічная група ў Канадзе ёсьць надзвычай цікавая, а разам з тым найменш знаная. Яна не адзначалася як асобная група ў перапісях насельніцтва. Дзеля таго, што беларусы паходзілі з Расейскай Імпэрыі – перапішчыкі запісвалі іх расейцамі. Да сяньняшняга дня няма ўсталенага назову для гэтай групы, тым больш, што самі беларусы на эміграцыі ўжываюць аж некалькі назоваў для сваёй нацыянальнасьці.

Толькі з прыбыцьцём у Канаду новай беларускай эміграцыі ды ад часу прыняцьця БССР у Задзіночаныя Нацыі канадзкаму грамадзтву стала больш ведама пра беларусаў.

Тут жа аўтар падае інфармацыі аб падзеле Беларусі пасьля першай сусьветнай вайны ды дадзеныя аб насельніцтве й тэрыторыі тады й цяперашняй БССР. Успамінае таксама, што самі беларусы ўважаюць, што толькі-ж беларускай тэрыторыі як у БССР улучана ў РСФР і што лік усіх беларусаў у цэлым СССР даходзіць да 18,000,000. (васемнаццаці мільёнаў).

У І-м разьдзеле др. Кэйэ падае пабежна абраз мінулага Беларусі, пералічвае пяць беларускіх плямёнаў, адзначае ролю Полацкага княства. Кажа, што Вялікае Княства Літоўскае пачалося з Наваградку, якім кіравалі князі мяшанага літоўскага й беларускага паходжаньня. Адзін зь іх Міндоўг

абяднаў суседнія беларускія княствы й далучыў непакорную Жамойдзь і Аўкштоту. Беларуская мова сталася тут мовай дзяржаўнай і мовай двара й вышэйшых станаў. Гаворыць пра Люблінскую вунію й палянізацыю, Берасьцейскую вунію й рэлігійнае аб'яднаньне. Падае аб'ектыўна што прынясло з сабой забраньне Беларусі Расеяй: перасьлед нацыянальны, рэлігійны й культурны ды русыфікацыю. Разьдзел канчае інфармацыяй аб нацыянальным адраджэньні і абвешчаньні незалежнасьці Беларусі ў 1918 годзе, ды контррэакцыі бальшавікоў якія, каб не дапусьціць да аддзяленьня Беларусі ад Расеі, стварылі сваю БССР.

II-гі разьдзел прадстаўляе прабег іміграцыі беларусаў у Канаду. Пачынаецца цытатай з кнігі Г. Окулевіча «Русские в Канаде», у якой гаворыцца, што «расейскія» эмігранты зь Мінскай, Горадзенскай ды іншых губерняў прыехалі ў Канаду ў 1907 годзе. Др. Кэйэ кажа, што гэта былі перадусім маласьведамыя сяляне. Да іх далучыліся расейскія палітычныя эмігранты пасьля рэвалюцыі 1905 году і пачалі тварыць расейскія «прагрэсыўныя» арганізацыі ў Таронта й іншых гарадох. Сябрамі гэтых арганізацыяў былі ў бальшыні беларускія сяляне, якімі кіравалі расейскія палітычныя эмігранты.

Др. Кэйэ не жалее сваіх высілкаў, каб пры помачы параўнаньня статыстычных дадзеных з перапісаў па рэлігіі й нацыянальнасьці выэлімінаваць беларусаў з расейскай і польскай групаў. Аказваецца, што ў 91,297 запісаных расейцамі пры перапісі ў 1951 годзе знаходзіцца некалькі нацыянальнасьцаў, сярод якіх расейцы як такія твораць мяншыню. Паводля рэлігіі – у гэтай лічбе ёсьць толькі 12,219 праваслаўных (аўтар залічае іх да расейцаў, украінцаў і беларусаў), рэшта належыць да каталікоў (13,323 – пераважна беларусы й балты, кажа аўтар), жыдоў (9,118), лютэран (8,259), мэнанітаў (7,517), іншых пратэстантаў (разам 18,701) ды духабораў (19,597). Др. Кэйэ ўважае зусім слушна, што толькі ўсіх духабораў ды пэўны працэнт праваслаўных і пратэстантаў (што зьмянілі рэлігію ў Канадзе) можна залічыць да расейцаў. Рэшта-ж гэта іншыя нацыянальнасьці, зь якіх, паводле д-ра Кэйэ, беларусаў ёсьць 20% з цэлай лічбы 91,279.

З такім выснавам нам цяжка пагадзіцца. Пры перапісі ў 1951 г. ўсе нацыянальнасьці з былой расейскай Імпэрыі маглі запісацца пад сваімі рубрыкамі, а калі такіх ня было (для меншых групаў), маглі падаць сваю нацыя-

нальнасьць, бо назовы балтыцкіх групаў, украінцаў і жыдоў былі ведамы перапішчыкам. Беларусы-ж ня мелі свае рубрыкі ў перапісных лістох, перапішчыкі звычайна ня ведалі аб існаваньні беларусаў, як асобнай групы і нават калі пачулі ад заінтарасаванага назоў «беларус» спакойна запісвалі яго расейцам, думаючы, што гэта тое самае. Такім чынам апрача духабораў, усіх пратэстантаў ды некалькі тысяч праваслаўных і пратэстантаў расейцаў – рэшта з 91,271 гэта беларусы па паходжаньню – усяго каля 40,000, на нашу думку.

Сярод польскай этнічнай групы (219,845) ёсьць 7,741 праваслаўных. Гэта ня хто іншы, як беларусы, якія жылі пад Польшчай й таму запісаны палякамі. Да іх трэба далічыць беларусаў каталікоў, якія з тых жа прычын запісаны палякамі. Др. Кэйэ прызнае ім 5% з усяго ліку польскай групы. Магчыма, што гэты працэнт вышэйшы, цяжка ўстанавіць дакладна. Агульную лічбу беларусаў як прыблізную др. Кэйэ падае 30,000. Мы думаем, што лічба гэта сягае паміж 60,000 і 70,000. Незалежна ад гэтага трэба прызнаць, што др. Кэйэ выявіў шмат добрай волі пры вылучэньні беларусаў зь іншых этнічных групаў, хоць можа, дзеля сваей асьцярожнасьці й абнізіў іх лік.

Далей др. Кэйэ цьвердзіць, што зь ліку 30,000 беларусаў толькі 5,000 бярэ ўдзел у беларускім жыцьці. Мы думаем, што ў гэтым выпадку лічба абніжана дзеля тэй жа асьцярожнасьці.

У разьдзелах III і IV др. Кэйэ апісвае беларускае арганізацыйнае й рэлігійнае жыцьцё ў Канадзе ды беларускую прэсу. Гаворыць ён часамі аб дасадных фактах, асабліва-ж калі ходзіць пра прэсу. Але што-ж, калі яны праўдзівыя. Паміма таго, што аўтар не сказаў у сваёй брашуры ўсяго, што мы-б хацелі і як мы-б хацелі, брашура гэта ёсьць вельмі важным укладам у літаратуру аб беларусах на ангельскай мове. За гэту працу мы павінны быць вельмі ўдзячнымі паважанаму аўтару.

Жук.»

* * *

27-га красавіка 1964 году др. Кэйэ, а сапраўднае прозьвішча Кэйэ-Кысілевскы, піша да Вінцэнта Жук-Грышкевіча даўгі прыватны ліст паўкраінску, у якім між іншага гаворыць, што ўжо другі год працуе над гісторыяй пачаткавага пасяленьня ўкраінцаў у Канадзе, ды, што

«всетаки, білоруські справы мене далі цікавять, особліво група, яка належить до рымо-католицкоі церкви і не мае власных священників і через те трацить свое національне облича.» Далей ён кажа, што прыпадкова ў Аставе спаткаў студэнта каталіцкай тэалёгіі, сьведамага беларуса, які гаворыць прыгожа пабеларуску, роджанага ў Нью Ёрку. У Рыме ён хоча высьвеціцца на сьвятара абыдвух абрадаў, грэка- і рыма-каталіцкага, каб магчы служыць беларусам каталіком у Нямеччыне. Др. Кэйэ-Кысілевскы раіў студэнту пасьля студыяў застацца ў Канадзе й тут абслугоўваць беларусаў каталікоў. Падае адрас сп. Робэрта Патры й раіць В. Жук-Грышкевічу зь ім скамунікавацца.

* * *

На ліст др. Кэйэ В. Жук-Грышкевіч адказвае:

«Бэры, 12 мая, 1964

Вельмі Паважаны й Дарагі Доктару,

Ліст Ваш быў для мане прыемнай неспадзеўкай. Я ўжо ня раз думаў пра Вас і думаў пісаць да Вас. Цешуся, што Вы актыўны, як і раней.

Вельмі Вам удзячны за інфармацыю пра Мр. Робэрта Патры. Ня ведаю, ці нам удалося-б сабраць нашых параскіданых каталікоў і стварыць каталіцкую парафію, ня ведаю, ці Мр. Патры захоча ўзяцца за зусім штосьці новае, аднак я ўсяроўна пастараюся зь ім скантактавацца. Між іншага ў нас у рэлігійнай каталіцкай справе адбылося значнае палепшаньне. Папа Ян XXIII ардынаваў для нас беларускага біскупа ўсходняга абраду д-ра Часлава Сіповіча, які бярэ ўдзел у Экумунічным Саборы, як рэпрэзэнтант беларусаў і знаходзіцца ў Рыме. Атрымалі мы таксама й апякуна для беларусаў рыма-каталікоў на эміграцыі, ёсьць ім стары беларускі дзеяч Монсын'ёр др. Пётра Татарыновіч. Пражывае ён таксама ў Рыме й выдае беларускі каталіцкі часопіс «Зьніч». Ня ведаю, ці Мр. Патры паінфармаваны аб гэтым.

Мая актыўнасьць значна аслабла пасьля сэрцовага прыпадку (коронары) ў ліпені 1962 году. Цяпер я ўжо чуюся нармальна, але ня маю ані тэй сілы, ані энэргіі, як раней. Раблю тое сёе, але бяз высілку.

Жонка мая чуецца добра, як звычайна працуе шмат. Дзякую Вам за памяць. Шлю Вам і Вашай Спадарыні шчырыя прывітаньні.

З глыбокай пашанай,

В. Жук-Грышкевіч»

* * *

Пасьля мы ня раз сустракаліся з др. Кэйэ ў Атаве, ды й спадарста Кэйэ адведвалі нас у Бэры. Ён быў на сымпозіюм Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва Канады, што адбываўся ў 1975 годзе ў Атаве. Др. В. Дж. Кэйэ памёр 30-га жніўня 1976 году ў Атаве. Вечная й сьветлая яму памяць.

XIV. ПАЧАТАК 60-х ГАДОЎ

Вясною 1962 году старшыня Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ў Нью Ёрку др. Вітаўт Тумаш у лісьце з 18-га сакавіка да др-а Вінцэнта Жук-Грышкевіча, сябры БІНіМ у Нью Ёрку, піша:

«Дарагі Доктару!


Зьвяртаюся да Вас з прапановаю й просьбаю. У пачатку чэрвеня гэтага году прыпадае стагодзьдзе ад выхаду першага нумару «Мужыцкае праўды». Гэта важны беларускі палітычны і культурны юбілей. Наш Інстытут пляную з гэтае нагоды зладзіць у Нью Ёрку публічную юбілейную канфэрэнцыю на пачатку чэрвеня, на якую складалася-б колькі кароткіх рэфэратаў. Праўдападобна будзе зладжаная і выстаўка беларускае пэрыядычнае прэсы. Вось у сувязі з гэтым зьвяртаюся да Вас ад імені ўсяе Управы Інстытуту з просьбаю аб дапамогу «талакою». Ходзе аб тое, каб, як гісторык, далі рэфэрат аб «Мужыцкай праўдзе» на прыблізна нейкую гадзіну часу. Ведаю Вашыя цяжкія ўмовы дзеля далечыні ад бібліятэкі. Але ў гэтай справе ёсьць, памойму, выхад, – магу шмат што даслаць з мае бібліятэкі й збораў. У дадзеных умовах, памойму, наіск даводзіцца класьці не на тое, каб нешта новае расшукаць аб «Мужыцкай праўдзе» і Каліноўскім, што ў дадзеных умовах вельмі цяжка, і блізу немагчыма. Больш затое можна зрабіць у справе сучаснага беларускага **асэнсаваньня** гэтае важнае гістарычнае падзеі – выхаду першага часапісу, дый кінуць вокам на разьвіцьцё беларускага пэрыядычнага друку за 100 год. Пры тым, паколькі ў будучым годзе прыпадае 125 год ад нараджэньня Каліноўскага, а яшчэ за год – 100 год ад ягонае сьмерці, дык канфэрэнцыя Інстытуту й мае быць прысьвечана ня толькі самой асобе Каліноўскага ды паўстаньню, а якраз «Мужыцкай праўдзе» й самому гістарычнаму факту пачатку беларускае прэсы...»

У ліпені гэтага-ж 1962 году Вінцэнт Жук-Грышкевіч атрымаў першы раз «атак сэрца» – інфаркт. Доўга хварэў. У лісьце зь 19 верасьня 1962 году др. Вітаўт Тумаш, доктар мэдыцыны з прафэсіі, піша Вінцэнту Жук-Грышкевічу:

«...Калі-б ужо чуліся й зусім добра, дык пасьля такога неспадзяванага сэрцовага «эпізоду» колькі месяцаў, найменш да канца году, трэба быць вельмі асьцярожным з усякаю – і фізычнаю, і ўмысловаю – працаю, натугамі. Дык пра Ваш рэфэрат у гэтым годзе ня можа быць і гутаркі – ня раджу пра гэта й думаць...»

Быў Вінцэнт яшчэ ў шпіталі ў Бэры й тады, калі 1-3 верасьня 1962 году ў Таронта адбывалася 5-я Сустрэча Беларусаў Паўночнае Амэрыкі. На Сустрэчу ён меўся даць даклад. Заміж яго ключавым дакладчыкам быў др. Станіслаў Станкевіч. Прыехалі із Сустрэчы з Таронта ў Бэры сябры адведаць хворага Вінцука: Натальля Арсеньнева, Яня Каханоўская, Антон Шукелойць, Марыя і Рагнеда Ханяўкі. І Рагнеда кажа: «І наш тата хворы, дастаў хваробу Паркінсона». Дык і Чэсь Ханяўка, дваюродны брат Вінцука, у той жа 1962 год пачаў хварэць. Малодшы ад Вінцэнта, памёр на сем месяцаў раней яго.

У 1963 годзе Вінцэнт Жук-Грышкевіч вяртаецца да грамадзкае працы. 100-я ўгодкі паўстаньня Кастуся Каліноўскага й 125 год ад ягонага нараджэньня Згуртаваньне Беларусаў Канады і Беларускае Нацыянальнае Аб'яднаньне адзначаюць супольна на шырэйшую скалю з удзелам чужых гасьцей. Др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч чытае даклад у дзьвёх мовах – паангельску й пабеларуску.



Вінцэнт Жук-Грышкевіч з Міколам Абрамчыкам у сваім садзе. Бэры. 1960.



Вінцэнт і Раіса Жук-Грышкевічы ў сваім садзе. Бэры, 1960.



Вінцэнт і Раіса Жук-Грышкевічы. Бэры, сьнежань, 1962.

Рэфлексыі на сьмерць ксяндза Віктара Шутовіча

Вінцэнта Жук-Грышкевіча, 1964

«Прачытаў у «Зьнічы» Но. 76 артыкул-нэкралёг, В. Карасэвіча, прысьвечаны ксяндзу Віктару Шутовічу, і зжахнуўся. – Божа, чаму-ж нам, беларусам, трэба цярпець столькі за сваё роднае слова нават у пазнаваньні Тваёй Боскай Праўды, ды ў малітве да Цябе? То-ж Ты абдарыў народы мовамі адпаведнымі, каб кожны зь іх на сваёй мове ня толькі разумеўся паміжсобку, але й лепш разумеў Тваю навуку, ды мог у лепшым і глыбейшым разуменьні выказваць Табе жалі, скаргі й просьбы свае. Усе-ж народы роўныя перад Табою, як і мовы іхнія. Чаму-ж тады мы мусім цярпець перасьлед мовы нашай ня толькі ў штодзённым жыцьці, але й у Сьвятынях Тваіх, збудаваных нашымі-ж рукамі, на Славу Тваю? – ды цярпець гэты перасьлед ня толькі ад недаверкаў, але й ад такіх-жа хрысьціян як мы, толькі зь іншай мовы – ды ад біскупаў і сьвятароў з гэтай мовы? І не калісь даўно – у цемнаце сярэднявечча, а ў нашыя часы – у 20-м веку?

Такія думкі зьявяцца хіба што ў кожнага беларуса, які прачытае нэкралёг, прысьвечаны ксяндзу Шутовічу. Але той-жа нэкралёг сьціруе думкі нашы, асабліва ў каталікоў старэйшых векам, да тых дзіцячых гадоў і недалёкага мінулага з часоў польскай акупацыі Заходняй Беларусі. Прыпомнім мы тады, як вучылі нас маліцца на польскай мове й як мы, неразумеючы мовы, мармыталі бязсэнсоўна польскія словы й таму думкамі былі невядома дзе, але толькі не ў малітве. Тое самае было, калі мы пайшлі ў касьцёл, дзе ўся маса беларускіх вернікаў паўтарала незразумелыя польскія словы ў малітве або слухала польскае казаньне, незразумелае для іх. Ксяндзамі, як правіла, былі чужынцы-палякі. Калі-ж трапіўся ксёндз беларус – дык і яму ягоныя зьверхнія польскія духоўныя ўлады загадвалі маліцца й казаньні казаць папольску – для сваіх жа братоў-беларусаў. Калі-ж гэты ксёндз трымаўся прынцыпаў хрысьціянскай справядлівасьці, хацеў быць добрым пастырам свайго народу й маліўся й прамаўляў да яго ў зразумелай яму, беларускай мове – тады яго спатыкаў лёс ксяндза Шутовіча. Так цярпелі ад польскай каталіцкай гіерархіі й дзяржаўнай адміністрацыі, а найбольш хіба ад арцыбіскупа Яблжыкоўскага, ксяндзы – і то выдатныя – Абрантовіч, Станкевіч, Цікота, Гадлеўскі,

Рэшаць, Глякоўскі, Татарыновіч, Гэрмановіч, Тарасэвіч ды шмат імшых. Гісторыя ніколі не забудзе гэтае ганьбы. Мясцамі даходзіла да таго, што польскія ксяндзы, надужываючы свой сьвятарскі аўтарытэт, ашуквалі несьвядомых сялян. Яны цьвердзілі, што Бог ня выслухае малітвы на беларускай мове, што толькі папольску й палаціне можна маліцца, бо, нават, гаварылі яны, Матка Боская гаварыла папольску, не дарма-ж яна абвешчана каралевай кароны польскай.

Такое цемнатворства йснавала толькі ў Заходняй Беларусі, бо што датычыць Савецкага Саюзу – дык там ішло й ідзе адкрытае зьнішчаньне ўсіх рэлігіяў, як такіх. Гэта кожнаму ведама. Польшча-ж была хрысьціянскай дзяржавай і на ўвесь сьвет хвалілася свабодай і талеранцыяй да ўсіх рэлігіяў, а адначасна прасьледавала беларусаў за ўжываньне сваёй роднай мовы ў сьвятынях.

У тым жа часе шматлікія хрысьціянскія місіянеры пранікалі ў самыя глухія закуткі сьвету, да розных дзікіх і паўдзікіх плямёнаў і, каб несьці ў іхняе асяродзьдзе Хрыстову навуку, зразуменьне яе, – вучыліся іхніх цяжкіх моваў самі, каб прамаўляць на іх да сваіх вернікаў і такім чынам сумленна выконваць абавязкі апосталаў хрысьціянства.

У нас-жа, у геаграфічным цэнтры Эўропы, было зусім наадварот: польскае духавенства з дапамогай дзяржаўнай адміністрацыі змушала беларусаў слухаць і ўжываць у рэлігійным жыцьці незразумелую для іх мову пастыраў – польскую мову, зусім не турбуючыся, ці вернікі разумелі гэтую мову, ці не, ці навука Хрыстова ў гэтай мове пранікне ў іхнія душы, ці не. Пра гэта апошняе дбалася найменш. Пробашч маёй парафіі, напрыклад,сьмяяўся з майго «войчэнаш, курысь ес...», але не паклапаціўся вытлумачыць пабеларуску значэньне слоў вялікай малітвы. Малітва на незразумелай мове адмаўлялася мэханічна, бяз удзелу сьведамасьці. Яшчэ адзін прыклад: Гаспадыня мэханічна адмаўляла малітву, а яе сьведамасьць сачыла за тым, што робіцца ў хаце й каля хаты. Тым часам у хату увайшла курыца й скочыла на стол. Гаспадыня перарвала малітву й крыкнула: – «Акыш, каб цябе каршун!», пасьля чаго прадаўжала малітву. – Мясцовыя палякі любілі расказваць пры кілішку анэкдоты пра такія выпадкі. Але гэта ня былі анэкдоты, а праўдзівыя жыцьцёвыя факты. Гэта была прафанацыя Хрыстовай веры, а анэк-

доты й насьмяханьне палякаў былі зьдзекам над душой беларускай, імі-ж патаптанай.

Хто-ж быў вінаваты за гэты зьдзек і прафанацыю рэлігіі? Польскія ксяндзы. Ім хадзіла перш за ўсё аб тое, каб не дапусьціць у рэлігійнае жыцьцё беларускай мовы, каб беларусы гаварылі малітвы папольску. Ім хадзіла пра тое, каб праз польскія пацеры беларусаў палячылі. Яны служылі не справе Хрыстовай веры, а польскай дзяржаве. Яны былі польскімі дзяржаўнымі ўрадаўцамі ў касьцёле, а не добрымі пастырамі. Яны стапталі аб'яўленьне Сьвятога Духа, дзякуючы якому Апосталы Хрыстовыя пазналі ўсе мовы, ды панесьлі ў гэтых мовах Хрыстовую навуку ўва ўсе канцы сьвету. Польскія ксяндзы маюць на сваім сумленьні не аднаго беларуса, які пры такіх адносінах зьняверыўся, стаў рэлігійна абыякавым, або й атэістам.

Хтосьці спытае, чаму беларусы не пратэставалі? Пратэставалі, яшчэ й як! Але пратэсты на мясцох былі здушаны польскай паліцыяй, а весткі аб гэтых пратэстах у беларускай прэсе былі канфіскаваны польскай цэнзурай. Польская-ж прэса была за адно з прыгнятальнікамі.

Чаму-ж тады Ватыкан дапусьціў да такой ганьбы? – Да Рыму было далёка, а польскія ўлады старанна кантралявалі ўсе зносіны з заграніцай. У Ватыкане-ж сядзела моцная польская рэпрэзэнтацыя, якая прадстаўляла рэлігійнае жыцьцё ў Польшчы ў сваёй вэрсыі й старалася не дапусьціць пабочных, непрыемных для яе вестак. Да таго-ж голас у Ватыкане мог мець толькі біскуп, да годнасьці якога не дапускалі беларусаў тыя-ж цёмнатворцы на працягу стагодзьдзяў. А найважнейшай перашкодай быў канкардат паміж Ватыканам і Польшчай, паводле якога ніхто ня мог умешвацца ва ўнутраныя справы каталіцкага касьцёлу ў Польшчы. Канкардат гэты й быў выкарыстаны польскімі дзяржаўнымі й каталіцкімі духоўнымі ўладамі дзеля самаволі ў дачыненьні да беларусаў. Таму польскія біскупы маглі забараніць ужываньне беларускай мовы ў касьцёле ды пераводзіць ксяндзоў беларусаў зь беларускіх парафіяў. Ксяндзы нашы апынуліся ў Мазуршчыне, у цэнтральнай Польшчы, у Амэрыцы ці ў Кітаі, але не маглі ўжо мець парафіі ў Беларусі. Вось характэрны прыклад. У 1922 годзе, на фэсьце ў Новым Пагосьце ў Браслаўскім павеце было з суседніх парафіяў 24-х ксяндзоў, зь якіх быў толькі адзін паляк і адзін летувіс

(з Браслава), а ўсе іншыя 22 былі беларусы. Праз наступных-жа пяць год, г. зн. у 1927 годзе, ня было ўжо ніводнага ксяндза беларуса на парафіі ўва ўсім Браслаўскім і Дісьненскім паветах. Трымаліся яшчэ нейкі час толькі айцы Марыяне ў Друі, ды чутны былі водгукі змаганьня за беларускую мову ў касьцёле ксяндза Гадлеўскага – у другім канцы Віленшчыны – у Жодзішках. На арцыбіскупскі пасад у Вільню прыйшоў Яблжыкоўскі. Ён забараніў вернікам чытаць «Беларускую Крыніцу», ворган Беларускай Хрысьціянскай Дэмакратыі. Беларускія ксяндзы, што ўтрымаліся ў краі не на парафіях, былі пад сталым наглядам духоўных і паліцыйных уладаў.

* * *

Тое, што прайшоў ксёндз Шутовіч, ёсьць найлепшай ілюстрацыяй рэлігійнага жыцьця на Беларусі пад акупацыямі: польскай, нямецка-гітлероўскай і расейска-бальшавіцкай. Бязумоўна, пад расейска-бальшавіцкай акупацыяй было яму найгорш, бо тут, апрача цярпеньняў духовых, дайшлі яшчэ жахлівыя цярпеньні фізычныя. Але тут ксёндз Шутовіч цярпеў ад ведамых ворагаў хрысьціянства, а не ад самых хрысьціян, што на кожным кроку падкрэсьліваюць сваю вернасьць каталіцкаму касьцёлу.

У Савецкім Саюзе ксёндз Шутовіч выконваў такое самае заданьне, якое выконвалі першыя Апосталы Хрыста на пачатку хрысьціянскае эры. Яны, натхнёныя Сьвятым Духам, пайшлі ў народныя гушчы з Хрыстовай навукай, не баючыся варожых хрысьціянству сілаў, ды ў цяжкіх абставінах заснавалі падваліны пад хрысьціянскую царкву і не адзін зь іх загінуў мучанікам на сваім цярністым шляху. Такім-жа, як апосталы, быў і ксёндз Шутовіч. Ён пайшоў адбудоўваць з руінаў каталіцкі касьцёл на Беларусі, бяз ніякага падтрыманьня польскіх ксяндзоў, калі прыйшла бальшавіцкая навала. Ён адзін рабіў працу за ўсіх іх і, мучаны ворагамі Бога доўгімі гадамі, загінуў сьмерцьцю мучаніка ад непасільнай апостальскай працы й перасьледу. Ён новы мучанік за Хрыстову веру з нашага народу. Уся Беларусь будзе ганарыцца ім і будзе рабіць пілігрымкі да сьціплай магілы яго пад Барысавам. А прыдзе час, што й увесь хрысьціянскі сьвет прызнае мучанікам за хрыстову веру гэтага сьвятога чалавека.

Лічу за вялікі гонар, што меў шчасьце спаткацца з гэтым вялікім сьвятаром – хоць два разы толькі...

В. Жук»

(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 9-10 [623-624], 1964)

(Пра спатканьні В. Жук-Грышкевіча з ксяндзом Віктарам Шутовічам глядзі Разьдзел IV – у «Выбарчым інструктарам ў 1922 годзе»)

Успаміны аб Пётру Сычу

20-га чэрвеня 1964 году адыйшоў у вечнасьць Пётра Сыч. Вінцэт Жук-Грышкевіч піша ў «Бацькаўшчыне» успаміны аб сябру:

«Апошні раз мне пеў Пясьняр...
Пасьля спачыў ён вечным сном
Пад туліпанаў курганом,
Але пабегла ў вольны сьвет –
Мінстрэль і волат – песьня-сьлед.

(П. Сыч, з ‹Вячорны звон›)

Наш Пятрусь быў бравы хлапец. Дзіўны й асаблівы, просты й скамплікаваны. Просты ў адносінах, скамплікаваны ў душы й характары. Бравы – бо сьмелы й адважны, сумленны, прасталінейны й беспасрэдны. Ён рэзаў праўду ў вочы й ня любіў разьбірацца, каго гэта датычыць. Яго рэалізм у слове й пісьме не аднаго мог абразіць, але бадай-што немагчыма было на яго за гэта крыўдзіцца, бо пад войстрым словам хавалася праўда, а ў душы ягонай было столькі дабраты, спачуваньня.

Ён заўсёды шукаў праўды, справядлівасьці, сумленнасьці ў сучасным заблытаным, скамеканым сьвеце і патрапіў знаходзіць гэтыя асновы людзкога ‹я›. А раз знайшоў – бараніў іх сумленна, стойка й адважна, і ніякая сіла не магла зьвіхнуць яго зь ягоных устояў.

Пачуваўся да абавязку й быў кансэквэнтным. За што ўзяўся – выканаў. У адносінах да людзей і працы – верны й ляяльны. Ня зносіў маны й ашуканства, падхалімства й паклёпаў.

Меў багатую, чульлівую мастацкую натуру, адораную рознымі здольнасьцамі. Быў ён пісьменьнікам, і публіцыстам, і паэтам, і маляром – з задаткамі да скульптуры. На

вялікі жаль, гэтыя ўроджаныя здольнасьці не знайшлі належнага афармленьня ў сыстэматычнай адукацыі, культываваньні, і таму наш мастак да канца жыцьця застаўся мастаком-дылетантам. Жыцьцёвыя нягоды білі моцна нашага Пятруся й не далі магчымасьці сканцэнтравацца, разьвіцца ў аднэй, найбольш адпаведнай яму галіне. Таму хіба-што на дне душы ягонай затаілася нейкая прыніжанасьць, няпэўнасьць у свае сілы, а мо' й крыўда на свой жыцьцёвы лёс.

Сярэднюю асьвету, якую ён атрымаў у польскай гімназіі ў Вялейцы – не расцэніваў высока. Таксама й асяродзьдзе польскіх, «крэсовых кацыкаў», у якім ён працаваў урадаўцам у Вялейскім павеце перад вайной, і польскае войска, у якое ён трапіў у часе вайны ды атрымаў рангу паручніка, не імпанавала яму. Ён пачуўся сам сабой толькі тады, як уключыўся ў шэрагі беларускага вызвольнага руху.

Як бачым – ні польская школа, пачаткавая й сярэдняя, ні асяродзьдзе польскіх урадаўцаў, ні нават польская афіцэрская школа й служба ў польскай арміі не змаглі вырваць ці зламаць беларускасьць Пётры Сыча. Яна моцна сядзела ў ім і выявілася вялікім патрыятызмам у ягонай шматгадовай, ня раз гераічнай, беларускай рабоце, як толькі ён знайшоў сваю праўду, беларускую праўду.

* * *

Спамін пляцецца пад віхор,
Як слуцкіх паясоў узор.

(П. Сыч, з ‹Вячорны звон›)

Спаткаўся я з Пётрам Сычом у бальшавіцкім вастрозе ў Полацку, калі летам 1940 году быў перавезены з вастрогу ў Вялейцы разам зь ведамым беларускім дзеячом Антонам Нэкандай-Трэпкам, ягоным вучнем зь Віленскай тэхнічнай школы Кастусём Мацкевічам, ды з масай беларускіх сялян, польскіх урадаўцаў і вайсковых. У нашай камэры, апрача беларускай групы, былі два летувісы, адзін француз і некалькі палякаў. Патрусь кінуўся ў вочы тым, што ляпіў з хлеба цудоўныя шахматныя фігуркі, і дзякуючы яму мы маглі гульнёй у шахматы забіць цягучую вастрожную нуду. Пазнаўшыся бліжэй мы даведаліся, што Пётра Сыч ёсьць беларусам з пад Ілы, Вялейскага па-

вету. Хоць быў гадунцом польскай гімназіі, чуўся беларусам, ар'ентаваўся ў беларускіх справах, зачытываўся Купалам і Коласам. Пра праф. Трэпку й мяне чуў яшчэ раней. Незаўважна ён далучыўся да нашай групы.

У Полацку мы сядзелі нядоўга. У жніўні Пятруся, мяне й Мацкевіча выклікалі й адчыталі прысуд тройкі НКВД. Засуджаных пасадзілі разам, але асобна ад тых, якіх ня выклікалі, і мы ўжо больш не пабачылі праф. Трэпку. Бог ведае, які яго спаткаў лёс. Нас-жа незадоўга завязьлі ў Воршу, пасадзілі ў вялізарны зборны эшалён і павязьлі напоўнач у Печ.-лаг. (лягер на Пячоры.) У вагоне знайшоўся яшчэ адзін беларус, які далучыўся да нас – Павал Асіповіч. Ён некалькі год таму скончыў Радашковіцкую Беларускую Гімназію.

Падарожжа трывала каля шасьцёх тыдняў у страшэнных умовах. Вязьлі нас то цягніком, то баржамі па рацэ, то гналі пехатой, то зноў вязьлі грузавікамі. Кармілі салёнай камсой, а вады давалі мала й рэдка. Мы ўсе захварэлі і страшна цярпелі ад смагі. Падтрымоўвалі адзін другога на духу й фізычна. На адным з пераходных пунктаў Пятрусь пачуўся так блага, што ня мог устаць. Там яго забралі ў шпіталь, і мы надоўга страцілі кантакт зь ім. Пазьней мы даведаліся, што, як ён паправіўся, забралі яго ў будаўляную калёну, дзе ён моцна пагараваў, пакуль ня стаўся «художнікам». «Художнік» у лягярох быў «пэрсона грата», ён карыстаўся прывілеямі й прыхільнасьцяй начальства, якому маляваў партрэты. Таму пазьней Пятрусь ажыў. Калі нас прывязьлі на прызначанае месца – на паграніччы тайгі з тундрай, – разагналі па розных калёнах і ўтрымоўваць нейкую сувязь нам было немагчыма.

Спаткаліся мы зноў з Пятрусём аж у Іраку ў Другім Польскім Корпусе. Ён быў у ранзе «плютановага падхаронжага» й выконваў функцыю асьветнага афіцэра ў сваім аддзеле. Мы пастанавілі вышукоўваць беларусаў, утрымліваць зь імі сувязь, ды старацца групавацца па меры магчымасьці бліжэй адзін да аднаго. Пазьней пры рэарганізацыі Корпусу нам удалося трапіць у адну транспартную калёну, ды ў адзін зьвяз, у якім, дарэчы, Пятрусь быў зьвязным. Тут ён захварэў на малярыю й я яго адведваў у шпіталі. Калі паправіўся й вярнуўся ў аддзел, мы яшчэ зь месяц пабылі разам, адводзячы душу ў гутарках і разваганьнях. Хутка калёна наша была разьвязана й нас разлучылі. Я трапіў у санітарную транспартную калёну, а

Пятрусь у пяхоту, дзе атрымаў рангу падпаручніка. Ад гэтага часу мы бачыліся рэдка ў Іраку, у Палестыне, ў Эгіпце.

Справа нашых спатканьняў шмат паправілася, як мы прыехалі ў Італію. Вясной 1944 году нам удавалася часамі спатыкацца большай групай: Я з Пятрусём, Асіповіч, Бабарыка ды іншыя часамі даходзілі. Сытуацыя зноў пагоршылася з пачаткам баёў за Монтэ Касыно. Усім нам ня лёгка паводзілася, але Пятрусь прайшоў тут найгоршае пекла. Апісваў ён гэтую жахлівую падзею вельмі рэалістычна ў сваім апавяданьні «Сьмерць і салаўі». Пад Монтэ Касыно Другі Корпус меў вялізарныя страты й баявыя аддзелы трэба было папаўняць. Тады й я апынуўся ў паходзе. Але ў Пятрусёў батальён мне трапіць не ўдалося, дык мы бачыліся рэдка. Пазьней людзей майго веку замянілі маладымі палякамі з палонных, дык я зноў быў пераведзены ў транспартную калёну. А Пятрусь яшчэ доўга ваяваў на першай лініі. Быў 4 разы ранены, адляжаў у шпіталі й нарэшце быў прызначаны ў тэхнічны аддзел. Ад гэтага часу жыцьцё было лягчэйшым і цікавейшым і мы зноў спатыкаліся часьцей.

Асабліва цікавымі сталі спатканьні нашы, калі вясной 45-га году я быў прызначаны выкладчыкам у вайсковай сярэдняй школе. Пятрусь быў тады маім частым гасьцём у вільлі над Адрыятыкай. Вайна ўжо скончылася. Ня было ніякай небясьпекі й рвачкі. Жыцьцё плыло спакойна й выгодна. Сонечная Італія – гэты суцэльны музэй старадаўнасьці й мастацтва – сталася нашай домэнай. У часе ваенных пераходаў мы пазналі гэты край і палюбілі яго. Мы пабывалі ўва ўсіх гарадох Італіі, адведалі найважнейшыя музэі й галярэі мастацтва, дык было аб чым пагаварыць і падыскутаваць. Адно на нашых сэрцах ляжала каменям мучаніца Беларусь. Мы ваявалі з адным тыранам людзтва, а тым часам другі тыран – ня лепшы – акупаваў нашу Бацькаўшчыну. Усё больш і больш даходзіла да нас цяжкіх вестак з дому. Былі ўжо ў кантакце з айцом Сіповічам у Рыме, а крыху пазьней з інж. Абрамчыкам у Парыжы ды нашымі суродзічамі ў Нямеччыне. Чыталі «Беларускія Навіны». У Італіі-ж выявілася тады шмат маладых беларусаў, якія прышлі сюды з нямецкай арміі. Спатыкаліся зь імі, гутарылі, зьбіралі весткі зь Беларусі. Усім нам балела душа за ейны лёс. Думалі, разважалі пра будучыню Беларусі, пра сваю будучыню. Заседжваліся да

познай ночы ў вільлі над Адрыятыкай. Сытуацыя была трагічная. Прайшлі савецкія вастрогі й лягеры, крывавіліся на франтох вайны з надзеяй на новы, вольны, справядлівы сьвет, а як скончылася вайна, дык аказалася, што й Бацькаўшчына ў няволі, і мы бяздомныя. Тады мы й знайшлі сваё заданьне: трываць на эміграцыі, арганізавацца, з вольнага сьвету вясьці змаганьне за вольнасьць Беларусі. Модэна была далейшым працягам нашых спаткаьняў, толькі ў шырэйшым кругу, бо з удзелам вучняў-беларусаў з вайсковых сярэдніх школаў.

Наступным этапам была Англія й Лёндан і ЗБВБ, як уцелаўленьне плянаў жаўнераў-беларусаў. На сцэну выступіла маса беларускіх патрыётаў, якая й стварыла гэту арганізацыю. Спачатку Пятрусь толькі час-ад-часу мог супрацоўнічаць з ЗБВБ, але, як толькі звольніўся з войска – з душой і целам увайшоў у нашу грамаду й яе працу. Мы зь ім нанялі тады «флят» у Лёндане й пачалі жыць разам. Пятрусь працаваў у прасавальні, дзе зарабляў сабе на пражыцьцё. Увесь вольны час мы аддавалі грамадзкай працы.

Божа! Колькі энтузіязму было тады ў нашай грамадзе! Беларускае жыцьцё на эміграцыі проста кіпела. Арганізацыі, часапісы й газэты расьлі, як грыбы па дажджы, у вольных краінах Эўропы й Амэрыцы. Мы ня толькі жылі, мы гарэлі тым палымяным жыцьцём беларускага ўздыму на эміграцыі. Былі пэўныя, што створаная на вайне міжнародная палітычная сытуацыя часовая, што хутка прыйдуць новыя падзеі, якія ў сваім зараве прынясуць вызваленьне ўсім паняволеным народам, у тым ліку й нам, беларусам.

Але надзеі нашы не апраўдаліся. Упорыстая інэртнасьць сьвету перамагла. І мы, хоць і «не распакоўвалі яшчэ сваіх валізак», мусілі думаць аб далейшым эмігрыйным жыцьці. Ізноў мы з Пятрусём змушаны былі разлучыцца. Але гэтым разам, хоць у розных краінах, мы былі ў тэй-жа самай грамадзе беларускай эміграцыі, рабілі тую-самую беларускую справу.

Пятрусь аказаўся вельмі плодным у пісаньні. Пісаў артыкулы, апаваданьні, вершы, сатыры й жарты. Пісаў у «На шляху», «Беларус на чужыне», у камбатанцкім часапісе, выдаваў час-ад-часу гумарыстычны часапіс «Шарсьцень», які, як і камбатанцкі часапіс ды шмат выданьняў, сам-жа афармляў з мастацкага боку. Пазьней пачаў друкавацца ў «Бацькаўшчыне» і быў супрацоўнікам яе, ды

незаменным супрацоўнікам Беларускай Сэкцыі Радыя Свабода да апошніх дзён сваіх.

Спаткаліся мы з Пятрусём ізноў праз тры гады, калі зьявілася магчымасьць прамаўляньня да беларускага народу праз радыё. Тут адкрылася баёвая лінія – лінія псыхалягічнай вайны. Трэба было выяўляць маскоўскі імпэр'ялізм ды разьбіваць ману й ашуканства пэрфіднай бальшавіцкай прапаганды, а адначасна змагацца з амэрыканцамі й расейскімі шавіністамі на месцы за беларускі й незалежніцкі зьмест нашых праграмаў. Трэба было зносіць інтрыгі й паклёпы, ды быць гатовым на спатканьне савецкіх агентаў, што сачылі з-за вугла. Не адзін працаўнік радыя быў замардаваны іхняй бандыцкай рукой – у тым ліку й наш сябра Лявон Карась.

На гэтай цяжкой пляцоўцы Пятрусь аказаўся трывалейшым за мяне. Зломаны хваробай я адыйшоў, а ён, хоць быў адным зь першых у гэтай працы й перажыў цяжкую хваробу, ня зыйшоў з свайго месца, з надарваным здароўем ён дабыў на ім да самай сьмерці.

Так сходзіліся й разыходзіліся нашые жыцьцёвыя дарогі, Даражэнькі Дружа. Гэтым разам Твая дарога абарвалася на заўсёды й мы больш не сустрэнемся на гэтым сьвеце. Цяжкая й цярністая была твая дарога. Але прайшоў ты яе сумленна й вытрывала. У ролі жаўнера з гонарам выконваў заданьні змагара з аднэй тыраніяй, а з другой – у ролі беларускага грамадзкага працаўніка, пісьменьніка й публіцыста. «Азімут сэрца – кірунак Беларусь», аб якім ты сказаў так прыгожа ў інаўгарацыйнай нашай праграме, – быў тваім кірункам, ён прысьвечваў Табе ў жыцьці й працы.

Цябе нястала, Пятрусь. Усім нам цяжка з гэтым пагадзіцца. Гэта вялікая страта для беларускай справы й нас асабіста. Нястане й іншых, а ‹Азімут сэрца – кірунак Беларусь› будзе жыць заўсёды ў сэрцах беларускіх і давядзе да нашай мэты тых, што будуць жыць.

Твой Вінцук»

(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 9-10 [623-624], 1964)

Угодкі Франьцішка Багушэвіча

Была восень 1965 году. Больш за сто год ад таго часу й больш за тры тысячы міль ад таго мейсца, дзе радзіўся й

жыў Франьцішак Багушэвіч, жменька людзей, бо ня тысячы ці сотні, а сьціплыя дзясяткі між мільёнаў чужога мора, закінутыя бурай жыцьця ў далёкую Канаду, аддавалі чэсьць Таму, з чыім клічам – «Не пакідайце-ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмерлі!» – ішлі. Мо іх і ня шмат, але яны ня ўмерлі.

24 кастрычніка ў БАПЦаркве сьв. Кірылы Тураўскага ў Таронта адпраўляецца сьв. літургія, а побач царквы-капліцы заля, якая сяньня мае таксама атмасфэру сьвятыні. Чаму? Сяньня яна гасьціць Вялікага Дастойніка Франьцішка Багушэвіча. І прысутнасьць Яго тут адчуваецца. Кажны, хто ўваходзіць у залю, проста накіроўвае свае крокі напокуць, дзе пад слаўнай Пагоняй на беларускай дзяружцы між сьцагамі лунае партрэт Франьцішка Багушэвіча й ягоны бессьмяротны кліч: «Не пакідайце-ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмерлі!»

Пасьля багаслужбы заля напаўняецца. А першай гадзіне старшыня ЗБК мгр. А. Грыцук адкрывае акадэмію й дае слова дакладчыку др-у В. Жук-Грышкевічу.


«Роўна 125 год таму нарадзіўся й роўна 65 год таму памёр бацька беларускага адраджэньня Франьцішак Багушэвіч...» – пачаў дакладчык. Ён пераносіць нас думкамі на Беларусь у цёмную данашаніўскую пару, шукае прычынаў і дзейнікаў, якія фармавалі душу вялікага патрыёта й дзеяча. З партрэту на сьцяне зыходзіць на залю малады студэнт, а тады юрысты..., а тады паўстанец... І ўжо не дакладчык, а «сялянскі адвакат» з гарачай беларускай душой вядзе з намі гутарку. Ён гаворыць аб слаўнай нашай мінуўшчыне, аб тых дзяржаўных актах, пісаных нашай «чысьцюсенькай беларускай мовай», якую мы павінны шанаваць і не пакідаць. «Калыханкай» – прыпамінае матку; нясе настальгію пытаючыся: «Гдзе радзіліся, гдзе-ж вы хмарачкі? Гдзе «тутэйшымі» называліся?... Зямлі роднекай знаць няма ў вас, ні ўтулачку, ні прытулачку...»

А мы, што Яму адказалі? За 65 год ад ягонай сьмерці да чаго дабіваліся, што асягнулі?... На разьвітаньне толькі абяцалі: «Мы выйдзем шчыльнымі радамі... ў крывавых муках мы народзім жыцьцё Рэспублікі Сваей» Ці датрымаем слова? **Р. Ж.**

Пісала ў «Бацькаўшчыне», Мюнхэн, нр. 6 (633), 1965, аўтарка гэтых радкоў.

Пра пачаткі беларускага адраджэньня

На Агульным Зьезьдзе ЗБК у 1965 годзе я ўвайшла як сакратар у Галоўную Ўправу Згуртаваньня Беларусаў Канады. Асабліва ў тыя часы чамусьці толькі некалькі жанчын належала да ЗБК, іншыя лічылі, што ЗБК – гэта справа мужчынская. Дык мы сарганізавалі жаночую арганізацыю – Задзіночаньне Беларускіх Жанчын Канады. Жанчыны да яе гарнуліся. Зьбіраліся мы часта, рабілі гарбаткі, гаварылі пра беларускіх славутых жанчын, як: Еўфрасіньня Полацкая, Рагнеда, Цётка. Раз прашу мужа: «Вінцук, зрабі, нам – жанчынам, даклад-лекцыю, пра тое, як пачыналася, на чым палягала, як разьвівалася беларускае адраджэньне». На даклад 14-га лістапада 1965 г. у залі ЗБК – Беларускага Рэлігійна-Грамадзкага Цэнтру сабралося шмат жанчын, далучыліся й мужчыны. Даклад быў добры, даступны, шмат каму ў галаве праясьнілася, што такое «адраджэньне». («Пачаткі беларускага адраджэньня», «Бяцькаўшчына», Мюнхэн, 6 [633], 1965).



Вінцэнт Жук-Грышкевіч, Бэры, 1966.



Партрэт Вінцэнта Жук-Грышкевіча
ў выкананьні Пётры Сыча, Мюнхэн.

XV. КААРДЫНАЦЫЙНЫ КАМІТЭТ БЕЛАРУСАЎ КАНАДЫ

Беларускае арганізацыйнае жыцьцё ў Канадзе пачалося ў 1948 годзе, калі група маладых новапрыбылых у Канаду беларускіх эмігрантаў вырашыла заснаваць Згуртаваньне Беларусаў у Канадзе. Першы Зьезд Згуртаваньня Беларусаў у Канадзе адбыўся ў 1949 годзе ў Таронта.

На другім Зьезьдзе Згуртаваньня Беларусаў у Канадзе (ЗБК) 27-28 траўня 1950 году ў доўгіх нарадах дыскутавалася пытаньне, якім мае быць ЗБК – палітычнай, ці апалітычнай арганізацыяй. У пратаколе Зьезду гаворыцца: «Зьезд большасьцьцю галасоў пастанавіў, што ЗБК павінна быць арганізацыяй грамадзка-нацыянальнай, апалітычнай і стаяць на грунце 25 Сакавіка».

Але да пытаньня, палітычнай, ці апалітычнай мае быць арганізацыя, сябры ЗБК вернуцца йзноў на 4-тым Агульным Зьезьдзе ЗБК 17-18 траўня 1952 году ў сьвятліцы ЗБК на 140 Батэрст вуліцы ў Таронта. На гэтым Зьезьдзе дайшло да расколу ЗБК. Прычынай было ўстанаўленьне ідэялягічнага напрамку ЗБК.

Пасьля расколу Згуртаваньня Беларусаў у Канадзе ў Таронта паўстала другая беларуская арганізацыя – Беларускае Нацыянальнае Аб'яднаньне (БНА). Пры ЗБК у 1954 годзе сарганізавана была парафія Беларускай Аутакэфальнай Праваслаўнай Царквы Сьв. Кірылы Тураўскага, пры БНА – царква Сьв. Еўфрасіньні Полацкай, Грэцкай юрысдыкцыі. Спачатку абедзьве арганізацыі, апрача няпрыязьні, нічога супольнага між сабой ня мелі.

Ды патрэба паразуменьня, супольнага сьвяткаваньня беларускіх нацыянальных сьвятаў зь бегам часу ўсё болей стала праяўляцца. У 1958 годзе ЗБК і БНА дагаварыліся супольна адзначыць угодкі Слуцкага Збройнага Чыну. Старшынём ЗБК быў тады сп. Антон Маркевіч, БНА – сп. Рыгор Беразоўскі. Сьвяткаваньне ладзіў «Супольны Арганізацыйны Камітэт» – першая ластаўка «Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады». У артыкуле «Каардынацыйны Камітэт Беларусаў Канады», зьмешчаным у «Беларусе» нр. 181, за 1972 г., гаворыцца:

«Як архіўныя сьляды паказваюць, ужо ў 1958 г. «Супольны Камітэт Сьвяткаваньня», што складаўся з прад-

стаўнікоў ЗБК і БНА, ладзіў супольнае сьвяткаваньне 38-е гадавіны Слуцкага Паўстаньня. Супольна адзначаецца абедзьвюма арганізацыямі й 39-я гадавіна Слуцкага Паўстаньня ў 1959 годзе. У 1960 г. на запропсінах на Акадэмію, прысьвечаную 43-м угодкам Абвешчаньня Незалежнасьці БНР, фігуруе назоў «Беларускі Каардынацыйны Камітэт», што рэпрэзэнтуе ізноў БНА і ЗБК. Але БКК ня быў сталай арганізацыяй і ў 1962 г. абедзьве арганізацыі адзначаюць угодкі 25 Сакавіка асобна. Ад 1963 г. да 1965 г. БКК ладзіць супольна сьвяткаваньні 25 Сакавіка.»

У 1963 годзе, калі др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч пасьля сэрцовага атаку (коронары) вяртаецца ізноў да грамадзкае працы, 100-я ўгодкі паўстаньня Кастуся Каліноўскага й 125-я ад ягонага нараджэньня ЗБК і БНА адзначаюць супольна на шырэйшую скалю з удзелам чужых гасьцей.

Плянова Вінцэнт Жук-Грышкевіч прыступае да рэалізаваньня свае задумы стварэньня **сталае** арганізацыі – Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады. У цэнтры кампаніі дагавораў між ЗБК і БНА ён спакойным і разважным тонам гаворыць з прадстаўнікамі абедзьвюх арганізацыяў аб патрэбе заснаваньня **сталае арганізацыі** – Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады, і то ня толькі для патрэбаў нутранога беларускага жыцьця, як супольнага адзначаньня нацыянальных сьвятаў, але і для рэпрэзэнтацыі беларусаў Канады навонкі – рэпрэзэнтацыі перад канадзкімі ўрадавымі й грамадзкімі дзейнікамі.

Апрацаваны др-ам В. Жук-Грышкевічам праект Статуту Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады быў разгледжаны, прадыскутаваны й прыняты прадстаўнікамі ЗБК і БНА на арганізацыйным паседжаньні 16 студзеня 1966 году ў Таронта. І з гэтага часу датуецца існаваньне **сталага ўканстытуаванага,** па сяньняшні дзень дзейнага **Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады.**

Паводле прынятага Статуту ККБК, які ёсьць у сіле й па сяньня і пераложаны цяпер і ў ангельскую мову, мэтай ККБК ёсьць: «1. Каардынацыя працы беларускіх арганізацыяў у Канадзе. 2. Дапамога ў тварэньні новых беларускіх арганізацыяў. 3. Каардынаваньне працы зь беларускімі каардынацыйнымі камітэтамі ў іншых краінах вольнага сьвету. Заданьні: 1. Вонкавая нацыянальная рэпрэзэнтацыя ў канадзкіх дзяржаўных і грамадзкіх установах. 2. Абарона беларускіх нацыянальных і практычных інтарэсаў штодзённага жыцьця, змаганьне з дыскры-

мінацыяй, змаганьне з савецкай прапагандай і т. п. 3. Нацыянальная рэпрэзэнтацыя і кантакты ці супрацоўніцтва зь іншымі нацыянальнасьцямі Канады. 4. Ладжаньне нацыянальных сьвяткаваньняў і іншых беларускіх імпрэзаў. 5. Разьвіваньне, прапагаваньне беларускіх культурных вартасьцяў, як беларускія песьні, танцы, літаратура й мастацтва. Арганізаваньне беларускіх хораў, танцавальных групаў, беларускіх выставак і т. п. 6. Культурна-асьветная праца сярод беларусаў: школы й калёніі для дзяцей, школы беларусаведы, публічныя лекцыі й даклады. 7. Апека над беларускаю моладзьдзю й нацыянальнае ўзгадаваньне яе.»

«Закладчыкамі ККБК і першымі яго сябрамі зьяўляюцца: ЗБК, БНА і Беларуская Самапомач у Ашаве» – гаворыцца ў Статуце. Першым і шматгадовым старшынём ККБК быў др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч,сябра ЗБК. У першы Выканаўчы Камітэт ККБК увайшлі апрача старшыні: сп. Міхась Кухарчык, сябра БНА – сакратар, сп. Язэп Пітушка, сябра БНА – скарбнік, і сп. Антон Маркевіч, сябра ЗБК – рэфэрэнт рэпрэзэнтацыі.» («Каардынацыйны Камітэт Беларусаў Канады», «Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 107, 1966.)

Першай справай, за якую ўзяўся ККБК, была арганізацыя супольнага для ўсіх беларусаў сьвяткаваньня 48-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларусі. Супольна ўсімі яго сябрамі-арганізацыямі ладзяцца ўрачыстыя адзначэньні й іншых беларускіх нацыянальных сьвятаў, наладжваецца ўдзел у канадыйскім жыцьці.

Канфэрэнцыя – “Rights and Responsibilities.”

У жніўні гэтага-ж 1966 году старшыня ККБК др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч бярэ ўдзел у Антарыйскай канфэрэнцыі на тэму “Rights and Responsibilities” – «Правы й абавязкі». Канфэрэнцыя гэта адбылася ў жніўні 1966 г. у Порт Эльджын у Антарыё.

“The Canadian Family Tree.”

У наступным 1967-м годзе Канада сьвяткуе сваё стагодзьдзе. Canadian Citizenship Branch Department of the Secretary of State рыхтаваў новае пашыранае выданьне

кнігі "The Canadian Family Tree" – «Дрэва Канадыйскай Сям'і». На запросіны Дэпартамэнту Грамадзянства старшыня ККБК др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч апрацаваў для гэтае кнігі артыкул пра Беларусаў у Канадзе. Кніга "The Canadian Family Tree," у якой упершыню фігуруюць беларусы, была выдана Аддзелам Грамадзянства Дзяржаўнага Сакратарыяту і апублікована ў супрацоўніцтве з Камісіяй Стагодзьдзя Канады ў Атаве ў 1967 годзе. (Canadian Citizenship Branch, Department of the Secretary of State and published in co-operation with the Centennial Commission, Ottawa, 1967)

ККБК праводзіць намаганьні, каб у статыстыцы Канады фігуравалі беларусы і каб лік іх у Канадзе быў болей правільна паказаны.

Кангрэс Канадыйскіх Славянаў

У гэтым-жа 1967-м годзе ў чэрвені старшыня ККБК др. В. Жук-Грышкевіч бярэ ўдзел у Другім Кангрэсе Канадыйскіх Славянаў – Second National Conference on Canadian Slavs.

На гэтай канфэрэнцыі, што адбылася ў Атаве 9-11 чэрвеня 1967 г., др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч прачытаў даклад на тэму: «Беларусы й канадзкая статыстыка» – "Belorussians and Canadian Statistics" ("Slavs in Canada, Volume Two, p. 127). У гэтым дакладзе ён разглядае пытаньне, чаму няма беларусаў у канадзкай статыстыцы, і даказвае, што іх у Канадзе ёсьць болей 50-ці тысяч.

Census

Перапіс насельніцтва Канады – Цэнзус – адбываецца кожныя 5 год. Чарговы Цэнзус, пасьля Second National Conference on Canadian Slavs, прыпадаў на 1-га чэрвеня 1971 году. На пачатку гэтага году др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч зьвязваецца з Аддзелам Статыстыкі Канады – Цэнзусам 1971 – і ў супрацоўніцтве зь ім ККБК выдаў у беларускай і ангельскай мовах лістоўкі, якія паясьнялі, як трэба выпаўняць апытальнік Цэнзусу, каб правільна падаваць сваё беларускае паходжаньне. Лістоўкі гэтыя разасланы былі шырака перад Цэнзусам па ўсёй Канадзе на ведамыя адрасы канадыйцаў беларускага паходжаньня.

Гэткую акцыю ККБК праводзіць цяпер перад кожным Цэнзусам.

1968 год – Год Залатога Юбілею БНР

Залаты юбілей БНР Каардынацыйны Камітэт Беларусаў Канады адзначае вельмі ўрачыста й на шырокую скалю. На пачатку гэтага году Старшыня ККБК у «Вестках з Канады» («Весткі з Канады» – «Беларус», нр. 130, 1968) зьвяртаецца з гарачым заклікам да «Суродзічаў Беларусаў», у якім між іншага ён кажа: «І мы – беларуская эміграцыя – можам шмат што зрабіць, каб дапамагчы нашаму народу ў яго імкненьні да незалежнасьці, бо мы жывем у вольным сьвеце й можам свабодна весьці нацыянальную работу, якая там забаронена. Мы, дзеці сваёй Маці Беларусі, да грабовае дошкі ня можам забыцца пра наш абавязак у дачыненьні да яе...» і далей:

«Хай у гэтым юбілейным годзе нашы сэрцы й думкі ськівоўваюцца да нашае супольнае Маці Беларусі, каб мы маглі – кажны з нас, даць сваё зерне працы ў нацыянальна-грамадзкую справу. Хай кожны з нас стараецца быць карысным вязьмом у беларускай арганізацыі, а тыя, што несарганізаваныя, хай паступаюць у беларускую арганізацыю.»

Гэтыя словы якраз цяпер, калі ў Беларусі адбываецца духовае й нацыянальнае адраджэньне, вельмі актуальныя.

Супольнымі сіламі трох арганізацыяў ККБК арганізаваў сьвяткаваньне 50-тых угодкаў БНР 24 сакавіка ў Таронта, а 31-га сакавіка ў Ашаве.

Кіраўніком урачыстага сходу ў Таронта быў старшыня БНА сп. Рыгор Беразоўскі, даклад пабеларуску меў старшыня ККБК др. В. Жук-Грышкевіч, паангельску – сп. Улад. Барановіч.

На як шырокую скалю ККБК ладзіў у Таронта юбілейнае сьвяткаваньне абвешчаньня незалежнасьці БНР, сьведчыць колькасьць прысутных на ім прадстаўнікоў канадзкіх установаў. На акадэміі прамаўлялі такія госьці, як: пасол фэдэральнага парлямэнту Канады др. Станлей Гайдаш, бурмістр Таронта Вільям Дэнісон, пасол парлямэнту Антарыя Г. П. Картон, Сеніор Ліасон Оффісэр на Цэнтральную Канаду сп. Г. П. Ален, прадстаўнік Эстонскай Цэнтральнай Рады ў Канадзе сп. І. Гайнсу, прад-

стаўнік Украінскай Нацыяналнай Фэдэрацыі сп. Настукаш.

А юбілейныя прывітаньні прыслалі: Лестэр Б. Пірсан, Прэм'ер Канады; Пол Мартын, Дзяржаўны Сакратар; Пол Т. Гэльер, Міністар Транспарту; Волтэр Л. Гордон; Робэрт Л. Станфілд, лідар Апазыцыі; Санатар Пол Юзык; Джон П. Робэртс, Прэм'ер Антарыя; Алян Гросман, Міністар Папраўчых Інстытуцыяў; Джон П. Ярэмко, Міністар Сацыяльнай Дапамогі; Робэрт Ф. Ніксон, лідар Апазыцыі ў Антарыё; Дональд Мэк Дональд, лідар НДП у Антарыё; др. Дж. М. Кіршбаўм, Старшыня Фэдэрацыі Этнічнай Прэсы Канады, Старшыня Славацкай Нацыянальнай Рады.

Апрача вышэй успомненых англямоўных, было шмат прывітаньняў ад беларускіх арганізацыяў.

«БНР ці БССР»

50-ты юбілей БНР ня быў забыты й у БССР. У «Голасе Радзімы» нр. 13 за сакавік 1968 г. быў надрукаваны артыкул А. Пятровіча пад загалоўкам «Праўда аб Акце 25 Сакавіка». Артыкул гэты накіраваны на тое, каб зьбіць з нацыянальна-дзяржаўнай сьведамасьці беларусаў у вольным сьвеце й зьнеахвоціць іх да сьвяткаваньня 50-га юбілею абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

На гэты артыкул – на бальшавіцкія напады – старшыня ККБК др. В. Жук-Грышкевіч дае А. Пятровічу адказ у артыкуле «Як паўстаў Акт 25 Сакавіка» ў «Вестках з Канады» – «Беларус» нр. 133 і 134, 1968. і ў працы «БНР ці БССР».

(**В. Жук,** «БНР ці БССР», Нью Ёрк, 1968)

Thinkers' Conference

У гэтым самым 1968 годзе 13-га сьнежня ў Таронта адбылася Канфэрэнцыя ў справе праўнага стану культураў у Канадзе, так званая "Thinkers' Conference." Ад беларусаў браў у ёй удзел старшыня Каардыацыйнага Камітэту Беларусаў Канады др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч. "Thinkers' Conference," якая станоўча адкідала канцэпцыю двукультуралізму і дамагалася прызнаньня шматкультуралізму ў Канадзе, мела вялікае значэньне, бо спрычынілася да ўвя-

дзеньня ўрадам Трудо ў 1971 годзе палітыкі шматкультуралізму ў Канадзе.

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 141, 1968)

Зьмены ў ККБК

«26 студзеня 1969 г. ў Таронта адбылося паседжаньне Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады з удзелам прадстаўнікоў ЗБК, БНА і Беларускай Самапомачы ў Ашаве. Дасюлешні старшыня ККБК др. В. Жук-Грышкевіч зрэзыгнаваў із старшынства ККБК, матывуючы тым, што ягонае становішча заступніка старшыні Рады БНР, якое ён займае ад мінулага красавіка, можа выклікаць засьцярогі сяброў ККБК зь іншымі палітычнымі паглядамі, што некарысна адбілася-б на працы ККБК. Прадстаўнікі БНА і Беларускай Самапомачы ў Ашаве не згаджаліся з асьведчаньнем д-ра В. Жук-Грышкевіча й настойвалі, каб не адмаўляўся, на што ён, падзякаваўшы за давер, заявіў, што для ККБК будзе лепш, калі старшынём яго будзе асоба менш заангажованая палітычна.

Пасьля дыскусіі прадстаўнікі арганізацыяў пастанавілі, што старшынства ў ККБК на працяг аднаго году будуць займаць па чарзе старшыні арганізацыяў – сяброў ККБК. Такім чынам, старшынём ККБК на 1969 год стаўся старшыня БНА сп. Язэп Пітушка.»

(«Зьмены ў ККБК», «Беларус», Нью Ёрк, 142, 1969.)

Бел-чырвона-белы сьцяг ля ратушы Таронта

У 1970 годзе стараньнем ККБК на 25 Сакавіка ля ратушы Таронта першы раз у гісторыі Канады быў узьняты беларускі нацыянальны бел-чырвона-белы сьцяг, а Мэр Таронта Віліям Дэнісон выдаў праклямацыю, што абвяшчала дзень 25-га Сакавіка «Днём Незалежнасьці Беларусі».

З таго часу кожны год на дзень 25-га сакавіка стараньнем ККБК ля ратушы Таронта ўзьвіваецца беларускі нацыянальны бел-чырвона-белы сьцяг. На працягу апошніх болей дзесяці год праводзіць усе патрэбныя на гэта захады сябра Выканаўчага Камітэту ККБК сп. Паўлюк Пашкевіч.

Новыя арганізацыі ў ККБК – 1970-я гады

У артыкуле «Каардынацыйны Камітэт Беларусаў Канады», надрукаваным у «Беларусе» нумар 181, 1972, між іншым гаворыцца:

«На паседжаньні Рады ККБК 14 лютага 1971 году паступілі дзьве вусныя заявы аб уступленьні ў сябры ККБК: Саюзу Беларускае Моладзі Канады й Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ў Канадзе. Сакратар прачытала Статут ККБК, і дзьве новыя арганізацыі былі прынятыя ў ягоныя рады. І гэтак ККБК, папоўнены маладымі сіламі СБМК і інтэлектамі БІНіМК, прарабіў у 1971 годзе не малую работу.

Апрача ўрачыстасьцяў, зьвязаных з 53-ай гадавінай Абвешчаньня Незалежнасьці БНР, якія абымалі: Праклямацыю Мэра Таронта, што абвяшчала чацьвер, 25 сакавіка, 1971, «Беларускім Днём», узьняцьце Беларускага Нацыянальнага Сьцягу ля Ратушы Таронта, і Урачысты Сход беларускага грамадзтва Канады й гасьцей з ЗША, ККБК правёў «кампанію» перад ЦЭНЗУСАМ КАНАДЫ 71. «Кампанія» гэта, ці проста падрыхтоўка да перапісу насельніцтва Канады, палягала перш за ўсё на перапісцы з Дырэктарам Цэнзусу. Перапіска мела на мэце палепшаньне статусу беларусаў пры перапісі насельніцтва Канады...

На парадку дня паседжаньня Рады ККБК 30 студзеня 1972 г. былі пастаўленыя аснаўныя дзьве справы: 1. Сьвяткаваньне 54-е гадавіны 25 Саклавіка й 2. Справа фондаў, якія Канадзкі Фэдэральны ўрад прызначае для разьвіцьця культураў паасобных этнічных групаў Канады. Стварэньне гэтых фондаў – гэта першы крок правядзеньня ў жыцьцё нядаўна абвешчанай Прэм'ерам Трудо палітыкі «Шматкультуралізму» Канады. На гэтую мэту Фэдэральны Урад вызначыў да сакавіка 1973 г. панад мільён далараў. Стыпэндыю можа атрымаць кажная арганізацыя ці група, якая прадставіць свой праект працы, які будзе адказваць палітыцы шматкультуралізму,» – гаворыцца ў вышэй успомненым артыкуле: «Каардынацыйны Камітэт Беларусаў Канады», «Беларус» нр. 181, за 1972 год. Артыкул падпісаны: Сакратар ККБК. Сакратар ККБК – аўтар гэтых радкоў.

Магчымасьці атрыманьня ад Фэдэральнага Ураду для этнічных групаў Канады стыпэндыяў – «грантаў» прасту-



У павільёне «МЕНСК» Каравану Таронта. 1975.



Павільён «МЕНСК» Каравану Таронта. 1975.



Удзельнікі мастацкай часткі павільёну «МЕНСК» Каравану Таронта.

дыяваў В. Жук-Грышкевіч у «Канэдыен Сін» за 4 лютага 1972 і пастанавіў выкарыстаць іх і для беларусаў Канады. У наступным, 1973 годзе, з нагоды сваіх 70-х угодкаў жыцьця, і 50-х – нацыянальна-грамадзкай і палітычнай дзейнасьці, В. Жук-Грышкевіч заснаваў Фонд Беларускіх Падручнікаў. Дзякуючы працы гэтага фонду і дзякуючы фэдэральнай субсыдыі – «гранту» ў суме шаснаццаці тысяч даляраў, Выдавецкі Камітэт пры ККБК выдаў у 1974-1978 гадох два тамы англямоўнага падручніка **"Fundamental Byelorussian" – «Беларуская Мова»,** аўтарства Валентыны Пашкевіч.

Старшынём ККБК на пачатку 1970-х гадоў быў выбраны др. Барыс Рагуля, які застаўся на гэтым становішчы аж да Агульнага Сходу ККБК 19 сакавіка 1989 году.

Саюз Беларускай Моладзі Канады ў 1970-х гадох быў вельмі дзейным – браў удзел у «Караване», арганізаваў, ад 1971 да канца 70-х гадоў, павільён **МЕНСК,** што месьціўся ў Беларускім Рэлігійна-Грамадзкім Цэнтры ў Таронта. (524 St. Clarens Ave. Toronto)

Мэмарандум у справе дэкалянізацыі СССР

У 1976 годзе была створана сусьветная арганізацыя – Канфэрэнцыя Вольных Беларусаў, у якой Канаду рэпрэзэнтаваў Каардынацыйны Камітэт Беларусаў Канады. Ува ўправу «Канфэрэнцыі» ўвайшоў як старшыня др. Барыс Рагуля, (старшыня ККБК), як сакратар – сп. Паўлюк Пашкевіч, магістар палітычных навукаў (мае Master's Degree in Political Science), заступнік старшыні ККБК. Прадстаўнікі балцкіх і ўкраінскае сусьветнных арганізацыяў запрасілі беларусаў Канады далучыцца да іх, каб узяць удзел у апрацаваньні мэмарандуму да Галоўнае Асамблеі Задзіночаных Нацыяў у справе дэкалянізацыі Савецкага Саюзу.

У нарадах і працах прадстаўнікоў вышэй названых арганізацыяў, што адбываліся ў Таронта ў Канадзе, ад беларусаў браў удзел сп. Паўлюк Пашкевіч, які ў гэтай справе быў у сталым кантакце із Старшынём Рады БНР др-ам В. Жук-Грышкевічам.

У выніку двухгадовай працы прадстаўнікі пяцёх сусьветных арганізацыяў апрацавалі й выдалі ў Таронта мэмарандум да Галоўнай Асамблеі Задзіночаных Нацыяў у справе дэкалянізацыі Савецкага Саюзу ў форме кнігі на 150 бачын з далучэньнем дакумэнтацыі.

20 лістапада 1978 г. у Нью Ёрку адбылася ў гэтай справе прэсавая канфэрэнцыя, а 22-га лістапада – перадача Мэмарандуму адпаведнай Камісіі Задзіночаных Нацыяў.

(Паводле Пратаколу 15-ай Юбілейнай Сэсіі Рады БНР 25 лістапада 1978)

Да найважнейшай дзейнасьці ККБК (апрача сьвяткаваньня беларускіх нацыянальных сьвятаў) належыць:

1. **Скарэгаваньне** ў 1979 годзе скандалічнае на нашую некарысьць **памылкі ў дакумэнтах Крыніц Статыстыкі Канады,** у якіх ад пачатку 1930-х гадоў аж да 1979 году беларуская мова фігуравала як дыялект расейскай. Перапіска ў гэтай справе вялася з галоўным статыстышынам др-ам Пітэрам Кіркгамам, у выніку якое мы атрымалі ад яго ліст наступнага зьместу:

Dear Dr. Žuk-Hryškievič:

Thank you for your letter of November 14, 1979. The documentation attached to your letter is also very useful.

First of all, an investigation in September of the issue raised in your letter of August 11, 1979, **convinced me and my officials that Byelorussian is a separate language, distinct from Russian** (the emphasis is mine – R. Ž.-H.). As I already indicated in my letter of August 29, 1979, the possibility of having a separate code for Byelorussian in 198l will be investigated. It will certainly not be treated as a dialect of Russian. However, as I also indicated, budget constraints may force Byelorussian to be included in the "Other" category, or perhaps a more general "Other Slavic Languages" category.

Even though in 1981 we will not treat Byelorussian as a dialect of Russian, perhaps I might explain why this was done in the 1976 Census. In preparing the language portion of the 1976 Population Code Book, the Library of Congress Classification of Modern European languages (1933) was used to determine the classification of Slavic languages. The 1933 classification was also compared to the classification given in the Index to Languages and Dialects (1957), also compiled by the Library of Congress. The 1957 source indicated no revision to the 1933 classification in which White Russian was classified as a dialect of Russian. As a result, the 1971 assigment of White Russian/Byelorussian as a dialect of Russian was retained. I should

also point out that the Webster's 20th Century Dictionary (unabridged) also defines Byelorussian as "the dialect of Russian spoken in Byelorussia." I have instructed my officials to inform you as to the coding of the Byelorussian language for 1981 when the specifications for this activity are completed.

Again, thank you for interest in the 1981 Census.

Yours sincerely,

Peter G. Kirkham,
Chief Statistician

2. Намаганьні ў тым напрамку, каб у **статыстыцы Канады** фігуравалі беларусы й каб лік іх у Канадзе быў болей правільна паказаны. (Глядзі Разьдзел XVII)

3. Вялікім асягненьнем ККБК было выданьне Выдавецкім Камітэтам пры ККБК у 1974-78 гадох, з дапамогай Фонду Беларускіх Падручнікаў і дзяржаўнай субсыдыі, двох тамоў **англямоўнага падручніка: "Fundamental Byelorussian" – «Беларуская Мова»,** аўтарства Валентыны Пашкевіч. (Справаздачу з «Выдавецкага Фонду Беларускіх Падручнікаў у Канадзе» глядзі ў Разьдзеле XXI.)

4. ККБК рэпрэзэнтаваў беларусаў Канады ў «Канфэрэнцыі Вольных Беларусаў». Заступнік старшыні ККБК сп. Паўлюк Пашкевіч у 1976-1978 гадох браў удзел у працах прадстаўнікоў пяцёх сусьветных арганізацыяў (балтаў, беларусаў і ўкраінцаў) у апрацаваньні мэмарандуму да Галоўнай Асамблеі Задзіночаных Нацыяў у справе дэкалянізацыі Савецкага Саюзу. (Глядзі Разьдзел XXII, 15-я Юбілейная Сэсія Рады БНР.)

5. ККБК ёсьць сябрам **Канадзкай Этнакультурнай Рады** ад пачатку яе заснаваньня ў 1980 годзе. Сяньня гэтая арганізацыя – КЭР налічвае 37 сяброў-арганізацыяў розных этнічных групаў Канады й адыгрывае немалую ролю ў жыцьці краіны. Зь ёю лічыцца ўрад Канады й часткова субсыдуе яе дзейнасьць. Старшыня ККБК ёсьць сябрам "Board of Presidents of the Canadian Ethnocultural Council."

6. У сакавіку 1989 году ККБК зарганізаваў **1-ю Канфэрэнцыю Прадстаўнікоў Беларускіх Асяродкаў Канады.** На гэтую мэту ён атрымаў ад Сакратарыяту Канады, Аддзелу Шматкультуралізму 11,000.00 даляраў субсыдыі. Канфэрэнцыя адбылася 18-19 сакавіка 1989 году ў гась-

ціньніцы Skyline Triumph Hotel, 2737 Keele Street, Toronto, Ontario. У Канфэрэнцыі ўзялі ўдзел беларусы з правінцыяў: Антарыя, Квэбэку, Брытыйскай Калюмбіі й Саскачэван. Мэтай канфэрэнцыі было ўзмоцніць арганізацыйнае жыцьцё беларускай этнакультурнай групы Канады актывізацыяй прадстаўнікоў малодшага яе пакаленьня.

Адкрыў канфэрэнцыю старшыня ККБК др. Барыс Рагуля. Ён падзякаваў Канадыйскаму Фэдэральнаму Ўраду за субсыдыю ды пажадаў канфэрэнцыі памыснай працы. Хвілінай маўчаньня аддана была пашана памяці памерлага 14 лютага 1989 г. др-а Вінцэнта Жук-Грышкевіча, закладчыка Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады й былога Старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі.

На канфэрэнцыі было прачытана пяць дакладаў: 1. «Арганізацыйнае разьвіцьцё» – дакладчык сп. Расэл Бартон зь Міністэрства Шматкультуралізму; 2. «Удзел моладзі» – сп-ня Джуды Пол; 3. «Ажыўленьне заціхлых арганізацыяў» – сп-ня Эльвіра Санчэз дэ Маліцкі; 4. «Узгадаваньне лідэраў» – др. Вітаўт Кіпель, старшыня Беларускага Інстытуту Навукі і Мастацтва ў Нью Ёрку. 5. «Захаваньне й разьвіцьцё беларускай культурнай спадчыны ў Канадзе» – сп. Ганы Гасан.



Сп-ня Эдна Андэрсон, сябра Парлямэнту Канады, у кватэры Жук-Грышкевічаў уручае дзяржаўную датацыю др. Раісе Жук-Грышкевіч, сакратару-скарбніку Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады.

Першы дзень канфэрэнцыі закончыўся банкетам, на якім прамаўляў упераплёт пабеларуску й паангельску др. Ян Запруднік, Галоўны Рэдактар газэты «Беларус». Ягоная патрыятычная прамова была завяршэньнем настрою, вытваранага дакладамі й дыскусіямі ў ходзе канфэрэнцыі.

Наступнага дня адбылася пленарная сэсія й Агульны Сход ККБК. Выбраны быў новы Выканаўчы Камітэт ККБК у складзе: др. Раіса Жук-Грышкевіч – старшыня, сп. Уладзімір Рагуля – заступнік старшыні, сп-ня Юльяна Грыцук-Мэкарскі – сакратар, сп. Паулюк Пашкевіч – скарбнік, і сп-ня Івонка Сурвіла – рэфэрэнт рэпрэзэнтацыі. У Наглядную Раду ўвайшлі: сп. сп.: Роланд Цялеш, Антон Маркевіч і Алесь Палескі.

7. **Арганізацыя дапамогі ахвярам Чарнобылю ў Беларусі** сталася адной з найважнейшых справаў, якой заняўся ККБК пасьля Агульнага Сходу 19-га сакавіка 1989 году. У гэтым-жа 1989 годзе ў Атаве стараньнем рэфэрэнта рэпрэзэнтацыі сп-ні Івонкі Сурвілы, з удзелам спадарынь: др. Зінаіды Гімпелевіч-Шварцман і Паўліны Пашкевіч-Смітс, заснаваны быў «Канадыйскі Фонд Дапамогі Ахвярам Чарнобылю ў Беларусі» – "Canadian Relief Fund for Chernobyl Victims in Byelorussia." У 1990 г. Фонд гэты атрымаў "Charity Status," які дазваляе ахвярадаўцам ужываць паквітаваньні для мэтаў дзяржаўнага падатку.

ККБК супрацоўнічаў і зь «Беларускім Камітэтам Дапамогі Ахвярам Радыяцыі» ў Лёндане, Англіі.

26 красавіка 1990 году на 4-я ўгодкі чарнобыльскай трагэдыі перад парлямэнтам Антарыя ў Таронта адбыўся жалобны мітынг, у якім, стараньнем ККБК, бралі ўдзел беларусы зь бел-чырвона-белымі сьцягамі, а старшыня ККБК др. Раіса Жук-Грышкевіч выступала з прамовай, гаварыла аб трагічнай сытуацыі ў Беларусі, спрычыненай чарнобыльскай аварыяй.

Гэтыя сумныя ўгодкі былі адзначаны й багаслужбай на інтэнцыю ахвяраў Чарнобылю ў Беларусі ў каталіцкай царкве Сьв. Марыі ў Бэры, Антарыё.

8. **2-я Канфэрэнцыя** Прадстаўнікоў Беларускага Грамадзтва Канады, якая адбылася 4-5 травеня 1991 г., як і папярэдняя, у гасьціньніцы Skyline Triumph Hotel, адзначала:

25-я ўгодкі Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады. На арганізацыю канфэрэнцыі ККБК атрымаў ад Сакратарыяту Канады, Аддзелу Шматкультуралізму субсыдыю ў суме 9,270.00 даляраў.

У канфэрэнцыі ўзялі ўдзел прадстаўнікі беларускага грамадзтва з 6-цёх правінцый Канады: Брытыйскай Калюмбіі, Альбэрты, Манітобы, Антарыя, Квэбэку й Нью Брансвіку. Было прачытана сем дакладаў:

1. «Праграма Шматкультуралізму й здабыванье сродкаў» – сп.Расэл Бартон, прадстаўнік Міністэрства Шматкультуралізму.
2. «Палітычная й культурная сытуацыя ў Беларусі й яе ўплыў на жыцьцё беларускай эміграцыі ў Канадзе» – др. Ян Запруднік.
3. Даклад сп-ра Р. Бартана на працоўнай сэсіі моладзі аб стварэньні камітэту моладзі.
4. «Беларуская эміграцыя ў Канаду да другой сусьветнай вайны» – Др. Вітаўт Кіпель.
5. «Стан быцьця: Перагляд дэфініцыі: хто мы такія, беларускія канадыйцы» – сп-ня Марыя Сурвіла-Вахман.
6. «Наступствы Чарнобылю ў Беларусі» – сп-ня Івонка Сурвіла і відэа-фільм канадзкіх журналістаў з Альбэрты.
7. «На 25-я ўгодкі ККБК – Агляд гісторыі ККБК» – др. Раіса Жук-Грышкевіч, старшыня ККБК.

Свой 25-ты юбілей ККБК адзначыў і выражэньнем прызнаньня заслугаў аўтарцы англямоўнага падручніка «Беларуская Мова», сп-ні Валентыне Пашкевіч лістом наступнага зьместу:

BYLORUSSIAN CANADIAN COORDINATING COMMITTEE

КААРДЫНАЦЫЙНЫ КАМІТЭТ БЕЛАРУСАЎ КАНАДЫ

54 Mary Street, Barrie, Ont. L4N 1T1; Tel. (705) 728-7581

Таронта, 4 травеня, 1991 году

Яе Міласьці Спадарыні
Валентыне Пашкевіч
у Таронта, Канадзе.

Вельмі Паважаная Спадарыня Пашкевіч,

Пры нагодзе 25-га юбілею Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады ад імя гэтае арганізацыі ды Выдавец-

кага Камітэту пры Каардынацыйным Камітэце Беларусаў Канады мы выражаем Вам – шматгадовай настаўніцы беларускай суботняй школы ў Таронта, аўтарцы англямоўнага падручніка «Беларуская Мова» – "Fundamental Byelorussian," складальніцы першага беларуска-ангельскага слоўніка – нашае прызнаньне Вашых заслугаў й падзяку за Ваш уклад у захаваньне, разьвіцьцё й прапагаваньне беларускай мовы ў Канадзе. Ваш уклад у беларусістыку тым больш важны й цэнны сяньня, калі наша родная беларуская мова, дзеля безагляднай русыфікацыі на Бацькаўшчыне, знаходзіцца на мяжы пагібелі.

Гэтаксама мы вітаем Вас з 75-м юбілеем Вашага жыцьця, жадаем Вам добрага здароў'я й творчых сілаў закончыць Вашую манумэнтальную працу над складаньнем беларуска-ангельскага слоўніка і ўбачыць яго ў прыгожым выданьні на Вашым собскім працоўным стале.

З глыбокай пашанай да Вас,

Др. Раіса Жук-Грышкевіч
Старшыня ККБК

Др. Барыс Рагуля
Старшыня Выдавецкага
Камітэту пры ККБК

* * *

Абедзьве Канфэрэнцыі мелі на мэце ажывіць арганізацыйнае жыцьцё беларускага грамадзтва, заангажаваць да яго малодшае пакаленьне, каб беларуская культура не пераставала быць інтэгральнай часткай шматкультурнай мазаікі Канады.

Сяньня, у 1991 годзе, сябрамі ККБК ёсьць: Згуртаваньне Беларусаў Канады, Беларуская Самапомач у Ашаве, Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва ў Канадзе, Згуртаваньне Беларусаў Правінцыі Квэбэку і Парафія Сьв. Кірылы Тураўскага ў Таронта.

На сьяткаваньні **25-х угодкаў ККБК** – на 2-ой канфэрэнцыі – 5-га траўня 1991 году, старшыня яго др. Раіса Жук-Грышкевіч закончыла свой даклад славамі:

«Жадаю Каардынацыйнаму Камітэту Беларусаў Канады актыўнай і творчай будучыні, жадаю каб ККБК ахапіў беларускія асяродкі па ўсёй Канадзе й стаўся «амбрэляй» канадыйцаў беларускага паходжаньня ад Атлянтыку да Ціхага акіяну.

Жадаю ўсім беларусам канадыйцам беларускага паходжаньня помніць аб сваіх карэньнях, аб сваім беларускім паходжаньні і аб гэтым сказаць у Цэнзусе (перапісі насельніцтва Канады) 4-га чэрвеня 1991 году.

Жадаю, каб мы, будучы карыснымі грамадзянамі Канады, не забывалі аб нашым абавязку й у адносінах да нашай Бацькаўшчыны-Беларусі».

9. Урачыстае сьвяткаваньне 100-х угодкаў ад нараджэньня Максіма Багдановіча ККБК ладзіў 15 сьнежня 1991 г. у залі Беларускага Рэлігійна-Грамадзкага Цэнтру ў Таронта. У праграме імпрэзы былі: выстаўка й даклад старшыні ККБК др. Р. Жук-Грышкевіч, прысьвечаныя жыцьцю й творчасьці «Песьняра Красы».

XVI. ДАЛЕЙШЫ ХОД 60-Х ГАДОЎ

48-я ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларусі

Сьвяткаваньне арганізаваў нова-ўканстытуаваны, 16-га студзеня 1966 году Каардынацыйны Камітэт Беларусаў Канады. «Шмат працы ўлажыў ККБК, – кажа ў справаздачы із сьвяткаваньня др. В. Жук-Грышкевіч, старшыня ККБК – як і Тарантонскія сябры ЗБК і БНА, затое й вынікі былі добрыя: багатая праграма й панад дзьвесьце асоб прысутных на акадэміі. Гэта доказ, што можна зрабіць супольнымі сіламі...»

«...Урачыстая акадэмія – гаворыцца далей у справаздачы – адбылася папаўдні ў прасторнай Славацкай залі на вуліцы Дандас. Адчыніў акадэмію др. В. Жук-Грышкевіч. Ён прывітаў гасьцей і прысутных суродзічаў, выясьніў значэньне Акту 25 Сакавіка й сьвяткаваньня ўгодкаў яго, пасьля чаго перадаў вядзеньне акадэміі сп. М. Кухарчыку, сакратару ККБК. Даклад на тэму дня меў др. Б. Рагуля – паангельску й пабеларуску.

З гасьцей прамаўлялі: Антарыйскі Міністар Ален Гросман, др. Станлей Гайдаш – фэдэральны пасол і парлямэнтарны сакратар міністра Паўночных Справаў і Нацыянальных Рэсурсаў. Ён прачытаў і прывітальны ліст прэм'ера Канады Лестэра Б. Пірсана; Езэф Броўсэк – сябра Рады Вольнай Чэхаславаччыны; сп. Іван Палка – ад Украінскага Канадзкага Камітэту; сп. Мілан Якубец – ад Мючуэл Коопэрэйшын Лігі, Дастойны Айцец Ніколае Таннасэ – ад румынскай этнічнай групы.

Мастацкая частка, за выняткам двух нумароў, належала да моладзі. Моладзь грала, танцавала й дэклямавала. 17 дзяўчат і хлапцоў у прыгожых нацыянальных строях красавала на сцэне, чаргуючыся між сабой, ды двума старэйшымі выканаўцамі...»

Далей у справаздачы ідзе апісаньне багатай мастацкай праграмы; пералік 18-ці прывітальных лістоў ад прадстаўнікоў Фэдэральнага й Антарыйскага Урадаў, прадстаўнікоў управы гораду Таронта й іншых канадзкіх арганізацыяў ды агульная падзяка «Усім тым беларускім арганізацыям у вольным сьвеце, якія прыслалі прывітаньні з днём

абвешчаньня незалежнасьці Беларусі Каардынацыйнаму Камітэту Беларусаў Канады, Згуртаваньню Беларусаў Канады й Беларускаму Нацыянальнаму Аб'еднаньню».

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 108-109, 1966. Із справаздачы В. Жук-Грышкевіча.)

З успамінаў аб 25 Сакавіку

В. Жук-Грышкевіча

«Ужо 48-ыя ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларусі! А было-ж гэта нядаўна, здаецца, бо-ж на маёй памяці быў абвешчаны Акт 25-га Сакавіка.

Вучыўся я тады ў Беларускай Гімназіі ў Будславе й былі ў нас тады немцы. У канцы сакавіка хтось з настаўнікаў прыехаў зь Менску (М. Шыла, ці Лышчук – ня памятаю) і ўсім сабраным вучням і бацьком іх расказаў пра гістарычнае паседжаньне Рады БНР і прачытаў Акт 25 Сакавіка. Пасьля гаварыў дырэктар гімназіі Васілевіч, ён тлумачыў нам значэньне гэтага Акту. Тады вучні дэклямавалі вершы (я дэклямаваў «Разьвейся туман» Янкі Купалы), гімназіяльны хор прасьпяваў некалькі песьняў, а вучыцелька французскай мовы засьпявала солё штось небеларускае, клясычнае.

Ад таго часу прайшло 48 год. 48-мы раз сьвяткуюцца нашы слаўныя ўгодкі й 47 разоў былі адсьвяткаваны ў розных абставінах і ў розных мясцох. Кажны беларус ці беларуска ў вольным сьвеце можа прасачыць на аснове сваіх успамінаў аб сьвяткаваньнях угодкаў 25 Сакавіка пэўную частку свайго жыцьця й свайго ўдзелу ў беларускім грамадзкім жыцьці, а разам з тым адтварыць сваю вельмі цікавую гісторыю, ці, лепш, свой фрагмэнт гісторыі беларускага вызвольнага руху.

Кажны год, калі набліжаецца дата 25-га сакавіка, хоцькі-няхоцькі ўпадаеш у роздум, думкамі ськівоўваешся ў мінулае сваё й нацыянальнае, адтвараеш паасобныя сьвяткаваньні 25-га Сакавіка – дзе й пры якіх абставінах адбыліся. Каб сабраць гэтыя ўспаміны нас усіх – утварылася-б цікавая мазайка геаграфічна-палітычна-гістарычная, падмацаваная натаўпам перажываньняў... А падыспадам усяго гэтага, як пласт гліны, ляжыць вялікая цягучая туга, туга па нечым блізкім, родным, вялікім – у чым маладосьць, і радасьць, і жыцьцё.

Як я прыпамінаю сабе, дык з гэтых 47-мі сьвяткаваньняў я ня браў удзелу ў васьмёх. Тры зь іх пражыў у савецкай турме й лягерох, чатыры ў чужым войску й адно пасьля цяжкой хваробы дома. Але й гэтыя ўгодкі без грамадзкага беларускага акружэньня ня былі зусім пустымі. Былі са мной і цікавыя думкі, і жывыя гутаркі з рознымі сябрамі лёсу.

З рэшты-ж сьвяткаваньняў – на 16-цёх я быў у Вільні, на 4-ох у Празе, на 3-ох у Лёндане ў Англіі, на адным у Лювэне ў Бэльгіі, на двох у Мюнхэне і на адзінаццацёх у Таронта. Кажнае з гэтых сьвяткаваньняў – гэта асобная цікавая падзея. Найбольш сьветлымі выступаюць у маёй памяці сьвяткаваньні ў Вільні, асабліва-ж за вучнёўскіх часоў на пачатку 20-ых гадоў. Падзялюся тут успамінамі, хоць аб адным зь іх – з 1921 году.

Быў я тады вучнем 1-ай Віленскай Беларускай Гімназіі. Дзень 25 Сакавіка быў сьвятам і ніколі не адкладаўся, нават калі прыпадаў на будні дзень. Заняткаў у гэты дзень ня было, але ўсе вучыцялі й вучні прыходзілі ў гімназію бяз кніжак, апранутыя ў найлепшае. Прыходзілі на 9-ую гадзіну раніцы. Усе вучні, бяз розьніцы – праваслаўныя ці каталікі, шэрагамі йшлі ў праваслаўную царкву – Сабор Сьвятога Духа. (У 30-ых гадох – у гістарычную Пятніцкую царкву – беларускую парахвіяльную). Толькі жыды не прылучаліся да шэрагаў, але шмат якія зь іх ішлі ўсёж у царкву вольнымі групамі. На багаслужбу ў царкву прыходзілі ў шэрагах і дзеці зь беларускіх пачаткавых школ, якіх тады ў Вільні было, здаецца, сем. Зьбіралася ў царкве й шмат грамадзтва, таксама бяз розьніцы веры. Прыходзілі ў царкву ў строі й жаўнеры Асобнага Беларускага Батальёну, які стаяў тады ў Вільні. Вялічэзная царква была перапоўнена.

Багаслужба была вельмі ўрачыстая. Служыў сам архірэй у асысьце сьвятароў і манахаў. Сьпяваў архірэйскі хор. Маліліся за Беларусь. Адзін із сьвятароў гаварыў казаньне на тэму дня пабеларуску.

Пасьля багаслужбы ў праваслаўнай царкве ўсе бяз вынятку ішлі ў касьцёл сьв. Мікалая на каталіцкую імшу. Які сьвятар служыў тады, не прыпамінаю, але добра помню, што казаньне меў ксёндз Адам Станкевіч, настаўнік нашай гімназіі. Ксёндз Адам ведамы быў з красамоўства, дык можна ўявіць, які настрой вытвараўся ў вернікаў ад ягонага патрыятычнага казаньня. Хор вучняў ка-

талікоў сьпяваў у часе багаслужбы беларускія рэлігійныя гімны.

Пасьля каталіцкай багаслужбы – школьнікі й жаўнеры ў шэрагах, а грамадзтва вольна – усе накіроўваліся ў Беларускую Гімназію, на ўрачыстую акадэмію..

Адчыніў урачысты сход дырэктар гімназіі М. Каханоўіч, а прамову аб Акце 25-га Сакавіка меў Антон Луцкевіч. Заля была бітком набіта вучнямі, бацькамі іх, жаўнерамі й грамадзтвам.

У мастацкай частцы вучні выступалі з дэклямацыямі, а гімназіяльны хор – зь песьнямі. Выступалі й артыстыя зь Беларускай Драматычнай Майстэрні, якая тады была ў Вільні. Яна рабіла частыя пастаноўкі ў розных залях, але пераважна ў Беларускім Грамадзкім Клюбе й Беларускай Гімназіі. На заканчэньне акадэміі ўсе пяялі тадышні беларускі нацыянальны гімн «Не пагаснуць зоркі ў небе».

Пасьля акадэміі ўсе разыходзіліся, апрача вучняў гімназіі, што атрымоўвалі дажыўленьне. Спадарыня Арсеньнева (матка нашай Паэткі) давала ім гарачую зупу. З прадуктамі ў Вільні было тады яшчэ цяжкавата, і шмат якіх вучняў трэба было дакормліваць. Займалася гэтым Беларускае Дабрадзейнае Таварыства, якое атрымоўвала крыху прадуктаў з амэрыканскай дапамогі жыхаром Вільні.

Вечарам была ўрачыстасьць у Беларускім Грамадзкім Клюбе на Біскупскай вуліцы. Гэтая ўрачыстасьць мела шырэйшы, палітычны характар. Там зьбіраліся беларускія дзеячы, паважнейшае грамадзтва, студэнты ўніверсытэту й іншанацыянальныя госьці. Тут спачатку была акадэмія з дакладам і прывітальнымі прамовамі прадстаўнікоў ад беларускіх, летувіскіх, жыдоўскіх і польскіх арганізацыяў. Польскія прадстаўнікі былі ад Віленскіх Краёвых Дэмакратаў і партыі «Вызваленьне». Далей ішла мастацкая частка з рэцытацыямі артыстых, салёвымі сьпевамі й музычнымі нумарамі. Выступалі такія артысты, як Ганна Душэўская, Ніна Сасноўская, Франьцішак Аляхновіч, Пракулевічыха й іншыя. Увесь вечар – у прыгожай, удэкараванай залі – меў узьнёслы характар. Паважанай публікі ў вячорных строях было шмат, дык мы, вучні старэйшых клясаў гімназіі, якім дазволена было быць у клюбе толькі таму, што мы бралі ўдзел у мастацкай частцы, чуліся зьбянтэжанымі.

Паважная атмасфэра крыху расслаблівалася ў часе банкету, які адбываўся пасьля акадэміі. Сябры Клюбу,

госьці – прадстаўнікі арганізацыяў, сваіх і чужых, прэсы й удзельнікі мастацкай часткі – былі запрошаныя за расстаўленыя сталы з выпіўкай і закускай, а рэшта публікі частавалася ў ваграмадным буфэце ў другой залі. У часе банкету таксама былі прамовы.А як зайграла аркестра, маладзейшыя йшлі танцаваць, а старэйшыя заставаліся ў гутарках пры сталох або ішлі на каньяк у буфэт. Забава трывала амаль да раньня.

Было гэта ўсё пад польскай акупацыяй, але ў 1921 годзе акупацыя гэта не пасьпела яшчэ разгарнуць сваёй жорсткай палітыкі на «крэсах», дык тады яшчэ было шмат і беларускіх арганізацыяў і шмат дзейных людзей у Вільні, якія ня надта лічыліся з акупацыяй. Таму й сьвяткаваць маглі і шырэй, і вальней. **В. Жук.**»

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 108-109, 1966.)

17-ты Агульны Гадавы Зьезд Згуртаваньня Беларусаў Канады

У сваёй справаздачы із 17-га Зьезду ЗБК, што адбыўся 28 травеня 1966 году ў Таронта, («Весткі з Канады» – «Беларус», 111-112, 1966), Вінцэнт Жук-Грышкевіч піша:

«...З прывітаньнямі Зьезду выступілі др. В. Жук-Грышкевіч ад Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады і сп. В. Целеш ад Царкоўнай Рады.

Із справаздачаў аддзелаў ЗБК, Галоўнае Управы і Нагляднае Рады выявілася, што за мінулы год ЗБК зрабіла вялікую работу, выконваючы маль поўнасьцяй свой гадавы плян працы. Апрача звычайнай бягучай працы, была ўпрыгожана заля БР-ГЦэнтру, створана новая арганізацыя – Задзіночаньне Беларускіх Жанчын, зарганізаваны Каардынацыйны Камітэт Беларусаў Канады, адноўлены танцавальны гурток, аздароўлены «Весткі з Канады». Апрача ўдзелу ЗБК у сьвяткаваньні 25 Сакавіка, якое ладзіў ККБК, была зьвернута належная ўвага й на беларусаведу: адбылося некалькі дакладаў з угодкамі Багушэвіча й Цёткі ўлучна, ды праведзены кароткі курс беларускай мовы для дарослых. ЗБК брала ўдзел у працах Канэдыен Цэнтэнары Каўнсіл як сябра гэтай агульнаканадзкай арганізацыі; шкада толькі, што абмежаванасьць сродкаў не дала магчымасьці дла ЗБК здабыцца на ўласны будаўні-

чы праект на стагодзьдзе Канады. Была зьвернута ўвага й на таварыскае жыцьцё: ладзіліся прынагодныя бяседы й сяброўскія імпрэзы.

Да слабейшых пунктаў у выкананьні пляну працы трэба аднесьці недахоп беларускай школы для дзяцей. Школа праіснавала коратка й нерэгулярна. Што да арганізацыі моладзі, дык справа гэта, хоць і вельмі скамплікаваная, але скранулася зь месца. Зроблены былі паважныя высілкі, дзякуючы якім адноўлены быў танцавальны гурток моладзі ды ўдалося ўцягнуць моладзь у сьвяткаваньне 25-га Сакавіка. Стварэньне-ж арганізацыі моладзі – гэта наступны этап...

У справе пляну працы на новую кадэнцыю Зьезд даручыў новай Галоўнай Управе канкрэтныя заданьні: 1. Утрымаць усе пазыцыі,дасягнутыя ў мінулым годзе. 2. Завяршыць арганізацыю моладзі. 3. Зарганізаваць удзел ЗБК у сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі ў верасьні ў Клівэляндзе. 4. Усімі магчымымі сродкамі ўзяць удзел у сьвяткаваньні стагодзьдзя Канады й канцэрце на Сусьветнай Выстаўцы ў Монтрэалі. Паколькі-ж гэта справа агульна-беларускай рэпрэзэнтацыі, старацца прыцягнуць да яе нашых суродзічаў з ЗША й эвэнтуальна зрабіць у 1967 годзе надзвычайнае спатканьне Беларусаў Паўночнае Амэрыкі ў Канадзе. 5. Зьвярнуць увагу на арганізацыю й працу аддзелаў ЗБК. 6. Старацца выкупіць гіпатэку (моргідж) на доме БР-ГЦ. 7. Утрымаць на належнай вышыні газэту.

Мінулы год у працы ЗБК быў вельмі плённы. Дай-жа Божа, каб бягучы год быў яшчэ пляньнейшым.

Зьезд закончыўся адсьпяваньнем нацыянальнага гімну.»

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 108-109, 1966). Артыкул не падпісаны, але пісаў яго рэдактар «Вестак з Канады» В. Жук-Грышкевіч.)

60-я ўгодкі «Нашай Нівы»

Гэтыя так важныя для беларускага адраджэньня ўгодкі адзначала Згуртаваньне Беларусаў Канады ў Таронта 30-га кастрычніка 1966 г. Др. В. Жук-Грышкевіч меў даклад. Апрача таго ў «Вестках з Канады» – «Беларусе» 115, 1966 г., ён падаў два свае артыкулы: «Заснавальнікі й Рэдактары ‹Нашай Нівы›» і «Успамін пра ‹Нашу Ніву› з роднага Будслава». Падаем іх тут ніжэй:

«Заснавальнікі й рэдактары ‹Нашай Нівы›

Адзначаючы 60-я ўгодкі ‹Нашай Нівы›, мы ў першую чаргу мусім ушанаваць памяць заснавальнікаў й рэдактароў яе, усьведаміць сабе іх вялікія чыны, іх вялікія заслугі.

‹Наша Ніва›, як і яе папярэдніца ‹Наша Доля›, была ворганам Беларускае Сацыялістычнае Грамады. У 1906 годзе ў цэнтральны камітэт гэтай першай беларускай палітычнай партыі ўваходзілі браты Іван і Антон Луцкевічы, В. Іваноўскі й А. Бурбіс. Яны былі закладчыкамі ‹Нашай Долі› й ‹Нашай Нівы›.

Рэдакцыя ‹Нашай Нівы› складалася зь Івана й Антона Луцкевічаў і Аляксандра Уласава. Гэтыя тры асобы ня выпадкова ўвайшлі ў рэдакцыю ‹Нашай Нівы›. Браты Луцкевічы былі маторам усяго тагачаснага беларускага руху, на іх адказнасьці была газэта й яны фактычна рэдагавалі яе. А. Уласаў быў фармальным рэдактарам. Роля гэта прыпала яму таму, што ён быў памешчыкам і, як такі, у вачох царскай улады ўважаўся за больш ‹благанадзёжнага›.

Браты Луцкевічы – гэта сапраўдныя волаты беларускага адраджэньня. Яны былі тварцамі й інспіратарамі адраджэнскай ідэялёгіі, арганізатарамі беларускага грамадзтва, палітычнага й культурнага жыцьця, вучыцелямі нарастаючых пакаленьняў беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў, грамадзкіх і палітычных дзеячоў. Яны стаялі на старожы ўсяго беларускага руху, здабывалі для яго матар'яльную базу, вышуківалі выхады ў найцяжэйшых сытуацыях у найцяжэйшых часох.

Шчасьліва склалася, што браты Луцкевічы запачаткавалі Нашаніўскую пару будучы маладымі, у студэнцкіх гадох. Дзякуючы гэтаму, яны надалі сілу маладосьці ўсяму беларускаму руху, уцягнулі ў гэты рух маладое пакаленьне, якое панесла нашаніўства праз доўгія гады, праз Першую Сусьветную вайну, праз расейскую рэвалюцыю – аж да Акту 25 Сакавіка ўключна.

* * *

Іван Луцкевіч быў выняткавай фігурай ня толькі на беларускім грунце, але й у цэлым навакольлі нашых суседзяў. Хоць пражыў толькі 38 год (1881-1919), пакінуў па

сабе вялікую спадчыну ўва ўсіх галінах беларускага жыцьця. Атрымаўшы па бацьку пэўную суму грошай, маладыя Луцкевічы мелі магчымасьць здабыць вышэйшую асьвету. Іван Луцкевіч едзе ў Пецярбург, дзе студыюе архэалёгію й права, а Антон Луцкевіч (на пару гадоў малодшы) сьціроўваецца на прыродазнаўства ў Дарпацкі універсытэт (у цяперашняй Естоніі). Івану Луцкевічу ўдаецца закончыць архэалёгію ў Пецярбурзе й пашырыць свае веды ў гэтай галіне на ўніверсытэце ў Вене, сталіцы Аўстрыі. Пасьля гэтага ён варочаецца ў Пецярбург, каб закончыць і права, але тым часам так уцягваецца ў беларускі рух, што ўжо не да навукі яму: няма ўжо на гэта ані часу, ані грошы. Рэшткі бацькавай спадчыны йдуць на беларускую справу, якая вымагае ўсё большых і большых сродкаў, і для яе трэба было шукаць ужо новых крыніцаў. Уцягнуўшыся ў беларускую справу, ня мае часу й грошы на далейшую навуку й Антон Луцкевіч. Ён зрываецца з універсытэту й вяртаецца ў Менск, дзе, у сувязі з рэвалюцыяй 1905-га году, Беларуская Сацыялістычная Грамада вымагае большай актыўнасьці ад сваіх сяброў. У 1906 годзе Луцкевічы пераяжджаюць у Вільню й пачынаюць выдаваць «Нашу Долю» й «Нашу Ніву».

Фінансавая база газэты й усяго руху кладзецца на плечы Івана Луцкевіча. Кідкі, эгэргічны й вынаходлівы – ён дае сабе рады. Ён бярэ на сябе прадстаўніцтва розных фірмаў і праводзіць розныя гандлёвыя транзакцыі. Як найлепшы ў цэлым краі знаўца старасьветчыны й мастацтва, ён знаходзіць у заняпалых крамах і антыкварыях ды вясковых парахвіях закінутыя старасьвецкія рэчы й абразы, купляе іх за мінімальную цану, аднаўляе, а тады прадае за належную вартасьць і вельмі часта атрымлівае вельмі паважныя сумы.Тады ёсьць грошы на ўсё: і на газэту, і на грамадзкую работу, і на асабістыя выдаткі. Калі грошы канчаюцца – усё пераходзіць на крэдытовую гаспадарку – аж да новай удалай транзакцыі. Вынаходлівасьць Івана Луцкевіча выдаецца бязьмежнай. Людзі дзівяцца толькі ягонай энэргіі. Ён праводзіць свае транзакцыі ў Вільні, і ў Пецярбурзе, і ў Львове, і нават у Вене. Калі знаходзіць рэчы зь беларускай старасьветчыны – пакідае іх для беларускага музэю. Так зь бегам гадоў ён зьбірае вялікую колькасьць беларускіх экспанатаў, зь якіх паўстае найбольшы ў цэлым краі музэй – Беларускі Музэй Івана Луцкевіча ў Вільні, у Базыльянскіх мурох.

Фактычнае рэдактарства «Нашай Нівы» прыпадае Антону Луцкевічу, які лёгка спраўляецца із сваім заданьнем. Маючы прыродныя здольнасьці й асьвету, ён выраблеецца на выдатнага публіцыста й літаратураведа. Піша пад псэўдонімам Антон Навіна. Аднак ідэялягічны тон і характар надае газэце Іван Луцкевіч, хоць сам і ня піша. Навет пазьней, калі месца рэдактара «Нашай Нівы» займаюць іншыя асобы, фактычнае кіраўніцтва надалей належыць да Луцкевічаў. Празь некалькі год «Наша Ніва» здабывае шмат падпішчыкаў, лік якіх стала ўзрастае. Здавалася, ужо недалёка той час, калі газэта стане на свае собскія ногі. Але вайна перарывае яе існаваньне ў 1915-ым годзе.

З гэтым, аднак, не канчаецца вядучая роля Луцкевічаў. Яны знаходзяць спосабы, каб пад нямецкай акупацыяй выдаваць беларускую газэту «Гоман», ды выкарыстоўваюць новыя магчымасьці для беларускага руху. Гуртуюць новых людзей, запачаткоўваюць школьную акцыю, твораць новыя беларускія арганізацыі, стараюцца вывесьці беларускую справу на міжнародную арэну. У завірусе вайны й рэвалюцыі, ды акупацыяў – нямецкай, бальшавіцкай і польскай – яны ўвесь час стаяць начале беларускага руху ў Заходняй Беларусі, ды сягаюць сваімі ўплывамі й на аддзелены ад іх фронтам Менск. Іх уплывы адчуваюцца й на Акце 25-га Сакавіка. Зь іхняй ініцыятывы паўсталі ў Заходняй Беларусі такія творчыя арганізацыі, як Беларускае Выдавецкае Таварыства, Таварыстава Ахвяр Вайны, Беларускае Навуковае Таварыстава, Таварыства Беларускае Школы. Яны кіруюць арганізацыяй беларускіх школ і вучыцельскіх курсаў. Апошнім вялікім чынам Івана Луцкевіча была арганізацыя 1-ай Віленскай Беларускай Гімназіі на пачатку 1919-га году.

У бязьмежным высілку для справы гэты Вялікі Беларус надарваў свае сілы й захварэў на сухоты. Цяжкая хвароба змусіла яго перарваць навучаньне беларускай мовы ў гімназіі й спыніць усю грамадзкую дзейнасьць. Ён едзе ў санаторыю ў Закапанае, дзе 23-га жніўня 1919-га году памірае. У асобе Івана Луцкевіча беларускі вызвольны рух траціць найвялікшага свайго правадыра – і ў той цяжкі час, калі трэба змагацца за беларушчыну і пад польскай акупацыяй, і пад бальшавікамі.

* * *

Антон Луцкевіч стараецца ўтрымаць і разьвіваць усё тое, што стварылі супольна зь Іванам. Ідзе тым-жа шляхам. Ачольвае беларускі вызвольны рух у Заходняй Беларусі. Выкарыстоўвае для беларускай справы розныя палітычныя каньюнктуры, але заўсёду мае на ўвеце толькі дабро гэтай справы. Бачым яго начале ўраду БНР, бачым яго ў Парыжы на мірнай канфэрэнцыі, дзе ён стараецца здабыць прызнаньне для БНР. Калі-ж усе намаганьні здабыцьця беларускай дзяржаўнасьці не ўдаюцца – ён пераходзіць да жмуднай творчай працы ў Вільні, пад польскай акупацыяй. Ён ачольвае беларускія выбарчыя акцыі пры выбарах у польскі сойм. Выкладае беларускую літаратуру ў Віленскай Беларускай Гімназіі. Стала выконвае функцыю анякуна Беларускага Навуковага Таварыства і дырэктара Беларускага Музэю. Чытае публічныя лекцыі аб беларускай літаратуры. Апрача ўсяго гэтага – дбае, каб не заняпала беларуская прэса. Ён начале яе. Ён галоўны рэдактар шматлікай па назовах, бо часта канфіскаванай,той самай беларускай газэты, ня гледзячы на частыя арышты й усякія прыдзіркі польскай улады. У часе Грамады – Антон Луцкевіч належыць да галоўнага кіраўніцтва яе – ён-жа галоўны рэдактар грамадаўскай прэсы й усяго выдавецтва. Пасьля разгрому Грамады ён гуртуе каля сябе рэшткі яе, каб зноў працягваць беларускую работу, па колькі гэта магчыма ў варунках разьюшанага польскага шавінізму. Прыход бальшавікоў у Вільню ў 1939 г. перарывае ягоную дзейнасьць. Яго арыштоўваюць. Засьценкі НКВД, допыты, катаваньне, сьмерць. Яго спатыкае такі самы лёс, як і ўсіх іншых выдатных беларускіх адраджэнцаў, што трапілі ў бальшавіцкія рукі.

Антон Луцкевіч (Антон Навіна) пакінуў па сабе, апрача вялікай колькасьці газэт ім рэдагаваных, літаратурнакрытычныя нарысы «Нашы песьняры» і «Адбітае жыцьцё» ды кніжку «Беларусы пад польскай акупацыяй.»

* * *

Аляксандар Уласаў быў грамадзкім і палітычным дзеячом. Дбаў пра адміністрацыйны бок «Нашай Нівы», а пазьней пра беларускія арганізацыі й школы. Удзельнік 1-га Усебеларускага Кангрэсу. Арганізатар культурных устаноў. У часе польскай акупацыі арганізаваў беларускую гімназію ў Радашкавічах і апякаваўся ёю праз увесь

час яе існаваньня. Быў беларускім сэнатарам у польскім Сэнаце ў часе першай кадэнцыі, дзе выступаў з прамовамі ў вабароне правоў беларусаў. Быў старшынём Т-ва Беларускае Школы ў самых цяжкіх часох – пасьля разгрому Грамады. Ачольваў акцыю складаньня дэкляpацыяў на беларускую школу, змагаючыся з усімі шыканамі польскай адміністрацыі.

У 1939 годзе быў арыштаваны бальшавікамі. Сядзеў у турме ў Маладэчне. Старога й непасільнага ўжо, яго мучылі й катавалі на допытах НКВД. Ня вытрываў, бедны, памёр.

З трох сяброў першай рэдакцыі «Нашай Нівы» толькі Іван Луцкевіч памёр сваёй сьмерцяй, хоць і перадчасна. **В. Жук.**»

«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 115, 1966)

Успаміны пра «Нашу Ніву»

В. Жук-Грышкевіча

«Мне хочацца дакінуць маленькі ўспамін пра «Нашу Ніву» з асабістага жыцьця.

1911-ы год. Малое мястэчка Будслаў у Вялейскім павеце, у якім каля 1000 жыхароў – пераважна сялян каталікоў і крыху жыдоў. Зямлі мала, зарабіць няма дзе. Адважнейшыя дзяцюкі й дзяўчаты выяжджаюць у розныя гарады Расейскай Імпэрыі, а то й у Амэрыку, каб сабе зарабіць і бацьком пасобіць.

У мястэчку няшмат пісьменных, а на вёсках яшчэ менш; культурнікі – гэта ксёндз-паляк, расейскі вучыцель, ды валасны пісар п'яніца. Яны зацікаўлены самі сабой ды сваёй кар'ерай. Жыхары-ж мястэчка й навакольных вёсак жывуць сваім сялянскім жыцьцём. Пра сябе яны ведаюць толькі, што яны простыя мужыкі, не палякі й не расейцы, але якой нацыянальнасьці – ня знаюць, хіба простыя, тутэйшыя. Газэт ня чытаюць. Пра жыцьцё на сьвеце ведаюць толькі з прыпадковых чутак ды прагна ловяць весткі ад сваіх, што варочаюцца з гораду ці з салдатаў. Тады гуртам валяць у хату «гарадзкога» хлапца ці дзяўчыны й гадзінамі слухаюць іхнія апавяданьні.

Нешта падобнае здарылася й у нашай хаце, калі мая старэйшая сястра прыехала з Рыгі. Поўная хата радні й суседзяў, навет у сенях няма дзе павярнуцца. Вітаюцца,

выпытваюць пра жыццьцё ў горадзе, пра навіны на сьвеце й слухаюць расказы сястры.

Але, калі ўжо нагаварыліся, сястра мая штось успомніла пра беларускі каляндар, разгарнула кніжку й пачала чытаць «Важную фігу» Ядвігіна Ш. Людзі замерлі, анямелі, у вачох іх зьявілася зьдзіўленьне. – «Як гэта, у кніжцы надрукавана панашаму, папросту», – і зараз жа пачаўся сьмех з задаваленьня. Апавяданьне падабалася, было сьмешным і цікавым, ды «якраз як з нашага жыцьця» – чуліся заўвагі. «Гэта мусіць паны хацелі з нас пасьмяяцца, дык і напісалі папросту» – сказаў другі дзядзька.

Чытаньне кончылася, а з хаты ніхто ня выходзіў. Чакалі яшчэ на штось. Тады сястра мая ўзяла газэту й сказала: «А цяпер я прачытаю вам беларускую газэту «Нашу Ніву». Газэта была прачытана амаль уся, як кажуць ад дошкі да дошкі. І ад рэдакцыі, і весткі зь Вільні, і зь Пецярбургу, і вершыкі ды апавяданьні, і карэспандэнцыі, і парады. І ніхто ня выходзіў з хаты. Людзі былі, як заварожаныя, слухалі лепш, як ксяндза на казаньні. Толькі,як сястра змарылася й перастала чытаць, у хаце загуло. Пасыпаліся пытаньні й адказы, спрэчкі й перамовы. «Як гэта, газэта ды надрукавана папросту?» – «Хто яе друкуе й пашто?» – «Ці няма тут якога падводу?» – «Хто гэта ўсё піша?» – «Адкуль яны ўсё гэта ведаюць?» – «Хіба нейкія паны гэта робяць.» – «Гэткія паны, як і мы з табой, толькі разумнейшыя й граматнейшыя» – пачуўся адказ Сьмігельскага. Ён ужо раней чуў пра «Нашу Ніву», а можа й чытаў яе. У хаце было поўна гоману, зрабілася горача й аж цёмна ад накуранага дыму. Людзі спрачаліся й махалі рукамі, вочы ў іх блішчэлі. Відаць было, што яны нешта моцна перажывалі. Такой узбуджанасьці будслаўцаў я ніколі ня бачыў. Усё-ж некаторыя падыходзілі да сястры й распытваліся, як дастаць «Нашу Ніву». Я ніколі не забуду гэтай сцэны ўзбуджэньня сваіх суседзяў.

* * *

У наступным, 1912 годзе ўжо некалькі сьвятлейшых сялян з Будслава выпісвалі «Нашу Ніву». Некаторыя пасылалі навет карэспандэнцыі. Іншым выпісала «Нашу Ніву» радня, што была ў Вільні або ў іншых гарадох. Гарадзкія, асабліва-ж у Вільні, Пецярбурзе й Рызе, былі зьвязаны з сьвядомымі нацыянальна асяродкамі й чыталі

«Нашу Ніву». Вялікая заслуга ў гэтым сьв. пам. Эдварда Будзькі – актыўнага адраджэнца й супрацоўніка «Нашай Нівы». Ён трымаў лучнасьць з сваімі суродзічамі з Будслава, некаторым памагаў уладзіцца на работу й дапамагаў ахвотным да навукі. Таму будслаўцы ў гарадох усьведамляліся нацыянальна й мелі дабрадзейны ўплыў на свае сем'і дома. І ў суседніх вёсках былі ўжо падпішчыкі «Нашай Нівы». Пра пашырэньне «Нашай Нівы» стараліся Эдвард Будзька й сям'я Мядзёлкаў. Круг чытачоў разрастаўся, «Нашу Ніву» можна было пабачыць ужо і ў суседніх воласьцях. Я неяк падгледзіў, што «Нашу Ніву» чыталі й наш старшы вучыцель Зубец, і пісар воласьці, і арганісты. Ня рэдкім зьявішчам было пабачыць групу сялян на лаўцы пад хатай, зь якіх адзін чытаў «Нашу Ніву», а іншыя слухалі. Часта можна было пачуць дэклямацыю вершаў з «Нашай Нівы» сярод моладзі на вечарынках або й спаткаць пастушка пры статку ці на начлезе, які хваліўся беларускім вершам. Нашаніўцы вычулі правільны тон, яны пісалі ў унізон з жыцьцём народу.

Сьледам за «Нашай Нівай» пайшла беларуская кніжка. Там-сям у Будславе можна было пабачыць беларускія календары, кніжкі із супалкі «Загляне сонца й у наша ваконца», а навет «Гусьляра» і «Шляхам жыцьця» Янкі Купалы.

Пачала адчувацца й прага да асьветы. Шмат хто з сялян ужо стараўся, каб яго дзеці закончылі дзьве клясы ў мясцовай расейскай школе. Той-сёй высылаў свайго сына ў гарадзкое вучылішча ў Докшыцы ці Вялейку, а то й вучыцца на ксяндза. Некаторых дзяцей забірала радня, што жыла ў гарадох. Будслаў прачынаўся з сваей цемнаты й абыякавасьці, ізаляцыі й нясьведамасьці. Нашаніўскія зярняты ўзыходзілі сьвежай руньню. Сувязь з культурнымі цэнтрамі гарадоў, а перадусім зь Вільняй, сувязь зь беларускім адраджэнскім рухам узрастала яшчэ больш у наступных гадох, 1913-ым і 1914-ым, аж пакуль Першая Сусьветная вайна не перавярнула ўсталеную плынь жыцьця.

* * *

Вайна сутыкнула будслаўцаў з чужымі людзьмі й чужымі краінамі. Мужчыны прайшлі войска й франты. Некаторыя сем'і сталіся ўцекачамі, іншыя-ж гасьцілі ў сябе польскіх уцекачоў. Фронт пракаціўся аж два разы. Пры-

шлося пажыць пад немцамі й пабыць у доўгім кантакце з рознанацыянальным расейскім войскам. «Нашай Нівы» ўжо ня было. Будслаў быў адрэзаны ад Вільні фронтам, але ў сутычнасьці з чужынцамі ўвыпуклялася беларуская адрозьненасьць яго жыхароў.

Прышла Лютаўская рэвалюцыя й паставіла на парадак дня сацыяльныя й нацыянальныя праблемы, якія горача дыскутаваліся між рознанацыянальнымі вайскоўцамі ў хатах будслаўцаў. І яны ня былі глухімі на пякучыя пытаньні зямлі й волі, і ім штось перапала з гэтых дыскусіяў. У Будславе стаяў тады штаб арміі, а ў ім было шмат інтэлігэнцыі, дык было каму дыскутаваць.

Бальшавіцкі пераварот прынёс голад і развал на фронтах. Вярталіся з войска жаўнеры. Папрыяжджалі «гарадзкія», што выехалі калісь для заробкаў, а то й для навукі. Прывезьлі з сабой новыя ідэі, новыя думкі ды шмат кніжак, а сярод іншых і беларускія. Паміж прыехаўшых аказаўся пэўны працэнт інтэлігэнцыі.

Ніколі ў Будславе ня было так людна й весела, як у 1917-ым і 1918-ым гадох. Маса маладых мужчын і дзяўчат – здаровых і актыўных. «Нашай Нівы» ўжо ня было, але можна было дастаць пераплеценыя гадавікі яе, якія чыталіся на расхват. Узьдзеяньне «Нашай Нівы» адчувалася далей, ды было ўзмоцнена настроямі рэвалюцыі. Пачалася шырокая грамадзкая й культура-асьветная праца. Спачатку нібы для правядзеньня часу, пазьней мэтазгодная, ідэёвая, нацыянальна-ўсьведамляючая. Амаль кожную нядзелю была або беларуская тэатральная пастаноўка, або вечарына із сьпевамі й дэклямацыямі. Так здарылася, што штаб Арміі пакінуў тэатральны барак з гатовай заляй і сцэнай. Хутка паўстаў культурна-асьветны клюб «Вяночак», а пры ім бібліятэка, тэатральны гурток, струнная аркестра й хор. На шчасьце, арганістым у Будславе быў тады пазьнейшы рэдактар «Крыніцы» Янка Пазьняк (родны дзед Зянона Пазьняка – старшыні Сойму БНФ, Р.Ж.-Г.), які распрацаваў з хорам добры рэпэртуар беларускіх песьняў. Беларускія пастаноўкі й канцэрты хору адбываліся ня толькі ў Будславе, езьдзілі зь імі й у іншыя суседнія мястэчкі й вёскі.

У клюбе можна было дастаць беларускую кніжку, а часамі й беларускую газэту прачытаць. Вільня была адцятая, але зь Менскам была сувязь, хоць і ўтрудненая. А ў Менску ў тыя часы кіпела беларускае жыцьцё, дык і Буд-

славу тое-сёе перапала зь яго. У клюбе вяліся й палітычныя дыскусіі на тэму дня. Гаварылі аб аддзяленьні Польшчы ад Расеі, а таксама Каўказу й Украіны. Дыскутавалі, што-ж будзе з нашым краем, зь Беларусьсю. Аўтаномія была тады модным словам, але часамі высоўвалася й другое слова – незалежнасьць.

Шмат увагі займала й справа школы, якая у Будславе была ўжо нячыннай некалькі год. Прагнасьць асьветы была вялікая, дык ужо не хацелі задавольніцца двухклясовай школай. Высоўвалася думка, каб адчыніць гімназію. Хутка гэта думка пачала зьдзяйсьняцца. Ужо ў кастрычніку 1917-га году быў ськліканы валасны сход, на якім пастаноўлена было адчыніць беларускую гімназію ў Будславе. Пастанова гэта была ўжыцьцёўлена. Праз два месяцы гімназія пачала заняткі ў чатырох клясах нармальных і двох падрыхтаваўчых, спачатку зь лікам больш за 300 вучняў.

Галоўным арганізатарам гімназіі быў вышэй успомнены Эдвард Будзька – ведамы каапэратар і грамадзкі дзеяч, які жыў тады з сям'ёй у сваіх бацькоў у Будславе. Дырэктарам гімназіі быў архэалёг і гісторык Васілевіч зь недалёкай вёскі Пузыры, якога голад прымусіў вярнуцца з Масквы ў сваю вёску. Вучыцелямі былі – ягоны сын матэматык і дачка гуманістка, а апрача іх Поля Будзька, Л. Ігнатава, Мікола Шыла і Лышчук (абодва зь Менску), ды Панковіч з Крывіч. Гімназія праіснавала пад нямецкай акупацыяй у 1918 годзе й пад бальшавіцкай частку 1919 г. Восеньню 1919 г. Будслаў акупавалі палякі й зачынілі гімназію. Яны-ж здушылі ўсе праявы культурнага й грамадзкага беларускага жыцьця, якое ў Будславе ніколі пасьля не вярнулася да таго высокага ўзроўню.

Трэба было бачыць, зь якім запалам сяляне прыступалі да разбудовы сваёй новай школы, як яны дружна й ахвотна распачалі будаваць двухпавярховы будынак для гімназіі. Бацькі вучняў ападаткаваліся працай пры будоўлі або давозам будаўляных матар'ялаў. Зьбіралі грошы, прывозілі бярвеньне, пясок і каменьне на будоўлю. Да канца 1918 году першы паверх быў ужо амаль закончаны.*)

---

*) Польскія ўлады сканфіскавалі гатовы першы паверх будынку Гімназіі, пакрылі яго й зьмясьцілі ў ім канцылярыю Будслаўскай воласьці (гміны). **В. Ж.**

Гэты нацыянальны й культурны ўздым Будслава трэба заўдзячыць перадусім «Нашай Ніве». Яна пашырыла нацыянальную сьведамасьць, узбудзіла пашану да сябе й усяго свайго роднага й самабытнага, з чаго вырасла самаўпэненасьць і актыўнасьць. Вайна й рэвалюцыя далей папхнулі гэты адраджэнскі працэс. За кароткі час людзі й усё асяродзьдзе зьмянілася да непазнаньня. Гэта было ўжо сьведамае грамадзтва, якое ведала, чаго хоча. Таму ня дзіўна, што яно прышло ў вялікім ліку ў гімназію на сьвяткаваньне абвешчаньня незалежнасьці Беларусі ў сакавіку 1918-га году, як толькі гэтая вестка дайшла зь Менску да Будслава.

На вялікі жаль, уздым гэты ў Будславе, і ня толькі ў Будславе, перарвалі бальшавіцкая акупацыя ды польска-бальшавіцкая вайна й Рыскі трактат, які зафіксаваў польскую акупацыю і адчыніў новую, церпкую бачыну ў нашай гісторыі.

Так выглядае ілюстрацыя пра «Нашу Ніву» й яе ўзьдзеяньне ў малым мястэчку Будславе. А колькі-ж такіх і большых ці меншых ілюстрацыяў можна было-б даць з усяе Беларусі? З усіх іх злажыўся-б поўны працэс беларускага нацыянальнага адраджэньня ў часе нашаніўскай пары й рэвалюцыі, які прывёў да Акту 25-га Сакавіка. **В. Жук.»**

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 115, 1966.)

«Хай не марнуюцца беларускія песьні, мы іх выдадзім!»

Вінцэнт Жук-Грышкевіч цікавіўся і сачыў за тым, што дзеецца на Бацькаўшчыне. Гэта патрэбна было яму асабліва тады, калі працаваў кіраўніком беларускай сэкцыі радыя «Вызваленьне». І пасьля, вярнуўшыся ў Канаду, выпісваў зь Беларусі «Літаратуру й Мастацтва», «Весьці Акадэміі Навук БССР», «Полымя», «Маладосьць». Аб парадках і «асягненьнях» у «сувэрэннай» БССР быў паінфармаваны.

Ды прачытаўшы ў «Літаратуры й Мастацтве», нр. 80 (2133) за 4-га кастрычніка 1966 году артыкул М. Гіля «Дзесяць гадоў у папцы...» з абурэньнем і болем у голасе кажа: «Во, да чаго дажыліся...!»

Быў ён тады рэдактарам «Вестак з Канады» – часткі газэты «Беларус». У нумары 115, 1966 «Беларуса», у перадавіцы «Вестак з Канады» пад загалоўкам вялікімі літарамі:

падае адкрыты ліст да Рыгора Раманавіча Шырмы, а пад ім поўнасьцьцю артыкул М. Гіля – «Дзесяць гадоў у папцы...»

У артыкуле гэтым, выняткі зь якога тут падаем, М. Гіль між іншага апісвае, як яму давялося «...у час аднэй з камандзіровак гутарыць з кіраўніком самадзейнага харавога калектыву... У рэпэртуары хору шмат песень. Творы рознага пляну, рознага гучэньня: рускія, украінскія, вэнгерскія, польскія, грузінскія... фінская песьня. А вось роднай, беларускай – ніводнай.

Я спытаўся ў маладога кіраўніка:

– Чаму-ж так?

Разьвёў той рукамі ды і кажа: – І рады былі-б, ды, як кажуць, грахі ў рай ня пускаюць. Няма беларускіх песень.

Што такое, думаю, ці не дачуў я часам?

– Ды як-жа так? У такога паэтычнага народу песень няма? Што вы кажае? Пабойцеся Бога!

А кіраўнік усьміхаецца:

– Даруйце, вы мяне не так зразумелі. Я не пра тое. Песень то ў нас, ведама, вельмі шмат, але... Я кажу, сьпяваць няма чаго. Хораў няма. Ну, як вам растлумачыць? Распрацовак песень для хору няма. Сам я не магу гэтага зрабіць. Ды, прызнацца, і ня ведаю я дасканала нашай песьні. У музычным вучылішчы на беларускую народную песьню за чатыры гады было адпушчана пару гадзін...

У чым-жа ўсё-такі справа? Песень шмат, а сьпяваць няма чаго...?

Шукаць адказу на гэтае пытаньне я пайшоў да Рыгора Раманавіча Шырмы. А куды-ж яшчэ йсьці? Няма у нас большага знаўцы беларускай песьні...

Рыгор Раманавіч паклаў на стол даволі ёмістую папку:

– Вось паглядзеце, ёсьць у нас штоколечы, ці няма.

У папцы аказалася 150 (сто пяцьдзесят!) харавых твораў. Сто пяцьдзесят сучасных, каляндарна-абрадавых, бытавых, вясельных, любоўных, жартоўных народных песень. Гатовыя, адрэдагаваныя, хоць сяньня ў вытворчасьць.

Я змоўк ад разгубленасьці й непаразуменьня.

– Дзесяць гадоў ляжаць у мяне на стале. Роўна 10 гадоў – з 1956 – б'юся, каб яны былі выдадзены, трапілі да тых, хто іх чакае, і нічога не дабіўся, – расказвае Рыгор

Раманавіч. – Лепшыя кампазытары працавалі над імі. Больш сарака чалавек. Грачанінаў, Кошыц, Галкоўскі, Пашчанка, Багатыроў... І вось – дзесяць гадоў у папцы...

Рыгор Раманавіч зьнімае з паліц тоўстыя тамы:

– А вось пацікаўцеся, што робяць, што зроблена нашымі суседзямі...

– За гэтыя дзесяць гадоў, дзе я толькі ня быў з гэтай папкай, – гаварыў у той вечар Рыгор Раманавіч, – і нідзе не знайшоў зразуменьня і падтрымкі. Навет з боку тых людзей, якія па пасадах сваіх, па абавязку службы сваёй павінны дбаць аб росквіце культуры нашага народу...»

У канцы артыкулу М. Гіль разважае:

«...Толькі-ж усё-ж не магу пазбавіцца ад пытаньня:

– Чаму? Чаму яны ня бачаць сьвету? Чаму такое багацьце гадамі ляжыць у папцы? Хто ў гэтым вінаваты? Ад каго залежыць тое, каб зборнік беларускіх народных песень для хору ўсё-ж выйшаў?

Канечне, выдаць тую папку, што ляжыць на стале Рыгора Раманавіча Шырмы, справа нялёгкая. Можна спасылацца і на адсутнасьць паперы, і на слабасьць паліграфічнай базы, і на нерэнтабельнасьць выданьня, і г. д. ...»

Знайсьці выхад зь нявыхаднае ў «сувэрэннай» БССР сытуацыі хочуць памагчы беларускія эмігранты ў Канадзе. У «Вестках з Канады» – «Беларусе», 115 – 1966, пад вышэй успомненым загалоўкам «Хай не марнуюцца беларускія песьні, мы іх выдадзім!» пішуць:

«Адкрыты ліст да Рыгора Раманавіча Шырмы, кіраўніка Дзяржаўнай Акадэмічнай Капэлі БССР

Вельмі Паважаны Рыгор Раманавіч,

Мы прачыталі артыкул «Дзесяць гадоў у папцы...» ў газэце «Літаратура і Мастацтва» нр. 80 (2133) з 4-га кастрычніка 1966 году і нам аж дух заняло: такое народнае багацьце, як 150 беларускіх песьняў гарманізацыі Грачанінавага, Кошыца, Галкоўскага, Пашчанкі, і іншых 10 гадоў марнуюцца ў папцы! Яны-ж вельмі патрэбны на Беларусі й ня менш нам на эміграцыі. Нельга дапусьціць, каб гэты народны скарб далей марнаваўся.

У 1960 годзе Згуртаваньне Беларускае Моладзі ў Клівэлендзе (ЗША) выдала «Беларускі песенны зборнік», у якім зьмясьціла 61 песьню й 31 жартоўных песьняў, гуль-

няў і скокаў – усё гарманізацыі Міколы Куліковіча. Мы маем ня меншыя магчымасьці, як моладзь Кліўленду, і можам выдаць 150 беларускіх песьняў, якія залежваюцца ў вашай папцы. Дык будзьце ласкавы, просім Вас, прышліце нам гэтыя песьні, мы іх выдамо старанна, у якім хочаце тыражы, каб хапіла і для Беларусі, і для эміграцыі. Кажны беларускі эмігрант не пашкадуе даць штось із сваіх заробкаў, каб гэты скарб пабачыў сьвет.

З глыбокай пашанай да Вас,

Галоўная Управа Згуртаваньня Беларусаў Канады
Byelorussian Canadian Alliance
524 St. Clarens Avenue
Toronto 4, Ontario, Canada»

За год пасьля надрукаваньня ў «Вестках з Канады» адкрытага ліста да Рыгора Шырмы нам давялося бачыцца на сусьветнай выстаўцы – ЕКСПО-67 – у Мантрэалі з Максімам Танкам, які ў сувязі з гэтым лістом сказаў В. Жук-Грышкевічу:

«Вы наіўныя...!»

– Не, Максіме, не наіўныя!

УДЗЕЛ У КАНАДЗКІМ ЖЫЦЬЦІ

У Радзе Стагодзьдзя Канады

У верасьні 1965 году др. В. Жук-Грышкевіч бярэ ўдзел у зьезьдзе Рады Стагодзьдзя Канады, што адбыўся ў Таронта, сталіцы Антарыя, у днях 8, 9 і 10 верасьня ў Роял Ёрк гатэлі.

Падзею й значэньне яе ён апісвае ў «Бацькаўшчыне», Мюнхэн, 6 (633), 1965:

«У 1867 годзе ў Лёндане быў прыняты Брытыйскі Паўночна-Амэрыканскі Акт, паводле якога Канада была ператворана з калёніі ў дамінію. Ад гэтага часу датуецца пачатак канадзкай дзяржаўнасьці й нацыянальнасьці. У 1967 годзе скончыцца стагодзьдзе гэтага векапомнага Акту, а разам з тым і стагодзьдзе Канады.

Гэту вялікую гістарычную падзею Канада рыхтуецца адзначыць ня толькі агульнанацыянальным сьвяткаваньнем, але й выкананьнем розных канструкцыйных і культурна-асьветных праектаў па ўсёй краіне. Каб дапамагчы

ў плянаваньні й выконваньні гэтых вельмі-ж лічных праектаў, як і ў арганізацыі сьвяткаваньня стагодзьдзя Канады па ўсёй краіне – па лініі дзяржаўнай быў створаны адмысловы дзяржаўны ворган – Камісія Стагодзьдзя (Цэнтэніял Комішын). Па лініі грамадзкай, зь ініцыятывы грамадзтва ў 1960 годзе паўстала грамадзкая каардынацыйная арганізацыя – Рада Стагодзьдзя Канады (Канэдыен Цэнтэнэры Каўнсіл). Стварылі яе 100 грамадзкіх арганізацыяў, якія сталіся ейнымі закладчыкамі й першымі сябрамі. Цяпер лік арганізацыяў – Сяброў Рады Стагодзьдзя Канады – асягнуў лік 850. Згуртаваньне Беларусаў Канады сталася паўнапраўным сябрам Рады Стагодзьдзя Канады ў 1961 годзе. Заданьнем Рады ёсьць стымуляваньне праектаў на стагодзьдзе Канады й каардынацыя працы ды дапамога ў выкананьні іх.

Каб бліжэй падыйсьці да грамадзтва й арганізацыяў – сяброў сваіх па ўсёй краіне, Рада Стагодзьдзя Канады робіць свае штогоднія зьезды ў паасобных гарадох, сталіцах правінцыяў Канады. Сёлетні ўжо 5-ты гадавы зьезд Рады Стагодзьдзя Канады адбыўся ў Таронта – сталіцы Антарыё ў днях 8, 9 і 10 верасьня, у найбольшым тутэйшым гатэлі Роял Ёрк Гатэл.

Ад Згуртаваньня Беларусаў Канады браў удзел у Зьезьдзе др. В. Жук-Грышкевіч. Праца Зьезду была зарганізавана добра, вялася паводля загадзя апрацаванага пляну й абняла ўсе дзялянкі дзейнасьці Рады. Работа праводзілася часткова ў камісіях, часткова на пленарных паседжаньнях. Таму адзін дэлегат ня мог быць на ўсіх паседжаньнях камісіяў. Гэта аднак было прадугледжана й паасобныя камісіі рабілі справаздачы з сваёй працы на плянарным паседжаньні.

Выкарыстоўваўся час і на абедах, і на вячэрах, у часе якіх выступалі адмыслова запрошаныя прамоўцы, якімі мелі быць канадзкія міністры ці іх заступнікі, або кіраўнічыя дзеячы Рады Стагодзьдзя Канады ці Камісіі Стагодзьдзя Канады.

Зьезд ішоў пад знакам ахапленьня сьвяткаваньня стагодзьдзя Канады ўсіх арганізацыяў, усіх асяродкаў, усяго грамадзтва. Дыскутаваліся спосабы каардынацыі працы й парады ў плянаваньні ды выконваньні праектаў на стагодзьдзе Канады ў разрэзе фэдэральным, правінцыянальным, муніцыпальным, як і ў паасобных мясцовых арганізацыях. Абмяркоўваліся праекты маладзёжных арганіза-

цыяў і работніцкіх, артыстаў і мастакоў, шпіталёў і школаў.

Праектаў і розных плянаў аказалася безьліч: і паркі, і будынкі, і культурныя цэнтры адпачынку, і навуковыя, і школьныя, і вайсковыя, і лякарскія, і рэлігійныя й розныя іншыя. Залежыць на тым, каб ня толькі адсьвяткаваць стагодзьдзе Канады, але й пакінуць у сувязі з гэтай падзеяй трывалыя, відавочныя помнікі. Тут выявілася ў поўнасьці, колькі-ж гэта трэба ўлажыць працы, высілкаў ды ўмеласьці, каб скалыхнуць цэлай нацыяй і захапіць яе так важнай падзеяй.

Трэці дзень Зьезду прайшоў навокал пытаньня: што яшчэ трэба зрабіць за 15 месяцаў, якія засталіся да даты сьвяткаваньня. І тут выявілася мора работы. Усе даклады й дыскусіі на гэту тэму зводзіліся да аднаго: як уключыць у сьвяткаваньне ўсіх жыхароў Канады, аб'ednываючы іх пад адным нацыянальным Канадзкім сьцягам?

Тут было месца на пытаньне прадстаўнікоў этнічных групаў, аб якіх нічога не ўспаміналася ў дыскусіях; якая-ж роля этнічных групаў у гэтым агульна-канадзкім сьвяткаваньні? Пытаньне гэта паставіў ў сваім выступленьні прадстаўнік Згуртаваньня Беларусаў Канады.

Пытаньне было на часе, яно выклікала жывую дыскусію й шмат рэплікаў. Забіралі голас дэлегаты, а між імі ўкраінцы й палякі (прадстаўнікоў іншых этнічных групаў, здаецца, і ня было). Урэшце агульны адказ на пытаньне гэта, як сфармуляваў яго старшыня паседжаньня, зводзіўся да таго, што этнічныя групы маюць усьведаміць свае асяродкі ў значэньні стагодзьдзя Канады, але адзначаць яго пасвояму ў выкананьні сваіх мясцовых праектаў з захаваньнем сваіх этнічных культурных асаблівасьцяў. **Этнічная й культурная разнароднасьць вельмі карысная й пажаданая ў агульнаканадзкім адзінстве,** казаў старшыня, **у канадзкай культуры, якую гэта разнароднасьць узбагачае (дывэрзіты ін юніты).** Тут, між іншага, выявілася, як важным ёсьць, каб дэлегат тэй ці іншай арганізацыі выступаў, забіраў голас у дыскусіях. Пасьля паседжаньня дэлегат ЗБК быў абдораны значнай увагай удзельнікаў Зьезду. Яго абступілі розныя дэлегаты й пачалі закідаць пытаньнямі пра яго арганізацыю, пра яго нацыянальнасьць.

Агульнае ўражаньне аб Зьезьдзе Рады Стагодзьдзя Канады: Гэта быў высілак велізарнага арганізацыйнага

канглямэрату, каб уся Канада, усё ейнае насельніцтва адсьвяткавала стагодзьдзе сваёй дзяржаўнасьці й нацыянальнасьці ды пакінула па ім відавочныя помнікі; каб выкарыстаць гэтую падзею для канадзкага нацыянальнага ўсьведамленьня, а таксама нацыянальнага й дзяржаўнага адзінства з захаваньнем культурнай разнароднасьці правінцыяў і розных этнічных групаў. Для нас жа, беларусаў, Зьезд гэты меў і пэўнае значэньне прапагандовае. Назоў нашай арганізацыі ёсьць ува ўсіх выданьнях Рады Стагодзьдзя Канады. Дэлегат яе на працягу трох дзён насіў прышпіленую картку з назовам свае арганізацыі. Назоў гэты быў у справаздачах Зьезду. **Ж.**»

(«Беларусы ў Радзе Стагодзьдзя Канады» «Бацькаўшчына», Мюнхэн, 6 [633], 1965.)

«**Адзначэньне Канадыйскага Грамадзянства** адбылося 18-га травеня 1966 году ў Антарыйскім Парлямэнце ў Таронта. Фэдэральны суд на ўрачыстай сэсіі даў грамадзянства 30-цём асобам розных нацыянальнасьцяў, пры ўдзеле Прэм'ера Антарыя Джона Робэртса, сакратара правінцыі й міністра грамадзянства Антарыя Джона Ярэмкі і дзяржаўнага сакратара Канады сп-ні Джуды Лямарш. Прысутныя былі шматлікія дастойныя госьці – прадстаўнікі грамадзтва, канадзкіх арганізацыяў і этнічных групаў. Ад беларусаў быў прысутны, запрошаны на ўрачыстасьць, старшыня Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч.

Пасьля ўрачыстасьці надаваньня канадзкага грамадзянства ўдзельнікі былі запрошаны на прыняцьце ў Губэрнатара Лейтэнанта Антарыя, дзе былі прадстаўлены асабіста Губэрнатару й ягонай жонцы ды ўсім вышэй успомненым Міністрам.»

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 111-112, 1966.)

Канфэрэнцыя на тэму «Правы й Абавязкі» – "Rights and Responsibilities"

Як старшыня Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч браў удзел у Антарыйскай канфэрэнцыі на тэму «Правы й абавязкі» – "Rights and Responsibilites." Канфэрэнцыя гэта адбылася ў жніўні 1966 году ў Порт Эльгін, у Антарыё. Цікавую спра-

ваздачу з гэтай канфэрэнцыі даў В. Жук-Грышкевіч у «Вестках з Канады» – «Беларусе» 113, 1966. Яе ніжэй зьмяшчаем. «Весткі з Канады» – гэта частка газэты «Беларус», якую ў той час рэдагаваў В. Жук-Грышкевіч.

«Правы й абавязкі чалавека

Пад такім назовам адбылася канфэрэнцыя прадстаўнікоў розных Антарыйскіх арганізацыяў і этнічных групаў у Порт Эльгін 21-26 жніўня 1966 году. Арганізавалі яе Антарыё Вэльфэр Каўнсіл у супрацоўніцтве з Аддзелам Грамадзянства Фэдэральнага Дэпартамэнту Іміграцыі й Грамадзянства, Аддзелам Грамадзянства Антарыйскага Дэпартамэнту Правінцыянальнага Сакратара, ды Антарыйскай Камісіі Правоў Чалавека. Нарады канфэрэнцыі адбываліся ў Адукацыйным Цэнтры Юнайтыд Аўтомобіль Уоркэрс.

Запрошаныя былі ўсе Антарыйскія арганізацыі, у тым ліку й беларускія. На канфэрэнцыю прыехала 80 асоб, а сярод іх адзін беларус – старшыня ККБК др. В. Жук-Грышкевіч. Ад этнічных групаў было 25 прадстаўнікоў. Найбольшая рэпрэзэнтацыя, пасьля англа-саксонскай, была французская, далей ішлі індыяне, жыды, японцы, італьянцы й славяне. З балтаў былі дзьве эстонкі. Былі мэтысы з Ямайкі й навет адна эгіпцыянка з групы коптаў.

Мэтай Канфэрэнцыі было сабраць прадстаўнікоў розных групаў і арганізацыяў, ды разгледзіць і прадыскутаваць у сяброўскай атмасфэры іхнія балячкі жыцьця, вынікаючыя з дыскрымінацыі.

Трэба прызнаць, што мэта была асягнута. Расфуфыраныя дамы й, здавалася-б чэрствыя, джэнтльмэны бязцырымонна падыходзілі да тых, каго ня зналі, знаёміліся й выпытвалі, хто ты й каго рэпрэзэнтуеш. На другі дзень ужо ўсе зналіся міжсобку, сталіся сябрамі й звалі адзін другога па іменю.

Доўгае прозьвішча беларускага прадстаўніка й назоў «белёрашын» інтрыгавалі шмат каго, і ён меў нямала клопату з тлумачэньнямі й выясьненьнямі. Але былі й вынаткі, калі ня трэба было тлумачыць – і ня толькі славянам. Жыдоўскія прадстаўнікі ведалі, хто такія беларусы, ды некаторыя англясаксы: прафэсары ўнівэрсытэту й урадаўцы зь Іміграцыйнага Дэпартамэнту. Некаторыя зь іх нават пыталіся, зь якой часткі Беларусі ён паходзіў.

Арганізацыя канфэрэнцыі была дасканалай. Во, дзе трэба вучыцца арганізацыі нам, беларусам. Шкада, што ніхто больш зь беларусаў ня быў тут. Ужо пры рэгістрацыі кожны атрымаў папку із сваім прозьвішчам на картцы, раскладам часу, праграмамі й інфармацыямі, чыстай паперай для нататкаў і алоўкам, ды ключ да свайго пакою. Усё было падрыхтована загадзя, усё прадбачана да найменшай драбніцы. Згары былі вызначаныя даклады на кажны дзень з дакладчыкамі спэцыялістамі, згары былі вызначаныя кіраўнікі дыскусіяў на пленумах. Апрача таго з удзельнікаў былі створаны пэнэльныя й дыскусійныя групы па розных пытаньнях з вызначанымі кіраўнікамі, якія давалі справаздачы на пленумах. Ад гадз. 9-ай да 5:30 па паўдні ўсе былі заняты, зь перапынкамі толькі на лянч. Вечарамі-ж, па 7-ай гадз. адбываліся розныя разрыўковыя імпрэзы: кіно, танцы, сьпевы, забавы. Увесь вечар быў адчынены буфэт, але п'яных ня было. Было цікава й весела, ніхто ня нудзіўся, ня было на гэта часу, ды й не далі-б самотніку бянтэжыцца ці трымацца збоку.

Галоўныя тэмы дакладаў: Канадзкае грамадзтва – чытаў а. С. Баўэрс (езуіт), праф. Антарыйскага унівэрсытэту; Правы чалавека й законнасьць – праф. Крывэр з Тарантонскага унівэрсытэту; Правы чалавека й эканоміка – Г. Маркл, дырэктар аддз. Адукацыі ў Юнайтыд Аўтомобіль Уоркэрс; Эканамічныя праблемы й цяжкасьці этнічных мяншынь – Джэймс Бюлер (індыянін), выканаўчы дырэктар Індыянска-Эскімоскага Згуртаваньня; Правы чалавека кругом сьвету – заступнік дырэктара Аддзелу Правоў Чалавека ў Задзіночаных Нацыях. Адказнасьць асьветных і рэлігійных інстытуцыяў адносна правоў чалавека – сымпозіюм.

Зь першага дакладу а. Баўэрса вынікала, што канадзкае грамадзтва ня ёсьць «мэлтінг пот», што прыпісваецца Задзіночаным Штатам, а мазайкавае грамадзтва, г. зн. такое, у якім на агульнай плошчы англасасаў знаходзяцца большыя й меншыя асяродкі розных этнічных групаў. Канадзе залежыць на дзяржаўным адзінстве, але не ў яе інтарэсах пазбаўляць культурна-этнічных рысаў этнічныя групы. Наадварот, Канадзе залежыць на тым, каб гэтыя этнічныя асаблівасьці захаваліся ды ўзбагачвалі агульнаканадзкую культуру. Усё гэта адпавядала агульнаму настрою аўдыторыі. Але пры канцы а. Баўэрс выказаў сваё задавальненьне, што й камуністычнае грамадзтва дбае аб правох чалавека ў сваіх краінах, што выявілася на канфэ-

рэнцыі на Гаваях. Дакладчык, відаць, забыўся, што ў камуністычных краінах існуе дыктатура й таталітарны рэжым, а камуністычнай дактрыны ён мо' й ня ведаў. У дыскусіі толькі прадстаўнік беларусаў забраў голас у гэтай справе, даводзячы, што толькі навонкі камуністыя крычаць аб правох чалавека, а ў сваіх дзяржавах яны топчуць гэтыя правы самым безаглядным спосабам. У сваім адказе апанэнтам дакладчык апраўдываў камуністых, «калі дабро народу вымагае ахвяр». Было дзіўна, што так гаворыць сьвятар і што ніхто больш не зарэагаваў на такое цьверджаньне. Памыліўся-б, аднак, той, хто думаў-бы, што ўдзельнікі Канфэрэнцыі згодны з думкай а. Баўэрса што да камуністых. На другі дзень – Ален Баравой (жыд) зь Лейбар Коміты фор Гюмэн Райтс пачаў сваё выступленьне наступна: «Калі ў ЮНЭСКО прадстаўнік камуністаў меў тэму дакладу «свабода чалавека», дык я тым больш магу гаварыць аб правох чалавека». Гэтае асьведчаньне выклікала ўсеагульныя воплескі слухачоў.

У далейшых дакладах і дыскусіях найбольш увагі зьвярталася на дыскрымінацыю. Найбольш пакрыўджанымі чуліся індыяне й выказвалі найбольш незадаваленьня. Выглядае, аднак, што справа іх на добрай дарозе. Яны маюць сваіх лідэраў, арганізацыі й інтэлігэнцыю – ды добрую волю Канадзкага Ураду.

Шмат голасу забіралі французы, як з Квэбэку, так і мяншыня іх з Антарыя. Калі-ж ходзіць пра двумоўнасьць і двукультурнасьць, дык яны супраць накіданьня іншым гэтага прынцыпу. Ім толькі ходзіць аб здабыцьцё роўных праў для сябе.

Італьянцы наракалі на дыскрымінацыю ў атрыманьні работы, аб чым выказваліся й іншыя групы. Нэгры жаліліся, што ня хочуць наймаць ім памешканьняў. У мяшаным расава грамадзтве такія выпадкі не навіна, і трэба зь імі змагацца. **Аднак, калі параўнаеш усе гэтыя нараканьні з тым, што робіцца ў Савецкім Саюзе, на Беларусі, як там топчуць аснаўныя правы чалавека, дык дзіву даешся. Тут дзяржаўныя ўстановы склікаюць адумысловыя канфэрэнцыі з усіх пластоў грамадзтва, каб яны крытыкавалі існуючы лад і парадак. Там-жа дыктатура, таталітарызм робіць тое, што Масква скажа, што «положено» і «не положено», ды дзякавай яшчэ як за ласку якую. І ніхто аб гэтым не заікнецца. Вось што баліць!** (Падкрэсьлена мною, Р. Ж.-Г.)

Праўда, гэта канфэрэнцыя лёкальная, Антарыйская. Вычуваецца, што яна сьведама ўнікае супярэчлівых дачыненьняў паміж вольным сьветам і камуністычным. Але ў атмасфэры настрояў вычуваецца прысутнасьць Ветнамскага пытаньня, вылазіць у прыватных дыскусіях. Беларускаму прадстаўніку прышлося схапіцца за гэтае пытаньне ў войстрай дыскусіі зь японцам, які, хоць і не камуністы, паўтараў лёзунгі камуністычнай прапаганды. Наагул-жа на канфэрэнцыі прыхільнікаў камунізму спаткаць ня прышлося.

Адзіная нагода, дзе можна было-б зачапіць пытаньне правоў чалавека пад камунізмам, гэта на дакладзе прадстаўніка Задзіночаных Нацыяў аб правох чалавека кругом сьвету. Але ён у сваім дакладзе разглядаў і Афрыку і Азію, і Амэрыку, але не зачапіў Савецкага Саюзу ані паўслоўцам. Трымаўся фармальнага шаблёну, які вытварыўся ў Задзіночаных Нацыях у выніку супрацоўніцтва з камуністычнымі дзяржавамі. У дыскусіі таксама нельга было зачапіць правоў чалавека пад камуністычным рэжымам «з браку часу». Шмат хто, а асабліва славянскія прадстаўнікі, чуліся расчараванымі.

На канфэрэнцыі было шмат цікавых людзей, зь якімі было аб чым пагаварыць і можна было пасябраваць зь імі. Успомнім тут хоць некалькіх. Перадусім ведамы беларусам Глын П. Ален з Сітызэншып Бранч, які быў душой канфэрэнцыі; сымпатычны француз Ролян Фурнье – з Асьветнай Арганізацыі французаў канадыйцаў у Антарыё, зь якім беларусу прышлося жыць у адным пакоі. Успомнім і «земляка», «ляндсмана», як ён казаў, др. Кэйжа – жыда з Мантрэалю, які паходзіць зь Менску. Гэта ідэйны жыдоўскі асьветнік з Джуіш Імігрант Эйд Сэрвісыс оф Кэнада. Гэта адукаваны, разумны й глыбокі чалавек. Ня раз захоплівалася ягонымі мудрымі сказамі ўся аўдыторыя Канфэрэнцыі. Хоць малым выехаў зь Менску, мае сэнтымэнт да Беларусі й да традыцый, захаваных бацькамі. З такімі людзьмі нам – беларусам трэба мець дачыненьні.

Канфэрэнцыя аб правох і абавязках чалавека была цікавым зьявішчам. Сабралі людзей на шэсьць дзён з разнастайных групаў, далі ім ідэальныя варункі на ўсім гатовым у харстве прыроды над возерам Гюрон ды акунулі іх у вір дыскусіяў над цікавымі праблемамі жыцьця. Не дарма-ж былі там і такія людзі, якія нікога не рэпрэзэнта-

валі, а прыехалі асабіста, каб паслухаць цікавыя даклады й дыскусіі ды чагось навучыцца. Такія канфэрэнцыі адбываюцца штогод на розныя тэмы. Варта помніць аб гэтым і карыстаць зь іх.

Варта помніць яшчэ аб чымсь. Афіцыйныя канадзкія дзейнікі дамагаюцца, каб этнічныя групы не забываліся сваіх звычаяў і мовы. Цяпер гэта адзін з пастулятаў навучаньня ў Канадзе: «Трэба, каб канадыйцы былі прынамся двумоўнымі, каб ведалі ангельскую мову, але й захавалі мову бацькоў. І то цяпер, пакуль малыя, маладыя. Пазьней другую мову трэба будзе здабываць зь вялікай натугай, калі цяпер яе можна захаваць лёгка й натуральна.». Гаварыў гэтак урадавец з Антарыё Борд оф Эдукэйшын. Ен казаў навет, што Борд оф Эдукэйшын гатоў забясьпечыць пакоямі для навучаньня этнічных моваў, калі ў дыстрыкце зьбярэцца належная колькасьць дзяцей. Дык памятайце аб гэтым бацькі-беларусы.

Ж.» (В. Жук-Грышкевіч)

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 113, 1966)

Змаганьне з камуністычнай прапагандай

Тое, што сталася ў 1989 годзе – ужо пасьля сьмерці Вінцэнта Жук-Грышкевіча – у сатэлітах Савецкага Саюзу – у Польшчы, Усходняй Нямеччыне, Чэхаславаччыне, Вугоршчыне, а ў 1990 годзе ў Прыбалтыцы, ды насьпявае ў нацыянальных савецкіх рэспубліках, Вінцэнт Жук-Грышкевіч прадбачыў у 1966 годзе: «У нутры Савецкага Саюзу ляжыць нацыяналістычная бомба. Яна мае страшэнную выбуховую сілу. Пытаньне толькі, ці гэта бомба выбухне сама, ці будзе раззброена эвалюцыйным працэсам» – пісаў ён у артыкуле:

«Савецкая Імпэрыя недаўгавечная

У часе пасьля бальшавіцкага пераваротy расейскія камуністы прыцягвалі да сваёй справы сымпатыкаў прывабнай прапагандай і прыгожымі абяцанкамі. Яны прапагавалі інтэрнацыяналізм, атакавалі расейскі вялікадзяржаўны шавінізм, ды сулілі прызнаньне нацыянальных правоў усім народам Расейскай Імпэрыі. Тады Ленін кінуў быў кліч самавызначэньня народаў аж да аддзя-

леньня. Прынцып гэты стаўся адным з найважнейшых параграфаў у савецкай канстытуцыі, на яго аснове былі ўтвораныя нацыянальныя савецкія рэспублікі, якія ўвайшлі ў Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Пазней толькі аказалася, што й прывабная прапаганда, і прыгожыя абяцанкі й клічы былі звычайнай хлусьнёй. Яны былі пушчаны ўход, каб прыцягнуць масы людзей, пры помачы якіх бальшавікі маглі стварыць свой таталітарны лад і ўмацаваць яго. Усе народы Савецкага Саюзу сталіся ахвярамі бяспрыкладнага ашуканства, мільёны людзей заплацілі жыццём за сваю лёгкавернасьць.

Гэта праўда, што ад бальшавіцкага тэрору пацярпеў і расейскі народ, але адначасна ўзрос расейскі камуністычны нацыяналізм, які праяўляе расейскую нацыяналістычную захланнасьць да такой меры, да якой яна не даходзіла на працягу ўсёй расейскай гісторыі. Ніколі расейскі імпэр'ялізм не сягнуў так далёка на Захад, ніколі не пранікала так далёка й глыбока русыфікацыя іншых нацыянальнасьцяў у іхных жа «сувэрэнных» рэспубліках.

Асновы расейскага камуністычнага нацыяналізму й імпэрыялізму запачаткаваў Ленін. Гэтыя асновы знаходзіліся ўжо ў камуністычнай дыялектыцы, дзякуючы якой усякі прынцып можна перакруціць на сваю карысьць, а таксама ў клічы сусьветнай рэвалюцыі. Сталін-жа сканцэнтраваў мэты расейскага камуністычнага нацыяналізму й імпэр'ялізму ў вадным сказе: «адзін сьвет, адзін народ, адна мова.»

20-ты зьезд Камуністычнай партыі Савецкага Саюзу зьнішчыў культ Сталіна, але зусім не крануў фундамэнту Сталінскай Савецкай Імпэрыі ўключна зь ягонай жахлівай тэорыяй панаваньня над сьветам.

Чырвоны Крэмль ня выракся імпэр'ялістычных мэтаў, ён толькі стараецца замацаваць іх. Цяперашнія савецкія валадары прыкрываюць цынізм сталінскай тэорыі такімі паняцьцямі, як савецкі народ, пад які падцягваюць і нерасейскія нацыянальнасьці і, як адзіная савецкая сацыялістычная дзяржава, у якой «сувэрэнныя» саюзныя рэспублікі зводзяцца да адміністрацыйных адзінак, як самая перадавая сацыялістычная культура – пад якую падцягваецца расейская культура, як сусьветная мова сацыялізму – пад якой разумеецца расейская мова. А адначасна савецкая палітыка – як вонкавая, так і нутраная – не да-

пускае да ніякіх дыскусіяў над нацыянальнымі праблемамі ў Савецкім Саюзе, цьвердзячы, што гэтыя праблемы даўно ўжо разьвязаныя ідэальна.

Крамлёўскія імпэрыялісты не прадбачылі, аднак, што прыклады заразьлівы, што могуць знайсьціся супернікі, якія пярэймуць усе трыкі й пачнуць разбудоўваць свае камуністычныя нацыяналізмы. Першым і самым небясьпечным супернікам стаўся камуністычны Кітай, а ўсьлед за ім пайшлі сатэліты: Югаславія, Альбанія, Вугоршчына, Польшча й Чэхаславаччына, а з усіх іх на нацыяналістычнае чало высунулася Румынія. Цяпер ужо ўва ўсіх сатэлітах культывуецца камуністычны нацыяналізм. Нават камуністычныя партыі Заходняй Эўропы, як італьянская, французская й іншыя, маюць свой нацыянальны характар і лепш разумеюцца з сатэлітамі, чымся з маскоўскімі спадкаемцамі Сталіна.

Тым часам у рознанацыянальным Савецкім Саюзе ня відаць ніякіх фактычных зьмен у нацыянальнай палітыцы. І надалей там культывуецца толькі расейскі нацыяналізм. Усе-ж праявы нацыяналізму ў нерасейскіх рэспубліках неміласэрна прасьледуюцца. Нават дзяржаўныя правы, загарантаваныя савецкай канстытуцыяй, ня выконваюцца. 13-ты параграф саюзнай канстытуцыі дае права кажнай рэспубліцы выступіць з Саюзу, унезалежніцца, а ў практыцы нават гутарка аб гэтым уважаецца за праступства й сурова караецца. Усе савецкія рэспублікі маюць права на свае міністэрствы замежных справаў і абароны, а ў практыцы апошнія існуюць толькі на паперы, а замежныя справы зводзяцца толькі да ўдзелу ў Задзіночаных Нацыях для Беларусі й Украіны, іншыя-ж рэспублікі ня маюць і гэтага. Канстытуцыі паасобных савецкіх рэспублік упаўнаважваюць іх урады вызначаць і адклікаць сваіх дыпляматычных прадстаўнікоў у чужых дзяржавах, а таксама прыймаць чужых дыпляматычных прадстаўнікоў – практыка-ж зусім супярэчыць канстытуцыйнаму праву, у практыцы расейскі цэнтральны ўрад зманапалізаваў усе дыпляматычныя правы, пазбаўляючы нерасейскія рэспублікі ўсіх азнакаў сувэрэннасьці.

У Савецкім Саюзе расейцы скаладаюць каля палавіны насельніцтва. Сталін пабаяўся ўключыць сатэлітаў у Савецкі Саюз, бо калі-б уключыў толькі адну Польшчу, дык і тады расейцы апынуліся-б у відавочнай мяншыні. Але 82% кніг і 85% газэт і часопісаў друкуецца на расейскай

мове. Эканамічныя й адміністрацыйныя справы ў нерасейскіх рэспубліках падлягаюць Маскве й адказьнейшыя становішчы там займаюць расейцы. Навет у наданьні ордэнаў за заслугі расейцы ўпрывілеяваныя, бо ім прыпадае 75% усіх ордэнаў Савецкага Саюзу.

Камуністычная імпэрыя даходзіць да абсурду. У вадных камуністычных краінах, як Румынія, Польшча, Вугоршчына й іншых сатэлітах, культывуецца камуністычны нацыяналізм, а ў другіх, як Беларусь, Украіна й іншых савецкіх нацыянальных рэспубліках, нацыяналізм прасьледуецца. Першыя краіны маюць незалежнасьць адміністрацыйную, незалежнасьць у галіне культуры й асьветы ды адносную незалежнасьць эканамічную; другія-ж гэтай незалежнасьці ня маюць зусім, яны трактуюцца як калёніі. Першыя краіны маюць прарагатывы палітычнай незалежнасьці, другія-ж, хоць і маюць забясьпечаньне гэтых прарагатываў правам, у практыцы пазбаўлены іх зусім.

Такі абсурдальны стан доўга трываць ня можа. Жывём мы ў часох нацыяналізму, а нацыяналізм пабуджае паняволеныя народы да змаганьня за сваю незалежнасьць. Узрост нацыяналізму не ападае, а прыбірае на сіле й дынаміцы. На працягу гісторыі ніводная імпэрыя не магла супрацьставіцца дынаміцы нацыяналізму.Так закончылі сваё існаваньне імпэрыі: Брытыйская, Французская й Галяндзкая. Такі самы канец чакае й Савецкую імпэрыю. Камуністычныя сатэліты ўжо паступова ўнезалежніваюцца. Нацыяналізм, які прышоў да іх, не абмінае й савецкія нацыянальныя рэспублікі. Прыклад заразьлівы й тут.

Пакаленьне сталіністых вымірае. Іх месца займае новае, інакш настаўленае пакаленьне. **Дэсталінізацыя з дэкалянізацыяй савецкай імпэрыі – справа няўхільная.** На доўгую мэту немагчыма ўтрымліваць палавіну імпэрыі ў бяспраўі, калі побач, у тэй-жа сыстэме, іншыя народы атрымліваюць поўныя правы й незалежнасьць.

У нутры Савецкага Саюзу ляжыць нацыяналістычная бомба. Яна мае страшэнную выбуховую сілу. Пытаньне толькі, ці гэта бомба выбухне сама, ці будзе разброеная эвалюцыйным працэсам (падкрэсьлена мною, Р.Ж.-Г.). **В. Жук**»

«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 114, 1966 г.)

Узгадаваўчая праца й змаганьне з камуністычнай прапагандай

Праз увесь час Вінцэнт Жук-Грышкевіч стараецца ўплываць на беларускае грамадзтва й праводзіць сярод яго ўзгадаваўчую працу. Робіць гэта ён дзе толькі можа, у прыватных гутарках, на паседжаньнях, на зборках, сходах і ў прэсе. Даецца гэта яму натуральна, бо мае выраблены сьветапагляд, мае моцныя пераканаьні, умее гаварыць плаўна, прыгожа, пераконваюча й аўтарытэтна. Яму хацелася бачыць беларускае грамадзтва нацыянальна сьведамым, зьведаю й пашанаю да свае гістарычнае спадчыны, грамадзка й палітычна выраблеым, добра сарганізаваным, дзейным і эфэктыўным у змаганьні за вызваленьне Беларусі.

«Бацькі, дбайце пра сваіх дзяцей!»

– Заклікае ён у «Вестках з Канады» – «Беларусе» 128, 1967:

«Дзеці – наш найвялікшы скарб, бо яны будуць прадаўжаць нас. Мы хочам, каб яны былі лепшыя за нас, больш асьвечаныя, разумнейшыя й шчасьлівейшыя. Мы хочам, каб яны менш цярпелі, чымся мы, каб іх жыцьцё было лягчэйшае, як нашае.

Мы хочам, каб нашы дзеці перанялі ад нас усё, што ёсьць найлепшае ў нас саміх: чэснасьць, справядлівасьць, любоў да працы, свабоды, да ўсяго прыгожага й узвышанага, да Бога, да свайго народу, да сваёй старой бацькаўшчыны й яе культуры. Дзеля гэтага мы стараемся самі быць добрым прыкладам для дзяцей, каб ад нас яны шмат чаго навучыліся, ды пасылаем іх на навуку ў школы, каб там яны навучыліся больш, як тое, што мы ім можам даць, і падрыхтаваліся да самастойнага жыцьця.

Вырваўшыся з камуністычнага пекла, мы пачуліся шчасьлівымі, што апынуліся ў новай вольнай дэмакратычнай краіне – Канадзе ці Амэрыцы, дзе знайшлі дастатняе жыцьцё, свабоду – вялікія магчымасьці для сябе й для сваіх дзяцей. Самі мы кінуліся ў работу, якую знайшлі й, працуючы, пачалі будаваць свой дабрабыт. А дзяцей выправілі ў школы, у якіх нямя ані камунізму, ані бязбожніцтва, ані клясавай нянавісьці, каб яны здабылі сабе навуку й спэцыяльнасьць.

З такімі перакананьнямі мы былі пэўныя за свой лёс і лёс сваіх дзяцей. Дзеля хутчэйшага павялічаньня дабрабыту да працы пайшоў ня толкі бацька, але й матка. Усё, здавалася-б, ішло гладка: бацькі, хоць праводзілі з сабой і дзецьмі толькі вечар і ноч, а часам і радзей бачыліся, калі прыпадалі розныя шыхты працы, на канецтыдня прыносілі падвойны заробак, з часам сталі на ногі матар'яльна, купілі дом, мэблі й усё патрэбнае ў хаце, самаход і нават грошы завяліся ў банку.

А дзеці? А дзеці таксама давалі сабе рады, зь неабходнасьці яны самі навучыліся глядзець за сабой: і зь ядой, і з навукай, і з гульнямі й таварыствам. Іх уцягнула ў свой вір жыцьця школа, мясцовае сяброўства, вуліца, а ў веку падросткаў – спорт, танцы, розныя сходкі й... ранткі (дэйтс). Усё гэта, зразумела, паза домам, без кантролю бацькоў.

І вымогі для дзяцей былі невялікія: каб была ежа ў фрыджы, вопратка, час ад часу падаркі, як на Каляды, або з прычыны «промоўшын» у школе, ды «бэрдздэй парты» дома. Пра пасьпех у навуцы рэдка калі прыходзілася клапаціцца, бо нашы дзеці, звычайна, вучацца добра. А на сваю родную мову, сваю культуру й наагул беларушчыну – навет калі ў бацькоў і была якаясь ахвота штось зрабіць у гэтым напрамку, ня было ані часу, ані адпаведных абставінаў: бацькі замала бачыліся зь дзяцьмі, а калі й бачыліся, дык былі перамучанымі, ды яшчэ мусілі займацца гаспадаркай. Ня было часу, а то й ахвоты й на рэлігійна-маральнае й грамадзкае ўзгадаваньне ў сваім родным духу. Усё ўзгадаваньне здадзена было на школу, якая ніколі ня можа абняць усяго ўзгадаваньня, тым больш іншая па духу й арганізацыі, як свая родная. Беларускія суботнія школкі, калі дзе й ёсьць, ахопліваюць вельмі малы працэнт нашых дзяцей і маюць за мала часу, каб запоўніць прабелы нармальных мясцовых школ. Дый самі бацькі ў бальшыні выпадкаў мала, а то й зусім не ўдзялялі беларускаму рэлігійнаму й грамадзкаму жыцьцю й дзяцей ня ўцягвалі ў яго. І на гэта шкада было грошай і часу.

Так і йшло жыцьцё блізка 20 год. Матар'яльна ўмацаваліся, ня было ўжо ніякіх даўгоў і моргіджаў, ашчаднасьці ў банку расьлі, але хацелася мець іх яшчэ больш. Тым часам дзеці павырасталі, паканчалі школы, пачалі працаваць, пажаніліся некаторыя, павыходзілі замуж. Той-сёй

пайшоў на вышэйшую навуку. Здаецца, усё як найлепш. Што-ж аказалася?

Аказалася, што бацькі й дзеці – гэта два розныя сьветы – часта навет чужыя адзін аднаму. Паміж імі няма аднэй мовы й духовага зразуменьня. Бацькі не навучылі дзяцей пабеларуску, дык найчасьцей яны гавораць толькі паангельску й згаварыцца зь імі цяжка. Тое, што ў бальшані выпадкаў самі бацькі мала, а то й зусім не ўцягнуліся ў беларускае царкоўнае жыцьцё, а яшчэ менш у грамадзкае – і дзяцей не ўцягнулі, ды што мала хто з дарастаючых належыць да арганізацыі беларускае моладзі – дало прыкрыя вынікі: тыя, адцятыя і ад беларускай мовы, і ад беларускага жыцьця, чуюцца чужымі для духовага сьвету бацькоў і для беларускага асяродзьдзя. У новымжа – мясцовым канадыйскім ці амэрыканскім асяродзьдзі – яны таксама ня чуюцца сваімі, бо, папершае, псыхалёгія й мэнтальнасьць (умысловасьць) у іх іншая, як у англасасаў, падругое, доўга яшчэ будзе цягнуцца за імі з-заду мянушка «ДП», якая сьцягвае на іх ніжэйшую ступень у англасаксонскім асяродзьдзі. Яны вырваны із свайго беларускага асяродзьдзя, але чуюцца пасынкамі ў новым асяродзьдзі. Гэта робіць іх няпэўнымі сябе, няпоўнавартаснымі... паніжанымі й часта нешчасьлівымі, што можа спрычыняцца й да духовага заламаньня, і да розных збачэньняў.

Гэта трагэдыя й для бацькоў і для дзяцей, і для беларускага грамадзтва. І вінаваты ў гэтым найбольш самі бацькі, што, пагнаўшыся за матар'яльным дабрабытам, пазашываліся ў норы, адсунуліся ад сваёй роднай беларускай грамады, страцілі лучнасьць з родным карэньнем, на якім узрасьлі. Занядбалі роднае ўзгадаваньне дзяцей, адарвалі іх ад гэтага роднага карэньня: ад роднай мовы, ад родных традыцыяў, духу, культуры. Пазбавілі іх грунту, на якім расьце й разьвіваецца чалавек. А грунт гэты не абышто, ён творыцца пакаленьнямі й усосваецца з матчыным малаком. А новы грунт адразу ня прысвоіш, на гэта таксама трэба пакаленьні. Вось таму й трагэдыя адчужэньня з аднаго боку паміж дзяцьмі й бацькамі з розным асяродзьдзем, а, з другога боку, трагэдыя няпоўнавартаснасьці й адчужэньня дзяцей у новым асяродзьдзі.

Трагэдыя можа быць яшчэ большай, яшчэ горшай. Калісь мы былі пэўныя, што ў мясцовых школах няма камунізму, і так яно было. Але цяпер шмат што зьмянілася.

Сярод амэрыканскай і канадыйскай моладзі зьявіліся розныя «бітнікі», «гіпіс», «піснікі», а між імі й камуністы. Камуністы праніклі ўва асяродзьдзі студэнтаў унівэрсытэтаў, нават у «гай скул» (сярэднія школы), яны ўцягваюць у свае камуністычныя дэманстрацыі студэнтаў і вучняў. Якая зарука, што нашы дзеці не падпадуць пад іх уплывы, што ня стануцца камуністамі?

Элемэнт няпэўны сябе, бяз моцнага ўзгадаваўчага грунту, незадаволены сваім станам – найбольш хісткі й падатны на ўсякія эксцэсы, скрайнасьці, а сярод нашага маладога пакаленьня такі элемэнт ёсьць. Дык ня вылучана, што ў ім знойдуцца прыхільнікі камунізму. Вось тады й будзе завяршэньне трагэдыі: бацькі ўцякалі з камуністычнага пекла, а іх дзеці робяцца камуністамі!

Такія вынікі зусім магчымыя, і трэба паважна браць іх пад увагу й забясьпечвацца перад імі. Як? Адкажам словамі нашага слаўнага паэты Якуба Коласа: «Не адрывацца ад роднага карэньня!»

Калі нашы дзеці будуць узгадоўвацца ў сваім родным духу, калі яны разам з бацькамі будуць трымацца сваёй беларускай грамады, калі наша моладзь будзе належаць да арганізацыі беларускай моладзі й, як і бацькі, будзе дзейнай у беларускім жыцьці – яна ня будзе чуцца адкінутай, горшай, прыніжанай, і ніякі камунізм пагражаць ёй ня будзе.

А ў канадзкім і амэрыканскім грамадзтве наша моладзь праз гэта ня толькі нічога ня страціць, але нават зышча, бо будзе мець куды большую пашану й прызнаньне ў англясасаў, чымся нешта бясьтварае, хісткае – нейкае няведама што. І тады, калі пойдзе дэманстраваць – дык не з камуністамі, а супраць іх. **Ж.**» (В. Жук-Грышкевіч)

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 128, 1967.)

«Камуністы рыхтуюць Ветнам у Канадзе
(Артыкул В. Жук-Грышкевіча)

‹Падрыўная палітычная дзейнасьць камуністаў у Канадзе, добра зарганізаваная, робіцца чым далей, тым больш разнастайнай›. Так кажа часопіс ‹Канэдыен Сін› (Канадзкая сцэна) нр. 738 з 10 лістапада сёлета (1967) ў артыкуле аб камуністычнай актыўнасьці, у якім заклікаецца грамадзтва да алертнасьці. Падаём далейшы зьмест гэтага артыкулу.

‹Добра зарганізаваная прасавецкая камуністычная сетка ў Канадзе прытрымліваецца ленінскай стратэгіі ў разбудове камунізму ‹мірнымі сяродкамі›, як прапаганда й розныя маніпуляцыі, імкненьне да прызнаньня грамадствам іх яўнай дзейнасьці ды выкарыстоўваньне для сваіх мэтаў нармальнай розьніцы паглядаў у нашай дэмакратычнай сыстэме. Спэцыфічнай камуністычнай дырэктывай ёсьць ‹будаваньне шырокага аб'яднанага фронту› пры помачы праніканьня ў іншыя палітычныя арганізацыі – нават далёкія ідэялягічна ад камуністаў, ды стымуляваньне руху ўлева сярод нявыразных і хісткіх.

Свае заданьні камуністы дасягаюць тым, што хапаюцца за контравэрсыйныя для канадыйцаў пытаньні, як антыамэрыканізм, дыскрэдытаваньне абароннага высілку Захаду й асабліва націскаюць на выступленьне Канады з НАТО і НОРАД. Яны стараюцца ўзмоцніць супярэчнасьці паміж работнікамі й працадаўцамі, павялічыць забастовачную акцыю ды стымуляваць нацыяналізацыю прамысловасьці.

Камуністычная партыя Квэбэку заклікае бязупынна да самавызначэньня Квэбэку з правам аддзяленьня, яна напэўна, разам із сваімі спадарожнікамі, выкарыстае гэту справу для сваіх мэтаў у часе правінцыянальных выбараў у Квэбэку.

Друк работніцкіх вуніяў, што знаходзяцца пад камуністычным правадырствам, стала трымаецца камуністычнай лініі ўва ўсіх найважнейшых для работнікаў справах. Бальшыня сяброў гэтых вуніяў ня ёсьць камуністы, але яны выстаўлены на сталы ўплыў камуністычнай прапаганды праз друк і іншыя спосабы. Апанаваны камуністамі Юнайтыд Фішэрмэн энд Айлянд Уоркэрс мае цяпер 5 аддзелаў у Новай Шкоцыі. Базуючыся на заходнім узьбярэжжы, камуністы кінуліся ў гэтым годзе на арганізацыйны высілак у правінцыях над Атлянтыкам.

Саюз Канадзкіх Студэнтаў, ня гледзячы на сільную апазыцыю сваіх сяброў, пастанавіў старацца аб сяброўства ў Інтэрнэшынэл Юніён оф Студэнтс (ІЮС) – Інтэрнацыянальным Студэнцкім Саюзе. Гэта выклікала ў грамадзтве зразумелую трывогу, бо, як перасьцерагала адна публікацыя ў 1962 годзе, ІЮС, як і яе блізкі саюзьнік Ворльд Фэдэрэйшын оф Дэмократік Ютс (ВФДЮ) – Сусьветная Фэдэрацыя Дэмакратычнай Моладзі «Насьледуе кажны зрух маскоўскай партыйнай лініі й больш зацікаўлена ў пашы-

раньні савецкай прапаганды, чымся сапраўднымі студэнцкімі справамі». Што ІЮС ёсьць палітычнай прыладай камунізму, відаць і з таго, што ён браў удзел у 1966 г. у Канфэрэнцыі Трох Кантынэнтаў у Гаване (сталіца Кубы) ды іншай зьвязанай зь ёю дзейнасьці.

Найбольшай-жа падзеяй у Канадзе трэба лічыць гуртаваньне розных груп і рухаў навокал ‹Кастраізму›. Адна з такіх групаў ёсьць Фэр Плей фор Кюба Коміты (ФПКК) – Камітэт Справядлівых Дачыненьняў да Кубы. Галоўным грунтам дзейнасьці гэтай групы ёсьць унівэрсытэты з прыбудоўкамі ў Гай Скул (сярэдніх школах). ФПКК, разам зь нядаўна заснаванай Тэрд Ворльд Інформэйшын Сэрвіс (ТВІС) – Інфармацыйная Служба Трэцяга Сьвету, пашырае прэсавы орган Цэнтральнага Камітэту Кампартыі Кубы, што друкуецца паангельску, пафранцуску й пагішпанску. Гэта публікацыя прапагуе партызанскую вайну.

У часе арганізацыі Інфармацыйнай Службы Трэйцяга Сьвету (ТВІС) на сходзе ў Таронта ў чэрвені выразна выявілася арганізацыйная сетка Трох Кантынэнтаў. Арганізацыя ТВІС адбылася паводля ўзору Фэр Плей фор Кюба Коміты. Абедзьве арганізацыі займаюцца прапагандай партызанскай вайны, таксама, як і ‹Торонто Кампэйн фор Піс энд Дызармамэнт› (ТКПД, – Тарантонская Акцыя за Мір і Раззбраеньне). Не дарма-ж адзін камуністычны партыйны тэарэтык нядаўна выясьніў, што ‹справа міру набрала цяпер новага рэвалюцыйнага зьместу›. Уся гэтая дзейнасьць ськівараная на тое, каб прызвычаіць канадыйцаў, асабліва моладзь, да ідэяў і спосабаў партызанскай вайны.

Якія-ж пэрспэктывы маюць усе рухі, пра якія тут мова? Лік людзей, замешаных у гэтых рухах, параўнальна невялікі. Але, на вялікі жаль, існуе па ўсёй Канадзе гатовая ўжо сетка розных г.зв. групаў ‹за мір›, якія, калі пойдуць па шляху ‹Тарантонскай Акцыі за Мір і Раззбраеньне›, стануцца магутнай прыладай распаўсюджваньня камуністычных ідэяў аб партызанскай вайне. Да гэтага трэба дадаць камуністычныя кнігарні й іх прыбудоўкі, што пашыраюць камуністычныя кнігі, брашуры й артыкулы аб партызанскай вайне.

З другога боку, прасавецкая сетка, якая таксама мае сваіх сяброў, паўтыканых у розных групах «за мір», прапануе ‹мірны шлях да камунізму›, які ў цяперашніх абставінах, на думку камуністаў прасавецкіх, зьяўляецца найка-

рысьнейшым. Але яны цьвердзяць, што гэта ня выключае іхняга права на ўжыцьцё збройнай сілы, калі сама сытуацыя будзе вымагаць гэтага. Адна зь нядаўных камуністычных публікацыяў асьветчыла: ‹Рашаючым фактарам у кажнай сытуацыі ёсьць сіла, арганізаваная на сталай аснове й падрыхтаваная загадзя да змаганьня, гатовая выступіць у кажную хвіліну, калі паўстане спрыяльная сытуацыя›.

Зусім лягічна, што камуністы не пагрэбуюць арганізацыяй ваяўнічай мянушкі, абазнанай з партызанскай тактыкай. Незалежна ад гэтага, яны пастараюцца папхнуць шмат маладых канадыйцаў пад уплывы тых ідэяў, якія ўзбудзяць у іх, прынамся ў больш нявіннай форме, цывільную непаслухмянасьць (канадыйскім уладам).

Калі-б стараньнікі партызанскай вайны выклікалі сваёй дзейнасьцяй публічнае зацікаўленьне й трывогу, чым вывялі-б грамадзтва з апатыі – так карыснай для поступу камунізму «мірным шляхам» – тады пасьлядоўнікі Масквы стрымлівалі-б (праўдападобна) сваіх ваяўнічых братоў ад рызыкоўных крокаў›.

Такім супакойваючым прыпушчэньнем заканчываецца артыкул. Мы аднак, што добра знаем ня толькі балышавіцкую тактыку, але й безагляднасьць камуністаў у дасягненьні сваіх мэтаў, скажам адкрыта: Пара зірнуць цьвяроза на камуністычную небясьпеку! Пара пачаць змаганьне зь ёю!

Мы мусім быць удзячныя ‹Канэдыен Сін›, што яна адважылася сьмела й адкрыта прадставіць сапраўдны твар камуністычнай дзейнасьці, завуаляванай пад рознымі хітрымі назовамі. Артыкул гэты тым больш важны, што вялікая й багатая англямоўная прэса Канады маўчыць аб падрыўной дзейнасьці камуністаў, ня хоча бачыць камуністычнай небясьпекі й часта-густа памагае камуністычнай прапагандзе.»

Падпісана – **В.** Адзін з псэўдонімаў В. Жук-Грышкевіча.

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 128, 1967)

Шануйма сваё права!

Ізноў і йзноў Вінцэнт Жук-Грышкевіч гаворыць аб патрэбе арганізованасьці:

«Толькі зарганізаваныя мы можам выявіць свой нацыянальны твар, сваю культурную й нацыянальную спадчы-

ну, свае патрэбы». У артыкуле «**Шануйма сваё права!**» ён вымоўна гаворыць аб нашых патрэбах і балячках. Пачынае з цытаты:

«І слушна запраўды маем за што Пану Богу дзякаваці жэ... тую ўладу і вольнасьць у руках сваіх маем, а права самі сабе творым... вольнасьці сваей ва ўсім пасьцерагаем, бо ня толькі сусед а спольны наш абыватэль у атчызьне, але і сам гаспадар, пан наш, жаднае зьверхнасьці над намі зажываці ня можаць, адно толькі, колькі яму права дапушчаець...» Леў Сапега.

* * *

«Гэта цытата із звароту падканцлера Вялікага Княства Літоўскага Льва Сапегі да ўсіх станаў ВКЛ. Зварот гэты быў зроблены ім у сувязі з надрукаваньнем у 1588 годзе ў друкарні братоў Мамонічаў у Вільні трэцяй рэдакцыі Статуту ВКЛ.

Зварот гэты ёсьць вельмі цікавым дакумэнтам. У ім гаворыцца аб тым, якое вялікае значэньне мае права для кожнага народу, для кожнай дзяржавы й як трэба шанаваць сваё права, падпарадкавацца яму, каб забясьпечыць парадак, свабоду й справядлівасьць. І калі ў ВКЛ быў парадак, грамадзкая, рэлігійная й палітычная свабода, а таксама дабрабыт і высокі ўзровень культуры й асьветы – дык перадусім гэта ўсё трэба заўдзячаць існаваньню ўсталенага права, скаадыфікаванага ў слаўным Статуце ВКЛ. які быў даступны кажнаму:

‹А есьлі каторамy народу стыд праў сваіх ня ўмеці, пагатове нам, каторыя ня обчым якім языком, але сваім уласным права спісанае маем і каждага часу чаго нам патрэба ку атпору ўсякае крыўды ведаці можам›, – гаворыцца ў іншым мейсцы таго-ж звароту.

Словы, сказаныя Львом Сапегам у 1588 годзе, праўдзівыя й сяньня. Там, дзе няма права або няма пашанаваньня для існуючага права – няма парадку, няма свабоды, няма справядлівасьці. Цывілізацыя й грамадзкая свабода, а зь імі й культура растуць і разьвіваюцца толькі на аснове права, а дзе права няма – там пануе дзіч, самаволя, бязладзьдзе. Маем шмат довадаў на гэта й у гісторыі, і ў навакольным цяперашнім сьвеце.

Права патрэбнае ня толькі для дзяржаўнага жыцьця, але й для грамадзкага, арганізацыйнага. У кажнай упа-

радкаванай дэмакратычнай дзяржаве права прадугледжвае магчымасьці для ўсякага роду грамадзкіх арганізацыяў, што самі сабе твораць праўныя нормы, якімі й кіруюцца ў сваёй дзейнасьці. Тут звычайна ёсьць пэўная аналёгія зь дзяржаўным правам. У дзяржаве асновай права ёсьць канстытуцыя. У ёй зьмешчаны аснаўныя, рамовыя правы. Канстытуцыя ўстанаўляецца ўстаноўчым соймам ці асамблеяй, выбранай толькі для гэтай мэты. Для правядзеньня-ж розных законаў і пастановаў для штодзённага жыцьця выбіраецца звычайны сойм ці парлямэнт, але ён можа праводзіць кажнаразовыя законы ці пастановы, толькі згодныя з канстытуцыяй, інакш гэтыя пастановы й законы будуць нелягальныя. А зьмяніць канстытуцыю парлямэнт ня можа, дзеля гэтага трэба склікаць устаноўчы сойм, ці канстытуцыйную асамблею. У Канадзе даўно ўжо гавораць пра зьмену канстытуцыі, але ніхто гэтага ня можа зрабіць, пакуль ня будзе склікана канстытуцыйная асамблея.

Падобны парадак і ў розных арганізацыях грамадзтва. Кажная арганізацыя для свайго існаваньня прыймае свой статут – канстытуцыю (паангельску статут ёсьць канстытуцыя, а слова статут ужываецца для розных рэгулямінаў). Статут устанаўляе арганізацыйны сход арганізацыі. У далейшым-жа агульны сход выносіць патрэбныя для жыцьця й працы розныя пастановы.

Аднак гэтыя пастановы мусяць быць згодныя із статутам. Калі-ж акажацца, што дабро арганізацыі вымагае зьмены статуту, тады агульны сход можа зьмяніць тыя ці іншыя пункты статуту ці прыняць новыя – з захаваньнем усіх фармальнасьцяў, але ніколі ня можа праводзіць пастановаў, супярэчлівых із статутам, ці непрадугледжаных статутам. На выпадак няпэўнасьці што да правільнасьці пастановаў і спосабу правядзеньня іх, у дэмакратычных краінах існуюць адумысловыя падручнікі дэмакратычнай парлямэнтарнай працэдуры для розных арганізацыяў, бо дэмакратычны лад будзе забясьпечаны поўнасьцьцю толькі тады, калі ён будзе функцыянаваць правільна, як у дзяржаўных установах, так і ў арганізацыях грамадзтва.

Мы – беларуская эміграцыя – жывём у вольных дэмакратычных краінах і падлягаем ладу й парадку іх. Як расцярушаная маса адзінак – мы нічога ня зможам і губімся ў чужым моры людзей. Толькі зарганізаваныя мы можам выявіць свой нацыянальны твар, сваю культурную

й нацыянальную спадчыну, свае патрэбы. Гэта вялікае няшчасьце для нас і нашага народу, што тысячы нашых суродзічаў, нясьведамых нацыянальна, ня трапілі ў свае беларускія арганізацыі й запрапасьціліся. Гэта вялікае няшчасьце, што сотні нашых суродзічаў, сьведамых беларусаў, абыякавыя да нашага арганізацыйнага жыцьця й не бяруць у ім удзелу. Яны хіба што нясьведамы таго, якую вялікую шкоду яны робяць беларускай справе сваёй абыякавай, пасыўнай паставай.

Усё-ж значная частка беларускай эміграцыі – лепшая частка – зразумела сваю ролю й значэньне эміграцыі, яе гістарычны наказ і, карыстаючы з дэмакратычных свабодаў сваіх краінаў пражываньня, стварыла сваё арганізацыйнае жыцьцё. Посьпех і трываласьць гэтага жыцьця залежыць бязумоўна ад таго, як яно зарганізавана. Справа гэта першай вагі, бо ад яе залежыць, ці будзе чутны беларускі голас у вольным сьвеце.

Асновай спраўнасьці, жывучасьці й працаздольнасьці нашых арганізацыяў ёсьць права, на якім мы базуемся, г. зн. статуты іх. А другім важным мамэнтам ёсьць, ці мы шануем гэта права – нашы статуты, ці прытрымліваемся іх у сваёй дзейнасьці, правільна вырашаем свае заданьні.

Мы ёсьць народам із слаўнымі прававымі традыцыямі, але, на вялікі жаль, вельмі часта не прыдаём вялікага значэньня свайму праву – статуту ці пастановам агульнага сходу, трактуем іх як сухую малаважную фармалістыку й часамі **робім ня так, як кажа статут, а так, як нам хочацца, як нам падказваюць свае асабістыя меркаваньні.** І трэба дзіву дзівіцца, але кіраўніцтва сходу й сябры арганізацыі часамі прапускаюць парушэньні статуту абыякава, бязь ніякай рэакцыі, чым уводзіцца прэцэдэнс для далейшай самаволі, для далейшага парушаньня права.

У выпадку-ж спрэчнага тлумачэньня дадзенага пункту статуту мы часта, заміж таго, каб заглянуць у падручнік парлямэнтарнай працэдуры й знайсці правільную разьвязку – сварымся, валтузімся, трацім час і або адступаем ад парушанае справы, або вырашаем яе няправільна, чым ствараем незадаваленьне й недавер да арганізацыі.

Арганізацыя без свайго права – статуту ня ёсьць арганізацыяй, а калі ў яе ёсьць статут, але ніхто на яго не зьвяртае ўвагі – яна робіцца штучнай, прыпадковай і ня мае ніякай будучыні, яна занікае. І вінаваты ў гэтым будзем толькі мы самі.

У нашым арганізацыйным жыцьці было й ёсьць шмат сварак і закалотаў. Былі нават паважныя арганізацыйныя расколы. Вінаватыя ў гэтым тыя ці іншыя людзі, спрычыніліся да гэтага шмат розьніца ў пераканаьнях і нашая грамадзкая нявырабленасьць. Але ўва ўсіх нашых закалотах прычына была ў тым, што мы не шанавалі свайго права, забыліся на несьмяротныя словы нашага вялікага праўніка Льва Сапегі, якія ён вымавіў 400 год таму назад, адыйшлі ад слаўных традыцыяў сваіх продкаў. **Ж.**»

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 127, 1967)

Аб патрэбе агульнанацыянальнага цэнтру

Яшчэ ў саракавых гадох, пасьля заснаваньня Згуртаваньня Беларусаў у Вялікай Брытаніі, гаворыць Вінцэнт Жук-Грышкевіч аб патрэбе стварэньня агульнанацыянальнага беларускага цэнтру, ня толькі дзеля каардынацыі беларускага жыцьця на эміграцыі, але й дзеля нацыянальнай рэпрэзэнтацыі беларусаў за мяжой. Спробы ў гэтым напрамку ўжо рабіліся. У лістападзе 1948 году адбыўся ў Парыжы Першы Сусьветны Зьезд Беларускай Эміграцыі, які стварыў арганізацыю «Сусьветнае Аб'яднаньне Беларускай Эміграцыі», якая ў свой час гуляла ролю гэткага цэнтру. У Канадзе на малую скалю створаны Каардынацыйны Камітэт Беларусаў Канады, які гэткую ролю выконвае на Канаду, але-ж не ахоплівае ўсяе беларускае эміграцыі.

Пытаньне беларускага агульнанацыянальнага цэнтру разглядае др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч у артыкуле ў «Вестках з Канады» – «Беларусе», 107, 1966.»:

«Патрэба агульнанацыянальнага цэнтру

Беларуская эміграцыя – нацыянальна сьведамая – ня можа пахваліцца вялікім лікам. Актыўнасьць і ахвярнасьць яе немалая, але блага зарганізаваная й нескаардынаваная. Найгоршай перашкодай у нашым нацыянальна-грамадзкім жыцьці ёсьць наша разьбіцьцё на групы й групкі. Адбіваецца гэта на нацыянальнай рэпрэзэнтацыі і на нашай нутраной працы нацыянальна-грамадзкай ды культурна-асьветнай.

Што ў нас ёсьць розныя пагляды й розныя палітычныя напрамкі з сваімі арганізацыямі – гэта нармальнае зьявішча ў дэмакратычным сьвеце. Ненармальным адылі ёсьць той факт, што мы ня можам здабыцца на агульнанацыянальны цэнтр, у якім маглі-б зьмясьціцца ўсе напрамкі, усе пераканаьні, усе арганізацыі, дзе-б таляравалася апрычонасьць у паглядах і пераканаьнях – а з другога боку, дзе-б лучыліся ўсе агульнанацыянальныя справы, агульнанацыянальныя інтарэсы.

Такі цэнтр узяў-бы на сябе нацыянальную рэпрэзэнтацыю ўсіх беларусаў дадзенай краіны й каардынацыю працы ўсіх беларускіх арганізацыяў, якія ў ім знаходзяцца. Пазьней нацыянальныя цэнтры паасобных краінаў маглі-б дамовіцца між сабой і стварыць агульнанацыянальны цэнтр для ўсёй беларускай эміграцыі. Так была-б завершана арганізацыя беларусаў у вольным сьвеце.

На вялікі жаль, за 20 год нашага жыцьця на эміграцыі мы да такога цэнтру йшчэ не дайшлі, хоць і ўсьведамляем сабе, што ён нам вельмі патрэбны, і ведаем, што ўсе іншыя нацыянальнасьці такія цэнтры маюць – ці то нацыянальныя кангрэсы, ці фэдэрацыі, ці іншыя, і дзякуючы гэтым нацыянальным арганізацыям яны вельмі шмат аблягчаюць сабе працу, як нутраную, так і рэпрэзэнтацыйную.

Адсутнасьць сталай агульнанацыянальнай арганізацыі паніжае нашу нацыянальную годнасьць, ставіць нас у рад нявырабленых палітычна й грамадзка народаў. Няўжо беларусы анархісты з натуры або няздарныя, што не патрапяць добра зарганізавацца? – Пытаемся сябе й дзіву даёмся. Але-ж не, гісторыя наша нас вучыць, што беларускі народ умеў зарганізавацца й рабіў вялікія справы. Дык віна мусіць ня ў нашай натуры, а ў ахвоце й добрай волі. Мы проста занядбалі нашу арганізацыйную справу, паддаліся груповым і асабістым справам і амбіцыям.

Закранутая тут справа ня новая, яе прабавалі вырашыць і ў Задзіночаных Штатах, і ў Канадзе, і ў Эўропе, але без пазытыўных вынікаў. Старыя непаразумленьні, груповыя й асабістыя амбіцыі ды анімозыі бралі верх над нацыянальнай справай. Добра, калі там сям удавалася зрабіць супольнымі сіламі сьвяткаваньне 25-га Сакавіка, ці якуюсь іншую імпрэзу, найчасьцей-жа й такія сьціплыя пачынаньні канчаліся нічым.

А час не чакае. Мы паносім усё большыя й большыя страты. Людзі зьнеахвочваюцца й робяцца абыякавымі да нашай справы. А моладзь? Наша моладзь? Толькі частку нам удаецца захаваць пры сабе, рэшта-ж расплываецца ў чужым моры. Ня будзем шукаць вінаватых. Ведаем, што вінаваты эміграцыйныя абставіны, бацькі – ды й усё грамадзтва, якое нічым ня можа заімпанаваць маладому пакаленьню: ані арганізацыяй, ані творствам, ані культурным узроўнем ці зарганізаваным культурным жыцьцём.

Агульнанацыянальны цэнтр, скаардынаваны высілак пэўне-ж ня вылечыць усіх балячак нашага жыцьця. Але ўплянаваная й скаардынаваная праца шмат у чым нам дапаможа, аблегчыць, а перадусім дасьць нам сьведамасьць нацыянальнага адзінства, нацыянальнага абавязку, – падыме нас на духу й узмоцніць нашу нацыянальную годнасьць.

Дык найвышэйшы час, каб наша грамадзтва ўва ўсіх краінах рассяленьня адкінула груповыя й асабістя непаразумленьні й анімозыі ды пачало тварыць каардынацыйныя камітэты, зь якіх пазьней утварыўся-б Беларускі Агульна-Нацыянальны Эміграцыйны Цэнтр.

Першы крок ужо зроблены. Варта зьвярнуць увагу на зацемку аб утварэньні Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады ў Таронта. **Ж.**»

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 107, 1966).

Аб патрэбе стварэньня агульна-нацыянальнай беларускай арганізацыі, якая ахоплівала-б розныя беларускія арганізацыі, і аб прадумовах магчымасьцяў яе быцьця гаворыць Вінцэнт Жук-Грышкевіч у артыкуле ў «Вестках з Канады» – «Беларусе», 135-136, 1968.:

«Прынцып 'Unity in Diversity' і Беларусы

Прынцып адзінства ў разнароднасьці ёсьць асновай у палітычным, грамадзкім і культурным жыцьці Канады, ён вынікае з праўдзіва дэмакратычнага ладу, якім Канада можа хваліцца на ўвесь сьвет. Дзякуючы гэтаму прынцыпу, забясьпечваецца поўная свабода адзінцы, розным нацыянальнасьцям, усім арганізацыям, усім цэрквам, усім палітычным партыям ды рознамоўнай і рознай ідэялягічна прэсе. Свабода слова, свабода сходаў, свабода ўсіх рэлігіяў, свабода дзеяньня, пакуль яно не парушае права й ладу, належыць кожнаму канадыйцу.

Канадыйскія ўлады нават заахвочваюць да захаваньня нацыянальнасьцяў зь іх мовамі й культурамі – спадчынай продкаў, бо ведаюць, што дзякуючы гэтаму ўзбагачваецца агульная канадыйская культура.

Разам із свабодай прынцып адзінства ў разнароднасьці з усяго канадыйскага грамадзтва пераходзіць і ў меншыя асяродкі – у розныя нацыянальнасьці. І тут людзі маюць розныя палітычныя партыі, розныя рэлігіі й цэрквы, розныя арганізацыі ды розныя ідэялягічна газэты й часопісы. Дзеля розьніцы ў паглядах яны дыскутуюць, нават сварацца ідэялягічна, але ў сэнсе нацыянальным яны твораць адзінства й не абмяжоўваюцца каардынацыйнымі камітэтамі, а маюць сталыя агульна-нацыянальныя арганізацыі, у якія ўвайходзяць усе арганізацыі. Так, украінцы маюць КУК, палякі – Польскі Кангрэс, балты свае нацыянальныя фэдэрацыі.

Аднак, каб прынцып адзінства ў разнароднасьці праводзіўся ў жыцьцё – неабходнымі ёсьць талеранцыя, цярпімасьць паміж рознымі групамі й арганізацыямі ды ўзаемная пашана й няўмешваньне ў справы адзін другога. Бяз усяго гэтага ня можа быць арганізованага адзінства ані агульна канадыйскага, ці груповага.

Трэба прызнаць, што талеранцыя й узаемная пашана не такія ўжо простыя якасьці. Яны паўстаюць і ўтрымліваюцца ў людзей на адпаведным культурным узроўні, у людзей выраблены, пераканаць дэмакратаў. Таму арганізацыйнае адзінства паўстае зь вялікімі цяжкасьцямі й не адразу.

У нас – беларусаў Канады дагэтуль няма арганізованага адзінства й ня ўсюды ёсьць арганізацыі ды ня ўсе яны чынныя. Няважна, якія гэта арганізацыі й да якога кірунку яны належаць, важна, каб яны былі, каб былі чыннымі. Добра, што ў Вініпэгу ёсьць БВФ і ён чынны, і блага, што ў Мантрэалі ёсьць аддзел ЗБК і ён нячынны. Мы здабыліся пакульшто толькі на ККБК і то ён не ахоплівае ўсіх арганізацыяў. Усё гэта пахвальна аб нас не гаворыць.

Правядзеньне прынцыпу адзінства ў разнароднасьці мае й іншую перашкоду. Выкарыстоўваюць яго свабоду дзеяньня й талерантнасьць камуністы й іх прыхвасьні ў сваёй падрыўной разбураючай рабоце. На Экспа-67 у Мантрэалі абслуга савецкага павільёну й савецкія «турыстыя» не дарма праседзелі там чуць ня год. Яны выкарыстоўвалі сваю сутычнасьць зь людзьмі для сваёй прапаган-

ды ўмела й асьцярожна. Апрача таго, яны адведвалі мясцовых беларусаў і пры кожнай нагодзе стараліся ўбіць у іх галовы свае тэзы. Яны ачэрнівалі нашых палітычных дзеячоў – «нацыяналістых», беларускія арганізацыі – асабліва палітычныя, ды стараліся намовіць нашых людзей, каб трымаліся мага як далей ад іх. Яны нацкоўвалі праваслаўных на каталікоў, стараліся ўбіць клін між беларусамі, што бяруць чынны ўдзел у палітычнай працы (асабліва націскалі на бээнэраўцаў), і тымі, што палітычна нявырабленыя, або палітычнай працай ня цікавяцца.

Зразумела чаму. Палітычныя арганізацыі й іх дзеячы ім косткай у горле, бо прыпамінаюць сьвету аб бальшавіцкім паняволеньні Беларусі і змагаюцца зь імі. Бальшавікі нічога ім зрабіць ня могуць, дык прынамся стараюцца аддзяліць ад іх уплываў. Дзеля гэтага бальшавіцкія агенты пусьцілі вэрсыю, што палітычныя дзеячы й іх прыхільнікі гэта не канадыйцы, а «эгзыльнікі» – эмігранты, бо яны прызнаюць БНР, што быццам ёсьць нязгодна з канадзкім правам. Тут ёсьць відавочнае застрашваньне, маўляў, хочаш быць добрым канадыйцам, дык сядзі й ня рыпайся. Можаш належаць да якойсь «нявіннай» беларускай арганізацыі ці царквы й этнічнай групы, але ў ніякую беларускую справу не мяшайся.

Але страхі на ляхі, БНР цяпер ня ёсьць дзяржавай і Канада не прызнае яе, як такую. Рада БНР ня ёсьць для Канады дзяржаўнай інстытуцыяй, а палітычнай арганізацыяй. А да палітычных арганізацыяў, згодна з сваімі перакананьнямі, можа належыць кожны канадыец зусім праўна. У такой-жа сытуацыі знаходзяцца й украінцы, і палякі, і іншыя. Украінцы маюць сваю УНРаду й ніхто з украінцаў не закідае, што тыя, што належаць да яе, або падтрымліваюць яе – робяць гэта бяспраўна й ёсьць благімі канадыйцамі. Тое самае ў палякаў і балтаў. Не дармаж канадыйцы ставяцца прыхільна да сьвяткаваньня ўгодкаў дзяржаўнасьці гэтых народаў ды прысылаюць на сьвяткаваньні сваіх высокіх урадаўцаў.

Аўтар гэтых радкоў быў сьведкам, як 500 канадыйцаў украінскага паходжаньня вітала свайго прэзыдэнта УНРады Міколу Левіцкага, а канадыйскі сэнатар Павал Юзык заклікаў да стварэньня ўкраінскай дзяржавы на эміграцыі, па прыкладу жыдоў у Палестыне. І напэўна нікому зь дзеячоў і прыхільнікаў УНРады навет у галаву ня прыйшло, што ён няпраўны, ці благі канадыец, дзеля таго,

што абстойвае украінскую дзяржаўнасьць. Толькі здрадніку або неразумнаму можа прыйсьці ў галаву такая думка.

Бальшавіцкая дэмагогія ськівравана на тое, каб аслабіць палітычную дзейнасьць і значэньне эміграцыяў паняволеных падсавецкіх народаў. Пашыраюць яе й тутэйшыя камуністы й іхнія прыхвасьні. І ў беларускім асяродзьдзі круціцца тып, які, як той злодзей, што ўкраў і крычыць «лаві злодзея!», закідае ідэйным беларусам тое, што робіць сам. Ён, хоць і аднекваецца ад камунізму, але праводзіць тыповую бальшавіцкую работу: ачэрнівае ўсё беларускае, што жывое й актыўнае, і асабліва нападае на палітычную працу бээнэраўцаў. У сваёй здрадніцкай рабоце ён не затрымліваецца ні перад нацыянальнымі сьвятасьцямі, ні перад рэлігійнымі. Ён натраўлівае бээнэраўцаў на небээнэраўцаў, праваслаўных на каталікоў, страшыць беларусаў, што яны няпраўныя канадыйцы, калі яны належаць да Рады БНР, падтрымліваюць яе й абстойваюць незалежную беларускую дзяржаўнасьць. Яго мэтай ёсьць – зьнеахвоціць беларусаў да сваей нацыянальнай справы. Мана, ашуканства, плётка, паклёп – гэта ягоныя прылады. Ён пускаецца на ўсе трыкі, абы толькі сеяць разьбіцьцё, нязгоду й варажнечу сярод беларускага грамадзтва й не дапусьціць да арганізацыйнага адзінства й згоды.

Але мы не павінны праймацца варожай прапагандай, а даваць ёй адпор і рабіць сваё. Беларуская справа вялікая, чыстая й даўгавечная, яна пераможа. І адпадзе ад яе ўсякі бруд і здрада, як струп ад загоенай раны.

Для дабра беларускай справы й палепшаньня свайго жыцьця ў Канадзе мы мусім ськіваць свае высілкі на ўзмацненьне арганізацыйнага адзінства з захаваньнем пашаны да разнароднасьці нашых арганізацыяў, іх кірункаў і асабістых пераканаьняў. Толькі такім шляхам мы зможам утрымацца ў Канадзе як асобная беларуская група. **Ж.**»

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 135-136, 1968)

Беларусаў дзеляць на нацыяналістых і... расейцаў

І яшчэ адзін прыклад ужо даўняе камуністычнае дзейнасьці ў Канадзе, у якой «пэрфідную ролю згуляў беларускі рэнэгат былы грамадавец Рыгор Акулевіч». Яму адпор

дае Вінцэнт Жук-Грышкевіч у артыкуле «**Беларусаў дзеляць на нацыяналістых і... расейцаў**»:

«Такі падзел праводзяць расейскія камуністы ў Канадзе. Нармальна кажная нацыянальнасьць мае нутраны падзел паводле палітычных паглядаў: нацыяналістых, сацыялістых, дэмакратаў, камуністых і т. п. Самі расейцы дзеляцца на правых (белых), якія маюць некалькі групаў, і левых (чырвоных). Але ў дачыненьні да беларусаў – расейскія камуністы ў Канадзе (і ў Амэрыцы) прызнаюць толькі адзін падзел: беларускія нацыяналісты (бебурнацы) і рускія зь Беларусі, якія, як «прагрэсыўныя» – уцягнуты ў Фэдэрацыю Расейскіх Канадцаў. Нават прынцып камуністычнага сьвятога Леніна аб нацыянальным самавызначэньні ў дачыненьні да беларусаў не бярэцца пад увагу, хоць у дачыненьні да ўкраінцаў гэты прынцып прызнаецца, бо ўкраінскія камуністы ў Канадзе маюць свае арганізацыі, незалежныя ад расейскіх.

Справа гэтая пачалася даўно й мае сваю гісторыю. Пэрфідную ролю згуляў у ёй беларускі рэнэгат Рыгор Акулевіч. Ён былы грамадавец. Прыехаў у Канаду з Заходняй Беларусі пасьля разгону Грамады. Як сам піша ў сваёй кніжцы «Русские в Канаде», спаткаў шмат беларусаў. Быў актыўны сярод іх. Арганізаваў сярод іх расейскія работніцкія клюбы імя Горкага, а пазьней Фэдэрацыю Расейскіх Канадцаў (ФРК). Ён адзін із заснавальнікаў і супрацоўнікаў расейскай камуністычнай газэты «Канадский Гудок», а пазьней «Вестника». Ён і цяпер галоўны стоўб у ФРК і «Вестнику».

У «Канадским Гудку» Акулевіч друкаваў у пяцёх нумарох «беларускі куток» (відаць жывое йшчэ было ў яго беларускае сумленьне грамадаўца), але закінуў яго быццам таму, што ня было зацікаўленьня ў чытачоў. Наіўнае апраўданьне. Напэўна перамагла тут партыйная лінія, бож якраз тады ў БССР пачалося змаганьне з нацдэмаўшчынай і траўля ўсяго беларускага, якая перанесена была й на эміграцыю. Курс русыфікацыі ў Беларусі стаўся ўзорам і для русыфікацыі эміграцыі.

Лёс лідэраў Грамады – Тарашкевіча, Мятлы, Рак-Міхайлоўскага й іншых грамадаўцаў, якіх Саветы вызвалілі з польскіх вастрогаў, а пазьней зьнішчылі ў сваіх лягерах – нічога не навучыў Акулевіча. Верны сталінскай палітыцы, ён становіцца начале русыфікатараў старой беларускай эміграцыі, зацягваючы яе спачатку ў расейскія ра-

ботніцкія клюбы, а пазьней у Фэдэрацыю Расейскіх Канадцаў. Цяпер ён ужо навет не заікнецца пра беларусаў у ФРК, хоць стала знаходзіцца ў вакружэньні сваіх землякоў, якія, насьледуючы яго, высіляюцца на ламаную расейшчыну, а то й гавораць чысьцюсенькай беларускай матчынай мовай.

Навет Прокша ў завяртанскім «Голасе Радзімы» цьвердзіць, што беларусаў у Канадзе не адзін дзесятак тысяч, што, «большасьць зь іх члены прагрэсыўнай арганізацыі – Фэдэрацыі Рускіх Канадцаў і што яны любяць беларускае слова, песьні й кніжкі.» На сходзе ФРК да яго – Прокшы, як ён сам піша, зьвярталася шмат людзей з розных куткоў Беларусі, гаварылі пабеларуску, прасілі беларускіх песьняў, а адзін слонімскі паводля паходжаньня, прачытаў верш Янкі Купалы. Адным словам, беларусаў у ФРК шмат. Але гэта фактычны бок справы. Фармальна-ж «прагрэсіўных» беларусаў няма, яны ўсе «рускія». Яны належаць да Фэдэрацыі Расейскіх Канадыйцаў і працуюць для справы «адзінай радзімы» – паводля савецкага рэцэпту, гэта знача для расейскай нацыі, для расейскай справы.

Папала мне ў рукі расейская (камуністычная) газэта «Вестник» нр. 2695-96 з 14 кастрычніка 1967 г. Гэты падвойны нумар прысьвечаны 12-му зьезду ФРК. На некалькіх бачынах зьмешчаны даўжэзныя даклады сяброў Галоўнай Управы ФРК, зь якіх найдаўжэйшы сакратара Гал. Упр. Акулевіча – аж на 3 бачыны. З дакладаў відаць, што цэнтральным пунктам зьезду было імкненьне Фэдэрацыі да супрацоўніцтва й адзінства ўсяго расейскага насельніцтва Канады, і асаблівы націск клаўся на супрацоўніцтва з духаборамі (у імкненьнях да «общчего дела» ведамы рэлігійны фанатызм і рэакцыйнасьць духабораў ня ёсьць перашкодай для расейскіх камуністых, тут яны ня грэбуюць нічым). На зьезьдзе ФРК гаварылася аб арганізацыі расейскіх школ, навучаньні расейскай мовы, аб расейскіх кніжках, бібліятэках, расейскіх песьнях, хорах, фэстывалях, аб расейскім патрыятызьме. Сяброў Фэдэрацыі заклікалі да ўдзелу ў барацьбе за мір (пэўне-ж, паводля савецкага рэцэпту), да ўдзелу ў дэманстрацыях супраць вайны ў Ветнаме, супраць «амэрыканскага імпэрыялізму» (савецкі-ж імпэрыялізм для іх легальная справа!), супраць «агрэсыі» Ізраэля ў дачыненьні да арабаў.

Але ані Акулевіч у сваім даўжэзным дакладзе, ані іншыя дакладчыкі навет адным словам ня ўспомнілі пра

нацыянальныя патрэбы беларускіх сяброў Фэдэрацыі, пра якіх з такім гонарам пісаў Прокша. Затое вялікая ўвага ўдзялялася на зьезьдзе французскім канадыйцам і Квэбэку. Акулевіч цьвердзіў, што рух квэбэцкіх сэпаратыстых з правам на нацыянальнае самавызначэньне аж да аддзяленьня станецца ў блізкай будучыні дакананым фактам, і казаў, што ФРК мусіць вітаць гэту рух.

Гэта зусім згодна зь ленінскай палітыкай, якую Савецкі Саюз прапагуе на ўсім сьвеце, за выняткам нацыянальных нерасейскіх савецкіх рэспублікаў у сябе: тут ленінскі нацыянальны прынцып павіс у паветры, а ў практыцы ўва усіх гэтых рэспубліках, уключна зь беларускай, праводзіцца безаглядная русыфікацыя. Такой-жа лініі трымаецца й «прагрэсыўная» Фэдэрацыя Рускіх Канадцаў: вітае сэпаратыстычны рух у Квэбэку, але ня прызнае беларускай нацыянальнасьці ў сваёй арганізацыі й зусім ня дбае пра нацыянальныя патрэбы сваіх сяброў беларусаў: пра іх мову, песьні, кніжкі, пра іх нацыянальныя правы. Для гэтай «прагрэсыўнай» арганізацыі беларусамі ёсьць толькі беларускія нацыяналісты, а ўсе іншыя беларусы – асабліва-ж ‹прагрэсыўныя› сябры ФРК – гэта ‹рускія›.

Грамадавец» (Псэўдонім В. Жук-Грышкевіча).

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 127, 1967)

Камуністы цікавяцца Згуртаваньнем Беларусаў Канады

(20-я ўгодкі Згуртаваньня Беларусаў Канады)

16-га лістапада 1968 году сьвяткавалі мы 20-я ўгодкі ЗБК. Запросіны для гэтай мэты рабілі мы ў друкарні беларуса з старой эміграцыі. Да ЗБК ён не належаў, але яго знаў Уладыка Мікалай. Калі Уладыка Мікалай зайшоў у друкарню забраць гатовыя ўжо запросіны, собсьнік яе зьбянтэжана перапрашаў, што прыйшоў адзін чалавек і ўзяў адныя запросіны.

– «Акулевіч?» – пытаецца Уладыка.

– «Але! Скуль вы ведаеце?!» – кажа гаспадар.

– «Ведаю. Ну, што-ж, узяў то ўзяў.» – адказвае Уладыка Мікалай. На гэтым інцыдэнт тымчасам скончыўся.

Да сьвяткаваньня прыгатаваліся мы надта старанна. Зрабілі выстаўку зь дзейнасьці ЗБК за 20 год у фатаграфі-

ях і дакумэнтах. Залю ўпрыгожылі арыгінальнымі беларускімі багатымі тканінамі й кветкамі. Выстаўка складалася зь дзесяці гнёздаў: 1. Афармленьне франтовай сьцяны з нацыянальнымі эмблемамі, партрэтам Янкі Купалы, Якуба Коласа і Кастуся Каліноўскага; 2. Удзел ЗБК у сьвяткаваньні стагодзьдзя Канады; 3. Здымкі зь першага беларускага дому на Дандас 1000; 4. Адзначэньне 450-ці год Беларускага Друку; 5. Залаты юбілей Беларускай Народнай Рэспублікі; 6. Сьвяткаваньні 25-га Сакавіка ад 1949 году, сьвяткаваньні Дня Герояў Беларусі, 1-я й 2-я Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі, візыта Архіяпіскапа БАПЦ Уладыкі Васіля, візыта Біскупа Часлава Сіповіча; 7. Здымкі з 1966-1968 гадоў; 8. Франьцішак Багушэвіч – ягоны партрэт і кліч «Не пакідайце мовы нашай роднай беларускай, каб ня ўмерлі!»; 9. Гэтае гняздо прысьвечана беларускаму народнаму мастацтву й жанчыне. Яго ачольваў партрэт Алёйзы Пашкевіч-Цёткі; 10. На сталах, накрытых беларускімі тканінамі – публікацыі ЗБК, плякаты, афішы, альбомы са здымкамі.

У гэтай сьвяточнай і ўрачыстай залі чуткай душою можна было пачуць клічы: «Паўстань з народу нашага Прарок... Пясьняр... Ваяк... Уладар...!»; «Каб мы ўсякага труду й скарбаў для паспалітага дабра й айчыны свае не шкадавалі!»; «Не пакідайце мовы нашай роднай беларускай, каб ня ўмерлі!»; «Я там біўся, я там віўся, я там крыльлі паламаў, а ўсё-ж такі не дабіўся, каб народ свой голас даў...»; «Мой родны кут, як ты мне мілы, забыць цябе ня маю сілы...»; «Бо я табе з пад шыбеніцы кажу, Народзе, што тады толькі зажывеш шчасьліва, калі над табою Маскаля ўжо ня будзе!»

Сярод гасьцей былі: Япіскап БАПЦ Уладыка Мікалай, заступнік старшыні Рады БНР др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч, прадстаўнік ад мэра Таронта сп-ня Маргарэт Кэмпбэл, высокі ўрадавец ад Аддзелу Іміграцыі на Цэнтральную Канаду сп. Глын П. Ален і спадарыня Ален, заступнік старшыні Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня – др. Язэп Сажыч, старшыня аддзелу БАЗА ў Клівэляндзе сп. С. Карніловіч, сакратар аддзелу БАЗА у Дэтройце др. Уладзімір Бакуновіч, старшыня Беларускага Нацыянальнага Аб'яднаньня сп. Язэп Пітушка й іншыя.

Пры ўваходзе ў залю сустракалі гасьцей: маладзенькае дзяўчо ў нацыянальнай вопратцы – Эва Пашкевічанка й аўтарка гэтых радкоў. Мы прасілі гасьцей падпісвацца ў



Др. В. Жук-Грышкевіч прамаўляе на акадэміі 20-х угодкаў ЗБК. Таронта, 16 лістапада, 1968.

кнізе прысутных й прышпільвалі ім юбілейныя значкі. Зайшоў у залю незнаёмы спадар і, паказваючы нам запросіны, кажа: «Мне прыслалі запросіны...». Неяк ніхто так сябе не прадстаўляў... Кажу яму: «Ніхто вам запросінаў не высылаў, вы самі ўзялі іх у друкарні...». Ня ведаючы, што зрабіць, параілася зь іншымі й дазволіла сп. Акулевічу (зь якім мы ўжо вышэй пазнаёміліся) зайсьці ў залю.

Пачаўся ўрачысты сход. Вёў яго старшыня ЗБК сп. М. Ганько. Вітаў сход Яго Праасьвяшчэнства Укладыка Мікалай, за ім Віцэстаршыня Рады БНР др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч:

«...ЗБК заўсёды ведала свае мэты й заданьні, яно было й ёсьць астояй вялікіх ідэалаў Беларускай Народнай Рэс-

публікі, дык можа якраз таму й здолела праводзіць так вялікую работу.

Згуртаваньне Беларусаў Канады ёсьць вызначным і ў іншым аспэкце: яно злучыла ў сваіх радох беларусаў з розных чужацкіх акупацыяў – савецкай, польскай, нямецкай – якія прывівалі ім свае ідэялёгіі й намагаліся зрабіць зь іх сваіх служак; з розных варожых сабе арміяў, якія ў часе 2-ой Сусьветнай вайны стараліся зрабіць з нас ваякаў за чужыя нам справы; з розных эміграцыйных асяродзьдзяў шматлікіх краінаў Эўропы й Амэрыкі зь іх спэцыфічнымі звычаямі й псыхалёгіяй. Сябры ЗБК прыехалі ў Канаду не беспасярэдня з дому, а прайшлі, кожны пасвойму, розныя цярністыя шляхі.

Тут ёсьць тыя, што скаштавалі бяды савецкіх турмаў і лягероў, польскіх турмаў і нацыстоўскіх засьценкаў, тыя, што цярпелі зьдзекі ўсіх акупацыяў Беларусі, тыя, што вытрымалі жахі вынішчэньня ваеннай гітлероўскай машыны й савецкіх партызанаў, урэшце й тыя, што прыехалі ў Канаду, каб зарабіць, яшчэ перад вайной.

І ня гледзячы на разнароднасьць шляхоў у Канаду, шматгадовых чужацкіх націскаў і ўплываў, сябры ЗБК не перасталі быць беларусамі, патрыётамі. Яны адшукаліся ўзаемна, беларускасьць і абавязкі перад бацькаўшчынай злучылі іх увадно, яны залажылі ЗБК ды пачалі працаваць для сябе й Беларусі.

Гэта зьявішча мае вялізарнае значэньне, яно гаворыць аб тым,што мы НАЦЫЯ, БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯ. Нас нельга зьнішчыць, ні разагнаць. Раскінутыя нягодамі, катаклізмамі па ўсім сьвеце – мы, дзе-б мы не знаходзіліся, зноў зьбіраемся разам, каб жыць і працаваць разам для вызваленьня нашай любай Беларусі. Факты гэтыя ёсьць зарукай, што мы як нацыя раней ці пазьней здабудзем належныя нам правы, вернем гістарычную славу свайму народу...» – гаварыў Віцэстаршыня Рады БНР др. В. Жук-Грышкевіч. («Мы Нацыя», «Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 140, 1968.)

Прамаўлялі й віталі нас чужыя й свае госьці. Настрой быў радасны, сьвяточны. Пасьля акадэміі была мастацкая праграма. Паводжаньне меў танцавальны гурток пад кіраўніцтвам Барыса Кіркі. Пачалася агульная вечарына, адкрыўся буфэт. Усе шчасьлівыя, што сьвяткаваньне ўдалося надзвычайна! Да нашага століка, пры якім былі й спадарства Алены, падыйшоў сп. Акулевіч разьвітацца,

падзякаваць за гасьціннасьць. Падумала сабе: добра, што ён бачыў ЗБК у як найлепшай форме.

Ды не да спадобы было Акулевічу ўсё тое, што ён у нас чуў і бачыў. І намаляваў-жа ён і нас і ўсё ЗБК у сваім «Вестнику»...!



На сьвяткаваньні 20-годзьдзя Згуртаваньня Беларусаў Канады. Таронта, 16 лістапада, 1968. Зь лева на права: Вінцэнт Жук-Грышкевіч, Раіса Жук-Грышкевіч, Маргарэт Кэмпбэл, прадстаўнік гораду Таронта, Япіскап БАПЦ Уладыка Мікалай.

XVII. 1967 ГОД – ГОД 450-х УГОДКАЎ БЕЛАРУСКАГА ДРУКУ – ГОД СТАГОДЗЬДЗЯ КАНАДЫ

"The Canadian Family Tree" – Дрэва Канадыйскае Сям'і

Да стагодзьдзя – Centennial – рыхтавалася Канада загадзя на працягу некалькіх папярэдніх гадоў. Як свой цэнтэньял праект Canadian Citizenship Branch, Department of the Secretary of State рыхтаваў новае, значна пашыранае выданьне кнігі "The Canadian Family Tree" – «Дрэва канадыйскае сям'і». Дзеля гэтай мэты Аддзел Грамадзянства Дэпартамэнту Дзяржаўнага Сакратара яшчэ на пачатку 1966 году зьвярнуўся да др. Вінцэнта Жук-Грышкевіча з просьбай напісаць манаграфію пра беларусаў у Канадзе. За выкананьне гэтага заданьня ён атрымаў ад Дэпартамэнту Дзяржаўнага Сакратара ліст, датаваны 17 лістапада 1966 г. з выражэньнем падзякі за прыгатаваную манаграфію аб беларусах Канады й прапановай ганарару ў суме 150-ці даляраў. Ганарарам гэтым ён падзяліўся із спадарыняй Лын Кулеш, беларускай, роджанай у Канадзе, у сваім часе сакратаром Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады, якая памагала яму ў перакладзе ягонай працы на ангельскую мову. 17-га красавіка 1968 году др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч атрымаў ад Дэпартамэнту Дзяржаўнага Сакратара другі ліст з падзякай і адным паасобнікам кнігі "The Canadian Family Tree." Ліст быў наступнага зьместу:

CANADA
DEPARTMENT OF THE SECRETARY OF STATE

April 17, 1968.

Dear Dr. Žuk-Hryškievič:

The Citizenship Branch undertook, as its Centennial project, a revised and vastly expanded edition of "The Canadian Family Tree." This book pays tribute to the many peoples who have contributed to make Canada what it is today.

Many people were involved in the successful completion of this project, as consultants, writers of individual chapters, con-

tributors of documentation, etc. As you are one of them, the Citizenship Branch is pleased to present you with a copy of this book, as a token of deep appreciation.

Sincerely yours,

Mike Andrassy,
Chief, Immigrant Integration Division.

Артыкул "Byelorussians" – «Беларусы» зьмешчаны ў гэтай кнізе на бачыне 51. Гэта першы раз у гісторыі беларусы фігуруюць у кнізе "The Canadian Family Tree" – «Дрэва канадыйскае сям'і».

Наступнае й апошняе, як дагэтуль, выданьне "The Canadian Family Tree – Canada's Peoples" – «Дрэва канадыйскае сям'і – Людзі Канады», прыгатаванае Дырэктаратам Шматкультуралізму, выйшла ў 1979 годзе. Матарыял пра беларусаў у Канадзе да гэтага выданьня дала сакратар ККБК др. Раіса Жук-Грышкевіч, аўтарка гэтых радкоў.

Happy Birthday, Happy Centennial, Canada!

Перадавіцай пад такім загалоўкам у «Вестках з Канады» – «Беларусе», 118, 1967, вітае Канаду ад беларусаў старшыня Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады й рэдактар «Вестак з Канады» др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч:

«Ніколі канадыйцы не спатыкалі Новага Году так урачыста, як сёлета. А гэта таму, што Новы 1967 Год ёсьць годам канадыйскай дзяржаўнасьці. Спаткаьне Новага Году было адначасна пачаткам сьвяткаваньня стагодзьдзя Канады, якое будзе трываць праз увесь 1967 год.

Сьвяткаваньне пачалося ў сталіцы Канады Атаве на Парлямэнт Гіл у навагоднюю ноч перад поўначчу. Зазванілі сваю мэлёдыю званы на Піс Таўэр, засьвяціўся вялізарны тэлевізыйны экран. На ім зьявілася постаць каралевы Альжбеты – сымбаль дзяржаўнай лучнасьці, – якая прывітала Канаду зь яе днём нараджэньня. Магутны хор з 200 галасоў прасьпяваў гімн «О, Канада». А тады Прем'ер Канады Лестэр Пірсон запаліў зьніч стагодзьдзя. Ён кінуў запаленую паходню ў дванаццацікутны фантан, насычаны натуральным газам, які выбухнуў полымям, што будзе гарэць на працягу ўсяго 1967 году.

Зазванілі званы ў дваццаці двох тысячах цэркваў і касьцёлаў, загрымелі прывітальныя стрэлы сотні гармат у сталіцах правінцыяў, загарэліся сьвяткавальныя вогнішчы ў гарадох і вёсках.

Так пачалося сьвяткаваньне стагодзьдзя Канады па ўсёй краіне – ад Атлянтыку да Пацыфіку. Усе правінцыі, усе гарады й вёскі, усе арганізацыі, усе этнічныя групы, усе цэрквы й касьцёлы прыймаюць у ім удзел. Тысячы рознародных праектаў будуць выкананы ў імя гэтага сьвята. Найважнейшыя й найцікавейшыя зь іх – гэта Сусьветная Выстаўка ў Мантрэалі й Цягнік Стагодзьдзя – музэй гісторыі Канады, які пройдзе ад Пацыфіку да Атлянтыку й зробіць 83 прыпынкі для наведвальнікаў. Ува ўсіх праектах будуць выказаны Канадзе найлепшыя пажаданьні міру, прагрэсу, шчасьця й дабрабыту на будучыню. Да гэтых пажаданьняў з сваімі праектамі далучаемся й мы, беларусы.»

Каб пазнаёміць беларускае грамадзтва хоць агульнікова зь гісторыяй Канады, др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч на самым пачатку 1967-га – «цэнтэніял» году – падае ў «Вестках з Канады» свой артыкул:

«Зь гісторыі Канады

Канада была адкрыта 42 гады пасьля адкрыцьця Амэрыкі. У 1534 г. француз Жак Карт'е выкрыў затоку сьв. Лаўрына.

У выніку спаборніцтва прыморскіх дзяржаваў, як Гішпанія, Англія, Францыя й Галяндыя, адкрыцьцё новых краінаў і астравоў пайшло вельмі шпарка. Стымулам да гэтага спаборніцтва было імкненьне завалодаць як найбольшымі заморскімі абшарамі, зь якіх чэрпаліся вялікія багацьці ў відзе золата, серабра, дарагіх футраных скурак і рэдкіх пладоў заморскіх расьлінаў. Не апошнюю ролю гуляла й шуканьне добрых рыбалоўных водаў, якімі славілася Атлянтыцкае ўзьбярэжжа Амэрыкі.

Прывожаныя з заморскіх краінаў новыя тавары ўзмоцнілі гандаль у Эўропе, зьмянілі эканоміку й палітыку эўрапэйскіх дзяржаваў. Цяпер тая дзяржава была багацейшай і магутнейшай, якая мела найбольшыя валаданьні за морам і найвялікшую колькасьць караблёў, што прывозілі ёй заморскія багацьці. Важнейшыя эканамічныя й палітычныя цэнтры ў Эўропе перасунуліся на ўзьбярэжжа

Атлянтыку, і дзяржавы, што былі на гэтым узьбярэжжы, пачалі гуляць найважнейшую ролю. Першае месца сярод іх займала спачатку Гішпанія, якая захапіла Паўдзённую Амэрыку, апрача Бразыліі, Сярэднюю й частку Паўночнай. Рывалізаваць зь ёю пачала Англія, захопліваючы яе караблі й займаючы тэрыторыі ў Паўночнай Амэрыцы над Атлянтыкам ды ў іншых часьцінах сьвету. Паступова Англія, як каляніяльная дзяржава, высоўваецца на першае месца, сьпіхаючы Гішпанію на шэры канец.

* * *

За Гішпаніяй і Англіяй не магла застацца ззаду Францыя, асабліва-ж у часе імпэрыялістычнай палітыкі Людовіка XIV (1638-1715). Ужо ў 1608 годзе ваяўнік і мараплаўца Самуэль Шамплен даплывае з гандлярамі футраў на французскіх караблёх да Квэбэку, дзе асядае на стала французская кампанія для гандлю футранымі скуркамі. З часам у гандаль гэты ўцягваюцца парыскія фінансісты й справа гэта набірае дзяржаўнага значэньня. Падтрымоўвае яе вялікі французскі палітык кардынал Рышэлье, а пазьней французскі фінансіст Кальбэр. Футры ў Францыі й Эўропе сталіся тады вельмі моднымі, і гандаль імі прыносіў вялікія даходы, якія так патрэбны былі Людовіку XIV на ягоныя захопніцкія войны. Наагул, згодна з тэорыяй мэркантэлізму Кальбэра, уважалася тады, што гандаль ёсьць асновай багацьця й дабрабыту краіны. Таму французскі ўрад падтрымліваў гандаль футранымі скуркамі й апякаваўся французскай кампаніяй, якая старалася пранікнуць па рэках і вазёрах як найглыбей у нутро амэрыканскага кантынэнту. Кампанія гэтая закладала там свае факторыі, якія выменьвалі ў Індыянаў скуркі баброў і іншых зьвяркоў на розныя малавартасныя тавары эўрапэйскага вырабу.

У 1615 годзе Шамплен пранікнуў па Оттава Рывэр і іншых рэках аж да возера Гюрон. Такім чынам быў адкрыты для французскай калянізацыі вялікі абшар ад Атлянтыку да вялікіх вазёраў, які сталі называць Новай Францыяй. Гэтая вялікая калёнія сталася дзяржаўнай уласнасьцяй. Французскі ўрад пасылаў для абароны яе сваіх жаўнераў, але адначасна забавязваў гандлёвую кампанію, каб яна засяляла новыя абшары французскімі каляністамі-земляробамі й рамесьнікамі. Аднак справа каляніза-

цыі пасоўвалася вельмі туга. Прывезеныя ў невялікіх колькасьцях каляністы – без належнай арганізацыі й апекі – або выміралі ў цяжкіх кліматычных абставінах, або, заміж займацца земляробствам, уцягваліся ў здабываньне футраных скурак. Толькі ў 1643 годзе калянізацыя рушыла зь месца. Былі прывезены 4,000 каляністаў у Квэбэк, частка якіх пачала засяляць востраў Мантрэаль. Пакрысе завозілі каляністаў і ў Акадыю – на ўзьбярэжжа Новай Шкоцыі.

У 1665 годзе Новая Францыя была ператворана ў каралеўскую правінцыю. Туды былі прывезены 24 роты войска й шмат каляністаў. Французская экспансія ў нутро кантынэнту па вялікіх вязёрах і рэках пасоўвалася далей. Яна пранікае ў Сусанмары, у тэрыторыю на захад ад возера Супір'ёр, а таксама ськівоўваецца на паўдзённы захад. Па рацэ Огаё французы даходзяць да ракі Місісіпі. Урэшце ў 1682 годзе займаньне французамі тэрыторыі Амэрыкі даходзіць да найвышэйшага пункту. Французская экспэдыцыя на чале зь Ля Салем плыве ўніз па рацэ Місісіпі аж да самога яе ўплыву. Такім чынам апаноўваецца новая вялізарная тэрыторыя абапал гэтай магутнай ракі. З гэтай тэрыторыі была ўтворана новая французская калёнія Люізьяна.

Здавалася-б, што цяпер ніхто ўжо ня зможа спыніць французкай калянізацыі ўсяго кантынэнту Паўночнай Амэрыкі. Аднак рэчаіснасьць выглядала зусім інакш. Французская калянізацыя была вельмі-ж павярхоўнай. У 1672 годзе сталага французскага насельніцтва ў французскіх велізарных калёніях было толькі 7,000 у Квэбэку й 500 у Акадыі. На рэшце-ж тэрыторыі былі толькі параськіданыя там-сям французкія фарты й гандлёвыя факторыі. Французы й надалей мала дбалі пра засяленьне новых зямель сваімі каляністамі, а, як і раней, гналіся перадусім за здабываньнем футраных скурак. Такая палітыка не варажыла дабра на будучыню.

* * *

Тым часам ангельская калянізацыя Паўночнай Амэрыкі мела зусім іншы характар. Ангельскія тэрыторыі над ракой Гадсон і Атлянтыцкім узьбярэжжам, што называліся Новай Англіяй, засяляліся кампактнай масай земляробаў і рамесьнікаў. Гэта былі пераважна пурытане, якія, перасьледаваныя ў Англіі, шукалі ў Амэрыцы свабо-

ды для свайго жыцьця й веравызнаньня. Яны засялілі тэрыторыю 13-ці калёніяў Новай Англіі. Яны разьвілі сельскую гаспадарку, пабудавалі гарады, у якіх узрастаў гандаль і промыслы. Сваім лікам насельніцтва, разумнай эканомікай і экспансіяй гэтыя 13 калёніяў тварылі моцную базу для пазьнейшай каляніза цыі кантынэнту.

Ангельцы таксама праніклі ў нутро кантынэнту, але іншым шляхам – праз затоку Гадсон. Тут яны заснавалі Гадсон Бэй Компаны для гандлю футранымі скуркамі й пачалі пранікаць аж да вялікіх вазёраў. Там яны спаткаліся з факторыямі французаў, што дайшлі сюды раней з даліны ракі сьв. Лаўрына з Квэбэку. Інтарэсы французаў і ангельцаў пачалі крыжавацца. Паўставалі канфлікты.

Супярэчнасьць ангельскіх інтарэсаў з французскімі ўзьнікала й на поўдзень ад вялікіх вазёраў. Французская Люізьяна на рацэ Місісіпі загараджвала дарогу далейшай каляніза цыі ангельскім каляністам з Новай Англіі, якія пасоўваліся на захад, бо ў сваіх 13-ці калёніях ім рабілася цеснавата. Такім чынам, раней ці пазьней мусіла дайсьці да змаганьня між ангельскімі й французскімі калёніямі ў Паўночнай Амэрыцы.

Змаганьне гэтае пачалося ўжо ў канцы 17 стагодзьдзя й перайшло ў 18-е. Ішло яно ў пары з эўрапэйскімі войнамі між Францыяй і Англіяй. Ангельцам было лягчэй весьці змаганьне ў амэрыканскіх калёніях, бо: 1. Англія, дзякуючы сваёй сільнай флёце, панавала на Атлянтыку, так як яна дбала аб шырокі марскі гандаль, а ня толькі із сваімі калёніямі – у той час як французы былі занятыя пашыраньнем сваіх калёніяў унутры амэрыканскага кантынэнту й толькі зь імі вялі свой гандаль. 2. Ангельцы мелі ў сваіх калёніях ужо шмат добра загаспадараванага насельніцтва, зь якога можна было набраць значную колькасьць войска, тады як французы зьвярталі меншую ўвагу на каляніза цыю, а большую на здабываньне футраных скур і, апрача Квэбэку, на ўсім вялізарным абшары сваіх калёніяў кампактнага насельніцтва ня мелі й усё войска мусілі прывозіць з Францыі.

Да канчатковай фазы змаганьне дайшло ў 1759 годзе, калі ангельскі генэрал Вольф падплыў на сваіх караблёх зь пераважаючым лікам войскам пад горад Квэбэк і разграміў французскае войска Монткальма на раўніне Абрагама. Пасьля гэтага, паводля Парыскага міру ў 1763 годзе, Францыя аддала Англіі ўсе свае амэрыканскія землі, за

выняткам правабярэжнай Люізьяны, якая пазьней – у 1803 годзе – была прададзена Задзіночаным Штатам.

* * *

Ад гэтага часу пачынаецца новая пара ў гісторыі Канады як ангельскай калёніі. Важнейшае значэньне тут маюць спачатку заселеныя французамі Квэбэк і прыморскія калёніі Нова Скоўша й Нью Брансвік. Аднак паступова пачынаюць засяляцца англясаксонскім элемэнтам землі над верхняй часткай ракі сьв. Лаўрына й над вялікімі вазёрамі. Да ўзмацненьня гэтай калянізацыі спрычынілася шмат Амэрыканская Рэвалюцыя ў 1774 г., якая прывяла да таго, што 13 калёніяў Новай Англіі здабылі незалежнасьць ад Англіі й утварылі Задзіночаныя Штаты Амэрыкі. Цікава, што, ня гледзячы на вялікія намаганьні, амэрыканскія рэвалюцыянеры не змаглі пацягнуць за сабой паўночныя калёніі – Новую Шкоцыю, Новы Брансвік і Канаду. Гэтыя калёніі засталіся вернымі Англіі й атрымалі нават шмат эмігрантаў із Задзіночаных Штатаў – гэтак званых лёялістаў. Прыплыў каляністаў із Задзіночаных Штатаў адбываўся й пазьней.

Пасьля страты Задзіночаных Штатаў Англія скансалідавала свае сілы ў паўночных калёніях і стварыла новую каляніяльную імпэрыю ў Паўночнай Амэрыцы. Яна складалася з чатырох правінцыяў: Нова Скоўша, Нью Брансвік, Прынц Эдвард Айлянд і Канада. Апошняя дзялілася на Апэр Канада (над верхняй часткай ракі сьв. Лаўрына – цяпер Антарыё) і Лёўэр Канада (над дольнай часткай гэтай ракі – цяпер Квэбэк). Але прыйшла пагроза з паўдня. У часе вайны Напалеона з Англіяй і Расеяй у 1812 годзе Задзіночаныя Штаты хацелі апанаваць усю Паўночную Амэрыку й пайшлі вайной на ангельскія паўночныя калёніі. Аднак паважнейшых дасягненьняў яны не дабіліся. Пасьля-ж упадку Напалеона Англія мела вольныя рукі, каб прыйсьці на помач загрожанай Канадзе. Задзіночаныя Штаты мусілі зрачыся сваіх заваёўніцкіх намераў. У 1818 годзе быў зроблены мір, паводле якога паміж Задзіночанымі Штатамі й ангельскімі калёніямі была прызнана тая самая граніца, што была ўстаноўлена ў 1783 годзе.

* * *

Цяпер яшчэ больш эмігрантаў пачало прыбываць у паўночныя ангельскія калёніі ў Амэрыцы – ужо ня толькі з ЗША, але й з Англіі. Што далей, то больш на захад засяляліся пустыя землі. Але Паўночны Захад – Брытыйская Калюмбія й Паўночна-Заходнія Тэрыторыі, што фармальна належалі да Гадсон Бэй Компаны, былі яшчэ пустыя. Іх маглі заняць амэрыканцы, якія шмат раней дайшлі да Пацыфіку. Ангельскія паўночныя правінцыі мусілі канадалідавацца, каб бараніцца ад амэрыканскай экспансіі. З другога-ж боку й нутраныя справы паасобных правінцыяў вымагалі задзіночаньня іх усіх у вадзін арганізм.

З гэтай мэтай у верасьні 1864 году прыморскія правінцыі зрабілі канстытуцыйную канфэрэнцыю ў Шарлёттаўн, але яны мелі на мэце фэдэрацыю толькі сваіх прыморскіх правінцыяў. Да гэтай канфэрэнцыі далучыліся й прадстаўнікі Канады – 8 міністраў гэтай правінцыі на чале з Джонам А. Мэк Дональдам, які заўзята пераконваў міністраў прыморскіх правінцыяў аб неабходнасьці задзіночаньня ў вадну дзяржаву ўсіх правінцыяў, ня толькі прыморскіх. Канфэрэнцыя гэта ніякіх вырашаючых пастановаў не правяла, але згадзіліся на скліканьне новай канфэрэнцыі ўсіх правінцыяў у Квэбэку. Яна была склікана ў кастрычніку й прыняла 72 рэзалюцыі, якія пазьней увайшлі ў Брытыйскі Паўночна-Амэрыканскі Акт, што тварыў канстытуцыйную аснову для фэдэрацыі ўсіх правінцыяў.

Прынц Эдвард Айлянд і Ньюфаўндлянд не згадзіліся прыступіць да фэдэрацыі, але іншыя тры правінцыі – Канада, Нова Скоўша й Нью Брансвік давялі справу да канца й стварылі фэдэрацыю. Дэлегаты іх сабраліся ў Лёндане ў 1866 годзе, яшчэ раз разгледзілі рэзалюцыі, прынятыя ў Квэбэку, і ськівалі іх на зацьверджаньне ў Брытыйскі парлямэнт. Рэзалюцыі гэтыя былі зацьверджаныя як Брытыш Нортс Амэрыкэн Акт у сакавіку 1867 году.

Першага ліпеня 1867 году – на першы Доміньён Дэй – фэдэральная вунія сталася дакананым фактам у форме Дамініі з назовам Канада для ўсяго абшару. Цяпер ужо ў склад яе ўваходзілі чатыры правінцыі: Антарыё, Квэбэк, Нова Скоўша й Нью Брансвік. Незадоўга далучыўся да іх Прынц Эдвард Айлянд і новапаўсталыя правінцыі – Манітоба й Брытыш Калюмбія. Калі-ж з наплывам эмігрантаў з Эўропы заселены былі й прэрыі – у 1905 годзе былі

створаныя правінцыі Альбэрта й Саскачэван, якія таксама ўвайшлі ў Фэдэрацыю. Апошнім далучыўся да Канады Ньюфаўндлянд ажно ў 1949 годзе.

Ад утварэньня Канадзкай Фэдэрацыі – незалежнай Канады – прайшло сто год. Сёлета мы сьвяткуем разам з усімі канадыйцамі стагодні юбілей. За гэтых сто год Канада выросла ў вялікую й багатую дзяржаву. Закладалі яе тры правінцыі з 3,300.000 насельніцтва. А сяньня Канада мае дзесяць правінцыяў й Нортс-Вэст Тэрыторы з насельніцтвам 20 мільёнаў. Яе эканоміка багатая й разнастайная. Яе тэрыторыя вялізарная, яе натуральныя багацьці неаблічальныя.

Тут шануецца свабода чалавека, а роўнасьць і справядлівасьц для ўсіх грамадзян загарантавана правам. Вольная ініцыятыва, вольнасьць прадпрыемства ёсьць асновай грамадзкага й эканамічнага ладу, а свабода слова й свабода веры забясьпечваюць вольнае разьвіцьцё адзінкі й грамадзтва. Усё гэта варожыць Канадзе слаўную й сьветлую будучыню. **Ж.**»

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 118, 1967)

«Сьвяты нацыянальны абавязак»

Ды гучнае «Цэнтэніял» Канады не заглушыла «Сьвятога нацыянальнага абавязку», аб якім піша Старшыня Кардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч у «Вестках з Канады» – «Беларусе», 119, 1967. Ён заклікае беларусаў памятаць, з пашанай і сьвятасьцьцю адносіцца да ўгодкаў Акту 25-га Сакавіка. Рупіцца аб тым, каб 25-га Сакавіка сьвяткавалі ня толькі ў Таронта, але й у іншых мясцох, дзе толькі магчыма. Ён сам на дзень незалежнасьці Беларусі езьдзіў з дакладам у Садбуры, дзе ёсьць аддзел ЗБК, у Ашаву, у Мантрэаль.

У артыкуле «**Сьвяты нацыянальны абавязак**» ён піша:

«Актам 25-га Сакавіка была абвешчаная незалежнасьць нашай Бацькаўшчыны Беларусі, была выяўленая воля беларускага народу жыць свабодна ў сваёй незалежнай дзяржаве. Акт 25-га Сакавіка стварыў новую – незалежніцкую – эру ў нашай гісторыі, узьвёў нас на ўзровень жывых дзяржаўных народаў. І хоць ворагі нашыя абрабавалі нас з нашай свабоды й незалежасьці – яны не змаглі паняволіць нашых душаў, не змаглі зламаць нашай волі,

нашых імкненьняў да свабоднага й незалежнага жыцьця, не змаглі забраць нашай пуцяводнай ідэі незалежнасьці Беларусі.

Ідэя незалежнасьці Беларусі лучыць нас – усіх беларусаў у вадным змагарным напрамку, незалежна ад таго, дзе мы ёсьць – дома, ці на эміграцыі. Гэтая ідэя стымулюе ў нас актыўнасьць, творачы й змагарны дух, прыпамінае нам, што наша Бацькаўшчына паняволеная. Гэтая ідэя незалежнасьці Беларусі дае нам жыцьцёвы духовы зьмест і пабуджае нас да нацыянальнага жыцьця, да грамадзкай працы. Таму мы шануем і культывуем яе. Таму мы штогод сьвяткуем урачыста дзень 25-га Сакавіка – дзень незалежнасьці Беларусі ды ўцягваем у гэта сьвяткаваньне нашу моладзь, нашую зьмену.

Дзякуючы культу йдэі незалежнасьці Беларусі – хоць 49 год прайшло ўжо ад абвешчаньня Акту 25-га Сакавіка, хоць 49 год паняволена наша Бацькаўшчына – мы жывыя нацыянальна, мы стала дамагаемся нашых слушных нацыянальных і чалавечых правоў. Дзякуючы гэтаму мы можам ганарыцца нашым нацыянальным ростам – ня гледзячы на цяжкія абставіны, дзякуючы гэтаму мы сьмела можам глядзець у будучыню Беларусі. Нам прыемна пачуць зьдзіўленьне чужынцаў, што хоць паўстагодзьдзе даходзіць ад часу, як была абвешчана незалежнасьць Беларусі – мы, што жывем у моры чужынцаў, сьвяткуем угодкі гэтай падзеі з такім самым запалам, як і раней.

Уявім сабе, што было-б, калі-б мы не культывавалі ідэі незалежнасьці Беларусі, калі-б не сьвяткавалі ўгодкаў 25-га Сакавіка на працягу мінулых 48 гадоў.

Мы згубілі-б тады нашую пуцяводную зорку незалежнасьці Беларусі й паступова забыліся-б пра нашу Бацькаўшчыну. Разам з гэтым – мы згубілі-б сэнс свайго нацыянальнага існаваньня, мы згубілі-б свой нацыянальны твар; мы апынуліся-б на раздарожжы й блудзілі-б бязмэтна, як распуджаныя авечкі. На эміграцыі – мы даўно ўжо расплыліся-б у гушчы мясцовых народаў. Беларуская справа зьнікла-б зь міжнароднай паверхні й ня трэба было-б тады маскоўскім верхаводам аглядацца ні на нашую крытыку й пратэсты, ні на міжнародную апінію, ні на нацыянальныя дамаганьні нашых патрыётаў на Бацькаўшчыне.

Што-б не казалі бальшавікі, як-бы яны не хваліліся сваімі «подзьвігамі» – незалежнасьць Беларусі зрабілі гістарычным фактам не яны, а нашы слаўныя Бээнэраўцы,

ідучы ў унізон з воляй беларускага народу. Бальшавікі не маглі ігнараваць гэтага гістарычнага факту, бо за ім стаяў беларускі народ, яны мусілі падхапіць ідэю незалежнасьці Беларусі, спадзяючыся, што зь бегам часу ім удасца схвальшаваць яе, выялавіць праўдзівы зьмест яе. Пацьвярджае гэта маскоўская палітыка ўніфіікацыі й русыфікацыі. І калі гэта палітыка сустракае супраціў нашых суродзічаў на Беларусі – дык дзякуючы таму толькі, што й яны пранятыя ідэяй незалежнасьці Беларусі – ідэяй праўдзівай, аўтэнтычнай, а не схвальшаванай Масквой. Культ ідэі незалежнасьці Беларусі ўзмацняе, бязспрэчна, сьведамасьць неабходнасьці правядзеньня яе ў жыцьцё й у нашых суродзічаў на Бацькаўшчыне. І тут вялікую ролю гуляе штогоднае сьвяткаваньне 25-га Сакавіка ў вольным сьвеце, рэха якога даходзіць і на Беларусь.

Бяз культу ідэі незалежнасьці Беларусі, без сьвяткаваньня ўгодкаў 25-га Сакавіка – беларуская справа занепадала-б, яна магла-б быць запрапашчана, а разам зь ёю магла-б быць запрапашчаная й будучыня беларускага народу. Таму сьвяткаваньне ўгодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларусі ёсьць нашым нацыянальным абавязкам.

Цяпер спытаем сябе, ці мы заўсёды й усюды выконваем належна гэты абавязак? На вялікі жаль, тут трэба прызнацца да недахопаў.

1. Хоць Акт 25-га Сакавіка ёсьць выяўленьнем волі беларускага народу, мы дагэтуль не заўсёды й ня ўсюды сьвяткуем угодкі яго ўсе салідарна, разам, як належыла-б сьвяткаваць агульнанацыянальнае сьвята. Дагэтуль шмат дзе яшчэ стаяць на перашкодзе груповыя нязгоды або дробныя асабістыя амбіцыі й інтарэсы некаторых адзінак.

2. Хоць на сьвяткаваньнях зьбіраецца многа людзей – ня ўсе беларусы ўважаюць за свой абавязак быць на іх. Ня ўсе згаджаюцца браць удзел у сьвяткаваньні й выконваць тую ці іншую функцыю. А ёсьць і такія, што асьмельваюцца ўзалежніць свой удзел у сьвяткаваньні ад задаваленьня іх амбіцыяў.

3. Сьвяткаваньні арганізуюцца ў большых беларускіх асяродках, а ў меншых 25-ты Сакавік праходзіць бязьсьледна. А трэба было-б адзначаць гэтае наша вялікае агульнанацыянальнае сьвята ўсім беларусам бяз вынятку: і ў цэрквах, і ў арганізацыях, і ў сяброўскім коле, і ў сям'і – калі няма магчымасьці прыняць удзелу ў шырэйшым сьвяткаваньні. А як дзе нямя матар'ялу аб Акце 25-га Са-

кавіка – дык можна прачытаць хоць-бы й артыкул зь беларускай газэты ў гэтай справе, прачытаць яго сябром або й сям'і сваёй, каб і дзеткі нашы ведалі, што такое Акт 25-га Сакавіка.

Ідэя незалежнасьці Беларусі ёсьць нашым найвялікшым нацыянальным скарбам. За яе пралітая кроў беларускіх патрыётаў. За яе пакутавалі й пакутуюць тысячы братоў і сясьцёр нашых. Перад яе веліччу, перад яе сьвятасьцьцю мусяць скарыцца й групы й асобы. **В. ЖУК.**»

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 119, 1967.)

49-я ўгодкі Дня Незалежнасьці Ў Мантрэалі

Як старашыня Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч ліставаўся з аддзелам ЗБК у Мантрэалі ў справе сьвяткаваньня 49-х угодкаў Акту 25-га Сакавіка. 22 студзеня ён піша да спадарства Анатоля й Крыстыны Храноўскіх, адных з найболей дзейных беларусаў у Мантрэалі, ліст наступнага зьместу:

«22. 01. 67.

Даражэнькія Крыстына й Анатоль,

Пішу Вам у справе сьвяткаваньня 25-га Сакавіка. У мінулую нядзелю адбылося паседжаньне Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады, у які ўвайходзяць абедзьве арганізацыі – ЗБК і БНА. Пастанавілі, ня гледзячы на розьніцу палітычных паглядаў, сьвяткаваць наша агульна-нацыянальнае сьвята разам. Дзеля таго, што 25 сакавіка прыпадае на Вялікую Суботу па новым стылю, а 26-га Вялікдзень – дату сьвяткаваньня ў Таронта вызначылі на 19-га сакавіка, з тым, каб тыдзень пасьля Вялікадня 1, 2-га красавіка мець эвэнтуальную магчымасьць паехаць у Мантрэаль.

Учора адбылося паседжаньне Галоўнай Управы ЗБК, на якім пастаноўлена дапамагчы беларусам у Мантрэалі правесьці сьвяткаваньне 49-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларусі. Вы пісалі ў сваім лісьце, што канкрэтна павядоміце, якога дня й месяца мы маем прыехаць на ваша сьвяткаваньне. Мы ня хочам накідаць Вам даты, але, на жаль, тут няма выбару. Звычайна, калі 25-га Сакавіка прыпадае на будні дзень – дык сьвяткаваньне робіцца ў найбліжэйшую нядзелю перад, ці пасьля 25-

га сакавіка. А дзеля таго, што сёлета 25- і 26-га сакавіка прыпадаюць на Вялікую Суботу й Вялікдзень – ня столькі з огляду на сябе, колькі з огляду на канадыйскіх гасьцей – у гэтыя дні сьвяткаваньня рабіць нельга. У нядзелю-ж перад 25 сакавіка – робім сьвяткаваньне ў Таронта, значыць на Мантрэаль, калі мы там хочам быць, прыпадае вікэнд пасьля 25-га сакавіка – 1, 2-га красавіка. Пазьнейшая дата была-б ужо задалёка ад 25 сакавіка.

Цяпер, хто да Вас зможа прыехаць і што мы можам запрапанаваць. Мы думаем, што Вы будзеце мець залю й зьбярыцё што найменш 50 асоб, а мо й больш. У такім выпадку мы прыехалі-б у 4-6 асоб, адзін з нас мог бы зрабіць даклад, калі-б Вы хацелі, і дэклямацыю. Магчыма, што магла-б прыехаць і танцавальная група 6-8 асоб. Мог бы прыехаць і а. Архімандрыт Мікалай і адслужыць урачыстую багаслужбу, але тады-б Вы мусілі напісаць да яго, запрасіць яго й знайсьці царкву для багаслужбы. Мы-б прыехалі тады ў суботу 1-га красавіка папаўдні, а таго-ж вечара каля гадзіны 7-ай магло-бы адбыцца сьвяткаваньне – акадэмія. А ў нядзелю раніцай магла-б адбыцца багаслужба, пасьля якой мы паехалі-б дамоў, бо ў нядзелю вечарам мы мусім быць ужо дома. Я ня ведаю, колькі Вы вышлеце запросінаў і колькі зьбярыцё людзей. Мы ў Таронта рассылаем каля 500 запросінаў і ў нас зьбіраецца каля 300 асоб. Мы прадаем пры ўваходзе нацыянальныя сьцяжкі й праграмкі, з чаго мы аплачваем усе расходы й яшчэ штось застаецца. Як Вы думаеце зрабіць і якую плянуеце праграму, напішыце, калі ласка. Калі-ж бы думалі рабіць сьвяткаваньне ў цясьнейшым сямейным кругу, тады іншая справа, тады-б ад нас магло прыехаць можа пара чалавек. Напішыце нам, калі ласка, як найхутчэй, каб мы ведалі загадзя, што й як рабіць, як і да чаго рыхтавацца. Час не чакае.

На прысланыя Вамі адрасы мы ўжо газэту разаслалі й маем надзею, што яна дайшла да адрасатаў.

Маем надзею, што як Вы самі, так і дзеткі Вашы здаровы. Пішыце нам часьцей, калі не Анатоль, то Крыстына – хоць бы паангельску, калі пабеларуску цяжка. Прывітаньні ўсім знаёмым, а перадусім Вашым бацьком.

Жадаем Вам усяго найлепшага.

Раіса й Вінцэнт Жук-Грышкевічы.»

І гэтак 19 сакавіка адбылося сьвяткаваньне дня незалежнасьці Беларусі ў Таронта, а 1-2 красавіка – у Мантрэалі. На сьвята ў Мантрэаль прыехалі беларусы з Таронта з танцавальнай групай і аркестрай – усіх разам 24 асобы.

Урачысты сход адбыўся ўва Украінскім Доме Моладзі. Др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч ў сваім дакладзе «прадставіў агульнікова гісторыю Беларусі, зьвяртаючы ўвагу на тыя факты, якія сьведчылі, што галоўным зьместам нашае гісторыі было або змаганьне за незалежнасьць Беларусі, або змаганьне за ўтрыманьне яе. Так было ў Полацкім Княстве й Смаленскім, так было й у Вялікім Княстве Літоўскім.

Галоўнай прычынай упадку й паняволеньня Беларусі, як казаў дакладчык, было тое, што вядучыя клясы перасталі цікавіцца лёсам нашага народу й краю й займаліся толькі эгаістычнымі справамі свайго дабрабыту. У пагоні за выгоднымі пасадамі й пажывай яны адыйшлі ад свайго народу й спачатку польшчыліся, а пасьля рушчыліся. ‹Свая костка чыжым мясам абрасла й ваняе...› казаў Смаленскі каштэлян Мялешка. Гэтым запрапасьцілі лёс свае бацькаўшчыны, загубілі долю народу, здрадзілі яго.

Дакладчык падкрэсьліў, што ў гэтым факце ёсьць навучаючы прыклад для беларусаў – дома й на эміграцыі – на цяперашні час, асабліва для тых, што занядбоўваюць свае абавязкі нацыянальныя. Калі хто адсоўваецца ад беларускага жыцьця – гэтым самым ён прыносіць вялікую шкоду для братоў і сёстраў, што паняволены бальшавікамі.

Далей дакладчык прадставіў беларускае адраджэньне, Акт 25-га Сакавіка й яго значэньне. Спыніўся над жахамі бальшавіцкага ярма й 2-ой Сусьветнай вайны. Беларускі вызвольны рух, – казаў ён – ператрываў найцяжэйшыя выпрабаваньні й ня зьнік. Наадварот, ён жыве й разрастаецца. У гэтым доказ, што рух гэты ніколі не загіне, пакуль недасягнута будзе поўная незалежнасьць і сувэрэннасьць Беларусі. Пасьля дакладу была мастацкая частка...

У нядзелю раніцай пайшлі на багаслужбу ў украінскую Царкву сьв. Пакровы. Служыў наш (з БАПЦ у Таронта) Архімандрыт а. Мікалай з а. Аляксандрам Косцюком – настаецелям царквы. А. Архімандрыт сказаў прынагодную казань, прысьвечаную незалежнасьці Беларусі. Пазьней а. Аляксандар у цёплых словах пазнаёміў сваіх парахвіян з

БАПЦ, зь беларускай вызвольнай справай і прадставіў а. Архімандрыта Мікалая. Багаслужбай закончылася сьвяткаваньне дня незалежнасьці Беларусі ў Мантрэалі.»

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 121 – 1967)

Беларусы й канадзкая статыстыка

У чырвені 1967 году др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч бярэ ўдзел у Другім Кангрэсе Канадыйскіх Славянаў – Second National Conference on Canadian Slavs, што адбыўся ў Атаве.

На гэтым кангрэсе ён прачытаў даклад на тэму: «Беларусы й канадзкая статыстыка» – "Belorussians and Canadian Statistics," надрукаваны ў 2-ім томе "Slavs in Canada," бачына 127. Справаздачу з гэтага кангрэсу ён падаў у «Вестках з Канады» – «Беларус», 123-124, 1967. У гэтым-жа нумары газэты падаў ён і ў скароце зьмест свайго дакладу: «Чаму няма беларусаў у канадзкай статыстыцы», і ў наступным нумары гэтай-жа газэты – артыкул зьвязаны з гэтым кангрэсам: «Масква забіла ідэю Славянскай Фэдэрацыі». Усе тры артыкулы падаём ніжэй:

«Другі Кангрэс Канадыйскіх Славянаў

Кангрэс гэты адбыўся ў Атаве, у мурох Атаўскага Універсытэту, на працягу трох дзён – 9, 10, 11 чырвеня 1967 г. Арганізацыя яго была пад апекай Міжунівэрсытэцкага Славянскага Камітэту, у які ўвайходзяць прафэсары канадыйскіх унівэрсытэтаў, і пад пратэктаратам Яе Міласьці Спадарыні Паўліны Ванье, канцлера Атаўскага Унівэрсытэту. Ужо гэтыя факты былі зарукай, што праца кангрэсу адбудзецца на высокім акадэмічным узроўні.

Імкненьні да ўзаемнай інфармацыі й каардынацыі працы канадыйскіх славістых і славянскіх групаў ды стварэньне агульнага славянскага воргану выяўляліся ўжо ня раз на працягу апошняга дзесяцігодзьдзя. Але канкрэтнае афармленьне гэтых імкненьняў адбылося толькі ў чырвені 1965 году на Першым Кангрэсе Канадыйскіх Славян у Бэнф, у Альбэрце. Там быў створаны сталы Міжунівэрсытэцкі Камітэт і было пастаноўлена арганізаваць што два гады кангрэсы канадыйскіх славянаў.

Другі Кангрэс Канадыйскіх Славянаў у Атаве быў прысьвечаны Стагодзьдзю Канадыйскай Канфэдэрацыі, і бальшыня дакладаў прадстаўляла на Кангрэсе ўклад у разбудову Канады паасобных славянскіх этнічных групаў.

Кангрэс гэты прадставіў сілу й значэньне канадыйскіх славянаў, агульны лік якіх сягае больш мільёну. У ім прынялі ўдзел усе славянскія групы, апрача сэрбаў і македонцаў, агульным лікам 143 асобы ўлучна з 71 прадстаўніком ад 21 унівэрсытэту, 12 ад канадыйскага ўраду і рэшта ад розных славянскіх арганізацыяў – у наступным складзе паводля альфабэту: баўгары, беларусы, палякі, расейцы, славакі, славенцы, украінцы, харваты й чэхі. Зразумелая рэч, што найбольшы ўклад у Кангрэс далі найбольшыя лікам групы – украінцы й палякі, але наагул там панавала сяброўская атмасфэра й роўная пашана да ўсіх групаў, хоць прадстаўленыя яны былі далёка няроўнай колькасьцяй і ўдзелам.

Другі Кангрэс Канадыйскіх Славянаў быў вельмі важнай падзеяй як з пункту гледжаньня культурнага, так і палітычнага. Ён выявіў сілу й творчасьць канадыйскіх славянскіх этнічных групаў, іх вялізарны ўклад у разбудову іх новай свабодалюбнай бацькаўшчыны – Канады, а з другога боку быў доказам, што канадыйскі прынцып свабоды й пашаны да ўсіх этнічных групаў, да іх самабытнай культурнай спадчыны – ёсьць не якімсь пустым гукам, а рэальным прынцыпам. Гэты Кангрэс быў добрай канфрантацыяй з маскоўскім камунізмам, які крычыць, што нясе свабоду ўсім народам, а ў запраўднасьці трымае ў няволі падбітыя ім народы, нішчыць іх нацыянальнае жыцьцё ўлучна з славянскімі народамі – беларусамі й украінцамі.

Канадыйскія ўлады аднесьліся да Кангрэсу з поўнай павагай і прыхільнасьцяй. Яны далі яму вялікую маральную й матар'яльную падтрымку, ды апрача кампэтэнтных у этнічных справах урадаўцаў, як ведамыя нам Г. П. Ален і С. Яворскі з Сітызэншіп Бранч, што бралі сталы ўдзел у Кангрэсе (Мр. Ален меў даклад аб шматэтнічнай праграме Сітызэншып Бранч) – дэлегавалі высокіх прадстаўнікоў ураду, якія віталі Кангрэс. На заканчэньне канадыйскія ўлады частавалі ўдзельнікаў Кангрэсу багатым банкетам ад імя Антарыйскага Ураду. З прыватных асоб трэба ўспомніць славацкага прамыслоўца Сьцяпана Б. Романа, які ахвяраваў на арганізацыю Кангрэсу 1000 даляраў.

Кангрэс меў вялікае значэньне і для нас беларусаў. Беларусы ўзялі ў ім удзел як паўнапраўны сябра, мелі свой даклад і занялі належнае ім месца сярод славянскіх этнічных групаў Канады. Далейшыя вынікі нашага ўдзелу будуць залежаць ад нашай стараннасьці й актыўнасьці.

Старшынём кангрэсу быў прафэсар Атаўскага Унівэрсытэту Канстантын Біда – украінец, а старшынямі паасобных сэсіяў былі: праф. Стронг з Карльтанскага ўнівэрсытэту ў Атаве, праф. Адамкевіч з Мантрэальскага ўнівэрсытэту, Сэнатар Павал Юзык, праф. Сімпсон з Саскачэванскага ўнівэрсытэту, др. Кіршбаўм з Антарыйскай Этнічнай Прэсы, др. Кушнір з Украінскага Канадыйскага Камітэту, др. Ст. Гайдаш – фэдэральны пасол і парлямэнтарны сакратар Міністра Паўночных Спраў, др. Чыеш із Ст. Франціс Ксавьер унівэрсытэту, праф. Войцехоўскі з Атаўскага ўнівэрсытэту, праф. Мостовац – з Атаўскага унівэрсытэту, праф. Міхаленка з Саскачэванскага ўнівэрсытэту, С. Кальба з Украінскага Канадыйскага Камітэту.

Кангрэс правёў вялікую работу. На працягу трох дзён адбыў 12 сэсіяў, на якіх было прачытана 35 дакладаў з дыскусіямі й адна пэнальная дыскусія. Даклады былі на розныя тэмы – пераважна з жыцьця й дзейнасьці славянскіх групаў у Канадзе, але й на агульныя для ўсіх групаў тэмы, як напрыклад Р. Марча з Карльтонскага ўнівэрсытэту аб палітычнай рухлівасьці славянаў у фэдэральным і правінцыянальных парлямэнтах Канады. Даклад гэты выклікаў вельмі жывую дыскусію й водгалас у прэсе адносна дыскрымінацыі славян у палітычных партыях Канады.

Удзельнікі Кангрэсу былі занятыя ад раніцы да вечара з малымі пярэрвамі на абед. Вечары таксама былі занятыя. На першы вечар спачатку быў пачастунак віном ад Рэктара Атаўскага ўнівэрсытэту др. Р. Гвідона, а пазьней паказ народнага мастацтва, у якім бралі ўдзел танцавальныя групы польская, славацкая й украінская ды сьпявачкі й музыкі гэтых нацыянальнасьцяў. На другі вечар быў банкет у Бікон Армс Гатэлі на кошт удзельнікаў Кангрэсу, на якім меў прамаўляць міністар транспарту Пікэрсгіл, але дзеля яго хваробы прамаўляў ягоны заступнік.

На трэйці вечар – у нядзелю – удзельнікі Кангрэсу былі гасьцямі Антарыйскага Ураду, які выдаў ім банкет у тым-жа гатэлі. Банкет гэты асаблівы быў і тым, што за прэзыдыяльны стол былі запрошаны прадстаўнікі паасоб-

ных славянскіх групаў пад старшынствам др. Кіршбаўма – славака, якія, пасьля агульнага прамоўцы, прамаўлялі ад імя сваей групы на аднэй з урадавых моваў – ангельскай, ці французскай (Кангрэс таксама праводзіўся на гэтых двох мовах) і на сваёй мове. Цікава было пачуць мовы ўсіх славяскіх народаў. Гэтым банкетам і закончыўся Кангрэс. Кожны з прамоўцаў разьвітаўся сваім звычаем і на сваёй мове, а беларускі прамоўца др. В. Жук-Грышкевіч нашым беларускім «З Богам, бывайце здаровы». **В.»**

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 123-124, 1967.)

«Чаму няма беларусаў у канадзкай статыстыцы?

Пытаньне гэта было галоўным у дакладзе др. В. Жук-Грышкевіча на Другім Кангрэсе Канадыйскіх Славянаў 9-11 чырвеня сёлета (1967) ў Атаве.

Беларусы пачалі прыяжджаць у Канаду на пачатку гэтага стагодзьдзя спад расейскае царскае ўлады, а пазьней, у часе між войнамі, з Заходняй Беларусі. У першым выпадку ў Канадзе іх запісвалі расейцамі, а ў другім палякамі – згодна зь іх дакумэнтамі. І навет тады, калі пасьля Другой Сусьветнай Вайны прыехалі новыя беларускія імігранты з высокай нацыянальнай сьведамасьцяй і рознымі дакумэнтамі, у якіх часта было зазначана, што яны беларусы – выглядала так, што ніхто ў Канадзе не разумеў іх нацыянальнага паходжаньня дзеля розных прычынаў.

Найважнейшай перашкодай у правільным азначаньні нацыянальнасьці недзяржаўных народаў быў той факт, што канадыйцы прывыклі вызначаць нацыянальнасьць імігрантаў паводля назоваў дзяржаваў, з пад панаваньня якіх яны паходзілі. Такі падыход уносіў блытаніну й часта даводзіў чуць што не да абсурду. Бо як, напрыклад, азначыць нацыянальнасьць такога народу, што меў сваю дзяржаўнасьць, а пазьней страціў яе? Ці дзеля гэтага ён перастаў быць асобнай нацыянальнасьцяй, хоць застаўся тым самым народам на тэй самай сваёй тэрыторыі?

Другой ня меншай перашкодай ёсьць недахоп веды ў канадыйцаў аб Усходняй Эўропе й асабліва аб усходніх славянах. Яны ўважаюць, што Савецкі Саюз – гэта Расея, і ня лічацца з тым фактам, што нерасейскія народы тво-

раць палавіну Савецкага Саюзу й імкнуцца да сваёй незалежнай дзяржаўнасьці. Ня лічацца з тым, што Беларусь абвесьціла сваю незалежнасьць Актам 25-га Сакавіка ў 1918 годзе, і толькі бальшавіцкая навала зьнішчыла гэтую незалежнасьць. Не бяруць пад увагу, што навет бальшавікі мусілі лічыцца з гэтым гістарычным фактам і ўтварылі БССР ды зрабілі яе сябрам Задзіночаных Нацыяў. Для канадыйцаў-жа БССР – гэта тая самая Расея.

Такога пагляду трымаецца канадыйская прэса, такі-ж пагляд праводзіцца ў школьных падручніках, як напрыклад у падручніках геаграфіі для 10-ай і 12-ай клясы сярэдняй школы. Ня дзіўна тады, што такі пагляд пашыраны ў канадыйскім грамадзтве, сярод дзяржаўных урадаўцаў і перапішчыкаў насельніцтва. Гэткія-ж пагляды праведзены й у інструкцыях для перапішчыкаў у часе перапісу насельніцтва Канады ў 1951 і 1961 гадох. Праўда, у інструкцыі апошняга перапісу ёсьць мова аб Савецкай Беларусі й прапануецца перапішчыкам упісваць БССР, як месца народжаньня для тых перапісваных, што зажадаюць гэтага. Але наагул і ў гэтай інструкцыі БССР прадстаўлена, як частка Расеі.

Трэцяй перашкодай ёсьць тэхнічны бок перапісаў. У фармулярах перапісаў вылічаны толькі большыя й ведамыя этнічныя групы, а меншыя й менш ведамыя не ўспамінаюцца, Назоў нацыянальнасьці апошніх перапішчык мог запісаць у вольнай графе, але як ён мог іх запісаць, калі нічога пра іх ня ведаў, а перапісваным ня так лёгка было давесьці іх нацыянальнае паходжаньне на ангельскай мове. У дадатку апошнія маглі падумаць, што, раз іхняе нацыянальнасьці не падаецца ў фармуляры – значыць яна ня прызнана канадыйскімі ўладамі, дык пашто намагацца тады, каб іхняя нацыянальнасьць была ўпісана?

Дзеля ўсяго тут сказанага, як паказалі інтэрвю з тарантонскімі беларусамі, вельмі нязначны працэнт беларусаў запісаны ў часе перапісаў беларусамі, а абсалютная бальшыня запісана або расейцамі або палякамі, у залежнасьці ад таго, пад чыёй уладай яны жылі.

Пры такім дачыненьні да меншых і мала ведамых этнічных групаў вынікі перапісаў што да нацыянальнага паходжаньня выйшлі вельмі праблематычнымі, а часамі даходзілі чуць што не да абсурду. Прыкладам можа служыць расейская этнічная група.

Паводля перапісу 1961 году расейцаў у Канадзе ёсьць 119,168. Але калі разьбіць гэту лічбу паводля рэлігійнае прыналежнасьці, дык выходзіць, што расейцы твораць у гэтай лічбе абсалютную мяншыню, а бальшыня гэта іншыя нацыянальнасьці. Расейцамі можна залічыць паданую ў табліцы перапісі лічбу 13,761 праваслаўных на агульную лічбу запісаных расейцамі 119,168 (і то ня ўсю лічбу праваслаўных, бо найменш палавіна будзе ў ёй беларусаў) і 20,394 духабораў – напэўна расейцаў. Рэшта-ж – гэта 16,644 каталікоў (хіба беларусаў каталікоў), 23,461 жыдоўскай веры – значыць жыдоў, а не расейцаў, 9,415 мэнанітаў – гэта немцы, 8,237 лютэранаў – гэта балты й часткова расейскія немцы, 1,180 украінскай грэкакаталіцкай царквы – гэта украінцы і рэшта – гэта розныя пратэстанцкія веравызнаньні лікам 26,126, у якім напэўна ня ўсе ёсьць расейцамі. Такім чымам у 119,168 запісаных расейцамі можа быць каля 30,000 запраўдных расейцаў.

Вялікія цяжкасьці маюць беларусы і ў упісваньні свайго беларускага паходжаньня ў часе атрыманьня канадыйскага грамадзянства. І тут канадыйскія ўрадаўцы, заміж беларускага паходжаньня,ня гледзячы на пратэсты заінтарасаваных, упісваюць імёны тых краін, пад акупацыяй якіх жылі беларусы, г. зн. Расею або Польшчу. Выказалі гэта інтэрвю зь беларусамі з Таронта й ваколіцаў. Толькі нязначнай частцы беларусаў удалося ўпісаць сваё беларускае паходжаньне ў канадыйскі дакумэнт, а ў некаторых выпадках, як напрыклад із К. Акулам і Л. Карыбам, толькі дзякуючы катэгарычнай адмове прыняць дакумэнт, у якім было ўпісана чужое паходжаньне заміж беларускага. Гэта найлепшы прыклад, як трэба змагацца за сваё нацыянальнае імя.

Трэба прызнаць, што не заўсёды й далёка ня ўсе беларусы дамагаліся прызнаньня свайго нацыянальнага імя. Старая маласьведамая нацыянальна беларуская імігрэцыя зусім ня дбала пра тое, як яна будзе запісана. Ёсьць такія й з новай імігрэцыі, што прыліплі да расейцаў ці палякаў. Але ходзіць тут аб тых беларусаў, якія ганарацца сваім беларускім паходжаньнем і ня могуць захаваць яго фармальна дзеля вышэй пералічаных прычынаў.

Свабодалюбнай дэмакратычнай Канадзе не залежыць на адмаўляньні беларусам прызнаньня іх нацыянальнага паходжаньня, ці павялічаньня іншых групаў коштам беларусаў. Трэба толькі дагледзіць, каб урадаўцы былі

больш усьвядомлены ў нацыянальных дачыненьнях Усходняе Эўропы і ўвесьці ў тэхніку перапісаў пэўныя зьмены: каб былі пералічаны ў фармулярах перапісу ці на асобным лісьце ўсе этнічныя групы – большыя й меншыя, больш ведамыя й менш ведамыя, каб усе яны мелі роўныя шансы ў захаваньні свайго нацыянальнага паходжаньня.

Хтось скажа мо', што пытаньне, чаму беларусаў няма ў канадыйскай статыстыцы, сяньня ўжо малаважнае, бо й так усе яны сталіся канадыйскімі грамадзянамі. Але не забываймася тады, што Канада ня ёсьць «мэлтінг пот» (кацёл, у якім усё растопліваецца ў вадно), што, як цьвердзяць выдатныя канадыйскія дзяржаўныя адзінкі, сіла й моц Канады ў вадзінстве разнароднасьцяў: адзінства ў дзяржаўнай прыналежнасьці й разнароднасьць у спалучнасьці рознанацыянальных культураў краінаў паходжаньня, што культуры гэтыя твораць усю мазаіку вялікай, багатай агульнаканадыйскай моцы й культуры. З гэтага пункту гледжаньня ёсьць вельмі важным, ці беларусы фігуруюць у канадыйскай статыстыцы.

У другой частцы дакладу была мова пра ўклад беларусаў у разбудову Канады. **В.**»

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 123-124, 1967.)

Справа палепшаньня перапісу

У сувязі з дакладам др. В. Жук-Грышкевіча на Другім Кангрэсе Канадыйскіх Славянаў «Беларусы й канадыйская статыстыка», ды дыскусіяй над ім, выявілася, што канадыйская статыстыка абмінае меншыя й менш ведамыя славянскія групы Канады. Зважыўшы гэта, Другі Кангрэс Канадыйскіх Славянаў вынес рэзалюцыю, у якой прапануе канадыйскім уладам палепшыць тэхніку перапісу насельніцтва Канады – менавіта – увесьці ў фармуляры перапісу назовы ўсіх славянскіх групаў Канады.

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 123-124, 1867)

Ніжэй падаем даклад др. В. Жук-Грышкевіча, прачытаны на Другім Кангрэсе Канадыйскіх Славянаў і надрукаваны ў кнізе: "Slavs in Canada" Volume Two. Proceedings of the Second National Conference on Canadian Slavs. Inter-University Committee on Canadian Slavs. pp. 127-134.

BELORUSSIANS AND CANADIAN STATISTICS

by
V. Žuk-Hryškievič
Belorussian Canadian Alliance

Officially Belorussians are not known in Canada. There is no trace of Belorussians in Canadian Statistics although they have lived in Canada in considerable numbers for at least three generations. I quote from an article by Dr. V. J. Kaye, "Canadians of Belorussian Origin" – the first Canadian work about Belorussians and a small but very valuable one: "Canadians of Belorussian origin form one of the most interesting although at the same time one of the least known ethnic groups in Canada. It is not listed in Canadian census statistics as a separate ethnic group, which makes it difficult to estimate their numbers." And farther on: "In Canada the public became aware of the new (in fact – a very ancient) Belorussian ethnic group only quite recently, after the arrival of the post-war immigration."[1] A very ancient group indeed. In this very significant year, 1976, when all Canadians celebrate the centenary of Confederation, Belorussians, besides this common celebration, have two more occasions to celebrate: the nine hundredth anniversary of their homeland capital, Minsk, and the four hundred and fiftieth anniversary of Belorussian printing (in 1517 Dr. Francisk Skaryna from Polotzk printed the first book of the Bible translated into old Belorussian).

Why the Belorussians are not listed

Belorussians began to come to Canada in the beginning of this century when their homeland was under Russian czarist rule. There was further immigration between the wars from West Belorussia which was then under Polish rule. In the first case they were listed as Russians and in the second as Poles. Later on, when new Belorussian immigrants came to Canada after World War Two, even if they had a highly developed national consciousness, nobody seemed to comprehend their ethnic origin for a variety of reasons.

With some exceptions, Canadians were accustomed to defining nationality by the name of a state. And this is a key

[1]V.J. Kaye, "Canadians of Belorussian Origin," Revue de l'Université d'Ottawa, July-September, 1960, p. 300.

question. Definition of nationality of nation, with interpretation of this basic notion of term, is made in close relation to such terms as ethnic group, birthplace and language.[2] The Oxford Dictionary defines nationality as "national quality of character, nation feeling, the fact of belonging to a particular nation." And for the term "nation," it gives "distinct race or people, characterized by common descent, language or history and organized as a separate political state and occupying a definite territory." The question arises now if a people which has all the above mentioned attributes except a separate political state could be considered as a nation and nationality. In a European approach to this question, the answer would be positive. Europeans, especially Eastern Europeans, distinguish very clearly between state and nationality in their treatment of a state with different national groups. But for most Canadians nation and nationality is synonymous with the state. This is what brings confusion to the definition of stateless nationalities.

Canadians confuse the name Belorussian with Russian and White Russian with anti-Bolshevik Russian immigrants. There was, and still is, among Canadians a great deal of ignorance about Eastern Europe, especially about Eastern Slavs and the peoples of the Soviet Union. It is not well known in Canada that Belorussians, like the other peoples of former Czarist Russia, have struggled continuously since the Russian Revolution of 1917 for their independent democratic state, and that for this reason, the Moscow Bolshevik rulers established the Belorussian Soviet Republic and made it a member of the United Nations.[3]

Generally, the Soviet Union is considered by Canadians as Russia. You can notice this in the press, in textbooks and maps. You may find information in geography textbooks about the Soviet Union and Russia, but very little on the other national Soviet republics and peoples as being different nationally from Russians, although they form half of the population of the Soviet Union – over one hundred million altogether. Not too many Canadians realize that the Belorussians and other non-Russian peoples of the Soviet Union have their own territory with their own population, their own language, history and culture and that in spite of the denial of self-determination

[2]The Oxford International Dictionary, (Toronto, 1957), p. 1311.

[3]I. Mienski, "Establishment of the Belorussian SSR," Belorussian Review, Munich, Institute for the Study of the U.SD.S.R., Vol. I, 1955, pp. 5-33.

by the central Moscow government, they strive for their real independence and not a fictitious one.

The recent textbooks give more information on the peoples of the Soviet Union, but still consider Belorussians and Ukrainians as Russians. I quote from a geography textbook for Grade 10 published in 1961: "The name of the U.S.S.R. emphasizes the fact that it is a union of many different peoples; in fact, there are over a hundred different ethnic or racial groups within the Union's borders. By far the largest group, however, comprising over three-quarters of the total population, are the Russians – a Slavic people related to the inhabitants of Poland, Czechoslovakia, and other East European countries. Even the Russians are divided into three major groups:

The White Russians or Belorussians, numbering ten million, who inhabit the region of the upper Dvina and Dnieper Rivers.

The Little Russians or Ukrainians, about forty million in number, live in the black-earth steppes and the surrounding territory."[4]

In another textbook for Grade 12 published in 1963 we read: "Technically the R.S.F.S.R. is 'Russia,' but this term has come to be used for the U.S.S.R. as a whole."[5]

It is very interesting that such a rather Russian, very conservative nationalistic view of Belorussians and Ukrainians should be introduced in Canadian high schools. It is in contradiction to the scientific classification of Slavs, which considers Russians, Belorussians and Ukrainians as separate peoples of the East Slavic group.[6] It contradicts also the Soviet official view of Belorussians and Ukrainians.[7]

This general attitude of the Canadian public towards Belorussians is shared by Canadian civil servants and enumerators of the Censuses of the Canadian population. This can be seen from the Census questionnaires and Enumeration Manuals. The population questionnaire for the 1951 census included questions on mother tongue, birthplace and origin. Belorussian

---

[4]D.A. Clee, Through Europe and Asias a regional Geography of the Eurasian continent. (Holt, Rinehart and Winston of Canada Limited, Toronto, 1961), p. 314.

[5]Selected Studies in Regional Geography (McGraw-Hill Company of Canada Limited, New York, Toronto, London, 1963), p. 216.

[6]See Encyclopaedia Britannica, Vol. 20. 1966, "Slavonic languages, (classification)," p. 787.

[7]See Bolshaya Sovietskaya Encyclopedia, Vol. 39, Moscow, 1957, "Slovianskiya yazyki," p. 305; and Vol. 4, Moscow 1950, "Beloruski yazyk," p. 351.

is not in the list of languages, nor is Belorussia mentioned in the question on origin.[8]

In the question on birthplace, different European countries are listed, but none that has fallen under Soviet rule, including Belorussia and the Ukraine. Of course Poland and Russia or U.S.S.R. are in parenthesis. Under lists of languages and countries, there is the remark: "If not listed, write below." The question arises as to what to write in the case of the Belorussians.

It is easy to guess the dilemma of the enumerators who knew nothing of Belorussians and of the Belorussian respondents who look for all means to explain the name of their country, their origin and their language. The result was that, with very rare exceptions, they were listed as of Russian or Polish origin because their birthplaces were under former Russian or Polish rule. It is impossible to state with certainty how Belorussians were listed during the Census in 1951, but an analysis of interviews with even a small group of people can give an idea of what happened.

I held interviews with a small group of nationally conscious Belorussians in Toronto – 24 highly active members of the Belorussian Canadian Alliance. Of this number, only three succeeded in convincing enumerators to list them as Belorussians by origin. One of them showed to an enumerator his birthplace on the map of the Belorussian Soviet Republic; another presented his French document in which his birthplace was marked "Bielorussie" in French; the third one was lucky because the enumerator was his friend and allowed him to write in the name of his country. The rest of the twenty-one, in spite of their efforts to prove their Belorussian origin, were listed as Russian or Poles. One girl refused to give any information because the enumerator did not want to enter her Belorussian origin. She received a compromise: she was listed as "other." It is easy to imagine how those Belorussians were listed who had not the ability to explain and prove their origin or who were less insistent. As far as mother tongue was concerned, some enumerators agreed to write in Belorussian.

In census statistics, it is not the rule to describe the Irish, Scottish or Welsh as of English origin. The same distinction is made in regard to French Canadians, whether born in Quebec or in English-speaking Canada. That is why it is difficult to

---

[8]Canada, Dominion Bureau of Statistics, Census of Canada 1951 (Ottawa, 1955), Vol. II., p. 189.

understand a different approach to the similar case of Eastern Slavs – Russians, Ukrainians and Belorussians.

For the 1961 census, the enumerators received more instructions about birthplaces that were uncertain because of changes in national boundaries in some parts of continental Europe or elsewhere, including the Soviet Union. We can find this in the Enumeration Manual for the 1961 census. But in this Manual too the Soviet Union is considered as Russia. True, the manual mentions U.S.S.R. and gives instructions on how to enter the birthplace for those respondents who state that they were born in one of the Soviet republics including the Belorussian. However the subtitle of the paragraph is "If born in Russia."[9]

This subtitle is very significant. It gives inspiration to enumerators to consider all respondents born in the Soviet Union as Russians, especially those, who are not sure, or are not able to explain to which Republic his birthplace now belongs. According to instructions, in such a case enumerators may write in U.S.S.R., but then the respondent was considered Russian.

It is an improvement that in the 1961 census an ethnic group question was introduced with thorough explanations and examples in the above-mentioned manual as to how to make the entries.[10] Unfortunately, no instructions were given on how to enter the ethnic groups from the present Soviet Union which was still considered as Russia. I think, because of such an attitude, many Belorussians during the 1961 census were listed as Russians or Poles if they were born in West Belorussia, although with some insistence it was easier than in 1951 to persuade enumerators to write in "Belorussian origin." It seems to me that the questionnaire itself had much to do with the inaccuracies during this census. The fact that not all ethnic groups or languages were listed in many cases put enumerators and respondents in a confused position.

Population Questionnaire (Form 2A) of the 1961 census had among other things three very important points – birthplace, ethnic group and mother tongue – in which different nationalities were listed, but some ethnic groups, including Belorussians, were missing.[11] I understand that larger nation-

---

[9]Canada, Dominion Bureau of Statitics, Census of Canada 1961: Enumeration Manual (Ottawa, 1961), p. 31.

[10]Ibid., p. 33.

[11]Canada, Dominion Bureau of Statistics, Census of Canada 1961 (Ottawa, 1962), Vol. I, Tables 34, 48, 63.

alities had priority in this case. But this fact put them in an advantageous position in relation to the smaller groups which, because they were not listed in the population questionnaire, did not have equal chances during the census. True, there was a "write in space," but this puts them in a doubtful position; it looks as though they are less important than the groups mentioned in the lists and are dependent upon the views of enumerators who write in their statements. Some could even think: if their ethnic origin is not listed in the questionnaire it is not recognized by authorities, and so what is the use of referring to it?

Also, from the practical point of view, it would be much easier for enumerators and respondents to co-operate if there were a list of all Canadian ethnic groups and their languages without regard to how large or small they are. I understand that there is not enough space in the questionnaire for this, but a **full** list of ethnic groups, countries and languages could be printed separately and attached to the questionnaire. This could be a big help to both enumerators and respondents.

We may agree that it is very difficult to list precisely all the different ethnic groups in such a mixed population as Canada's. But the question is how far we can afford this lack of precision. In some cases, the figures for Canadian censuses of population present very uncertain results. If we compare the general figures for some ethnic groups with figures by religious denominations, we can notice distinct discrepancies. We can take as an example the Russian figures from the 1961 census. It shows us that this group actually consists of several ethnic groups of which the Russians proper formed a minority. In his above-mentioned work, Dr. Kaye came to the same conclusion in analyzing the religious affiliations of the Russian origin group from the 1951 census.[12]

The total figure for the Russian ethnic group according to the census of 1961 is 119,169.[13] Let us see now how this group looks when broken down by religious denominations.

Total number of Russians	119,168
Anglican	4,341
Baptist	3,468

[12]Op. cit., p. 307.

[13]Canada, Dominion Bureau of Statistics, Census of Canada 1961. (Ottawa, 1962), Vol. I, Table 110.

Greek Orthodox	13,761
Jews	23,461
Lutheran	8,237
Mennonite	9,415
Pentecostal	1,011
Presbyterian	1,325
Roman Catholic[14]	16,644
Ukrainian Greek Catholic	1,180
United Church	15,981
Other	20,344

We know that Russians, with the exception of a small number of converts, are Greek Orthodox. But as the figures show there are only 13,761 Russian Greek Orthodox in the whole number of 119,168. We can consider the 20,344 "Others" as Dukhobors – definitely Russian – and can add 26,126 of different Canadian Protestant denominations. But what of the remainder? This includes 16,644 Roman Catholics; 9,415 Mennonites; 8,237 Lutherans and 23,461 Jews. Are these Russians? Possibly a small fraction are but not all 57,757. And how can we interpret the fact that there are only 13,761 Greek Orthodox and 16,644 Roman Catholics in the Russian group? From this example we can see that in some cases Canadian censuses of population are quite a distance from the real figures for the Canadian ethnic groups.

There are some difficulties in preserving Belorussian origin on Canadian citizenship paper, too. The trouble is that in many cases, clerks who fill in applications and prepare the papers, refuse to recognize the unfamiliar name of Belorussia and put instead the countries under the rule of which were the applicants born – Poland or Russia. Interviews with some members of the Belorussian Canadian Alliance are very convincing. To mention only a few: in Toronto, 1959, Mr. J. Baran, despite his insistence that his birthplace was Belorussia, was marked in Canadian documents as of Polish origin. Mr. N. Prakopchik of Cobourg named his birthplace "Belorussia" but, because he served in the Polish army, "Polish origin" was written in his document. Against their insistence that they were of Belorussian origin Mrs. N. Baranovich (Toronto) was marked as Russian, Mr. M. Ratchicki (Toronto) as Polish, and so on. Other examples are A. Protas (Stratford), N. Silvanovich (Toronto)

[14]All emphasis is mine, V. Z.-H.

and B. Lischonak (Oshawa). We could expand this list much more. Others – Mr. A. Monid (Brantford) succeeded in preserving his Belorussian origin in Canadian documents because in his previous French document his origin was stated to be Belorussian.

There were some more dramatic cases. Mr. K. Akula, the Belorussian writer and one of the founders of the Belorussian Canadian Alliance, before becoming a Canadian citizen found it necessary to travel to the States and applied for a Canadian temporary travel document. In spite of his protest, Poland was put as his birthplace instead of Belorussia. Because of his urgent need for this document, he could not afford to refuse it. When in 1954 he applied for Canadian citizenship a city clerk again intended to write in Poland as his birthplace. But this time he refused to accept the document, and after some time the clerk conferred with a higher official and agreed to put in Belorussia.

Something similar happened to Mr. L. Karyba in Toronto. In September 1966 he refused to accept the certificate of Canadian citizenship for the same reason. Again a higher official had to intervene and told him to wait two weeks for correction. And indeed after two weeks he received a corrected document.

How do Belorussians themselves feel in such situations? In the past they could not express their national identity under Polish rule. The Bolshevik rulers tried to russify them, and some Belorussians, because of their national convictions, even had to endure Russian forced labour camps. After the end of World War II many Belorussians in Germany were chased by the Soviet Repatriation Commission who wanted to force them to return. And after they came to such a free country as Canada they never expected that even here they would have difficulty in preserving their national identity.

I do not intend to insist that Belorussians are not listed in Canadian statistics only because of ignorance about them and some technical disadvantages in questioning. I know that the old Belorussian so-called "dollar" immigrants had not enough national consciousness and did not care at all how they were listed. I know that many Belorussian immigrants accepted alien identities – Russian or Polish, as they were taught for years by Russian or Polish teachers, priests and officials in the old country and by the Communist propaganda in Canada. But we can not dismiss other causes which obstruct the expression of Byelorussian identity for those who are proud of it.

Maybe the question of how Belorussians are listed in Canadian statistics is not so important; they are Canadians now anyway. But we have to keep in mind that Canada is not a melting pot. As distinguished Canadian statesmen believe, the basic strength of Canada is diversity in unity – diversity in the cultural heritage of different ethnic groups and unity in the common rich Canadian culture. From this point of view, it is important indeed to secure an expression of identity for all ethic groups, to give an equal chance to all of them, big and small, better known or less known. Canada, our new homeland is big, beautiful, rich and a free country. It is a country which gives equal rights, equal opportunities and equal chances to every citizen. That is why the question of how Belorussians are listed has some importance.

Перапіс насельніцтва Канады – Цэнзус 1971

Чарговы перапіс – Цэнзус – насельніцтва Канады прыпадаў на 1 чырвеня 1971 году. Др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч вырашыў правесьці акцыю, каб беларусы падавалі ў апытальніках Цэнзусу сваё беларускае, а не чужое паходжаньне. Ён скамунікаваўся з Dominion Bureau of Statistics, атрымаў ад іх адпаведныя матарыялы й прыгатаваў ад імя Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады, і ў супрацоўніцтве зь ім, заклік да беларусаў наступнага зьместу:

КААРДЫНАЦЫЙНЫ КАМІТЭТ БЕЛАРУСАЎ КАНАДЫ
Ў СПРАВЕ ПЕРАПІСУ НАСЕЛЬНІЦТВА КАНАДЫ – ЦЭНЗУС 1971

Суродзічы беларусы!

1 чырвеня 1971 г. адбудзецца чарговы перапіс – ЦЭНЗУС – насельніцтва Канады. **Ён абавязковы для ўсіх жыхароў** – згодна з дзяржаўным правам Статыстыкс Акт.

Пэрсанальныя дадзеныя перапісу будуць засакрэчаныя. Паводле Статыстыкс Акт усе пэрсанальныя дадзеныя, якія вы падасьцё пра сябе, ці пра сваю сям'ю патрэбны толькі для статыстыкі. Яны будуць трымацца ў тайніцы й ніхто, нават дзяржаўныя інстытуцыі, ня будуць

мець да іх доступу, апрача працаўнікоў статыстычнага бюра, якія робяць статыстыку. Гэтыя-ж працаўнікі склалі прысягу, што не дапусьцяць нікога да пэрсанальных дадзеных перапісу, і знайшліся-б пад суровай адказнасьцяй, калі-б парушылі прысягу.

Удзельнікі ў перапісе гэта толькі статыстычныя адзінкі, а іх імёны й прозьвішчы патрэбны толькі на тое, каб ня зблытаць хто мужчына, а хто жанчына, каб не палічыць тую самую асобу 2 разы й каб нікога не прамінуць.

Гэта будзе самаперапіс, бо кажны сам будзе выпаўняць апытальнік (квэшчэнэр). Каб дапамагчы ў выпаўненьні апытальніка, падаём тут наступныя парады:

Запазнайцеся добра прынамся зь першымі дзьвюма бачынамі інструкцыі, якую атрымаеце з апытальнікам. З рэшты інструкцыі карыстайце пры кожным незразумелым пытаньні. Пытаньні, што адносяцца да нацыянальнасьці – беларусы выпаўняюць такім чынам:

Page 2 (бачына 2) – Question 5 – Mother tongue (родная мова)

У вольнай лінейцы трэба пісаць – **BYELORUSSIAN**

Page 6 (бачына 6) – Question 11 – Where were you born? (дзе нарадзіліся?)

Трэба пісаць – **BYELORUSSIA**

Question 15 – To what ethnic or cultural group do you or your ancestors belong? (Да якой нацыянальнай групы вы ці вашы продкі належалі?)

Трэба пісаць – **BYELORUSSIAN**

Question 17 – What language do you most often speak at home now? (На якой мове вы найбольш гаворыце дома?)

Калі гаворыце пабеларуску, пішыце – **BYELORUSSIAN**

Дзеля розных прычынаў некаторыя беларусы былі запісаны ў дакумэнтах і перапісах пад іншымі нацыянальнасьцямі (расейцамі ці палякамі), а не беларусамі. Інакш было запісана іхняе паходжаньне – замест Беларусі (Расея ці Польшча), а ня рэдка й іхняя родная мова была ўпісана інакш, як беларуская. Мусім старацца, каб больш гэтых памылак не паўтаралася. Няважна, як хто раней быў

запісаны, важна тое, каб кожны з нас сам цяпер запісаў сябе правільна. Зацікаўлены ў гэтым ня толькі мы – беларусы, але й канадыйскія ўлады. Ходзіць аб тое, каб статыстыка была правільная наагул і правільная ў нацыянальных, моўных, культурных і іншых адносінах. Толькі з правільных дадзеных можна рабіць правільныя высновы, якія карысна адаб'юцца й на нашым жыцьці. Вось чаму Каардынацыйны Камітэт Беларусаў Канады ўвайшоў у паразуменьне й супрацоўніцтва з Дамініон Бюро оф Статыстыкс пры правядзеньні Цэнзусу (перапісу) 1971. Зьвяртайцеся да нас ува ўсіх справах перапісу. Наш адрас:

129 Emerson Ave., Toronto 172
Tel. 537-7163

Торонто, травень 1971

Каардынацыйны Камітэт
Беларусаў Канады

Заклік гэты ў беларускай і ангельскай мовах быў шырока распаўсюджаны, сярод беларусаў і канадыйцаў беларускага паходжаньня па Канадзе. Такая практыка распаўсюджваньня падобнага зьместу зваротаў да беларусаў і канадыйцаў беларускага паходжаньня праводзіцца Каардынацыйным Камітэтам Беларусаў Канады кожныя пяць гадоў перад Цэнзусамі Канады.

«Масква забіла ідэю славянскай фэдэрацыі

Карэньні панславізму – злучэньне ўсіх славянскіх народаў у вадной фэдэрацыі – паходзяць ад заходніх і паўдзённых славянаў, зь якіх большая частка была пад уладай Аўстра-Вугорскай Імпэрыі, а меншая – пад турэцкай уладай.

Ужо ў 1659 г. харвацкі сьвятар Юры Крыжаніч паехаў у Маскву «да цара майго племяні», каб пераканаць яго ў патрэбе панславізму. Тады маскоўскі цар ня чуўся яшчэ на сілах, каб выкарыстаць панславізм для сваіх імпэрыялістычных мэтаў, а мо' й не разумеў яго.

Панславізм, як культурны й палітычны кірунак, выкрышталізаваўся ў 19 стагодзьдзі пад уплывам рамантыз-

му й аб'яднаўчага руху Нямеччыны. Спрычыніліся да гэтага таксама сваімі навуковымі працамі аб славянах вучоныя славістыя Ягіч, Доброўскі й Шафарык, а асабліва славацкі паэта Ян Коляр, які ў сваёй паэзіі заклікаў славянаў да аб'яднаньня.

Рэвалюцыя 1848 году ў Аўстрыі й Нямеччыне – гэтак званая «Вясна Народаў» значна ўзмоцніла панславянскі рух. Тады быў скліканы Першы Славянскі Кангрэс у Празе Чэскай пад старшынствам чэскага гісторыка й патрыёты Паляцкага. У гэтым кангрэсе ўзялі ўдзел славянскія народы, што былі пад Аўстрыяй: харваты, славенцы, чэхі, славакі, палякі й русіны-украінцы з Галіччыны. Калі рэвалюцыя была здушаная – былі здушаныя й славянскія рухі, а славянскія народы зноў апынуліся пад уладай Аўстрыі або Вугоршчыны. Яны ськівалі свае надзеі на вызваленьне на Расею, і цэнтрам панславізму сталася Масква.

Але Масква зразумела ідэю панславізму пасвойму, на сваю карысьць. Ужо Пушкін пісаў, што ўсе славянскія ручаі зьліваюцца ў вадзіным расейскім моры. Расейская-ж царская палітыка пабачыла добрую нагоду выкарыстаньня панславізму для падпарадкаваньня сваёй уладзе ўсіх славянскіх народаў. Падтрымлівала гэтую палітыку й расейскае грамадзтва, у якім пашыраўся сільны рух «славянафільства», на чале якога стаялі расейскія дзеячы Хамякоў і браты Кірэеўскія. Рух гэты супрацьставіўся заходняй культуры й цывілізацыі ды глёрыфікаваў расейскае праваслаўе і царскі абсалютызм. На ім базаваўся расейскі нацыяналізм і імпэрыялізм. Падтрымліваў славянафільства й Дастаеўскі, а расейскі гісторык Пагодзін і пісьменьнік Данілеўскі прадбачылі, што панславізм прывядзе да фэдэрацыі ўсіх славянскіх народаў пад зьверхнасьцяй Расеі, і што граніцы гэтай фэдэрацыі стануць на лініі Шчэцін – Трыест.

На руку расейскіх славянафілаў быў вызвольны рух супраць Турэччыны, баўгараў і сэрбаў на Балканах, якія шукалі расейскай помачы й пратэкцыі. Пры такіх настроях і абставінах быў скліканы Другі Славянскі Кангрэс у Маскве ў 1867 годзе.

Гэты Славянскі Кангрэс ня меў вялікага значэньня. Чорнай плямай ляжаў на ім 1863 год – здушэньне расейцамі польскага паўстаньня й паўстаньня Кастуся Каліноўскага на Беларусі. Для ўсіх было ясным, што расейскі панславізм нясе няволю славянскім народам.

Далейшыя славянскія кангрэсы адбываліся пасьля расейскай рэвалюцыі 1905 году ў Празе Чэскай і Сафіі, інспіратарам якіх быў чэскі кансэрватыўны палітык Кароль Крамаж.

Бальшавікі ня прызнавалі панславізму. Ленін казаў, – панславізм – гэта рэакцыйны буржуазны рух, які разьбівае клясавую салідарнасьць. Аднак калі ў 1941 годзе Гітлер напаў на Савецкі Саюз, Сталін кінуўся на выкарыстаньне панславізму для сваіх палітычных мэтаў. У Маскве быў створаны Славянскі Камітэт, які заклікаў усіх славян да змаганьня зь Немцамі. Была праведзеная шырокая акцыя арганізаваньня славянскіх камітэтаў у Паўночнай і Паўдзённай Амэрыцы сярод славянскіх нацыянальнасьцяў эміграцыі на падтрымку Савецкага Саюзу. А як кончылася вайна, камітэты гэтыя сталіся асновай дзейнасьці камуністычнай партыі.

У 1946 годзе савецкі генэрал А. Гундоров – старшыня маскоўскага славянскага камітэту – склікаў у Белградзе канфэрэнцыю ўсіх славянскіх камітэтаў, якая пастанавіла склікаць Усеславянскі Кангрэс у сьнежні 1946 году ў тымжа Белградзе. Дамінуючай фігурай на гэтым Кангрэсе быў маршал Ціта, а Белград быў абраны за сталую сядзібу Цэнтральнага Панславянскага Камітэту.

Але праз паўтара году разрыў Ціта із Сталінам падарваў дзейнасьць гэтага Камітэту. З таго часу заглохла ягоная дзейнасьць. Незалежна ад гэтага, ідэя панславізму даўно ўжо сталася мёртвай, хоць камуністы й стараліся ажывіць яе для сваіх імпэрыялістычных мэтаў. Забіла гэтую ідэю Масква – спачатку царскі імпэрыялізм, а пазьней бальшавіцкі. І якія-ж славянскія народы могуць верыць у ідэю панславізму, калі яны бачаць, як жывуць паняволеныя Масквой беларусы й украінцы, як расейскія шавіністы стараюцца зьнішчыць нацыянальную й культурную самабытнасьць гэтых народаў пры помачы прымусовай русыфікацыі.

Другі Кангрэс Канадыйскіх Славянаў ня меў нічога супольнага з палітычнымі тэорыямі панславізму, якія ў практыцы зводзіліся да расейскага імпэрыялізму.

Кангрэс гэты базаваўся на штодзённым практычным жыцьці славянскіх этнічных групаў Канады, браў пад увагу іх практычныя патрэбы, іх культурныя й грамадзкія арганізацыі, сумаваў вынікі іх працы, як уклад у разбудову Канады. У гэтым практычным падыходзе выявіла-

ся салідарнасьць славянскіх групаў, узаемная пашана й супрацоўніцтва на аснове канадыйскіх прынцыпаў дэмакратычнай свабоды й роўнасьці для ўсіх грамадзян.

Выказаў усё гэта вельмі прыгожа Мр. Лёрэнц – пасол Антарыйскага Парлямэнту, як госьць спікэр на нядзельным банкеце ўдзельнікаў Другога Кангрэсу Канадыйскіх Славянаў у Бікон Армс Гатэлі ў Атаве, зводзячы сваю прамову да параўнаньня правядзеньня тэорыі панславізму ў палітыцы й вольнае супрацоўніцтва славянскіх нацыянальнасьцяў на практыцы ў Канадзе. **Ж.**»

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 125, 1967)

450-я ўгодкі беларускага друку

Сьвяткаваньне 450-х угодкаў беларускага друку, запачаткаванага ў 1517 годзе др. Франьцішкам Скарынам, Згуртаваньне Беларусаў Канады спалучыла із сьвяткаваньнем стагодзьдзя Канады. Падрыхтоўка да адзначэньня гэтак важнага беларускага юбілею праводзілася доўга. Плянавалі мы зрабіць выстаўку, прысьвечаную жыцьцю й творчасьці др. Франьцішка Скарыны, якую назвалі Выстаўкай Старога Беларускага Друку. Экспанаты на выстаўку ласкава пазычыў нам Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва ў Нью Ёрку. У беларускага мастака Пётры Мірановіча, які тады жыў у Нью Ёрку, заказалі мы вялікі партрэт др. Франьцішка Скарыны. А так як ідэя выстаўкі выйшла ад нас – Вінцэнта й Раісы Жук-Грышкевічаў – мы яе й рыхтавалі. Да экспанатаў трэба было прыгатаваць напісы ў беларускай і ангельскай мовах. З ангельскімі памагаў нам наш пляменьнік, тады вучань сярэдняй школы Паўлюк Пашкевіч і на колькі дзён госьць зь Лёндану, Англіі, айцец Рабэрт Тамушанскі (тады яшчэ ня доктар філязофіі). Аформіць выстаўку ў залі Беларускага Рэлігійна-Грамадзкага Цэнтру ў Таронта заняло нам тры дні. Зраніцы прыяжджалі мы ў Таронта й вечарам вярталіся дамоў у Бэры (у Беларускі Рэлігійна-Грамадзкі Цэнтр аўтам – панад 100 км.). Выстаўка складалася зь сямі гнёздаў: 1. Скарына вандроўны; 2. Скарына ў Падуі; 3. Скарына сярод сучасьнікаў; 4. Скарынавыя кнігі; 5. Скарынавыя ілюстрацыі й гравюры; 6. Скарынавыя папярэднікі й пасьлядоўнікі; 7. Скарына ў беларускай літаратуры й прэсе.

Гэтыя сем гнёздаў трэба было разьмясьціць на сьценах залі так, каб яны тварылі добра зарганізаваную кампазыцыю, каб на выстаўку было прыемна глядзець. Інакш яна ірытавала-б і адпіхала-б гледачоў заміж іх сваім эстэтычным выглядам прыцягваць да сябе. За першы дзень разьвесілі мы ўсе экспанаты. Не хапала партрэту Скарыны. Мелі мы толькі пабольшаную фатаграфію Падуанскага партрэту др. Франьцішка Скарыны із «Залі Сарака», але хоць апраўлена ў большую рамку – была яна за малая... Увечары едзем самаходам дамоў, спадзяемся, што партрэт надыйшоў... Партрэт ня прыйшоў. Нічога не парадзіш. На другі дзень зраніцы заходзім у залю Цэнтру, і... трэба ўсё перааранізаваць, перавесіць... Ня выглядае прыемна для вока. Усё зрабілі нанава. Увечары засталі дома паведамленьне, што ёсьць для нас пачка!!! Нараніцу едзем у Таронта зь вялікім прыгожым партрэтам др. Франьцішка Скарыны... Прыехалі ў залю й Вінцук кажа: «Сяньня перавешваць усяго ня будзем!». Ня было патрэбы. Трэба было толькі закончыць дэкарацыю залі. Да дыспазыцыі мелі мы багатыя аўтэнтычныя беларускія тканіны – дываны, настольнікі, вазы й шмат жывых кветак.

Вялікі алейны партрэт др. Франьцішка Скарыны із слаўнага града Полацка на франтовай сьцяне, на фоне палескага дывана, абапал ушанаваны нацыянальнымі – беларускім і канадыйскім – сьцягамі, надаў жыцьцё й душу ўсёй грандыёзнай выстаўцы. Увечары таго дня яна была гатова. А заля БР-ГЦ выглядала ўрачыста й сьвяточна.

* * *

Выстаўкай Старога Беларускага Друку й урачыстым сходам 17-га верасьня 1967 году ў залі Беларускага Рэлігійна-Грамадзкага Цэнтру на 524 St. Clarens Ave. у Таронта беларусы Канады адзначалі 450-я ўгодкі беларускага друку й стагодзьдзе Канады. Урачыстасьці ладзіла Згуртаваньне Беларусаў Канады.

Выстаўка:

1. Скарына вандроўны. Пры дапамозе карты, фатаграфіяў і перакладу на беларускую й ангельскую мовы ліста гэрцага прускага Альбрэхта паказаны 9 ведамых нам

сяньня асяродкаў, дзе радзіўся, жыў, дзеіў і памёр Франьцішак Скарына. Гэта: Полацак, Вільня, Кракаў, Прага, Капэнгага, Падуя, Пазнань, Каралевец і Масква.

2. Скарына ў Падуі. Апрача фатаграфіі Скарынавага партрэту, які да сяньня вісіць у «Залі Сарака» Падуанскага ўнівэрсытэту ў Італіі, тут фатакопіі актаў таго-ж унівэрсытэту аб урачыстым экзамене й прамоцыі Франьціш-ка Скарыны да годнасьці доктара мэдыцынскіх навук. Адзін з гэтых дакумэнтаў перакладзены на беларускую мову.

3. Скарына сярод сучасьнікаў. У гэтым разьдзеле мы знаёміліся з выдатнымі асабістасьцямі таго часу, зь якімі Франьцішак Скарына меў дачыненьні. Гэта: Жыгімонт Казіміравіч – Вялікі Князь Літоўскі і кароль польскі, які быў вельмі прыхільны да Скарыны й даў яму сваю праўную апеку; Ян – біскуп Віленскі; Фэрдынанд I, кароль аўстрыйскі, чэскі й вугорскі, і ягоная жонка Ганна з Ягайлавічаў, якім Скарына залажыў адзін зь першых у Эўропе батанічны сад; Ганс – кароль Даніі, Швэцыі й Нарвэгіі з жонкай і сынам Хрыстыянам, у якога Скарына быў сакратаром; Альбрэхт – гэрцаг прускі, які выдаў Скарыне дарожны ліст, із зьместам якога мы пазнаёміліся ў першым разьдзеле выстаўкі; Васіль III Іванавіч – вялікі князь маскоўскі, які загадаў сканфіскаваць і публічна спаліць Скарынавыя кнігі, прывезеныя ім у Маскву для пашырэньня.

4. Скарынавыя кнігі. Гэты разьдзел абымаў 12 экспанатаў, ілюстраваў друкаваныя бачыны з розных Скарынавых кнігаў, выняткі зь ягоных прадмоваў і допісаў, што знаходзяцца на пачатку, канцы, між разьдзеламі кнігаў.

Ведамая сяньня друкарская спадчына Скарыны складае блізу 4000 бачынаў друку. Скарына выдаў 23 кнігі Бібліі ў беларускім перакладзе ў Празе Чэскай у гадох 1517-1519 і Апостала ды Малую Падарожную Кніжку ў Вільні ў 1522 годзе.

Кнігі свае Скарына выдаваў «людзям паспалітым к добраму навучэньню» і «пажытку», а пісаў іх пабеларуску, як сам кажа, «іжэ мя міласьцівы Бог з таго языка на сьвет пусьціў».

5. Ілюстрацыі й графічныя аздобы Скарынавых кнігаў. Скарынавы кнігі былі ня толькі важнай падзеяй у гісторыі беларускага ды наагул славянскага кірылічнага друку, але й у гісторыі мастацтва. Скарына першы ў кнігах



Фрагмэнт Выстаўкі, прысьвечанай 450-м угодкам Беларускага Друку, «Скарына вандроўны». Дзевяць нам сяньня ведамых асяродкаў, дзе радзіўся, жыў, дзеіў і памёр др. Франьцішак Скарына. Гэта – Полацак, Вільня, Кракаў, Прага, Капэнгага, Падуя, Пазнань, Каралевец і Масква. Таронта, 17 верасьня, 1967.



Фрагмэнт Выстаўкі Старога Беларускага Друку. Таронта, 17 верасьня, 1967.



«Скарына ў беларускай прэсе 1967 г.» Таронта, 17 верасьня, 1967.

кірылічнага друку ўвёў звычай багатага іх ілюстраваньня, каб «хто межы простымі людзьмі браціі маей хацеў ясьнее разумеці... усё вымалевана ніжэй знойдуць...» Як і сам шрыфт, так і ілюстрацыі ды гравюры вельмі прыгожыя, сваім стылем здраджаюць сувязь з гравюрай Нюрынбэрскай школы ды гравюрай італьянскага рэнэсансу. Зь ілюстрацыямі, ініцыяламі знаёміў нас 5-ты разьдзел выстаўкі.

6. Скарынавыя папярэднікі й пасьлядоўнікі. Найважнейшымі беларускімі пасьлядоўнікамі Скарыны былі: Сымон Будны – выдатны дзеяч і заснавальнік другое з чаргі (першай была Скарынава ў Вільні) друкарні на Беларусі ў Нясьвіжы, і Васіль Цяпінскі – грамадзкі дзеяч, гарачы патрыёта, абаронца беларускай мовы й заснавальнік друкарні ў Цяпіне (Полаччына). Формы літараў нясьвіскай і цяпінскай друкарні напамінаюць формы літараў Скарынавага шрыфту.

7. Скарына ў беларускай літаратуры й прэсе. Тут былі выстаўлены працы пра Скарыну др. Вітаўта Тумаша – Сымона Брагі, ды артыкулы аб Скарыне з газэт – «Беларуса», «Літаратуры й Мастацтва» і іншых.

Урачысты сход

Урачысты сход адкрыла й вяла рэфэрэнт культуры Галоўнай Управы ЗБК др. Раіса Жук-Грышкевіч.

Першым дакладчыкам быў высокі ўрадавец з Дэпартамэнту Грамадзянства й Іміграцыі сп. Глын П. Ален, які перад тым, як прыступіць да разьвіцьця свае тэмы аб стагодзьдзі Канады, гаварыў аб 450-ых угодках беларускага друку, аб Франьцішку Скарыне, старой беларускай культуры, якой мы павінны ганарыцца, захоўваць і разьвіваць яе.

Другім дакладчыкам на тэму: «450-я ўгодкі беларускага друку» быў др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч. З увагі на гасьцей й нашу моладзь, якая, на жаль, не заўсёды валодае беларускай мовай, ён гаварыў паангельску, а пасьля пабеларуску.

Каб лягчэй уявіць і асэнсаваць заслугі др. Франьцішка Скарыны ды значэньне пачатку друкарства ў Беларусі, дакладчык кінуў сьпярша сьвятло на тагачасную Эўропу, якую нуртавалі тады новыя плыні: гуманізму, рэнэсансу й рэфармацыі. Яны несьлі з сабой поступ, разьвіцьцё культуры й асьветы. Дзякуючы Статуту Вялікага Княства Літоўскага, які спрыяў выяжджаньню ягоных грамадзян за



Др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч робіць даклад на сьвяткаваньні 450-х Угодкаў Беларускага Друку. Канада, Таронта, 17 верасьня, 1967.

межы для здабыцьця асьветы, заходняэўрапэйскія плыні пранікалі й на Беларусь. Таму сучасная Скарыне Беларусь была ўжо прыгатаванай да ўспрыйманьня новых ідэяў, новых вынаходаў – прыкладам друкарства, а зь ім і пашыраньня кніг. Далёка ззаду заставалася забабонная яшчэ Маскоўшчына. Яна сустрэла Скарынавыя кнігі не як сьвятло, а як чорную магію, і на загад вялікага князя маскоўскага Васіля III Іванавіча іх спаліла. «Гэта гіронія лёсу, – гаварыў дакладчык – што Беларусь, у якой расьцьвітала заходняя культура, якая кіравалася парлямэнтарным ладам і правам, сьпісаным у Статуце Вялікага Кня-

ства Літоўскага, пасьля сталася ахвярай вынішчаньня й русыфікацыі адсталай Маскоўшчыны».

Далей гаварыў дакладчык аб адным з найболей таленавітых і бліскучых дзеячоў «залатое пары» Беларусі, доктару сямі вызваленых навук і мэдыцыны Франьцішку Склярыну з Полацку. Гаварыў аб ягоным паходжаньні, аб ведамых сяньня фактах зь ягонай біяграфіі, аб ягонай дзейнасьцьці, ягоным сьветапаглядзе й значэньні ў гісторыі беларускай культуры. Скарына пакінуў сьлед свае дзейнасцьці ў шматлікіх галінах: філязофіі, тэалёгіі, праве, мэдыцыне, батаніцы, літаратуры, лексікалёгіі, мастацтве, але найбольшай ягонай заслугай у гісторыі культуры Беларусі – пераклад Бібліі на беларускую мову, запачаткаваньне беларускага кнігадрукаваньня (1517), ды заснаваньне першай на Беларусі друкарні ў Вільні ў 1522 годзе.

«Сяньня мы тут сабраліся, каб аддаць пашану памяці др. Франьцішка Скарыны, але мы ўшануем яе найляпей, калі будзем праводзіць у жыцьці ягоныя думкі й ідэі, вечна жывыя й вечна актуальныя» – закончыў дакладчык.

(«450-я Угодкі Беларускага Друку», «Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 126, 1967.)



Удзельнікі сьвяткаваньня 450-х угодкаў беларускага друку. У Беларускім Рэлігійна-Грамадзкім Цэнтры ў Таронта. 17 верасьня, 1967.

Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва ў Канадзе

У сьнежні 1951 году ў Нью Ёрку быў заснаваны Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва. Сяброўства й дзейнасьць яго пашыралася ня толькі на ЗША, але й на Канаду ды Эўропу. У гэтым жа годзе стараньнем канадыйскага сябры БІНіМ Вінцэнта Жук-Грышкевіча пры Унівэрсытэце Таронта, аддзеле славістыкі – University Extension – заснаваны быў лектарат Беларусаведы. Лектарат праіснаваў да 1954 году, да часу, калі выкладчык лектарату, др. В. Жук-Грышкевіч, мусіў выехаць у Мюнхэн, каб там арганізаваць беларускую сэкцыю радыя «Вызваленьне».

У верасьні 1967 году зь ініцыятывы й стараньнем сяброў БІНіМ Згуртаваньне Беларусаў Канады ўрачыста адзначала 450-я ўгодкі беларускага друку, запачаткаванага ў 1517 годзе др. Франьцішкам Скарынам. З гэтай нагоды была наладжана выстаўка Старога Беларускага Друку, якая адлюстроўвала жыцьцё, дзейнасьць і творчасьць др. Франьцішка Скарыны.

На Другім Кангрэсе Канадыйскіх Славянаў, што адбыўся ў чырвені 1967 году ў Атаве, др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч, сябра БІНіМ, чытаў даклад на тэму «Беларусы й канадзкая статыстыка» – "Byelorussians and Canadian Statistics." Выступаў ён ад грамадзкае арганізацыі Згуртаваньня Беларусаў Канады, а вымагалася, каб лектар рэпрэзэнтаваў нейкую навуковую арганізацыю – learned society – Канады, а не грамадзкую. Выпадак гэты быў беспасрэднай і адной з галоўных прычынаў заснаваньня БІНіМ у Канадзе.

У паразуменьні з др. В. Тумашам, тагачасным старшынём БІНіМ у Нью Ёрку, 17 верасьня 1967 году ў Беларускім Рэлігійна-Грамадзкім Цэнтры ў Таронта адбылося арганізацыйнае паседжаньне, на якім створаны быў Аддзел БІНіМ у Канадзе, паангельску "Byelorussian Institute of Arts and Sciences, Canada Branch." Вось першы пратакол:

Пратакол нр. 1

Арганізацыйнага паседжаньня Аддзелу Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ў Канадзе, дня 17-га верасьня 1967 году ў Таронта ў Беларускім Рэлігійна-

Грамадзкім Цэнтры. Прысутныя: др. Барыс Рагуля, спня Людміла Рагуля, др. Яўхім Скурат, мгр. Алесь Грыцук, др. Раіса Жук-Грышкевіч і др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч.

Парадак дня: Заснаваньне Аддзелу Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ў Канадзе.

Др. В. Жук-Грышкевіч паінфармаваў аб патрэбе заснаваньня Аддзелу БІНіМ у Канадзе, калі мы хочам, каб голас беларусаў быў чутны й у навуковым жыцьці канадзкім і канадзкіх этнічных групаў. Як прыклад ён падаў удзел беларусаў у Кангрэсе Канадзкіх Славян у чырвені г.г. ў Атаве. Каб стацца сталым сябрам арганізатараў падобных Кангрэсаў, трэба мець сваю навуковую арганізацыю. Ёсьць і іншыя галіны жыцьця, у якіх могуць браць удзел толькі навуковыя арганізацыі, а таксама існуюць і нашыя натуральныя патрэбы, што вымагаюць існаваньня навуковай арганізацыі.

Прысутныя сябры пагадзіліся з довадамі др. В. Жук-Грышкевіча й пастанавілі аднагалосна заснаваць Аддзел БІНіМ у Канадзе. Паангельску Аддзел мае называцца: "Byelorussian Institute of Arts and Sciences, Canada Branch." На старшыню Аддзелу БІНіМ у Канадзе быў выбраны др. В. Жук-Грышкевіч, а на сакратара-скарбніка мгр. А. Грыцук.

На гэтым паседжаньне было закончана.

Падпісана: Старшыня – В. Жук-Грышкевіч.

(Архіў БІНіМ у Канадзе)

У пратаколе нр. 2, з 17 лістапада 1968 г. гаворыцца:

«Др. В. Жук-Грышкевіч паінфармаваў, што з прычынаў фармальных і практычных варта назваць наш Інстытут Беларускім Інстытутам Навукі й Мастацтва ў Канадзе, а не Аддзелам БІНіМ у Нью Ёрку. Дзеля вышэй паданых прычынаў такую-ж думку сугэраваў і др. В. Тумаш, старшыня БІНіМ у Нью Ёрку. Пасьля кароткай дыскусіі прапанова была прынята аднагалосна».

Пастанавілі прыняць удзел у Зьезьдзе Канадзкіх Славянаў, які адбудзецца ў чырвені 1969 г. ў Таронта. Пастанавілі таксама падрыхтаваць на гэты Зьезд наступныя рэфэраты: «Новая беларуская іміграцыя ў Канадзе» – апрацуе др. В. Жук-Грышкевіч; «Беларускае пісьменства ў Канадзе» – апрацуе паангельску мгр. А. Грыцук; «Белару-

ская культурная дзейнасьць у Канадзе» – пафранцуску апрацуе др. Я. Скурат.

Аб заснаваньні Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ў Канадзе інфармуе БІНіМ у Нью Ёрку ў сваім АБЕЖНІКУ нр. 13, за сьнежань, 1967 год.

ЭКСПО-67

Найвыдатнейшай і найболей велічнай падзеяй сьвяткаваньня стагодзьдзя Канады была міжнародная выстаўка – ЭКСПО-67 – у Мантрэалі.

Ліставаньне зь беларусамі Мантрэалю

Да «ЭКСПО-67» рыхтаваўся й Каардынацыйны Камітэт Беларусаў Канады. У Мантрэалі быў аддзел Згуртаваньня Беларусаў Канады – сябры ККБК. Старшыня ККБК др.В. Жук-Грышкевіч утрымоўваў сувязь зь беларусамі Мантрэалю й ліставаўся із спадарствам Храноўскімі, аднымі з болей дзейных там беларусаў. У канцы 1966 году ён піша да іх ліст наступнага зьместу:

«7 сьнежня 1966.

Дарагія Крыстына й Анатоль,

Маю надзею, што Вы ня маеце нічога супраць, што я да Вас так зьвяртаюся. Вы прынялі мяне, як родныя, то й я зьвяртаюся да Вас, як да радні. Дзякую Вам за Вашу сардэчную гасьціннасьць і супрацоўніцтва ў нашай агульнай справе. Усе мы дзякуем вам за гэта й думаем, што наша супрацоўніцтва дасьць добры плён, што ваша арганізацыя ў Мантрэалі разаўецца й стане на ногі. У вас ёсьць добры актыў, які можа згуртаваць каля сябе паважную колькасьць сяброў. Управа Вашага аддзелу ЗБК фактычна ёсьць, вам трэба дабраць толькі старшыню.

На нашай супольнай нарадзе мы гаварылі, што Вам трэба быць у кантакце з "Canadian Corporation for the 1967 World Exhibition" (адрас якой хіба вам ведамы), каб:

1. Паведаміць іх, што ваша арганізацыя бярэцца закватэраваць пэўную колькасьць наведвальнікаў Выстаўкі з Канады й з ЗША, але **толькі беларусаў** (бо яны могуць

напхаць вам чужых – каго хочаш), і даведацца, якую карысьць можа мець з гэтага ваша арганізацыя.

2. Даведацца, ці вы можаце прыймаць замаўленьні на білеты на Выстаўку й па якой цане паадзіночныя й груповыя, і ці ваша арганізацыя можа мець за гэта якісь працэнт заробку (commission).

3. Выдзяліць з сваей групы адну асобу, якая была-б Liaison Officer паміж Выстаўкай і вашай арганізацыяй і мела ў сваёй дыспазыцыі ўсе інфармацыі адносна Выстаўкі. Гэтыя пункты я падаю ў сувязі з нашай гутаркай, а на месцы вы пабачыце, што трэба рабіць і як рабіць.

Справа беларускай арганізацыі ў Мантрэалі ляжыць на сэрцы нам усім. Найбольшы горад у Канадзе й мае шмат беларусаў – добрых патрыётаў, а арганізацыя нячынная, у той час, як ува ўсіх большых гарадох у вольным сьвеце, дзе толькі ёсьць беларусы, ёсьць і беларускае арганізацыйнае жыцьцё. І вы й мы добра ведаем, што ўсё ў вас заняпала пасьля таго, як быў праданы пляц. Ня будзем шукаць вінаватых, ці нявінаватых, гэта нам нічога ня дасьць. Будзем думаць лепш, як паправіць справу. Каб арганізацыя існавала й разьвівалася, мела сталае беларускае жыцьцё, трэба мець свой сталы асяродак, гэта значa – сваю залю, дом, а то й царкву. Людзі, што ўлажылі ў гэты дом грошы, лічаць яго сваім агульным, гуртуюцца каля яго, дом іх зьвязвае, ён іх грамадзкая гордасьць. Так ёсьць усюды. Калі вы ўжо ўзнаўляеце арганізацыю, плянуйце адразу набыцьцё дому з царквой. Ня пужайцеся гэтых вялікіх плянаў, гэта на даўжэйшую мэту, а бяз мэты няма арганізацыі. Хто не пляну е, жыве толькі сёньняшнім днём і ня мае будучыні. Так ёсьць у нашым асабістым жыцьці, так ёсьць і ў грамадзкім жыцьці. **Сусьветная Выстаўка й закватэраваньне вамі нашых суродзічаў, што прыедуць яе наведаць, дасьць вам добрую нагоду на зьбіраньне фондаў на дом.** Вы будзеце мець добрую магчымасьць спаткаць вялікі лік нашых суродзічаў і напэўна знойдзеце спосабы, як атрымаць зь іх даходы на фонд куплі дому. Апрача таго, вы можаце пусьціць сярод іх падпісныя лісты на фонд куплі дому й напэўна ніхто не адмовіцца даць ахвяру на такую важную справу. Хто прыедзе на выстаўку, той будзе мець грошы. Вам ніяк нельга не скарыстаць з такой выняткова нагоды, як Сусьветная Выстаўка, бо невядома, ці яна калі паўторыцца.

Другая крыніца на фонд куплі дому – гэта звароты тых ахвяр, якія былі ўложаны ў праданы пляц. Сяньня гэтыя сумы ня ёсьць ужо надта вельмі важнымі для калішніх ахвярадаўцаў. Грошы патанелі, а людзі пабагацелі. З другога боку напэўна ў тых ахвярадаўцаў камянём ляжаць на сумленьні тыя грошы, якія яны атрымалі ад прадажы таго пляцу. Асабіста яны шмат не скарысталі, а грамадзкая справа пацярпела. Я перакананы, што яны зноў ахвяруюць тыя сумы, каб быць у згодзе і з сваім сумленьнем, і зь беларускай справай. Зьвярнецеся да іх – дзе-б яны ня былі – у Канадзе, ці ў ЗША, і яны напэўна прышлюць вам гэтыя ахвяры, калі правядзеце гэтыя мерапрыемствы – вынікам іх будзе значная сума на куплю дому.

Выбачайце за маю доўгую пісаніну. Гэта толькі мае разважаньні. А ці яны на часе й ці вам адпавядаюць – вы самі пабачыце.

Мы з жонкай зь вялікай удзячнасьцяй прымаем Вашы запросіны, каб у часе выстаўкі затрымацца ў Вас. Пад адным толькі варункам: мы заплацім, колькі належыцца, за пакой. Цяпер яшчэ цяжка азначыць, якія дні мы ў Вас будзем, але напэўна, калі будзем здаровы, 16, 17 і 18-га жніўня. Але аб гэтым яшчэ паразумеемся дакладней.

А цяпер бывайце здаровы. Хай жа Бог багаславіць Вас і Вашых дзетак ды дапаможа Вам у вашай добра пачатай справе.

Ваш В. Жук-Грышкевіч.

5 студзеня, 1967.

Дарагія Крыстына й Анатоль,

Вельмі вам удзячны за ліст і пажаданьні, а асабліва за адрасы. Мы сабе ўяўляем, колькі гэта было высілку, сабраць столькі адрасоў ды перапісаць іх. Здаем сабе справу, колькі гэта вымагала часу й працы. Спадзяёмся, што й сабе вы пакінулі адну копію адрасоў, бо ў вашай далейшай працы яны напэўна вам будуць патрэбны. Цэнім таксама вашу слоўнасьць: Сказалі, што зьбярэцё адрасы й прышліцё ў рэдакцыю – дык і выканалі (у рэдакцыю «Вестак з Канады» – Р. Ж.-Г.). Толькі так робіцца паважная грамадзкая праца, калі словы й абяцаньні ня кідаюцца на вецер. На ўсе прозьвішчы з адрасамі мы будзем высылаць газэту («Беларуса» – Р. Ж.-Г.).

Тут мушу зрабіць Вам і маленькую перасцярогу: Не давайце адрасы абы каму... Глядзіце, каб яны ня трапілі ў неадпаведныя рукі...

Нам трэба шукаць спосабаў, каб беларусы, што будуць прыяжджаць на Выстаўку, праходзілі праз ваш асяродак, ці каб вы мелі сутычнасьць зь імі. Гэта патрэбна з двух прычын: 1. Каб трымаць і ўзмацняць нацыянальную лучнасьць. 2. Каб выкарыстаць гэтую нагоду дзеля зьбіраньня грошы на куплю дому.

Гэты спосаб мог бы быць такі: Паразумецца з Canadian Corporation for the 1967 World Exhibition – з аддзелам закватэраваньня й сказаць ім, што ваш Liaison Officer будзе замаўляць кватэры для беларусаў, наведвальнікаў Выстаўкі. Кватэр гэтых, як відаць з прэсы, у іх будзе падрыхтавана на сотні тысяч людзей у гатэлях, матэлях і прыватных дамах па розных якасьцях і цэнах. Яны напэўна згодзяцца, каб вы былі іх агентам. Пасьля гэтага вы можаце даць абвестку ў нашу газэту, што беларусы, якія хочуць адведаць выстаўку, могуць дастаць праз вас кватэру й білет на выстаўку, калі зробяць замаўленьне пісьмова ці тэлефанічна. Можна будзе падаць цэны й варункі закватэраваньня, як яны вам будуць ведамы. Сьціраваць на замоўленыя кватэры прыехаўшых можаце вы, а як ня будзе змогі, дык дасьцё, ці перашліцё адрас. Толькі ў апошнім выпадку ня будзе асабістай сутычнасьці. Але й на гэта ёсьць выхад: каб пабачыцца з беларусамі, што прыедуць на выстаўку, варта было-б зрабіць сходку ці вечар у якімсь большым памешканьні – магчыма вечарам, у той дзень, калі будзе беларускі савецкі канцэрт. Гэта можа быць 17 жніўня. Паведаміць аб гэтым вечары можна было-б асабіста, лістоўна й праз прэсу. Будучы у вас тады, мы змаглі-б вам памагчы зарганізаваць гэты вечар.

Я ведаю, што ў вас ёсьць мала людзей да працы і зарганізаваць гэта ўсё будзе цяжкавата. Але вазьміце пад увагу, што беларусы будуць прыяжджаць на Выстаўку пераважна, калі будзе беларускі канцэрт – на 17 жніўня, ці яшчэ пару дзён. Урэшце вы можаце запрапанаваць свае ўслугі на гэтыя 3-4 дні жніўня. Абмяркуйце гэты праект. Пагаварыце ці, і як вы яго зможаце выканаць.

Вельмі добра, што вы зможаце закватэраваць 10 асоб з нашых знаёмых. Вельмі Вам удзячны. Мы з жонкай тады лічым на Вас і ня будзем шукаць кватэры, а прыедзем да Вас.

На 25-га сакавіка мы напэўна прыедзем, калі трэба, з дакладам і дэклямацыяй. Напішу аб гэтым дакладней, як паразумеемся з Галоўнай Управай ЗБК.

А цяпер жадаю Вам шмат шчасьця й памыснасьці ў Новым Годзе й яшчэ раз дзякую за супрацоўніцтва.

Ваш В. Жук-Грышкевіч»

Міжнародная выстаўка – ЭКСПО-67

Трывала Выстаўка паўгода, ад 28 красавіка да 27 кастрычніка. Займала агромную плошчу 400 гэктараў над ракой Лаўрына. Брала ў ёй удзел 62 дзяржавы, што мелі свае павільёны. Быў і савецкі павільён, але нацыянальныя рэспублікі зусім ня былі ў ім рэпрэзэнтаваны. Былі ж, пэўне экспанаты зь Беларусі, але ня было пры іх выясьненьня, зь якой рэспублікі яны паходзяць. Для наведвальніка-чыжынца ўсё гэта выглядала расейскім. У аддзеле культуры, у агульным моры кніжак, у якім пераважалі расейскія выданьні, можна было знайсці трохі, раскіданых у розных мейсцах, беларускіх кніг. Выстаўлена на асобным стэндзе і адна кніга Франьцішка Скарыны. На двох паясьняльных картачках ля кнігі, паангельску й пафранцуску, напісана: «Кніга Ёвы. Прага, 10.IX.1517. Гэта кніга Бібліі была перакладзена ў беларускую мову й надрукаваная ў Празе першым друкаром Францыскам Георгіем Скарынам (на французкай картцы: Георгіем Францыскам Скарынам). Ілюстрацыі й арнамэнты зробленыя дрэварытным спосабам. (Вартасьць кнігі – 1000 рыблёў)».

Нацыянальны мамэнт сьцёрты ня толькі на экспанатах савецкага павільёну, але й на савецкіх сувэнірах, на іх толькі адзін штамп – "Made in USSR" – «Зроблена ў Савецкім Саюзе».

Агулам уся выстаўка вельмі цікавая. Адзначае яна ня толькі стагодзьдзе Канады, але й 325-годзьдзе Мантрэалю.

(«ЭКСПО-67», «Беларус», Нью Ёрк, 122, 1967)

Беларускі Нацыянальны Дзень

на выстаўцы ў Мантрэалі заплянаваны на 17 жніўня, але пазьней быў пераложаны на 28 верасьня. З гэтае прычы-

ны шмат беларусаў Канады й ЗША, каб быць на Беларускім Дні на выстаўцы, узялі свае працоўныя водпускі й некаторыя нават пакуплялі на выстаўку білеты на 17 жніўня, прыбыць на Беларускі Дзень у верасьні ўжо не маглі.

Ды й сама праграма Беларускага Нацыянальнага Дня, абвешчаная раней у савецкай прэсе й афіцыйных камунікатах выстаўкі, была моцна звужана. Паведамлялася, што ў мастацкай частцы дня, апрача іншых выканаўцаў, возьме ўдзел Дзяржаўны Народны Хор БССР Генадзя Цітовіча й Дзяржаўная Акадэмічная Капэля БССР Рыгора Шырмы. Вялікі беларускі канцэрт меўся адбыцца 17 жніўня ў вадным з найбольшых тэатраў Мантрэалю. Аказалася, што ані Дзяржаўны Хор Цітовіча, ані Акадэмічная Капэля Шырмы ў Мантрэалі ня выступаюць, быццам з тае прычыны, што ўрад БССР ня ў стане аплаціць паездкі вялікай групы людзей, ды што вялікага беларускага канцэрту ў Мантрэалі ня будзе.

Хоць Беларускі Дзень на Выстаўцы афіцыйна адзначаўся ў чацьвер 28 верасьня, то канцэртныя беларускія праграмы адбываліся ў савецкім павільёне ад аўторка 26 верасьня й да аўторка 3 кастрычніка.

У часе беларускага тыдня праводзілася палітычная тэндэнцыя, што Беларусь поўнасьцьцю незалежная сувэрэнная дзяржава й мае неабмежаваныя магчымасьці разьвіцьця свае эканомікі й нацыянальнай культуры.

Гэтак старшыня Савету Міністраў БССР Ц. Кісялёў ува ўсіх сваіх прамовах і на прэсавай канфэрэнцыі 26 верасьня, і на афіцыйным адчыненьні Беларускага Дня на Пляцы Нацыяў 28 верасьня, на афіцыйным урачыстым канцэрце гэтага-ж дня выступаў вылучна ў беларускай мове, што тут жа перакладалася на ангельскую і французскую мову.

У савецкім павільёне распаўсюджвалася ў гэтыя дні інфармацыйна-прапагандовая брашура «Савецкая Беларусь» у беларускай, ангельскай і французскай мове. Распаўсюджваўся таксама адумысловы нумар, прысьвечаны Савецкай Беларусі, у французскай і ангельскай мове "The Moscow News." Распаўсюджваліся гэтаксама адумысловыя люксусовыя выданьні менскіх беларускамоўных газэтаў – «Літаратура й Мастацтва», «Зьвязда» й «Чырвоная Зьмена».

Прэсавая канфэрэнцыя

У сваёй прамове на прэсавай канфэрэнцыі Ц. Кісялёў асабліва моцна падчыркваў, што Беларусь быццам сувэрэнная дзяржава. «Маем свой урад, свой дзяржаўны гімн, свой сьцяг, зьяўляемся сябрамі й заснавальнікамі Арганізацыі Задзіночаных Нацыяў і заўсёды выступаем ў вабароне міру,» – закончыў сваю прамову Кісялёў.

Але раптам і Кісялёва й усю дэлегацыю БССР спаткала клапатлівая няпрыемнасьць. Як толькі Кісялёў скончыў сваю прамову, адзін з прысутных у залі беларусаў із ЗША, сп. Ян Запруднік, зьвярнуўся ў ангельскай мове, каб уся аўдыторыя залі разумела, да сяброў урадавай дэлегацыі сп-ні Галены Рамановіч, старшыні Беларускага Адзелу Таварыства Дружбы й культурных сувязей з замежнымі краінамі, да сп. Станіслава Пілатовіча – Сакратара ЦК КПБ і сп. Максіма Танка – першага сакратара Саюзу Пісьменьнікаў БССР, просячы іх адказаць на наступныя пытаньні: «Як вытлумачыць факт, што ў Беларусі, у якой дзевяць мільёнаў жыхароў і тысячы нацыянальнай інтэлігенцыі, ня выдаюцца слоўнікі замежных моваў, што беларускія гісторыкі, не зважаючы на дамаганьні, ня маюць права выдаваць свой гістарычны часапіс, як ня маюць права выдаваць свайго часапісу й беларускія філялёгі, што беларусы ня маюць навет свайго календара ў беларускай мове? І ці гэта праўда, як часамі пішуць на Захадзе, што беларусы забываюцца родную мову ў выніку напорыстай і сыстэматычнай кампаніі русыфікацыі?»

Хоць пытаньне было ськіваванае да асобаў, якія маюць беспасрэднае дачыненьне да беларускае культуры, адказаў на яго сам Кісялёў. Ён заявіў, што пытаньне, ськіваванае да дэлегацыі БССР, зусім неабгрунтаванае. Ён цьвердзіў, што беларускі народ мае дзьве родныя мовы – расейскую й беларускую, ды ня гледзячы на гэта, школьніцтва ў БССР вядзецца пераважна на беларускай мове, 70% кніжнае прадукцыі выдаецца на беларускай мове. Як прыклад таго, што жыхары БССР незалежна ад іхняй нацыянальнасьці валодаюць і расейскай і беларускай мовай, ён паказаў на аднаго із сяброў дэлегацыі праф. Шмыгава, што ён расеец, вучыўся ў расейскай школе й добра знае беларускую мову, аб чым запытальнік можа сам пераканацца.

Адразу пасьля гэтага іншы прысутны на залі беларус, др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч з Канады, задаў Кісялёву, гэ-

таксама ў ангельскай мове, два наступныя пытаньні: «Чаму савецкая статыстыка не падае ніякіх дадзеных аб колькасьці беларускіх школ у БССР, і ад якога гэта часу расейская мова ўважаецца за другую матчыную мову беларусаў?»

На пытаньне, ад якога гэта часу расейская мова зьяўляецца другой матчынай мовай беларусаў, Кісялёў адказаў з аплёмбам – ЗАЎСЁДЫ! На другое пытаньне, чаму савецкая статыстыка не падае дадзеных аб колькасьці беларускіх школ у БССР, Кісялёў адказаў, што адказваць на гэтае пытаньне, гэта тое самае, што падымаць муху пад'ёмным кранам. У голасе Кісялёва гучэла злосьць і нянавісьць, ці да ўсяго беларускага, ці да тых беларусаў, якія ў вабароне роднай мовы й свайго паняволенага краю сьмеюць выкрываць ягоную ілжу, і ілжу ўсяе савецкае сыстэмы. Ня мейсца было на прэсавай канфэрэнцыі адказваць Кісялёву, але др. В. Жук-Грышкевіч даў яму адказ у «Вестках з Канады» – «Беларус», 126, 1967, у артыкулах: «На ЭКСПО-67 Кісялёў перасаліў» і «Беларускае школьніцтва і... муха».

«І прыкрай было неспадзеўкай для дэлегацыі БССР, калі на Беларускі Дзень на тэрыторыі ўсяе Выстаўкі, нават у павільёнах іншых краін, на пляцох для паркаваньня, у цягнікох, што развозілі гледачоў у розныя часткі Выстаўкі, паміж савецкімі інфармацыйнымі брашурамі й газэтамі зьявіліся тысячы друкаваных у ангельскай і французскай мовах зваротаў, падпісаных Інфармацыйным Бюром Беларускай Народнай Рэспублікі ў экзылі, у якіх прыводзіліся канкрэтныя факты русыфікацыі й эканамічнай экспляатацыі Беларусі чырвонай Масквой. Яшчэ большае выклікала зьдзіўленьне тое, калі звароты гэтыя былі надрукаваны й у вельмі пашыранай англямоўнай газэце "The Montreal Star" аж ува ўсіх трох ейных выпусках у дзень 28 верасьня...

Побач з многімі ценямі, Беларускі Нацыянальны Дзень у Мантреалі меў і свае бязспрэчныя блескі. Да іх перш-наперш трэба залічыць беларускія канцэрты, і гэта незалежна навет ад таго, што яны былі вельмі звужаны сваімі праграмамі, абсягам і колькасьцьцю выканальнікаў з прычыны няпрыезду хору Цітовіча й капэлі Шырмы ды адсутнасьці ансамблю народных танцаў».

(«Беларускі Нацыянальны Дзень на ЭКСПО-67», «Беларус», 126, 1967)

Каб быць на прэсавай канфэрэнцыі, др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч, др. Станіслаў Станкевіч, рэдактар газэты «Беларус», (у пазьнейшых гадох) др. Ян Запруднік, сп. Алесь Грыцук і аўтар гэтых радкоў прыехалі на ЭКСПО-67 у панядзелак, 25 верасьня, тры дні перад Беларускім Днём 28 верасьня. У аўторак была прэсканфэрэнцыя, аб якой была мова вышэй, канцэрт і кактэйль, на які нас запрасілі й на якім мы спаткаліся з Максімам Танкам. Пагаварыць зь ім мы не маглі, бо яго вельмі хутка ад нас забралі.

У сераду сарганізавалі мы распаўсюджваньне апублікаванага нашым стараньнем ў Мантрэальскай газэце звароту – "Fact Sheet" – Інфармацыйнага Бюра Беларускай Народнай Рэспублікі. Думку выданьня такога звароту падаў у прысутнасьці др. Янкі Запрудніка, які перад выездам у Мантрэаль заехаў да нас у Бэры, др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч. Др. Янка Запруднік, з добрай ведай ангельскай і французскай мовы, зрэдагаваў тэкст звароту у абедзвюх мовах. Тут падаем тэкст звароту паагнельску:

"BYELORUSSIAN BRAINWASHING AT EXPO 67?

To save Expo visitors from the charge that they were brainwashed at the Byelorussian Day festivities on September 28, 1967, we offer the following:

– FACT SHEET –

1. The Byelorussian Soviet Socialist Republic was created by the Russian Bolsheviks in January 1919 not to show goodwill but to subvert the aspirations of the Byelorussian people, who had proclaimed their own independent Byelorussian Democratic Republic in March 1918.

2. One-third of the Byelorussian ethnic territory has been sliced off the Byelorussian Soviet Republic and distributed according to Moscow's designs, mainly in favor of the Russian Republic.

3. The practices of genocide and deportations by the Soviet Russian regime in Byelorussia have amounted to a loss of 9 million Byelorussians, as shown in the book "Population of the Byelorussian SSR in the Light of the 1959 Census" (Whiteruthenian Institute of Arts and Sciences, New York, 1962).

4. Russians occupy all power positions in the Byelorussian Republic – usually the number two spot – and give orders to the Byelorussian nationals in the top posts.

5. The Byelorussian economy is being drained of its wealth. The standard of living in Byelorussia has been considerably lower than in the Russian parts of the Soviet Union. Byelorussia has been turned into the source of man-power to build the Russian empire in Siberia and Soviet Central Asia.

6. The Soviet regime in Byelorussia is conducting a systematic russification campaign:

a) The Byelorussian language has been almost completely eliminated from official use in administration, in higher education, in secondary schools, and in a large number of elementary schools.

b) Of the 12 professional theatres in the Byelorussian Republic, all but three perform in Russian.

c) Byelorussian language publishing has been limited almost exclusively to poetry, fiction, and propaganda publications.

d) The Soviet cultural overseers order small printings for Byelorussian periodicals and books, ignoring consumer protests. The principal literary magazine of Byelorussian writers, *Polymya,* does not exceed 8,000 copies while its Russian counterpart in the Republic, *Nyeman,* spills over with 12,000 copies of each issue. A recently published new work, the 2-volume *Grammar of the Byelorussian Language,* was published in 1,600 copies – in a republic of 8.8 million people of whom 80 percent are Byelorussians! "Free" Byelorussians have not even succeeded, in spite of many attempts, to publish a simple calendar in their own language.

e) Byelorussian philologists have not the right to compile and publish dictionaries of foreign languages or even a dictionary of their own language. The "sovereign" Byelorussian Republic has managed to publish only Russian-Byelorussian and Byelorussian-Russian dictionaries.

f) Byelorussian historians still don't have the right to publish their own historical review. Russian colonizers do everything possible to keep the Byelorussian people in ignorance about their past freedom in the Grand Duchy of Lithuania, as Byelorussia was called in XIV-XVIII centuries.

g) Millions of Byelorussians living outside of the Byelorussian Soviet Republic in the Soviet Union are not allowed to organize their own cultural groups.

7. With the exception of its membership in the United Nations (where it docilely follows Moscow's line) the so called independent Byelorussian Soviet Republic does not maintain diplomatic representation in a single capital of the world; nor does any foreign country have its mission in Byelorussia's capital of Minsk.

Contrary to the public efforts by the Communist rulers of the Soviet Union, the facts (hundreds of them) show Byelorussia – despite its tinsel ornaments of nominal statehood and sovereignty – to be a modernized colony of the Russian imperialism.

September, 1967.

Information Bureau of the Rada (Council) of the
Byelorussian Democratic Republic in Exile.

HELP STAMP OUT BRAINWASHING – PASS THE FACT SHEET ON TO A BRAINWASHED FRIEND."

Гэткі вось зварот быў апублікаваны ў газэце "The Montreal Star," Thursday, September 28, 1967, аж у трох яе выданьнях і ў форме лістовак вельмі шырака (хоць і нелягальна) пашыраны ў савецкім ды іншых павільёнах Выстаўкі.

У савецкім павільёне пазнаёміліся мы з трома беларусамі з БССР, якія, як сіямскія – не двайняты – а трайняты, заўсёды хадзілі неразьдзельна разам. Адзін зь іх быў гісторык з Заходняй Беларусі. Гутарылі яны добра пабеларуску й былі прыемнымі субяседнікамі. Мы ведалі, што ім дадзенае было заданьне «пільнаваць» нас, можа што цікавага ад нас даведацца, можа мець на нас які ўплыў, а з другога боку, яны павінны былі адзін за другім сачыць, каб каторы зь іх не падпаў пад наш уплыў і ня высьлізгнуўся з пад партыйнай дысцыпліны.

27 й 28 верасьня, на Беларускі Дзень, прыехала шмат беларусаў з Канады й ЗША. На гэты дзень мы ўзялі з сабой шмат беларускіх кніг, выданых на эміграцыі, я прынесла здымкі з Выстаўкі Старога Беларускага Друку й урачыстага сходу сьвяткаваньня 450-х Угодкаў Беларускага Друку, што адбылося ў Таронта ў Канадзе. Кажу сваім новым знаёмым з БССР: «Хацела бы вам нешта паказаць, ня ведаю, ці хочаце бачыць?» – «Чаму не!» – адказваюць.

Доўга разглядалі фатаграфіі, як і кожнага асобна сфатаграфаванага гнязда выстаўкі, гэтак і ўдзельнікаў сходу. Часам пыталіся – хто гэта, або – гэта? Кажам: Сьвятар Беларускай Аўтакэфальнай Праваслаўнай Царквы, а гэта канадзкі высокі ўрадавец з жонкай.» Не выпускаючы з рук і ўсё й усё разглядаючы фатаргафіі выстаўкі, адзін зь іх кажа: «Каб ня гэтыя нацыянальныя эмблемы – а быліж там і бел-чырвона-белы сьцяг і Пагоня – было-б зусім, як у нас...»

Тут др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч паказвае кнігі Сымона Брагі – др. Вітаўта Тумаша – «Лякалізацыя жыцьцяпісу доктара Франьцішка Скарыны», «Пытаньне імя др. Франьцішка Скарыны», «Скарына ў Маскве» – і кажа: «У нас ёсьць выдатны навуковы дасьледчык, што ўжо даўно працуе над Скарыніянай.» – «Больш за дзесяць гадоў!» – дадае др. Мікола Шчорс. Др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч прапануе нашым новым знаёмым, як падарак, гэтыя кнігі. Вельмі няпэўна й асьцярожна, бо-ж няведама, што другія два на гэта скажуць – адзін зь іх – гісторык – узяў падарак і падзякаваў. Наагул вельмі шмат беларускіх кніжак эміграцыйнага выданьня мы далі ня толькі гэтым тром, але й іншым удзельнікам дэлегацыі з БССР. Але, як пазьней весткі нясьлі, ніводнае з гэтых кніг яны ў БССР з сабой узяць не маглі. Кнігі тут былі, як некалі Скарынавая Біблія ў Маскве, зьнішчаны або забрала іх НКВД.

Спадарыня Ала Курыла наракала перад прадстаўнікамі з БССР, што дзеля зьмененай даты Беларускага Дня, ейныя дзеці, ужо роджаныя ў Амэрыцы, дзеля школьнага часу, не маглі быць на Беларускім Дні, «а яны-ж у Беларусі ніколі ня былі». Запрашалі нас прыехаць у Мінск. Мы ім адказалі, што ў Мінск ня прыедзем, але ў МЕНСК, калі ён будзе беларускім – прыедзем.

Даведаўшыся аб лістоўках – звароце Інфармацыйнага Бюра Рады БНР – пашыраных у павільёне, ды аб тым, што ён надрукаваны й у газэце, нашыя знаёмыя з БССР не захацелі больш з намі гаварыць.

Пасьля Беларускага Дня мы разьехаліся дамоў. Ды дэлегацыя з БССР яшчэ засталася й праводзіла сярод беларусаў Мантрэалю сваю дэструктыўную работу. Нагаварвалі, ды й застрашвалі людзей, каб трымаліся здалёк беларускіх арганізацый, а жылі сваім спакойным жыцьцём. Адзін чалавек расказваў: «Прыйшлі да нас (звычайных работнікаў) – і кажуць: «Во, халадзільнік стаіць, але што ў

халадзільніку?» – Кажам: паглядзеце! – Быў гэта якраз дзень, што мы зрабілі закупы на цэлы тыдзень, і халадзільнік быў перапоўнены».

Ды савецкая прапаганда падзеіла. Беларуская арганізацыя ў Мантрэалі ніколі ня была асабліва моцнай. На наступны год беларусы Мантрэалю, ня гледзячы на пераконваньні старшыні Каардынацыйнага Камітэтыу Беларусаў Канады др. В. Жук-Грышкевіча, адмовіліся сьвяткаваць 25 Сакавіка – залаты яго юбілей...

Аб гэтай варожай прапагандзе, спосабу яе праводжаньня, як у часе ЭКСПО-67, гэтак і заўсёды, як мы павінны зь ёй змагацца, Вінцэнт Жук-Грышкевіч гаворыць у артыкуле: «Прынцып ‹Юніты ін Дывэрсіты› і Беларусы». Савецкай прапагандзе ў Канадзе дае ён адпор у артыкуле «Беларусаў дзеляць на нацыяналістых і... расейцаў». Аб падрыўной камуністычнай дзейнасьці ў Канадзе гаворыць ён у артыкуле «Камуністы рыхтуюць Ветнам у Канадзе». (Глядзі Разьдзел XVI) («Весткі з Канады» – «Беларус», 128, 1967)

«На ЭКСПО-67 Кісялёў перасаліў

‹Расейская мова – другая родная мова беларусаў›. Так сказаў прэм'ер БССР Ціхан Кісялёў на прэсавай канфэрэнцыі пры адчыненьні Дня Беларусі на ЭКСПО 67. На пытаньне-ж др. В. Жук-Грышкевіча з залі: ‹Ад якога гэта часу расейская мова ўважаецца за другую родную мову беларусаў›, – прэм'ер Кісялёў адказаў з аплёмбам: ЗАЎСЁДЫ. Разгледзім-жа, як гэтая справа выглядае ў запраўднасьці.

1. Цьверджаньне, што расейская мова ёсьць другой роднай мовай беларусаў, недарэчнае ў сваёй істотнасьці, бо ня можа быць дзьвюх родных моваў, так як ня можа быць у дзіцяці дзьвюх родных матак. Родная мова ёсьць матчына мова, так як яна гучэла ў ангельскай вэрсіі ў пытаньні й адказе на прэсавай канфэрэнцыі – "mother tongue", гэта значa, тая мова, на якой матка вучыць вымаўляць першыя словы сваё дзіця. Такое разуменьне паняцьця РОДНАЯ МОВА прынята ўва ўсім сьвеце. Так яно разумеецца й ува ўсіх статыстыках улучна із савецкай.

2. Адказ Кісялёва, што расейская мова была заўсёды другой роднай мовай для беларусаў, тым больш недарэч-

ны. Навет калі дапусьціць тэарэтычную магчымасьць існаваньня дзьвюх родных моваў наагул, дык для беларусаў расейская мова не магла быць другой роднай мовай **заўсёды** ўжо дзеля таго, што толькі пры самым канцы 18-га стагодзьдзя Беларусь была забраная Расеяй, а перад гэтым беларускі народ у сваёй масе на працягу вякоў ня меў беспасярэдняй сутычнасьці ні з Расеяй, ні з расейскай мовай. І калі хто ад каго вучыўся – дык не беларусы ад расейцаў, а наадварот, расейцы ад беларусаў: і ад Франьцішка Скарыны, і ад Сымона Полацкага й шмат ад якіх іншых беларускіх вучоных.

3. Афіцыйна ўрад Савецкага Саюзу не накідае расейскае мовы, як другой роднай мовы, хоць у штодзённай практыцы русыфікацыя Беларусі праводзіцца поўнай парай. У савецкай статыстыцы зь перапісаў насельніцтва СССР у 1959 годзе няма тэрміну другая родная мова. Гэтая статыстыка падае, што лік беларусаў ува ўсім Савецкім Саюзе выносіць наагул 7, 913.488, а зь беларускай мовай, як роднай мовай – 6,952.123. Дзеля таго, што лік беларусаў ў БССР выносіць 6,532.035 – з гэтага вынікае, што беларускую мову, як родную мову, савецкая статыстыка падае ня толькі для беларусаў у БССР, але й для 420,088 тых беларусаў, што жывуць у іншых частках Савецкага Саюзу.

Чаму-ж тады прэм'ер Кісялёў уводзіць новы тэрмін – другая родная мова й як такую накідае беларусам расейскую мову? Навет палякі, якія накідалі беларусам у Заходняй Беларусі польскую мову, ніколі не казалі, што гэта мова ёсьць другой роднай мовай для беларусаў.

Прынцып роўнасьці ўсіх нацыянальнасьцяў, як і канстытуцыя, існуюць у Савецкім Саюзе толькі на паперы. У практыцы яны парушаюцца на кажным кроку, бо ў жыцьці праводзіцца тая партыйная лінія, якая карысная для расейскай савецкай імпэрыі, хоць яна й пярэчыць як прынцыпам свабоды, так і самой канстытуцыі. Усім нам ведама, што кіраўніцтва партыі намагаецца стварыць з народаў Савецкага Саюзу адзіную, аднамоўную (расейскую) савецкуюэ нацыю. Такой думкі, відаць, і стаўленьнік Масквы прэм'ер БССР Кісялёў. Дык ягонае цьверджаньне, што расейская мова ёсьць другой роднай мовай для беларусаў, зусім згоднае з партыйнай лініяй русыфікацыі беларусаў, як і іншых нерасейскіх народаў. Толькі Кісялёў забыўся, што прамаўляў не ў савецкім Менску ці

Маскве, а ў вольным Мантрэалі. У савецкім Менску ягонае цьверджаньне, што расейская мова ёсьць другой роднай мовай для беларусаў, было-б спатканае энтузыястычнымі воплескамі маскоўскіх падхалімаў. А ў вольным Мантрэалі гэтае цьверджаньне выклікала канстэрнацыю. Тут Кісялёў перасаліў. **В.**» (Адзін з псэўдонімаў В. Жук-Грышкевіча)

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 126, 1967.)

«Беларускае школьніцтва і... муха

Хвалячыся дасягненьнямі Савецкай Беларусі на прэсавай канфэрэнцыі ў Мантрэалі, прэм'ер БССР Ц. Кісялёў гаварыў таксама аб школьніцтве й выдавецтве. Ён цьвердзіў, што ў БССР 80 працэнтаў беларускіх школ (злыя языкі кажуць, што ў Менску няма ніводнай чыста беларускай школы) і што 70 працэнтаў кніг выдаецца на беларускай мове. Для кажнай сувэрэннай дзяржавы гэтыя лікі былі-б нармальнымі й імі ня трэба было-б хваліцца. Яны можа навет за малыя, бо як ніяк, паводля савецкай статыстыкі, у БССР жыве 81 працэнт беларусаў. Але, дзеля таго, што й гэтыя лічбы Кісялёў падаваў, як вяліке асягненьне, аўдыторыя прыняла іх з пэўнай дозай зьдзіўленьня й недаверу.

Для беларусаў-жа, прысутных на прэсавай канфэрэнцыі, паданыя лікі гучэлі, як самая звычайная хлусьня, бо і зь лістоў ад радні, і з савецкай прэсы яны ведаюць, што беларускія школы ў загоне, што з кажным годам іх лік зьмяншаецца на карысьць расейскіх школ і што навет тыя школы, якія фармальна называюцца беларускімі, фактычна расейскія, бо ў іх усе прадметы выкладаюцца парасейску, а беларуская мова абмежаваная да мінімальнага ліку гадзін. Гэта датычыць перадусім гарадзкіх школаў. Кісялёў мог падаваць свае хвальшывыя працэнты сьмела, не заікаючыся, ён ведаў, што ўжо ад даўжэйшага часу савецкая статыстыка не падае ані лічбы ці працэнтаў беларускіх школ у БССР, ані лічбаў ці працэнтаў выдавецтва беларускіх кніжак.

Др. В. Жук (Жук-Грышкевіч, Р.Ж-Г) задаў Кісялёву пытаньне, чаму савецкая статыстыка не падае ніякіх дадзеных аб колькасьці беларускіх школ у БССР? – Адказ Кісялёва быў штонайменш дзіўны. Ён сказаў, што адказ-

ваць на гэтае пытаньне – гэта тое самае, што падымаць муху пад'ёмным кранам.

Што ён разумеў пад мухай? Ці беларускую мову, ці беларускае школьніцтва, ці беларускую нацыянальную праблему наагул? Магчыма, што ў савецкай практыцы, наперакор тэорыі, усе гэтыя праблемы сапраўды такія нязначныя, як муха, але для беларусаў адказ Кісялёва гучэў, як ігнараваньне беларускай справы, як нацыянальная абраза. Ён збыў такое істотнае пытаньне, як беларускае школьніцтва, звычайнай кпінай, чым выклікаў зьдзіўленьне ў канадзкіх журналістых і шырэйшай публікі, ды абурэньне ў беларусаў.

Шкада, што задаваньне пытаньняў было абмежанае, а дыскусія не прадбачвалася. Зразумела чаму. У Канадзе, як і ў эўрапэйскіх рознамоўных краінах, статыстыка падае дакладна лічбы школ усіх нацыянальнасьцяў, а для Кісялёва гэта справа такой самай важнасьці, як муха. Рэч ясная, што прэм'еру Савецкай Беларусі Кісялёву не залежыць на існаваньні беларускіх школ, хоць гэта гучыць парадаксальна. Яму залежыць на русыфікацыі Беларусі, на тварэньні адзінай савецкай нацыі.

Даўней, у 20-тых гадох савецкі друк падаваў з натхненьнем вестку аб адкрыцьці кажнай беларускай школы, а савецкая статыстыка вылічвала старанна лічбы ўсіх тыпаў беларускіх школ. Выхвалялася – і цяпер яшчэ часамі выхвальваецца – слаўнае змаганьне за родную беларускую школу на чале з ТБШ у Заходняй Беларусі пад Польшчай. А сяньня ў «аб'яднанай» «сувэрэннай» Савецкай Беларусі прэм'ер яе Ціхан Кісялёў зводзіць справу беларускага школьніцтва да мухі. **В.**»

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 126, 1967.)

XVIII. 1968 ГОД – ГОД ЗАЛАТОГА ЮБІЛЕЮ БНР

БНР – спадчына ўсіх беларусаў
(Артыкул В. Жук-Грышкевіча)

«Беларуская Народная Рэспубліка паўстала з волі беларускага народу, выяўленай на Першым Усебеларускім Кангрэсе ў канцы сьнежня 1917 году. Абвесьціла-ж незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі Трэйцяй Устаўной Гаматай 25 сакавіка 1918 году Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, выбраная Першым Усебеларускім Кангрэсам. Рада гэта, апрача трэйцяй, выдала першую й другую Ўстаўную Грамату. Гэтыя тры Ўстаўныя Граматы далі беларускаму народу дзяржаўную незалежнасьць у этнаграфічных межах, усе дэмакратычныя свабоды, нацыянальную й сацыяльную справядлівасьць ды роўнасьць усіх грамадзян перад правам.

Бальшавіцкія акупанты чырвонай Масквы зьнішчылі БНР, а на яе месца ўстанавілі сваю таталітарную БССР у межах палавіны беларускай этнаграфічнай тэрыторыі. Яны скасавалі ўсе дэмакратычныя свабоды БНР ды ўвялі паліцыйны тэрор, а вольных сялян, што былі гаспадарамі на сваіх землях, загналі ў калгасную паншчыну.

Волялюбны беларускі народ ніколі не пагодзіцца з панаваньнем бальшавіцкіх акупантаў, ён будзе змагацца зь імі аж да канца – пакуль ня вызваліцца ад іх. Але калі мы ненавідзім чужую накінутую нам сілай уладу й хочам пазбыцца яе, дык мусім ведаць, чаго мы хочам узамен яе.

Адказ тут можа быць толькі адзін. Мы хочам БНР у яе этнаграфічных межах замест таталітарнай, куртатай БССР. Мы хочам – усе беларусы як адзін – тэй улады й тых парадкаў у Беларусі, якія ўстанавіла 50 год таму назад Беларуская Народная Рэспубліка. БНР гэта наш агульнабеларускі ідэал, гэта мэта нашага змаганьня на працягу 50 год і далейшага змаганьня аж да перамогі.

Але на працягу 50-ці год змаганьня мы змушаны былі перажыць розныя эпізоды акупацыі Беларусі, у часе якіх акупанты стараліся ашукаць і падмануць нас на розныя эпізадычныя палітычныя канцэпцыі. Палякі на пачатку

акупацыі, а таксама й бальшавікі падсоўвалі нам розныя ўступкі, каб абніжыць наш змагарны дух, каб зацьміць нашы сапраўдныя мэты ды паступова падпарадкаваць нас сабе. Таксама й гітляроўцы ў часе апошняй вайны падкідалі нам такія сякія ўступкі, каб скааптаваць нас для сваёй таталітарнай справы. А бальшавікі яшчэ й сяньня кормяць нас прапаганднымі «асягненьнямі» й «сувэрэннасьцяй» хвальшывай дзяржаўнасьці. Ці мы можам пайсьці на падступныя акупанцкія прапановы? Ці мы можам прыняць хвальшывыя акупанцкія палітычныя канцэпцыі, што як клін ськіваныя на наш суцэльны вызвольны рух?

Ніколі ў жыцьці! Свабода й дзяржаўная незалежнасьць ёсьць непадзельнымі, і ніколі шануючы сябе народ не задаволіцца толькі часткай іх. Ніколі сапраўдны патрыёта не пагодзіцца на адпадкі нацыянальнай і сацыяльнай свабоды з рукі акупанта. Ніколі не пагодзімся на акупанцкую ласку й мы – беларусы! Мы мелі сваю незалежную дзяржаву – Беларускую Народную Рэспубліку, якую забралі ў нас сілай маскоўскія бальшавікі, і мы хочам толькі Яе.

Мы добра разумеем, што нашы суродзічы на бацькаўшчыне ня могуць пад тэрорам акупанта выстаўляць адкрыта сваіх вызвольных дамаганьняў. Яны шукаюць іншых спосабаў змаганьня. Але мы – беларуская эміграцыя – вольная ад усякага націску, мы мусім быць бескампраміснымі ў сваіх дамаганьнях і дзеяньні.

Беларуская Народная Рэспубліка – гэта наш агульны ўсебеларускі дзяржаўны твор, і ніяк нельга яго падмяніць уступкам, ці хвальшыўкай дзяржаўнасьці. БНР ёсьць нашым дзяржаўным ідэалам і спадчынай для ўсіх беларусаў – і для братоў і сясьцёр нашых на бацькаўшчыне, і для нас на эміграцыі. Абставіны змаганьня за БНР на Беларусі й у эміграцыі розныя, але ідэя й мэта змаганьня ў нас тая самая.

У нашай барацьбе за вызваленьне Беларусі мы зможам асягнуць сваю мэту, злучаныя ўсе ў вадну магутную сілу толькі пад сьцягам БНР. Тут месца для ўсіх беларусаў.

В. Жук»

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 132, 1968)

* * *

Год Залатога Юбілею БНР

Як старшыня Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч зьвяртаецца на пачатку гэтага году да беларускага грамадзтва ў «Вестках з Канады» – «Беларус», 130, 1968, гэтак:

«Дарагія суродзічы беларусы!

1968 год ёсьць юбілейным годам Беларускай Народнай Рэспублікі. 50 год таму назад – 25 сакавіка 1918 году ў сталіцы Беларусі Менску была абвешчана незалежнасьць нашай рэспублікі, чым выяўлена была воля беларускага народу перад сьветам быць ні ад кога незалежным гаспадаром сваёй зямлі.

Расейскі камунізм брутальнай сілай зьнішчыў нашу сувэрэнную дзяржаву – Беларускую Народную Рэспубліку, але ня змог ён зьнішчыць волі беларускага народу быць незалежным. Таму ён мусіў стварыць гэтак званую БССР узамен БНР. Але мы ведаем добра, што БССР ня ёсьць ані дзяржавай, ані сувэрэннай, ані беларускай. Яна ёсьць маскоўскай фальшыўкай дзяржаўнасьці. Яна створана маскоўскімі камуністамі па тое, каб, пад пакрыўкай нібы «незалежнасьці», забіць волю беларускага народу да сапраўднай дзяржаўнасьці і зрусыфікаваць яго.

Аднак бальшавіцкія намаганьні спатыкаюць нязломны супраціў. За 50 год незалежніцкая ідэя ня толькі не памерла ў беларускім народзе, але расьце й мацнее. Наш народ робіць усё, што магчыма ў вабставінах бальшавіцкага таталітарнага рэжыму, каб даць адпор наступу русыфікацыі, каб узбагаціць беларускую культуру, каб захаваць беларушчыну, каб разбудаваць эканамічны дабрабыт і ўнезалежніць яго ад Масквы.

І мы – беларуская эміграцыя – можам шмат што зрабіць, каб дапамагчы нашаму народу ў яго імкненьні да незалежнасьці, бо мы жывем у вольным сьвеце й можам свабодна весьці нацыянальную работу, якая там забаронена. Мы, дзеці сваёй Маці-Беларусі, да грабовае дошкі ня можам забыцца пра наш абавязак у дачыненьні да Яе. Яна на нас чакае, каб мы працай сваёй памаглі ёй скінуць путы няволі, наложаныя ворагам, які высасвае зь Яе ўсе сокі й аграблівае з найбольшых нацыянальных скарбаў.

Хай у гэтым юбілейным годзе нашы сэрцы й думкі ськіроўваюцца да нашае супольнае Маці Беларусі, каб мы маглі, кожны з нас, даць сваё зерне працы ў нацыянальна-грамадзкую справу. Хай кожны з нас стараецца быць карысным вязьмом у беларускай арганізацыі, а тыя, што несарганізаваныя – хай паступяць у арганізацыю.

Хай кожны з нас пастановіць, што ў гэтым годзе будзе старацца кіраваць свае думкі і чыны на тое, каб мець на ўвеце перадусім дабро беларускае справы, а не асабістыя амбіцыі, выгоды, прыватныя сымпатыі ці антыпатыі.

Хай кожны з нас прыйме ўдзел у сьвяткаваньні залатога юбілею беларускай дзяржаўнасьці ў дзень 25-га Сакавіка й дапаможа ў арганізацыі гэтага сьвяткаваньня.

Выканайма свой грамадзкі й нацыянальны абавязак усе як адзін!

Каардынацыйны Камітэт Беларусаў Канады»

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 130, 1968)

У тым самым нумары газэты Вінцэнт Жук-Грышкевіч вітае з залатым юбілеем УНР і ўкраінцаў, прысьвячаючы ім з гэтай нагоды ўспамін – «Слава Украіне!». (Артыкул «Слава Украіне!» быў высланы ў рэдакцыю «Беларуса» загадзя, для зьмяшчэньня яго ў студзеньскім нумары газэты, калі ўкраінцы сьвяткуюць свой дзень незалежнасьці, але зь незалежных ад «Вестак з Канады» прычынаў ён быў зьмешчаны ў лютаўскім нумары).

Аб сустрэчы Старшыні Рады БНР інж. Міколы Абрамчыка зь беларускім грамадзтвам у БР-ГЦ у Таронта В. Жук-Грышкевіч піша ў 131 нумары «Вестак з Канады» ў артыкуле: «Прэзыдэнт Рады БНР у Канадзе.»

«Прэзыдэнт Рады БНР У Канадзе

4 лютага 1968 году стараньнем Галоўнай Управы ЗБК й Тарантонскага аддзелу адбылася сустрэча Прэзыдэнта Рады БНР інж. Міколы Абрамчыка зь беларускім грамадзтвам у Беларускім Рэлігійна-Грамадзкім Цэнтры ў Таронта. За бяседным сталом віталі паважанага гасьця старшыні й прадстаўнікі ад усіх арганізацыяў Беларускага Цэнтру.

Ад ЗБК вітаў Спадара Прэзыдэнта старшыня Гал. Управы сп. Мікола Ганько, ад Канадзкага Сэктару Рады

БНР др. В. Жук-Грышкевіч, ад прыходу БАПЦ айцец Архімандрыт Мікалай, ад Царкоўнай Рады сп. Уладзімер Целеш, ад ЗБЖК сп-ня Надзя Барановіч, якая з прывітаньнямі ўручыла сп. Прэзыдэнту падарак ад усіх прысутных, ад арганізацыі беларускае моладзі сп. Б. Кірка, і ад «Пагоні» сп. К. Акула.

Сп. Прэзыдэнт пачаў сваю прамову ў вадказ на выказваньні прадстаўнікоў розных арганізацыяў заўвагай, што ён не пагаджаецца з пэсымізмам некаторых прамоўцаў і лічыць за перавышаную тую характэрыстыку, якую даў яму др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч. Да рэчы, др. В. Жук-Грышкевіч знае сп. Прэзыдэнта яшчэ з студэнцкіх часоў у Празе Чэскай, дзе яны вучыліся ў 20-х гадох і былі сябрамі беларускай студэнцкай арганізацыі, а пасьля ня раз супрацоўнічалі разам.

Вяртаючыся да сваёй тэмы, сп. Прэзыдэнт на ноту пэсымізму адказаў, што беларуская вызвольная справа ніколі дагэтуль ня была ў лепшым стане, як цяпер. Важна толькі, каб гэты стан утрымаць на адпаведнай вышыні. – Пасьля Першае сусьветнае вайны із сьведамай палітычнай беларускай эміграцыі былі лічаныя адзінкі, беларуская справа ў палітычных колах Захаду была амаль няведамай, Беларусь была падзелена й вынішчалася двума акупантамі

Цяпер Беларусь, хоць і знаходзіцца ў ціскох прымусовай русыфікацыі й задзіночаная адміністрацыйна, але падлягае аднаму акупанту й мае масавыя сьведамыя інтэлігэнцкія кадры, якія ўсьцяж растуць і змагаюцца за правы роднае мовы, за правы сваей гістарычнай спадчыны, за правы да жыцьця беларускага народу. У гэтым змаганьні дапамагае беларускаму народу на бацькаўшчыне вольная й сьведамая палітычная беларуская эміграцыя, якая мае свае асяродкі ў ЗША, Канадзе, Аўстраліі, у розных краінах Эўропы, як Ангельшчына, Францыя, Нямеччына, Бэльгія, Італія й Гішпанія. У палітычным жыцьці Захаду беларуская справа сталася ведамай справай, міжнароднай справай. Хоць беларуская дэлегацыя ў Задзіночаных Нацыях фікцыйная й ідзе на павадку Масквы, але ўсё-ж імя Беларусі фігуруе ў гэтай міжнароднай арганізацыі, таксама як і ў ЮНЭСКО.

А ў эміграцыі – Рада БНР належыць да Лігі Вызваленьня Народаў Савецкага Саюзу (Парыскі блёк, старшынём якога ёсьць Прэзыдэнт Абрамчык на працягу ўжо 15 год, – Ж.), што змагаецца за правы гэтых народаў.

Дзякуючы стараньням Рады БНР, ад 1954 году існуе ў радыё «Свабода» Беларуская Сэкцыя, якая перадае сваю паўгадзінную праграму на Беларусь штодзень на працягу 24 гадзін. Існуе таксама Беларуская Сэкцыя ў Інстытуце Вывучэньня Савецкага Саюзу ў Мюнхэне, які ведамы сваімі выданьнямі аб СССР і Беларусі. Ёсьць і іншыя выдавецтвы аб Беларусі (напр. у Ангельшчыне) паміма сьціплага выдавецтва й прэсы нашай эміграцыі. Не дарма-ж савецкая прапаганда ад найдаўжэйшага часу вядзе змаганьне зь беларускай эміграцыяй.

Дык няма ніякіх прычынаў да пэсымізму. Трэба толькі дбаць пра тое, каб беларуская эміграцыя была актыўнай і разбудоўвала ды паляпшала сваё арганізацыйнае жыцьцё, трэба дбаць пра тое, каб беларуская справа ня зыходзіла з сумленьня кажнага беларуса.

Далей, на просьбу прысутных, Прэзыдэнт Абрамчык расказаў пра жыцьцё й працу беларускае эміграцыі ў Эўропе. **Ж.**»

«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 131, 1968)

«Слава Украіне!

Вясна 1917 году. У нашай хаце ў малым мястэчку Вялейшчыны дзьверы амаль не зачыняюцца ад прыходзячых і выходзячых жаўнераў. У нас кватэруе канцылярыя Радыятэлеграфічнага Дывізіёну, а ў мястэчку стаіць штаб арміі. Днём у канцылярыі бывае шмат розных інтэрасантаў, а вечарам прыходзяць сябры да жаўнераў, што сьпяць у нашай хаце.

Фронт стаў на лініі Дзьвінск, вазёры Мядзел – Нарач, Баранавічы, ужо з год таму ня рухаецца. Ад нас да фронту па простай лініі каля 30 кілямэтраў. Мы ў прыфрантовай паласе, якая даслоўна заваленая расейскім войскам.

Жаўнеры й мясцовае насельніцтва звыкліся з прыфратовай сытуацыяй і, здавалася-б, забыліся пра вайну. Яны занятыя цяпер рэвалюцыяй, якая выбухла тры месяцы таму, іх цікавіць, што будзе з Расеяй, што будзе зь іхнімі краінамі, які лёс іх саміх. Амаль кожны дзень ёсьць мітынг на рынку або ў тэатральным бараку. Прамаўляюць прадстаўнікі ўсіх партыяў, а найчасьцей прадстаўнікі часовага ўраду Керанскага й вайсковых арганізацыяў. Усе за рэвалюцыю, усе за перабудову Расейскай Імпэрыі й

кажны па свояму. Выступаюць сацыялдэмакраты-меншавікі, сацыялісты-рэвалюцыянэры, кадэты й беспартыйныя. Бальшавікоў яшчэ ня чуваць, яны зьявяцца пазьней. Пасьля мітынгу адбываюцца дыскусіі й спрэчкі, пераносяцца на вуліцу, у хаты, дзе кватэруюць жаўнеры, у цывільнае насельніцтва. Усе дыскутуюць, усе спрачаюцца, усе хочуць сваіх парадкаў, усе карыстаюць із свабоды. «Расейскай турмы народаў» больш няма, яна разваленая. Усе перажываюць рэвалюцыю – кажны пасвоему.

У дыскусіях пачуеш ня толькі расейскую, але й іншыя мовы: беларускую, украінскую, польскую й мову каўказцаў. Дыскутуюць ня толькі аб Расеі, але й аб Польшчы, Украіне, Беларусі, Каўказе, Туркестане. Чуюцца такія словы, як аўтаномія, фэдэрацыя, незалежнасьць, самастыйнікі, сувэрэннасьць, «едзіная недзелімая».

Немцы абвесьцілі, што пасьля вайны прызнаюць незалежнасьць Польшчы, і часовы ўрад Керанскага какетуе палякаў, а Фінляндыя ўжо аддзяляецца. Ходзяць чуткі аб арганізацыі польскіх легіёнаў. Але й чуваць гутаркі аб самастойнасьці Украіны, Беларусі, Каўказу, Туркестану. Беларусы, украінцы, палякі часта дэманстрацыйна гавораць на сваіх мовах – навет вайсковыя.

Дыскусіі адбываюцца й у нашай хаце. Жаўнеры, што працуюць у канцылярыі й жывуць у нас, усе з асьветай, ад іх можна пачуць шмат чаго цікавага і даведацца шмат чаго новага. Гэта тры ўкраінцы й тры беларусы. Яны гавораць між сабой кожны пасвоему й добра разумеюцца. І я іх добра разумею. Украінцы для мяне не навіна, іх столькі перавалілася праз нашае мястэчка: і кіеўскіх, і падольскіх, і палтаўскіх, і валынскіх, і харкаўскіх. Спачатку я іх не разумеў, але з часам прыслухаўся, прывык і пачаў разумець.

Дысананс у дружную сям'ю нашых кватэрантаў уносіць іх начальнік Шчукін. Ён жыве ў майго дзядзькі. Ён расеец. Ён ня церпіць самастыйнікаў і высьмейвае ўкраінскую й беларускую мову. Ён за «адзіную недзелімую Расею». Між ім і нашымі кватэрантамі ёсьць толькі афіцыйнае супрацоўніцтва й субардынацыя, як да старэйшага. Паза службай Шчукін цяпер для іх ужо не начальнік, але й ня сябра, бо занадта самапэўны, неталерантны, уладалюбны й прыдзіра. Ён ніяк ня можа пагадзіцца, што пасьля рэвалюцыі ўзьнялі голас розныя нацыянальнасьці й дабіваюцца аддзяленьня ад Расеі. Адсюль войстрыя ды-

скусіі зь ім і спрэчкі. Вось як цяпер чую такую спрэчку. Шчукін нэрвуецца й крычыць сваім начальніцкім тонам. – «Прыпэр самопэр» – кідае ён прыдуманую насьмешку над украінскай мовай, нібы паказваючы сваю вышэйшасьць. Да Шчукіна далучаюцца іншыя расейцы – частыя бывальцы ў канцылярыі, яны таксама супраць «расчленителей России» і памагаюць яму перамагчы ў спрэчцы самастыйнікаў. Але нашы кватэранты не паддаюцца, яны спакойна даводзяць карысьць аддзяленьня, а на моўныя вульгарызмы Шчукіна вытыкаюць расейскія лаянкі й саратаўскія частушкі.

Раптам чуецца гучнае прывітаньне: «Слава Украіне!» і адказ нашых кватарантаў: «Украіне Слава!». Гэта прыйшоў сябра нашых кватарантаў, заядлы самастыйнік Гуменюк, які вельмі любіць спрачацца. У канцылярыі робіцца шумна. Ужо чуваць зычны голас Гуменюка ў спрэчцы, якая, відаць, заходзіць далёка, бо ўспамінаюцца такія імёны, як Хмяльніцкі, Мазэпа, Пётр Вялікі, Кацярына, Каліноўскі, Мураўёў вешацель, Азэф, ды мяшаюцца такія эпітэты, як галаварэз, патрыёта, здраднік, герой, кравапійца, узурпатар. Спрэчка ўжо перайшла ў сварку, каб чаго добрага бойка ня вынікла!?

Але тут зазваніў тэлефон, хтось падняў слухаўку, у хаце зрабілася ціха. Спрэчка перарвалася. Іншым разам спрэчку перарываюць інтарасанты ахвіцэры.

А як западае шэрая гадзіна й наступае вечар, тады чутны спакойныя й разважлівыя гутаркі: – За каго мы ваюем, за каго гібеем у акопах? За свае народы, за свае правы? Не, мы кроў праліваем за матушку Расею, якая высысае з нас сокі, за яе пыху й дабрабыт. Але мы аддзелімся ад Расеі, тады няхай маскалі пакукуюць і пакажуць, што ўмеюць, а награбіўшы чужых земляў і дабра, лёгка крычаць аб сваёй велічы й моцы, – гаворыць украінец – здаецца Паўлэнка. – Але, але, аддзяліцца ад Расеі мы мусім, кажа беларус Дубавік, бо якая-б яна ня была Расея, яна ўсяроўна будзе думаць пра сябе, а не пра нас. Аднак аддзяліцца будзе нялёгка. Як усе народы аддзеляцца, дык з Расеі мала што застанецца, яна зыйдзе на шэры канец. Таму расейцы будуць старацца ўсімі сіламі не дапусьціць да аддзяленьня іншых народаў. – Можа тады дабіцца спачатку аўтаноміі, а пазьней аддзяляцца? – дакідае, здаецца, Садоўскі. – Не, толькі аддзяляцца, і то як найхутчэй, – гарачыцца другі ўкраінец – хутчэй, пакуль

расслабленая вайной і рэвалюцыяй Расея не зьбярэцца з сіламі ды зноў ня возьме нас за горла. – І зажы-вём-жа мы тады, зажывём, як аддзелімся, – вымаўляе з асалодай павольны беларус Валевіч. Але тут адчыняюцца дзьверы й чуецца прывітанне: «Слава Украіне!». Прыйшоў Гуменюк. Гутарка зыходзіць на другі бок. Чуваць пытаньні, ці разасланы паведамленьні аб украінскім вайсковым зьезьдзе? Ці прыйшоў адказ ад Каваленкі зь Сібірскага палка? Тры беларусы адсоўваюцца і таксама гавораць пра арганізацыйную перапіску. Вельмі часта ўспамінаецца Менск. Нарады чаргуюцца з прыцішаным сьпевам украінскай ці беларускай песьні. Пад гэты сьпеў і засынаю.

Так у нарадах, дыскусіях, спрэчках, сьпевах і роздумах праходзяць дні, тыдні, месяцы – у штабах, у вайсковых аддзелах, у вакопах на фронце, у сялянскіх хатах і ў гарадох. Дасьпяваюць вялікія думкі. Расейская рэвалюцыя ўнядраецца ў рознанацыянальных масах жаўнераў і цывільных, расплываецца па нацыянальных асяродках, у якіх творацца нацыянальныя рэвалюцыйныя клічы: «Слава Украіне!», «Хай жыве Беларусь!», якія западаюць глыбока ў народную сьведамасьць. Групавыя дыскусіі й нарады па ўсім вялізарным абшары зьліваюцца ў большыя зборышчы, канфэрэнцыі й зьезды. Узрастаюць нацыянальныя рэвалюцыі, крышталізуецца незалежніцкая ідэялёгія, крэпне воля народаў да самастойнага жыцьця аж да паўнейшага выяўленьня на вялікіх усенародных зьездах-кангрэсах, на якіх паўстаюць такія несьмяротныя акты, як абвешчаньне незалежнасьці Украінскай Народнай Рэспублікі 22 студзеня 1918 году і абвешчаньне незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі 25 сакавіка 1918 году.

Гэтым вялікім актам прысьвячаю свой маленькі ўспамін з нагоды 50-тых угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Украіны. УКРАІНЕ СЛАВА! **В. Жук-Грышкевіч»**

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 130, 1968)

50-ыя ўгодкі Беларускай Народнай Рэспублікі ў Таронта

Дзіўнай сілай ускалыхнуў юбілейны 1968-ы год усёй нацыянальнай беларускай эміграцыяй. Яна заварушылася, як закрануты мурашнік, загрымела, як наэлектрыза-

ванае паветра перад бурай. Ня дзіва! Маятнік часу выбівае паўстагодзьдзе Акту абвешчаньня Незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі!

На пачатку году прыяжджае ў Паўночную Амэрыку Старшыня Рады БНР інж. Мікола Абрамчык. Ягоныя наведваньні беларускіх асяродкаў Канады й ЗША, даклады, дыскусіі й гутаркі дадаюць алертнасьці й пругкасьці ўсяму, што беларускае й жывое.

У сэктарах Рады вядуцца дыскусіі й падрыхтоўка да чароднай Сэсіі Рады БНР. Як жывы помнік залатому юбілею БНР, пускае першыя парасткі Ліга БНР, арганізацыя для ўсіх тых, хто стаіць на грунце Акту 25-га Сакавіка.

Першы раз у гісторыі Нью Ёрку, у "Public Library" на 5-ай авенью непадалёк ад будынку Задзіночаных Нацыяў – цэнтру падзеяў – адбываецца на працягу чверцьгодзьдзя выстаўка: «**450 Год Беларускага Друку**». Плякаты з партрэтам др. Франьцішка Скарыны весьцяць колькімільённаму Нью Ёрку аб багацьці культурнай спадчыны беларускага народу.

А кажны большы й меншы беларускі асяродак па ўсім сьвеце мае свае амбіцыі й робіць свае намаганьні адзначыць і ўшанаваць залаты юбілей БНР.

Таронта

Згуртаваньне Беларусаў Канады галоўным чынам кіруе сваю энэргію на інфармаваньне лістамі, літаратурай і «ДЭКЛЯРАЦЫЯЙ Рады БНР» урадавых, грамадзкіх і культурных дзейнікаў Канады аб Беларусі, яе паняволеньні й вызвольным змаганьні. Гэтая інфармацыя была найболей інтэнсыўнай перад сьвяткаваньнем 25-га Сакавіка.

Найважнейшую аднак ролю ў вадзначэньні Незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі гуляе тут Каардынацыйны Камітэт Беларусаў Канады, які рэпрэзэнтуе ЗБК, БНА, і БСА (Беларускую Самапомач Ашавы). Ягоным стараньнем былі наладжаныя 24-га сакавіка ўрачыстасьці, што адзначалі залаты юбілей БНР.

У нядзелю 24-га сакавіка, у БАПЦ Сьв. Кірылы Тураўскага зраніцы адбываецца ўрачыстая япіскапская Багаслужба. Адначасна адбываецца Багаслужба й у царкве Сьв. Еўфрасіньні Полацкай.

Акадэмія

Як падрыхтоўка да Акадэміі была дэтальнай і старанай, так і ўсё беларускае грамадзтва выказалася абавязкавасьцяй і пунктоўнасьцяй. А 3-яй гадзіне папаўдні вялікая заля Канадзка-Славацкай Лігі на вуліцы Дандас 1407 хутка напоўнілася па берагі. Колькі хвілін перад пачаткам – 3:30 п.п. – прыйшлі паважаныя госьці: Яго Праасьвяшчэнства Уладыка Мікалай, пасол Фэдэральнага парлямэнту др. Станлей Гайдаш із сп-няй Гайдаш, бурмістр Таронта Вільгэльм Дэнісон із сп-няй Дэнісон, пасол Парлямэнту Антарыя Г. П. Картон, Senior Liaison Officer на Цэнтральную Канаду сп. Г. П. Ален із сп-няй Ален, старшыня Камітэту Вонкавых Спраў Эстонскай Цэнтральнай Рады ў Канадзе сп. Ільмар Гэйнсоо, прадстаўнік Украінскай Нацыянальнай Фэдэрацыі сп. Настукаш, старшыня «Эдмонд Буркэ Сосаеты» сп. Д. С. Андрус, заступнік старшыні Галоўнай Управы БАЗА др. Язэп Сажыч з жонкай Варай і дачкой Ленай ды сп-ня Вера Арцюх з Дэтройту.



Др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч, старшыня Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады, робіць даклад на акадэміі залатога юбілею Беларускай Народнай Рэспублікі. Таронта, 24 сакавіка, 1968.



На сьвяткаваньні 25-га Сакавіка ў Таронта. 1968.

Урачыстасьць пачалася канадзкім гімнам, адыграным аркестрай сп. Б. Лішчонка. Акадэмію адчыніў й вёў сябра ККБК сп. Р. Беразоўскі. Два кароткія, але зьмястоўныя даклады – старшыні Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады др. В. Жук-Грышкевіча пабеларуску й сп. Ул. Барановіча паангельску – далі слухачом усьведамленьне важнасьці падзеі, якую яны сабраліся тут адзначыць, ды велічы заданьня, якое ўскладае на іх гістортыя й бацькаўшчына. – «Чаго мы хочам, за што змагаецца беларускі народ, у гэтым няма ніякага сумліву. Мы змагаемся за Незалежную Беларускую Народную Рэспубліку – гаварыў др. В. Жук-Грышкевіч – наш шлях ясны й мы ідзем непахісна да свае мэты».

Пасьля дакладаў і прывітаньняў прысутных гасьцей прамаўляў пасол Фэдэральнага парлямэнту др. Ст. Гайдаш. Ён прачытаў прывітальны ліст Прэм'ера Канады Л. Б. Пірсана, а пасьля ў сваіх цёплых пажаданьнях ён зазначыў, што між прадстаўнікамі ад усіх народаў на канфэрэнцыі Задзіночаных Нацыяў аб «Гюмэн Райтс» у Тэгэране, ён спадзяецца, што будзе незалежны прадстаўнік і ад беларускага народу, што дамагаўся-б сваіх правоў чалавека.

Пасол Парлямэнту Антарыя, сп. Г. Р. Картон прачытаў ліст Прэм'ера Антарыя Я. П. Робартса й дадаў прывітаньні ад сябе.

Мэр Таронта В. Дэнісон у сваім прывітаньні зазначыў, што ў культурным і эканамічным жыцьці Таронта, якое перавышае рост іншых гарадоў Канады,немалую ролю адыграла й беларуская эміграцыя.

Спадар Г. П. Ален Senior Liaison Officer на Цэнтральную Канаду, вітаючы з паўстагодзьдзем незалежнасьці Беларусі, сказаў, што народ з такой гістарычнай і культурнай спадчынай, як беларускі, з такімі продкамі, як др. Франьцішак Скарына, заслугоўвае на сваю дзяржаўную незалежнасьць і здабудзе яе.

Сп. Настукаш, прадстаўнік Украінскае Нацыянальнае Фэдэрацыі, горача вітаў з залатым юбілеем БНР, гаварыў аб братняй сувязі між беларусамі й украінцамі, аб патрэбе лучэньня сілаў паняволеных народаў у змаганьні за незалежнасьць зь іх супольным ворагам – расейскім камунізмам.

Аб змаганьні з камунізмам і падтрымцы беларускаму народу ў яго змаганьні за незалежнасьць гаварыў і сп. С. Андрус, старшыня «Эдмонд Буркэ Сосаеты».

Слухаючы прамоўцаў, мімавольна ў вушах гучэлі словы «Дэкляpацыі Рады БНР»: «Ты ведаеш добра, Народзе, што Ты не адзін цяпер, што ёсьць у Цябе верныя саюзьнікі... Ведай-жа, што й цэлы вольны сьвет... прасякнуты спагадай табе...»

Тымчасам пачалася мастацкая частка. Вуснамі др. Раісы Жук-Грышкевіч несьмяротны дух Янкі Купалы бярэ з нас «прысягу й зарок», каб не прадалі сябе, каб ня здрадзілі сваёй справе. Будзіць да жыцьця сьпячых і памерлых нацыянальна. Кліча Ваяка свой край заваяваць, Уладара – адбудаваць свой збураны пасад. «На ўладара жджэ Беларусь даўно...!»

«Я ад вас далёка, бацькаўскія гоні...» – плачуць сэрцы з чыстым, як раса, голасам спадарынь Веры Арцюх і Вары Сажыч пад акампанямэнт Лены Сажыч. – «На чужое неба ўжо гляджу сягоньня, але сэрцам, думкай толькі Вас я знаю, як жыву, жыць буду ў сваім родным краю...»

Настальгію перарывае колерная касьцюмамі й жывая расьцьвітаючаю маладосьцьцю дзявочая танцавальная група пад кіраўніцтвам сп-ні Валі Пашкевіч народным танцам «Бульба». Большай сталасьцьцю й выразленасьцьцю адзначаецца «Крыжачок» і «Юрачка» ў выкананьні Беларускае Моладзі. Харавая дэклямацыя верша Натальлі Ар-



Др. Раіса Жук-Грышкевіч рэцытуе верш Янкі Купалы «Паўстань з народу нашага...» Таронта, 24 сакавіка, 1968.



Удзельнікі мастацкай часткі сьвяткаваньня 50-х угодкаў БНР у Таронта.

сеньневай у выкананьні ўдзельнікаў танцавальнай групы дзяўчат і маладога Я. Пітушкі (кіраўнічка сп-ня Валя Пашкевіч) цешыць вуха добрай беларускай вымовай ды зьместам: «Мы праўда, мы сіла, мы радасьць, мы рух... Мы ймкнемся на ўзвышшы, нам межаў няма!» У вадказ ім хочацца сказаць: Так, моладзь, імкніся на ўзвышшы, каб заўтра змагла ты ўзяць на свае плечы абавязкі й прадаўжаць шлях сваіх бацькоў. Хай з твайго пакаленьня паўстане Купалаўсі Прарок, Пясьняр, Ваяк, Уладар!

Песьні! Найбольшай аднак атракцыяй ёсьць песьні нашага прыгожага дуэту з Дэтройту... ён выканаў яшчэ: «О, Беларусь, мая шыпшына», «Ня першы раз», «Даруй» і «Песьня мая, песьня», музыка праф. М. Куліковіча.

«Лявоніха» й Беларускі Нацыянальны Гімн «Мы выйдзем шчыльнымі радамі...» канчаюць Акадэмію.

Закончылася Акадэмія, разыйшліся людзі, са сцэны зьняты сьцяг, Пагоня, беларускія дзяружкі, дэкарацыя, – ня зьняты толькі з душы перажываньні, хваляваньні, не закончаны юбілейны год БНР, не закончаная праца, ня зьняты з плеч абавязкі, не закончаны шлях – «Нас чакае Маці Беларусь!»

Р. Жук-Грышкевіч.

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 132, 1968)

Юбілейныя прывітаньні прыслалі:

Lester B. Pearson, Prime Minister of Canada; Paul Martin, Secretary of State; Paul T. Hellyer, Minister of Transport; The Hon. Walter L. Gordon; Robert L. Stanfield, Leader of the Opposition; Senator Paul Yuzyk; John P. Robarts, Premier of Ontario; Allan Grossman, Minister of Reform Institutions; John P. Yaremko, Minister of Social Services; Robert F. Nixon, Leader of the Opposition in Ontario; Donald MacDonald, Leader of the NDP in Ontario; Dr. J.M. Kirshbaum President of Canada Ethnic Press Federation, President of the Slovak National Council.

Беларускія арганізацыі:

Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне – Галоўная Управа; Згуртаваньне Беларусаў у Вялікай Брытаніі – Галоўная Управа і аддзел у Брадфардзе; Беларуска-Амэрыкан-

скае Задзіночаньне – аддзел у Лёс Анджэлес; Каардынацыйны Камітэт Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі; Беларускі Камітэт Сьвяткаваньня Юбілею ў Чыкага; Беларускі Кангрэсовы Камітэт у Амэрыцы; Беларуская Амэрыканская Нацыянальная Рада ў Чыкага; Беларускі Вызвольны фронт у Вялікай Брытаніі; Беларускі Вызвольны Фронт у Вініпэгу.

З найбольш характэрных лістоў:

"Ontario Office of the Prime Minister and President of the Council.

Dear Dr. Žuk-Hryškievič:

On the occasion of the observance of the 50th anniversary of the Proclamation of Independence of the Byelorussian Democratic Republic, I am pleased to extend greetings to the people of Ontario of Byelorussian heritage.

During the early years of this century some 30,000 people came to Ontario from Byelorussia. They settled in many of our cities, Hamilton, Oshawa, Toronto, Windsor, Sudbury and Timmins, where they have made a substantial contribution to the dynamic growth and development of this province. They have helped to open the mines of Northern Ontario and participated in the great industrial expansion of Ontario. The children and grandchildren of these newcomers have achieved prominence in the medical, scientific and engineering professions and are in the forefront of our newest developments.

Byelorussians have joined with the people of many nationalities and origins in building Ontario and Canada. They take pride in being Canadian, just as they maintained their love of the land they left behind. The customs and cultural heritage, the energy and initiative, the talent and undaunted spirit, the love of freedom of these Canadians of Byelorussian heritage have enriched the life all of us enjoy in Canada.

I join with my collegues in the Government and with my fellow Ontarians in extending good wishes to our friends and neighbours of Byelorussian heritage as they commemorate an important milestone in the life and history of their mother country.

Yours very truly,

John P. Robarts
(Prime Minister of Ontario)"

"BYELORUSSIAN CANADIAN CO-ORDINATING COMMITTEE
(telegram)

On this memorable occasion of the 50th anniversary of the Proclamation of the Byelorussian Democratic Republic I join with all freedom-loving people to send you sincere best wishes that Byelorussians be given complete freedom as we enjoy in our great country of Canada.

Honourable John Yaremko
Minister of Social and Family Services."

«Падзяка

Складаем шчырую падзяку ўсім суродзічам, старэйшым і маладзейшым: тым, што спрычыніліся да арганізацыі сьвяткаваньня залатога юбілею Беларускай Народнай Рэспублікі ў Таронта, тым, што прынялі чынны ўдзел у выкананьні праграмы сьвяткаваньня, як і тым шматлікім, што прыбылі зь блізку, тым больш тым, што прыбылі з далёку, каб ушанаваць сваёй прысутнасьцяй гэту вялікую беларускую падзею.

Асабліва-ж дзякуем Спадарыні Веры Арцюх, др. Язэпу Сажычу, Спадарыні Вары Сажыч і іх дачцы Лене, што, не зважаючы на злую пагоду й далёкую дарогу, прыехалі на наша сьвяткаваньне з Дэтройту й узбагацілі нашу праграму сваім цудоўным сьпевам так дарагіх нам беларускіх песьняў.

Каардынацыйны Камітэт Беларусаў Канады.»

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 132, 1968)

«Залаты Юбілей БНР У Ашаве

У Ашаве (30 міль ад Таронта) жыве значная група беларусаў, бальшыня якіх працуе ў вялікай хвабрыцы самаходаў Джэнэрал Моторс. Там было шмат намаганьняў, каб стварыць беларускую арганізацыю, але ня менш і перашкаджалі да гэтага абыякавасьць да беларускага грамадзкага жыцьця ў некаторых, малая нацыянальная сьведамасьць у іншых ды традыцыйны, войстры падзел на два

напрамкі ў беларускім жыцьці сярод найбольш сьведамых нацыянальна й актыўных, які закараніўся яшчэ ў лягерох ДП ў Нямеччыне. Зьявішча ведамае амаль ува ўсіх беларускіх асяродках. Але паступова сьведамы нацыянальна актыў перамагаў перашкоды. Ён знайшоў такую форму арганізацыі, якая была ўспрыймальнай для ўсіх тамтэйшых беларусаў. Такім чынам паўстала Беларуская Самапомач у Ашаве. Яна праявіла ўжо сябе ня раз як рэпрэзэнтант беларусаў у шматнацыянальнай Ашаве.

Калі ў Таронта паўстаў Каардынацыйны Камітэт Беларусаў Канады, Беларуская Самапомач у Ашаве зацікавілася ім і ў мінулым годзе ўступіла ў яго як трэйцяя арганізацыя, далучаючыся да ЗБК й БНА, якія залажылі ККБК. Супольнымі сіламі трох арганізацыяў ККБК арганізаваў 24 сакавіка сьвяткаваньне 50-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларусі ў Таронта, а ў нядзелю 31 сакавіка ў Ашаве.

Зраніцы адбылася ў гэты дзень у ўкраінскай царкве Сьв. Пакровы ў Ашаве ўрачыстая беларуская япіскапская Багаслужба, арганізаваная ашаўцамі незалежна ад ККБК. Служыў Уладыка Мікалай, які сказаў прынагоднае казаньне, прыгожа сьпяваў украінскі царкоўны хор і было шмат людзей.

Урачыстая акадэмія пачалася а гадз. 3:30 папаўдні ў украінскай залі «Дніпро». Адчыніў акадэмію старшыня Беларускай Самапомачы сп. М. Бохар, і пачалася яна канадыйскім гімнам. Выканала яго аркестра сп. Б. Лішчонка. Вёў акадэмію сябра ККБК сп. Р. Беразоўскі, які прывітаў усіх прысутных зь беларускім нацыянальным сьвятам.

Даклад пабеларуску зрабіў др. В. Жук-Грышкевіч, а паангельску сп. Ул. Барановіч. Старшыня акадэміі прадставіў гасьцей, якія склалі свае прывітаньні.

Пасол Антарыйскага Парлямэнту з НДП Кліфорд Пілкэй гаварыў аб свабодзе ў Канадзе для ўсіх нацыянальнасьцяў і заахвочваў беларусаў да шанаваньня сваёй нацыянальнай спадчыны – мовы, культуры, звычаяў.

Ольдэрман Джон дэ Гарт гаварыў ад імя бурмістра Ашавы й дзякаваў беларусам, якія разам зь іншымі нацыянальнасьцямі зрабілі ўклад у разбудову места.

Прэзыдэнт Ашаўскага Народнага Фэстывалю Місыс Дж. Олдуніл выказала зацікаўленьне беларускім народным мастацтвам і дзякавала беларусам за ўдзел у штогоднім Ашаўскім Народным Фэстывалі.

Др. Д. Антонэвіч вітаў беларусаў з залатым юбілеем абвешчаньня сваёй незалежнай дзяржаўнасьці ад імя УНО і Украінскага Эгзыльнага Ураду. У сваёй доўгай прамове ён закрануў важнейшыя падзеі зь гісторыі Беларусі і жадаў ёй хуткага зьдзейсьненьня ідэалаў Акту 25-га Сакавіка.

Ад Лігі Вызваленьня Украіны выступаў сп. О. Водвуд, які гаварыў аб падобнай долі Беларусі й Украіны, аб братэрстве абодвух народаў і выказваў пэўнасьць іх хуткага вызваленьня.

Апошнім гаварыў сп. Б. Новак ад Славенскай Лігі. Ён сказаў, што славенцы маюць такі самы боль, як і беларусы, бо й яны ня маюць сваёй незалежнай дзяржавы. Жадаў абодвум народам хуткага асягненьня незалежнасьці.

У мастацкай частцы мы пачулі дэклямацыю др. Раісы Жук-Грышкевіч «Паўстань з народу нашага...» – Янкі Купалы й харавую дэклямацыю моладзі «Мы праўда..» – Натальлі Арсеньневай.

Малодшыя дзяўчаты станцавалі вельмі прыгожа «Бульбу», што «сама ссыпалася ў мяшок», а група Беларускай Моладзі паказала сваё мастацтва ў танцах «Крыжачка» й «Лявоніхі».

Трэба ўспомніць яшчэ й малую артыстку Новак, якая прасьпявала «Люблю наш край...», падыгрываючы сама на акардыёне, большым за сябе.

Сьвяткаваньне было закончана беларускім нацыянальным гімнам. Народу было шмат і ўсе былі задаволеныя з прабегу сьвяткаваньня. Беларуская Самапомач у Ашаве, на долю якой выпалі мясцовыя арганізацыйныя заданьні, вывязалася з іх вельмі добра, а само сьвяткаваньне сталася вялікім крокам наперад у разбудове беларускага жыцьця ў Ашаве. **Ж.**»

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 132, 1968)

ЯК ПАЎСТАЎ АКТ 25-ГА САКАВІКА

Адказ др. Вінцэнта Жук-Грышкевіча на бальшавіцкія напады

«У ‹Голасе Радзімы› нр. 13 за сакавік 1968 г. быў надрукаваны артыкул А. Пятровіча пад загалоўкам ‹Праўда аб Акце 25 Сакавіка›. Артыкул гэты накіраваны на тое, каб зьбіць з нацыянальна-дзяржаўнай сьведамасьці бела-

русаў у вольным сьвеце й зьнеахвоціць іх да сьвяткаваньня 50-гадовага юбілею абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

У імя аб'ектыўнай праўды, абапіраючыся на гістарычныя факты, узятыя з розных крыніцаў, улучна з бальшавіцкімі, пастараемся бесстаронна разгледзіць падзеі, закранутыя А. Пятровічам.

1. Бальшавікі й дзяржаўнасьць нерасейскіх народаў СССР

У сваім артыкуле А. Пятровіч кажа: «Дзякуючы рэвалюцыі й савецкай уладзе, беларусы, як і ўсе народы вольнай Расеі, упяршыню за шматгадовую гісторыю атрымалі права й магчымасьць стварыць сваю нацыянальную дзяржаву...» – Тут ёсьць поўнае запярэчаньне гістарычнай праўды. Беларусы, палякі, украінцы, армяне, грузіны, татары й туркестанцы мелі сваю дзяржаўнасьць раней за Расею (Расея пачала называцца так ад Пятра Вялікага, раней-жа была Маскоўскім княствам). У 10-12 ст. Беларусь мела пачатковую дзяржаўнасьць у сваіх княствах Полацкім, Турава-Пінскім і Смаленскім, а ад 13 ст. у Вялікім Княстве Літоўскім. Пад Расею трапіла толькі ў канцы 18-га ст., а раней ані з Маскоўшчынай, ані з Расеяй, апрача войнаў, нічога супольнага ня мела. Маскоўшчына, а пазьней Расея зьнішчыла дзяржаўнасьць усіх пералічаных вышэй народаў і, забраўшы іхнія землі стварыла сваю імпэрыю. Бальшавікі нікому не стварылі сувэрэннай дзяржаўнасьці, наадварот, яны зьнішчылі адроджаную дзяржаўнасьць у 1917-18 гадох забраных Расеяй нерасейскіх народаў і стварылі ім не незалежныя дзяржавы, а фікцыйныя савецкія рэспублікі, падпарадкаваныя Маскве. Яны адрадзілі расейскі імпэрыялізм, узмоцнілі яго й удасканалілі.

Цьверджаньне А. Пятровіча, што пасьля бальшавіцкага пераварота ў кастрычніку 1917 году «...поўным ходам ішла падрыхтоўка да стварэньня Беларускай Савецкай Рэспублікі», абсалютна ня згоднае з праўдай. Вось што кажа актыўны з тых часоў на Беларусі вызначны бальшавік В. Кнорын у сваёй кнізе «1917 г. в Белоруссии и на Западном фронте» (Менск, 1925, б.б. 74-75): «...Беларускае пытаньне, дзеля таго, што бальшавікі не ўдзялялі яму належнай увагі, спрычынілася да некаторых нашых пры-

красьцяў. Папершае, перад Саўнаркомам Заходняй Вобласьці паўстала пытаньне аб выдзяленьні беларускіх вайсковых аддзелаў... падругое, перад Саўнаркомам паўстала пытаньне аб Усебеларускім зьезьдзе (Кангрэсе, В. Ж.), скліканым у Менску з дазволам Наркамнаца (Народнага Камісарыяту Нацыянальнасьцяў у Петраградзе, В. Ж.)... Пасьля доўгага змаганьня за рэвалюцыйную большыню левай часьціны зьезду, прынятая зьездам рэзалюцыя аб уладзе ўсё-ж такі аказалася нацыянальна-дэмакратычнай, у сапраўднасьці ськіваванай да замены ўлады Саветаў на нацыянальна-дэмакратычную ўладу, створаную зьездам. Дзеля гэтага Саўнарком Вобласьці пастанавіў распусьціць зьезд... На бліжэйшы час роспуск Усебеларускага зьезду спрычыніўся да пераходу беларускай нацыяналістычнай дэмакрацыі яўна на бок выразных праціўнікаў савецкай улады і да падтрыманьня ёю рыхтаваных плянаў контра-рэвалюцыйных выступленьняў, завершаных арганізацыяй ураду Беларускай Народнай Рэспублікі пасьля адступленьня савецкай улады».

Дык не бальшавікі дбалі пра беларускую дзяржаўнасьць, а беларускія народныя масы, дэмакратыя, што выявіла сваю волю на Усебеларускім Кангрэсе пастановай стварэньня Беларускай Народнай Рэсдпублікі, якая была абвешчаная незалежнай пасьля таго, як бальшавікі на мірнай канфэрэнцыі зь немцамі ў Берасьці раздавалі беларускія землі нашым суседзям, ігнаруючы волю беларускага народу. Пасьля абвешчаньня незаленасьці Беларусі бальшавікі ня мелі ўжо іншага выхаду, як стварыць сваю Савецкую Беларускую Рэспубліку, што яны й зрабілі на цэлы год пазьней.

2. Усебеларускі Кангрэс

Скліканы ў сьнежні 1917 г. Усебеларускі Кангрэс А. Пятровіч называе контрарэвалюцыйным зборышчам, падабраным «Беларускай Радай», якое, быццам, складалася «...з буржуазных інтэлігэнтаў, **памешчыкаў, фабрыкантаў,** (падкрэсьленьне маё, В. Ж.), кулакоў, буйных чыноўнікаў.» – У сапраўднасьці-ж Усебеларускі Кангрэс меў такое вялікае прадстаўніцтва ад усіх пластоў беларускага народу, якога ня меў ніводзен народ з усяе Расейскае імпэрыі, навет ня мела яго й Усерасейскае Учрэдзіцельнае Сабраньне. Вось што кажа пра склад Кангрэсу сучасны гі-

сторык БССР Вадзім Круталевіч у артыкуле «Без народнае апоры» (у часопісе «Полымя» нр. 2, 1967 г., б. 186, 187, 188): «Згодна зь літаратурнымі дадзенымі, у зьезьдзе (Кангрэсе, В. Ж.) удзельнічала 1915 чалавек, зь іх 1175 з рашаючым голасам і 740 з дарадчым... Гэта былі, найбольш, прадстаўнікі валасных, павятовых і губэранскіх земстваў, гарадзкіх самакіраўніцтваў, павятовых і губэранскіх зямельных камітэтаў, настаўніцкіх арганізацыяў, саюзаў земскіх і паштова-тэлеграфных служачых, розных нацыяналістычных арганізацыяў. Не пакінуты былі бяз увагі навет дарожныя й бежанскія камітэты... Валасныя й павятовыя земствы, гарадзкія думы, настаўніцкія бежанскія арганізацыі й павятовыя Саветы сялянскіх дэпутатаў пасылаюць па адным дэлегату. Губэранскія харчовыя камітэты і губэранскія сялянскія Саветы – па тры дэлегаты. Саветам рабочых і салдацкіх дэпутатаў прапаноўвалася накіраваць на зьезд па адным дэлегату... На зьезд у Менск прыбыло больш за 700 прадстаўнікоў арміі й флёту, г.зн. больш за трэць усіх дэлегатаў з рашаючым голасам. Прадстаўнікі арміі займалі на зьезьдзе найбольш правыя пазыцыі, патрабуючы неадкладнага абвяшчэньня ‹незалежнай Беларусі›... На зьезьдзе прысутнічалі, праўда, іх была нязначная колькасьць, прадстаўнікі Саветаў, і сярод іх дэлегаты Віцебскага губэранскага зьезду Саветаў...» Былі на Кангрэсе й беларускія бальшавікі зь беларускай Сацыял-Дэмакратычнай партыі, якая ўтварылася зь левага крыла Беларускай Сацыялістычнай Грамады ў Петраградзе. «Цэнтральны Камітэт партыі ўхваліў паездку ў Менск 10 сяброў гэтай арганізацыі і матар'яльна падтрымаў яе. Накіраваныя зь Петраграду беларусы павінны былі дзейнічаць у кантакце з камуністамі Заходняй вобласьці...» – кажа Круталевіч. Ён-жа прыводзіць словы А. Чарвякова (пазьнейшага прэзыдэнта БССР, В. Ж.), паводле якіх «на Кангрэсе была пэўная частка дэлегатаў работнікаў і сялян, настроеных зусім пасавецку, і таму кіраўніком Кангрэсу трэба было прыстасоўвацца і маскаваць савецкай фразыялёгіяй антысавецкія справы».

Характэрна, што, як кажа В. Круталевіч, зьезд ня прызнаў мясцовай бальшавіцкай улады, бо, паводля слоў Канчара, аднаго з арганізатараў Кангрэсу, «Саўнарком Заходняй Вобласьці, утвораны на франтавым зьезьдзе ў Менску (г. зн. на зьезьдзе расейскага войска на Беларусі, В. Ж.),... і Саветы рабочых і сялянскіх дэпутатаў ня ўдзельнічалі ў

выбарах ‹гэтых камісараў›. – Довады В. Круталевіча супраць гэтага цьверджаньня слабыя й непераконлівыя. Зразумела таму, чаму разгон Кангрэсу на загад гэтага бяспраўнага воргану вайсковай сілай выклікаў паўсюднае абурэньне.

Паводля слоў А. Чарвякова («За Савецкую Беларусь», Менск, 1927, б.б. 41-50) удзельнік Кангрэсу ведамы беларускі сацыялістычны дзеяч А. Бурбіс так прадстаўляў склад яго: «...На зьезьдзе былі, апрача прадстаўнікоў салдат і матросаў усіх фронтаў і флёты, прадстаўнікі рабочых арганізацыяў, валасных земстваў, гарадоў, чыгуначнікаў, паштоватэлеграфных служачых, сацыялістычных партыяў ад бальшавікоў да меншавікоў і ад максымалістых да правых с-р (эсэраў, В. Ж.), Усерасейскага Савету Сялянскіх дэпутатаў, уцекачоў, каапэратываў, беларускіх сацыялістычных і нацыяналістычных партыяў і арганізацыяў. З прадстаўнікоў кадэцкай партыі й абшарнікаў ня было ані воднага дэпутата, хаця аб прысутнасьці асабліва абшарнікаў вельмі часта гавораць. Былі арганізаваныя на зьезьдзе сялянскія зямляцтвы – Менскае, Магілёўскае, Віцебскае, Віленскае, Горадзенскае й Смаленскае...»

З паданых тут цытатаў бачым, якое шырокае й усестароннае прадстаўніцтва меў Усебеларускі Кангрэс ад усіх пластоў беларускага народу. Не дарма-ж вышэй успомнены В. Кнорын называе Усебеларускі Кангрэс «Учредзіцельным Сабраньнем» (Устаноўчым соймам). Адно, на што наракаюць бальшавіцкія аўтары, дык гэта на тое, што Кангрэс ня прызнаваў савецкай улады на Беларусі й заміж яе, пастанавіў стварыць Беларускую Дэмакратычную Рэспубліку.

Дадамо да гэтага, што, як відаць з успомненага артыкулу В. Круталевіча, Народны камісарыят нацыянальнасьцяў у Петраградзе даў згоду на Усебеларускі Кангрэс і навет асыгнаваў на гэту мэту 50.000 рублёў згодна з пастановай Саветаў Народных Камісараў пад старшынствам самога Леніна («Без нар. апоры», Полымя нр. 2, 1967, б. 184-85). Дык Кангрэс быў легальны навет з бальшавіцкага гледзішча.

Чаму-ж тады Усебеларускі Кангрэс быў абвешчаны контрарэвалюцыйным і разагнаны быў бальшавіцкай вайсковай сілай? Адказ на гэта пытаньне дае сам А. Пятровіч: «Нацыяналісты вырашылі стварыць асобную ад рэвалюцыйнай Расеі незалежную беларускую дзяржаву...» і –

дадае дэмагагічныя словы: «...а ў сапраўднасьці вотчыну беларускіх памешчыкаў і капіталістаў...» (Былі тады памешчыкі, фабрыканты й капіталістыя, што прызнаваліся да беларускасьці? В. Ж.) І далей: «Выконваючы волю беларускага народу, мясцовыя ворганы Савецкай улады распусьцілі «кангрэс»... – кажа А. Пятровіч.

Аб якой волі беларускага народу ён гаворыць? Воля беларускага народу была выказана 1915-ма дэлегатамі яго на легальным Кангрэсе ў прыняцьці пастановаў аб утварэньні Беларускай Дэмакратычнай Рэспублікі. Якая-ж іншая яшчэ магла быць воля беларускага народу? Мясцовыя ворганы Савецкай улады, аб якіх гаворыць А. Пятровіч, не маглі мець ніякага дачыненьня да беларускага народу й ягонай волі. Гэта былі чужыя людзі, якія апіраліся на расейскае бальшавіцкае войска, што было тады на Беларусі, і на малыя групкі рознанацыянальных бальшавікоў. Гэтыя ўлады зрабілі вялікае злачынства супраць беларускага народу, разганяючы сілай амаль двутысячны легальны Кангрэс ягоных дэлегатаў. Гэтым тыя бальшавіцкія ўлады сплямілі бальшавізм як рэвалюцыйны рух на ўсе вякі.

А што пазьней розныя бальшавіцкія зьезды сваіх аднадумцаў выносілі рэзалюцыі супраць Усебеларускага Кангрэсу, дык гэта, з пункту гледжаньня аб'ектыўнапраўнага, ня мае ніякага значэньня, бо: 1. рэзалюцыі гэтыя былі вынесеныя «постфактум»; 2. з бальшавіцкай статыстыкі ведама, што бальшавікі-камуністы прадстаўлялі нязначную мяншыню ў дачыненьні да насельніцтва Беларусі.

Найважнейшым мамэнтам тут ёсьць той факт, што бальшавікі разагналі Усебеларускі Кангрэс, які быў скліканы зь іх згодай і зь іх удзелам, і разагналі яго толькі таму, што Кангрэс гэты, выяўляючы сувэрэнную волю беларускага народу, ня дзеяў па іхняй указцы й ня стаўся бальшавіцкай марыянэткай, а дзеяў самастойна й прыняў рэзалюцыю аб утварэньні Беларускай Дэмакратычнай Рэспублікі – згодна зь інтарэсамі беларускага народу.

Адважваемся прыпушчаць, што, калі-б Кангрэс пайшоў па бальшавіцкай лініі й прыняў пастанову аб утварэньні бальшавіцкай беларускай дзяржавы – з дыктатурай бальшавіцкай партыі й цэнтральнага ўраду – тады-б напэўна ня быў бы разагнаны, наадварот, тады-б гэты Кангрэс бальшавікі хвалілі-б і славілі. **Вось дзе наглядны**

прыклад у гісторыі, як бальшавікі лічацца з воляй народу й дэмакратыяй! А з другога боку, разганяючы легальны Усебеларускі Кангрэс, бальшавікі самі даказалі, што яны ня мелі падтрыманьня й апоры ў беларускім народзе й маглі захапіць уладу на Беларусі толькі сілай... Гэтай праўды ніяк не схаваеш, не памогуць тут ніякія даўжэзныя артыкулы бальшавіцкіх гісторыкаў і публіцыстых.

3. Рада Кангрэсу – Рада БНР

Кангрэс усё-ж пасьпеў выбраць Раду Кангрэсу, якую ўпаўнаважыў усімі паўнамоцтвамі ў вырашэньні справы дзяржаўнасьці Беларусі. Рада гэтая, згодна з вымогамі абставін, ператварылася пазьней у Раду БНР. Выконваючы паўнамоцтвы Кангрэсу, яна законна абняла ўладу ў Менску ў лютым 1918 г. перад прыходам немцаў, выкідаючы бальшавікоў. Вось што піша аб гэтым Усевалад Ігнатоўскі ў артыкуле «Вялікі Кастрычнік на Беларусі» у зборніку «Беларусь» (Менск, 1924, б.б. 198-200): «...Аблісkамзап (Абласны Іспалніцельны Камітэт Западнай Абласьці, той, што разагнаў Кангрэс, В. Ж.) уноч на 19 лютага 1918 году пакінуў Менск дзеля таго, што становішча яго стала небясьпечным, дзякуючы ня толькі немцам, колькі мясцовай апазыцыі. На чале гэтай апазыцыі стаяла Рада Беларускага Зьезду (Кангрэсу, В. Ж.). Ландэр, старшыня Савету Камісараў Заходняй вобласьці ў сваіх успамінах («Вперед», 1922, нр. 1) так малюе падзеі таго часу: «У горадзе пачаўся рух беларусаў, гатовіўшых выступ проціў нас. На вуліцах пачаліся дробныя стычкі, раздаваліся стрэлы. Калі Т. Пятроў, камандант Саветаў, увечары выводзіў мяне з Савету чорным ходам, з параднага ўжо ўварваліся ўзброеныя банды, шукаючы мяне й таварышоў. На станцыі нас усялякімі спосабамі стараліся затрымаць, нацкоўваючы на нас рабочых чыгуначнікаў і ўрэшце ўтварылі крушэньне нашага цягніка – два вагоны перавярнуліся, мой зыйшоў з рэек. Гэта рабілася з мэтаю выйграць час да прыходу немцаў ці палякаў.»

І далей: «І сапраўды, Рада Зьезду выйграла час. 19 лютага Аблісkомзапу ў Менску ўжо ня было, а немцы занялі сталіцу Беларусі толькі 25 лютага. Рада Зьезду скарыстала гэты тыдзень, каб захапіць уладу ў свае рукі. Яна папаў-

няе свой склад прадстаўнікамі земства, нацыянальных меншасьцяў (жыдоў, вялікарусаў, палякаў і ўкраінцаў) і абвяшчае сябе часовым урадам Беларусі. 21 лютага Выканаўчы Камітэт Рады Зьезду выдае ‹1-ую Устаўную Грамату да народаў Беларусі›. Зьмест яе такі: ‹Быўшая ў Беларусі ўлада выйшла. Каб ажыцьцявіць права нацыі на самавызначэньне, трэба склікаць на дэмакратычных асновах Устаноўчы Сойм. Выканаўчы Камітэт Зьезду да гэтага часу абвяшчае сябе часоваю ўладаю Беларусі і выканаўчую частку сваёй улады аддае ўтворанаму Камітэтам Народнаму Сакратар'яту Беларусі. З гэтага часу Народны Сакратар'ят прыступіў да выкананьня сваіх абавязкаў›. Дык няпраўда, што Рада Кангрэсу (Рада БНР) атрымала ўладу на Беларусі з ласкі немцаў, як цьвердзяць бальшавікі.

Народны Сакратарыят Беларусі ня меў такой вялікай вайсковай сілы, каб паўстрымаць нямецкае войска, што акупавала Беларусь. Акупацыя наступіла паміма яго волі. Бальшавікі-ж усімі спосабамі стараліся не дапусьціць да арганізацыі беларускага войска й самі ня мелі сілаў, каб процістаўіцца немцам.

А. Пятровіч, апісваючы нямецкую акупацыю, робіць вінаватымі за ўсе дзеяньні немцаў Раду й Урад БНР. Тымчасам ведама добра, што пад нямецкай акупацыяй Рада й Урад БНР былі толькі талераванымі, але ня мелі ніякай улады. Немцы ўсімі спосабамі стараліся не дапусьціць да арганізацыі беларускага войска. Яны тасавалі самыя крутыя мерапрыёмствы, каб абяззброіць усіх і змусіць насельніцтва здаць ім усякую зброю.

Ня маючы вайсковай сілы, каб пазбыцца нямецкай акупацыі, Рада й Урад БНР мусілі зь ёй лічыцца й мець дыпляматычныя зносіны зь нямецкім урадам. Тэлеграма нямецкаму кайзэру, якую так часта вытыкаюць беларусам бальшавікі дэмагагічным спосабам, была нармальнай зьявай пры дыпляматычных зносінах кажнай дзяржаўнай улады. Бальшавікі рабілі й робяць каркаломныя дыпляматычныя акты, але яны ня любяць аб іх гаварыць. Ведама, што ў паразуменьні зь нямецкім кайзэраўскім урадам Ленін прыехаў у заплямбаваным вагоне ў 1917 годзе ў Расею. Ведама, якім каркаломным трыкам быў трактат Рыбэнтроп-Молатаў ў 1939 годзе. Шмат было падобных актаў у бальшавікоў. Але яны лічаць, што ім усё можна, а на звычайных рэчах у іншых будуюць сваю дэмагогію. Ня

будзем спыняцца на далейшай драбязьлівай дэмагогіі А. Пятровіча, шкада на яе гэтых шпальтаў. Затрымаемся на важнейшым.

4. Акт 25 Сакавіка

3-ю Устаўную Грамату (а не «Статутную Грамату», як кажа А. Пятровіч) – Акт 25 Сакавіка – А. Пятровіч галаслоўна называе «...найвялікшым зьдзекам над беларускім народам, вяршынёй здрады яго інтарэсаў». Тым часам, як мы бачылі зь гістарычных крыніц, Рада БНР (Рада Кангрэсу) была выбраная легальным Усебеларускім Кангрэсам, ад якога атрымала паўнамоцтвы сувэрэннасьці беларускага народу й упаўнаважаньні да вырашэньня справы дзяржаўнасьці Беларусі. Дык абвяшчаючы незалежнасьць БНР Актам 25 Сакавіка, Рада БНР ня толькі не зрабіла ніякай здрады беларускага народу, а наадварот – сумленна выканала перад ім свой абавязак.

Але мы добра разумеем А. Пятровіча. Празь ягоны артыкул і словы абурэньня прамаўляе заядлы расейскі імпэрыялізм. У сваім імпэрыялістычным засьляпеньні ён забываецца навет на Ленінскі прынцып самавызначэньня народаў, улучна з аддзяленьнем, у правядзеньні якога бальшавікі так старанна дапамагаюць усім народам, за выняткам тых, што знаходзяцца пад іх уладай. А. Пятровіч абураецца, што, абвяшчаючы Акт 25 Сакавіка, «...нацыяналісты хацелі, каб беларусы адмовіліся ад сваіх брацкіх сувязяў з расейскім і іншымі народамі Расеі...» Дык вось у чым злачынства беларускіх нацыяналістых, яны пасьмелі аддзяліцца ад матушкі Расеі! Цяпер справа ясная, адсюль і загарэўся сыры бор. Тут нічым не паможа А. Пятровічу й спасылка на г. зв. Усебеларускі Зьезд Саветаў у лютым 1919 г., які абвесьціў (а не аб'явіў, В. Ж.) Беларусь Савецкай Рэспублікай у фэдэрацыі з Расеяй і заклаймiў «Беларускую Раду» (Раду БНР, В. Ж.), бо зьезд гэты ня быў свабодным волявыяўленьнем беларускага народу, а прыладай тэй-жа імпэрыялістычнай Масквы, якая вайсковай сілай захапіла ўладу на Беларусі й толькі з часткі яе ўтварыла БССР, забіраючы Ўсходнюю Беларусь із Смаленскам сабе, а Заходнюю на 20 год аддаючы Польшчы.

А. Пятровіча зусім ня цікавіць, што маскоўскі бальшавіцкі рэжым і далей шахруе беларускімі землямі, ігнаруючы волю беларускага народу. У 1939 годзе часткі Віленскай

шчыны разам зь Вільняй, якую бальшавікі называлі сталіцай Заходняй Беларусі, былі далучаны да Літвы, а Беласток з цэлай акругай, у якім у тым-жа 1939 годзе сход народных дэлегатаў па бальшавіцкаму манеру пастанавіў далучыць Заходнюю Беларусь разам зь Беластокам да БССР – пасьля апошняй вайны адданы Польшчы.

Толькі Акт 25 Сакавіка, згодна з воляй беларускага народу, выяўленай на Усебеларускім Кангрэсе, гарантаваў незалежнасьць і непадзельнасьць Беларусі й нацыянальную ды сацыяльную справядлівасьць жыхаром яе. І хоць Акт гэты быў стаптаны расейскімі бальшавікамі, якія акупавалі тэрыторыю Беларусі, ён застаўся пуцяводнай зоркай беларускай незалежнай дзяржаўнасьці ў сэрцах і сьведамасьці беларусаў. І таму тыя беларусы, што не падлягаюць бальшавіцкаму тэрору, зусім слушна штогод сьваткуюць урачыста ўгодкі гэтага вялікага Акту, не зьвяртаючы ўвагі на тое, ці гэта падабаецца каму, ці не. **В. Жук.**»

(«Весткі з Канады» – «Беларус», 133-134, 1968, і брашура «25-га САКАВІКА» 1978 – «БНР ці БССР», б.б. 28-40)

УСТАЎНЫЯ ГРАМАТЫ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ

1-я Устаўная Грамата да народаў Беларусі

Родная старонка наша апынулася ў новым цяжкім стане. Дзе цяпер улада, што была тут, няведама, мы стаімо перад тым, што наш край можа быць заняты нямецкімі войскамі.

Мы павінны ўзяць свой лёс ва ўласныя рукі. Беларускі народ павінен зьдзейсьніць сваё права на поўнае самаазначэньне, а нацыянальныя меншасьці – на нацыянальна-пэрсанальную аўтаномію.

Правы нацыі павінны знайсьці сваё зьдзейсьненьне шляхам скліканьня на дэмакратычных асновах Устаноўчага Сойму.

Але й да скліканьня Устаноўчага Сойму ўся ўлада на Беларусі павінна належаць тым народам, якія на ёй жывуць.

Выканаўчы Камітэт Рады першага Усебеларускага Зьезду, папоўнены прадстаўнікамі рэвалюцыйнай дэма-

кратыі нацыянальных меншасьцяў, зьдзяйсьняючы мэты Зьезду, абвяшчае сябе часовай уладай на Беларусі для кіраваньня краем і скліканьня, як можна хутчэй, Усебеларускага Устаноўчага Сойму на аснове агульнага права для ўсякага дарослага, ня лічучыся з нацыянальнасьцю, вызнаньнем і родам.

Часовую народную ўладу краю, якая ставіць сабе мэтай абарону і зацьверджаньне заваяваньняў рэвалюцыі, будзе зьдзейсьневаць створаны намі Народны Сакратарыят Беларусі, які ад гэтага дня пачаў выконваць свае абавязкі. Пэрсанальны склад Сакратарыяту будзе апублікаваны пасьля.

Дадзена ў Менску-Беларускім 21 (8) лютага 1918 г.

Выканаўчы Камітэт Рады
Усебеларускага Зьезду.

2-я Устаўная Грамата да народаў Беларусі

У часе сусьветнай вайны, што бурыць адны моцныя дзяржавы і аслабляе другія, абудзілася Беларусь да дзяржаўнага жыцьця. Пасьля трох з паловаю вякоў няволі ізноў на ўвесь сьвет кажа беларускі народ аб тым, што ён жыве і будзе жыць. Вялікі Народны Збор – Усебеларускі Зьезд 15-17 сьнежня 1917 року, дбаючы аб долі Беларусі, зацьвердзіў на яе землях рэспубліканскі лад. Выпаўняючы волю Зьезду і баронячы дзяржаўныя правы народу, Спаўняючы Камітэт Рады Зьезду гэтак пастанаўляе аб дзяржаўным устроі Беларусі і аб правох і вольнасьцях яе грамадзян і народаў:

1. Беларусь у рубяжах расьсяленьня і лічэбнай перавагі беларускага народу абвяшчаецца Народнай Рэспублікай.

2. Асноўныя законы Беларускай Народнай Рэспублікі зацьвердзіць Устаноўчы Сойм Беларусі, скліканы на асновах агульнага, роўнага, простага, патаёмнага і прапарцыянальнага выбарчага права, не зважаючы на род, народнасьць і рэлігію.

3. Да часу, пакуль зьбярэцца Устаноўчы Сойм Беларусі, заканадаўчая ўлада ў Беларускай Народнай Рэспублікі належыць Радзе Усебеларускага Зьезду, дапоўненай прадстаўнікамі нацыянальных меншасьцяў Беларусі.

4. Спаўняючая й адміністрацыйная ўлада ў Беларускай Народнай Рэспубліцы належыць Народнаму Сакратарыяту Беларусі, які назначаецца Радаю Зьезду і перад ёю трымае адказ.

5. У рубяжох Беларускай Народнай Рэспублікі абвяшчаецца вольнасьць слова, друку, сходаў забастовак, хаўрусаў; бязумоўная вольнасьць сумленьня, незачэпнасьць асобы і памешканьня.

6. У рубяжох Беларускай Народнай Рэспублікі ўсе народы маюць права на нацыянальна-пэрсанальную аўтаномію; абвяшчаецца роўнае права ўсіх моваў народаў Беларусі.

7. У рубяжох Беларускай Народнай Рэспублікі права прыватнае ўласнасьці на зямлю касуецца. Зямля перадаецца бяз выкупу тым, што самі на ёй працуюць. Лясы, вазёры й нутро зямлі абвяшчаюцца ўласнасьцьцю Беларускай Народнай Рэспублікі.

8. У рубяжох Беларускай Народнай Рэспублікі ўстанаўляецца найбольшы 8-гадзінны рабочы дзень.

Абвяшчаючы ўсе гэтыя правы і вольнасьці грамадзян і народаў Беларускай Народнай Рэспублікі, мы, Спаўняючы Камітэт Рады Зьезду, абавязуемся пільнаваць законнага парадку жыцьця ў Рэспубліцы, сьцерагчы інтарэсаў усіх грамадзян і народаў Рэспублікі і захаваць правы і вольнасьці працоўнага люду. А таксама даложым усіх сілаў, каб склікаць у найбліжэйшым часе Устаноўчы Сойм Беларусі.

Усіх верных сыноў Беларускай зямлі клічам памагчы нам у цяжкой і адказной нашай працы.

Спаўняючы Камітэт Рады
1-га Ўсебеларускага Зьезду.

Выдана ў Менску-Беларускім 9 сакавіка 1918 року.

3-я Устаўная Грамата Рады Беларускае Народнае Рэспублікі

Год таму назад народы Беларусі разам з народамі Расеі скінулі ярмо расейскага царызму, які найцяжэй прыціснуў быў Беларусь; ня пытаючыся народу, ён кінуў наш край у пажар вайны, якая чыста зруйнавала гарады і вёскі беларускія. Цяпер мы, Рада Беларускай Народнай Рэс-

публікі, ськідаем з роднага краю апошняе ярмо дзяржаўнай залежнасьці, якое гвалтам накінулі расейскія цары на наш вольны й незалежны край. Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнаю й вольнаю дзяржавай. Самі народы Беларусі ў асобе Установчага Сойму пастановяць аб будучых дзяржаўных зьвязях Беларусі.

На моцы гэтага трацяць сілу ўсе старыя дзяржаўныя зьвязі, якія далі магчымасьць чужому ўраду падпісаць і за Беларусь трактат у Берасьці, што забівае на сьмерць беларускі народ, дзелячы зямлю яго на часткі. На моцы гэтага ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі мае ўвайсьці ў зносіны з зацікаўленымі старанамі, прапануючы ім перагледзіць тую часьціну Берасьцейскага трактату, якая датычыць Беларусі, і падпісаць мірную ўмову з усімі ваяваўшымі дзяржавамі.

Беларуская Народная Рэспубліка павінна абняць усе землі, дзе жыве і мае лічэбную перавагу беларускі народ, а ласьне: Магілёўшчыну, беларускія часьці Меншчыны, Гродзеншчыны (з Гродняй, Беластокам і інш.), Віленшчыны, Віцебшчыны, Смаленшчыны, Чарнігаўшчыны і сумежных часьцяў суседніх губэрняў, заселеных беларусамі.

Беларуская Народная Рэспубліка зацьвярджае ўсе тыя правы й вольнасьці грамадзян і народаў Беларусі, якія абвешчаныя Ўстаўной Граматай ад 9 сакавіка 1918 року.

Абвяшчаючы аб незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі, Рада яе пакладае свае надзеі на тое, што ўсе любячыя волю народы дапамогуць беларускаму народу ў поўнай меры зьдзейсьніць яго палітычна-дзяржаўныя ідэалы.

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі

Дана ў Менску-Беларускім
24 сакавіка 1918 року.

Паседжаньне Рады БНР для прыняцьця пастановы аб незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі было скліканае 24 сакавіка й таму трэйцяя Устаўная Граната датаваная 24 сакавіка 1918 году. Само прыняцьце канчатковага тэксту трэйцяе граматы адбылося аднак-жа, пасьля ўсяночных абмяркаваньняў і спрэчак, ужо на сьвітаньні 25 сакавіка, 25 сакавік дзеля гэтага, а не 24 сакавік быў

запраўдным днём абвешчаньня незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі.

В. Жук-Грышкевіч»

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 133 і 134, 1968.)

Празь Беларусь – да «Прывісьленскага Краю»

(Артыкул В. Жук-Грышкевіча)

«Пры цары ў падручніках геаграфіі Расейскай Імпэрыі ня было такіх назоваў, як Беларусь або Польшча. Беларусь называлася «Северо-Западным Краем», а Польшча – «Прывісьленскім Краем». І ў Польшчы й у Беларусі праводзілася русыфікацыя. Расейская гісторыя прадстаўляла беларусаў як «истинно-русских», адарваных калісь ад расейцаў літоўцамі й палякамі, а пазьней зноў «шчасьліва» злучанымі зь імі (што прапагуецца й цяпер бальшавікамі), а палякаў лічыла бунтарамі, няздольнымі да ўтрыманьня дзяржаўнага ладу, «мяцежнікамі», якіх толькі расейцы маглі прывучыць да парадку. Гэта расейская вэрсыя «гісторыі» была, зразумела, адным з русыфікацыйных сродкаў, сапраўдная-ж гісторыя, як, зрэшты, і цяпер, не дапускалася да сьведамасьці народу.

Што Польшча сталася «Прывісьленскім Краем», вінавата ў гэтым польская палітыка. Рассэймаваная польская шляхта, што гуляла галоўную ролю ў дзяржаўным жыцьці, ня мела вялікага палітычнага розуму. Яна дбала перадусім пра свае асабістыя й становыя выгады й прывілеі, а на свайго сфэдэраванага партнэра Беларусь-Літву глядзела, як на тэрыторыю сваей экспансіі й не праймалася надта тым, што гэты партнэр знаходзіцца ў цяжкім, амаль безперапынным змаганьні за сваё існаваньне з агрэсіўнай Масквой. У часе Лівонскіх войнаў у 16 веку Польшча вельмі-ж неахвотна згаджалася на навет нязначную дапамогу Вялікаму Княству Літоўскаму, ігнаруючы маскоўскую небясьпеку. Палякам тады й у галаву ня прыходзіла, што Маскоўшчына можа сягнуць і па іх. Але расейскі імпэрыялізм даў добрую навуку ўсім народам Усходняе Эўропы, а тым больш палякам. Па кусочку Масква забірала беларускія землі ды ўмацоўвала на Беларусі свае ўплывы, асабліва пры Пятры Вялікім, якія па-

чалі сягаць і на Польшчу, ды ўзрастаць там усё больш і больш. Таму Кацярына Другая безь вялікіх цяжкасьцяў здабыла ўсе беларускія землі ў часе трох падзелаў Рэчыпаспалітай Двух Народаў на супалку з Прусіяй і Аўстрыяй. Уся Беларусь апынулася пад Расеяй, а Польшча зьнікла з мапы Эўропы.

У выніку напалеонскіх войнаў Польшча зноў адрадзілася хоць часткова: з бальшыні польскіх земляў было створана г. зв. Польскае Царства пад пратэкцыяй расейскага цара, які стаўся й польскім царом. Адроджаныя на духу палякі спадзяваліся дабіцца поўнай незалежнасьці. Але расейскі імпэрыялізм ніколі не спыняецца ў сваіх захопніцкіх імкненьнях, пакуль не натрапіць на непераломную сілу. Такая ўжо яго натура. Польскі супраціў, абмежаваны ў сваім засягу, аказаўся за слабым на ўзмоцнены расейскі напор. Апіраючыся на свае базы на Беларусі, расейцы лёгка сьцерлі з мапы Эўропы Польскае Царства, а землі яго назвалі «Прывісьленскім Краем». Такім чынам Расея ўжо два разы спрычынілася да зьнішчэньня польскай дзяржаўнасьці, маючы, як выхадную базу, беларускія землі. А пазьней прыйшоў і трэйці раз.

Утрата незалежнасьці на доўгі час выклікала спачуваньне палякам ува ўсім сьвеце. Польскія імкненьні да адраджэньня сваёй дзяржаўнасьці ўсюды былі спатканы зь вялікай сымпатыяй, а суседзі Польшчы – беларусы, украінцы, летувісы, што былі ў падобнай сытуацыі, лічылі іх пабратымцамі ў змаганьні з супольным ворагам. І палякі адплачвалі ім такой-жа ўзаемнасьцяй, дык ня дзіва, што няраз усе разам рабілі супольныя палітычныя выступленьні й чуць ня супольны барацьбяны фронт. Аднак...

Аднак, як толькі Польшча зноў здабыла сваю незалежнасьць у выніку Першай сусьветнай вайны пад клічам «вольны з вольнымі, роўны з роўнымі» – наступіла мэтамарфоза, якая ператварыла палякаў, нядаўных сымпатычных пабратымцаў беларусаў і ўкраінцаў у супольным змаганьні, у заядлых шавіністаў і імпэр'ялістаў. Закружыла ім галаву «мацарствовасьць» коштам земляў і нацыянальных правоў даўных пабратымцаў. Польскі шавінізм і імпэр'ялізм так цяжка перажылі беларусы й украінцы на працягу 20-ці год між войнамі, што польскі кліч «за вашу й нашу вольнасьць» стаўся насьмешкай бадай што назаўсёды.

У 1939 годзе польская «мацартствовасьць» разьвеялася як дым, а польская дзяржава зьнікла з мапы Эўропы ўжо трэйці раз. І гэтым разам, цяпер супольна зь Гітлерам, спрычынілася да ўпадку Польшчы Расея (хоць і камуністычная), апіраючыся на тэрыторыю Беларусі.

Пасьля 2-ой Сусьветнай вайны і Польшча й Беларусь засталіся на мапе, але пад кіраўніцтвам Масквы: Польшча як сатэліт яе, а Беларусь як, абкроеная з сваіх земляў, фэдэральная рэспубліка Саветаў. Польшча апынулася ў значна лепшым палажэньні, як Беларусь. Польшча атрымала свае этнаграфічныя граніцы, землі, калісьці забраныя немцамі, беларускую беласточчыну ды шмат каталіцкага насельніцтва зь Беларусі, хоць і падлягае Маскве. Апошняя акалічнасьць ёсьць галоўнай прычынай незадаваленьня палякаў дома й на эміграцыі, што імкнуцца да незалежнасьці Польшчы ад Масквы. Гэта нам зусім зразумела. Цяжка зразумець, аднак, тое, што палякі ня хочуць ці ня ўмеюць зрабіць выснаваў із сваёй гісторыі й геапалітычнай сытуацыі. Пры цяперашнім міжнарсдным укладзе сілаў адны зь іх мараць аб новым далучэньні Заходняй Беларусі да Польшчы, а другія вераць у атрыманьне поўнай незалежнасьці Польшчы ў сучасных граніцах у нейкім паразуменьні зь Нямеччынай і Расеяй, ігнаруючы беларускую праблему. Як для першых, так і для другіх беларуская праблема ня існуе. Яны лічаць, што Польшча цяпер гранічыць з Расеяй, а Беларусі як быццам бы й ня было.

Усё-ж з прыемнасьцяй трэба сьцьвердзіць, што сярод палякаў ёсьць аднак адзінкі, якія аб'ектыўна й крытычна разглядаюць польскую палітыку адносна ўсходніх суседзяў і прыпамінаюць польскім палітыкам, што іхнія пляны ня маюць рэальных падставаў.

Польскі пісьменьнік Павал Гоставец у сваім артыкуле «Вспомнене о пшыяцелю», надрукаваным у парыскай «Культуры» нр. 4-246 (красавік 1968, б. 132), успамінаючы трактат у Рызе, між іншага кажа:

«Чарвякоў, тагачасны старшыня беларускага рэўкому ў Менску, пазьнейшы прэзыдэнт Беларускай Рэспублікі (Савецкай, В. Ж.), які кончыў самагубствам у 1936 г., так выказаў іхнія (беларускія? В. Ж.) спадзяваньні, калі я яго спаткаў у Рызе, назаўтра пасьля падпісаньня перамір'я, што дзяліла Беларусь паміж Расеяй і Польшчай:

‹ – Страшны лёс краю, што падзелены паміж чужымі дзяржавамі. Палякі найлепш ведаюць аб гэтым. А ўсё-ж

такая сытуацыя ў цяперашнім часе дае нейкую надзею. Шмат залежыць ад таго, што палякі зробяць на сваёй частцы Беларусі, ад іхняй нацыянальнай палітыкі, Масква ня зможа адмовіць нам у тых свабодах, зь якіх будуць карыстаць беларусы ў Польшчы. – ›

У гэтых словах Чарвякоў выказаў ня толькі беларускія надзеі, але й польскія. Карыстаючы із свабодаў, хоць-бы й у рамках Савецкага Саюзу, Украіна й Беларусь былі-б для Польшчы лепшай гарантыяй бясьпечнасьці, чымся папяровыя пакты аб неагрэсіі. Якую ўрэшце будучыню магла мець ізаляваная маральна «Мацарствовая Польшча» паміж двума найбольшымі мілітарнымі дзяржавамі кантынэнту?

Глухія на голас розуму, засьлепленыя нацыяналізмам палякі дваццацігодзьдзя ашукалі чужыя й свае надзеі (падкрэсьленьне маё, В. Ж.)...»

У гэтай цытаце Павал Гоставец прыпомніў нам аб вялікім палітычным розуме беларускага патрыёты Чарвякова, ды выказаў разумную й аб'ектыўную крытыку польскай палітыкі. Нам застаецца толькі сказаць нашым суседзям палякам, каб яны помнілі, што, як доўга Беларусь знаходзіцца пад уладай Масквы, так доўга над Польшчай вісіць пагроза стацца «Прывісьленсклім Краем». Бяз вольнай Беларусі няма ніякай пэўнасьці для незалежнай Польшчы. **В. Жук**»

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 137, 1968)

Із страху перад свабодай

«Камунізм, калі ён хоча выжыць, мусіць датарнавацца да духу нашага часу, да гістарычнага працэсу. Мусіць пераставіць сваю эканоміку на прыватную ініцыятыву й гандлёвую рэнтоўнасьць, што цягне за сабой прызнаньне свабоды народам і адзінкам...» – пісаў др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч у 1968 годзе, у артыкуле **«Із страху перад свабодай».** – Тое якраз, што зразумеў і імкнецца правесьці ў жыцьцё у Савецкім Саюзе дваццаць з гакам гадоў пазьней Міхаіл Гарбачоў...

«Напад Савецкага Саюзу на Чэхаславаччыну, каб здушыць маладую свабоду, пракаціўся злавесным рэхам па ўсім сьвеце. Людзі не спадзяваліся, што нешта падобнае можа здарыцца ў нашых часох. Жывём у часе нязвычайнага поступу тэхналёгіі й агульнанароднай асьветы, што

ўзмацняе імкненьні да індывідуальнай ініцыятывы, да асабістай і нацыянальнай свабоды, да дэмакратыі.

Імкненьні гэтыя ёсьць галоўнай азнакай нашага часу. **Камунізм, калі ён хоча выжыць, мусіць датарнавацца да духу нашага часу, да гістарычнага працэсу. Мусіць пераставіць сваю эканоміку на прыватную ініцыятыву й гандлёвую рэнтоўнасьць, што цягне за сабой прызнаньне свабоды народам і адзінкам** (падкрэсьлена мною, Р. Ж.-Г.). Здавалася, што й у Савецкім Саюзе зьявіліся зародкі зьмен у гэтым кірунку, а ў некаторых савецкіх сатэлітаў адбыліся вельмі сьмелыя й паважныя зьмены.

У нядаўным часе Чэхаславаччына высунулася на першае месца сярод сатэлітаў у правядзеньні рэформаў і зусім ня дзіўна – чаму? Чэхаславаччына найбольш падрыхтаваная да сучаснага гістарычнага працэсу з усяе Савецкае імпэрыі. Чэхі найкультуральнейшы народ з усіх славянаў, а за імі падцягваюцца славакі. Яны маюць найлепш разьвітую прамысловасьць і тэхналёгію з усіх народаў, што трапілі пад маскоўскі рэжым. Чэхі й славакі маюць глыбока закаранёныя дэмакратычныя традыцыі, у часе між войнамі ў Чэхаславаччыне на працягу 20 год быў сапраўдны дэмакратычны лад.

Калі ў 1948 годзе Чэхаславаччына была ўцягнута пад панаваньне Сталіна, яна мусіла падзяліць лёс усіх падсавецкіх народаў. Яе багатая й жыватворчая эканоміка была ўцягнута ў савецкую сыстэму й пачала заміраць. Усе дэмакратычныя свабоды былі скасаваныя. У краі запанавала таталітарная дыктатура Масквы. Прамысловасьць падупала. Гандаль быў зьведзяны да савецкай экспляатацыі. Край бяднеў. Грамадзтва апанавала галіта й безнадзейнасьць. І ня было выхаду, пакуль панавала дыктатура сталінскага тэрору.

Калі культ Сталіна быў звалены й яго сыстэма паслабела – высокакультурнае й сьведамае сваіх сілаў і патрэбаў грамадзтва Чэхалаваччыны пачало ажываць і дамагацца здэмакратызаваньня жыцьця. Напор грамадзтва на здабыцьцё свабоды паступова ўзрастаў. Сталіністы на чале з Навотным не маглі стрымаць узросту гэтай магутнай плыні, яна расла й пашыралася, ахапіла вялікі лік лібэральных камуністаў, якія высунулі на чало партыі Дубчэка. Дубчэк стаў правадыром гэтай плыні, ён паставіў стаўку не на партыйны апарат, як гэта зрабіў Гамулка ў Польшчы, а на грамадзтва, на народ. Дзякуючы гэтаму, у

такім малым краі вырасла магутная сіла, што сталася пагрозай для такой вялікай, але рэакцыйнай і адсталай Савецкай імпэрыі.

Дубчэк із сваім лібэральным партыйным і дзяржаўным апаратам пачаў уводзіць зьмены паводля патрэбаў народу. 8 месяцаў лібэралізацыі адрадзіла край. Была створана новая форма камуністычнага ладу: камуністычная дэмакратыя ў жыцьці, а не на паперы. Гэтая новая форма камуністычнага ладу аказалася запярэчаньнем аджыўшай бальшавіцкай сыстэмы Маркса й Леніна й савецкай практыкі, а адначасна сталася канкрэтным зьместам і прыкладам для камуністычных партыяў Захаду, якія, адарваўшыся ад маскоўскіх тэорыяў і практыкі, шукалі новага жыцьцёвага зьместу для сваіх праграмаў, каб не збанкрутаваць канчальна. Чэхаславаччына дала выхад з тупіка камуністам Францыі, Італіі й іншых заходніх краінаў, але разам з тым паставіла ў яшчэ горшы тупік Савецкі Саюз. Чаму?

Таму, што Савецкі Саюз, хоць і дапусьціў нязначную лібэралізацыю, як адкінулі Сталіна, але ў васнаўным сталінскай сыстэмы не зьмяніў. А тым часам палітычная сытуацыя ў сьвеце моцна зьмянілася. Выхад з пад маскоўскай дамінацыі Кітаю й ягонае суперніцтва з Масквой у камуністычным сьвеце на грунце палітычным і ідэялягічным разслабілі камуністычны фронт і спрычыніліся да незалежніцкіх імкненьняў у сатэлітаў і навет у падсавецкіх народаў. У самім-жа Савецкім Саюзе, дзякуючы разьвіцьцю тэхналёгіі й пашырэньню асьветы, эканамічнае й грамадзкае жыцьцё вымагае радыкальных зьменаў, каб задаволіць патрэбы насельніцтва, каб не адставаць ад поступу й прагрэсу ў гістарычным працэсе. Аднак на няшчасьце сваё й падсавецкіх народаў тупыя й рэакцыйныя савецкія апаратчыкі або ня бачаць гэтага, або не разумеюць. Яны й надалей спадзяюцца ўтрымацца пры ўладзе із сваімі няжывымі тэорыямі, апіраючыся на сталінскую сыстэму тэрору.

Таму чэхаславацкую лібэралізацыю, якая прывяла да скасаваньня цэнзуры, да свабоды слова, сходаў і крытыкі, савецкія лідэры ўспрынялі не як нармальнае зьявішча, а як вялікае зло, што пагражае ўсёй іхняй сыстэме, усёй Савецкай імпэрыі і ім самім. Трымаючыся такіх паглядаў, маскоўскія заправілы адразу былі адназгодныя ў тым, што лібэралізацыю ў Чэхаславаччыне трэба зламаць сілай, ха-

дзіла аб тое толькі, як і калі. Адсюль і вынікла тыповая савецкая «дыпляматыя» пры перамовах у Цэрнай і Братыславе, каб выйграць час ды знайсьці квісьлінгаў у падстаўны паслушны ім урад і падрыхтавацца да ваеннага нападу.

Ваенная апэрацыя нападу ўначы з 20 на 21 жніўня прайшла хутка й спраўна, але савецкім агрэсарам прыйшлося наткнуцца на прыкрыя й неспадзяваныя перашкоды. Савецкія «браты» былі пэўныя, што ім удасца зьнішчыць Дубчэка з усёй ягонай праграмай і апаратам так лёгка, як лёгка яны зьнішчылі ў 1948 годзе Масарыка. Але рэчаіснасьць змусіла іх пераканацца, што цяпер ня 1948 год, а 1968, і што калі-б яны й зьнішчылі Дубчэка, дык на яго месца зьявіцца некалькі Дубчэкаў. Палітычна Саветы ўлезьлі ў такое гразкае балота, зь якога ня скора ім удасца вылезьці, і пытаньне, ці яны змогуць калісь абчысьціцца зь яго.

Ваенны напад на Чэхаславаччыну ўдаўся, але вайна з чэскім і славацкім народам яшчэ ня выйграная й пытаньне, ці будзе выйграная. Ужо відаць, што Масква не змагла дасягнуць у акупаваным краі: яна не магла пазбыцца Дубчэка й яго лібэральнага ўраду ды ўстанавіць на яго месца паслушнага ёй падстаўнога ўраду. Чэхаславацкія сталінаўцы, на якіх Масква так лічыла, як на апору, ня толькі не змаглі ні ў чым ёй памагчы, але й самі цяпер, як, напрыклад, Швэстка, Білак, Кольдар і Якош, выракаюцца публічна супрацоўніцтва з акупантамі. Масква не змагла пазбыцца супраціўнага ёй чэхаславацкага парлямэнту, які быў і ёсьць чынны ад самога пачатку нападу. Акупантам не ўдалося зламаць пасыўнага супраціву ўсяго народу, як чэхаў, так і славакаў. Гэта ў самой Чэхаславаччыне. А на сусьветнай палітычнай арэне?

Савецкая агрэсія ў Чэхаславаччыне выклікала куды большую й мацнейшую рэакцыю ў сьвеце, чымся агрэсія 12 год таму назад ў Вугоршчыне. Дык і кансэквэнцыі зь яе для Савецкага Саюзу будуць куды большыя. Ужо відаць, што камунізм, як прылада савецкай вонкавай палітыкі, скончыўся, бо напад на Чэхаславаччыну паказаў усім народам, што нясе з сабою гэты маскоўскі камунізм. З 88 камуністычных партыяў сьвету толькі 10 падтрымалі савецкую агрэсію ў Чэхаславаччыне, рэшта-ж 78 паставіліся да яе адмоўна, або й войстра асудзілі яе.

Пасьля гэтага ганебнага чыну Савецкі Саюз мусіць пазбыцца сваіх мараў аб кіраўніцтве камунізму у сьвеце.

Вызначаны на лістапад г.г. камуністычны кангрэс у Маскве з мэтай запэўненьня кіраўнічай ролі КПСС – пытаньне, ці зможа навет адбыцца.

Гэтак званае мірнае суіснаваньне Саветаў з Захадам адразу павісла ў паветры з усімі яго гандлёвымі й культурнымі абменамі. Дагавор Саветаў з Амэрыкай аб непашыраньні нуклеарнай зброі сярод меншых дзяржаваў ніхто ўжо ня хоча падпісваць, а НАТО змушана да павялічэньня сваіх ваенных сілаў. Вось які балянс савецкай агрэсіі ў Чэхаславаччыне.

А тым самым праўдзівы абраз здрадніцкага савецкага нападу на малы камуністычны пабратымчы край – паміма хлусьлівай савецкай прапаганды й глушэньня радыёвых перадачаў з вольнага сьвету – рознымі каналамі даходзіць да сьведамасьці падсавецкіх народаў, да ўсяго грамадзтва і напэўна выкліча абурэньне ды ўзмоцніць дамаганьні лібэралізацыі й свабоды. Тады савецкія лідары мо' зразумеюць, што нельга стрымліваць шматнароднай хвалі ў яе імкненьні да свабоды й дэмакратыі ні хлусьнёй, ні схалястычнай палітграматай, ні тэрорам; што гэта імкненьне ня ёсьць чыёйсь выдумкай, а натуральным вынікам поступу ў эканамічным, культурна-асьветным і грамадзкім жыцьці, натуральнай патрэбай кажнага народу, кажнага грамадзяніна, што стрымліваньне гэтых імкненьняў азначае супрацьстаўленьне гістарычнаму працэсу.

Калі-ж маскоўскі камунізм і далей будзе сілай стрымліваць гэты працэс, дык няўхільная рэвалюцыя, якая прывядзе да распаду ўсяе Савецкае імпэрыі. **В. Жук.**»

(«Весткі з Канады» – «Беларус», нр. 137, 1968)

«Гісторыя паўтараецца

Увосень, 30 год таму (у 1938 г.), у Мюнхэне адбылася капітуляцыя Чэхаславаччыны й яе саюзьнікаў Англіі й Францыі перад нацыстаўскай Нямеччынай у справе прэтэнсіяў апошняй да Чэхаславаччыны. Каб унікнуць вайны, саюзьнікі аддалі Гітлеру Судэты й фактычна здалі на яго ласку й няласку лёс Чэхаславаччыны. Далейшы прабег трагэдыі Чэхаславаччыны й усёй Эўропы кожнаму ведамы.

Увосень сёлетняга году чэхаславацкая трагэдыя паўтарылася з тэй розьніцай толькі, што ў ролі агрэсара высту-

піла ня гітлероўская Нямеччына, а Савецкі Саюз. Аб нападзе на Чэхаславаччыну Савецкага Саюзу разам з чатырма сваімі сатэлітамі мы ўжо пісалі. Цяпер бачым, што сьціснутая з усіх бакоў брутальнай ваеннай сілай Масквы, Чэхаславаччына змушана была пагадзіцца фармальна на ўсе маскоўскія дамаганьні, мусіла скапітуляваць – таксама, як скапітулявала ў 1938 г. перад Гітлерам.

У пачатку кастрычніка сёлета (1968 г.) ў Маскве адбыліся перамовы паніж савецкай тройкай – Бражнёў, Касыгін, Палянскі з аднаго боку й чэхаславацкімі лідарамі – кіраўніком чэскай кампартыі Дубчэкам, прэм'ерам Чэрнікам і кіраўніком славацкай кампартыі Гусакам з другога боку. З камунікату гэтых перамоваў відаць, што гэта ня былі перамовы раўнапраўных бакоў, а перамовы агрэсара із сваёй ахвярай. Агрэсар дыктаваў свае дамаганьні, а ахвяра змушана была іх прыняць.

Чэхаславацкі бок забавязаўся: 1. Узмоцніць змаганьне супраць «антысацыялістычных (незалежніцкіх, Ж.) сілаў». 2. Павялічыць мерапрыёмствы кантролю над ужо цэнзураванай прэсай. 3. Узмоцніць партыйныя й дзяржаўныя ворганы... людзьмі, адданымі марксізму-ленінізму і пралетарскаму інтэрнацыяналізму...» (сталіністымі, Ж.). Гэта тыповыя пункты, на якіх апіраецца савецкая дыктатура і ў вадхіляньні ад якіх Масква абвінавачвала чэхаславацкіх партыйных і дзяржаўных кіраўнікоў ад пачатку лібэралізацыі.

Што да найважнейшай для Чэхаславаччыны справы – забраньня акупацыйнага войска – камунікат, між іншага, гаворыць толькі, што абодвы ўрады пачнуць перамовы ў гэтай справе й зробяць умову аб «часовым пастоі савецкіх і іхніх саюзьнікаў войскаў у Чэхаславаччыне», а што да рэшты гэтых войскаў, дык яны будуць выводзіцца з Чэхаславаччыны паступова, згодна з пасьляакупацыйным паразуменьнем, якое было зробленае ў Маскве. Такім чынам, чэхаславацкія лідары змушаны былі пагадзіцца з тым, што значная частка савецкага войска застанецца ў Чэхаславаччыне на даўжэйшы час, мо' й на стала, бо слова «часова» мае іншае значэньне ў савецкім слоўніку, чымся ўсюды. У 1956 г. пасьля здушэньня рэвалюцыі ў Вугоршчыне было пакінутае савецкае войска (100,000!) «часова», але прайшло ўжо 12 год, а Масква забіраць яго й ня думае. Згодна з савецка-чэхаславацкім камунікатам пакінутая таксама вольная рука Савецкаму Саюзу да рэш-

ты паўмільённай арміі, ён забярэ яе тады, калі будзе хацець, і столькі, колькі будзе хацець.

Чэхаславацкія лідары змушаныя былі таксама прыабяцаць, што й далей будуць даваць эфэктыўную помач камуністычнаму Ветнаму ды дапамагаць паўстрымліваць «...імпэр'ялістычную агрэсыю на Сярэднім Усходзе...» (Ізраэля, Ж.).

Столькі забавязаньняў узяў на сябе чэхаславацкі бок у часе нядаўніх перамоваў у Маскве. А якія-ж забавязаньні ўзяў на сябе другі бок перамоваў, Савецкі Саюз? – «Даць Чэхаславацкім таварышам усякую патрэбную ім помач пры правядзеньні нармалізацыі сытуацыі ў (іхняй) краіне і партыі...» – інакш кажучы, Саветы забавязаліся даць помач чэхаславацкім лібэральным камуністам у зьнішчэньні іхнімі ўласнымі рукамі маладой свабоды, узьнятай імі-ж самімі ў часе лібэралізацыі.

А ў міжчасе чэхаславацкі прадстаўнік у Генэральнай Асамблеі Задзіночаных Нацыяў папрасіў усіх сяброў Асамблеі (пэўне-ж пад націскам Савецкага Саюзу), каб не парушалі справы акупацыі Чэхаславаччыны Савецкім Саюзам, дзеля дабра тэй-жа Чэхаславаччыны. Як беларуская прыказка кажа: «Б'юць і жаліцца не даюць!»

Так жорстка й цынічна распраўляюцца савецкія «таварышы» з «братняй» камуністычнай Чэхаславаччынай за тое толькі, што яна пазволіла сабе на самастойны шлях дэмакратызацыі камунізму. Справа гэтая цяжкая й трагічная. Добра ўсё-ж, што яна разыгрываецца на вачох усяго свету. Яна можа стацца паказной лекцыяй для ўсіх тых, што, не разабраўшыся ў істоце маскоўскага камунізму, так сьлепа верылі ў дабрадзействы Савецкага Саюзу.

Незалежна ад гэтага, увесь сьвет сочыць за падзеямі ў Чэхаславаччыне й задае пытаньні: на колькі капітуляцыя Чэхаславаччыны перад бальшавіцкай Масквой будзе падобная ў сваіх выніках да капітуляцыі яе ў 1938 годзе перад Гітлерам? Ці й гэтым разам ненасытны агрэсар, заахвочаны лёгкімі перамогамі, не паквапіцца на далейшыя заваёвы? Ці ня будзе гэта пачаткам новага сусьветнага катаклізму?

Падставы да гэтых трывожных пытаньняў ачавідныя. Ведама, што бальшавіцкая Масква ніколі не перастала лятуцець аб г. зв. сусьветнай рэвалюцыі пад сваёй гэгэмоніяй. Ведама, што яна бразгае аружжам пры кажнай магчымай нагодзе перад усімі, хто зь ёй не згаджаецца. Ад-

нак даваць якіясь прарочыя адказы на гэтыя пытаньні было-б перадчасным. Мы ня ведаем яшчэ, як паставяцца да капітуляцыі сваіх лідэраў у Маскве чэхі й славакі, якія не скарыліся яшчэ перад маскоўскай дыктатурай. Мы ня ведаем, як зарэагуюць дэмакратычныя дзяржавы Захаду на новую, створаную савецкай агрэсіяй у Чэхаславаччыне, стратэгічную й палітычную сытуацыю, да разгляду якой прыступілі ўжо сябры НАТО. Але мы ведаем, што агрэсія ў Чэхаславаччыне шмат пагоршыла нутраную й вонкавую сытуацыю Савецкага Саюзу. **Жук.**»

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 138, 1968.)

Там, дзе дэмакрацыя

«Ня трэба забывацца, што Квэбэк мае нацыянальную, палітычную й культурную аўтаномію, куды большую, як г. зв. «сувэрэнная» БССР... Справа Квэбэку актуальная й вельмі цікавая, асабліва-ж для народаў, паняволеных маскоўскім камунізмам» – гаворыць В. Жук-Грышкевіч у ніжэй паданым артыкуле:

«Там, дзе дэмакрацыя. Справа Квэбэку

Справа Квэбэку сталася цэнтральнай справай для ўсей Канады. У гэтай французскай правінцыі паўстаў моцны незалежніцкі рух, які не задавальняецца ўжо забясьпечаньнем французскай мовы й культуры ў Квэбэку ды зраўнаньнем у правох з рэштай Канады ў эканамічным і палітычным жыцьці, а хоча аддзяленьня Квэбэку і стварэньня зь яго незалежнай, сувэрэннай дзяржавы. Рух гэты мае моцны стымул і звонку. Яго падтрымлівае Францыя на чале з Дэ Голем, які, як ведама, ад даўжэйшага часу вядзе антыамэрыканскую й наагул антыангласаскую палітыку. Сваімі выступленьнямі за сэпаратызм Квэбэку на ЭКСПО-67 і ў Францыі Дэ Голь спрычыніўся да завойстраньня дачыненьняў між Францыяй і Канадай і выцягнуў справу Квэбэку на міжнародную арэну.

Савецкі Саюз таксама падтрымлівае незалежніцкі рух у Квэбэку, падтрымліваюць яго і ўсе камуністы як канадыйскія, так і замежныя – уключна з Кубай.

Для Канады аддзяленьне Квэбэку прадстаўляе вялікую небясьпеку, як эканамічную, так і палітычную. Таму ка-

надыйскі ўрад стараецца цаной уступак і пераконваньнем квэбэцкіх палітыкаў знайсьці супольнае сужыцьцё й не дапусьціць да аддзяленьня гэтай вялікай і багатай правінцыі.

У самім Квэбэку на працягу некалькі гадоў адбываюцца вялікія зьмены культурныя, гаспадарскія й палітычныя ды сацыяльныя – г.зв. «спакойная рэвалюцыя». Рэвалюцыя гэтая ня скончылася, яна працягваецца, яна хіба што й разьвяжа лёс гэтай краіны. Ня трэба забывацца, што Квэбэк мае нацыянальную, палітычную й культурную аўтаномію, куды большую, як гэтак заваная «сувэрэнная» БССР. Квэбэкам кіруе свой правінцыянальны ўрад, свой правінцыянальны парлямант і ўся ўлада ў правінцыі знаходзіцца ў руках квэбэцкіх французаў. Там цяпер адбываецца жывая дыскусія аб далейшым лёсе краіны, у якой бярэ ўдзел увесь народ.

Аднадумнасьці няма. Адны стаяць за аддзяленьне й незалежнасьць Квэбэку – гэта самы скрайні кірунак, другія супраць аддзяленьня, трэйція бяз выразнага становішча. Сэпаратысты вядуць моцную прапаганду за аддзяленьне Квэбэку, адкрыта зьбіраюць грошы на свой рух у Канадзе й Францыі, арганізуюцца, і ніхто ім не перашкаджае, ніхто іх не арыштоўвае й ня судзіць за тое, што хочуць адарваць Квэбэк ад Канады, паколькі яны не ўжываюць насільля й ня робяць матар'яльнай шкоды дзяржаве ці прыватным асобам.

Сэпаратысты маюць вялікі ўплыў, але квэбэкаўцы мусяць добра падумаць, ці варта ім аддзяляцца. Справа ў тым, што яны моцна зьвязаны эканамічна з усёй Канадай і Амэрыкай наагул. Аддзяліўшыся-ж, яны адарвуцца ад эканомікі ўсяго кантынэнту, ад тэй эканамічнай сыстэмы, якая тут пануе, і пытаньне, ці дадуць сабе рады ў сваёй абмежанай гаспадарцы. Як выказаўся нядаўна прэм'ер Квэбэку Джонсан, Квэбэк ня можа ўводзіць сваіх асаблівых правілаў гульні ў вадным кутку рынгу, тады, калі ў цэлым эканамічным рынгу на ўвесь Паўночна-Амэрыканскі кантынэнт існуюць даўно ўжо ўсталеныя правілы, абавязкавыя для ўсіх.

Справа Квэбэку актуальная й вельмі цікавая, асабліваж для народаў, паняволеных маскоўскім камунізмам. Таму дазволім сабе разгледзіць яе шырэй і глыбей. Дамо тут голас квэбэцкаму журналісту Клёду Раяну – рэдактару мантрэальскай газэты «Ле Дэвуар», зьмяшчаючы ягоную прамо-

ву, сказаную на гадавым сходзе Рады Канадыйскага Грамадзтва. Падаю гэтую прамову ў трох частках, так, як друкуе яе ‹Канадыен Сін›, пачынаючы з часткі першай. **В. Ж.**»

(«Весткі з Канады» – «Беларус» нр. 130, 1968)

«Канада й нацыянальнасьці

Чым больш я задумваюся над пытаньнем, ці Канада выжыве, і над тым, як утварыць гармонію паміж яе дзьвюма галоўнымі нацыянальнасьцямі, тым больш я пераконваюся, што стрыжань канадыйскай дылемы ляжыць у Квэбэку; не таму, што квэбэканцы горшыя за іншых канадыйцаў, не таму, што яны спрытнейшыя, а таму, што гісторыя паставіла іх у такое становішча, якое яны мусяць зьмяніць. У сувязі з гэтым сярод іх адбываецца працэс эвалюцыі, якая ёсьць бадай што найвызначнейшым зьявішчам для ўсёй Канады.

У Квэбэку ёсьць два кірункі думаньня, адзін пэсымістычны, другі аптымістычны. Праблема робіцца скамплікаванай тым, што адна й тая самая асоба трымаецца абодвух пунктаў гледжаньня й дзеля розных прычын можа перастаўляцца з аднаго пункту на другі.

Пэсымістычны пагляд. Паводля гэтага пункту гледжаньня ангельская перамога на Раўніне Абрагама ў 1760 г. была такой катастрафальнай, зь якой канадыйскія французы ніколі поўнасьцьцю не аправіліся. На думку пэсымістых, на працягу двох стагодзьдзяў пасьля гэтай падзеі былі створаныя палітычныя інстытуцыі ў такой форме, якая заўсёды запэўнівала пераможцам зьверхніцтва над пераможанымі.

Пэсымісты падкрэсьліваюць таксама той факт, што лік канадыйскіх французаў на кіраўнічых становішчах у бізнэсе, прамысловасьці, гандлі й фінансавых інстытуцыях вельмі абмежаваны.

Яны цьвердзяць на аснове статыстыкі, што французская нацыянальнасьць навет у Квэбэку ня мае будучыні, што яна засімілюецца. Яе натуральны прырост зьмяншаецца. Цяпер ён ніжэйшы, як прырост у Антарыё. І іміграцыя не ўзмацняе французскай групы, 85 працэнтаў імігрантаў, якія на працягу апошніх 20-ці год аселі ў Квэбэку, улучыліся ў англамоўную групу гэтай правінцыі. Калі такая тэндэнцыя прадоўжыцца, праз адно стагодзьдзе ці

паўтара канадыйскія французы стануцца мяншынёй у Квэбэку.

Пэсымісты любяць спасылацца на ўмовы, якія былі накінутыя канадыйскім французам у Манітобе пры канцы мінулага стагодзьдзя. Яны цярпелі гэтыя ўмовы аж да нядаўнага часу, але за тое зрабілі такі выснаў: калі французы хочуць захаваць сваю нацыянальнасьць, дык ім нічога не застаецца, як утварыць сваю ўласную дзяржаву ў Квэбэку.

Гэтае цьверджаньне сталася асновай незалежніцкай філязофіі, першай філязофіі Квэбэку, або нацыяналістычнай філязофіяй канадыйскіх французаў. Незалежніцкі кірунак набраў такога насіленьня, што ён прызнаецца цяпер за вядучую інтэлектуальную й сацыяльную сілу ў Квэбэку.

Аптымістычны пагляд. Шмат канадыйскіх французаў уважаюць, што заваяваньне Квэбэку было непазьбежнай падзеяй тых часоў. Гэта аптымісты. Яны ўважаюць, што для канадыйскіх французаў, паміма некаторых сапраўды некарысных умоваў, былі таксама й карысныя. На доказ гэтага падаюць статыстычныя лічбы. У 1760 годзе канадыйскіх французаў было 60,000, у часе паўстаньня Канадыйскай Канфэдэрацыі (1867 г.) было іх крыху больш як мільён, а цапер іх ёсьць каля шасьці мільёнаў; з гэтай лічбы панад пяць мільёнаў жыве ў Квэбэку й творыць там сваю ўласную балышыню, якая прадстаўляе паважную палітычную сілу ня толькі для Квэбэку, але й для ўсёй Канады.

Аптымісты падкрэсьліваюць, што ў эканамічным жыцьці, паміма адсталасьці, канадыйскія фрацузы стварылі свае паважныя інстытуцыі, як рух крэдытовых касаў, работніцкія вуніі, фармарскія арганізацыі. Яны маюць каля двох тузінаў розных таварыстваў забясьпечаньня, якія добра праспэруюць і знаходзяцца ў поўным уладаньні й кантролі канадзкіх французаў. Бальшыня зь іх абапіраецца на каапэратыўнай філязофіі, гэта знача, што гэтыя таварыствы належаць не да капіталістаў, а да тысячаў пайшчыкаў. Апрача гэтага, тысячы канадыйскіх французаў займаюць паважныя й адказныя становішчы ў транс-Канадыйскіх, ці транс-Паўночнаамэрыканскіх прадпрыёмствах і фінансавых канцэрнах.

Аптымісты любяць адзначаць той поступ, які дасягнуты на працягу апошніх сямі-васьмі год у галіне асьветы,

сацыяльным забясьпечаньні, публічнай маральнасьці, у публічнай абслузе Квэбэку ды ў удзеле канадыйскіх французаў у палітычным жыцьці на ўсіх узроўнях. Такія асобы, як мэр Мантрэалю Жан Драпо, Морыс Совэ, ды іншыя вядучыя палітычныя фігуры, узьнімаюцца высока над усімі тымі палітыкамі канадыйскіх французаў, што дзеялі 20 год таму назад.

Частка другая: Дачыненьні да Канады. Пэсымістычны кірунак думаньня заняў такое становішча, якое вымагае ўсё большай і большай аўтаноміі й незалежнасьці для Квэбэку. Ён ня надта цікавіцца палажэньнем французаў у рэшце Канады. Ён ня надта зацікаўлены абяцанкамі зраўнаньня ў правох канадыйскіх французаў Фэдэральным урадам. Ён кажа: «Мы маем сваю прыладу ўлады, якую мы можам фармаваць згодна з нашымі асьпірацыямі. Прыладай гэтай ёсьць урад Квэбэку й інстытуцыі, што падпарадкоўваюцца ягонаму аўтарытэту. Давайце сканцэнтруем на ім усю сваю энэргію, і гісторыя пакажа, што мы можам зрабіць. Іншымі справамі мы займемся пазьней.»

Кірунак гэты не адкідае Канады. Некаторыя канадыйцы паза Квэбэкам называюць пэсымістаў «ізаляцыяністамі». Але яны ня маюць рацыі, бо ў васнаўным пэсымісты ня ёсьць ізаляцыяністамі. Яны толькі хочуць прадставіць Квэбэк у найлепшым сьвятле перад усімі краінамі сьвету. Яны думаюць аб новых сувязях – перадусім з франкамоўнымі краінамі, але таксама й зь іншымі краінамі Паўночнай й Паўдзённай Амэрыкі.

Аптымісты Квэбэку відзяць вялікую карысьць у тым фэдэрацыйным тыпе палітычнай структуры, якая была ў Канадзе на працягу мінулага стагодзьдзя. У галіне асабістай свабоды, кажуць яны, мы цешыліся фундамэнтальнымі правамі на працягу цэлага стагодзьдзя. Канада была й ёсьць аднэй з тых краінаў сьвету, у якіх грамадзкая й палітычная свабода адзінкі старанна ахоўваецца палітычнымі й юрыдычнымі ўладамі. Што мы мелі гэтую свабоду ў Квэбэку, трэба заўдзячваць гэта ў значнай меры таму факту, што мы былі часткай большага арганізму – цэлай Канады, якая ставілася спрыяльна да свабоды адзінкі.

Аптымісты кажуць таксама, што канадыйскія французы, паміма таго факту, што яны не заўсёды дасягаюць вышэйшых ступеняў герархічнай дабрыні ў эканамічным

жыццьці – усё-ж шмат скарысталі з таго тыпу эканомікі, якая разьвілася ў Канадзе. Частка Квэбэку на захад ад места Квэбэку ёсьць, дзякуючы гэтаму, параўнальна заможнай краінай. Гэта трэба заўдзячаць у значнай меры таму факту, што мы ў Мантрэалі зьяўляемся адным зь вялікіх цэнтраў эканамічнай і фінансавай дзейнасьці для ўсёй Канады. Аптымісты падкрэсьліваюць, што вельмі добра, што Квэбэк мае фэдэрацыйны тып лучнасьці з рэштай Канады і што гэту лучнасьць – стагоднюю ўжо – трэба працягваць далей, але пад тэй умовай, што будуць уведзеныя значныя зьмены. Прадстаўнікі аптымістычнага кірунку любяць падкрэсьліваць, што бяз прызнаньня англамоўнай Канады большай гарантыі праўдзівага зраўнаньня ў культурным жыцьці канадыйскіх французаў на агульна-канадыйскім узроўні – цяжка будзе ўтрымаць лучнасьць Квэбэку з рэштай Канады, бо гэта лучнасьць будзе штучнай.

Роўнасьць у культуры. Мы мусім запрапанаваць Квэбэку большыя гарантыі, што моўная й культурная роўнасьць стануцца рэальнымі. Урад у Атаве робіць вельмі шмат у гэтым кірунку, таксама й палітычныя лідары, як прэм'ер Джон Робартс у Антарыё, Даф Роблін і іншыя. Прэм'ер Альбэрты Эрнэст Манінг зрабіў магчымым атрыманьне ўнівэрсытэцкага дыплёму з пэдагогікі для тых студэнтаў, што вучацца ў нармальнай двумоўнай школе. Але поступ у гэтым кірунку запавольны, каб мог задаволіць канадыйскіх французаў Квэбэку.

Спэцыяльны статус. Гэты пункт ёсьць косьцяй нязгоды між намі й застанецца такім празь некалькі год. Шмат квэбэканцаў прышло да выснаву, што Квэбэк, як адменнае грамадзтва із сваімі ўласнымі праблемамі, мусіць мець адменны статус у фэдэральнай сыстэме Канады. Квэбэк – гэта правінцыя з франкамоўнай бальшынёй, але ён патоне сярод 200 мільёнаў англямоўнага насельніцтва Паўночнай Амэрыкі. Гэта вельмі добра, што, як кажуць, фэдэральны ўрад Канады можа забясьпечыць роўнасьць абедзьвюх культураў і абедзьвюх моваў (ангельскай і французскай). Але канадыйскія французы Квэбэку ня могуць палягаць на гэтым запэўніваньні, бо яны добра памятуюць гісторыю апошняга стагодзьдзя, на працягу якога фэдэральны ўрад ня мог выказацца вызначнымі дадзенымі на іх карысьць. Канадыйскія французы із сваёй «цьвярдыняй» у Квэбэку ня зьбіраюцца здаваць гэтай цьвярдыні

ў замен за абяцаньне добрай волі. Яны хочуць дадатковых гарантыяў да тых, што можа даць фэдэральны ўрад, і каб гэтыя дадатковыя гарантыі былі ў руках квэбэцкага ўраду. Прыкладам такіх дадатковых гарантыяў ёсьць адмысловы плян старэчай пэнсіі для Квэбэку, які запэўнівае поўны аўтарытэт квэбэцкага ўраду ў гэтай галіне. Гэты прыклад прызнаюць аптымісты ў Квэбэку, якія хочуць, каб квэбэканскі ўрад меў падобны аўтарытэт і ў іншых галінах жыцьця, калі гэты ўрад мае выконваць сваю ролю ў разьвіцьці французскай культуры ў Паўночнай Амэрыцы. Аднак аптымісты ня ёсьць за тым, каб фэдэральны канадыйскі ўрад быў пазбаўлены ўсёй улады. Тут ёсьць шмат месца для дыскусіі, якая дамоўленасьць мае быць з Квэбэкам, каб заспакоіць тыя ягоныя спэцыфічныя вымогі, якія дадуць яму магчымасьць выказацца больш самастойна, чымся іншыя правінцыі Канады.»

(Паводля «Канадыен Сін»)

(«Весткі з Канады» – «Беларус» нр. 130-131, 1968).

Канфэрэнцыя ў справе праўнага стану культураў у Канадзе

13 сьнежня 1968 году ў Таронта адбылася канфэрэнцыя ў справе праўнага стану культураў. Ад беларусаў – ЗБК браў у ёй удзел др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч, які ўважаў і пераконваў беларускае грамадзтва Канады аб патрэбе, мага найактыўней, уключацца ў грамадзкае, а асабліва палітычнае, жыцьцё Канады, бо толькі тады мы можам мець вагу й значэньне ў краіне, у якой жывем, ды гэтым прапагуем беларускае імя. Аб канфэрэнцыі, што звалася "Thinkers' Conference" і аб праўным стане культураў у Канадзе ён гаворыць у ніжэй паданым артыкуле:

«Шматкультуралізм заміж двукультуралізму

Ад часу, калі ў франкамоўным Квэбэку пачаўся сэпаратызм аж да аддзяленьня гэтай правінцыі ад Канады ў сваім скрайнім імкненьні, урад Канады пачаў процідзеяць гэтым імкненьням, але ня сілай і тэрорам, як дзеіць у такіх выпадках бальшавіцкая Масква, а разумнымі дэмакратычнымі мерапрыёмствамі. Уся ўвага была ськіравана на тое, каб сам народ, усе правінцыі, усе пласты грамадз-

тва, усе этнічныя й рэлігійныя групы й арганізацыі Канады абмяркавалі адміністрацыйныя й нацыянальна-культурныя дачыненьні ў Канадзе, выказаліся пра недахопы ў палітычных, сацыяльных і культурных дачыненьнях і далі свае канкрэтныя праекты направы.

З гэтай мэтай была створаная ўрадавая Камісія Білінгвалізму і Бікультуралізму, якая пранікла ўва ўсе каморкі канадыйскага грамадзтва ўлучна з этнічнымі групамі, каб сабраць матар'ялы для сужыцьця між найвялікшымі групамі Канады – англасаксонскай і французскай. У гэтым свайго роду рэфэрэндуме прыймалі ўдзел і беларусы. Былі разгледжаныя й прадыскутаваныя Камісіяй два беларускія праекты – «брыфы», апрацаваныя др. Б. Рагулям і мгр. А. Грыцуком.

Вынік некалькігадовай працы Камісіі Білінгвалізму і Бікультуралізму хутка выйдзе з друку ў 2-ох тамох. Але выснавы Камісіі ведамыя ўжо: Камісія прызнае мовы – ангельскую й французскую за афіцыйныя мовы Канады на фэдэральным узроўні й абедзьве культуры за роўназначныя. На правінцыянальным узроўні мае пераважаць мова бальшыні насельніцтва. У школах таксама пераважае мова бальшыні насельніцтва дадзенае правінцыі, але ў вакругах, дзе лік насельніцтва з другой мовай даходзіць да 10% і больш – у школах можа быць уведзена й другая мова.

Выснавы Камісіі ставяць у нявыразнае становішча тых канадыйцаў, што не належаць ані да англасаксонскай групы, ані да французскай. Тым часам гэты трэйці элемэнт, што складаецца з большых і меншых этнічных групаў, як немцы, італьянцы, украінцы, галяндцы, палякі, жыды, грэкі, беларусы й іншыя – на сяньняшні дзень складаюць каля траціны ўсяго насельніцтва Канады. У працэнтных дачыненьнях да першых элемэнтаў – трэйці элемэнмт мае тэндэнцыю да сталага ўзросту. Вось параўнаньне працэнтных дачыненьняў з 1901 і 1961 гадоў:

	1901	1961
Брытыйцы	57%	44%
Французы	31%	30%
Трэйці элемэнт	12%	26%

Калі-б трэйці элемэнт, згодна з выснавамі Камісіі Б. і Б., быў абойдзены ў новай канстытуцыі Канады, чацьвер-

тая частка грамадзян Канады апынулася-б у сэнсе культурным і моўным у становішчы няйнакш горшай, другой катэгорыі канадыйцаў, што супярэчыць дэмакратычным прынцыпам і парушае асновы чалавечых правоў. А ўсімі прызнаецца, што гэты трэйці элемэнт зрабіў вялізарны ўклад у разбудову Канады й разьвіцьцё канадыйскай культуры.

Сьвядомасьць такой небясьпекі для трэйцяга элемэнту завайстрылася, калі стала ведамым, што канстытуцыйная камісія хутка мае прыступіць да апрацоўкі новай канстытуцыі Канады. Вось чаму дзеячы этнічных групаў на чале з сэнатарам Паўлам Юзыкам – украінскага паходжаньня – пастанавілі склікаць канфэрэнцыю этнічных групаў пад назовам: Канфэрэнцыя ў Справе Праўнага Стану Культураў (Тсынкэрс Конфэрэнс он Кальчэрал Райтс – Thinker's Conference on Cultural Rights).

Канфэрэнцыя гэта была зарганізавана ў Таронта 13-15 сьнежня летась (1968 г.), пад старшынствам сэнатара Юзыка, які ёсьць старшынём і Камісіі Сэнату, што была патранатам Канфэрэнцыі.

У Канфэрэнцыі прыняло ўдзел 150 дэлегатаў ад 20-ці этнічных групаў і 50 назіральнікаў. Дэлегатам ад беларусаў – ЗБК быў др. В. Жук-Грышкевіч.

Тэмай першага дня Канфэрэнцыі было: **Правы й абавязкі групаў з рознымі культурамі ў канадыйскім жыцьці.**

Рэфэраты на гэту тэму мелі: сэнатар Юзык – «Выяўленьне новай сілы ў выяўленьні новай Канады»; Р. Шульгін з СіБіСі – «Канадыйскія этнічныя мяншыні й іх пазыцыя ў дачыненьні да дзьвюх большых моўных групаў»; Омар Пітэрс – прэзыдэнт Індыянска-Эскімоскага Згуртаваньня – «Правы Індыянаў і Эскімосаў у справядлівым грамадзтве»; Вольтэр С. Тарнапольскі – дзекан юрыдычнага факультэту ўнівэрсытэту ў Віндзары – «Групы з рознымі культурамі і новая канадыйская канстытуцыя».

Тэмай другога дня было: **Утрыманьне культурных традыцыяў ў Канадзе. Рэфэраты:** «Матывацыя да самавыяўленьня ў формах розных культураў» – др. В. Сушынскі – прафэсар псыхалёгіі Атаўскага унівэрсытэту; «Роля аьветы ў захаваньні традыцыяў культуры» – В. Г. Дэйвіс, міністар асьветы Антарыё; «Роля грамадзян і грамадзкіх групаў у захаваньні традыцыяў шматлікіх культураў» – сэнатар Андру Томпсон (наш добры знаёмы й прыяцель); «Трэйці элемэнт, як раўнаважнік культураў у васабовасьці

канадыйца» – др Клів Н. кардынал, з Рысэрч Цэнтру для Этнічных Студыяў на універсытэце ў Кальгары.

Тэмай трэйцяга дня – 15 сьнежня – была: «**Дзяржаўная палітыка й захаваньне традыцыяў шматлікіх культураў**». Даклад на гэту тэму зрабіў Клёд Раян – рэдактар Мантрэальскай газэты «Ле Дэвуар». Гэты даклад быў бадай што найцікавейшы ня толькі сваім зьместам, але й тым фактам, што гэта быў голас другога боку двумоўнай Канады – французскага боку. І гэты голас выказаўся за шанаваньне й захоўваньне шматлікіх культураў этнічных групаў, а навет за ўвядзеньне іхных моваў у школы ў тых мясцовасьцях, дзе знаходзіцца дастатковая колькасьць грамадзян дадзенай этнічнай групы.

Я наўмысьля пералічыў ўсе тэмы дакладаў і рэфэратаў, каб можна было пабачыць, як паважна, глыбока й шырока абмяркоўвалася на Канфэрэнцыі справа ўтрыманьня й перахоўваньня моваў і культураў этнічных групаў Канады – улучна з нашай беларускай.

Да якіх-жа выснаваў прыйшла Канфэрэнцыя? Адказ на гэтае пытаньне даюць нам рэзалюцыі Канфэрэнцыі, пададзеныя асобна. Але для паўнаты інфармацыі трэба сказаць, што Канфэрэнцыя была вельмі ўдачнай і дасягнула сваю мэту. Зь яе выснавамі й пастановамі напэўна будзе лічыцца канстытуцыйная камісія. Канфэрэнцыя аднагодна пагадзілася з двумоўнасьцяй Канады, але такжа аднагодна адкінула двукультуралізм і выказалася за шматкультуралізм, г. зн. за пашану да моваў і культураў усіх этнічных групаў і за перахоўваньне іх дзеля агульнага дабра Канады й яе культурнага ўзбагачэньня.

Канфэрэнцыя паказала таксама, што трэйці элемэнт – гэта вялікая сіла, зь якой трэба лічыцца. Яна сьцьвердзіла, што ў Канадзе ёсьць усе магчымасьці для разьвіцьця кажнай этнічнай групы й ейнай культуры й што гэтыя магчымасьці забясьпечаныя правам. У новай канстытуцыі права гэтае мае быць ня толькі прызнанае, але й пашыранае. Такім чынам, доля й будучыня кажнай этнічнай групы будзе залежыць ад яе самой, ад тых людзей, зь якіх яна складаецца, ад іх адданасьці сваёй нацыянальнасьці й культуры ды ейнай актыўнасьці.

Шкада, што беларусы Канады выявілі мала зацікаўленьня да гэтай Канфэрэнцыі й абмежаваліся да аднаго дэлегата. Тут можна было гэтулькі цікавага пачуць і шмат чаго навучыцца, спаткаць гэтулькі цікавых людзей

і навязаць зь імі шырэйшыя кантакты. Відаць, мы забываемся, што засклепліваньне жыцьця й думкі не дае карысьці ні для сябе, ні для нашай справы, а нашая адсутнасьць на міжнацыянальных зборышчах адсоўвае нас ад агульнага ходу канадыйскага жыцьця. Трэба памятаць аб гэтым і не засклепліваццa ў сваім толькі хатнім штодзённым жыцьці. **Ж.**»

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 141, 1969.)

Рэзалюцыя Канфэрэнцыі ў Справе Праўнага Стану Культураў Канады:

1. Канфэрэнцыя падтрымлівае стараньні фэдэральнага й правінцыянальных урадаў у справе падрыхтаваньня новай канстытуцыі Канады, але станоўча адкідае канцэпцыю двукультурталізму й дамагаецца прызнаньня шматкультуралізму ў Канадзе.

2. Канфэрэнцыя прапануе фэдэральнаму ўраду ўтварыць дарадны орган пры ўрадзе, які-б займаўся справамі этнічных групаў і запэўніў ім поўны ўдзел у разьвіцьці культуры Канады.

3. Канфэрэнцыя дамагаецца пашырэньня Рады Народнага Мастацтва (Фолк Арт Каўнсіл) і поўнага маральнага й фінансавага падтрыманьня яе ўрадам на ўсіх урадавых узроўнях.

4. Утрымоўваныя з публічных фондаў установы інфармацыі, такія як СіБіСі – павінны ў сваіх праграмах прызначаць належнае месца шматлікім культурам Канады.

5. Школьныя ўлады павінны пашырыць праграмы ў навучаньні моваў. Курсы моваў усіх этнічных групаў павінны быць прызнаныя як прадметы, што даюць крэдыты на матрыкуляцыйным узроўні.

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 141, 1969.)

Ліга БНР і рэарганізацыя Рады БНР

Як сябра Рады БНР і старшыня Сэктару Рады БНР на Канаду др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч уважаў, што зьмена палітычнай сытуацыі, ды зьмены ў жыцьці беларускай эміграцыі вымагаюць перагляду й рэарганізацыі Рады БНР і стварэньня нацыянальна-палітычнай бээнэраўскай

арганізацыі – Лігі БНР, якая была-б заплеччам Рады БНР. Справы гэтыя ён дыскутуе з Старшынём Рады БНР інж. Міколам Абрамчыкам, які ў гэтым 1968 г. наведаў Канаду, з сябрамі Сэктару Рады БНР у Канадзе, ды аб патрэбе арганізацыі Лігі БНР піша ў «Вестках з Канады» – «Беларус», 131, 1968, у артыкуле «Ліга БНР вельмі на часе».

Як дыскусійны матар'ял др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч падрыхтаваў Праект рэарганізацыі Рады БНР у двох разьдзелах для разгляду на 10-ай Сэсіі Рады БНР, што адбылася 13 красавіка 1968 году ў Нью Ёрку.

«У трэцім разьдзеле гэтай працы мае быць праект статуту рэарганізаванай Рады БНР ды праграма й статут Лігі БНР,» – кажа аўтар у канцы другога разьдзелу «Праекту».

Першыя два разьдзелы былі разгледжаны, узгоднены ды прыняты 10-ай Сэсіяй Рады БНР.

На 10-ай Сэсіі Рады БНР 13-га красавіка 1968 году др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч быў выбраны Першым Заступнікам Старшыні Рады БНР. («10-ая Сэсія Рады БНР», «Беларус», Нью Ёрк, 132, 1968.)

«Ліга БНР вельмі на часе

Беларуская эміграцыя, хоць ёсьць палітычнай эміграцыяй, дагэтуль ня мае ані палітычных партыяў, ані выразнай незалежніцкай бээнэраўскай арганізацыі. Хтось мо' пакажа на Раду БНР. Але Рада БНР – гэта палітычна-дзяржаўная інстытуцыя, а не масавая незалежніцкая арганізацыя. Рада БНР і яе выканальны ворган – гэта наш парлямэнт і ўрад на эміграцыі. Яны маюць свае палітычныя заданьні ў міжнародным палітычным жыцьці, але не займаюцца нацыянальнымі справамі ў паасобных асяродках, як не займаюцца таксама й палітычным узгадаваньнем нашага грамадзтва. Гэта належыць да заданьняў самога грамадзтва. І чым больш грамадзтва выпрацаванае нацыянальна й палітычна, тым жывейшы ўдзел яно прыймае ў нацыянальным жыцьці, тым мацней і згадней яно рэагуе на падзеі, шкодныя нашай вызвольнай справе, тым больш яно можа зрабіць для гэтай справы.

Рада БНР рэпрэзэнтуе БНР, рэагуе на падзеі, што датычуць Беларусі, складае, куды трэба, пратэсты, мэмар'ялы, выдае маніфэсты, заклікі, дэкляцыі, ды ўтрымлівае дачыненьні з палітычнымі дзейнікамі дзяржаваў вольнага

сьвету, а за ўсёй дзейнасьцяй Рады БНР стаіць грамадзтва, што яе падтрымлівае.

Але ёсьць выпадкі – вельмі частыя – калі падтрыманьне грамадзтва мусіла-б быць больш актыўнае, больш відавочнае, каб мець патрэбны эфэкт, патрэбны вынік. У такіх выпадках няма каму заняцца такой падтрымкай, няма каму зарганізаваць яе, бо няма бээнэраўскай незалежніцкай арганізацыі. Добра, што ў нас час ад часу зьяўляецца прыватная ініцыятыва або ініцыятыва тэй ці іншай грамадзкай арганізацыі ў палітычных выступленьнях, але гэтым «час ад часу» не адбудзеш, бо паняволяньне нашага народу ня ёсьць «час ад часу» толькі, а сталым, дык і змаганьне зь ім мусіць буць сталым і безупынным.

Далей, цяжар і адказнасьць беларускай незалежніцкай дзейнасьці ня можа ўскладацца толькі на Раду БНР, на яе сяброў, цяжар гэты мусіць несьці й нашае грамадзтва. Добра, што нашыя грамадзкія арганізацыі бяруць гэты цяжар на сябе, але яны бяруць яго толькі часткова, бо грамадзкі характар гэтых арганізацыяў абмяжоўвае іх шмат у чым, і яны ня могуць заняцца бээнэраўскімі справамі поўнасьцьцю. Трэба ўзяць увагу й на той факт, што ў грамадзкіх арганізацыях ёсьць людзі розных перакананьняў і зь імі таксама трэба лічыцца. Толькі незалежніцкая бээнэраўская арганізацыя, як Ліга БНР, магла-б заняцца поўнасьцяй бээнэраўскімі справамі й даць поўнае падтрыманьне Радзе БНР.

Мы, беларуская эміграцыя, расьсеяныя па ўсім сьвеце ў большых, ці меншых асяродках, але ў сэнсе перакананьняў – у нас адна мэта й заданьне: вызваленьне нашай бацькаўшчыны. Асягнуць гэту мэту нам будзе куды лягчэй, калі ўсе бээнэраўцы задзіночацца ў вадну арганізацыю – Лігу БНР і скаардынуюць свае высілкі.

Згуртаваньне беларусаў-незалежнікаў вельмі на часе ў гэтым 1968 годзе, бо гэты год ёсьць годам залатога юбілею Беларускай Народнай Рэспублікі, бо наш вораг – акупант Беларусі павёў сваёй шалёнай прапагандай наступ на БНР, каб стаптаць і апаганіць гэты сьвяты нам юбілей, каб зьнявечыць гістарычную праўду аб БНР і замяніць гэтую праўду хвальшывым нібы то легалізмам дзяржаўнасьці сваёй БССР. Нашым абавязкам ёсьць даць рашучы адпор варожаму наступу супольным злучаным высілкам якраз цяпер, якраз у гэтым годзе. **Ж.**»

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 131, 1968)

«Праект рэарганізацыі Рады БНР

(Узгоднены з прэзыдэнтам Абрамчыкам і разгледжаны й прыняты на 10-ай Сэсіі Рады БНР)

I. Чаму патрэбна рэарганізацыя

Аднаўленьне Рады БНР 28 сьнежня 1947 г. ў Нямеччыне прайшло ў ня зусім спрыяльных абставінах. Аснаўная маса беларускай эміграцыі перабывала ў лягерох. Вісеў над ёй яшчэ сьцень страху рэпатрыяцыі пад прымусам, была няпэўнасьць будучыні, нявыразнасьць агульнапалітычнай сытуацыі. Трэба было сьпяшацца з арганізацыяй аўтарытэтнага прадстаўніцтва.

Увосень 1946 г. было ўзгоднена з старэйшымі беларускімі палітычнымі дзеячамі, што пры аднаўленьні Рады БНР трэба ахапіць як мага шырэй актыў палітычных і грамадзкіх дзеячоў.

Паколькі ў нас ня было палітычных партыяў і, апрача Францыі й Ангельшчыны, ня йснавалі йшчэ грамадзкія арганізацыі, якія маглі-б паслаць у Раду сваіх прадстаўнікоў, было пастаноўлена ўлучыць у склад Рады БНР кожнага грамадзка-палітычнага дзеяча, які сваёй мінулай дзейнасьцяй стварыў сабе аўтарытэт у беларускім грамадзтве ды меў адпаведныя кваліфікацыі. Актывам старэйшых і быў складзены сьпіс гэткіх людзей у ліку 72 асобаў, у якім на першым мейсцы стаялі, паслы Польскага Сойму з Заходняй Беларусі, удзельнікі Усебеларускага Кангрэсу 1917 году, вайскавікі таго часу й старэйшыя заслужаныя грамадзкія дзеячы.

28 сьнежня 1947 г. адбылася інаўгурацыйная сэсія, на якой гэтыя 72 кандыдаты склалі ўрачыста прысягу вернасьці БНР. Далей папаўненьне праходзіла павальней – паводля таго-ж прынцыпу. Пад канец 1954 г. Рада мела 142 радных.

Прыблізна да 1956 г. сябры Рады выяўлялі максымальную актыўнасьць і энтузіязм. Рада БНР здабыла сабе пашану ня толькі сярод эміграцыяў іншых народаў, але прадстаўнікамі Рады БНР трактаваліся праблемы й зь дзейнікамі дзяржаўных народаў (з Данскім Урадам у 1948 г., з Ватыканам у 1951 г. ды іншымі). Вялікую ролю адыграла Рада БНР у арганізацыі амэрыканцамі акцыі «вызваленьня ад бальшавізму» (Амэрыканскі Камітэт, Радыё «Вызваленьне», Інстытут Вывучэньня СССР) і ў арганіза-

цыі Лігі вызваленьня народаў Савецкага Саюзу (Парыскі блёк).

Зьмена курсу ў міжнароднай палітыцы Амэрыкі – ад «сьцюдзённай вайны» да каагзыстэнцыі й разьвіцьцё нуклеарнае зброі – стварыла псыхоз стабілізацыі. На людзей, якія свой удзел у нашым вызвольным руху ўзаляжнялі ад міжнароднай каньюнктуры, гэта моцна падзеіла. Пэрспэктыва вызваленьня Беларусі здавалася ім занадта далёкай, калі не безнадзейнай. Каля чверці сяброў Рады сталіся абыякавымі, пасыўнымі – улучна з выпадкамі выразнага дэзэртырства. 12 высокавартасных сяброў адыйшло на вечны супакой.

Рада патэнцыянальна аслабела, тымчасам як бальшавіцкая прапаганда супраць нас непамерна ўзмацнілася. Апрача брашураў пашквільнага характару, Радзе БНР, Усебеларускаму Кангрэсу 1917 году пачалі прысьвячацца вялікія артыкулы ў гэткіх органах, як «Полымя» й «Весьці Акадэміі Навук БССР».

Сяньня тым больш відавочна, што Рада БНР небясьпечная для акупанта. Бальшавіцкія навукоўцы ў пошуках «абгрунтаваньня» юрыдычна-праўных падставаў «сувэрэннасьці» БССР атакуюць БНР, хоць міжволі ды ўскосна мусяць даваць і довады, што гэткія правы сувэрэннасьці належаць Радзе БНР, не зважаючы на перабываньне яе на эміграцыі, не зьмяняе істотна ейнага значэньня. Абапіраючыся на беларускую эміграцыю, Рада БНР сталася адзіным праўным рэпрэзэнтантам сувэрэнных правоў беларускага народу, бо дзяржаўны лад Беларускае Народнае Рэспублікі быў зьнішчаны брутальна чужымі варожымі сіламі Савецкай Расеі супраць волі беларускага народу, бо народ гэты пазбаўлены акупантам свабоды ды ўсякіх магчымасьцяў выяўленьня свайго голасу, бо беларуская эміграцыя, як адзіная вольная частка сувэрэннага беларускага народу, мае ня толкі права, але й абавязак змагацца ўсімі магчымымі спосабамі за вызваленьне БНР ды, зразумела, мае права й абавязак тварыць дзеля гэтае мэты арганізацыі й палітычны орган, што кіруе гэтым змаганьнем ды рэпрэзэнтуе паняволеную БНР у міжнародным палітычным жыцьці да часу вызваленьня яе.

Органам гэтым ёсьць Рада БНР на выгнаньні, якая сталася ня толькі кіраўнічым цэнтрам і палітычным рэпрэзэнтантам беларускае эміграцыі, але й натуральным спадкаемцам тае Рады БНР, што мела паўнамоцтвы Усебеларускага Кангрэсу 1917 году.

Выходзячы з вышэйсказанага, трэба зрабіць наступныя высновы:

1. Беларуская эміграцыя мусіць за ўсякую цану захаваць і ўтрымаць Раду БНР на выгнаньні як адзіны палітычны й рэпрэзэнтатыўны орган, што стаўся натуральным спадкаемцам тае Рады БНР, якая была абрана Усебеларускім Кангрэсам 1917 году.

2. Дзеля таго, што апошнімі гадамі адбыліся некаторыя зьмены ў пэрсанальным складзе Рады БНР і дзейнасьць ейная падупала – канечна трэба зрабіць строгі падлік бээнэраўскіх сілаў, папоўніць недахопы й правесьці рэарганізацыю Рады.

3. Паколькі за 25 год існаваньня Рады БНР на выгнаньні адбыліся паважныя зьмены ў міжнароднай палітычнай сытуацыі ды значныя зьмены ў беларускай эміграцыі, трэба ўзяць на ўвагу гэтыя зьмены пры рэарганізацыі Рады БНР, каб датарнаваць яе да цяперашніх абставінаў.

II. Арганізацыйная база Рады БНР на выгнаньні

Трэба абаперці Раду БНР на шырэйшай грамадзкай аснове. Прапануецца, каб сябры Рады абіраліся грамадзтвам, за выняткам спэцыялістых, якіх вызначае Прэзыдыюм Рады. Дзеля таго, аднак, што ў беларускай эміграцыі няма ніводнае палітычнае арганізацыі, а грамадзкія арганізацыі ня ўсе маюць выразнае палітычнае становішча, прапануецца стварыць масавую палітычную арганізацыю бээнэраўцаў і на ёй найперш абаперці Раду БНР на выгнаньні. Мабілізацыя бээнэраўцаў патрэбная й затым, што нашая бээнэраўская дзейнасьць значна заняпала, а наступ бальшавіцкае прапаганды супраць БНР узмоцніўся.

Гэтая масавая арганізацыя магла-б называцца ЛІГАЙ БНР, у аснову свае ідэалёгіі й праграмы магла-б узяць Устаўныя Граматы Рады БНР, рэзалюцыю Усебеларускага Кангрэсу 1917 г. ды пастановы Рады БНР. Ліга БНР запоўніла-б той прабел, які існаваў у нас дагэтуль: мы маем Раду БНР – дзяржаўную установу, але ня маем ніводнае палітычнае арганізацыі, якая давала-б палітычнае ўзгадаваньне нашаму грамадзтву.

Пачынальнікамі Лігі БНР, даючы добры прыклад для іншых, павінны былі-б стацца ўсе цяперашнія сябры Рады БНР. Да гэтага аснаўнога ядра дайшлі-б бээнэраўцы,

што ня сталіся раднымі. Гэткія бээнэраўцы ёсьць у кажным беларускім асяродзьдзі, але яны (зрэшта й радныя) чамусьці ня ўцягваліся ў палітычную дзейнасьць, ад іх не вымагалася маральнага й матар'яльнага падтрыманьня гэтае дзейнасьці, адказнасьць і ўтрыманьне якой ускладалася найперш на радных. Вэрбаваньнем гэтых бээнэраўцаў мусілі-б заняцца мясцовыя сэктары Рады, засноўваючы мясцовыя аддзелы Лігі БНР. Пасьля заканчэньня вэрбаваньня ўсіх пераконаных бээнэраўцаў трэба было-б зрабіць арганізацыйны зьезд Лігі БНР, на якім былі-б прынятыя праграма й статут. Заснаваньне Лігі БНР было-б прыгожай і карыснай падзеяй на юбілейны 1968 год, як стварэньне жывое памяткі 50-ці годзьдзя абвешчаньня незалежнасьці БНР. За арганізацыю Лігі трэба было-б узяцца як найбарджэй, каб можна было-б абаперціся на ёй пры ўтварэньні рэарганізацыі Рады. Для ўспраўненьня арганізацыі Лігі варта было-б стварыць адмысловую камісію зь ініцыятывы Прэзыдыюму Рады.

Праз арганізацыю Лігі БНР можна было-б узмоцніць палітычную дзейнасьць, якой дагэтуль мы займаліся толкі выпадкова. Было-б тады каму заняцца рознымі палітычнымі праявамі, навет масавымі (прыкладам дэманстрацыямі), якія канечна патрэбныя ў нашым палітычным жыцьці, у змаганьні, а якімі, з розных прычынаў, ня могуць займацца грамадзкія арганізацыі. Тыя-ж грамадзкія арганізацыі, ці аддзелы іхныя, што займаюць прабээнэраўскае становішча, маглі-б далей залічацца да заплечча Рады БНР ды абіраць ад сябе радных.

Гэткім парадкам, арганізацыйнай базай Рады БНР былі-б Ліга БНР ды бээнэраўскія грамадзкія арганізацыі. Ня вылучаюцца й іншыя беларускія грамадзкія арганізацыі, якія захацелі-б мець сваіх прадстаўнікоў у Радзе БНР. Трэба сьцьвердзіць, што ў некаторых небээнэраўскіх арганізацыях адбываецца пэўнае зрушша ў кірунку БНР, і абапіраньне Рады БНР на арганізаваным грамадзтве ўзмоцніла-б гэтае зрушша й дало-б магчымасьці гэтым арганізацыям стаць на бээнэраўскі грунт.

III. Склад і характар рэарганізаванае Рады БНР

Выбары радных маюць праводзіць дэмакратычным спосабам арганізацыі, пра якія была мова вышэй, на кожную кадэнцыю працягам 5 год згодна з адмысловай вы-

барчай інструкцыяй. Прапарцыянальнасьць выбараў усталіць Сэсія Рады.

Рэарганізаваная Рада ня мусіла-б быць вельмі лічнай (40-50 сяброў), але мусіла-б быць актыўнай ды высокаякаснай у сэнсе ідэйным, інтэлектуальным і палітычным. Выканальны орган Рады – Прэзыдыюм яе – мае быць кіраўнічым цэнтрам сэктараў і сталым палітычна-выканальным органам Рады БНР. Склад Прэзыдыюму Рады БНР ды кампэтэнцыю старшыні яго й паасобных сяброў азначае статут Рады.

IV. Як правесьці рэарганізацыю Рады БНР

а) Першым чынам Прэзыдыюм Рады ці адмысловая камісія з даручэньня старшыні Рады мусіць пазбыцца шкоднага элемэнту із складу Рады перад скліканьнем Сесіі Рады. б) Прэзыдыюм Рады, або вызначаныя радныя, мусяць падрыхтаваць праекты рэарганізацыі (улучна з гэтым праектам), якія мусяць быць разгледжаны й прадыскутаваны ў сэктарах Рады перад Сесіяй, каб радныя, што возьмуць удзел у Сэсіі, мелі свой азначаны погляд на рэарганізацыю. Праекты гэтыя мусяць быць разасланы сэктарам прынамся за месяц перад скліканьнем Сэсіі. Сэктары, якія ня здолеюць узяць удзелу ў Сэсіі, павінны прыслаць свае пісьмовыя камэнтары што да праекту ў Прэзыдыюм Рады дзеля прадстаўленьня на Сэсіі. в) Праект ці праекты рэарганізацыі мусяць быць пастаўлены на парадак дня Сэсіі. Калі праект рэарганізацыі будзе прыняты на Сэсіі – мусіць быць пастаноўлена таксама, як і калі адбудзецца рэарганізацыя Рады паводля прынятага праекту.

Да паправак статуту Рады БНР

1) Прапануецца перайсьці з дасюлешняга становішча, што прэзыдэнт БНР – спадкаёмца паводля тэстамэнту, да становішча, што прэзыдэнт абіраецца на Сэсіі Рады большынёй галасоў на кадэнцыю 5 год.

2) Затым, што згодна сучаснага статуту права пакліканьня сяброў Рады належыць вылучна прэзыдэнту БНР (хоць прэзыдэнт правам гэтым **ніколі не карыстаўся**), прапануецца што: сяброў Рады БНР абіраюць палітычныя

й грамадзкія арганізацыі, таксама на абмежаны час – кадэнцыю 5 год, а некаторую частку толькі, патрэбных спэцыялістых, пакліча Прэзыдыюм Рады.

Што да выканальных органаў

Спалучыць Прэзыдыюм Рады з Сакратарыятам Рады ў вадзін Выканальны орган. Ужыць усіх высілкаў, каб у выканальным органе мець хоць аднаго аплачванага працаўніка, які-б меў час поўнасьцяй пасьвяціцца працы па лініі Рады, як арганізацыйнай, гэтак і навонкі, рэпрэзэнтатыўнай.

У далейшым гэтай працы мае быць праект статуту рэарганізаванай Рады БНР ды праграма й статут Лігі БНР.

В. Жук-Грышкевіч
Страшыня Канадзкага Сэктару Рады БНР

14 лютага, 1968 году.»

«Ідэёвыя вытычныя Лігі БНР

І. Уступ

Кожны ідэйны рух, а асабліва-ж рух вызвольны, зьвязаны зь нямінулай барацьбой. Ён мусіць мець сваю ідэю, выразную ідэялёгію, волю да зьдзейсьненьня ідэі, ды арганізацыйны стрыжань, касьцяк. Ідэя дае канкрэтную мэту, дзеля якой вядзецца праца й змаганьне, ідэялёгія гэту мэту прэцызуе, выяўляе твар руху й злучае ў адно ўсіх удзельнікаў яго, а воля, якой кіруе арганізацыйны стрыжань, дае пэўнасьць у асягненьні ідэі.

Ідэя, выразная ідэялёгія, воля да асягненьня ідэі й арганізацыйны стрыжань набіраюць асаблівай важнасьці ў нацыянальна-вызвольным руху, які бяз гэтых чатырох складнікаў ня мае духовага й валявога злучыва.

Грамада людзей, хай сабе й вялікая, бяз ідэі, ідэялёгіі, волі да зьдзейсьненьня ідэі й арганізацыйнага стрыжня – нічога асягнуць ня можа. Яна разьбіваецца рознымі думкамі й імкненьнямі й ня можа быць зарганізаваным рухам, а толькі звычайнай бясформенай грамадой людзей, якая не здае сабе нават справы, чаго хоча. Такая грамада

ніколі ня можа стацца творчым дзейнікам і ня можа асягнуць аніякае мэты, а заўсёды будзе заставацца грамадзка бязьдзейнай масай. Разьбітая дробнымі імкненьнямі й асабістымі справамі, ды найчасьцей рассвараная, яна ёсьць сырым матар'ялам для чужых, сьведамых сваіх мэтаў нацыянальных групаў, ды розных варожых беларускай справе махераў, якія пастараюцца выкарыстаць гэту бясформную масу для сваіх цёмных мэтаў на шкоду беларускаму народу.

Маем добры прыклад, што сталася з масай старых беларускіх эмігрантаў у Канадзе й Злучаных Штатах, якія ня мелі ані нацыянальнай ідэі, ані арганізацыйных стымулаў. Вялікую частку іх пацягнулі чужыя цэрквы й касьцёлы, а яшчэ большую камуністычныя агенты сьцягнулі ў расейскія арганізацыі, дзе выкарыстоўваюць іх для разбудовы савецкай імпэрыі й замацаваньня паняволеньня Беларусі. Старая беларуская эміграцыя мае апраўданьне, што ў абсалютнай сваёй бальшыні яна ня мела нацыянальнай сьведамасьці й нічога ня ведала пра беларускі вызвольны рух, а ўсьведаміць яе ня было каму.

II. Заданьні нашай эміграцыі

Новая беларуская эміграцыя сьвядомая нацыянальна. У большай ці меншай меры яна была зьвязана зь беларускім вызвольным рухам на бацькаўшчыне й якраз дзеля гэтага апынулася на чужыне як палітычная эміграцыя.

У розных краінах рассяленьня яна патрапіла стварыць сваё арганізацыйнае беларускае жыцьцё. Але пасьля больш як 20-ці гадоў аказалася, што гэта жыцьцё зарганізавана вельмі слаба й што, калі наша эміграцыя не схамянецца ў час і ня ўзмоцніцца ідэйна й арганізацыйна, і яе чакае няцікавы лёс. Яна хіба што ня станецца ахвярай камунізму, але разьлезецца ў нявыразным ідэёва амэрыканскім, канадыйскім, ці іншым грамадзтве.

А наша эміграцыя – гэта-ж адзіная частка беларускага народу, вольная ад маскоўскага панаваньня, адзіная частка, што можа й павінна працягваць змаганьне за вызваленьне Беларусі ды інфармаваць увесь сьвет аб бальшавіцкіх зьдзеках і паняверцы над беларускім народам. Рабіць гэта ёсьць нашым заданьнем і абавязкам. І калі мы гэтага абавязку ня выканаем – нас асудзяць браты й сёстры нашы на бацькаўшчыне, нас асудзіць і наша гісторыя.

Жывём мы ў трывожным часе, калі стабільнасьць сьвету, збудаваная на хісткім грунце спаўіснаваньня розных палітычных сыстэмаў, банкрутуе, калі савецкая імпэрыя дрыжыць ад вонкавай і нутраной няпэўнасьці. **Вось, вось гатовы выбухнуць новы сусьветны канфлікт, які можа высунуць на парадак дня вырашэньне лёсу паняволеных Масквой народаў і мы, беларусы, ізноў акажамся непадрыхтаванымі да гэтага, як і ў часе папярэдніх дзьвюх сусьветных войнаў.** (Падкрэсьлена мною, Р. Ж.-Г.).

Таму з кожным днём становіцца больш відавочнай веліч і значэньне ролі беларускай эміграцыі для нашай бацькаўшчыны, для яе змаганьня за сваё нацыянальнае існаваньне. Не дарма-ж савецкая прапаганда так заўзята атакуе нас. Зразумела таксама, чаму беларускія патрыёты ў БССР прыслухоўваюцца так уважна да нашага голасу, сочаць за нашай беларускай работай, за нашай актыўнасьцьцю. Асабліва цяпер, калі там варочаецца сталінізм і ўсе беларускія нацыянальныя праявы заціскаюцца мацней, наша дзейнасьць ім патрэбна, як ніколі раней, бо толькі мы, беларуская эміграцыя, можам сказаць сьвету, што робіцца ў Беларусі, бо толькі мы можам процістаўіць бальшавіцкаму эрзацу беларускай дзяржаўнасьці сапраўдную незалежную беларускую дзяржаўнасьць – Беларускую Народную Рэспубліку, ды, як вольныя людзі ў вольным сьвеце, можам вясьці адкрытае змаганьне за яе.

Вось якія заданьні й абавязкі беларускай эміграцыі перад бацькаўшчынай.

III. Чаму нам патрэбна Ліга БНР

Ці мы разумеем значэньне й важнасьць гэтых заданьняў і абавязкаў? Ці мы выконваем іх? – Разумеем павярхоўна й выконваем толькі часткова й чым далей тым зь меншым перакананьнем і ахвотай. Чаму? – Таму, што мы ня маем моцнага ідэйнага хрыбта й блага зарганізаваныя.

Жывём мы ў дастатку й спакою, матар'яльна добра даём сабе рады й шмат на што можам сабе дазволіць, але чамусьці ня можам добра зарганізавацца, чамусьці мы слабыя й незарадныя ў выкананьні сваіх нацыянальных і грамадзкіх абавязкаў. І таму ня мы, а нас скубуць з усіх бакоў і ворагі Беларусі, і яе суседзі. А мы неяк нянадта й абстайваем сваё, мы нават не змагаемся за беларускія душы, што засіляюць нашых ворагаў і суседзяў. Мы кажам,

што яны лічнейшыя, дык і мацнейшыя за нас і нам цяжка зь імі справіцца. Так, яны мацнейшыя, але не таму, што іх больш, а перадусім таму, што яны маюць мацнейшы ідэёва-нацыянальны хрыбет і моцны арганізацыйны касьцяк, чаго нам якраз не хапае.

Чэхі й славакі маленькія народы, але патрапілі процістаўіцца маскоўскаму імпэр'ялізму з такой сілай, аб якой куды большыя народы могуць толькі марыць. Другі прыклад для нас Ізраэль. Дык ня ў лічбовасьці сіла народу ці часткі яго, а ў ідэйнасьці, адданасьці сваёй справе ды арганізацыі.

Прыгледзімся таксама да тых, што знаходзяцца ў падобных абставінах як нашы, да ўкраінцаў, палякаў і балтаў на эміграцыі, дык пабачым, што ў іх мацнейшы ідэйна-нацыянальны хрыбет як у нас, што яны маюць свае нацыянальна-палітычныя арганізацыі, якія дбаюць аб усё іхняе нацыянальнае арганізацыйнае жыцьцё, як, для прыкладу, у ўкраінцаў арганізацыя нацыяналістаў. А ў нас нацыянальнае арганізацыйнае жыцьцё, з малымі выняткамі, ідзе самапасам, без асаблівых забавязаньняў і дысцыпліны, як у якімсь клюбе для прыемнага правядзеньня часу й пляткаваньня. У нас людзі робяць што хочуць, а ня тое, што патрэбна для справы. Але-ж усім зразумела, што пры такіх адносінах мы ніякага змаганьня правясьці ня зможам і незалежнасьці Беларусі не здабудзем. І ніхто іншы для нас гэтага ня зробіць.

У нас ёсьць моцныя адзінкі й нямала адданых справе й ахвярных патрыётаў, але іх высілкі распарушаны, нескаардынаваны, а іх дзейнасьць абмежана абыякавым адношаньнем нашага масавага грамадзтва. А з другога боку, у нас няма сталага, належна зарганізаванага ідэёвага ўзьдзейваньня на гэта грамадзтва. У нас ёсьць, што праўда, групкі нашага актыву, нянадта зьвязаны між сабою, якія топчуцца ў кругу сваіх мясцовых арганізацыяў і нямала робяць для справы, але цэласьцю нашага жыцьця й шырэйшымі масамі беларусаў ня цікавяцца. Гэтыя масы пакінуты самі сабе, сваім штодзённым прыватным інтарэсам. І няма ў нас зарганізаванага дзейніка, які-б стараўся пранікнуць у душы й сэрцы гэтых людзей, даць ім патрэбныя інфармацыі аб Беларусі, зацікавіць беларускім жыцьцём, беларускай справай, прыцягнуць іх да нашай актыўнай грамады – так, як гэта робяць камуністы-масавікі ці ўкраінскія нацыяналісты.

Да абыякавых адносінаў нашых масаў да беларускага жыцьця ў значнай меры спрычыняецца поўная адсутнасьць плянавага грамадзкага й нацыянальнага ўзгадаваньня, і то ня толькі масаў, але й нашых актыўных людзей. У нас нават няма арганізацыі, якая-б гэтым займалася й дзеіла ў абсягу ўсёй нашай эміграцыі.

У нармальных, неэміграцыйных абставінах усе краіны маюць свае школьныя сыстэмы (што мы рэдка мелі дома) і палітычныя партыі, якія даюць грамадзтву нацыянальнае, палітычнае й грамадзкае ўзгадаваньне. У нашых эміграцыйных абставінах мы ня можам стварыць сваёй школьнай сыстэмы, а для палітычных партыяў тут няма грунту. Але-ж мы ня маем невет нацыянальна-палітычнай арганізацыі, для якой ёсьць і шырокі грунт, і вялікая патрэба. Калі мы ня маем сваей школьнай сыстэмы й палітычных партыяў, дык штось мусіць іх замяніць, каб наша грамадзтва разьвівалася й нармальна функцыянавала. Замяніць іх можа толькі беларуская нацыянальна-палітычная арганізацыя, якая-б: дбала аб нацыянальнае й палітычнае ўзгадаваньне беларускага грамадзтва, аб утварэньне новых кадраў, якая-б стаяла на старожы ўсяго беларускага жыцьця й старалася-б аб яго актыўнасьць і ўзрост. Гэта арганізацыя мусіла-б стацца касьцяком усяго беларускага жыцьця, стымулюючай і арганізуючай сілай, добра зарганізаванай і здысцыплінаванай.

Хтось скажа мо', што ў нас ёсьць нацыянальна-палітычная арганізацыя, гэта Рада БНР. Але', ёсьць, ды Рада БНР – гэта ня масавая нацыянальна-палітычная арганізацыя, а нацыянальна-дзяржаўная інстытуцыя, якая, поруч са сваімі парлямэнтарнымі функцыямі, выступае ад нашага імя ў міжнародным палітычным жыцьці, бароніць беларускія дзяржаўныя інтарэсы й толькі часткова ўплывае на наша грамадзкае й нацыянальнае жыцьцё зьверху. А нам не хапае масавай нацыянальна-палітычнай арганізацыі, што вырастае зь нетраў нашага грамадзтва й пранікае ўва ўсе каморкі арганізацыйнага жыцьця яго, творыць касьцяк, ідэйную й стымулюючую аснову гэтага арганізацыйнага жыцьця.

І ніякая зь існуючых у нас арганізацыяў не заменіць гэтага касьцяка. Адны зь іх маюць адмысловыя заданьні, як царкоўныя й навуковыя арганізацыі, другія-ж, як нашы грамадзкія арганізацыі, ня ўзгляднівающь палітычнага й узгадаваўчага боку ў нашым грамадзтве, ня маюць

выраблена ідэялёгіі й арганізацыйнай дысцыпліны. Нам, калі мы хочам узмоцніць наша жыццё ідэёва й арганізацыйна, патрэбна агульная нацыянальна-палітычная арганізацыя, якая-б аб'яднала ўсіх нашых актыўных людзей з усіх асяродкаў, людзей ідэйных, выраблены нацыянальна й грамадзка, якія-б сталіся зарганізаванай і здысцыплінаванай сілай нашага нацыянальнага жыцця й змаганьня за БНР. Нам трэба мець згуртаваньне такіх людзей, якія пры ўсякіх абставінах вытрымаюць пры змаганьні за нашу дзяржаўную незалежнасьць, створаць патрэбныя кадры й не дапусьцяць да заняпаду беларускага жыцця.

Без такой здысцыплінаванай нацыянальна-палітычнай арганізацыі не абыйшоўся ніводзен вызвольны рух, і мы былі-б наіўнымі, калі-б думалі, што мы безь яе можам абыйсьціся. Жывем мы ў часе й сьвеце бязупыннага змаганьня розных варожых нам агрэсыўных сілаў, дык як жа мы вытрымаем, што мы ім паставім супраць бяз моцнага ідэйнага хрыбта й добра зарганізаванага, здысцыплінаванага касьцяка? Бяз нашай рэальнай сілы яны жартуючы разложаць нас. Памятайма таксама, што беларускае грамадзтва, як і кожнае іншае, па сваёй натуры інэртнае й эгаістычнае, яно ня можа быць дзейным на доўгую мэту бяз узьдзейваньня сталай стымулюючай і арганізуючай сілы.

Мусім ведаць таксама, што ня маючы добра зарганізаванага арганізму, нельга рабіць паважнай справы, а тым больш праводзіць беларускі вызвольны рух. Ніхто з такім рухам ня будзе лічыцца: ані нашы ворагі, ані нашы прыяцелі, ані нават шырэйшыя беларускія масы.

Добра абдумаўшы ўсё тут сказанае, група сяброў Рады БНР выступіла зь ініцыятывай стварэньня беларускай нацыянальна-палітычнай арганізацыі пад назовам Лігі БНР, якая-б сталася касьцяком беларускага вызвольнага руху й беларускага арганізацыйнага жыцця. У красавіку 1968 году 10-я Сэсія Рады БНР апрабавала гэту ініцыятыву, прыняла заклік да ўсіх радных падтрымаць стварэньне Лігі БНР і дала свабоду дзеяньня ініцыятарам у арганізаваньні Лігі БНР.

Такім чынам у 1968 годзе паўстала Ліга БНР – жывая памятка на 50-я ўгодкі БНР. Пастараемся-ж запоўніць яе шэрагі й прыступіць да працы. Мусім узяць пад увагу, што кожны сьведамы беларус, які ўхіляецца ад удзелу ў

беларускім вызвольным руху, ад удзелу ў стварэньні моцнай арганізацыі гэтага руху, непаважна адносіцца да беларускай справы, чым спрычыняецца да аслабленьня, а можа й да запрапашчаньня яе, што адаб'ецца на будучыні беларускага народу.

IV. Чым ёсьць Ліга БНР

Ліга БНР ёсьць беларускай нацыянальна-палітычнай арганізацыяй. Як неад'емная частка беларускага вызвольнага руху, Ліга БНР мае ў сваёй арганізацыйнай аснове чатыры складнікі, аб якіх была мова ў уступе: ідэю, ідэялёгію, волю да зьдзейсьненьня ідэі й арганізацыйны стрыжань.

1. Ідэя Лігі БНР – незалежнасьць і непадзельнасьць Беларусі.

2. Яе ідэялёгія – канстытуцыйныя асновы Беларускай Народнай Рэспублікі: Акт 25 Сакавіка й Другая Устаўная Грамата Рады БНР (Рады Першага Усебеларускага Кангрэсу) з 9-га сакавіка 1918 году.

Акт 25 Сакавіка ўстанаўляе форму беларускай дзяржаўнасьці ў відзе незалежнай і непадзельнай Беларускай Народнай Рэспублікі ў граніцах этнаграфічнай тэрыторыі Беларусі.

Другая-ж Устаўная Грамата акрэсьлівае канстытуцыйныя асновы дзяржаўнага ладу БНР ды правы й вольнасьці грамадзян яе наступна:

а) Аснаўныя законы БНР (канстытуцыю) устанаўляе Устаноўчы Сойм, да часу-ж скліканьня яго заканадаўчая ўлада належыць да Рады БНР.

б) Выбарчыя правы: агульныя, роўныя, простыя (аднаступнёвыя, ці беспасрэднія), патаемныя й прапарцыянальныя выбары ў заканадаўчыя ўстановы для ўсіх грамадзян бяз розьніцы паходжаньня, нацыянальнасьці й рэлігіі.

в) Выканаўчая й адміністрацыйная ўлада ў БНР належыць Народнаму Сакратарыяту (Ураду) БНР, які вызначаецца Радай БНР і ёсьць адказны перад ёю.

г) Аснаўныя правы грамадзянаў БНР: роўнасьць усіх перад законам, свабода слова, друку, сходаў, арганізацыі, забастовак; свабода веравызнаньняў, нятыкальнасьць асобы й памешканьняў.

Што датычыць справы собскасьці маёмасьці й сацыяльна-эканамічных дачыненьняў, дык мусім прыняць пад

увагу, што за 51 год часу ў Беларусі адбыліся вялікія зьмены, як у сувязі з агульнай эканомікай і сацыяльнай эвалюцыяй, так і пад націскам бальшавіцкай улады. Таму такія справы, як собскасьць, і асабліва-ж зямельная собскасьць, ды справы сацыяльна-эканамічных дачыненьняў – ніяк нельга акрэсьліваць з воддалі й наперад. Пакінем іх адкрытымі, бо Бог ведае, у якім стане яны будуць у часе вызваленьня Беларусі й як трэба будзе іх вырашаць. У аснаўным жа, паданыя тут пункты ідэялёгіі Лігі БНР ёсьць агульна нацыянальныя, бо яны адпавядаюць усім беларусам-незалежнікам.

3. Ліга БНР мае нязломную волю да асягненьня сваёй ідэі: вызваленьне Беларусі й утварэньне Беларускай Народнай Рэспублікі. Воля гэта паходзіць з нас саміх, сяброў Лігі БНР, яна спрычынілася да паўстаньня гэтай арганізацыі й будзе праяўляцца ўва ўсёй нашай дзейнасьці. Дзякуючы гэтаму Ліга БНР ёсьць неад'емнай часткай беларускага вызвольнага руху і, поруч з іншымі беларускімі арганізацыямі, зьяўляецца асновай і заплеччам Рады БНР на выгнаньні.

4. Арганізацыйным стрыжнём Лігі БНР цяпер ёсьць арганізацыйныя камітэты – цэнтральны й мясцовыя, а пасьля арганізацыйнага зьезду ім станецца прынятая зьездам арганізацыйная структура Лігі.

V. Заданьні Лігі БНР

1. Праца й змаганьне за вызваленьне Беларусі.

2. Прапагаваньне ідэі вызваленьня Беларусі сярод нашых суродзічаў па ўсім сьвеце ды інфармаваньне аб тым, што робіцца ў Беларусі пад акупацыяй Масквы.

3. Сталае й плянавае ўзьдзейваньне на беларускае грамадзтва, каб яно было дзейным, актыўным для беларускай справы ў сваіх арганізацыях і паза імі ды брала ўдзел у працы й змаганьні за вызваленьне Беларусі.

4. Нацыянальнае ўсьведамленьне маласьведамых беларусаў, азнаямленьне іх з беларускай гісторыяй і культурай, з беларускім вызвольным рухам ды ўцягваньне іх у беларускае жыцьцё, беларускія арганізацыі, дзеля чаго, як і для папярэдняга пункту, мае быць апрацавана адпаведная праграма й тактыка.

5. Праца над сябрамі Лігі БНР у напрамку большага нацыянальнага й палітычнага ўсьведамленьня, адукацыя

й самаадукацыя з беларусаведы, арганізацыйнай практыкі й дысцыпліны, каб сябры Лігі БНР сталіся добрымі праваднікамі й арганізатарамі ў беларускім грамадстве і адданымі змагарамі за вызваленьне Беларусі.

6. Кажны сябра Лігі БНР мусіць належаць да тэй ці іншай беларускай арганізацыі паза Лігай, у якой павінен быць прыкладным, ды не адмаўляцца ад ускладаных на яго функцыяў.

7. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на нашу моладзь, на яе беларускае ўсьведамленьне. Трэба знайсьці да яе падыход, бяручы пад увагу, што яна тут роджаная й Беларусі ня бачыла й ня знае.

8. Уцягнуць у Лігу актыўных ідэйных беларусаў, здольных да грамадзкай працы.

9. Старацца не дапусьціць да заняпаду беларускага жыцьця вартасных беларускіх арганізацыяў. Ліга БНР ня можа дапусьціць да свайго заняпаду й мусіць старацца аднавіць вартасныя заняпалыя, а то й спрычыніцца да паўстаньня новых, арганізацыяў.

10. Рэагаваць на ўсе шкодныя беларускай справе праявы з боку нашых ворагаў і суседзяў і то ўсімі магчымымі спосабамі ўключна з прэсавымі й пісьмовымі пратэстамі ды масавымі дэманстрацыямі. Арганізаваць беларускія нацыянальныя дэманстрацыі ў выпадку патрэбы.

11. Пры выконваньні ўсіх гэтых заданьняў трэба мець на ўвеце, што Ліга БНР ёсьць яўнай дэмакратычнай арганізацыяй, лёяльнай да мясцовых уладаў на тэрыторыі свайго дзеяньня й што ўсякія нелягальныя сродкі дзеяньня не дапускаюцца, як супярэчлівыя ідэёвасьці Лігі БНР.

Ліга БНР ёсьць новай беларускай арганізацыяй у тым сэнсе, што яна нацыянальна-палітычная арганізацыя, якой да гэтага часу ў нас ня было. Але яна ня толькі не перашкаджае іншым нашым арганізацыям, але ёсьць карыснай для іх, паколькі дбае, каб беларускае жыцьцё было актыўным і плённым у працы.

Ліга БНР ня ёсьць палітычнай партыяй, бо ня мае ані акрэсьленага сьветапагляду, ані сацыяльна-эканамічнай праграмы, неабходных вымогаў для палітычных партыяў. Ліга БНР ёсьць нацыянальна-палітычнай арганізацыяй з агульна нацыянальнай мэтай вызваленьня Беларусі й агульна нацыянальнай ідэялёгіяй, аб чым гаварылася вышэй. Таму да Лігі БНР можа належаць кожны ідэйны й актыўны беларус ці беларуска, за выняткам камуністаў і

анархістаў, калі пагаджаецца з гэтымі ідэёвымі вытычнымі й зложыць сяброўскую заяву ў кіраўніцтва Лігі.

Сакавік, 1969 г.

Цэнтральны Арганізацыйны Камітэт Лігі БНР.

Арганізацыйная Інструкцыя Лігі БНР нр. 1

1. У красавіку 1968 г. 10-я Сэсія Рады БНР апрабавала ініцыятыву арганізацыі Лігі БНР і зрабіла заклік да ўсіх радных падтрымаць гэту арганізацую. Абапіраючыся на гэта, Цэнтральны Арганізацыйны Камітэт Лігі БНР зьвяртаецца з просьбай да ўсіх сэктараў Рады БНР, каб кіраўніцтвы іх пазнаёміліся самі ды пазнаёмілі сяброў радных свайго сэктару з Ідэёвымі Вытычнымі Лігі БНР і склалі сяброўскія заявы ў Лігу БНР. Уступ у Лігу БНР ёсьць дабравольны, аднак, як відаць з Ідэёвых Вытычных, дабро беларускай справы вымагае, каб у Лігу БНР увайшлі ўсе ідэйныя й актыўныя беларусы, а тым больш радныя БНР – наша ідэйная эліта.

Просьба да сэктараў таксама, каб яны пазнаёмілі зь Ідэёвымі Вытычнымі Лігі БНР іншых ідэйных і актыўных беларусаў у сваім асяродку, што ня ёсьць раднымі БНР, і каб запрапанавалі ім уступіць у Лігу БНР.

2. Зьвяртаемся з просьбай і да іншых суродзічаў, якім вышлем Ідэёвыя Вытычныя Лігі БНР разам з гэтай інструкцыяй незалежна ад сэктараў, каб і яны ўступілі ў Лігу БНР ды стараліся ўцягнуць у лік сяброў яе іншых ідэйных і актыўных беларусаў. Сяброўскія заявы можна складаць у мясцовыя арганізацыйныя камітэты Лігі, калі такія ўжо існуюць у іхных асяродках, або пасылаць беспасрэдна ў Цэнтральны Арганізацыйны Камітэт Лігі на нiжэй паданы адрас.

3. Калі ўжо будзе некалькі сяброў Лігі БНР, ці прынамся тры асобы – просіцца іх стварыць мясцовы арганізацыйны камітэт Лігі БНР з засягам дзеяньня на ўсю краіну, дзе ёсьць толькі адзін сэктар, і з засягам толькі на сваё асяродзьдзе, дзе ёсьць некалькі сэктараў, як у Амэрыцы.

4. Мясцовыя арганізацыйныя камітэты Лігі БНР на ўсю краіну вызначаюць даверaных сяброў Лігі БНР у іншых беларускіх асяродках сваёй краіны, у якіх знойдзец-

ца хоць па адной асобе, што жадаюць быць сябрамі Лігі БНР. Калі-ж там знойдуцца больш як 3 сябры Лігі БНР, тады ўтвараецца падкамітэт падпарадкаваны мясцоваму арганізацыйнаму камітэту.

5. Сябры мясцовых арганізацыйных камітэтаў дзеляць між сабой функцыі старшыні, сакратара й скарбніка. Іх заданьнем ёсьць вярбаваць сяброў у Лігу БНР, трымаць сувязь з Цэнтральным Арганізацыйным Камітэтам і выконваць ягоныя інструкцыі ды падрыхтаваць усё неабходнае да першага Зьезду Лігі БНР. Даваеныя сябры Лігі БНР і падкамітэты вярбуюць сяброў Лігі БНР у сваіх асяродках і праводзяць работу згодна з інструкцыямі сваіх арганізацыйных камітэтаў Лігі.

6. Пэрыяд часу да скліканьня першага Зьезду Лігі БНР уважаецца за арганізацыйны пэрыяд, а арганізацыйныя камітэты – цэнтральны й мясцовыя – за часовыя ворганы Лігі БНР. Зьезд установіць арганізацыйную структуру Лігі БНР згодна са статутам, на падставе якога будуць створаны сталыя ворганы Лігі.

7. Каб мець хоць мінімальныя сродкі на арганізацыйныя патрэбы Лігі БНР, уступаючыя ў Лігу сябры плацяць адзін даляр (ці раўнавартасьць у іншай валюце) уступных. Грошы гэтыя пойгдуць на паштовыя й іншыя арганізацыйныя расходы мясцовых арганізацыйных камітэтаў.

8. Ува ўсіх справах, датычных Лігі БНР, просім зьвяртацца на наступны адрас: V. Žuk, 54 Mary St., Barrie, Ont., Canada.

Сакавік, 1969.

Цэнтральны Арганізацыйны Камітэт Лігі БНР»

XIX. 1969-ты ГОД

Натальля Арсеньнева ў Канадзе

Беларускае грамадзтва Канады мела гонар гасьціць у сябе паэтку Натальлю Арсеньневу.

Сустрэча адбылася 16 лютана 1969 году ў Беларускім Рэлігійна-Грамадзкім Цэнтры ў Таронта. Арганізавала яе Задзіночаньне Беларускіх Жанчын Канады.

Гісторыя была такая. Блізу два гады таму ЗБЖК прасіла Паэтку прыняць ганаровае сяброўства свае арганізацыі. Натальля Арсеньнева ласкава згадзілася прыняць яго. Жанчыны захацелі пазнаёміцца з выдатнай сяброўкай свае арганізацыі й запрасілі яе да сябе ў Таронта. На сваю агульную зборку ЗБЖК запрасіла ўсё беларускае грамадзтва й прыяцеля беларусаў й беларускай паэзіі ўкраінскага паэта Барыса Аляксандрава з сям'ёй. Назначылі зборку, як заўсёды «ў нядзелю пасьля багаслужбы».

Пасьля «Магутны Божа», сьпяванага ў царкве ўсімі ўлучна з Аўтаркай слоў млітвы, мы перайшлі ў залю Цэнтру. Старшыня ЗБЖК др. Раіса Жук-Грышкевіч адчыніла, як адзін з прамоўцаў выразіўся, «літаратурны дзень» песьняй «Беларусь наша Маці Краіна» (словы Натальлі Арсеньневай). Пасьля прывітаньня й кароткага прадстаўленьня Спадарыні Натальлі Арсеньневай-Кушаль слова для дакладу аб літаратурнай творчасьці Паэткі дала др. Вінцэнту Жук-Грышкевічу, школьнаму сябру Паэткі яшчэ зь Віленскай Беларускай Гімназіі.

«Гэтая гімназія» – гаварыў прэлегэнт – «як і сутык з выдатнымі беларускімі літаратурнымі й грамадзкімі дзеячамі таго часу, а перадусім з Максімам Гарэцкім, былі тэй кузьняй, што ўзгадавала нацыянальна, гартавала ідэйна ды падрыхтавала да літаратурнай творчасьці Натальлю Арсеньневу». Даклад, што даваў абраз этапаў разьвіцьця паэзіі, асаблівасьці яе формы, ідэялягічныя асновы й сьветапагляд Паэткі, быў ілюстраваны цытатамі й цэлымі вершамі.

Ілюстрацыю паэзіі Натальлі Арсеньневай дапоўнілі рэцытаваныя Раісай Жук-Грышкевіч вершы: «Не астыць нам», «Сівой вярбой», «Сутункі» і «Гэтак будзеш ты мной»,

ды слова й рэцытацыя маг. А. Грыцука, што падкрэсьлілі пагляд Паэткі на чалавека.

Тады гаварыла сама Паэтка. Яе даклад «Майму жыццю» перапляталі ейныя вершы. Але дзе канчаўся верш, а пачыналася невершаваная паэзія гутаркі, я ледзь магла прыкмеціць. Жанчыны пахліплівалі, былым жаўнерам і скаўтам блішчэлі вочы, нат неўгамонныя дзеці, вычуваючы нязвычайны настрой бацькоў, заціхлі.

Кіраўнічка імпрэзы дзякуе Паэтцы й дае слова другому паэту Барысу Аляксандраву.

Ён хоча гаварыць да нас «мілагучнай, сьпеўнай» беларускай мовай, але, не жадаючы чым-небудзь яе зьняформіць, памайстроўску ўжывае сваю ўкраінскую, якая ў вуснах мастака-паэты гучыць ня меней мілагучна й прынадна за нашую. Выражае радасьць з нагоды знаёмства із слаўнай беларускай пясьняркай Натальляй Арсеньневай, аддае справядлівасьць яе паэзіі, якая, як і ўся беларуская паэзія, цешыцца пашанай сярод украінцаў, ён цёпла вітае «братоў Крывічоў», што так горача й жыва прымаюць сваю паэтку.

Былы беларускі вайскавік, др. Язэп Сажыч, што аж з Дэтройту прыехаў, каб пачуць пясьнярку, расказвае, як ён некалі,у Менску, слухаючы першы раз беларускую опэ-



Натальля Арсеньнева і Вінцэнт Жук-Грышкевіч, БР-ГЦ у Таронта. 16 лютага, 1969.

ру «Лясное возера», лібрэта якой напісала Натальля Арсеньнева, расплакаўся... Так кранаючым было харство музыкі й паэзіі ў сваёй роднай мове!

– «А што Паэтка дала нам як вайскавіком! Песьня, што мы сьпявалі напачатку, гэта-ж нашая вайсковая малітва! Кажнай раніцы пры падняцьці бел-чырвона-белага сьцягу мы сьпявалі яе навыцяжку. А цяпер я вас усіх папрашу, тут ёсьць былыя вайскавікі, засьпяваем ‹У гушчарах, затканых імглою› – жаўнерскую песьню, якую Паэтка нам таксама дала!» – зь пераконлівай просьбай у голасе гаворыць др. Сажыч.

Усе падхапіліся й грымнулі: «У гушчарах, затканых імглою, шэрым змрокам... Беларуь, Беларусь залата-а-а-я, за Цябе, за Цябе мы ідзём!»

Надыйшоў час разьвітвацца. Сп-ня Оля Грыцук дзякуе Пясьнярцы й уручае падарак ад ЗБЖК, др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч ад мужчынаў ЗБК дорыць ёй «сэрца»... напоўненае чакалядай, а ад усіх Паэтка атрымоўвае чырвоныя ружы й белыя гвазьдзікі.



Паэтка Натальля Арсеньнева ў Канадзе. Сядзяць зь лева на права: беларускі пісьменьнік Кастусь Акула, Сьвятлана Аляксандрава, украінскі паэт Барыс Аляксандраў, беларуская паэтка Натальля Арсеньнева, Япіскап БАПЦ Уладыка Мікалай, Валентына Пашкевіч, Вінцэнт Жук-Грышкевіч. Таронта, 16 лютага, 1969.



Беларускае грамадзтва Канады слухае дакладу паэткі Натальлі Арсеньневай. Таронта, 16 лютага, 1969.

Імпрэза канчаецца рэцытаваным др. Р. Жук-Грышкевіч вершам Натальлі Арсеньневай «Варта жыць!» **Р. Ж.-Г.**

(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 143, сакавік, 1969.)

Падарожжа ў Нью Ёрк. 16. IV. – 5. V. 1969

(Зь лісткоў дзёньніка В. Жук-Грышкевіча)

«У Рочэстар – у Натальлі Арсеньневай

Падарожжа з Бэры ў Нью Ёрк. Едзем з Раісай на паседжаньне Прэзыдыюму Рады БНР. Выехалі 16 красавіка, начавалі ў Таронта ў Пашкевічаў, а 17-га прыехалі ў Рочэстар, каб адведаць Наталку Арсеньневу. Яна з сынам Улодкам Кушалем жыла ў чысьценькім доміку на прадмесьці. Яны нам былі рады. Натальля з мужам гэн. Франьцішам Кушалем мусіла пераехаць зь Нью Ёрку ў Рочэстар да сына, бо ягоная жонка памерла й засталося двое малых дзяцей. Трэба было памагчы іх гадаваць. Летась памёр і гэн. Кушаль. І Наталка перажыла гэта вельмі цяжка. Але ўжо аправілася і жывая й вельмі чынная. Зразумела, адданая сыну й унукам. Дзеткі ўжо падрасьлі,

дзяўчынка «Тата» – 7 гадоў, а хлапец Пеця – 9 год. Улодак чалавек культурны й субтэльны, яму ўжо добра пасьля саракоўкі. Да нас і сяброў маткі ягоныя адносіны сардэчныя. Але відаць, ён штось цяжка перажывае, бо, паводле слоў маткі, сумны, маўклівы й удзяляецца толькі сваёй фаховай працы й дзецям. Я калісь пытаўся ў Наталкі, чаму ён ня жэніцца другі раз? Адказ быў – няведама, што робіцца ў ягонай душы. Сёньня ён між іншым выказаўся, што лёс нацыянальна іншых эмігрантаў вызначаны згары, праз 350 год яны стануцца амэрыканцамі й мала хто зь іх будзе ведаць сваю мову. Магчыма, што Улодак прыйшоў да выснаву, што лепш адразу стацца амэрыканцам. Апрача таго, ягоная праца (у якойсьць дзяржаўнай вытворчасьці) вымагае адданасьці дзяржаве й дыскрэтнасьці. Гэта магло змусіць яго трымацца збоку ад беларускага жыцьця. А шкада, пры нашым бязьлюдзьдзі ўтраціць для нашай справы такія дзьве асобы, як Наталка й яе сын – гэта вялікая страта. Але нічога ня зробіш. Улодак завёз нас да аўтабусу, дзеля чаго прыехаў з працы апаўдні, і настойліва запрашаў, каб заехалі, едучы назад.

Сяньня пахаладала й ідзе дождж. Выехалі а гадз. 1-ай. У аўтабусе цёпла, але цудоўныя віды на прыроду дождж і туман папсулі. Пасьля язды па Through Way шафёр зьвярнуў на бакавую дарогу на Ітаку. Едзем узгоркамі й нізінамі, узьбярэжжам вялікага возера (нідзе ня відаць імя яго) па гайвэй 89. Каб ня дождж – было-б чым любавацца. Такая тут прыгожая дарога. У Ітака высадзілі пасажыраў, частка іх перасела на аўтобус у Пэнсыльванію. Выехалі зь Ітака і зноў едзем малой дарогай 79. З пагоркаў выехалі на раўніну. Тут частыя аселішчы, празь якія едзецца 35 міляў на гадзіну, а па дарозе 50 м./г. Паказваюцца й невялікія фармы. Цешаць вока белыя драўляныя домікі, чыстыя й акуратныя. Кругом шмат дрэў. Рунь ужо зусім зялёная, і зелянее трава й вербы. Тут шмат цяплей, як у Бэры. У Рочэстары мы бачылі магнолію, якая пачынала цьвісьці. У Канадзе для яе за холадна. Зноў едзем пагоркамі, цяпер аўтобус лезе на парадачную гару. Мясцовасьць цудоўная, гарыстая. Уяўляю, як-бы яна выглядала, каб было сонца. Раіса наракае, што едзем памалу, цягнучыся паміж горак.»

– Але', я наракала, бо нудзілася. А Вінцук цешыцца краявідам, дзеліцца са мною сваімі ўражаньнямі і ўсё піша... –

«Але мусіць жа аўтобус вярнуцца на Through Way. Трапляецца шмат ручаёў і рэчак. Напэўна ў іх ёсьць фарэлька. Кругом тут беднаватыя фармы. Мусіць гадаўляныя, бо ворнай зямлі відаць мала. Але й фабрыкаў ня відаць. Нарэшце зьехалі на Through Way. Гэта тая самая дарога, якой мы ехалі на 6-ю Сустрэчу Беларусаў Паўночнае Амэрыкі ў Нью Брансвік.

Бог ведае, што мне ўдасца зрабіць у Нью Ёрку. Прайшоў год ад 10-ай Сэсіі Рады БНР і нічога ня зрухнула зь месца.

У міжчасе аўтобус зьехаў з Through Way у Вошынгтон – вялікаваты прамысловы горад. На станцыі затрымаўся на 5 хвілін, і тут, а не ў Ітака высадзіў пасажыраў на Філядэльфію. Цяпер ізноў узьехалі на «тру вэй». Шафёр абвесьціў, што больш затрымоўвацца ня будзе.

Хацеў я паехаць у Нью Ёрк восеньню, але настроі ў нашых там былі нявыразныя ў сувязі з канфліктам ЗБК і БАЗА. І чуўся я тады няважна. У міжчасе сытуацыя праясьнілася. Аб паседжаньні Прэзыдыюму Рады я дамовіўся праз сп. В. Русака зь ньюёрскімі сябрамі, а таксама з Акам (Абрамчыкам, Р. Ж.-Г.). Апошні маніўся прыехаць у Нью Ёрк, каб ад імя Парызкага Блёку інтэрвэніяваць у Амэрыканскім Камітэце, але стала на тым, што Амэрыканскі Камітэт вышле ў Мюнхэн Пэча, які займецца ўладжаньнем адносінаў. Выясьнілася гэта на канфэрэнцыі Парызкага Блёку ў Мюнхэне ў канцы сакавіка. Абрамчык уступіў са старшынства Парыскага Блёку, на яго мейсца быў выбраны Левіцкі, старшыня УНРады.

Я тымчасам звольніўшыся із старшынства ККБК і газэтнай работы, мог узяцца больш арганізацыяй Лігі БНР. Напісаў Ідэёвыя Вытычныя, арганізацыйную інструкцыю й блянкі сяброўскіх заяваў. Разаслаў гэтыя друкі ўва ўсе сэктары. Буду прабаваць знайсьці прыхільнікаў у Лігу ў Нью Ёрку й у Нью Брансвіку. Наталка згадзілася быць сябрам Лігі й абяцала памагчы звэрбаваць іншых сяброў (Яню Каханоўскую).

Галоўны націск буду класьці на стварэньне апарату Рады БНР, а паза гэтым на вэрбаваньне сяброў Лігі.

19. 04. 1969.

Прыехалі ў Нью Ёрк са спазьненьнем на 25 хвілін. Знайшлі таксі, але да спадарства Валодзі й Нюры Русакоў шафёр ня ведаў, як папасьці й вазіў нас цэлую га-

дзіну. Спаткалі нас Русакі вельмі цёпла – як гасьцей. Пачаставалі вячэрай. Шмат аб чым гаварылі, аб грамадзкіх справах – Валодзя Русак настроены пэсымістычна. Наракае на разьбіцьцё, што мала людзей, што людзі зьнеахвоціліся да працы. Штось чуў пра тое, што мае адбыцца якоесь паседжаньне ў Радзе БНР, але некаторыя сябры казалі, што заняты іншымі справамі й ім не да гэтага.

Пазванілі да Васіля Русака, сакратара Рады БНР. Я пытаўся, ці ён паведаміў сябраў Прэзыдыюму аб паседжаньні. Адказаў, што выслаў паведамленьні, якія яны мусілі ўжо атрымаць, але зазначыў, што ў ранейшых гутарках некаторыя сябры аднесьліся скэптычна да паседжаньня й майго прыезду. Дык пытаньне, хто прыйдзе на паседжаньне і ці ўдасца яго зрабіць. Скэптычнае адношаньне было й да запрапанаванага мною парадку дня. Як я й прадбачыў, адразу зьяўляюцца вялікія цяжкасьці. Але пабачым, што будзе далей.

Паседжаньне Прэзыдыюму Рады БНР

22. 04. 69.

На паседжаньне прыйшлі ўсе ўключна з Я. Запруднікам, В.Кажаном, А. Адамовічам. Ня прыйшоў толькі др. Ул. Набагез, бо ён звольніўся ад усякай дзейнасьці беларускай на два месяцы (на гэта была важная прычына, Р. Ж.-Г.). Паседжаньне прайшло добра, увесь парадак дня прынялі. Сакратар В. Русак падрыхтаваў некалькі лістоў да Сэктараў і радных згодна з нашымі пастановамі. Маю ўражаньне, што працу ўдасца наладзіць.

У нядзелю былі мы з Раісай у царкве. Людзей было панад 20 асоб. Яны губіліся ў вялікай царкве. А гадзіне 3-яй былі на абедзе ў спадарства Запруднікаў. Атмасфэра была сяброўская. Шмат аб чым гаварылі. Янка Запруднік канчае дысэртацыю, пасьля чаго будзе мець больш часу на беларускую работу. Думае палажыць націск на інфармацыйны бюлетэнь у ангельскай мове і на адбіцьцё копіяў БНРаўскіх дакумэнтаў. У гэтай справе будзе кантактавацца з М. Абрамчыкам. Гаварыў аб Абрамчыку й ягонай цяжкой сытуацыі. І Запруднік выявіў долю крытыцызму да ягоных спосабаў павялічаньня ўсяго й прадстаўленьня ў ружовым сьвятле, а з другога боку непрактычнасьці й незараднасьці.

Адведалі Колю Абрамчыка, у яго летась кватэравалі. Пасьля леташняй практыкі ніякіх гутарак аб беларускіх справах зь ім не вялі.

Вечарам адведалі др. Ст. Станкевіча й яго жонку. Ён паказаў нам свой пакой – варштат працы. Выглядае, што ён у ім увесь час працуе і аддаецца выключна газэце.

Учора – 21-га 04. – спаткаліся ў Паблік Ляйбрэры з др. В. Тумашам. Пайшлі выпіць каву й штось перакусіць. Выглядае ён блага; худы, зялёны, прыгнечаны. Ксеня (жонка) хворая. Была ў гошпіталі два разы, але нічога не памагло. Трэба глядзець і за дзяцьмі. ЦяжкаТумашу. Паза лекарскай працай ён адданы навуковай працы і БІНіМу. Хутка мае выйсьці 5-я кніга Запісаў. Прапанаваў, каб наш Інстытут у Канадзе выдаў адбітку Запісаў («Скарына – лекар»). Мы з гэтым пагадзіліся.

Вечарам я гутарыў з нашым гаспадаром Уладзімерам Русаком. Гэты чалавек нядурны, беларускімі справамі праймаецца. Ён скончыў Тэхнічную школу ў Вільні, таму добры тэхнік, але працуе крэсьляром. Вельмі дасьціпны ў таварыстве, але большай нагрузкі працы грамадзкай узяць ня хоча, хоць і радны. Ён вельмі гасьцінны й сяброўскі. Паходзіць Валодзя з Баранавічаў, якія былі зрусыфікаваны й таму ў гутарцы шмат русыцызмаў. Ня можа дараваць, што Мерляк адыйшоў з групай, і царква страціла шмат аўтарытэту й людзей. Ня можа дараваць Уладыку Васілю суда з мерлякоўцамі, царкве й людзям каштавала гэта масу грошай.

Жонка яго – Нюра (чаму ня Ганна?) надзвычай мілая жанчына, вельмі гасьцінная й добрая гаспадыня. Вучылася ў Віленскім універсытэце, але ня скончыла. Працуе швачкай. Абое яны добра зарабляюць. У грамадзкай працы яна памагае, але ніякай функцыі на сябе не бярэ.

З Валодзем я гутарыў аб Лізе БНР. Даў яму Ідэёвыя Вытычныя. Ён згаджаўся, што такая рэч патрэбная, але энтузіязму ня выявіў. Таксама як і А. Міцкевіч адразу заявіў, што трэба, каб у Нью Ёрку ўвайшлі ў Лігу й мясцовыя лідары.

У вайсковых справах – сп. Русак не абы што, у часе вайны ў Бранавічах ён камандаваў батальёнам і быў добрым ахвіцэрам. Але, калі яму запрпанаваў, згодна з пастановамі Прэзыдыюму Рады БНР, увайсьці у вайсковы аддзел у Сакратарыяце, ён запрапанаваў Сажыча. Аднак не адмовіўся належаць да Вэрыфікацыйнай Камісіі ў вайсковым аддзеле.

23. 04. 69.

Адведаў мяне А. Міцкевіч. Раіса пайшла па музэях, а я застаўся, каб зь ім пагутарыць. Гаварылі аб газэце, БАЗА і нашым грамадзтве ў Нью Ёрку. Я думаў дома, што ўдасца тут пагутарыць і зь ягоным братам Валянтынам і дзядзькам Міхасём – братам Коласа. Але апошні выехаў у Вашынгтон, а Валянтын быў на рабоце. Аляксандар Міцкевіч вельмі дзейны, – скарбнік у царкве, у БАЗА і ў газэце. Д-ра Станкевіча ня любіць за ягонае дыктатарства, але не вядзе зь ім змаганьня. Цьвердзіць, што «Беларуса» ён вядзе падыктатарску, але пакуль вядзе – трэба газэту падтрымліваць. Калі-ж бы пала – перакананы, што іншыя яе павядуць. – Хто? – Не хацеў сказаць. Да Лігі БНР прыхільны й відаць уступіць у яе, толькі варунак, каб у Нью Ёрку ўвайшлі й лідары.

Вечарам быў у нас А. Шукелойць. Гаварылі шмат. Згадзіўся быць сябрам Лігі, але быць у арганізацыйным Камітэце неахвотна й толькі ад чэрвеня месяца.

24. 04. 69.

Адведаў днём Орсіху. Дочкі й зяць былі на працы. Жывуць яны ня блага. Наташа ўжо састарэлася, але выглядае яшчэ добра, хоць і жаліцца на болі, бо мае артрэтызм. Бярэ ўдзел у грамадзкай працы, цікавіцца школай і імпрэзамі. Як і заўсёды, яна шмат каго пакрытыкавала. Сардэчнасьці да мяне я не адчуў, штось у глыбіні яна мае, як бы зайздрасьць, што ейны муж ужо ня жыве, а я і іншыя старэйшыя – поўныя жыцьця.

Учора быў у Амэрыканскім Камітэце. Прыйшоў Шукелойць і, як было ўмоўлена, разам з Запруднікам і Адамовічам прадоўжылі паседжаньне Прэзыдыюму Рады БНР. Разгледзілі сытуацыю ў Беларускай Сэкцыі Радыя, сяброў у Мюнхэне.

Сяднёва А-іч і З-ік уцягнулі туды на сваю галаву. Ён стаўся Галоўным рэдактарам і пайшоў на супрацоўніцтва з Гэрусам – амэрыканскім начальнікам над беларускай і ўкраінскай сэкцыямі. Цяпер ён імкнецца запоўніць вольныя месцы ў нашай сэкцыі зарубежнікамі. Праз а. Лапіцкага стараўся завэрбаваць у Беларускую Сэкцыю радыя Касяка, Галяка (О, іронія лёсу!), Кавыля і іншых. На шчасьце, яны адмовіліся. Абрамчык падняў алярм і прасіў, каб я пайшоў з інтэрвэнцыяй. Усе на гэта пагадзіліся.

Візыта ў Саржанта

25. 04. 69.

Саржант, прэзыдэнт Амэрыканскага Камітэту, прыняў мяне а гадзіне 10:30. Быў вельмі ветлівы і запэўняў мяне, што Амэрыканскі Камітэт хоча шчыра супрацоўнічаць з Радай БНР. Я вылажыў яму, як гэта выглядае на практрыцы, калі Гэрус з Сяднёвым хочуць запоўніць Беларускую Сэкцыю людзьмі, якія заўсёды былі ворагамі Амэрыканскага Камітэту, і супрацоўнікаў зь ім – бээнэраўцаў – называлі за гэта непрэдрашэнцамі. Мала таго – Касяк і Галяк адкінулі прапанову з насьмешкай, дык крок Гэруса скампраміtаваў Амэрыканскі Камітэт. Саржант папрасіў мяне падаць на пісьме матар'ял. Мы яго апрацуем.

Вечарам паехалі з Раісай да Міколы Гарошкі. Забраў ён нас з Фундацыі Крэчэўскага самаходам і прывёз дамоў. Гасьцілі яны нас вельмі міла. Старалася аб гэта яго жонка й ейная матка старушка. Апошняя гаворыць пабеларуску з прымешкай расейскай. Зь Міколам Гарошкам гаварылі шмат аб справах БАЗы, Фундацыйі Крэчэўскага й іншым.

26. 04. 69.

Начавалі ў Гарошкаў. Пасьля сьнеданьня паехалі на 5-ю Авенью на парад Ляяльнасьці. Селі каля Уладыкі Васіля на трыбуне. Я прастудзіўся ўчора, ахрып і ня мог гаварыць. Так я з Уладыкам і не пагутарыў. Сказаў ён мне толькі, што Уладыку Мікалаю не дазволяць выехаць з Таронта, пакуль ня знойдуць там на ягонае мейсца сьвятара. Парадавалі амэрыканскія вэтэраны й розныя арганізацыі невялікімі групкамі. За імі йшла даволі лічная й прыгожая кітайская група. Іншых групаў ня было. Да нас падыйшоў Манькоўскі й Кунцевіч і сказалі, што іншыя нацыянальнасьці не пайшлі й беларусаў было за мала, каб парадаваць.

Манькоўскі дапамог нам даехаць да аўтабуснай станцыі – на Bus Terminal. Там мы селі ў аўтабус і паехалі ў Саўдз Рывэр.

27. 04. 69.

Марыся Ханяўка забрала нас з аўтабуса. Прывіталіся з Чэсям і мне так шкада яго стала, што я чуць не заплакаў. Стаіць бедны, трасецца й з трудам вымаўляе слова. Ён жа



Выстаўка абразоў і даклад Галіны Русак у БР-ГЦ у Таронта. Сядзяць зь лева на права: др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч, мастачка Галіна Русак, Япіскап БАПЦ Уладыка Мікалай, а. М. Мігай, др. Р. Жук-Грышкевіч, інж. Васіль Русак. 9 лістапада, 1969.

маладзейшы за мане на якіх 5 год, а выглядае так страшна. Меў дзьве апэрацыі, але яны амаль нічога не памаглі. Трасуха (хвароба Паркінсона) ня ўступіла. Гаварыць яму цяжка. Пагаварыць аб тым, чым ён жыве й што адчувае, так і не ўдалося. Па хаце бегаў чорнавалосы хлопчык, вельмі жывы, даволі вялікі на свае 3 гадкі. У хаце ўсё нармальна, як і было, але на дварэ й у садочку запушчэньне. Гаспадар занядужаў...

Шкада, што Чэсь пісаць ня можа, бо пісаць ён мог і мае аб чым. Вечарам прыехала Рагнеда з мужам – арабам з Іраку. Яна кончыла калеж і працуе ў кампаніі, што вырабляе розныя касмэтыкі ў Прынцтон. Муж яе малады й здаровы, выглядае добра апрануты паэўрапэйску. Добра гаворыць паангельску. Робіць дактарат з архэалёгіі на ірацкай стыпэндыі.

У нядзелю паехалі ў царкву ў Нью Брансвік. Служыў а. Кэндыш. Людзей было многа, хор сьпяваў прыгожа. Айцец Кэндыш прывітаў навет нас з Раісай.

Пасьля багаслужбы ў залі пад царквой мне далі магчымасьць пагутарыць з раднымі й пару сябрамі – (каля 10 асоб) аб Лізе БНР. Нажаль, Сакратар Рады БНР не раздаў радным і іншым асобам «Ідэёвых Вытычных Лігі БНР», якія я яму выслаў. Прышлося выясьняць усё самому. Выглядае, што некаторыя сябры ўступяць у Лігу. Доўга я гаварыць ня мог, бо мела быць паседжаньне Царкоўнай Рады. Тым часам Марыся завязла нас да спадарства Васіля й Галіны Русакоў. Цесьць Васіля, сп. Родзька вельмі цікавы чалавек, яму 80 год, а ён пры поўным розуме й энэргіі духовай. Ён быў настаўнікам каля Баранавіч, праз доўгія гады – кіраўніком школы. Родзьчыха старая й згорбленая, але яшчэ рухавая. Дачка Галіна, жонка Васіля Русака – каляжанка Раісы з Марбургу. Русакі маюць дзьве дачушкі. Галіна працуе ў бібліятэцы, добрая гаспадыня і да таго ня блага малюе. Раіса пляну зрабіць выстаўку яе абразоў у Таронта (і зрабіла, Р. Ж.-Г.).

Зьелі раскошны абед, тады мы з Васілём аформілі патрэбныя паперы Рады БНР, заехаліся да Ханяўкаў па рэчы й позна ўвечары вярнуліся ў Нью Ёрк.

28. 04. 69.

Каля паўдня паехалі да мастака Пётры Мірановіча. Яшчэ ў мінулым годзе мы былі ў яго, і Раіса дамовілася зь ім рабіць мой партрэт. Тады мы пазнаёміліся й добра пагутарылі Ён амаль мой равесьнік і цікавы чалавек. Быў беларускім вучыцелем у Латвіі. Пазьней кончыў мастацкую акадэмію ў Рызе. Добры беларус, гасьцінны й ветлівы. Знаў усіх беларусаў з Латвіі, што былі ў Празе. Пры ягонай помачы я дастаў адрас А. Салаўя ў Празе ад сястры яго сп-ні Махноўскай.

Пачалі рабіць партрэт, я пазаваў. Ён зрабіў толькі шкіц. Вечарам былі ў гасьцях у Каханоўскае Яні. (Цяжка пісаць, надта трасе ў аўтобусе).

Прадаўжаю. Жыве яна з маткай – Шабуняй па мужу (80 год) – у двох малых пакойчыках у нецікавым раёне Нью Ёрку. У кватэры ў іх цесна, але ўтульна. Прыехалі мы да іх з Раісай ды Нюрай і Валодзем Русакамі. Пакуль вячэраць аглядалі альбом са здымкамі зь Вільні, прысланымі Лявонам і Юркам Луцкевічамі (сынамі Антона). Вячэра прайшла ў сяброўскай атмасфэры пад жарты Валодзі. Найважней было мне пагутарыць з маткай Яні, малодшай сястрой Івана й Антона Луцкевічаў. Але пакуль

дайшло да гутаркі, Яня дала мне ліст паперы з машынапісам і сказала, што тут напісана аб тым, што я хацеў ведаць. Гэтым яна папярэдзіла мяне, калі я зьвярнуўся да яе маткі, сказаўшы, што чуюся шчасьлівы, бо спадзяюся ад яе даведацца пра дзяцінства Антона й Івана, сп-ня Шабуня рэзкавата адказала мне парасейску, што нічога ня ведае, бо з малых гадоў была аддана ў расейскі пэнсыянат і дома ня жыла. Тады якраз Яня й дала мне той аркуш паперы. За сталом сп-ня Шабуня памягчэла, а пазьней, здаецца, набрала да мяне крыху даверу й гаварыла ахватней. Але я ўжо не вярнуўся да распытваньня пра дзіцячыя гады Луцкевічаў.

Сп-ня Шабуня гаворыць парасейску й нібы баіцца быць чымсь прычаснай да беларускага руху.

Хто бліжэй знае Яню й яе матку Шабуню, тлумачыць паводзіны апошняй тым, што яна, жывучы пад саветамі ў Менску, столькі гадоў пратраслася за сваю зродненасьць з Луцкевічамі, што выбіла сабе з галавы, што яна мае зь імі штось супольнае. Гэта ў яе засталося й цяпер. Затое Яня Каханоўская – актыўная беларуская патрыётка, дзякуючы й ёй ейны ўнук Данчык так прыгожа гутарыць пабеларуску.

5 траўня, 1969.

Вось мы й дома. Прыехалі ўчора вечарам а гадзіне 9:30 і ўжо пасьпелі адпачыць.

Дапішу, што было ў Нью Ёрку й па дарозе.

Аднаго дня я быў вольны й адведаў Наташу Орсіху. У нас зь ёю цягнецца знаёмства яшчэ з Прагі й Наваградку. Я, як экзаменатар, прыяжджаў два разы ў Наваградзкую Беларускую Гімназію на пачатку 30-х гадоў.Сябраваў зь яе мужам Аляксандрам і дырэктарам гімназіі Цеханоўскім. Іхняя Галя яшчэ не хадзіла ў школу, а Алюньця толькі пачала хадзіць на сваіх ножках. Быў я ў іх і ў Нью Ёрку яшчэ пры жыцьці Аляксандра і пасьля яго сьмерці. Дзяўчаты выраслі на добрых беларусак і адведваць іх было вельмі міла. Да мяне яны адносіліся прыязна, як да сябры бацькі.

Наташа пастарэла, але па натуры не зьмянілася: патрыёткай засталася, як і заўсёды ёю была. Гаварылі мы зь ёю пра розныя справы шмат. Расказвала мне пра сваіх дачок. Алюньця выйшла замуж за амэрыканца італьянскага паходжаньня. Жанімства й жыцьцё ў яе ўклалася

вельмі добра. Ён стаўся прафэсарам універсытэту ў Нью Ёрку, а яна зрабіла дактарат з хіміі і таксама пачала вучыць у калежы. Наташа вельмі цешыцца, што мае двох малых хлапцоў – унукаў (цяпер гэтыя малыя хлапцы выраслі, як дубы,гавораць пабеларуску, абыдва танцуюць у ансамблю «Васілёк» пад кіраўніцтвам іхняе маткі др. Алы Орса-Романо. У 1990 годзе «Васілёк» адведаў Беларусь, выступаў у Менску ды ў Беласточчыне. Р. Ж.-Г.). Жалею, што ня мог спаткацца й пагутарыць зь ёю й ейным мужам. Спаткаўся толькі й гаварыў з Галяй. Яна працуе сакратаркай, але незадаволена й думае набыць незалежную прафэсію. Пастараму яна была вельмі прыязнай і падвезла мяне сваім самаходам у Фундацыю Крэчэўскага. Адведваючы матку, я з удзячнасьці прынёс ім абедзьвюм кветкі.

Пакінуў Наташы Ідэёвыя Вытычныя Лігі БНР, каб сама прачытала й дала прачытаць Галіне й Алюньці. Раіса зь імі бачылася.

Наступны вечар мы з Раісай адведалі Бартулёў. Я ў іх быў з тыдзень у 1964 годзе. Дом і абстаноўка ў іх вельмі прыгожая. Вера працуе мадэлькай модаў, а Франьціш мае сваю дэнтыстычную лябараторыю. Відаць, абое зарабляюць добра. Аня, дачка іх, мяне не пазнала. Маюць яшчэ прыгожага трох-гадовага сына Антона, які гаворыць пабеларуску. Гасьцілі нас шампанскім і вячэрай. Прыймалі сардэчна. З Франьцішом мы добра пагаварылі аб беларускіх справах. Ён згадзіўся быць сябрам Лігі й сябрам мясцовага арганізацыйнага камітэту.

У чацьвер 1-га траўня былі ў Мірановіча. Ён закончыў мой партрэт. За партрэт і тры малюнкі ён запрасіў толькі сто даляраў. Ён быў вельмі сардэчны, правёў нас да пад'земкі й нёс даволі цяжкі пакунак. Ён моцны беларус й праймаецца беларускай справай. Раіса замовіла другі партрэт Скарыны.

Заскочылі яшчэ й другі раз да Ст. Станкевіча. Гаварылі пра газэту. Абяцалі падтрымліваць яе й пісаць час ад часу. Гаварылі пра Лігу БНР. Станкевіч прызнаў яе патрэбу й вартасьць, але сказаў, што нічога з гэтага ня выйдзе, бо настрой у людзей падупаў, нічога ня хочуць рабіць.

У пятніцу – 2-га травеня адпачывалі. Вечарам прыйшоў Тумаш і Запруднік. Гаспадары – спадарства Русакі – частавалі нас вячэрай. Шмат аб чым гаварылі, і аб распрацоўцы гісторыі. Гэты апошні вечар у Нью Ёрку пра-

йшоў вельмі міла. Пастанавілі выехаць у суботу раніцай і затрымацца па дарозе ў Наталкі (Арсеньневай, Р. Ж.-Г.) на адпачынак.

Спадарства Русакі выказалі сваю сардэчнасьць ня толькі гасьціннасьцьцю, але яшчэ ўзяліся адвесьці нас сваім самаходам на Бас Тэрмінал. Прывезьлі нас за гадзіну да адыходу аўтобуса й хацелі яшчэ трымаць нам таварыства, каб мы ня нудзіліся. Мы ўгаварылі іх ехаць па сваіх справах.

Варочаліся ў Рочэстар тэй самай дарогай праз прыгожыя мясцовасьці й уздоўж Сэнэка возера. Надвор'е было прыгожае, ціха й сонечна. Пунктуальна а гадз. 5-ай былі на Бас Тэрмінал ў Рочэстар. Наталка з сям'ёй ужо нас чакала. Прывезьлі дахаты, накармілі, напаілі. Мы ўсё-ж чуліся змучанымі й па вячэры пайшлі трохі легчы адпачыць. Вечарам гутарылі й глядзелі тэлевізар. Я расказваў, як там у Нью Ёрку беларускае жыцьцё распарушанае. Адчуваецца брак грамадзкай душы. Як Наталка там была, гэтага не адчувалася. Яна з гэтым пагадзілася, бо была сакратаром ўва усіх беларускіх арганізацыях. Таму яе там цяпер бракуе. Але хоць душыцца ў Рочэстары з дзяцьмі й гаспадаркай, хоць цяжка ёй без грамадзкага жыцьця – павароту ёй у Нью Ёрк няма. Ня можа кінуць сына зь дзяцьмі. А ён хоць ветлівы, не гаворкі й замкнуты ў сабе. Няма ў яго грамадзкай жылкі. Гэта яшчэ больш асамочвае Наталку.

У нядзелю дапаўдня Улодак вазіў нас па горадзе й завёз на магілу гэн. Кушаля. Мы паставілі на ёй кветкі. Помнік ужо пастаўлены. Вялікі чорны каменны крыж. Робіць маестатычнае ўражаньне, але напіс на ім толькі замэрыканізованае імя й прозьвішча Франціс Кушэль і дата народжаньня й сьмерці. Такі напіс зацірае сьляды па гэтым чалавеку, выдатным у беларускім жыцьці. Хоць гэты напіс выклікаў у мяне абурэньне, я нічога ня пытаўся ў Наталкі. Сказаў толькі, што гістарычныя постаці не павінны губіцца ў амэрыканскім моры людзей. Балюча было тым больш, што побач стаялі помнікі з украінскімі напісамі, а калі й амэрыканскім, дык ўсё-ж было напісана, што нябошчык радзіўся на Украіне. Тое самае перажывала й Раіса.

Выехалі мы з Рочэстар а 2:20 папаўдні. Ехалася даволі прыемна. Турбавала пераноска рэчаў (аж 4 пакункі), але сілаў у мяне хапала. Мы трапілі на добрае палучэньне,

дык толькі 10 мінут чакалі на Бас Тэрмінал у Таронта на свой аўтабус у Бэры й а гадзіне 9:30 былі ўжо дома.

Вынік паездкі

Паездка наша была вельмі карыснай і цікавай. Я палагодзіў усе справы, а Раіса адпачыла духова й зьведала музэі. Адбылі два паседжаньні Рады БНР і правялі патрэбныя пастановы. Я інтэрвеніяваў у Саржанта ў Амэрыканскім Камітэце ў справе хлусьлівых адносін амэрыканскага кіраўніка да нашай Сэкцыі радыя ў Мюнхэне, адносна чаго будзе зложаны яшчэ мэмар'ял. Праламаў ледаватыя адносіны да Лігі БНР у Нью Ёрку і запачаткаваў арганізацыйныя крокі. Спаткаўся з многімі нашымі людзьмі і шмат што зь імі прадыскутавалі. Выясьнілася для мяне, што ў сяброў Прэзыдыюму Рады БНР адносіны да мяне добрыя й працаваць зь імі магчыма.

Прыкрае ўражаньне, што жыцьцё беларускае ў Нью Ёрку падупала, распарушваецца, але ёсьць жывыя людзі, якія здаюць справу з гэтага й робяць што могуць. Калі пераканаюцца ў патрэбе Лігі, згуртуюцца разам, тады змогуць ажывіць і паправіць справу. Сытуацыя ня ёсьць безнадзейнай.

9-га жніўня, 1969.

Вярнуліся з вакацый з «Отава Рывэр». Знайшоў лісты: ад М. Абрамчыка, у якім піша, што папраўляецца й едзе на месяц у дом выздараўленьня; ад Ніны Абрамчык: пацьвярджае словы Міколы, але піша, што ён яшчэ ня ведае, што ў яго рак і просіць пісаць да яго асьцярожна, каб ня здрадзіцца. Ліст ад В. Пануцэвіча: запрашае, каб я прыехаў у Чыкага ў верасьні й прапануе выдаваць асобную ад «Беларуса» газэту пад маім рэдактарствам, бо з Ст. Станкевічам супрацоўнічаць нельга. Ад Каляскі: просіць, каб напісаў рэцэнзію – рэкляму да яго кніжкі. Ад Яні Каханоўскае: прыслала даныя пра Луцкевічаў.

4-га кастрычніка, 1969.

У Беларускім Рэлігійна-Грамадзкім Цэнтры сьвяткаваньне 15-тых угодкаў БАПЦ парафіі Сьв. Кірылы Тураўскага. У залі Цэнтру наладжаная багатая выстаўка з жыцьця парафіі за 15 год. Арганізатар выстаўкі – Раіса.

Увечары адбылася сходка Лігі БНР. Прысутныя: мы з Раісай, А. Грыцук, М. Ганько і А. Протас. Пастанавілі за-

снаваць аддзел Лігі БНР на Канаду. Часова выбралі толькі сакратара – Раісу.

5-га кастрычніка. 1969.

Зраніцы ў царкве была архірэйская багаслужба. Пасьля яе – банкет, на якім прысутнічала каля 60-ці асоб. Апрача нашых, з Дэтройту прыехалі на сьвята Сажычы й Бакуновіч, зь Лёндану – Шуст і Рагулі, з Кінгстану – Грыцукі й Садоўскія. Усе імпрэзы сьвяткаваньня прайшлі добра.»

Памяці Івана Луцкевіча

На 50-ыя ўгодкі сьмерці Івана Луцкевіча, што споўніліся 20 жніўня сёлета, Згуртаваньне Беларусаў Канады 7 верасьня (1969) годна ўшанавала памяць вялікага Чалавека, Грамадзяніна й Змагара, што мала меў сабе роўных у беларускім адраджэнскім руху. Імя Івана Луцкевіча сталася сынанімам ахвярнасьці й адданасьці справе, палітычнага розуму й няўтомнай дзейнасьці ў палітычным, грамадзкім і культурным кірунку.

Каб даць лепшае ўяўленьне пра гэтую асобу й аддаць належную пашану ейнай памяці, патрэбныя былі адпаведныя падрыхтаваньні, стварэньне адпаведнага фону. У сьвяточна прыбранай залі Беларускага Рэлігійна-Грамадзкага Цэнтру ў Таронта наладжаная была ілюстрацыя, што датычыла жыцьця й дзейнасьці Івана Луцкевіча.

Сонечнае сьвятло падала на партрэт Івана Луцкевіча, што займаў месца на франтовай сьцяне пад Пагоняй, якой Іван Луцкевіч калісьці быў «Рыцарам». Абапал партрэту ўзьнятыя былі нацыянальныя сьцягі ў ягоны гонар. Беларускія народныя тканіны выражалі любасьць да Бацькаўшчыны. Жывыя кветкі – нашую пашану да Яго.

На правай сьцяне – іншы варыянт партрэту. Пад ім фотаздымак магілы, зроблены пасьля паховінаў у 1919 годзе ў Закапаным, дзе Іван Луцкевіч перадчасна, на 38-ым годзе жыцьця, дагарэў на сухоты. Далей фотаздымкі найбліжэйшых ягоных супрацоўнікаў: Алёйзы Пашкевіч-Цёткі й Юльяны Мэнкэ Дубейкаўскай. Далей направа – здымкі з тагачаснай Вільні, дзе жылі й дзеілі браты Іван і Антон Луцкевічы; выдадзеная ў 1919 годзе ў Бэрліне паштоўка з каляровымі гэрбамі гарадоў Беларусі й напі-



Др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч робіць даклад на акадэміі, прысьвечанай 50-м угодкам сьмерці Івана Луцкевіча. Таронта, 7 верасьня, 1969.



На акадэміі, прысьвечанай 50-м угодкам сьмерці Івана Луцкевіча у БР-ГЦ у Таронта, 7 верасьня, 1969.

сам «Няхай жыве Беларуская Народная Рэспубліка» ды здымак Базыльянскіх мураў, адваяваных у гэтым часе Іванам Луцкевічам пры дапамозе Юльяны Мэнкэ ў немцаў для беларускіх патрэбаў. У Базыльянскіх мурах зь ініцыятывы й стараньнем Івана Луцкевіча напачатку 1919 году была адчыненая Віленская Беларуская Гімназія, у якой 1-га лютага гэнага году ейны заснавальнік меў першую энтузіястычна-патрыятычную прамову. У Базыльянскіх мурах аж да Другое Сусьветнае вайны месьціўся названы ад імя свайго заснавальніка Беларускі Музэй Івана Луцкевіча. Дырэктарам музэю аж да свайго арышту бальшавікамі ў 1939 годзе быў Іванаў брат Антон Луцкевіч.

Рэпрадукцыя загалоўнай бачыны «Літоўскага Статуту», рэдагаванага й выдаванага ў XVI-м ст. у Вільні «слаўнымі продкамі нашае зямлі», тварыла эстэтычнае й тэматычнае завяршэньне кампазыцыйнае групы.

Зь левага боку цэнтральнае групы тры бачыны зь «Беларуса» давалі ілюстрацыі газэты «Наша Ніва» й два фотаздымкі братоў Луцкевічаў разам з Аляксандрам Уласавым, артыкулы з таго-ж «Беларуса»: «Заснавальнікі й Рэдактары «Нашай Нівы» (В. Жук-Грышкевіча), ды «Браты Іван і Антон Луцкевічы – на ўгодкі іхняй сьмерці» (Ст. Станкевіча). Вышэй – рэпрадукцыя партрэту Франьцішка Скарыны й загалоўнай бачыны ягонае «Бібліі», бо й Скарына дзеіў у Вільні, дзе ў 1522 заснаваў першую на Беларусі друкарню. Побач на стале разложаныя гадавікі газэты «Бацькаўшчына» з артыкуламі пра Івана Луцкевіча ды ягонымі фотаздымкамі. Партрэты папярэднікаў – Кастуся Каліноўскага й Франьцішка Багушэвіча ды Луцкевічавых сучаснікаў – Янкі Купалы й Якуба Коласа дапаўнялі наглядную ілюстрацыю.

Пасьля сьв. літургіі, у якую была ўлучаная малітва за супакой душаў Івана й Антона Луцкевічаў, адбылася ў іхнюю памяць урачыстая акадэмія. Адчыніў яе старшыня ЗБК сп. М. Ганько ды перадаў голас дзеля дакладу др. Вінцэнту Жук-Грышкевічу.

У дакладзе была гутарка пра паходжаньне братоў Луцкевічаў, ды жыва намаляваная была эпоха, у якой яны жылі, беларуская палітычная сытуацыя на фоне міжнароднай, працэс беларускага нацыянальнага адраджэньня ад Кастуся Каліноўскага, Франьцішка Багушэвіча й да Івана Луцкевіча, які зрабіў значны крок наперад, выносячы беларускую справу на міжнародны форум. Даклад па-

казаў маштабы дасягненьняў у галіне беларускага школьніцтва, навуковай і грамадзка-палітычнай, маляваў характар Івана Луцкевіча, які сваім жыцьцём выявіў найвышэйшую ступень самаахвярнасьці для ідэі. Іван Луцкевіч, як увайшло было ў пагаворку, із сваіх сьціплых заробкаў «фінансаваў беларускі рух».

Даклад закончыўся хвалюючымі цытатамі з успамінаў найбліжэйшае супрацоўніцы, сяброўкі й заручніцы Івана Луцкевіча, адзінай прысутнай пры ягонай сьмерці, цяперашняй сп-ні Юліяны Дубейкаўскай.

Пасьля дакладу кароткае слова дзеля ўспамінаў, зьвязаных з асобай Антона Луцкевіча, меў др. Яўхім Скурат. Хвілінаю цішыні прысутныя ўшанавалі памяць Івана й Антона Луцкевічаў, а беларускім нацыянальным гімнам «Мы выйдзем шчыльнымі радамі...» была закончана Акадэмія.

Узіраючыся на фотаздымак магілы Івана Луцкевіча з дзераўляным на ёй крыжам, падумала: – сваім жыцьцём Ён паставіў сабе манумэнт, як казаў Гарацы – «цьвярдзейшы за скалу, што ператрывае вякі й іржа часу яго не сатрэ» **Р. Ж.-Г.** (Аўтар гэтых радкоў).

(«Беларус» нр. 150, 1969.)

Юльяна Дубейкаўская ня жыве

Рыхтуючыся да адзначэньня 50-ых угодкаў сьмерці Івана Луцкевіча, мы зь Вінцуком камунікаваліся лістоўна з панічкай, як яе звалі, Дубейкаўскай, якая тады жыла ў Нюрэнбэргу ў Нямеччыне. Урачыстасьць угодкаў сьмерці Івана Луцкевіча ў Таронта адбылася 7-га верасьня 1969 году, і толькі пару тыдняў пасьля гэтага, бо ў канцы верасьня, як паведамляе «Беларус» нр. 150, 1969:

«Дайшла да нас вестка, што ў канцы верасьня сёлета ў Заходняй Нямеччыне, у г. Нюрэнбэргу, на 83-м годзе жыцьця, памерла заслужаная беларуская дзеячка, сяброўка Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ды плённая супрацоўніца выданьняў БІНіМ, часопісаў ‹Конадні› й ‹Запісы›.

Сьв. пам. Ю. Дубейкаўская, актыўная ўдзельніца шмат якіх вехавых падзеяў беларускага нацыянальнага адраджэньня, пакінула па сабе вялікі (тымчасам машынапіс ано) том успамінаў, што кідаюць багатае сьвятло й даюць

шмат цікавых дэталяў да беларускае навейшае гісторыі, асабліва нашаніўскага пэрыяду. У кароткай аўтабіяграфічнай даведцы, якой пачынаюцца ўспаміны, яна напісала: ‹Нарадзілася я ў Вільні 30 лістапада 1886 г. як дачка нямецкае купецкае сам'і, якая ўжо ў двух пакаленьнях жыла там і прыняла звычаі й мэнтальнасьць гэтага мілага краю.›

Ушаноўваючы ў нашай газэце 80-годзьдзе Дубейкаўскае два гады таму, мы казалі пра ейнае «нялёгкае, цалком адданае іншым» жыцьцё. Было яно запраўды гэткім, было нялёгкім і шчодрым, было даўгім, плённым і сьветлым. Сьветлай і вечнай будзе памяць па Юліяне Дубейкаўскай удзячных прадаўжальнікаў справы служэньня ‹міламу краю› – Беларусі.»

«Я вучыўся й рос пад уплывам братоў Луцкевічаў.»

Успаміны В. Жук-Грышкевіча на Акадэміі памяці Івана й Антона Луцкевічаў, 6 лістапада 1969 году ў Нью Ёрку

«Паважаныя Спадарыні й Спадары!

Мы сабраліся сягоньня тут, каб ушанаваць памяць нашых вялікіх дзеячоў – Івана й Антона Луцкевічаў, якія стварылі цэлую эпоху ў нашай гісторыі. Івана Луцкевіча я, на жаль, не спаткаў асабіста, калі прыехаў у Вільню вясной 1920 году, каб вучыцца ў Віленскай Беларускай Гімназіі, ён ўжо ня жыў. Нашу Беларускую Гімназію у Будславе зачынілі палякі, як прыйшлі ў восені 1919 году й я быў вельмі шчасьлівы, што, калі была наладжаная чыгуначная камунікацыя ў часе польска-бальшавіцкай вайны, мог прыехаць у Вільню, каб прадаўжаць навуку. І якраз тады, у красавіку 1920 году, выйшла кніжка «Іван Луцкевіч». Гэту кніжку я прачытаў тады й яна вельмі моцна ўзьдзеела на мяне й пашырыла маю веду пра беларускі рух. Прыпамінаю сабе, што тады ў Вільні – у беларускім асяродзьдзі й паза ім – шмат гаварылася пра Івана Луцкевіча, хоць прайшло ўжо 8 месяцаў ад яго сьмерці ў жніўні 1919 году. Людзі разважалі, як жа будзе далей у беларускім жыцьці без такога кіраўніка, як Іван Луцкевіч, хто займе яго мейсца?

Каб зразумець і здаць сабе справу, чаму гэты чалавек, паміраючы маладым яшчэ – у веку 37 гадоў – меў такое вялікае значэньне, можа лепш зьвярнуцца да ўспамінаў

ягонае заручніцы, якая нядаўна памерла, сьв. пам. Юльяны Дубейкаўскай.

Іван Луцкевіч хварэў на сухоты. Пры ягонай адданасьці беларускай справе й надлюдзкіх высілках для яе, без агляду на стан свайго здароўя, трэба было гэтага спадзявацца. Гэты чалавек ніколі ня зьеў упару, не аддыхнуў упару. Як казалі тады даслоўна, «ён насіўся па Вільні», займаючыся беларускімі справамі, а перадусім шукаючы сяродкаў на пакрыцьцё патрэбаў гэтых справаў, выкарыстоўваючы свае высокія кваліфікацыі архэалёга й знаўцы мастацтва. Ён патрапляў у розным ламаччы дробных гандляроў і мяшчан знаходзіць высокавартасныя абразы й старадаўнія рэчы, купляць іх за грашы', а па прывядзеньні іх да належнага выгляду прадаваць за паважныя сумы, або пакідаць у беларускі музэй, калі гэтыя рэчы мелі беларускі характар. Не дарма тады гаварылі, што беларускі рух утрымліваў (фінансаваў) Іван Луцкевіч. Зразумела, чаму гэты чалавек хварэў на сухоты, ды яму й лячыцца ня было калі. А як яго прасілі, каб ратаваў сваё здароў'е, ехаў у санаторыю – ён супраціўляўся. Вось што ён казаў, згодна з успамінамі Ю. Дубейкаўскай:

«З санаторыі я ўсяроўна ўцёк бы. Як мне там сядзець, нічога не рабіць, калі тут, з гэтага развалу Расеі й набліжэньня разгрому Нямеччыны паўстаюць магчымасьці, аб якіх мы маглі толькі марыць пару гадоў таму назад.»

Цытуем далей з успамінаў Ю. Дубейкаўскай: «Іван са свойскім яму парывам і палётам пачаў казаць,што цяпер настае час, калі паняволеным народам пара пачаць каваць свой собскі лёс, што ён тут, пад нямецкай акупацыяй, мусіць ня толькі пільнаваць беларускае справы, але й арганізаваць беларускае грамадзтва да самастойнага палітычнага жыцьця, каб у адпаведны мамэнт стварыць сваю незалежную беларускую дзяржаву. Я яго ўважна слухала. О, Іван быў прыгожы ў сваім парыве!»

А цяпер аб сіле волі й вытрываласьці Івана Луцкевіча. У спадарыні Дубейкаўскай, тадышняй Юльяны Мэнкэ, якраз тады была сямейная страта. Прыйшла вестка, што брат ейны забіты на фронце. Іван пацяшае яе, бо такія часы, і няведама, калі й як прыйдзецца зноў спраўляць памінкі й па кім. Зьмены йшлі вельмі хутка й нясьлі ўсё новыя й новыя ахвяры. Іван Луцкевіч умеў і свае цяжкія страты пераносіць стойка.

«Якраз у гэты час, у студзені 1918 году была вызначаная беларуская канфэрэнцыя ў Вільні – тэй часткі Беларусі, якая была пад нямецкай акупацыяй – кажа Ю. Дубейкаўская – На Юраўскім праспэкце (пры паляках вул. Міцкевіча, В. Ж.-Г.) была нанята вялікая заля, бо ў Беларускім Клюбе, які існаваў у Вільні, было цесна. У вызначаны дзень прышла я ў Камітэт і Пятруся, гаспадыня Луцкевічаў, мне сказала: – Як пані паважна выглядае ў сваёй чорнай, аксамітнай сукенцы, як сама жалоба, з гэтым сумным тварам.

– А пан Іван ужо гатовы?

– Так, сядзіць у габінэце, чытае нейкі ліст.

Я ўвайшла. Іван сядзеў із зьбялелым тварам і ў руцэ яго дрыжэў нейкі лісток.

– Яська, што з Табой?

Ён з болем глянуў на мяне й падаў мне лісток; я прабегла вачыма...

– Мамы, тваёй мамы няма!

– Ціха, – шапнуў ён, – каб Пятрыся ня чула, каб Антон ня ведаў. Ён ужо там, у залі, ён будзе маршалкам канфэрэнцыі... У часе канфэрэнцыі я ўсё глядзела, як Іван добра трымаўся, і толькі нэрвовы тон ягоных, як заўсёды, моцных прамоваў, казаў аб ягоным узрушаньні.»

Вось якую волю меў Іван Луцкевіч. Атрымаўшы вестку аб сьмерці маткі, ён не пахіснуўся, а далей праводзіў такую вялікую справу, як канфэрэнцыя часткі Беларусі пад нямецкай акупацыяй,якая ў выніку сваіх нарадаў стварыла **Беларускую Раду Віленшчынмы й Горадзеншчыны, што згуляла вялікую ролю ў Заходняй Беларусі й у тварэньні Акту 25 Сакавіка** (падкрэсьлена мною. Р. Ж.-Г.). У пачатку сакавіка 1918 году немцы занялі Менск. Іван Луцкевіч разам зь іншымі прадстаўнікамі Беларускай Рады Віленшчыны й Горадзеншчыны едзе ў Менск, бярэ ўдзел у падрыхтоўцы Акту 25 Сакавіка й абвешчаньні яго.

На акупаваных немцамі беларускіх землях у 1915-1918 гадох браты Луцкевічы правялі вялізарную работу. Пад іх кіраўніцтвам былі адчынены сотні беларускіх школаў і шмат арганізацыяў у Вільні: Беларускае Таварыства Дапамогі Ахвярам Вайны, Таварыства Беларускае Школы, Беларускія Вучыцельскія Курсы, Беларускі Вучыцельскі Саюз, Беларускі Нацыянальны Камітэт, Беларускае Навуковае Таварыства, Беларускі Музэй, Беларускае Выдавец-

кае Таварыства, Беларускі Работніцкі Саюз і апошнім творам, запраектаваным Іванам Луцкевічам і праведзеным у жыццё, была Віленская Беларуская Гімназія адчыненая на пачатку 1919 году.

Жыццё братоў Луцкевічаў было характэрна надзвычайным энтузіязмам для беларускай справы. Былі ў іх вялікія асягненьні й радасьці, але было й шмат трагізму й у іхнім жыцьці і ў іхняй сьмерці. Іван памёр перадчасна ў квітнеючым веку, поўны нязьдзейсьненых надзеяў і плянаў для Беларусі, і ўжо дзеля гэтага сьмерць яго была трагічнай, хоць і натуральнай. А Антон, пасьля столькіх гадоў дзейнасьці для беларускага народу, быў пазбаўлены жыцьця яшчэ трагічней. У 1939 годзе яго арыштавалі бальшавікі, два гады мучылі ў засьценках НКВД, а пазьней застрэліі яго, зьняможанага, на дарозе, калі гналі вязьняў зь Вялейскай турмы ў напрамку Менску ў 1941 годзе, бо немцы былі ўжо блізка, а савецкая армія ўцякала на ўсход.

Яшчэ большая трагэдыя сталася з пладамі працы братоў Луцкевічаў. Далучаючы Вільню да Літоўскай ССР пасьля вайны, бальшавікі зьнішчылі дашчэнту ўсё, што было ў ёй беларускае: беларускія школы, беларускія грамадзкія культурныя й навуковыя ўстановы, бібліятэкі, кніжкі, газэты й навет Беларускі Музэй, які нікому ні ў чым не перашкаджаў. З таго часу навет словы – беларус, беларускі зьніклі зь віленскай атмасфэры.

Найвялікшай стратай і зьнявагай для беларусаў, а для памяці Луцкевічаў у першую чаргу, было зьнішчаньне Беларускага Музею ў Вільні. Заснаваў яго Іван Луцкевіч, а апякаваўся ім на працягу дзесяткаў гадоў Антон Луцкевіч. Экспанаты вялікай нацыянальнай вартасьці ахвяроўвала беларускае грамадзтва з усяе Беларусі. І ўсё-ж Масква не ўважала за патрэбнае лічыцца з гэтым фактам і зьліквідавала Беларускі Музэй у Вільні – собскасьць беларускага народу, сьвятыню беларускай культуры й мастацтва, якая перажывала войны, першую нямецкую акупацыю, польскую акупацыю й навет гітлероўскую. Бальшыня экспанатаў трапіла ў летувіскія ўстановы й была прысабечана. Так, трагізм перасьледуе братоў Луцкевічаў і па сьмерці, Масква ня можа дараваць ім беларускіх незалежніцкіх імкненьняў. Але затое расьце іх слава й значэньне сярод патомных.

Івана Луцкевіча я знаў толькі па расказах і па тых настроях, якія застаў пасьля яго сьмерці па прыезьдзе ў

Вільню. Яны зрабілі ў маёй сьведамасьці вялікі й незабыўны сьлед. Але Антона Луцкевіча я знаў вельмі доўга й сустракаўся зь ім гадамі. Ён быў маім настаўнікам у Віленскай Беларускай Гімназіі, дзе выкладаў беларускую літаратуру. Ён прышчапіў мне любоў да беларушчыны, да беларускае мовы, літаратуры, гісторыі. Пазьней, калі я вярнуўся з Прагі й у 1927 годзе сам стаўся настаўнікам у гэтай гімназіі ды браў чынны ўдзел у беларускім грамадзкім жыцьці, Антон Луцкевіч быў маім вучыцелем у грамадзкай працы. Ён быў фактычным кіраўніком беларускага руху ў Заходняй Беларусі пад Польшчай і ня было ніводнай важнейшай справы ў беларускім жыцьці, у якой бы ён ня браў удзелу.

Пра Антона Луцкевіча ў мяне ёсьць многа ўспамінаў, але, дзеля абмежанага часу, я многа тут сказаць не магу. Зьвярну ўвагу толькі на найважнейшыя справы.

Браты Луцкевічы былі ня толькі заснавальнікамі «Нашай долі» й «Нашай нівы», але й душой нашаніўскай пары ды закладчыкамі наступнага вялікага этапу беларускага адраджэньня, этапу палітычнага – дзяржаўнасьці. Да гэтага часу беларускае адраджэньне было нацыянальна-культурным і літаратурным. Як звычайна ў гісторыі кожнага народу, яно папяраджае палітычны рух, палітычнае адраджэньне. Тое самае было й у нас. Вось жа браты Луцкевічы першыя ўзяліся за апрацоўку беларускай дзяржаўнай канцэпцыі. Яны раней за ўсіх тварылі ў беларускім жыцьці імкненьне да незалежнасьці Беларусі. Яны першыя паставілі справу беларускай дзяржаўнасьці на міжнароднай арэне. Мы маем на гэта цэлы сьцяг фактаў, аб якіх успамінаў у сваім цудоўным дакладзе доктар Янка Запруднік. Гэта можа сьцьвердзіць кожны, хто быў у Вільні пад нямецкай акупацыяй у 1915-1918 гадох і цікавіўся беларускай справай.

Дзякуючы Луцкевічам, нямецкія акупацыйныя ўлады прызналі беларускую мову афіцыйна як адну з краёвых моваў – поруч з польскай і літоўскай – і далі дазвол на адкрыцьцё беларускіх школаў.

Дзякуючы Луцкевічам, беларусы бралі ўдзел у Канфэрэнцыі Вялікага Княстава Літоўскага й стварэньні яго ўнівэрсалу, бралі ўдзел у міжнародных зьездах у Штокгольме й Лёзаньне, а таксама ў Тарыбе ў Вільні. Такім чынам, канцэпцыя незалежнасьці Беларусі, якая была зьдзейсьнена абвешчаньнем Акту 25 Сакавіка ў 1918 го-

дзе, падрыхтоўвалася Луцкевічамі шмат раней. Па сьмерці Івана Антон дзеіў у напрамку зьдзейсьненьня гэтай канцэпцыі праз усё жыцьцё. Ён дамагаўся прызнаньня незалежнасьці Беларусі на мірнай канфэрэнцыі ў Вэрсалі й не заламаўся з прычыны няўдачы, а далей працаваў для гэтай канцэпцыі іншымі шляхамі й іншымі спосабамі.

Вельмі важнай была й справа стварэньня сталага беларускага палітычнага асяродку – стрыжня беларускага вызвольнага руху. Наша шчасьце, што Луцкевічы й іх паплечнікі былі маладымі, ідэйнымі й энэргічнымі людзьмі. Яны былі адукаванымі й добра ўсьвядомленымі, як арганізавацца й вясьці работу. Пачалі ад арганізацыі Беларускай Сацыялістычнай Грамады як арганізацыйнага асяродку, стрыжня беларускага руху, які дбаў аб найбольш патрэбныя й магчымыя ў дадзеных абставінах дзялянкі працы. Першай найважнейшай справай была прэса, пры помачы якой пашыралі далейшы круг дзейнасьці. У гэты стрыжань увайшлі самыя актыўныя й моцныя ідэйна людзі. Не бяда, што іх было мала спачатку, што, як сьмяяліся чужынцы тады, усіх беларускіх дзеячоў можна было пасадзіць на адной канапе. Але гэта быў моцны стрыжань, касьцяк беларускага руху. Ён ведаў, чаго хоча, ведаў, што патрэбна беларускаму народу, ён рос, да яго далучаліся ўсё новыя й новыя людзі. Сьмею цьвердзіць, бо ёсьць на гэта падставы, што гэты стрыжань трываў і пад першай нямецкай акупацыяй, хоць і ня выступаў ужо пад назовам Беларускай Сацыялістычнай Грамады, і пад польскай акупацыяй у Заходняй Беларусі аж да прыходу бальшавікоў у 1939 годзе.

Часы былі цяжкія, зьменныя й трывожныя: войны, рэвалюцыі, зьмены ўладаў чужога панаваньня. Усё бурліла, усё зьмянялася. Калі-б ня было гэтага арганізацыйнага стрыжня, сталага касьцяка, беларускі рух мог бы разваліцца, мог бы пайсьці рознымі напрамкамі й не сканцэнтравацца ідэйна ў Акце 25 Сакавіка. А як не ўдалося здабыць незалежнасьці Беларусі, беларускі рух апынуўся пад рознымі чужымі ўладамі, мог бы заняпасьці, калі-б ня было сталага, дзеючага стрыжня яго.

Па сьмерці Івана Луцкевіча кіраўнічую ролю пераняў Антон Луцкевіч, і мы можам прасачыць, якую ролю ён згуляў у беларускім жыцьці ў Заходняй Беларусі пад Польшчай. Ён трымаў у курсе справы тых беларусаў, якія

ўжо былі згуртаваныя й зацягваў, дабіраў новых людзей да арганізацыйнага стрыжня. І гэты стрыжань трымаў на сабе галоўны цяжар беларускага жыцьця й кіраваў ім. Ён спрычыняўся да тварэньня арганізацыяў, якія патрэбны былі ў той час, ці ў даны мамэнт, ці ў дадзеных абставінах; ён стымуляваў і выконваў рэакцыі, дэманстрацыі, пратэсты ці дэмаршы міжнародныя й мясцовыя на актуальныя патрэбы, ён таксама дбаў аб выдаваньне прэсы й кніжак. Калі па павароце з Прагі я пачаў браць удзел у беларускім грамадзкім і палітычным жыцьці ў Вільні, я таксама ўвайшоў у гэты стрыжань.

З 1903 па 1939 год шмат людзей перайшло праз яго на віленскім грунце. Адны адпадалі паміма іх волі, як напрыклад некаторыя зь ліку 33-х, якіх палякі выкінулі ў Літву ў 1921 годзе. Іншыя адпалі дабравольна пад уплывам камунізму. На іх месца прыходзілі новыя людзі, і гэты стрыжань трымаўся й рос. Заснавалі яго Луцкевічы, Уласаў і Бурбіс як Беларускую Сацыялістычную Грамаду, да іх дайшлі іншыя нашаніўцы, магчыма, Купала й Колас. Пазьней, за польскіх часоў, у гэты стрыжань, апрача А. Луцкевіча, увайходзілі інж. Трэпка, санатар Уласаў, паслы Тарашкевіч і Рак-Міхайлоўскі – пакуль не пайшлі да камуністаў, ды іншыя людзі зь Вільні й правінцыі. Дзякуючы гэтаму арганізацыйнаму стрыжню, ніводная дзялянка жыцьця, ніводная галіна дзейнасьці ў нашым змаганьні нацыянальным, палітычным і культурным ня была занядбаная, ён дбаў пра ўвесь беларускі рух, пра ўсе яго патрэбы.

Я не выпадкова пра гэта ўспомніў. Я баюся, што мы на эміграцыі трацім шмат якраз таму, што ня маем такога нацыянальна-грамадзкага стрыжня, які дбаў бы пра ўсю беларускую эміграцыю й беларускую справу ў вольным сьвеце. Мы занадта расцярушаны, дбаем перадусім пра сваё мясцовае жыцьцё, якое найчасьцей ідзе самацёкам, бяз лучнасьці з іншымі асяродкамі й агульным плянам. Калі мы й зьбліжаныя палітычнымі перакананьнямі, як, скажам, БНРаўцы, то й так мы занадта распарушаны й ня маем аднаго грамадзкаарганізацыйнага стрыжня, што дбаў бы аб нашы агульныя нацыянальныя й грамадзкія патрэбы, абавязкі й дысцыпліну. Мы навет нянадта й адчуваем, што нам нешта падобнае патрэбна ў абсягу ўсёй нашай эміграцыі. Найвышэйшы час аб гэтым падумаць. (Падкрэсьлена мною – Р. Ж.-Г.)

Канчаючы гэты кароткі свой успамін, зьвяртаюся з заклікам, каб мы помнілі, якую ролю ў беларускім вызвольным руху згулялі браты Луцкевічы, каб мы помнілі, што мы спадкаемцы іхніх запаветаў і прадаўжальнікі іхняй працы, што мы мусім вучыцца ад іх, як працаваць і як арганізавацца, каб беларуская справа не заняпадала, а разьвівалася й расла.»

(Прыватны архіў)

Аб братох Івану й Антону Луцкевічах ёсьць і ў Разьдзеле XVI гэтае працы ў артыкуле В. Жук-Грышкевіча «Заснавальнікі й рэдактары ‹Нашай Нівы›.»

Падарожжа ў Чыкага

10-13 кастрычніка, 1969.

(Зь лісткоў дзёньніка В. Жук-Грышкевіча)

«Яшчэ на вясельлі ў Сажычаў у чырвені мы ўмовіліся з Вацлавам Пануцэвічам, што восеньню я прыеду ў Чыкага, каб распачаць у іх арганізацыю Лігі БНР. Хутка пасьля гэтага я выслаў Пануцэвічу 10 паасобнікаў Ідэёвых Вытычных Лігі, некалькі інструкцыяў, заяваў сяброўскіх, каб ён раздаў іх мясцовым радным. Ды ў канцы жнівеня Пануцэвіч напісаў мне, каб я прыехаў у верасьні. Апрача справы Лігі, высунулася справа канфлікту ў яго з Ст. Станкевічам і «Беларусам». Станкевіч не зьмясьціў ягонага артыкулу ў «Беларусе», а, быццам, выкарыстаў яго, як матар'ял для свайго артыкулу. Адсюль абурэньне Пануцэвіча й прапанова выдаваць асобную газэту, але пад маім рэдактарствам. Я адказаў яму лістом, што: 1. рэдагаваць і выдаваць другую газэту я не змагу ўзяцца; 2. што гэта магло-б давясьці да расколу – прыхільнікаў «Беларуса» й прыхільнікаў новай газэты, да чаго мы ня можам дапусьціць; 3. трэба націскаць на арганізацыю Лігі, якая пачне выдаваць свой бюлетэнь, што з часам можа ператварыцца ў газэту; 4. «Беларус» – гэта Ст. Станкевіч. Але замяніць яго няма кім, дык пакульшто трэба мірыцца й рыхтаваць сілы да іншай газэты. У верасьні я ня мог паехаць у Чыкага, але абяцаў прыехаць пазьней, восеньню.

Выехаў 10-га кастрычніка ў пятніцу сваім самаходам. Заехаўся ў Лёндан да Рагуляў нанач. Адпачыў, пагаварыў з Барысом і Людкай. Выехаў у Дэтройт па 2-ой, а каля 6-ай быў ужо ў Сажычаў у Дэтройце. Як заўсёды – мі-

лая гасьціннасьць і гутаркі. Язэп наракаў на інэртнасьць сяброў з Дэтройту, але згадзіўся паехаць са мной у Чыкага. У пятніцу мы яшчэ пасьпелі адведаць Бакуновічаў. Пачалі гутарку, каб ён, Бакуновіч, уступіў у Лігу. Ён заявіў, што Ліга патрэбная, але ён ня ўступіць, бо калі яго абміналі й не ўзялі ў Раду БНР, дык ён абражаны. Гэтага асьведчаньня было досыць... Доўга мы зь ім не гаварылі. А жонка (дачка др. В. Войтанкі), талковая й працавітая, вельмі добрае рабіла ўражаньне.

У суботу каля гадзіны 10-ай раніцы выехалі ў Чыкага й прыехалі каля 6-ай да Пануцэвічаў. Пасьля перакускі пайшлі на сход Сэктару Рады БНР у залі пры царкве. Засталі панад 20 асоб людзей, навет др. Б. Грабінскі быў. Я зрабіў даклад пра цяперашнюю сытуацыю ў Радзе БНР. Сажыч гаварыў аб справах вэтэранаў. Пазьней шмат хто забіраў голас. Агульнае ўражаньне – расчараваньне Радай БНР. А на 10-ай Сэсіі ніхто зь іх ня быў. У прысланых пісьмовых дэзыдэратах былі супраць рэарганізацыі Рады БНР.

Выяўлялася зьнеахвочаньне да дасюлешніх паводзінаў Рады БНР.

Др. В. Рамук: Форма Рады БНР устарэлая, трэба яе змадэрнізаваць, прыцягнуць праціўнікаў і людзей, што стаяць збоку. Перавыбраць прэзыдэнта й радных.

Др. Грабінскі: Страцілі веру ў вызваленьне Беларусі, таму імпасэ. Падыходзім да канца. Трэба здабываць, што можна.

Сп-ня Рамук: За імпасэ вінаватыя старэйшыя, бо не падрыхтавалі моладзі.

Сп. Макоўскі: Што зрабіць з вэтэранамі, што стаяць звонку арганізацыі?

Сп. Махнач: Як бы адбыліся выбары радных?

(Адказ мой: Так, як выбіраюцца кіраўніцтвы нашых арганізацыяў, паводле ўстаноўленага права.)

Сп. Чарнэцкі: У Сакратар'яце Рады БНР няма Сакратара моладзі. Каб у нашых палітычных арганізацыях былі ўсе – уключна з Ка-мі й Ла-кімі.

Сп-ня Рамук: Імкнуцца да аб'яднаньня на нацыянальным грунце ўсіх, распачаць дыскусію ў газэце з БЦР-аўцамі.

Сп. Бяленіс: Ворганы БНР – аднаго напрамку партыйныя. Трэба, каб апіраліся на ўсіх беларусах.

Сп. Пануцэвіч: БНР вінавата ў тым, што не пераканала сваіх праціўнікаў.

Г. Сенкевіч: Ёсьць шмат беларусаў, якія ня знаюць ні БНР, ні БЦР, як да іх падыйсьці? (Мой адказ: уцягваць іх у царкоўныя, культурныя і грамадзкія арганізацыі)

Мой адказ: Дыскутаваць з праціўнікамі БНР няма з кім. К-к і Ла-цкі ня выявілі зацікаўленьня ў пазытыўнай дыскусіі да нейкага аб'яднаньня, уся іхняя дзейнасьць сьціравана на разьбіцьцё БНР-у і нашых арганізацыяў. А больш у тым лягеры няма з кім гаварыць. Што не падрыхтавалі моладзі – віна нас усіх і абставінаў. Трэба кансалідаваць нашы палітычныя сілы ў Лізе БНР і ўзгадоўваць палітычна грамадзтва, якое сталася-б апорай нашай палітычнай дзейнасьці.

Зборка ў справе Лігі БНР адбылася ў нядзелю а 12:10 пасьля багаслужбы. Зноў сабралося каля 20 асоб. Аказалася, ня ведаю чаму, Пануцэвіч не раздаў нікому Ідэёвых Вытычных Лігі. Людзі ня толькі не прачыталі вытычных, але й нічога ня ведалі пра Лігу. Прышлося выясьняць усё ад пачатку. Страцілася шмат часу, а я-ж ехаў, лічачы на падрыхтаваны грунт Пануцэвічам. Чаму ён падвёў мяне, чаму не раздаў людзям даручанае яму літаратуры аб Лізе БНР, не разумею... Праўда, на сходзе настойваў на патрэбу такой арганізацыі. У выніку дыскусіі справу Лігі перадалі др. Вітаўту Рамуку, які будзе прадаўжаць гутаркі.

Добры ёсьць звычай у нашых у Чыкага: кожную нядзелю пасьля багаслужбы прысутныя йдуць у царкоўную залю, садзяцца кругом стала й абмяркоўваюць розныя бягучыя пытаньні пры кубку кавы. Гэта добры спосаб утрымоўваньня лучнасьці, сталага абмену думак.

Абедалі ў Пануцэвічаў з Сажычам і Бяленісамі. Падавала й частавала нас з сваімі дочкамі старэнькая Буцьчыха – маці Іркі, Люні й Чэся. Такая-ж гасьціннасьць і клапатлівасьць, як калісьці ў Вільні й Будславе. Ёй ужо каля 80-ці год. У красавіку, як быў у іх, ляжала яна ў шпіталі, але дзякаваць Богу паправілася. Абед прайшоў у добрым настроі.

Выехалі ад іх па гадзіне 5-ай вечара. Аўта вёў Язэп. Ехалася добра, але да Сажычаў прыехалі па гадзіне 10-ай. Па дарозе шмат гаварылі. Язэп цікавы тып. Упіраўся супраць Лігі, а ў Чыкага бараніў яе. У панядзелак адпачываў я, а вечарам зьезьдзілі мы да М.Арцюха. Пагаварылі зь Верай. Была яе матка. Такая-ж тыповая беларуская жанчына. Калі ўсёй іхняй сям'і закідалі русафільства, дык хіба таму, што ніхто зь беларусаў імі ня цікавіўся. З Арцю-

хом дамовіліся, што ўвойдзе ў Лігу. Язэп зь ім дабяруць яшчэ кагось у сяброўства Лігі.

У аўторак 14:10 выехаў дахаты. І зноў затрымаўся ў Рагуляў, перадыхнуў, а дамоў прыехаў каля 8-ай вечара. Добра, што надвор'е было прыемнае.»

Паездка ў Нью Ёрк,
14-18 лістапада, 1969.
(Зь лісткоў дзёньніка В. Жук-Грышкевіча)

«Ляцелі мы з Раісай у Нью Ёрк самалётам. Прыехалі сваім самаходам у Таронта да Пашкевічаў, дзе думалі пакінуць самаход, а да лётнішча ўзяць таксі. Выходзячы з самаходу, я пачуў востры боль ззаду – у сярэдзіне. З трудам даплёўся ў дом Пашкевічаў. Раіса з Валяй цьвердзілі, што паездку ў Нью Ёрк трэба адкласьці, але я пастанавіў ехаць, бо пачуўся ляпей. Боль перастаў быць вострым. Валя пачаставала гарбатай. Не маглі дастаць на час таксі. Прышлося ехаць сваім самаходам, што пры болі ня было прыемным. Запаркавалі на лётнішчы самаход, прыехалі на час.

У самалёце ляцелася роўна й я пачуўся ляпей. Праз паўтары гадзіны былі ў Нью Ёрку на Ля Гвардыя. Валодзя й Нюра Русакі сваім самаходам забралі нас да сябе.

Пазваніў да Васіля Русака, Запрудніка й Шукелойця, каб заўтра ў суботу 15 лістапада а 8-ай гадзіне вечара зрабіць паседжаньне, за ласкавай згодай гаспадароў, у спадарства Русакоў. Пазваніў таксама да др. Тумаша, каб параіў якое лякарстава ад болі сярэдзіны. Ён сказаў прымаць кажныя чатыры гадзіны асьпірыну, а ў суботу позна вечарам заскочыў сам і прынёс свае таблеткі.

Да суботы вечара адпачываў, і болі зьменшыліся. На гадзіну 8-ю зьявіліся: праф. А. Адамовіч, Я. Запруднік, др. Ст. Станкевіч і Васіль Русак. А. Шукелойця й В. Кажана не дачакаліся.

Што было на паседжаньні, ёсьць у пратаколе. Агулам жа скажу, што паехаў я ў Нью Ёрк, каб неяк актывізаваць Прэзыдыюм Рады БНР. Не выглядае, каб гэта ўдалося поўнасьцьцю.

Ст. Станкевіч да Прэзыдыюму Рады не належыць, але ніхто ня быў супраць ягонай прысутнасьці. Ён хацеў паінфармаваць пра заснаваньне Беларускага Рэспубікан-

скага Камітэту на чале зь ім і відаць лічыў на падтрымку грашыма й людзьмі.

Пасьля паседжаньня далучыліся да нас Русакі, Тумаш і Раіса і мы добра правялі вечар.

У нядзелю 16-га лістапада паехалі з Русакамі на Акадэмію ўгодкаў сьмерці Луцкевічаў у царкоўнай залі на Брукліне. Са сьпіной было мне лягчэй. Акадэмія была добра зарганізаваная, з удзелам радні Луцкевічаў – пляменьніцы й пляменьніка з сям'ёй, хорам і цудоўным дакладам Янкі Запрудніка, пасьля якога дзяліліся ўспамінамі аб Луцкевічах – Янка Станкевіч, я («Я вучыўся й рос пад уплывам братоў Луцкевічаў»), М. Гарошка, В. Тумаш, Ст. Станкевіч. Антон Шыкелойць падрыхтаваў прыгожую выстаўку. Людзей было каля 50-ці чалавек. Шмат з кім была нагода пагаварыць.

Па павароце да Русакоў зазваніў да Бартулёў і папрасіў, каб адведалі мяне. Прыехалі абое, Франьціш і Вера. Чуліся нявыразна, што ня былі на акадэміі.

З Франьцішом я гаварыў пра Лігу БНР. Да даручанага яму ў красавіку заданьня паразумецца з кандыдатамі ў Лігу ён аднёсся пазытыўна, гаварыў шмат з кім і ня бяз вынікаў. Дык ёсьць надзея, што ў Нью Ёрку Ліга знойдзе падтрымку. У панядзелак гаварыў на гэту тэму з А. Міцкевічам і знайшоў у яго поўнае зразуменьне.

У аўторак вярнуліся мы ў Бэры. Ахнулі на лётнішчы, калі за паркаваньне самаходу трэба было плаціць 14 даляраў.»

XX. 1970-я ГАДЫ

Пасьля сэрцовага эпізоду, інфаркту, у 1962-м годзе Вінцуковае здароў'е стала падупадаць. Дзеля благой цыркуляцыі крыві яму цяжка стала хадзіць, балелі ногі. Ды духова ён чуўся добра, як заўсёды поўны энэргіі, плянаў на будучыню, заўсёды ў цэнтры грамадзкага жыцьця ў Таронта. У лісткох дзёньніка ён піша:

«Субота, 10. I. 1970.

Паехалі ў Таронта на 6-ю гадзіну, бо Раіса, старшыня Задзіночаньня Беларускіх Жанчын Канады, арганізавала з жанчынамі навагоднюю вечарыну. Паехалі на дзьве гадзіны раней, каб быў час падрыхтавацца. Каля 8-ай пачалі зьбірацца людзі: Аляксяевіч, што прадаваў білеты, Куляшы, Ганькі, Чорныя, Стэльмашкі й іншыя нашы і незнаёмыя людзі. Сабралося каля 50 асоб, і вечарына была вельмі прыемнай. Аркестра грала добра й танцавалі прыгожа. Вынік: каля 60 даляраў чыстага даходу, таму мабыць, што было шмат ахвярнасьці. Нават закуску ў буфэт жанчыны прыносілі сваю й задарма. Арганізатары былі задаволены, вечарына ўдалася.

Было пасьля поўначы, калі ўсё закончылася. Дамоў (у Бэры) у няпэўную пагоду ехаць, ды заўтра прыяжджаць ізноў на ёлку ня было сэнсу, таму начавалі ў спадарства Куляшоў.

Нядзеля, 11. I. 1970.

Спаў я блага, як звычайна ня дома. Устаў каля 9-ай. Усе спалі яшчэ. Зрабіў сьнеданьне. І Раіса ўстала. Мы хацелі паехаць на багаслужбу ў царкву. І Лена ўстала. Пачалі сьнедаць. Ды загаварыліся й не агледзіліся, што ўжо 10-я. Мы з Раісай паехалі ў царкву, а Лена сказала, што мусіць адпачыць. Дарункі на ёлку павёз Міша.

Прыехалі на палавіну багаслужбы. Людзей было парадачна. Пасьля багаслужбы была ялінка для дзяцей. Арганізавалі яе Целяшовы дочкі, ясна, паканадыйску й паангельску, бо яны ня ведаюць беларускай мовы. А заняцца, каб падрыхтаваць дзетак з дэклямацыямі пабеларуску, у Таронта ніхто ня ўзяўся... Дзяцей было каля 20-ці, яны танцавалі, гаварылі вершыкі, гулялі. Толькі Сільванові-

чаў хлопец гаварыў беларускі верш, бо Раіса выслала бацьку тэкст верша й прасіла, каб навучыў дзіця сказаць яго напамяць. Дзеці атрымалі шмат падаркаў і пачастунак. Каля 3-яй мы паехалі дамоў у Бэры.

18. I. 70.

Раіса адляжала ў ложку тыдзень на «флю», але, як прыехалі Ганько з Акулам, усё-ж устала, каб браць удзел у паседжаньні Галоўнай Управы ЗБК. Трэба было аканчальна абгаварыць Зьезд ЗБК, што быў вызначаны на 31. I., плян працы й каго выбраць у наступную Галоўную Управу. Браў удзел і я, бо яшчэ лічыўся сябрам Галоўнай Управы. Паседжаньне прайшло добра. Акула паінфармаваў, што атрымаў ліст ад Сурвілаў з Атавы. Яны нядаўна прыехалі зь Гішпаніі й працуюць у фэдэральным аддзеле – Secretary of State. Пацьвердзілася інфармацыя Тумаша. Мы параілі, каб Акула ў сваім лісьце запрапанаваў ім уступіць у ЗБК.

20-ты Агульны Зьезд ЗБК адбыўся ў суботу, 31 студзеня, 1970 г. Зьезд мы закончылі каля гадзіны 7-ай вечара. Рагуля, Садоўскі, Грыцук мелі застацца нанач ў Касьцюкевіча. Ён і нас запрасіў на вячэру, і мы згадзіліся, бо была магчымасьць зрабіць паседжаньне БІНіМ-у. Трэба выкарыстаць нагоду, калі людзі зьедуцца з розных мясцовасьцяў.

Паседжаньне БІНіМ

Вячэра прайшла прыемна. Касьцюкевічы гасьцінныя. А пасьля пачалі паседжаньне БІНіМ. Прынялі статут. Пастанавілі да старшыні Я. Садоўскага й сакратара А. Грыцука дабраць яшчэ Я. Скурата ў управу БІНіМ, каб было траіх. Такім чынам, управа амаль уся разам, бо Скурату да Кінгстану, дзе Садоўскі й Грыцук, зусім блізка.

Правялі пастанову выдаваць гадавік – Рэв'ю БІНіМ паангельску. Садоўскі запэўніў, што матар'ял зьбярэцца і грошы дастане ад канадыйцаў. У рэдкалегію выбралі Садоўскага як рэдактара й мяне й яго жонку як споўрэдактараў. Грыцук быў пэўне незадаволены, што яго не ўзялі ў рэдакцыю. Казаў, што нельга пакідаць журнала на маладых Садоўскіх – недасьведчаных, а ён, не ўвайшоўшы ў рэдакцыю, ня будзе мець ніякага ўплыву. Меў мо' рацыю, але гэта можна будзе паправіць.

Я паінфармаваў аб дамоўленасьці з Тумашам выдаваць яго адбітку з «Запісаў» – «Скарына ў Падуі» – на кошт нашага БІНіМ у Канадзе. Тут запратэставаў адзін сябра і заявіў, што калі наш БІНіМ будзе выдаваць чыесьці адбіткі заміж свайго матар'ялу, то ён выступіць з сяброўства. Тут разумна й спрытна ўзяў яго ў абарот Б. Рагуля: «Калі не прызнаеш пастановы большасьці й шантажуеш выступленьнем з сяброў БІНіМ, дык выступай цяпер адразу, каб нешта падобнае не паўтарылася больш». Той сябра змоўк і асеў.

Нанач у Таронта мы не засталіся. Я хацеў прывесьці Раісу дамоў, каб яна адпачыла, тым больш, што на сход Касы, які мае быць назаўтра ў нядзелю, яна ня мусіць ехаць.

Нараніцы я паехаў у Таронта на **сход Касы – Сход Беларускай (Таронта) Крэдытовай Супалкі** – адзін. Сход прайшоў добра. Цікава, што людзі трымаюцца нашай Касы й укладаюць грошы, хоць працэнты на іх малыя: 3% на дэпазыты, і 4% на паі ў гэтым годзе. Капіталу ёсьць 30,000.00 даляраў.

Нечаканасьць: Язэп Чорны адмовіўся на адрэз ад скарбніцтва пасьля якіх 15 год на гэтым важным і адказным становішчы.

Сход Касы кончыўся каля 4-ай па паўдні. Я адразу паехаў дамоў, каб завідна заехаць (самаходам) і адпачыць, бо чуўся вельмі змучаны за два дні сходаў.»

Я падзіўляла Вінцуковую вытрываласьць. Я, маладзейшая й здаравейшая, пасьля двох сходаў – ЗБК і БІНіМ – была выканчана. А ён, ужо чалавек у веку 67-мі гадоў, з падкошаным здароў'ем, на другі дзень ізноў паехаў у Таронта на трэці Сход Пажычковае Касы, якую, дарэчы, сам заснаваў у 1953-м годзе.

«7. II. 1970.

Цэлы тыдзень нічога паважнага не зрабіў. Чытаў шмат. З «Полымя» прачытаў «Чужы хлеб» І. Турскага – прапагандны пляцень супраць беларускіх лідэраў з часоў гітлероўскай акупацыі. Дзіўна, што «Полымя» засьмечвае сябе такой брыдой, бо ў ёй ані сэнсу, ані якасьці няма. Але нам гэта на карысьць, чытачы ў БССР, прачытаўшы гэты пляцень, могуць уявіць, што беларуская эміграцыя мае куды большую сілу й значэньне, чымся ў запраўднась-

ці. Бальшавікі запраўды нас баяцца, калі ўдзяляюць нам столькі ўвагі. Пару дзён таму прыслалі іншую поскудзь выданьня «Голасу Радзімы» – брашуру А. Стука «Прафэсія іх – здрада». Тут пераважна палеміка з Беларускай Сэкцыяй Радыя «Свабода».

А нам так цяжка весьці беларускую работу, сьведамых людзей мала, а актыўных яшчэ менш, ды ў нас у Канадзе інтэлігэнцыі ўсяго сем асоб параськіданых на больш сотні міль адны ад другіх. Рэшта – якіх 3-4 дзесяткі людзей – інэртныя, а актыўныя не заўсёды талковыя. Цяжкі матар'ял, каб зьвязаць зь яго цэласьць. Але ўсё-ж неяк ляпім і рухаемся патросе.

Прачытаў «эсэ», як называюць саветчыкі эсэй, Ул. Караткевча «Званы ў прадоньнях азёр», я-б назваў гэта нарыс. Гэта апісаньне падарожжа па Палесьсі, як я калісь езьдзіў па Вяльлі, Нёмане, Нарачанцы й Сэрвачы і пехатою з фотаапаратам. Тут было чым захапіцца й душу адвесьці. Караткевіч і добры пісьменьнік і вялікі беларускі патрыёт. А з другога боку баліць душа, як гэны савецкі расейскі пакост выцясьняе беларускую самабытнасьць, залівае ўвесь край, ня толькі меставую, але й вясковую моладзь.

Прачытаў таксама машынапіс працы Янкі Станкевіча «Украінскія дачыненьні да Беларусі-Вялікалітвы». Праца мае выйсьці друкам. Цікавая, дае шмат абгрунтаваных навукова матар'ялаў. Але ўжываньне ўсюды «Вяліка-Літва» замест Беларусі ды штучная Янкава мова, якую й я не заўсёды разумею, зьвядзець вартасьць працы чуць ні да нуля. Самадурства тут горш за дурноту, а хварэе на яго шмат хто.

Доктар Фрыдрых прынёс мне лякарства й сказаў, што маю ісьці на абсэрвацыю ў гошпіталь. Хадзіць мне вельмі цяжка, баляць ногі, бо кроў у іх слаба даходзіць. Трэба яго слухаць і лячыцца, пакуль можна. А я яшчэ маю столькі плянаў. Як-жа іх выканаць?

Быў Майк (Міхась) Бычко. Стараўся гаварыць пабеларуску й ня блага выходзіла. Прывёз мне колькі здымкаў, якія ён мне запрапанаваў зрабіць сваімі прыладамі. Копія ненадзейная. А здымак з 1927 ці 1928 году з Будслава з групай будслаўцаў, і другі здымак – будслаўскі касьёл. Прыслалі мне яго суседзі з Польшчы. Разгаварыліся. Усё-ж ёсьць нейкае хоць слабое зацікаўленьне беларушчынаю ў гэтага маладога чалавека. Не магу выбрацца, каб наве-

даць ягоных бацькоў і запісаць беларускія народныя песьні ад Майкавай маткі.

Другі выпадак – Марыя Ванюк. Радзілася й гадавалася ў Паўдзённай Афрыцы, куды трапілі яе бацькі, як звольніліся з савецкіх лягероў ў 1941 годзе. Арыштаваны былі ў 1939 г., як бальшавікі занялі іхнюю мясцовасьць, хоць звычайныя непісьменныя сяляне. Па вайне прыехалі ў Канаду. Бацька набыў малую фарму, а Марыя закончыла сярэднюю школу й прыехала ў Таронта на далейшую навуку. Выйшла летась замуж за італьянца, мы былі на вясельлі. Уладыка Мікалай даў ёй шлюб. Яна й далей трымае кантакт з беларусамі. Працуе настаўніцай ў сярэдняй школе ў Таронта. Учора зьвярнулася да Раісы, каб дастаць матар'ял аб беларускай культуры на ілюстрацыю да адной лекцыі аб Беларусі. Нешта беларускае ўсё-ж ёсьць у душы. Заўтра паедзем у Таронта, каб спаткацца зь ёю й дапамагчы ёй радай і матар'ялямі.

11. II. 1970.

Учора прыпадаў мой дзень нарадзінаў. Правялі мы яго спакойна. Тыя гады Раіса заўсёды рабіла прыняцьці, на якія прыяжджалі Сажычы, Рагулі, Грыцукі, Арсеньнева, Пашкевічы, Касьцюкевічы, часам доктар Фрыдрых з жонкай Іле. У гэтым годзе мы ня чуліся на сілах. І пагода сёлета вельмі-ж няпэўная й самапачуцьцё ненадзвычайнае, і настрою няма. А працы хоць адбаўляй, ды й робіцца яна вяла. Нашы прыняцьці мы выкарыстоўвалі на спатканьні з паважнымі людзьмі, на разьмяркоўваньне розных бягучых справаў, і гэта памагала. Сёлета можа зробім такую бяседу дзесь пад вясну, калі будзе цяплей і дарогі будуць пэўныя. Апаўдні наша прыбіральніца місыс Маргарэт Урбан прынесла мне спэцыяльны пірог сваёй работы, і мы выпілі тоўст, папілі кавы з пірагом, пагаварылі. На стале красаваўся традыцыйны вазон кветак.

Я пражыў 67 гадоў ужо. Гэта вялікі кусок часу, а прабег ён неяк так хутка... Праўда, шмат перажыў і шмат чаго цікавага бачыў і пазнаў, але ў штодзённай сумятні й грамадзкай працы ўсё важнейшае перажытае й пабачанае хаваецца пад награвушчаньнем масы дробных рэчаў. Хацелася-б зафіксаваць хоць найважнейшае з перажытага й бачанага, чаго іншыя ня бачылі, каб пакінуць важнейшыя мамэнты для гісторыі нашай і патомным. Але Бог ведае, ці даным мне будзе запісаць усё, што хацеў бы. Гэ-

тыя нататкі раблю на ўсякі выпадак, каб хоць зь бягучага жыцьця нешта занатаваць, чаго пазьней ня ўспомніш.

Ня ведаю, калі змагу прыступіць да пісаньня сваіх успамінаў, калі змагу адарвацца ад цяперашніх заняткаў, якія займаюць мне час і энэргію.

Сяньня дастаў прывітаньні з нарадзінамі ад Лашука зь Лёндану й Натальлі Арсеньневай, якая была ў нас летась на прыняцьці на маіх нарадзінах. Жаліцца, што пасьля флю аслабелі клапаны яе сэрца, ляжыць другі тыдзень у ложку й бярэ лякарства.

У гошпіталі ў Бэры

25. II. 1970.

Ізноў я ў гошпіталі ў Бэры. Прыйшоў сам і сваю торбу прынёс. З дому гэта каля 10-ці мінут хадзьбы. Прыйшоў без асаблівага высілку, але пры канцы ікры ног, асабліва левай, пачалі балець. Дзеля гэтага-ж мяне др. Фрыдрых і сьціраваў на дасьледаваньне сюды. Кажа, што цыркуляцыя крыві ў мяне нядобрая, таму й ікры ног баляць пры хадзе. Думае, што ў мяне зацьвярджэньне й звужаньне венаў і таму хоча ўстанавіць, у якім мейсцы звужаньне. Пашлюць мяне ў Джэнэрал Госпіталь у Таронта на спэцыяльны рэнтгэн. Заўтра а гадзіне 8-ай раніцы павязуць мяне ў Таронта й а 1-ай павінны прывезьці назад у Бэры. Раіса хацела ехаць са мною, але выявілася, што гэта немагчыма, а апеку я буду мець добрую. Яна пераймаецца маім станам здароўя і што працэдура рэнтгэну можа быць няпрыемнай, бо будуць упускаць у жылы «фарбу», каб магчы выявіць рэнтгэнам мейсцы іхняга звужэньня. Гэтыя мейсцы пры апэрацыі трэба будзе вырэзваць і замест іх устаўляць тэфляновыя трубкі. Лекар падкрэсьліў, што звужэньне жылаў было вынікам курэньня, гэта значыць, трэба кідаць курыць. Гэта падзеіла на мяне й ужо другі раз змагаюся з сабой, не куру. Што-ж, хоць прыкра, але «чэк ап» – дасьледаваньне – зрабіць трэба, каб ведаць, у чым справа. А ўжо каб рашацца на апэрацыю – трэба будзе падумаць.

Раіса перанялася маёй сытуацыяй, тым больш, што цяпер час рыхтаваньня да сьвяткаваньня 25 Сакавіка й ёсьць камплікацыі. Яна неспакойная, нэрвовая. Пры такім самапачуцьці цяжка ёй працаваць з пацыентамі ды

яшчэ займацца грамадзкімі справамі, якія адбываюцца ў Таронта.

Сяньня перад выхадам у гошпіталь выслаў Абрамчыку 80.00 даляраў, якія сабраў на падпісны ліст. Запруднік у тэлефанічнай гутарцы казаў, што Абрамчыкі дастаюць цяпер досыць дапамогі з Амэрыкі, але й мы тут мусім гора іх не забываць, бо сытуацыя іх незайздросная.

Атмасфэра ў шпіталі ня ёсьць прыкрай. Спаткалі мяне добра. Сёстры старанныя й ветлівыя. Спаткаў знаёмых. У пакоі нас чатырох хворых на сэрца. Відаць, яны кураць, а мне-ж трэба вытрываць, каб не курыць. Мы на 7-ым паверсе. Вельмі прыгожыя віды на ваколіцы. Наагул тут спакойна, але дакучае радыё. Можа-ж мне ня прыдзецца тут доўга быць. Мой віз-а-віз містэр Грыфітс трымае радыё чынным увесь час. Хоць ня голасна, хоць пераважна прыгожая музыка з Ф. М. – дакучае. Гэты дзядзька й іншым спосабам дае аб сабе знаць: ён жартаблівы, гаваркі, актыўны. Цэлы дзень у нашым пакоі поўна рогату, бо сёстры пераважна маладыя, любяць яго жарты й сьмехі й найдаўжэй тут прабываюць. Яно добра, што ў гошпіталі вясёлая атмасфэра замест панурай, але часамі за шмат рогату, няма спакою.

1. III. 1970.

Я яшчэ ў гошпіталі й столькі часу нічога ня пісаў, бо не да гэтага было. Сёньня нядзеля. Цяпер 9:30. Я крыху лепш чуюся, але тэмпэратура яшчэ ёсьць й болі не прайшлі. Штось запішу, пакуль змагу.

У чацьвер 26. II. мяне пабудзіла сястра а гадзіне 5-ай раніцы. Прыйшоў санітар і агаліў мне ваколіцы мачавога праходу й між нагамі. Пазьней я сам пагаліўся. Каля гадзіны 8-ай прыйшла сястра, якая мела мною апякавацца ў дарозе, запазналася са мной і сказала, што будзе чакаць на нізе. Хутка прыйшлі два маладыя санітары, пералажылі мяне на стрэчар і павезьлі ў элевэйтар. Акруцілі мяне коўдрай, калі зьехалі на ніз, вывезьлі да пад'езда й унесьлі стэчар у амбулянс. Сястра села каля мяне, а хлапцы наперадзе. Старалася мяне забаўляць, гаварыць са мной. Яе прозьвішча місыс Грэй. Яна ўжо ў гадах (каля 50) і стала, як сястра, не працуе. Мусіць выкарыстоўваюць яе на такую прыпадковую помач. Здаецца, муж яе нейкі вучоны, а сын «форэстэр» (лясьнік) працуе недзе дзесь блізка Арктыкі. Яна ведала, як пачаць са мной гу-

тарку. Др. Гэлен Манчэстэр, зь якой калісь Раіса працавала ў Таронта, і якая была заўсёды нашым прыяцелем, ейная кузынка. Ад гэтага яна й пачала. А як тэма вычарпалася – ведаючы, што я рыбалоў – ухапілася за рыбалоўства, карыстаючы з інфармацыі аб гэтым свайго сына – рыбалова й паляўнічага. Яна выразна хацела сваёй гутаркай адцягнуць мяне ад дэнэрваваньня, бо вязьлі мяне на свайго роду апэрацыю. Я ўжо збольшага ведаў, чаго магу спадзявацца, ад Сажыча, але асьцярожна й у місыс Грэй спытаўся, ці гэта зафарбаваньне крыві ня ёсьць балючым. Яна адказала нявыразна, значыць Сажыч меў рацыю. Але я гэтым не праймаўся й не дэнэрваваўся, бо псыхічна падрыхтаваў сябе да гэтага ўжо тры дні таму. Лягічна ня было іншага выхаду, як выясьніць прычыну, чаму ў мяне кроў у ногі не даходзіць і чым хутчэй тым лепш, бо тады будзе відаць, што рабіць далей. А што ня будзе прыемна й будзе балець, трэба з гэтым мірыцца.

Аднак мае сапраўдныя цярпеньні перавысілі мае найгоршыя дапушчэньні. А гадзіне 9:30 мы былі ўжо на месцы на каторымсь паверсе Джэнэрал Госпіталь. Я быў у дыспазыцыі мясцовай сястры й двох рэнтгэналёгаў. Мая сястра з Бэры пайшла штось зьесьці й знайсьці для мяне штось выпіць, якісь сок пасьля рэнтгэну. Я ўжо ведаў, што са мной будзе: спачатку зьнячуляць эвэнтуальную боль, тады запусьцяць шпрыцу ў вену зь якойсь фарбай, а пасьля здымуць рэнтгэнам ніжнюю частку майго цела. Але як і ў якім мейсцы яны гэта зробяць – ніхто з нас ня ведаў. Сястра з Джэнэрал Госпіталь ветліва са мной пагутарыла (выглядае на эўрапэйку), дала праглынуць тры таблеткі на супакой нэрваў, а тады санітары перавезьлі мяне ў лябараторыю. Відаць зараньня ўсё было ўмоўлена й падрыхтавана. Да мяне падыйшлі два маладыя рэнтгэналёгі ў халатах. Адзін прадставіўся нешта ў родзе Аманскі, ці Манэс. Я сказаў, што такое прозьвішча для мяне ня чужое і спытаўся, скуль ён родам. Ён сказаў, што радзіўся ў Канадзе, але бацька паходзіць зь Вільні. Тут я асьмеліўся сказаць, што Вільня – мой родны горад, я адтуль паходжу й што я беларус. Абодва рэнтгэналёгі выразна здраджвалі літоўскае паходжаньне, і пасьля абмены зь імі ўспомненымі сказамі былі да мяне прыхільныя й ветлівыя. Далі мне ін'екцыю ўбок у нагу, каб зьнячуліць эвэнтуальны боль і сказалі, што ўся справа доўга трываць ня будзе, але каб я спакойна ляжаў на бруху й ня рухаўся. Будзе пячы й бу-

дзе балець, але я гэта мушу вытрываць. І тут-жа мяне апякло, як агнём, і пякло далей, а адначасна зьявіўся страшэнны боль у сьпіне й сярэдзіне. Аднак горш за ўсё была ташната такая нязносная, што здаецца ўсе вантробы выварачвала. Я застагнаў, але й голасу ня было, а рэнтгэналёгі паказваюць, каб барані Божа не крануўся, а я ляжаў на бруху на стрэчы й усёй істотай толькі й імкнуўся, каб саскочыць з гэтай пякельнай мукі. Але калі ўжо на варштаце, як кажуць, дык трэба-ж вытрываць, гэта-ж я для сябе раблю, інакш ня выясьніш, які ў мяне стан, сьцяў зубы. На шчасьце тымчасам і боль супакоіўся й ташната, але не на доўга. Праз якую мінуту ізноў тое самае. Я зразумеў, што рэнтгэналёг перасунуў рэнтгэн ніжэй, а перад гэтым успрыцнуў мне ў нагу якойсь вадкасьці, што дадае колеру жылам, і тады відаць, дзе яны звужаны. Калі я назваў тую вадкасьць фарбай, рэнтгэналёг чуць не абразіўся, сказаў, што гэта ня фарба, а спэцыяльны «стаф». Пратрываў я й яшчэ адзін здымак з тымі самымі мукамі. Пасьля перапынку – ізноў мне ўлілі ў вену тое паскудзтва. Доктар пацяшаў, што гэта ўжо апошні раз. Я быў страшэнна вымучаны, але неяк жа вытрымаў і гэты раз. Калі мяне вывезьлі на калідор – там чакала сястра, наш санітар й шофар. Сястра падала мне шклянку чакаляды. Гэта адзінае, што яна магла купіць у кафэтэрыі. Мне было не да ежы, ці піцьця, хоць было ўжо каля 11-ай гадзіны й я быў бяз сьнеданьня. Але ў роце было суха, сам я чуўся, як сноп выняты з малатарні. Выхляптаў тую чакаляду без ніякага смаку. Яна была нейкая горкая й сухая.

Хутка мы выехалі ў Бэры. Трэфік быў малы, і ехалася добра. Я чуўся зусім хворы: балела сьпіна, плечы, смылела ўсё цела. Чуў гарачку. Усе маўчалі. Прыехалі каля гадзіны 12-ай. Лёг у ложка й зараз-жа заснуў. Чуўся нявыспаны, у пятніцу й суботу была тэмпэратура панад 100 градусаў Ф. У суботу мне дазволілі ўстаць. Раіса прыходзіла што дня па два разы, бо непакоілася, і ёй было не лягчэй: прымаць пацыентаў і ляцець да мяне. Ды яшчэ дэнэрвавалася справай 25 Сакавіка, бо нічога дэфінітыўна ня было вырашана. Але ў суботу папаўдні прыехалі Валя з Паўлюком Пашкевічы (Паўлюк – Валін сын), каб забраць Раісу да сябе і зь ёй у нядзелю пайсьці на паседжаньне ККБК (Каардынацыйны Камітэт Беларусаў Канады).

З Раісай прыйшлі да мяне Валя й Паўлюк. Я вельмі ўсьцешыўся імі й тым, што было зь кім пагутарыць пра

тэрмін сьвяткаваньня й іншыя зьвязаныя зь ім справы. Усе згадзіліся яшчэ на паседжаньні ККБК 22 лютага, што сьвяткаваць трэба 5 красавіка, але аказалася, што 5-га красавіка славацкая заля занята, а на 22 III – вольная. Вось тут і пайшлі спрэчкі, што рабіць. Знайшлі харвацкую залю, трохі даражэйшую (70 даляраў), але ў добрым пункце, якую можна наняць на 5 красавіка. Раіса заявіла, што пакрые розьніцу ў цане за залю й за дадзены ўжо задатак на славацкую залю. Але ўсё-ж не беспадстаўна Пашкевічы баяліся, ці людзі захочуць пайсьці ў новую залю, калі прывыклі да славацкай. Мне ўдалося добра пагутарыць з маімі візыцёрамі й наставіць іх у тым сэнсе, што ня трэба, каб паставіць на сваім, а супольнымі сіламі знайсьці выхад, найлепшы для самой справы.

Раіса з Валяй пайшлі раней, бо Раіса мела штось зрабіць Валі з зубамі, а Паўлюк застаўся са мной больш гадзіны.

Я цешыўся, што мы пагаварылі зь ім. Ён, відаць, пераняўся беларускай справай, бо не дарма ўступіў разам з маладым Пітушкам у БНА. Ён хоча паставіць на ногі БНА як арганізацыю. Аказалася, што толькі іх двох дайшло да справы, іншыя – іх хлапцы й дзяўчаты – індэфэрэнтныя. Мы дыскутавалі, як прыцягнуць больш моладзі да працы й бягучых беларускіх справаў. Паўлюк быў задаволены нашай гутаркай.

У нядзелю вечарам а гадзіне 7-ай прыйшла адведаць мяне Грэйс Сэйсо. Яна запрапанавала Раісе, што забярэ мяне дамоў, калі-б Раіса была ў Таронта, і цяпер прыйшла. Даведалася, што я застаюся да заўтра. Тэмпэратура ў мяне яшчэ была, хоць і ніжэйшая. Мы гаварылі зь ёю аб справах яе сям'і, бо ад сьмерці яе мужа Тоні мы так і ня мелі нагоды да яе зайсьці.

За суботу ў нашым пакоі шмат зьмянілася. Першы пайшоў дахаты містэр Грыфітс, каб у панядзелак ехаць у Таронта Джэнэрал Госпіталь на апэрацыю лёгкіх. Яму маюць выразаць частку лёгкіх зь венаю разам. Такі вясёлы й, здавалася-б, бесклапотны чалавек пад пакрывай весялосьці трымае сваю трагэдыю. Я ня дзіўлюся, што ён зноў курыць, (а быў не курыўшы). Хоць сівы й каля 60-ці гадоў, ён поўны жыцьця, але здае сабе справу, што можа ня выжыць на апэрацыі, а іншага выхаду няма, на апэрацыю ісьці мусіць. Хто ведае, можа й мне прыйдзецца ісьці на апэрацыю. Бог бацька...

На месца Грыфітса прывезьлі старыка, які не гаворыць і не ўладае сабой. Відаць ён меў удар (строўк). У нас у пакоі стала спакойна, толькі сёньня нядзеля й візыцёры дакучаюць. Да майго судеда справа – сымпатычнага шкота, які прыехаў у Канаду ў 1949 годзе, спачатку прыйшоў дарослы сын, а пазьней жанчына пажылая з дзяўчаткамі. Яна гаварыла зь ім, як кулямёт, амаль дзьве з паловай гадзіны. У выніку ня толькі ён, але й я чуўся змучаны ад яе гутарак. А з містэрам Шэпардам, так завуць майго суседа, зусім блага. Яму навет кісларод (оксыджэн) не памагае, яму не хапае паветра, ён хаўкае, каб больш яго злавіць, і выглядае неспакойна.

Каля гадзіны 8:30 прыйшла Раіса – вярнулася з Таронта. Паседжаньне ККБК адбылося талкова, усе згадзіліся наняць залю ў харватаў і сьвяткаваць 5-га красавіка. Заля тая, хто яе бачыў, спадабалася, далі задатак.

У панядзелак мне трэба будзе выпісвацца.

2. III. 1970.

Вось я й дома. Раісін вольны дзень. Пагода добрая, сонечна. Пайшлі на спацыр. Выглядае, што ногі мае паправі-ліся, амаль не баляць. Праўда, я маю на сабе лягчэйшыя боты. Калі мы прыйшлі з прагулкі, я адчуў, што маю тэмпэратуру, зьмераў – 37.5. Пайшоў у ложак.

5. III. 1970.

У Раісы, як пацыент, быў др. Фрыдрых, мой – наш доктар. Пасьля візыты ў Раісы пагаварылі аб маім стане. Вынікаў рэнтгэну яшчэ няма з Таронта. Тэмпэратура ў мяне трымаецца, але з кажным днём ніжэй. Др. Фрыдрых кажа, што за пару дзён зусім зыйдзе. Таксама й болі ззаду, дзе ўпускалі мне вадкасьць у жылы, мусяць прайсьці хутка, хоць цяпер яшчэ дакучаюць, асабліва ўначы. Аказваецца, гэта параненыя жылы баляць моцна й доўга, ад іхжа й тэмпэратура. Др. Фрыдрых кажа, што мо' й ня трэба будзе рабіць апэрацыі, мо' боль у нагах пройдзе сама сабой пад уплывам лякарства, якое прыймаю й таго, што кінуў курыць. Сапраўды, болі ў нагах меншыя і я магу прайсьці больш, але зусім ня зьніклі. Яны-ж аказваюцца, калі ходзіш даўжэй. Значыць, нармальнага даплыву крыві няма.

Тэмпэратура, болі псуюць мне настрой. Зьявілася інэртнасьць, брак энэргіі, тупасьць. Я не працаздольны й нічога не раблю, хоць работы шмат. Няма апэтыту.

Раіса працуе шмат з пацыентамі, а пасьля вечарам апрацоўвае лісты ад ККБК да бурмістра Таронта й Губэрнатара Антарыё, каб Дзень 25 Сакавіка абвесьцілі Днём Незалежнасьці Беларусі, і каб у Таронта ля магістрату – Сіты Гол – у гэты дзень узьнялі беларускі нацыянальны бел-чырвона-белы сьцяг. Сёньня скончыла гэтыя лісты й выслала. Цяпер мусіць брацца за лісты-запросіны да высокіх канадыйскіх урадаўцаў. А я толькі чытаю. У гошпіталі чытаў і дома закончыў вельмі цікавую кніжку Ірвінга Стоўна "Immortal Wife" («Несьмяротная жонка») з жыцьця вышэйшых колаў ЗША ў сярэдзіне 19-га веку. Кніжка гэтая падобная да іншага твору гэтага-ж аўтара "Those who love" («Тыя што любяць»). Характэрна, што ў часе разбудовы дзяржаўнага жыцьця ЗША, вялікую ахвярнасьць праяўлялі чаловыя дзеячы Амэрыкі й укладалі ў справу ня толькі працу, але й свае ўласныя грошы. Гэта відаць, як з аднэй, так і з другой кніжкі. Дык няма дзіву, што ў беларускім руху цяпер такая ахвярнасьць частая. Толькі кніжка «Іммортал Увайф» прадстаўляе й шмат прыкрых і брудных фактаў – нянавісьці й падкопаў, ды «склоку» ў самых вышэйшых патрыятычных сфэрах ЗША. У гэтым сэнсе кніжка зрабіла на мяне благое ўражаньне, падарвала пашану да Амэрыкі, дэмакрацыі й дзяржаўнага ладу. Што-ж тады дзівіцца, што ў нас беларусаў ёсьць сваркі й інтрыгі.

8. III. 1970.

Думалі ехаць у Таронта, бо сяньня там **парафіяльны сход** у царкве Кірылы Тураўскага. Але праз ноч найшло шмат сьнегу, і я не зарызыкаваў на няпэўнае падарожжа. Раіса паехала сама аўтобусам. Дзіўлюся, што яна магла ўстаць перад гадзінай 8-ай, бо да гадзіны 1:30 ночы пісала лісты ЗБК, адпрацаваўшы свой нармальны дзень у «офісе». Няраз я дзіўлюся, што ў яе столькі энэргіі й ахвоты да працы. Адно бяда, што ў яе рабоце брак грамадзкай сыстэмы і замнога асабістых сэнтымэнтаў. Усё-ж у нашым грамадзкім жыцьці яна сіла, зь якою прыходзіцца лічыцца. Шкада, што пагода, мусіць пад уплывам учарайшага зацьменьня сонца, перашкодзіла мне паехаць, бо непакоюся справамі парафіі. Чаму было ськлікаць сход цяпер, калі няпэўная пагода? Чаму не пачакаць было пару месяцаў, калі людзям і з далейшых мясцоў было-б лягчэй прыехаць?

Вяртаючыся да зацьменьня: яно мела быць поўным у Мэксыку, Флярыдзе й Новай Шкоцыі ў Канадзе. Але было

хмарна й навет тэлевіжын магло паказаць зацьменьне толькі з Мэксыку. У нас у Бэры зусім яно не адчувалася.

Сяньня чуюся лепш, гарачкі няма. Болі нязначныя. Раскапаў сьнег, занёс лісты на пошту, а галоўнае, пахадзіў яшчэ 40 хвілін. Запішу гэтыя радкі, а тады вазьмуся за лісты, якія ляжаць неадпісаныя.

Раіса прыехала каля 8-ай – вымучаная й з галаўной больлю. Была на абедні і на сходзе. Сход, кажа, удаўся, хоць з прыежджых, апрача яе, нікога ня было.

11. III. 1970.

Фізычна чуюся лепш, але работа ня клеіцца. За што не вазьмуся, дык з рук валіцца. У чым справа? Разабраўшыся, адказ знайшоў. Гэта нічога, што лепш чуюся й пераадольваю боль у часе хады. У падсьведамасьці засела няпэўнасьць – што паказаў рэнтгэн, ці трэба будзе рабіць апэрацыю? Вось гэта мяне й гняце. Але найважнейшая рэч, што такое звужэньне жыл можа быць ня толькі ў нагах, а й у такіх мейсцах цела, дзе апэрацыі ня зробіш... Вось жа гэтая няпэўнасьць мяне й гняце. З хадзьбой таксама нявыразна: адзін дзень мне здаецца, што болі ў нагах зьменшыліся й можна хадзіць даўжэй. Дык мо' наагул ніякага звужэньня ня было, а толькі перарыў у хадзьбе ў часе прастуды спрычыніўся да заклякласьці мускулаў, так як было, калі я хварэў на сэрца й люмбага. Значыць, трэба больш хадзіць, расходжваць ногі. Вось і ўсё. Але ўчора мне хадзілася цяжэй, ногі балелі, дык таму зноў сумліў пачаў тачыць маю сьведамасьць.

Прышлі з друкарні запросіны на сьвяткаваньне 25 Сакавіка. Усё добра, але аснова для Пагоні ў нейкім цёмначырвоным колеры, а не ў чырвоным. Гэта папсула нам настрой. Ужо нічога ня зьменіш, бо мала часу засталося да 5 красавіка. Раіса да позна пісала запросіны-лісты.

Бел-чырвона-белы сьцяг ля Ратушы Таронта

22. III. 1970.


Былі мы ў Таронта на паседжаньні ККБК 15-га сакавіка й сяньня на паседжаньні Галоўнай Управы ЗБК, разглядалі справы: 1. Прыняцьці для гасьцей, што прыедуць з Дэтройту й Нью Ёрку. Гэта было заладжана пазытыўна. 2. Дасталі адказ з Сіты Гол у Таронта, што дазволена

ўзьняць беларускі нацыянальны сьцяг ля Ратушы Таронта на дзень 25 сакавіка. Дык дамаўляліся, каб заўтра афіцыйна ўручыць наш сьцяг адпаведнаму ўрадаўцу ў Сіты Гол, ды каб на 25 Сакавіка падвечар сабрацца ля сьцягу й зрабіць здымак.

Дамоў мы не паехалі, а засталіся нанач у спадарства Куляшоў, бо заўтра зраніцы мы павінны з Раісай і Ленай Кулеш паехаць у Сіты Гол, дзеля працэдуры ўручэньня нашага сьцягу адпаведнаму ўрадаўцу, які дагледзіць, каб 25 сакавіка сьцяг быў узьняты ля ратушы Таронта ад усходу да захаду сонца. Бел-чырвона-белы сьцяг 90 цаляў даўжынёй і 45 цаляў шырынёй пашыла Раіса.

23. III. 1970.

Прыехалі ў Сіты Гол а 10-ай. Мелі яшчэ паўгадзіны часу да спатканьня з мр. Вудынгтонам – «Сіты Проперты Комішынэр». Учора Раіса званіла да Язэпа Пітушкі (старшыні БНА, Р. Ж.-Г.), каб на ўручэньне сьцягу прыйшоў нехта з БНА. Усе мелі быць на працы, але малодшы Пі-



Прадстаўнікі Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады – Вінцэнт Жук-Грышкевіч (справа), Раіса Жук-Грышкевіч (зьлева) і Лын Кулеш у «Сіты Гол» перадаюць дырэктару гарадзкой маемасьці сп. Вудынгтану беларускі бел-чырвона-белы сьцяг дзеля ўзьняцьця яго ў дзень 25 Сакавіка ля Ратушы Таронта. 23 сакавіка, 1970.

тушка быў на вялікодных канікулах, дык мог прыйсьці. Званіла й да Антона Маркевіча (ЗБК, Р. Ж.-Г.). Дык мы й углядаліся на дзьверы з чакальні, але прыйшоў толькі Маркевіч. А 10:30 мы падняліся на 9-ты паверх. Прыняў нас містэр Вудынгтон вельмі ветліва й згадзіўся з намі й з бел-чырвона-белым сьцягам сфатаграфавацца. Раіса, Лена, мр. Вудынгтон і я трымалі за рагі сьцаг, а Маркевіч зьняў нас сваім апаратам. Калі здымак выйдзе добра – гэта будзе належнае адзначэньне нашага асягненьня: узьняцьця першы раз у Таронта ля ратушы беларускага нацыянальнага бел-чырвона-белага сьцягу.

Далей мы ў траіх (без Маркевіча) пайшлі ў канцылярыю Мэра, каб на ўсякі выпадак спытацца, ці выдана праклямацыя абвешчаньня дня 25 Сакавіка днём незалежнасьці Беларусі. На ўсякі выпадак, бо ніхто ня ведаў, ці такая праклямацыя наагул будзе выдана. На пытаньне Раісы сакратарка зірнула ў папку й сказала, што праклямацыя выдана й у пятніцу выслана на адрас Раісы. На нашу просьбу яна дала нам аж тры копіі яе, каб зьмясьціць у прэсе. Праклямацыя мела добры зьмест, але як яе разгледзілі, у ёй ня было сказана, што бальшавікі пазбавілі Беларускую Народную Рэспубліку незалежнасьці, проста віноўнік быў змоўчаны. Ды ў далейшых сказах гаварылася, што Беларусь паняволеная й што народ наш змагаецца за свю свабоду й незалежнасьць. Гэта ўжо паправіла нявыразны зьмест, і мы вырашылі зьмясьціць праклямацыю ў газэтах «Торонто Дэйлі Стар», «Глёўб энд Мэйл» і «Тэлеграм». У «Стар» нам сказалі, што няма ніякай пэўнасьці, што наша праклямацыя будзе зьмешчана за дарма ў разьдзеле “Voice of the people,” але калі мы заплацім 96 даляраў, тады напэўна будзе зьмешчана. Столькі мы не маглі заплаціць. Пайшлі ў «Глёўб энд Мэйл». Там за зьмяшчэньне праклямацыі ў навінах у двох шпальтах па 3 цалі зажадалі 81 даляр. На гэта мы пагадзіліся, бо газэта йдзе па ўсёй Канадзе, дык будзе добрая прапаганда нашай справы. Надрукавана будзе ў нумары за 25 сакавіка. А ў «Тэлеграм» згадзіліся зьмясьціць нашу праклямацыю за дарма ў навінах з Таронта ў заўтрашнім нумары, 24 сакавіка. Пабачым, як гэта будзе выглядаць.

Пазьней нам прыйшло ў галаву, каб гэту праклямацыю абвесьціць у радыё ў Таронта. Лена (беларуска, роджана ў Канадзе, выйшла замуж за новага імігранта Міхася Кулеша, Р. Ж.-Г.) пазваніла на радыё на «Колыдж» і

СФРБ. Першае згадзілася падаць у сераду падыктаваны тэкст, а другое зажадала напісанага тэксту. Лена напісала хуценька й зараз-жа занесьлі ліст на почту.

Дык вось колькі асягненьняў за адзін дзень», а ніжэй тэкст дэкляpацыі:

MAYOR'S OFFICE
TORONTO

WILLIAM DENNISON
MAYOR

BRYAN LLOYD
EXECUTIVE ASSISTANT

CITY OF TORONTO – PUBLIC NOTICE
"BELORUSSIAN INDEPENDENCE DAY"

WEDNESDAY, MARCH 25TH, 1970.

The City of Toronto has been approached by the Belorussian Canadian Coordinating Committee to proclaim Wednesday, March 25th as "Belorussian Independence Day."

This year marks the Fifty-second Anniversary of the independence of the Belorussian Democratic Republic, which was shortlived as the government was overthrown, and forced into exile. Belorussian people, who have become useful and worthy citizens of Canada, continue to strive, hope and pray that justice and freedom will be restored in their native land.

The City of Toronto is therefore pleased to proclaim Wednesday, March 25th, 1970, as "Belorussian Independence Day" in recognition of ceremonies to be held that day and to bring attention to the Belorussian fight for freedom.

(Signed) Mayor.

Mayor's Office, City Hall, Toronto,
March 24, 1970.

26. III. 1970.

25 сакавіка зьбіраемся ў Таронта, каб пабачыць узьняты бел-чырвона-белы сьцяг пры «Сіты Гол». Тымчасам купілі й разглядаем газэты. Газэта «Торонто Дэйлі Стар» зьмясьціла

кароткую зацемку аб нашым сьвяце й праклямацыю Мэра Таронта ў аўторкавым нумары (24. 3.); «Дзэ Тэлеграм», які так прыязна нас спаткаў у панядзелак, нічога не напісаў пра наша сьвята ні ў аўторак, ні ў сераду; а «Глёўб энд Мэйл» зьмясьціў аплачаную праклямацыю, што абвяшчала дзень 25-га сакавіка «Днём Незалежнасьці Беларусі», на 2-ой бачыне й апрача таго ліст К. Акулы на тэму сьвята за дарма. З гэтага й мы й усе беларусы былі задаволены.

У Таронта паехалі мы папаўдні й ськіваваліся на Натан Філіп Сквэр каля Ратушы. Здалёк бел-чырвона-белы сьцяг красаваўся на вятры. Быў прыгожы сонечны дзень. Нам пашчасьлівілася, бо на другі дзень ізноў прыйшла завея й сьцюжа. Мы любаваліся сваім сьцягам, і Раіса зрабі-



Першы раз у гісторыі Канады беларускі бел-чырвона-белы сьцяг узьвіваецца ля Ратушы Таронта. 25 сакавіка, 1970.

ла шмат здымкаў, некаторыя са мной, некаторыя так. І я зрабіў некалькі здымкаў з Раісай каля сьцягу. Прыйшоў А. Маркевіч таксама з апаратам. У міжчасе прыйшло трох людзей з усходнімі тварамі. Адзін пачаў гутарку з Раісай. Я не памыліўся, гэта былі камуністы. Яны ведалі, што нацыянальны беларускі сьцяг узьняты ў гонар дня незалежнасьці БНР, і сталі абзываць нас гітлероўцамі. Мы ім адказалі, што іх хлусьлівая прапаганда абмінаецца з фактамі, бо БНР паўстала ў 1918 годзе, а беларускі нацыянальны сьцяг яшчэ раней. Дык пры чым тут гітлероўцы? Каля гадзіны 5-ай пачалі зьбірацца нашы людзі, а каля 6-ай было ўжо 33 асобы: 18 з ЗБК і 15 з БНА. Прыйшлі палюбавацца беларускім сьцягам пры Ратушы, задакумэнтаваць сваю салідарнасьць зь ідэяй БНР. Задэманстраваць сваё зацікаўленьне сьвяткаваньнем угодкаў (52-іх) 25 Сакавіка. 33 – гэта вельмі малая лічба на двухмільённы горад. Праўду кажучы, дык пры найлепшым стараньні лічба гэта магла-б толькі падвоіцца, калі браць пад увагу ўсе сьведамыя беларускія актыўныя сем'і ў Таронта. А неактыўных і абыякавых ёсьць тысячы й другія тысячы несьвядомых нацыянальна беларусаў. Якія ўсё-ж важныя справы можа праводзіць гэта малая, актыўная жменька людзей. З такімі думкамі ехалі мы дахаты.



25 Сакавіка, чацьвер, 1971. Бел-чырвона-белы сьцяг ля Ратушы Таронта.

29. III. 1970.

Сяньня каталіцкі Вялікдзень. Я ня памятаю такога сьцюдзёнага Вялікадня: сьнег, вецер, мароз (16 градусаў Ф.). Учора была завея, таксама ў Вялікую Пятніцу, калі мы былі ў касьцёле. Сяньня паехалі ў касьцёл на 11:20 – на апошнюю імшу. Было маса людзей, што ня было дзе машыну запаркаваць. Спаткалі там Майка Бычко з жонкаю, іх зямлячкай, што нядаўна прыехала з Польшчы, і 10-ці гадовай сястрой Майка. Воддаль сядзела матка. Па імшы запрасілі мы іх да сябе. Сьнедалі-разгаўляліся, гаварылі: мы й матка ды Майк – пабеларуску, а Вікця (жонка Майка) і Зоська ды Марыська – папольску, або ламанай беларушчынай. Пазьней паехалі ўсе на фарму да Бычкоў, дзе ізноў шмат гутарылі й елі вялікодны абед. Вікця й Зоська паходзяць з пад Стоўпцаў (вось дзярэўня), як і сям'я Бычко, але абедзьве выехалі з бацькамі ў Польшчу й спольшчыліся. Пабеларуску гавораць столькі, колькі чулі ад сваіх бацькоў. Так трацяцца беларускія душы... Масква й Варшава й надалей карыстаюць зь іх, ня толькі з слабавольля беларусаў, але й зь няспрыяльнай каньюнктуры для беларусаў.

Учора гаварылі па тэлерфоне з др. Сажычам. Ён падыктаваў Раісе праграму, зь якой прыедуць дэтройтцы 5-га красавіка на сьвяткаваньне 25-га Сакавіка. Прыедзе іх каля 10-ці асоб, і прыедуць у суботу. Раіса ўкладае ўсю праграму й мусіць адбіць яе на рататары.

7. IV. 1970.

Сьвяткаваньне 25 Сакавіка прайшло вельмі ўрачыста. Было шмат людзей й багатая праграма. Раісу я завёз у Таронта ў суботу нанач, каб яна вечарам магла прыбраць залю ЗБК, а заўтра раніцай харвацкую залю для сьвяткаваньня 25 Сакавіка. Вярнуўся дамоў, бо спадзяваўся, што Сажычы прыедуць да нас нанач. Але дзесь па 8-ай вечара прыехалі Бруцкі, Стрэчань і Калоша з Клівэлянду. Прывёз іх Барыс Кірка. Хадзіла ім аб афармленьне ў радныя Рады БНР Бруцкага. Я дамовіўся зь імі, каб пастанову аб правядзеньні ў радныя Бруцкага правялі ў сваім сэктары – пасьля ўзнаўленьня дзейнасьці яго – у прысутнасьці др. Сажыча, сакратара Рады БНР. Пачаставаў іх вэнджанай асятрынай з канадыйскай гарэлкай і яны вярнуліся ў Таронта.

У нядзелю, 5 красавіка, прыехаў я ў Таронта перад 11-ай і трапіў на сярэдзіну багаслужбы. Было маса людзей, што ў царкву было цяжка прасунуцца. Сьпяваў хор з Дэ-

тройту – 10 асоб пад кіраўніцтвам Веры Арцюх. Сьпявалі цудоўна, што ўсе заслухоўваліся. Багаслужба, якую адпраўляў Уладыка Мікалай і а. Мігай, была прыгожая й урачыстая. Незадоўга прыехалі Запруднікі (Янка й Оля, Р. Ж.-Г.) з Рагулямі (Барыс і Люда, Р. Ж.-Г.). Пасьля багаслужбы селі за прыбраныя сталы – госьці й мясцовыя. Сталы ў тры рады, за імі села больш як 60 асоб. З прамовамі, але без гарэлкі, зьелі абед, нагутарыліся, і на 3-ю гадзіну паехалі ў харвацкую залю на святкаваньне.

Даклад Янкі Запрудніка пабеларуску быў вельмі добры. Янка Садоўскі меў даклад паангельску. Некалькі прывітаньняў, а тады багатая мастацкая частка: сьпевы дэтройтцаў – дуэт Веры Арцюх і Вары Сажыч, солё Веры і хор пад кіраўніцтван Юркі Мазуры – былі вельмі добрыя, некаторыя нумары цудоўныя. Чамусьці слабавата вышла песьня «Ад родных ніў» – на словы М. Багдановіча. Цудоўнае выкананьне танцаў «Крыжачка» й «Лявоніхі» чатырома парамі, моладзь захапіла публіку. Зь дзяўчат выдзялялася прыгожай танцавальнай манерай Эва Пашкевічанка. Ды найбольшае ўражаньне зрабілі сваім выступленьнем «Полькі Янкі» малыя 8-10-гадовыя дзяўчаткі – чатыры пары. Навучыла іх Эва Пашкевічанка. Агульнае адсьпяваньне на заканчэньне акадэміі беларускага нацыянальнага гімну – «Мы выйдзем шчыльнымі радамі» таксама выйшла вельмі добра.

Сажычы сьпяшаліся дамоў, бо зь імі ехалі Вера Арцюх і Юрка Мазура, якія ў панядзелак мусілі йсьці да працы. Каб мець нагоду пагутарыць з Сажычам і Запруднікам, мы прынялі запросіны Касьцюкевічаў заехаць да іх разам з дэтройтцамі. Гаварылі аб сытуацыі ў Прэзыдыюм й Сакратарыяце Рады БНР. Дамовіліся: 1. Трымаць кантакт з Прэзыдэнтам Абрамчыкам і старацца перавесьці архіў Рады БНР з Парыжу ў Нью Ёрк. 2. Паколькі ў Нью Ёрку не хапае людзей, каб абсадзіць мейсцы ў Прэзыдыюм і Сакратарыяце Рады БНР, шукаць іншае разьвязкі, г. зн. перанясеньне некаторых рэсортаў у другія асяродкі, як Чыкага ці Клівэлянд. 3.Абдумаць чарговую Сэсію Рады БНР, паколькі няма надзеі, каб Прэзыдэнт Абрамчык вярнуўся да поўнага здароў'я.

А 8:30 мы з Запруднікамі выехалі ў Бэры. Дома гасьцілі іх рыжыкамі й вэнджанай рыбай, выпівалі й шмат аб чым гаварылі. Аддыхаць пашлі позна, а ў панядзелак раніцай а гадз. 9:00 Запруднікі выехалі ў Нью Ёрк.

Сьмерць Міколы Абрамчыка й Уладыкі Васіля

14 чэрвеня 1970.

У канцы красавіка др. Б. Рагуля адведаў Прэз. Абрамчыка ў Парыжы. Перад ад'ездам я зь ім абгаварыў важнейшыя справы. Па павароце ён патэлефанаваў і сказаў, што Прэз. Абрамчык доўга не патрывае. Але пакуль бяда ня ўдарыць, чалавек думае, што яна яшчэ далёка. А яна была ўжо блізка. 29 траўня каля 11:00 гадзіны дня зазваніла Людка Рагуліха й сказала: Атрымалі тэлеграму ад Ніны такога зьместу: «Сёньня Мікола памёр». Праз якіх дзесяць хвілін такую-ж тэлеграму атрымалі й мы. Заразжа зазванілі да Запрудніка й адразу пачалі ўмаўляцца, як Раіса зь ім паляціць у Парыж. (Я ня чуўся на сілах, каб пусьціцца ў такое падарожжа). Былі клопаты з грашыма, бо ў суботу ўсе банкі зачынены, але неяк атрымалі патрэбную суму ад знаёмых. Дагаварыліся, што Раіса й Янка Запруднік палятуць зь Нью Ёрку тым самым самалётам у суботу (30. VI.) вечарам. Завёз Раісу на лётнішча і а 5-ай яна паляцела ў Нью Ёрк.

У аўторак зазваніў Адамовіч зь Нью Ёрку й сказаў, што атрымаў тэлефанічную вестку ад Запрудніка з Парыжа. Даехалі яны з Раісай шчасьліва. Паховіны будуць у чацьвер 4-га чэрвеня на парыскіх могілках Пэр Ляшэз, а не ў Вільлепінтэ. На гэта патрэбныя грошы, больш, як дзьве тысячы даляраў, частку – адну тысячу – мае даць Эўропа, прывязе Уладыка Сіповіч, а другую – Амэрыка, прывязе Адамовіч. Вылятае ў Парыж праз гадзіну. Значыць, Раіса вернецца дзесь у пятніцу ці суботу.

У міжчасе ў нядзерю 31 траўня адбылося ўрачыстае парафіяльнае сьвята БАПЦ у Таронта. Служыў Япіскап Андрэй (Крыт) у саслужэньні Уладыкі Мікалая, а. Мігая й дыякана Страпко (родам з Пружаншчыны, Р. Ж.-Г.). Людзей было каля 60 асоб. Абед прайшоў добра. Я прачытаў Раісін даклад пра сьв. Кірылу Тураўскага. Ужо тады ўшанавалі памяць нябожчыка Міколы Абрамчыка. Адслужылі паніхіду пасьля абедні, а пры абедзе я сказаў слова памяці адыйшоўшага ў вечнасьць Старшыні Рады БНР і паінфармаваў пра падзеі ў Парыжы. Мінутай маўчаньня прысутныя аддалі пашану сьв. пам. Міколы Абрамчыка.

Раіса вярнулася ў пятніцу. Гутарак аб усім, што было ў Парыжы, хапіла на тыдзень. (Аб архіве БНР ня буду ўспамінаць).

У нядзелю 7-га чэрвеня мы з Раісай паехалі да Сажычаў на іх сямейную ўрачыстасьць. У царкве служыў Уладыка Мікалай, пасьля абедні была паніхіда на сьв. пам. Міколе Абрамчыку. Дамоў вярнуліся ў панядзелак. Тыя дні ніяк мы не маглі прыйсьці да сябе псыхічна ад шоку сьмерці Міколы. А ў пятніцу – новы шок! Каля гадзіны 11-ай вечара зазваніў Язэп Сажыч і паведаміў, што зьнянацку ў Нью Ёрку памёр Уладыка Васіль... Паведамілі мы Уладыку Мікалая й Міколу Ганька. У суботу рана званіў др. Васілеўскі (Войтанка). Аказалася, што Уладыка Васіль памёр некалькі дзён таму, седзячы ў крэсьле. Выкрылі суседзі...

Сяньня былі ў Таронта. Уладыка Мікалай паехаў у Нью Ёрк, дык служыў а. Мігай, і абедню й паніхіду па сьв. пам. Уладыку Васілю. Паховіны будуць у сераду. Паедуць Ганько й Грыцук, хіба й мы з Раісай. Пасьля паховінаў мне варта было-б зрабіць паседжаньне Прэзыдыюма Рады БНР у Нью Ёрку.

15. 06. 1970.

Званілі да Запрудніка, паведамілі, што прыедзем з Ганьком і Грыцуком сваім аўтам у сераду 17. 06. Запруднік сказаў, што ўсе зьбіраюцца ў сераду ў Саборы БАПЦ на 401 Атлянтык Авенью ў 10-ай гадзіне раніцы. Маю надзею, мы пасьпеем прыехаць на час. Адтуль пасьля адпяваньня паховіны адбудуцца на беларускім могільніку Жыровіцкай Божай Маці ў Іст Брансвіку.

На паседжаньне Прэзыдыюму Рады БНР Запруднік пагадзіўся, аб дні й часе дамовіцца зь іншымі. Па паховінах Раіса вернецца дамоў, а я застануся ў Запруднікаў, каб мець час на гутаркі.

22. 06. 1970.

Вяртаюся аўтобусам зь Нью Ёрку. Выехалі з Раісай з Таронта з Ганькамі ў аўторак 16. 06. а гадзіне 6-ай вечара сваім аўтам. Далучыліся да нас Стэльмашок з сваім аўтам. Ён вёз Уладзімера Целеша (старшыню царкоўнай Рады) з сынам. Ехалі мы праз Кінгстан і Сыракузы, каб забраць яшчэ ў Кінгстане Грыцука. Едзем мы ўсе ў Нью Ёрк на паховіны сьв. пам. Уладыкі Васіля. Гэта другая вялікая страта на працягу двох тыдняў пасьля сьмерці Прэзыдэнта Абрамчыка, і раптоўная й нечаканая. У пятніцу 12 чэрвеня позна вечарам зазваніў нам др. Сажыч з

Дэтройту, што памёр раптоўна Уладыка Васіль. Сталася гэта 11 дзён пасьля сьмерці Міколы Абрамчыка. Пасьпеў яшчэ Уладыка Васіль паведаміць аб сьмерці Абрамчыка М. Нікана ў Аўстраліі. Успамінае аб гэтым Нікан у сваім лісьце да мяне.

У Грыцука мы былі ўжо перад гадзінай 9-ай, але яго ня было дома. Пайшоў прайсьціся, казала Оля. Чакалі мы на яго 45 мінут, калі ўрэшце прыйшоў. Выехалі ад Грыцукоў за 15 мінут 10-я. Нашу машыну вёў Ганько. Хоць ноччу, але ехалася добра, дарога была добрая й цудоўная пагода – чэрвеньская ноч. Прыехалі ў Нью Ёрк каля 6-ай раніцы да Валодзі й Ганны Русакоў, так як яны нас запрасілі. Яны прынялі ўсіх нас восем чалавек і далі мейсца легчы на адпачынак. Адпачывалі мы каля 3-х гадзін і на 10-ю былі ўжо ў царкве на адпяваньні. У царкве было больш ста людзей. Былі: сп.Кіслы з харыстамі з Клівэлянду, др. Я. Сажыч з Дэтройту, мы з Канады й шмат людзей зь Нью Ёрку. Адпяваньне цягнулася больш трох гадзін. Пры труне ўвесь час стаяла ганаровая варта: сп. Стрэчань (радны БНР з Клівэлянду), др. Я. Сажыч й я. Мне цяжка было доўга выстаяць й др. Сажыц, як лекар, параіў мне пайсьці сесьці, што я й зрабіў. Служылі абодва Уладыкі – Андрэй і Мікалай, а. Войтанка й тры дыяканы: Савіцкі, Страпко й Старавойтаў. Цудоўна пяяў павялічаны хор – мясцовы й з Клівэлянду.

Дзесьці каля трэцяй вынесьлі труну, пакрытую белчырвона-белым сьцягам, з царквы ў самаход, і вялікая працэсія вырушыла на беларускі могільнік Жыровіцкай Божай Маці ў Іст Брансвік, якіх 30 міль ад царквы. Але ўтрымацца разам працэсіі дзеля трэфіку не ўдалося. На могільнік прыбылі па 4-ай. Само пахаваньне трывала вельмі доўга – маленьне й прамовы. Колькасьць людзей яшчэ павялічылася, бо даехалі людзі з Саўдз Рывэру й Нью Брансвіку.

Прамовы над магілай казалі: Уладыкі Андрэй і Мікалай, а. Войтанка, тады я як Старшыня Рады БНР, М. Гарошка й др. Сажыч.

Могільнік у вельмі прыгожым мейсцы, мне спадабаўся, на такім могільніку й я хацеў бы легчы... (там ён 21-га лютага 1989 году й лёг..., Р. Ж.-Г.).

Па паховінах усе былі запрошаны на абед у царкоўную залю ў Гайлянд Парку – частцы Нью Брансвіку. За памінальным сталом села якіх 150 асоб. Там было больш

прамоваў. Мы з Раісай мелі нагоду наведаць магілу майго сябры др. Аляксандра Орсы і памаліцца над ёй. Помнік прыгожы, але за даўгі напіс. Абед трываў да гадзіны 8-ай. Раіса з тарантонцамі паехала дамоў, а я застаўся, каб у суботу правесьці паседжаньне Рады БНР. З Валодзем й Нюрай Русакамі ды др.Тумашам мы заехалі да Ханяўкаў. Бедны Чэсь, ён пастарэў, хоць трасуха не выглядае, каб пагоршала, але гаворыць з трудам. У Нью Ёрк выехалі па 10-ай. Завязьлі дамоў др. Тумаша й Натальлю Орсіху. Да Русакоў прыехалі а гадзіне 1:30 ночы. Толькі цяпер я пайшоў спаць, хоць надта перамучаны й ня чуўся. Шмат чалавек можа вытрываць як трэба.

Чацьвер і пятніцу адпачываў. Рыхтаваўся да паседжаньня Рады БНР у суботу, 20-га чэрвеня. Як звычайна, спадарыня Ганна Русачыха даглядала мяне, як маці родная. Быў спакойны за Раісу, бо ў чацьвер каля гадзіны 11-ай яна зазваніла з дому, што даехалі шчасьліва.

Субота пачалася неспакойна. Пазваніла да Русакоў Натальля Орсіха й паведаміла, што Уладыка Мікалай заўтра мае рукапалажыць у сьвятары дыякана Карпа. Ён зь Віцебшчыны, але вельмі слаба гаворыць пабеларуску. Рэкамэндаваў яго пакойнаму Уладыку Васілю якісь казацкі манах. І хоць ён служыў з Уладыкам каля году, ніхто яго добра не пазнаў як чалавека, тым больш, што й жыве ён каля 100 міляў ад Нью Ёрку. Але сьвятар нагвалт патрэбны, бо а. Кэндыш хворы, а Уладыка Мікалай мае абавязкі ў Таронта й Дэтройце. Але апёкшыся ня так даўно на Абрэмскім, шмат хто з парахвян настойваў, каб дыякана Карпа яшчэ ня высьвечваць, а старацца лепш пазнаць яго. Ды нашы Уладыкі й Царкоўная Рада мелі, відаць, іншы погляд. Вось жа Орсіха й Русакі паднялі буру. Уселі на мяне, каб я, як Страшыня Рады БНР, не дапусьціў да гэтага рукапалажэньня. Я адмовіўся на адрэз, бо гэта да маёй кампэтэнцыі не належыць. Пазваніў толкі да Міколы Гарошкі прыватна, каб выясьніць справу, ды перадаў трубку Русаку. Паміж імі ўзьнікла вострая спрэчка. Русак заявіў, што ён падыме гэтую справу на паседжаньні Рады БНР.

Паседжаньне Рады БНР

У Фундацыю Крэчэўскага я паехаў пад'земкай сам да 168-ай стрыт, а тады пайшоў пехатой. Выехаў раней, каб трапіць на паседжаньне Галоўнай Управы БАЗА, бо пры

спаткаьні са старшынём БАЗА абяцаў паінфармаваць аб поглядзе ЗБК на працоўныя сэсіі на Сустрэчы БПА. Прыйшоў я па гадзіне 4-ай. Іхняе паседжаньне было ў поўным разгары. Прыемнае ўражаньне зрабіла тое, што пераважалі маладыя: старшыня Вячаслаў Станкевіч, др. Расьціслаў Гарошка, й Валентын (адвакат) Гарошка, Рая Станкевіч і Аляксандар Міцкевіч, а са старэйшых – Зіна Станкевічыха, Кунцэвіч і Тулейка. Адразу пераравалі дыскусію й прасілі мяне выказацца. Я коратка прадставіў патрэбу працоўнух сэсіяў у часе Сустрэчы, націскаючы на справу беларускага ўзгадаваньня дзяцей і моладзі, якая, пажадана, каб была ў цэнтры падзеяў Сустрэчы. З дыскусіі я пераканаўся, што Галоўная Ўправа БАЗА падыходзіць да гэтай справы таксама паважна, як і мы. Толькі час можа быць вызначаны на некалькі сэсіяў у суботу, а не ў нядзелю.

Надыходзіла 5-я гадзіна. Пачалі зьбірацца радныя. Паседжаньне БАЗА перайшло ў іншы пакой. Усіх радных сабралося 15 асоб, як пашыранае паседжаньне Прэзыдыюму й Сакратарыяту Рады БНР. Запрапанаваны мною з сямёх пунктаў парадак дня быў прыняты з даданьнем пункту рознае. Пачалося з ушанаваньня хвілінай маўчаньня сьв. пам. Прэз. Абрамчыка й Уладыкі Васіля, а тады прывітаньне мяне як новага Прэзыдэнта Рады БНР. Пасьля гэтага др. Запруднік, які склікаў і распачаў паседжаньне, папрасіў мяне вясьці яго далей. Паседжаньне было паважным ува ўсіх пунктах, зь вельмі жывымі дыскусіямі. Тэрмін новай Сэсіі згадзіліся вызначыць на Сустрэчы БПА. Была вызначана камісія дзеля перагляду статуту. Ня буду спыняцца над усім паседжаньнем. Гэта ў пратаколе. Затрымаюся яшчэ над выступленьнем сп. Ул. Русака з дамаганьнем, каб паседжаньне пастанавіла не дапусьціць да рукапалажэньня ў сьвятары дыякана Карпа Старавойтава. Сп. Стагановіч і яшчэ пару моцна падтрымалі яго, проці выказаўся А. Адамовіч. Я забраў слова ў справе фармальнай і асьведчыў, што справа высьвячэньня сьвятароў і выбар кандыдатаў на іх не належыць да кампэтэнцыі Рады БНР і таму дыскусія ў гэтай справе спыняецца.

Наагул усе ўважалі, што паседжаньне прайшло памысна, і я адчуў вялікае аблягчэньне, прабыў я некалькі дзён у Нью Ёрку не дарма.

Вярнуліся мы да Русакоў па гадзіне 10-ай. Засталі там др. Тумаша. Правялі прыемна рэшту вечара. Ганна пры-

гатавала нам закуску й выпіўку, пры якіх мы нагутарыліся й насьмяяліся да 1:30 ночы.

* * *

Думаў ляцець дамоў у нядзелю, але задажджылася, і чуўся змучаны, вырашыў яшчэ дзень адпачыць. Хацеў таксама спаткацца з Запрунікам, каб спрэцызаваць справы да заладжаньня ў найбліжэйшым часе. Дзеля гэтага трэба было ехаць у царкву, але там было рукапалажэньне сьвятара, на якім я ня мусіў быць, тым больш, што існавала кантравэрсыя. Русакі вырашылі быць на рукапалажэньні, але не засталіся на ўрачысты абед. Яны паехалі пры канцы службы. Мяне маглі-б завезьці да Русакоў Запруднікі, але я не хацеў іх абцяжваць. З Запруднікам й Шукелойцям я ўзгодніў, якія справы й у якой чарзе мы праводзім, і больш мне зь ім ня трэба было гаварыць.

Прышлося мне пагутарыць з Валодзем і Алінаю Курыламі й пабываць у іхнім новым доме. Яны прапанавалі ў панядзелак падкінуць мяне на самалёт ці аўтобус.

У царкве вытварылася такая сытуацыя, што мне прышлося быць і на рукапалажэньні сьвятара й на абедзе. У канцы багаслужбы Уладыка Мікалай у казаньні абвесьціў, што дыякана Карпа рукапаложана ў сьвятары для парафіі, якую ён арганізуе ў Філядэльфіі, а ў Нью Ёрку ён будзе служыць да таго часу, пакуль знойдзем сьвятара для Нью Ёрку, або выздаравее а. Кэндыш, які нядаўна меў «гарт атак». Гэта разаружыла апазыцыю, нават і Натальля Орсіха была на абедзе да канца. За сталом было каля 50-ці асоб. Многія ўсё-ж не пайшлі. Віталі новага сьвятара, але й мяне віталі й ганаравалі як Прэзыдэнта Рады БНР і за сталом пасадзілі разам зь Япіскапам. Айцец Карп Старавойтаў паходзіць з-за Віцебска, ён беларус, само прозьвішча за гэтым прамаўляе. Сьвятар зь яго мо' будзе й добры, а калі й ня вырабіцца на моцнага беларуса, то ўсяроўна будзе служыць для БАПЦ сярод такіх, як сам, а іх тут шмат у Амэрыцы.

Новы дом Курылаў вялікі, мае чатыры спальні, збудованы па апошнім слóве тэхнікі й моды, выгадны й вельмі прыгожы. Я меў нагоду пагутарыць з Валодзем пра справы разбудовы фінансава-эканамічнай базы для беларускага руху. Канкрэтнага выхаду мы не знайшлі, але пастанавілі шукаць яго з усімі, з кім можна, пры кажнай нагодзе.

Цікава, што ў асабістых справах у нас ёсьць добрыя бізнэсмэны (Гарошка, Курыла й іншыя), а ў грамадзкім бізнэсе яны бязрадныя.

У Курылаў я добра адпачыў, а сяньня раніцай завезьлі мяне а гадзіне 6-ай на аўтобус. Ехалася мне добра, драмаў, адпачываў і запісваў гэтыя радкі, што дома рабіць не заўсёды ўдаецца. Цяпер 7:20 папаўдні й мы зьбліжаемся да Таронта, дзе маем быць а гадзіне 8-ай. Тэлефанічна ўмовіўся з Раісай, што зазваню да Пашкевічаў і яны завязуць мяне ў Бэры.

Прыехалі на Бас Тэрмінал за 15 мінут 8-ая. Выйшаў з аўтобусу, узяў сваю валізку й думаў ісьці да тэлефону. Але ў гэты мамэнт зьявілася, як з-пад зямлі Раіса й схапіла мяне ў абдымкі. Сяньня панядзелак, і яна не працавала, таму сама захацела спаткаць мяне. Пашкевічам пазваніла, каб заўтра вечарам прыехалі й прывязьлі Эву, якая цяпер працуе з Раісай. Раіса завязла мяне дамоў сваім самаходам.

4 верасьня, 1970.

Доўга нічога не запісваў. Быў заняты дробнымі справамі, але ўвесь час у руху, а часу мала. Лета прайшло хутка пад знакам сьмерці Прэзыдэнта Абрамчыка й Уладыкі Васіля, па якіх рабіліся памінкі. Дзеля таго, што я заняў месца сьв. пам. Міколы Абрамчыка, прышлося павялічыць перапіску з беларускімі асяродкамі.

На адпачынку былі тры тыдні над ракой Атавай. Чуліся перамучанымі, ніякімі справамі не займаўся, навет нічога не запісаў у гэты дзёньнік. А як вярнуліся дамоў, ізноў карэспандэнцыя й падрыхтоўка да 9-ай Сустрэчы БПА ў Нью Ёрку забіралі ўвесь час. На Сустрэчу вырашылі ехаць утраіх: Раіса, я й Эва Пашкевіч, якая, хоць зьбліжаецца да 16-ці год векам, была асыстэнткай Раісы праз лета й давала сабе рады. Ды бяз камплікацыяў, ці што адбываецца?! Як гром зь яснага неба Раісу схапіў такі боль сьпіны, што яна папала ў гошпіталь. Ды ахвота горш няволі. У гэтым выпадку ейная ахвота й нашая з Эвай маральная падтрымка хутка паставілі яе на ногі.

На Оттава рывэр сёлета была страшэнна вялікая вада, каля 5 футаў вышэй нармальнай. Рыба бралася слаба, але я налавіў колькі хацеў.

Рыжыкі на «маёй фарме» былі выкінуліся ў канцы ліпеня й пачатку жніўня. Перад выездам на адпачынак я

схадзіў некалькі разоў у лес і прыносіў іх досыць, каб зварыць, і было яшчэ на саленьне. Насаліў чуць ня поўны вялікаваты слоік. А па павароце з адпачынку пайшоў у лес і знайшоў толькі тры нэндзныя рыжыкі. Такая суш, што яны зусім не расьлі. Цяпер пашлі дажджы, дык мо' пачнуць расьці. Ня ведаю, ці пасьпею сяньня схадзіць у лес, быў дождж, але я вельмі заняты.

А вось і Эва прыйшла. Трэба ехаць у гошпіталь па Раісу. Эва задаволена, што цётка чуецца лепей і зможа з намі паехаць на Сустрэчу».

9-я Сустрэча Беларусаў Паўночнае Амэрыкі адбылася 5-7 верасьня ў Нью Ёрку

У сваім прывітальным Сустрэчы слове старшыня Рады БНР др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч гаварыў:

«...9-я Сустрэча Беларусаў Паўночнае Амэрыкі адбываецца пад знакам «Беларусь у Змаганьні». Дэдыкацыя гэта гаворыць сама за сябе. Яе вызначыла сытуацыя нашай бацькаўшчыны-Беларусі, што знаходзіцца ў бязупынным змаганьні за сваё вызваленьне з пад чырвонага расейскага каляніяльнага ярма. Яе вызначылі абавязкі беларускай эміграцыі – адзінай часткі беларускага народу, вольнай ад маскоўскага таталітарнага паняволеньня, у вадонсінах да свае Бацькаўшчыны.

Калі Беларусь у змаганьні, гэта значa, што й мы, беларуская эміграцыя, павінны быць у гэтым змаганьнмі. Мы мусім выконваць тыя заданьні, якія вызначае нам наша палажэньне ў вольным сьвеце, а якія недаступныя нашым братом на бацькаўшчыне. А гэта:

1. тварыць і ўтрымліваць беларускае арганізацыйнае жыцьцё ў вольным сьвеце;

2. перахоўваць і культываваць беларускую нацыянальную спадчыну й беларускія незалежніцкія дзяржаўныя традыцыі;

3. інфармаваць увесь сьвет аб тых зьдзеках і злачынстве, якія чыніць над нашым народам маскоўскі акупант;

4. дапамагаць усімі магчымымі спосабамі нашым суродзічам на Беларусі ў іх змаганьні супраць нацыянальнага й палітычнага паняволеньня, супраць русыфікацыі й эканамічнага вызыску.

Дзеля выкананьня гэтых абавязкаў нам патрэбна грамадзкая актыўнасьць, нацыянальнае адзінства, згода й нацыянальная салідарнасьць.

Гэта вельмі высокія якасьці, бяз якіх ніякі народ ня можа здабыць сваёй дзяржаўнай незалежнасьці.

Зьвяртаюся да вашага патрыятызму й заклікаю ўсіх беларусаў, тут прысутных і няпрысутных, каб, культывуючы гэтыя высокія якасьці, выконвалі сумленна нашыя, вышэй паданыя абавязкі.

ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ У ЗМАГАНЬНІ!»

60-я ўгодкі Ларысы Геніюш

Знаёмства з беларускай паэткай Ларысай Геніюш цягнецца ў нас з часоў апошняе вайны, а перапіска зь ёю ад 60-х угодкаў ейнага жыцьця. Радзілася яна 27 ліпеня 1910 году. 22 чырвеня 1970 году пішу ёй ліст:

Вельмі Паважаная й Дарагая Спадарыня Ларыса Геніюш!

Вітаем Вас з 60-мі ўгодкамі Вашага жыцьця й жадаем ад найшчырэйшага сэрца яшчэ шмат гадоў творчай і плённай працы.

Вы мяне напэўна ня помніце, але гэта ня так важна. Ваш сын тады быў можа сямігоднім хлапчуком, які сказаў: «Паэт, які ня ведае сваіх вершаў напамяць, гэта качарга, а не паэт!», і давай дэклямаваць свой верш напамяць.

Але мы Вас усе помнім, чытаем Вашыя новыя творы ў «Полымі». Трымала ў руках Ваш зборнік «Невадам з Нёмана» й заўважыла, што «Зубры» зрэдагаваны ў ім горай, як у «Полымі».

«Куфар бабулі» – надзвычайны твор, вельмі падабаецца.

25 траўня выслалі Вам падарак на ўрадзіны: пераважна матарыялы на сукенкі, свэтры Вам і Вашаму мужу. Мой муж прасіў мяне: «Перадай Янку прывітаньні ад Вінцука». Яны разам вучыліся ў П. Вось свэтар Янку ад Вінцука. Гэта было 25-га, а 29-га траўня прыйшла тэлеграма аб сьмерці Міколы (Абрамчыка). Лётала на пахавіны. Ягоную сьмерць перажываем цяжка, хоць неспадзеўкай яна ня была. Заставайцеся здаровы. З найлепшымі пажаданьнямі й прывітаньнямі ад нас Вам абоім, застаюся з глыбокай пашанай да Вас – Раіса.

Гэтак пачалася доўгая, аж да ейнае сьмерці, перапіска з Ларысай Геніюш.

А 13 кастрычніка 1970 г. пішу да др. Тумаша, які рэдагаваў першы зборнік вершаў Ларысы Геніюш «Ад родных ніў»:

«...Дзякую за матар'ял аб творчасьці Ларысы Геніюш для дакладу на 60-ці годзьдзе ёйнага жыцьця. Даклад адбыўся, як і плянавалася, 27-га верасьня. Уступное слова да яго меў Вінцук...»:

На 60-ыя ўгодкі Ларысы Геніюш
(уступное слова)

«Ларыса Геніюш ёсьць асаблівым зьявішчам у беларускай літаратуры. Яна неяк стаіць асобна і ад паэтаў Заходняе Беларусі пад Польшчай, хоць сама там жыла, і ад сучасных паэтаў БССР, хоць жыве ад даўжэйшага часу ў БССР. Яе творства выйшла на яў у часе апошняй вайны, калі на Беларусі было ўсё заціснута й прыгнечана: яе першы зборнік вершаў «Ад родных ніў» выйшаў у 1942 годзе ў Празе.

І паходжаньнем яна крыху адменная ад бальшыні беларускіх паэтаў. Ларыса Геніюш паходзіць з сям'і старога беларускага шляхоцкага роду Міклашэвічаў з Горадзеншчыны. Я добра знаў яе мужа Янку Геніюша, зь якім у 20-х гадох вучыўся на ўнівэрсытэце ў Празе, але жонку яго – Ларысу Геніюш на жаль ня меў шчасьця пазнаць.

Ларыса Геніюш асаблівая й у сваіх вершах. Творы ейныя глыбокія зьместам, патрыятычныя, вызначаюцца сілай экспрэсіі й хараством формы. Ня дзіва таму, што ейнымі вершамі захапляюцца ня толькі беларусы, але й украінцы. Дазволю сабе зацытаваць кароткую характарыстыку творчасьці Ларысы Геніюш украінскага крытыка Володымэра Лучука, якая была надрукавана як уступ да жмені вершаў нашай паэткі, пераложаных на ўкраінскую мову й зьмешчаных у ўкраінскім часопісе «Жоўтэнь» Но. 3, у 1970 г. у Львове.:

«Леў Талстой радзіў пісаць толькі тады, калі ўжо ня можаш ня пісаць. Ларыса Геніюш належыць якраз да тых, хто піша толькі ў сьвятых хвілінах натхненьня, зь вялікай патрэбы выліць душу, суцешыць сэрца ў песьні. Наша паэтка не хадзіла па параду да прарочнага графа: цяжкое жыцьцё яе дало тую самую параду. Хіба што таму

зь яе строфаў ня выкінеш слова. Хіба што таму беларуская паэтка скупая на словы, затое шчодрая на пачуцьці, што нуртуюць у іх.

Паэтычны даробак Ларысы Геніюш невялікі. Выбраныя вершы паэткі, што выйшлі ў Менску ў 1967 годзе, зьмешчаны ў невялічкім томіку на 200 бачын. Гэта ёсьць падсумаваньнем за паўстагодні творчы шлях.»

– «...Паэтка на дзіва пасьлядоўная й у сваіх тэмах, і ў вобразным выражэньні іх. Тэмы ёй дыктавала само жыцьцё. Закінута доляй за межы айчыны (жыла ў Празе), паэтка тужыць за родным краем, за родным словам. Але гэта ня ёсьць туга бязрадна апушчаных рук. Паэтка верыць у лепшую будучыню, ня ў прыгожыя словы, а ў самое жыцьцё.

Воля – ня тое, што
«вольны ты» – скажуць,
Воля – то воля, якую адчую...

...Жыцьцё народу ў усіх яго аспэктах – вось сталая паэтычная тэма Ларысы Геніюш. Навет пра звычайныя буднія рэчы яна ўмее сказаць так, што прачытаўшы раз, не забудзеш ніколі...

Больш аб творчасьці Ларысы Геніюш скажа нам Раіса.»

Гэткім уступным словам адкрыў др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч 27 верасьня 1970 году ў Беларускім Рэлігійна-Грамадзкім Цэнтры ў Таронта літаратурны вечар, якім беларускае грамадзтва ў Канадзе адзначала 60-ты юбілей жыцьця Ларысы Геніюш. Імпрэзу ладзіла Задзіночаньне Беларускіх Жанчын Канады. Даклад аб жыцьці й творчасьці паэткі мела старшыня ЗБЖК др. Раіса Жук-Грышкевіч.

А 20-га сьнежня 1970 году прыпадалі і

60-я ўгодкі др. Вітаўта Тумаша

Зь лісткоў дзённіка В. Жук-Грышкевіча:

«24. 12. 1970.

Ізноў мы ў гасьцінных спадарства Русакоў – Ганны й Валодзі. Прыехалі 18 сьнежня, каб 19-га быць на сьвяткаваньні 60-тых угодкаў жыцьця др. Вітаўта Тумаша, калісь майго вучня ў Віленскай Беларускай Гімназіі, а цапер Старшыні Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ў

Нью Ёрку, навуковага працаўніка, апякуна беларускага мастацтва за мяжой, ды перш за ўсё выдатнага Скарынаведа.

Урачыстасьць адбылася вечарам у будынку Фундацыі Крэчэўскага. Для Юбіляра была яна неспадзеўкай. Ён прыйшоў, як старшыня й дакладчык, на адну з рэгулярных зборак сяброў БІНіМ. Др. Тумаш зрабіў даклад пра найнавейшыя дадзеныя этнагэнэзы беларусаў. Цікавы даклад уважна слухала каля сарака мужчын і жанчын. Пасьля дакладу старшыня сходу праф. Антон Адамовіч перайшоў да ўрачыстай часткі вечара. У прыгожай прамове прывітаў Юбіляра з 60-мі ўгодкамі ягонага творчага жыцьця, падкрэсьліваючы ягоныя заслугі як Скарынаведа ды старшыні БІНіМ. Далей даў слова др. Станіславу Станкевічу – рэдактару «Беларуса», мне як старшыні Рады БНР і іншым прамоўцам. Раіса вітала Юбіляра ад Згуртаваньня Беларусаў Канады ды прачытала прысланы зь Беларусі прывітальны верш Ларысы Геніюш, прысьвечаны 60-тым угодкам др. Вітаўта Тумаша, які рэдагаваў ейны першы зборнік вершаў ‹Ад родных ніў›, што выйшаў у Празе ў 1942 годзе.»

Зэльва, 22. X. 1970.

Вітаю Вас, Сябра, праз тысячы вёрст,
як заўсёды ад шчырага сэрца:
– Часам пазнаеш, адчуеш кагосьць
і ўжо не забудзеш да сьмерці...

Першыя вершы мае – жураўлі, –
дзякуюць Вам за апеку,
дзякуй за тое, што другам былі,
што заўсёды былі чалавекам!

Калі мой жыцьцёвы завузіўся круг
трагэдый ліхой няўдачы,
я верыла – сьледу шукаціме друг,
застогне, калі не заплача.

Загублены ў далях марозных гусьляр
пад тленьне нямых спадзяваньняў,
я бачыла месяца роднага твар
ў паўночным, разбрызганым зьзяньні.

Лягчэйшая ноша адчайных гадзін,
нямілась ць суровага лёсу,
калі не забыты, калі не адзін
калі ёсць на сьвеце сяброўства!

Нічога, мой Дружа, што не маладосць,
што не зара, а сутоньне,
што рук маіх сяньня, прамерзлых наскрозь,
не пакласьці на Вашы далоні.

Гадоў каляровых ня вернеш назад,
ужо восень жыцьцём нашым правіць, –
– красуе, няхай, залаты лістапад,
як некалі сонечны травень.

І хоць ужо 60 на нашым вяку,
жывем для Радзімы аднойчы,
таму гэта толькі пачатак шляху,
калі шлях гэты дзейны й творчы!

Ваша Ларыса Геніюш

Яшчэ перад сьвяткаваньнем Ларыса Геніюш у сваім лісьце пісала: «Не магу Вам сказаць, як я рада з таго, што Вы атрымалі й ліста майго й верш. **Дык буду з Вамі супольна ў гасьціне хоць вершам.**»

«Як угодкавы падарак ад БІНіМ – піша далей у дзёньніку Вінцук – Юбіляр атрымаў партрэт Доктара Франьцішка Скарыны, на якім Скарына падобны да нашага Скарынаведа др. Вітаўта Тумаша, работы мастака Пётры Мірановіча. У суседнім пакоі быў прыгатаваны пачастунак з закускай і выпіўкай, пры якой паважны ўрачысты настрой перайшоў у вясёлы. Прысутная была амаль уся (беларуская) інтэлігэнцыя Нью Ёрку. Быў і мастак М. Касак. Галіна Русак і Раіса заатакавалі яго папрокамі: як ён сьмеў аддаць беларускае Палесьсе Расеі!? У кнізе аб сваім мастацтве ўва ўступе ён кажа, што паходзіць з Палесься – Расеі.

Учора ўдалося мне зрабіць паседжаньне Прэзыдыюму Рады БНР на сьпех, бо Адамовіч зьбіраўся ў Эўропу. Галоўным пытаньем было ўстанавіць дату сэсіі Рады БНР. Так і ня было вырашана аканчальна, бо ў канцы траве ня, калі думалі зрабіць сэсію, БАЗА робіць свой кангрэс.

Пастанавілі рабіць сэсію ў травені, калі БАЗА згодзіцца адступіць суботу, калі-ж не, дык склікаць яе на канецтыдня сьвята Працы – «лейбар дэй» у верасьні.

Сяньня Русакі наладзілі куцьцю. Запрасілі др. Тумаша, Натальлю Орсіху з Галінай, ну й нас з Раісай. Госьці пачынаюць зьбірацца, дык і мне трэба канчаць пісаніну і йсьці да іх.



Каляды ў Нью Ёрку. Зь лева на права: др. Вітаўт Тумаш, Галіна Орса, др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч, Нюра Русак (вышэй), Натальля Орса (ніжэй), Раіса Жук-Грышкевіч. У памешканьні Русакоў. 1970.

26. XII. 1970.

Куцьця прайшла весела й міла. Добрае таварыстава, традыцыйныя (беларускія, Р. Ж.-Г.) закускі, добрыя напіткі ды гутаркі й жарты. Мне ўдалося прывезьці праз граніцу вэнджанага асятра, якога сам злавіў у рацэ Атаве, а вывандзіў у Жоржа Харэвіча ў Ашаве, ды салёных рыжыкаў. Рыба й грыбкі, ужо прыпраўленыя Ганнай, мелі вялікі пасьпех.

Учора на першы дзень Каляд езьдзілі мы з Валодзем і Нюрай ў Нью Брансвік. Адведалі Ханяўкаў і Русакоў. Усьцешыла нас, што Чэсь чуецца лепш, рукі не трасуцца, лягчэй ходзіць і мае лепшы настрой. Памагло яму новае

лякарства, хоць ёсьць небясьпека пабочнае рэакцыі. Зьелі сьвяточны абед – індыка з чырвонай капустай й іншымі стравамі. Падрыхтавалі абед Марыся й ейная сястра Аўфрасіньня. Рагнеда атрымала развод ад мужа-араба. Хлопчык яе вельмі мілы, мае ўжо 4 гадкі. Рагнеда хварэла, але цапер ужо чуецца добра й працуе.

Некалькі гадзін былі у Русакоў. Мілыя яны з сваімі дочкамі, Людміле 12, і Натальлі 7 гадоў, ды з старымі Родзькамі. Ім ужо за 80 год, але яны поўныя жыцьця. Галіна Русак далей малюе й непакоіцца лёсам сьвету з прычыны «полюшын» й недахопу паліва. Беларускае жыцьцё ў Нью Брансвіку трымаецца добра.

Сяньня адведалі мы з Нюрай і Валодзем Натальлю Орсу й Галіну. Тут частавалі нас гарачай каўбасой з капустай. Усе беларускі ўмеюць добра варыць і гасьціць. Гаспадыні паехалі з Раісай на сход Беларускага Рэспубліканскага Клюбу, а я з Валодзем і Нюрай вярнуліся дамоў.

30. XII. 1970.

Вось і канчаецца год. Мне ўжо нецярпіцца, бо хутка два тыдні, як мы з дому, але Раісе ды й мне хочацца застацца на сьвяткаваньне Новага Году ў Нью Ёрку. Я стараюся кантактавацца зь людзьмі, заладжваць розныя справы. Гэта ня так лёгка, бо людзі днём працуюць, а вечарам, з агляду на напады чорных, небясьпечна хадзіць па месьце ці езьдзіць пад'земкай. Адну справу заладзіў. Скантактаваўся з малодшымі сябрамі актыву й запрапанаваў ім быць сябрамі Рады БНР, так як іхнія кандыдатуры выстаўляе мясцовы сэктар. Гэта – Аляксандар Міцкевіч, Ала Ораса-Романо й Валентын Гарошка. Яня Каханоўская выехала, зь ёю пагаворыць Янка Запруднік, як яна вернецца. Аляксандар Міцкевіч адразу згадзіўся, а Ала й Валянтын сказалі, што мусяць падумаць і пазьней дадуць адказ. Гаварыў тэлефанічна й са старым Гарошкам. Зь ім і зь іншымі спадзяюся спаткацца пры сустрэчы Новага Году ў чацьвер.

Учора езьдзіў у кнігарню "Four Continents" і знайшоў кніжку Сядова «Славяне верхняга надняпроў'я й падзьвіньня» (М. 1970). Кніга аказалася запраўды цікавай, бо пераконваюча даводзіць, што беларусы выдзяляліся з рэшты ўсходніх славянаў дзякуючы асыміляцыі балцкага субстрату на ўсёй сваёй тэрыторыі.

Сяньня мае быць на вячэры др. Тумаш.

31. XII. 1970.

Учарайшы вечар прайшоў прадуктыўна. Гаварылі пра Ларысу Геніюш, якая прыслала Раісе, апрача верша на 60-я ўгодкі Тумаша, ліст і свой здымак. Старэнькая яна на фатаграфіі, але вочы поўныя жыцьця. Раіса кажа, можа варта было-б замовіць ейны партрэт у Пётры Мірановіча. Гаварылі пра «Пражакоў» і іх ролю ў беларускім жыцьці. Мала іх ужо засталося. Ларыса была на паховінах Клімовіча ў Вільні й апісала іх прабег ды ўражаньні зь Вільні. Для нас зь яе вестак балюча, што летувісы заліваюць Вільню, ужо кожны другі ў Вільні гавопрыць палітувіску, а беларускае ўсё выціснутае, і беларусаў там ня чутно.

Адносна маіх недамаганьняў з цыркуляцыяй крыві – Тумаш ня раіў ісьці на апэрацыю, пакуль я магу хадзіць. Раіў толькі часьцей хадзіць і менш сядзець.

Сустрэча Новага 1971-га Году ў Нью Ёрку

2. 01. 1971

Новы год сустракалі ў царкоўнай залі на Атлянтык Авенью сьціпла, але прыемна. Сабралося болей паўсотні асоб. Быў гэта беларускі ньюёрскі актыў. Закуску падрыхтавалі жанчыны, напіткі – мужчыны. Уступ – 10 даляраў ад мужчын, 8 – ад жанчын, і адзін даляр ад дзіцяці. Пілі ў меру, гаварылі, танцавалі, пяялі песьні. Віталі Новы 1971 Год. Ехалі дамоў да спадарства Русакоў пад хмяльком па сьвежа нападаным сьнезе. Нью Ёрк выглядаў рамантычна, як у казцы. 1971 год пачаўся, як і трэба, прыгожа й весела. Дай Божа, каб такім ён быў да канца.

З адлётам дамоў у Канаду мелі вялікія камплікацыі. То была сьнежная завея й усе лёты былі спынены, то йзноў у суботу й нядзелю нельга было дастаць мейсца на самалёт. Прышлося адлятаць аж у панядзелак 4-га студзеня. У міжчасе бачыліся йзноў з др. Тумашам ды былі ў гасьцях у спадарстава Алюньці (Алы) й Франка Романо. (Ала Романо – дачка Натальлі Орсіхі, Р. Ж.-Г.)»

XXI. СТАРШЫНСТВА Ў РАДЗЕ БНР

КАМУНІКАТЫ Прэзыдыюму і Сакратарыяту Рады Беларускае Народнае Рэспублікі – 166-34 Gothic Dr., Jamaica, N.Y., 11432, USA, у нумары I, за ліпень 1970 г. паведамляюць:

КАМУНІКАТ
Прэзыдыюму Рады Беларускае Народнае Рэспублікі пра пераняцьцё старшынства Рады БНР

Гэтым падаецца да агульнага ведама, што ізь сьмерцяй сьв. пам. Старшыні Рады Беларускае Народнае Рэспублікі інж. Міколы АБРАМЧЫКА (29 травеня 1970 г.) старшынства Рады БНР перайшло на др. Вінцэнта ЖУК-ГРЫШКЕВІЧА на аснове 9-га параграфу Статуту Рады БНР, а таксама пастановы 10-е Сэсіі Рады БНР, праведзенае ў Нью Ёрку ў красавіку 1968 г., ды на аснове асабістага пераданьня паўнамоцтваў інж. Міколам Абрамчыкам свайму першаму заступніку др. Вінцэнту Жук-Грышкевічу.

20 чырвеня 1970 г. у Нью Ёрку адбылося пашыранае паседжаньне Прэзыдыюму й Сакратарыяту Рады БНР з удзелам Старшыні Рады др. В. Жук-Грышкевіча, на якім былі разгледжаныя пытаньні далейшае арганізацыйнае й палітычнае дзейнасьці Рады БНР ды прыняты адпаведныя пастановы: між імі – пастанова склікаць у найбліжэйшым часе чарговую сэсію Рады, а таксама перагледзець рэгулямін Рады БНР.

Рада БНР аднадушна заяўляе пра сваю непахісную наважанасьць весьці далей палітычную працу й вызвольнае змаганьне, самаахвярна й няўтомна праводжанае сьв. пам. інж. Міколам Абрамчыкам, пад новым старшынствам др. Вінцэнта Жук-Грышкевіча. Рада БНР заклікае ўсё беларускае грамадзтва весьці далей і пашыраць нацыянальна-вызвольную працу на карысьць дэмакратычных свабодаў ды эканамічнага й духовага росквіту ўсяго жыхарства будучае незалежнае й непадзельнае Беларускае Народнае Рэспублікі.

Жыве Беларусь у змаганьні!

20 чырвеня 1970 году

Прэзыдыюм Рады БНР

Гэты Камунікат Прэзыдыюму Рады Беларускае Народнае Рэспублікі апублікаваны й у газэце «Беларус», Нью Ёрк, 159, 1970.

Прывітальныя лісты:

«BELORUSSIAN CANADIAN ALLIANCE
ЗГУРТАВАНЬНЕ БЕЛАРУСАЎ КАНАДЫ
524 St. Clarens Ave., Toronto 4, Ontario, Canada

Таронта, 23 студзеня, 1971.

Яго Міласьці Старшыні Рады
Беларускай Народнай Рэспублікі
Доктару Вінцэнту Жук-Грышкевічу
Бэры, Антарыё, Канада.

Высока Паважаны Спадар Старшыня!

Мы, Прэзыдыюм і ўдзельнікі 21-га Агульнага Зьезду Згуртаваньня Беларусаў Канады, што адбываецца ў Беларускім Рэлігійна-Грамадзкім Цэнтры ў Таронта, выражаем глыбокі жаль па страце быўшага Старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі сьв. пам. інж. Міколы Абрамчыка й складаем Вам ды Ураду БНР шчырыя спачуваньні.

Аднак мы верым, што ня гледзячы на страту, Рада БНР будзе выконваць сваю ролю як палітычнага прадстаўніка Беларускага Народу, які безупынна ймкнецца й будзе імкнуцца да сувэрэннасьці Беларусі.

Мы вітаем Вас, Спадар Старшыня, на Вашым адказным становішчы, жадаем Вам сілаў, вытрываласьці й посьпехаў у Вашай патрабавальнай і цяжкой працы ды дэкляруем нашую ідэйную й маральную падтрымку Вам і Радзе БНР.

Хай жыве Рада й Урад БНР!

Хай жыве Беларускі Народ у змаганьні!

(М. Ганько)
Старшыня

(Янка Сурвіла)
Сакратар

21-га Агульнага Зьезду ЗБК»

"THE ANGLO-BYELORUSSIAN SOCIETY
230 Strand, London, W. C. 2.
Tel: 01-353-2114

25 January 1971

Dear President Žuk-Hryškievič,

At a Meeting of the Council of the Anglo-Byelorussian Society, held on the 10th December 1970, the first since the death of President Mikola Abramčyk, the Chairman and members of the Council requested me to convey to you our sincerest greetings on the occasion of your accession to the Presidency of the Byelorussian National Rada.

The Society appreciates the interest shown, and the support given to its activities by the Byelorussian community overseas, and particularly by organizations having a connection with your Council. The Rada has an impressive record of cultural achievements abroad, and we sincerely hope that under your Presidency it will consolidate and maintain its historic traditions which are so worthy of respect.

In concluding, may I offer you the assurance of my personal attachment.

Yours sincerely,

Guy de Picarda
Honorary Secretary."

«(Выява Пагоні)

СТАРШЫНЯ РАДЫ БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

President of the Rada of the Byelorussian Democratic Republic (In Exile)

March 6, 1971

Barrie, Ontario, Canada.

Mr. Guy de Picarda
Honorary Secretary
The Anglo-Byelorussian Society
230 Strand, London, W.C.2.
England.

Dear Mr. Picarda:

I wish to thank you for your kind letter of January 25, 1971, and convey my sincere appreciation to the Chairman and the members of the Council of the Anglo-Byelorussian Society for the greetings on the occasion of my accession to the Presidency of the Rada of the Byelorussian Democratic Republic in Exile.

My pleasure derived from your letter is augmented by the fact, that I personally, as well as the members of the Rada, have the highest regard for the splendid contribution which the Anglo-Byelorussisan Society is doing for the Byelorussian cause.

I appreciate very much your personal interest and involvement in our Byelorussian life and I am touched by your offer of the assurance of your personal attachment to me.

With personal regards,

Sincerely yours,

V. Žuk-Hryškievič
President"

Яшчэ сьв. пам. Старшыня Рады БНР інж. Мікола Абрамчык за актыўны й творчы ўдзел у беларускім жыцьці надаў сп. Гаю дэ Пікарда ганаровае грамадзянства БНР. Наступны Старшыня Рады БНР др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч пацьвердзіў ганаровае грамадзянства БНР сп. Гая дэ Пікарды. У сувязі з гэтым у сваім лісьце да Старшыні Рады БНР др. В. Жук-Грышкевіча сп. Пікарда піша:

"The Cloisters
Temple
London, EC4Y 7AA
Telephone: 01-353-2114

20th June 1978

My Dear President,

It was kind of you to write to me in connection with my interest in and work on Byelorussian subjects, and I am very touched by the mark of your appreciation. It has indeed given me much personal pleasure and satisfaction to discover and become involved with your people's affairs. It is even more gratifying to find that there is a growing circle of individuals sharing this interest and forming their own objective views on Byelorussia, despite attempts in some quarters to minimize and deprecate her cultural heritage and aspirations to self-determination.

I shall endeavour, both in my professional activities and in my outside interest, to do all I can to advance the Byelorussian cause. I hope to serve it all the more devotedly as an honorary compatriot as well as a friend.

Please convey my kind regards to Mme. Žuk-Hryškievič, and believe me,

Yours very sincerely,

Guy de Picarda

P. S. Thank you for your letter regarding the commemorative postal service. As soon as I have stamps to hand, I will send you some sheets."

“ASSOCIATION OF BYELORUSSIANS IN GREAT BRITAIN
Bradford Branch

Head Office:
52, Penn Road
London, N.7.
Tel: North 1455, Hilside 1938

Branch Office:
Walmer House
Bradford 8.
Yorkshire

21-га сакавіка 1971 г.

Яго Міласьці Старшыні
Рады Беларускай Народнай Рэспублікі
Доктару Вінцэнту Жук-Грышкевічу
Бэры, Антарыё, Канада.

Высокапаважаны Спадар Старшыня!

Мы, Управа й сябры Аддзелу ЗБВБ у Брадфардзе зь вялікай прыемнасьцяй вітаем Вас з 53-мі ўгодкамі абвешчаньня дзяржаўнай незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

Жадаем Вам сілаў, вытрываласьці й посьпехаў у Вашай патрабавальнай і цяжкой працы ды дэкляруем нашую ідэйную й маральную падтрымку Вам і Радзе Б.Н.Р.

Адначасна паведамляем, што ўпершыню ў дзень 25 Сакавіка на плошчы пры Сіты Гол у Брадфардзе будзе разьвівацца Беларускі Нацыянальны Сьцяг адзначаючы Дзень Незалежнасьці Беларусі, а на Акадэміі 27-га сакавіка будуць прысутныя сябры Брытыйскага Парлямэнту, што сьведчыць аб працы мясцовага Аддзелу ЗБВБ, чым мы ўсе ганарымся й падзяляемся з Вамі.

Хай Жыве Рада й Урад БНР!

Хай Жыве Беларускі народ у Змаганьні!

За Управу Аддзелу ЗБВБ,

Янка Калбаса
Старшыня»

«БЕЛАРУСКА-АМЭРЫКАНСКАЕ ЗАДЗІНОЧАНЬНЕ
Аддзел у Дэтройт
4055 Normandy Road
Royal Oak, MI, 48072 Tel.: (313) 549-8678

22 сакавіка 1971 г.

Сп. Доктару В. Жук-Грышкевічу
Старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі
Barrie, Ont., Canada

Глыбока Паважаны Спадар Старшыня!

Аддзел БАЗА ў Дэтройт ветліва просіць Вас ушанаваць Вашаю прысутнасьцю ўрачыстую акадэмію, прысьвечаную 53-м угодкам абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

Акадэмія адбудзецца ў нядзелю 28 сакавіка 1971 г. а гадзіне 12:30 пасьля ўрачыстай Багаслужбы ў залі Беларускай Аўтакэфальнай Праваслаўнай Царквы Сьвятога Духа, 14873 Collinson, East Detroit, MI, 48021.

Жыве Беларусь!

Жыве Беларуская Народная Рэспубліка!

Старшына Аддзелу

Тацяна Плескач.»

Старшыня Рады БНР др. В. Жук-Грышкевіч прыняў ветлівыя запросіны Аддзелу БАЗА у Дэтройце. Прыбыў на акадэмію й патрыятычнай прамовай вітаў прысутных на ёй суродзічаў з 53-мі ўгодкамі абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

"BYELORUSSIAN-AMERICAN Ass'n, Inc.
Michigan Branch

БЕЛАРУСКА-АМЭРЫКАНСКАЕ ЗАДЗІНОЧАНЬНЕ

Дэтройт, Міч.

25 сакавіка, 1972.

Яго Міласьці
Прэзыдэнту Рады БНР
Др. Вінцэнту Жук-Грышкевічу

Высока Паважаны Спадар Прэзыдэнт,

Мы, Аддзел БАЗА ў Мічыган, горача вітаем Вас з 54-мі ўгодкамі Абвешчаньня Незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі й жадаем Вам далейшых посьпехаў у грамадзкай працы на карысьць нашага Беларускага Народу.

Мы моцна верым, што ідэі, высунутыя Актам 25-га Сакавіка, ніколі не перастануць быць пуцьцяводнай зоркай для беларусаў, што гуртуюцца вакол Рады БНР і яе ворганаў.

Жыве Беларуская Народная Рэспубліка!

Юры Мазуро
Старшыня»

* * *

Яшчэ будучы старшынём Канадзкага сэктару Рады БНР ды пасьля першым заступнікам Старшыні Рады БНР, др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч працаваў над праектам рэарганізацыі Рады БНР й над яе статутам. Да 11-ай Сэсіі Рады БНР, што адбылася 29-га траўня 1971 году, ён прыгатаваў праект новага перагледжанага статуту Рады БНР. Як падставу й выхадны пункт сваіх разважаньняў ён падае:

«ПРАЎНЫЯ Й ІДЭЯЛЯГІЧНЫЯ АСНОВЫ РАДЫ БНР

І. Праўныя падставы Рады БНР

Рада БНР паўстала з волі народу, была выбрана І-ым Усебеларускім Кангрэсам у сьнежні 1917 году. Яна й называлася спачатку Радай Кангрэсу. Але І-шы Усебеларускі Кангрэс, ня могучы выканаць сваіх заданьняў з прычыны брутальнага націску расейскага бальшавіцкага войска, перадаў усе свае паўнамоцтвы Радзе Кангрэсу да часу скліканьня Ўстаноўчага Сойму ў вольнай і незалежнай Беларусі.

У змаганьні за гэтую вольную й незалежную Беларусь Рада Кангрэсу ператварылася ў Раду Беларускае Народнае Рэспублікі – незалежнасьць і непадзельнасьць якой абвесьціла 25 сакавіка 1918 году.

Пасьля акупацыі Беларускай Народнай Рэспублікі чужымі варожымі сіламі Рада БНР мусіла выехаць на эміграцыю, дзе была дзейнай у далейшым змаганьні за незалежнасьць Беларусі. Дзейнасьць гэту перарвала ІІ-я Сусьветная Вайна.

У выніку заканчэньня ІІ-ой Сусьветнасй Вайны зноў Беларусь, цяпер ужо ўся, была паняволена расейскай бальшавіцкай уладай. Вольнай засталася толькі тая частка беларускага народу, што апынулася на эміграцыі. Бяручы пад увагу,што дзяржаўны лад Беларускае Народнае Рэспублікі быў зьнішчаны чужымі варожымі сіламі Савецкай Расеі, ня гледзчы на пратэсты й супраціў беларускага народу; што Савецкая Расея акупавала ўсю тэрыторыю Беларускае Народнае Рэспублікі й паняволіла народ яе; што народ гэты пазбаўлены акупантам свабоды й усякіх магчымасьцяў свабоднага выяўленьня сваёй волі й голасу

– беларуская эміграцыя, як адзіная вольная частка сувэрэннага беларускага народу, мае ня толькі права, але й абавязак змагацца ўсімі магчымымі спосабамі за вызваленьне Беларускае Народнае Рэспублікі й, зразумела, мае права й абавязак тварыць дзеля гэтай мэты патрэбныя арганізацыі й палітычны ворган, што кіруе гэтым змаганьнем ды рэпрэзэнтуе Беларускую Народную Рэспубліку ў міжнародным палітычным жыцьці да часу вызваленьня яе й здабыцьця незалежнасьці й сувэртэннасьці.

Ворганам гэтым ёсьць адноўленая ў сьнежні 1947 году Рада Беларускае Народнае Рэспублікі (БНР), якая зьяўляецца ня толькі кіруючым цэнтрам і рэпрэзэнтантам палітычным беларускае эміграцыі, але й натуральным спадкаемцам тэй Рады БНР, што мела паўнамоцтвы І-га Ўсебеларускага Кангрэсу, бо: апрача таго факту, што аднавіла Раду БНР вольная частка беларускага народу, перакананая ў слушнасьці й правамоцнасьці Акту 25 Сакавіка, спадкаемчасьць гэта вынікае й з тэстамэнту апошняга старшыні арыгінальнай Рады БНР Васіля Захаркі, данага Міколу Абрамчыку, які стаўся першым старшынём адноўленай Рады БНР. Дзякуючы гэтаму тэстамэнту адноўленая Рада БНР набыла ідэёвую й праўную сувязь і цягласьць з Радай БНР, выбранай на 1-ым Усебеларускім Кангрэсе.

II. Народны, дэмакратычны характрар Рады БНР

Беларускі нацыянальна-адраджэнскі й вызвольны рух ад самога пачатку меў народны, дэмакратычны характар. Вышэйшыя клясы, дыктатура, таталітарызм – чужыя яму. Гэтым народным, дэмакратычным духам быў прасякнуты і І-шы Ўсебеларускі Кангрэс, і Рада БНР, і Акт 25 Сакавіка, дый 1-я й 2-я Ўстаўныя Граматы. Народны, дэмакратычны характар мусіць мець і адноўленая Рада БНР. Ужо сам назоў «Рада Беларускае Народнае Рэспублікі» прамаўляе за гэтым.

Народны, дэмакратычны дух мусіць панаваць і ў статуце Рады БНР. Гэта значa,што ў ім мусяць быць захаваны прынцыпы ўшанаваньня волі грамадзтва, прынцыпы волі бальшыні на ўсіх сходах і паседжаньнях, прынцыпы дэмакратычных выбараў усіх ворганаў, ды ўсе ўпаўнаважаньні ці паўнамоцтвы выканаўчага характару мусяць

паходзіць з волі бальшыні сходаў Рады, ці паседжаньняў ейных ворганаў.

III. Эміграцыйная спэцыфіка

Мы знаходзімся на эміграцыі. Дзеля гэтага Рада БНР ня можа абмежыцца да канцэпцыі парлямэнту й ураду, як гэта было ў Беларусі, а мусіць займацца й справамі беларускае эміграцыі, на якой апіраецца. Рада БНР мусіць браць пад увагу спэцыфічныя абставіны й ня толькі выконваць свае абавязкі адносна Беларусі, але й дбаць пра ўтрыманьне беларускага нацыянальнага жыцьця ў беларускай эміграцыі.

Наша грамадзтва параскідана па вялікіх прасторах розных краінаў і толькі часткова зарганізавана. Нам цяжка сабрацца разам у паасобных краінах і яшчэ цяжэй сабрацца хоць бы толькі прадстаўніком нашых асяродкаў з усіх краінаў, каб хоць раз параіцца пра нашы найважнейшыя справы. На нашы асяродкі націскаюць мясцовыя асыміляцыйныя дзейнікі, а актыўнасьць нашых людзей у нацыянальна-грамадзкай працы зьмяншаецца. Усё гэта трэба браць пад увагу ў дзейнасьці Рады БНР і асабліва старацца захаваць працаздольным і, зьвязаны з Радай БНР, наш нацыянальны актыў. Толькі Рада БНР можа лучыць беларускую эміграцыю, раскіданую па ўсім сьвеце, лучыць нацыянальна й ідэёва.

Мы мусім лічыцца з нашымі мэтамі й заданьнямі ў адносінах да Беларусі, але каб лягчэй асягнуць іх, мусім лічыцца таксама з агульнай і мясцовай палітычнай сытуацыяй ды з духам часу.

З увагі на ўсё сказанае вышэй і праведзена значная зьмена статуту Рады БНР. Гэта трэцяя рэдакцыя яго. Першая рэдакцыя была апрацавана пры аднаўленьні Рады БНР у сьнежні 1947 году. Другая рэдакцыя была праведзена дзякуючы зьменам на 10-ай сэсіі Рады БНР у 1968 годзе, а вось гэта трэцяя, якая ўзяла пад увагу папраўкі статутовай камісіі Рады БНР з дня 21 сакавіка 1971 году ды заўвагі некаторых радных, – прапануецца на разгляд 11-ай Сэсіі Рады БНР.

В. Жук-Грышкевіч
Старшыня Рады БНР

Бэры, Канада, красавік 1971 г.»

«11-я Сэсія Рады БНР

29 траўня 1971 г. у Нью Ёрку, у памешканьні Фундацыі ймя Пётры Крэчэўскага, адбылася 11-я сэсія Рады Беларускае Народнае Рэспублікі. У сэсіі ўзяло ўдзел 65 радных, прадстаўляючых сэктары Рады ў ЗША, Канадзе, Аўстраліі, Вялікабрытаніі, Заходняй Намеччыне, Бэльгіі, Францыі, Гішпаніі, Італіі.

У прэзыдыюм сэсіі былі абраны: Вінцэнт Жук-Грышкевіч – пачэсны сябра, Антон Адамовіч – старшыня, Васіль Плескач – заступнік старшыні, Антон Шукелойць і Янка Запруднік – сакратары.

Сэсія прыняла ў Раду дзевяцёх новых сяброў.

Справаздачы абыймалі пэрыяд ад папярэдняе сэсіі, што адбылася ў красавіку 1968 году.

Старшыня Рады БНР др. В. Жук-Грышкевіч у сваёй справаздачы адзначыў, што на працягу папярэдніх трох гадоў яму давялося быць два гады першым заступнікам Старшыні Рады БНР сьв. пам. Міколы Абрамчыка, а год на становішчы Старшыні Рады. Пэрыяд гэты быў складаным пераходным часам, з пэўным звужэньнем нутраное й вонкавае дзейнасьці. Тым ня менш, Рада БНР не пераставала працаваць. На працягу апошняга году была праведзеная рэарганізацыйная работа, абмеркаваны зьмены статуту ды ўзмоцненая лучнасьць Прэзыдыюму Рады з паасобнымі сэктарамі й сябрамі праз выдаваньне «Камунікатаў».

У справаздачы Сакратарыяту Рады БНР, апрача агляду нутрана-арганізацыйнае й вонкава-рэпрэзэнтацыйнае дзейнасьці, была ўзятая ўвага на ход палітычнага разьвіцьця на Беларусі, схарактэрызаванага наступным парадкам:

1. Беларусь у сучаснай міжнароднай сытуацыі ўсьцяж займае выключнае геа-палітычнае палажэньне, важнае асабліва з гледзішча на заходня-ўсходні ідэялягічны й патэнцыянальны збройны канфлікт.

2. У беларускім народзе назіраюцца войстрае адчуваньне сацыяльнага й нацыянальнага ўціску збоку расейска-камуністычнага цэнтру й гатовасьць, пры спрыяльнай нагодзе, узьняцца на збройнае змаганьне за сваю нацыянальную свабоду.

3. Адчуваньне эканамічнага й культурнага ўціску на Беларусі ўзмацняецца ўсьведамленьнем гістарычнае й культурнае апрычонасьці беларускага народу.


4. Беларускі народ за паваенны пэрыяд узгадаваў паважныя кадры свае нацыянальнае інтэлігэнцыі, што становіць найбольшую заруку ў далейшым працэсе абароны нацыянальных інтарэсаў Беларусі.

5. Беларусы на Бацькаўшчыне выказваюць вялікае зацікаўленьне да тае ўвагі, зь якою ставяцца да беларускай праблемы палітычныя дзейнікі ў заходніх дзяржавах, у заходнім друку. Дзейнасьць беларускае палітычнае эміграцыі становіць паважны маральны фактар у падтрыманьні ў беларускім народзе на бацькаўшчыне духу супраціву злу маскоўскага паняволеньня.

Па выслуханьні справаздачаў і правядзеньні дыскусіяў над імі ўдзельнікі сэсіі падзяліліся на тры камісіі: статутовую, рэзалюцыйную й плянавую, у якіх была праведзена падрыхтоўчая праца. На плянарным паседжаньні былі прыняты зьмены Статуту Рады ды рэзалюцыі й звароты Рады БНР да беларускага народу, да АЗН і да ўрадаў тых заходніх дзяржаваў, дзе ў большым ліку жывуць беларусы. У нова прынятым пляне дзейнасьці падчыркваецца асаблівая важнасьць нутрана-арганізацыйнае актыўнасьці,



Прэзыдыюм 11-ай Сэсіі Рады БНР: зь лева на права – др. Ян Запруднік, Антон Шукелойць – сакратары, Васіль Плескач – заступнік старшыні Сэсіі, праф. Антон Адамовіч – старшыня Сэсіі, др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч – Старшыня Рады БНР. Нью Ёрк, 29 травеня, 1971.



Др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч на 11-ай Сэсіі Рады БНР у часе галасаваньня. Нью Ёрк, 29 траўня, 1971.

лучнасьці з народам на Бацькаўшчыне, а таксама з прадстаўніцтвамі іншых нацыянальных народаў.

Сэсія Рады БНР абрала за Старшыню Рады на наступны шасьцігадовы пэрыяд др. Вінцэнта Жук-Грышкевіча, за ягонага першага заступніка – др. Барыса Рагулю ды двух заступнікаў Старшыні рады БНР – у Аўстраліі й Эўропе. Сэсія перавыбрала таксама трох сяброў Прэзыдыюму Рады й двух сакратароў, што супольна з Старшынём і ягонымі заступнікамі твораць Прэзыдыюм і Сакратарыят Рады Беларускае Народнае Рэспублікі.

У нядзелю 30 траўня ў катэдральным саборы сьв. Кірылы Тураўскага ў Нью Ёрку Япіскап БАП-Царквы Мікалай у асысьце аа. Віктара й Карпа адслужылі паніхіду па сьв. пам. Старшыні Рады БНР М. Абрамчыку на першыя ўгодкі ягонае сьмерці. **Я. З.**»

(«Беларус», Нью Ёрк, 171, 1971)

11-я Сэсія Рады БНР прыняла рэзалюцыю наступнага зьместу:

RESOLUTION

of the 11th Session of the Council (Rada) of the Byelorussian Democratic Republic held in New York City on May 29, 1971.

IN VIEW OF THE FACT THAT:

The Byelorussian Democratic Republic, proclaimed by the will of the Byelorussian people on March 25, 1918, was crushed by the military forces of Bolshevik Russia, the continuator of Tsarist imperialism;

The Byelorussian Soviet Socialist Republic (BSSR) was created by the aggressor as a tool of suppression of the Byelorussian people's striving towards freedom and independence;

A large part of the Byelorussian territory was annexed by colonial Russia and lesser parts distributed among Byelorussia's neighbours in political maneuverings;

The Government of the BSSR has never been democratically elected, but appointed by Moscow and fully controlled by her; it represents a mere agency of colonial administration, forced upon the Byelorussian people, and stuffed in key positions by Russian nationals;

Byelorussia in the United Nations is represented not by the delegates of the Byelorussian people, but by the puppets of colonial Moscow, in their majority not even Byelorussians but Russians;

The Russian regime in Byelorussia has been conducting genocidal policies by means of arrests and deportations as well as by siphoning off the Byelorussian Republic's labor resources for use in the remote areas of Siberia and Central Asia, and recently for the building of a demographic wall against Communist China;

Moscow's policies on exploiting Byelorussia's natural resources are carried on not for the benefit of the Byelorussian people, but for fostering Russian imperial ambitions;

An intensive Russification campaign has been conducted in Byelorussia with the Byelorussian language completely eliminated from the Republic's administration and loosing its ground in the field of education, theaters, and print; monuments of national history are being destroyed and Byelorussians in the USSR, outside of their republic have no right to set up their own organizations for cultural activities;

Religion in Byelorussia has been systematically suppressed with priests and believers harassed and persecuted;

The Byelorussian people staunchly resist this exploitation of their economic resources and suppression of their cultural values by defending their national dignity and the right to have a free and independent state —

IN VIEW OF ALL THE ABOVE FACTS WE RESOLVE:

To intensify activity of the Rada of the Byelorussian Democratic Republic in the support of the Byelorussian people in their struggle for self-preservation, the rebirth of their nationhood, and the achievement of their democratic goals;

To condemn the Muscovite colonial system of government and red fascism for its inhuman deeds in Byelorussia and other captive nations;

To call upon the governments of free nations to speak up in defense of the victims of Russian colonial imperialism, among them the Byelorussian people, and to extend to them moral and political support;

To request the Secretary General of the United Nations to set up a committee for investigation of Moscow's colonial rule in Byelorussia, of genocide and cultural and religious oppression as well as of misrepresentation of Byelorussia, the founding member of the UN, by a delegation which fraudulently claims to speak in the name of Byelorussian people;

To request all the delegates in the United Nations and appropriate international bodies to help the Byelorussian people in their struggle against enslavement, in their endeavor to preserve themselves and their culture and to attain high ideals of human and national freedom.

New York City, May 29, 1971

11th Session of the Rada of the
Byelorussian Democratic Republic

Рэзалюцыя з адпаведным лістом была выслана Галоўнаму Сакратару Задзіночаных Нацыяў, Яго Ексцэленцыі Курт Вальдгайму, Прэзыдэнту Злучаных Штатаў Рычард Ніксану, Прэм'еру Канады Піер Эліёт Трудо й шматлікім прастаўніком урадаў ЗША й Канады. Ліст на блянку Рады БНР з выявай Пагоні быў наступнага зьместу:

President:
Dr. Vincent Žuk-Hryškievič
524 St. Clarens Avenue
Toproпto 4, Ont.
Canada

Secretariat:
166-34 Gothic Drive
Jamaica Hill, N.Y. 11432
U. S. A.

Dear Sir:

Please find enclosed the Resolution of the 11th Session of the Council (Rada) of the Byelorussian Democratic Republic. I would appreciate if you would distribute and make use of the facts mentioned in the Resolution, as you see fit, thus contributing to the cause of Byelorussia's freedom and friendship of our peoples.

Sincerely yours,

Dr. Vincent Žuk-Hryškievič
President

Статут Рады Беларускае Народнае Рэспублікі

быў прыняты на 11-ай Сэсіі Рады БНР 29-га траўня 1971 году за выняткам пяці апошніх разьдзелаў, якія былі прынятыя на 12-ай Нечароднай Сэсіі Рады БНР 21-га красавіка 1973 году. Папраўкі ўнесены пасьля й на 13-ай ды 15-ай сэсіях Рады БНР.

СТАТУТ РАДЫ БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

I. Паўнамоцтвы, мэты й заданьні

Пар. 1. Рада Беларускае Народнае Рэспублікі (БНР) – найвышэйшая ўстанова й адзінае праўнае прадстаўніцтва сувэрэнных правоў беларускага народу, выяўленых у пра-

ватворчым Акце 25 Сакавіка 1918 г., зафіксаваным 3-яй Устаўной Граматай БНР.

Пар. 2. Правы Рады БНР вынікаюць зь неабмежаных паўнамоцтваў дадзеных ёй Усебеларускім Зьездам (Кангрэсам), як свайму найвышэйшаму органу – Радзе Зьезду 31 сьнежня 1917 г. і перададзеных апошнім вышэйшым пэрсанальным носьбітам гэтых паўнамоцтваў, старшынём Рады БНР Васілём Захаркам, тэстамэнтальна Міколу Абрамчыку, зь ініцыятывы якога на грунце гэтага аднавілася дзейнасьць Рады БНР у экзылі ў сьнежні 1947 г.

Пар. 3. Паўнамоцтвы гэтыя трываюць, згодна з пастановай Усебеларускага Зьезду (Кангрэсу) 1917 г., да часу вольных выбараў Устаноўчага Сойму ў незалежнай БНР.

Пар. 4. Аснаўная мэта й заданьне Рады БНР – перахаваньне й выкананьне волі беларускага народу, выказанай у Акце 25 Сакавіка 1918 году, а гэта – адбудова незалежнай беларускай дзяржаўнасьці на ўсіх беларускіх землях усімі магчымымі й даступнымі спосабамі й дарогамі.

Пар. 5. Выкананьне заданьняў Рады БНР рэалізуецца праз дзейнасьць ейных органаў, да якіх належаць:

1. Сэсія Рады БНР
2. Прэзыдыюм Рады БНР з Старшынём Рады БНР
3. Сакратарыят Рады БНР
4. Кантроль Рады БНР
5. Суд Рады БНР

2. Сяброўства ў Радзе Беларускае Народнае Рэспублікі

Пар. 6. Рада БНР складаецца зь сяброў радных, якіх прапануюць беларускія палітычныя й грамадзкія арганізацыі, верныя Акту 25 Сакавіка, а таксама незарганізаваныя групы беларусаў незалежнікаў у ліку найменш пяці асобаў. Кажнага новага сябру павінны рэкамэндаваць найменш двох сяброў Рады БНР. Прапанова аб прыняцьці кандыдата ў сябры Рады БНР высылаецца – разам з рэкамэндацыямі – Старшыні, або Прэзыдыюму Рады БНР.

Пар. 7. Сябры Рады БНР плацяць нацыянальны падатак, вышыню якога вызначае Сэсія Рады БНР.

Пар. 8. Усіх сяброў Рады БНР забавязвае поўная тайніца што да справаў, у дачыненьні да якіх адмыслова засьцярожана.

Пар. 9. За зраду гэтай тайніцы нясецца адказнасьць, як за зраду дзяржаўнай тайніцы, перад Судом Рады БНР.

Пар. 10. Перад пачаткам свае дзейнасьці сябры Рады БНР складаюць прысягу на рукі Старшыні Рады БНР, або ўпаўнаважанай ім асобы наступнага зьместу:

«Я, сябра Рады Беларускае Народнае Рэспублікі, урачыста прысягаю перад Богам і Беларускім Народам, што буду непахісна стаяць на прынцыпах Акту 25 Сакавіка, дзеіць у кірунку ўжыцьцяўленьня яго, падпараткавацца ўсім пастановам, прынятым Радаю БНР і ейным Прэзыдыюмам, ды сьвята захоўваць усе тайніцы Рады БНР.»

Толькі пасьля злажэньня прысягі пісьмовай і вуснай Прэзыдыюм, ці Рада БНР прыймаюць кандыдатаў у сябры Рады БНР ад даты прысягі.

Пар. 11. Сябры Рады БНР пазбаўляюцца сяброўства ў Радзе БНР у выпадку дзеяньняў нязгодных з Актам 25 Сакавіка ці супярэчных з пастановамі Рады, зраджаньня тайніцы Рады, ці выяўленьня іншых маральных або нацыянальных заганаў ды неаплачваньня складак нацыянальнага падатку на працягу аднаго году. У гэтым выпадку даўжніку даецца яшчэ год часу на аплату залегласьцяў пасьля апошняга прыпамненьня ў канцы году. Пра такія парушэньні Статуту й прысягі радных маюць паведамляць Старшыню ці Прэзыдыюм Рады БНР кіраўніцтвы сэктараў або Сакратарыят Рады БНР.

Пар. 12. Сябра Рады БНР можа быць пазбаўлены сяброўства пастановай Прэзыдыюму Рады БНР на аснове Пар. 11-га гэтага Статуту. У выпадку нязгоды з гэтай пастановай сябра Рады БНР можа адклікацца да Суду Рады БНР, або найбліжэйшай Сэсіі Рады.

Пар. 13. Старшыня Рады БНР ці Прэзыдыюм яе можа завесіць у сяброўстве ў Радзе кажнага раднага, а таксама сябру органаў Рады да часу суда, ці сэсіі Рады.

3. Сэсія Рады БНР

Пар. 14. Сэсія Рады БНР – найвышэйшая інстанцыя ў працы Рады БНР. Да кампэтэнцыі яе належыць:

а) прыйманьне й зьменьваньне Статуту Рады БНР,
б) ратыфікаваньне ўмоваў,
в) выпрацоўваньне палітычнае лініі й тактыкі дзеяньня ў вонкавых сувязях і беларускім вызвольным руху,
г) прыйманьне законаў, загадаў і інструкцыяў,

д) пазбаўленьне сяброўства ў Радзе БНР на аснове пар-аў 11, 12,
е) іншыя справы, што не належаць да кампэтэнцыі іншых органаў Рады, ці Старшыні Рады.

Пар. 15. Сэсія Рады БНР склікаецца што тры гады, а ў меру канечнае патрэбы й часьцей, Старшынём Рады БНР, а калі яго няма – заступнікам старшыні, і калі яго няма – Прэзыдыюм Рады БНР із собскае ініцыятывы, або на жаданьне ня менш, як аднае пятае сяброў Рады.

Пар. 16. Сэсіі Рады правамоцныя, калі яны праўна скліканыя й сябры Рады паведамленыя пра тэрмін, месца й парадак дня сэсіі найменш зь месяц часу перад датаю сэсіі.

Пар. 17. Сэсію вядзе прэзыдыюм сэсіі, які абіраецца на сэсіі ў складзе старшыні сэсіі, 2-х сакратароў, 1-га сябры. Пастановы сэсіі прыймаюцца звычайнай балышынёю галасоў. У выпадку роўнасьці галасоў справу пастанаўляе другі голас старшыні сэсіі.

Пар. 18. Галасаваньне на сэсіі мае быць тайным:
1. Пры выбарах Старшыні Рады БНР і Прэзыдыюму Рады,
2. Калі ня менш, як адна пятая сяброў прысутных сэсіі зажадае тайнага галасаваньня пры разьвязваньні тае ці іншае справы.

Усе сябры маюць па адным голасе, апрача тых, што маюць пісьмовыя ўпаўнаважаньні ад іншых сяброў, аднак ня больш за пяць галасоў разам із сваім.

4. Прэзыдыюм Рады БНР

Пар. 19. Прэзыдыюм Рады БНР складаецца з Старшыні Рады БНР, ягоных заступнікаў, сакратара, скарбніка й сяброў. Абірае іх, устанаўляючы пры гэтым колькасьць заступнікаў старшыні й сяброў, сэсія Рады БНР на тэрмін шасьці гадоў.

Пар. 20. Да Прэзыдыюм Рады БНР належыць:
а) вядзеньне справаў Рады БНР у часе паміж ейнымі сэсіямі,
б) дапільноўваньне выкананьня пастановаў сэсіі органамі Рады БНР,
в) праводжаньне рэфэрэндумаў сэктарамі Рады ў выпадку патрэбы прыняцьця пастановаў, што належыць да кампэтэнцыі сэсіяў Рады БНР,

г) рэпрэзэнтацыя Рады БНР навонкі,
д) скліканьне сэсіяў Рады БНР згодна з пар. 15.

5. Старшыня Рады БНР

Пар. 21. Начале Рады БНР стаіць Старшыня Рады БНР.

Пар. 22. Старшыня Рады БНР – найвышэйшы прадстаўнік Рады БНР і беларускага народу. Яго абірае Рада БНР на сэсіі на тэрмін шасьці гадоў.

Пар. 23 Старшыня Рады БНР паклікае Сакратарыят Рады БНР у патрэбнай колькасьці асобаў.

Увага. Пры перакладах у іншыя мовы слова «Народная Рэспубліка» перакладаецца як «Дэмакратычная Рэспубліка» а слова «Старшыня» як «Прэзыдэнт».

Пар. 24. Да кампэтэнцыі Старшыні Рады БНР належыць:

а) рэпрэзэнтаваньне БНР перад урадамі й нацыянальнымі прадстаўніцтвамі іншых народаў,
б) прызначаньне прадстаўнікоў БНР пры ўрадах і прадстаўніцтвах іншых народаў,
в) іншыя справы, што вынікаюць з займанага становішча, а ня вызначаныя іншым органам.

Пар. 25. У выпадку вакансіі становішча старшыні Рады БНР ягоным наступнікам стаецца першы заступнік Старшыні Рады БНР.

6. Сэктары Рады БНР

Пар. 26. У месцы, дзе зьбярэцца трох ці больш сяброў Рады, творыцца сэктар Рады БНР. Дзеля стварэньня сэктару могуць злучыцца разам радныя двох ці трох асяродкаў.

Пар. 27. Да заданьняў сэктараў належыць:

а) сачыць разьвіцьцё палітычных падзеяў у сваім асяродку і ў дадзеным краі, сачыць прэсу ў справах Беларусі ды ў важных выпадках безадкладна інфармаваць Прэзыдыюм Рады БНР або рэагаваць адпаведна сытуацыі самым на месцы,
б) прыймаць пастановы ў справах рэфэрэндуму Рады БНР,
в) рупіцца пра разьвіцьцё грамадзкага й палітычнага жыцьця ў сваім асяродку й краі.

Пар. 28. Сэктар мае сваю ўправу ў складзе старшыні, сакратара й скарбніка. Старшыня сэктару – прадстаўнік Рады БНР у сваім асяродку й краі. Для краю, дзе ёсьць колькі сэктараў, прадстаўніка Рады БНР вызначае Старшыня Рады БНР.

Пар. 29. У меру патрэбы склікаюцца агульныя сходы сяброў сэктару Рады БНР. Раз на год Старшыня сэктару склікае гадавы перавыбарчы сход сяброў сэктару, да кампэтэнцыяў якога належыць:

а) апрабаваньне справаздачаў управы сэктару й прызнаньне ёй абсалюторыюму,
б) перавыбары ўправы,
в) прыняцьце бюджэту й пляну працы сэктару.

7. Скарб Рады БНР

Пар. 30. Фінансавыя сродкі на дзейнасьць Рады БНР зьбіраюцца ў скарбе Рады БНР ды паходзяць з:

а) складак нацыянальнага падатку Рады БНР,
б) ахвяраў грамадзтва,
в) асыгнаваньняў беларускіх арганізацыяў,
г) зь іншых непрадбачаных прыбыткаў.

Пар. 31. Грошы ў скарб зьбірае Скарбнік Рады БНР беспасярэдня й праз скарбнікаў сэктараў Рады БНР. Скарбнік Рады БНР адказны перад Радай БНР як фінансава, гэтак і ў дзейнасьці й робіць раз на год фінансавыя справаздачы.

8. Кантроль Рады БНР

Пар. 32. Кантроль Рады БНР ужыцьцяўляецца камісіяй, абіранай на сэсіі Рады БНР на тэрмін шасьці гадоў у складзе старшыні, сакратара, сябры й заступніка.

Пар. 33. Да кантрольнае камісіі належыць кантроль грашовае гаспадаркі Рады БНР ды складаньне справаздачаў з гэтага.

9. Суд Рады БНР

Пар. 34. На аснове пар-аў 9 і 12 гэтага Статуту ўстанаўляецца Суд Рады БНР у складзе старшыні й двух судзьдзяў, абіраных на сэсіі Рады на тэрмін шасьці гадоў.

Пар. 35. Разгляду суда падлягаюць справы, што вынікаюць з пар-аў 9 і 11 гэтага статуту, а таксама магчымых канфліктаў паміж сябрамі Рады БНР. Усе справы разглядаюцца на аснове статуту.

Пар. 36. З мэтаю абароны інтарэсаў сяброў Рады БНР і органаў БНР Старшыня Рады БНР вызначае абвінавальніка, што праводзіць сьледзтва й абвінавачаньне на паседжаньнях суда ў выпадках, калі справа сьціраваная ў суд зь ягонае ініцыятывы або з пастановы Рады БНР.

Пар. 37. Кажны сябра Рады, як і кажная асоба, што мае справу ў судзе Рады БНР, мае права абраць сабе правазаступніка.

Пар. 38. Справы кіруюцца ў суд абвінавальнікамі, зацікаўленымі ў справе бакамі, або пастановаю Рады БНР.

Пар. 39. Ад пастановы суда можна адклікацца ў месячным тэрміне да Рады БНР.

10. Архіў Рады БНР

Пар. 40. Дакумэнты Рады БНР і ўсіх ейных органаў з усіх часоў ейнага існаваньня й дзеяньня, а таксама ўся карэспандэнцыя яе, што захавалася ў органах Рады БНР ды ў розных прыватных асобаў, што маюць ці мелі дачыненьне з Радай БНР ці ейнымі органамі, уважаецца за собскасьць Рады БНР.

Пар. 41. Усе гэтыя дакумэнты й карэспандэнцыя павінны захоўвацца ў Архіве Рады БНР у месцы сядзібы ейнага Прэзыдыюму.

Пар. 42. Органы Рады БНР, улучна зь ейнымі сэктарамі, могуць затрымваць у сябе толькі копіі матарыялаў, патрэбныя дзеля іхняй працы, а іншыя дакумэнты перадюць у архіў Рады БНР.

11. Зьмены Статуту

Пар. 43. Гэты Статут можа быць зьменены або папраўлены на кажнай Сэсіі Рады БНР бальшынёю трох чацьвертых галасоў беспасярэдніх фактычных удзельнікаў сэсіі, калі пункт пра зьмену статуту ўнесены ў парадак дня сэсіі ў вымаганым тэрміне перад скліканьнем сэсіі.

12. Уваход у сілу Статуту

Пар. 44. Гэты Статут уваходзіць у сілу адразу пасьля прыняцьця яго Адзінаццатай Сэсіяй Рады БНР, касуючы адначасна датуль дзейныя статутовыя ўстанаўленьні.

Гэты Статут Рады БНР быў прыняты на Адзінаццатай Сэсіі Рады БНР 29-га травеня 1971 году ў Нью Ёрку за выняткам пяці апошніх разьдзелаў, якія былі прынятыя на Дванаццатай Нечароднай Сэсіі Рады БНР 21-га красавіка 1973 году ў Таронта, Канада.

Падпісалі:

Старшыня 12-й Сэсіі, Барыс Рагуля
Сакратар, Раіса Жук-Грышкевіч

Гэта апошняя рэдакцыя Статуту Рады БНР. У ёй зьмешчаны папраўкі на 13-ай Чароднай Сэсіі Рады БНР 30-га лістапада 1974 году й на 15-ай Юбілейнай Сэсіі Рады БНР 25-га лістапада 1978 году ў Нью Ёрку. (Глядзі пратаколы 13-ай і 15-ай Сэсіяў Рады БНР).

Згоднасьць з арыгіналам Статуту Рады БНР і зьмешчанымі ў ім папраўкамі сьцьвярджаю сваім подпісам:

(подпіс)
Вінцэнт Жук-Грышкевіч
Старшыня Рады БНР
(Архіў Рады БНР)

Старшыня Рады БНР у Ангельшчыне

У сувязі з 25-мі ўгодкамі Згуртаваньня Беларусаў у Вялікай Брытаніі, на запросіны ягонай Галоўнай Управы, у палавіне красавіка 1972 г. наведаў Ангельшчыну Старшыня Рады БНР, заснавальнік і ганаровы сябра ЗБВБ, др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч.

Візыту сваю давялося Старшыні Рады БНР і ягонай жонцы, др. Раісе Жук-Грышкевіч, пачаць удзелам у шчасьлівай нагодзе – вясельлі ведамага беларускага прыяцеля, Ганаровага Сакратара Англя-Беларускага Таварыства, сябры ЗБВБ ды ганаровага грамадзяніна Беларускай Народнай Рэспублікі сп. Гай дэ Пікарды із сп-чняй Зузаннай Флемінг.

На другі дзень, 16 красавіка, адбыліся ўрачыстасьці сьвяткаваньня 25-тых угодкаў ЗБВБ, справаздача зь якіх на іншым мейсцы.

У першай палавіне тыдня Старшыня Рады БНР правёў дзьве грамадзкія нарады й канфэрэнцыі зь беларускімі дзеячамі Лёндану, а ў другой палавіне наведаў Аддзелы ЗБВБ у Брадфардзе й Манчэстары, ды пасьля беларусаў у Бэльгіі.

У Брадфардзе

21-га красавіка вечарам у залі «Лявоніха» Беларускага Грамадзкага Клюбу «Сакавік» сабралося беларускае грамадзтва Брадфарду й ваколіцаў сустрэць Старшыню Рады БНР ды адзначыць 25-я ўгодкі ЗБВБ. У ўрачыстай атмасфэры старшыня аддзелу ЗБВБ у Брадфардзе сп. Аляксандар Калько прывітаў Старшыню Рады БНР і ягоную сужонку, якой «Каралева Беларусь» у Брадфардзе сп-чня Гэля Калбаса з прывітальным словам уручыла букет чырвоных ружаў. Сп. Янка Калбаса вітаў гасьцей з Канады ды бліжэйшых зь Лёндану – сакратара Сэктару Рады БНР у Ангельшчыне сп. Аляксандра Лашука й старшыню Лёнданскага аддзелу ЗБВБ сп. Янку Сяўковіча.

У сваёй прамове Старшыня Рады БНР др. В. Жук-Грышкевіч казаў: «Традыцыю й жыцьцё Рады БНР трэба культываваць і прадаўжаць як факт і памятку таго, што Беларусь мела дзяржаўную незалежнасьць, ды змагацца за гэтую незалежнасьць... Рада БНР і ейны ідэал незалежнасьці й сувэрэннасьці Беларусі мусіць выжыць да іхняга ўжыцьцяўленьня. Абавязак культываваньня традыцыі Рады БНР, што стаіць на стражы ідэалаў 25 Сакавіка, ляжыць на ўсім беларускім грамадзтве. Яно, зарганізаванае ў беларускія арганізацыі ці проста згуртаванае большымі групамі, мае права й абавязак выстаўляць ад сябе кандыдатаў у сябры Рады. 25-ты Агульны Зьезд ЗБВБ у ліпені 1971 году высунуў кандыдатуру на сябру Рады БНР ад Аддзелу ў Брадфардзе. Кіраўніцтва Рады вітае новага кандыдата.»

Тады Старшыня Рады БНР папрасіў Кандыдата да прэзыдыяльнага стала, а ўсіх прысутных устаць. Пры ўрачыстай цішыні новы Кандыдат склаў прысягу раднага. Нацыянальным гімнам «Мы выйдзем шчыльнымі радамі...» закончылася афіцыйная частка ўрачыстасьці.

Беларусы Брадфарду гасьцінныя й добрыя гаспадары. Із залі «Лявоніха», удэкараванай старанна ў вытрыманым нацыянальным тоне, пераходзім у бар «Крыніца». Тут узапраўды крынічыць ды адбіваецца ад люстранай сьцяны й рознага тыпу выстаўленых бутэлек колернае сьвятло, тут весела. Заля не вялікая, але ўтульная... Паводле мясцовага права з бару могуць карыстаць толькі сябры Клюбу, таму госьці адразу атрымалі білеты ганаровага сяброўства Клюбу «Сакавік».

І так «пад гоман вясёлы» шмат чаго ўдалося даведацца, шмат чаго навучыцца з жыцьця суродзічаў, якіх доля закінула ў ангельскі Брадфард.

У беларускім Манчэстары

У Манчэстар прывёз нас на другі дзень старшыня Лёнданскага аддзелу ЗБВБ сп. Янка Сяўковіч. Заехалі да айца Янкі Абабуркі й матушкі Кацярыны. Быццам увайшлі ў беларускую хату. Чысьценька ў ёй, як кажуць, хоць ты з падлогі еж. І скрозь вышыўкі, ручнікі, сурвэткі, тканіны. На другім паверсе каплічка. Як тут сьветла, бела й утульна сьвятым на іконах між крамянага кужалю й народных вышывак! Колькі ўложана тут сэрца! «Але пачакайце, – кажа матушка Кацярына, – хай мы ўладзім толькі нашую царкву, што вунь купілі, тады пабачыце!»

Ды пара ўжо ехаць на абед да старшыні аддзелу ЗБВБ у Манчэстары сп. Хведара Кажаневіча. Спадарыня Кажаневіч, прыстойная сіньёра, сьпеўнай гамонкай просіць за накрыты стол і падае смачны абед, ды пасьля яшчэ абяцае, што, як наступным разам прыедзем, будзе гаварыць пабеларуску.

Усе разам едзем у Беларускі Дом – Клюб, каля якога з грамады выходзіць сп. Міхась Яськевіч зь невялічкім сынком Віктарам і вітае свайго былога гімназіяльнага настаўніка ў Модэна, Італіі, і кіраўніка пры заснаваньні ЗБВБ, а цяпер Старшыню Рады БНР др. В. Жук-Грышкевіча. У вачох ягоных не афіцыйнасьць, а нешта, што сьціскае горла й туманіць вочы, ды тут яшчэ малы Віктар падае мне кветкі...

У ўрачыста прыбранай беларускімі нацыянальнымі эмблемамі залі сп. Хведар Кажаневіч, старшыня аддзелу ЗБВБ у Манчэстары, адчыняе сход. Вітае Старшыню Рады БНР др. В. Жук-Грышкевіча, ягоную сужонку ды гась-

цей зь Лёндану й Брадфарду. Ад вернікаў БАПЦ прыгожым словам вітае а. Янка Абабурка, ад Сэктару Рады БНР у Ангельшчыне сп. Аляксандар Лашук. Тады прамаўляў Старшыня Рады БНР. Коратка вітала суродзічаў Манчэстару старшыня Згуртаваньня Беларусаў Канады др. Раіса Жук-Грышкевіч.

Пазьней Старшыня Рады БНР, навязваючы да сваёй прамовы, паведаміў, што 25-ты Агульны Зьезд ЗБВБ выбраў кандыдатуру на раднага Рады БНР ад аддзелу ЗБВБ у Манчэстары. Адбыўся тут-жа хвалюючы акт прысягі ды прывітаньне новага раднага. Афіцыйная частка закончылася беларускім нацыянальным гімнам.

Тон сяброўскай бяседзе надавалі прыстойныя маладзіцы. Мужчыны акружылі Старшыню Рады БНР. Між імі былі ня толькі сябры Рады й ЗБВБ, але й беларусы, што праз усе гады былі ў апазыцыі як да Рады, гэтак і да ЗБВБ. Ды сэрцам-жа яны балеюць за беларускую справу й жадаюць для яе дабра.

Ды вернемся да бяседы. Хопіць толькі глянуць на а. Абабурку й матушку Кацярыну, каб захацелася сьпяваць. Надта-ж яны галасістыя й прыгожа пяюць. Першая песьня «Пагоня», праўда, выйшла трохі пацаркоўнаму, але як паліліся народныя, аж у вачох жыта закаласіла, а баявыя й патрыятычныя прыцягнулі мужчын з другое залі. А як грымнулі «Ідуць жаўнеры беларусы», тады адчувалася, што ўсе мы йшлі тымі самымі шляхамі, жывём тымі самымі ідэаламі й імкненьнямі.

Дзіўнае гэтае беларускае грамадзтва Ангельшчыны: чым шырэй зь ім стыкаемся, тым глыбей яно заваёўвае тваю душу. Гэтак і цяпер, ня ведаючы нават усіх імёнаў, разьвітаемся з усімі, як з найраднейшымі. Гэткімі вас будзем і памятаць, дарагія суродзічы з Манчэстару й Ангельшчыны.

Вяртаючыся ў Лёндан да спадарства Дамінікаў, спазьніліся мы на тры гадзіны й прыемна былі зьдзіўленыя спаткаць там Уладыку Часлава Сіповіча й старшыню Галоўнай Уравы ЗБВБ сп. Янку Міхалюка. Добра было яшчэ зь імі пабачыцца, бо за пару гадзін пакідалі мы Ангельшчыну.

У Бэльгіі

Пасьля гасьціны ў спадарства Дамінікаў у «Сабэнэ» марыў нас сон, і не агледзіліся, як яна, патрасаючыся, прызямілася на лётнішчы ў Бруксэлі. Сустрэў нас а. др. Аўген

Смаршчок з васьмігадовым сынком Пятрусём. Пятрусь вельмі гаваркі. І паверце, ягоная гаворка й вымовай, і лексыкай – найчысьцейшая беларуская.

Ды вось сустракае нас на парозе Марбурская сяброўка Зоя Жэлязоўская-Смаршчок і ейны 18-цігадовы сын Андрэй. Пасьля абеду едзем на зборку беларусаў у Бэльгіі – на кватэру інж. Янкі Жучкі. Тут спаткалі яшчэ аднаго Марбурскага сябру др. хіміі Аляксея Арэшку.

Пачынаецца паседжаньне. Вядзе яго др. Аўген Смаршчок. Прывітаўшы афіцыйна Старшыню Рады БНР, ён для агульнае арыентацыі прачытаў пратакол з апошняга паседжаньня Прэзыдыюму Рады, што адбылося ў сьнежні 1971 г. у Нью Ёрку. Была дыскусія, былі пытаньні. Паседжаньне закончыў даўжэйшым словам Старшыня Рады БНР др. В. Жук-Грышкевіч.

Расстаёмся зь беларусамі Бэльгіі із запэўненьнем, што незадоўга пабачымся на Амэрыканскім кантынэнце і ў Бэры. **Госьць** (аўтар гэтых радкоў).

(«Беларус», Нью Ёрк, 182, 1972).

«Падзяка

Гэтым складаю шчырую падзяку ад імя сваёй жонкі й свайго Галоўнай Управе ЗБВБ, Айцом Марыянам і аддзелам ЗБВБ у Лёндане, Брадфардзе й Манчэстары за гасьціннасьць і сардэчнасьць, якую мы дазналі ў часе нашай візыты ў Ангельшчыне ў сувязі з 25-мі ўгодкамі Згуртаваньня Беларусаў у Вялікай Брытаніі. Дзякую таксама ўсім суродзічам беларусам у Ангельшчыне, якія прыйшлі, каб пабачыцца з намі, пагутарыць і правесьці разам шмат прыемных і карысных часінаў.

Старшыня Рады БНР
В. Жук-Грышкевіч»

(«Беларус», Нью Ёрк, 182, чэрвень, 1972)

«25-ыя ўгодкі ЗБВБ

Першая беларуская арганізацыя ў Вольным Сьвеце пасьля апошняе вайны – Згуртаваньне Беларусаў у Вялікай Брытаніі 16 красавіка 1972 году ўрачыста сьвяткава-

ла свой сярэбраны юбілей. Арганізатар сьвяткаваньня – Галоўная Управа ЗБВБ паставіла сваёй мэтай ня толькі прыпомніць дзейнасьць Згуртаваньня на працягу 25 год, але так-жа склікаць большы лік сяброў, каб перажыць супольна радасьць гістарычнага дня ды набраць сілаў да далейшай натужнай працы.

І ўзапраўды, прыбыло на ўрачыстасьць шмат людзей. Заля школы сьв. Кірылы Тураўскага, што можа зьмясьціць каля 200 асобаў, была перапоўненая. Урачыстасьць пачалася спатканьнем сп-ва Жук-Грышкевічаў, якія прыбылі з Канады. Дзяўчаткі ў народных строях уручылі сп-ні др. Раісе Жук-Грышкевіч пышны букет кветак. Сп. Янка Міхалюк прывітаў др. Вінцука Жук-Грышкевіча як заснавальніка ЗБВБ, а ў сучасны мамэнт Старшыню Рады БНР. За прэзыдыяльным сталом занялі месца ўспомненыя госьці з Канады, Я. Д. Біскуп Ч. Сіповіч, а. Янка Пякарскі, сьвятар БАПЦ, і Старшыня Галоўнай Управы ЗБВБ.

Праграму ўрачыстага сходу выпаўнялі: даклад др. В. Жук-Грышкевіча, прамова сп-ні др. Р. Жук-Грышкевіч, даклад Біскупа Ч. Сіповіча, прывітаньні ад розных арганізацыяў і асобаў, прыняцьцё.

Заснавальнік нашай арганізацыі распачаў свой зьмястоўны даклад словамі: «Я чуюся вельмі шчасьлівым, што сяньня мы адзначаем вялікую падзею – 25-я ўгодкі Згуртаваньня Беларусаў у Вялікай Брытаніі й што, пасьля 22 год разлукі, я зноў знаходжуся сярод Вас. Вітаю ЗБВБ ізь сярэбраным юбілеем ад імя Рады БНР і ад сябе».

Дакладчык прыпомніў Першы Агульны Зьезд, галоўныя этапы з дзейнасьці ЗБВБ, аб уплыве нашай арганізацыі на беларускія асяродкі ў іншых краінах.

«У гадох 1948-50 – казаў далей першы старшыня ЗБВБ – беларускія арганізацыі расьлі ў розных краёх сьвету, як грыбы пасьля дажджу. Вось дзе наяўны довад жывучасьці беларускай нацыі. Палілі наш край, нішчылі нас Саветы й гітлероўцы. Толькі ў часе апошняй вайны зьнішчылі два з палавінаю мільёны беларускага жыхарства, але ня зьнішчылі й не застрашылі беларускага нацыянальнага духу. Як толькі скончылася вайна, мы ўсталі як фэнікс з папялішчаў да нацыянальнага жыцьця й працы – дзе хто быў, дзе хто мог і як мог. І ў Вольным Сьвеце і на Бацькаўшчыне пад савецкай акупацыяй. Адважваемся цьвердзіць, што няма такой сілы, якая-б змагла зьнішчыць беларускі нацыянальны дух».

Др. Раіса Жук-Грышкевіч так-жа горача й красамоўна вітала ЗБВБ і ягоныя ўгодкі ад імя Згуртаваньня Беларусаў Канады, ад імя Каардынацыйнага Камітэту ды іншых беларускіх арганізацыяў Канады.

Біскуп Ч. Сіповіч падаў у сваім дакладзе гісторыю паўстаньня й дзейнасьці ЗБВБ, абапіраючыся на архіўныя матарыялы. Прыгадаў ён імёны й прозьвішчыі ізь сьпіску першых сяброў ЗБВБ з 1946 г. Сярод іх некаторыя былі прысутныя на ўрачыстасьці, як а. А. Надсон, а. Я. Пякарскі, сп.сп. Асіповіч, Навара, Весялоўскі, Бутрымовіч і сам дакладчык.

Вялікіх трэба было натугаў, каб, будучы ў чужой краіне, нутрана належна зарганізавацца, прыдбаць маемасьць (сяньня ЗБВБ мае тры собскія дамы: у Лёндане, Брадфардзе й Манчэстары), залегалізавацца й весьці дзейнасьць грамадзкую, культурную й рэлігійную.

ЗБВБ выдавала часопісы: «На шляху», «Беларус на чужыне». Выйшла 85 Камунікатаў Галоўнай Управы, якая мела 218 паседжаньняў, прыймала ўдзел у розных беларускіх і міжнацыянальных імпрэзах. Сябрамі ЗБВБ былі два царкоўныя дастойнікі праваслаўныя: Архіяпіскап Андрэй Крыт і Япіскап Мікола Мацукевіч ды адзін каталіцкі – Біскуп Часлаў Сіповіч, а так-жа колькі сьвятароў беларусаў.

«Пэўне-ж ня ўсё ЗБВБ магло зрабіць – казаў дакладчык, – што жадала й што было патрэбным. Аднак сяньня, глянуўшы на ягоную дзейнасьць з адлегласьці чверці стагодзьдзя й ягоны стан сучасны, мы можам аб'ектыўна сьцьвердзіць, што ЗБВБ – салідная заслужаная беларуская арганізацыя на чужыне».

Было-б няпоўным апісаньне юбілейных урачыстасьцяў, калі-б мы ня ўспомнілі шматлікіх прывітаньняў, прысланых з розных краёў пасяленьня беларусаў. Няма магчымасьці падаць поўнага зьместу іх, аднак хаця некаторыя хай нам будзе дазволена адцеміць.

У першую чаргу адчыняем ліст сп. Віктара Сенькевіча зь Гішпаніі, які быў адным із заснавальнікаў ЗБВБ й ягоным першым сакратаром, а які дзеля абставінаў, ад яго незалежных, ня мог прыбыць на ўрачыстасьць. Жадаючы для ЗБВБ вялікіх посьпехаў, «яшчэ больш плённае працы на карысьць нашае Беларусі, больш згуртаванасьці, мужнасьці й ахвярнасьці», кончыў свой прывітальны ліст словамі «Слава Вам, Дарагія Сябры! Няхай жыве й красуе ЗБВБ пад сьцягам БНР!»

З далёкай Аўстраліі надыйшлі прывітаньні ад сп. М. Нікана – быўшага Старшыні ЗБВБ, і ад сп. М. Скабея, што вітаў ад сябе й ад імя Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў Вікторыі.

Із Задзіночаных Штатаў Амэрыкі мы атрымалі прывітаньні ад др. В. Тумаша, Старшыні Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва, ад др. Ст. Станкевіча, Старшыні Рэдакцыйнай Калегіі й Рэдактара заслужанай газэты «Беларус», ад др. Я. Станкевіча, Старшыні Вялікалітоўскага Навуковага Таварыства Пранціша Скарыны.

З Канады віталі прысутныя сп-ва Жук-Грышкевічы, а таксама прыслалі цёплыя прывітаньні й пажаданьні сябры Ўправы Клюбу «Пагоня» сп. сп. К. Акула й А. Маркевіч.

З Францыі вітаў усіх прысутны на ўрачыстасьці сп. М. Наўмовіч, і прыслаў пісьмовае прывітаньне сп. Ул. Шыманец.

Зь Італіі надыйшлі прывітаньні ад а. Архімандрыта Льва Гарошкі, які цяпер працуе кіраўніком Беларускай Сэкцыі Ватыканскага радыя, і ад Пралата П. Татарыновіча.

Зь Нямеччыны не забыліся пра ЗБВБ калішнія ягоныя актыўныя сябры сп.сп. Ч. Кукель і П. Паўлоўскі, кампазытар А. Карповіч і сп. Ю. Попка.

З Бэльгіі ад Саюзу Беларусаў прыслаў прывітаньні а. прат. др. А. Смаршчок.

Найбольш прывітаньняў, пэўне-ж, надыйшло ад беларусаў, што жывуць у Вялікабрытаніі. Не забыліся пра ЗБВБ і тыя, што некалі былі аднымі зь першых у радох ЗБВБ, а пасьля зь іх выйшлі. Віталі так-жа беларусы, што ніколі ня былі сябрамі ЗБВБ, але ацэньваюць ягоную дзейнасьць ды дзеляцца з намі радасьцяй у гэты гістарычны дзень.

Шматлікія ангельцы былі прысутныя на ўрачыстасьці або прыслалі прывітальныя тэлеграмы. Сярод іх успомнім сп-ню Веру Рыч і ейную матку, нашага прыяцеля сп. Г. Пікарду, які за дзень да нашай урачыстасьці ажаніўся і ня мог быць разам з намі, але пра нас не забыўся. Прыйшлі на нашую ўрачыстасьць або прыслалі свае прывітаньні чэхі, палякі, украінцы, летувісы, славакі, латышы, эстонцы й іншыя. Ад Радыя «Свабода» быў прысутны др. Уладзіміраў з жонкай.

Нашую рэдкую й нязвычайную ўрачыстасьць, лепш сказаць, ейную першую частку, закончылі прапяяньнем

беларускага гімну «Мы выйдзем шчыльнымі радамі». Пасьля адбылося прыняцьцё. Смачна й густоўна прыгатаваныя напіткі й закускі сп-няй Лёляй Міхалюк яшчэ больш прыемнымі рабілі сяброўскія спатканьні й гутаркі. Былі з намі прадстаўнікі ад розных Аддзелаў ЗБВБ: з Брадфарду, Кавэнтры, Бірмінгаму. Найбольшы гонар, але й найбольш улажылі ахвярнай працы ў падрыхтаваньні ўрачыстасьці сябры Лёнданскага Аддзелу ЗБВБ на чале зь ягоным Старшынём Янкам Сяўковічам.

Да недахопаў сьвяткаваньня трэба залічыць адсутнасьць прадстаўнікоў прэсы, канцэртнай часткі і прынагоднага выданьня-друку пра ЗБВБ. Праўда, былі сьпевы народных і патрыятычных песьняў, але гэта была толькі пахвальная беларуская стыхійная прывычка, а не памастацку апрацаваная праграма. Даведваемся, што прыгатаўляецца так-жа і брашура пра ЗБВБ. Лепш позна, як ніколі! А тымчасам няхай жыве й красуецца нашае слаўнае ЗБВБ! **Д-ка**»

(«Беларус», Нью Ёрк, 182, 1972)

У Гішпаніі

Ды пакуль вярнуцца з Англіі й Бэльгіі ў Канаду, адведалі мы яшчэ й Гішпанію, дзе прабылі адзін тыдзень. Гішпанія зусім адрозьніваецца ад іншых эўрапэйскіх краінаў і краявідам, і архітэктурай, людзьмі, парадкамі, звычаямі, надвор'ем. На'т неба там нейкае іншае, чыстае, празрыстае. Прыляцелі мы ў Мадрыд увечары. Асьветлены горад выглядаў, як сьвятыня. На другі дзень зраніцы – сонечна, цёпла, як улетку, а гэта-ж быў толькі канец красавіка. Тэлефанічана Вінцук паразумеўся з Віктарам Сенькевічам, які жыў тады ў Палямос. Спаткацца зь ім асабіста ня было магчымасьці.

Адведалі мы дзівоснае Прадо, адну з найбольшых галярэяў мастацтва ў сьвеце. Незабыўнае ўражаньне пакінуў агромны абраз Вэлязкэз – Лас Мэнінас, 1656, які вісіць на сьцяне, быццам ад самой падлогі да столі, у канцы даўгога калідору. Абраз прадстаўляе цёмны, поўны людзей інтэр'ер пакоя, у цэнтры якога стаіць асьветленая 5-цігодняя прынцэса Маргарыта, дачка Філіпа IV. Каля яе ўважлівая абслуга дам, а збоку дрэмле вялікі сабака. Вось, калі ідзеш па тым калідоры ў напраму абраза, дык здаецца,

што перад табой не абраз, а пакой, у які вось-вось і сам увойдзеш.

Аддзел з абразамі Гоя рабіў чуць ня прыгнятаючае ўражаньне. Навет сямейныя каралеўскія, з сабачкам і без сабачкі, партрэты, абразы прыгожых маяў, і тыя не прадстаўлялі жыцьцярадаснасьці, а мелі ў сабе нешта цёмнатрывожнае, не казаць ужо пра «чорныя» малюнкі жахаў вайны, у якіх Гоя прадстаўляў лёс ня толькі гішпанскага народу, але й усяго чалавецтва.

З творчасьцьцю Эль Грэка – абразамі на рэлігійныя тэмы – найболей пазнаёміліся мы ў Толедо, дзе ў 16-тым стагодзьдзі жыў і тварыў гэты мастак. Толедо, старажытны горад, па вузенькіх вуліцах якога ня мог праехаць наш турыстычны аўтобус. Праваднік запаркаваў яго на плошчы перад горадам, а нам усім сказаў трымацца разам, бо калі-б хто з нас ад групы адбіўся й зблудзіў, дык у забітым людзьмі Толедо ніхто нас ня змог-бы адшукаць. І скрозь, у касьцёлах, якія мы зьведвалі, у замчышчах, галярэях, усюды было маса наведвальнікаў, цесната перашкаджала поўнасьцьцю ўспрымаць і цешыцца здабыткамі гішпанскае культуры. Каля самога Толедо бачылі мы, яшчэ ў адносна добрым стане, руіны старажытнага маста, які будаваў каторысь рымскі цэзар.



Вінцэнт Жук-Грышкевіч з жонкай (зь левага боку).
Мадрыд, красавік, 1972.

У Мадрыдзе папалі мы якраз на першамайскую дэманстрацыю, якая, гаварылі гішпанцы, бывала бурная, але гэтая была зусім спакойная, нават прыгожая – калярытная.

Прычынай нашай паездкі ў Мадрыд было ня толькі зьведаць Гішпанію. Старшыня Рады БНР меў пляны дагаварвацца з гішпанскімі ўрадавымі дзейнікамі адносна беларускіх радыёперадачаў. Ён рабіў у гэтым напрамку захады, аб выніках якіх не магу сказаць нічога канкрэтнага.

Ніводнага дня ў часе нашага побыту ў Гішпаніі ня было пахмурнага. Вярнуліся ў Канаду, як у зусім іншы, сьцюдзёны яшчэ ў травені, сьвет.



На адкрыцьці 10-ай Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі ў БР-ГЦ у Таронта, 2 верасьня 1972 году. У першым радзе з права на лева: Паэтка Наталья Арсеньнева, Старшыня Рады БНР др. В. Жук-Грышкевіч, праф. А. Адамовіч, а. Кэндыш, Уладыка Андрэй, Уладыка Мікалай, старшыня ЗБК др. Р. Жук-Грышкевіч, старшыня БАЗА др. Р. Гарошка, сп. М. Махнач.



10-я СУСТРЭЧА
БЕЛАРУСАЎ ПАЎНОЧНАЕ АМЭРЫКІ

прысьвечаная
90-тым угодкам ад нараджэньня
ЯНКІ КУПАЛЫ й ЯКУБА КОЛАСА
й
450-тым угодкам
ДРУКУ НА БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ

2, 3, 4 верасьня, 1972
Торонто, Канада

Загаловачная бачына запросінаў на 10-ю Сустрэчу БПА ў Таронта.



Старшыня Рады БНР др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч прамаўляе на 10-ай Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі, прысьвечанай 90-м угодкам ад нараджэньня Янкі Купалы й Якуба Коласа і 450-м угодкам Друку на Беларускай Зямлі. Таронта, 2 верасьня, 1972.



Удзельнікі мастацкай часткі на 10-ай Сустрэчы БПА ў Таронта, верасень, 1972.

10-я Сустрэча Беларусаў Паўночнае Амэрыкі

адбылася 2-4 верасьня 1972 году ў Таронта, Канадзе. Ладзіла яе Згуртаваньне Беларусаў Канады (ЗБК), якога старшынёй тады была аўтарка гэтых радкоў, і Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне (БАЗА).

Дзень Герояў Беларусі й 25-я ўгодкі Задзіночаньня Беларускіх Вэтэранаў на Чужыне

Падзеі гэтыя ў 1972 годзе былі адзначаныя адпаведнымі ўрачыстасьцямі: 12 лістапада ў Дэтройце, 26 – у Таронта, і 3-га сьнежня ў Нью Брансвіку.

Старшыня Рады БНР др. В. Жук-Грышкевіч, які браў удзел ўва усіх трох сьвяткаваньнях, у сваёй прамове між іншага гаварыў:

«...Кожны народ, каб быць нацыяй, мусіць мець сваю дзяржаўнасьць або, як у нашым выпадку, мусіць змагацца за дзяржаўную незалежнасьць; і мусіць ведаць, якую форму дзяржаўнасьці ён хоча мець. Яму трэба мець як найбольш патрыётаў-змагароў, вайскавікоў, якія ў адпаведным мамэнце гатовы збройна падняць змаганьне за сваю дзяржаўную незалежнасьць. Бяз гэтага ўсяго народ уважаецца за інэртную этнічную масу.

І наіўны быў бы той, хто-б думаў, што хопіць нам мець свае рэлігійныя, грамадзкія й культурныя арганізацыі, апранаць беларускую вопратку й сьпяваць беларускія песьні, каб быць нацыяй, а ня толькі этнічнай групай. Так, бяз сумліву, усё гэта нам вельмі патрэбна як духовая й нацыянальная аснова, але, апрача гэтага ўсяго, мы мусім ведаць, што галоўнай справай для нас ёсьць здабыць-цё дзяржаўнай незалежнасьці, і не абы-якой незалежнасьці, а тэй, якой мы хочам. І мы ведаем, якой мы хочам.

Усе мы прызнаем Акт 25 Сакавіка, які акрэсьлівае форму нашай дзяржаўнасьці як Беларускую Народную Рэспубліку. І мы маем за сабой даўгі шлях змаганьня за яе. За гэта мусім быць удзячны нашым Героям-Змагаром.

Аднак мы ня маем права зьменшыць напружаньне й сілу нашага змаганьня. Нам трэба зьвярнуць большую ўвагу на нашу палітычную арганізацыю й дзейнасьць ды ўзмоцніць і павялічыць лік нашых змагароў ды лік нашых высілкаў.

Справа гэта нялёгкая. Усе мы людзі – з рознымі людзкімі склоннасьцямі й слабасьцямі. Усе мы можам лічыць сябе змагарамі, але трэба нам шчыра глянуць сабе ў душу, каб сказаць, ці сапраўды мы змагары. Каб быць змагаром, трэба патрапіць не паддацца цэлым хмарам варожай нам г. зв. навукі, літаратуры й публіцыстыкі, прайсьці туманы варожай прапаганды й ашуканства, адкінуць г. зв. «вышэйшыя» культуры ды матар'яльныя прывабы, якімі прыцягваюць нас нашы праціўнікі. Трэба панаваць над самім сабой і ставіць дабро нашай справы вышэй за свае асабістыя карысьці й амбіцыі.

І змагацца, і змагацца за нашы ідэалы, за нашу культуру, за Беларускую Народную Рэспубліку, дзе толькі можна, як толькі можна й калі толькі можна. Такім, на маю думку, павінен быць беларускі змагар. І такія змагары ёсьць сярод нас. А колькі з нас станецца такімі – адкажа гісторыя».

(Далей ішла гутарка пра «сытуацыю цяпер»)

«Жадаю вам усім, каб чуліся й былі сапраўднымі змагарамі й каб наша гісторыя назвала нас Героямі Беларусі. Дзякую. **В. Ж.-Г.**»

(Узята з накінутых нататак да прамовы. Прыватны архіў.)



Дзень Герояў Беларусі ў ЗБК. 25-я ўгодкі Арганізацыі Беларускіх Вэтэранаў. Уручэньне дыплёмаў на вайсковы чын. Зь лева на права: Гэнрык Барановіч, Сакратар Вэтэранаў Рады БНР др. Язэп Сажыц, Старшыня Рады БНР др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч, Заступнік Старшыні Рады БНР др. Барыс Рагуля. Таронта, лістапад, 1972.



25-я ўгодкі Арганізацыі Беларускіх Вэтэранаў. 3 сьнежня, 1972. Гайлянд Парк, Нью Джэрзі, ЗША.



25-я ўгодкі Арганізацыі Беларускіх Вэтэранаў. Застольная бяседа ў царкоўнай залі. 3 сьнежня, 1972. Гайлянд Парк, Нью Джэрзі, ЗША.

1973 год. 70-я ўгодкі жыцьця Вінцэнта Жук-Грышкевіча

«Дарагія Суродзічы!

10 лютага 1973 году спаўняецца 70 год ад нараджэньня др. В. Жук-Грышкевіча, Старшыні Рады БНР. Нядаўна, мінулае восені, прыпадалі й угодкі ягонае нацыянальна-грамадзкае дзейнасьці, якая пачалася актыўным удзелам у выбарчай кампаніі 1922 году ў агітацыі па сёлах і мястэчках Заходняе Беларусі за беларускіх кандыдатаў на паслоў і сэнатараў у польскі сойм і сэнат.

Дык, за Дастойным Юбілярам пяцьдзесят ужо гадоў ахвярнае нацыянальнае працы й на зямлі роднай, і па краёх выгнаньня, працы й штодзённай шэрай, і на важных грамадзкіх ды адказных палітычных станановішчах, спыніць якое не змаглі ні вязьніцы, ні ссылкі, ні савецкія канцэнтрацыйныя лягеры.

Заміж плянаванага адзначэньня гэтых угодкаў публічнай бяседай, на жаданьне самога Юбіляра, пэдагога па прафэсыі, былога настаўніка Віленскай Беларускай Гімназіі, Угодкавы Грамадзкі Камітэт заснаваў **Фонд Выдаваньня Беларускіх Падручнікаў.** Фонд гэты, за згодай управаў Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ў Канадзе й ЗША, створаны пры Інстытуце. Сабраныя на Фонд сумы скарыстаныя будуць, пад наглядам Інстытуту, на выдаваньне беларускіх падручнікаў.

Заклікаем Суродзічаў ушанаваць угодкі дзейнага грамадзкага жыцьця й заслужанае ахвярнае нацыянальнае працы др. В. Жук-Грышкевіча дарамі на Фонд. Ахвяры просім слаць на адрасы БІНіМ у Канадзе або ЗША, з зазначэньнем «На Фонд выдаваньня беларускіх падручнікаў». Чэкі трэба выпісваць і слаць на:

Byelorussian Institute of Arts and Sciences, Canada.
c/o A. Hrycuk, 742 Laidlaw Crescent
Kingston, Ont. K7M 5M4, Canada.

Або ў ЗША: Byelorussian Institute of Arts and Sciences, Inc.
3441 Tibbett Avenue, Bronx, N.Y. 10463, USA.

Таронта, Студзень 1973 году.
Угодкавы Грамадзкі Камітэт»

(«Беларус», Нью Ёрк, 189, студзень, 1973)

Зь ліскоў дзёньніка В. Жук-Грышкевіча:

«8 лютага 1973.

Мушу перарваць падрыхтоўку «Камунікатаў» (Рады БНР), бо Раіса вырашыла зрабіць прыняцьце на мае нарадзіны. 10-га лютага мне споўніцца 70 год. Я прасіў, каб не рабілі бяседы, а ляпей, каб мае прыхільнікі далі ахвяру на «Фонд Выдаваньня Беларускіх Падручнікаў», аб чым Угодкавы Грамадзкі Камітэт ужо паведаміў у «Беларусе». Усё-ж я ня мог адмовіць Раісе зрабіць мне прыняцьцё, на якое яна запрасіла найбліжэйшых нашых сяброў і супрацоўнікаў.

9 лютага 1973.

Зраніцы прыехала Валя (Пашкевіч) й застанецца да нядзелі, каб памагчы Раісе ў падрыхтоўцы да бяседы. Я ім памагаю, раблю закупы – купляю ўсё, што трэба. Зварыў два шчупакі, злоўленыя ў рацэ Атаве (5 і 3 фунты), і падрыхтаваў слоік салёных рыжыкаў са сьмятанай. Тымчасам прыходзяць прывітальныя лісты з розных канцоў сьвету ад арганізацыяў і ад асобаў.

Прашу Бога, каб заўтра была такая пагода, як сяньня – спакойна, сонечна, хоць і марозна.

10 лютага 1973.

Пагода ўдалася надзвычайная! У Бэры шумна ад гасьцей, што зьехаліся на карнавал, што адбываецца на возеры Сімко. І ясна ад сонца, хоць мароз і цісьне.

Зраніцы Раіса з Валяй прывіталі мяне з букетамі кветак: 12 ружаў ад Раісы й 12 гвазьдзікаў ад Пашкевічаў. Папаўдні званілі Сурвілы, што едуць з Грыцукамі, а пазьней Рагулі, што ня могуць знайсьці матэлю (дзеля карнавалу ў Бэры). Мы іх запэўнілі, што мейсца для ўсіх нашых гасьцей мы маем.»

Прыехала зь Міхасём, Паўлюком і Эвай Пашкевічамі (з Таронта) і Натальля Арсеньнева з Рочэстар, ЗША; Вара й Язэп Сажычы з Дэтройту, ЗША; Люда й Барыс Рагулі зь Лёндану, Антарыё; Івонка, Янка, Ганулька й Паўлінка Сурвілы з Атавы; Оля й Алесь Грыцукі з Кінгстану; Марыя й Мікола Ганькі з Таронта; Ірэна й Віктар Касьцюкевічы з Таронта; Грэйс Сэйсо з Бэры. Нью Ёрк, як казалі, рэпрэзэнтавала Галіна Тумаш. Місыс Урбан, наша памочніца, нас абслугоўвала.

Сабралася харошая й дарагая грамадка. Сёньня, 17 год ад таго вечара, ня стала ўжо між намі: Вары Сажыч, Алеся Грыцука і тадышняга Юбіляра – Вінцука... Хай сьвятло вечнае на тым сьвеце ім сьвеціць. Сумна цяпер, як гэта ўспамінаеш, а тады было радасна й весела. Дзьверы-сьцяна рассунуты й у злучаных трох пакоях сьветла й прасторна. Застольная бяседа пачалася ўрачыстым пяяньнем «Магутны Божа». Шмат добрых галасоў – сьпеў узьнёслы, сьвяточны. І ўсе госьці сьвяточна-ўрачыстыя ў вячэрніх уборах, у веку ад 7-мі да 70-ці гадоў. Тосты, прамовы, жарты, сьмех і песьні. Віталі Юбіляра: Першы Заступнік Старшыні Рады БНР Др. Барыс Рагуля, сябра Сакратарыяту Рады БНР др. Язэп Сажыч, віталі мужчыны, віталі жанчыны. Ды найбольшае ўражаньне зрабіла найпрыгажэйшае, нештадзённае прывітаньне школьнае сяброўкі Вінцука паэткі

Натальлі Арсеньневай:

Дарагому Вінцуку – сябру юнацтва

Сябры! Увага!
Сяньня ў нас
дзень, не абы-які у сьвеце:
ня ўсім-жа доляю дана
нагода піць семдзесяцілецьце!
Піць поўнай чарай,
маладым,
жывым душой, і хоць чупрыну
ўжо срыбны спавівае дым,
імкненьням не даваць супыну.
Супын... Спачын... На іх пара
Ня хутка прыйдзе шчэ,
дай Божа.
Цябе я,
любы Юбіляр,
раней за ўсіх пазнала, можа...
Вось – Базыльянскія муры
У клясе – цішыня густая...
А мы,
да позьняе пары,
з Табой наш часапіс складаем.
Гартаем допісаў лісткі,

у пальцы хухаем,
– і пішам.
Маўляў на руні каласкі,
радкамі прарастае ціша.
Расьце й каласіцца верш,
а сэрцу радасна й зьзянна.
Тваё, маё – жыло й жыве
непакананае, да сяньня.
І хай Ты Прэзыдэнт цяпер,
хай муж дастойны, санавіты, –
а для мяне ты ўсьцяж, самперш
– сяброк ціхі й працавіты.
Ня той, што шлях пакут, дакук
прайшоўшы,
нас тут сёньня госьціць,
а ў шэрым фрэнчыку Вінцук
з тых вечароў,
з той маладосьці...
Так цёпла, цёпла у грудзях,
калі аб гэтым прыгадаеш.
Жыві-ж сто год нам, Юбіляр,
Дый больш,
калі ахвоту маеш!
. . . . . .
Жыві сто год нам, жыві сто год нам... (усе сьпяваюць)

10 лютага 1973.

І другое прывітаньне, ад ягонага вучня ў Віленскай Беларускай Гімназіі, цяперашняга др. Вітаўта Тумаша, старшыні Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ў Нью Ёрку, на прывітальнай картцы:

«Свайму Дастойнаму Настаўніку гісторыі, лекцыі якога пра эўрапэйскі гуманізм і адраджэньне былі мне першымі арыентацыйнымі вехамі пры пазьнейшай дасьледнай працы над жыцьцём і дзейнасьцьцю найвыдатнейшай постаці гуманізму й адраджэньня беларускага доктара Скарыны.

Пры нагодзе юбілейных сямідзесятых угодкаў жыцьця прывітаньні з пажаданьнямі шмат далейшых гадоў шчасьця, радасьці, здароў'я шле

Вітаўт Тумаш. Нью Ёрк, Люты, 1973.»



Др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч на юбілейнай бяседзе. Бэры, Канада. 10 лютага, 1973.



На юбілейнай бяседзе Натальля Арсеньнева чытае Юбіляру свой верш: «Дарагому Вінцуку, сябру юнацтва». Бэры, 10 лютага, 1973.



Юбілейная бяседа. Вінцэнту Жук-Грышкевічу 70 год. Бэры, 10 лютага, 1973.



Вінцэнт Жук-Грышкевіч прамаўляе на юбілейнай бяседзе.
10 лютага, 1973.

Апрача гэтага, прыйшлі пісьмовыя прывітаньні ад: Я. Д. Біскупа Часлава Сіповіча, Апостальскага Візытатара для Беларусаў:

"CESLAUS SIPOVIC
Episcopus tit. Mariamitanus

Лёндан, 1. II. 1973.

Вельмі Паважаны й Дарагі Прафэсар,

Дык-жа ад шчырага сэрца 100 год! Сяньня атрымаў лістоўку Угодкавага Грамадзкага Камітэту й запраўды цешуся, што людзі аб Вас помняць і жадаюць адсьвяткаваць Ваш юбілей. Не забудуць Вас і беларусы з Вялікай Брытаніі, але гэта адбудзецца больш афіцыяльным шляхам.

Дзеля таго, што толькі ўчора мы атрымалі сьвежы нумар Journal of Byelorussian Studies, а звычайнай поштай ён ідзе вельмі доўга, перасылаю яго лятунскай з думкай ушанаваць Ваш Юбілей. Вельмі-ж скромны падарак, але Вы й Ваша Спадарыня можаце ацаніць, колькі нам каштуе выданьне аднаго такога нумару! А наша непахісная ідэя – дараўняць найбольш сур'ёзным навуковым часапісам сьвету, бо толькі гэткім спосабам можам прыслужыцца для той праўды аб Беларусі, беларусах. Якія-ж нашы сьціплыя сілы і як жа эканомна трэба імі карыстацца!

Заўважце: ангелец праф. Дынглей выступіў у абароне прысабечанай украінцамі граматыкі Ужэвіча; праф. Алтбаўэр цудоўна прыгожа выказаў вагу перакладу на беларускую мову Бібліі з гэбрайскага ў канцы XV ці пачатку XVI ст.; а. Надсон паказвае запраўдны воблік Скарыны, разьбіраючы нікім дагэтуль незакранутую тэму «Малой падарожнай кніжкі...»

Пэўне-ж шмат недахопаў у тым часопісе і мы бачымо іх, спадзяёмся іх у будучыні выэлімінаваць.

Ваш ліст у справе беларускай народнасьці я атрымаў і гутарыў са сп. Пікарда. Ён гатоў дапамагчы...

Усяго, усяго найлепшага! Пішыце, бо заўсёды міла мець ад вас вестку.

Ваш Ч. Сіповіч.»

Ад Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ў Нью Ёрку з 5-га лютага, 1973 г.:

«Вельмі Паважаны Спадару Доктару!

Ня шмат хто пры сваіх 70-х угодках можа азірнуцца і на больш за паўстагодзьдзя гэткае ахвярнае для народу працы, як Вашая, што абыймае розныя галіны дзейнасьці – пэдагагічную, навуковую, арганізацыйна-грамадзкую, палітычна-дзяржаўную – і вялася не зважаючы на перасьледы, арышты, вязьніцы, ссылкі, канцэнтрацыйныя лягеры.

Вітаючы Вас з Вашымі юбілейнымі 70-мі ўгодкамі, Управа Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва перасылае Вам пажаданьні шмат-шмат гадоў далейшага жыцьця пры поўні духовых сілаў і здароўя, сабе на радасьць, беларускаму-ж народу й ягонай вызвольнай справе на карысьць.

У глыбокай пашане

Др. Вітаўт Тумаш Праф. Ант. Адамовіч
Натальля Арсеньнева
Др. Янка Запруднік Др. Вітаўт Кіпель.»

Ад быўшага Першага Заступніка Старшыні Рады БНР сп. Аляксандра Стагановіча:

«Яго Міласьці Прэзыдэнту Б.Н.Р.
Спадару Вінцэнту Жук-Грышкевічу!

У дзень Вашага 70-годняга жыцьця дазвольце злажыць Вам мае сардэчныя зычэньні і пажаданьні на даўгія гады добрага здароўя, шчасьця й усякай памыснасьці ў Вашай працы за вызваленьне нашай Бацькаўшчыны Маці-Беларусі, паняволенай крамлёўскай чырвонай сотняй сярпа-молата.

З Глыбокай Пашанай.

А. Стагановіч.»

7. 2. 1973 г.

"BIELARUAS
Byelorussian Newspaper of North America.

Нью Ёрк, 4 лютага 1973

Доктару Вінцуку Жук-Грышкевічу
Бэры, Канада.

Вельмі Паважаны Спадар Доктар!

У дзень Вашага 70-годзьдзя й 50-ых угодкаў беларускай нацыянальна-палітычнай, грамадзкай і культурнай дзейнасьці прыміце ад мяне самыя гарачыя вітаньні й шчырыя пажаданьні жыцьцёвае памыснасьці, здароўя й доўгага жыцьця, а таксама плённасьці ў працы для нашае сьвятое нацыянальна-вызвольнае ідэі.

З глыбокаю пашанаю

Др. Станіслаў Станкевіч»

Ад паэты Юркі Віцьбіча:

«Глыбокапаважаны Спадар Доктар Жук-Грышкевіч!

На глыбокі мой жаль, асабіста не знаёмы з Вамі, як зь сьвятое й незабыўнае памяці Прэзыдэнтам Абрамчыкам, які ветліва завітаў да мяне ў Саўт Рывэры, але-ж тое – асабістае – ці гэтак ужо й патрэбнае, каб добра Вас ведаць, разумець і паважаць.

Сардэчна вітаю вас зь сёляташнімі 70-мі ўгодкамі нарадзінаў і, даруйце за спазьненьне, леташнімі 50-мі ахвярнае нацыянальнае працы, жадаю здароўя й духовай нязломнасьці. Няхай будзе прыкладам для ўсіх Вашая адданасьць нацыянальнаму.

Дай Божа Вам найбольшае дабрыні,

Ваш Юрка Віцьбіч

8. 2. 73 г. Саўт Рывэр.»

Колькі год пасьля, калі паэт Юрка Віцьбіч быў хворы, Вінцэнт адведаў яго ў Саўт Рывэры.

Ад Сэктару Рады БНР у Аўстраліі прывітаньні падпісаны старшынёй Сэктару сп-няй А. Каранеўскай, калісьняйшай вучаніцай Юбіляра ў Віленскай Беларускай Гімназіі.

Ад Згуртаваньня Беларусаў у Вялікай Брытаніі прывітаньні падпісаны страшынём Галоўнай Управы сп. Янкам Міхалюком.

Ад Сэктараў Рады БНР у Заходняй Эўропе:

«Я. М. др. В. Жук-Грышкевічу
Старшыні Рады Б.Н.Р.
у Канадзе

Высокапаважаны Спадар Старшыня,
Высокадастойны ЮБІЛЯР,

Сэктары Рады Б.Н.Р. у Заходняй Эўропе й спэцыяльна ў Бэльгіі лучаць свой голас да ўдзячнага водгуку беларускага грамадзтва на чужыне ў высокай ацэне Вашай доўгай і плённай працы на нацыянальна-грамадзкай ніве, з нагоды 70 угодкаў Вашага ахвярнага жыцьця.

Просім прыняць нашы шчыра-беларускія жаданьні Вам, Высокадастойны Юбіляр, каб у добрым здароўі яшчэ шматлікія годы змаглі прыносіць Вашы служэньні на ахвярнік Бацькаўшчыны як дасьведчаны сэньёр у змаганьні за беларускае імя й за беларускую праўду.

Няхай Усемагутны Бог пашле Вам свае багатыя ласкі ў асабістым Вашым жыцьці й багаславіць Вашы добрыя пляны й дзейнасьць.

З глыбокай пашанай,

протоп. др. Аўген Смаршчок,
II Заст. Старш. Рады Б.Н.Р.
Старш. Сэктару Рады ў Бэльгіі

Бэльгія, 10 лютага 1973 г.»

Ад Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня ў Нью Джэрзі:

«7-га лютага 1973 году

Яго Міласьці Прэзыдэнту Рады
Беларускай Народнай Рэспублікі
др. Вінцэнту Жук-Грышкевічу.

Вельмі Паважаны Спадар Прэзыдэнт:

Ад імя Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня ў Нью Джэрзі лічу сабе вялікім гонарам Вас вітаць, Спадару Прэзыдэнце, з нагоды 70-х угодкаў ад Вашага нараджэньня. Адначасна вітаю Вас з 50-мі ўгодкамі Вашай нацыянальна-грамадзкай дзейнасьці на Беларусі, а таксама бесперапыннай й на выгнаньні.

Шлем Вам нашыя найшчырэйшыя пажаданьні й жычым Вам Сто Год добрага здароўя, каб далей плённа працаваць на беларускай ніве.

Няхай Вас Усемагутны мае ў сваёй апецы.

Жыве Беларуская Народная Рэспубліка!

У сапраўднай пашане
Расьціслаў Войтанка – Старшыня»

Ад Сэктару Рады БНР у Нью Джэрзі, ЗША:

«3-га лютага, 1973 г.

Яго Міласьці Доктару Вінцэнту Жук-Грышкевічу
Старшыні Рады Беларускае Народнае Рэспублікі.

Вельмі Шаноўны Спадар Старшыня!

Радныя Рады БНР – Сэктару ў Нью Джэрзі складаюць Вам свае найшчырэйшыя пажаданьні з нагоды Вашага 70-ці годзьдзя.

Няхай Усемагутны пашле Вам яшчэ на доўгія годы здароўя і вытрываласьці ў працы дзеля вызваленьня Паняволенае Бацькаўшчыны.

З глыбокай пашанай да Вас
М. Васілеўская – сакратар В. Стома – старшыня.»

Ад Сэктару Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ў Чыкага:

«Чыкага, 7 лютага, 1973.

Вельмі Дастойны Прэзыдэнце!

З нагоды Вашага слаўнага юбілею 70 гадоў жыцьця й 50 гадоў плённай працы на карысьць незалежнасьці БНР, свабоды й дэмакрацыі ды вызваленьня ад чужакоў, ад імя сэктару і ў лучнасьці з усімі сябрамі, перасылаю Вам нашы стойкія ды найлепшыя пажаданьні, хай Усемагутны трымае Вас у асаблівай сваёй апецы, хай дасьць Вам фізычныя й духовыя сілы, каб мы ўсе пад сьцягам БНР змаглі як найлепш спрычыніцца да паслабленьня нацыянальнага ярма нашага народу ды наблізіць час яго-най свабоды. Мы верым у Вашую мужнасьць, каб мы пад Вашым кіраўніцтвам змаглі выканаць нашае нацыянальнае пасланьніцтва.

У імені Сэктару
В. Пануцэвіч»

Ад Задзіночаньня Беларуска-Амэрыканскіх Вэтэранаў у Нью Джэрзі:

«6-га лютага 1973 году.

Яго Міласьці др. Вінцэнту Жук-Грышкевічу,
Прэзыдэнту Рады Беларускай Народнай Рэспублікі
на Выгнаньні.

Высока Паважаны Спадар Прэзыдэнт:

Кіраўніцтва й Сябры Задзіночаньня Беларуска-Амэрыканскіх Вэтэранаў у Нью Джэрзі горача Вас вітаюць з 70-мі ўгодкамі Вашага нараджэньня, а таксама з 50-мі ўгодкамі Вашай нясупыннай нацыянальна-грамадзкай працы на зямлі роднай Беларусі й на выгнаньні.

Шлем Вам нашыя найшчырэйшыя пажаданьні – доўгага жыцьця і добрага здароўя, каб далей плённа працаваць на беларускай ніве.

Жыве Беларусь!

Сяргей Гутырчык – Старшыня»

Ад Аддзелу ЗБВБ і Беларускага Клюбу ў Манчэстары, Ангельшчыне:

«5-га лютага 1973.

Яго Міласьці Спадару Прэзыдэнту
В. Жук-Грышкевічу
54 Мэры Стрыт
Бэры, Антарыё, Канада.

Высокапаважаны Спадар Прэзыдэнт:

У сувязі зь вялікай нагоды 70-ці годзьдзем Вашага жыцьця і 50-мі ўгодкамі нацыянальнае дзейнасьці, паз-вольце мне прывітаць Вас і пажадаць Вам усяго найлеп-шага ад аддзелу ЗБВБ і сяброў Беларускага Клюбу ў Манчэстары.

Прашу лічыць на наша супрацоўніцтва й дапамогу ў Вашай дзейнасьці й працы на карысьць вызваленьня на-шае Бацькаўшчыны.

Сто год! Прыяжджайце ў госьці, чакаем!

З глыбокай пашанай,

Х. Кажаневіч
Старшыня Аддзелу ЗБВБ і
Радны Б.Н.Р.»

Ад Рады Беларускае Аўтакэфальнае Праваслаўнае Царквы ў Вялікай Брытаніі:

«10-га лютага, 1973 г.

Вельмі Паважанаму Спадару Прэзыдэнту
Рады Б.Н.Р.
Др. В. Жук-Грышкевічу
ў Канадзе.

Вельмі Паважаны Спадар Прэзыдэнт!

Ад Настаяцеля, сяброў Рады й вернікаў БАПЦ у Ан-гельшчыне просім прыняць нашыя найшчырэйшыя па-жаданьні з нагоды 70-х угодкаў Вашага жыцьця й 50-х

угодкаў Вашай грамадзка-палітычнай працы, накіраванай для дабра нашай Бацькаўшчыны-Беларусі.

Няхай Бог Вам памагае, сьцеражэ й захоўвае Вас у добрым здароў'і на доўгія годы.

Астаюся з пашанай да Вас,

Янка Калбаса
Сакратар Рады Б.А.П.Ц. у Англіі»

Ад Выдавецтва «Родны Край» даўжэйшы прывітальны ліст падпісаны К. Якубам.

Ад др. Віктара Сенькевіча:

«Гішпанія, 6. II. 1973.

Вельмі Паважаны Спадар Прафэсар,

З нагоды 70-х угодкаў з дня Вашага нараджэньня дазвольце пажадаць Вам як Старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі добрага здароўя і вытрываласьці, а як свайму Настаўніку ў нацыянальна-арганізацыйна-палітычнай дзейнасьці шчырае «многае лета» і памыснасьці ў Вашым прыватна-асабістым жыцьці!

Ваш заўсёды шчыры й адданы

В. Сенькевіч»

Тэлеграма з Францыі:
«Шчырыя прывітаньні. Сто Год! Шыманцы.»

Тэлеграма зь Нью Ёрку:
«Многая лета. Запруднікі.»

«Урачысты вечар і прыняцьце ўдаліся надзвычайна...» – піша ў сваім дзённіку Юбіляр – «На другі дзень на сьнеданьне засталося нас яшчэ дванаццаць асоб. Дзякаваць Богу за Ягоную ласку...»

* * *



На другі дзень пасьля юбілейнай бяседы. Зь лева на права: на падлозе сядзяць Ганулька й Паўлінка Сурвілы. У другім радзе: Эва Пашкевіч, Міхась Пашкевіч, Галіна Тумаш, Івонка Сурвіла, Раіса й Вінцук Жук-Грышкевічы, Натальля Арсеньнева, Валя Пашкевіч, Паўлюк Пашкевіч й Янка Сурвіла.

«Назад ня прыйдзе хваля тая, што з быстрай рэчкай уплывае...» З таго часу мінула 17 год. Кажуць, што Вінцука ўжо няма, што ён закончыў сваю работу, што ўсе ягоныя турботы й клапоты, усе ягоныя цярпеньні скончыліся...А мне здаецца, што ён цяпер таксама, як і я, перажывае, сумуе, што яго ўжо няма ў жывых на гэтым сьвеце – сонечным і хмурным, радасным і сумным, спакойным і бурным, нэгатыўным і пазытыўным, усім тым, што робіць жыцьцё бясцэнным і непаўторным. Кожнай добрай весткай зь Беларусі хачу дзяліцца зь Вінцуком і шкадую, так шкадую, што ён не дажыў да часу, калі ў Менску ізноў зашумелі бел-чырвона-белыя сьцягі... Бо як-бы там яшчэ ня было блага, як бы там яшчэ не паношыліся цёмныя «чырвонай сотні» сілы – Беларусь – паўтараючы словы Вінцука – «як фэнікс з папялішчаў» з духовага й фізычнага Чарнобылю – «падымаецца да нацыянальнага жыцьця».

* * *

«Падручнікі перш за ўсё»

– Піша В. Жук-Грышкевіч, старшыня Рады БНР, у «Камунікатах» Прэзыдыюму й Сакратарыяту Рады БНР нр. 4, за люты 1973 год:

«Але, але, падручнікі перш за ўсё, бо без падручнікаў бадай што нічога нельга навучыцца. А што-ж казаць пра вывучэньне беларусклай мовы й беларусаведы – жывучы ў чужамоўным акружэньні. З падручніка можна вучыцца ня толькі ў школе, але й самому дома. А беларусаведы трэба вучыцца ня толькі дзецям, а й дарослым, бо рэдка хто з нас вучыўся ў беларускай школе. У першую чаргу трэба вучыць беларускай мовы дзяцей і моладзь...

Народ наш знаходзіцца ў савецкай няволі, дзе беларускія школы ператвараюць у расейскія, перасьледуюць беларускую мову, перасьледуюць нашых суродзічаў за тое, што яны гавораць пабеларуску. Масква стараецца вынішчыць усё беларускае, зрусыфікаваць край і народ беларускі. І напэўна ў нашым народзе ёсьць надзея на нас, што жывем у вольным сьвеце ў свабодзе й дастатку, што можам бяз ніякіх абмежаваньняў культываваць сваю мову й культуру, узгадоўваць кадры сьведамыя нацыянальна беларускай інтэлігэнцыі...». І канчае свае разважаньні В. Жук-Грышкевіч гэтак: «Заклікаю беларускае грамадзтва складаць шчодрыя ахвяры на выданьне беларускіх падручнікаў і ў першую чаргу зьвяртаюся з гэтым заклікам да сяброў Рады БНР».

Выдавецкі Камітэт
Беларускіх Падручнікаў у Канадзе

(Справаздача з 9 сакавіка 1981 году)

«**Фонд Беларускіх Падручнікаў** быў заснаваны Старшынём Рады БНР др. Вінцэнтам Жук-Грышкевічам з нагоды 70-х угодкаў ягонага жыцьця ды 50-тых угодкаў ягонай нацыянальна-грамадзкай працы 10-га лютага 1973 г. Фонд БП быў створаны пры Беларускіх Інстытутах Навукі й Мастацтва ў Канадзе й Нью Ёрку. Ужо ў лютым таго году паступіла ў Фонд БП 990 дал. грамадзкіх ахвяраў (655 дал. у Нью Ёрку, і 335 дал. у Канадзе).

Увесну 1973 году актуальнай сталася справа выданьня англамоўнага падручніка «Беларуская Мова» аўтарства спні Валентыны Пашкевіч (з роду Жукоўскай, Р. Ж.-Г.) і пад

рэдакцыяй праф. Антона Адамовіча. Справай гэтай заняўся створаны з ініцыятывы др. В. Жук-Грышкевіча пры Кардынацыйным Камітэце Беларусаў Канады Выдавецкі Камітэт у складзе: старшыні ККБК др. Барыса Рагулі, спні Валентыны Пашкевіч, як аўтаркі падручніка, др. Раісы Жук-Грышкевіч, як сябры Дзяржаўнай Канадзкай Кансультатыўнай Рады для Справаў Шматкультуралізму, др. Вінцэнта Жук-Грышкевіча, як дарадніка ў справах беларускай мовы, сп-ні Івонкі Сурвілы, як дарадніцы ў справах мастацкага афармленьня, і сп. Паўлюка Пашкевіча, як карэктара ангельскай мовы. Выдавецкі Камітэт пры ККБК быў афіцыйна аформлены 16 лютага 1974 году.

Дзякуючы спрыяльнай канадзкай палітыцы шматкультуралізму ды ў выніку нашых стараньняў, ККБК дастаў ад фэдэральнага ўраду Канады субсыдыю (grant) у суме шэсьць тысячаў даляраў на друк англямоўнага падручніка "Fundamental Byelorussian" – «Беларуская Мова». Сума гэтая была пакладзеная ў банку ў Лёндане, Антарыё, на імя старшыні ККБК др. Б. Рагулі ды скарбніка сп. А. Алешкі.

22-га кастрычніка 1974 г. падпісаная была ўмова з друкарняй "Harmony Printing," паводле якой друк падручніка меўся каштаваць 16,150.00 даляраў.

Першая кніга "Fundamental Byelorussian" – «Беларуская Мова» выйшла з друку ў сьнежні 1974 г. Кошт друку быў – 11.195,20. дал. Сума гэта канчальна была сплочаная друкарні 2-га травеня 1975 г.

23-га лютага 1975 г. сакратар-скарбнік др. Раіса Жук-Грышкевіч выслала ў Дзяржаўны Сакратарыят у Аддзел да Справаў Шматкультуралізму фінансавую справаздачу з выданьня 1-ай кнігі падручніка, падзяку, каштарыс на друк выданьня другой кнігі ды заяву на далейшую субсыдыю ў суме дзесяць тысячаў даляраў. Субсыдыя была прызнаная, і грошы атрыманыя на пачатку красавіка таго-ж году.

Другая кніга «Беларускай Мовы» выйшла з друку ў сакавіку 1978 г. і друк яе каштаваў – 15.926,64 дал. Фінансавая справаздача з выданьня 2-ой кнігі падручніка з падзякай за дапамогу была высланая на рукі сп. Орэста Кругляка, Дзяржаўнага Дырэктара для Шматкультуралізму, 26 чэрвеня 1978 году. Належнасьць у друкарню канчальна была сплачана 24 жніўня 1978 году, але на гэта трэба было ўзяць прыватную беспрацэнтавыю пазыку ў суме 500 дал., якую Выдавецкі Камітэт сплаціў у ліпені 1980 г.

Друк абедзьвюх кнігаў тыражом 2000 камплетаў – 500 у цьвярдой вокладцы й 1500 у мяккой – каштаваў 27,121.84 дал. Адна кніга ў мяккой вокладцы каштуе 10.00 дал. – камплект – 20.00 дал; адна кніга ў цьвярдой вокладцы – 15.00 дал. – камплект – 30.00 дал.

Адміністраваньнем Выдавецкага Камітэту й кальпартажам падручнікаў займаецца сакратар-скарбнік др. Раіса Жук-Грышкевіч. У іншых краінах для распаўсюджваньня падручнікаў уцягнуты грамадзкія дзейнікі або паасобныя грамадзяне.

Як належыцца паводле закону, два камплекты падручніка «Беларуская Мова» былі высланыя ў Дзяржаўную Канадзкую Бібліятэку, чатыры камплекты – у Дырэктарат Шматкультуралізму, адзін – у Аддзел Грамадзянства й Імігрыцыі ў Таронта, адзін быў падараваны тагачаснаму Міністру Шматкультуралізму даст. Джону Мунро й сп. Глыну Алену. Колькі камплектаў былі высланыя ў Ангельшчыну ў Беларускую Бібліятэку імя Франьцішка Скарыны ў Лёндане. Наагул каля трыццацёх камплетаў падручніка было раздана для прапагандавых мэтаў.

Каля паўсотні камплектаў падручніка прададзена розным бібліятэкам сьвету, асабліва ў Канадзе й ЗША. Апрача Канады й ЗША, падручнік разыходзіцца па краінах Эўропы: у Ангельшчыне, Нямеччыне, Бэльгіі, Галяндыі, Швэцыі, Аўстрыі й Паўдзённай Амэрыцы ды Аўстраліі.

Цяпер на чарзе стаіць выданьне беларуска-ангельскага слоўніка, які апрацоўвае аўтарка англамоўнага падручніка «Беларуская Мова» сп-ня Валянтына Пашкевіч.

Бэры, Канада, 9 сакавіка 1981 году.

Др. Барыс Рагуля
Старшыня Выдавецкага Камітэту

Др. Раіса Жук-Грышкевіч
Сакратар-Скарбнік Выдавецкага Камітэту.»

(«Беларус», Нью Ёрк, 289, 1981)

«Фонд Беларускіх Падручнікаў» ужо згуляў паважную ролю, ён існуе па сяньня, і перад ім стаіць новае заданьне – выданьне беларуска-ангельскага слоўніка.

Нечародная 12-я Сэсія Рады БНР

У сувязі з 55-мі ўгодкамі абвешчаньня незалежнасьці Беларусі й патрэбай вырашэньня неадкладных справаў была склікана нечародная 12-я Сэсія Рады БНР на 21 красавіка 1973 г. ў Таронта ў Беларускім Рэлігійна-Грамадзкім Цэнтры на 524 Ст. Клярэнс Авенью ў Канадзе.

Між іншымі пастановамі Сэсія прыняла пяць апошніх пунктаў Статуту Рады БНР, якія не пасьпела прыняць 11-я Сэсія. У сувязі з 55-мі ўгодкамі абвешчаньня незалежнасьці БНР і каб зарэагаваць на ўзмоцненую хлусьлівую савецкую прапаганду аб г. зв. бальшавіцкіх дабрадзействах за 50 год СССР і нібыта справядлівым вырашэньні нацыянальнага пытаньня згодна зь ленінскай нацыянальнай палітыкай, Сэсія прыняла рэзалюцыю, ськіваваную да Сакратарыяту й Дэлегацыяў Задзіночаных Нацыяў, ды ўрадаў розных дзяржаваў сьвету.

Апрача гэтае рэзалюцыі, Сэсія прыняла наступнага зьместу пастанову:

«Зварачаючы ўвагу на факт, што сёлетнія 55-я ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларусі супадаюць з паўвяковым – 50-гадовым юбілеем уводу беларусізацыі ў БССР, Рада БНР уважае за адпаведнае абвесьціць ідучы 1973 год залатым юбілейным годам дзяржаўнае беларушчыны й заклікае ўсё беларускае грамадзтва прысьвяціць гэты юбілейны год, наколькі магчыма, вывучэньню, усьведамленьню фундамэнтальнага гістарычнага значэньня, усебаковай ацэне й абароне пазытыўнае спадчыны беларусізацыі, выкаранянае цяпер русыфікацыйнаю палітыкай камуністычнага савецкага кіраўніцтва.»

Ня маючы змогі выслаць сваіх дэлегатаў на канфэрэнцыю заходніх дзяржаваў з Саветамі ў Гэльсінкі й Вену, Старшыня Рады БНР др. В. Жук-Грышкевіч зьвярнуўся з адумысловымі лістамі з залучанай да іх рэзалюцыяй 12-ай Сэсіі Рады БНР да прэзыдэнтаў ці прэм'ераў важнейшых дзяржаваў Захаду – удзельнікаў канфэрэнцыяў з Саветамі. Падобны ліст з рэзалюцыяй 12-ай Сэсіі быў высланы й Генэральнаму Сакратару Задзіночаных Нацыяў. (Паводле Пратаколу 12-ай Сэсіі Рады БНР.)

Зьмест Рэзалюцыі падаем тут у ангельскай мове:

BYELORUSSIAN SURVIVAL THREATENED:

RESOLUTION FORMULATED

RESOLUTION

Submitted by the 12th Session of the Rada (Council) of the Byelorussian Democratic Republic-in-exile held in Toronto, Canada, on April 21, 1973.

PREAMBLE: At the 12th Session of the above Rada, the following points were discussed:

The Union of Soviet Socialist Republics, being a Russian colonial empire, practices genocide and constantly violates the Charter of the United Nations and the Universal Declaration of Human Rights,

The Soviet regime shot or starved to death over100,000 Byelorussian intellectuals and over one million Byelorussian peasants in Stalin's time; farmers were consigned to serfdom on collective farms, and millions of Byelorussians were forcefully deported to hard labour in Siberia or Central Asia,

As a consequence of all the above acts, Byelorussia lost 7,000,000 of its people, plus 2,000,000 lost in World War Two,

In 1918, on the present territory of the Byelorussian Soviet Socialist Republic there were 8,500,000 people. After 54 years of Soviet rule, there are about 9,000,000 people on the original territory instead of 18,000,000 under normal conditions.

Therefore the following submission was made:

WHEREAS: a free and independent Byelorussian Democratic Republic proclaimed by the will of the Byelorussian people on March 25, 1918, was subjugated by Communist Russia;

WHEREAS: Communist Russia, this new colonial power, annexed to the Russian Soviet Socialist Republic over one-third of Byelorussian territory, distributed by political maneuvering lesser parts amongst the Byelorussian neighbours, and created out of the remaining half a political fiction in the form of the Byelorussian Soviet Socialist Republic;

WHEREAS: there has never been a democratic election of the BSSR Government; it has been appointed by Moscow and fully controlled by her. It represents a mere agent of colonial administration which has been forced on the Byelorussian peo-

ple, and even in the United Nations, Byelorussia is represented by the puppets of colonial Moscow, most of whom are not Byelorussians, but Russians;

WHEREAS: under the subterfuge of the "merging" of nations, Moscow rulers deprived Byelorussian art and literature of their national character, changed Byelorussian schools into Russian, persecuted Byelorussian clergy and closed the churches – all this in order to destroy Byelorussian identity;

WHEREAS: Moscow's polices in exploiting Byelorussia's natural resorces do not benefit the Byelorussian people, but foster Russian imperial ambitions;

WHEREAS: many Byelorussian patriots in Byelorussia, especially among the young and the intelligentsia, do their utmost to defend and develop Byelorussian national interests;

THEREFORE: We, the Rada of the Byelorussian Democratic Republic-in-exile, do UNANIMOUSLY RESOLVE:

TO CONDEMN the Moscovite colonial system of Government for its inhuman deeds in Byelorussia and other captive nations;

TO EXPOSE economic exploitation and Russification of Byelorussia, now being continued under the "smoke screen" of the 50th Anniversary of Soviet Federation;

TO CONTINUE the struggle for the reestablishment of a free and independent Byelorussian Democratic Republic;

TO CALL UPON the governments of free nations to speak out in defense of the victims of the Russian Imperialism, among them the Byelorussian people, and to extend to them moral and political support;

TO REQUEST the Secretary-Genaral of the United Nations to set up a Committee for investigation of Moscow's colonial rule in Byelorussia, of genocide and cultural and religious oppression, as well as of the misrepresentation of Byelorussia, the founding memberof the United Nations, by a delegation which fraudulently claims to speak in the name of the Byelorussian people;

TO REQUEST all the delegates in the United Nations and appropriate international bodies to help the Byelorussian people in their struggle against enslavement, in their endeavour to preserve themselves and their culture, and to attain high ideals of human and national freedom.

12th Session of the Rada
of the Byelorussian Democratic Republic

Toronto, Canada

April 21, 1973.

«Рэзалюцыя 12-ай Сэсіі Рады БНР была выдана й у французскай мове ды выслана да ўрадаў Францыі, Бэльгіі й Квэбэку.

Канцылярыя Старшыні Рады БНР разаслала рэзалюцыю 12-ай Сэсіі з суправаджальным лістом 87-мі дэлегацыям розных дзяржаваў ЗН, ды Генэральнаму Сакратару Задзіночаных Нацыяў. Відаць гэта вылкікала рэакцыю ў дэлегацыі БССР у ЗН, бо ў лістападзе яна выдала й распаўсюдзіла свой прапагандовы «Прэс Рэліз» аж на 12 бачын машынапісу.

Ніжэй падаём некаторыя адказы на лісты Старшыні Рады БНР на той мове, на якой яны напісаны:

Foreign and Commonwealth Office
London SW1

Mr. V. Žuk-Hryškievič
(address)

Dear Mr. Žuk-Hryškievič,

I am writing to thank you for your letter of August 22, 1973, to the Prime Minister which has been passed to the Foreign and Commonwealth Office.

The contents of your letter and the resolution enclosed with it have been noted and brought to the attention of those concerned.

Your faithfully,

R. C. C. Cook
Eastern European and Soviet Dept.

Auswartiges Amt
53 Bonn 1, Postfach

Rada of the Byelorussian Democratic Republic (in Exile)
(address) Bonn 7. 9. 1973
Ihre Zeichen und Nachricht vom 24. 8. 1973.

Sehr geehrter Herr Žuk-Hryškievič!

Ihr Schreiben an Bundeskanzler Willy Brant ist dem Auswärtigen Amt zur Beantwortung zugeleitet worden.

Ihre Ausfürungen sind hier zur Kenntnis und zum Material genommen worden.

Mit vorzüglicher Hochachtung

Dr. Meyer-Landrut

Office of the Prime Minister
Ottawa K1A 0A2

March 25th, 1974.

(address)

Dear Madam:

Kindly accept this acknowledgement, on the Prime Minister's behalf, of your March 20 letter and accompanying correspondence from Mr. Žuk-Hryškievič. Please be assured that the representations contained in the above correspondence have been carefully noted.

Yours sincerely,

Hanry Alen Lawless,
Correspondence Secretary.

United Nations
Reference: SO 215/1 USSR

6 November 1973

Dear Dr. Žuk-Hryškievič,

I am directed to acknowledge the receipt of your letter dated 20 August 1973, the contents of which have been noted with attention.

Yours sincerely,

Jakob T. Moller
Human Rights Officer
Division of Human Rights

Сэктары Рады БНР пашырылі рэзалюцыю 12-ай Сэсіі Рады БНР сярод палітычных арганізацыяў і палітычных дзеячоў ды парлямэнтарыстаў сваіх краінаў. У Англіі яна была зьмешчана ў часопісе Фэдэрацыі ‹Юропіен Прэс›».

(«Камунікаты» Прэзыдыюму й Сакратарыяту Рады БНР нр. 5. Красавік, 1974. Архіў Рады БНР.)

Яшчэ перад 12-ай Сэсіяй Рады БНР, перад 25 Сакавіком, было разаслана ўва ўсе беларускія асяродкі ў вольным сьвеце **Прывітаньне Старшыні Рады БНР:**

«СТАРШЫНЯ РАДЫ БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ
President of the Rada of the Byelorussian Democratic Republic
(in exile)

Бэры, 25 сакавіка 1973.

Дарагія Суродзічы!

Вітаю Вас са сьвятам 25 Сакавіка, 55-мі ўгодкамі абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі. Сьвята гэта слаўнае й радаснае, але радасьць нашу засланяе сум паняволеньня й цярпеньні нашага народу.

На вачох цэлага сьвету расейскія бальшавікі зьнішчылі вольную й незалежную беларускую дзяржаву, зьнішчылі свабоду беларускага народу. Пусьцілі ў ход ману й нагаворы, страх, ашуканства й тэрор. А калі й гэта не памагло, кінулі на нашу свабодалюбную краіну брутальную вайсковую сілу, затапілі ў крыві найменшы водрух свабоды.

54 гады трымае Беларусь у паняволеньні бальшавіцкая Масква. Вывозіць нашы багацьці, душыць у калгаснай паншчыне беларускае сялянства, гнобіць у партыйным уціску работнікаў і інтэлігэнцыю. Нішчыць беларускую культуру, перасьледуе беларускую мову, русыфікуе беларускія школы, русыфікуе беларускі народ. Паводле маскоўскага рэцэпту беларускі народ, як і іншыя падсавецкія народы, мае зьнікнуць з паверхні зямлі, мае зьліцца ў адным расейскім народзе, пэрфідна названым савецкім народам.

Паратунак ад гэтага ёсьць толькі адзін: бескампрамісная барацьба. Мы можам лічыць на дапамогу вольнага сьвету, калі самі дружна будзем змагацца. У змаганьні за

вызваленьне нашай Бацькаўшчыны з маскоўскага ярма мы павінны браць удзел дружна й вытрывала ЎСЕ ЯК АДЗІН, УСЕ БЕЛАРУСЫ – БЯЗ РОЗЬНІЦЫ ВЕРЫ, ПОГЛЯДАЎ І ПЕРАКАНАНЬНЯЎ!

Гэтага чакаюць ад нас браты й сёстры ў паняволенай Беларусі. Гэты абавязак налажылі на нас абставіны й гісторыя.

ХАЙ ЖЫБЕ БЕЛАРУСКІ НАРОД У ЗМАГАНЬНІ!
ХАЙ ЖЫВЕ МІЖ НАМІ НАЦЫЯНАЛЬНАЕ АДЗІНСТВА Й ЗГОДА!
ДАПАМАЖЫ НАМ, УСЕМАГУТНЫ БОЖА!

В. Жук-Грышкевіч
Старшыня»

13-я чародная Сэсія Рады БНР

Адбылася 30-га лістапада 1974 году ў будынку Фундацыі імя Пётры Крэчэўскага, 166-34 Готык Драйв, Джамэйка ў Нью Ёрку.

Сэсія ўшанавала памяць памерлых сяброў Рады ды зацьвердзіла прыняцьце новых. Абмеркавала статутовыя ды арганізацыйныя пытаньні ды праблемы бягучае палітычнае працы. Праслухаўшы справаздачы Старшыні Рады БНР др. В. Жук-Грышкевіча, Прэзыдыюму й Сакратароў, Сэсія ўхваліла плян далейшай працы. Быў прыняты таксама аднагалосна «Зварот Рады БНР да беларускага грамадзтва».

«Зварот
Рады Беларускае Народнае Рэспублікі
да беларускага грамадзтва

Другая палавіна дваццатага стагодзьдзя адзначаецца працягам нацыянальна-вызвольнага змаганьня паняволеных народаў і ростам ліку незалежных дзяржаваў. Найлепш пра гэта сьветчаць дзесяткі новых дзяржаваў, што працягам двух апошніх дзесяцігодзьдзяў, здабыўшы сваю незалежнасьць, увайшлі ў склад Задзіночаных Нацыяў і рэпрэзэнтаваныя там запраўднымі прадстаўнікамі сваіх народаў, а не марыянэткамі каляніяльнае мэтраполіі, як

у выпадку кантраляванае Масквой дэлегацыі Беларускае ССР. Увесь гэты працэс міжнароднага разьвіцьця адно пацьвярджае жыцьцёвасьць сфармуляваных у лютым-сакавіку 1918 году ў трох устаўных граматах Рады Беларускае Народнае Рэспублікі ідэялаў нацыянальнае незалежнасьці й дэмакратычных свабодаў беларускага народу ды тэрытарыяльнае непадзельнасьці.

За свабоду й незалежнасьць Беларусі змагалася шмат пакаленьняў беларускага народу: паўстанцы Кастуся Каліноўскага ў 1862-1864 гадох, народнікі 1880-х гадоў, нашаніўцы на пачатку гэтага стагодзьдзя, Рада Беларускае Народнае Рэспублікі й берларускія патрыёты ад часу Ўсебеларускага Кангрэсу 1917 году й абвешчаньня незалежнасьці Беларусі 25 сакавіка 1918 году. Гадамі Другое сусьветнае вайны Беларусь заплаціла жыцьцём кажнага свайго чацьвертага жыхара за права жыць у свабодзе, матар'яльным і духовым дабрабыце. Дагэтуль, аднак, беларускі народ, паняволены сатрапамі маскоўскае дыктатуры, не дамогся сабе гэтага права, хоць права гэтае прызнанае ў прынцыпе на паперы: савецкая прапаганда шырака расьпісваецца пра дзяржаўную сувэрэннасьць Беларусі ды матар'яльны й духовы дабрабыт. Гэтыя аблыжныя цьверджаньні прызначаныя на прыхоўваньне факту эканамічнае экспляатацыі й русыфікацыйнага ўціску на Беларусі. У іх, аднак, адлюстравалася адначасна ўсьведамленьне беларускім народам самае патрэбы свае нацыянальнае сувэрэннасьці. На здушэньне й выкараненьне гэтага ўсьведамленьня якраз і ськіраваная ўся русыфікацыйная акцыя савецкае ўлады. Канчальнай бо мэтай Масквы ніколі не пакідала быць, ні да рэвалюцыі 1917 году ні пасьля яе, мацаваньне коштам падбітых народаў «единой и неделимой» імпэрыі, як-бы яна ні звалася: «Расейская» ці «Савецкая». Да рэвалюцыі мацаваньне гэтае на Беларусі праводзілася шляхам запярэчваньня існаваньня беларускага народу й забаронай ягонае мовы, цяпер – прыхваткай «збліжэньня» й «зьліцьця» яго з расейскім народам у г. зв. «новую гістарычную супольнасьць – савецкі народ».

Да чаго гэтая палітыка этнацыду вядзе практычна, паказваюць факты: у Савецкай Беларусі беларуская мова, што становіць галоўны кампанэнт нацыянальнае сьведамасьці народу, выціснутая ў вялікай меры з культурнага жыцьця рэспублікі, з навукі, з адміністрацыі, з галінаў масавага мастацтва (кіно, тэлебачаньне), вышэйшых і ся-

рэдніх навучальных установаў, друку. Савецкая палітыка двумоўя з падступным канцэптам расейскае мовы, як другое «роднае» мовы беларуса – нічога іншага, як фігавы лісток вялікадзяржаўнага шавінізму, за якім хаваецца тэндэнцыя перацягненьня беларусаў да расейскага аднамоўя. Ужо цяпер паводля савецкае-ж статыстыкі адно 15 працэнтаў кніжак у Савецкай Беларусі выдаецца пабеларуску – найніжэйшы працэнт за ўсе паваенныая гады. Да чаго гэтая тэндэнцыя можа давесьці, сказаў яшчэ пачынальнік беларускага літаратурнага адраджэньня, Франьціішак Багушэвіч у 1891 годзе: «Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю, так як той чалавек прад скананьнем, каторому мову займае, а потым і зусім замерлі». Пра тое пісаў у 1862 годзе й Кастусь Каліноўскі, Багушэвічаў сябар па зброі ў паўстаньні 1863 году, рыхтаваўшы гэнае паўстаньне выдаваньнем падпольнае газэты «Мужыцкая Праўда» (Нр. 4): «У нас, Дзяцюкі, адно вучаць у школах, каб ты знаў чытаці памаскоўску, а то для таго, каб цябе зусім перарабілі на маскаля».

Беларускі народ тымчасам мае сваю старадаўнюю культуру й мову – мову дзяржаўнага справаводзтва й заканадаўства Вялікага Княства Літоўскага, пра прыгажосьць якое казаў ураджэнец Беларусі паэта Адам Міцкевіч, самабытнасьць якое паказаў акадэмік Яўхім Карскі, нявычэрпнае багацьце якое захаванае ў нетрах беларускага фальклёру й творчасьці сотняў беларускіх пісьменьнікаў.

У 1974 годзе споўніліся 90-я ўгодкі ад выхаду беларускага падпольнага часапісу «Гоман», выдаўцы якога, беларускія студэнты ў Пецярбурзе (на Беларусі вышэйшыя навучальныя ўстановы расейскі царызм быў забараніўшы), працягваючы рэвалюцыйныя традыцыі Кастуся Каліноўскага, вялі змаганьне з русыфікатарскім засільлем царскіх бюракратаў за адраджэньне свайго старадаўняга краю й ягонае багатае гістарычнае й культурнае спадчыны. «У сучасны момант (пісалі гоманаўцы ў 1884 годзе) поруч із змаганьнем за свабоду асобы йдзе ўпартае змаганьне за нацыянальнае раўнапраўе й незалежнасьць..., вось чаму ў рэвалюцыйны катэхізіс увайшла, як незапярэчная догма, нацыянальная салідарнасьць на аснове роўнасьці, а не падпарадкаваньня...»

Зварачаючыся да беларускае інтэлігэнцыі з заклікам спрыяць народу «выявіць свой нацыянальны гені», гома-

наўцы сфармулявалі прынцып, што ў сваёй аснове застаўся актуальным і цяпер для ўсіх нас:

«Бяз цеснае еднасьці із сваім народам, бяз глыбокага вывучэньня ягоных матарыяльных і духовых запатрабаваньняў, без разуменьня й павагі ягоных патрэбаў, што выцякаюць з асаблівасьцяў усяго ягонага мінулага гістарычнага й эканамічмага жыцьця, – усе ідэялы інтэлігэнцыі застаюцца назаўсёды пустым гукам, якімі-б з выгляду дэмакратычнымі яны ня былі. Толькі цалком зьвязаная з патрабаваньнямі жыцьця беларускага народу дзейнасьць інтэлігэнцыі будзе плённай, толькі прыстасаваныя да ўмоваў жыцьця й культуры беларускага народу ідэялы інтэлігэнцыі знойдуць ажыцьцяўленьне на беларускай глебе, садзейнічаючы матар'яльнаму й духоваму росквіту беларускага народу. Лішні раз тады давядзе беларуская нацыянальнасьць даведзенае ўжо ці раз... што «НЯ НІЗКІ ЎЗРОВЕНЬ КУЛЬТУРЫ ВЫКЛІКАЕ ЯЕ ПАДПАРАДКАВАНЬНЕ, А НААДВАРОТ, ПАДПАРАДКАВАНЬНЕ ВЫКЛІКАЕ ЗАСТОЙ.»

Хоць з тых часоў беларускае нацыянальнае разьвіцьцё пайшло далёка наперад ды набыло характару масавага руху, русыфікацыйная пагроза ня зьнікла – яна сталася цяпер больш вытанчанай і ў век масавае асьветы больш грунтоўнай. Не зьмянілася ў сувязі з гэтым і існасьць змаганьня за нацыянальнае існаваньне. А затым ня страціла актуальнасьці й тая праграма, якую сфармулявалі перад беларускай інтэлігэнцыяй і перад цэлым беларускім народам выдаўцы «Гоману».

Трынаццатая Сэсія Рады Беларускае Народнае Рэспублікі, скліканая ў 90-я ўгодкі ад выхаду часопісу «Гоман» ды ў перыядзе ўзмоцненага русыфікацыйнага наступу на Беларусь, заклікае ўсіх сумленных сыноў і дачок Беларусі да актыўнага ўдзелу ў змаганьні за сваю нацыянальную існасьць. Змаганьне гэтае будзе тым больш плённым, чым лепш мы ўсьведамім сабе выказаную гоманаўцамі глыбокую думку, што «ня нізкі ўзровень культуры выклікае яе падпарадкаваньне, а, наадварот, падпарадкаваньне выклікае застой». Адначасна, як паказала ўся далейшая гісторыя беларускага нацыянальна-вызвольнага руху й дзяржаўнага будаўніцтва, нязвычайна важным фактарам у змаганьні – і чым далей, тым больш – становіцца ўсьведамленьне другое заканамернасьці: засваеньне нацыянальнае культуры, выяўленьне й пашырэньне багацьцяў

гістарычнае спадчыны вызваляе духова, аблягчае цяжар падпарадкаванасьці ды ўзмацняе надзею на поўнае скасаваньне гэтае падпарадкаванасьці праз ужыцьцёўленьне ідэялаў Беларускае Народнае Рэспублікі: нацыянальнае сувэрэннасьці, дэмакратычных свабодаў, матар'яльнага й духовага дабрабыту.

Жыве Беларусь у змаганьні!

Нью Ёрк, 30, XI, 1974 г.

13-я Сэсія Рады Беларускае Народнае Рэспублікі.»

(«Беларус», Нью Ёрк, 213, 1975)

13-я Сэсія Рады БНР прыняла Рэзалюцыю наступнага зьместу:

RADA OF THE BYELORUSSIAN DEMOCRATIC REPUBLIC (in Exile)

RESOLUTION

Submitted by the 13th Session of the Rada (Council) of the Byelorussian Democratic Republic-in-exile held in New York, U.S.A., on November 30, 1974.

WHEREAS: a free and independent Byelorussian Democratic Republic, proclaimed by the will of the Byelorussian people on March 25, 1918, was subjugated by Communist Russia 56 years ago;

WHERERAS: more than seven million Byelorussians have perished in Soviet prisons and concentration camps, while innumerable Byelorussian cultural treasures have been destroyed;

WHEREAS: for 56 years the government of the BSSR has been formed through the fictitious elections of candidates appointed by Moscow and fully controlled by her;

WHEREAS: under the subterfuge of the "merging" of nations and the consolidation of all the nationalities of the Soviet Union into one so-called "Soviet Nation," the totalitarian Russian regime has systematically pursued the Russification of Byelorussia: the Byelorussian language has been forced out of educational, public, and administrative use and replaced by Russian; the use of Byelorussian in the press and other forms of publication has been diminished steadily and replaced by Russian; Byelorussian art and literature have been deprived of their national character;

WHEREAS: The Soviet regime severely oppresses and discriminates against Byelorussian religious life: closes churches, persecutes Byelorussian clergy and faithful; from those Orthodox churches which have survived, Moscow has created yet another instrument of Russification – by denying them their own Byelorussian jurisdiction and placing them under the Russian jurisdiction in Moscow, even though Byelorussia is called an independent and sovereign Republic; similarly Byelorussian Catholic parishes are being Polonized. Unlike the Catholic population in neighboring republics which have their national bishops – Byelorussians have been denied their own bishops and have been placed under foreign Polish jurisdiction of Cardinal Wyszynski – a well-known polonizer of Byelorussians in Bielastok province occupied by Poland;

WHEREAS: Moscow has persistently violated the Charter of the United Nations and the Universal Declaration of Human Rights; it has totally isolated the population of the Byelorussian S.S.R. from Western countries, prohibiting the emigration to free nations; it has also restricted correspondence and cultural exchanges of the Byelorussian population with the free world;

WHEREAS: Moscow's policies in exploiting the natural resources of Byelorussia do not benefit the Byelorussian people but serve only to foster Russian imperialism;

As a consequence of the above acts – we, the 13th Session of the Rada of the Byelorussian Democratic Republic-in-exile, DO UNANIMOUSLY RESOLVE:

TO CONDEMN the Russian colonial system of the Soviet Union for its subjugation of the freedom-loving Byelorussian people and for its inhuman deeds in Byelorussia and in other captive nations;

TO CONDEMN Soviet economic exploitation and Russification of Byelorussia under the "smoke screen" of the "merging of nations" and the creation of the so-called "Soviet nation";

TO CONTINUE the struggle for the reestablishment of a free and independent Byelorussian Democratic Republic;

TO CALL upon the government of the United States of America and all governments of the free world to condemn the Soviet Union for the abrogation of human rights in Byelorussia and to request these nations to condition their political detente and economic cooperation with the Soviet Union upon a relaxation of free movement of people and ideas between Byelorussia and the free world, including emigration;

TO REQUEST the Secretary General of the United Nations to set up a special committee to investigate Soviet colonial rule in Byelorussia: genocide, political and cultural oppression; religious discrimination and oppression: the prohibition of an autonomous Byelorussian jurisdiction for Byelorussian Orthodox churches as well as Byelorussian Catholic churches,the persecution of Byelorussian priests and faithful; the misrepresentation of Byelorussia, a founding member of the United Nations, by a delegation which fraudulently claims to speak in the name of the Byelorussian people;

TO REQUEST that the United Nations grant Observer Status to a delegation from the Rada of the Byelorussian Democratic Republic in exile.

For the 13th Session of the Rada of the Byelorussian Democratic Republic in Exile,

Anthony Adamovich
Chairman of the Session

Старшыня Рады БНР выслаў Прэзыдэнту ЗША, Джэральду Форду, Галаве Амэрыканскай дэлегацыі на канфэрэнцыі Заходніх дзяржаваў з Саветамі ў Гельсінках у Фінляндыі, Рэзалюцыю 13-ай Сэсіі Рады БНР з лістом наступнага зьместу:

«Rada of the Byelorussian Democratic Republic (in Exile)

166-34 Gothic Drive, Jamaica, New York, U.S.A. 11432

July 25, 1975

Mr. Gerald Ford
President of the United States of America
Head of the American Delegation to
The Conference on Security and Co-operation in Europe
Finlandia Hall, Helsinki
Finland.

Dear Mr. President:

We are all aware that at this time extensive decisions and negotiations are being carried out between Western democra-

cies and the Soviet Union with regard to the establishment of closer contacts and cooperation between the East and West towards the preservation of peace and the consolidation of the status quo.

The one persistent question, however, is what will become of the Byelorussian and other non-Russian nations (consisting of a total population of 130 million) which have been conquered and subjugated by the Soviet Union.

Are the governments and the public of the Western democracies prepared to take upon themselves the responsibility for the loss of freedom and human rights by these 130 million people, by consolidating the status quo as proposed by the Soviet Union?

We are confident, Sir, that you fully comprehend the tragedy which would befall not only these 130 million, but all mankind if the Soviet proposals for a political and territorial status quo were accepted without security for the freedom and rights to self-determination of Byelorussia and other non-Russian nations.

This is why we ask you, Sir, as a representative of humanitarianism and democracy, to do everything within your power, to prevent the consolidation of the captive status of Byelorussia and the other non-Russian nations of the Soviet Union, and to guarantee their freedom and their human rights.

We are enclosing the Resolution of the Thirteenth Session of the Council of The Byelorussian Democratic Republic-in-exile from which you yourself will be able to judge the predicament in which the Byelorussian nation finds itself under the Soviet regime.

Respectfully submitted,

Vincent Žuk-Hryškievič
President»

Старшыня Рады БНР др. В. Жук-Грышкевіч выслаў лісты, вышэй паданага зьместу, з залучанай Рэзалюцыяй 13-ай Сэсіі Рады БНР, і Галовам дэлегацыяў на канфэрэнцыі Заходніх дзяржаваў з Саветамі ў Гэльсінках наступных дзяржаваў: Англіі, Заходняй Нямеччыны, Францыі, Бэльгіі, Галяндыі, Даніі, Італіі, Гішпаніі, Грэцыі й Турэччыны.

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ
ПРЭЗЫДЫЮМ

Рэзалюцыя
13-ай Сэсіі Рады Беларускае Народнае Рэспублікі
на чужыне

30 лістапада 1974 г. у Нью Ёрку, ЗША.

Савецкі Саюз – расейская каляніяльная імпэрыа – ужо 56 год зьдзекуецца над Беларускім дваццацімільённым Народам.

Беларуская Народная Рэспубліка, абвешчаная незалежнай і сувэрэннай дзяржавай 25 сакавіка 1918 году з волі 1800 дэлегатаў 1-га Усебеларускага Кангрэсу – была зьнішчана брутальнай вайсковай сілай Расеі 56 год таму назад і дагэтуль знаходзіцца пад яе акупацыяй.

Праз гэты час маскоўскі акупант зьнішчыў у сваіх вастрогах і канцэнтрацыйных лягерох больш **за сем мільёнаў** беларускага насельніцтва й неаблічальную колькасьць вартасьцяў беларускае культуры.

Больш траціны Беларусі бальшавіцкая Масква далучыла да Расеі, а рэшту-ж – яна, меншымі часткамі беларускай тэрыторыі, надзяліла суседзяў Беларусі ў сувязі са сваімі палітычнымі махінацыямі ды з астанкаў – каля палавіны Беларусі – стварыла фікцыйную беларускую дзяржаву – БССР.

Праз 56 год у БССР дзяржаўная ўлада ўстанаўляецца фікцыйнымі выбарамі кандыдатаў вызначаных Масквой і стала знаходзіцца пад яе выключнай кантроляй.

Пад прэтэкстам шырака прапагаванай «дружбы народаў» і злучэньня ўсіх народаў Савецкага Саюзу ў адну гэтак званую «савецкую нацыю», маскоўскі таталітарны рэжым праводзіць русыфікацыю Беларусі. Беларуская мова выцясьняецца з публічнага ўжытку й школьніцтва ды замяняецца расейскай, памяншаецца беларускі друк прэсы й кніжак ды замяняецца расейскім, а беларуская літаратура й мастацтва пазбаўляюцца свайго нацыянальнага зьместу й характару.

Савецкі рэжым праводзіць у Беларусі жорсткі ўціск і дыскрымінацыю беларускага рэлігійнага жыцьця: зачыняе сьвятыні, перасьледуе беларускіх сьвятароў і вернікаў. З тых жа праваслаўных цэркваў, якія ўтрымаліся, маскоўскія заправілы стварылі яшчэ адну прыладу русыфіка-

цыі: гэтым цэрквам не дазволена свая, беларуская праваслаўная юрыздыкцыя з беларускім япіскапатам, хоць Беларусь і называецца незалежнай і сувэрэннай рэспублікай. Яны паданы пад юрыздыкцыю расейскай праваслаўнай царквы ў Маскве й зроблены сяродкамі русыфікацыі вернікаў.

Ня лепшая доля й уцалеўшых беларускіх каталіцкіх парафіяў, у якіх праводзіцца палянізацыя. Ім не дазволена мець сваіх беларускіх япіскапаў, як маюць сваіх нацыянальных япіскапаў суседнія рэспублікі. Замест гэтага для беларусаў каталікоў у Беларусі Масква знайшла юрыздыкцыю заграніцай – польскую каталіцкую юрысдыкцыю кардынала Вышынскага – ведамага палянізатара беларусаў каталікоў у Польшчы ў Беласточчыне, які ахвотна бярэцца за новы матар'ял да палянізацыі – у Беларусі.

Маскоўскія заправілы стала гвалцяць у Беларусі Хартыю Вольнасьцяў Задзіночаных Нацыяў і Ўніверсальную Дэкларацыю Людзкіх Правоў. Яны трымаюць у поўнай ізаляцыі ад рэшты сьвету насельніцтва БССР, забараняюць эміграцыю ў Амэрыку й іншыя заходнія дзяржавы і толькі ў рэдкіх выпадках пазваляюць некаторым асобам на часовы выезд за граніцу. Нават ліставаньне й культурная сувязь з вольным сьветам перасьледуецца.

Эксплюатацыя Масквой беларускіх натуральных багацьцяў робіцца не на карысьць беларускага народу, а на ўзмацненьне расейскага імпэрыялістычнага патэнцыялу, чым павялічваецца небясьпека для ўсяго вольнага сьвету.

Дзеля ўсяго вышэй сказанага – мы, 13-я Сэсія Рады Беларускай Народнай Рэспублікі на чужыне – пастанавілі:

Асудзіць расейскі імпэрыялізм Савецкага Саюзу за паняволеньне свабодалюбнага Беларускага Народу, за нялюдзкія зьдзекі савецкай улады над беларусамі і іншымі паняволенымі народамі;

Асудзіць жорсткую савецкую эканамічную эксплюатацыю й русыфікацыю Беларусі, якія праводзяцца пад кліччам «дружбы народаў» і ўтварэньня гэтак званай «**аб'яднанай савецкай нацыі**», а фактычна «**адзімай расейскай нацыі**»;

Прадаўжаць далейшую барацьбу за вызваленьне Беларусі спад маскоўскага ярма;

Заклікаць урад Задзіночаных Штатаў Амэрыкі й урады ўсіх дзяржаваў вольнага сьвету, каб асудзілі ўрад Са-

вецкага Саюзу за пагвалчваньне людзкіх правоў у Беларусі й за палітычны, рэлігійны, культурны й эканамічны ўціск яе насельніцтва, ды каб гэтыя дзяржавы ўзалежнілі адпружаньне ў адносінах з Савецкім Саюзам і эканамічнае супрацоўніцтва зь ім ад прызнаньня Савецкім Саюзам права на свабодныя зносіны з вольным сьветам і на эміграцыю ў Амэрыку й наагул у вольны сэвет – беларусам і іншым падсавецкім народам;

Дамагацца ў Генэральнага Сакратара Задзіночаных Нацыяў, каб стварыў адумысловую камісію Задзіночаных Нацыяў, якая-б занялася дасьледаваньнем каляніяльнай палітыкі Савецкага Саюзу ў Беларусі, а менавіта: генацыдам Беларускага Народу й перасьледаваньнем беларускае мовы й культуры; жорсткім рэлігійным уціскам з забаронай утварэньня беларускай праваслаўнай юрыздыкцыі ў Беларусі ды недапушчэньнем беларускага каталіцкага япіскапату для беларусаў каталікоў; фальшывай рэпрэзэнтацыяй Беларусі ў Задзіночаных Нацыях – аднаго з закладчыкаў гэтае арганізацыі – дэлегацыяй гэтак званай БССР, якая рэпрэзэнтуе інтарэсы Масквы, а не Беларусі;

Дамагацца далучэньня ў Задзіночаныя Нацыі дэлегацыі Рады Беларускай Народнай Рэспублікі як абсэрватара.

Прэзыдыюм 13-ай Сэсіі
Рады Беларускай Народнай Рэспублікі на чужыне.

* * *

Апрацаваныя Старшынём Рады БНР др. В. Жук-Грышкевічам і прынятыя 13-ай Сэсіяй Рады БНР Асновы Пляну Працы былі пададзены да ведама ўсіх сябраў Рады БНР у «Камунікатах» нр. 6, за кастрычнік 1974 году:

«Плян працы Рады БНР на кадэнцыю (1974-1977)

I. Асновы пляну працы:

1. Ідэялягічныя падставы

Рада Беларускае Народнае Рэспублікі (БНР) – найвышэйшая ўстанова й адзінае праўнае прадстаўніцтва сувэрэнных правоў беларускага народу, выуяўленых у прававтворчым акце 25 сакавіка 1918 г., зафіксаваным 3-ай Устаўной Граматай БНР.

Правы Рады БНР вынікаюць з неабмежаваных паўнамоцтваў, дадзеных ёй Усебеларускім Зьездам (Кангрэсам) як свайму найважнейшаму органу – Радзе Зьезду 31 сьнежня 1917 г. і перададзеных апошнім вышэйшым пэрсанальным носьбітам гэтых паўнамоцтваў, старшынём Рады БНР Васілём Захаркам, тэстамэнтальна Міколу Абрамчыку, зь ініцыятывы якога на грунце гэтага аднавілася дзейнасьць Рады БНР у экзылі ў сьнежні 1947 г.

Паўнамоцтвы гэтыя трываюць, згодна з пастановай Усебеларускага Зьезду (Кангрэсу) 1917 г., да часу вольных выбараў Устаноўчага сойму ў незалежнай БНР.

Аснаўная мэта й заданьне Рады БНР – перахаваньне й выкананьне волі беларускага народу, вызначанай у акце 25 Сакавіка 1918 г., а гэта – адбудова незалежнай беларускай дзяржаўнасьці на ўсіх беларускіх землях усімі магчымымі й даступнымі спосабамі й дарогамі.

(Статут Рады БНР, пар. 1, 2, 3, 4.)

З гэтага вынікае, што:

а) Рада БНР ня можа быць толькі сымбалем БНР, яна мусіць быць жывой, дзейнай арганізацыяй і праводзіць змаганьне за незалежнасьць Беларусі.

б) Стаяць на пазыцыях Акту 25 Сакавіка – гэта ніякая ласка, кожны чэсны чалавек, нават небеларус – па справядлівасьці – павінен прызнаваць незалежнасьць Беларусі, а сапраўдныя незалежнікі, бээнэраўцы, мусяць змагацца за зьдзейсьняньне Акту 25 Сакавіка, а не збываць яго пустымі дэкляpацыйнымі сказамі.

2. Рола Рады БНР

Роля Рады БНР вынікае з наступнага:

а) Рада БНР – гэта найвышэйшая беларуская ўстанова й адзіны праўны рэпрэзэнтант сувэрэнных правоў беларускага народу;

б) гэта кіраўнік беларускага вызвольнага руху;

в) гэта адзіная беларуская арганізацыя, што аб'ядноывае ўсё ідэйнае незалежніцкае беларускае грамадзтва ў вольным сьвеце.

3. Роля сяброў Рады БНР

Роля сяброў Рады БНР вынікае з таго, што:

а) радныя БНР – гэта найбольш сьведамы нацыянальна, ідэйны і ахвярны актыў беларускага грамадзтва, маральная й матар'яльная падстава Рады БНР.

б) Радныя, як паслы ў парлямэнце, вырашаюць, якой мае быць Рада БНР у сэнсе арганізацыйным і што й як яна мае рабіць, а з другога боку, выконваць пастановы Рады БНР і Сакратарыяту. Гэтыя абавязкі яны бяруць на сябе ўжо тым фактам, што згаджаюцца быць раднымі й складаюць прысягу радных. Калі-б радныя ня выконвалі сваіх абавязкаў – тады-б Рада аказалася бяздарнай і бязчыннай і фактычна не магла-б існаваць. Гэта прывяло-б нас да страшэннай нацыянальнай катастрофы, якую-б не даравалі нам ні народ наш, ні гісторыя.

Каб не дапусьціць да гэтага, радныя мусяць помніць, што яны ня могуць адмаўляцца ад выконваньня сваіх абавязкаў, згодна са зложанай імі прысягай, як ня могуць адмаўляцца і ад ускладзеных на іх функцыяў – у цэнтры, ці на мясцох. У праціўным выпадку яны будуць пустымі ганарліўцамі, а не сапраўднымі беларускімі патрыётамі – незалежнікамі. Толькі ў вынятковых выпадках яны могуць быць звольнены ад сваіх абавязкаў.

І няма тут нічога дзіўнага. Паслы ў парлямэнце ня могуць адмаўляцца ад сваіх абавязкаў, а прапанаваныя імі функцыі прыймаюць з гонарам. Звычайна-ж кожны пасол належыць да тэй ці іншай парлямэнтарнай камісіі, якія твораць парлямэнт. Такім чынам робіцца падзел працы, пры якім усе дзялянкі чынныя й ўсе паслы чынныя, а на пленуме канчальна вырашаюць падрыхтаваныя камісіямі справы да разгляду ўсе паслы грэміяльна.

4. Фінансавае забясьпечаньне

Ня можа быць мовы пра выконваньне працы, а тым больш плянавай працы, калі няма сталага, рэгулярнага даплыву фінансавых сродкаў на гэта. Крыніцай гэтых сродкаў ёсьць складкі нацыянальнага падатку радных па 2.00 дал. у месяц, зь якіх палавіна застаецца ў сэктарах, і толькі другая палавіна мае трапляць у касу Рады БНР. Да гэтага даходзяць зборы ахвяр, як Дар Сакавіка, сярод беларускага грамадзтва. Бяручы пад увагу інфляцыю, нават тэарэтычна сродкі гэтыя мінімальныя. Фактычна-ж яны яшчэ меншыя, бо дзе якія радныя ня плацяць складак або плацяць нерэгулярна. Гэтым страшэнна падрываюцца магчымасьці вядзеньня плянавй нармальнай працы. Як паправіць нашы фінансавыя магчымасьці, будзе мова далей.

5. Падзел працы

Без падзелу працы паміж раднымі ў ворганах Рады БНР і сэктарах ня можа быць мовы пра плянавую працу. Немагчыма, каб адна ці толькі пара асобаў рабіла ўсё і немагчыма каб усе рабілі ўсё. Падзел працы павінен ісьці па ўзроўневай лініі – паміж ворганамі Рады БНР у цэнтры і сябрамі Рады БНР у сэктарах – і па старчмавой лініі: розныя сэктары й аддзелы Рады БНР у цэнтры маюць сваіх супрацоўнікаў у сэктарах, напрыклад, сакратар вонкавых дачыненьняў мае прадстаўнікоў да вонкавых справаў у сэктарах на мясцох; скарбнік Рады БНР мае сваіх супрацоўнікаў на мясцох у асобах скарбнікаў сэктараў, зь якімі ўтрымлівае кантакт і супрацоўніцтва і г. д. Зразумелая рэч, што пры такім падзеле працы ня трэба забываць мясцовай ініцыятывы, але трэба дагледзіць, каб гэта ініцыятыва была плянавай і мэтазгоднай, ды ня была шкоднай для цэласьці.

Такім чынам, асновай плянавай працы Рады БНР ёсьць: 1. ідэялягічныя падставы, 2. роля Рады БНР, 3. роля сяброў радных, 4. фінансавае забясьпечаньне і 5. падзел працы. Бяз гэтай асновы ў Радзе БНР ня можа быць нармальнай плянавай працы.

II. Плян працы Рады БНР

Каб мець магчымасьць выконваць свае заданьні, мы ў першую чаргу мусім заняцца далейшай разбудовай кіраўніцтва, а асабліва-ж выканаўчага апарату Рады БНР. Параграф 23 статуту Рады БНР кажа: «Старшыня Рады БНР паклікае Сакратарыят Рады БНР у патрэбнай колькасьці асобаў».

1. Прэзыдыюм Рады БНР

Прэзыдыюм Рады БНР, як пастанаўляючы ворган паміж сэсіямі, спраўляецца з сваімі заданьнямі добра і, у выпадку недахопу людзей у выканаўчым воргане (Сакратарыяце), мог бы, хоць часткова, запоўніць гэты недахоп. Гэта пажаданьне варта ўзяць пад увагу ў пляне працы.

2. Выканаўчы ворган Рады БНР (Сакратарыят)

Цяпер у выканаўчым воргане Рады БНР выканаўчую работу праводзяць Старшыня Рады БНР, скарбнік Рады

БНР сп. В. Кажан і сакратар вэтэранаў гэнерал др. Я. Сажыч. Ёсьць яшчэ два сакратары: дакумэнтацыі БНР – др. Я. Запруднік і інфармацыі – маг. Я. Сурвіла. Не хапае нам яшчэ старшыні Сакратарыяту й трох сакратароў: вонкавых дачыненьняў, культуры й асьветы ды нутраной арганізацыі.

Некаторым сакратаром неабходна мець у сваіх рэсортах аддзелы: сакратар інфармацыі творыць аддзел прапаганды й прэсы, які зьбірае весткі, што піша пра БНР і беларусаў рознамоўная заходняя й савецкая прэса ды выдае свой інфармацыйны бюлетэнь.

Сакратар дакумэнтацыі БНР мае архіўны аддзел, які зьбірае матар'ял БНР і пра БНР ды матар'ялы пра страты беларускай культуры й людзкія страты ў Беларусі. Сакратар нутраной арганізацыі дбае пра сэктары Рады БНР, мае аддзел пэрсанальны й кадраў актыву, зьбірае матар'ялы пра ўсе беларускія арганізацыі й іхнюю дзейнасьць ды выдае «Камунікаты».

Сакратар асьветы й культуры дбае пра беларускія школы й беларускае ўзгадаваньне моладзі ў беларускіх асяродках вольнага сьвету й утрымлівае сувязь з вучыцелямі й беларускімі асьветнымі арганізацыямі.

Калі-б не знайшлося кандыдата на старшыню Сакратарыяту, яго мейсца можа спалучыць са сваім адзін з дзеючых сакратароў.

Усе сакратары маюць сваіх супрацоўнікаў у сэктарах Рады БНР, пры помачы якіх праводзяць сваю працу на мясцох.

Нам неабходна арганізаваць і агульную канцылярыю Рады БНР, якая падлягала-б старшыні Сакратарыяту, а арганізатарам і кіраўніком яе быў бы шэф канцылярыі БНР.

Таксама неабходна арганізаваць і выдавецтва Рады БНР, што падлягала-б старшыні Сакратарыяту, і хоць маленькую друкарню пры ім, пачынаючы ад машынкі «Вэрытайпэр».

3. Сэктары Рады БНР

Маем 10 сэктараў Рады БНР: 4 у ЗША, 1 у Канадзе, 1 у Аўстраліі й 4 ў Эўропе. Актыўнасьць іх і ўдзел у працы Рады БНР няроўная – незалежна ад колькасьці сяброў і

адлегласьці ад кіраўніцтва цэнтру Рады БНР. Слабейшыя зь іх гэта тыя два, што дагэтуль ня выбралі свайго кіраўніцтва й тыя, што ня зьбіраюць сяброўскіх складак нацыянальнага падатку. Гэтыя недахопы сэктараў трэба выраўняць у першую чаргу. Наагул жа дзейнасьць сэктараў павінна мець два напрамкі: мясцовы (па лініі ўзроўневай) і агульна-бээнэраўскі (па лініі старчмовай).

У мясцовым напрамку – сэктары, як арганізаваны актыў, стымулююць і каардынуюць беларускую работу на сваім абшары. У выпадку непаразумленьняў ці супярэчнасьцяў у грамадзе і мясцовых грамадзкіх арганізацыях яны стараюцца заладзіць ці залагодзіць непаразумленьні й супярэчнасьці. Сама мясцовая дзейнасьць пакажа радным, які мае быць падзел працы між імі.

У агульна-бээнэраўскім напрамку сэктары ўключаюцца ў мясцовую работу згодна зь дзейнасьцяй і інструкцыямі сакратароў выканаўчага воргану Рады БНР. У гэтым выпадку самі сэктары ў паразумленьні са сваімі сябрамі ўстанаўляюць падзел працы, хто зь якім рэсортам мае супрацоўнічаць, нпр.: са скарбнікам Рады БНР, сакратарамі вонкавых дачыненьняў, інфармацыі ці іншымі. Некаторыя рэсорты ўжо маюць устаноўленае супрацоўніцтва з раднымі на мясцох. Так, усе скарбнікі сэктараў супрацоўнічаюць са скарбнікам Рады БНР, рэпрэзэнтанты у Парыскім Блёку й Льезон Груп у Лёндане супрацоўнічаюць з сакратаром вонкавых дачыненьняў (пакуль яго няма – са Старшынём Рады БНР). Пажадана, каб у большых сэктарах знайшліся супрацоўнікі з усімі рэсортамі, а ў меншых – прынамся са скарбнікам Рады БНР, сакратарамі вонкавых дачыненьняў і да спраў вэтэранаў.

У далейшым само жыцьцё й праца пакажуць, што й як рабіць. Магчыма, трэба будзе апрацаваць адумысловую інструкцыю ў гэтай справе, як і ў справе працы ўсіх воргануў Рады БНР. Але ўжо цяпер відаць, што без разбудовы выканаўчага апарату мы ня зможам выконваць заданьняў Рады БНР, і таму трэба адразу прыступіць да рэалізацыі прапанаванага тут пляну працы.

В. Жук-Грышкевіч
Старшыня Рады БНР»

(«Камунікаты» нр. 6)
Кастрычнік, 1974 год.

12-я Сустрэча Беларусаў Паўночнае Амэрыкі

адбылася 4-6 верасьня, 1976 году ў Нью Брансвіку, Нью Джэрзы ў ЗША. У сваім прывітаньні Сустрэчы Старшыня Рады БНР др. В. Жук-Грышкевіч гаварыў:

«Лічу за вялікі гонар і шчасьце вітаць вас ад імя Рады БНР на 12-ай Сустрэчы Беларусаў Паўночнай Амэрыкі, прысьвечанай 200-годзьдзю ЗША й 200-годзьдзю беларускай эміграцыі ў гэтыя Штаты.

Сьвяткаваньне 200-годзьдзя ЗША праносіцца глыбокім і гучным рэхам па ўсім сьвеце, і не дарма: гэта волялюбная, магутная й слаўная нацыя на працягу двыхсот год рабіла й робіць вялізарны ўплыў на ўвесь сьвет, на разьвіцьцё й захаваньне ў ім свабоды, свабоды адзінак і народаў.

Вызваленьне 13-ці амэрыканскіх правінцыяў з каляніяльнага ярма й утварэньне з іх вольных незалежных Злучаных Штатаў у 1776 годзе папярэдзіла Французскую Рэвалюцыю й мела на яе вялікае ўзьдзеяньне, а праз французскую рэвалюцыю й беспасрэдна мела ўзьдзеяньне на Эўропу й увесь сьвет.

Маркіз Ляфает, які, так як і наш зямляк Касьцюшка, браў чынны ўдзел у вызваленьні Амэрыкі, быў праняты ейнымі свабодалюбнымі ідэямі й пазьней стаўся адным з галоўных дзеячоў французкай рэвалюцыі. Апіраючыся на амэрыканскую канстытуцыю, ён склаў «Дэкляpацыю правоў чалавека й грамадзяніна», якая была прынятая ў 1879 г. Французскім Рэвалюцыйным Нацыянальным Сходам і ўвайшла ў французскую канстытуцыю. Амэрыканская канстытуцыя сталася ня толькі асновай французкай канстытуцыі, але па сёньняшні дзень ёсьць асновай правоў чалавека – (Human Rights).

Бяз вызваленьня Злучаных Штатаў Амэрыкі й бяз узьдзеяньня іх на жыцьцё цэлага сьвету на працягу двухсот год – гэта жыцьцё было-б куды горшым і цяжэйшым, і наш лёс, як і лёс усіх паняволеных Масквой народаў, сяньня быў бы бадай безнадзейным.

Будзем спадзявацца, што й надалей ЗША будуць дбаць ня толькі пра сваю свабоду, але, паколькі свабода ёсьць непадзельнай, яны будуць дбаць і пра свабоду нашу й іншых паняволеных народаў і ў выніку нашых высілкаў і высілкаў іншых народаў ды й помачы ЗША й гэтыя народы даб'юцца поўнага вызваленьня й незалежнага дзяржаўнага жыцьця, як 200 год таму назад дабіліся свайго

вызваленьня й незалежнай дзяржаўнасьці 13 амэрыканскіх калёніяў.

Дарагія Суродзічы! Гераічныя чыны амэрыканскіх калёніяў – **хай будуць для нас натхненьнем** у нашым змаганьні за вызваленьне нашай Бацькаўшчыны-Беларусі. Мы мусім узяць глыбока да розуму й сэрца прыклад Амэрыкі. Памятайма, што й мы станем вольнай беларускай нацыяй толькі тады, калі будзем змагацца за незалежную беларускую дзяржаву і асягнем гэту мэту. Бо толькі праз нацыянальную й палітычную сьведамасьць ды змаганьне за сваю незалежную дзяржаву **народ стаецца нацыяй,** а не толькі якойсьці этнічнай групай...

ХАЙ ЖЫВЕ БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА!

В. Жук-Грышкевіч
Старшыня Рады БНР»

14-я нечародная Сэсія Рады БНР

На 14-ай Сэсіі Рады БНР, што адбылася 27-га лістапада 1976 году ў будынку Фундацыі Крэчэўскага, 166-34 Готык Драйв, Джамэйка, Нью Ёрк, ЗША, др. В. Жук-Грышкевіч быў выбраны Старшынём Рады БНР на наступную кадэнцыю шасьці гадоў.

На гэтай Сэсіі між іншых спраў разглядалася справа Фундацыі Крэчэўскага.

Старшыня **Фундацыі Крэчэўскага** інж. Мікола Гарошка даў наступную справаздачу: Фундацыя Крэчэўскага куплена ў 1964 г., прадстаўляе сабой два будынкі, а чатыры дамы, якія цяпер за 12 год патрабуюць шмат догляду, але й даюць пэўны прыбытак. Фундацыя Крэчэўскага дала пад грамадзкае карыстаньне памешканьне на бібліятэку й на грамадзкія сходы; часткова фінансуе «Запісы», часткова сфінансавала выданьне «Прыказак з Лагойшчыны» ды дапамагае ў іншых выданьнях. На грамадзкія мэты разам з карыстаньнем гэтага будынку Фундацыя Крэчэўскага дала дзесяць тысяч даляраў. Прыватныя даўгі сплачаны.

Фундацыя Крэчэўскага

«Паміж Радай БНР і Фундацыяй Крэчэўскага існуе ўмова, падпісаная Радай Дырэктароў Фундацыі Крэчэўскага ды Старшынём Рады БНР і заступнікам яго. Паводз-

ле гэтай умовы Фундацыя Крэчэўскага забавязалася арганізаваць архіў-музэй беларускі, ды да таго, што на паседжаньні дырэктароў Ф. К. мусяць быць запрошаны сябры Прэзыдыюму Рады БНР, якія не належаць да Рады Дырэктароў Фундацыі Крэчэўскага, Рада БНР павінна дбаць, каб гэта ўмова выконвалася.»

(«Камунікаты» нр. 8. сакавік, 1977)

«Рада БНР ніколі не ліквідавалася

Камуністычная прапаганда цьвердзіць, што Рада БНР зьліквідавалася, калі ў 1925 годзе, на г. зв. Бэрлінскай канфэрэнцыі тры БНР-аўскія міністры – Цьвікевіч, Пракулевіч й Заяц зракліся БНР, прызналі БССР і выехалі ў Менск. Тую-ж самую ілжу аб ліквідацыі БНР паўтараюць БЦР-аўцы. Супярэчаць гэтай ілжы наступныя факты:

1. Дзеля адыходу трох міністраў ня можа ліквідавацца ўсё дзяржаўнае кіраўніцтва, тым больш, што ўспомненыя тры міністры падаліся ў дэмісію перад Бэрлінскай канфэрэнцыяй.

2. Нават калі ўвесь урад адыходзіць, дзяржаўнае кіраўніцтва не ліквідуецца, а на месца адышоўшага ўраду Прэзыдэнт паклікае новы ўрад. У нашым выпадку, пасьля выезду трох міністраў у БССР, у Празе застаўся Старшыня Рады БНР Пётра Крэчэўскі з сваім заступнікам і некалькімі раднымі, які перад сьмерцяй перадаў свае паўнамоцтвы свайму заступніку Васілю Захарку, а Старшыня Рады БНР В. Захарка перадаў свае паўнамоцтвы інж. М. Абрамчыку, які пасьля вайны аднавіў Раду БНР, і яна існуе па сяньняшні дзень.

Вельмі важна, каб Рада БНР існавала ў вольным сьвеце й надалей ды вяла барацьбу за вызваленьне Беларусі, бо фактам свайго існаваньня й барацьбы за Беларусь яна рэпрэзэнтуе праўную цягласьць незалежнай дзяржаўнасьці Беларусі, што вынікла з волі народу, і цягласьць змаганьня за ажыцьцяўленьне гэтай волі. У падобнай сытуацыі знаходзяцца эгзыльныя ўрады нашых суседзяў.

В. Жук-Грышкевіч
Старшыня Рады БНР»

(«Камунікаты» Прэзыдыюму й Сакратарыяту Рады БНР нр. 8, сакавік, 1977)

«Узнаўленьне арганізацыі Лігі БНР

Жыцьцё й наша палітычная сытуацыя паказалі, што мы ня можам абыйсьціся без такой арганізацыі, як ЛІГА БНР. Гэта погляд шмат якіх радных, на прапанову якіх і пастаноўлена ўзнавіць арганізаваньне Лігі БНР. У Цэнтральны Арганізацыйны Камітэт Лігі БНР увайшлі: Старшыня – др. В. Жук-Грышкевіч, Старшыня Рады БНР, заступнік старшыні – сп. В. Кажан, Галоўны Скарбнік Рады БНР, сакратар – сп. В. Стома, старшыня сэктару Рады БНР у Нью Джэрзі, і сп. Янка Сурвіла, скарбнік Галоўнай Управы ЗБК.

У сакавіку 1969 г. былі разасланы ўсім радным Ідэёвыя Вытычныя Лігі БНР, Арганізацыйныя Інструкцыі Лігі БНР нр. 1, ды блянкі сяброўскіх заяваў. Просьба да сяброў радных, каб прачыталі гэтыя друкі, выпаўнілі заявы і выслалі іх на адрас, паданы на першай бачыне «Камунікатаў». Калі хто ня мае ўспомненых друкаў, атрымае іх, як толькі паведаміць на той жа адрас. Радных, якія маюць Арганізацыйную Інструкцыю нр. 1, просім, каб зараз жа прыступілі да арганізаваньня Лігі БНР згодна з гэтай інструкцыяй.

Цэнтральны Арганізацыйны Камітэт Лігі БНР.»

(«Камунікаты» нр. 8, сакавік, 1977)

Адна з заяваў аб прыняцьце у сябры Лігі БНР:

«4., 4., 1977

Глыбокапаважаны Старшыня ЦАК Лігі БНР Сп. Жук-Грышкевіч!

Ветліва паведамляю, што Арганізацыйнай Інструкцыі Лігі БНР нр. 1, і блянкаў сяброўскіх заяваў я ня маю, прашу прыслаць іх мне.

Адначасна прызнаюся, што я вельмі задаволены з асоб, ачольваючых Цэнтральны Арганізацыйны Камітэт Лігі БНР. Пакліканыя Вамі заступнік і сакратар – гэта людзі, годныя Вашага даверу. Можаце лічыць на маю поўную Вам адданасьць.

Памажы Вам Божа! Жыве БНР.

З глыбокай пашанай да Вас,

Аўген Трусаў.»

«У Цэнтральны Камітэт Лігі БНР

Заява

Ідэёвыя Вытычныя Лігі БНР адпавядаюць маім поглядам і я згодны прыняць удзел у правядзеньні іх у жыцьцё. Таму прашу прыняць мяне ў лік чынных сяброў Лігі БНР.

Мае дадзеныя: Прозьвішча – Трусаў, імя – Аўген, век – 66 год, адрас – Францыя (Château d'Avoise, 71210 Montchanin).

Нарадзіўся ў (месца, краіна, павет) – Гэльсінкі (Фінляндыя)

Асьвета – б. вуч. БВГ; прафэсія – зводшчык; сямейны стан – жанаты; належу да арганізацыяў: Радны БНР і сябра «Хаўрусу» (Францыя). Дата – 26 кастрычніка, 1977 г. Подіс – А. Трусаў.»

«30-я ўгодкі
Згуртаваньня Беларусаў у Вялікай Брытаніі

30 гадоў прайшло ад першага зьезду Беларусаў у Вялікай Брытаніі, які адбыўся на Вадохрышчы ў Лёндане ў 1947 годзе і заснаваў ЗБВБ. Падрыхтаваў гэты Зьезд і арганізацыю ЗБВБ часопіс «На Шляху»; першы нумар якога выйшаў у лістападзе 1946 году (усяго выйшла 13 нумароў). Чым жыла, у якіх была настроях і да чаго імкнулася беларуская калёнія ў Англіі – гаворыць перадавіца першага й другога нумару «На Шляху», напісаная аўтарам гэтых радкоў (В. Жук-Грышкевічам, Р. Ж.-Г.) Для цікавасьці падаём яе поўны тэкст:

«На Шляху, а не дома стаімо мы, выгнаныя з пад родных стрэх вайной і чужацкай няволяй. Мяркуем дзе пайсьці, куды кінуцца... бо аднэй няма, а шмат дарог перад намі.

Гэта адна магла-б быць толькі дарога на Бацькаўшчыну...

На жаль ня можам мы сяньня пайсьці ёю, бо яна нас у няволю, на Сібір, на калыму, ці яшчэ далей завяла-б, бо не на родныя гоні, не да сваіх блізкіх...

А пакуль-што стаімо на Шляху...

Аднак Шлях гэты мусіць быць Шляхам натужнай, дружнай падгатаваўчай працы ўсіх беларусаў да лепшай

будучыні, да волі, культуры й дабрабыту і, як такі, мусіць злучыць нас у адну вялікую сям'ю – і тых, што засталіся на Бацькаўшчыне, і нас на эміграцыі ў Вялікай Брытаніі, на кантынэнце Эўропы і ў заморскіх краінах...

Толькі тады Шлях Наш будзе здаровым, творчым, жыцьцёдайнмым, – а не бездарожным.»

Як бачым беларуская ідэйная эміграцыя ў Вялікай Брытаніі жыла 30 гадоў таму назад такімі самымі настроямі й падобным духовым жыцьцём, як і сёньняшняя ідэйная беларуская эміграцыя.

Пры добрай нагодзе вітаю Згуртаваньне Беларусаў у Вялікай Брытаніі з трыццатымі ўгодкамі ад імя Рады БНР і жадаю гэтай выдатнай арганізацыі шмат удачы, вытрываласьці й плённай працы і надалей – для разьвіцьця беларускай культуры, а перадусім для вызваленьня Беларусі з расейскага бальшавіцкага ярма.

В. Жук-Грышкевіч
Старшыня Рады БНР»

(«Камунікаты» Прэзыдыюму й Сакратарыяту Рады БНР, сакавік, 1977)



25-я ўгодкі ЗБВБ. У залі школы сьв. Кірылы Тураўскага. Зьлева на права: Я. Міхалюк, др. Р. Жук-Грышкевіч, др. В. Жук-Грышкевіч, а Я. Пякарскі, біскуп Часлаў Сіповіч. Лёндан, Англія, 16 красавіка, 1972.

XXII. 60-ты ЮБІЛЕЙ 25 САКАВІКА

Адзначаньне 60-тых угодкаў абвешчаньня дзяржаўнай незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі пачалося ў сакавіку 1977 г. Старшыня Рады БНР др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч у сваім звароце да Беларускага Грамадзтва ў Беларусі й вольным сьвеце вітае сваіх суродзічаў з 60-мі ўгодкамі **Беларускай Нацыянальнай Рэвалюцыі,** а пасьля ў сьнежні – з 60-мі ўгодкамі **Першага Усебеларускага Кангрэсу** – падзеі гэтыя й завяршыліся **Актам 25 Сакавіка,** 60-ці гадовы юбілей якога сьвяткавалі мы ў сакавіку ды на працягу ўсяго 1978 году.

60-я ўгодкі Беларускай Нацыянльнай Рэвалюцыі

«РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ Rada of the Byelorussian Democratic Republic (in Exile)

Бэры, сакавік, 1977.

Да Беларускага Грамадзтва ў Беларусі й вольным сьвеце

Дарагія Суродзічы!

Ад імя Рады Беларускае Народнае Рэспублікі вітаю Вас са сьвятам 59-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларусі й шэсьцьдзесятымі ўгодкамі **Беларускае Нацыянальнае Рэвалюцыі.** Лютаўская Рэвалюцыя ў Петраградзе ў 1917 годзе ськінула расейскі царскі рэжым, разваліла г. зв. расейскую турму нерасейскіх народаў. Беларусы й іншыя народы кінуліся да арганізацыі й разбудовы свайго нацыянальнага жыцьця, сваей незалежнай дзяржаўнасьці.

Ня гледзячы на тое, што ваенны фронт ад 1915 году перарэзаў Беларусь па лініі Дзьвінск, Смаргоні, Баранавічы, Пінск; што Горадзеншчына й частка Віленшчыны зь Вільняй былі пад немцамі; што столькі тысяч беларусаў былі эвакуаваны ў глыбіню Расеі; што ўсе здольныя да вайсковае службы мужчыны былі змабілізаваны ў расей-

скую армію й што на Беларусі было паўтара мільёна расейскага войска й блізка ж сотні тысяч нямецкага – **на ўсёй тэрыторыі Беларусі, а нават сярод беларускіх уцекачоў у Расеі, пачаўся моцны беларускі нацыянальны рух, які быў сапраўднай беларускай нацыянальнай рэвалюцыяй.** Вякамі душанае беларускае нацыянальнае жыцьцё паднялося раптоўна ўва ўсіх сваіх галінах. Паўставалі беларускія грамадзкія, палітычныя, вайсковыя, рэлігійныя й навуковыя арганізацыі, узрастала беларуская прэса, рос лік беларускіх пастановак, паўставалі беларускія школы; і ўсё гэта ў абставінах жорсткай вайны.

Ужо ў лютым 1917 году закцівізавалася Беларуская Сацыялістычная Грамада, якая ўжо тады налічвала тысячы сяброў (Бел. Сав. Энц. падае пяць тысяч), пашырылі сваю дзейнасьць Беларускія Эс-Эр-ы, Беларускія Сацыял Дэмакраты й Беларускія Хрысьціянскія Дэмакраты. Па ўсёй лініі фронту й у тыле арганізаваліся беларускія вайсковыя зьезды, дзякуючы якім пачалі вылучацца беларускія вайсковыя аддзелы. Каб задзіночыць і ўпарадкаваць гэты спантанічны рух ды акрэсьліць ягоныя мэты, ужо ў сакавіку 1917 году быў створаны ў Менску Беларускі Нацыянальны Камітэт, які стаяў за ўтварэньне Беларускай Рэспублікі. У ліпені 1917 Камітэт гэты ператварыўся ў Раду Беларускіх Арганізацыяў. Беларускія вайсковыя арганізацыі стварылі тады Беларускую Вайсковую Раду, начале ўсяго беларускага руху стаяла Вялікая Беларуская Рада. Завяршэньнем гэтага магутнага руху стаўся Першы Усебеларускі Кангрэс – скліканы ў Менску ў сьнежні 1917 году.

ДАРАГІЯ СУРОДЗІЧЫ! Адзначаючы сяньня 59-я ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларусі й 60-я ўгодкі Беларускай Нацыянальнай Рэвалюцыі ды ўсьведамляючы важнасьць яе, мы мусім адзначыць належна й завяршэньне гэтай рэвалюцыі. Дзеля гэтага мы павінны падрыхтавацца да годнага адсьвяткаваньня 60-ці гадовага юбілею Першага Ўсебеларускага Кангрэсу ў сьнежні гэтага году. Памятайма пра гэты юбілей і рыхтуймася да адсьвяткаваньня яго.

ХАЙ ЖЫВЕ БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА!

В. Жук-Грышкевіч
Старшыня Рады БНР

П. С. Просьба прачытаць гэта прывітаньне на сьвяткаваньні 25-га Сакавіка.»

(«Камунікаты» Прэзыдыюму й Сакратарыяту Рады БНР нр. 8, Бэры, Канада, сакавік 1977.)

Прывітаньне Старшыні Рады БНР на 60-я ўгодкі Першага Усебеларускага Кангрэсу

«Да ўсяго Беларускага Грамадзтва

Дарагія Суродзічы!

Ад імя Рады Беларускай Народнай Рэспублікі вітаю Вас зь вялікім беларускім нацыянальным сьвятам – шэсьцьдзесяці-гадовым юбілеем Першага Усебеларускага Кангрэсу, што адбыўся ў сьнежні 1917 году.

Адзначаючы гэты слаўны юбілей, мы мусім адначасна прызнаць вялікі беларускі патрыятызм і геройства беларускім арганізацыям, якія склікалі Кангрэс, і дэлегатам яго, што прыбылі на Кангрэс, не зважалі на жорсткую вайну, калі Беларусь была завалена расейскім войскам і ў самым Менску было больш расейскага войска, як насельніцтва; не зважалі на тое, што бальшавікі захапілі ўладу ў Петраградзе, а мясцовы расейскі Абласны Іспалніцельны Камітэт (Облискомзап) узурпаваў уладу ў Беларусі ды змагаўся з Беларускай Нацыянальнай Рэвалюцыяй. Ён раззброіў беларускія вайсковыя аддзелы ў Менску, не дапускаў да Менску беларускія вайсковыя часткі з франтоў, перасьледаваў арганізацыю беларускага войска й іншых беларускіх арганізацыяў. Да таго ж камунікацыя зь Менскам была цяжкая й скамплікаваная.

І ня гледзчы на ўсе гэтыя неспрыяльныя абставіны, усё-ж дэлегаты з усёй Беларусі гурмам зьявіліся ў Менску на Першы Усебеларускі Кангрэс у ліку 1872 і бралі ўдзел у працах Кангрэсу 15, 16 і 17 сьнежня 1917 году (паводле старога стылю), а шмат хто зь іх быў чынны цэлы тыдзень у падрыхтаваўчых працах-нарадах Кангрэсу.

Сваёй абсалютнай бальшынёй яны правялі рэзалюцыю, паводле якой ствараўся свой беларускі дзяржаўны ворган з рэспубліканскім ладам, да якога павінна была перайсьці ўлада над усёй Беларусяй. Тут, у самым кульмінацыйным пункце Кангрэсу, дэлегаты яго праявілі свой беларускі патрыятызм ды палітычную сьведамасьць і выразненасьць.

Рэзалюцыя гэта касавала самавольную расейскую бальшавіцкую ўладу ў Беларусі, у выніку чаго Облискомзап пастанавіў разагнаць Першы Усебеларускі Кангрэс. Ён акружыў будынак Кангрэсу бальшавіцкім войскам, якое ўварвалася ў залю Кангрэсу, правяло зацятую бойку з дэлегатамі Кангрэсу, што супраціўляліся разгону, і сілай разагнаў Кангрэс.

Не зважаючы на тое, што Першы Усебеларускі Кангрэс рэпрэзэнтаваў усе пласты беларускага грамадзтва, апрача буржуазіі й абшарнікаў, якія не лічылі сябе беларусамі, і складаўся з прадстаўнікоў бадай што ўсіх партыяў – дэмакратычных, рэвалюцыйных і сацыялістычных, уключна з бальшавікамі – Облискомзап матываваў разагнаньне Кангрэсу тым, што ён быў нацыяналістычным беларускім і быццам буржуазным і рэакцыйным ды не прызнаваў бальшавіцкай улады.

Такі падыход да Усебеларускага Кангрэсу, абсалютная бальшыня дэлегатаў якога паходзіла з сялянства й работнікаў, супярэчыў нават бальшавіцкаму клічу «ўлада працоўным!» і ленінскаму прынцыпу самавызначэньня народаў уключна з аддзяленьнем ад Расеі, але расейскі імпэрыялістычны Облискомзап і гэтага ня браў пад увагу.

Разгон Першага Усебеларускага Кангрэсу бальшавікамі выклікаў вялікую хвалю абурэньня па ўсёй Беларусі й сярод усіх народаў Расеі ўключна з сумленнымі расейцамі. Насільства бальшавікоў над правам Беларускага Народу вырашаць свой лёс тым больш абурыла беларусаў і перадусім нашых герояў – дэлегатаў Кангрэсу. Яны да позьняй ночы з 17 на 18 сьнежня змагаліся з бальшавіцкім войскам у залі Кангрэсу і толькі лічбовая перавага й зброя-войска выціснула іх на вуліцу.

І ўсё-ж канчальнымі пераможцамі сталіся яны, дэлегаты Першага Усебеларускага Кангрэсу. На наступны дзень яны зрабілі закрытае паседжаньне ў чыгуначным дэпо, на якім перадалі ўсе паўнамоцтвы Кангрэсу й выкананьне пастаноў яго Радзе Кангрэсу, выбранай ім у ліку 71 асобы, да часу скліканьня Усебеларускага Ўстаноўчага Сойму. А праз тры месяцы Рада Кангрэсу ператварылася ў Раду Беларускай Народнай Рэспублікі, якая 25 сакавіка 1918 году абвесьціла **незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі.**

Так, дзякуючы нашым героям – арганізатарам і дэлегатам Першага Усебеларускага Кангрэсу – адбылося за-

вяршэньне Беларускай Нацыянальнай Рэвалюцыі й **утварэньне новай пары** ў гісторыі Беларусі, пары **змаганьня за аднаўленьне незалежнай Беларускай Дзяржавы.**

Змаганьне гэта сталася абавязкам усіх беларусаў, усяго Беларускага Народу, а тым больш тэй часткі яго, што знаходзіцца ў вольным сьвеце. Бо, як казаў Кастусь Каліноўскі, Беларусь зажыве шчасьліва толькі тады, калі ўжо маскаля над ёй ня будзе.

ПРЭЧ ЗЬ БЕЛАРУСІ РАСЕЙСКУЮ БАЛЬШАВІЦКУЮ ЎЛАДУ ЎЗУРПАВАНУЮ МАСКВОЙ!

СЛАВА ГЕРОЯМ – АРГАНІЗАТАРАМ І ДЭЛЕГАТАМ ПЕРШАГА УСЕБЕЛАРУСКАГА КАНГРЭСУ!

ХАЙ ЖЫВЕ ВОЛЬНАЯ, НЕЗАЛЕЖНАЯ Й НЕПАДЗЕЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА!

В. Жук-Грышкевіч
Старшыня Рады БНР

П. С. Просьба прачытаць гэта прывітаньне на сьвяткаваньні шэсьцьдзесяцігадовага юбілею Першага Ўсебеларускага Кангрэсу.»

(«Камунікаты» Канцылярыі Старшыні Рады БНР, нр. 9, Бэры, лістапад, 1977.)

60-я ўгодкі 25 Сакавіка

«Да ўсяго Беларускага Грамадзтва

Дарагія Суродзічы!

Вітаю Вас зь вялікім беларускім нацыянальмым сьвятам – шасьцідзесяцігадовым юбілеем абвешчаньня незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі 25-га сакавіка 1918 году.

60 год прайшло ад таго часу, калі Рада Беларускае Народнае Рэспублікі на ўвесь сьвет абвесьціла векапомны Акт 25-га Сакавіка, чым аднавіла беларускую незалежную дзяржаўнасьць і сьцьвердзіла, што беларусы гэта асобная, жывая, шматмільённая творчая нацыя.

У 1918 годзе, не зважаючы на 150 год паняволеньня, беларускі народ быў захаваўшы сваю мову й культуру, а

інстынкт самаабароны й народная мудрасьць утрымоўвалі ў ім перакананьне, што толькі ў сваёй дзяржаве народ можа мець сваю нацыянальную свабоду й культуру ды вольнае жыцьцё й вольную будучыню.

Гэтая беларуская народная мудрасьць выявілася і ў сьнежні 1917 году ў нашых герояў – арганізатараў і дэлегатаў 1-га Ўсебеларускага Кангрэсу, калі яны пастановаю пра ўсталеньне рэспубліканскага дэмакратычнага ладу на Беларусі спрычыніліся да абвешчаньня, абранаю імі Радаю Кангрэсу, незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі, якая й была праклямаваная Актам 25-га Сакавіка.

На вялікі жаль, на маладую Беларускую Дзяржаву кінуліся лютыя ворагі з усходу й захаду, а дапамогі ня было зьнікуль, і ўрэшце рэштаў уся Беларусь была паняволеная. І ў часе змаганьня на жыцьцё й сьмерць нацыі на працягу 60 год нашыя змагары кіраваліся сваёй народнай мудрасьцяй і перакананьнем, што без дзяржаўнай незалежнасьці няма ні свабоды, ні будучыні.

Вось чаму, пры вялізарных людзкіх і матар'яльных стратах ды неаслабным савецкім тэроры на бацькаўшчыне, справа незалежнае беларускае дзяржаўнасьці ня толькі не занікла, а ўсё больш і ўсё шырэй узрастае, як актуальная міжнародная справа.

Вялікая заслуга ў гэтым нашых змагароў на Беларусі, якія, не зважаючы на савецкі тэрор, знаходзяць свае сьцежкі й спосабы змаганьня, але ёсьць тут і нашая заслуга – беларусаў у вольным сьвеце, хоць ня ўсё і ня ўсе мы робім, што маглі-б рабіць.

Памятайма, што мы – беларусы ў вольным сьвеце – неадрыўная частка Вялікага й Слаўнага Беларускага Народу. Жывучы ў свабодзе й дастатку, мы мусім ня толькі інфармаваць вольны сьвет пра жахлівы стан паняволеньня нашага народу, але й весьці змаганьне за вызваленьне Яго, каб не дапусьціць да ягонай і нашай нацыянальнай сьмерці.

ЖЫВЕ ВОЛЬНАЯ, НЕЗАЛЕЖНАЯ Й НЕПАДЗЕЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА!

СЛАВА ЗМАГАРОМ ЗА ВЫЗВАЛЕНЬНЕ БЕЛАРУСІ!

В. Жук-Грышкевіч
Старшыня Рады БНР»

(«Беларус», Нью Ёрк, 251, сакавік, 1978.)

60-я ўгодкі 25 Сакавіка ў Палаце Лёрдаў у Вэстмінстэр у Англіі

Старшыня Рады БНР др. В. Жук-Грышкевіч атрымаў ад Лёрда Эгрэмонт й Камітэту ЗБВБ запросіны на "Reception" – прыняцьцё, ладжанае 6 красавіка 1978 году ў Палаце Лёрдаў, у Вэстмінстэр Палацы ў Лёндане з нагоды сьвяткаваньня 60-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці БНР.

У вадказ на запросіны Старшыня Рады БНР выслаў арганізатарам прыняцьця 29 сакавіка 1978 году наступнага зьместу тэлеграму:

"To the Lord Egremont and the Council of the Byelorussian Association in Great Britain:

Thank you kindly for the invitation to a Reception to be held on Thursday, April 6, 1978, in the House of Lords on the occasion of the sixtieth Anniversary of the Declaration of Byelorussian Independence.

Our greetings and best wishes to all the participants attending the Reception. We join with you in tribute to the patriots who paid the supreme sacrifice for freedom and Independence.

We deeply regret that circumstances prevent us from attending the Reception.

Dr. and Mrs. V. Žuk-Hryškievič
President of the Byelorussian Democratic Republic"

Гэтаксама высланы былі тэлеграмы ў адказ на запросіны: Згуртаваньню Беларусаў у Вялікай Брытаніі, якое ладзіла сьвяткаваньне 60-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці БНР 2-га красавіка ў будынку Беларускае Бібліятэкі імя Франьцішка Скарыны ў Лёндане; і Беларуска-Амэрыканскаму Задзіночаньню (БАЗА) ў Нью Ёрку наступнага зьместу:

«Думкамі й сэрцам з вамі, браты, у дзень 60-тых угодкаў абвешчаньня незалежнасьці БНР. Слава змагаром за незалежнасьць Беларусі! Жыве БНР!

В. Жук-Грышкевіч
Старшыня Рады БНР»

Прывітаньне Старшыні Рады БНР 13-ай Сустрэчы БПА

На пачатку верасьня 1978 году, на 13-ай Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі, што адбылася ў Таронта ў Канадзе і прыпадала на 60-я ўгодкі Першга Усебеларускага Кангрэсу й 60-я ўгодкі абвешчаньня дзяржаўнай незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі, Старшыня Рады БНР др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч у прывітальнай Сустрэчы прамове гаворыць аб цяжкім шляху, які мусіла прайсьці Рада й Урад БНР за апошнія 60 год ды аб патрэбе нашага змаганьня за ўзнаўленьне незалежнасьці БНР. «**Галоўнае наша заданьне наперадзе.**» – кажа ў канцы сваей прамовы Старшыня Рады БНР:

«Дарагія Суродзічы!

Ад імя Рады Беларускай Народнай Рэспублікі вітаю Вас на 13-ай Сустрэчы Беларусаў Паўчнае Амэрыкі й адначасна вітаю з двума векапомнымі ўгодкамі: з шасьцідзесяцігадовым юбілеем І-га Усебеларускага Кангрэсу й шасьцідзесяцігадовым юбілеем абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

У сваіх папярэдніх прывітаньнях з гэтымі юбілеямі – у першым я зьвярнуў увагу на ролю ўдзельнікаў І-га Усебеларускага Кангрэсу, а ў другім на значэньне Акту 25 Сакавіка. У сяньняшнім прывітаньні я зьвярну ўвагу на цяжкасьці й перашкоды, спатыканыя пры аднаўленьні беларускай дзяржаўнасьці.

Для ўтварэньня дзяржавы неабходна мець тры складнікі: народ, тэрыторыю й волю народу на будаваньне сваей незалежнай дзяржавы. БНР мела ня толькі гэтыя тры складнікі, але й абапірала сваю дзяржаўнасьць на дэмакратычных прынцыпах свабоды й роўнасьці ўсіх грамадзян ды на свабодзе слова й свабодзе сумленьня. Сьведчаць аб гэтым прабег І-га Усебеларускага Кангрэсу й тры Устаўныя Граматы Рады БНР.

Гэтыя складнікі й прынцыпы й сяньня згодны з духам часу й нашымі пажаданьнямі, але яны перакрэсьлівалі й будуць перакрэсьліваць далей імпэрыялістычныя пляны расейскай дыктатуры пралетар'яту й шавіністычнай Польшчы «людовай». І хоць гэтыя імпэрыялісты ў 1921 годзе падзялілі Беларусь між сабой, Ра-

да БНР і сама ідэя БНР засталіся пагрозьлівымі для іх і надалей.

Як бы там ня было, шэсьць дзяржаваў прызналі БНР. Рада й Урад БНР былі дзейнымі ў Коўне, у Празе й Бэрліне. Беларусы пад Польшчай падтрымлівалі БНР, а патаемна падтрымлівалі БНР і беларусы пад Саветамі.

Для бальшавіцкай Масквы Беларусь – гэта мост у Заходнюю Эўропу,асабліва ў іх кроках да сусьветнай рэвалюцыі. І таму бальшавіком было пажаданым зьнішчыць ня толькі існаваньне, але й саму ідэю беларускае дэмакратычнае дзяржаўнасьці.

Хоць у сваёй прапагандзе Масква цьвердзіла, што эмігранцкая БНР ня мае ніякага значэньня, у сапраўднасьці баялася дзейнасьці й уплываў Рады й Ураду БНР і за ўсякую цану пастанавіла зьнішчыць іх нават цаной уступак беларусам у БССР.

Вось чаму было абвешчана на ўвесь сьвет у пачаткыу 20-ых гадоў, што толькі ў БССР будуецца «Беларускі Дом» і што – у пашыраных тады межах – БССР ёсьць адзінай сапраўднай беларускай дзяржавай. І таму ж пачалася сапраўдная беларусізацыя БССР. Паміма прапаганды такія відавочныя факты, як пашырэньне межаў БССР і беларусізацыя яе, былі моцнымі аргумэнтамі за прызнаньне БССР беларускай дзяржавай.

Але ў сапраўднасьці гэта будаваньне «Беларускага Дому», як пабачым далей, аказалася пасткай для зьнішчэньня беларускага вызвольнага руху, а перадусім беларускага нацыянальнага актыву, што ачольваў гэты рух.

Усё гэта рабілася згодна з бальшавіцкай дыялектыкай «крок наперад – два назад». Тады пачалася ўзмоцненая кампанія за ліквідацыю Рады й Ураду БНР на эміграцыі. Праводзілася настырная прапаганда, каб сябры Рады й Ураду БНР ды іншыя беларускія эмігранты, уключна са студэнтамі, ня траціліна пуста час і энэргію, а зьмянялі палітычныя вехі ды ехалі ў БССР будаваць «Беларускі Дом», які чакае на іх – так патрэбныя беларускія культурныя сілы.

Прапаганда дала нязначныя вынікі. Толькі Цьвікевіч, Пракулевіч й Заяц паехалі з Прагі ў Бэрлін на скліканую там прадстаўнікамі БССР канфэрэнцыю, склаўшы перад выездам дэмісіі з займаных становішчаў на рукі Прэзыдэнта Крэчэўскага. Паехала й некулькі студэнтаў з Прагі дзеля цікавасьці. Там былыя міністры прызналі БССР і паехалі ў Менск.

Што далей зь імі сталася – нам ведама. Праз пару год былі яны замучаны ў бальшавіцкіх засьценках сьмерці. У міжчасе ўрад БССР абвесьціў на ўвесь сьвет, што Рада й Урад БНР ліквідаваліся й больш ня існуюць. Падае гэта й Беларуская Савецкая Энцыкляпэдыя (т. 2, б. 227).

Ды гэта была бязсорамная бальшавіцкая ілжа. Сябры Сакратарыяту не маглі ліквідаваць Раду й Урад БНР. Ластоўскі пераехаў з Коўна ў Менск незалежна ад іх на год пазьней. У Празе засталіся прэзыдэнт Пётра Крэчэўскі, ягоны заступнік Васіль Захарка, сакратар сельскай гаспадаркі Тамаш Грыб, прадстаўнік на Чэхаславакію М. Вяршынін, Я. Мамонька, П. Бадунова (лідар беларускіх эсэраў), Б. Русак, Ермачэнка, Шышкоўскі. Усе яны былі радныя БНР, як і цэлая група старэйшых студэнтаў зь Янкам Станкевічам і Ігнатам Дварчанінам начале. Дык было кім папоўніць сакратарыят, і Рада БНР была працаздольнай і чыннай, аж пакуль гітлероўцы не занялі Прагі. Па сьмерці прэз. П. Крэчэўскага ягонае мейсца заняў прэз. В. Захарка, які перад сьмерцяй перадаў старшынства прэз. Міколу Абрамчыку. Што было далей – вы ведаеце.

Нават, калі-б усе міністры паехалі ў БССР, і тады-б ня перастала існаваць Рада БНР, пакуль быў Старшыня Рады й была група радных, якімі можна было папоўніць сакратарыят.

Мы жывём у дэмакратычным сьвеце і ведаем, што калі нават увесь урад краіны адыходзіць – на яго месца галава дзяржавы паклікае новы ўрад. Дык бальшавіцкая ілжа пра ліквідацыю БНР увайшла ў канфлікт з прынцыпамі дэмакратычнага ладу.

У такой сытуацыі, як Рада БНР, знаходзіцца УНРада, Польскі ўрад у Лёндане й іншыя ўрады паняволеных народаў. Таму трэба дзівіцца, што на эміграцыі знайшлася група беларусаў, якая ўпарыста паўтарае бальшавіцкую ілжу, што Рада БНР ня існуе, што яна ліквідаваная.

Адначасна з прапагандай аб ліквідацыі БНР і ўпэўніўшыся, што беларуская незалежніцкая дзейнасьць звонку ім ужо не пагражае, бальшавікі распачалі вострае змаганьне з усім тым, што магло спрычыніцца да незалежнай беларускай дзяржаўнасьці ў межах БССР. У 1929 годзе пачалі пагром г. зв. «нацдэмаўшчыны». На працягу доўгага часу праводзілі масавыя арышты беларускай інтэ-

лігэнцыі й сялян, ачышчалі зь беларускага нацыянальнага духу школьніцтва й Менскі ўнівэрсытэт, нішчылі беларускую культуру й дзеячоў яе. Нават грамадаўскія паслы ў польскі сойм і сябры КПЗБ, што папалі ў БССР з Заходняй Беларусі, былі зьнішчаны.

І тут, як згаварыўшыся, Польшча дапамагала бальшавіком у зьнішчаньні беларускай інтэлігэнцыі. Яна стварала для яе немагчымыя жыцьцёвыя варункі ў Заходняй Беларусі, дык тая шукала выхаду з цяжкой сытуацыі ў Саветах, а там, замест лепшай сытуацыі, трапляла ў савецкія лягеры сьмерці. Пераканаўшыся, што ніхто не становіцца ў абарону беларусаў, польскія ўлады пазачынялі ўсе беларускія школы й арганізацыі ды стэрарызавалі ўсякую беларускую нацыянальную дзейнасьць.

А ў часе апошняй вайны палякі – былыя ўрадаўцы ў Заходняй Беларусі – паддабраліся немцам, каб трапіць у паліцыю ці нямецкія ўстановы, дзе рабілі даносы на беларусаў, што яны камуністы, каб немцы іх зьнішчалі.

Як было пад нямецкай акупацыяй, вы ведаеце лепш за мяне. Добра, што была БЦР і дбала пра ўсё беларускае й рабіла, што магла. Але БЦР была толькі адміністрацыйнай інстытуцыяй, падпарадкаванай нямецкай вайсковай уладзе, а не дзяржаўным ворганам хоць бы ў такой ступені, як урады Славацкі й Харвацкі. І паклікана БЦР была пры канцы 1943 г., калі ў немцаў ня было ўжо ніякай надзеі на перамогу. Беларусы ў часе апошняй вайны пацярпелі найбольшыя страты ў людзях і маёмасьці за ўсе іншыя народы. Спрычыніліся да гэтага: геапалітычнае палажэньне Беларусі, нямецкая палітыка тварэньня «лебэнсраўму», вынішчаньне беларусаў бальшавікамі, але й наша слабая арганізованасьць.

З усяго вышэй сказанага бачым, што цяжкія шэсьцьдзесят год мела Беларуская Народная Рэспубліка. Хоць змаганьне за яе вызваленьне – у тэй, ці іншай форме, у тым ці іншым часе й мейсцы – ня спынялася, і мы маглі навучыцца, як трэба вясьці гэта змаганьне, **галоўнае наша заданьне наперадзе.**

Пацяшаючым усё ж ёсьць тое, што вольны дэмакратычны сьвет лепш пазнаў і адчуў пагрозу бальшавізму ўсяму сьвету, дык змушаны будзе мацней ёй супрацьставіцца, і мы знойдзем у яго лепшае зразуменьне й падтрыманьне ў нашай справе, якая сталася ўжо міжнароднай і мусіць завяршыцца поўным вызваленьнем Беларусі.

ЖЫВЕ ВОЛЬНАЯ Й НЕЗАЛЕЖНАЯ БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА!


СЛАВА ЗМАГАРОМ ЗА ЯЕ ВЫЗВАЛЕНЬНЕ!

Жадаю шмат удачы 13-ай Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі.

В. Жук-Грышкевіч
Старшыня Рады БНР.»



На 13-ай Сустрэчы БПА ў Таронта ў часе застольнай бяседы. Зьлева на права: др. Раіса Жук-Грышкевіч, Мітрапаліт БАПЦ Уладыка Андрэй, Старшыня Рады БНР др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч, паэтка Наталья Арсеньнева. БР-ГЦ у Таронта, 3-га верасьня, 1978.



Рагнеда Аляхновіч, дачка Вінцэнта Жук-Грышкевіч з дочкамі Арыяднай і Алёнай, Менск, 1978.

Беларуская Замежная Пошта

Каб адзначыць 60-я ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі Актам 25 Сакавіка, ганаровы грамадзянін Беларускай Народнай Рэспублікі сп. Гай дэ Пікарда, юрыст па прафэсіі, пляную арганізаваць прыватную юбілейную пошту. Ды для апэраваньня яе патрэбны яму дазвол – ліцэнцыя Ураду БНР, бо ў Англіі, дзе ён жыве, гэта правам дазволена. І вось-жа ў сваім лісьце да Старшыні Рады БНР ён між іншага піша:

«60th Jubilee Postal Service 1978

To mark the 60th anniversary of BNR it is proposed to run a private jubilee postal service for one or two days from London to Paris, and from London to, say, Manchester. Existing English legislation permits the operation of private delivery services of this kind, provided that in time and scope they do not impinge upon the Post Office's monopoly. Would the BNR be prepared to grant such a postal service (which would in effect be the old Pošta ZBVB), a limited licence to operate "na čužynie" for a period of, say, one week? Such a service would

continue the tradition of a separate Byelorussian service, and would, apart from providing an interest for philatelists, be a useful propaganda venture. If a licence is granted, it could be granted to Mr. Michaluk in the form of a letter signed by the appropriate authority, perhaps in the form enclosed herewith."

Ліцэнцыю для апэраваньня «**Юбілейнае Пошты БНР 1918-1978**» ніжэй паданага зьместу Старшыня Рады БНР др. В. Жук-Грышкевіч выдаў 30-га траўня, 1978 году:

"RADA OF THE BYELORUSSIAN DEMOCRATIC REPUBLIC (in Exile)

54 Mary Street
Barrie, Ontario
Canada, L4N 1T1

30th May 1978

Guy de Picarda, Esq.
The Cloisters
Temple
London, E.C.4.
Great Britain

Dear Sir:

B.N.R. Jubilee Postal Service
1918-1978

Subject to existing legal regulations governing postage between England and other countries, or internal postage in the United Kingdom, you are hereby granted a limited licence to operate a commemorative postal service as an overseas agency of the B.N.R., for a period not to exceed three days running consecutively or otherwise, and not extend beyond 31st December 1978. It is understood that this licence is granted on the exclusive liability of the postal service concerned.

Yours faithfully,

Vincent Žuk-Hryškievič
President»

Ліцэнцыя была далучана да ліста наступнага зьместу:

«СТАРШЫНЯ РАДЫ БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ
President of the Rada of the Byelorussian Democratic Republic (in Exile)

54 Mary Street
Barrie, Ontario
Canada L4N lTl

30 траўня 1978.

Спадар Гай дэ Пікарда
The Cloisters, Temple
London, E. C. 4.
Great Britain

Вельмі Паважаны й Дарагі Спадар Пікарда!

Маё прызнаньне Вам, Грамадзяніну Беларускай Народнай Рэспублікі, прыяцелю беларускай калёніі ў Вялікай Брытаніі, ды шчыра дзякую Вам за, як мне ведама, частую фаховую параду й канкрэтную дапамогу пры шматлікіх нагодах!

Вашае зацікаўленьне рознымі аспэктамі нашага беларускага жыцьця й актыўны ў ім удзел мы высока цэнім і лічым за гонар мець Вас як нашага прыяцеля.

Дзякую за фаховую рэдакцыю далучанага афіцыйнага ліста адносна юбілейных паштовых марак ды за самую ідэю іх выданьня

Я асабіста ніколі ня меў філятэлістычных зацікаўленьняў й нажаль ні ў чым не магу Вам памагчы – даць адказ на Ваш апытальнік. Як Вам хіба ведама, у нас спадар Часлаў Будзька з гэтымі справамі найбольш азнаёмлены.

Калі-б выданьне Юбілейных Паштовых Марак БНР было зрэалізавамым, мы асабіста хацелі-б набыць іх якую сотню, калі гэта магчыма.

З найлепшымі пажаданьнямі й шчырымі прывітаньнямі Вам з сям'ёй, ад нас абоіх –

З пашанай да Вас,

Вінцэнт Жук-Грышкевіч»

У лісьце з 28-га чэрвеня 1978 году сп. Пікарда піша:

"Dear Dr. Žuk-Hryškievič,

I now enclose for your approval the art-work for a proof stamp with a blank left in the base for values to be inserted as appropriate. These will be expressed in numbers only... There will be four values:

5.....red
10.....blue
25.....yellow
50.....green

I am having 5.000 of each printed, and they will then be overprinted as required. For the BNR diamond jubilee service the following surcharge will appear:

Юбілейная
пошта
1918-1978

The British Post Office has given clearance for the carriage of newspapers and parcels, but expresses reservations about letters unless it can be established that they are carried at the request and under the orders of the sender. This can be achieved, I think, by affixing a small instruction sticker signed by the sender: "BZP Private Messenger for (signature of sender)." I am in correspondence with several American philatelists who are interested in Byelorussian stamps. Also Stanley Gibbons Catalogue are asking me to write a short note for inclusion in their catalogue on "Asobny Atrad BNR." There does appear to be a growing interest in Byelorussian postage particular since it became known that the BSSR also produced "provisional" stamps in 1921-1922. We may yet see Byelorussia properly treated – at least among philatelists!

I hope you like the enclosed design.

With kind regards,
Yours sincerely,

Guy de Picarda

Dr. V. Žuk-Hryškievič
54 Mary Street
Barrie, Ontario, Canada."

«СТАРШЫНЯ РАДЫ БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ
President of the Rada of the Byelorussian Democratic Republic (in Exile)

54 Mary Street
Barrie, Ontario
Canada L4N 1T1

8 ліпеня, 1978.

Яго Міласці Спадару Гай дэ Пікарда
The Cloisters, Temple
London EC4Y 7AA
Great Britain

Вельмі Паважаны й Дарагі Спадар Пікарда,

Шчыра ўдзячны Вам за лісты з 20-га й 22-га чэрвеня ды за надасланы праект юбілейных марак БНР.

З самой задумай тэмы, яе мастацкім афармленьнем ды добра абдуманым спосабам выданьня марак я ўсёцэла згодны й ахвотна даю Вам сваю апрабату.


Цешуся, што, дзякуючы Вам, дыямэнтавы юбілей Беларускай Народнай Рэспублікі будзе адзначаны ў шырэйшым засягу, бо ў пэўнай меры й філятаэлістамі сьвету, што ў гэткі спосаб павялічыцца прапаганда БНР. Цешуся, што «Беларуская Замежная Пошта» выдала й значкі «Лятунская Пошта» – "For a Free Byelorussia." Цешуся з актыўнасьці грамадзян БНР у Ангельшчыне.

Найлепшыя пажаданьні й сардэчныя прывітаньні ад нас абоіх –

З глыбокай да Вас пашанай,

Ваш
Вінцэнт Жук-Грышкевіч
Старшыня

Guy de Picarda, Esq.
The Cloisters
Temple
London, EC4Y 7AA"



Юбілейныя маркі Рады БНР. 1978.

"MEDUNARODNI SLAVISTICKI KONGRES
ZAGREB – LJUBLJANA 3-9. IX. 1978.

Hotel Seplamair, Zagreb.

6/9/1978

Dear Dr. Žuk-Hryškievič,

I thought you might be interested to receive greetings from Zagreb with a few specimens of stamps.

The Congress has been going very well. Professor McMillin and Shirin Akiner are reading papers on Byelorussian subjects and a Ukrainian from Munich has (presented? – illegible, R. Ž.-H.) a paper on Maxim Bahdanovic and Ukrainian Literature. Fr. Nadson is also here staying at the Theological Institute. He is proving a great success with the Scholars from Minsk such as Naumienka, Biryła, Adamovič and Suprun. I was able to buttonhole Professor Sudnik, a member of the International Committee of Slavists (he is staying in this hotel), and asked him whether it was not high time to "rehabilitate" Aleś Harun, since this persistant "boycotting" of an excellent poet was becoming something of a laughingstock among Slavists. He made a note of my remarks, though whether for the AN-BSSR or some other Committee I know not. We shall see.

The weather is hot, the food (indigestable? – illegible, R. Ž.-H.), but the company excellent. We are having a most enjoyable time.

With kindest regards,
Yours sincerely,

Guy de Picarda"

БЗП – (Беларуская Замежная Пошта)

"18th September 1978

My Dear Dr. Žuk-Hryškievič:

B.N.R. Jubilee Post

I enclose for your reference herewith a number of the recently printed stamps of the Biełaruskaja Zamiežnaja Pošta, including those which have been overprinted for use as a commemorative issue of the B.N.R. These letters are, as you know, a very limited issue: it has not yet been decided on what three days the service will make use of them, though two likely dates are the Słucak Uprising and Christmas.

B.Z.P. Dispatch Co. has been officially registered as a delivery service with the Registrar of Business names in London under the number RBN2305515. A number of additional postal stationery (stickers, postcards, envelopes) items will shortly be

made available. Insofar as the stamps are concerned, a double quantity of the brown/red 5-hr. has been produced as the printers failed to adhere to colour specifications; the first run was a dull brown instead of a brick or chestnut red, as you see from the enclosed specimens.

Among the sheets you will find three cancelled "par complaisance," as they say, to illustrate the postmarks of the London (60 Quentin Road SE13), Dublin (28 Exchequer Street 2) and Paris (65 rue des Gravillières) offices of BZP. I enclose also a draft of a notice relating to the nature of the service offered. If you think it appropriate, perhaps you could pass it on to Dr. Stankievic for gazetting in "Bielarus." A number of deliveries was effected at the Zagreb Congress, either through couriers, or by courier and ordinary post. It may be some time before any publicity is achieved.

In the meantime, may I request you to return to me one of the sheets of stamps, with the BNR overprint, duly cancelled with the official seal of the Byelorussian Rada in exile as a record of your approval? I should be grateful.

With every best wish,

Yours sincerely,

Guy de Picarda

Dr. V. Žuk-Hryškievič
54 Mary Street
Barrie, Ontario
Canada."

Беларуская Замежная Пошта
Reg. No. RBN 2305515

B.Z.P. DISPATCH COMPANY, otherwise BIEŁARUSKAJA ZAMIEŽNAJA POŠTA is a duly registered business enterprise which came into being in May 1978, and commenced its activities officially on 19th August of that year.

The objects of the enterprise are to provide a service for the delivery of parcels, packages, newspapers, circulars, and suject to certain conditions, private messages or letters, in particular between Byelorussian organizations and individuals resident overseas. B.Z.P. aims to maintain the tradition of an indepen-

dent postal delivery service, subject to local legal restrictions imposed to preserve national postal monopolies.

The enterprise has its registered office in London (Great Britain) at 60 Quentin Road, London SE13. It has subsidiary offices in Dublin (Eire) and Paris (France). Deliveries are effected by courier, or by a combination of courier and local postal services at the user's option. Delivery charges are fixed in accordance with a scale, details of which are available on application to the Company's registered office. Receipt stamps are affixed to any item carried as evidence of payment by the sender of the appropriate delivery charge.

All enquiries concerning services and stationery should be addressed to:

The Administrator
Biełaruskaja Zamiežnaja Pošta
60 Quentin Road, London, SE13.

«РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ
Rada of the Byelorussian Democratic Republic
(in Exile)

54 Mary Street
Barrie, Ontario
Canada L4N 1T1

26 верасьня, 1978.

Высокапаважаны й Дарагі Спадар Пікарда!

Міла й цікава было атрымаць ад Вас ліст з Загрэбу, з 8-га Міжнароднага Кангрэсу Славістых ды першыя ластаўкі марак Беларускай Замежнай Пошты.

Факты, што на Кангрэсе былі чытаны працы на беларускія тэмы ня толькі славістамі з Менску, але й з Англіі, ды што ў Кангрэсе бралі ўдзел беларусы й прыяцелі беларусаў з за мяжы, для нас бязумоўна важныя й карысныя. Прафэсар Суднік напэўна быў, магчыма й прыемна, уражаны тым, што беларуская літаратура й беларускія пісьменьнікі знаходзяць зацікаўленьне, а то й падтрымку, у ангельцаў. Добра, што беларускія вучоныя зь Менску мелі сутык з айцом Надсонам. Карысьць з гэтага для абоіх бакоў, а перадусім для Менчукоў.

Сяньня-ж атрымаў і Ваш ліст з 18-га верасьня, далучаны да яго камунікат Канторы Беларускай Замежнай Пошты ў Лёндане, ды 23 лісты (па 50 штук кожны) марак Беларускай Замежнай Пошты. Зь іх 8 лістоў юбілейных марак БНР з напісам на кожнай «**Юбілейная Пошта БНР. 1918-1978**». Шчыра за ўсё дзякую.

Маркі прыгожыя, асабліва сінія й чырвоныя, а зь юбілейных – жоўтыя й зялёныя. Юбілейныя маркі БНР, ды наагул БЗП – задума дасканалая й добрае яе выкананьне. Віншую працаўнікоў Беларускай Замежнай Пошты, а перадусім Вас, яе арганізатара й спірытус мовэнс. Заслугоўваюць на ўвагу й пячаткі канторaў БЗП у Лёндане, Парыжы й Дубліне.

Фатакопіі Камунікату Беларускай Замежнай Пошты разам з эгзэмплярамі марак і сваім лістом высылаю праф. А. Адамовічу, др. Я. Запрудніку дзеля інфармацыі, ды ў газэты «Беларус» і «Беларускі Час» для апублікаваньня.

Прашу Вас прысласць і ўсякія іншыя выданьні БЗП, як наклейкі, паштоўкі, канвэрты. Добра было-б ведаць ды падаць у беларускай прэсе цэны лістоў марак, ды іншых паштовых выданьняў.

У доказ апрабаты юбілейных марак БНР далучаю, як Вы прасілі, адзін ліст гэтых марак, адштэмпляваны пячаткай БНР.

Будзьце ласкавы паведаміць нас, які грашовы ўклад належыцца на справу выданьня й распаўсюджваньня беларускіх паштовых марак ад Рады БНР і ад нас з жонкай? Якую эвэнтуальную цану жадаць ад нашых людзей, сярод якіх будзем распаўсюджваць маркі Беларускай Замежнай Пошты? Колькі Вы выдалі гэтых марак і колькі іх, на Вашу думку, трэба будзе распаўсюдзіць (асабліва марак з юбілейным напісам)?

З найлепшымі пажаданьнямі
й глыбокай да Вас пашанай,

Ваш
Вінцэнт Жук-Грышкевіч
Старшыня Рады БНР

Guy de Picarda, Esq.
The Cloisters
Temple
London, EC4Y 7A»

«РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ
Rada of the Byelorussian Democratic Republic
(in Exile)

54 Mary Street
Barrie, Ontario
Canada L4N 1T1

13 кастрычніка, 1978.

Высока Паважаны й Дарагі Спадар Пікарда!

На днях атрымаў ад Вас ліст з 3-га кастрычніка й далучаныя паштовыя наклейкі БЗП, за што шчыра дзякую. Сьпяшаю безадкладна Вам хоць коратка адказаць, бо ў наступным тыдні ў нас паштавікі йдуць на штрайк, ня ведама на як доўга мы будзем адрэзаны ад сьвету.

Бязумоўна будзем Вам удзячны, калі прышлеце нам, Радзе БНР, траціну выданых Вамі юбілейных марак БЗП. Мы ім дамо ход, і яны адыграюць сваю ролю. Калі добра Вас зразумеў, гэта будзе каля 60-ці лістоў?

З Вашага ліста мне трудна было зарыентавацца, які ёсьць кошт, скажам, аднаго ліста марак. Ведаю, Вы ветліва кажаце, што беларускае грамадзтва за мяжой ня ёсьць перад Вамі забавязана. Я ўважаю, што яно ёсьць забавязана, і то ня толькі грашова! І я ўпэўнены, што беларусы за мяжой дацэньваюць Ваш уклад на карысьць беларускай справы.

Далучаю да ліста грашовы пераказ на $225.00 за ласкава надасланыя Вамі нам 22 лісты беларускіх марак, у тым ліку 8 лістоў юбілейных, і пачтовыя наклейкі. Запраўды ня ведаю, ці мяркаваньне маё справядлівае. Быў бы ўдзячны, калі-б Вы паказалі на маю памылку.

З найлепшымі пажаданьнямі й прывітаньнямі ад нас абоіх застаюся

Ваш

Вінцэнт Жук-Грышкевіч
Старшыня Рады БНР

Guy de Picarda, Esq.
The Cloisters, Temple
London, EC4Y 7AA
Great Britain»

На жаданьне Спадара Пікарды даход з прадажы марак павінен ісьці на карысьць Скарбу Рады БНР.

26-га верасьня Старшыня Рады БНР паведамляе сп. Пікарду аб тым, што: «Фатакопіі Камунікату Беларускай Замежнай Пошты разам з экзэмплярамі марак і сваім лістом высылаю праф. А. Адамовічу, др. Я. Запрудніку дзеля інфармацыі, ды ў газэты «Беларус» і «Беларускі Час» для апублікаваньня».

У нумары «Беларуса» за лістапад-сьнежань 1978 году падана кароткая зацемка:

«Беларуская Замежная Пошта

Пад гэткім назовам зарэгістраванае сёлета ў травені ў сталіцы Вялікабрытыяніі Лёндане незалежнае прадпрыёмства (паангельску: B.Z.P. Dispatch Company), якое пачало сваю дзейнасьць афіцыйна 19 жнівеня 1978 году.

Мэта Беларускае Замежнае Пошты (БЗП) – забясьпечыць пастачаньне пачкаў, газэтаў, абежнікаў ды, пры пэўных умовах, прыватных паведамленьняў і лістоў, упаасобку паміж беларускімі арганізацыямі й асобамі. БЗП мае канторы ў Лёндане, Дубліне (Ірляндыя) й Парыжы (Францыя). Пастачаньне пасылак забесьпячаецца кур'ерамі або камбінацыяй кур'ераў і мясцовае паштовае службы. БЗП мае свае маркі, пячаткі й налепкі ў ангельскай і беларускай мовах.

Па ўсе далейшыя інфармацыі трэба зварачацца на адрас:

The Administrator
Biełaruskaja Zamiežnaja Pošta
60 Quentin Road
London, SE 13 (England)»

(«Беларус», Нью Ёрк, 159-260, 1978)

Дзіўна, што ў зацемцы ані слова пра 60-ці гадовы юбілей Беларускай Народнай Рэспублікі, для адзначэньня якога, у гонар якога арганізавана была: «Юбілейная Пошта БНР 1918-1978», ані слова пра юбілейныя маркі БНР...

На пачатку лістапада Старшыня Рады БНР атрымаў наступнага зьместу прывітаньне:

«БЕЛАРУСКАЯ ЗАМЕЖНАЯ ПОШТА

Greetings on the occasion of the first operative day of the BNR Jubilee Postal Service 1918-1978.

The Administrator

20-X-1978"

18-га сьнежня, 1978 году аўтар гэтых радкоў піша ліст да Старшыні Сэктару Рады БНР у Канадзе сп. М. Ганька:

Вельмі Паважаны Сп. Старшыня:

Як Вам ведама, адным із спосабаў адзначэньня 60-тых угодкаў БНР было заснаваньне Беларускай Замежнай Пошты з галоўнай яе канторай у Лёндане ў Англіі. БЗП выдала Юбілейныя Маркі БНР. Некаторыя зь іх маюць напіс: «**Юбілейная Пошта БНР 1918-1978**», некаторыя такога напісу ня маюць.

Большую колькасьць гэтых марак Старшыня Рады БНР атрымаў на рукі толькі 15 сьнежня, 1978. Дзеля таго толькі ўчора й сяньня рассылаю іх па ўсіх сэктарах Рады БНР дзеля распаўсюджваньня марак сярод беларусаў.

Вам залучаю 90 марак з юбілейным напісам й 125 без такога напісу. (Зь юбілейным напісам марак ёсьць куды меней.)

Маркі прадаваць па 20 цэнтаў кожную. Прыход з прадажы марак пойдзе ў Скарб Рады БНР. Калі-б хто быў зацікаўлены купіць адзін аркуш – 50 марак, цана яго была-б $8.00.

Мы абое жадаем Вам і спадарыні Марыі Вясёлых Каляд і Шчасьлівага Новага Году!

З прывітаньнем,

Р. Жук-Грышкевіч
Сакратар Сэктару Рады БНР у Канадзе.

* * *

15-я Юбілейная Сэсія Рады БНР

15-я Юбілейная Сэсія Рады БНР адбылася 25-га лістапада 1978 году ў будынку Фундацыі Крэчэўскага, 166-34 Gothic Drive, Jamaica, New York, 11432, USA.

У сваім дакладзе з дзейнасьці Рады БНР на працягу 60-ці год, ды асабліва ў пэрыядзе між двума апошнімі войнамі, Старшыня Рады БНР др. В. Жук-Грышкевіч паказаў хвальшывасьць бальшавіцкай прапаганды, быццам бы БНР пасьля І-ай Сусьветнай вайны зьліквідавалася. Прапаганда гэта пранікае ў беларускае грамадзтва за мяжой і выкарыстоўваецца БЦР-аўцамі, якія, фаварызаваныя газэтай «Беларус», паўтараюць: раз БНР зьліквідавалася, застаецца толькі створаная гітлероўцамі БЦР. І хоць так казаць могуць толькі людзі палітычна няграматныя, усё-ж такое прапаганды ігнараваць нельга.

Ды ня гледзячы на ўсякага роду шкодніцтва, дзякуючы дзейнасьці Рады БНР і БНР-аўцаў, беларуская вызвольная справа здабывае ў сьвеце ўсё мацнейшыя пазыцыі.

Сёлета ўгодкі аднаўленьня незалежнасьці Беларусі былі адзначаныя юбілейным прыняцьцем у Вашынгтоне з прысутнасьцьцю амэрыканскіх сэнатараў і кангрэсмэнаў, прадстаўнікоў уладаў ды іншых народаў.

У Англіі 60-я ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі былі адзначаны ўрачыстым прыняцьцем у Палацы Лёрдаў, у Вэстмінстэр Палацы ў Лёндане, ды сарганізаваньнем ганаровым грамадзянінам БНР сп-ром Гай дэ Пікардам, у паразуменьні із Старшынёю Рады БНР, Юбілейнай Пошты БНР у Англіі з галоўнымі яе паштовымі канторамі ў Лёндане (Англія), Парыжы (Францыя) і Дубліне (Ірляндыя). Беларуская Замежная Пошта выдала юбілейныя маркі чатырох дэнамінацыяў. Матывам марак ёсьць Пагоня, напіс БЕЛАРУСЬ ды адна з лічбаў – 5, 10, 25 або 50. Колеры марак – чырвоны, сіні, жоўты й зялёны. Частка марак кажнай дэнамінацыі мае напіс: «Юбілейная Пошта Б.Н.Р. 1918-1978». Беларуская Замежная Пошта афіцыйна зарэгістравана ў Лёндане, Англіі, пад нумарам РБН2305515.

Заснаваны ў лютым гэтага году ў Канадзе «Выдавецкі Фонд Успамінаў зь Беларускага Жыцьця», апрача брашуры «25 Сакавіка», перавыдаў выданую ў 1919 годзе ў Бэрліне карту Беларускай Народнай Рэспублікі.

Ад Галоўнай Управы Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня вітаў Сэсію старшыня яе сп. Антон Шукелойць. Ён дзякаваў Прэзыдыюму Рады БНР за субсыдыю, дзякуючы якой БАЗА адзначыла 60-я ўгодкі абвешчанья незалежнасьці БНР імпрэзай у Вашынгтоне з удзелам кангрэсмэнаў й санатараў. Пра гэту імпрэзу сяньня піша «Зьвязда». БАЗА бярэ ўдзел у працы Канфэрэнцыі Вольных Беларусаў. Аддзелы БАЗА з асаблівай стараннасьцьцю адзначылі юбілей БНР.

Ад Галоўнай Управы Згуртаваньня Беларусаў Канады вітаў Сэсію заступнік старшыні ЗБК др. Барыс Рагуля.

Др. Янка Запруднік, вітачюы Сэсію ад Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ў Нью Ёрку, зазначыў, што Рада БНР стаіць на моцнай гістарычнай базе. Ён дзякаваў Радзе БНР за фінансавую дапамогу БІНіМ для выданьня прац з гісторыі БНР. Зазначыў таксама, што ў БССР ажывае вывучэньне гісторыі беларускага руху ў часе Першае Сусьветнае вайны.

Справу Канфэрэнцыі Вольных Беларусаў прадставіў старшыня яе др. Барыс Рагуля. Два гады таму назад прадстаўнікі балцкіх і ўкраінскае сусьветных арганізацыяў запрасілі беларусаў Канады далучыцца да іх, каб узяць удзел у апрацаваньні мэмарандуму да Галоўнае Асамблеі Задзіночаных Нацыяў у справе дэкалянізацыі Савецкага Саюзу.

У нарадах і працах прадстаўнікоў вышэй названых арганізацыяў, што адбываліся ў Таронта, Канадзе, ад беларусаў браў удзел сп. Паўлюк Пашкевіч, заступнік старшыні Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады, які ў гэтай справе стала канфэраваў з Старшынём Рады БНР др. В. Жук-Грышкевічам.

Дзеля сапраўднага ўдзелу беларусаў у гэтай справе патрэбна была нейкага роду сусьветная арганізацыя, стварэньне якой сталася сьпешнай неабходнасьцьцю. Пасьля паразумленьня з беларускімі арганізацыямі ў ЗША, Англіі, Нямеччыне й Аўстраліі створана была «Канфэрэнцыя Вольных Беларусаў», у якой Канаду рэпрэзэнтуе Каардынацыйны Камітэт Беларусаў Канады. У Управу «Канфэрэнцыі» ўвайшоў як сакратар сп. Паўлюк Пашкевіч, магістар палітычных навукаў (мае Master's Degree in Political Science), а на старшыню плянавалася некага з ЗША. Але таму, што ў ЗША такой асобы не знайшлі, функцыю старшыні прыняў другі беларус з Канады – др. Барыс Рагуля,

старшыня Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады.

У выніку двухгадовай працы прадстаўнікі 5-ёх сусьветных арганізацыяў апрацавалі й выдалі ў Таронта ў Канадзе мэмарандум у справе дэкалянізацыі Савецкага Саюзу, у форме кнігі на 150 бачын з далучанымі дакумэнтамі, скіраваны да Галоўнай Асамблеі Задзіночаных Нацыяў:

To THE UNITED NATIONS GENERAL ASSEMBLY **A RESOLUTION** with appended Documents concerning **THE DECOLONIZATION of the UNION OF SOVIET SOCIALIST REPUBLICS** submitted by **THE CONFERENCE OF FREE BYELORUSSIANS,** THE ESTONIAN WORLD COUNCIL, THE LITHUANIAN WORLD COMMUNITY, THE WORLD CONGRESS OF FREE UKRAINIANS, THE WORLD FEDERATION OF FREE LATVIANS. Toronto – New York, 1978.

20 лістапада, 1978 г., адбылася ў Нью Ёрку ў гэтай справе прэсавая канфэрэнцыя, а 22-га лістапада – перадача Мэмарандуму адпаведнай Камісіі Задзіночаных Нацыяў. Сябра Канадзкага Парлямэнту сп. У. Шымко пры гэтай нагодзе зазначыў, што гэта справа вялікай вагі й раней ці пазьней справа гэтага Мэмарандуму будзе пастаўлена на парадку дня Галоўнай Асамблеі.

(Паводле пратаколу 15-ай Юбілейнай Сэсіі Рады БНР, 25 лістапада, 1978).

75-ты Юбілей др. Вінцэнта Жук-Грышкевіча

Угодкавы Грамадзкі Камітэт на просьбу Юбіляра заснаваў ВЫДАВЕЦКІ ФОНД УСПАМІНАЎ ЗЬ БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ й выдаў адозву наступнага зьместу:

«Выдавецкі Фонд Успамінаў зь Беларускага Жыцьця

Дарагія Суродзічы!

10-га лютага 1978 году споўніцца 75 гадоў ад нараджэньня й 55 год нацыянальна-грамадзкай дзейнасьці др. Вінцэнта Жук-Грышкевіча, Старшыні Рады БНР.

На просьбу Юбіляра, Угодкавы Грамадзкі Камітэт заснаваў Выдавецкі Фонд Успамінаў зь Беларускага Жыцьця. Аб патрэбе й значэньні выдаваньня гэткіх успамінаў выясьняе сам Юбіляр у ніжэй паданым артыкуле.

У Выдавецкі Фонд Успамінаў зь Беларускага Жыцьця ўваходзяць, між іншымі: Старшыня Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ў Канадзе сп-ня Івонка Сурвіла ды старшыня Угодкавага Камітэту сп. Янка Сурвіла.

На жаданьне аўтараў успамінаў зь беларускага жыцьця БІНІМ у Канадзе ахвотна ўдзеліць ім фаховую дапамогу, а Выдавецкі Фонд Успамінаў будзе старацца выдаць іхнія працы друкам.

Кіраўніцтва Фонду будзе створана на агульным сходзе заснавальнікаў і ахвярадаўцаў, на якім мае быць прыняты й статут Фонду.

Заклікаем беларускае грамадзтва ўшанаваць 75-я ўгодкі ад нараджэньня й 55 год ахвярнае нацыянальна-грамадзкае працы Юбіляра. Ахвяры просім слаць на БІНІМ у Канадзе на адрас Старшыні Ўгодкавага Камітэту з зазначэньнем «На Выдавецкі Фонд Успамінаў зь Беларускага Жыцьця». Просім чэкі выпісваць на:

Byelorussian Institute of Arts and Sciences, Canada і высылаць на адрас:

Mr. Janka Survilla, Mountain Road, R. R. 2, Lucerne, Que., Canada, J9H 5E1.

Угодкавы Грамадзкі Камітэт»

(«Камунікаты» Рады БНР нр. 10, Бэры, Канада, 1978.)

«Пра мінуўшчыну – дзеля будучыні

Усім нам ведама, што Масква (як сваім часам і Варшава) заўсёды была супраць беларускай незалежнай дзяржаўнасьці й заўсёды старалася нішчыць нашы дзяржаўныя, нацыянальныя й культурныя вартасьці й выявы.

І не зважаючы на гэта, у XIX ст. пачалося беларускае нацыянальнае адраджэньне, якое расло з такой сілай і размахам, што ў 1917 годзе прывяло да беларускай нацыянальнай рэвалюцыі, якая завяршылася абвешчаньнем незалежнасьці Беларусі 25 сакавіка 1918 году. Сталася гэта дзякуючы таму, што ўсёй беларусчыны цары не змаглі зьнішчыць, бо яна жыла ў нетрах сялянскай масы.

Але па кастрычніцкім перавароце зьявіўся новы вораг беларускай дзяржаўнасьці, як і дзяржаўнасьці іншых нерасейскіх народаў былое Расейскай Імпэрыі, – расейскія

бальшавікі. Яны выявіліся больш зьнішчальнымі для ўсіх гэтых народаў, як расейскія цары.

Сваёй ідэялёгіяй хвальшывай свабоды для народаў і паасобных грамадзянаў бальшавікі, ці лепш – расейскія шавіністы пад гэтым назовам, праніклі ў самыя народныя нетры і, пад фірмай гэтак званай ленінскай нацыянальнай палітыкі, пачалі нішчыць ня толькі нацыянальную дзяржаўнасьць нерасейскіх народаў, але й русыфікаваць іхнюю нацыянальную культуру й нацыянальную сьведамасьць.

Яшчэ страшнейшым для нерасейскіх народаў сталася тварэньне з усіх народаў Савецкага Саюзу «**Аднаго Савецкага народу**», што значыць поўную русыфікацыю ўсіх нерасейскіх народаў. Мерапрыемства гэтае праводзіцца бальшавіцкай Масквой бесцырымонна ад часу пераможнага для яе заканчэньня Другой Сусьветнай вайны.

У выніку русыфікацыйных мерапрыемстваў нішчыцца ў беларускім народзе нацыянальная сьведамасьць, нішчыцца веданьне гісторыі Беларусі, недапушчаецца веда пра беларускае нацыянальнае адраджэньне й нацыянальны вызвольны рух. Недапушчаецца інфармацыя пра беларускае нацыянальнае жыцьцё ды пра беларускія школы й установы ў савецкай і заходняй Беларусі перад апошняй вайной.

Пройдуць яшчэ два-тры дзесяткі год, вымруць жывыя сьведкі беларускага жыцьця й зусім зьнікне памяць аб ім, быццам яго й ня было. І не застанецца ніякіх дадзеных з выяваў і фактаў гэтага жыцьця для гісторыі, навет, калі-б адбыліся ў Беларусі зьмены й паўсталі спрыяльныя абставіны для беларускае нацыянальнае працы.

Застаецца надзея на беларусаў у вольным сьвеце, надзея, што яны пакінуць аб'ектыўныя друкаваныя матар'ялы пра беларускае жыцьцё перад Другой Сусьветнай вайной і ў часе яе. Інакш і быць ня можа, бо-ж нашы суродзічы на бацькаўшчыне пры найлепшых здольнасьцях і ахвоце – пад савецкім рэжымам пісаць і друкаваць такіх матар'ялаў ня могуць.

Вось чаму група беларусаў у Канадзе заснавала ў лютым месяцы 1978 году **Выдавецкі Фонд Успамінаў зь Беларускага Жыцьця,** разьлічваючы на тое, што сярод беларускіх патрыётаў у вольным сьвеце шмат такіх, што змогуць напісаць свае ўспаміны зь беларускага жыцьця, а яшчэ больш такіх, што сваімі ахвярамі дадуць сродкі на

друкаваньне гэтых успамінаў, а ўжо выдаваньнем іх зоймецца наш Выдавецкі Фонд.

Заклікаю тых Паважаных Грамадзянаў, што могуць пісаць успаміны зь беларускага жыцьця, узяцца безадкладна за гэтую дабародную справу, а ўсё беларускае грамадзтва прашу складаць шчодрыя ахвяры на гэтую так важную мэту ды ўступаць у сябры Выдавецкага Фонду Успамінаў зь Беларускага Жыцьця.

Чэкі, з зазначэньнем «на Выдавецкі фонд» (Byelorussian Publishing Fund), а таксама рукапісы ці машынапісы ўспамінаў, просім слаць на:

Byelorussian Institute of Arts and Sciences, Canada, і адрасаваць на: Mr. J. Survilla, Mountain Rd., R.R. 2., Lucerne, Que., Canada, J9H 5E1; або: Dr. R. Žuk-Hryškievič, 54 Mary St., Barrie, Ont., Canada, L4N 1T1.

В. Жук-Грышкевіч
Старшыня Рады БНР»

(«Беларус», Нью Ёрк, 251, сакавік, 1978)

«Юбілей др. В. Жук-Грышкевіча

Ня кажнаму дадзена пражыць семдзесят пяць – асабліва, калі гэтыя семдзесят пяць прыпадаюць на гады дзьвюх сусьветных войнаў ды ўсялякага іншага ліхалецьця – а йшчэ менш каму ўдаецца ператрываць і вытрываць пяцьдзесят пяць з гэных семдзесят пяцёх пры грамадзка-нацыянальнай дзейнасьці. Доктару Вінцэнту Жук-Грышкевічу пашчасьлівіла ў першым выпадку, а беларускаму нацыянальнаму руху – у другім. З гэтых дзьвюх нагодаў, ці лепш – з гэтае аднае падвойнае нагоды і адбылася ў Нью Ёрку 19 лютага сёлета (1978, Р. Ж.-Г.), у Беларускім Рэлігійна-Грамадзкім Цэнтры ў Брукліне, урачыстая бяседа ў гонар Юбіляра й ягонае Спадарыні др. Раісы Жук-Грышкевіч. Арганізатарам урачыстасьці быў Прэзыдыюм і Сакратарыят Рады БНР.

Пасьля літургіі й малебну за Юбіляра, адслужаных а. Р. Войтанкам, у залі БРГЦ адбыўся банкет з лічным удзелам беларусаў Нью Ёрку, Нью Брансвіку ды ваколіцаў.

Прывітаўшы Юбіляра й ягоную Спадарыню ад імя арганізатараў урачыстасьці, др. Ян Запруднік прачытаў

прывітаньні ад герархаў Беларускае Аўтакэфальнае Праваслаўнае Царквы, якія ніжэй падаём:

Яго Міласьці
Старшыні Рады БНР
Вельмішаважанаму
Др. В. Жук-Грышкевічу

Вітаю Вас, Дастойны Сп. Старшыня, словамі апостала Паўла: «Заўсёды дзякую Богу майму за Вас з прычыны ласкі Божае, дадзенае Вам у Ісусе Хрысьце». (І. Кар. 1:4).

На працягу свайго цярністага жыцьця, Вы сваёю ахвярнаю працаю засьветчылі любоў да свайго народу й няхай гэтая любоў паланее заўсёды ў сэрцы й у дзеяньнях Вашых.

А Госпад Бог наш узмоцніць сілы Вашыя, каб яшчэ доўга ў добрым здароўі й радасьці натхнёна служылі Беларускаму народу, і Ласка Божая каб судзейнічала Вам!

Зь любоўю ў Хрысьце

✠ Мітрапаліт АНДРЭЙ

У Сакратарыят Рады
Беларускае Народнае Рэспублікі

Даведаўшыся, што Прэзыдыюм і Сакратарыят Рады БНР ушаноўваюць 75-годзьдзе жыцьця й 55-годзьдзе вызвольна-грамадзкае дзейнасьці др. Вінцука Жук-Грышкевіча, Старшыні Рады Беларускае Народнае Рэспублікі, хачу й я далучыцца да Вас, прызнаючы вялікую заслугу Юбіляра, які ўвесь час непахісна стаяў у вабароне 25 Сакавіка, правоў Беларусі й ейнага народу.

Толькі вялікая ягоная любоў да свайго Народу, іншымі словамі – вялікі патрыятызм, дала яму на ягоным цярністым жыцьцёвым шляху сілу й настойлівасьць праз увесь час працаваць на карысьць вызваленьня Беларусі.

А Вашай Міласьці, Дарагі Юбіляр, спакойнага, шчасьлівага жыцьця й добрага здароўя й радасьці ад душы жадаю НА МНОГІЯ ГАДЫ!

16 лютага 1978 г.
Таронта, Ант., Канада

З ласкі Божае Пакорны

Архіяпіскап МІКАЛАЙ

У духу гэтых двух прывітаньняў выступалі з прамовамі й успамінамі поўнымі цікавых фактаў зь беларускае мінуўшчыны й жыцьця Юбіляра ды жыцьця самых прамоўцаў, інж. В. Русак, інж. М. Гарошка, др. В. Тумаш, сп. А. Шукелойць, сп-ня Г. Русак, сп-ня М. Станкевіч, сп. У. Курыла, др. В. Кіпель. сп. Ф. Бартуль, праф. Ант. Адамовіч, сп. У. Русак, сп. Я. Сокал, а. Р. Войтанка.

Др. В. Жук-Грышкевіч падзякаваў ад свайго й жончынага ймя за прыняцьцё й пажаданьні ды заклікаў тых, хто выступаў, замацаваць свае ўспаміны ў друку. Юбіляр прачытаў свае ўспаміны пра сьвяткаваньне ў 1923 годзе ў Празе ўгодкаў 25 Сакавіка.

Група дзетак перадала Юбіляру й ягонай Спадарыні падарунак-альбом з вышытай беларускім вузорам вокладкай (праца сп-ні Ю. Андрусышын) і букет кветак.

Зачыняючы бяседу, др. Я. Запруднік падзякаваў спадарыням, якія рыхтавалі ежу для бяседы: В. Бартуль (кардынатарка), Н. Рагуля, А. Орса-Рамана, О. Запруднік, сп-ні Кажан.

Бяседа пачалася й закончылася бласлаўленствам, дадзеным а. Расьціславам, ды супольнай малітвай. **Я. З.**»

(«Беларус», Нью Ёрк, 251, сакавік, 1978)

«Францыя, Моншана, 10. 02, 1978.

Спадару Прэзыдэнту
Беларускай Народнай Рэспублікі.

Глыбокапаважаны й Дарагі нам усім,
Спадар В. Жук-Грышкевіч!

З нагоды Вашага Юбілею, 75-ці год жыцьця і 55-ці год грамадзкай дзейнасьці для дабра Беларускага Народу й Славы Бацькаўшчыны, мы, беларусы Ле Крэзо-Моншана-Монсо, жадаем Вам у гэты ўрачысты дзень доўгіх год жыцьця, сіл і мужнасьці несьці наш бел-чырвона-белы Сьцяг і

надалей у змаганьні за незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі аж да перамогі. Адначасна ўпэўніваем Вас у нашай поўнай адданасьці Радзе БНР і Яе Прэзыдэнту.

Памагай Бог! Жыве Вольная й Незалежная Беларусь!

Жыве Яе Прэзыдэнт!

За сяброў Радны Б.Н.Р.

Аўген Трусаў.»

«Падзяка

Ад шчырага сэрца дзякую ўсім Беларусам, што віталі мяне з 75-мі ўгодкамі майго жыцьця й 55-мі ўгодкамі беларускай нацыянальна-грамадзкай працы: Прэзыдыюму й Сакратарыяту Рады БНР, што 19-га лютага гг. зарганізавалі ў залі БАПЦ ў Нью Ёрку прыгожую ўрачыстасьць на мае ўгодкі з удзелам шматлікага Беларускага Грамадзтва; Яго Высока-Праасьвяшчэнству Мітрапаліту БАПЦ Андрэю за ўзьнёслыя прывітаньні й пажаданьні, якія былі прачытаныя на ўрачыстасьці; Яго Высокапраасьвяшчэнству Архіяпіскапу БАПЦ Мікалаю за шчыры прывітальны ліст, які таксама быў прачытаны на ўрачыстасьці; Яго Дастойнасьці Пратаярэю БАПЦ Айцу Васілю Кэндышу за ягонае пісьмовае прывітаньне; Дастойнаму Айцу Расьціславу Войтэнку – сьвятару БАПЦ за малебен за мяне й за «Многае лета», дзякую паважаным Гаспадыням і Гаспадаром, што так прыгожа прыбралі вялікую залю й накрылі даўжэзныя сталы, застаўляючы іх смачнай закускай і пітвом; дзякую др. Я. Запрудніку за кіраваньне ўрачыстасьцяй; дзякю ўсім прамоўцам, якія віталі мяне на ўрачыстасьці; дзякую за прыгожы падарак – альбом – хораша вышыты беларускімі ўзорамі – і дзеткам, усім чатыром, якія падалі мне гэты падарак, а маёй жонцы – кветкі. Дзякую ўсім Паважаным Спадарыням і Спадаром, што прынялі ўдзел у гэтай урачыстасьці.

Асобную падзяку складаю Паважаным Спадарыням і Спадаром у розных краінах, што прывіталі мяне пісьмова з маімі ўгодкамі адумысловымі карткамі. Шчыра дзякую ўсім!

В. Жук-Грышкевіч
Старшыня Рады БНР»

(«Беларус», Нью Ёрк, 251, сакавік, 1978)

«Абвестка

10 сакавіка гг. выходзіць з друку ў Таронта брашура «**25 САКАВІКА**», прысьвечаная 60-ым угодкам абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі. Зьмест: успаміны зь Менску, Будслава, Вільні, Прагі, савецкай турмы, дадаткі й карта Беларускай Народнай Рэспублікі. Выдае Выдавецкі Фонф Успамінаў зь Беларускага Жыцьця з дапамогай Рады БНР.

Цана брашуры 3.00 дал. плюс кошты перасылкі. Замоўленьні просім слаць на імя й адрас:

Dr. Raisa Žuk-Hryškievič, 54 Mary St., Barrie, Ont., L4N 1T1, Canada.»

(«Беларус»,Нью Ёрк, 251, сакавік, 1978).

Колькі тыдняў пазьней 75-я ўгодкі жыцьця Вінцэнта Жук-Грышкевча адзначала й сям'я дома ў Бэры. На ўрачыстасьці прымалі ўдзел, апрача звычайна прысутных ў такіх выпадках сяброў – паэткі Натальлі Арсеньневай, спстваў: Пашкевічаў, Сурвілаў, Рагуляў, Касьцюкевічаў, др. Я. Сажыча – Яго Эксцэленцыя Біскуп Часлаў Сіповіч, Апостальскі Візытатар для Беларусаў і старшыня Згуртаваньня Беларусаў у Вялікай Брытаніі сп. Ян Міхалюк, з сп-няй Лёляй Міхалюк з Лёндану, што ў Англіі. У часе застольнай бяседы сп. Міхалюк з прывітальным словам уручыў Юбіляру як падарак ад ЗБВБ нядаўна выданую кнігу:

"Die Literatur der Weissrussen. A History of Byelorussian Literature From its Origins to the Present Day, von Arnold B. McMillin. 1977. Wilhelm Schwartz Verlag in Giessen."

З наступнага зьместу дэдыкацыяй:

«Вельмі Паважанаму й Дарагому Прэзыдэнту Рады БНР, др. В. Жук-Грышкевічу, Закладчыку й Першаму Старшыні Згуртаваньня Беларусаў у Вялікай Брытаніі, з нагоды ягонага 75ці-годзьдзя Управа ЗБВБ разам з найлепшымі пажаданьнямі ахвяроўвае гэтую кнігу.»

Подпісы: Ян Міхалюк, А. Зданковіч, П. Наваро (й яшчэ два подпісы нячытэльныя, Р. Ж.-Г.), Лёндан, 25 Сакавіка, 1978 г.»

На другі дзень пасьля застольнай бяседы Я. Э. Біскуп Часлаў Сіповіч ў касьцёле Сьв. Марыі ў Бэры адправіў Сьв. Літургію на інтэнцыю Юбіляра, ягонае сям'і й усяго беларускага народу.

У гэтым жа 1978 годзе выйшла з друку і другая каштоўная, высока-мастацкага выданьня, аўтарства Біскупа Часлава Сіповіча, кніга:

"The Byzantine-Slavonic Liturgy of St. John Chrysostom" Edited with explanatory Liturgical Notes by Ceslaus Sipovic, Bishop of Mariamme, Apostolic Visitor of Byelorussians together with THE LIFE OF THEODORE SKUMINOVIC Bishop Gratianopolis Suffragan and Archdeacon of Byelorussia. The Francis Skaryna Byelorussian Library and Museum, London, 1978."

З нагоды Каляд Уладыка Сіповіч ласкава даруе нам гэтую цэнную кнігу з дэдыкацыяй:

«Дарагім Вінцуку й Раісе Жук-Грышкевічам, няўтомным змагаром за лепшую долю свайго народу, ахвярую з пашанай і любоўю – Аўтар ✠ Ч. Сіповіч, Каляды, 1978.»

XXIII. 1979-ты ГОД

У красавіку 1979 году Старшыня Рады БНР др. Вінцэнт Жук-Грышкешвіч адведаў беларускую калёнію ў Англіі з мэтай правядзеньня канфэрэнцыі эўрапэйскіх сэктараў Рады БНР.

«Канфэрэнцыя эўрапэйскіх сэктараў Рады БНР

21 красавіка 1979 году ў Лёндане (Ангельшчына) адбылася канфэрэнцыя эўрапэйскіх сэктараў Рады Беларускай Народнай Рэспублікі. Гэта ўжо другая такая канфэрэнцыя, скліканая зь ініцыятывы ейнага Старшыні др. В. Жук-Грышкевіча. (Першая нарада прадстаўнікоў эўрапэйскіх сэктараў Рады БНР адбылася, таксама ў Лёндане, 15 красавіка 1972 году).

У сёлетняй канфэрэнцыі прыймалі ўдзел прадстаўнікі ад сэктараў у Вялікабрытаніі (Лёндан, Манчэстар і Брадфард), Бэльгіі, Францыі й Нямеччыны, а таксама прадстаўнік Рады БНР у Гішпаніі. Канфэрэнцыя мела інфармацыйна-кансультатыўны характар. Яна пачалася каротка малітвай Уладыкі Часлава Сіповіча і хвілінай цішыні ў знак пашаны памяці радных, што адыйшлі нядаўна ў вечнасьць (палкоўнік Аўген Трусаў і інж. Мікола Гарошка). Пасьля прывітальнага слова Старшыні Рады БНР і абраньня сакратара канфэрэнцыі (была выбраная аднагалосна др. Раіса Жук-Грышкевіч), др. В. Жук-Грышкевіч запрапанаваў парадак дня канфэрэнцыі зь пяцёх пунктаў, які й быў адобраны ўдзельнікамі амаль што бязь зьменаў. Затым ён перайшоў да іх разгляду, пачынаючы ад інфармацыі пра сучасны стан Рады БНР. Ён адзначыў, што як і ў дзейнасьці любога дзяржаўнага арганізму, у дзейнасьці Рады БНР ёсьць плюсы й мінусы. Гэтыя апошнія выклікаюцца галоўным чынам з прычынаў часта ад нас незалежных, такіх, як, прыкладам, расьцярушанасьць нашай эміграцыі й радных па розных краінах і кантынэнтах, факт, які ня можа не адбіцца нэгатыўна на дзейнасьці Рады й ейных органаў. Аднак у параўнаньні із станам Рады БНР перад 10-ай сэсіяй Рады БНР у 1968

годзе сытуацыя зьмянілася на лепшае. За гэты пэрыяд ажывіліся сэктары Рады БНР і шмат было зроблена ў розных галінах нашага палітычнага, культурнага й грамадзкага жыцьця, а таксама й на міжнароднай арэне.

Сярод недахопаў Старшыня Рады адзначыў як галоўныя: адсутнасьць экзэкутывы Рады БНР і свайго прэсавага органу. У сувязі з гэтым апошнім пытаньнем адбылася дыскусія, у часе якой былі выказаны розныя меркаваньні й зроблены канкрэтныя прапановы. –

1. Аднэй зь іх было аднаўленьне газэты «Бацькаўшчына», выданьне якой было спыненае ў 1966 годзе. («Бацькаўшчына», між іншага, – гэта адзіная беларуская эмігрыйная газэта, пра якую, хоць і адмоўна, згадвае навет у сваім 2-ім томе на бачыне 189 «Беларуская Савецкая Энцыкляпэдыя», пры чым згадвае яе, як «орган Рады БНР»).

На канфэрэнцыі, апрача кароткіх справаздачаў пасобных прадстаўнікоў эўрапэйскіх сэктараў Рады БНР, абмяркоўваліся таксама іншыя пытаньні;

2. як ажыўленьне дзейнасьці сэктараў;

3. дзейнасьць радыя «Свабода» й пытаньне беларускай нацыянальнай тэматыкі беларускай сэкцыі радыя;

4. дзейнасьць сяброў Рады на міжнароднай арэне і ішыя.

5. Было выказанае пажаданьне, каб з мэтаю больш скаардынаванай дзейнасьці й дзеля ўтрыманьня больш цесных кантактаў часьцей склікаліся сустрэчы эўрапэйскіх сэктараў.

6. Заступнік Старшыні Рады БНР на Эўропу сп. Уладзімір Бортнік паінфармаваў пра ўдзел радных у канфэрэнцыі швайцарскай арганізацыі «Канфэрэнцыя Людзкіх Правоў і Самавызначэньня», якая адбылася ў студзені мінулага году ў Люцэрне, ды пра рэакцыю ў БССР на выступленьні беларускага дэлегата (сп. Уладзіміра Бортніка).

7. Пра дзейнасьць Беларускай Сэкцыі Радыя «Свабода» паведаміў др. В. Сенькевіч, які адзначыў тыя цяжкасьці, што існуюць часамі ў штодзённай працы, ды падчыркнуў патрыятычнасьць і самаахвярнасьць ейных супрацоўнікаў.

8. На заканчэньне было закранута пытаньне летувіскіх самавыдавецкіх матарыялаў, якія нядаўна трапілі на Захад і ў якіх гаворыцца пра «дыскрымінацыю летувісаў у БССР». Матарыялы гэтыя актыўна пашыраюць летувіскія эмігранты, якія выкарыстоўваюць іх для сваіх палітыч-

ных мэтаў. У рэпартажы, загалоўленым «Палажэньне летувісаў у Беларускай ССР», у прыватнасьці, кажацца, што з мэтай дэнацыяналізацыі летувісаў у БССР ім забараняецца мець свае школы, займацца культурнай дзейнасьцьцяй, мець сваіх сьвятароў і г. д. (згаданы рэпартаж быў выдадзены самвыдавецкім спосабам у Вільні й датуецца 1978 годам). Прысутныя на канфэрэнцыі былі азнаёмленыя з тэкстам зацемкі-камэнтару, якая была перададзеная радыём «Свабода» на бацькаўшчыну і ў якой быў дадзены адказ на закіды летувіскіх дысыдэнтаў. У згаданай зацемцы-камэнтары, між іншага, адзначалася, што палітыку нацыянальнай дыскрымінацыі савецкія ўлады праводзяць ня толькі ў дачыненьні да летувіскае мяншыні ў Беларусі. Такую-ж дыскрымінацыю церпіць і беларуская мяншыня ў ЛітССР, дзе нават паводля савецкага перапісу жыхарства 1970 году 45,5 тыс. асобаў падалі сваю нацыянальнасьць як «беларускую». (Паводля таго-ж самага перапісу ў Беларускай ССР усяго каля 8-мі тысячаў чалавек падалі сваю нацыянальнасьць, як «летувіскую»). У ЛітССР існуюць, апрача летувіскіх, таксама расейскія й польскія



Удзельнікі Канфэрэнцыі Эўрапэйскіх Сэктараў Рады БНР у садзе Беларускай Бібліятэкі й Музэю імя Франьціška Скарыны ў Лёндане, Англія. У першым радзе зь лева на права: А. Лашук, Біскуп Часлаў Сіповіч, Апостальскі Візытатар для Беларусаў, др. Р. Жук-Грышкевіч, Старшыня Рады БНР др. В. Жук-Грышкевіч, Ул. Бортнік, Л. Шыманец. Красавік, 1979.

школы, аднак там няма беларускіх, як таксама няма ніякіх беларускіх друкаваных выданьняў, ніякіх беларускіх грамадзкіх і культурных арганізацыяў.

9. Перад закрыцьцём канфэрэнцыі было пастаноўлена выслаць на Монтэ Касына беларускую дэлегацыю, каб прыняць удзел у сьвяткаваньні 35-ых угодкаў гэтае бітвы, у якой удзельнічалі таксама шматлікія беларусы (між імі й В. Жук-Грышкевіч, Р. Ж.-Г.), частка якіх там загінула (яны пахаваныя на мясцовых вайсковых могілках). У сьвяткаваньні, якое адбудзецца 18 траўня, будуць прыймаць удзел прадстаўнікі ад усіх народаў, якія ўдзельнічалі ў змаганьні, а таксама Папа Ян Павал Другі, які адправіць Багаслужбу за загінуўшых і за справу міру на зямлі. **В. Сенькевіч»**

(«Беларус», Нью Ёрк, 266 – 1979)

Адносна канфэрэнцыі эўрапэйскіх сэктараў Рады БНР Старшыня Рады БНР др. В. Жук-Грышкевіч падае ў газэце «Час» наступныя заўвагі:

«1) Што спрычынілася да скліканьня канфэрэнцыі эўрапэйскіх сэктараў Рады БНР? З рэдкімі выняткамі сябры іх ня бралі ўдзелу ў сэсіях Рады БНР у Нью Ёрку, бо адлегласьць эўрапэйскіх краінаў ад Нью Ёрку, дзе звычайна адбываюцца сэсіі РБНР, даволі вялікая, і падарожжы з Эўропы ў Нью Ёрк вымагаюць шмат часу й вялікіх коштаў, на што радныя з Эўропы ня могуць сабе пазволіць. А абмен думак зь імі ў справах Рады БНР проста неабходны як для іх, так і для Рады БНР. І тут на дапамогу прыходзяць канфэрэнцыі эўрапэйскіх сэктараў рады БНР.

2) Чаму канфэрэнцыя была склікана ў Лёндане? – Бо ў Лёндане, дзякуючы гасьціннасьці Кіраўніцтва Беларускай Бібліятэкі й Музэю імя Франьцішка Скарыны, можна было без вялікіх коштаў атрымаць месца на канфэрэнцыю й закватэраваньне для ўдзельнікаў яе, на што нельга лічыць у іншых эўрапэйскіх цэнтрах.

3) Вельмі важным быў і той факт, што ўдзельнікі канфэрэнцыі мелі нагоду пазнаёміцца з Беларускай Бібліятэкай і Музэям Францішка Скарыны, дзякуючы ветлівасьці кіраўніка Бібліятэкі а. А. Надсона, які ахвотна паказваў ім скарбы бібліятэкі й музэю. Некаторыя радныя нават мелі магчымасьць скарыстаць з матарыялаў бібліятэкі, знайшоўшы сярод шматлікіх беларускіх друкаў з розных часоў патрэбыя ім крыніцы.

4) Аднэй з важнейшых справаў, што разглядаліся на канфэрэнцыі, была справа сустрэчы Беларусаў Заходняй Эўропы. Справа гэта была вельмі важнай і ажыцьцяўленьне яе прызнана было абавязкавым, што выявіла дыскусія ўдзельнікаў канфэрэнцыі. Заняцца гэтай справай маюць ня толькі сэктары Рады БНР, але й беларускія грамадзкія ды культурныя арганізацыі ў краінах Заходняй Эўропы.

5) Яшчэ адзін пункт, якога нельга ня ўспомніць, – гэта гасьціннасьць лёнданскіх беларусаў. Удзельнікаў канфэрэнцыі зь іншых краінаў Лёнданцы – гаспадары канфэрэнцыі – спатыкалі на лётнішчы або станцыях, адразу бралі пад сваю апеку й давалі ім закватэраваньне. Доўга застанецца ў памяці ўдзельнікаў канфэрэнцыі цудоўная вялікодная бяседа, якую зладзіў для іх сэктар Рады БНР у Вялікай Брытаніі.

* * *

Да гэтых сьціплых заўвагаў далучаю сваю шчырую падзяку Кіраўніцтву Беларускай Бібліятэкі й Музэю імя Франьцішка Скарыны ў Лёндане за гасьціннасьць, Кіраўніцтвам Сэктару Рады БНР у Вялікай Брытаніі й ЗБВБ за дапамогу ў арганізацыі канфэрэнцыі й усім Сэктарам Рады БНР у Заходняй Эўропе за тое, што яны адгукнуліся на мой заклік і прыслалі сваіх прадстаўнікоў, а сябры Сэктару Рады БНР у Бялікабрытаніі зьявіліся на канфэрэнцыю ўсе грэміяльна, нават радныя з Манчэстару й Брадфарду.

Вялікі Вам дзякуй, Дарагія Сябры!

ЖЫВЕ БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА!

Др. В. Жук-Грышкевіч
Старшыня Рады БНР»

(«Час», Фляшынг, Н. Ё. 20, [4] 1979.)

* * *

Вярнуўшыся з Ангельшчыны, Старшыня Рады БНР застаў у Канадзе праблему: было выкрыта ў Атаве, што ў дакумэнтах Крыніц Статыстыкі Канады ад пачатку 30-

тых гадоў беларуская мова фігуруе як дыялект расейскай. Гэтая скандалічная памылка абурыла ўсіх беларусаў. У выніку стараньняў – ліставаньня з Галоўным Статыстышыным др. П. Кіркгамам памылка была выпраўлена. (Глядзі Рзьдзел XV – ККБК).

У сувязі з XVIII-м Кангрэсам Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня Старшыня Рады БНР атрымаў ліст наступнага зьместу:

«BYELORUSSIAN-AMERICAN ASSOCIATION, Inc.
NATIONAL HEADQAUARTERS
166-34 Gothic Drive
Jamaica, N. Y. 11432

10 верасьня, 1979 г.

Яго Эксцэленцыі
Старшыні Рады Беларускае Народнае Рэспублікі
Др. Вінцуку Жук-Грышкевічу
у Канадзе.

Ваша Эксцэленцыя!

Ад імя ўдзельнікаў XVIII-га Кангрэсу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня, што адбыўся 1-2 верасьня 1979 году ў Гайлэнд-Парку, Нью-Джэрзы, перадаем Вам найшчырэйшыя прывітаньні і пажаданьні добрага здароўя ды плённых далейшых дасягненьняў у Вашай адказной працы на карысьць дзяржаўнага адраджэньня Беларусі.

(Подпіс)
Янка Запруднік, старшыня Кангрэсу

(Подпіс)
Зора Кіпель, сакратар Кангрэсу»

У сувязі з 16-ай Сэсіяй Рады БНР Старшыня яе др. В. Жук-Грышкевіч атрымаў ад др. Віктара Сенькевіча, сябры Рады БНР з Гішпаніі, ліст наступнага зьместу:

«Палямос, 23. XI. 79.

Дарагі і Паважаны Спадар Прафэсар,

Спадзяюся, што Вы атрымалі маё кароценькае пісьмо зь Лёндану, скуль я вярнуўся зусім нядаўна. «Камунікат» нр. 12 толькі што атрымаў. Ішоў ён амаль што месяц! Я думаю, што гэта віна гішпанскай «дэмакратычнай» пошты. У сувязі з гэтым высылаю гэты ліст на адрас Фундацыі Крэчэўскага, бо такім чынам існуе надзея, што Вы яго яшчэ атрымаеце перад Сэсіяй.

Падарожжа маё ў Мюнхэн, затым у Бэльгію і ў Ангельшчыну было надзвычай цікавае і карыснае. Шмат чаго і пра што даведаўся, а асабліва ўзрадвала мяне вестка з Бацькаўшчыны: зьяўленьне першага самвыдавецкага дакумэнту пад загалоўкам «Пісьмо да расейскага сябры», тэкст якога трымаю у сваіх руках і змог пазнаёміцца дакладна зь ім. Гэта штосьці, чаго мы даўно чакалі. Дакумэнт гэты, на маю думку, стане вехавой, пераломнай зьявай у нашым нацыянальным жыцьці. Ён будзе гатовы



Вінцэнт і Раіса Жук-Грышкевіч, на сьцяне партрэт Вінцэнта работы Пётры Мірановіча. На юбілейнай бяседзе 60-тых угодкаў жыцьця Раісы Жук-Грышкевіч. Бэры, 22 кастрычніка, 1979.



Вінцэнт Жук-Грышкевіч, Бэры, 22 кастрычніка, 1979.

праз пару тыдняў, калі не раней (ён цяпер перакладаецца на ангельскую мову). Зь яго мы можам шмат што даведацца пра сучасны стан нашай беларускай справы наагул і на бацькаўшчыне, у асабліваcьці. Дакумэнт гэты даказвае, што, ня гледзячы на страшэннае вынішчэньне нашых нацыянальных кадраў бальшавікамі, на страшэнную русыфікацыю, беларуская нацыянальная справа жыве й мацнее з кожным днём, што яе нельга ўжо больш ні спыніць, ні зьнішчыць! Нашым абавязкам цяпер будзе разумна дакумэнт гэты пашырыць і нарабіць шмат шуму вакол яго. Паколькі я даў слова, што пакуль ён ня будзе пададзены да публічнага ведама, ня буду пра яго шмат гаварыць, дык абмяжуюся толькі тым, што дакумэнт гэты (21 старонка машынапісу) ёсьць адным з сотняў, якія сёньня распаўсюджваюцца на Беларусі, а гэта павінна напоўніць нас аптымізмам і даць нам сілу волі і дынамізму да далейшае дзейнасьці тут на эміграцыі. Калі да ўсяго гэтага дадаць яшчэ весткі, атрыманыя ад мастака Міколы Паўлоўскага, які нядаўна пастанавіў не вяртацца на Беларусь (ён цяпер жыве ў Францыі), дык сапраўды мусім цешыцца, што справа наша на вельмі добрай дарозе. (Пра

ўсё гэта я меў намер напісаць шырэй, аднак у сувязі з тым, што мала часу засталося да Сэсіі, дык абмяжоўваюся вось толькі да сказанага тут).

Калі гэты ліст дойдзе да Вас перад Сэсіяй, дык буду прасіць вас вітаць усіх Радных, прысутных на ёй, ад майго імя і, адначасна, жадаць плённай працы на карысьць нашае Бацькаўшчыны Беларусі. Прашу Вас таксама прыняць маё ўпаўнаважаньне. У выпадку, калі-б Вы мелі аж некулькі іх ад іншых сяброў, дык прашу перадайце яго Спадарыні Раісе.

На гэтым і кончу. Жадаючы Вам і Спадарыні ўсяго найлепшага, застаюся Ваш заўсёды шчыры

В. Сенькевіч.»

16-я звычайная чародная Сэсія Рады БНР

16-я Сэсія Рады БНР адбылася 24-га лістапада 1979 г. у будынку Фундацыі Крэчэўскага ў Нью Ёрку. У сваім звароце да Сэсіі Старшыня Рады БНР др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч гаварыў:

«Высокі Сход Рады Беларускай Народнай Рэспублікі!

Я чуюся вельмі шчасьлівым, што мы змаглі сабрацца на 16-ю Звычайную Чародную Сэсію Рады БНР, каб узмоцніць нашу арганізацыю і вырашыць найважнейшыя пытаньні, якія высунула наша палітычная сытуацыя й дзейнасьць Рады БНР.

Жывём мы й працуем у вельмі неспрыятлівай міжнароднай атмасфэры. Перажылі мы часы суіснаваньня паміж вольным дэмакратычным Захадам і камуністычнай дыктатурай Усходу ды трапілі ў яшчэ горшую міжнародную сытуацыю гэтак званага дэтанту. У часе гэтай няспрыятлівай сытуацыі для паняволеных бальшавікамі народаў нельга лічыць ня толькі на падтрымку вольных дэмакратычных дзяржаваў, але нават на зацікаўленьне імі.

У гэткай сытуацыі цяжка было лічыць на ўдачы ў нашай вонкавай палітыцы. Прышлося абмежыцца да высыланьня мэмар'ялаў і лістоў ад Рады БНР у Задзіночаныя Нацыі ды да ўрадаў дэмакратычных дзяржаваў. Пэўную актыўнасьць праявілі нашы прадстаўнікі: Заступнік Старшыні Рады БНР на Эўропу сп. Уладзімір Бортнік у «Эўрапэйскай Канфэрэнцыі Правоў Чалавека й Самавызна-

чэньня» ў Люцэрне і сп. сп. П. Асіповіч і Я. Міхалюк у «Юропіен Льезон Груп» у Лёндане ў Англіі.

Найбольш рацыянальным для Рады БНР было зьвярнуць увагу на падрыхтоўку да лепшых часоў, на рэарганізацыю нашай дзейнасьці, на ўзмацненьне й палепшаньне нашай арганізацыі, на ўзмацненьне нашай палітычнай сьведамасьці й выраблёнасьці.

Што-ж нам удалося зрабіць у гэтым напрамку? – Мы ажывілі Раду БНР, рэарганізавалі яе, паставілі яе на моцных **праўна-статутовых асновах** і вызначылі рацыянальны падзел працы між ворганамі Рады БНР – ды ўзмоцнілі склад яе новымі маладзейшымі сіламі.

На вялікі жаль ня ўсе нашы ворганы Рады БНР поўнасьцьцю працаздольныя. Нам не ўдалося стварыць поўнага выканаўчага воргану – Сакратарыяту Рады БНР. Мы маем толькі трох сакратароў: фінансаў, вэтэранаў і дакумэнтацыі, а на іншых сакратароў, як вонкавых дачыненьняў, інфармацыі й прапаганды, нутраных дачыненьняў і асьветы, у нас не знайшлося ахвотнікаў. І таму такія важныя дзялянкі нашай дзейнасьці, як вонкавая палітыка, інфармацыя й прапаганда ды нутраныя суадносіны, занядбаныя. Ня маем мы таксама БНР-аўскага друкаванага воргану, які-б прапагаваў ідэялёгію БНР ды інфармаваў пра дзейнасьць Рады БНР. Няма ў нас таксама палітычных арганізацыяў ці партыяў.

Добра, што ў нашым грамадзтве ажывілася этнічна-мастацкая дзейнасьць у форме фэстываляў, і хоць яна шырокая, прыгожая й узьнёслая, аднак ніколі яна ня зможа замяніць палітычнай дзейнасьці.

У кажным вызвольным руху й ягоным змаганьні лічацца толькі зь сілай, гэта значыць зь сілай палітычнага арганізаванага жыцьця й змаганьня (Падкрэсьлена мною, Р. Ж.-Г.). На вялікі жаль наша грамадзтва да справы палітычных арганізацыяў ці партыяў ставіцца абыякава. Нават нашы радныя, калі напатыкаюцца на шкодныя для Рады БНР факты, ці шаптаную процібээнэраўскую прапаганду, не праяўляюць ніякай рэакцыі, так як быццам бы іх гэта не датычыла.

А тымчасам міжнародная сытуацыя мяняецца на нашых вачох. Дэтант паміж дэмакратычнымі дзяржавамі й Савецкім Саюзам ператвараецца ў замаскаваную барацьбу, якая можа зьмяніцца ў сьцюдзённую, ці нават гарачую вайну. Да гэтага мы мусім быць падрыхтаваны.

Зразумелая рэч, што мы ня маем права й надалей заставацца «апалітычнымі», незарганізаванымі палітычна й абыякавымі ў адносінах да зьменаў у міжнароднай сытуацыі.

Дык што-ж нам рабіць? – Гэта пытаньне нам трэба добра прадумаць і прадыскутаваць. Але ўжо цяпер можна праводзіць некаторыя мерапрыемствы. Нам трэба правясьці да канца рэарганізацыю ў Радзе БНР і палітычную арганізацыю ў грамадзтве. Калі ня будзе магчымасьці арганізаваць поўнага сакратарыяту, трэба будзе пашырыць Прэзыдыюм Рады БНР і перадаць яму абавязкі сакратарыяту. Гэта ўжо мы можам зрабіць. Тады й іншыя справы лягчэй будзе правесьці. Толькі ня можна быць абыякавым да гэтых справаў і ня можна апускаць рук.»

(Пратакол 16-ай Сэсіі Рады БНР).

Ды сярод радных бытавала й думка, што Рада БНР павінна быць толькі сымбалем, а ня добра зарганізаваным, з падзелам працы, дзейным і эфэктыўным палітычным ворганам, падрыхтаваным даць у адпаведнай сытуацыі дапамогу змагаром за незалежнасьць Беларусі на Бацькаўшчыне.

XXIV. 1980-я ГАДЫ

У справе амэрыканскай дапамогі Беларусі "The American Relief Administration (ARA) in Byelorussia"

15 лістапада 1980 г. сп-ня Алеся Кіпель, юрыст з прафэсіі, (дачка др. Вітаўта й Зоры Кіпеляў) піша да др. В. Жук-Грышкевіча ліст такога зьместу:

«Высокапаважаны Др. Жук-Грышкевіч!

На параду маіх бацькоў зьвяртаюся да Вас у наступнай справе: скончыўшы першую частку мае працы аб **амэрыканскай дапамозе Беларусі (БССР)...,** я апрацоўваю цяпер частку другую: **Дапамога АРА Заходняй Беларусі.** І тут я натыкаюся на цяжкасьці – недахоп друкаваных матар'ялаў. Мая просьба да вас: ці Вы нешта памятаеце аб амэрыканскай дапамозе, а можа маеце нейкія матар'ялы, якія адносяцца да гэтага пэрыяду?

Была-б Вам вельмі ўдзячная за любую дапамогу. Прасіла-б адказаць на мой адрас у Вашынгтоне. Згары шчыра Вам дзякую. Прывітаньне ад нас усіх Вам і Вашай Спадарыні.

З глыбокай пашанай

Алеся Кіпель»

«5 сьнежня, 1980.

Даражэнькая Алеся,

Прыемна мне было атрымаць Ваш ліст з залучнікам – першай часткі Вашай працы – **"The American Relief Administration (ARA) in Byelorussia,"** якую я прачытаў з вялікім зацікаўленьнем. Цешуся, што Вы, за прыкладам сваіх бацькоў, маеце навукова-дасьледчыя зацікаўленьні. Ахвотна Вам дапамагу чым змагу, але, на вялікі жаль, помач мая будзе вельмі абмежанай, бо ня маю я ніякіх матарыялаў пра дзейнасьць **АРА ў Заходняй Беларусі** й ня

ведаю, дзе іх шукаць. Дык мушу абмежавацца да сваіх скупых успамінаў.

1. Калі я паступіў у Віленскую Беларускую Гімназію ў 1920 годзе, у Вільні былі значныя цяжкасьці з прадуктамі, асабліва ж для беларускіх дзяцей і моладзі, што прыехалі зь вёскі, каб вучыцца ў сваёй гімназіі. Польска-бальшавіцкая вайна была тады ў поўным разгары, і сувязі зь вёскай амаль ня было. Бальшыня вучняў жыла ў гімназіяльным інтэрнаце, дзе мела кватэру й харчаваньне, якое ў значнай меры паходзіла з амэрыканскіх крыніцаў. Зрэштай усе віленскія школы карысталі з гэтых крыніцаў.

У 1920 і 1921 гадох ня толькі гімназіяльны інтэрнат атрымліваў амэрыканскую харчавую дапамогу, прыхожых вучняў з гораду таксама дакормлівалі ў гімназіі раз у дзень (у часе вялікага перапынку) – пераважна заціркай з пшоннай мукі, з чаго карыстаў і я. Карміла нас найчасьцей сп-ня Арсеньнева (Клаўдзія, Р. Ж.-Г.), матка нашай слаўнай паэткі.

Зь якой амэрыканскай арганізацыі йшла гэта харчавая дапамога – я ня ведаю. Таксама ня ведаю, хто стараўся пра атрыманьне гэтай харчавой дапамогі ад амэрыканцаў: ці гімназіяльны Бацькоўсі Камітэт, ці Беларускае Дабрадзейнае Таварыства Помачы Пацярпеўшым ад Вайны, якое паўстала ў 1915 годзе. І ня ведаю, ці гэту дапамогу нашы апякуны атрымлівалі беспасрэдна ад амэрыканцаў ці за пасярэдніцтвам віленскіх гарадзкіх уладаў. На гэтыя пытаньні, магчыма, магла-б даць адказ наша паэтка Наталья Арсеньнева, паколькі ейная матка брала чынны ўдзел у дакормліваньні вучняў Віленскай Беларускай Гімназіі. Другая асоба, што можа ведаць, як і ад каго беларусы ў 1920-21 гадох атрымлівалі амэрыканскія прадукты ў Вільні (пшанічную муку, цукар, сланіну й іншыя тлушчы) – гэта спадарыня Будзьчыха, – матка Часлава Будзькі й спадарыняў Пануцэвічыхі й Бяленісіхі. Іхны бацька С. П. Эдвард Будзька быў вельмі актыўным народным і каапэратыўным дзеячом і адным з закладчыкаў Беларускага Таварыства Помачы Пацярпеўшым ад Вайны.

2. Можа дарэчы будзе таксама ўспомніць, што амэрыканская «УМСА» вельмі шмат дапамагала беларускаму грамадзтву й вучням беларускіх гімназіяў у Радашкавічах і Клецку. Некаторыя беларусы зьблізіліся з «УМСА»-й, а былі й такія, што супрацоўнічалі з гэтай арганізацыяй у Заходняй Беларусі й Варшаве й сталіся пратэстанцкімі

сьвятарамі. Больш інмфармацыяў пра гэта хіба мог бы даць а. Ян Пятроўскі, які жыве ў Флярыдзе. Вось і ўсё, што я магу сказаць у адказ на Вашы пытаньні.

Хто зь беларусаў працуе цяпер у Бібліятэцы Кангрэсу? Можа знаеце спадарства Кітаў і ведаеце іх адрас?

Памажы Вам Божа ў Вашай навукова-дасьледчай працы!

З глыбокай пашанай

В. Жук-Грышкевіч»

1000-годзьдзе дзяржаўнасьці Беларусі ў Канадзе

28 і 29 лістапада 1981 году ля будынку Беларускага Рэлігійна-Грамадзкага Цэнтру ў Торонта ўзьвіваўся побач канадыйскага бел-чырвона-белы сьцяг. Згуртаваньне Беларусаў Канады ўрачыста адзначала 1000-ыя ўгодкі дзяржаўнасьці Беларусі.

Падрыхтоўка да гэтага надзвычай важнага сьвята вялася цэлы год. Інспірацыяй былі перавыданыя Згуртаваньнем Беларусаў у Вялікай Брытаніі дзьве юбілейныя падпольна выданыя ў БССР паштоўкі.

У праграму сьвята ўвайходзілі: багаслужбы, даклады: «Тысячагодзьдзе дзяржаўнасьці Беларусі», «На дзень Герояў Беларусі» і «Сто год ад нараджэньня Івана Луцкевіча», мастацкая выстаўка ды супольныя застольныя бяседы.

Субота – 28 лістапада

Увечары, пасьля малебну ў БАПЦаркве, урачысты сход адкрыла сп-ня Івонка Сурвіла, старшыня Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ў Канадзе, была агульна адсьпявана малітва «Магутны Божа». Слова для ключавога дакладу «Тысячагодзьдзе дзяржаўнасьці Беларусі» дала яна Старшыні Рады БНР др. Вінцэнту Жук-Грышкевічу.

Прывітаўшы прысутных ад імя Рады БНР зь юбілейным сьвятам, др. В. Жук-Грышкевіч гаварыў:

«Найстарэйшыя зьвесткі аб гісторыі Беларусі дайшлі да нас з летапісаў і легэндаў. Нажаль найстарэйшыя беларускія летапісы – полацкі й тураўскі – не захаваліся.

Таму веда пра найстарэйшую гісторыю Беларусі фрагментальная. Тым ня менш, дзякуючы дасьледаваньням гісторыкаў, сяньня маем уяўленьне аб галоўных мамэнтах разьвіцьця дзяржаўнага станаўленьня беларускіх зямель.

У мінулым 1980-ым годзе споўнілася тысяча год ад часу, як у гадавіках летапісаў зьявіліся імёны, якія маюць беспасрэднае дачыненьне да гісторыі Беларусі. А менавіта пад годам 980-ым у найстарэйшым летапісе «Аповесьці мінулых гадоў» гаворыцца пра Полацкага князя Рагвалода, ягоную дачку Рагнеду ды пра Тураўскага князя Тура.

З мамэнтам зьяўленьня першых гістарычных імёнаў канчаецца прагісторыя, а пачынаецца гісторыя Беларусі, адзначаная важнымі падзеямі й слаўнымі імёнамі. Драматычныя падзеі 980 году, якія зафіксаваў летапіс, кідаюць сьвятло на мінулыя да гэтай даты часы й выясьняюць падзеі наступных гадоў.»

Далей Прэзыдэнт Рады БНР гаварыў пра рассяленьне ўсходніх славян,пра плямёны, зь якіх утварыўся беларускі народ – крывічоў, дрыгавічоў, вяцічаў, радзімічаў, севераноў – пра балцкі субстрат беларускага народу, пра значэньне ў гістарычным лёсе беларускіх плямёнаў вялікага воднага шляху «З Варагаў у Грэкі» – аднэй з галоўных гандлёвых, а тым самым і культурных магістраляў Усходняе Эўропы. Тады гаварыў ён пра падзеі 980 году.

«Летапісы сьведчаць, што Рагвалод быў незалежным князем Полацкай зямлі, якая прадстаўляла сабой значную сілу. Тверскі летапіс кажа, што ўсе крывіцкія землі характарызуюцца, як «поласкія власьці». Пасрэдным доказам сілы Полацка служыць факт, што Уладзімір, ідучы з Ноўгараду паходам на Рагвалода, сабраў «воі многі» з варагаў, славян, чудаў і крывічоў ізборскіх. Рагвалод быў пабіты, Полацак зьнішчаны. Уладзімір, відаць, хацеў і зьнішчыць небясьпечную для сябе дынастыю Рагвалода, калі забіў яго, жонку й сыноў яго. Пакінуў толькі Рагнеду, якую прымусіў быць сваёй жонкай. Рагнеда мсьціцца за сьмерць бацькі й сама чуць ня гіне. Ратуе яе сын Ізяслаў. Уладзімір быў прымушаны аддаць бацькаўшчыну Рагнедзе й яе сыну. Збудаваў ім горад Ізяслаў – цяперашняе Заслаўе – пасяліў у ім Ізяслава з маткай Рагнедай. Ізяслаў аднак пераяжджае ў Полацак, які ў міжчасе адбудаваўся, і стаецца князем Полацкай зямлі. Ізяслаў быў першым прасьветнікам Полаччыны, увёў пісьменства. Пры ім пісаліся граматы зь ягоным подпісам і пячаткай. Рагвало-

давы нашчадкі былі князямі незалежнай Полацкай дзяржавы аж да літоўскага пэрыяду, а Усяслаў Чарадзей быў і Кіеўскім князем.»

Напасьледак Старшыня Рады БНР гаварыў пра нэгатыўнае афіцыйнае стаўленьне БССР і Масквы да 1000-годзьдзя дзяржаўнасьці Беларусі, якое было абыйдзена маўчаньнем.

* * *

Далей у справаздачы із сьвяткаваньня (Архіў ЗБК) гаворыцца аб мастацкай выстаўцы, у якой былі прадстаўлены працы: сп. Юркі Акулы, спадарынь: Валі Пашкевіч, Александры Протас, Івонкі Сурвілы й сп. Міколы Шуста. Афіцыйна адкрыла выстаўку паэтка Натальля Арсеньнева.

Нядзеля – 29 лістапада

Пасьля сьв. літургіі й паніхіды за Герояў Беларусі быў супольны абед. Прыгатавалі яго, як і вячэру ў суботу, спадарыні Марыя Ганько й Вера Кірка.

Сакратар Вэтэранаў Рады БНР др. Я. Сажыч прывітаў прысутных з 1000-годзьдзем Беларусі. Старшыня Тарантонскага аддзелу ЗБК сп. М. Ганько прачытаў даклад, прысьвечаны Дню Герояў Беларусі – гісторыі змаганьня беларускага народу за незалежнасьць БНР.

«Гэтак, як імёны Рагвалод, Рагнеда, Ізяслаў сымбалізуюць пачатак гісторыі Беларусі, так імёны Іван і Антон Луцкевічы зьвязаны з пачаткам сучаснага яе этапу – нацыянальна-палітычнага адраджэнскага руху» – гаварыла др. Раіса Жук-Грышкевіч у сваім дакладзе «На сотыя ўгодкі ад нараджэньня Івана Луцкевіча.»

Беларускім нацыянальным гімнам «Мы выйдзем шчыльнымі радамі» закончылася сьвяткаваньне тысячагодзьдзя дзяржаўнасьці Беларусі.

Сьмерць Біскупа Часлава Сіповіча

«У нядзелю 4 кастрычніка 1981 году ў Лёндане Ангельшчыны, «Фінчлейская Беларусь» – раён Дому Мар'янаў ды Бібліятэкі й Музэю імя Францішка Скарыны – кіпеў сваім асаблівым уздымам. Надыйшоў дзень вялікага сьвя-

та – дзесятых угодкаў адкрыцьця беларускае культурна-навуковае сьвятыні – Беларускае Бібліятэкі й Музэю імя Франьцішка Скарыны ў Лёндане...

Асабліва вялікі гэта дзень – чытаем далей у артыкуле «Сьвята і... Сьмерць» у газэце «Беларус» нр. 294-295, 1981 – для пачынальнікаў гэтай выдатнай справы, найперш Біскупа Часлава Сіповіча ды айца Аляксандра Надсона. Пачыналі некалі з нуля... І з Божай помаччу, пасьля доўгай працы й стараньняў, 15-га траўня 1971 году новую бібліятэку й музэй афіцыяльна адчыніў прафэсар Оксфардскага Ўнівэрсытэту Робэрт Оты, а дабраславіў яе Апостальскі Дэлегат на Вялікую Брытанію, Архібіскуп Домэніко Энрычы.

Бібліятэка атрымала права харытатыўнай інстытуцыі 23-га ліпеня 1979 году й цяпер кіруе ёю Рада Даверaных 10-ёх асобаў, у якую ўваходзяць сьвятары каталіцкія, праваслаўныя, прадстаўнікі беларускай грамады ў Вялікай Брытаніі, а таксама зацікаўленыя беларусаведы брытанскія навукоўцы...»

«Дзень малітвы... і разьвітаньня

Сонечная нядзеля 4-га кастрычніка напоўніла царкву ў Доме Мар'янаў. Сьвятую Літургію служыць Уладыка Часлаў Сіповіч і айцец Алесь Надсон.

Сяньня вялікае сьвята ня толькі маленькай «Фінчлейскай Беларусі», але й усяго беларускага народу. Гэтыя выгнаньнікі, што пакінулі сваё «раськіданае гняздо», гэтта ня толькі самі астаўбаваліся й прыяцеляў у чужым сьвеце здабылі, але й яшчэ сьвятыні навукі пабудавалі. Дзіва няма, што ўрачыста гучаць галасы сьвятароў. Падзяка Богу за дасягнутае, і каб далей памагаў. Каб у будучыні й бацькаўшчыну ад нячыстых вызваліў.

А сп. Гай дэ Пікарда ізь сьціплым хорам сьпявае старыя беларускія царкоўныя мэлёдыі, якія адшукаў, апрацаваў...

Уладыка Часлаў гаворыць пра Збавіцеля нашага, які выздаравіў хворую дачку жанчыны з Кананітаў, дый прыгадвае, што Ён загадаў апосталам сваім ісьці й навучаць усе народы. Уладыка цытуе й Франьцішка Скарыну... Вялікі навуковец і гуманісты наказваў дзецям беларускім, каб трымаліся й любілі сваё. Гэтыя словы Скарынавы мелі асаблівую вымову й гучаньне ў гэты дзень і ў тым месцы, ды з вуснаў нашага высокага Дастойніка, выдатнага культурнага дзеяча й поўнасьцьцю адданага Сы-

на Вялікай і Пакрыўджанай Маці Беларусі. Бог так учыніў, што гэта былі словы апошняга казаньня Уладыкі Часлава Сіповіча перад адыходам у вечнасьць...»

У часе ўрачыстага юбілейнага сходу, кіраўнік яго, Біскуп Часлаў Сіповіч, атрымаў атак сэрца. Скорая дапамога забрала яго ў шпіталь.

«Каля гадзіны 4-ай вярнуўся із шпіталя а. Алесь Надсон, што суправодзіў туды Уладыку Сіповіча, і зь вялікім смуткам паведаміў, што дарагі нам, незаменны й вялікі чалавек хвілінаў дваццаць таму адыйшоў у вечнасьць...»

Памінальная імша ў касьцёле Люрдаўскай Божай Маці ў Таронта ў Канадзе

У той жа дзень айцец Надсон паведаміў нас тэлефанічна ў Канадзе аб сьмерці Уладыкі Часлава. Шок, смутак, трывога, ізноў вялікая нашая страта. Вінцук кажа: «Нам трэба заказаць памінальную імшу – урачыстую імшу – ў каталіцкім касьцёле ў Таронта, каб нашыя людзі ў большым ліку маглі ўзяць у ёй удзел». У Бэры заказаць імшу было-б лёгка, а ў Таронта, ня ведаючы ні касьцёлаў, ні сьвятароў, аказалася даволі складаным. Быў адзін касьцёл у Таронта, куды мы пэрыядычна заходзілі, калі Вінцук прыяжджаў у Прынцэс Маргарэт Гошпіталь. Апошнімі гадамі яму давялося ў гэтым шпіталі праходзіць лячэньне ад рака горла, і цяпер ён прыяжджаў сюды толькі на праверкі. Каля шпіталя быў каталіцкі касьцёл Люрдаўскай Божай Маці, да яго мы й накіраваліся. Але так як імшу па сьв. пам. Уладыку Чаславу Сіповічу павінен быў служыць Біскуп, найбліжэйшая магчымая дата на багаслужбу магла быць толькі аж 6-га лютага, 1982 году.

У лісьце з 29 сьнежня 1981 году а. Аляксандар Надсон піша нам:

«Ваш ліст з паведамленьнем аб памінальнай службе Божай за супакой душы Уладыкі Часлава дайшоў да мяне на Куцьцю (24 сьнежня) і быў для мяне найлепшым Каляднім падаркам. Шчыра дзякую... Я пасьпеў выслаць Вам 24 сьнежня кнігу Уладыкі Часлава і некалькі экзэмпляраў брашуры пра Бібліятэку. Спадзяюся, што атрымаеце іх да 6-га лютага й такім чынам зможаце зрабіць падарак Біскупу Амброзіку... Я яму вельмі ўдзячны за тое, што згадзіўся адслужыць сьв. Імшу і крыху пазьней пастараюся напісаць яму.»

Апрача беларускіх запросінаў-паведамленьняў, мы выдалі й патрэбныя англямоўныя наступнага зьместу:

"CESLAUS SIPOVICH
Titular Bishop of Mariamme, Apostolic Visitor for Byelorussians

Born December 8, 1914 in Dziedzinka, Byelorussia
Died October 4, 1981 in London, England

A Memorial Mass for the late Bishop Ceslaus Sipovich will be celebrated by the Most Rev. Aloysius M. Ambrozic, Auxiliary Bishop of Toronto, on Saturday, February the 6th 1982 at 12.00 noon at the Church of Our Lady of Lourdes, Sherbourne and Earl Street, Toronto (Take the Bloor Subway Line to Sherbourne Station, then walk south to Earl Street).

After the Mass there will be a memorial meeting at the Lynch Hall.

You and your family are invited to attend the Mass, to join in prayer, and to pay tribute to the memory of this valiant servent of God and a great Byelorussian.

Toronto, January, 1982.

ORGANIZING COMMITTEE"

На памінальную службу за супакой душы Уладыкі Часлава Сіповіча прыбылі людзі з Таронта, Бэры, Атавы й Ашавы. У прыгожым гатыцкага стылю касьцёле Люрдаўскай Божай Маці адпраўляў Сьватую Імшу Біскуп (славенскага паходжаньня) Алойзіус Амброзік. (Цяпер ён Арцыбіскуп і галава Арчдыяцэзіі Таронта). У сваім красамоўным казані гаварыў ён аб сьв. пам. Біскупу Чаславе Сіповічу, ягонай службе Богу й бацькаўшчыне Беларусі.

Пасьля імшы Вінцэнт і я мелі нагоду пазнаёміцца зь Біскупам Амброзікам, падзякаваць за багаслужбу й казань ды перапрасіць, што задуманы ад нас яму падарак – кніга сьв. пам. Біскупа Часлава Сіпопвіча "The Byzantine – Slavonic Liturgy of St. John Chrysostom" ня прыбыла яшчэ з Англіі, і таму мы прасілі-б дазволу адведаць Біскупа, як надыйдзе кніжка, каб магчы яму яе ўручыць. Біскуп Амброзік падзякаваў нам за надасланыя яму загадзя матарыялы пра Біскупа Часлава Сіповіча.

Пасьля багаслужбы беларусы лічнай грамадой сабраліся ў прасторнай залі Лынч на памінкавы сход. Вёў яго арганізатар жалобнай імпрэзы калішняйшы супрацоўнік і асабісты прыяцель сьв. пам. Уладыкі Часлава Сіповіча др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч, Старшыня Рады БНР. Ён расказаў пра жыцьцё й дзейнасьць сьв. пам. Уладыкі Часлава Сіповіча, пра яго як сьвятара – добрага пастыра, беларускага патрыёта – дзеяча на ніве рэлігійнай, культурнай і грамадзкай. «Ён быў магутным сьветачам, дадзеным нам Богам. І за гэта мы павінны быць Богу ўдзячны,» – казаў дакладчык.

Ніхто болей з прысутных не прамаўляў, але нехта запрапанаваў зрабіць зборку ахвяраў на Беларускую Бібліятэку імя Франьцішка Скарыны ў Лёндане, каб гэтым падкрэсьліць нашую пашану памяці Закладчыка яе – сьв. пам. Уладыкі Часлава Сіповіча, што й было ўчынена.

Пазьней, вясной гэтага году, мы зрабілі візыту Біскупу Амброзіку, уручылі яму падарак – кнігу Біскупа Часлава Сіповіча – "The Byzantine – Slavonic Liturgy of St. John Chrysostom," мастацкім выданьнем якое захапляўся Біскуп Алойзіус. Вінцук шмат зь ім гутарыў, расказваў пра Беларусь, яе гісторыю й цяперашнюю сытуацыю. Біскуп Амброзік слухаў з зацікаўленьнем й наракаў, што людзі ў Канадзе (уключна зь ім) мала ведаюць пра Беларусь.

Сяньня, у 1990 годзе, Біскуп Алоізіус Амброзік ёсьць Арцыбіскупам і галавой Арчдыяцэзіі Таронта. Утрымоўваю зь ім кантакт, высылаю яму англямоўную літаратуру пра Беларусь – (часапіс "Byelorussian Review"), пра адраджэнскі рух й чарнобыльскую трагэдыю. Вось адзін з гэтых лістоў:

BYELORUSSIAN CANADIAN COORDINATING COMMITTEE
КААРДЫНАЦЫЙНЫ КАМІТЭТ БЕЛАРУСАЎ КАНАДЫ
54 Mary Street, Barrie, Ont, L4N lTl. Tel.: (705) 728-7581.

December 30, 1990.

His Excellency Most Reverend Aloisius Ambrozic
Archbishop of Toronto
355 Church Street, Toronto, Ont. M5B 1Z8

Your Excellency,

Today after the Holy Mass at the St. Mary's Church in Barrie, Ont., an announcement was made that on January the 6th

one-fourth of the church collection will be donated to the newly reestablished church in Ukraine.

I welcome this honourable decision. But in spite of this good news my heart is bleeding... because of the tragic fate of our Byelorussian church, of our country Byelorussia.

Elizabeth Ambrose, a London-based consultant on East European Affairs, in her article "The Reemergence of Eastern-Rite Catholicism in Byelorussia" describes what happened to our Byelorussian church.

The fate of Byelorussia is presented in Father Nadson's newsletter of November 1, 1990, "Chernobyl in Byelorussia," in Vera's Rich article "Byelorussia awakens," and in the following articles: "The Forgotten Children of Chernobyl," "Harvest of Sorrow" and "Byelorussia: Genocide of a Nation."

Your Excellency, I feel almost guilty to send you so much material to read, but if you recall, ten years ago, when my late husband Vincent and I were privileged to visit you and present to you a book of our late Bishop Ceslaus Sipovich: "The Byzantine-Slavonic Liturgy of St. John Chrysostom," you mentioned that so little is known about Byelorussia... If you recall, you were kind to say the Memorial Mass for our late Bishop Ceslaus Sipovich – a great Bishop and a great Byelorussian. Now Father Alexander Nadson is continuing Bishop Sipovich's work.

I lost my husband Vincent Žuk-Hryškievič, PhD, on February 14th, 1989. His last achievement was the erection of the Byelorussian Memorial Cross in Martyrs' Shrine, Midland, Ontario, to mark Millennium of Christianity in Byelorussia. The Cross was blessed by Father Alexander Nadson on 5 September, 1988.

Your Excellency, on behalf of the Byelorussian Canadian Coordinating Committee I am honoured to extend to you our best wishes for the New Year.

Respectfully yours,

Dr. Raisa Žuk-Hryškievič
President

"MOST REVEREND ALOYSIUS M. AMBROZIC
ARCHBISHOP OF TORONTO
355 Church Street, Toronto, Ontario, M5B 1Z8

January 9, 1991.

Dr. Raisa Žuk-Hryškievič
President
Belorussian Canadian Coordinating Committee
54 Mary Street
Barrie, Ontario
L4N 1T1

Dear Dr. Žuk-Hryškievič:

It was a pleasure to receive your letter, and the enclosed articles provided enlightening and interesting reading. Though much of what they have to say is sad, it is good to know that the atrocities and disasters of the past can be spoken of in a fairly open way, and that the Bielorussian Uniate Church is reawakening. I am very curious about how things will develop from now on. Much will, no doubt, depend on the Bielorussian Catholics of Eastern Rite in the West.

My sincere sympathy on the death of your husband. I shall say a Mass for his eternal repose.

Wishing you and the Committee you lead a happy and successful New Year, I remain,

Sincerely yours,

Aloysius Ambrozic
Archbishop of Toronto."

Вяртаючыся да 1982 году – надыходзіла Сакавіковае сьвята. Беларускія арганізацыі віталі Старшыню Рады БНР з 25 Сакавіком. Старшыня Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня сп.Антон Шукелойць прысылае Старшыні Рады БНР ліст наступнага зьместу:

«**BYELORUSSIAN-AMERICAN ASSOCIATION, INC.**
National Headquarters
166-34 Gothic Drive
Jamaica, N.Y., 11432

21 сакавіка 1982 г.

Яго Эксцэленцыі
Старшыні Рады Беларускае Народнае Рэспублікі
Д-ру Вінцэнту Жук-Грышкевічу.

Ваша Эксцэленцыя!

Галоўная Управа Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня ў Амэрыцы мае гонар вітаць Вас з нагоды 64-ых угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі Актам 25-га Сакавіка 1918 году і жадаць здароўя ды посьпехаў у Вашай працы на дабро Беларускага Народу.

Галоўная Ўправа БАЗА гэтым запрашае Вас і Спадарыню прыняць удзел у нашым сьвяткаваньнмі, якое адбудзецца ў нядзелю 28-га сакавіка 1982-га году ў Нью Ёрку ў залі гатэлю Дорал Ін на 50-ай вул. і Лэксынгтан Авэнью ў Мангэтане, Нью Ёрк. Пачатак а гадз. 2-й п.п.

З глыбокай пашанай. Жыве Беларусь!

Антон Шукелойць
Старшыня»

«**ЗГУРТАВАНЬНЕ БЕЛАРУСАЎ КАНАДЫ**
524 St. Clarens Avenue
Toronto, Ontario, M6H 3W7

Яго Міласьці
Др. Вінцэнту Жук-Грышкевічу
Старшыні Рады
Беларускай Народнай Рэспублікі
Barrie, Ontario, Canada

Высокапаважаны Спадар Прэзыдэнт!

Галоўная Управа Згуртаваньня Беларусаў Канады ветліва запрашае Вас прыняць удзел у сьвяткаваньні 64-х

угодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

Сьвяткаваньне ладзіцца ў нядзелю 4-га красавіка, 1982 году ў залі БРГЦ, 524 St. Clarens Avenue, Toronto, адразу пасьля Багаслужбы, гадзіна 13:00.

Ваша прысутнасьць будзе для нас вялікім гонарам.

З глыбокай пашанай,

Ваш В. Касьцюкевіч
Старшыня
Згуртаваньня Беларусаў Канады.»

Улетку старшыня Галоўнай Управы Беларуска-Амэрыканскага Задзіночанмьня, сп. Антон Шукелойць піша да Старшыні Рады БНР д-ра В. Жук-Грышкевіча (на блянку БАЗА) ліст такога зьместу:

«10 ліпеня, 1982 г.

Яго Эксцэленцыі
Др. В. Жук-Грышкевічу
Старшыні Рады Беларускае Народнае Рэспублікі

Ад імя Галоўнай Управы Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня выказваю найшчырэйшую падзяку за перасланыя нам Сакратаром Фінансаў Рады БНР сп. В. Кажаном 350 даляраў, на выдаткі зьвязаныя з абаронай беларускага йменя ў Амэрыцы ды закранутых паклёпамі тэлевізыйнай перадачай “60 Minutes” – “Nazi Connections,” якая адбылася 16-га траверня сёлета ў ЗША, беларускіх дзеячоў.

Сягоньня закончаны друк адбіткі англямоўнае старонкі газэты «Беларус», Но. 300 (зь некаторымі зьменамі), якая таксама будзе рассылацца ў розныя амэрыканскія ўстановы дзеля належнай інфармацыі аб сытуацыі на Беларусі ў часе Нямецкай акупацыі, ў пэрыяд 2-ой Сусьветнай вайны і працы нашай адміністрацыі. У пляне – выданьне брашуры, да якой рыхтуюцца матар’ялы. Я думаю, што Вы маеце копію нашага мэморандум, якое было разасланае ўсім губэрнатарам, сэнатарам і кангрэсмэнам, а таксама ў Белы Дом, некаторыя дзяржаўныя дэпартамэнты ды ў прэсу, тэлевізію й радыё тых штатаў, дзе жыве большая колькасьць беларусаў.



Група ўдзельнікаў 15-ай Сустрэчы БПА ў Нью Дээрзі. У верхнім радзе зь лева на права: 2-я асоба сп-ня Каляда, др. Р. Жук-Грышкевіч, Старшыня Рады БНР др. В. Жук-Грышкевіч, сп-ня Марыя Войтанка, сп. Аляксандар Стагановіч, былы першы заступнік Старшыні Рады БНР, сп. М. Нікан, заступнік Старшыні Рады БНР на Аўстралію. Гайлянд Парк, Нью Джэрсі, ЗША, верасень, 1982.

Газэта «Беларус» рассылаецца рознымі людзьмі і з розных мейсцаў. Каб Вы ня мелі больш клопату, перадаю сягоньня Ваш адрас сп-ру Б. Андрусышыну, які рассылае каля 350-ці нумароў першай клясай амэрыканскай пошты. Браты Андрусышыны вызначаюцца пэдантнасьцяй у выконваньні сваіх абавязкаў.

Пры гэтай нагодзе паведамляю, што чарговая Сустрэча Беларусаў Паўночнае Амэрыкі адбудзецца сёлета ў канцатыдні амэрыканскага сьвята Працы (Лэйбар Дэй) у суботу-нядзелю-панядзелак 4-5-6-га верасьня ў гор. Нью Брансьвіку, штат Нью Джэрзі ды будзе прысьвечаная 100-годзьдзю ад нараджэньня Янкі Купалы й Якуба Коласа. Праграма Сустрэчы будзе разасланая ў асобным лісьце й надрукаваная ў чарговым нумары газэты «Беларус».

Да гэтага ліста залучаю шэраг цікавых для Вас дакумэнтаў і матар'ялаў.

З глыбокай пашанай і прывітаньнямі др. Раісе.
Жыве БНР!

А. Шукелойць
Старшыня»

17-я Сэсія Рады БНР

У гэным 1982 годзе 27-га лістапада адбылася ў Нью Ёрку 17-я Сэсія Рады БНР. На ёй скончылася дзьве кадэнцыі старшынства др. Вінцэнта Жук-Грышкевіча. Дзьве кадэнцыі па шэсьць гадоў кожная вымагалі шмат натужнай працы, у якой бывала ўсяго – і цяжкасьцяў, няпрыемнасьцяў, і перажываньняў, давалі яму й маральнае задаваленьне, бо ведаў, што выконваў важнае заданьне й працаваў з адданьнем для ідэі, для якое жыў кожным фібрам свае істоты аж да самага канца.

У канцы сваёй прамовы да 17-ай сэсіі Рады БНР ён падзякаваў сябром Прэзыдыюму, Сакратарыяту, сябром радным за супрацоўніцтва й маральную падтрымку.

«Гэтаксама – ён гаварыў – У працы спрыяла тая акалічнасьць, што ў Нью Ёрку былі людзі, якія гасьцілі мяне ў сябе па некалькі дзён, а то й даўжэй, як спадарства Ганна й Валодзя Русакі, сп-ні Натальля й Галіна Орсы, сп-ства Люба й Віталі Кажаны, ды сп-ства Вера й Фаньціш Бартулі. Усім ім скаладаю тут шчырую падзяку». І пасьля далей:

«Зьявіліся новыя камплікацыі й цяжкасьці ў беларускім жыцьці й працы ў сувязі з царкоўнымі непаладкамі, перамагчы якія ў маім веку, пры маіх сілах і здароўі, сталася немагчымым.

Пара заняць месца Старшыні Рады БНР чалавеку маладзейшаму й здаравейшаму, але, зразумела, дасьведчанаму й выпрактыкаванаму ў працы палітычнай і грамадзкай і ў новых спэцыфічных абставінах...»

І не давялося Вінцэнту Жук-Грышкевічу дабыць да канца сваей апошняй 17-ай сэсіі Рады БНР. Фактычна ад самога пачатку сходу ягонае самапачуцьцё не варажыла дабра... Урэшце хуткая дапамога, яшчэ перад заканчэньнем сэсіі, забрала яго ў гошпіталь. На другі дзень мы змаглі вярнуцца ў Канаду.

І гэтак на парозе 80-х угодкаў закончылася яшчэ адна бачына няўтомнага й ахвярнага жыцьця др. Вінцэнта Жук-Грышкевіча, і пачалася новая.

XXV. ВОСЕМДЗЕСЯТЫЯ ГАДЫ ЖЫЦЬЦЯ

Паэтычна вітае Вінцэнта Жук-Грышкевіча зь ягоным 80-ці годзьдзем Натальля Арсеньнева:

Даражэнькі Вінцук,

Мой сябра зь дзён, калі вясёлкай
Прад намі клаліся шляхі,
Калі жыцьцё было на золку,
Калі яшчэ й ня сьніўся схіл...

– І вось ён тут, із намі сяньня,
Скрозь павальней жыцьця разгон,
Дні не ў красе,
  у адцьвітаньні...
А хочацца яшчэ змагацца
За ўчора, заўтра, усіх і ўсё!
Дык будзем жыць!
  Мо ў дзесяць столкаў
Гады йшчэ скруцяць нас, сябры,
Дасьць Бог, шматколернай вясёлкай
  і рэшта нашых дзён згарыць!

Натальля Арсеньнева.

Сакратар Фінансаў Рады БНР сп. Віталь Кажан піша:

«8. II. 1983.


Высока Паважаны
Прафэсар, Доктар Вінцэнт Жук-Грышкевіч,
Дарагі Вінцук!

З нагоды васьмідзесяці гадоў Твайго жыцьця я з Любай перасылаем Табе самыя шчырыя пажаданьні прадаўжаць гэтае прыгожае жыцьцё й на далей.

За Вамі 80 гадоў жыцьця, але-ж з гэтых гадоў Вы асабіста аддалі самую вялікую частку свайго жыцьця для нашай Беларускай Справы. Вы сваёй працай упісалі сваё ймя ў лік вялікіх працаўнікоў-змагароў за нашую Беларусь.

Жыве Беларусь!

Люба й Віталь Кажаны»



Партрэт др. Францішка Скарыны работы Пётры Мірановіча на франтовай сьцяне залі Беларускага Рэлігійна-Грамадзкага Цэнтру ў Таронта ў часе сьвяткаваньня 500-х угодкаў ад нараджэньня др. Францішка Скарыны. Таронта, 1985 (Партрэт – собскасьць Жук-Грышкевічаў).



Старшыня Рады БНР др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч і старшыня ЗБК др. Раіса Жук-Грышкевіч на сьвяце 500-х угодкаў ад нараджэньня др. Францішка Скарыны ў залі ЗБК. Таронта, 1985.

Др. Віктар Сенькевіч, разам з Вінцэнтам Жук-Грышкевічам адзін з закладчыкаў ЗБВБ, першы сакратар гэтае арганізацыі, з Палямос, Гішпаніі, 2-га лютага 1988 году піша да В. Жук-Грышкевіча:

«Дарагому й Вельмі Паважанау Настаўніку й Старэйшаму Сябру з нагоды 85-годзьдя з дня нараджэньня Сто год, добрага здароўя і шчасьця ад шчырага сэрца жадае Віктар Сенькевіч.

Многае Вам Лета!

P. S. Дарагая Раіса! Шчыра дзякую за прысланы камунікат (адносна 18-ай Сустрэчы БПА, Р. Ж.-Г.) і прывітаньні. Спадзяюся, што пабачымся ў час Сустрэчы ў Таронта.

З узаемнымі прывітаньнямі і пажаданьнямі

Віктар.»

І зноў Натальля Арсеньнева:

«Дарагому Вінцуку,

Адзінаму ўжо тутка сяньня сябру нашага далёкага, далёкага юнацтва, шчыра зычу яшчэ ці аднаго дзесяцігодзьдзя, сустрэчаў, працы і ўспамінаў.

Натальля Арсеньнева,

а прасьцей – Твая Наталка.»

Звольніўшыся з абавязкаў старшынства ў Радзе БНР, др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч не адыйшоў ад беларускага грамадзкага жыцьця, а заўсёды, як кажуць, трымаў руку на пульсе. Я была дзейнай, як сакратар, а ад 1985 году, як старшыня Згуртаваньня Беларусаў Канады; і ў розных сытуацыях Вінцук быў радай і парадай, быў той маральнай і кіруючай сілай, як казаў Міхась Яськевіч, «магутнай апорай». Браў удзел ува ўсіх нацыянальна-грамадзкіх імпрэзах, хіба што фізычныя недамаганьні затрымоўвалі яго ў ложку ці ў шпіталі.

Новы 1987 год ЗБК сустракала 17-га студзеня застольнай бяседай й танцамі. Імпрэза адзначала 40 год новай беларускай эміграцыі ў Канадзе. Паехалі на вечарыну, бязумоўна-ж, і мы ўдваём. Людзей было многа, шмат Бе-

ластачан. Іграла магнітафонная музыка, весела гулялі. Запрасіў Вінцук мяне да танцу, і мы ўключыліся між віруючых пар. Раптам на танцавальнай плошчы засталіся толькі мы з Вінцуком, і раздаліся агульныя воплескі. Быў гэта апошні наш танец, апошняя вечарына. Было весела й цяпер з любасьцяй гэта ўспамінаю.

Плянавая падрыхтоўка да наступнага жыцьця

Што мне ў памяць кідаецца, гэта Вінцуковая сыстэматычнасьць і плянавасьць, як у грамадзкай працы, так і ў яго асабістым жыцьці. На працягу даўжэйшага часу ён мне ўсё казаў: «Раіса, нам трэба йсьці ў "Funeral Home" – пахавальны дом. І ў мяне заўсёды было тысячы прычынаў адкладаць гэты не зусім прыемны занятак на пазьней... Урэшце раз зімой на пачатку 1986 году кажа мне Вінцук: «Раіса, я быў у "Funeral Home," цяпер нам треба йсьці ўдваём». Стаіць апрануты ў паліто й чакае. Раіса ня мела іншага выхаду, як апрануцца й ісьці зь ім... Далей адкладаць ня было як. У пахавальным доме было ўсё вельмі прыгожа ўладжана й гэта лагодзіла маё жахлівае адчуваньне. Урадавец выпаўніў два даўгія апытальнікі для нас абоіх, кожнаму асобны, і кажа: цяпер пойдзем выбіраць "coffins" – дамавіны. Ізноў у мяне першы водрух – не пайду! Урадавец кажа: «Гэта нічога..., ваш муж ужо выбраў... патырэбная толькі вашая згода». Я на мужаў выбар згоды не дала, выбрала іншыя – прыгажэйшыя й даражэйшыя, такую самую для кожнага з нас. Чалавек жа памірае толькі раз у жыцьці... Фактычна ў тым салёне з дамавінамі ня было так страшна, як мне здавалася. Ізноўжа ня страшна, бо прыгожа. Мусіць і ў раі прыгожа, таму там і добра. І ня дзівуйся,чытач, чаму я аб гэтых рэчах пішу. Пішу таму, што гэта важнае. Важна зрабіць падрыхтоўку за жыцьця, загадзя. Як прыйшла тая страшная гадзіна сьмерці, а прыйдзе яна для кожнага з нас, складаная справа паховінаў была заладжана, аплачана. Кіраўнік пахавальнага дому сам за ўсім сачыў.

Было гэта зімой 1986 году, а вясной у красавіку 1987 году Вінцук накіроўваецца, і бярэ мяне з сабой, у Нью Джэрзі залагодзіць справу паховінаў у тамтэйшым пахавальным доме, ды закупіць мейсца на беларускім могільніку Жыровіцкае Божае Маці ў Іст Брансвіку. Задаткі на мейсца на магілкі Вінцэнт даў ўжо даўно, першы раз та-

ды, як могілкі куплялiся, а другі раз колькі год пазьней. Справу арганізацыі беларускага могільніка ў Канадзе, недзе ў Таронта, парушаў ён у ЗБК і ККБК даўно, але ў людзей ня было зразуменьня гэткай патрэбы, і ў Канадзе беларускага могільніку няма. Ён-жа хацеў быць пахаваным між сваіх людзей, на беларускім могільніку. Ён верыў, што беларускі могільнік патрэбны, ён лучыць людзей у смутку, у малітве, а калісь будзе сьведчыць аб прысутнасьці беларусаў на амэрыканскім кантынэнце, аб беларускім народзе, аб беларушчыне. І не адабраў, калі на нашым могільніку на помніку было напісана прозьвішча беларускага нябошчыка польслай, а не беларускай, транскрыпцыяй. Казаў з абурэньнем: «Калісь скажуць, што гэта польслія могілкі!»

У Нью Джэрзі заехалі мы да спадарства Аліны й Валодзі Курылаў, Вінцуковых сяброў яшчэ з Англіі, з ЗБВБ. Дай Божа ім добрага здароў'я й доўгага, шчасьлівага жыцьця. Валодзя сустрэў нас на Ньюворк лётнішчы й пасьля вазіў усюды сваім самаходам: і на могілкі й у пахавальны дом, пакуль мы не заладзілі ўсіх нашых справаў. Завёз ён нас таксама й да Ханяўкаў, дзе два дваюродныя браты – Чэсь і Вінцук – бачыліся апошні раз на гэтым сьвеце. Чэсь памёр 2-га ліпеня 1988 году, (у дзень фэсту сьв. Марыі ў Будславе), Вінцук – 14 лютага 1989 году. Хацелася тады Вінцуку паехаць яшчэ й у Нью Ёрк, у Амэрыканскі Камітэт, куды, як Старшыня Рады БНР, будучы часта ў Нью Ёрку, бывала, заўсёды заходзіў, бачыўся й гутарыў там з праф. А. Адамовічам, др. Я. Запруднікам, сп-няй Яняй Каханоўскай, з сп. А. Шукелойцем, а па суседзтве ў "Public Library" на 5th Avenue з спадарствам Вітаўтам і Зорай Кіпелямі, ды др. В. Тумашам... Што й казаць, добрыя былі тады часы... Ды гэтым разам яму ў Нью Ёрк на разьвітаньне заехаць не ўдалося...

Вярнуўшыся ў Канаду, Вінцук хутка захварэў, дастаў запаленьне лёгкіх, быў у гошпіталі й моцна цярпеў, але неяк паправіўся, бо не закончана была яшчэ ягоная місія. Яшчэ трэба было яму памагаць Раісе, даваць рады й парады, у арганізацыі 18-яй Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі ў Таронта ў верасьні 1988 году, у арганізацыі Канфэрэнцыі прадстаўнікоў беларускіх асяродкаў Канады, кіраваць пабудовай Памятнага Беларускага Крыжа, што адзначаў бы 1000 год хрысьціянства ў Беларусі, і што

сьведчыў бы сотні гадоў пасьля нас аб тым, што ў Канадзе ў 2-ой палове 20-га стагодзьдзя былі беларусы... і ня толькі былі, а й тварылі; працавалі, каб жыла Беларусь.

Сьвята 25 Сакавіка для Вінцука было заўсёды асабліва важным, заўсёды ён падкрэсьліваў патрэбу ўрачыстага яго адзначэньня. Першы раз ён сьвяткаваў першага 25 Сакавіка, будучы 15-ці гадовым вучнем Беларускай Гімназіі, у 1918 годзе ў родным Будславе, а апошні раз – 70-я ўгодкі 25 Сакавіка ў 1988 годзе – ў Таронта ў Канадзе. Я была старшынёй ЗБК і кіраўніком урачыстага сходу. Нехта чытаў даклад, і як апошнімі гадамі сталася модным, гаварыў, як кажуць, аб усім, толькі не аб падзеях, што прывялі да паўстаньня Акту 25 Сакавіка, бо «аб гэтым усе ведаюць». Пасьля дакладу др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч папрасіў слова, як гэта ня раз бывала ў мінулым, для прывітаньня. Прывітаў прысутных з найбольшым нашым нацыянальным сьвятам, з 70-мі ўгодкамі Акту 25 Сакавіка, і спакойным, сумна лірычным голасам, з задуменьнем у вачох стаў расказваць пра падзеі 1917 і 1918 гадоў у Менску ды ў Беларусі. Ягоны плаўны расказ ліўся не з нататак, і здавалася, не з галавы, а недзе з глыбіні душы й сэрца, як запавет, каб ніколі не забывалі, не страцілі зь віду «пуцьцяводнай зоркі» – незалежнасьці Беларусі.

Гэтак закончыў Вінцэнт Жук-Грышкевіч свае сьвяткаваньні 25 Сакавіка – Дня Незалежнасьці Беларусі.

Беларускі Крыж

Стараньні аб узьнясеньне Беларускага Крыжа ў Прошчы Паўночна-Амэрыканскух Пакутнікаў у Мідлянд, што ў Канадзе, пачаліся восеньню 1987 году. Ды дазвол на гэта атрымалі мы толькі ў студзені 1988 году. Дырэктар "Martyrs' Shrine" айцец Джэймс Фаррэлл прыслаў нам ліст наступнага зьместу:

"MARTYRS' SHRINE
MIDLAND, ONTARIO
L4R 4K5

January 6, 1988

Dr. Raisa Žuk-Hryškievič
54 Mary Street
Barrie, Ont.
L4N 1T1

Dear Dr. Raisa Žuk:

It is sometime now since you visited Martyrs' Shrine regarding a Byelorussian pilgrimage. I think you mentioned Saturday, September 10th as a possible date. That date is fine with us. Other dates are also available.

You also mentioned the erection of a Byelorussian Cross on the shrine grounds. We looked at various sites. I have looked at other sites since you were there. I have enquired about a cross in fibreglass or a nice cross in wood. It has to be able to weather all kinds of climates. The total cost would be about $3,000.00 erected on the grounds.

You spoke of the millennium of Christianity. This would be a nice monument to mark it. We would be happy to have the monument on the grounds and to welcome the pilgrimage to the Shrine. I look forward to hearing from you.

Blessings for the New Year, 1988.

Sincerely yours,

James J. Farrell, S.J.,
Director"

Атрымаўшы дазвол на пабудову беларускага крыжа ў прошчы ў Мідляндзе, без адвалокі мы выдалі да беларускага грамадзтва за мяжой такі заклік:

Пабудова Беларускага Крыжа

Сёлета адзначаем 1000-годзьдзе хрысьціянства ў Беларусі. Гэты важны юбілей хочам услявіць узьняцьцем Беларускага Крыжа ў Канадзе, у сьвятым мейсцы паўночнаамэрыканскіх мучанікаў, што завецца Martyrs' Shrine,

Пакланяльня Мучанікам. Знаходзіцца гэтая прошча ў мясцовасьці Мідлянд, міляў 80 на поўнач ад гораду Таронта, над возерам Гюран на маляўнічым лясістым узгорку. На самай гары стаіць касьцёл, а навакола яго, на плошчы колькі гэктараў лесу-парку, разьмешчаныя крыжы або алтары розных нацыянальнасьцяў: італьянцаў, партугальцаў, славакаў, харватаў, палякаў, летувісаў, славенцаў, філіпінцаў... беларусаў тымчасам няма... Увесну, улетку, увосень штотыдня там адбываюцца палонмічтвы, тысячы людзей наведваюць прошчу Мучанікаў.

Думка, каб узьняць там і наш беларускі Еўфрасінеўскі крыж, нуртавала ў нас даўно, аж пакуль не дасьпела ў сувязі зь сёлетнім тысячагодзьдзем хрысьціянства.

На крыжы мог-бы быць выбіты напіс: «Крыж гэты ўзьнесены беларусамі (дата) ў тысячныя ўгодкі прыняцьця хрысьціянства ў Беларусі на славу Богу й Бацькаўшчыне». Гэта паангельцку. А далей ішоў-бы беларускі тэкст малітвы «Магутны Божа».

Як паінфармавала нас дырэкцыя прошчы, крыж гэткі будзе каштаваць тры тысячы даляраў.

Горача зьвяртаемся да вас, Дарагія Суродзічы, спрычыніцца фінансава да ўжыцьцяўленьня гэтага праекту, узьняцьця Беларускага Крыжа, які быў-бы годным адзначэньнем сёлетняга вялікага юбілею 1000-годзьдзя хрысьціянства ў Беларусі ды адначасна стаўся-б трывалым сьледам нашага нацыянальнага жыцьця на паўночна-амэрыканскім кантыненце.

Ахвяры, за якія будзерм Вам шчыра ўдзячныя, просім слаць на адрас (выпісваючы чэк на Byelorussian Cross):

Dr. Raisa Žuk-Hryškievič
54 Mary St., Barrie, Ont., L4N 1T1 Canada

Арганізатары праекту
«Беларускі Крыж»

(«Беларус», Нью Ёрк, 344, люты, 1988.)

Фактычны кошт пабудовы Крыжа быў значна большы:

Сам крыж	–	$3,000.00
мэмарыяльная з бронзы дошка	–	$1,578.95
"Landscaping" – уладжаньне вакол крыжа	–	$2,157.00
Усё разам каштавала	–	$6,735.95

І ў студзені 1988 году мы энэргічна прыступілі да рэалізаваньня нашай задумы. Часу было мала, бо трэба было, каб Крыж быў узьнесены да 18-ай Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі, якая адбудзецца 3-5-га верасьня 1988 г. у Таронта, каб у часе яе правесьці ўрачыстае пасьвячэньне Крыжа пры лічным удзеле беларусаў з розных частак сьвету – удзельнікаў пабудовы яго.

У траўні 1988 году ў часе 19-ае Сэсіі Рады БНР у Нью Ёрку адзін сябра зь недаверам у голасе спытаўся мяне:

– Ну, а што з Крыжам?! –

– Будуецца – адказваю, а ў думцы пытаньне, ці пасьпеем да Сустрэчы, бо справа пасоўваецца марудна, не так, як хацелася-б, ды пасьля былі яшчэ й камплікацыі з мэмарыяльнай дошкай. Кампанія абяцала зрабіць яе на канец верасьня, а нам трэба-ж на пачатак яго. Мусілі шукаць іншае кампаніі, у іншай правінцыі. На зямлі кіраўніком пабудовы Беларуслкага Крыжа быў др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч, а ў небе – Бог. Ён дазволіў узьнесьці Крыж да Сустрэчы БПА, дазволіў Вінцуку быць 5-га верасьня на высьвячэньні Крыжа й пасьля яшчэ адведаць яго разам з паэткай Натальляй Арсеньневай, якая й апела наш – «гэткі родны ўжо сэрцу Крыж».

Высьвячэньне Беларускага Крыжа

На трэці дзень 18-ай Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі, 5-га верасьня 1988 году, удзельнікі яе: з Бацькаўшчыны, Аўстраліі, Эўропы, ЗША й Канады – зрабілі паломніцтва ў прошчу, што каля Мідлянд, блізу 200 км. напоўнач ад Таронта, каб быць удзельнікамі ўрачыстасьці высьвячэньня Крыжа – беларускага Манумэнту – пастаўленага беларусамі для адзначэньня 1000 гадоў хрысьціянства ў Беларусі на славу Богу й Бацькаўшчыне-Беларусі.

Перад сьв. літургіяй, адпраўленай айцом Аляксандрам Надсонам, Апостальскім Візытатарам для Беларусаў, айцец Джэймс Фаррэлл, Дырэктар прошчы, што завецца Martyrs' Shrine in Midland, прывітаў паломніцтва беларусаў, вітаў пабудову беларускага Манумэнту ў прошчы й ацаніў гэту гістарычную падзею як узмоцненую сувязь з Усявышнім у малітвах за зьдзейсьненьне нашых ідэалаў. А гэтак, як у паломніцтве бралі ўдзел й канадыйцы, прыяцелі беларусаў з Бэры, а. Надсон прамаўляў і паангель-



Памятны Крыж Тысячагодзьдзя Хрысьціянства ў Беларусі ў Сьвятыні Пакутнікаў, Мідлянд, Канада. Пасьвячаны 5-га верасьня 1988 г.

ску, ды зазначыў, што багаслужба будзе ў беларускай мове, бо важна, каб наша малітва йшла да Бога ў нашай роднай мове. Толькі сьв. Эвангельле, апрача пабеларуску, прачытаў паангельску а. Фаррэлл, які быў у саслужэньні з айцом Надсонам. Апостала чытаў др. Вітаўт Рамук з Чыкага. Да багаслужбы пяялі ўсе пад кіраўніцтвам сп. Зьмітра Ціханюка, кіраўніка царкоўнага хору ў Гайнаўцы, гітарыстага ансамблю «Дубіноў», з удзелам такіх выдатных галасоў, як сп. Данчыка Андрусышына, др. Алы Орса-Романо, сп-ні Галіны Ганчарэнка, сп-ні Веры Заморскай, др. Язэпа Сажыча, спадарстваў Махначоў, Рамукоў ды іншых.

«Веру», «Войча наш» і малітву перад прычасьцем:

«Веру, Госпадзе, і вызнаю, што Ты сапраўды Хрыстос, Сын Бога жывога, што прышоў у сьвет збавіць грэшнікаў, сярод якіх я самы першы. Веру таксама, што гэта сапраўды Тваё сьвятое Цела й пачэсная Кроў. Малюся Табе, зжалься нада мною і даруй мне мае правіны вольныя й міжвольныя, якія я зрабіў словам і ўчынкам, сьведама й нясьведама; і дай мне бяз асуджэньня прыняць Твае сьвятыя Тайны для адпушчэньня грахоў і жыцьця вечнага.

Зрабі мяне сёньня, Сыне Божы, удзельнікам Тваёй тайнай Вячэры; я ня здраджу ворагам Тваім тайны, і ня дам пацалунку, як Юда, але як разбойнік вызнаю Цябе: Успомні мяне, Госпадзе, у валадарстве Тваім...»

– Усе гаварылі хорам уголас. І амаль усе пасьля былі «ўдзельнікамі тайнай Вячэры».

У сваім казаньні пабеларуску а. Надсон гаварыў пра значэньне крыжа для нас, хрысьціян. Бог стаўся чалавекам, каб нам паспачуваць, пражыць людзкія спакусы, крыўды, перасьледы й нявінны памёр на крыжы за нашыя віны, дзеля нашага збаўленьня. Сьмерцьцю на крыжы перамог сьмерць. Сваім уваскрашэньнем дараваў нам жыцьцё вечнае.

На заканчэньне гімн «Магутны Божа!» узьнімаў душы й сэрцы нашыя ўгару.

Пасьля Літургіі, якая дзеля неспрыяльнага надвор'я адбылася не, як плянавалася, перад Крыжам, а ў капліцы, паломнікі перайшлі да беларускага Крыжа. Ужо здалёк відаць было на ўзгорку паміж, бел-чырвона-белым беларускім і з кляновым лістком канадыйскім, сьцягамі, на фоне зеляні хвояў, кароны якіх зь ветрам, здалося, пяялі песьню хвалы, з манумэнтальнай дастойнасьцьцю ўзнімаўся ў неба бронзава-залацісты шасьціканцовы Еўфрасінеўскі Крыж.



5 верасьня 1988 г. перад адкрыцьцём і высьвячэньнем Беларускага Крыжа.

Гонар адкрыцьця мэмарыяльнай дошкі на каменнай падставе Крыжа, заслоненае бел-чырвона-белым сьцягам, айцец Надсон даручыў др. Раісе Жук-Грышкевіч. Адсланіўся на бронзавай табліцы напіс наступнага зьместу:

This Cross was erected by Byelorussians to commemorate the Millennium of Christianity in Byelorussia for the Glory of God with a prayer for the Freedom of Byelorussia.

Kryž hety pastaŭleny Biełarusami na adznačeńnie tysiačnych uhodkaŭ Chryscijanstva ŭ Biełarusi na sławu Bohu j Backauščynie – Biełarusi.

Mahutny Boža! Uładar susvietaŭ,
vializnych soncaŭ i serc małych,
nad Biełarusiaj cichoj i vietłaj
rassyp pramieńnie Svaje chvały.

Daj uradlivaść žytniovym nivam
učynkam našym pašli ŭmałot.
Zrabi svabodnaj, zrabi ščaślivaj
krainu našu j naš narod!

This Cross was blessed and dedicated during the 18th biennial Convention of Byelorussians of North America on September 5, 1988, by Rt. Rev. Alexander Nadson Apostolic Visitor for Byelorussians.

У часе ўрачыстай Багаслужбы (рэдакцыі а. Надсона) асьвячэньня Крыжа а. Надсон з натхненьнем гаварыў:

«**Госпадзе, Божа славы, Войча ўсемагутны...** мы, слугі Твае, удастоіўшыся такой вялікай ласкі, сёньня прыносім Велічы Тваёй славы, падзяку й пакорнае пакланеньне, **і просім Цябе глянуць ласкава на гэты вось Крыж, які мы паставілі на ўспамін аб ласцы веры сьвятой, дадзенай нашаму беларускаму народу тысяча гадоў таму назад.** Пашлі на яго ласку Духа Твайго Сьвятога, блаславі, асьвяці яго і дай яму быць нам і ўсяму нашаму беларускаму народу магутнай абаронаю ад усіх супраціўнікаў бачаных і нябачаных, аховаю ад спакусаў, умацаваньнем у веры, падтрымкаю надзеі і заахвочваньнем да дабрадзействаў.



Айцец Аляксандар Надсон, Апостальскі Візытатар для Беларусаў, моліцца перад адкрыцьцём мэмар'яльнай дошкі на падставе Крыжа. З правага боку ў глыбі – а. Джэймс Фаррэлл, Дырэктар Прошчы ў Мідлянд, Канада. 5-га верасьня 1988 г.



Высьвячэньне Беларускага памятнага Крыжа. Зь лева на права: др. В. Кіпель, Галіна Ганчарэнка, Яня Каханоўская, Натальля Арсеньнева, А. Шукелойць, др. В. Жук-Грышкевіч, др. В. Рамук, а. А. Надсон, Ул. Праховіч, а. Дж. Фаррэлл.

Будзь спагадлівы для нас усіх, якія перад гэтым Крыжам молімся, і дай нам спаўненьне просьбаў для нашага збаўленьня. І як Крыжам сьвет быў вызвалены ад асуджэньня, так і слугам Тваім, і ўсяму нашаму беларускаму народу, і ўсім бацьком, братом і сёстрам нашым, якія памерлі ў надзеі ўваскрасеньня й жыцьця вечнага, асабліва тым, якія аддалі жыцьцё за свой народ, дай, каб яны былі пераможцамі граху, даруючы ім усё патрэбнае да збаўленьня і, настаўляючы ўсіх нас Крыжам Тваім да ўсяго добрага, прывядзі да Твайго Валадарства. Бо Ты – Крыніца й Падавец усяго добрага і Табе славу аддаем, Айцу й Сыну і Сьвятому Духу цяпер і заўсёды, і на векі вякоў. Амін.»

Пасьля асьвячэньня Крыжа сьвятой вадой – тройчы крыжапаклонны напеў:

«Крыжу Тваяму пакланяемся, Уладыка наш, і сьвятое ўваскрасеньне Тваё славім»

І малітва Сьвятара: «...Прыйдзіце, верныя, паклонімся жыцьцядайнаму Крыжу... Прыйдзіце верныя, паклонімся дрэву, якім мы удастоіліся скрышыць галовы нябачаных ворагаў; прыйдзіце, ўсе народы зямлі, каб песьнямі ўсла-

віць крыж Гасподні... Сяньня мы, хрысьціяне, са страхам цалуем цябе, славім да цябе прыбітага Бога, кажучы: «Госпадзе, што быў прыбіты да крыжа, зьмілуйся над намі, бо Ты добры й чалавекалюбец. Слава Табе, Хрысьце Божа, надзея наша, слава Табе!»



Удзельнікі высьвячэньня Беларускага Крыжа. Прошча, Мідлянд, Канада, 5 верасьня, 1988 г.

Сход удзячнасьці

Урачыстасьці асьвячэньня Крыжа – беларускага манумэнту – сваёй прысутнасьцяй удастоілі: Дырэктар прошчы айцец Джэймс Фаррэл, кіраўнік пабудовы Крыжа й былы Старшыня Рады БНР сьв. пам. др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч, Старшыня Рады БНР др. Язэп Сажыц, паэтка Натальля Арсеньнева, пісьменьнік Сакрат Яновіч і сп-ня Таня Яновіч з Беласточчыны, удзельнікі ансамблю «Дубіны» пад кіраўніцтвам сп. Пётры Ськепкі з Беласточчыны, сьпявак Данчык Андрусышын, сп-ня Івонка Сурвіла, мастачка й адначасна старшыня Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ў Канадзе, др. Ала Орса-Романо, кіраўнік танцавальнага гуртка «Васілёк», кіраўнікі беларускіх радыёперадачаў: сп. сп. Уладзіслаў Пра́ховіч у Беластоку, Міхась Лужынскі ў Сыднэі ў Аўстраліі; старшыні



Вінцэнт і Раіса Жук-Грышкевічы каля беларускага Крыжа. Верасень, 1988.

беларускіх арганізацыяў: сп. Антон Шукелойць – Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня, др. Вітаўт Кіпель – Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ў Нью Ёрку, спня Вера Рамук – Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Чыкага, сп. Анатоль Храноўскі – Згуртаваньня Беларусаў

Правінцыі Квэбэку, сп. Аляксандар Палескі – Таварыства Беларусь, сп. Паўлюк Пашкевіч – заступнік старшыні Кардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады. Нельга ня ўспомніць сп-ні Яні Каханоўскае, пляменніцы Івана й Антона Луцкевічаў; прадстаўнікоў далёкага Лёс Анджылес – спадарства Каці й Славы Вініцкіх, спадарства Стусаў і сп. Язэпа Арцюха, ды зь ня менш далёкага канадыйскага Ванкувэру сп-ні Эвы Пашкевіч-Мэк Карвіл.

Зьвяртаючыся да дастойных Айцоў і ўсіх прысутных, др. Раіса Жук-Грышкевіч, старшыня Згуртаваньня Беларусаў Канады, аддаўшы хвалу Богу, падзякавала а. Аляксандру Надсону, Апостальскаму Візытатару для беларусаў (з Англіі) за Багаслужбы асьвячэньня Крыжа, а. Джэймс Фаррэлл, Дырэктару "Martyrs' Shrine in Midland" за дазвол пабудовы Беларускага Крыжа на тэрыторыі прошчы, сп. Рэй Пітс за фактычнае выкананьне манумэнту, усім ахвярадаўцам і прыяцелям беларусаў за маральную й матарыяльную дапамогу ў зрэалізаваньні праекту Беларускага Крыжа, маладому Рыгору Храноўскаму за задакумэнтаваньне падзеі на «відэатэйпе», тым, што рабілі здымкі, і ўсім прысутным, што ўзялі ўдзел у малітве й урачыстасьцях гістарычнае падзеі – высьвячэньні першага Беларускага Крыжа-Манумэнту ў Канадзе, ды наагул за мяжой.

Прамаўлялі сп.сп.: Антон Шукелойць, старшыня БАЗА, др. Вітаўт Кіпель, старшыня БІНіМ у Нью Ёрку. Уладзіслаў Праховіч, кіраўнік беларускіх радыяперадачаў у Беластоку. Сёстры Галена й Ларыса Храноўскія (з Мантрэалю), хораша апранутыя ў беларускія народныя строі, ад імя Згуртаваньня Беларусаў Правінцыі Квэбэку ўручылі др. Раісе Жук-Грышкевіч на пабудову Беларускага Крыжа чэк на $600.00 (шэсьцьсот даляраў), прачыталі лісту 28-мі асоб-ахвярадаўцаў. Шчырая падзяка ахвярадаўцам і прызнаньне сям'і Храноўскіх, якая пад кіраўніцтвам свайго бацькі сп. Анатоля Храноўскага заўсёды гуляла вядучую ролю ў беларускім жыцьці Мантрэалю, а ў гэтым юбілейным годзе зарганізавала збор ахвяраў на Беларускі Крыж.

Ды яшчэ адна дэталь. Сп. Праховіч, расказваючы пра Беларускі Музэй у Беластоку, зьвярнуў увагу на цікавы й прыгожы для Музэю экспанат, які ён угледзяў... на плячох сп. Анатоля Храноўскага. Халоднае было надвор'е, і сп. А. Храноўскі меў на сабе белы свэтар, упрыгожаны бе-

ларускім арнамэнтам, на сьпіне якога была выява чырвонага канадыйскага ліста, а на ім – беларуская Пагоня! Ня гледзячы на холад, сп. Анатоль зьняў з сябе свэтар і ўручыў яго сп. Уладзіславу Праховічу як экспанат у Беларускі Музэй у Беластоку ад беларусаў Канады. А вязала свэтар сп-ня Крыстына Храноўская. Агульнаадсьпяванай песьняй «Люблю наш край» закончылася гістарычная падзея ў прошчы ў Мідлянд.

Хто ехаў у напрамку Таронта, хоць і ўсе былі запрошаны, затрымаўся па дарозе ў Бэры ў кватэры Жук-Грышкевічаў на полудзень.

Слава Табе, Госпадзе, слава Табе! Беларускі Памятны Крыж пастаўлены, асьвячаны й апеты паэткай:

Наталья Арсеньнева

Крыж

Як вокам ськінуць –
сьцяг пушчаў сініх...
За пушчай далеч, яшчэ сіней...
А тут, на ўзвышшы, стаіць над імі
наш Крыж прыгожы, маўляў у сьне...

Шмат чулі сьвету крыжы маленьняў,
шмат просьбаў, выкліканых бядой.
Прыйшлі й мы ў Прошчу сагнуць каленьні,
сьвяціць ня нечы ўжо крыж, а свой.

«Зрабі свабоднай, зрабі шчасьлівай
краіну нашу», маліўся хор,
і ўторыў натаўп, і сьпелай нівай
хінуўся, ветру наперакор.

А вецер дужаў, кудысь аблокі
зусім павосеньску ўжо плылі.
Маўчала прошча, унізе-ж, далёка
сінелі зарасьнікі й палі.

– «Магутны Божа», бяз слоў прасілі
мы ўсе, а рукі узьняўшы ўзвыш,
стаяў нязрушна на ўзгорку схіле
ён, гэткі родны ўжо сэрцу Крыж.

Тут – дождж імгненны каменьне сьпляміў,
рассыпаў кроплі ў траве, у лісьці...
Няйнакш –
і Нехта дзесь там, над намі,
наш Крыж вадою сьвятой хрысьціў.

Прошча, 5 верасьня, 1988 году.

Другая беларуская паэтка **Данута Бічэль** піша:

Божа!
Пад крыжам адзіным народ наш
злучы.
Дай прычасьціцца крывёю Хрыстовай
Крывіі.
Перакрыжуй нашых душаў шляхі
баравыя,
Роднаю мовай малітву шаптаць
навучы.

Пасьля высьвячэньня Беларускага Крыжа Дырэктар прошчы а. Фаррэлл піша да нас ліст наступнага зьместу:

"September 16, 1988.

Raisa Žuk-Hryškievič, D.D.S.
54 Mary St.
Barrie, Ont., L4N lTl

Dear Doctor Žuk:

You must be very happy with the dedication ceremony of the Byelorussian Cross on Martyrs' Shrine grounds. There was a nice and friendly crowd of people. The Mass, the blessing of the cross and the gathering to express appreciation, all went well. A lovely warm spirit prevailed. We at the Shrine, like this new addition to these grounds of faith. I am sure it will add to the faith of many pilgrims. I thank you most sincerely for suggesting it and for all you and your husband did to make it a reality.

It would be nice if an annual celebration would take place at the cross. If you have any ideas, I welcome them.

Blessings. May the Martyrs intercede for you and your husband always.

Sincerely yours,

Rev. James J. Farrell, S.J.
Director"

20 верасьня 1988 году беларускае грамадзтва адзначала ў Нью Ёрку 85-я ўгодкі жыцьця беларускай паэткі Натальлі Арсеньневай. З гэтай нагоды др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч шле ёй прывітальны ліст:

«VINCENT ŽUK-HRYŠKIEVIČ
54 Mary Street
Barrie, Ontario
728-7581

Бэры, 20 верасьня, 1988.

Высока Паважанай Беларускай Паэтцы
Натальлі Арсеньневай
у Рочэстар, ЗША.

Дарагая Наталка!

Сяброўка мая з тых школьных дзён, з той маладосьці, з той школьнай лаўкі Віленскай Беларускай Гімназіі, з тых Базыльянскіх муроў з Беларускім Музэем Івана Луцкевіча, сяньня раскінутым і адданым чужынцам...

Ты калісь мне пісала:

«Вось – Базыльянскія муры
у клясе – цішыня густая...
а мы,
да позьняе пары,
з Табой наш часапіс складаем.
Гартаем допісаў лісткі,
у пальцы хухаен,
– і пішам.
Маўляў на руні каласкі,
радкамі прарастае ціша.
Расьце й каласіцца верш,

а сэрцу радасна й зьзянна.
Тваё, маё – жыло й жыве
непакананае, да сяньня.»

І гаворачы Тваімі славамі, але ськіваванымі гэтым разам да Цябе, Дарагая:

«Жыві-ж сто год нам, Юбіляр,
Дый болей,
калі ахвоту маеш!»

Гэта шчыра жадаем Табе мы з Раісай. І яшчэ адно: мы дзякуем і хай Бог Табе адудзячыцца за тое, што сваёй песьняй, сваім вершам «Крыж», услявіла наш Беларускі Крыж у Прошчы ў Канадзе.

Шчыра адданыя Табе,

Вінцэнт і Раіса Жук-Грышкевічы»

Даведаўшыся, што Прэфэкт Кангрэгацыі Усходніх Цэркваў у Рыме зацікавіўся Беларускім Крыжам і пытаўся айца Аляксандра Надсона, Кансультатара гэтай Кангрэгацыіі, ці ня мае ён здымку Крыжа, др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч выслаў Яго Эксцэленцыі Д. С. Ц. Люрдусамы дзьве фатаграфіі Беларускага Крыжа ў прошчы ў Мідлянд-зе й атрымаў ад яго ліст наступнага зьместу:

"CONGREGATIO PRO ECCLESIIS ORIENTALIBUS
00193 Roma,
Via della Conciliazione, 34

January 18, 1989

Dear Mr. Žuk-Hryškievič,

I have duly received your letter, dated December 8 last, by which you courteously sent me two photographs of the Cross erected at the Martyrs' Shrine in Midland, Ontario, to commemorate the Millennium of the Baptism of Rus'.

Let me assure you that I deeply appreciate your initiative and I avail myself of this opportunity to offer you my best wishes for the spiritual and pastoral well-being of the Byelorussian community in North America.

Invoking God's blessing upon you, and with all kind regards, I am

Sincerely yours in Christ,

D. Simon Card. Lourdusamy
Prefect

Mr. Vincent Žuk-Hryškievič
54 Mary Street
BARRIE, Ontario, L4N lTl
Canada."

Паломніцтвы да Беларускага Крыжа адбываюцца кожны год, але да іх др. Вінцэнт Жук-Грышкевіч ужо не дажыў, ды кожны раз у часе паломніцтва ўспаміналі мы Яго, як будаўніка Крыжа, у малітвах за вечную радасьць Ягонай душы. У 1989 годзе стараньнем арганізатараў праекту «Беларускі Крыж» выданы былі беларускія малітоўныя карткі й паштоўкі Беларускага памятнага Крыжа. Адны й другія можна набыць у Прошчы.

Канфэрэнцыя Прадстаўнікоў Беларускіх Асяродкаў Канады


Адразу пасьля Сустрэчы БПА (на пачатку верасьня 1988 г.) прыступілі мы да арганізацыі **Канфэрэнцыі Прадстаўнікоў Беларускіх Асяродкаў Канады.** Канфэрэнцыя была назначана на 18-19 сакавіка 1989 году ў гасьцінніцы Skyline Triumph Hotel у Таронта. Была яна асаблівай таму, што на правядзеньне яе арганізатар – Каардынацыйны Камітэт Беларусаў Канады – атрымаў субсыдыю фэдэральнага ўраду (адзінаццаць тысяч даляраў), у ёй мелі ўзяць удзел прадстаўнікі малодшага пакаленьня беларусаў з усяе Канады, ды што дакладчыкі пяцёх працоўных сэсіяў мелі быць, апрача аднаго беларуса – др. В. Кіпеля, канадыйцы. Вінцэнт уважаў гэтую падзею за вельмі важную й усёй душой браў удзел у падрыхтоўцы да яе.

(Аб канфэрэнцыі глядзі разьдзел XV. Каардынацыйны Камітэт Беларусаў Канады)


На прыродзе: «Любіў і ты як я блукаць па пералесках...» Н. Арсеньнева.



Вінцэнт Жук-Грышкевіч пад Лёнданам на Тэмзе. 1949 г.




Вінцэнт Жук-Грышкевіч, Канада, 1971.




Раіса й Вінцук Жук-Грышкевічы прыехалі на летні адпачынак над раку Атаву. Deep River, 1970-я гады.



Лодка Жук-Грышкевічаў на рацэ Атаве. 1970-я гады.




Раіса й Вінцук са злоўленым ім у рацэ Атаве шчупаком.
Канец 1960-х гадоў.



Вінцук Жук-Грышкевіч каля свае лодкі із сваім уловам. 9-га жніўня 1976 году на рацэ Атаве.




Вінцук і асяцёр над ракой Атавай, 1976.



Вінцук і стэрджэн на рацэ Атаве, 1976.



Каля котыджу. Зь лева на права: Вінцэнт Жук-Грышкевіч, Паўлінка, Івонка, Ганулька Сурвілы, Раіса Жук-Грышкевіч, Янка Сурвіла. Pinecrest Resort *над ракой Атавай. 8 жніўня, 1976.*



У лесе над ракой Атавай. Зь лева на права: Івонка Сурвіла, Вінцук і Раіса Жук-Грышкевічы. Валя й Міхась Пашкевічы. 1976.



Раіса й Вінцук Жук-Грышкевічы над ракой Атавай. Жнівень, 1976.



Рагнеда Аляхновіч, дачка Вінцэнта Жук-Грышкевіча й ягоныя ўнукі й праўнукі.

XXVI. АПОШНІ ДЗЕНЬ

10-га лютага 1989 году прыпадалі 86-я ўгодкі жыцьця Вінцэнта. Зраніцы гэтага дня ён упаў дома й зламаў бядро. Скорая дапамога забрала яго ў гошпіталь. Гэтага-ж дня позна ўвечары яго апэравалі. Апэрацыя трывала надта доўга. Я сядзела ў шпітальнай пачакальні і ціха плакала. Людзі пыталсія, чым могуць мне памагчы... Я баялася, што ягонае схварэлае сэрца ня вытрывае даўгое й скамплікаванае апэрацыі. Вытрываў і апэрацыю й яшчэ чатыры дні агоніі. У апошні дзень, 14-га лютага, папаўдні, прыйшлі яго адведаць нашы Бэрскія прыяцелі: Бэрнардэта й Морыс Мэрдокі. Вінцэнт ім расказваў пра вялікі зьезд беларускі, на якім будуць браць удзел і канадыйцы й прадстаўнікі канадзкага ўраду. Гаварыў плаўна й вобразна паангельску, бо нашы прыяцелі англясасы. Усё было-б нармальна, каб ня тое, што ён цьвердзіў, што «і мы з Раісай на зьезьдзе будзем...» Усьцяж пасылаў мяне паглядзець, ці людзі ўжо зьбіраюцца... У канцы гэтага дня перад поўначчу, з вобразам бел-чырвона-белага сьцягу ў вачох, адыйшоў Вінцук навек да свайго Творцы.

Гэтак закончылася апошняя бачына кнігі Ягонага даўгога й карыснага, творчага й ахвярнага жыцьця на зямлі.

На другі дзень у сераду цела сьв. пам. Вінцэнта Жук-Грышкевіча спачывала ў пахавальным доме Steckley-Gooderham. У галаве яго стаяў вялізарны, што пасьля закрываў усю дамавіну, бел-чырвона-белы сьцяг. На дамавіне й вакол яе кветкі ад: жонкі, сям'і, Сэктару Рады БНР у Канадзе, Згуртаваньня Беларусў Канады, Парафіі Сьв. Кірылы Тураўскага ў Таронта, прыяцеляў беларусаў і канадыйцаў, суседзяў. У пятніцу прыляцеў з Англіі а. Аляксандар Надсон, Апостальскі Візытатар для Беларусаў. Увечары адслужыў ён у пахавальным доме пры шматлікім удзеле людзей – беларусаў з Таронта й ваколіц, ды сяброў і знаёмых з Бэры – пабеларуску паніхіду. На другі дзень зраніцы цела сьв. пам. Вінцэнта Жук-Грышкевіча перанесьлі сябры Нябожчыка: др. Барыс Рагуля, Віктар Касьцюкевіч, Аркадзь Харавец і Барыс Кірка ў каталіцкі касьцёл Сьвятое Марыі. Сустрэў яго там у белым аблачэньні малады й рослы айцец Пол Сэбор (чэскага паходжаньня) славамі: «Вітаю Вас, Вінцэнт, апошні раз у Ст. Мэры'с...».

Ён адслужыў імшу, пры удзеле а. Аляксандра Надсона й прысутнасьці Архіяпіскапа БАПЦ Уладыкі Мікалая.

Пасьля імшы Уладыка Мікалай адслужыў кароткую паніхіду. Цела Вінцэнта Жук-Грышкевіча дырэкцыя пахавальнага дому самалётам адправіла ў Нью Джэрзі. Памінальная бяседа адбылася ў кватэры др. Р. Жук-Грышкевіч. Настыупнага дня ў нядзелю мы з айцом Надсонам паляцелі ў Нью Джэрзі. Затрымаліся ў сп-ні Марыі Ханяўкі. Ня было ўжо там Чэся, ня было з намі й Вінцука... У панядзелак у пахавальным доме, куды перавезена было цела сьв. пам. Вінцэнта Жук-Грышкевіча, айцец Васіль Андрэюк, настаяцель БАПЦарквы Жыровіцкай Божай Маці ў Гайлянд-Парку, адслужыў паніхіду з удзелам царкоўнага хору пад кіраўніцтвам сп. Лявона Стагановіча. На другі дзень адбыліся, як паведамляе газэта «Беларус»:

«Паховіны др. В. Жук-Грышкевіча

Пахаваньне сьв. пам. др. Вінцэнта Жук-Грышкевіча, былога Сатаршыні Рады БНР, адбылося ў аўторак 21 лютага 1989 году. У царкве Жыровіцкай Божай Маці ў Гайлянд-Парку а. Аляксандар Надсон адправіў сьв. Літургію й паніхіду. Хорам кіраваў сп. Міхась Тулейка. Ля дамавіны, пакрытае бел-чырвона-белым сьцягам, стаяла ганаровая вэтэранская варта.

Над магілай на Беларускім могільніку ў Іст-Брансвіку Старшыня Рады БНР др. Язэп Сажыц сказаў разьвітальнае слова. Песьня «Сьпі пад курганам герояў» прагучэла, як заключны акорд пачуцьцяў тых, што праводзілі ў апошні шлях.

Памінальная бяседа адбылася ў Саўт-Рывэры з удзелам сям'і нябожчыка, радных, сяброў і суродзічаў, што зьехаліся аддаць апошнюю пашану вялікаму нацыянальнаму працаўніку.

Успамінамі пра цярністы шлях памерлага, ягонае працавітае й самаахвярнае жыцьцё на беларускай грамадзкай ніве падзяліліся сп. сп. В. Русак, а. А. Надсон, А. Шукелойць, др. Я. Запруднік, Я. Азарка, М. Тулейка, сп-ня Р. Галяк, Ул. Курыла, В. Стома.

Усім шчыра дзякавала за малітвы й духовае падтрыманьне жонка нябожчыка др. Р. Жук-Грышкевіч.

Айцец Васіль Андрэюк, настаяцель парафіі Жыровіцкай Божай Маці, перад канчальнай малітвай выказаў

спачуваньні ўдаве ад імя Архіепіскапа БАПЦ Мікалая і ўправы свае парафіі.»

(«Беларус», Нью Ёрк, 357а Сакавік 1989 г.)

Разьвітальнае слова сп. Міхася Тулейкі ў часе памінальнай бяседы:

«Дарагія Айцы! Вельмі Паважаная Спадарыня Доктар Раіса Жук-Грышкевіч! Шаноўныя сябры Радныя! Паважаныя Спадарыні й Спадары!

Раз за разам мы сустракаемся над магіламі нашых дарагіх суродзічаў, якія адыходзяць у сьвет вечнага спачынку. У працягу цэлага году мы сабраліся сяньня ўжо чацьверты раз, каб ушанаваць памяць аднаго з нашых лідараў, заслужанага на беларускай нацыянальнай і палітычнай ніве, сьветлай памяці Доктара Вінцэнта Жук-Грышкевіча, які прыбыў з Канады на сваё апошняе прыстанішча – Беларускі магільнік у Іст Брансвіку – Нью Джэрзі, які стаўся якбы сьвятым месцам для беларусаў Амэрыкі, бо ўжо амаль кожны з нас мае кагось блізкага, каму прыпаў кусочак зямлі на гэтых могілках, дый бадай усе мы з часам знойдзем там сваё ціхае, сонцам агрэтае месца.

Аб дзейнасьці сьв. памяці Доктара Вінцэнта Грышкевіча мы ведаем нямала, аб гэтым ужо сказалі мае папярэднікі, а я веру, што будзе ўсё напісана ў нашай слаўнай газэце «Беларус». Сёньня, ад імя Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня ў Нью Джэрзы, я хачу скласьці глыбокае спачуваньне Спадарыні Доктар Жук-Грышкевіч у страце дарагога мужа, зь якім яна прыкладна працавала на дабро Беларускага Паняволенага Народу.

Безумоўна, шкада нам кажнага суродзіча беларуса, які пакідае нас па волі Божай, аднак нам трэба верыць, што ўсе, хто працуе для іншых, для дабра свайго народу й бацькаўшчыны, яны не паміраюць, яны жывуць вечна, бо іхнія ўчынкі вечныя.

І так, няхай жыве між намі сьветлая памяць Вінцэнта Жук-Грышкевіча й натхняе нас да далейшай дзейнасьці й змаганьня за Вольную й Незалежную Беларусь!

21-га лютага 1989 г.

Міхась Тулейка»

Разьвітальнае слова сп. Васіля Стомы:

«Высокадастойныя Айцы, Вельмішаважаная др. Раіса Жук-Грышкевіч, Паважаныя Радныя, Суродзічы, Сусе-дзі!

Таму, што мне выпала гаварыць пазьней за ўсіх, дык у мяне мімаволі паўстала думка, што можа мне ня будзе аб чым гаварыць. Але гэтая думка была ў мяне толькі лічаныя сэкунды, бо я адчуў, што гэта проста звычайная «трэма», якая будзе ў падобных да мяне неспрактыкаваных прамоўцаў. Бо гаварыць аб Тым, зь Кім мы сёньня разьвітваемся назаўсёды, можна яшчэ вельмі шмат і вельмі доўга пад умовай, што прамоўца будзе мець большыя ад мяне здольнасьці, – бо памёр ня толькі былы Старшыня Рады БНР, палкі Патрыёт свайго хоць Прыгнечанага, але Няўміручага Народу, памёр Настаўнік, Жаўнер, але й зь вялікае літараы ЧАЛАВЕК.

Калі іншыя гаварылі аб Нябожчыку, успамінаючы Яго як Грамадзкага і Палітычнага Дзеяча, дык мне нях-ай будзе дазволена затрымацца на Ягоных, так сказаць, агульналюдзкіх якасьцях, якімі бываюць адораныя далёка ня ўсе, а толькі выбраныя людзі. Гэта быў чалавек, які вельмі рэдка, а бадай што й ніколі не гаварыў нічога благога аб іншых, хоць некаторыя зь іх і мелі пэўныя заганы і былі часамі настаўленыя супраць Яго. Але нават пачуўшы канкрэтныя факты іх чынаў, ён стараўся ўсё пачутае неяк зьнівэляваць і пусьціць у няпамяць. Ён быў таксама глыбока веруючым чалавекам, аднак без дадатку рэлігійнага фанатызму. Будучы сам рыма-каталіком, ён вельмі часта маліўся ў нашай царкве Жыровіцкае Божае Маці.

Я вельмі ганаруся і буду да сьмерці ганарыцца тым, што Нябожчык залічаў мяне да сваіх прыяцеляў, пачынаючы ад 60-х гадоў і аж да канца. Вось здаецца гэтая прыязьнь да мяне і была прычынай таго, што я свайго часу быў ім запрошаны на адзінаццаціднёвы адпачынак на цудоўнай Оттава-Рывэр (рацэ Атаве) у Канадзе. Туды быў таксама запрошаны сёньня ўжо адыйшоўшы ў вечнасьць сьв. пам. Уладзімір Бортнік, між іншым, мой недалёкі сусед з бацькаўшчыны. Ён таксама, як і Нябожчык, быў сапраўдным Сынам свайго Народу, а пры гэтым і палітычна-грамадзкім дзеячом. Вось тады я меў нагоду назіраць, колькі супольнага ў сваіх характарах мелі гэтыя два са-

праўды верныя сыны Беларусі. Колькі праектаў і дыскусіяў над гэтымі праектамі я меў нагоду тады пачуць! Гэтыя дыскусіі звычайна пачыналіся, калі мы ўсе разам з сонейкам выяжджалі на рыбалку і не перапыняліся нават і тады, калі ў аднаго зь іх, або нават і ў абодвух, пачынала «кляваць». Прадаўжаліся гэтыя дыскусіі й тады, калі мы вечарам вярталіся ў прыбярэжны «котыдж», дзе звычайна я браўся за прыгатаваньне скромнай рыбацкай вячэры, і пазьней, калі я ўжо пачынаў засынаць.

Сягоньня-ж іх абодвых ужо няма. І яны адыйшлі якраз у такім часе, калі праз цёмныя хмары няволі пачынае прабівацца кволы, а мажліва й ілюзорны агеньчык свабоды. А іх няма!

Нябожчык заўсёды, бываючы ў асяродзьдзі бліжэйшых да сябе людзей, называў сам сябе папросту «Вінцук». І вось сёньня, наш дарагі Вінцук ужо ляжыць на гэтым, як мы прызвычаіліся яго называць, «лапіку беларускай зямелькі» ў Іст Брансвіку.

Дык сьпі спакойна, Дарагі й Незабыўны Вінцук! Няхай Табе сьніцца родны Будслаў. Мы-ж Цябе не забудзем і будзем цьвёрда верыць, што мажліва ўжо хутка Твае косьці будуць з гонарам перанесены ў Вольны Менск і паложаны побач з Магілай Няведамага Жаўнера на Пляцу Свабоды. Калі-ж да гэтага ня дойдзе, дык напэўна Тваё імя быдзе выбіта на Табліцы Герояў, на тым-жа Пляцу.

21-га лютага, 1989 г.

Васіль Стома»

«З жыцьця ў Кліўлендзе
Паніхіда па сьв. пам. В. Жук-Грышкевічу

У нядзелю 19 лютага ў царкве Жыровіцкай Божай Маці была адслужана паніхіда за супакой душы былога Старшыні Рады БНР сьв. пам. Вінцэнта Жук-Грышкевіча. Паніхіду адправілі а.а. Міхась Страпко й Якуб Пэрута. У часе паніхіды радныя Андрэй Стрэчань і Янка Каваленка трымалі беларускі й амэрыканскі сьцягі ў гонар нябожчыка. Пазьней за памінальным сталом было сказана колькі цёплых словаў аб памерлым сябру. Няхай раньні

вясновы вецер занясе ягоны змагарны дух на родную беларускую зямельку.

Жыве Беларусь!

Рада сэктару Кліўленд-Дэтройт:
Андрэй Стрэчань, Уладзімір Бакуновіч, Янка Ханенка.»

(«Беларус», Нью Ёрк, 357а, 1989.)

12 травеня, 1989.

Іх Міласьці Спадаром:
Андрэю Стрэчаню,
Уладзіміру Бакуновічу й
Янку Ханенку –
Радзе Сэктару Рады БНР Кліўлянд-Дэтройт.

Вельмі Паважаныя й Драгія Сябры Радныя!

Сардэчна дзякую Вам за памяць, руплівасьць, адданьне пашаны памяці майму дарагому мужу сьв. пам. др. Вінцэнту Жук-Грышкевічу, былому Старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі. Сардэчна дзякую Дастойным Айцом: Міхасю Страпко й Янку Пэрута за адслужэньне 19-га лютага паніхіды за супакой душы майго мужа Вінцэнта, сп. сп. Андрэю Стрэчаню й Янку Каваленку за трыманьне сьцягоў у гонар Нябожчыка; спадарыням за наладжаньне памінальнай бяседы, усім прысутным на паніхідзе й памінках, за малітвы, і «цёплыя словы», ды аўтару словаў: «Няхай раньні вясновы вецер занясе Ягоны змагарны дух на родную беларускую зямельку. Жыве Беларусь!».

З пашанай да Вас, Сябры Радныя з Кліўлянд-Дэтройт Сэктару Рады БНР.

Раіса Жук-Грышкевіч

На саракавы дзень пасьля сьмерці сьв. пам. др. В. Жук-Грышкевіча, 26 сакавіка, у царкве Жыровіцкай Божай Маці ў Гайлянд Парку а. Васіль Андрэюк адслужыў пры ўдзеле Радных БНР і парахвян царквы паніхіду за супакой Ягонае душы.

У 357а нумары «Беларуса» пададзена наступнае:

«Памяці др. Вінцэнта Жук-Грышкевіча

Заміж вянка на магілу, ахвяры на Беларускі Крыж.

1. Эва і Ян Мэк Карвіл (Э. Пашкевіч).....кан. дал. 100.00
2. Рагнеда Увітнэй (Ханяўка) з сям'ёй.....117.23
3. Марыя Ханяўка.....58.62
4. Галіна й Васіль Русакі.....58.62
5. Нікіфар і Ванда Сільвановіч.....40.00
6. Сям'я Стагановічаў.....29.31
7. Еўфрасіньня Станяшак.....23.45
8. Пётра Нядзьведзкі.....23.45
9. Пётра й Марыя Кажуры.....23.45
10. Вінцэнт Грузд.....11.72
11. Аляксандра Чарнэцкая.....11.77
12. Віталі й Люба Кажаны.....35.55
13. Ірэна Гайдзель.....59.25
14. Раіса Галяк.....59.25

Разам.....кан. дал. 651.67

15. Нюра й Валодзя Русакі – на Бібліятэку імя Францішка Скарыны ў Лёндане.....ам. дал. 50.00
16. К. і С. Вініцкія – на «Беларуса».....25.00

Пабудова Беларускага Крыжа ў Канадзе
Справаздача

Пабудова крыжа.....кан. дал. 3,000.00
Мэмарыяльная дошка.....1,578.95
«Ляндскэйпінг».....2,157.00

Разам.....6,735.95

Ахвяраў сабрана:
(Глядзі «Беларус» нр.нр.: 348, 350, 351, 354, 355, 357а).....4,271.69
Раіса Жук-Грышкевіч памяці свайго дарагога мужа Вінцэнта Жук-Грышкевіча.....2,464.26

Разам.....6,735.95

Арганізатары праекту «Беларускі Крыж» шчыра дзякуюць усім ахвярадаўцам. Асаблівая падзяка за ўшанаваньне сьв. пам. др. Вінцэнта Жук-Грышкшвіча, які быў душой праекту «Беларускі Крыж» і хваліў Бога, калі ўдалося яго ўрэчаісьніць. І як напісаў у лісьце дырэктар Прошчы ў Мідляндзе а. Джэймс Фаррэлл, «Беларускі Крыж у Прошчы стаіць, як адзін з манумэнтаў памяці Вінцэнта Жук-Грышкевіча», так будзе ён заўсёды манумэнтам і беларусаў на чужыне.

Арганізацыйны Камітэт.»

(«Беларус», Нью Ёрк, 357а, Сакавік 1989 г.)

Памінкі па др. В. Жук-Грышкевічу ў Таронта

У нядзелю 16 красавіка ў Беларускім Рэлігійна-Грамадзкім Цэнтры ў Таронце адбыліся памінкі па веч. пам. др. Вінцэнту Жук-Грышкевічу, які адыйшоў у вечнасьць на 87-м годзе жыцьця 14 лютага 1989 году ў Бэры ў Канадзе. Народу сабралося шмат. Людзі зналі, памяталі й шанавалі Яго, як чалавека, што заўсёды быў у цэнтры беларускага жыцьця, зь людзьмі працаваў і змагаўся за беларускія ідэалы, зь людзьмі дзяліў годы й нягоды беларускага грамадзкага жыцьця.

У царкве Сьв. Кірылы Тураўскага Архіяпіскап БАПЦ Уладыка Мікалай адслучыў сьв. літургію й паніхіду. Сьпяваў хор пад кіраўніцтвам Міколы Ганька.

Паніхіда... узьнёсла-сумныя напевы, дрыготкія ў руках агеньчыкі сьвечак... Алілуя, алілуя, слава Табе, Божа... Усьведамленьне марнасьці кароткага, як сон, жыцьця на зямлі, і няведамай вечнасьці... Адчуваньне прысутнасьці Таго, за каго молімся: «Са сьвятымі супакой, Хрысьце, душу заснуўшага слугі Тваяго...»

Малітвай Уладыкі Мікалая й напевам «Вечная памяць...» пачалася застольная памінковая бяседа. Кіраваў ёю заступнік Старшыні Рады БНР др. Барыс Рагуля. Ён прадставіў кароткі нарыс жыцьця нябожчыка.

Сп. Кастусь Акула, закладчык Згуртаваньня Беларусаў Канады, падкрэсьліў тры этапы дзейнасьці сьв. пам. Вінцэнта Жук-Грышкевіча: першае – у 1946 г. ён заснаваў Згуртаваньне Беларусаў у Вялікай Брытаніі. Гэта-ж першая беларуская арганізацыя за мяжой пасьля 2-ой Су-

сьветнай вайны, падкрэсьліў прамоўца; другое – у 1954 г. у Мюнхэне ён зарганізаваў і вёў Беларускую Сэкцыю Радыё «Вызваленьне». Перад ім яе ня было. Трэцяе – ягоная дзейнасьць у Канадзе. Ён быў якраз тым чалавекам, што быў патрэбны ў тым часе й тым мейсцы. «Што мы тады, што я тады – малады мог...» гаварыў прамоўца.

Вінцэнт Жук-Грышкевіч са сваёй просталінейнай прынцыповасьцьцю, плянавасьцьцю надаваў кірунак беларускаму арганізацыйнаму жыцьцю: ідэялягічны напрамак – вернасьць Акту 25 Сакавіка й Радзе БНР; рэлігійны – свая беларуская царква – БАПЦ; а для разьвіцьця ідэйна-нацыянальнага й духовага жыцьця патрэбна й матарыяльная база – свой дом з царквой, свая крэдытовая супалка. І сыстэматычна й плянава гэтыя пастуляты праводзіліся ў жыцьцё.

Сп. Мікола Ганько, старшыня Тарантонскага Аддзелу ЗБК, гаварыў пра іншы аспэкт дзейнасьці Нябожчыка – беларускае ўзгадаваньне моладзі. Стараньнем др. В. Жук-Грышкевіча заснаваны быў пры Тарантонскім Універсытэце ў 1951 г. лектарат беларусаведы, дзе Нябожчык быў лектарам. «У мяне было двох настаўнікаў – Вінцэнт Жук-Грышкевіч і Алесь Грыцук», – сказаў прамоўца.

А я, слухаючы, думала й пра заснаваньне Нябожчыкам, на ягонае семідзесяцігодзьдзе, у 1973, «Фонду беларускіх падручнікаў», дзякуючы якому, разам з дзяржаўнай субсыдыяй, у 1974-1978 гадох, Каардынацыйны Камітэт Беларусаў Канады змог выдаць два тамы англямоўнага падручніка «Беларуская Мова» – "Fundamental Byelorussian" Валентыны Пашкевіч, падручніка так патрэбнага дзеля нацыянальнага ўзгадаваньня беларускай моладзі.

Сп. Уладзімер Целеш, старшыня Парафіяльнай Рады, гаварыў пра др. В. Жук-Грышкевіча як пра Старшыню Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, пра ягоны патрыятызм, адданасьць і ахвярную працу на карысьць беларускай вызвольнай справы.

Сп. Віктар Касьцюкевіч, сакратар Галоўнай Управы ЗБК, успамінаў нябожчыка як сябру й напарніка праводжаньня летняга адпачынку на прыродзе. Прырода, лес, рака былі сьвятыняй, раем на зямлі для Вінцэнта. «Любіў і Ты, як я, блукаць па пералесках...» успамінае пра яго Натальля Арсеньнева.

Паэтка Натальля Арсеньнева, сяброўка Вінцэнта Жук-Грышкевіча яшчэ з 20-х гадоў, калі яны вучыліся ў Ві-

ленскай Беларускай Гімназіі ды разам выдавалі вучнёўскі часапіс, ня могучы прыбыць на памінкі асабіста, прыслала верш; «На сьмерць сябры юнацтва».

Жонка Нябожчыка др. Раіса Жук-Грышкевіч прачытала верш Натальлі Арсеньневай «На сьмерць сябры юнацтва» (надрукаваны ў нр. 358 «Беларуса») і ўрывак зь ліста вучаніцы Нябожчыка зь Віленскай Беларускай Гімназіі сп-ні Ніны Абрамчык, жонкі былога Старшыні Рады БНР сьв. пам. Міколы Абрамчыка.

Др. Раіса Жук-Грышкевіч дзякавала ўсім тым, што аддалі пашану памяці яе мужа: Уладыку Мікалаю за Багаслужбы ў часе паховінаў і сяньня, царкоўнаму хору за ўдзел у іх, усім прысутным на паховінах і памінках, тым, што несьлі ў дамавіне цела ейнага мужа на вечны супачын; Канадзкаму Сэктару Рады БНР, Згуртаваньню Беларусаў Канады, Прыходу Сьв. Кірылы Тураўскага, сябром за надмагільныя кветкі, за ахвяры Ягонай памяці на беларускія фонды, на Беларускі Крыж, прамоўцам над магілай і на памінках; паэтцы Натальлі Арсеньневай за прысьвечаны памяці ейнага мужа пачуцьцёва-філязофскі верш, сп-ні Марыі Ганько й яе памочніцам за стараннае і прыгожае зрыхтаваньне памінковага абеду. Усім прысутным на паніхідзе й памінках, усім тым, што прыслалі ёй спачувальныя лісты – шчырая падзяка ўсім!

Песьняй «Сьпі пад курганам герояў» і малітвай Уладыкі Мікалая закончыліся памінкі.

На ўсё гэта глядзелі з партрэту, што на франтовай сьцяне на фоне бел-чырвона-белага сьцягу, пад Пагоняй, разумныя, і здавалася, сумныя вочы Вінцэнта Жук-Грышкевіча.

(У скароце ў «Беларусе», Нью Ёрк, 359, травень-чырвень 1989 г.)

Натальля Арсеньнева

Малачай
(На сьмерць сябры юнацтва)

Памёр... няма... і анідзе у сьвеце
не пакрыжуюцца ўжо нашыя шляхі,
хай восень зноў сьпляце нам залатыя сеці,
хай зазяленяцца узноў вясновыя лагі.

Якое слова дзіўнае, няўцямнае – «ніколі»,
якое жудаснае скова – «анідзе»,
як замірыцца з тым, што ня сустрэцца болей
нам у жыцьці з Табой
ні ў шчасьці, ні ў бядзе?

Любіў і Ты, – як я, – блукаць па пералесках,
спыніцца ў гушчары, скамечыць мох мяккі,
яшчэ й яшчэ чытаць ад крэскі й да крэскі,
баляды, што дубы зьбіралі праз вякі,
а там ужо зьмярканьнем,
выйсьці ў поле
і жыць, як казалі нам, малым:
«як набяжыць,»
не крыўдаваць, калі нас часта хтось і ўколе,
ні, – абы што, – хапацца за нажы.
Мой сябра дарагі!
Нялёгкімі гадамі
нам давялося жыць,
відаць наш Кон такі.
Ды мы брылі. Ступой
ішоў і Кон із намі,
аж запыніў Цябе кіўком рукі.
Стаю... ужо адна...
Скрозь – тае сьнег счарнелы.
Журчыць у раўчаку ручай...
Ну, што-ж, бывай!
Ужо мо' й там, дзе Ты,
тчэ парасткі нясьмела
прадвесьнік весьніх дзён –
зялёны малачай!

Красавік, 1989 г.

«Даражэнькая!

Пасылаю верш, хай ён заступіць мяне на памінках. Пісала «ад сэрца»... Моцна цалую,

Твая Наталка.»

Рагнеда Аляхновіч, дачка сьв. пам. Вінцэнта Жук-Грышкевіча, прысьвяціла свайму Тату, якога жорсткі кон забраў ад яе яшчэ ў маленстве, наступныя радкі:

Няхай Табе сьняцца
пралескі, як неба,
І з маленства пахі
аржанога хлеба,
І пошум таемны
бярозак у гаю,
І ўсё, што
Радзімай
людзі называюць.



Раіса Жук-Грышкевіч над сьвежай магілай Мужа, беларускі могільнік у Іст Брансвіку, ЗША, вясна 1989.



Памятнік Жук-Грышкевічаў на беларускім могільніку Жыровіцкай Божай Маці ў Іст Брансвіку, ЗША. На памятніку пад датай сьмерці напіс: Старшыня Рады Беларускай Народай Рэспублікі, 1970-1982. У нізе напіс: Усесьвятая Тройца зжалься над намі!

Можа на гэтым і закончыць апісаньне «Жыцьця Вінцэнта Жук-Грышкевіча», але з фізычнай сьмерцяй жыцьцё чалавека ўсё-ж не канчаецца, яно жыве ў тых людзях, жыцьцё якіх было, ў той ці іншы спосаб, кранутае адыйшоўшым у вечнасьць.

Жыцьцё Вінцэнта Жук-Грышкевіча мусіла крануць жыцьці іншых людзей, калі пасьля ягонай сьмерці я атрымала шмат, шмат спачувальных лістоў і то ня толькі ад блізкіх супрацоўнікаў і сяброў, але й ад людзей, зь якімі, здавалася, ня было, прынамсі за мяжой, ніякай сувязі. Прыкладам ліст др. Міколы Шчорса – Віленчука, калісь сябры й старшыні Беларускага Студэнцкага Саюзу ў Вільні:

Nicholas Ščors, M.D.
2106 Dogwood Circle
Mt. Dora, Florida, 32757

17-га лютага, 1989.

Высокапаважаная Доктар!

Надовячы даведаўся аб сьмерці Вашага С. П. Мужа. Ягоная сьмерць не зьяўляецца толькі Вашаю асабістаю стратаю!

У Ягонай асобе Беларуская Грамадзкасьць на эміграцыі, незалежна ад палітычнае ахварбоўкі, страціла высокай вартасьці культурна-грамадзкага і палітычнага дзеяча – змагара за лепшае заўтра Беларускага Народу.

Хай лёгкай будзе яму канадыйская зямелька!

Прымеце, калі ласка, ад мяне самыя шчырыя словы глыбокага спачуваньня.

З пашанай,

М. Шчорс»

Дзякуючы др. Міколу Шчорсу за спачуваньні й адданьне пашаны памяці майго Мужа, я паведаміла, што цела майго Мужа спачывае не на канадыйскай зямлі, а на «лапіку беларускай зямелькі» – беларускім могільніку Жыровіцкай Божай Маці ў Іст Брансвіку. Такая была Яго воля.

І прыклад іншых лістоў:

«Бэльвіл, 18. III. 1989.

Вельмі Паважаная й Дарагая Спадарыня Др. Раіса!

Учора пасьля паўдня (пятніца) мы атрымалі чарговы нумар «Беларуса».

Зь вялікім сумам мы даведаліся з газэты, што Высока Паважаны й Дарагі нам Др. Жук-Грышкевіч адыйшоў у вечнасьць.

Нам вельмі цяжка зрабілася на сэрцы. Хаця мы не падтрымоўвалі бліжэй нашага знаёмства, то аднак маем для Сп-ра Доктара ў сэрцах нашых спэцыяльны куточак.

Др. Жук-Грышкевіч многа, многа мне дапамог маральна ў тыя мамэнты нашых пачаткаў у Канадзе, а тыя часы былі вельмі цяжкімі для нас – у нас былі малыя дзеці. Якраз Алінка была паважна хворая (6 месяцаў) на запаленьне лёгкіх й каб мы яе тады не аддалі ў Sick Children's Hospital – сяньня мы-б яе ня мелі. Тады я ня ведала ангельскай мовы. Др. Грышкевіч кожны дзень тэлефанаваў у гошпіталь, а потым да нас, каб паведаміць як справа стаіць з маёй малой. Таксама Др. Грышкевіч вазіў мяне і Віцю ў сваёй маленечкай аўтамашыне (на 2-х чалавек) у шпіталь, каб я магла паглядзець маю малую.

Што гаварыць, тут на гэтым кусочку паперы немагчыма расказаць усяе тае ўдзячнасьці, якую мы носім і сягоньня ў нашым сэрцы за тыя добрыя, падтрымоўваючыя словы Др. Грышкевіча, якімі ён хацеў нам разьсьвятліць нашыя гаротныя першыя дні ў Канадзе. Мы яго не забудземся, хаця-б і таму, што Алінка дала ягонае імя свайму сынку з удзячнасьці да Др. Вінцука Грышкевіча.

Хай будзе лёгкай яму канадыйская зямелька!

Ня сумуйце, мілая мая Спадарыня, для нас, веруючых людзей, гэта толькі расстаньне на нядоўгі час, а там усе спаткаемся ў Госпада Бога на зялёных нябесных лугох.

Моцна абдымаю Вас і цалую, галаву да гары, Драгая! Мы Вас любім й думаем тут аб Вас.

З пашанаю,

Вашая Галена Скурат

П. С. Алінка заплакала, як даведалася сумную новасьць. Г. С.»

«24. 2. 1989 г.
Дарагая Раіса,

Спачуваю. Вінцуку даў Бог магчымасьць і сілу шмат добрага зрабіць для нашага паняволенага народу. За гэта нашчадкі аддадуць яму належную пашану. А мы, што былі побач нябожчыка ў працы, сьхіляем галовы ў смутку!

Вечная яму памяць!

Кастусь Акула»

«Манчэстар, 20. 2. 1989 г.

Вельмі Паважаная Др. Раіса Жук-Грышкевіч,

Я атрымаў сумную вестку аб сьмерці дарагога Вам Вашага мужа Вінцэнта.

Разумею, што жаль сьціскае сэрца, калі па толькі гадох супольнага жыцьця мусім разьвітацца, адводзячы на вечны супачынак. Гэта прыкра й балюча, аднак зьмяніць гэтага мы ня ў сіле, так Богам дана й так мае быць.

Прыйміце, Драгая Др. Раіса, маё шчырае спачуваньне Вашага жалю, а літасьцівы Гаспод Бог хай прыме душу пакойнага Вінцэнта ў Валадарства Нябеснае.

Вечная памяць!

Мітр. Прат. Ян Абабурко.»

Ад сябры Вінцэнта яшчэ зь віленскіх часоў др. Баляслава Грабінскага:

«Дарагая Доктар Раіса,

Дастаў я сумную вестку. Падзея вельмі сумная для ўсіх нас, а Вам, Дарагая Раіса, глыбока балючая. Дай Бог Вам сіл перажыць гэты цяжкі пэрыяд.

Закончыў Вінцусь працавітае й ахвярнае для Бацькаўшчыны жыцьцё і заслужыў на вечную памяць.

Б. Грабінскі.»

А вось ад маладзейшага пакаленьня, ад Паўлінкі Сурвіла й яе мужа Эрыка:

"Dear Raisa,

Eric and I extend our sympaties during this difficult time. Although it has been many years since I have spent time with you, my memories of Deep River, and of the kindness you both have always shown, remain an important part of my childhood.

Please know that we are thinking of you.

Паўлінка and Eric"

Ад ганаровага грамадзяніна БНР сп. Гай дэ Пікарды:

"The Cloisters
Temple.
London, EC4Y 7AA
16th February 1989

Dear Raisa,

I was sorry to hear of Vincuk's recent death and hasten to send you my condolences in your bereavement, and to assure you of my affectionate thoughts at this difficult time. The sadness of being parted from a loved one, as I know myself after the recent loss of my dear old mother in her 90th year, is somewhat tempered by gratitude for a long and valiant life usefully spent in the service of others.

So it is with Vincuk, whose devotion to the Byelorussian national cause needs no recalling by any of those who knew him. His life spanned and linked the fortunes of the BNR in Vilna, in London and in America, and his Presidency filled in what were dark days for the national movement. It is good to know that he lived to see crowds of young people in Minsk and Vilna having hoisted the «Бел-чырвона-белы сьцяг» and celebrating the anniversary of Byelorussian National Republic and its ideals. Thanks to those in emigration – Krečeŭski, Zacharka, Abramčyk and Žuk-Hryškevič, these ideals have never died, and I have no doubt that their names and endeavours on behalf of Byelorussia will not be forgotten amongst rising generations of Byelorussia.

In all this you, Raisa, as his longstanding companion, and in your own life have played a part which we "foreigners" here

all admired, and it is largely thanks to your efforts that the Byelorussians in Canada are such a strong bulwark of the Emigration, enjoying the praise of Sakrat Janovic and the admiring interest of his works in Belastok and in Byelorussia.

As a small token of my respect and admiration for a great figure of the Byelorussian national movement at home and in emigration, I enclose a «Вечная памяць» I have adopted from Ravenski's «Сьпі пад курганам герояў» for (...illegible) such an occasion.

In warm and affectionate greetings

Yours ever,

Guy de Picarda

P. S. I have not forgotten the honour Vincuk did me in renewing my honourary citizenship of the BNR, an honour which I have always highly prized. **G.**"

«Кінгстан, 18. 2. 1989.

Дарагая Раіса!

У гэты сумны й балючы час для Цябе й у Тваім нясшчасьці з прычыны сьмерці Сьв. П. Вінцука, складаю мае шчырыя і глыбокія спачуваньні.

Мне вельмі цяжка і прыкра, што я не змагла асабіста быць прысутнай, каб пакланіцца і аддаць яму чэсьць і пашану, якую я для Яго заўсёды мела.

На вялікі жаль я ня была ў стане прыехаць з прычыны хваробы (sciatica).

Тут у дома я памалілася за душу Ягоную. Хай Усявышні Бог Наш ахавае Яго ласкай сваёй у Царстве Нябесным на заўсёды.

Мы тут на зямлі гэтай пакуль жывем, захаваем у сэрцах нашых ягоную памяць на заўсёды, як годнага чалавека, грамадзкага дзеяча, гарачага беларускага патрыёта і адданага сына Беларускага Народу. Ягоная праца й адданасьць для беларускай справы застанецца ўпісана у нашую беларускую гісторыю як пачэснага мужа стану.

З вялікім сумам і глыбокаю пашанай сьхіляю галаву маю, аддаючы чэсьць і славу вялікаму беларускаму патрыёту й добраму сябру пакойнага Алеся. Людзі кажуць, што

час раны гоіць, але павер мне, што яны ніколі не загойваюцца камплетна.

Оля Грыцук.»

Беларуская Царква Хрыста Збаўцы ў Чыкага:

«2-19-89.

Паважаным і Драгім Раісе й Пашкевічам засылаем словы спагады і вялікі жаль з прычыны сьмерці Вашага Мужа й Швагра, Вялікага Беларускага Змагара.

2-18 была літургія і сёньня маліліся за супакой і вечную радасьць Яго душы. Служылі: айцец Вайцяхоўскі й а. Сіроў. Падпісаліся усе, хто маліўся ў сьвятыні. **В. М.**» (Ванда Махнач – Р. Ж.-Г.)

На спачувальнай картцы 39 подпісаў, некаторыя нячытэльныя.

«Флярыда. 15 лютага, 1989.

Даражэнькая Доктару,

З вялікім сумам мы даведаліся аб сьмерці Доктара Грышкевіча.

Прыміце, калі ласка, нашы сардэчныя спачуваньні.

Праз увесь час нашага знаёмства, а пачалося яно яшчэ ў Англіі, мы ўважалі Доктара як найшчырэйшага чалавека з нашых знаёмых, ды заўсёды стойкага Патрыёта Беларусі. Ён быў закладчыкам ЗБВБ і нашым правадніком у Англіі.

Мы адчуваем страту.

З глыбокім пачуцьцём

Вашы
Эвэліна і Язэп Пазьняк»

“Dr. Vincent Zuk-Hryskievic
Will share in the fruits of
100 Masses
to be offered

for the members of the
Agnus Dei Society
at Immaculate Conception Monastery
during the next twelve months
Requested by
Eveline and Joseph Pazniak"

Сьледам Вінцука на той сьвет хутка пайшоў і Язэп Пазьняк.

Супакой ягонай душы.

«2. 22. 89.

Мілая й Дарагая Др. Раіса,

Зь вялікім сумам і жалем даведалася аб сьмерці Вашага сьв. пам. Дарагога Мужа др. Вінцэнта, нашага былога Старшыні Рады БНР, гарачага патрыёта й вялікага змагара за нашую Бацькаўшчыну Беларусь. З гэтай сумнай нагоды засылаем Вам, Дарагая, нашы шчырыя й найглыбейшыя спачуваньні. Няхай Гаспод Бог прыме Нябожчыка ў Сваё Царства Нябеснае, а Вам пашле добрае здароў'е і сілы духовай...

Я асабіста вельмі паважала і любіла сьв, пам. Доктара, Прэзыдэнта. Ён быў вельмі добры, цёплы, мілы, шчыры й прыязны чалавек. Таму заўсёды, як ён прыяжджджў у Нью Брансвік, на Сакавіковае ці Лістападовае сьвяткаваньне, я зь нявесткаю Ленаю стараліся запрасіць Прэзыдэнта да нас на абед у Сомэрсэт. Я мела гонар гасьціць яго ў сябе 2 разы, а сын Расьціслаў й Лена, нявестка, адзін раз. Нябожчык быў вельмі інтэлігэнтны, высока адукаваны й ачытаны.

Няхай будзе вечная й сьветлая памяць Дарагому нашаму сябру й былому Прэзыдэнту Рады БНР.

Зь любоўю да Вас, Вашыя шчырыя,

Марыя, Людміла й Войтанкі.»

У такім тоне былі дзесяткі іншых сдпачувальных картак і лістоў.

За супакой душы Вінцэнта Жук-Грышкевіча ахвяравалі багаслужбы апрача Пазьнякоў:

Айцец Джэймс Фаррэл, Дырэктар прошчы ў Мідлянд-зе.

Сем'і: Кэлі, Фіцпатрік, Мэрдок, Курылаў, Комар й іншыя ў Бэры, у Лёндане, у Ватыкане, у Martyrs' Shrine in Midland.

"MARTYRS' SHRINE
Midland, Ontario

March 13, 1989

Dear Dr. Žuk-Hryškievič:

I express my sincere sympathy to you on the death of your husband. I heared indirectly that he died. I was not sure. I was on the verge of calling the Kelly's. Your letter confirmed it. I have pleasant memories of our association and your husband's satisfaction at the site and erection of the **Byelorussian Cross** on the Shrine grounds. **It stands as a monument to his memory. It is one of many such monuments.** (Emphasis is mine – R. Ž.-H.)

I will offer Mass for the repose of his soul. I have enroled him in Martyrs' Shrine Association. He is remembered in 100 Masses offered for members and in daily prayers of intercession through the Martyrs. May his soul be at peace with God.

We feel death very much. It is so final a separation. But for people with faith, it is a temporary separation. May your faith be your strength and give you courage as you face the future.

I appreciate your letter, the clippings, the memorial card at this time of bereavement. I look forward to seeing you during the summer. Blessings.

Sincerely yours,

James J. Farrell, S.J.,
Director"

* * *

Дарагі Вінцук!

Хацелася мне ад пачатку й папарадку прайсьці дарогу Твайго нязвычайнага, працавітага, самаахвярнага, пакутнага й сьветлага жыцьця. Расказаць пра яго, і хоць збольшага сабраць у гэту кнігу зярняты-плады Твае працы. Не сабрала ўсяго. І магчыма ня так, як трэба было-б рабіла, але рабіла, зьбірала й складала іх так, як умела. Пісала, як Ты заклікаў нас у 1978 годзе ў «Беларусе» пісаць:

«ПРА ПРОШЛАСЬЦЬ – ДЗЕЛЯ БУДУЧЫНІ»

і дзеля таго, каб аддаць пашану Тваёй Памяці, каб сказаць Табе дзякуй за тыя незабыўныя гады, якія мы з Табой разам пражылі. Дзякую Богу за Цябе, і прашу Яго, каб прыняў Душу Тваю ў Валадарства Сваё. А там пасьля, да пабачаньня, Дарагі!

Твая Раіса

Бэры, 6-га студзеня, 1991 году.

КАНЕЦ

БІБЛІЯГРАФІЯ
артыкулаў і матарыялаў Вінцэнта Жук-Грышкевіча

Вінцэнт Жук-Грышкевіч падпісваў свае працы ўласным прозьвішчам і ведамымі аўтару псэўдонімамі: **В. Жук-Грышкевіч, др. В. Жук-Грышкевіч, V. Žuk-Hryskievic, Wincenty Žuk-Hryszkiewicz, W. Hryszkiewicz, (др.) В. Жук, V. Žuk, Жук, В. Ж., В. Ж.-Гр., В. Ж.-Г., Твой Вінцук, Заляшчанін, Грамадавец, Прысутны,** і літарамі: **В., Ж., Z., Н.**

Ніжэй зьмешчаная бібліяграфія не абыймае ўсяе спадчыны В. Жук-Грышкевіча, а толькі тое, што аўтару ўдалося знайсьці.

1927

Hryszkiewicz, W. «Росквіт беларускага краснага пісьменства». 1927.

Аб гэтай працы ўспамінае Ганна Сурмач у «Дакументах са збору Музея імя І. Луцкевіча – Крыніцазнаўчая база для вывучэння біяграфій дзеячоў беларускага адраджэння». (Наш Радавод. Материалы Международной научной конференции по региональной истории Восточной Европы. «Культура народов Великого княжества Литовского и Белоруссии. XIII – нач. XX вв.») Кн. 3 (Часть I. Гродно. 1991)

1936

Hryszkiewicz, W. "Rola ziem białoruskich w unjach polsko-litewskich."
(Pamientnik VI. Powszechnego Źjazdu Historyków Polskich w r. 1935 w Wilnie, referaty, Lwów, 1936)

1947-1949

Н. "Wieszcz Białorusi." (R. C. S., Ruch Chrzescijansko-Społeczny, London, Rok 1 [6], 1947)

Žuk-Hryszkiewicz, Wincenty. "Kwestia Białoruska." (Kurs Spraw Wschodnich, Serja III, Zeszyt 6, Instytut Bliskiego i Środkovego Wschodu, "Reduta," London, 1949, b. 22.)

Z. Byelorussia (Whiteruthenia) under Russian Occupation, London, 1949. Published by: Association of Byelorussians in Gt. Britain Ltd.
Association of Byelorussians in Great Britain Ltd.
52 Penn Road. LONDON, N.4. Tel. NORth 1455.

1952

Жук. «Антон Лявіцкі – Ядвігін Ш.» (Да 30-х угодкаў сьмерці пісьменьніка).
(«Беларускі Эмігрант», Таронта, 2 [40], 28 лютага, 1952)

Жук. «Трагічная сьмерць паслоў Работніцка-Сялянскай Грамады».
(«Беларускі Эмігрант», Таронта, 3 [41] 25 сакавіка, 1952)

Ж. «Рэха 25-га Сакавіка – Монтрэаль».
(«Беларускі Эмігрант», Таронта, 4 [42], 1952)

Жук. «Максім Багдановіч». (Да 35-х угодкаў сьмерці паэты, 25 мая 1917 году.)
(«Беларускі Эмігрант», Таронта, 5 [43], травень, 1952)

Жук. «Жыцьцё й творчасьць прарока Беларусі».
(Да семдзясятых угодкаў ад дня нараджэньня й дзясятых ад дня сьмерці Янкі Купалы).
(«Беларускі Эмігрант», Таронта, 6 [44], 25 чэрвеня, 1952)

Крытычны разгляд творчасьці Купалы ды ягонае ролі ў разьвіцьці беларускага нацыянальнага руху. Купала ўважаецца за фарматара беларускае літаратурнае мовы. Перадрук вершу «Звяваным».

Жук-Грышкевіч, Вінцэнт. «Лірыка Янкі Купалы»: дакторская дысэртацыя. Аттава, Канада, Аттаўскі Унівэрсытэт, 1952, 220 б.

Праца была пададзеная для абароны ды абароненая на філязафічным Факультэце Аттаўскага Унівэрсытэту за пасярэдніцтвам Паўднёва-Усходняга Эўрапэйскага Інстытуту як дакторская дысэртацыя.

Зьмест: Разьдзелы: I. Атмасфэра асяродзьдзя. II. Жыцьцё й творчасьць Янкі Купалы. III. Агляд крытыкі творчасьці Янкі Купалы. IV. Разьвіцьцё лірыкі Янкі Купалы. V. Падзел лірыкі Янкі Купалы. VI. Чужыя ўплывы на лірыку Янкі Купалы. VII. Самабытнасьць творчасьці Янкі Купалы. VIII. Вывады. IX. Рэзюмэ паангельску. X. Бібліяграфія. XI. Аналітычны слоўнік.

Ж. «Кнігапіс». Запісы Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва, Нью Ёрк, 1952, кн. I, б. 64.
(«Беларускі Эмігрант», Таронта, 7 [45], ліпень, 1952)

Ж. «Паказьнік Беларускіх Выданьняў на Чужыне». Беларуская Бібліяграфічная Служба. Уклаў М. Панькоў. Нью Ёрк 1952, б. 64.
(«Беларускі Эмігрант», Таронта, 7 [45], ліпень, 1952)

Заляшчанін. «Байкот Амэрыканскага Камітэту Вызваленьня Народаў Расеі, ці ўдзел у ім?» Артыкул зьмяшчаецца як дыскусыйны – Рэд.
(«Беларускі Эмігрант», Таронта, Год V, 7 [45], ліпень, 1952)

Заляшчанін. «За, ці супраць палітыкі?» («Беларускі Эмігрант», Таронта, Год. V, 9 [47], кастрычнік, 1952)

Зьмест: Што такое палітыка? Ці можам не займацца палітыкай? Хто мае займацца палітыкай? Памылковы погляд.

Ж. «Канцэрт беларусаў з Монтрэалю ў Таронта, (12.10.1952)» («Беларускі Эмігрант», Таронта, 9 [47], кастрычнік, 1952)

Заляшчанін. «Дыскусыя ці лаянка?» («Беларускі Эмігрант», Таронта, Год V, 10 [48], 20 сьнежня, 1952)

Зьмест: 1. Дэмакрацыя гэта дыскусія. 2. Дыскусыі падлягаюць усе публічныя грамадзкія справы. 3. Няправільная дыскусыя шкодная. 4. Розьніца паміж дыскусыяй і лаянкай.

1953

Заляшчанін. «Украінцы аб удзеле ў КІЦАБ.»
(«Беларускі Эмігрант», Таронта, Год VI, 1 [49], 1953)

Ж. «Кнігапіс: Запісы нр. 2, 1952.»
(«Беларускі Эмігрант», Таронта, 2 [50], 22 лютага 1953)

Жук, В. «Успаміны аб 25 Сакавіку» (З дакладу на акадэміі ЗБК).
(«Беларускі Эмігрант», Таронта, Год VI, 4 [52], красавік, 1953 і 5 [53], чэрвень, 1953)

Заляшчанін. «Шукайма эканамічных падстаў для нашых арганізацыяў».
(«Беларускі Эмігрант», Таронта, Год. VI, 5 [53], чэрвень, 1953)

Заляшчанін. «Аб магчымасьцях навукі ў Канадзе».
(«Беларускі Эмігрант», Таронта, Год VI, 5 [53], чэрвень, 1953)

Ж. «Уладзімер Жылка».
(«Беларускі Эмігрант», Таронта, Год VI, 7 [55], жнівень, 1953)

1954-1960

Жук-Грышкевіч, В. (Выступленьне па дакладу Ст. Станкевіча)
(V:IV Конференция Института по Изучению Истории и Культури СССР. Доклад и дискусии, Мюнхен, 1954. Вып. 2-ой, б. 85-86)

Зазначаецца эпізод, калі бальшавікі паслалі Я. Купалу ў Прагу на перагаворы ў справе зьліквідаваньня ўраду БНР.

Жук, В. «Пайшлі памяраць, каб жыла Бацькаўшчына».
(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 45 [227], 5 сьнежаня 1954.)

Перадача цераз радыястанцыю «Вызваленьне» на 34-я ўгодкі Слуцкага паўстаньня.

Жук. В. «25 Сакавіка ў радыё ‹Вызваленьне›».
(«Бацькаўшчына, Мюнхэн, 15-16 [245-246], Вялікдзень 1955)

Перадача цераз радыястанцыю «Вызваленьне» на 37-я ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці БНР.

Жук, В. «Самабытнасьць творчасьці Янкі Купалы».
(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 30-31 [260-261], 31 ліпеня 1955)

Аналіз самабытнасьці й індывідуальнасьці творчасьці Янкі Купалы: мова, тэматыка, паэтычная тэхніка.

Жук, В. «Згуртаваньню Беларусаў у Вялікабрытаніі».
(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 13 [347], 1957)

Ж. «Недапушчальная памылка».
(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 17 [351], 1957)

У інфармацыі на ангельскай мове аб Беларусі, выдадзенай Гал. Управай БАЗА, з тэксту вынікае, што і Першы Ўсебеларускі Кангрэс, і Акт 25 Сакавіка зьявіўся, дзякуючы кастрычніцкай, значыць бальшавіцкай рэвалюцыі.

В. «Садбуры (Канада)». Аб сьвяткаваньні 25 Сакавіка.
(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 17 [351], 1957)

Прысутны. «Сьв. Пам. Эдвард Будзька».
(З дакладу др. Жука, 19.10. у ЗБК, у Таронце)
(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 44 [430], 1958)

1960

Жук. Рэцэнзія на манаграфію др. В. Дж. Кэйэ "Canadians of Byelorussian Origin" 1960.
(Прыватны архіў. Разьдзел XIII у гэтай кнізе)

Жук, др. В. «Янка Купала. У 18-ю гадавіну сьмерці».
(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 24-25 [508-509], 26 чэрвеня 1960)

Аналіз творчасьці Я. Купалы. Янка Купала – неразлучны духова зь ідэямі беларускага вызналеньня, ідэямі незалежнасьці.

Ж. «Памёр Балеслаў Бабарыка».
(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 7-8 [621-622], 1964)

Жук, В. «Рэфлексыі на сьмерць ксяндза Віктара Шутовіча».
(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 9-10 [623-624], 1964)

Твой Вінцук. «Успаміны аб Пётру Сычу».
(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 9-10 [623-624], жнівень, 1964)

В. Ж. «Шостая Сустрэча Беларусаў Паўночнае Амэрыкі».
(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 11-12 [625-623], верасень, 1964)

В. Ж. «Голас беларусаў у Камісіі Бікультуралізму й Білінгвізму ў Канадзе».
(«Бацькаўшчына, Мюнхэн, 3 [630], 1965)

В. Ж. «Рэха сьвяткаваньня ўгодкаў Акту 25 Сакавіка ў Таронта».
(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 3 [630], 1965)

В. Ж. «16-ты Зьезд Згуртаваньня Беларусаў Канады».
(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 4 [631], 1965)

Ж. «Яго Эксцэленцыя біскуп Часлаў Сіповіч у Таронта».
(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 4 [631], 1965)

В. Ж. «Рэха Сакавіковых сьвяткаваньняў – Ашава (Канада)».
(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 4 [631], 1965)

Ж. «Архіяпіскап БАПЦ ў Канадзе».
(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 5 [632], 1965)

Ж. «Сустрэча над возерам Гюрон».
(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 5 [632], 1965)

Ж. «Беларусы ў Радзе Стагодзьдзя Канады».
(«Бацькаўшчына», Мюнхэн, 6 [633], 1965.)

Жук-Грышкевіч, др. В. «Прадмова» да кніжкі П. Сыча «Сьмерць і салаў'і». (Buchdruckerei "Logos" München 19, Bothmerstr. Мюнхэн, 1965.)

Жук, В. «Заканчэньне» да кніжкі П. Сыча «Сьмерць і салаў'і». Мюнхэн, 1965.

Ж. «Жылкава жонка 35 гадоў ня бачыла сваёй дачкі». («Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 107, 1966)

Ж. «Патрэба агульнанацыянальнага цэнтру». («Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 107, 1966)

Жук, В. «З успамінаў аб 25 Сакавіку». («Беларус», Нью Ёрк, 108-109, 1966)

Ж. «Прыемная неспадзяванка». («Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 110, 1966)

Паведамленьне й інфармацыя аб зьяўленьні ў Лёндане ў Англіі: "The Journal of Byelorussian Studies" vol. 1, Nr. 1 – Year 1., London, 1965, p. 64. Далей пададзены зьмест журналу.

Ж. «Стагодзьдзе Канады й Сусьветная Выстаўка». («Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 112, 1966)

Ж. «Правы й абавязкі чалавека». («Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 113, 1966)

Жук, В. «Савецкая Імпэрыя недаўгавечная». («Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 114, 1966)

Жук, В. «Заснавальнікі й Рэдактары ‹Нашай Нівы›». («Беларус», Нью Ёрк, 115, 1966)

Жук, В. «Успаміны пра ‹Нашу Ніву›». («Беларус», Нью Ёрк, 115, 1966)

1967

Ж. «‹Мёртвым не баліць› Васіля Быкава ў украінскай прэсе». («Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 117, 1967)

Ж. «Зь гісторыі Канады».
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 118, 1967)

Жук, В. «Сьвяты нацыянальны абавязак».
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 119, 1967)

Ж. «Рэпатрыянты варочаюцца на эміграцыю».
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 119, 1967)

Ж. «БССР на выстаўцы ў Мантрэалі».
(«Беларус», Нью Ёрк, 119, 1967)

Ж. «Толькі адзін аказаўся».
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 120, 1967)

Ж. «49-я ўгодкі дня незалежнасьці ў Мантрэалі».
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 121, 1967)

Ж. «‹Лявоніха› перад Ратушай Таронта».
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 122, 1967)

В. Ж. «Беларускі Доктар здабывае славу...»
«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 122, 1967)

Жук-Грышкевіч, В. «На Дваццатыя ўгодкі ЗБВБ. 21-му Зьезду Сяброў і Дэлегатаў ЗБВБ».
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 123-124, 1967)

В. «Другі Кангрэс Канадыйскіх Славянаў»
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 123-124, 1967)

В. «Чаму няма беларусаў у канадзкай статыстыцы?»
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 123-124, 1967)

Ж. «Масква забіла ідэю славянскай фэдэрацыі».
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 125, 1967)

Zuk-Hryskievic, V. "Belorussians and Canadian Statistics."
("Slavs in Canada" – Volume Two. Proceedings of the Second National Conference on Canadian Slavs. Inter-University Committee on Canadian Slavs. pp. 127-134.)

В. «На ЭКСПО-67 Кісялёў перасаліў».
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 126, 1967)

В. «Беларускае школьніцтва і... муха».
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 126, 1967)

Ж. «Шануйма сваё права».
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 127, 1967)

Грамадавец. «Беларусаў дзеляць на нацыяналістых і... расейцаў».
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 127, 1967)

В. «Камуністы рыхтуюць Ветнам у Канадзе».
(«Весткі з Канады» – «Беларус». Нью Ёрк, 128, 1967)

Ж. «Бацькі, дбайце пра сваіх дзяцей».
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 128, 1967)

1968

Жук-Грышкевіч, В. «Слава Украіне!» На 50-я ўгодкі УНР.
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 130. 1968)

В. Ж. «Там, дзе дэмакрацыя. Справа Квэбэку».
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 130, 1968)

Ж. «Ліга БНР вельмі на часе».
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 131, 1968)

Ж. «Прэзыдэнт Рады БНР у Канадзе».
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 131, 1968)

Жук, В. «БНР спадчына ўсіх беларусаў».
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 132, 1968)

Ж. «Залаты юбілей у Ашаве».
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 132, 1968)

Жук, В. «Як паўстаў Акт 25 Сакавіка» (Адказ на бальшавіцкія напады).
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 133 і 134, 1968)

Жук, В. «БНР ці БССР», брашура. Нью Ёрк, 1968.

В. Ж. «Як яны русыфікуюць».
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 134, 1968)

Рэцэнзія на кніжку на ангельскай мове Джона Каляскі «Эд'юкэйшын ін Совет Ю'крэін».

Ж. «Прынцып "Юніты ін Дывэрсіты" і беларусы».
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 135-136, 1968)

Жук-Грышкевіч, В. «Беспадстаўныя закіды».
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 135-136, 1968)

Жук, В. «Празь Беларусь – да ‹Прывісьленскага Краю›».
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 137, 1968)

Жук, В. «Із страху перад свабодай».
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 137, 1968)

Жук. «Гісторыя паўтараецца» (Аб савецкай агрэсіі ў Чэхаславаччыне).
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 138, 1968)

Жук. «Памылка, ці прысабечаньне?»
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 140, 1968)

Заляшчанін. «Завяртанцы самі сябе сьцёбаюць».
(«Весткі з Канаду» – «Беларус», Нью Ёрк, 140, 1968)

1969

Ж. «Шматкультуралізм заміж Двукультуралізму».
Канфэрэнцыя ў справе праўнага стану культураў у Канадзе.
(«Весткі з Канады» – «Беларус», Нью Ёрк, 141. 1969)

Ж. «Сход Беларускай Касы ў Таронта».
(«Беларус», Нью Ёрк, 142, 1969)

В. «Славянскія Канфэрэнцыі ў Таронта».
(«Беларус», Нью Ёрк, 147-148, 1969)

Жук-Грышкевіч, В. «Зварот да Радных БНР».
(«Камунікаты» Прэзыдыюму й Сакратарыяту Рады БНР, нр. 2, Джамэйка, Нью Ёрк, сьнежань, 1970.)

Зьмест: Зварот у справе Камунікатаў Рады БНР; матарыял для дыскусіі ў Камунікатах: 1. Што гэта Рада БНР? 2. Пад ціскам палітычнае каньюнктуры... 3. Ці ператрываем? 4. Ці запраўды Рада БНР нічога ня робіць? 5. Падазронае цьверджаньне. 6. Шануйма Раду БНР!

Жук-Грышкевіч, В., Старшыня Рады БНР. «Праўныя й ідэялягічныя асновы Рады БНР».

Разьдзелы: I. Праўныя падставы Рады БНР. II. Народны, дэмакратычны характар Рады БНР. III. Эміграцыйная спэцыфіка.

Да праекту рэарганізацыі Рады БНР і зьмены Статуту Рады БНР, пададзенага на разгляд 11-ай Сэсіі Рады БНР. (Раздзел XXI гэтай кнігі)

В. Ж.-Гр. «Сп. Прэзыдэнт, сябры Радныя БНР!» і «Дыскусія актывізуецца». У справе «Камунікатаў» Прэзыдыюму і Сакратарыяту Рады БНР.
(«Камунікаты» Прэзыдыюму і Сакратарыяту Рады БНР нр. 3, Джамэйка, Нью Ёрк, травень, 1971.)

Жук-Грышкевіч, В., Старшыня Рады БНР. «Падзяка»
(«Беларус», Нью Ёрк, 182. 1972.)

В. Ж.-Г. «У справе Сэсіі. Ад Выдавецтва. У справе Лігі БНР. З дзейнасьці Рады БНР. Слова Старшыні Рады БНР. Каб Каса ня была пустая... Нашто нам патрэбны грошы».
(«Камунікаты» Прэзыдыюму і Сакратарыяту Рады БНР нр. 4, Таронта, Канада, люты, 1973.)

Жук-Грышкевіч, В. «Падручнікі перш за ўсё!»
(«Камунікаты» Прэзыдыюму і Сакратарыяту Рады БНР нр. 4, Таронта, Канада, люты, 1973.)

Жук-Грышкевіч, В. Старшыня рады БНР. «13-ая Звычайная Чародная Сэсія Рады БНР – 30 лістапада,

1974. У справе сэсіі. З дзейнасьці Рады БНР па 12-ай Сэсіі: 1. Правядзеньне ў жыцьцё пастановаў сэсіі. 2. Радыё ‹Свабода›. 3. ‹Ліга вызваленьня народаў Савецкага Саюзу› (Парыскі Блёк). 4. Нутраная сувязь і супрацоўніцтва. Актуальныя заўвалі. Шаптаная прапаганда. Тэма да распрацоўкі. Падзяка».
(«Камунікаты» Прэзыдыюму і Сакратарыяту Рады БНР нр. 5, Таронта, Канада, красавік, 1974.)

1974-1980

Жук-Грышкевіч, В., Старшыня Рады БНР. «Плян працы Рады БНР на кадэнцыю (1974-1977)».
(«Камунікаты» Прэзыдыюму й Сакратарыяту Рады БНР нр. 6, Таронта, Канада, кастрычнік, 1974.)

Зьмест: І. Асновы пляну працы: 1. Ідэялягічныя падставы. 2. Роля Рады БНР. 3. Роля Сяброў Рады БНР. 4. Фінансавае забясьпечаньне. 5. Падзел працы.

ІІ. Плян працы Рады БНР. 1. Прэзыдыюм Рады БНР. 2. Выканаўчы ворган Рады БНР (Сакратарыят). 3. Сэктары Рады БНР.

Жук-Грышкевіч, В., Старшыня Рады БНР. «Да Беларускага Грамадзтва ў Беларусі й вольным сьвеце», Прывітаньне з 59-мі ўгодкамі 25 Сакавіка, і 60-мі ўгодкамі Беларускай Нацыянальнай Рэвалюцыі.
(«Камунікаты» Прэзыдыюму й Сакратарыяту Рады БНР, нр. 8, Бэры, Канада, сакавік, 1977.)

Жук-Грышкевіч, В., Старшыня Рады БНР. «Рада БНР ніколі не ліквідавалася».
(«Камунікаты» Прэзыдыюму й Сакратарыяту Рады БНР, нр. 8, Бэры, Канада, сакавік, 1977.)

Жук-Грышкевіч, В., Старшыня Рады БНР. «Узнаўленьне арганізацыі Лігі БНР».
(«Камунікаты» Прэзыдыюму й Сакратарыяту Рады БНР, нр. 8, Бэры, Канада, сакавік, 1977.)

Жук-Грышкевіч, В., Старшыня Рады БНР. «30-я ўгодкі Згуртаваньня Беларусаў у Вялікай Брытаніі».

(«Камунікаты» Прэзыдыюму й Сакратарыяту Рады БНР, нр. 8, Бэры, Канада, сакавік, 1977.)

Жук-Грышкевіч, В., Старшыня Рады БНР. «Да Ўсяго беларускага грамадзтва. Дарагія Суродзічы!» Прывітаньне Старшыні Рады БНР на 60-я ўгодкі Першага Усебеларускага Кангрэсу.
(«Камунікаты» нр. 9 Рады Беларускае Народнае Рэспублікі, Бэры, Канада, лістапад, 1977.)

Жук-Грышкевіч, В. «25 Сакавіка», Успаміны зь Менску, Будслава, Вільні, Прагі, савецкай турмы», брашура. Выдавецкі Фонд Успамінмаў зь Беларускага Жыцьця. Торонто, 1978. 41 б.

Жук-Грышкевіч, В., Старшыня Рады БНР. «60-я ўгодкі 25 Сакавіка. Да ўсяго Беларускага грамадзтва. Дарагія Суродзічы!»
(«Беларус», Нью Ёрк, 251, Сакавік, 1978.)

Жук-Грышкевіч, В., Старшыня Рады БНР. «Дарагія Суродзічы!» Прывітаньне з 60-мы ўгодкамі 25 Сакавіка.
(«Камунікаты» Рады Беларускае Народнае Рэспублікі нр. 10, Бэры, Канада, сакавік, 1978.)

Жук-Грышкевіч, В. «Дбайма пра веду нашага мінулага, каб было на чым базаваць будучыню.»
(«Камунікаты» Рады Беларускае Народнае Рэспублікі. нр. 10, Бэры, Канада, сакавік, 1978.)

Жук-Грышкевіч, В., Старшыня Рады БНР. «Прывітаньне 13-ай Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі», Таронта, верасень, 1978.
(«Камунікаты» Рады Беларускае Народнае Рэспублікі, нр. 11, Бэры, Канада, кастрычнік, 1978.)

Пра цяжкасьці й перашкоды спатыканыя пры аднаўленьні беларускай дзяржаўнадсьці.

Жук-Грышкевіч, В., Старшыня Рады БНР. «Пра мінуўшчыну – дзеля будучыні».
(«Беларус», Нью Ёрк, 251, сакавік, 1978)

Жук-Грышкевіч, В., Старшыня Рады БНР. «Падзяка».
(«Беларус», Нью Ёрк, 251, 1978)

Жук-Грышкевіч, др. В. «Канфэрэнцыя Эўрапэйскіх Сэктараў Рады БНР».
(«Час», Фляшынг, Н. Ё. 20 [4], 1979)

ПАКАЗЬНІК ПРОЗЬВІШЧАЎ

А

Абабурко, Кацярына, 580, 581
Абабурко, Ян, сьвятар, 580, 581, 749
Абрамтовіч, сьвятар, 272
Абрамчык, Коля, 494
Абрамчык, Мікола, інж. xi, 44, 46, 71, 73, 77, 95, 143, 149, 150, 161, 162, 163, 165, 170, 174, 175, 176, 181, 189, 197, 245, 247, 248, 253, 256, 257, 258, 279, 419, 425, 469, 471, 492, 493, 495, 502, 525, 538, 539, 540, 541, 543, 545, 555, 564, 566, 569, 572, 604, 609, 612, 631, 638, 651, 743
Abramčyk, M., eng., xv, 557, 750
Абрамчык, Ніна, 149, 502,743
Абрэмскі, сьвятар, 542
Адамкевіч, праф., 372
Adamovič, A., 660
Адамовіч, Антон, праф., 258, 493, 495, 517, 539, 543, 550, 551, 566, 567, 588, 603, 612, 626, 663, 665, 674, 709
Адважны, Вінцук, (псэўдонім кс. Язэпа Гэрмановіча), 137
Азарка, Янка, 735
Akiner, Shirin, 660
Акула, Кастусь, 81, 101, 126, 178, 211, 246, 375, 420, 489, 520, 535, 585, 741, 749
Akula, K., (Акула, Кастусь), 384
Акула, Юрка, 693
Акулевіч, Рыгор, (Окулевіч, Г.), 212, 222, 224, 237, 348, 349, 350, 353, 354, 355
Александровіч, Андрэй, 137
Ален, Глын П., 289, 328, 352, 354, 371, 395, 426, 428, 613
Ален, Дорыс, 352, 354, 426
Алешка, А., 612
Альбрэхт, гэрцаг, 391, 392
Альтбаўэр, М., 602
Аляксандраў, Барыс, 487, 488, 489
Аляксандрава, Сьвятлана, 489
Аляксяевіч, 519
Аляксюк, 28
Аляхновіч, Алёна, 654
Аляхновіч, Арыядна, 125, 654
Аляхновіч, Рагнеда, 125, 654, 733, 744
Аляхновіч, Франьцішак, 38, 137, 142, 306
Ambrose, Elisabeth, 689
Амброзік, Алёйзіус, арцыбіскуп, 695, 696, 697
Aloysius, M. Ambrozic, Archbishop, 696, 697, 699
Ананіч, 121
Andrassy, Mike, 357
Андрус, Д. С., 426, 428
Андрусышын, Багдан, 703
Андрусышын, Данчык, 499, 703, 715, 719
Андрусышын, Юля, 764
Андрэй, мітрапаліт, 539, 541, 548, 584, 588, 653, 673, 675
Андрэюк, Васіль, сьвятар, 735, 739
Андэрсон, Эдна, 298
Антонэвіч, др. Д., 435
Арсеньнева, Клаўдзія, 306, 690
Арсеньнева, Наталья, (Арсеньнева-Кушаль), vii, 35, 115, 169, 258, 270, 428, 435, 487-90, 501, 523, 524, 588, 596, 597, 603, 610, 653, 676, 690, 693, 705, 707, 713, 718, 719, 722, 724, 726, 742, 743
Arsieńnieva, Natalla, xiii
Арцюх, Вера, 426, 428, 433, 516, 538
Арцюх, Мікола, 81, 516
Арцюх, Язэп, 721
Арэхва, 30
Арэшка, др. Аляксей, 176, 582
Асіповіч, Павал, 80-1, 584, 687

Асіповіч, Павал, былы вучань Радашковіцкае Беларускае гімназіі. 63, 278, 279
Астапчык, 52
Астроўская, Антаніна, 53
Астроўскі, Віктар, 57
Астроўскі, Радаслаў, 53, 57, 245, 247, 248
Аўгуст III, кароль, 134

Б

Бабарыка, Балеслаў, 279
Бабровіч, 44, 48
Багатыраў, 320
Багдановіч, Максім, 102, 103, 107, 137, 175, 538
Bahdanovic, Maksim, 660
Багдановіч, 52
Багушэвіч, Франьціішак, 104, 105, 136, 281, 282, 307, 352, 505, 622
Бадунова, Палута, 651
Baješko, Jarmalej, 216
Бакуновіч, Уладзімер, 352, 503, 515, 739
Баравой, Ален, 327
Баран, Янка, 101
Baran J., 383
Барановіч, Гэнрык, 121, 593
Барановіч, Надзя, 124, 136, 420
Baranovich, N., (Барановіч, Надзя), 124, 383
Барановіч, Уладзімер, 289, 427, 434
Barouka, 215
Бартон, Расэл, 289, 300
Бартуль, Антон, 500
Бартуль, Аня, 500
Бартуль, Вера, 500, 518, 674, 703
Бартуль, Франьціш, 81, 500, 518, 674, 703
Баршчэўскі, Ян, 136
Баўэрс, сьвятар, 326
Bezkorovayny, Rev. V., 230
Беразоўскі, Рыгор, 285, 289, 427, 434
Біда, Канстантын, праф., 372
Білак, 454
Bird, Thomas E., prof., xiii
Biryla, 660
Бічэль (Бічэль-Загнетава), Данута, vii, 723
Богдан, архіяпіскап, 210
Бодлер, 107
Бортнік, Уладзімер, 188, 189, 679, 680, 686, 737
Бохар, М., 434
Брага, Сымон, (псэўдонім др. Вітаўта Тумаша), 395, 411
Бражнёў, 456
Brant, Willy, 617
Брокінг, Кірыла, 123
Броўсэк, Езэф, 303
Brucki, Ivan, eng., (Бруцкі, Іван), 214
Бруцкі, Іван, інж., 537
Будзіч, А., 185
Budzka, Alaksej, 216
Будзька, Валерыя, (Будзьчыха), 53, 516, 690
Budzka, Ihnat, 216, 217
Budzka, Luka, eng., 216
Будзька-Бяленіс, Людовіка, viii, 53, 516
Будзька, Поля, 317
Будзька, Часлаў, 516, 656, 690
Будзька, Эдвард, 15, 24, 30, 53, 198, 199, 200, 201, 202, 203, 204, 205, 206 315, 317, 690
Будзённы, 32
Будны, Сымон, 136, 395
Бунд, 87
Бурбіс, А., 309, 439, 513
Буры, Аляксандар, 77
Бутрымовіч, 584
Bucko, Mikola, 213
Буяк, М., 81
Бычко, Майк (Міхась), 522, 537

Бэнэш, Эдвард, 255
Бэрд, Томас Е., праф., viii
Бюлер, Джэймс, 326
Бядуля, Зьмітрок, 137
Бяленіс, Антон, 515, 516
Бяленіс, Людовіка, (Будзька-Бяленіс), 516, 690

В

В., (псэўдонім Вінцэнта Жук-Грышкевіча), 339, 373, 376, 414, 415, 437-41, 443
В. Ж., (псэўдонім Вінцэнта Жук-Грышкевіча), 317, 437, 438, 450, 451, 460, 464
В. Ж.-Г., (псэўдонім Вінцэнта Жук-Грышкевіча), 509, 593
Вайцяхоўскі, сьвятар, 752
Вакар, 211
Валевіч, 424
Валейша, 24
Валоціч, Мікола, (псэўдонім Вацлава Пануцэвіча), 236, 237
Valocic, Mikola, 231
Валошын, 142, 143
Валынец, 143
Вальдгайм, Курт, 571
В. М., (Ванда Махнач), 752
Ванюк, Марыя, 523
Васілевіч, архэалёг, 8, 9, 22, 201, 304, 317
Васілеўскі, др. Віктар, (Войтанка), сьвятар, 540
Васілеўская, Марыя, (Войтанка), 569, 606
Васіль, архіяпіскап, 183, 198, 210, 262, 352, 494, 496, 539, 540, 541, 542, 543, 545
Васіль III Іванавіч, князь, 392, 396
Вахман, Эрык (Eric), 750
Верамей, 48
Вержбаловіч, Барбара, 174, 175, 176, 188
Весялоўскі, 584
Відук, М., 159
Віктар (Войтанка), др., сьвятар, 569
Віліямс, дырэктар радыястанцыі радыя «Вызваленьне», 151
Вініцкая, Каця, 721, 740
Вініцкі, Яраслаў, 721, 740
Вісьнеўскі, генэрал, 86
Віцьбіч, Юрка, (Ю. Стукаліча), 604
Вітаўт Вялікі, князь, 74, 134
В. М., (Ванда Махнач), 752
Водвуд, О., 435
Войтанка, др. Віктар, сьвятар, 515, 541
Войтанка, Людміла (Лена), 515, 753
Войтанка, Марыя, 702, 753
Войтанка, Расьціслаў, сьвятар, 606, 672, 674, 675, 753
Войцехоўскі, праф., 372
Вольны, А., 137
Вольф, генэрал, 361
Вудынгтон, 532, 533
Вышынскі, кардынал, 629
Wyszynski, Cardinal, 625
Вэлязкэз, 586
Вэрлен, 107
Вэрнант, 248
Вярнікоўская, 44
Вяршынін, Мікола, праф., 43, 651

Г

G., (pseudonym of Guy de Picarda), 751
Гадлеўскі, Вінцэнт, сьвятар, 272, 275
Гайдаш, др. Станлей, 289, 303, 372, 426, 427
Гайдаш, сп-ня, 426
Гайдзель, Ірэна, 740
Гайнсу, Ільмар, 298, 426
Галавач, 142

Галкоўскі, 320
Галубок, Уладзіслаў, 137
Галяк, Леанід, 115, 495, 496
Галяк, Раіса, 735, 740
Гамулка, Владыслав, 452
Ганна, Д. У., 38
Ганна з Ягайлавічаў, 392
Ганс, кароль, 392
Ганько, Марыя, 519, 520, 596, 666, 693, 743
Ганько, Мікола, 100, 101, 123, 178, 284, 353, 419, 502, 505, 519-20, 540, 541, 556, 596, 666, 693, 741, 742
Гантэр, 163
Ганчарук, 30
Ганчарэнка, Галіна, 163, 174, 175, 176, 715, 718
Гапановіч, Язэп, 24, 30
Гарбачоў, Міхаіл, 451
Гарошка, Леў, сьвятар, 77, 149, 585
Гарошка, Мікола, інж., 42, 44, 45, 46, 115, 496, 518, 541, 542, 545, 553, 637, 674, 678
Гарошка, Валентын, 543, 553
Гарошка, др. Расьціслаў, 543, 588
Гарт, Джон дэ, 434
Гартны, Цішка, (псэўдонім Жылуновіча Зьмітра), 137
Гарун, Алесь, (псэўдонім Прушынскага Аляксандра), 137
Harun, Ales, 660
Гаршын, 103
Гарэцкі, Максім, 20, 21, 22, 36, 137, 143, 487
Гасан, Ганы, 298
Гаўрылік, 139, 141, 142, 143
Гвідон, др. Р., 372
Геніюш, Ларыса, 102, 547, 548, 550, 551, 554
Геніюш, др. Янка, 44, 45, 547, 548
Гіль, М. 318, 319, 320
Гімпелевіч-Шварцман, др. Зінаіда, 299
Гітлер, Адольф, 256, 389, 450, 455, 456, 457
Глякоўскі, сьвятар, 273
Гордон, Вольтэр Л., 8, 290
Gordon, Walter L., 431
Гостовец, Павал, 450, 451
Гоя, 587
Грабінскі, др. Балеслаў, 115, 749
Грамадавец, (псэўдонім Вінцэнта Жук-Грышкевіча), 351
Грачанінаў, 320
Гросман, Ален, 290, 303
Grossman, Allan, 431
Грузд, Вінцэнт, 740
Грузд, Фэлікс, 31
Грыб, Тамаш, 44, 651
Грыфітс, 525, 528, 529
Грыневіч, 38
Грыцук, Аляксей, 100, 101, 121 123, 134, 138, 155, 178, 179, 193, 211, 282, 284, 399, 408, 465, 488, 502, 503, 520, 523, 540, 541, 595-7, 742, 751
Грыцук, Оля, 489, 503, 523, 596, 752
Грыцук-Мэкарская, Юльяна, 299
Грышкевіч, Антон, viii, 2, 3
Грышкевіч, Марыя, (Ханяўка), viii, 2, 3
Грышкевіч, Браніслаў, viii, 2
Грышкевіч, Вінцэнт, праф., (Жук-Грышкевіч), 70, 71, 73, 74, 99, 100, 135, 748, 752
Грышкевіч, Міхась, viii, 2
Грышкевіч (Аляхновіч), Рагнеда, vi, 53, 55, 183
Грышкевіч, Ядвіня, viii, 1, 2, 313
Грышкевіч, Яська, viii, 2
Грэй, місыс, 525, 526
Г. С., (Галена Скурат), 748
Гук, Я., сьвятар, 235, 244
Гузоўскі, 44
Гуменюк, 423, 424

Гундоров, А., 389
Гурло, Аляксандар, 137
Гусак, 456
Гусоўскі, інж., 30
Гутырчык, Сяргей, 607
Hucko, V., 214
Гушча, Тарас, (Якуб Колас), 20, 106
Гэльер, Пол Т., 290
Hellyer, Paul T., 431
Гэнкэ, фон, 256
Гэрмановіч, каапэратар, 30
Гэрмановіч, Язэп, (Вінцук Адважны), сьвятар, 273
Гэрус, Мікола, 495, 496

Д

Дабравольскі, 87
Д-ка, 586
Дамарадзкі, др., 112, 113
Дамінікі, 581
Данілеўскі, 388
Данілюк, Барыс, 258
Дарэўскі-Вярыга, Арцём, 136
Дастаеўскі, Ф. М., 388
Дварчанін, др. Ігнат, 44, 45, 139, 141, 142, 143, 651
Джонсан, прэм'ер Квэбэку, 459
Дзехцяроў, 44
Д., Случчак, 37
Доброўскі, 388
Драпо, Жан, 462
Дрэгэр, Роберт, 149, 150, 178
Дубавік, 423
Дубейкаўскі, Лявон, інж., 8, 10, 202
Дубейкаўская, Юльяна, (Мэнкэ), 506, 507, 508, 509
Дубоўка, Уладзімер, 107, 137
Дубчэк, 452, 453, 454, 456
Дудар, Алесь, 137
Дунін-Марцінкевіч, Вінцук, 104, 136
Душэўская, Ганна, 306
Душэўскі, К., інж., 30
Дыліс, Арнольд, 25, 26
Дыліс, Аўген, 25, 26, 44, 45
Дынглей, Дж., 602
Дэ Голь, 458
Дэнісон, Вільям, 289, 291, 426, 428
Дэнісон, сп-ня, 426
Дэйвіс, В. Г., 466
Дэсэ, 151, 176

Е

Egremont, Lord, 648
Engelhardt, E. F. von, (Энгэльгардт), 237
Ермачэнка, Іван, 651
Еўлашэўскі, Тодар, 136
Еўфрасіньня, Полацкая, 125, 283

Ж

Ж., (псэўдонім Вінцэнта Жук-Грышкевіча), 48, 51, 109, 123, 139, 324, 329, 336, 343, 345, 348, 364, 390, 420, 421, 435, 456, 457, 468, 470
Жаўрыд, 186
Жук, В., (псэўдонім Вінцэнта Жук-Грышкевіча), 41, 96, 123, 166, 187, 266, 276, 290, 307, 313, 318, 332, 367, 417, 444, 451, 455
Жук, (Вінцэнт Жук-Грышкевіч), 165
Жук, др. (псэўдонім Вінцэнта Жук-Грышкевіча), 106, 134, 135, 141, 143, 157, 165, 166, 198, 266, 390, 458
Žuk, Dr., (Раіса Жук-Грышкевіч), 261, 711
Žuk, Dr. V., (псэўдонім Вінцэнта Жук-Грышкевіча), 207, 217, 227, 238, 242, 251, 253, 260, 262, 486

Žuk-Hryszkievicz, Vincent, prof., (Жук-Грышкевіч, др. Вінцэнт), 149, 150
Жукоўская, Валя, (Валентына Пашкевіч), 99
Жукоўская, Раіса, (Раіса Жук-Грышкевіч), x, 121, 133, 136, 159
Жукоўскі, Мікола, 171
Журэпняў, Іван, 26
Жучка, Ян, інж., 582
Жыгімонт Казіміравіч, князь, 392
Жылка, Уладзімер, 44, 45, 46, 49, 50, 102, 106, 107, 108
Жылка, Бэатрычэ, Бэата, Ата, Натальля, 49, 50, 51
Жылка-Лазарава, Натальля-Бэата, (Жылка, Бэатрычэ), 49, 50, 51
Žytko, (Жытко, Ян), 214
Жытко, Ян, інж., (Zytko), 213, 214, 244
Жэлезоўская-Смаршчок, Зоя, 582

З

Z., (Вінцэнт Жук-Грыушкевіч), 94
Забейда-Суміцкі, Міхась, 175
Загуменны, др., 65
Загурскі, А., 81
Залескі, 255
Заляшчанін, (псэўдонім Вінцэнта Жук-Грышкевіча), 118, 119, 132, 143, 148
Заморская, Вера, 715
Zajko, Andrej, 215
Zajko, Jury (George), 214
Запруднік, Оля, 538, 609, 674
Запруднік, др. Ян, viii, 175, 179, 180, 185, 299, 300, 406, 408, 493, 495, 500, 501, 511, 517, 518, 525, 538, 539, 540, 543, 544, 553, 566, 567, 603, 609, 634, 663, 665, 668, 672, 674, 675, 683, 709, 735
Zaprudnik, Dr. Jan, xiii
Захарка, Васіль, 255, 256, 257, 564, 572, 631, 638, 651
Zacharka, V., 750
Заяц, Лявон, 638, 650
Зданковіч, А., 676
Зіняк, 237
Знамяроўскі, 25
Зубец, 315

І

Іваноўскі, В., 309
Ivanouski, Viktar, (Іваноўскі, Віктар), 213, 215, 242, 244
Ігнатава, Л., 9, 22, 317
Ігнатовіч, 44
Ігнатоўскі, Усевалад, 441
Ізяслаў, князь, 692, 693
Ільяшэвіч, Мікола, 16, 17, 18, 25, 26, 44, 46, 48, 171
Ільяшэвіч, Ніна, 18
Ільяшэвіч, Хведар, 18, 171

К

К., 137
Кабычкін, 179
Кабыш, Сымон, (псэўдонім Сымона Кандыбовіча), 151, 161, 165
Каваленка, Янка, 738
Кавыль, Міхась, 495
Каганец, Карусь, (псэўдонім Казіміра Кастравіцкага), 107, 136
Кажан, Віталі, 258, 493, 517, 634, 639, 701, 703, 705, 740
Кажан, Люба, 674, 703, 705, 740
Кажаневіч, спадарыня, 580
Кажаневіч, Хведар, 580, 608
Кажура, Марыя, 740
Кажура, Пётра, 740

Казімір, Ягайлавіч, 134
Калаўр, Уладзімер, 26
Калбаса, Гэля, 579
Калбаса, Янка, 560, 579, 609
Каленік, 81
Калесьнік, 81
Каліноўскі, Кастусь, 61, 269, 270, 286, 352, 388, 423, 505, 621, 622, 646
Кальба, С., 372
Калоша, Кастусь, 537
Кальбэр, 359
Калько, Аляксандар, 579
Каляда, сп-ня, 702
Каляскі, 502
Канчар, 438
Канчэўскі, Арсень, 52
Канчэўскія, браты, 30
Каранеўская, А., 605
Карасэвіч, В., 272
Карась, Леанід, 151, 160, 172, 176, 179, 180, 281
Караткевіч, Уладзімер, 522
Каратынскі, Вінцэсь, 136
Карніловіч, Сяргей, 352
Карп, (Старавойтаў), сьвятар, 542, 544, 569
Карповіч, Алесь., 174, 175, 585
Карскі, Яўхім, 622
Карт'е, Жак, 358
Картон, Г. П., 289, 426, 428
Карыба, Лявон, 375
Karyba, L., (Карыба, Лявон), 384
Касак, Мікола, 551
Кастусь, В., 59, 60, 61
Касьцюкевіч, Віктар, 121, 284, 520, 523, 538, 596, 676, 701, 734, 742
Касьцюкевіч, Ірэна, 523, 538, 596, 676
Касьцюшка, Тадэуш, 636
Касыгін, 456
Касяк, Іван, 495, 496
Катовіч, Іван, 22
Кахановіч, Міхась, 16, 36, 306
Каханоўская, Яня, 270, 492, 498-9, 502, 553, 709, 718, 721
Каўцэвіч, 48
Керанскі, 146, 201, 421, 422
Кіпель, Алеся, юрыст, 689
Кіпель, др. Вітаўт, vii, 298, 300, 603, 674, 689, 709, 718, 720, 721, 726
Kipel, Dr. Vitaut, xiii
Кіпель, Зора, vii, 683, 689, 709, 734
Kipel, Zora, xiii
Кірка, Барыс, 354, 420, 537, 734
Кірка, Вера, 693
Кіркгам, др. Пітэр, 296, 683
Kirkham, Dr. Peter G., 297
Кіршбаўм, др. Дж. М., 290, 372, 373
Kirshbaum, Dr. J. M., 431
Кірыла Тураўскі, 530, 539, 583
Кірэўскія браты, 388
Кіслы, 10
Кіслы, Кастусь, 155, 262, 541
Кіты, спадарства, 691
Кысілевскы (Кэйэ), др. В. Дж., (Кисілевський, д-р. В. Дж.), 243, 261
Кісялёў, Ціхан, 405-7, 412-5
Клейнбарт, Леў, 183
Клів, др. Н., 467
Клімовіч, 44, 554
Кляйноў, 81
Кміта, Філон, 136
Кнорын, В., 436, 439
Колас, Якуб, 103, 105, 106, 137, 198, 278, 352, 495, 505, 513, 703
Кольдар, 454
Коляр, Ян, 388
Комар, сям'я, 754
Конюх, Пётра, 153, 155, 190
Копаньскі, ген. 75
Корж, Уладзімер, 25, 26, 44, 45
Koron, Michael, 217
Косьцюк, Аляксандар, сьвятар, 369

Косьцялковскі, др. С., праф., 109
Кошмідэр, Эрвін, праф., 192
Кошыц, 320
Крамаж, Кароль, 389
Крапіва, Кандрат, 137
Краскоўскі, І., праф., 30, 36
Краскоўская, 44
Краўцоў-Косьцевіч, Макар, 56, 187
Крэстон, Чарльз Дж., 208
Kerston, Charles J., 208
Крэчэўскі, Пётра, 45, 255, 256, 638, 650, 651
Krečeŭski, P., 750
Кругляк, Орэст, 612
Круталевіч, Вадзім, 438, 439
Крыванос, 121
Крывашэін, 6, 7
Крывэр, праф., 326
Крыжаніч, Юры, 387
Кукель, Часлаў, 76, 77, 78, 81, 82, 585
Cook, R.C.C., 617
Кулеш, Лена, 356, 519, 532, 533, 534
Кулеш, Міхась, 519, 532, 533
Kulesh, Michas, (Кулеш, Міхась), 216, 217
Куліковіч, Мікола, 180, 321, 431
Кунцэвіч, Мікола, 496, 543
Купала, Янка, 7, 11, 102-5, 113, 115, 132, 133, 137, 174, 198, 278, 304, 315, 350, 352, 428, 435, 505, 513, 703
Курыла, Уладзімер, 81, 544, 545, 674, 709, 735, 754
Курыла, Аліна, 544, 709, 754
Кухарчык, Міхась, 287, 303
Кушаль, Пеця, 491
Кушаль, Тата, 491
Кушаль, Уладзімер (Улодак), інж., 490, 491, 501
Кушаль,Франьціш, генэрал, 115, 258, 490, 501
Кушнір, др., 372
Кэйдж, др., 328
Кэйэ, В., спадарыня, 263
Кэйэ, др. В. Дж., (Кэйэ-Кысілевскы), хі, 109, 112, 113, 207, 208, 209, 213, 218, 238, 242, 243, 251, 252, 258, 263, 264, 265, 266, 267, 268
Kaye, Dr. V. J., (Кэйэ, Васіль, – Кысілевскы), 208, 218, 232, 238, 242, 251, 253, 261, 262, 263, 377, 382
Кэлі, заступнік Прэзыдэнта Амэрыканскага Камітэту на Эўропу, 152
Кэлі, сям'я ў Бэры, 754
Kelly, 754
Кэмпбэл, Маргарэт, 352, 355
Кэндыш, Васіль, сьвятар, 497, 544, 588, 675
Кэніг, інж., 65, 66
Кэрк, адмірал, кіраўнік Амэрыканскага Камітэту Вызваленьня Народаў Расеі, 144-45

Л

Ландэр, 441
Lawless, Hanry Alen, 618
Лапіцкая, Ксеня, 52
Лапіцкі, Мікола, сьвятар, 52, 495
Ласковіч, 22
Ластоўскі, Вацлаў, 651
Лаўскі, 44, 45
Лашук, Аляксандар, 524, 579, 581, 680
Левіцкі, Мікола, 347, 492
Лекант, 57
Ліманоўскі, 153, 160, 161, 165
Ленін, 389, 442
Літвіновіч, др., 112, 113
Лішчонак, Балеслаў, 427, 434
Lischonak, B., (Лішчонак Балеслаў), 384
Лёнька, 6
Лёрэнц, 390
Лужынскі, Міхась, 719

Луцкевіч, Антон, (Навіна), 21, 35, 36, 53, 54, 57, 306, 309-12, 498, 499, 503, 505-7, 509-14, 693, 721
Луцкевіч, Іван, (Яська), 8, 35, 54, 309-13, 498-9, 503-8, 510, 512-3, 693, 721
Луцкевіч, Лявон, 498
Луцкевіч, Юрка, 498
Луцэвіч, Іван, (Янка Купала), 104
Лучук, Володымер, 548
Лышчук, 304, 317
Людовік XIV, кароль, 359
Люрдусамы, Д. Сімон, кардынал, 725
Lourdusamy, D. Simon, Cardinal, 726
Лявіцкі, Антон, (Ядвігін Ш.), 102, 103, 104, 105
Лямарш, Джуды, 324
Ляндэр, 441
Ля Саль, 360
Ляфает, Маркіз, 636

М

Мазуро, Юры, 538, 562
Мазэпа, 423
Макоўскі, (беларускі студэнт у Празе ў 20-х гадох), 44
Макоўскі, (беларус у Чыкага), 515
Малевіч, 44
Малафеяў, др., 58
Мальвіна, 14, 15
Малька, Ян, 30
Мальцінскі, Хаім, 50, 51
Мамонька, Я., 44, 651
Маневіч, Рыма Маркаўна, 49, 51
Манінг, Эрнэст, 463
Манчэстэр, др. Гэлен, 194, 526
Манькоўскі, Пётра, 89, 496
Марашэўскі, 136
Марч, Р., 372
Марговіч, 151
Маркевіч, Антон, 123, 285, 287, 299, 533, 536, 585
Маркевіч, каапэратар, 30
Маркл, Г., 326
Мартын, Пол, 290
Martin, Paul, 431
Марцінкевіч, Вінцук, (Вінцук Дунін-Марцінкевіч), 104, 105, 136
Марцінская, 87
Масарык, 255, 454
Maskaluk, Maksim, 215
Масэй, Вінцэнт, 99
Махнач, Ванда, 715, 752
Махнач, Міхась, 515, 588
Махноўская, 498
Мацкевіч, Кастусь, 66, 277, 278
Мацукевіч, Міхал, сьвятар, 124, 164, 174, 179, 368, 369
Macukevich, Rev. Michail, (Мацукевіч, Міхал), 209, 210, 262
Мерляк, Кастусь, 258, 494
Мехаў, Уладзімер, 49, 50
Meyer-Landrut, Dr., 618
Мігай, Міхаіл, сьвятар, 100, 124, 209-11, 497, 538-40
Мігай сп-ня, 125
Мікалай, архіяпіскап, 351-3, 355, 426, 434, 489, 496, 497, 523, 538-42, 544, 569, 584, 588, 674-5, 735-6, 741, 743
Мікуліна, 22
Мілоўская, 44
Мілош, Чэслаў, 65
Міндоўг, князь, 240, 264
Мірановіч, Пётра, 390, 498, 500, 551, 554
Міхаленка, праф., 372
Міхалюк, Янка, viii, 505, 581, 583, 605, 655, 676, 687
Michaluk, Jan, xiii
Міхалюк, Лёля, 586, 676
Міцкевіч, Адам, 622
Міцкевіч, Аляксандар, 65, 494, 495, 518, 543, 553
Міцкевіч, Валентын, 495

Міцкевіч, К., 65
Міцкевіч, Міхась, 495
Мішкінец, сьвятар, 23
М. К., 65
Молатаў, х, 66, 442
Moller, Jakob T., 618
Monid, Arsen, 384
Монткальм, 361
Морнік, 239
Мостовац, 372
М. Р., (М. Рачыцкі), 134, 135
Мунро, Джон, 613
Мураўёў, 423
Муха, 48
МэкДональд, Джон А., 363
МэкДональд, Дональд, 290
MacDonald, Donald, 431
МэкКарвіл, Эва, (Пашкевіч), 740
МэкКарвіл, Ян, 740
McMillin, Dr. Arnold B., prof., 660, 676
МэкТэвіш, Рэй, 195
Мэнкэ, Юльяна, (Дубейкаўская, Юльяна), 8, 503, 505, 508
Мэрдок, Бэрнардэта, 734, 754
Мэрдок, Морыс, 734, 754
Мядзёлкі, 315
Мялешка, Іван, (прамова Мялешкі), 136, 369
Мятла, Пётра, 139-40, 142-3, 349

Н

Набагез, др. Уладзімер, 493
Навара (Наваро), Павал, 74, 81, 584, 676
Навіна, Антон, (псэўдонім Антона Луцкевіча), 311, 312
Навіцкі, Валерыян, 100
Навіцкая, Натальля, 135
Навотны, 452
Надсон Аляксандар, сьвятар, viii, 1, 77, 81, 82, 95, 584, 602, 660, 662, 681, 694, 695, 713, 715-18, 721, 725, 734, 735
Nadson, Rev. Alexander, xiii, 660, 681, 689, 717
Настукаш, 290, 426, 428
Найдзюк, Часлаў, 52
Naumenka, I., 660
Наўмовіч, Міхась, 585
Нікан, Мікола, 89, 541, 585, 702
Ніксан, Рычард, 571
Ніксон, Робэрт Ф., 290
Nixon, Robert F., 431
Новак, Б. 435
Нор, К., 76, 77, 79, 81
Нэканда-Трэпка, Антон, інж., 30, 56, 57, 58, 62, 277, 278
Нядзьведзкі, Пётра, 740
Няслухоўскі, Ян, 104, 136

О

Олдуніл, Дж., сп-ня, 434
Окулевіч, Г., (Акулевіч, Рыгор), 265
Орса, Ала, (Алюньця), 499, 500, 553
Ораса, Аляксандар, 44, 45, 499, 542
Ораса, Галіна, 499, 500, 552, 553, 703
Орса, Натальля (Наташа), 495, 499, 500, 542, 544, 552, 553, 703
Орса-Романо, др. Ала, 500, 553, 674, 715, 719
Орса, Пётра, інж., 30, 44, 45
Оськерка, 202
Оты, Робэрт, праф. 694

П

Пагодзін, 338
Пазьняк, Зянон, 316
Пазьняк, Эвэліна, 752
Pazniak, Eveline, 753

Пазьняк, Язэп, 752
Pazniak, Joseph, 753
Пазьняк, Янка, 316
Палескі, Аляксандар, 299, 721
Палка, Іван, 303
Палянскі, 456
Паляцкі, 388
Панковіч, з Крывіч, 8, 9, 317
Пануцэвіч, Вацлаў, 502, 514, 515, 516, 607
Пануцэвіч, Ірэна, 516, 690
Папа Ян XXIII, 267
Папа Ян Павал Другі, 681
Папроцкі, М. Я., 239
Патры, Робэрт, 267
Пашкевіч, Алёйза (Цётка), 352, 503
Пашкевіч, Валентына, (Жукоўская Валя), viii, 210, 295, 297, 300, 428, 431, 489, 514, 517, 527, 528, 596, 610-3, 676, 693, 732, 742, 752
Pashkievich, Valentyna, xiii
Пашкевіч, Міхась, 596, 610, 676, 732, 752
Пашкевіч, Паўлюк, viii, 291, 295, 297, 299, 390, 527, 528, 596, 610, 612, 668, 676, 721, 752
Пашкевічанка (МэкКарвіл), Эва, 352, 538, 545, 546, 596, 610, 676, 721, 752
Пашкевіч-Смітс, Паўліна, 299
Пашчанка, 320
Паўленка, 423
Паўлоўскі, Мікола, 685
Паўлоўскі, П., 585
Підгайный, 138, 142
Пікарда, Гай дэ, viii, 557-9, 578, 585, 602, 654, 656-8, 662, 664, 665, 667, 694, 750
Picarda, Guy de, xiii, 557, 558, 559, 585, 657, 658, 660, 661, 663, 664, 751
Пікэрсгіл, 372
Пілатовіч, Станіслаў, 406
Пілкэй, Кліфорд, 434
Пілсудзкі, Юзэф, 32, 35, 37
Пірсан, Лестэр Б., 290, 303, 357, 427
Pearson, Lester B., 431
Пітс, Рэй, 721
Пітушка, Язэп, 287, 291, 352, 532
Пітушка, Я. (малодшы), 431, 528, 532
Пітэрс, Омар, 466
Плескач, Васіль, 566, 567
Плескач, Тацяна, 561
Пол, Джуды, 298
Попка, Юры, 585
Prakopchik, N., 383
Пракулевіч, 638, 650
Пракулевічыха, мастачка, 38, 306
Pranovič, Nikanor, 216
Pranovič, Symon, 216
Праховіч, Уладзіслаў, 718, 719, 721
Прокша, Лявон, 350, 351
Протас, Аляксандра, 693
Протас, Аляксандар, 502
Protas, A., 383
Прысутны, (псэўдонім Вінцэнта Жук-Грышкевіча), 206
Пушкін, Аляксандар, 388
Пушча, Язэп, 107, 137
Пэрута, Якуб, сьвятар, 738,739
Пэч, 492
Пякарскі, Янка, сьвятар, 583, 584, 691
Пятровіч, А., 290, 435, 436, 437, 439, 440, 442, 443
Пятроў, Т., 441
Пятроўскі, Ян, сьвятар, 691
Пятруся, 509

Р

Равенскі, Мікола, 169, 180
Радчанка, Міхась, 214
Radchanka, Michas, (Радчанка Міхась), 214

Рагвалод, князь, 692, 693
Рагнеда, (Грышкевіч-Аляхновіч), 55, 125, 183
Рагнеда, Рагвалодаўна, 283, 692, 693
Рагуля, др. Барыс, 151, 176, 295, 298, 301, 303, 399, 465, 503, 514, 517, 520, 521, 523, 538, 539, 568, 578, 593, 596, 597, 612, 613, 668, 676, 734, 741
Рагуліха, Людміла, (Людка), 399, 503, 514, 517, 523, 538, 539, 596, 676
Рагуля, Ніна, 674
Рагуля, Уладзімер, 299
Раіса, (цётка з Земсаюзу ў Менску), 8
Рак-Міхайлоўскі, Сымон, 54, 139, 140, 142, 143, 349, 513
Рамановіч, Галена, 406
Рамук, Вера, 515, 715, 720
Рамук, др. Вітаўт, 515, 516, 715, 718
Расьціслаў, сьвятар, (Войтанка), 674
Рафаэль, 190
Р. Ж., (Раіса Жук-Грышкевіч), 282
Р. Ж.-Г., (Раіса Жук-Грышкевіч), 327, 452, 478, 490, 492, 493, 498, 500, 506, 509, 513, 532, 541
Рачыцкі, Мечыслаў, 101, 120, 124, 135, 193
Ratchicki, M., (Рачыскі Мечыслаў), 383
Раян, Клёд, 459, 467
Rich, Vera, 689
Роблін, Даф., 463
Робартс, Джон П., 290, 324, 428, 463
Robarts, John P., 431, 432
Родзька, Галіна, 115
Родзька, Філярэт, 498, 553
Родзьчыха, 498, 553
Роман, Сьцяпан Б., 371
Романо, Франк, 554
Романо, др. Ала (Орса), 554
Рудзь, 81
Русак, Васіль, інж., 115, 492, 493, 497, 498, 517, 553, 674, 735, 740
Русак, Б., 651
Русак, Ганна (Нюра), 492, 494, 498, 500, 501, 517, 541, 542, 543, 549, 552, 553, 674, 703, 740
Русак (Родзька), Галіна, 497, 498, 551, 553, 674, 740
Русак, Уладзімір (Валодзя), 492, 493, 494, 498, 500, 501, 517, 541, 542, 543, 549, 533, 552, 674, 703, 740
Русак, Людміла, 553
Русак, Натальля, 553
Рыбак, 52
Рыбэнтроп, 442
Рыдлеўскі, Лявон, інж., 44, 89
Рыма, (Маневіч), 50, 51
Рымша, Андрэй, 136
Рынгольд, 240
Рыпінскі, Аляксандар, 136
Рыч, Вера, 585
Рышэлье, кардынал, 359
Рэйзін, (Р.), 56, 62
Рэшаць, Язэп, сьвятар, 273

С

Савіцкі, Каліст рат, 541
Сагайдакіўскі, сьвятар, 210
Сажыч, Вара, 426, 428, 433, 523, 538, 540, 596, 597
Сажыцч, др. Язэп, 352, 426, 433, 488, 489, 494, 503, 514, 515, 516, 517, 423, 526, 537, 540, 541, 593, 596, 597, 634, 676, 693, 715, 719, 735
Сажыч, Лена, 426, 428, 433
Сазановіч, 44
Сак, (браты Сакі), 44
Садоўская, 44

Садоўскі, др. Янка 503, 520, 538
Садоўскі, 423
Салевей, А., 498
Санчэз дэ Маліцкі, Эльвіра, 298
Сапега, Леў, 136, 340
Саржант, 496, 502
Сасноўская, Ніна, 306
Сасноўскі, Аляксандар, 17, 44
Сваяк, Казікір, (псэўдонім кс. Кастуся Стэповіча), 137
Семянкевіч, 175
Сенькевіч, др. Віктар, 76, 77, 78, 79, 80, 81, 584, 586, 609, 679, 681, 683, 686, 707
Сенькевіч, Гэнрык, 81, 516
Серафімовіч, С. 81
Sigismunt II Auhust, 259
Сікорскі, х, 66
Сільвановіч, Ванда, 740
Сілвановіц, Мікола, 214, 229
Silvanovic, Mikola, 214, 229, 231
Сільвановіч, Нікіфар, 120, 519, 740
Silvanovich, N., (Сільвановіч Нікіфар), 383
Сімпсон, праф., 372
Sinica, Aleksandar, 217
Сіняўская, 52
Сіповіч, др. Часлаў, біскуп, 77, 95, 117, 175, 267, 279, 352, 539, 581, 583-4, 602, 676-8, 680, 693-7
Sipovich, Ceslaus, bishop, 677, 696, 698
Сіроў, Джозэф, сьвятар, 752
Скабей, М., 585
Скарына, др. Франьцішак, 2, 61, 136, 241, 390, 391, 392, 395, 396, 425, 428, 505, 551, 598, 602, 694, 697, 706
Skaryna, Dr. Francisk, (Франьцішак Скарына), 377
Скурат, Аліна, 284, 748
Скурат, Віктар, 284, 748
Скурат, Галена, 284, 748
Скурат, др. Яўхім, 399, 400, 506, 520
Сланеўская, 44
Слаўко, Марта, 124
Слаўко, Ніна, 121
Слаўко, Пётра, 124, 184
Слаўко, Ю., 121
Слосканс, Балеслаў, біскуп, 154
Случчак, Д., 37
Смаршчок, др. Аўген, сьвятар, 582, 585, 605
Смаршчок, Андрэй, 582
Смаршчок, (Жэлезоўская-Смаршчок), Зоя, 582
Смаршчок, Пятрусь, 582
Смоліч, Аркадзь, 30
Совэ, Морыс, 462
Сокал, Я., 674
Стагановіч, Аляксандар, 143, 258, 543, 603, 702
Стагановіч, Лявон, 735
Стагановіч, сям'я, 740
Сталыгава, 30
Станкевіч, Адам, сьвятар, 23, 24, 36, 37, 272, 305
Станкевіч, Вячаслаў, 543
Станкевіч, Зіна, 494, 543
Станкевіч, Марыя, 674
Станкевіч, Рая, 543
Станкевіч, др. Станіслаў, 55, 151, 155, 165, 170, 176-9, 192, 270, 408, 494, 495, 500, 502, 505, 514, 517, 518, 550, 585, 604
Stankievic, Dr. St., 661
Станкевіч, др. Янка, 44, 194, 234, 518, 522, 585, 651
Станфілд, Робэрт Л., 290
Stanfield, Robert L., 431
Станяшак, Еўфрасіньня, 740
Старавойтаў, Карп, сьвятар, 541, 542, 543, 544
Стаўбунік, Кацярына, 171
Стома, Васіль, viii, 378, 606, 639, 735, 737
Stoma, Vasil, xiii
Стоўн, Ірвінг, 530
Страпко, Міхась, сьвятар, 539, 541, 738, 739

Стронг, праф., 372
Стрэчань, Андрэй, 537, 541, 738, 739
Стук, А., 522
Стусы, спадарства, 721
Стывэнс, 150
Стэльмашок, Мікалай, 519, 540
Sudnik, prof., 660
Суднік, праф., 662
Сукенніцкі, Віктар, праф., 161
Suprun, 660
Сурвіла, Янка, 89, 98, 520, 556, 596, 610, 634, 639, 670, 676, 731
Survilla, Janka, 670, 672
Сурвіла, Івонка, 299, 300, 520, 596, 610, 612, 670, 676, 691, 693, 719, 731, 732
Сурвіла, Ганна, 596, 610, 731
Сурвіла-Вахман, Марыя, Паўля, (Паўлінка), 300, 596, 610, 731, 750
Сушынскі, др. В., праф., 466
Сыракомля, Уладзіслаў, 136
Сыч, Пётра, 63, 64, 69, 74, 95, 150-3, 155, 160, 162, 165, 168, 172, 175, 176, 276-81
Сьвідрыгайла, 134
Ськепка, Пётра, 719
Сьмігельскі, 314
Сьпічонак, 89
Сэбор, Пол. сьвятар, 734
Сэйсо, Грэйс, 528, 596
Сэйсо, Тоні, 528
Сяднёў, Масей, 495, 496
Сядоў, В., 553
Сяргей, архіяпіскап, 89, 210
Сяўковіч, Янка, 579, 580, 586, 589

Т

Тамашчык, Уладзімер, інж., 88, 89, 98
Тамушанскі, др. Рабэрт, сьвятар, 390
Танк, Максім, 55, 132, 321, 406
Таннасэ, Ніколае, сьвятар, 303
Тарасэвіч, сьвятар, 273
Тарашкевіч, Браніслаў, 54, 142, 349, 513
Тарнапольскі, Вольтэр С., 466
Тарноўскі, 75
Татарыновіч, др. Пётра, сьвятар, 175, 190, 267, 273, 585
Твожыдло, палкоўнік, 86
Томпсон, Эндру, 466
Троцкі, 63
Трудо, Піер Эліёт, 291, 292, 571
Трусаў, Аўген, палкоўнік, 639, 640, 675, 678
Trynda, Danila, 215
Трэпка, А., інж., 54, 278, 513
Тулейка, Міхась, viii, 114, 115, 543, 735, 736
Tulejka, Michael, xiii
Турскі, І., 521
Тумаш, др. Вітаўт, vii, 269, 395, 398, 399, 411, 494, 500, 501, 517, 518, 520, 521, 542, 543, 549, 550, 551, 552, 553, 554, 585, 598, 603, 674, 709
Тумаш, Ксеня, 494
Тумаш, Галіна, 596, 610
Тур, князь, 692
Тызэнгаўз, 221
Тэрпак, 165, 176

У

Увітнэй, Рагнеда, (Ханяўка), 740
Ужэвіч, Іван, 602
Уладзімір, князь, 692
Уладзіміраў, (упаўнамочаны Земскага Саюзу ў Менску ў 1917 г.), 7
Уладзіміраў, др., (радыё «Свабода»), 585
Уладзіміраў, 57

Уласаў, Аляксандар, 54, 309, 312, 505, 513
Урбан, Маргарэт, 523, 596
Усяслаў Чарадзей, князь, 61, 693

Ф

Farrell, Rev. James J., S. J., 711, 724, 754
Фаррэл, Джэймс Дж., сьвятар, 710, 713, 715, 717, 718, 719, 721, 723, 741, 754
Флемінг, Зузанна, 578
Фіцпатрік, сям'я, 754
Форд, Джэральд, 626
Ford, Gerald, 626
Фрыдрых, Іле, 392
Фрыдрых, др. Стывэн, 522, 523, 524, 529
Фурнье, Ролянд, 328
Фэрдынанд I, кароль, 392

Х

Хамякоў, 388
Ханенка, Янка, 739
Ханяўка, Казюк, 57
Ханяўка, Марыя, 115, 116, 270, 496, 498, 542, 552, 553, 709, 735, 740
Ханяўка, Рагнеда, 115, 116, 270, 497, 553
Ханяўка, Часлаў, інж., 114, 115, 270, 496, 497, 542, 552, 709, 735
Харавец, Аркадзь, 734
Харэвіч, Жорж, 552
Хмара, Сяргей, (Chmara, Serhey), 100, 131, 209, 211, 244-9, 251, 252, 260
Chmara, Serhey, (Хмара), 251
Хмяльніцкі, 423
Храноўскі, Анатоль, 367, 368, 400, 402, 720, 721
Храноўская, Галена, 721
Храноўская, Крыстына, 367, 368, 400, 402, 722
Храноўская Ларыса, 721
Храноўскі, Рыгор, 721
Хрыстыян, князь, 392

Ц

Цанава, 166
Целеш, Рыта, 123, 519
Целеш, Уладзімер, (В.), 123, 307, 420, 540
Цеханоўскі, (дырэктар беларускай гімназіі ў Наваградку), 499
Цётка, (псэўдонім Алёйзы Пашкевіч), 136, 283, 307
Цікота, сьвятар, 272
Цімафей, 60
Цімафейчык, Т., 80, 81
Ціта, маршал, 389
Цітовіч, Генадзь, 405, 407
Ціханюк, Зьмітро, 715
Цьвікевіч, др. Аляксандар, 45, 151, 638, 650
Цьвірка, Уладзімер, 151, 174, 179
Цьвяткоў, Пётра, 44, 46, 47, 48
Цялеш, Роланд, 299
Цяпінскі, Васіль, 136, 395

Ч

Чарапук-Змагар, Янка, 115-6
Чарвякоў, А., 438, 439, 450, 451
Чарнэцкі, (бел. студэнт у Празе), 44
Чарнэцкая, Аляксандра, 740
Чарнэцкі, Ян, 515
Чарняўская, 21
Чарняўскі, Франьціш, сьвятар, 89
Чарот, М., 137
Чартарыскі, кн., 221
Чачот, Ян, 136
Чайкоўскі, 179

Čorčus, Janka, (Чопчыц), 213
Чорны, Кузьма, 137
Чорная, Ніна, 515, 519
Чорны, Язэп, 101, 121, 122, 123, 519, 521
Чыжэўскі, 30
Чыеш, др., 372
Чыркун, 121
Чэрнік, 456

Ш

Шабуня, Эмілія, 498, 499
Шавейка, 48
Шамплен, Самуэль, 359
Шафарык, Павал, 388
Шах, 44
Швэстка, 454
Шмыгаў, праф., 406
Шнаркевіч, Надзея. 53
Шнаркевіч, Язэп. 53
Шор (Shore), праф., 133
Špakowski, Petre, 217
Штэкеліс, Валя, 124
Шэрман, др., 65
Шукелойць, Антон, 58, 258, 270, 495, 517, 518, 544, 566, 567, 668, 674, 699, 700, 701, 703, 709, 718, 720, 721, 735
Шульгін, Р., 466
Шуст, Мікола, 503, 693
Shust, M., (Шуст, Мікола), 215, 503
Шутовіч, Віктар, сьвятар, 39, 40, 41, 272, 275, 276
Шушынскі, др. В.
Шчорс, др. Мікола, 411, 747
Scors, Dr. Nicholas, 747
Шчукін, 422, 423
Шыла, Мікола, 7, 10, 202, 304, 317
Шыманец, Уладзімер, 89, 98, 585, 609
Шыманец, Лявон, 606, 609, 680
Шыманка, М., 48
Шымко, У., 669
Шырма, Рыгор, 319, 320, 321, 405, 407
Шышкоўскі, 651
Шэпард, 529
Шэрман, др., 65

Э

Эгрэмонт, Лёрд, 648
Эль Грэко, 587
Энгэльгардт, (Engelhardt, E. F. von), 236, 237
Энрычы, Домэніко, арцыбіскуп, 694
Эрэнкройц, праф., 56

Ю

Юзык, Павал, 290, 347, 372, 466
Yuzyk, Paul, 431
Юсьціцкая, 52
Юзыфовіч, 81

Я

Яблжыкоўскі, арцыбіскуп, 272, 275
Яворскі, С., 371
Ягіч, 388
Ядвігін, Ш., (псэўдонім Антона Лявіцкага), 102, 103, 104, 105, 106, 136, 314
Яжоў, 166
Я. З., (псэўдонім Янкі Запруднiка), 569, 674
Якош, 454
Якуб, К., 609
Якубец, Мілан, 303
Ян, біскуп, 392
Ян XXIII, Папа Рымскі, 267
Ян Павал Другі, Папа Рымскі, 681
Яновіч, Сакрат, 719

Janovic, Sakrat, 751
Яновіч, Таня, 719
Ярэмко, Джон П., 290, 324
Yaremko, John P., 431, 433
Яськевіч, Віктар, 580
Яськевіч, Міхась, viii, 70, 74, 580, 707
Jaskiewicz, Michał, (Яськевіч, Міхась), 74
Jaskievich, Michael, xiii

ЗЬМЕСТ

УВОДЗІНЫ vii
БІЯГРАФІЯ ВІНЦЭНТА ЖУК-ГРЫШКЕВІЧА viii
INTRODUCTION xiii
BIOGRAPHY xiii

I. АПОШНІ І ПЕРШЫЯ ДНІ 1

II. У МЕНСКУ 5

III. 25 САКАВІКА Ў БУДСЛАВЕ 9

IV. У ВІЛЬНІ Ў 1-ай ВІЛЕНСКАЙ БЕЛАРУСКАЙ ГІМНАЗІІ 13
(Да 45-х угодкаў адкрыцьця гэтай школы)
У Гімназіі 15
У Ільяшэвічаў 18
Экзамены 19
Новыя знаёмыя. Базыльянскія Муры 24
Што такое Базыльянскія Муры? 26
Віленскі Саюз Каапэратываў 28
Бальшавікі ў Вільні 31
25-га Сакавіка ў Вільні 35
Выбарчым інструктарам у 1922 г. 39

V. У ПРАЗЕ ЧЭСКАЙ 42
Толькі адзін аказаўся 47
Жылкава жонка 35 гадоў ня бачыла сваёй дачкі 49

VI. У ВІЛЬНІ ПАСЬЛЯ ПРАГІ 52

VII. У САВЕЦКІХ ТУРМАХ І ЛЯГЕРОХ 56
Успаміны. Др. В. Жук-Грышкевіч. 27.04.1976

VIII. У ПОЛЬСКІМ ВОЙСКУ Ў ІТАЛІІ 69
Настаўнікам у вайсковай сярэдняй школе 69

IX. У АНГЛІІ 75
Згуртаваньне Беларусаў у Вялікай Брытаніі 75
Пратакол Першага Агульнага Зьезду Сяброў ЗБВБ 76
Думкі й спасьцярогі 83
Экспэдыцыя па «Залатое руна» 10.9.47 86

Беларусы ў Мальвэрн Вэйлз лягеры 86
Разважаньні 87
Першы Сусьветны Зьезд Беларускай Эміграцыі 88
Яшчэ аб беларускім доме ў Лёндане 89
Кантакты зь іншымі нацыянальнасьцамі 92
"Kwestia Białoruska" 92
Беларуска-ўкраінскае зьбліжэньне 92
"Byelorussia (Whiteruthenia) under Russian Occupation" 94
Згуртаваньню Беларусаў у Вялікай Брытаніі ... 95
На 20-я ўгодкі ЗБВБ. 21-му Зьезду Сяброў і Дэлегатаў ЗБВБ 96

X. У КАНАДЗЕ 99
На другім зьезьдзе Згуртаваньня Беларусаў у Канадзе 99
Авангард Беларусі 101
Літаратурныя ўгодкі 102
Антон Лявіцкі – Ядвігін Ш. (Да 30-х угодкаў сьмерці пісьменьніка) 102
Уладзімер Жылка 106
Дактарат 109
Першая Сустрэча Беларусаў Паўночнае Амэрыкі 114
Кангрэс "Pax Romana" 116
Беларуская (Таронта) Крэдытовая Супалка Byelorussian (Toronto) Credit Union, Limited 118
Шукайма эканамічных падставаў для нашых арганізацыяў 118
Арганізацыйны Сход Касы Узаемнай Помачы пры ЗБК 120
Зацьверджана Каса Узаемапомачы пры ЗБК ... 120
Сход Беларускай Касы ў Таронта 122
Царква 124
Арганізацыйная, культурна-асьветная, і ўзгадаваўча-палітычная праца 125
За, ці супраць палітыкі? 127
Лекцыі з беларускай літаратуры на ўнівэрсытэце ў Атаве 132
У Украінскім Літаратурна-Мастацкім Клюбе 132
Лектарат Беларусаведы 133
Заканчэньне Лектарату Беларусаведы ў Таронта 134

Другі год Лектарату Беларусаведы 135
Трагічная сьмерць паслоў Работніка-Сялянскай Грамады 138
Байкот Амэрыканскага Камітэту Вызваленьня Народаў Расеі, ці ўдзел у ім? 143

XI. У НЯМЕЧЧЫНЕ 149
Беларуская сэкцыя радыя «Вызваленьне» 149
Радыё «Вызваленьне» аб 25 Сакавіку 155
Беларускія перадачы ў Радыё «Вызваленьне» ... 156
Інаўгурацыйная беларуская перадача цераз радыястанцыю «Вызваленьне» 164
Вытрымкі зь лістоў Вінцэнта Жук-Грышкевіча да жонкі Раісы 173
Аб царкве й Тарантонскіх справах 182
Пайшлі памяраць, каб жыла Бацькаўшчына 185
Раіса ў Мюнхэне 188
У Італіі 190
На Іскіі 190
Разьвітаньне з супрацоўнікамі радыя «Вызваленьне» 192
Паварот у Канаду 193

XII. У КАНАДЗЕ – НА «ПАРУ АКРАЎ СЬНЕГУ», ЯК КАЗАЎ ВАЛЬТЭР 194
2-я Сустрэча Беларусаў 194
Наша прыстанішча - Бэры 194
Жыцьцё ў ЗБК 197
Сьмерць Эдварда Будзькі 198

XIII. ПЕРАПІСКА З ДР. В. ДЖ. КЭЙЭ ў справе манаграфіі «КАНАДЫЙЦЫ БЕЛАРУСКАГА ПАХОДЖАНЬНЯ» 207
Да разьдзелу “Beginning of Byelorussian immigration to Canada” 220
Да разьдзелу «Статыстыка». Колькі беларусаў у Канадзе 221
Колькі беларусаў пад расейскай рубрыкай 222
Развагі аб паляках 224
Да разьдзелу “Religious Divisions...” 227
Да гісторыі Рады й Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) 254

"V. J. Kaye, Professor at the Faculty of Arts, University of Ottawa, 'CANADIANS OF BYELORUSSIAN ORIGIN'" 263

XIV. ПАЧАТАК 60-х ГАДОЎ 269
Рэфлексыі на сьмерць ксяндза Віктара Шутовіча 272
Успаміны аб Пётру Сычу 276
Угодкі Франьцішка Багушэвіча 281
Пра пачаткі беларускага адраджэньня 283

XV. КААРДЫНАЦЫЙНЫ КАМІТЭТ БЕЛАРУСАЎ КАНАДЫ 285
Канфэрэнцыя – Rights and Responsibilities 287
"The Canadian Family Tree" 287
Кангрэс Канадыйскіх Славянаў 288
Census. 288
1986 год – Год Залатога Юбілею БНР 289
БНР ці БССР 290
Thinkers' Conference 290
Зьмены ў ККБК 291
Бел-чырвона-белы сьцягла ля ратушы Таронта 291
Новыя арганізацыі ў ККБК – 1970-я гады 292
Мэмарандум у справе дэкалянізацыі СССР 295
Да найважнейшае дзейнасьці ККБК належыць 296

XVI. ДАЛЕЙШЫ ХОД 60-х ГАДОЎ 303
48-я ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларусі 303
З успамінаў аб 25-м Сакавіку 304
17-ты Агульны Гадавы Зьезд Згуртаваньня Беларусаў Канады 307
60-я ўгодкі «Нашай Нівы» 308
Заснавальнікі й рэдактары «Нашай Нівы» 309
Успаміны пра «Нашу Ніву» 313
Хай не марнуюцца беларускія песьні, мы іх выдадзім 318
Удзел у канадзкім жыцьці 321
У Радзе Стагодзьдзя Канады 321
Адзначэньне Канадзкага Грамадзянства 324
Канфэрэнцыя на тэму: «Правы й абавязкі» – "Rights and Responsibilities" 324
Змаганьне з камуністычнай прапагандай 329
Савецкая Імпэрыя недаўгавечная 329

Узгадаваўчая праца й змаганьне з камуністычнай прапагандай 333
Бацькі дбайце пра сваіх дзяцей 333
Камуністы рыхтуюць Ветнам у Канадзе 336
Шануйма сваё права 339
Аб патрэбе агульнанацыянальнага цэнтру 343
Прынцып "Unity in Diversity" і Беларусы 345
Беларусаў дзеляць на нацыяналістых і... расейцаў 348
Камуністы цікавяцца Згуртаваньнем Беларусаў Канады 351

XVII. 1967 ГОД – ГОД 450-х УГОДКАЎ БЕЛАРУСКАГА ДРУКУ – ГОД СТАГОДЗЬДЗЯ КАНАДЫ ... 356
"The Canadian Family Tree" – «Дрэва Канадыйскае Сям'і» 356
Happy Birthday, Happy Centennial, Canada! 357
Зь гісторыі Канады 358
Сьвяты нацыянальны абавязак 364
49-я ўгодкі Дня Незалежнасьці ў Мантрэалі 367
Беларусы й канадзкая статыстыка 370
Другі Кангрэс Канадыйскіх Славянаў 370
Чаму няма беларусаў у канадзкай статыстыцы? 373
"Belorussians and Canadian statistics" 377
Перапіс насельніцтва Канады – Census 1971 385
Масква забіла ідэю славянскай фэдэрацыі 387
450-я ўгодкі беларускага друку 390
Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва ў Канадзе 398
ЭКСПО-67 400
Ліставаньне з беларусамі Мантрэалю 400
Міжнародная выстаўка - ЭКСПО-67 404
Беларускі Нацыянальны Дзень 404
Прэсавая канфэрэнцыя 406
"Byelorussian Brainwashing at EXPO 67? – FACT SHEET" 408
На ЭКСПО-67 Кісялёў перасаліў 412
Беларускае школьніцтва і... муха 414

XVIII. 1968 ГОД – ГОД ЗАЛАТОГА ЮБІЛЕЮ БНР .. 416
БНР – спадчына ўсіх беларусаў 416
Год Залатога Юбілею БНР 418

Прывітаньне Старшыні ККБК суродзічам беларусам 418
Прэзыдэнт Рады БНР у Канадзе 419
Слава Украіне! 421
50-я ўгодкі Беларускай Народнай Рэспублікі ў Таронта 424
Залаты Юбілей ў Ашаве 433
ЯК ПАЎСТАЎ АКТ 25-га САКАВІКА .....
(Адказ др. В. Жук-Грышкевіча на бальшавіцкія напады) 435
1. Бальшавікі й дзяржаўнасьць нерасейскіх народаў СССР 436
2. Усебеларускі Кангрэс 437
3. Рада Кангрэсу – Рада БНР 441
4. Акт 25 Сакавіка 443
Устаўныя Граматы БНР 444
Празь Беларусь – да «Прывісьленскага Краю» 448
Із страху перад свабодай 451
Гісторыя паўтараецца 455
Там дзе дэмакрацыя. Справа Квэбэку 458
Канада й нацыянальнасьці 460
Канфэрэнцыя ў справе праўнага стану культураў у Канадзе 464
Шматкультуралізм заміж двукультуралізму 464
Ліга БНР і рэарганізацыя Рады БНР 468
Ліга БНР вельмі на часе 469
Праект рэарганізацыі Рады БНР 471
I. Чаму патрэбна рэарганізацыя 471
II. Арганізацыйная база Рады БНР на выгнаньні 473
III. Склад і характар рэарганізаванае Рады БНР 474
IV. Як правесьці рэарганізацыю Рады БНР 475
Да паправак Старуту Рады БНР 475
Ідэёвыя вытычныя Лігі БНР 476
I. Уступ 476
II. Заданьні нашай эміграцыі 477
III. Чаму нам патрэбна Ліга БНР 478
IV. Чым ёсьць Ліга БНР 482
V. Заданьні Лігі БНР 483
Арганізацыйная Інструкцыя Лігі БНР нр. 1. ... 485

XIX. 1969-ты ГОД 487
Натальля Арсеньнева ў Канадзе 487
Падарожжа ў Нью Ёрк (Зь лісткоў дзёньніка В. Жук-Грышкевіча) 490
У Рачэстар – у Натальлі Арсеньневай 490
Паседжаньне Прэзыдыюму Рады БНР 493
Візыта ў Саржанта 496
Вынікі паездкі 502
Памяці Івана Луцкевіча 503
Юльяна Дубейкаўская ня жыве 506
Я вучыўся й рос пад уплывам братоў Луцкевічаў 507
Падарожжа ў Чыкага 514
Паездка ў Нью Ёрк 517

XX. 1970-я ГАДЫ 519
Зь лісткоў дзёньніка В. Жук-Грышкевіча: Навагодняя вечарына. Ялінка для дзяцей. 20-ты Агульны Зьезд ЗБК 519
Паседжаньне БІНіМ 520
Сход Касы 521
У гошпіталі ў Бэры 524
Бел-чырвона-белы сьцяг ля ратушы Таронта 531
Праклямацыя Мэра Таронта: "Byelorussian Independence Day" 534
Сьвяткаваньне 25-га Сакавіка 537
Сьмерць Міколы Абрамчыка й Уладыкі Васіля 539
Паседжаньне Рады БНР 542
9-я Сустрэча Беларусаў Паўночнае Амэрыкі 546
60-я ўгодкі Ларысы Геніюш 547
60-я ўгодкі др. Вітаўта Тумаша 549

XXI. СТАРШЫНСТВА Ў РАДЗЕ БНР 555
Камунікат Прэзыдыюму Рады Беларускае Народнае Рэспублікі пра пераняцьцё старшынства Рады БНР 555
Прывітальныя лісты 556
Праўныя й ідэялягічныя асновы Рады БНР 563
I. Праўныя падставы Рады БНР 563
II. Народны, дэмакратычны характар Рады БНР 564
III. Эміграцыйная спэцыфіка 565
11-я Сэсія Рады БНР 566

Статут Рады Беларускае Народнае Рэспублікі .. 571
Старшыня Рады БНР у Ангельшчыне 578
У Братфардзе 579
У беларускім Манчэстары 580
У Бэльгіі 581
Падзяка 582
25-я ўгодкі ЗБВБ 582
У Гішпаніі 586
10-я Сустрэча Беларусаў Паўночнае Амэрыкі 592
Дзень Гераяў Беларусі й 25-я ўгодкі Задзіночаньня Беларускіх Вэтэранаў на Чужыне 592
1973 год. 70-я ўгодкі жыцьця Вінцэнта Жук-Грышкевіча 595
Зварот Угодкавага Грамадзкага Камітэты (Фонд Выдаваньня Беларускіх Падручнікаў) . 595
Зь лісткоў дёньніка В. Жук-Грышкевіча 596
Верш Натальлі Арсеньневай: «Дарагому Вінцуку – сябру юнацтва» 597
Пісьмовыя прывітаньні 598
Падручнікі перш за ўсё 611
Выдавецкі Камітэт Беларускіх Падручнікаў у Канадзе 611
Нечародная 12-я Сэсія Рады БНР. 1973 614
Рэзалюцыя: "Byelorussian Survival Threatened" .. 615
Прывітаньне Старшыні Рады БНР з 55-мі ўгодкамі 25 Сакавіка 619
13-я чародная Сэсія Рады БНР 620
Зварот Рады Беларускае Народнае Рэспублікі да Беларускага Грамадзтва 620
Resolution 624
Ліст Старшыні Рады БНР да Прэзыдэнта ЗША ў Гэльсінкі 626
Рэзалюцыя 13-ай Сэсіі Рады БНР пабеларуску . 628
Плян працы Рады БНР на кадэнцыю (1974-1977) 630
I. Асновы Пляну Працы 630
1. Ідэялягічныя падставы 630
2. Роля Рады БНР 631
3. Роля сяброў Рады БНР 631
4. Фінансавае забясьпечаньне 632
5. Падзел працы 633
II. Плян Працы Рады БНР 633
1. Прэзыдыюм Рады БНР 633

2. Выканаўчы ворган Рады БНР (Сакратарыят) 633
3. Сэктары Рады БНР 634
12-я Сустрэча Беларусаў Паўночнае Амэрыкі ... 636
14-я нечародная Сэсія Рады БНР 637
Фундацыя Крэчэўскага 637
Рада БНР ніколі не ліквідавалася 638
Узнаўленьне арганізацыі Лігі БНР 639
30-я ўгодкі Згуртаваньня Беларусаў у Вялікай Брытаніі 640

XXII. 60-ты ЮБІЛЕЙ 25 САКАВІКА 642
60-я ўгодкі Беларускай Нацыянальнай Рэвалюцыі 642
Прывітаньне Старшыні Рады БНР на 60-я ўгодкі Першага Ўсебеларускага Кангрэсу 644
60-я ўгодкі 25 Сакавіка 646
60-я ўгодкі 25 Сакавіка ў Палаце Лёрдаў у Вэстмінстэр у Англіі 648
Прывітаньне Старшыні Рады БНР 13-ай Сустрэчы БПА 649
Беларуская замежная пошта 654
15-я юбілейная Сэсія Рады БНР 667
75-ты юбілей др. Вінцэнта Жук-Грышкевіча 669
Выдавецкі Фонд Успамінаў зь Беларускага Жыцьця 669
Пра мінуўшчыну – дзеля будучыні 670
Юбілей др. Жук-Грышкевіча 672
Падзяка 675
Абвестка 676

XXIII. 1979-ты ГОД 678
Канфэрэнцыя эўрапэйскіх сэктараў Рады БНР 678
16-я Сэсія Рады БНР 686

XXIV. 1980-я ГАДЫ 689
У справе "The American Relief Administration (ARA) in Byelorussia" 689
1000-годзьдзе дзяржаўнасьці Беларусі ў Канадзе 691
Сьмерць Біскупа Часлава Сіповіча 693
Памінальная імша ў касьцёле Люрдаўскал Божай Маці ў Таронта ў Канадзе 695
17-я Сэсія Рады БНР 703

XXV. 80-я ГАДЫ ЖЫЦЬЦЯ 705
Верш Натальлі Арсеньневай: «Даражэньні Вінцук» 705
Плянавая падрыхтоўка да наступнага жыцьця. .. 708
Беларускі Крыж 710
Пабудова Беларускага Крыжа 711
Высьвячэньне Беларускага Крыжа 713
Сход удзячнасьці 719
«Крыж», верш Натальлі Арсеньневай 722
«Божа! Пад крыжам адзіным народ наш злучы...», верш Дануты Бічэль 723
Канфэрэнцыя Прадстаўнікоў Беларускіх Асяродкаў Канады 726

XXVI. АПОШНІ ДЗЕНЬ 734
Паховіны др. В. Жук-Грышкевіча 735
Разьвітальнае слова сп. Міхася Тулейкі 736
Разьвітальнае слова сп. Васіля Стомы 737
Паніхіда па сьв. пам. В. Жук-Грышкевічу ў Клівэляндзе 738
Памяці др. Вінцэнта Жук-Грышкевіча 740
Пабудова Беларускага Крыжа – Справаздача ... 740
Памінкі па сьв. пам. др. В. Жук-Грышкевічу ў Таронта 741
Верш Н. Арсеньневай: «Малачай (На сьмерць сябры юнацтва)» 743
Спачувальныя лісты 747
Дарагі Вінцук! 755

БІБЛІЯГРАФІЯ артыкулаў і матарыялаў Вінцэнта Жук-Грышкевіча 757

ПАКАЗЬНІК ПРОЗЬВІШЧАЎ 771

ЗЬМЕСТ 788

ЖЫЦЬЦЁ ВІНЦЭНТА ЖУК-ГРЫШКЕВІЧА

РАІСА ЖУК-ГРЫШКЕВІЧ